# МІНШЧЫНА

## ў легендах і паданнях



МОЙ РОДНЫ КУТ

# МІНШЧЫНА

## Назвы населеных пунктаў паводле легендаў і паданняў



МІНСК «БЕЛАРУСЬ» 1998

УДК 882.6-3+[801.311+398.2] (476.1)
ББК 82.33 (4 Бен)-6
М 62

*Серыя заснавана ў 1995 годзе*

Складанне, запіс і апрацоўка
доктара філалагічных навук
**А. М. Ненадаўца**

ISBN 985-01-0015-X

© Складанне, запіс, апрацоўка.
А. М. Ненадавец, 1998
© Афармленне. М. В. Анемпадзістаў, 1998
© Ілюстрацыі. А. Г. Дашкевіч, 1998



# МІНСК

Ой, мае ж вы дзеткі, няўжо вы не ведаеце, адкуль пайшоў такі слаўны горад? Колькі пра гэта распавядалі даўней, а зараз то і па радыё гавораць, і вершы-байкі ўсялякія пішуць. Цікава чытаць, супадае многае з тым, што і мне даводзілася чуць ад старэйшых. Канешне, людзі адукаваныя, то і павыдумлялі складаней, не тое што тады было, калі проста пераказвалі з вуснаў у вусны. Сядуць, здаралася, на прызбе ў божую нядзельку і давай распавядаць пра ўсялякія старынкі, пра выпадкі незвычайныя, здарэнні дзівосныя. Да таго напалохаюць-настрашаць, што яшчэ зусім рана, а дамоў ісці сам не адважышся, мрояцца ў цёмных завулках здані, пачвары, дамавікі, нячысцікі. Многае памяталі людзі, перадавалі, нібы спадчыну, гэтыя гісторыі, імкнуліся, каб нашчадкі не забыліся. Вось і мне пераказаў мо яшчэ прапрадзед мой паданне пра Мінск. Не думайце, што выдумляю ці хлушу, не, проста жыў старэча надзвычай доўга, адзінаццаць дзесяткаў размяняў і пры сваёй памяці памёр. Ніколі не хварэў, а розум надзіва меў светлы. Памятаў усё да драбніц, нават дзень дакладна мог

сказаць, нягледзячы на тое, што падзея адбывалася мноства гадоў назад. Да яго людзі хадзілі параіцца ці каб замову ад жывата прашаптаў. Надта дапамагаў у гэтай справе.

Некалі, за сівымі стагоддзямі, за далёкімі вякамі, на месцы сённяшняга горада-прыгажуна нічога не было. Маецца на ўвазе з будынін ці з паселішчаў. Цякла рэчка, якая таксама і назвы ўласнай не мела. Абапал яе непралазныя лясы-пушчы стаялі, размерана пагойдваючыся пад вольнымі вятрамі, ды хмаркі-свавольніцы па небе пралятлі. Хто ж яго ведае, колькі часу гэтак доўжылася, можа, доўга, а можа, і не надта, толькі аднаго дня звяры, якія тут жылі спрадвеку, чагосьці захваляваліся. Гледзячы на іх, можна было сказаць, што яны прадчуваюць нейкую страшную бяду: мітусіліся, раўлі без дай прычыны, зашываліся ў норы і бярлогі. Ніколі раней такога не здаралася, а тут — на табе. Прыціх лес, стаіўся, птушкі і тыя не спяваюць, толькі ўслухоўваюцца ў напружаную лясную дрымоту. Адзін ручаёк, які ўпадаў у свавольніцу раку, смела журчэў, нібы яго нішто не хвалявала і не палохала. Знае сваю справу, звініць, дый годзе!

Сапраўды, не дарэмнай была трывога ляснога жыхарства. Дзён праз колькі раздаўся магутны тупат, нібы тысяч пару коней разам пераганялі з аднаго месца на другое. Дрэвы з каранямі вывальваліся, кусты, да самай зямлі прыгнуўшыся, назад разагнуцца не маглі, камяні, што ляжалі, нібы хаціны агромністыя, на дробныя кавалкі рассыпаліся, рэчка і тая супраць цячэння бег павярнула. Стогн па наваколлі, роў параненых і пакалечаных жывёлін стаяў. Здавалася, яшчэ гадзіна-другая — і ўся тутэйшая зямля правалiцца некуды ў апраметную, а на яе месцы з'явіцца бяздоннае мора.

Аж не. Н준як пад вечар тупат гэты яшчэ болей узмацніўся, і на тое самае месца, пра якое мы з вамі гаворку вядзём; выйшаў такі здаравенны чалавек, якіх мо ўсяго некалькі ва ўсім белым свеце было. З дубамі шматсотгадовымі роўны і такі ж магутны, як і яны. У руках, таўшчэразных, нібы слупы, трымаў такую агромністую булаву, што калі б трахнуў ёю адзін раз, то палавіну пушчы ў вокамгненне знёс бы. Вось такі асілак сюды прыблукаў.

Сеў адпачыць і задрамаў. Пахіліўся незаўважна на бок, а потым і расцягнуўся на мяккім імху, нібы

на пярыне. Храпе так, што ажно шышкі з елак асыпаюцца ды лістота на дрэвах шуміць, як ад самага моцнага ветру-ўрагану. Сонца, спадцішка падглядваючы праз густыя галіны, і тое пасяшалася як мага хутчэй закаціцца за гару. Усю ноч хроп незнаёмец, а пад раніцу завалтузіўся і прыўзняўся, абвёў вачыма навокал сябе і мармытнуў густым басам: «Куды гэта я ўчора заблукаў? Нешта і не памятаю добра, як прысеў ды як заснуў. Трэба пахадзіць-паглядзець, можа, тут спадабаецца, то і асяду, бо надакучыла ўжо па белым свеце бадзяцца, усё роўна, дзе б ні быў, але нешта не падабаецца...»

Устаў і пайшоў зноўку, але ўжо далёка не адыходзіўся, а імкнуўся абысці бліжэйшыя мясціны. Стане, азірнецца ды як ляпне далонню па дрэве, то тое напалавіну, нібы тонкая саломінка, і пераломіцца. А асілак на ўсё горла рагоча-заліваецца, так весела яму ад гэтага! Смяяцца смяяўся, але старанна ўсё выглядваў і праз некаторы час вярнуўся да сваёй простай начлежкі. Сеў на паваленым дуб дый сказаў нібыта: «Ну, цяпер я адсюль далей ні ў якім разе не пайду. Спадабалася мне тут. Усё ёсць пад рукамі: лес густы, гара высокая, ручаінка цурчыць-уецца, а вунь і рэчка віднеецца... Пабудую сабе хароміну, буду ў ёй жыць-пажываць ды дабра наживаць! Навакольных вёсак жыхароў прымушу на сябе працаваць, то і бяды ніякай ведаць не буду! Ой, столькі таго гора, што адзін! Сябрукоў хеўру збяру, з імі весялей стане. Запомняць тутэйшыя жыхары, хто такі Менеск і як з ім трэба лічыцца! Запомняць, бо не аднаму бубну на спіне адлупцую. Хай толькі каторы правінаваціцца! Дзесятаму закажа такі лайдак ці нядобразычлівец!»

З таго дня і застаўся тут жыць магутны незнаёмец. Толькі ж надта благі гэта быў чалавек. Так яго, можа, і называць не трэба, бо вельмі мякка пра такога злыдня сказана будзе. Мяркуйце самі. Сядзіць-сядзіць, дрэмле Менеск, а потым, ад таго, што няма чаго рабіць, пачынае за маленькімі зубраняткамі ці турамі ганяцца. Ведама ж, куды тыя ад такога велікана ўцякуць? Яны ж, дурненькія, думаюць, што з імі нехта гуляецца, але якая гэта гульня, калі асілак прыжме пальцам жывёліну да зямлі — яна і дух выпусціць. Крычыць-раве па-свойму маці-зубрыха ці турыха, дзяцей уласных аплаквае-шкадуе, а ў адказ ёй грамавы смех па пушчы разносіцца. За дзень столькі бяды-гора ўчыніць у лесе,

што крывавыя ручаі пачынаюць у раку цячы, і тая пачырванее і доўга колер вады не мяняе. У хуткім часе зусім ціха ў наваколлі стала. Тыя звяры, якіх Менеск перадушыць не паспеў, выбраліся пад покрывам ночы, калі ён соладка спаў, у іншыя мясціны, дзе па-ранейшаму было ціха і спакойна і ніхто не пагражаў іхняму жыццю.

Ачомаўся тады злыдзень, ведама ж, аднаму жыць сумна і не цікава, пачаў думаць, чым бы зноў тут заняцца. А быў ён, акрамя ўсяго іншага, яшчэ і злым чараўніком. Што толькі захоча — тое і здзейсніць. Нават і вокам не міргне, не прызадумаецца над тым, што пасля ягонага знахарства нехта будзе плакаць горкімі слязьмі, клясці сваю бязлітасную долю. Няма жывёл, дык асілак у іншым забаву знайшоў — пачаў вялізныя камяні з аднаго месца на другое перакідаць. Як пусціць такую глыбу, то яна вёрст дваццаць ляціць са страшным свістам і як рэзнецца ў зямлю, то паверхню да самай глыбокай вады прабівае. А то пабярэ ў далоні два шматпудовыя камені і давай адзін у адзін біць, лупасіць — ажно іскры ляцяць. А дзе іскры ляцяць, там пажар заўсёды ўзнікае. Займецца пушча гарэць, разгуляецца вогненны вал — мільёны дрэў загубіць. Толькі таму, хто ў гэтым вінаваты быў, хоць у вочы плюй, ягоную душу нішто не кране.

Потым і гэтакія прыгоды надакучылі Менеску, і вырашыў ён зрабіць нешта такое, чым можна было б здзівіць астатніх людзей. Хацелася здзейсніць дзіўнае, да чаго ў іншых рукі не даходзілі. Спахмурнеў чараўнік. Сядзіць, куды і сон прапаў, і ўсё разважае-думае — не прыходзіць нічога ў галаву. Тады раззлаваны асілак пачаў вымяшчаць злосць на акаляючым. Дабраўся аднаго разу да ракі, забрыў на сярэдзіну яе і спыніўся. Яму толькі па калена вады было. Паставіў далоні ўпоперак цячэння, хацеў перагарадзіць, ды вада як бегла, так і працягвала бегчы, толькі крыху ў бакі ўзяла. Бачыць злыдзень, што не палохаецца стыхія ягонай сілы, зверашчаў:

— З маёю сілаю спрачацца?! Я ж табе за гэта адпомшчу! Прымушу на сябе працаваць, і не проста сілу прыкладваць, а стамляцца так — сілы звінець-журчэць не застанецца!

Выскачыў на бераг, а са злосці не ведае, за што ўхапіцца. Дрэвы прыбярэжныя пачаў ламаць-крышыць і кідаць у рэчышча, ды вада іх, як салому, далей

адносіла, нібы пасміхаючыся над Менескам. Той нічога што здаровы, але заўважыў марнасць задуманага. Зноў сеў і задумаўся, неяк жа трэба адпомсціць ганарліўцы...

Доўга нерухома лыпаў вачыма, недзе ажно пад вечар ускочыў і радасна засмяяўся:

— Цяпер прыдумаў! Цяпер не выкруцішся! Будзеш ведаць, што словы мае на вецер лёгкімі пёркамі не ляцяць! Цяпер усё вырашана!..

Кінуўся да вялізнага каменя, на якім любіў адпачываць, седзячы ля ракі, ухапіў яго аберуч і як гопнуў пасярод ракі, то вада, можа, на пяць вёрстаў за берагі выйшла. Пасля першага пачаў кідаць мноства другіх. Не паспелі яшчэ ў небе першыя зоркі з'явіцца, а неўтаймаваная некалі рака была моцна запруджана. Віравала яна, кідалася на камяні. Але дарэмна. Нічога не здолела зрабіць стыхія з перашкодаю. А асілак ляжыць на беразе і са смеху давіцца:

— Дакруцілася! Даганарылася! Цяпер канец табе прыйшоў! Заўтра ж на камянях млын магутны ўзвяду, каб муку малоць! Казаў жа, што дарма існаваць не будзеш! І гэта яшчэ не ўсё. Каб надта лёгкім жыццё не падалося, малоць буду не жыта-пшаніцу, а камяні! Іх каб перакруціць, добра напнуцца трэба!

Сказаў так і запяяў сваім грамавым голасам нейкую, толькі яму аднаму зразумелую, песню...

З раніцы Менеск ужо шчыраваў на запрудзе. Напружваючы ўласныя сілы, насіў здалёку каменне і мураваў высокі і вялікі млын. Такіх яшчэ на мясцовых землях ніхто не будаваў. Слова сваё трымаў чараўнік. Як сказаў — так і рабіў. На дзесяткі вёрстаў навокал усе валуны пазбіраў, пазносіў да млына. Можа, за тыдзень будыніну і агораў, яе тысяча майстроў за год да канца не давялі б, а ён сам управіўся. Магутны дый умелы быў, чаго ўжо замоўчваць. Колы, можа, і не паверыце, але сцізорыкам выразаў. Тыя самыя, якія вада павінна была круціць. Падважыў як мае быць, прымеркаваў, паставіў і супакоіўся крыху. Вырашыў адпачыць, адразу не займацца млынарствам.

Ля берлагу пастаянна знаходзіўся і прыдумваў, як выгаду з такога дзіўнага вынаходніцтва найбольшую мець. Усё да драбніц прадумаў, наперад зазірнуў, як людзей прыціснуць, на сябе прымусіць працаваць.

Пайшоў па свеце хадзіць і вяскоўцаў папярэджваць, каб збожжа малоць толькі да яго на млын везлі,

інакш — караць бязлітасна будзе! Людзі падумалі, што ён жартуе, і пацiху млыны на месцах пачалі ўзводзіць. Ды дзе там, чараўнік, калі пра такое непаслушэнства даведаўся, раз'юшыўся, нібы звер паранены, і ўсіх, хто муку самастойна малоў, перабіў, а будыніны іхнія агнём зыркім пусціў. Нічога іншага сялянам рабіць не заставалася, як да злыдня лютага на паклон ісці. Есці ж хочацца, дзеці галодныя плачуць, жонкі ў вушы ўводзяць, каб неяк з цяжкага становішча выйсце знайсці. Толькі Менеск не дараваў ім такое бунтарства. Так мовіў:

— За тое, што вы мяне з першага разу не паслухаліся, не скарыліся, а вырашылі нораў паказаць, я вам адпомшчу! Да пятага калена закажаце, як не выконваць мае загады. Просьбаў да вас ніколі не меў і мець не буду. Так і ведайце! Збожжа на мой млын вязіце, бо не тое яшчэ будзе, калі нешта хітрае надумаеце!

Папляліся гаротнікі-працаўнікі па вёсках, каб з раніцы назад вяртацца. Загаласілі-закрычалі жанчыны, але нічога не папішаш, сіла, яна заўсёды законы дыктуе!

На золку першыя вазы ўжо да млына пад'язджалі. Менеск стаяў і з-пад лахматых брывоў пасміхаўся. Чаго б не радавацца, калі ўсё атрымалася, як і задумана было з часу будаўніцтва? Адчыніў дзверы, сялян з мяшкамі прапускаючы, і зноў гаворыць, да іх звяртаючыся:

— За тое, што малоць ваша збожжа буду, вы мне кожны па залатоўцы за адзін раз будзеце плаціць! У каго няма, той паўгода на маіх абшарах працаваць павінен! Зразумелі?!

Нехта, відаць не зразумеўшы, паспрабаваў было нешта мовіць у адказ, але не паспеў, бо толькі і прагучала прыдушанае: «А-а-а...»

Вялізны палец млынара прыціснуў бедалагу да зямлі, з якой яму было наканавана ўжо ніколі не ўзняцца.

Зарыпелі колы, завішчэлі, пасыпалася мука ў скрынку. А чараўніку ўсё мала. Новы здзек прыдумаў:

— Каб помнілі маю шчырасць, буду вам збожжа разам з камянямі малоць. Такім чынам, і раку-свавольніцу пакараю, як абяцаў, і вам у памяць добра ўемся!

Ужо ніхто і рота адкрыць не спрабаваў, хутчэй бы

з гэтага страшнага месца вырвацца, адчапіцца ад Менеска, бо дзе гарантыя, што наступным нябожчыкам не ты сам будзеш?

Заплацілі, а ў каго не было чым, той застаўся ў двары адрабляць. Дапамаглі адзін аднаму мяхі на вазы пазакідаць. Ведама ж, каб з чыстай мукой, то і самі б управіліся, а з каменнем, няхай сабе і памолатым, далёка не кожны нават ад зямлі адарве. Гаспадар глядзіць на мукі сялян ды пасмейваецца:

— Дзякуй вам, вяскоўцы, дзякуй, родныя, што выручылі, а то ўжо жыць не было за што, апошняя залатоўка некуды закацілася. І за работнікаў дзякуй вялікае. Хіба ж аднаму гэтулькі зямлі апрацаваць можна? Дзе ж гэта вы бачылі такое? Цяпер жа і мне спакайней стане: новыя работнікі парадак навядуць, а там, думаю, іх яшчэ болей стане. Прыязджайце, людзі добрыя, на наступным тыдні, чакаць вас буду. Ды не ўздумайце зноў характар паказваць, вам жа даражэй абыдзецца!

Загрукалі колы па вымашчанай грэблі, і хутка вазы зніклі з вачэй. Тады Менеск павярнуўся да тых, каго пакінуў у двары:

— Так, шаноўныя, адразу даводжу да вашага ведама, што ў мяне вы павінны працаваць не гэтак, як дома, а ў два разы хутчэй! Калі нехта не выканае тое, што я яму загадаю, то застанецца яшчэ на паўгода! Глядзіце, калі хто паспрабуе ўхіляцца ад працы, мне мае слугі хутка данясуць, а яны ў мяне ой якія верныя і старанныя! Глядзіце!

З таго самага дня жыцця вольнага людзям бедным не стала. Што толькі не прымушаў іх выконваць чараўнік! Куды захоча, туды чалавека і пасылае. Бачыць, што той ужо ледзьве ногі перастаўляе, то не дае яму адпачыць, а гляне суровым позіркам — і на месцы вяскоўца застаецца невялікі камень. Жывыя, праўда, пачыналі ўжо зайздросціць мёртвым. Тым не балела і пакутаваць болей не трэба было. Зямля святая да сябе прыбрала ад пярэваратня гэткага.

Менеск сяброў сабе пазнаходзіў, такіх жа крыважэрных і сквапных, як і сам. П'юць-гуляюць з раніцы да вечара, а не — то і ноч цэлую, потым лютаваць пачынаюць. Дзе ні хавайся — усё роўна знойдуць і калі жыцця не пазбавяць, то скалечаць — гэта ўжо дакладна. Болей таго, чараўнік набраў сабе цэлую шматлікую дружыну і па начах раз'язджаў з ёю па наваколлі, раба-

ваў да апошняй анучкі вёскі і сёлы, рэдкіх падарожных, якія, не ведаючы пра існаванне такога злыдня, спрабавалі прайсці некуды ў іншы край.

Усяго мала было Менеску: грошай, багацця, зямлі. Здавалася, што калі б мог, то і паветра ўсё аднаму сабе забраў бы. Ды не ў яго магчымасцях гэта было.

А людзі паміж сабою ўжо празвалі тое месца, дзе ведзьмакаваты млынар жыў, Менескавым берлагом. На лепшае не спадзяваліся, бо нават думак нельга было ад чараўніка схаваць, ён іх чытаў нібы па кнізе, яму ўсё вядома станавілася. Некаторыя родных дзяцей жыцця пазбаўлялі, каб не мучыліся, каб не трывалі пакуты потым ад млынара, бо ён амаль усіх жыхароў узяў да сябе ў рабства.

Прачулі неяк сяляне, што непадалёку, у іншым княстве, ёсць таксама чараўнік і, што самае галоўнае, ён не здзекуецца над паспалітымі жыхарамі, а, наадварот, дапамагае ім пры любым зручным выпадку, працуе разам з усімі ў полі, ніякай працы не цураецца. Хаваючыся, пагаманілі найбольш мудрыя паміж сабою і вырашылі паслаць да яго сваіх пасланцоў, каб прасіць аб неадкладнай дапамозе, бо яшчэ год-два і дапамагаць ужо не будзе каму.

Пад покрывам ночы неяк умудрыліся тыя праслізнуць паміж Менескавых служак і дайсці да добрага чараўніка. Упалі перад ім на калені і ўставаць не хочуць, гавораць, што да таго часу так стаяць будуць, пакуль не дапаможа ім усемагутны чалавек. Той паціснуў плячыма і сказаў:

— Устаньце, людзі добрыя, устаньце. Няма чаго перада мною на каленях у пыле поўзаць. Я ніколі і нікому ў дапамозе не адмаўляў і вас выручу. Раскажыце, што там у вас такое творыцца, калі вы гэтак скардзіцеся на ўласную долю?

Як пачалі гаварыць прыйшоўшыя, як пачалі распавядаць, то ва ўсіх, хто тут быў, валасы дыбарам паўставалі. Чараўнік адно толькі і вымавіў:

— Ды як жа так з людзьмі можна?! Я ж яму гэтага да скону веку свайго не дарую! Я ж яму...

Прыціхлі астатнія, на ўладара лёсаў гледзячы, бо ніколі яго такім узрушаным не бачылі. А той не змаўкае:

— Вось што, даражэнькія, як вы ні здарожыліся, але трэба нам тэрмінова назад кіравацца, бо ён жа за гэты час яшчэ колькіх на той свет звядзе...

— Ваша праўда, шаноўны,— пагадзіліся прышэльцы,— мы як-небудзь вытрымаем... Толькі дапамажыце, не кідайце ўжо нас на волю лёсу...

Доўга ці не ішлі назад, але нарэшце прыйшлі ва ўладанні Менеска. Чараўнік як убачыў, што млынар з сялянамі парабіў, то ажно за галаву схапіўся і яшчэ хутчэй прыпусціў да берлагу.

Млынар тым часам палуднаваў, за працуючымі пільнаназіраючы. Таму на падышоўшых людзей ніякай увагі не звярнуў, думаў, што зноў нешта прасіць прыбеглі. Ды жорстка памыліўся злыдзень на гэты раз.

— Што ж гэта ты, ваўкарэзіна, вырабляеш? Што ж гэта ты з тымі, хто зямлю апрацоўвае, робіш? Хто табе на гэта права даў? — узвіўся прыйшоўшы чараўнік.— Дзе тваё сумленне, дзе тваё сэрца? Як цябе зямля святая носіць?

— Ты хто такі, каб рот разяўляць на мяне? — грозна запытаўся Менеск і замахнуўся цялячай галёнкай, якую са смакам абгрызаў. Кінуць яе не паспеў, бо чараўнік як глянуў на гаспадара, то той адразу ж, на вачах, стаў рабіцца меншым і ператварыўся ў хлапчука. Усе зарагаталі, а былы валадар заплакаў і пабег прэч. З тых часоў яго ніхто на гэтых землях ніколі не сустракаў.

Добры чараўнік разбурыў млын і запруду, і зноў рэчка вольна пабегла па старым рэчышчы, гулліва плёскаючы ў берагі. Але паселішча, якое ўзнікла каля млына, захавала сваю ранейшую назву — Менеск. Потым, з цягам часу, стала — Менск, яшчэ пазней у Мінск перайначылі.

## ЗАСЛАЎЕ

Горад гэты — адно з самых старых паселішчаў на ўсёй Беларусі. Не было яшчэ Мінска і Барысава, Навагрудка і Віцебска і многіх іншых старажытных гарадоў, а тут, у спрадвечным краі крывічоў, сярод дрымучых лясоў і хуткіх рэк, ужо існаваў горад. Надта ж цікавая гісторыя яго ўзнікнення.

Уважліва слухайце ды запамінайце, што там да чаго, каб і каму яшчэ маглі паведаць. А справа тая пачалася з самага магутнага і велічнага горада на ўсёй беларускай зямлі — з Полацка.

Некалі, даўным-даўно, калі яшчэ нашы продкі былі язычнікамі і пакланяліся сваім драўляным багам, правіў у Полацку паважаны князь. Было ў яго двое сыноў і дачка-прыгажуня — Рагнедай звалі. Такая ўжо ясная ды харошая, што ў свеце, можа, усяго некалькі дзяўчат, на яе падобных па прыгажосці, было.

Вядома ж, калі б яна была з беднай сям'і, то пра яе прывабнасць мала б хто даведаўся, а тут жа, што ні гаварыце, дачка князя, ды яшчэ такога магутнага і ўплывовага. Яна зусім маладзенькай дзяўчынкай была, а да яе ўжо сватоў дзесяткамі слалі, кожны з вяльможных (блізкіх і далёкіх) суседзяў жадаў парадніцца з такім родам, узяць Рагнеду ў сваю хаціну.

Бацька любіў сваю адзіную дачку і не прымушаў ісці замуж супраць волі. Ён прытрымліваўся той думкі, што, хто дзяўчыне спадабаецца, за таго няхай і ідзе, а за бацькаўскім блаславеннем затрымкі не будзе. Ды Рагнеда не спяшалася надта, нібы адчувала сваім прачулым сэрцам, што чакае яе наперадзе ой якое цяжкае і пакутлівае жыццё. Пасмяецца, пагамоніць з князем, з гасцямі, са сватамі і пойдзе ў сваю святліцу. Задумаюцца прыезджыя, а потым і зразумеюць, што не згодна князёўна да шлюбу ісці. Што тут зробіш, прымусам жа не будзеш дзейнічаць, бо хутка ў каршэнь надаюць. Вунь колькі ваяў-дружыннікаў у мясцовага валадара.

Так гадоў колькі прайшло. За гэты час Рагнеда яшчэ прыгажэйшай стала. Расцвіла, нібы тая грушадзічка, з аднаго боку — стой, любуйся яе цвіценнем, а з другога — не працягвай руку, бо ўколешся, надзвычай гордая і непрыступная была красуня. Цяпер ужо далёка не кожны асмельваўся сватоў слаць, бо зараней ведаў, што іх у двары чакае. Князёўна ж на тое, што яны радзей з'яўляцца сталі, ніякай увагі ўвогуле не звяртала: ходзіць сабе, пасміхваецца, з людзьмі рознымі нібы з роўнымі размаўляе, адным словам, радуецца жыццю. Бацька хацеў было неяк паўшчуваць дзяўчыну, але, гледзячы на яе і прыгадваючы, як ён пабраўся са сваёй жонкай, нічога не сказаў, толькі буркнуў нешта ў густую бараду, накшталт: «Вылітая маці-нябожчыца! Вылітая! Усе кроплі пазбірала... Як жа так ужо і перадацца можа... Падобная і тварам, і характарам...»

Але аднаго разу і сама Рагнеда адчула, як можа сэрца соладка заміраць, калі нехта спадабаецца.

Было ўсё, як і шмат разоў да гэтага. Увайшоў, пакланіўшыся, у пакой да князя дружыннік і ад парога мовіў стрымана:

— Валадар, сваты прыехалі да князёўны.

— Адкуль на гэты раз? — гэтаксама стрымана запытаўся гаспадар, бо і яму такія навіны былі ўжо далёка не ўпершыню.— Мо зноў аднекуль з-за мора сіняга?

— На гэты раз крыху бліжэй, княжа, але якраз-такі ад сіняга мора, з Ноўгарада Вялікага. Прычым, дзіўна, але не толькі сваты, а і сам жаніх, тамтэйшы валадар...

— Што ж гэта ён так, сам да дзеўкі пабег? Непрыгожа так чалавеку ягонага дастатку паступаць. Няйначай пабаяўся, што сваты ні з чым назад вернуцца, дык сам прыджгаў,— і гаспадар усміхнуўся. Расплыўся ва ўсмешцы і дружыннік.

— Дык што ім загадаць?

— Пакарміце людзей з дарогі, хай адпачнуць, а пад полудзень чакаць будзем за сямейным сталом, там і паглядзім, там і распытаем, што да чаго.

— Усё зраблю, як загадана,— і вой нячутна знік за дзвярыма.

На полудзень уся сям'я сабралася ў вялікай, прасторнай святліцы, дзе звычайна вырашалі неадкладныя справы, раіліся і г. д. Сюды ж запрасілі і сватоў. Увайшлі тыя чынна, як і належыць людзям, якія прыбылі з такой місіяй, нізка пакланіліся гаспадару і давай распавядаць, дзеля якой куніцы яны сюды прыехалі з такіх далёкіх земляў. Незаўважна і да маладога князя гаворка падабралася, на той момант увялі і яго ў пакой. Рагнеда ўбачыла перад сабою сапраўднага асілка: маладога, высокага, магутнага, з такой шчырай усмешкай, што сама не ўтрывалася, як ні старалася, таксама ўсміхнулася ў адказ. Пераглянуліся сівабародыя сваты — будзе справа, раз так усё абярнулася! Далей рэй вядуць, не спыняючца. Гаспадар адчуў душою, што з гэтымі людзьмі не хутка прыйдзецца развітвацца, вунь як дачка зачырванелася ды вочы долу апусціла. Не было раней такога, не было. Спадабаўся, відаць, наўгародскі валадар, ды ён любому спадабацца можа, гэткі асілак і прыгажун.

Гаварылі сваты, гаварылі, а потым заціхлі. І такая незвычайная цішыня ў пакоі ўсталявалася, што чуваць было, як муха нейкая сонная ачнулася і пачала сваю

адвечную песню. Колькі так сядзелі — ніхто не заўважыў, але нарэшце гаспадар устрапянуўся:

— Дзякуй вам, госці дарагія, дзякуй, што не мінулі мой двор, што гэтак добра і хораша пра ўсё распавялі. Нізкі паклон ад мяне за павагу ды пашану прыміце.

Сказаў і на дачку непрыкметна зірнуў, а тая нікога вакол сябе не заўважае, глядзіць на госця і ўсміхаецца...

— Дык што, княжа, які ваш адказ нам будзе? — выдавіў ціхенька адзін са сватоў, здавалася, што яму нават няёмка было перабіваць гэткую замілаваную сцэну.

— Мой адказ такі, як і ў Рагнеды... Чуеш, дачушка? — пачаў было гаспадар.

Князёўна не чула. Яна была далёка адсюль. Тады валадар паціху пакратаў яе за рукаў:

— Дачушка, тут адказу патрабуюць далёкія госці. Якім тваё слова будзе? Як скажаш, так і вырашым.

— Татка, я згодна за князя пайсці,— сарамліва мовіла Рагнеда і выбегла з пакоя.

Тут ужо гамонка ўзнялася, што на ловах якіх. Справа вырашана, цяпер можна і мёду хмельнага выпіць, і песні папяяць. Усё самае лепшае на стале з'явілася. Пачалі па-сапраўднаму весяліцца, гаспадару не жадалася перад гасцямі, цяпер ужо такімі дарагімі, сквапным ці двурушным паказацца, а наўгародцам таксама хацелася сябе з лепшага боку паказаць. Неўзабаве і песні звонкія птушкамі паляцелі праз адчыненыя вокны ў начную цемру. Пад раніцу дамовіліся і пра дзень вяселля.

Яшчэ колькі дзён пагасцявалі сваты з жаніхом і пакіравалі ў сваё княства, бо там чакалі іх дзяржаўныя справы, іх нельга было адкладваць. Рагнеда выйшла правесці свайго суджанага. Развіталіся стрымана навідавоку, і імклівыя чаўны хутка схаваліся за паваротам Палоты.

Дзяўчына з бацькам да вяселля рыхтавацца сталі, часу заставалася не надта многа. Клопаты радасныя на плечы зваліліся. Забыліся яны зусім, што не толькі шчасце па зямлі ходзіць, але за сабою і бяду-ліха водзіць.

Аднаго дня зноў увайшоў да князя ў пакой дружыннік і прамовіў змрочна:

— Княжа, там... гэта... зноў сваты прыехалі...

— Якія яшчэ сваты? — здзівіўся гаспадар.— Князёўну мы ўжо запілі. Ні за каго іншага яна не збіралася ісці. Дык ідзі і паведамі прыезджым, каб надта тут не расседжваліся.

— Княжа, я ўжо так гаварыў, але...

— Гавары, чаго заціх?

— Яны пачалі пагражаць, валадар. То давялося нагадаць, што не ў сябе дома знаходзяцца, каб так сябе паводзіць... Тым не меней патрабуюць сустрэчы з табою і князёўнай.

— Вось як. А адкуль яны з'явіліся?

— Кажуць, што ад самога кіеўскага князя Уладзіміра... Можа, і ад яго, бо надта нахабныя і разбэшчаныя...

— Ну што ж, раз патрабуюць сустрэчы, то пайшлі, пагавару з імі, каб да маіх людзей ніякіх прэтэнзій не мелі.

Выйшлі ў перадпакоі, а там крыкі, шум. Князь рыкнуў на ўсіх магутным голасам, і адразу настала цішыня, бо тыя, што прыехалі, зразумелі, хто перад імі.

— Што госці дарагія жадаюць ад мяне пачуць? — пачаў валадар.— Нешта не зразумелі ці мае вої вам няправільна давялі?

— Давялі-то правільна,— азваўся незнаёмец са здаравенным гузаком на ўвесь лоб,— але ж яны забыліся, што мы ад самога кіеўскага князя сюды завіталі, каб дачку тваю, Рагнеду, сватаць.

— Запозніліся, шаноўныя,— з лёгкаю ўсмешкай прамовіў гаспадар.— Запозніліся. Заручоная яна ўжо. Вось і да вяселля рыхтуемся...

— Наш князь загадаў перадаць, што калі дабром не аддасі дачку, то сілай яе возьме, але тады ўжо позна вам шкадаваць будзе, літасці не чакайце,— нахабна адставіўшы нагу, працягваў, мабыць, старэйшы са сватоў. Хацеў яшчэ нешта дадаць, ды не паспеў, бо нехта з гаспадаровых дружыннікаў так улупіў яму ў патыліцу, што ён пераляцеў цераз увесь пакой і ўрэзаўся ў дубовую сцяну так, ажно дрэва застагнала.

— Мяне палохаць? У маім двары мяне палохаць? — захлынаючыся ад ярасці, усхадзіўся князь.— А ці ведаеце вы, што полацкія князі ніколі ніжэй кіеўскіх не стаялі і загадаў іхніх выконваць не збіраліся, так і перадайце свайму гаспадару. Слугі, правядзіце гасцей з пашанай! Як ім і належыць за такія паводзіны!

Праводзілі сапраўды з гонарам і пашанай. Сваты

ляцелі так, што толькі спіны трашчалі пад магутнымі ўдарамі полацкіх вояў, якім таксама не надта спадабалася тое, як яны сябе трымалі. Ледзьве кіеўскія госці за вароты выскачылі і паджгалі як мага хутчэй ад страшных сцен.

Але нездарма яны ўсё ж пагражалі палачанам. Неяк зусім нечакана апынулася шматлікае войска князя Уладзіміра, які гэтак дабіваўся рукі Рагнеды, пад Полацкам. Жыхары і апамятацца не паспелі, калі гэта ворагі прыспелі сюды. А сабралося іх столькі, што нават на прыступ высокіх сцен усе адразу пайсці не маглі — месца не хапала. Прыйшлі сюды не толькі кіеўскія ваяры, але і многія іншыя. Хто дапамагчы паспяшаў, а хто — парабаваць багатыя храмы і цэрквы, дамы заможных гараджан.

Уладзімір паслаў аднаго з дружыннікаў, каб той паведаміў мясцоваму князю ягоную волю, і калі Рагнеда скорыцца, не будзе адмаўляць, то, можа, яшчэ і даруе палачанам ганебную для яго адмову. Толькі не паслухалася дзяўчына ліслівых прапаноў.

— Ёсць у мяне суджаны, з ім я заручоная, болей ведаць нікога не хачу! — адрэзала коратка і адвярнулася. Калі ж пасланец перайшоў на мову пагроз, то ўвогуле, успыхнуўшы, гнеўна прамовіла: — Не пайду я разуваць сына рабыні! (Гэта значыцца, што князь Уладзімір меў не надта высокае паходжанне.) Так яму і перадай! У мяне ёсць бацька, ёсць браты, яны за мяне ўступяцца! Не думайце, што вас тут чакае лёгкая перамога!

Пайшоў пасланец, нічога не дабіўшыся, паведаміў пра ўсё Уладзіміру. Той раз'юшыўся:

— Мяне, самага магутнага ва ўсім свеце князя, яна асмелілася назваць сынам рабыні?! Яна спадзяецца на што? На тое, што мы спалохаемся магутных сцен і ўмацаванняў і адыдзем? Ды я пасля такіх размоў ад горада каменя цэлага не пакіну — усё знішчу, усё зруйную, а жыхароў — у палон павядзём! На прыступ! На сцены, мае смелыя воі!

Зараўлі на розныя галасы ваяры і кінуліся штурмаваць Полацк. Ды толькі не трэба было забывацца, што і на гарадскіх сценах стаялі не менш вопытныя дружыннікі, і напалохаць крыкамі і шматлікасцю іх не выпадала. Як пачалі пускаць трапныя стрэлы, як сталі ліць на галовы нападаючых смалу, кіпень, як грохнулі на штурмавыя лесвіцы першыя вялізныя

валуны, спецыяльна сабраныя і звезеныя на баявыя пляцоўкі для такіх момантаў, то адразу ж пачаў мяняцца радасны настрой ў няпрошаных гасцей. Адкаціліся на зыходныя пазіцыі і сталі раны залізваць. Змрочны Уладзімір слухаць нічога не жадаў у апраўданне, што, маўляў, гарнізон буйны, сцены высокія і моцныя, воі спрактыкаваныя ў саперніка. Крычаў так на ваявод, што тыя ў плечы галовы паўбіралі:

— Пастухі вы, а не ваяры! Вам не мячамі, а цапамі махаць, ды і то асцерагацца трэба, каб самі сабе чаго не павыкручвалі ці не паадбівалі! Каго спалохаліся? Іх жа там зусім мала! Гляньце вакол! З такой сілай шэсць Полацкаў адначасова штурмаваць можна, перад намі ж толькі адзін!

Дзядзька ягоны, самы галоўны ваявода, асмеліўся слова насуперак мовіць. Паважаў Уладзімір гэтага дружынніка, вырас на руках старога.

— Не забывайся, княжа, што з Полацкам нам заўсёды надзвычай цяжка ваяваць даводзілася. Славы ў іх не меней, чым у нас. І жыццё ў палоне іх не задаволіць. Змагацца будуць да апошняга чалавека. Тут з наскоку справу не вырашыць, трэба да працяглай аблогі пераходзіць, у адваротным выпадку толькі людзей задарма патрацім, ды і хто яго ведае, як потым лёс можа павярнуць. Рыхтавацца трэба больш старанна. Вось так, валадар.

З цяжкім сэрцам пагадзіўся Уладзімір на такую прапанову, але і адмовіць яе не мог, бо выдатна бачыў, што яшчэ пару такіх штурмаў і ад ягонага войска і паловы не застанецца. Шкада, вельмі ж жадалася як мага хутчэй адпомсціць сваім зняважальнікам. Заскрыпеў князь зубамі і адпусціў ваявод.

З таго вечара кіяўляне не лезлі ў бойкі гэтак адчайна і неабдумана, асцерагаліся. Такая тактыка, канешне, не на руку была палачанам. Ім дапамогі чакаць не было адкуль. Замены загінуўшым не знаходзілася. Жанчыны, старыя, падлеткі бязвусыя на сцены ды вежы ўздымаліся, каб супрацьстаяць ворагам, але і іх станавілася з кожным днём усё меней і меней. Счарнелі абаронцы, змізарнелі, бо аблога не дзень, не два доўжылася, а можа, месяц ці болей. Каб жа с перапынкамі ці з адпачынкам, а то нават уначы кідаліся на штурм аб'яднаныя сілы.

Надакучыла ўжо і Уладзіміру такая гульня. Сабраў зноў ваявод і сказаў, хаваючы позірк:

— Вось што я тут вырашыў. Калі за тры наступныя дні Полацкам не авалодаем, то назад павернем. Няхай яна спрахне, тая Рагнеда са сваёй прыгажосцю разам...

Павесялелі ваяводы пасля такіх слоў, падбадзёрыліся. Яшчэ б! Што за тры дні яны горадам кіраваць не будуць, ніхто не сумняваўся, а гэта значыць, што хутка дамоў вернуцца, родных і блізкіх убачаць.

Князь адчуў рэзкую перамену настрою ў падначаленых і таму, каб не даваць ім лішніх прычын для размоў, загадаў:

— Разыходзьцеся па сваіх палках, ды глядзіце там, ахову пасільце. Людзей аберагайце, а то і так палачане самых смелых і вопытных пабілі, адны маладыя пазаставаліся, з імі не вельмі наваюеце. Ідзіце адпачывайце.

Усе так і зрабілі. Усе, акрамя дзядзькі. Падышоў ён да Уладзіміра і, спрабуючы зазірнуць яму ў вочы, мовіў:

— Нічога страшнага ў тым, што Полацкам не авалодаем, няма. Падумаеш, з кім такога не здараецца. Вайсковая справа — своеасаблівая. Здараецца, пашанцуе, а бывае і... Знойдзем мы табе яшчэ прыгажэйшую, княжа, не бядуй надта...

Ваявода хацеў сказаць яшчэ нешта, але ў гэты самы момант полаг шатра адхінуўся і на парозе з'явіўся нячутнай зданню начальнік аховы:

— Валадар. Навіна ёсць. Відаць, добрая навіна...

— Што яшчэ там такое? — ускінуўся Уладзімір.— Гавары хутчэй.

— Перабежчык з'явіўся. Здаецца, дапамагчы шчыра жадае. Цяпер зусім іншым шляхам справа пойдзе.

— Сюды яго, хутчэй!

У шацёр упіхнулі спалоханага, ускудлачанага чалавека невялічкага росту. Ён адразу ж брыкнуўся на калені і папоўз да князя, але той, грэбліва махнуўшы рукою, ускрыкнуў:

— Устань і гавары! Хутчэй!

Перабежчык падняўся і пачаў:

— Валадар, я ведаю, як незаўважна можна ўварвацца ў Полацк. Там ёсць падземны ход. Ён вядзе ў княжацкія харомы. Ноччу магу незаўважна правесці тваіх вояў у самы цэнтр абароны.

— Ты хто такі? — чамусьці запытаўся Уладзімір.

— Шолах я, княжа, Шолах... І гэты ход выдатна

ведаю, бо гадаваўся разам з Рагнедай у княжацкай сям'і, з яе братамі як родны быў... Часта ў падземным ходзе мне даводзілася да гэтага лазіць.

— А чаго ж ты сваіх прадаеш, калі з маленства разам рос? — данеслася з кута дзядзькава запытанне.

— Адпомсціць хачу ім за тыя прыніжэнні, якія пастаянна сыпаліся на маю галаву з-за нізкага паходжання.

Пры такіх словах Уладзіміра перакасіла, але ён стрымаўся.

— Што ж, паспрабуем ноччу. Калі падмануў — ведаеш, што цябе за гэта чакае,— нібы нехаця выдавіў ён з сябе.

— Ведаю,— пагадзіўся перабежчык.

Полацк спаў трывожным сном аблажнага горада. Толькі вартавыя на вежах і на сценах пільна ўглядаліся ў бок варожага лагера. Усё пакуль што было спакойна. Потым раптоўна ўсчаліся крыкі ў княжацкім палацы. Запалала зыркае полымя, загарэліся бліжэйшыя будыніны, пачуліся адчайныя галашэнні аб дапамозе. Полацкам авалодала паніка. Людзі, нібы звар'яцелыя, кідаліся ў розныя бакі і паўсюдна натыкаліся на ворагаў. Палілася шырокай ракою бязвінная кроў.

Самае страшнае адбывалася ў харомах мясцовага валадара. Там ужо не чулася гукаў бітвы. Толькі гарлалі-вішчалі жанчыны ды заходзіліся дзеці.

Князь Уладзімір стаяў пасярод ярка асветленага пакоя і глядзеў на паланёных непрыяцеляў: князя і ягоных сыноў.

— Што, не верыў у гэта? Не спадзяваўся, што возьмем горад і прыйдзецца адказваць за абразлівыя словы? — звярнуўся ён да гаспадара.— Бачыш, як добра атрымалася...

— Не надта каб і добра. Калі б не здрада, то не бачыць бы табе Полацка, як уласных вушэй! Абразлівыя словы? Ніколі людзей не абражаў, нелюдзяў — іншая справа! Твае ўчынкі абразлівыя, і заплаціш ты за іх у хуткім часе!

— Не скрыпі зубамі, князь, для мяне твае пагрозы зараз пустыя словы. Чакай, пакуль Рагнеду не прывялі. Сказаў, што мая будзе,— так і здзейснілася!

— Не будзе яна твая, злыдзень!

— Будзе, і ты гэта сам убачыш перад тым, як памерці!

Воі прывалаклі ў пакой князёўну. Яна спрабавала

супрацівіцца, але дзе вы бачылі, каб слабая дзяўчына адбілася ад некалькіх мужчын?

— Глядзі, бацька,— прагаварыў Уладзімір і пакіраваў да Рагнеды. Спыніўся, паглядзеў, хітнуў галавою: — Прыгожая... Падышоў ушчыльную і рвануў кашулю. Тая затрашчала і спала з князёўны. Цяпер яе трымалі голую, як маці нарадзіла. Вораг ухапіў яе за рукі і паваліў на падлогу, дзяўчына забілася і паспела крыкнуць:

— Татачка!..

Стары князь з сынамі закруціўся на месцы, спрабуючы хоць неяк дапамагчы, але ваявода-дзядзька злосна гыркнуў:

— У мячы іх!

Хвілін праз колькі ўсё было скончана: князь і сыны пасечаны, а згвалтаваная Рагнеда беспрытомная ляжала на тым самым месцы, дзе над ёю здзекаваўся Уладзімір...

Пераможцы радасныя вярталіся ў Кіеў. А чаго не весяліцца? Палону столькі набралі, багацця нахапалі, князь жонку-прыгажуню вязе... Страты шматлікія? Дык яны ў кожнай сечы бываюць. Да іх прызвычаіліся, яны не палохаюць.

З таго дня стала Рагнеда жыць у двары князя Уладзіміра. Лічылася ягонай жонкай. У хуткім часе сына нарадзіла, але крыўды, абразы, нанесеныя ёй, не забывала. Усё шукала зручнага выпадку, каб неяк адпомсціць за бацьку, за братоў, за сябе. Доўга не надаралася, але нарэшце пашанцавала. Уладзімір прыехаў да жонкі і, абласканы ёю, заснуў. Яна тым часам узяла востры нож і пачала красціся да ложка. Толькі не паспела здзейсніць свой намер, бо ў апошні момант муж адкрыў вочы і, вядома ж, выбіў смяротную зброю.

Паводле тагачасных законаў, Рагнеду павінны былі пакараць смерцю, і жанчына гэта выдатна ведала. Таму, калі Уладзімір пабег збіраць найбольш вядомых сваіх памагатых, каб суд учыніць, яна зачынілася ў пакоі і пачала спакойна апранацца ў святочную вопратку, каб адысці да бацькі і братоў у прыгожым убранні вясельнай маладой.

Сабраліся ваяводы, багатыя кіяўляне, сядзяць чакаюць, пакуль Рагнеда да іх выйдзе. Неўзабаве дзверы адчыніліся, і тая пераступіла парог. Некаторыя, па звычцы, усталі — княгіня ж была перад імі, некато-

рыя — таму, што яна ўсё роўна заставалася надзвычай прыгожай.

— Ну што скажаш, верная жоначка? — усчаў Уладзімір.

— Што скажу? Шкада, што не здолела зрабіць тое, над чым многія ночы не спала. Адпомсціць табе, вылюдак, не змагла,— горда адказала Рагнеда і адвяла позірк ад ра́дцаў.

— Чаго яе яшчэ дапытваць, княжа? — мовіў нехта з найбольш адданых прыхільнікаў Уладзіміра.— Мячом па шыі — і канец!

Але астатнія маўчалі.

Нечакана раздаўся тоненькі галасок:

— Спачатку мяне мячом па галаве, бо я выклікаю на двубой таго, хто замахнецца на маю маці!

Вочы ў радцаў акругліліся. Стары ваяр прыўзняўся і прашаптаў:

— Хто там яшчэ такі?..

— Я,— зазвінеў адчайны галасок, і з-за Рагнеды выступіў яе пяцігадовы сынок з цяжкім мячом у руках.— Я! Забівайце спачатку мяне!

Адзін з ваявод, перапыніўшы доўгую паўзу, устаў і, павярнуўшыся да князя, загаварыў:

— Асудзіць, вядома ж, мы можам, валадар. Толькі дай Бог, каб у мяне была такая жонка і такі сынок. Большага б я не жадаў.— Сказаў так і сеў.

Астатнія таксама маўкліва схілілі галовы.

— Я не дарую! — узарваўся Уладзімір.

— Твая справа, вяльможны, але забіваць іх мы табе не дамо,— прамовіў нейчы цвёрды голас.

— А што ж,— пачаў і не скончыў гаспадар,— што ж...

— Дай ім невялікі надзел у спадчынных землях Рагнедзінага бацькі-нябожчыка і адпусці туды жыць.

— З гэтым згодны,— адабральна загулі галасы.

У глухіх мясцінах Полацкай зямлі быў закладзены невялікі драўляны замак, дзе і стала жыць князёўна з сынам Ізяславам. Даўно яны памёрлі, а памяць пра іх жыве ў народзе. І горад, які пазней там узнік, Заслаўем назвалі, у гонар смелага сына мужнай матулі.

## ВІДАГОРШЧ

Мне мой дзед некалі гаварыў страшную казку-праўду, якая мела месца ў тутэйшых землях. Ён жа недзе

ад яшчэ старэйшых ці мо і ад сваіх сучаснікаў пачуў гэты аповяд. Я тады зусім маленькі быў, але запомніў усё да драбніц, бо надта ж жудасна ён гаварыў, а яшчэ і паказваў, чым ды як людзей увесь час дратавалі злыдні ўсялякія: панскія паслугачы, лёкаі, падпанкі. Не было ад каго бедным вяскоўцам чакаць дапамогі, толькі на сіняе неба спадзяваліся, што бачыць яно іхнія пакуты нечуваныя і не сёння-заўтра адплаціць тым, хто бязлітасна здзекаваўся. Але пра ўсю гісторыю па парадку паслухайце, бо не зразумееце нічога.

Вакол вёскі Відагоршч і цяпер лясоў непралазных ды густых няма — адны толькі лысыя пясчаныя ўзгоркі, на якіх не хоча расці ні збожжа, ні бульба. Не было і тады, у даўнія стагоддзі, ні бароў, ні пушчаў. Дарога роўненькай стужкай вілася-«кулялася» з узгорка на ўзгорак, за пад'ёмам спуск пачынаўся, а за спускам чарговы пад'ём, яшчэ больш круты і высокі. Таму і вазы мясцовыя сяляне рабілі надзвычай трывалымі і невялікімі. Калі вялікі агораеш, то коніка зморыш за пару вёрстаў цяжкай дарогі, а калі нетрывалым злепіш — то рассыплецца дзе-небудзь на чарговай яміне, калі жывёліна паляціць што ёсць духу, бо спуск круты быў. Такое чаргаванне ўзгоркаў і далін тут і сёння сяляне называюць калыскамі. Яно і праўда. Як глянуць аднекуль з нябёсаў на ніз, то і сапраўды даліна паміж двума ўзгоркамі надта калыску нагадвае.

Мучыліся вяскоўцы спрадвеку, апрацоўваючы такое поле. Яго ж то і араць не дай Божа, і скародзіць таксама. Пакуль да месца работнік дабярэцца, то і ў самога спіна мокрая, і конік ледзьве дыхае. Папрацуе гадзіну-другую, і ўсё, на большае не здатны чалавек. Але ж хто там глядзеў, асабліва тады, пры прыгоне! Божачкі! Што тут рабілася! Мароз па скуры прабягае, мурашкі да сэрца праймаюць і зараз яшчэ, хоць я сам такога дзікунства не бачыў, а мне пра яго толькі распавядалі.

Назганяюць сялян з бліжэйшых вёсак на гэтыя ўзгоркі араць поле, дзе можна нешта сахою ці плугам укалупнуць. Не разгінаюцца, бедалагі, сарочкі на плячах ад поту салёнага гнілі і лахманамі долу спаўзалі, ды і спыніцца нельга, перадыхнуць ні хвілінкі немагчыма, бо лютыя паслугачы з даўжэзнымі бізунамі, у тры разы скручанымі, пільна сачылі, каб панскі загад выконваўся непарушна. Вось так і трывалі, ад цямна і

да цямна, з сем'ямі сваімі амаль не бачыліся. Нярэдка такія аратыя і паміралі прама на баразне. Бывала, валы стомяцца, прыстануць, і хоць ты іх пазабівай — з месца не зрушацца, то падпанкі, не доўга думаючы і разважаючы, мужыкоў у ярмо запрагалі. Да чаго ўжо, злыдні, дадумваліся, што нават ваду на панскую кухню ў бочках і то не коньмі, а на людзях вазілі.

Каб было адкуль пільна сачыць за прыгоннымі вяскоўцамі, якія працавалі на палях, у старым і густым панскім парку, на гародах, дзед Казуновічыхі (пані такая была, мо гэтакую мянушку мела, а мо і прозвішча, хто ж яго дакладна ведае) загадаў прыбудаваць да свайго велічнага палаца высокую мураваную вежу, дзе ўвесь час сядзеў з падзорнай трубой галоўны эканом. Усё было відаць як на далоні. Нельга ні схавацца, ні ўкрыцца, ні адбегчыся, каб дзе ў куст які ўшыцца ды хоць паўгадзінкі падрамаць ці проста даць спачынак стомленаму целу. Прыпыніўся араты дзе-небудзь нават на імгненне, а служкі ўжо ляцяць на хуткіх конях ад панскага жылля, каб бязлітасна расправіцца з неахайным працаўніком. Такому чалавеку не дадуць ужо і палову ад той мізэрнай платы, якую іншым сялянам усё ж давалі. Вось і мяркуй, як далей быць. Сям'я ж дома, яе нечым карміць трэба, ды і зіма працяглая і халодная яшчэ наперадзе. Горкімі слязьмі заліваецца бедалага, але хіба ж ты расчуліш каменнае сэрца, калі яно ўвогуле не прывучана чуйна ўспрымаць людское гора. З гэтае нагоды на вясковых могілках пахілыя крыжы над магіламі заўчасна пайшоўшых з жыцця раслі што грыбы пасля дажджу.

Тут ужо гора, то гора, але ж некаторыя яшчэ вытрымлівалі надзвычай цяжкі працоўны рытм і выконвалі штодзённыя загады суровага пана. Ды і ў іх не ўсё надта гладка ішло. Справа ў тым, што памешчыкавы служкі глядзелі не толькі за людзьмі. Хатняя жывёла таксама была ў іх навідавоку. А што ж ты скажаш дурной жывёліне, каб яна ў чужую траву не заходзіла, каб на панскае поле, даруй Божа, не зайшла? Працуе селянін з гаспадыняй на палетках свайго гаспадара, шчыруе з раніцы да змяркання і не здагадваецца нават, што, прыйшоўшы дахаты, не застане яе там. Дзеці перапалоханыя плачуць-галосяць, што жывёлу не ўпільнавалі і яе загналі на падвор'е паме-

шчыка. Пачуе пра такую навіну гаспадыня і беспрытомнай на зямлю шасне. Што ж гэта за жыццё без кароўкі-другой? Дзе яна потым хоць кроплю малака вымаліць? Хто ёй паспачувае? Дзеці, убачыўшы такое, зусім дар мовы губляюць, па іх жа віне ўсё атрымалася! Гаспадар пасядзіць, гаротна апусціўшы рукі, і, гледзячы на тое, як убіваецца жонка, моўчкі ўстане і пакіруе да палаца, каб там упасці ў ногі свайму валадару, паспрабаваць вымаліць назад аднятую жывёлу. Праўда, мала каму там асабліва шанцавала, бо заставаў ён ля велічнай будыніны даўжэзную чаргу гэткіх жа гаротнікаў, як і сам, што прыйшлі сюды з такой жа просьбай. У паветры стаіць енк і плач, стогны і праклёны, чуваць адчайныя крыкі вяскоўцаў. Бо пан жа не проста так размаўляе з людзьмі, а яшчэ і загадвае верным цівунам лупцаваць, збіваць тых, хто ўпаў у ногі. Наздзекуецца, колькі пажадае, а потым прысуд свой выносіць.

— Што, думаеце, у мяне поля і сенакосаў столькі многа, каб на іх без дазволу сваю жывёлу пасвіць? Дзе ж вы такое бачылі ў белым свеце, каб вяльможны пан нейкім лапцюжнікам назад вяртаў забранае ў іх?

Людзі, збітыя, скрываўленыя, тым не меней па-ранейшаму літасціва прасілі:

— Пане, вяльможны, каханы ты наш, родны і адзіны, не дай памерці з голаду нашым дзеткам. Мы табе за ўсё адпрацуем: за ласку, за спачуванне. Толькі дапамажы, толькі выруч, а болей ужо ў жыцці ніхто з нас жывёлу на твае палеткі не пусціць. Навука да скону будзе. Даруй, вяльможны.

Толькі дарма яны прасілі і маліліся на старога дурня. Нікому не збіраўся ён за так дараваць парушэнне заведзеных ім самім законаў. Даруй аднаму — потым другі прыйдзе. Гэтак, глядзіш, і багацця паменшае. Таму і гаварыў такое, што валасы дыбарам уставалі нават у тых, хто на самае горшае спадзяваўся:

— Дарую вам, так ужо і быць. Добра надта ж просіце. Але толькі пры адной умове. Слухайце яе ўважліва, бо потым будзеце сцвярджаць, што нічога падобнага не чулі. Дарую таму, злыдні вы, якія на чужое пакваліліся, хто замест жывёлы дачку маладую да мяне ў пакоі на ноч-другую прывядзе. Чуеце?

— Чуем,— ледзьве мовіў нехта з прысутных сялян.

— Што, не задаволены такім паваротам справы?

Тады кіруйце дамоў і забудзьце дарогу да майго палаца! Што, паменшае вашых дачок ці сясцёр, калі са мною пераспяць?

Пан гучна рагатаў, яго, як маглі, падтрымлівалі прыслужнікі.

— Дык што, згодны? — перапытваў ён.

З невялічкага натоўпу ў адказ чуўся толькі прыдушаны ўсхліп.

Так працягвалася не год і не два, а некалькі дзесяцігоддзяў запар. Вяскоўцы ўжо нават забылі, калі смех гучаў у гэтых ваколіцах. Жудасна, змрочна навокал стала, нібы ў пекле якім, на самым дне.

Баяліся людзі, пакланяліся, хаваліся, трывалі ўсё, што на іх валілі, як бы балюча ні было. Можа, ужо і не задумваліся, што неяк можна аблегчыць уласнае становішча.

Аж неяк паміж імі з'явіўся чалавек, які не збаяўся супрацьпаставіць сябе панскім памагатым і самому памешчыку, і стаў паціху падбухторваць сялян рушыць у наступ на ненавісную для іх усіх вежу.

Аднае ночы, калі грымеў моцны гром і ішоў праліўны дождж, вяскоўцы накіраваліся з усіх бакоў да панскага палаца. Перабілі служак і прыслужнікаў, а гаспадара павесілі на браме ўязных варот, каб усе бачылі, як гойдаецца на ветры і груганы дзяўбуць ягоныя вочы...

Пазней гаварылі бунтары паміж сабою, што камяні ў панскай вежы былі чырвонага колеру і з іх цяклі пякучыя людскія слёзы. Там, дзе яны ўпалі, калі вежу разбілі, і да сённяшняга дня нічога не расце. Вось як яно было, мае дзеткі...

Месца само, дзе некалі ўзвышаўся палац з той каменнай цвярдыняй, адкуль усё наваколле відаць было — палеткі і даліны, горы і ўзгоркі,— празвалі людзі Віжгорамі. Пазней ужо — Відагоршч...

## ДАФАРЭНЦЫЯ

Тут, здаецца, і нічога надта дзіўнага няма. Такой гісторыі, каб расказаць вам, не знойдзеш, бо ў іншых выпадках то пра волатаў ці асілкаў, рабаўнікоў ці захопнікаў лютых якіх распавядаецца, а ў нас усё па-простаму адбывалася. Гаворка пойдзе пра самага звычайнага чалавека. Мне так здаецца. А можа, і не, бо

надта добры лекар быў, якіх тады па ўсёй Беларусі, магчыма, усяго некалькі і было, і паміж сабою яны знаёмыя не былі. Гэта цяпер то ўсё проста: пагаманіў па тэлефоне ці па радыё скажуць. А тады ж — дзе вы бачылі? Я так памятаю пра тыя падзеі. Ужо і не ведаю, ці добра ўсё вам перакажу, ці не выдумаю чаго, але паспрабую, раз ужо пытаецеся пра даўняе...

Прыблізна недзе ў сямідзесятых ці дзевяностых гадах мінулага стагоддзя адзін з буйных і слаўных беларускіх магнатаў, які грошы і багацце не толькі для ўласнай сям'і збіраў, але і на простых людзей траціў, граф Тышкевіч (асноўны ягоны маёнтак знаходзіўся непадалёку ад Астрашыцкага Гарадка), выпісаў далёка з-за мяжы вопытнага мадзьяра-лекара. Ведама ж, што, можа, і не сам зрабіў, а праз сваіх людзей, і, канешне ж, абы-каго яны свайму валадару не парэкамендавалі б. Даражылі, бачыце, графскім даверам падначаленыя. Раз-другі памылішся — гаспадар сабе іншага чалавека на такое адказнае месца падбярэ, тады прыйдзецца да якога злыдня на працу ўладкоўвацца, а там ужо да цябе як да жывёлы адносіцца будуць.

Але пра такія адносіны паноў да падначаленых вы і без мяне добра ведаеце. Слухайце лепей, далей пра што гаворка ісці будзе.

Якім было поўнае імя ці прозвішча чужога чалавека — нам зараз невядома, яго, можа, і тады людзі не ведалі. Не надта каб ужо і граматныя былі, а ён жа не мясцовы. Таму спачатку цяжка даводзілася прыезджаму. А што ж вы думаеце? Мовы не ведаў, звычаяў таксама... Вось і круціся. Праўда, ён надта чалавекам кемлівым быў. Тое, што іншаму і за сотню разоў не зразумець, для яго было простай гульнёй. Адзін раз пачуе ці ўбачыць і ўжо што там да чаго можа любому потым пераказаць ці давесці. Дома ніколі не сядзеў. Не любіў час дарма траціць. Часта бачылі вяскоўцы, як ён з самім графам пешкі прагульваліся далёка ад маёнтка і пра нешта пастаянна спрачаліся, нібы роўныя былі паміж сабою, хоць Тышкевіч быў значна багацейшы і знатнейшы. Нярэдка сустракалі яго мясцовыя жыхары і ў бліжэйшых вёсках, дзе ён таксама нешта выглядваў, часам запісваў, запамінаў, адным словам — усім цікавіўся чалавек!

Доктар, пачаўшы прафесійную практыку ў графскім маёнтку, у хуткім часе стаў вядомы людзям пад параўнальна лёгкім для іх вымаўлення імем Ферэнц. Як бачыце, вяскоўцы і тут імкнуліся перайначыць усё на свой, тутэйшы лад, каб і ім прасцей было, і лекару прыезджаму. Нават які дзядулька сівенькі, што і гадоў не памятаў уласных, забачыўшы Ферэнца, капялюш саламяны з галавы здымаў, павагу аддаючы залатым рукам чужынца. Той таксама, калі бачыў, як людзі пашану яму выказваюць, ім кланяўся, нібы даўно знаёмым і гэткім жа адукаваным ды спрактыкаваным.

Ён быў, напэўна, надзвычай адукаваным, гуманным чалавекам, выконваў не толькі абавязкі графскага лекара, але і лячыў усіх тых, хто да яго звяртаўся за дапамогай,— жыхароў мястэчка, сялян з бліжэйшых вёсак.

Аднаго разу здарыўся выпадак, які запаў глыбока ў душы людзей, і не толькі сучаснікаў, але і нашчадкаў іхніх.

Жыла ў невялічкай вёсачцы маладая ўдава. Справа ў тым, што муж яе быў палясоўшчыкам і пражылі яны зусім непрацяглае сумеснае жыццё, бо падчас графскага палявання верны ляснік, калі ў ягонага гаспадара стрэльба дала асечку, кінуўся насустрач раз'юшанаму мядзведзю і, вядома ж, быў цяжка пашкуматаны зверам, пакуль разгубленыя паляўнічыя не дабілі трапнымі стрэламі ляснога асілка. Некалькі начэй запар трызніў палясоўшчык, горка мачыла ягоныя валасы сваімі слязьмі жонка. Што ёй заставалася рабіць, калі дачушцы, якая ляжала ў калысцы, было толькі сем месяцаў? Сонечнаю марознаю раніцаю чалавек сканаў.

Граф і тут застаўся ў вачах вяскоўцаў, дый удавы таксама, добрым памешчыкам. Сам прыехаў на пахаванне і ішоў з голаю галавою за трunoй загінуўшага з-за яго палясоўшчыка. Жанчыне даў добры надзел зямлі, жывёлы ўсялякай, хату загадаў пабудаваць і пры першай жа нагодзе сказаў, каб па якіх справах звярталася прама да яго. Ён ніколі не адкажа ёй ў дапамозе. Дзівіліся людзі на такі паварот. Ніколі даўней і чуць не чулі, каб такі багаты і вяльможны гаспадар уважыў простую сялянку, няхай сабе ў яе і гора такое вялікае здарылася.

Яно-то і сапраўды, па першым часе ўдаву ніхто нават і пальцам не крануў, словам брыдкім не абразіў. Войт ці цівун які, заўважыўшы, што яе поле стаіць неаранае ці ніва не скароджаная, сам мужчын прысылаў, каб усё зрабілі належным чынам. Але праз гадоў колькі забыліся падпанкі на графскі загад. Сталі жанчыну і на працу выганяць, як і астатніх, і падаткі ўсялякія браць. Скардзіцца, бедная, і не думала. Сказаць-то сказаў сам Тышкевіч, але панскае слова, гавораць у народзе, не надта цвёрдае. Хто ж яго ведае на самай справе, што можа адбыцца, калі з просьбай якой прыйдзеш? Ды і прызвычаіліся людзі неяк самі па сабе цяжкасці ўсялякія і перашкоды пераносіць, ні да каго не звяртаючыся. Такой нагоды надта і не было, каб у панскі палац кіраваць. На нозі ўдава стала моцна, гаспадарку вялікую, парабкаў некалькіх трымала. Жыць можна было прыпяваючы па тых часах. Але так ужо, мабыць, водзіцца, што не толькі адно шчасце ці радасць чалавеку прывальвае, яго і бяда-гора не абмінае. Так і тут адбылося.

Дачцэ ўдавы ўжо ішоў пятнаццаты год. Прыгожая дзяўчына выцягнулася: вочы сінія, валасы светлыя, сама, што аерынка тая стромкая. Дык вось пайшла гэтая дзяўчына ў лес, чарніцы браць. І здарылася з ёю няшчасце. Справа набліжалася да полудня, сонца высока ўзнялося і прыпякала неміласэрна, ветрыку не было, таму тыя, хто быў у лесе, думалі яшчэ пабраць крыху ягад і кіраваць дамоў, бо ўжо ва ўсіх каробкі былі поўныя. Радаваліся, зусім мала часу ў лесе пабылі, а гэтулькі назбіралі. Ды рана, відаць, весяліцца пачалі. Пачулі нейчы адчайны крык. Пабеглі ў той бок і ўбачылі нашу прыгажуню. Яна ляжала на спіне, а ад яе шпарка віжавала-ўцякала даўжэзная гадзюка. Тут толькі здагадаліся, як усё здарылася: дзяўчына нагнулася над купінай, каб сабраць буйныя чарніцы, а там ляжала, скруціўшыся ў колца, змяюка, вось і джгнула недзе прама ў твар ці ў шыю. Пакуль бедную з лесу дамоў прынеслі! Ведама ж, жанчыны і не такія дужыя, і не такія спрытныя ў такой справе, як мужчыны. Убачыла маці, як яе адзіную дачку нясуць, і загарлала ў прадчуванні нечага страшнага. Але ж ці дапаможаш тут крыкам? Трэба нейкія лекі-зёлкі прыкладваць, яд страшны з маладога цела выцягваць. Пабеглі па мясцовага зна-

хара, прывялі старэнькага дзядульку, які ўжо сам і хадзіць не мог. Той паглядзеў, паглядзеў на збялелую сірату, прыклаў нейкага зелля да ранкі ля самага падбародка і прашамкаў бяззубым ротам:

— Можа, і выжыве. Што Бог дасць, тое і будзе. А я не ўсемагутны.

Сказаў так, і павялі яго назад дамоў...

Галосіць бедная матуля, убіваецца, не ведае, што далей будзе, калі дачка не пераасіліць укус. Ды нехта з аднавяскоўцаў, гледзячы на тое, як ірве ўдава на галаве валасы, мовіў ціха:

— Людзі, а можа, яшчэ і не ўсё страчана? Трэба толькі да доктара Ферэнца збегаць. Яго паклікаць. Ён-то ўжо дакладна дапаможа, колькіх з рук смерці вырываў нават у самых безнадзейных выпадках...

— А што,— пагадзіліся астатнія, не задумваючыся асабліва, бо ўсё роўна нічым іншым дапамагчы ўжо не маглі.

Пабеглі самыя хуткія па лекара. Неўзабаве і ён на вазку прыехаў. І сапраўды, дапамог дзяўчыне. Выхадзіў яе. З таго часу стаў чужынец самым жаданым госцем у гэтай сялянскай хаце.

Крыху пазней, ужо шырока вядомы ў наваколлі, доктар Ферэнц ці то купіў, ці то атрымаў у падарунак ад сваіх вяльможных гаспадароў за добрую службу невялічкі маёнтак, дзе абсталяваў нешта падобнае на сучасную аптэку і амбулаторыю, толькі, канешне ж, больш прымітыўныя. Доўгі час Ферэнц быў адзіным на ўсю акругу доктарам. Да вучонага лекара прыходзілі, прыязджалі ажно з трох валасцей. Яго вядомасць, папулярнасць раслі з кожным годам. Таму, хто сур'ёзна захварэў, звычайна раілі: «Ты б да Ферэнца схадзіў». Ці пыталіся ў сваякоў: «А да Ферэнца вы яго вазілі?» Да Ферэнца ішлі і ехалі за парадай і лекамі і ўдзень і ўначы...

Паступова тую мясціну, дзе жыў прыезджы доктар, мясцовыя людзі сталі называць паміж сабою па-простаму — Даферэнцыяй, ад таго, што там жыў такі чалавек...

У сучаснай Дафарэнцыі слядоў старога маёнтка і бальніцы Ферэнца ўжо даўно няма. Казалі, што мясцовыя жыхары, якія жылі ад сваіх прыроджаных лекаў, і для якіх урач быў неадольным канкурэнтам, спалілі і саму аптэку, і ягоны дом.

Толькі назва і засталася...

## НАВАШЫНО

Раней, мае родныя, надта ж многа казалі ўсялякага пра ведзьмаў, вядзьмарак, ведзьмароў. У кожнай вёсцы, мабыць, яны жылі сярод людзей, толькіператварацца паспявалі ў вяскоўцаў назад і ніхто не мог заўважыць гэтага. Але, здаралася, нешта ім перашкаджала прыняць чалавечы выгляд, і тады ім адплачвалі за ўсё дрэннае і жорсткае, здзейсненае супраць сялян.

Наша паселішча таксама адтуль і назву сваю вынесла. Паслухайце, што ды як тут адбывалася. Можа, вам і не спадабаецца, ды ўжо раз папрасілі — то слухайце. Выбачайце, калі што якое. Граматы ў мяне няма ніякай і распавядаць асабліва не прывучана.

Некалі, калі яшчэ прыгон быў, гаварылі, на месцы нашай вёскі хутар самотны стаяў. Больш ніякіх будынін не было паблізу. Жылі на тым хутары маці з сынам. Звалі таго хлопца, ці то мо і прозвішча такое, Наваш (некаторыя сцвярджалі — Нуваш). Займаліся па гаспадарцы, садзілі нешта, сеялі, жалі, і гэтак незаўважна год за годам мінаў. Цякло жыццё, адным словам.

Наваш працавіты надзіва быў і шчыры. Калі якога падарожнага спаткае ці за дапамогай хто звернецца, то пакуль усё не зробіць або не растлумачыць, чалавека ад сябе не адпусціць. І людзі яму за такую ўвагу таксама ўдзячныя былі. Маці ж, наадварот,— маўклівая, злаcлівая, сквапная, скарынкі хлеба нават таму не дасць, хто перад яе вачамі паміраць будзе. Не любіла надта, каб ёй словы насуперак гаварылі. Толькі гляне з-пад ілба, і таму чалавеку не дайсці дамоў, зваліцца дзе-небудзь па дарозе, не заўважаць — то і сканае на тым самым месцы. Такая сіла ў вачах яе моцная была. Сын заўважаў такія благія дзеянні з боку матулі і спрабаваў паўплываць на яе. Колькі разоў гаворку ўсчынаў адносна гэтага, ды тая і слухаць нічога не жадала, буркне толькі ў адказ: «Пажывеш з маё, то пабачыш, як і каму аддзячыць! Пашкадуе цябе нехта, дурань набіты. Рот разявіў і думаеш, што ўсе такія. А як жа! Яшчэ пашкадуеш, ды позна будзе!»

Аднаго разу паехаў Наваш у мястэчка, якое, можа, за дзесятак вёрстаў ад іхняй хаціны было. Ці то купіць чаго маці паслала, ці то прадаць, хто ж яго там

ведае. І што ж вы думаеце? Спаткаў дзяўчыну, ды так ужо яна яму спадабалася — і пераказаць нельга. Ехаў назад, а галаву ўсё пакручваў, быццам бы местачкоўка за ім існі павінна. Пасля таго разу хлопец спакой страціў: працуе дзе-небудзь, а сам пра незнаёмку думае. Не заўважыць, як, задумаўшыся, стане і прастаіць колькі часу. Раней бы ніколі ў жыцці такога не зрабіў, а тут... Самае галоўнае, што і не памятае, як гэта адбываецца. Нібы на галаву нешта насунецца, стома салодкая сэрца апануе — і ўсё.

Маці пачала заўважаць за сынам дзіўнае, падумала на першым часе, што падалося, ды потым яшчэ і яшчэ здарылася ўсё па-новаму. Падышла незаўважна і звярнулася:

— Ці не захварэў ты, Навашка, можа, недзе ветрам прахапіла, то ідзі ляж ды адпачні, я і сама ўпраўлюся.

Гаворыць лісліва і ў вочы імкнецца зазірнуць, канешне ж, з яе здольнасцямі тады не цяжка было б здагадацца, што з хлопцам здарылася.

Ды сын таксама не дурны:

— Нічога, матуля, нічога, проста задумаўся над будучым, як жыць далей будзем, ці стане хто побач сяліцца. Сумна неяк нам удваіх, так бы і паразмаўляў з кім, і параіўся, бо адзін не заўсёды здагадаешся ці зразумееш, калі сеяць ці калі поле скародзіць, каб потым пустазелля менeй было...

Сказаў так, і адышла маці ўбок, нібы паранай рэпы з'еўшы. Не раскусіла тады таямніцы хлопцавай. Пазней здагадалася, калі Наваш пачаў прасіцца амаль кожную нядзелю ў мястэчка ездзіць. Чараўніца і падумаць не магла, што яе сын закахаўся. Той спытае, а яна яму ў адказ:

— Вой, лепей лёг бы ды адпачыў, бо на заўтра зноў працы назбіралася, не ведаю, як яе і перарабіць... Ды і купілі мы ўсё самае неабходнае... Навошта коней дарма ганяць?

Ды хлопец не адстае:

— Там да знаёмых, да сяброў заеду, пагаманю, развеюся крыху, сваякоў праведаю...

— Ну праедзь тады ўжо, што з табою зробіш, але ж дамоў каб зараней вярнуўся!

Сын ног пад сабою не чуе, уподбежкі коней запрагае, пераапранаецца, і толькі яго і бачылі. Пад вечар, праўда, у час на двары ўжо тупае.

Але аднаго разу прыехаў і не пайшоў адразу ко-

ней распрагаць, а прыйшоў у хату да маці. Стаў перад ёю на калені і гаворыць:

— Дазволь, матуля, мне пабрацца з Ксінняю, бондаравай дачкою...

Чараўніца так і абмерла, нібы яе здаравеннай доўбняй у лоб дзеўбанулі. Рот разяўлены, вочы вырачаныя, валасы распушчаныя — ведзьма жывая, ды і толькі!

— Што?.. Што ты сказаў, ці мне падалося?

— Не падалося. Я прашу дазволу, матуля...— пачаў было Наваш ізноў, ды чараўніца перабіла, дзіка закрычаўшы:

— Ніколі!!! Ніколі!! Табе што, удваіх дрэнна?! Трэба яна нам сюды! Галадранка тая. У нас усё ёсць, усё водзіцца і плодзіцца, навошта камусьці яшчэ палову потым аддаваць?!

— Матуля, ды я не хачу, каб ты мне што са свайго багацця давала. Мы з ёю самі нажывём. Толькі дазволь...

— Не быць па-твойму, не быць, так і ведай. Пакуль я жывая, ты яе ў нашу хату не прывядзеш!

— Тады з дому сыду і не вярнуся назад! — катэгарычна заявіў Наваш.

— Ідзі, толькі калі да гэтага дойдзеш, то праклянну заклёнамі страшнымі, шчасця ў далейшым жыцці ніколі не чакай!

Бачыць сын, што дарэмна спрачацца, і пайшоў на двор. Але пасля гэтай спрэчкі перастаў пытацца ў чараўніцы дазволу, калі ехаў у мястэчка. Працу выконваў, праўда, як і даўней, спраўна. Але калі наважыцца, тады і едзе на спатканне.

Гаспадыня трывала-трывала, ды і вырашыла паглядзець, што ж там такая за прыгажуня. Але ж вы здагадваецеся, што зрабіла яна гэта незвычайным шляхам. Навошта ёй, каб нехта заўважыў, як будзе цікаваць ці падслухваць. Можна ж, выкарыстаўшы свае магчымасці, і па-іншаму здзейсніць усё.

Счакала, пакуль сын з двара выехаў, а самаператварылася ў сароку і следам паляцела. Хто там глядзець на птушачку будзе? Многа іх усялякіх навокал уецца. Лётае, няхай сабе лётае боскае стварэнне. Наваш коней падганяе, песню ад радасці на ўвесь лес спявае. Сарока следам, з дрэва на дрэва пералятае. Нарэшце і да мястэчка дапнуліся. Сын пад'ехаў да разгалістай вярбы, што расла ля невялічкай рэчкі,

і спыніўся. Села і сарока на самай вершаліне. Раптам бачыць — дзяўчына бяжыць сюды. Прыбегла і кінулася на грудзі да Наваша:

— Ледзьве дачакалася, родненькі... Усё дні лічыла, калі ж тая нядзелька надыдзе. Што ў цябе за навіны? Як там маці, усё супраць?

— Так,— ціха адказаў Наваш.

Давай яны сабе мілавацца-цалавацца, а сарока зверху наглядае і мяркуе, як найлепей іх разлучыць.

Прыехаў сын дамоў, а маці ўжо там. Гаршкамі на ўсю хату грыміць, злосць сваю паказвае.

У наступную нядзельку хлопец запрог конікаў з раніцы і паімчаў, але колькі ні стаяў пад вярбою, дзяўчына не прыбягала, не было яго Ксінні. Пайшоў тады ў хату бліжэйшую і запытаўся, ці не здарылася чаго незвычайнага тут у нядаўні час. Яму і адказваюць, што нейкая шалёная сучка пакусала Ксінню заўчора і дзяўчына ляжыць пры смерці, канае, божая душа.

Усё зразумеў Наваш, хто тут злоўжываннем займаўся. Маці родная. Пагнаў коней дамоў, ажно бачыць, уздоўж дарогі, разам з ім, бяжыць нейкая пярэстая сучка. Ён прылаўчыўся ды як шыбануў сякерку — прама ёй па пярэдніх лапах. Заскавытала яна і прыпусціла да хутара. Прыязджае сын, а маці на печы сядзіць і рукі ўжо бруднай анучай закруціць паспела. Пытаецца:

— Што гэта такое, родненькая, з табою здарылася?

А тая жалобным голасам адказвае:

— Рукі кіпнем абварыла, ажно аблезлі.

— Дык вось, глядзі, калі з Ксінні неадкладна свой яд-заклён не здымеш, то з цябе ўся скура злезе!

Зразумела чараўніца, што хлопец не жартуе, і адратавала дзяўчыну.

Пасля гэтага выпадку Наваш поле, якое ім належала, падзяліў на дзве паловы. На адной з іх стаў жыць разам з жонкай. Там пазней і вёска ўзнікла, назвалі яе ад гаспадара — Навашына.

## ПАПЕРНЯ

Вёска наша ад простага слова пайшла — папера. Сапраўды так. Не смейцеся. Не раз і не два даводзілася мне чуць пра такое. Гаварылі самыя старыя і

паважаныя людзі. Каму-каму, а ім ёсць у мяне ўсе падставы верыць. Бо ім жа дзяды, можа, пераказвалі, як усё на самай справе адбывалася.

На маёй памяці нават такое было, што паперы для пісьма не хапала і нас вучылі на чым прыйдзецца! Нягледзячы ні на што, я сама вельмі добра вучылася. Памяткáя была надзвычай. Верш настаўнік прачытае доўгі-доўгі адзін раз, а я за ім і перакажу на памяць адразу ж. І дзеці мае такія самыя. Толькі яны ўжо па кніжках навучаліся, у сшытках пісалі. Паперу пераводзілі, адным словам. Ім таксама ліха на лёс хапіла па вушы, а то і болей, але ж нічога, на сабе дровы насілі, на сабе аралі, а граматы ніколі не забывалі! Мабыць, такое ў нас ад далёкіх продкаў засталося, бо нядзіўна, што вёска Паперня завецца!

На беразе нашай рэчкі Вячы, якая цяпер стала на нейкую невялічкую ды прасмердлую канаву падобная, некалі, гавораць, выраблялі паперу. Вельмі каштоўную і якасную. Вось з таго часу чыйсьці язык і прымацаваў да населенага пункта назву — Паперня. Можа, крыху і не так усё было, бо і па-іншаму распавядаюць. Гэтая гісторыя для вас, канешне ж, намнога цікавейшая будзе. Тут многа захапляльнага і ўзнёсла-рамантычнага. Сапраўдная легенда, як і пра старажытныя гарады.

Там вось, бачыце, невялікія курганы стаяць? Так, не надта высокія, бо і падворвалі іх людзі не раз, і скарбы там шукалі, наслухаўшыся ўсялякіх апавяданняў пра незлічоныя багацці, і многія зусім ужо зраўняліся з палеткамі. Іх яшчэ ў нашай вёсцы капцамі называюць. Усяго метраў па пяць-шэсць акругле, не болей, кожны з іх. Некаторыя старыя гаварылі, што ў гэтых курганах французы сваіх забітых хавалі, калі з расейцамі ваявалі-біліся. Тут сапраўды вельмі крывавая бітва аднойчы адбылася. Нават на маёй памяці старадаўнія кулі знаходзілі ў зямлі. Зараз, можа, і няма, бо ці пражавелі, што сталі падобныя на камякі, ці ўжо павыбіралі іх да апошняй. Чула таксама і пра тое, быццам бы не французаў, а шведаў яшчэ даўней закопвалі ў нашу зямлю, калі яны па гэтай мясцовасці ішлі. Толькі мне здаецца, трэба карані ў зусім іншым шукаць.

Калі я была малой дзяўчынкай, па суседству з нашай хатай жыла такая ўжо старая бабуля, што, можа, паўтара стагоддзя па зямлі прахадзіла, а галаву

мела ясную. Памятала такія падрабязнасці, такія ўдакладненні, што іншыя людзі толькі вохкалі, яе слухаючы. І распавядаць суседка ўмела надзвычай цікава. Дык мне запомнілася, як яна пра вёску казала, адкуль тут першыя жыхары з'явіліся і чаму назва такая стала. Паводле яе слоў вось што вынікала.

Паехалі аднаго разу маладыя дзяўчаты сена касіць. Зараз гэтай справай у нашай мясцовасці займаюцца мужчыны і хлапцы, і тады гэтаксама было. Але часам, калі надта час прыспешваў, падзеі нейкія ці надвор'е не дазваляла надта расцягваць сенакос, то і на жанчын ды дзяўчат мужчынская справа ў некаторай ступені пераходзіла. Вось так і на гэты раз здарылася. Прычым далёка ехаць давялося. Ледзьве да полудня на валах дабраліся. Праўда, валы на працу спяшаюцца, як гнілое гарыць-шугае! Пад вечар крыху папрацавалі, а потым есці зварылі і паселі ля вогнішча, расказваюць усялякія выпадкі жыццёвыя, каб неяк час скараціць ды спаць улегчыся. Неяк само па сабе і да капцоў нашых дабраліся ў размове. А ўсё пачалося з таго, што адна з дзяўчат прыгадала, як бачыла вялікі скрутак жоўтай паперы на гарышчы ў сваіх бацькоў. Калі запыталася ў таты, дзе знайшлі такую дзіўную знаходку, той адказаў, што прынёс з капцоў, дзе кароў яшчэ хлапчуком аднойчы пасвіў. Уваліўся ў яміну напаўзарослую. Калі пачаў выбірацца, дык нагамі ўпёрся ў рэшткі нейкай будыніны. Ведама ж, малы, ён заўсёды цікаўны. Давай раскопваць. Потым сябрукоў сваіх паклікаў.

— І што ж там было? — не ўтрывалася адна са слухачак.

— Каштоўнага, маецца на ўвазе грошай ці золата якога, амаль не адкапалі. Затое выкалупалі старадаўнюю зброю: шапку жалезную востраверхую, меч даўжэзны, скураны абутак і мноства папер. Не падумайце, што такая папера, як мы прызвычаіліся зрэдчас бачыць у мястэчку.

— А няўжо папера яшчэ і іншая якая бывае? Цікава, што яна можа такое уяўляць, каб каштоўнасцю стаць? — пачуўся нейчы голас.

— Грошы ж, напрыклад, і папяровыя бываюць,— перабіў яго другі.

— Так, бываюць, але ж казалі, што даўней існавалі грошы не папяровыя, а з металу ўсялякага,— умяшаўся нехта.

— Цішэй вы,— рэзка перабіў звонкі галасок,— калі вам слухаць няма ахвоты, абы пагаманіць, то дайце мне даведацца, як далей справа развівалася.

— Ага,— пагадзіліся астатнія,— мы і забыліся дaслухаць.

— Гавораць, што папер тых нанеслі былі амаль з паўхаты да нас,— працягвала апавядальніца.— У вёсцы, калі што здарыцца незвычайнае, то пачынаюць хутка перадаваць адзін аднаму. За тыдзень вестка мо на сотню вёрстаў заляціць ад месца здарэння. Не вам пра тое распавядаць, хто яе разносіць.

— І без цябе зразумела,— заўсміхаліся астатнія.— Ты лепей далей размову працягвай, не выхваляйся, што ведаеш тое, чаго мы не чулі.

— А далей усё яшчэ прасцей адбывалася. Калі пачалі людзі, мо з зайздрасці, а мо з цікаўнасці, перадаваць, што ў нашу хату нанасілі мноства самых розных старадаўніх папер, то чутка гэтая дайшла да аднаго надзвычай багатага пана, які збіраў усё старажытнае, рэдкаснае ў свой палацавы музей. Прозвішча ягонае было Тышкевіч. Дык калі яму пераказалі пра такое здарэнне, то ён загадаў тэрмінова запрэгчы самых хуткіх коней у экіпаж і паімчаў да сялянскай хаты, каб глянуць, што ж там на самай справе людзі знайшлі. Але прыехаў, можа, праз тыдзень. Да таго часу паперы часткова то парасцягвалі, то папалілі, бо надта ж добра ўсё гэта ішло на тое, каб печ запальваць, але колькі скруткаў яшчэ і засталося. Ухапіўся пан за іх і, што ж вы думаеце, давай чытаць уголас. Ды так, нібы толькі ўчора гэта ўсё было напісана. Аглядзеў гаспадароў невялічкай хаціны і мовіў:

— Эх, людзі, людзі, што ж гэта вы так, каштоўнасці нашы не зберагаеце? Ды ім жа цаны няма! Яны ж колькі стагоддзяў таму назад напісаны! А вы іх у печ!.. Абы-каму параздавалі! Бяжыце ды прыносьце мне назад хутчэй, можа, яшчэ ў іншых захавалася!

— Даруй нам, паночку,— упалі хатнія ў ногі.— Мы ж ні чытаць, ні пісаць не ўмеем. Калі б твая светласць не давяла, так і не даведаліся б ніколі. Даруй, не карай, не ведалі мы.

— Не збіраюся я вас караць. Не палохайцеся. Не збіраюся біць-катаваць. Яшчэ ўзнагароджу за кожны скрутак папер. Вы толькі прыгадвайце, дзе ды каму аддавалі, і нясіце іх сюды. За мною справа не стане...

Пачуўшы такое абяцанне, гаспадары з хуткасцю ветру паджгалі да блізкіх і далёкіх суседзяў. Дзівуюцца людзі, з чаго б гэта так яны носяцца па наваколлі, але тыя язык за зубамі трымаюць. Думаюць, скажы слова-другое, потым ні грошай абяцаных не атрымаеш, ні папер не знойдзеш, а па спіне лаза паскача добра.

Да полудня абеглі ўсіх, каго ведалі, усіх, каго памяталі. Нават яшчэ ў іх дапытваліся, дзе могуць іхнія паперы быць. І даволі многа назносілі назад у хату. Памешчык сядзіць на цурбалку, ля парога, і разам са сваімі слугамі асцярожненька скруткі запакоўвае ў вялізную скрыню, што спецыяльна для такой мэты заўсёды з сабою вазіў. Мой жа бацька, тады яшчэ зусім хлапчук, я ж вам згадвала, убачыўшы, што справа так павярнулася, адзін скрутак пад печ засунуў. Прыхаваў, значыцца.

Не абмануў пан гаспадароў. Даў столькі грошай, што тыя ніколі такой сумы не толькі ў руках не трымалі, але нават і не марылі пра яе ў снах. Гопнуліся зноў шчыраму памешчыку ў ногі, але той, заспакоены адшуканнем каштоўных папер, усміхнуўся і сказаў ласкава:

— Чаго вы ў ногі ўсё падаеце? Уставайце. Не палохайцеся ды на будучае запамятайце: калі што старое знойдзеце, то не кідайце ў печ, не аддавайце суседзям, а мне паведамляйце праз людзей.

— Добра, пане, навука нам будзе на ўсё астатняе жыццё,— адказалі гаспадары.

— Дарэчы, а ці ведаеце вы, адкуль вёска ваша пайшла? — запытаўся ў іх прыезджы.

— Не,— перапалохана мовілі вяскоўцы, чакаючы зноў нейкіх хітрых разважанняў-павучанняў.

— У гэтых паперах напісана, што некалі, даўным-даўно, калі яшчэ князі гаспадарылі на нашай зямлі, тут стаяла адна са шматлікіх застаў, на якой правяраліся паперы ў купцоў-гандляроў ці ў іншых падарожных людзей. Едзе абоз, запыняе яго варта:

— Хто старшы? Дзе паперы вашыя, паказвайце.

Падбягае чалавек да стражнікаў і дастае тое, што патрабуецца. Глядзяць дружыннікі: добрыя паперы ў чалавека — заплаці і едзь сабе спакойненька далей; благія якія паперы ці ўкрадзеныя ў каго — заплаці і стой ці сядзі, лёс свой далейшы чакай. Было, і пасадзяць куды, турма невялікая, драўляная, але моцная,

побач узвышалася. Вось адтуль і пайшло, што ў Паперні паперы падарожныя правяралі...

— Цікава як, а мы і не ведалі і не чулі пра такое здарэнне,— выдыхнуў нехта з дзяўчат, задуменна гледзячы ў згасаючае полымя.— З простага скрутка папер колькі можна зразумець...

— Яно-то так,— пагадзілася апавядальніца,— і я б не даведалася нічога, каб на бацькаў скрутак папер не наткнулася і не распытала пра ўсё ў яго...

— Вось адкуль яна, Паперня... А то мовілі ўсе: паперу, паперу рабілі... Тут жа значна складаней усё адбывалася,— па-філасофску зазначыў нехта.



# БАРЫСАЎ

Гісторыя нашага горада надзвычай старадаўняя і багатая. Столькі пра яго ўсяго парасказвалі і панапісвалі, што і падлічыць цяжка, але слухаць усё роўна цікава, няхай сабе недзе ўжо і чуў такую гісторыю ці паданне. Хіба ж у некага няма ахвоты зразумець, як жылі бацькі нашы, чым займаліся, дзе славаю сябе неўміручаю пакрылі?

Даўным-даўно, калі толькі наш век пачынаўся, у гэтых мясцінах не было ншчэ нічога такога, што можна было б нават невялікім паселішчам назваць. Пустка звычайная: лясы непралазныя, рэкі паўнаводныя, дрэвы, вятрамі зваленыя, лугі, паводкамі залітыя, і г. д. Вось недзе тады ўдумаў адзін з полацкіх князёў, якога звалі Барысам і які паходзіў са славутай княжацкай дынастыі, ісці вайною на непакорлівых ятвягаў. Што благога яны яму ўчынілі, зараз цяжка сказаць, але ж нечым, мабыць, моцна не дагадзілі ганарліваму князю, раз той на гэткі рашучы крок адважыўся. Праўда, тады ледзь што, то за мячы адразу ж хапаліся. Валадары паміж сабою нешта не падзеляць ці дзе сп'яна палаюцца, а дружыннікам ды людзям паспалі-

тым прыходзіцца сваю кроў нявінную праліваць. Біліся, калоліся, асабліва не выбіралі шляхоў для дасягнення мэты. Хто перамагаў, той, адпаведна, і баль правіў, так у нас даўней гаварылі. Палон багаты бралі, гарады, вёскі пад корань выпальвалі і вынішчалі, мужчын баяздольных імкнуліся ўсіх да аднаго жыцця пазбавіць, надта даражылі майстрамі ўсялякімі, якія маглі потым багаты прыбытак у княжацкую скарбонку прынесці.

Трэба яшчэ адзначыць і той факт, што ў тутэйшых землях тады хоць і не было пастаянных мясцовых жыхароў, затое існавалі ажыўленыя водныя шляхі зносін. Першае месца, безумоўна, адводзілася гуллівай Бярэзіне, якая лёгка несла свае бяздонныя воды некуды далёка-далёка. І таму падарожных, гандляроў, а то і ваяроў перабывала тут надзвычай многа.

У землях жа, дзе ў сівыя стагоддзі жылі ятвягі, было значна прасцей адшукаць людзей, якія пастаянна жылі на сваіх адвечных тэрыторыях. Вольныя гэта былі тубыльцы, якія нікому не падпарадкоўваліся, нікога над сабою вышэй не ставілі. Мелі ўладу над імі толькі багі, якіх існавала мноства, ды старэйшыны плямёнаў, што ўзводзіліся ў такі ранг за свой багаты практычны вопыт, кемлівасць, а таксама вялікую фізічную сілу.

Трэба думаць, што і князь Барыс на ятвягаў пайшоў менавіта з-за таго, што яны даніну нікому не плацілі, не дзяліліся сваім здабыткам ні з кім з суседзяў. Калі што, то і адпор ворагам усялякім давалі адпаведны. Доўга чухаліся няпрошаныя госці пасля такой сустрэчы з гаспадарамі, збіраліся з сіламі і зноўку кіравалі па старой дарозе.

На гэты раз вось і полацкі князь-ганарлівец чамусьці вырашыў менавіта ў тым баку шукаць шчасця, здабычы і славы, бо ні для каго не сакрэт, што воі, ды і простыя людзі паважаюць і шануюць найбольш таго валадара, які мае многа галоў жывёлы, гарадоў і вёсак, іншага ўсялякага багацця. Да яго тады з усіх бліжэйшых земляў уся галота збягаецца, прапануючы свае рукі і спіны, бо болей у іх няма чаго прапанаваць.

Багатыя дружыннікі, канешне, не надта за паходы ды войны выступалі. Мяркуйце самі. Ужыўся добра чалавек, пасаду дзяржаўную пры самім князі мае, а тут раптам на вайне дзе ці падчас баявой сутычкі

напаткае імгненная страла ці востра адточаная дзіда. Вось і ўсё на гэтым: сям'я застанецца без гаспадара, дзеці без бацькі, жонка без мужа. Князь-то сабе чалавека на яго месца абавязкова знойдзе, але з забітых жа не падымешся. Калі ўжо траплялі ў вайсковыя паходы такія памяркоўныя ваяры, то былі самымі сквапнымі і бязлітаснымі: нікога не шкадавалі, бо забываліся пра тое, як самі галадалі, як беднымі былі, ім вочы і розум засціла толькі адна-адзіная думка — аб спажыве. У беднага дружынніка ці якога паспалітага захопленую ў баі здабычу маглі адабраць, таму і не бралі ў палон людзей, а задавольваліся тымі рэчамі і каштоўнасцямі, якія можна было лёгка прыхаваць і потым абмяняць на неабходную ў гаспадарцы жывёліну ці рэчы.

Сабраў князь Барыс шматлікае войска, нават суседзяў сваіх не забыўся запрасіць. Праваднікоў загадзя падрыхтавалі вопытных, каб дарма не лазіць па балотах ды глухіх лясах, а адразу трапіць на буйныя паселішчы. Выйшлі ранняй вясною, калі рэкі разліліся шырока і лёгка было на вастраносых чаўнах, зберагаючы сілы людзей і коней, дабрацца да прызначанага месца. На́ сваёй зямлі не хаваліся, плылі і ехалі ў адкрытую, але калі ступілі на чужую тэрыторыю, то адразу насцярожыліся, стаіліся. Чаму? Відаць, у кожным чалавеку недзе ў глыбінях яго душы хаваецца страх, баязлівасць і ў адпаведныя моманты вырываецца на паверхню і нібы папярэджвае чалавека, што вось тут, вось у гэтую часіну цябе чакае непрыемнасць або смяротная небяспека.

Плывуць войскі дзень, плывуць другі, а навокал толькі цішыня першастваральная, нікога няма. Князь пачаў хвалявацца, куды ж гэта ятвягі паўцякалі? Але вопытныя, спрактыкаваныя ў паходах ваяры супакойвалі яго. Яны-то ведалі, што іх сапернікі сочаць за імі пільна і адводзяць сваіх людзей у больш зручную мясціну, каб там памерацца сіламі, бо войска ў іх, мабыць, намнога меней. А бараніць жа трэба родную зямлю, мацярок і дзяцей, думаць пра будучыню.

Ажно аднае раніцы да князя з берага, па вадзе, дабраўся малады дружыннік з пярэдняга дазора, які быў высланы ў разведку. Па твары воя можна было здагадацца, што здарылася нешта непрадбачанае. Ён ледзь ускараскаўся на борт высокага і вялікага чоўна.

— Княжа, бяда! — выпаліў і заціх, бо не здолеў болей гаварыць ці то ад хвалявання, што ўпершыню блізка так бачыў грознага валадара, ці то ад стомы і перажытага.

— Што здарылася? — нецярпліва запытаўся вяльможны.— Што там яшчэ? Чаго цябе гэтак калоціць? Твару зусім няма. Глядзець сорамна! Што, першы раз ворагаў жывых убачыў? Чаму твой сотнік нікога больш вопытнага і сталага не накіраваў з данясеннем? Гавары, не маўчы!

— Бяда, княжа,— зноў паўтарыўся дружыннік.— Бядота вялікая чакала наш раз'езд... Таму і не прыслаў нікога іншага Граміла-сотнік, што перабілі ўсіх да аднаго, а самога сотніка на дзвюх бярэзінах раздзёрлі мясцовыя жыхары. Здаецца, і ўглядаліся пільна, ды нават і не здагадаліся, не тое што ўбачылі, як яны на нас накінуліся... Абклалі з усіх бакоў, заціснулі ў балота і... гамон. Мяне конь выпадкова вынес, а калі яго падстрэлілі з лука, то бягом выратаваўся. Яшчэ мне здаецца...

— Гавары далей, вой, гавары,— ужо без злосці і раздражнення мовіў Барыс.

— Мне падалося, валадар, што яны мяне і не вельмі даганялі. Можа, спецыяльна, каб я да войска дабраўся і паведаміў, што яны нічога і нікога на сваёй зямлі не баяцца...

— Нас будуць баяцца! Мы іх прымусім! — грозна скрыпнуўшы зубамі, сказаў князь і павярнуўся да сваіх ваявод, якія маўкліва чакалі зыходу сустрэчы вяльможнага з уцалелым разведчыкам.— Цяпер глядзець усім пільна! Павялічыць варту і ахоўныя парадкі, каб нават мыш не пракралася незаўважна, не тое што чалавек! Глядзіце ў мяне, калі што якое здарыцца... Бачыце, з якім хітрым і моцным ворагам справу маем!

— Княжа,— заўважыўшы, што валадар ужо адыходзіць ад яго, зноў звярнуўся да свайго гаспадара дружыннік-разведчык,— княжа, калі ятвягі стралялі з лукаў па нас, то ніхто з параненых нават не ўскрыкнуў. Адразу паміралі. Граміла яшчэ крыкнуць паспеў перад тым, як яго скруцілі, што ятвягі атручанымі стрэламі страляюць і ад іх чалавек памірае імгненна. Вось як яно на самай справе было...

Затупалі па чоўне таропкія крокі, загучалі прыглушаныя галасы, і над даўжэзным караванам навіс-

ла глухая, напружаная цішыня. Навіна, вядома ж, маланкай пранеслася па войску. Не было відаць зыркіх вогнішчаў, не чуліся крыкі ці смех. Усё жыло прадчуваннем вялікай бітвы, якая не сёння-заўтра павінна была адбыцца, бо не збіраліся адступаць мясцовыя жыхары невядома колькі часу, задарма ўступаючы спрадвечныя землі продкаў. І што найбольш палохала — свісне аднекуль страла, і чарговы дружыннік асунецца пад ногі каню або боўтнецца з чоўна ў ваду, толькі кругі шырокія пойдуць па рацэ. За нябачнымі саправнікамі і не пагонішся, бо, па-першае, можна на засаду нарвацца і тады непрыемнасці будуць значна большыя, а па-другое, мясцовыя жыхары выдатна ведалі мясціны і нібы раствараліся сярод хмызоў і дрэў.

Толькі не спяшаліся ятвягі выступіць у адкрытую, а прытрымліваліся ранейшай тактыкі — нападалі пры зручным выпадку на асобных вояў ці на невялікія атрады і незаўважна знікалі.

Князь Барыс не ведаў, што рабіць далей, які захад зрабіць, каб неяк апраўдаць мэту такога цяжкага і небяспечнага паходу ў чужую зямлю. Вопытныя ваяводы таксама маўчалі, схіліўшы свае мудрыя галовы. Калі б у чыстым полі з ворагам секчыся — то, калі ласка, параілі б і падказалі, тут жа...

Але выратаванне прыйшло нечакана. Аднаго дня да князя прыджгаў сівавусы ваявода і, захліпваючыся ці то ад радасці, ці то ад знямогласці, крыкнуў:

— Валадар, ятвяг сам здаўся ў палон! Ятвяг сам здаўся ў палон!

— Ну, дык чаго ты так радуешся і крычыш, нібы перамогу над цэлым войскам атрымаў?!

— Ён сам здаўся, разумееце? Сам...

— Што ў гэтым? — паціснуў плячыма Барыс.

— Дык ён жа паабяцаў...

— Паказаць, дзе стаіць войска і нас чакае? — насмешліва перабіў князь.

— Не, валадар, не! Ён вось што нам паабяцаў,— і ваявода зайшоўся працяглым кашлем. Потым працягнуў: — Паабяцаў паказаць, дзе іхнія сем'і хаваюцца.

— Навошта нам іхнія сем'і? — не зразумеў малады князь.— Мы ж прыйшлі біцца з мужчынамі, а не з жанчынамі і старымі!

— Яно-то так, вяльможны, але калі напасці на ся-

мейны лагер, то можна дыктаваць умовы і воям. Каму не шкада сваіх родных і блізкіх? Усё аддадуць, родненькія, дзеля таго, каб мацярок і дзяцей з бяды вызваліць...

І ваявода задаволена закірхаў-засмяяўся.

Князь, здавалася, яго не слухаў. Ён стаяў і глядзеў паверх галавы прыйшоўшага. Пра нешта думаў. Разважаў пра тое, як быць далей.

— Вось што, пакліч сюды старэйшых ваявод,— звярнуўся Барыс да дружынніка-ахоўніка, які маўкліва стаяў побач.— Няхай хуценька ідуць усе да мяне, раіцца будзем адносна таго, што далей рабіць.

Неўзабаве ўсе сабраліся. Паселі паважна, чынна, разгладзілі свае апраткі і ўтаропіліся на князя. Той павольна паходжваў паміж імі.

— Тут, ваяводы, адзін з ятвягаў у палон добраахвотна здаўся і прапануе свае паслугі. Хачу з вамі параіцца, прадугледзець трэба ўсё, каб потым у засаду дзе не трапіць ці на памылковы след не выйсці. Усё можа здарыцца...

Нехта з ваявод ціха пагадзіўся:

— Яно так, княжа, усяляк здараецца...

— Баюся таксама, што воя гэтага нам спецыяльна падаслалі. Мы ж нават не можам праверыць, ці праўду ён будзе гаварыць. Каб ведаць ды параўнаць, то іншая справа...

— Загадай прывесці яго сюды, княжа,— падаў хтосьці з прысутных голас.— Глянем на яго, паразмаўляем, можа, нешта і выплыве...

— Што выплыве, што выплыве! — узарваўся нейчы грозны і магутны голас.— Дапытаць яго з агнём, з бізунамі — адразу скажа, дзеля чаго тут з'явіўся. Сам прыйшоў ці паслалі! Вось і ўсё! А то паразмаўляць, паразмаўляць! Цьфу!

— Табе б толькі біць ды катаваць палонных. Ты б на ратным полі так смела сябе паводзіў. Хаваешся то ў абозе, то ў засадзе, у якую ніколі ніхто не трапляе, бо стаіць не там, дзе трэба,— спакойным голасам адказаў стары ваявода, што сядзеў сама бліжэй да Барыса.

Астатнія, за выключэннем таго, хто так горача выказаў уласнае меркаванне, заўсміхаліся, відаць, згадвалі выпадкі, якія сапраўды бывалі ў іхнім ратным жыцці.

Князь, прыхаваўшы ўсмешку, загадаў:

— Прывядзіце сюды ятвяга!

Хвілін праз колькі на палянку выпхнулі невялічкага чалавечка ў лапцях. Ён, падалося, і на нагах трымацца не мог, бо адразу бухнуўся на калені і ціхенька заскуголіў:

— Усё раскажу, усё раскажу... Толькі жыцця не пазбаўляйце, толькі не забівайце мяне... Усё скажу, што ні запытаеце...

— Ану ўстань! — грозна мовіў Барыс.— Чаго поўзаеш? Стой перад намі і адказвай на пытанні. Ды глядзі, калі схлусіш, то адразу ж з галавою развітаешся!

— Скажу, скажу,— лапатаў чалавек ужо стоячы, напаўсагнуўшыся перад ваяводамі.

— Хто цябе паслаў?

— Ніхто, я сам прыбег, каб вам дапамагчы...

— Чаго цябе паслалі? Што ты павінен зрабіць?

— Ды сам я прыйшоў, сам, разумееце?

— Нешта не верыцца.

— Знайшоў дурняў, так мы яму і паверылі адразу!

— Чаго прыйшоў! Гавары праўду!

— Хачу адпомсціць, людзі добрыя, за тыя здзекі і прыніжэнні, якія трываў ад аднавяскоўцаў.

— Чым жа яны табе гэтак насалілі?

— Мяне ледзьве не забілі месяцы два таму назад...

— Учыніў нешта злое, відаць. Добрая птушка перад намі стаіць, хоць і малюсенькая, ды смярдзючая,— не ўтрываўся нехта з прысутных.

Але ятвяг, здавалася, не звярнуў на гэтыя словы ўвагі і працягваў далей:

— Выдумалі на мяне, што я чужыя борці па пушчах выкурваю ды разбураю. Ну і пацягнулі на копны суд. Там усе і крыкнулі, каб жыцця пазбавіць. Потым узялі пад увагу тое, што сям'я вялікая і дзяцей трэба гадаваць. Збілі да паўсмерці і выгналі з паселішча. Гэтага нікому не дарую...

Маленькі чалавечак на вачах пераўтварыўся. Зараз перад дружыннікамі стаяў ужо не ятвяг, падобны на ўзмакрэлага ката, а істота, здольная біць і паліць, вынішчаць і караць, не разбіраючы асабліва, хто перад ім: старыя ці малыя, параненыя ці хворыя.

Стары ваявода ціха перапытаў:

— Дык, гаворыш, сам прыйшоў, па ўласнай волі, каб адпомсціць?

— Але...

— Як жа ты помсціць будзеш, калі там твае дзеці,

жонка засталіся? Відаць, у цябе і родныя, блізкія, сябры ёсць?

Усе чакалі і пільна назіралі за тварам перабежчыка. Што ж будзе, меркавалі, далей?

— Яны ад мяне адмовіліся, калі мяне ні за што білі, і я ад іх адмаўляюся! Самі так уздумалі, няхай і адплату адпаведную атрымаюць...

— Ясна...— працягнуў стары ваявода.— Усё з табой зразумела.

— А дзе лагер знаходзіцца? — запытаўся князь.

— Той, дзе войскі, ці той, дзе старыя і малыя? — пацікавіўся ятвяг.

— І той і другі,— хітра ўхіліўся ад канкрэтнага адказу Барыс.

— Той, дзе жанчыны і дзеці, старыя і хворыя, знаходзіцца непадалёку ад нашага паселішча. Я дарогу ведаю добра. Але прайсці туды ўсім войскам нельга будзе. Сцяжынка вузенькая, між балотаў, а то і па балацінах цягнецца... Мноства людзей разаб'юць сцяжынку, і нельга будзе прайсці... Да таго ж тапіцца будуць воі ў багне. Сотню-другую чалавек, болей не трэба на такую справу. Знянацку нападзём і...— павесялеў чалавечак, але Барыс гнеўна перабіў яго:

— Ты што, ужо ў маё войска запісаўся?

Перабежчык ніякавата заціх.

— Што вырашым, воі? — звярнуўся князь да сваіх дарадчыкаў.— Што будзем рабіць?

— Спачатку няхай адвядуць гэтага, каб нічога не чуў,— падказаў нехта.

— Вайна ёсць вайна, і выбіраць нам не даводзіцца. Колькі іх, ятвягаў-ваяроў, мы не ведаем, і чым можа скончыцца для нас адкрыты бой — таксама, а вось калі захопім сямейны лагер, то і палон багаты атрымаем, і ўмовы будзем дыктаваць. Я так думаю,— сказаў, звяртаючыся да ваявод, князь.— Што вы мне падкажаце?

— Мы згодны з табою, княжа,— загулі галасы ў адказ.— І людзей значна меней страцім, і выгаду будзем мець.

Прамаўчаў толькі стары ваявода, думаў пра нешта сваё, патаемнае.

Так і вырашылі. Пад покрывам ночы даволі моцны атрад, які вёў перабежчык, пакіраваў да сямейнага лагера. Дабіраліся не адну ноч. Днямі хаваліся-зашываліся ў такія нетры, дзе іх і мясцовыя жыхары не

здагадаліся б шукаць, нават даведаўшыся пра тое, што ворагі шныраць дзесьці побач з іхнімі паселішчамі. Здраднік сапраўды жадаў адпомсціць былым суродзічам, бо так ужо стараўся, ажно са скуры вылузваўся, каб лішні раз выслужыцца. І вывеў міма ўсіх пастоў, міма ўсіх застаў чужынцаў прама туды, дзе іх меней за ўсё чакалі,— да безабаронных жыхароў. Тут ужо захопнікі сябе паказалі! Што хацелі, тое і выраблялі, бо за старых і малых не было каму ўступіцца. Жанчын і дзяўчат гвалтавалі. Каторая імкнулася адбіцца, то, асабліва не задумваючыся, пазбаўлялі жыцця. Чаго шкадаваць, калі іх тысячы ў палоне апынуліся? Паслалі некалькіх дружыннікаў з данясеннем да князя Барыса, што ўсё зрабілі, як і меркавалі, што трэба высылаць насустрач асноўнае войска, каб вывесці палон, бо з нешматлікім атрадам з месца рушыць і думаць няма чаго.

Зноў здраднік прывёў да паланёных землякоў значна большы атрад, і пачалі тады людзей у чужы край выводзіць. Божачкі! Што там за страхоцце рабілася! Дзеці плачуць, жанчыны галосяць, старыя, дык тыя адразу адмовіліся ісці куды-небудзь, і іх на месцы пазабівалі.

А дружына ятвягаў і не ведала, што добра замаскіраваны лагер ужо даўно стаў вядомы захопнікам. Тады толькі зразумелі, калі князь Барыс з войскам пайшоў палон забіраць. Пачалі ў адкрытую сутычкі шукаць, але на гэты раз ужо сапернікі іхнія ўхіляліся. Секліся, здаралася, дзесяткі два-тры людзей, бо астатнім месца не знаходзілася, але да буйнога бою справа не даходзіла.

Бачыць князь Барыс, што ятвягі не адстаюць і войска ягонае ад іх адбіцца не можа. Пачаў думаць, як жа далей быць? Падказалі яму выйсце ваяводы, што вось зараз, маўляў, і трэба дыктаваць сваю волю, патрабаваць ад тутэйшых уступаць спрадвечныя землі, спасылаючыся на захоплены палон. Калі ім не шкада родных і блізкіх, тады самі ж адмоваю і смяротны прыгавор ім падпішуць.

Сустрэліся валадары. Князь Барыс, ведама ж, паспрабаваў ціснуць, заўважыўшы, як ятвягі за родных непакояцца, і грабежніцкія ўмовы выставіў:

— Я адпушчу палонных, тых, хто ў жывых застаўся, але вы мне за гэта палову зямель спадчынных

уступіце і пакленяцеся, што ніякіх прэтэнзій мець потым да мяне і маіх нашчадкаў не будзеце.

— Пра нашчадкаў непакоішся? Надта ты пра нашых думаў, каб мы потым за тваіх перажывалі,— злосна вымавіў нехта з ятвягаў.— Адплаты за такую бесчалавечнасць баішся?

— Няхай забіраюць зямлю, але каб вярнулі людзей, усіх да аднаго, што яшчэ жывыя ці параненыя ў вашым абозе сядзяць,— перабіў нейчы суровы, спакойны голас.— Зямлі нам на ўсіх хопіць, а вось людзей...

Так і зрабілі, як дамовіліся. Князь Барыс войска сваё яшчэ вёрстаў на дзесятак-другі адвёў, а палонных адпусціў. Там, дзе лагерам адпачываць задаволены спыніўся, вырашыў горад новы закласці, каб пусціць карані на гэтай зямлі назаўсёды. Спачатку замак і ўмацаванне часовае, драўлянае, пабудавалі воі, потым, з цягам часу, сталі ўзводзіць каменныя муры і сцены, адтуль і горад старадаўні пайшоў, і назву атрымаў Барысаў, ад імя князя, які ля яго вытокаў стаяў.

Каб паказаць цвёрдасць і непарушнасць межаў свайго княства, Барыс загадаў пакласці вялізны, агромністы камень пасярэдзіне Дзвіны і выбіць на ім словы: «Господи, помози рабу своему Борису» — гэта была мяжа з літоўскімі ўладаннямі. А з другога боку якраз тут і ўзнік новы гарадок-умацаванне — Барысаў. Камяні гэтыя ляжалі пасярэдзіне ракі (бо было іх не адзін, а некалькі) доўгія стагоддзі, і яшчэ зусім нядаўна іх можна было ўбачыць.

Вось што я чула ад сваіх старых, якія многае пераказвалі пра даўняе жыццё. Праўда, яны таксама гаварылі, што горад-то дакладна звязаны з імем полацкага князя Барыса, а вось камяні маглі адносіцца і да Барысаглебскіх святаў і заклікалі Усявышняга ці перадавалі яму волю людзей, якія жылі на зямлі, адносна будучага ўраджаю, яго добрага захавання на працягу года.

Хто ж яго, родненькія, ведае, можа, і так яно, а можа, і не, але пра Барысаў такое чула.

## БОЖАДАРЫ (Бярозаўшчына)

Жыў сабе чалавек адзін на белым свеце, і быў у яго сын. Вось аднаго разу бацька і гаворыць сыну:

— Ідзі, Пятрок, на ноч у гумно, вечарам пратапі добранька, а раненька пачнём збожжа малаціць (тады ж усё жалі сярпамі і былі гумны).

Пайшоў сын туды. Толькі ўвайшоў вечарам — чуе грукат нейкі, і прылятае да яго дзеўчына, ды такая прыгажуня, што ні ў казцы сказаць, ні пяром апісаць. Павіталася з хлопцам і цэлую ноч прагаманіла з ім, ад працы адвабіўшы. Так гумно і засталося на гэты раз нятопленым. Думае, за адзін раз нічога страшнага не будзе. Скажу бацьку, што надта натаміўся і таму нібы праваліўся ў сон.

Прыходзіць на другі дзень — зноў тое ж самае. Што ж вы думаеце? На трэцюю ноч яна зноў да яго дабралася. Ён і гэтую ноч празабаўляўся, працы не выканаў. Так, можа, з тыдзень доўжылася. Хлопец ужо і развітвацца з каханкай не жадае, калі яна пачынае ў птушку ператварацца, каб ляцець да сваёй хаты. Думаў, думаў, як яе не адпусціць, і дадумаўся. Пайшоў і запрасіў бацюшку з дзяком. Тыя прыйшлі і ўтварылі малітву вакол гумна. Хацела прыгажуня пад канец спаткання ператварыцца ў птушку, ударылася, як звычайна, аб зямлю, але... засталася дзяўчынай. Такім чынам, іншага выйсця не заставалася — толькі жаніцца.

Згулялі вяселле. І тут яна адкрылася маладому мужу, што ў яе дзесьці ёсць браты родныя і што яны... чэрці.

Сталі яны ціха-мірна жыць-пажываць ды дабра нажываць. І ўсё добра так ідзе, людзі ажно зайздросцяць чужому шчасцю. Аднаго разу пайшлі муж з жонкай жыта жаць на далёкую ніву. Працуюць не разгінаючыся, бо хочацца зрабіць як мага болей. Селі палуднаваць, ажно прылятае крумкач на бліжэйшую бярозку і пачынае каркаць. Ды так жудасна, зласліва, што на сэрцы млосна становіцца. Тут жанчына як заплача, як зальецца слязьмі. Муж кінуўся суцяшаць яе:

— Чаго ты плачаш? Што з табою здарылася? Хто цябе пакрыўдзіў? Адкажы хутчэй!

— Гэта ж,— гаворыць,— брат мой родны жэніцца і прыляцеў мяне на вяселле запрашаць. Гэта ён на бярозцы і крумкае.

Пятрок агледзеў уважліва прыціхлую птушку і да жонкі звярнуўся:

— Ну дык што тут дзіўнага ці страшнага? Раз

прыляцеў і запрашае, то не плакаць трэба, а на вяселле збірацца...

— Ой, гэта надта ж далёка і небяспечна там хадзіць. Невядома, чым такое падарожжа і запрашэнне можа для нас скончыцца...

— Няўжо ты брата роднага так баішся? Няхай бы я гэта казаў ці палохаўся, а то ты? Не веру, што могуць нас там пакрыўдзіць.

Што ж рабіць, трэба збірацца. Апрануліся ў самае чыстае і пайшлі. Ідуць, а жонка Петрака падвучвае:

— Глядзі ж, родненькі, як яны табе будуць есці стаўляць, таго не еш, бо атруцішча ці ператварыцца ў якую дзікую істоту можаш. Потым, як танцаваць пойдуць і сябе па вачах мазаць пачнуць, ты ўважліва глядзі, куды яны пальцамі торкаць будуць. Тады і сабе вока памаж...

Нарэшце дабраліся яны да вялікага палаца. Там ужо даўным-даўно ўсе весяляцца і скачуць, песні такія пяюць, якіх Пятрок ніколі раней не чуў. І самае галоўнае, што ніякія гэта не чэрці, а самыя звычайныя людзі, толькі што багата апранутыя. Пасадзілі і гасцей за стол. Жонка мужа штурхае ды паціху шэпча:

— Глядзі ж не забудзь, што гаварыла!

Ажно і сапраўды. Паскачуць-паскачуць запрошаныя і бягуць ды пальцамі ў вялікую міску мачаюць. Макнуў тады і чалавек. Як толькі зрабіў гэта, то нібы відушчым адразу стаў. Цяпер перад ім не панічы скакалі, а самыя што ні на ёсць чэрці: з хвастамі, з рагамі, з капытамі. І што самае страшнае, галоўным нячысцікам выступаў бацька ягонай жонкі. Жудасна зрабілася чалавеку ад думкі, што недалёка час адплаты і чэрці могуць яго са свету звесці.

Але жонка побач сядзіць, у адчай упадаць не дае. Гаворыць, да Петрака звярнуўшыся:

— Давай бацьку майго папросім, каб за мяне пасаг хоць нейкі даў. Што ж ён, мала багацця мае ці што? Няма чаго зацiскацца яму, хай дае. У яго болей дачок не было! Толькі ж глядзі, як будзе даваць сноп саломы, то памятай, што ў кожнай саломінцы мо з сотню чалавечых душ пакутуе, вось якой ён чароўнай сілай валодае! Мы тых людзей тады вызвалім, і нам гэта Усявышнім некалі залічыцца...

— Добра, каханенькая,— адказвае муж, а ў самога з перапуду зубы ў такт вясёлай музыцы ляскочуць.

Далей жанчына гаворыць:

— Не забывайся і на тое, што калі бацька будзе даваць быццам бы золата, то нас не так проста ашукаць гэтым. Гэта вуголле. І табе будзе бачна, бо ты ж вочы той чароўнай вадкасцю памазаў. Кажы, хай сапраўднае золата дае. У яго ўсяго хапае!

Збіраюцца ўжо адыходзіць, а галоўны чорт і кажа:

— Госцейкі дарагія, можа вы што папрасіць у мене жадалі?

— Так, бацька,— адказвае асмялелы Пятрок,— хацелі прасіць на пасаг што-небудзь, бо ўсім даюць, а ваша ж дачка не горшая.

— Згодны з гэтым, згодны, родненькія,— адказвае сам гаспадар і падводзіць іх да вялізнай скрыні з вуголлем, паказвае на яго і мовіць:

— Вось золата, бярыце яго, колькі хочаце. Мне не шкада...

А Пятрок жа добра бачыць, што гэта такое на самай справе, і гаворыць:

— Не, бацька, я сам каваль, дык у мяне вуголля і дома многа ёсць, ты мне золата дай, каб на ногі гаспадарку падняць ды дзяцей, калі будуць, апрануць-пракарміць.

Зразумеў галоўны чорт, глянуў на сваіх хаўруснікаў і кажа:

— Так ужо і быць. Забірайце сапраўднага золата скрынку!

Пакланіліся яны і пайшлі сабе дамоў. Жанчына, калі крыху адышліся, прасіць Петрака пачала:

— Давай вернемся ды той сноп саломы ўкрадзем! Гэта ж колькі людзей ад далейшых пакут вызвалім! Нам жа падзяка вялікая будзе!

Павярнулі да палаца, дзе нячысцікі працягвалі весяліцца. Неяк удалося чалавеку пракрасціся і сноп той разрэзаць, адразу душы пакутнікаў вольнымі зрабіліся і шуганулі ў паветра, каб да неба дабрацца.

Цяпер ужо пабеглі, колькі сілы ставала, бо ведалі, што нячысцікі ім такога ліха не даруюць. І сапраўды так здарылася: ачнуліся тыя ад п'янкі, бачаць — няма снапа, і здагадаліся, хто гэта ўчыніў. Кінуліся ў пагоню за Петраком з жонкаю. Ведаеце, што ад чарцей уцячы немагчыма, калі толькі іх не падманеш, вакол пальца не абвядзеш.

Беглі яны, бедныя, беглі, ажно глядзяць — ужо пагоня зусім блізка. Укленчылі, да Бога звяртаючыся:

— Божа высокі! Божа далёкі! Зрабі так, каб нячысцікі нас не знайшлі! Просім-молім цябе за гэта!

І ў той жа момант зрабілася жанчына глыбокай рэчкай, а Пятрок ператварыўся ва ўюна. Прыляцела пагоня на бераг. Узмыленыя, ледзь дыхаюць, але задаволеныя, бо галоўны чорт зразумеў, што рэчка — гэта ягоная дачка. Ён памятаў добра: колькі разоў тут лазіў, рэчкі ніколі не было! Заверашчаў на сваіх падначаленых:

— Піць усім, колькі ўлезе! Выпіць рэчку да дна! Выпіць, а ўцекачоў злавіць!

І давай яны піць-жлукціць рачную ваду. Справа да таго дайшла, што некаторыя нават лопацца ад празмернага старання пачалі. Але колькі ні глыталі, вады не станавілася меней, наадварот, яна аднекуль прыбывала і прыбывала.

Убачыў галоўны чорт, што справа так павярнулася, і заверашчаў:

— Ну, так ужо і быць, мая дачка! Была ты да гэтага чалавекам — ім і заставайся! А вы,— звярнуўся да астатніх чарцей,— за тое, што не ўпартавалі сноп з людскімі душамі, стойце лазнякамі ды алешнікам крывым над ракою ды па балотах тутэйшых!

Як закляў галоўны нячысцік моцным праклёнам, так і на самай справе здзейснілася. Чэрці і пікнуць не паспелі, як у дрэвы ды кустоўе ператварыліся. Сам бацька стаў вялізным каменем, які доўгія часы ляжаў на высокім беразе рэчкі.

А мужык з жонкай сваю хаціну бліжэй да гэтага месца перанеслі і назвалі яе Божадары — гэта значыцца дарунак Бога, які дапамог ім у такі адказны момант.

## КАСЦЮКІ

У нас такую казку-гісторыю распавядаюць. Я і сам не ведаю, ці так гэта было, ці не на самай справе. Але як усе гавораць, то і вам паўтарыць прыйдзецца. Там жа як адбывалася. Нехта адзін выдумае або ад сябе скажа, а дзесяткі, сотні людзей, потым іншым паведамляючы, ужо далучаюць нейкія новыя факты ці падрабязнасці. І вуснае апавяданне становіцца такім ужо пашыраным і ўзбагачаным, што нават той, хто першым пусціў яго ў белы свет гуляць, не пазнае

або пазнае з вялікай цяжкасцю. Так і пра нашу вёску старыя людзі казалі. Так і да нас дайшло. Вы, можа, яшчэ ад каго чулі, і таксама крыху па-іншаму. Колькі вяскоўцаў, столькі і гісторый ці паданняў. Але слухайце.

Жыў-быў адзін чалавек. Звалі яго па-простаму — Косця. Але вяскоўцы перарабілі імя гэтае на ўласны лад, і стаў чалавек не кім іншым, як Касцюком. У яго было двое дзяцей, абодва сыны, Іван ды Сцяпан. Такія ўжо ж штукары ды лайдакі выраслі, што не дай Божа. Чаго толькі не выдумаюць, каб не працаваць, не гнуць спіну ў полі ці ў лесе, а дзе паляжаць, адпачыць. Адзін з аднаго паздзекавацца любілі — жах! Можа, здзекамі гэта ўсё і вельмі гучна названа, але нічога не папішаш, так ужо людзі казалі.

Сядуць вечарам у хаце і давай да бацькі чапляцца:

— Ці то прадаў наш сусед сваю цялушку, тата?

Той, злуючыся, пачынае крычаць:

— А мне да гэтага якая справа?

— Як гэта якая? Будзем ведаць, што ў яго грошы ёсць! А ў яго ж Анэтка на выданні! Пасватаеш з нас каго.

— Вас хіба толькі за старую Тэклю, што ледзьве ногі валочыць, сватаць можна, ды яшчэ і тая можа адмовіцца!

Бацька іхні, нягледзячы на тое, што сыны лайдакавалі, быў надта шчырым працаўніком. У яго руках усё гарэла. Каб не Касцюк, то сыны і жонка даўнымдаўно б з голаду памерлі ці, у лепшым выпадку, пайшлі б па людзях пабірацца. Таму такія пустыя размовы яму і надакучвалі хутка. Але ж сыны бацьку добра ведалі і заўсёды свайго дабіваліся. Угавараць таго, прымусяць і на пытанні ўсялякія адказваць, і расказваць пра цікавыя здарэнні, якія ў пераважнай большасці былі звязаны са скарбамі ды з грашыма.

Іван, соладка пацягнуўшыся, пытаўся:

— Бацька, ці не чуў ты, у нас тут скарбы шукалі?

— Як не шукалі. Шукалі,— адказвае той.— Я тады хлапчуком быў і даволі выразна памятаю. Даўно было, канешне. Адзін пан з самога Пецярбурга прыязджаў. Ён не разумеў па-нашаму спачатку, але потым, за час, праведзены на раскопках, ля палаца, пачаў нават некаторыя словы самастойна вымаўляць.

— І што, многа знайшоў?

— Ды многа нешта. Толькі што там было — не ведаю. Але многа, бо з дзесятак фурманак нагрузілі так, што коні ажно са шкуры вылузваліся, цягнучы іх. А пан сам побач з вазамі ішоў, нават не садзіўся, каб пад'ехаць. Нейкая цацка дзіўная была ў ягоных руках. Пакладзе яе на далонь, і яна адразу падкажа, дзе скарб захаваны. Пан думае, што вось у гэтым месцы, але стрэлачка на цаццы гаворыць, што вось тут. Пачнуць капаць і сапраўды скарб знаходзяць, бывае, што невялікі, а здаралася, што і значныя каштоўнасці...

— Вось нам бы такую цацку, га, Сцяпане,— вытрашчыўшы вочы ад пачутага, вымаўляў Іван,— вось бы мы ўзбагаціліся і зажылі б!..

Але Касцюк не даваў ім болей расседжвацца, прыкрыкваў сурова:

— Спаць ідзіце, багацеі! Вам бы толькі языкамі мянташыць, а вось паедзем заўтра ў лес па дровы, там пагляджу, хто спрытнейшым акажацца! Спаць ідзіце!

Ды што ж вы думаеце? Такія вось гаворкі, гісторыі ўсялякія прывялі да таго, што пачалі сыны грошы збіраць. Працаваць не надта любілі, а як захацелі разжыцца, то і яны пачалі жываты на полі рваць. Капейку да капейкі мо некалькі гадоў запар збіралі. У лахманах гэткіх хадзілі, што бацька з маці вяскоўцаў саромеліся за бедна апранутых, няхай сабе і дарослых, дзяцей. Потым Іван паехаў у далёкі свет, каб там яшчэ болей падзарабіць. І гэта яму ўдалося. Грошай прывёз гэтулькі, што на пяць добрых, заможных гаспадарак хапіла б. Першай справай ён вялізны кавалак ворнай зямлі купіў. Не надта каб і таргаваўся з гаспадаром. Пабачыў, што бацька ажно засвяціўся ад радасці, то і выплаціў грошы.

Але праз некаторы час зноў на сыноў нібы нешта найшло. Па-ранейшаму сталі ленавацца, ды толькі ўжо хадзілі паўсюдна і пахваляліся. Людзі было зайздросціць пачалі Касцюку, а то, заўважыўшы, як той ужо ад старасці да зямлі гнецца, спачувалі, што ўсё так павярнулася на стары лад.

Неяк аднаго разу сыны, добра лыкнуўшы ў карчомцы, прыйшлі дамоў і пачалі будзіць бацьку:

— Тата, уставай!

— Чаго вам трэба? — здзівіўся той.— Спаць кладзіцеся ды спачывайце...

— Тата, пасылай сватоў заўтра да Насткі. Я жаніцца буду,— вымавіў Іван.

Не спаў Касцюк, усё думаў, што, можа, за старэйшым і малодшы адумаецца ды жыць як людзі пачне. Жэніцца, а жонка калі трапіцца бойкая і ўшчаперыць у свае рукі, то гультайства тое куды і дзенецца!

Дзеўку Іван выбраў сабе добрую: прыгожую, працавітую, з добрым пасагам. Яе бацькі за такога лайдака ніколі дачку не аддалі б, але і тут немалую ролю адыгралі грошы, пра якія вяскоўцы толькі і гаманілі пры першай жа нагодзе. Вяселле прызначылі ў хуткім часе, усё як мае быць зрабілі. Іван галаву ўжо гэтак задзіраў, што і блізка не падыходзь!

Нарэшце надышоў і дзень вяселля. Уся вёска гуляла, усіх папрасіў бацьку паклікаць на гэтую падзею старэйшы сын. Сядзяць людзі, дзівуюцца, колькі ўсяго рознага на сталах. У пана і то далёка не ў кожнага такое можа быць! П'юць, ядзяць, песні спяваюць. Ужо добра сяляне падпілі, некаторыя нават пад сталы папалазілі, спачынку там шукаючы. Іван да маладой жонкі туліцца, тая ж ад яго, наадварот, хіліцца, бо не надта прыгожы быў жаніх, ды і ростам не выйшаў, хіба што толькі адзін язык даўжэзны меў.

Убачыў Іван такую справу і вырашыў пакараць ганарліўку — прынесці і пры ўсіх паказаць, колькі ў яго грошай яшчэ засталося. Няхай, думае, пазайздросцяць, а то панапіваюцца і заўтра будуць яго косткі перамываць. Нічога не гаворачы, вылез з-за стала і пакіраваў у двор. Пакуль ён тыя грошы знайшоў, пакуль пералічыў і сабраўся назад ісці, на вуліцы цёмна стала, хоць вока выкалі. А тады ж ведаеце якое святло ў людзей па хатах было — лучына на камінку гарэла. Многа там убачыш пры гэткім агеньчыку... Вось таму Сцяпан, заўважыўшы, што маладая самотна сядзіць, галаву схіліўшы, а ля яе нікога няма, шуснуў да дзяўчыны. Малодшы з братоў быў не роўня Івану: высокі, плячысты, тварам прыгожы. Дзяўчына на яго на вечарынках яшчэ раней вокам не раз кідала. Сядзяць яны абое, цалавацца пачалі, а людзі п'юць і гарлаюць нецвярозымі галасамі велічальныя песні. Гаспадар хаты бачыць што да чаго і гаворыць, да гасцей звяртаючыся:

— Мы, родненькія, яшчэ пасядзім, пагамонім, а маладыя няхай спаць ідуць. Ім жа наконт далейшага жыцця дамаўляцца трэба...

Нехта захіхікаў у адказ, згадваючы, мабыць, сваё «дамаўленне» з жонкай, нехта, ікнуўшы, «дазволіў» ісці і г. д.

Бацька нявесты не быў дурнем. У яго яшчэ адна дачка была. Яе і жаніхі, і бабылі бокам абыходзілі. Непрыгожая надзіва ўрадзілася. Гарбатая нейкая, крывавокая, сварлівая. Таму ён, калі Сцяпан з малодшай дачкой спаць пакіравалі, яе на месца маладой пасадзіў.

Тым часам і Іван у хату прыцёгся. Сыпануў грошы на стол і як гукне:

— Глядзіце, колькі ў мяне дабра! Няўжо нейкая дзяўчына мне пасля гэтага адмовіць! Га?

І звяртаецца да той, што на месцы маладой сядзіць. Тая, ведама ж, ад шчасця ззяючы, ляпеча:

— Згодна я, згодна я, Іванка! Родненькі мой, згодна!

Засмяяўся жаніх задаволена:

— Вось то і яно!

Панапіваліся ўсе да ўпаду, бо было што ў глоткі ліць. А раніцай, толькі працверазіліся, па вёсцы чутка маланкай панеслася:

— Не таго жанілі!

Прыбеглі, глядзяць — на двары ў бацькі шчаслівыя Сцяпан з Насткай мілуюцца, а Іван са старэйшай дачкою, нешта ў сне распавядаючы, спяць і задніх ног не чуюць.

Касцюк не вытрымаў такой ганьбы, сабраў маёмасць і пераехаў жыць з сынамі і іхнімі маладымі жонкамі на зараней купленае поле. Там і стала будавацца пазней вёска, якая назву атрымала ад першага гаспадара — Касцюкі.

Вось так выйшла, што Касцюка з сынамі даўнымдаўно няма сярод жывых і, можа, нават косці іхнія ў зямлі ўжо пагнілі, а памяць пра іх захавалася.

## ЛАЎНІЦА

Адносна паходжання назвы нашай вёскі я чула ад старых людзей такую гісторыю. Але не падумайце, што яна толькі адна, бо расказваюць і іншыя, і некаторыя з іх мне таксама знаёмыя. На вячорках жа, здаралася, даволі часта такія пытанні ўздымаліся і прасілі распавесці тых, хто нешта ведаў пра карані

радаводу. Таму і засталося ў памяці да гэтых дзён. Таму і пішыце так.

Наша вёска Лаўніца паходзіць ад слова «лаўнікі», што азначала: «людзі, якія займаліся сплавам лесу па бурных, вірлівых рэках». Не глядзіце, што зараз яны такія спакойныя, раней зусім іншае было. Пра Напалеона ўсе чулі? Дык ён жа ў нашай рацэ Бярэзіне тапіўся. І мне здаецца, што больш правільна тое самае слова трэба вымаўляць не «лаўнікі», а — «плаўнікі», ці, яшчэ больш дакладна,—«сплаўнікі». Тут ужо і няцяжка здагадацца, што ўсе падзеі са сплавам лесу звязаны, з людзьмі, якія мелі такую прафесію.

Вядома, што кожны чалавек імкнуўся неяк пражыць, пракарміць і апрануць сябе ды сваю сям'ю. А ў нас трэба было добра круціцца, бо землі вакол нашай вёскі і сёння, калі столькі ўгнаенняў уносяць, не надта родзяць. А што даўней было, і згадваць не даводзіцца. Голад за голадам, паморак за паморкам. Вось і бачылі ў такім пабочным занятку мясцовыя жыхары адзінае выйсце. Трэба адзначыць, што небяспечны надта гэта быў занятак. Не думайце, што ўсё так проста і звычайна. Колькі плытагонаў гінула, зараз і прыгадаць цяжка. Ці адна жанчына зайшлася крыкам-стогнам, даведаўшыся пра трагічны лёс мужа ці сына? Было, усё было. Але ж і жыць трэба неяк. Таму і ганялі плыты.

Мой дзядуля таксама гэтым рамяством займаўся. Я з ім любіла сядзець і гаманіць. Надта ж цікава апавядаў пра сваё жыццё. А перажыць яму многае давялося. Мяркуйце самі: дваццаць пяць гадоў у царскім войску адслужыў, потым яшчэ крыху па белым свеце паблукаў, перш чым дамоў вярнуцца, і тут ужо плытагонам стаў. Да глыбокай старасці гэтага занятку не кідаў. Потым маладых мужчын ды дзецюкоў стаў сабе на замену вучыць.

Сядзем мы з ім на печы, калі холадна ці дождж ішоў, або на прызбе, калі сонейка яснае грэла, і давай я ў яго выпытваць усё, што мяне цікавіць. І ён мяне таксама любіў, ніколі не насварыўся, не адагнаў ад сябе, не сказаў, што надакучыла, і г. д. Іншыя ў хаце таксама прыслухоўваліся да нашай гамонкі, бо і ім жа цікава. Як пыталася? Ды вось так прыкладна:

— Дзеду, раскажы мне пра сваё жыццё...

— Пра жыццё, унучка?

— Раскажы тады, як даўней жылося... Што рабіў, чым займаўся?

— Дык я ж ужо і казаў...

— Забылася, бо даўнавата тое было,— хітравала я, і дзядуля нарэшце здаваўся.

— Ну, раз ёсць ахвота, то слухай, родненькая. Значыцца, было ўсё так. Даслужыў я ў войску свой тэрмін працяглы. Потым яшчэ па Расеі ездзіў гадоў колькі, «лёгкага» хлеба шукаў, ды не было яго нідзе для беднага чалавека, у якога толькі рукі здаровыя пры сабе ды сумленне чыстае. Вымушаны быў накіравацца ў родную вёску, адкуль некалі мяне забралі ў войска. Прыйшоў месяцаў праз пару, а тут... Божачкі! Голыя і босыя ў братоў дзеці на печы сядзяць, мае ссівелыя і састарэлыя бацькі ўжо ледзьве рухаюцца, есці ім няма чаго, бо працаваць самі ўжо не здужаюць, а ў сыноў у саміх бяды-гора хапае.

Вырашыў я тады на плыты пайсці. Паступіў на сплаў і папаў якраз на караван. Караван тады звычайна сплаўлялі з Чэрнеўкі (суседняй вёскі) да Бабруйска самога...

— Гэта што, плыты караванам называлі ці іншае нейкае прыстасаванне?

— Менавіта плыты, унучанька, прычым не адзін, а некалькі, звязаных адзін з адным.

— Дзядуля, а колькі людзей на плытах было звычайна? Многа?

— Ды не вельмі... На адным знаходзілася каманда з шасці чалавек, а ў караване — пяць-шэсць плытоў. Вось і падлічы сама.

— А драўніны багата звязвалі ў плыты? Ці, можа, не надта, на пару вазоў якіх укінуць можна?

— Да дзвюх тысяч кубаметраў лесу ўладкоўвалі акуратна, яшчэ і мала здавалася, даражэнькая.

— А чым вы іх звязвалі паміж сабою, дзеду?

— Такія вяроўкі тоўстыя былі, мо нават таўшчэйшыя за руку, вось імі і прышнуроўвалі моцна, каб дзе на пераvale якім ці на перакаце не паразрываліся і не параскідаліся. Там, дзе рака цякла роўнаю стужкаю, люба-дорага было глянуць, як плыты выцягваліся адзін за адным. Стваралася ўражанне, што жывая змяюка цягнецца па вадзе, а не шматлікія бёрны, злучаныя паміж сабою. На плытах стаялі і буданы, і ложкі, і есці на іх мы сабе варылі, бо не дзень і не два плылі да горада Бабруйска...

— А плыты шырокія былі?

— Дужа нават шырокія. Да шаснаццаці метраў, а то і шырэй у некаторых выпадках рабілі.

— І такія рэчкі шырокія ў нас былі, дзе магла б такая аграмадзіна бесперашкодна праплыць?

— А то не! Па Бярэзіне, напрыклад, і шырэйшыя плыты ганялі, асабліва ў даўнейшыя часы, яшчэ да мяне. І вады і глыбіні хапала.

— А ці па Бабры (рака наша) плыты сплаўлялі?

— Сплаўлялі, чаму ж не. Самасплавам кідалі, і лясіны плылі да патрэбнага месца. Там іх вылоўлівалі і звязвалі ў большыя плыты...

— А на Бабры невялікія плыты праводзілі?

— Вядома ж, калі і вязалі, то невялікія, адзін чалавек іх рабіў і суправаджаў сам. Вялікая каманда не патрабавалася. Уменне — то справа зусім іншая, без яе па такой невялікай рацэ не надта куды папхнешся. Адразу ці на мель якую сядзеш, ці да берага прыкруціць, тады ніякім шастом не адпіхнешся, прыйдзецца дапамогу з бліжэйшай вёскі клікаць ці іншых плытагонаў чакаць, каб з месца сарвацца дапамаглі, бо сам і да зімы сядзець будзеш. Яшчэ, як сярод нас гаварылі, тут малём ганялі драўніну.

— А як гэта, дзеду?

— Малём — гэта калі па лясіне паасобнай плыве па рацэ, і ўсё. Кожны свае бёрны на шырэйшым месцы вылоўлівае, у плыты невялікія вяжа і далей кіруе. У Чэрнеўцы бон стаяў, там і запыняліся адвольна плывучыя лясіны, там іх і парадкавалі адну да другой. Адтуль вялікія плыты і пачыналі гнаць. Як я ўжо гаварыў — да самога Бабруйска, а то і яшчэ далей, ажно да Рэчыцы. Я болей за сотню разоў у Рэчыцу сплаваў за ўвесь час, што на плытах працаваў. Ці ж мала гадоў я ім аддаў, ці ж мала яны мае сілы з'елі?

Вось адкуль пайшлі нашы людзі-лаўнікі і вёска Лаўніца. Ад плытагонаў назву займела.

Але гэта яшчэ не ўсё, што я чула ад сваіх старэйшых. Справа ў тым, што сама вёска Лаўніца падзялялася на своеасаблівыя надзелы, якія мелі адпаведныя назвы. Ну, напрыклад, Тальянка. Чаму назва такая ў гэтай вуліцы? Таму што, мне так чуць давялося, самым першым тут стаў дом будаваць чалавек, які прыйшоў на нашу зямлю аднекуль з горада. Сям'ю

з сабою прывёў і вырашыў у вёсцы назаўсёды застацца. Параіліся сяляне паміж сабою, выдзелілі яму надзел зямлі і далі грамадскага лесу на будоўлю, потым і хату ставіць дапамагалі, бо як жа аднаму чалавеку такую харамаціну агораць? А яшчэ што важна: той чужынец меў у сябе дзіўную для астатніх рэч — гармонік, які чамусьці сам называў тальянкай. Як сядзе, здаралася, калі пад вечар ці ў святую нядзельку, ды як зайграе, то ўся вёска да яго збягаецца паслухаць, так ён хораша мелодыі ўсялякія выводзіць. Голас меў надта звонкі, непаўторны, сам сабе як падцягне, то няхай у сто званоў папы званіць будуць, а ў царкву нікога і на вяроўцы не завалачэш. Слухаюць. Хто песні ведае — той падпявае, а хто не — той прытупвае ды ў скокі пад вясёлую музыку пускаецца. Усё роўна ж весялей, чым у царкве псалмы нудлівыя цягнуць ды, рот разявіўшы, казань якую мудрагелістую запамінаць.

На вяселлі запрашалі чалавека, на іншыя якія святы, і ён ніколі не адмаўляўся, прыходзіў, бо памятаў пра тое, як яму мясцовыя жыхары талакою дапамагалі ў цяжкі час. Сам пастарэў — то сына навучыў з тальянкай сябраваць, і той бацьку нават у гэтым майстэрстве пераўзышоў. Любы гук мог падрабіць, любую песню ці мелодыю пераняць. Ногі самі ў скокі пускаліся. Утрымацца нельга было. Мёртвы і той бы тупнуў-прытупнуў, у апошні зямны шлях накіроўваючыся. Такі ўжо музыка адмысловы вырас. Ад яго і да нашага часу ў вёсцы некаторыя мужчыны на гармоніках выцілінгоўваюць.

Яшчэ крыху па-іншаму кажуць. Нібыта тыя людзі не па аднаму ў нашай вёсцы збіраліся, не асобнымі сем'ямі прыязджалі на новае месцажыхарства, а перабіраліся сюды з нейкай далёкай вёскі, якая насіла дзіўную назву — Унтальянка. Яна нават і сёння існуе ў Начанскім сельсавеце нашага ж раёна. Хто не давярае — няхай правярае, з вусамі застанецца! Так дзед-нябожчык любіў прымаўляць. Дык тых салдат з іхнімі жонкамі і дзецьмі як перасялілі, то яны з сабою і назву старога паселішча прынеслі — Унтальянка, але з цягам часу ўсё перайначылася, перамянілася і засталася толькі Тальянка. Ды і то назва не ўсяго паселішча, а толькі паасобнай вуліцы.

А то яшчэ ёсць Пасёлак, Паляна, сяло Лаўніца. Напрыклад, сяло Лаўніца пайшло ад даўніх часоў. Тады, калі салдаты з войска дамоў вярталіся не пакалечаныя і не параненыя, а жывыя, здаровыя, то ім ва ўзнагароду вясковая грамада, так заведзена было, нічога не папішаш, зямлю выдзяляла. У нас цэлае поле такое было, дзе адны служывыя працавалі са сваімі сем'ямі, а хто і адзін гараваў-упраўляўся. Называлі яго салдацкім. Яны нават калі аралі ці скародзілі што, то песні спявалі-выцягвалі не нашы, вясковыя, а тыя, якія некалі спявалі ля паходных вогнішчаў ды падчас баявых маршаў. Чысцютка ўсё было, прыбрана, глянеш — дык вока радуецца, што на зямлі такі парадак наведзены. Ураджай у іх заўсёды быў лепшы, чым у астатніх, бо і днявалі і начавалі на ўласных надзелах. А як вяселле ў каго ці дзіця народзіцца, то такую пагулянку на цэлы тыдзень, а мо і на болей закочвалі, што і некаторым генералам-панам не снілася. Умелі адзін аднаму дапамагчы, падтрымаць у цяжкую хвіліну, умелі і адпачыць-павесяліцца.

Вось такія гісторыі пра нашу вёску даводзілася мне чуць у дзяцінстве і ў маладосці, таму і вам сёння пераказваю.

## СЕЛІШЧЫ

Вельмі даўно гэта было. Нават старыя людзі і то даведаліся пра ўсё ад сваіх бацькоў і дзядоў. Рос на месцы цяперашняй нашай вёскі густы яловы лес, а па ім працякала-круцілася пад галінамі ды між пакручастых каранёў невялічкая рачулка. Бегла сабе адвольна, ніякіх турбот не ведаючы. Ніхто яе не перагароджваў, не запруджваў, хіба што бабры, якіх мноства вадзілася па яе берагах, валілі дрэвы на хуткаплынныя воды і будавалі па берагах свае хаткі ды норы глыбокія і шырокія капалі. Майстры, што тыя цеслі адмысловыя. Гэтак адштукуюць непрыгожую зверху будыніну, што і чалавек далёка не кожны гэтак зрабіць здагадаецца. Рыбы было столькі, што як пойдзе вясною на нераст, то нібы муку хто ў вадзе спецыяльна разводзіў — гэтулькі ў рацэ яе збіралася. Зараз, можа, такіх відаў і не водзіцца ўжо — павымерлі. А якая вялікая расла! Жах бывала глядзець, калі рыбакі невадам сома пудоў на пятнаццаць на бераг

ледзьве ўсёй кампаніяй высунуць, а ён толькі ротам агромністым зяхае, нібы палохае надта цікаўных людзей, якія прыджгалі на дзіва гэткае паглядзець. Калодамі, сякерамі такіх рыбін дабівалі, іначай рады ніякай даць не маглі!

Неяк блукаў і прыблукаў аднекуль у гэтыя незаселеныя мясціны чалавек падарожны. Хто ён такі быў, адкуль прыкіраваў сюды — ніхто не памятаў і не памятае, ды, мабыць, гэта і не самае галоўнае ў даным выпадку. Мы ж гамонку зусім пра іншае завялі. Нас цікавіць, адкуль тут паселішча з'явілася, хто першым жыць стаў? Пахадзіў па густых лясах, паслухаў, як журчыць-весяліцца рэчка, і нешта за душу яго кранула, нібы сцвярджаючы: не ідзі адсюль, застанься назаўсёды. Агледзеўся яшчэ разоў колькі, пераначаваў на новым месцы, пад густымі елкамі, пару начэй. Бачыць, што звяр'я ды птаства надзвычай многа навокал. Толькі збярэцца куды пайсці, а жывёлы ўсялякія і кроку спакойна не даюць зрабіць — бегаюць, скачуць, палохаюць. Падумаў, падумаў і вырашыў — пажыву крыху, а калі потым не спадабаецца, то здымуся і далей сабе пакірую, мяне ж тут ніхто не трымае і нікому я нічым не абавязаны. Так, мае даражэнькія, толькі на першы погляд здаецца, а калі прыкіпіш да зямліцы сэрцам, пачуеш сябе з ёю адным цэлым, то нічым ужо з месца не скранеш. Такая натура чалавечая, тут нічога ўжо не зменіш. Усё так было, так застаецца і так, відаць, будзе заставацца, пакуль род чалавечы на свеце існаваць будзе.

Дык вось, спадабалася падарожнаму надта на гэтым месцы. Знайшоў ён сабе прыгожую палянку і вырашыў пасяліцца на ёй, як мы ўжо і адзначалі, толькі на першы час. Стаў адразу будавацца. Хто ж яго ведае, якую ён там ужо хаціну ладзіў. Можа, гэта і не хаціна была, а нейкая зямлянка ці напаўзямлянка, але, тым не меней, жыць у ёй можна было, і зімовыя маразы ды завеі не надта страшылі сваёй суровасцю і снягамі.

Канешне, нялёгка чалавеку абжыцца на новым месцы. Асабліва ў першы час. Калі мясцовасць яшчэ добра не зведаў і не ведаеш, дзе лепей звера якога ўпаляваць, рыбы налавіць, каб з голаду не сканаць, каб не заблудзіцца ды ад сцюжы не замерзнуць дзе-небудзь у глыбокім сумёце, дык і прасядзець пра-

цяглыя зімовыя месяцы нават у цёплым памяшканні цяжка, бо і сумна, і страшна, і, не дай Божа, захварэеш, тады і вады конаўку няма каму падаць. Пра лекі дык і вы ведаеце, якія яны тады былі, найболей на варажбітоў ды на ўсялякія травы і краскі засушаныя спадзяваліся. Здаралася, дапамагала, а калі не, то асабліва не ўбіваліся, лічылі, што гэта воля нябесных багоў такая — забраць няшчаснага да сябе.

Ледзьве дачакаўся той чалавек першых вясновых павеваў ветру, каб вылезці з хаціны ды пайсці шукаць ежу. Потым паступова і на рыбалку прызвычаіўся хадзіць, і грыбы-ягады збіраць. Але самае першае сярод жыўнасці ведаеце што завёў? Ніколі не здагадаецеся! Будзеце казаць, што сабаку, ката, казу і г. д. Не, няправільна! Курэй завёў той незнаёмец. Яны яму і дапамагалі выжыць на першым часе. А што ж вы думаеце? І мяса было, і яйкі неслі, і пер’е можна было ў справу пускаць. Карміцца, калі цёпла было, то выпускаў на падвор’е, старанна абгароджанае з усіх бакоў, бо звяр’я хапала і, вядома ж, яно б хутка з безабароннымі курамі разлічылася. А на зіму ўсялякага зерня, па лесе шастаючы ды па лугах бегаючы, назапасіў, каб пасыпáць кожны дзень прыручаным птушкам.

Колькі гадоў ён так самотна пражыў, ніхто і не скажа. Але ўжо стаў на ногі чалавек, гаспадарку даволі моцную трымаў, а гэта для вяскоўца ці для таго, хто ад зямлі корміцца, нямала значыць. Тут ужо толькі паварочвайся, працуючы, няма калі баяцца, што з голаду памрэш. На аднаго хопіць, яшчэ і шмат застанецца. Тут табе і яйкі, і малако, і мяса. Калі чалавек працуе, займаецца нечым, то яму і сумаваць часу асабліва нестае.

Неяк і да зямлі прывязаўся, стаў на ўласных валах добры такі кавалак выкарчаванай пусткі апрацоўваць і зерне сеяць. Што ж вы думаеце? Такая збажына каласіла — ого-го! Толькі збірай у бочкі зерне ды ў сусекі засыпай. Столькі дабра ўсялякага назапасіў гаспадар, што пачаў ужо і задумвацца, а навошта, маўляў, мне аднаму столькі? Сядзе, бедалага, вечарам ды з жывёламі сваімі размаўляе, каб увогуле гаварыць не развучыцца. Цяпер сапраўдную цягу да людзей, да яднання з імі адчуў. Начамі стаў малітвы да багоў шаптаць, ахвяры ім прыносіў самыя дарагія.

Неяк аднаго дня прыблукалі да яго першыя суседзі — цэлая сям'я прыйшла. Як ён радаваўся людзям! Што толькі ім не прапаноўваў! Накарміў, напаіў, спаць паклаў у хаціне. А калі тыя адпачылі і пачалі за ўсё дзякаваць, то нават і слухаць не жадаў, каб яны куды далей жыць пайшлі. Запрапанаваў будавацца побач з ім. Зямлі, маўляў, на ўсіх хопіць, лесу, рэчкі, звяр'я і рыбы ў іх — таксама. Толькі жывіце. І мне намнога весялей будзе, і вам не трэба будзе перажываць, чым заўтра пракармiцца. Раіў час не цягнуць, а будавацца адразу пачынаць, каб да халадоў паспець асноўнае зрабіць. І ён з ахвотаю дапаможа ім на ногі стаць, бо на сабе зведаў, што гэта такое. Дык ён жа без сям'і быў, а тут і дзеці малыя, і бацькі старыя, адным словам — праблем непачаты край. Трэба круціцца, дый добра, пакуль на свой хлеб не ўзаб'ешся!

Пабудаваліся да наступнай зімы новыя суседзі. Дружна перажылі халады і вясною ўзяліся ўсе разам лес карчаваць, каб новае поле апрацоўваць і засяваць, бо збожжа ўжо намнога болей патрабавалася, чым раней. Паступова і жыта пачало ўздымацца, і агароды побач з будынінамі вялікія агарадзілі. Цяпер ужо суседзі дапамагалі свайму добразычліўцу ў градах корпацца, бо ў гэтай справе ён быў не надта спрактыкаваны. А ў жанчын, вядома, рукі да такога найлепей прыстасаваны.

Потым яшчэ сем'яў колькі сюды прыбілася. Ужо не хутарок невялічкі стаяў пасярод густога лесу, а вёсачка. Людзі не толькі працавалі, але і да наваколля пільна прыглядаліся, дзе што найболыш родзіць, дзе што водзіцца. Так і рэчка, якая спакон вякоў была безыменнай, атрымала назву. Простую такую — Альхоўка, бо вольхамі нібы ўкутаны былі яе берагі.

А тыя людзі, якія прыязджалі сяліцца яшчэ пазней, пачалі ўжо будавацца не побач, а крыху далей, гэта значыцца зрабілі новую вуліцу. І дарогу, якую яны таксама пратапталі-праклалі першымі, назвалі па-свойму — Навасельскай.

Калі назбіралася народу цэлая вёска, змянілася ўжо не адно і не два пакаленні, то, адпаведна, і поля на ўсіх стала не хапаць у такой ступені, каб яно пракарміць магло. Трэба было шукаць нейкі іншы занятак, які б дапамог зарабіць капейку лішнюю, пракарміць ды апрануць сям'ю.

Лес стаў выручаць пакрыху. Справа ў тым, што ў нас тут яго надзвычай багата было, а ў некаторых жа мясцінах не хапала. За яго там надта вялікія грошы плацілі. Вось толькі давезці яго туды было праблемай. Але патрэба прымушала, і вяскоўцы спраўляліся з такой складанай задачай. Яшчэ зіма не канчалася, люты ці сакавік на дварэ стаяў, а сяляне са сваімі коньмі ўжо кіравалі ў лес, валілі дрэвы і вывозілі іх да рэчкі Альхоўкі. Звычайна гэта адбывалася ля возера Палік, паблізу вёскі Дальнавічы. Бярвенняў навозілі гэткія высокія і вялізныя гурбы, што яны вышэй верхавін стогадовых дубоў уздымаліся.

Як толькі лёд на рацэ раставаў, лясіны спускалі ў ваду і там іх вязалі ў плыты. Вязалі не вяроўкамі, а спецыяльна звязанымі лазовымі ўмацаваннямі («гужва» па-нашаму). Нашы людзі плыты не суправаджалі. Там спецыяльныя майстры былі. Вяскоўцы дамоў вярталіся, бо скародзіць, сеяць новы ўраджай трэба было. Праўда, некаторыя заставаліся на плытах і вярталіся дамоў праз год, а то і праз два. Тады ўжо распавядалі землякам, як вадзілі плыты да Бабруйска і адтуль ажно да Запарожжа. Там другім людзям лес перапрадавалі і назад дабіраліся. Так доўжылася з году ў год. Вось адкуль вёска Селішчы і рэчка Альхоўка пайшлі.

## ЧЭРНЕЎКА

Раней хто толькі чым мог, той тым і займаўся, бо жыць жа неяк трэба было. Людзям, якія мелі вялікія надзелы зямлі, маецца на ўвазе ворнай, можна было і надзел мець, а хлеба з яго нават на адну сям'ю не назапасіць. Зямля неўрадлівая, пясочак жоўценькі. А калі яшчэ які драсён ды пырнік уваб'ецца, то і гаспадар і гаспадыня рукі ад стомы на ім пакладуць, а станоўчага выніку не даб'юцца. Нестае хлеба ад восені да вясны, і ўсё. Хоць ты плач, хоць забівайся — нічога гэта не дасць, акрамя лішніх перажыванняў, якіх і так болей чым дастаткова было ў тагачасным жыцці вяскоўцаў. Яшчэ добра, калі ранняя вясна пачнецца, калі лебяда, шчаўе ды крапіва з'явяцца на паверхні. Гэта ўжо хоць нейкае, а падспор'е ў харчаванні людзей.

Але нельга забывацца і пра тое, што не ўсе вяс-

коўцы апрацоўвалі зямлю, ці, як даўней казалі, «сядзелі на зямлі». Былі і такія, якія займаліся нейкімі пабочнымі рамёствамі. Да іх адносіліся і яўрэі, якіх надзвычай многа ў тыя часы было ў нашых ваколіцах. Ім жа не дазвалялася даўней сяліцца ў буйных гарадах, і ўвогуле ў гарадах, а толькі ў мястэчках і вёсках. Прычым абавязкова рабілася агаворка-папярэджанне, што калі наспеюць нейкія хрысціянскія ці каталіцкія святы, то яўрэйскаму насельніцтву забаранялася прысутнічаць у месцах адпраўлення службы ці там, дзе збіраліся гараджане і местачкоўцы на свае пагулянкі.

Праўда, і яўрэі рук не апускалі, спрабавалі неяк выкручвацца. Добра ведаю, што бралі зямлю ў арэнду, але самі яе не апрацоўвалі, а наймалі шматлікіх парабкаў на самыя цяжкія работы. Распавядалі, што такія арандатары былі самымі лютымі на свеце. Дралі з бедных наймітаў не адну шкуру. Болей таго, самі нічога не рабілі, а толькі вылічвалі, як гэта надуць працаўніка ды прыбытак найбольшы мець. Грошы лічылі вялікія, а парабкам ледзьве на вопратку такую-сякую хапала ды з вады на хлеб перабівацца. Ішлі да іх служыць вяскоўцы, якім некуды было дзявацца.

Але ж і яўрэі не ўсе былі багатымі і заможнымі. Далёка не кожны меў гэтулькі грошай, каб узяць зямлю ў арэнду, каб заплаціць за яе, можа, тысячны задатак адразу. Што і сёння, гэта была вялікая сума. Самі яўрэі яўрэяў да сябе ў работнікі не бралі, гаварылі, што лянуюцца і працаваць не любяць. А дзе ж гэта вы бачылі, каб яўрэй на працы парваўся, ды яшчэ на каго іншага згінаючыся? За ўсю гісторыю такога, мабыць, ніколі не здарылася!

Вось і атрымлівалася: на зямлі не працавалі, у парабкі не бралі і самі ісці не жадалі. Як жа тады сям'ю пракарміць? Але і тут яўрэі своеасаблівае выйсце знайшлі. Што ж, вы думаеце, яны зрабілі? А вось што. Пачалі па дробных мястэчках і вёсках сяліцца і трымаць там то корчмы, то лаўкі, то майстэрні, дзе акрамя самога гаспадара яшчэ ягоныя шматлікія дзеці гарбаціліся, насілі па сялянскіх хатах усялякія тавары, якія недзе далёка куплялі крыху танней, чым прадавалі, і жылі за прыбытак. Селянін не селянін жыў у вёсцы, бо на зямлі і дня не працаваў, але вяскоўцы іх не праганялі, бо ўсё ж патрэбную справу такія яўрэі рабілі: было дзе і чарку пры нагодзе

выпіць, і пагаманіць-пасядзець у карчомцы доўгімі вечарамі, ад цяжкай працы адпачываючы, ды і калі грошай у кішэні не было, то карчмар мог напавер даць ці збожжам або якімі іншымі харчамі ўзяць.

Карчомка, яна ж раней для селяніна вельмі многае азначала. Дзе можна было спакойна душу адвесці? Толькі там. Сядзеш сабе, прыпрэшся да сцяны з тоўстых смалістых бярвенняў і паглядаеш, калі залатоўкі не маеш і выпіць таму няма чаго, за астатнімі, а то слухаеш уважліва, прыкінуўшыся добра лыкнуўшым. Чалавек жа, калі чарку-другую перакуліць, то перад любым душу ўласную выверне, спрабуючы выплакацца. Цвярозаму, вядома ж, не хочацца, ды і сорамна плакацца, што нічога за душою не маеш, а павесялеламу ад гарэлкі — усё роўна.

Навіны таксама самыя свежыя толькі ў карчме пачуеш, а то і станеш сведкаю якой падзеі, асабліва калі жонка прыйдзе забіраць сваю «моцную» палавіну, якая ўжо і не гэтак моцна трымаецца на нагах, але ўсё ж спрабуе супрацьпаставіць сябе жанчыне. Слова-другое, глядзіш, і бойка пачалася. Ды яшчэ якая! З лаянкай, з абразай, з «пажаданнямі» такога, чаго і ворагам не жадаюць, з паказам найбольш адпавядаючых гэткай сутычцы месцаў на ўласным целе. Тады тыя, хто яшчэ здольны быў нешта разумець, качаліся з рогату, гледзячы на выпадковае прадстаўленне.

У нашай вёсцы была карчма. Стаяла ў канцы паселішча, перад раздарожжам, там, дзе народу заўсёды болей бывала. Ці то праезджы які, ці то падарожны, але ж абавязкова зверне, каб перакусіць або пераначаваць ды з раніцы далей рушыць.

Назву ж таксама з-за яўрэйскага занятку вёсцы далі — Чэрнеўка. І вось як гэта ўсё атрымалася.

Мы ўжо з вамі даведаліся, чым тыя бедныя займаліся, якія грошай не надта многа мелі, а то і ўвогуле ў іх не было. Жыў і ў нас тут адзін такі. Звалі яго Шлёма. Сям'я вялікая ў яго была, відаць, і сам не ведаў, колькі ўсяго дзяцей, а калі і ведаў, то як завуць кожнага з сыноў і дачок — забываўся. Кінецца ён туды, каб нешта збарышаваць,— занята ўсё, падасца ў іншы бок — там ужо іншыя яўрэі працуюць. Пачаў па людзях дзяцей пасылаць пабірацца. Яўрэі, то яны хоць і бедныя, але пабірацца не хадзілі, лічылі гэта ніжэй уласнага гонару. Шлёму, бедалагу, ужо

нічога рабіць не заставалася. Ведаюць людзі, чые гэта дзеці, хто скарынку хлеба дасць, хто гарнец збожжа ўсыпле. Так і перабіваліся. Сам жа гаспадар страціў усялякую надзею на тое, што недзе працу ці занятак нейкі знойдзе.

Сядзіць неяк вечарам у хаце, гаротна галаву апусціўшы, і за стол сядаць адмаўляецца, гаворыць Сары, што еў ужо. Бо і дзецям усяго па нейкай лыжцы перападзе, а калі яшчэ і ён, дарослы, улепіцца, то зусім есці не будзе чаго.

Перакусілі дзеці ды давай па хаце галёкаць. А якая там хата! Пара крокаў у шырыню і столькі ж у даўжыню! Потым большыя пачалі меншых сажай мазаць і смяяцца пры гэтым:

— Чарнец! Чарнец! Чарнец, дзе чорнага набраў?!

Крыкнуў Шлёма на дзяцей:

— Ой, што гэта вы? Спаць кладзіцеся! Заўтра па вуліцы бегаць будзеце! Ой, каму гэта кажу?!

Паслухаліся тыя бацьку і заваліліся на суцэльныя палаці, што былі ўздоўж сцяны прыладкаваны. Неўзабаве засаплі ўсе насамі, і ў будыніне запанавала цішыня. Толькі гаспадару не спіцца. Думае, чым жа заўтра дзяцей карміць будзе, дзе хоць кавалачак хлеба ды пару бульбін перахапіць. І тут у галаву яму ўбіліся словы, якія дзеці вечарам крычалі. Падхапіўся, ніба варам абліты, і ўскрыкнуў:

— Сара! Сара, паслухай! Паслухай, што я прыдумаў!

— Ой, ратуйце,— азвалася тая,— ратуйце, што гэты дурань сярод ночы ўздумаў!

— Ды я зусім не тое рабіць збіраюся, дурніца! — зазлаваў Шлёма.— Уставай, штосьці пакажу. Дапаможаш мне, бо аднаму нязручна будзе!

Хоць і нехаця, але Сара ўстала і пашлэпала за мужам да печы. Запалілі газнічку, і Шлёма стаў у нейкі чарапок саскрабаць сажу. Жонка не магла дацяміць, што да чаго робіцца, але маўчала, каб не ўздымаць вэрхал, не будзіць крыкам дзяцей. Тым часам гаспадар ужо нешта боўтаў у гаршку і пасміхваўся ад задавальнення:

— Цяпер, Сарачка, мы з табою выратаваны! Цяпер выратаваны!

— Ад чаго? — ніяк не магла зразумець тая.

— Ад голаду! Цяпер і ў нас хлеб і да хлеба кожны дзень будзе!

Толькі потым, скончыўшы сваю справу, Шлёма распавёў жонцы, што гэта за дзіўны раствор ён рыхтаваў у такі позні час:

— Здагадалася, чым мы далей карміцца будзем, жоначка? — не мог схаваць свайго задавальнення яўрэй.— Будзем фарбаваць тутэйшым людзям вопратку, іншыя якія тканіны і рэчы. Разумееш? Чэрніць іх будзем!..

— Чэрніць, чэрніць,— перадражніла яго Сара,— лепей спаць кладзіся. Раніцай разбяромся, што з гэтага ўсяго атрымалася...

Вось з таго самага часу і стаў Шлёма вяскоўцам фарбаваць рэчы. Выедзе з двара на маленькім коніку ды пакрыквае:

— Каму чэрніць! Каму чэрніць!

Вось адтуль і пайшла вёска Чэрнеўка.



# БЁРАЗІНО

Раней усялякія цікавыя гісторыі здараліся. Людзі верылі ў тое, што ўсё навокал жывое, што ўсё дыхае і замірае, ажывае і ўпадае ў працяглы зімовы сон, каб зноўку абудзіцца і ўскаласіцца вясною, разам з надыходам цёплых дзён. Можа, яны і лепей жылі ад таго, што не лезлі куды не трэба, не злоўжывалі даверам прыроды, чуйна ўспрымалі яе, абагаўлялі, пакланяліся, і за гэта яна іх падтрымлівала, пасылала толькі ўсё добрае. Вось у той час недзе і адбываліся падзеі, пра якія мы будзем з вамі весці гамонку.

Жыў у адной заможнай сям'і бедны парабак. Наняўся да гэтых гаспадароў гадоў колькі таму назад і працаваў-гнуў спіну на іх. Не надта багата вясковец яму і плаціў: даваў хлеба і якой нішчымнай капусты, каб работнік зусім не знясілеў ды ногі не працягнуў. Адчуваў, што калі чалавека не карміць, то ён нічога і не зробіць. Сёння надарвецца, перапрацуецца, не адыдзе ягонае цела за кароткую ночку, не адновяцца сілы, дык і з раніцы парабак будзе хадзіць як сонная муха, нават бзыкаць не здужае.

Звалі хлопца таго Мартынам. Даўней такія імёны былі амаль паўсюдна, гэта іх пазней іншыя змянілі, сучасныя.

Працуе той парабак, працуе, сам сабе то песню якую нудлівую зацягне, бо весяліцца ж падстаў не было асаблівых, то гаварыць з валамі ці з конікам пачне, каб неяк смутак развесці. Што самае дзіўнае, то жывёла нібы адчувала душэўную цеплыню работніка і ласкава фыркала, калі ён пра нешта задуменна разважаў-гаманіў, побач ідучы. Адпачынак кароткі ў такога чалавека. Калі ўдзень гадзінку-паўтары перадрэмле дзе цішком, бо гаспадара побач няма, то гэта надзвычай добра. А калі той злыдзень наглядае, то нават не прыпынішся, каб дух перавесці, адразу ж шыпець пачынае:

— Чаго прыпыніўся, Мартынка? Яшчэ сонейка з-за лесу не ўзнялося, а ты ўжо адпачываць уздумаў. Хіба ж за гэта я табе такую плату вялікую плачу?

Плюне толькі моўчкі хлопец сабе пад ногі з агідай ды прашэпча, сагнуўшыся:

— Добразычлівец ты мой... З жывога шкуру спусціў бы, каб толькі кім замяніць было, бо сам ты працаваць і не ўмееш, і не жадаеш. Прызвычаіўся чужымі рукамі жар заграбаць. Ніякая трасца да цябе ў гаспадарку не ўваб'ецца...

Вось такая жытка ў бедалагі-парабка была. І мучыцца штодзень, і пакутуе, але ж і падацца болей няма куды. Навокал такія самыя прыгнятальнікі. І калі ў гэтага ўжо неяк прызвычаіўся, то на новым месцы давядзецца прыціраццa, прыстасоўвацца да нораву заможных наймальнікаў. Ды і гарантыя дзе, што тыя лепшыя будуць? Таму даходзіць да вечара і ледзьве дацягнецца да гумна, дзе спаў на сене. І не памятае, як сон на галаву зваліцца. Пеўні першыя крыкамі неба распалавіняць, а ён ужо топчацца, нешта па чужой гаспадарцы робіць.

Аднаго разу прыйшоў ён з поля і сеў ля свайго драўлянага ложка. Можа, не гэтак стаміўся, як звычайна, а можа, надвор'е на настрой паўплывала, але не заснуў. Сядзіць ціхенька, думае аб нечым. І тут яму ў галаву думка незвычайная прыйшла: «Цікава, у майго гаспадара і жывёлы не надта многа, а мяса кожны дзень ядуць. Адкуль ён усё гэта бярэ? Што ж гэта такое атрымліваецца? Нешта тут нячыстае, хоць бы вядзьмарствам не падыхнула...»

Заснуў з трывожным сэрцам, але з таго вечара пачаў незаўважна прыглядацца да багатых вяскоўцаў, што ды дзе яны парабляюць. Каб кожны дзень дома сядзеў, то гэта проста было б зрабіць, а то ж усё ў працы і ў працы, няма вольнага часу назіраць. Ды і гаспадары, мабыць, нешта адчувалі, бо ўсё ішло паранейшаму — спакойна, але мяса са стала не знікала, а наадварот, ягоная колькасць значна павялічылася. Мартын ужо спецыяльна вачэй не змыкае, хоць і цяжка такое рабіць. І што ж вы думаеце, мае даражэнькія? Ночы аднае прачнуўся парабак і адчувае, нібыта нехта за ім цікуе. Ускінуўся хуценька і бачыць — у хаціне святло яркае гарыць. Ён падкраўся неўпрыкметку да акна і стаіўся. Чуе неўзабаве голас гаспадыні:

— Мо б гэта ты, Панаска (Панас — так яго звалі, таго злыдня), збегаў на гэты раз да Антося з далёкага паселішча. У яго, гаварылі мне ўчора падарожныя, такія буйныя і сытыя авечкі ды коні, каровы ды валы, што дзіву суседзі даюцца, як такое можна выгадаваць на звычайным сене ды картоплі ў хляве. Трэба і сапраўды праверыць. Мала што там казаць могуць. Нехта зайздросціць ці спецыяльна хоча пазабаўляцца. А не, дык і нам выгада, галадаць не будзем, з нішчымнага хлеба на ваду перабівацца,— і залілася дробненькім смехам, ды такім незвычайнажудасным, што ў парабка мароз па скуры пабег.

Адхінуўся Мартын. Што ж вы думаеце? Калі такое пачуеш, то і знепрытомнець запроста можна, не тое каб перапалохацца. Хацеў спачатку ўцякаць, аж цікаўнасць перамагла — утрымаўся на месцы. І потым не пашкадаваў, што гэтак зрабіў, бо далейшы лёс парабка ад гэтага рэзка перамяніўся. Стаіць, і зноў да яго словы малазразумелыя пакуль што даносяцца:

— Глядзі, Панаска, каб ніхто не здагадаўся, бо тады канец надыдзе нашаму дабрабыту, нашаму багаццю і ўсяму станоўчаму, таму, чаму суседзі зайздросцяць... Каб толькі і надалей ціха адбывалася... Зайздроснікаў навокал, сам ведаеш, мноства, а жыць нам жа трэба...

На гэты раз засмяяўся ў адказ гаспадар. Засмяяўся нейкім казліным смехам: драбнюткім, звонкім. Потым яшчэ разоў колькі кірхануў і гаворыць:

— Не ўпершыню мне, Тэкля (гэтак жонку звалі),

такую справу рабіць. Ды і хто зараз убачыць — уся зямля навокал спіць, а тыя жывёлы і звяры, дрэвы і камяні, якія не спяць, нічога людзям давесці не могуць, бо мовы не маюць.

Сказаў такія словы Панас і давай ужо ўдваіх з Тэкляй смяяцца. Вырагаталіся нарэшце і зноў гамоняць:

— Сапраўды, пабягу да Антося, гляну вокам, што да чаго. Лепей самому пабачыць, чым потым шматлікіх апавядальнікаў слухаць. Ты спаткаць на ганак, як заўсёды, выходзь, далей ісці не трэба, каб падазрэння не выклікала сваімі паводзінамі ў вяскоўцаў.

Мартын стаіць пад акенцам, а ўсярэдзіну глянуць баіцца, хоць і парываўся ўжо разоў колькі. Нарэшце адважыўся і зірнуў. Зірнуў і... аслупянеў. Панас-гаспадар стаяў пасярод хаты голы, як маці нарадзіла, і на ягоным целе імкліва выраслі густыя валасы, а сам ён ператвараўся ў... ваўка. Яшчэ колькі хвілін, і самы звычайны лясны драпежнік стаяў пасярод пакоя. Тэкля прыдзірліва глядзела на яго, каб знайсці якую-небудзь зачэпку і тут жа выправіць недакладнасць, зрабіць усё як у самай сапраўднай прыродзе.

— Ну, то я паджгаў,— мовіў гаспадар-воўк і пакіраваў да парога.

Парабак ламануў у гумно колькі сілы было. І трэба сказаць, што зрабіў гэта своечасова. Ціхенька ляснулі дзверы, і на парозе паўстала гаспадыня, услухалася, агледзелася і сказала:

— Нікога няма. Давай.

Воўк імкліва выскачыў і паляцеў у начны лес. Мартын вачэй да раніцы не сплюшчыў. Напалохаўся да смерці, не ведае, што далей рабіць, як быць. А з іншага боку, яму ж надта цікава пабачыць, як гаспадар дамоў на досвітку вернецца, што прыцягне на плячах і ў якім абліччы будзе. Марудна цягнецца час, асабліва калі нечага чакаеш. Але нарэшце заспявалі пеўні ў трэці раз, і неба над акрайчыкам лесу пачало днець. Ажно падалося хлопцу, што чуе нейкі шум. Вылез ціхенька з гумна і за калодзеж схаваўся, каб бліжэй да дзвярэй хатніх быць і добра бачыць, што ж адбудзецца. Дзверы хаціны адчыніліся, і Тэкля ў начной кашулі села на парог. Сядзіць, пахістваецца і ў той бок паглядае, куды яе гаспадар пабег. Ужо трэба было б яму і вярнуцца, бо золак здалёку ўздымаўся. Ад хвалявання ўстала Тэкля і заўсміхалася шчасліва.

Парабак таксама туды вочы ўтаропіў і ўбачыў, што, можа, за крокаў трыста ад хутара воўк валок на спіне вялізнага барана. Падцягне крокаў з дзесяць і адпачывае, падцягне — і адпачывае... Кінулася гаспадыня яму насустрач, і ўдваіх хутка прывалаклі жывёліну ў двор. Пакінулі яе на траве, а самі ў хаціну пабеглі. Мартын падскочыў да акна. Бачыць, Панас з нейкай бутэлькі глынуў і з яго пачала густая воўчая поўсць ападаць на падлогу. Яшчэ хвілін колькі, і на тым самым месцы стаяў не звер, а чалавек, толькі надта знясілены, змардаваны. Здавалася, што ён ледзьве дыхаў. Але твар у ваўкалака быў задаволены:

— Тэклечка, каб ты толькі ведала, каб ты толькі бачыла, якая жывёла сытая ды вялікая ў Антося! Вось дзе нам спажыва на цэлы год будзе! Не глядзіць ніхто амаль за авечкамі, самі па сабе на блізкім лужку ля хаты пасуцца, таму і падабрацца да іх асаблівай цяжкасці не ўяўляе... Параўнай барана, што я на тым тыдні прынёс з Выселак, вось з гэтым! Гэта ж як шчанюка з дарослым сабакам раўняць. Вось дзе пажывімся! Зараз час не цягні, а прыхавай спажыву, я вечарам з ёю разбяруся. Ды на стол стаў што-небудзь, бо есці страшэнна хочацца. Паспаць таксама не перашкаджала б! Надта стаміўся ў гэты раз: і дарога далёкая, і цяжар на плячах вялікі. Глядзі, каб часам Марыську нашу не пабудзіць, бо яшчэ што западозрыць...

Пабег на працу Мартын, радуецца, што сёння цэлы дзень гаспадара побач не будзе, і перажывае таксама, як жа яму ад ваўкалака ў далейшым выблытацца. Гэта ж не просты вам чалавек, не звычайная душа, а пярэварацень, ён і спалох які напусціць можа, і заклён накласці страшэнны, які ніхто, акрамя яго самога, зняць не здольны, ды мала што! Паганяе валоў і спяваць ужо не можа. Трапечацца сэрца ў грудзях. Каму ж хочацца маладому, няхай сабе і парабку самаму беднаму, гінуць? Пашукайце дзе ў іншым месцы такога дурня.

А была ў тых гаспадароў дачка Марыська. Не падобная яна расла на бацькоў. Задуменная надта, спагадлівая, спачувала бедным і галодным, параненым і пакалечаным. Апошнім кавалкам хлеба гатова была падзяліцца, толькі каб старыя не сварыліся, а то калі такое заўважалі, то поедам яе елі. Папракалі, што хлеб не лёгка ў рукі даецца, каб з рук яго лёгка выпус-

каць. Паслухае яна, галаву схіліўшы, а потым плача горка, у двары дзе-небудзь прыхаваўшыся.

Аднаго разу яе ў такі момант і напаткаў выпадкова Мартын. Слова за слова, суцешыў дзяўчыну, і разгаварыліся неяк. Ведама ж, маладыя, яны заўсёды агульную мову знойдуць. А што ж вы думаеце, беднай Марысьцы лёгка даводзілася? Паспрабуйце ўсё ў душы трымаць: ні вам падзяліцца з кім знявагаю, ні выплакацца каму, ні ад каго спачування пачуць... Дрэнна так чалавеку жыць, ой як дрэнна. Таму, можа, упершыню пачуўшы спагадлівыя словы, і вырашыла адкрыцца парабку. Глядзіць на хлапчыну, а ў самой вочы то высахнуць, то слязьмі зальюцца. Потым вырашыла расказаць усё тое, пра што дакладна, яшчэ з дзяцінства, ведала:

— Каб ты толькі ведаў, Мартынка, як мне ў гэтым доме жыць невыносна! Гэта ж мае родныя бацька і маці, а такія злачынствы здзяйсняюць! Мала таго, што ваўкалакамі робяцца,— гэта яны перанялі ад маёй бабулі, матулінай маці, дык яшчэ і крадуць у людзей што толькі могуць. Усё дахаты валакуць. Раней жа і маці бегала па начах, але аднаго разу паляўнічы нейкі агрэў добра, дык перастала пераўвасабляцца, баяцца стала, што жыцця гэтак дзе-небудзь пазбавіцца. Бацька ж не перастае. Вось і гэтай ноччу бегаў. Зноў у некага авечку ці карову задушыў. Ён думае, што я ні пра што не здагадваюся, што я маленькая і дурная. Не, даўно ўжо ведаю. З тых часоў, калі бабуля памерла і людзі не дазволілі хаваць яе цела на вясковых могілках, а толькі за агароджай, ды як падчас працяглай засухі забілі ў яе тры асінавыя калы. Сцвярджалі, сама пра гэта чула, што быццам бы бабуля па-ранейшаму цёмнымі начамі займалася сваімі жудаснымі справамі, а вось як прабілі мёртвае цела каламі, то назаўсёды супакоілася.

— Можа, гэта толькі нагаворы нядобразычліўцаў, Марыська? — не ўтрымаўся і перабіў яе хлопец.

— Ды не, што ты. Я спачатку таксама гэтак думала, нават калі мне ўжо напэўняка даводзілі. Але потым зразумела, што ўсіх на свеце можна падмануць, акрамя самой сябе. Вось так... Я ж то думала, што са смерцю бабулі ўсё знікне назаўсёды і болей не ўсплыве. Ажно дзе там! Бацька з маці перанялі. У іх дваіх справа яшчэ мацней завязалася. Ніякай літасці, ніякага спачування да людзей ніколі не мелі.

Дадумацца толькі — апошнюю авечку ці казу якую ў самага беднага селяніна ці няшчаснай удавы ўкрадуць і з'ядуць. Я, як даведалася, адкуль гэтае мяса пастаянна на стале, нават перастала на яго глядзець, не тое што есці. Як толькі ад іх выпутацца? Падкажы што-небудзь, Мартынка! Ты ж па людзях усё жыццё працуеш, наймаўся да многіх, можа, што ведаеш ці чуў, хто ад ваўкалакаў якія замовы або сродкі ведае?

— Пра ваўкалакаў-пярэваратняў я чуў, і многа, але пра тое, як іх на чыстую ваду выводзіць,— не ведаю. Трэба неяк паспрабаваць... Ведаеш, што мы будзем рабіць, раз ужо аб'ядналіся? Будзем сачыць, чым твае бацькі сілу сваю чароўную падтрымліваюць. Даведаемся, тады і пазбавіцца можна ад злыдняў.

— Добра, Мартынка, толькі ты мяне не кідай адну. Баюся я іх, нягледзячы на тое, што роднай дачкою даводжуся. Са свету звядуць, калі даведаюцца аб нашай змове. Не трэба пра гэта забываць.

З таго самага дня і пачалі наглядаць за Панасам Мартын з Марыськай. Як выбегаецца пярэварацень за ноч, то днём ледзьве ногі перастаўляе і сваю злосць тады на парабку вымяшчае. Крычыць, лаецца ўсяляк, а некалькі разоў нават заклёнамі спрабаваў абкласці, ды ў апошні момант стрымліваўся. Бедны хлапчына толькі зубамі паскрыпваў і кулакі сціскаў, але віду не падаваў. Даведаецца ці адчуе нешта гаспадар, то больш асцярожна дзейнічаць стане, тады ўжо не вырвешся да смерці з ягоных рук учэпістых.

Марыська таксама перад бацькамі, як толькі магла, за работніка ўступалася, хоць словам добрым спрабавала паўплываць на родных. Неаднойчы гаспадар, заўважыўшы такое, гаварыў:

— Што, можа, закахалася? Глядзі ў мяне, каб з гэтым галадранцам нават размоў ніякіх не вяла! Забараняю! Мы табе такога жаніха знойдзем, што суседзі з зайздрасці папруцянеюць! У нас для цябе пасаг сабраны, дай Божа кожнаму такі сабраць! Закахалася, відаць, закахалася?

Неяк дзяўчына не вытрымала і выпаліла ў адказ:

— А калі і закахалася, то што? Непрыгожы, можа, ён, непрацавіты? Ці які гарбаты або лайдак? Чаго вы так на чалавека гаворыце? Вы яго нанялі, але ж не купілі! Таму не забывайцеся, што ён, адпрацаваўшы, можа дахаты, у родную вёску, да сваіх людзей пайсці.

Такіх рэзкіх адказаў гаспадар не мог аспрэчваць і таму спрабаваў неяк загладзіць уласную віну перад дачкою:

— Не хвалюйся, дочачка, не хвалюйся, пажартаваў я, проста пажартаваў, а ты ўсё ўсур'ёз успрыняла. Ці ж можна так з бацькам размаўляць? Я ж толькі для цябе адной стараюся, начэй не сплю, а ты...

Вярнуўся аднойчы Мартын з поля. Гаспадароў у хаціне не было, адна Марыська. Заўважыўшы парабка, запрасіла зайсці. Калі той прыбег, то выпаліла нечакана:

— Я знайшла бутэльку з вадою, якую бацька п'е для таго, каб ператварыцца ў ваўка.

— Дзе яна? — запытаўся работнік.

— Зараз,— і дзяўчына палезла пад ложак. Праз нейкае імгненне выцягнула адтуль тую самую пасудзіну, якую бачыў у руках гаспадара і сам Мартын.

— Вось...

— Так, гэта тая самая бутэлька. Я таксама бачыў, як твой бацька з яе піў, калі ў ваўка пераўвасабляўся.

— Цяпер я з імі зраблю, што пажадаю,— змрочна вымавіла Марыська.

— Ты што гэта, не забывайся! Каб на іх шлях не стала. Адно зло другое спараджае! Нельга тут дурнога задумваць, бо мы не ведаем, якая страшная сіла ў сапраўднасці ў гэтай вадзе ўтрымліваецца...

— І то праўда,— пагадзілася дзяўчына.— Што ж рабіць з гэтай бутэлькай будзем?

На некаторы час яны замаўчалі абое. Потым Марыська нібы ачнулася:

— Прыдумала, Мартынка, прыдумала! І гора ні маім родным, ні чужым людзям не прычынім! Сябе выратуем і бацькоў пакараем за шматлікія злачынствы. Нават дамо шанц пазбавіцца ад злых намераў!..

— А што ты рабіць хочаш? — запытаўся панура Мартын.

— Што рабіць? — перапытала дзяўчына.— А вось што. Зараз мы з гэтай бутэлькі тую жудасную вадкасць перальём у якую-небудзь іншую пасудзіну, а сюды нальём чыстай вады, якая ніякай чароўнай сілы мець не будзе і не дасць магчымасці болей маім бацькам тварыць благое людзям.

— Так, проста і знаходліва,— пагадзіўся парабак.— Вось дзіва будзе, калі яны вернуцца і гаспадар зноўку пачне збірацца на паляванне!

Задаволеныя хлопец з дзяўчынай весела засмяяліся і кінуліся пераліваць вадкасць, бо з хвіліны на хвіліну маглі прыехаць Панас з Тэкляй.

Пахаваліся і сачыць пачалі, што ж будзе далей адбывацца. Але не дачакаліся гаспадароў. Хлопец пайшоў спаць у гумно, а Марыська за печчу ўладкавалася. Мартын спакойна, ці не ўпершыню за ўсе тыя дні, калі даведаўся, кім на самай справе былі бацькі дзяўчыны, заснуў. Спіць сабе, і не сніцца нічога. Толькі чуе праз сон, катурхае яго нехта. Прахапіўся — бачыць, сядзіць ля яго Марыська і гаворыць:

— Мартынка, уцякаць адсюль трэба. Каб ты пабачыў, што там робіцца...

— Дзе?

— У хаце. Бацька раве, нібы звар'яцелы, і па падлозе качаецца, а маці валасы на сабе рве і нешта незразумелае крычыць. Баюся я болей тут заставацца. Пабеглі ўдваіх.

— Далёка не ўцячом, людзі падкажуць, дзе нас знайсці.

— Я пра гэта ўжо падумала. Мы вады той вып'ем і ў ваўкоў ператворымся, а калі далёка адбяжымся, то зноў глынём і людзьмі назад станем.

— А што...

Так і зрабілі. Бягуць сабе два дзіўныя ваўкі і пачалавечы размаўляюць. А ў ваўкоў жа ногі хуткія. Нездарма ў народзе гавораць, што ваўка ногі кормяць. За ноч колькі вёрстаў прабеглі — і палічыць цяжка. Пад раніцу прылеглі адпачыць, і дзяўчына гаворыць:

— Можа ўжо вады вып'ем?

А хлопец адказвае:

— Рана яшчэ, трэба далей адбегчыся. Мала вачэй людскіх нас бачыла, ды ўсё роўна хавацца больш старанна будзем.

Падняліся і далей паджгалі. Цэлы дзень да вечара беглі. Ваўчыца зусім прытамілася, ледзьве ногі суне. Ляглі адпачыць, а яна азірнулася і ціха мовіла:

— Паслухай, Мартынка, а можа ўжо давай далей і не пабяжым, вып'ем вады ды тут і застанемся? Паглядзі, як хараша навокал. Беразна як. І рэчка, і беразна. Жыць будзем спакойна, працаваць жа мы ўмеем, астатняе з часам прыйдзе.

Пагадзіўся былы парабак, і засталіся яны на гэтым прыгожым месцы, аблюбаваным дзяўчынай. Пазней ад слова таго дзіўнага «беразна» рака Бярэзіна пайшла і наш горад — Беразіно. Так вось людзі гавораць.

## БЕЛІЧАНЫ

У нас па-рознаму даўней казалі, чаму вёску так завуць. Добра адна бабка распавядала, старэнькая была, мо гадоў сто мела, а то і болей, але на памяць ніколі і нікому да самай смерці не скардзілася. Усё ведала, чула добра і меркавала цвяроза. У яе дачкі часта ў хаце на вячоркі моладзь збіралася. Як збяруцца, пасядуць, песні пяюць, танцуюць, некаторыя выгляд робяць, што працай якой заняты, ды дзе там! Потым бабку тую пачынаюць прасіць распавесці якую былічку. Аднаго разу я і чула, як старая пра тое, адкуль вёска пайшла, гаварыла. Памятаю, прыкладна так падзеі разгортваліся.

Жылі-былі два суседы побач. Адзін быў надта ж багаты, а другі, наадварот, надзвычай бедны. Дзеці ў багатага смачна елі, апраналіся прыгожа, а ў беднага, самі ведаеце. Паплача маці, гледзячы на галодных і абарваных малых, і спаць іх укладзе, а яны не засынаюць ніяк, бо есці ж хочацца. Есці-то хочацца, ды дзе ўзяць... У таго багатага, колькі ні прасі, усё роўна нічога не вымаліш. Калі ж якую скарынку ненарокам кіне, то потым адпрацоўваць прыйдзецца ў сто разоў болей. А дзе ж тае сілы набрацца, каб сваё поле, няхай сабе і неўрадлівае, не закінуць? Трэба ж нейкую бульбіну пасадзіць, жыта пасеяць. Так вось і перабіваўся бядняк з дня на дзень. Дзеці падрасталі, разумець пачыналі, што нялёгка бацьку неяк становішча выправіць, капейку лішнюю зарабіць, зрабіць так, каб збожжа ў сусеках не пераводзілася. І што самае галоўнае, дзеці ў гэтага чалавека былі надзвычай шчырымі, спагадлівымі. У іх і няма нічога, а яны ўсё роўна хоць яйкам птушыным, калі дзе ў полі знойдуць, падзеляцца. Лягчэй ад такога на душах станавілася ў маці з бацькам, як заўважалі, што дзеці не скваппныя, не панурыя растуць, хоць і нестае ім пастаянна, як мы ўжо казалі, ні ежы, ні вопраткі.

Мабыць, і гэтаму пазайздросцілі багатыя сусед з суседкай. Бо вось што здарылася аднаго разу. Людзі

праўду казалі, што яны валодалі чорным чараўніцтвам: заклёны розныя насылалі на вяскоўцаў. Але бедны сусед пакуль што на сабе такога не адчуваў і таму асабліва не верыў. Ведама ж, язык без касцей, што хочаш, тое і скруціш. Толькі сутыкнуцца яму ўсё ж давялося ўшчыльную: амаль усе дзеці ледзьве не памерлі ад заклёну. Але раскажу вам пра ўсё па парадку, каб зразумелі ды ведалі, што і гэткае можа здарыцца.

У багатага быў не толькі вялікі агарод, але і сад уходжаны. Чаго там толькі не было. Глядзяць, здаралася, дзеці бедняка галоднымі вачыма ў той бок, дзе голькі ажно гнуцца ад пладоў, а багацеі рагочуць задаволена, нават гнілушкі не дадуць, не тое каб добры яблык ці грушу прапанаваць. А дзеці ж ёсць дзеці. Каб жа яны ўсё гэтак рабілі, як іх дарослыя вучаць ці як просяць.

Аднаго разу ішоў старэйшы сын бедняка ўздоўж саду. А над галавою вісяць гэткія вішні спелыя, сакавітыя, што здаецца, ажно патрэскаюцца самі па сабе. Азірнуўся хлопец раз-другі — няма нікога. Падумаў, прыцішыў хаду і не вытрымаў. Працягнуў руку і сарваў дзесятак вішань. Азірнуўся зноў і пайшоў паспешліва ў хату. Зайшоў, а там якраз за стол усе сядаюць: бацька з маці, малодшыя брацікі і сястрычкі. Усміхнуўся ён і гаворыць:

— Эх вы, малеча! Каб толькі ведалі, што я вам прынёс, то за стол ніколі без мяне не селі б! Эх, каб вы толькі ведалі!

— А што ў цябе там такое? — адразу ж падскочыла да хлопца сястрычка, якую ўсе не Лізкай, а Ліскай звалі, гэткая хітрая дзяўчынка расла.— Скажы толькі мне, а я нікому не прызнаюся. Добра?..

— Не, хітранькая, не скажу. Вы лепей самі здагадайцеся.

Але як ні гадалі, як ні спрабавалі, ніхто і блізка не мог падумаць, што брат такі гасцінец прынёс, з поля ідучы.

Нарэшце маці не вытрымала і папрасіла:

— Сынок, не здзекуйся болей над малымі, не трэба так, бо і есці ўжо не пасядуць...

Бацька таксама, ласкава пасміхваючыся, вымавіў:

— Пакажы, сынок, ім усё, няхай супакояцца.

Тады хлопец асцярожна расціснуў руку і паказаў

сваім родным, што там. Малыя завішчалі ад радасці:

— Мне дай!

— І мне дай!

— Мяне не забудзь!

— Я ж таксама цябе заўсёды слухаюся і дапамагаю!

Палічыў тады старэйшы ягады, на стале рассыпаўшы, і пароўну падзяліў, нават бацьку з маці па адной адклаў, але тыя адмовіліся і меншым паклалі. Сказаў гаспадар, спахмурнеўшы:

— Вы, дзеткі, лепей не чапайце ягоных вішань, бо мала што можа здарыцца, потым ліха не абяромся...

— Дык мы ж, тата, не кожны дзень, і ўсяго толькі дзесятак вішанек тут.

Паелі ўсёй сям'ёй, дзеці ягадкі праглынулі і пайшлі па сваіх справах з хаты ў розныя бакі. Сабраліся вечарам, пагаманілі ды спаць заваліліся, бо назаўтра раніцай уставаць трэба, няма часу асабліва разлежвацца. Ажно ноччу гаспадару падалося, што нехта плача. Прачнуўся, прыслухаўся і сапраўды, самая меншанькая дачушка плакала ў сне. Падышоў да яе і спалохаўся: бедненькая, ручкамі часала-драла сваё цела, якое ўжо крывавіла, але яна праз сон не адчувала, мабыць, страшнага болю. Разбудзіў тады жонку. Тая адразу нібы адрэзала:

— Гэта заклён! Заклён на вішнях быў! Як жа мы не прадбачылі гэтага?! Вішні не трэба было даваць нашым родненькім есці! Ой, Божачка, што ж гэта будзе?! Каб хоць на іншых не перакінулася! Давай астатніх глянем.

Агляд не даў нічога радаснага, бо і тыя дзеці, якія спалі на агульных палацях, таксама часаліся, раздзіралі цела ад невыноснага свербу. Старэйшы хлопчык не спаў, а ляжаў з шырока адкрытымі вачыма і, калі ўбачыў падышоўшых бацькоў, заплакаў і сказаў:

— Гэта я ва ўсім, тата, вінаваты. Я ж хацеў як лепей... Не ўтрымаўся, каб не сарваць, бо меншых хоць нечым парадаваць хацеў. Хай бы толькі на мяне хвароба напала, а то ж на ўсіх.

Вымавіў гэтыя словы хлопчык і горка-горка заплакаў.

Што ж бацькам рабіць, гледзячы на такое? Заплакалі і яны. Толькі хваробы жудаснай ім і не хапала ў хаціне.

Раніцай дзецям стала яшчэ горш. Яны ўжо пачалі

трызніць, клікаць на дапамогу. Бацька з маці не паспявалі бегаць ад аднаго да другога, але адзінае, што яны маглі даць хворым,— гэта конаўку з халоднай вадою. Ды і тая амаль уся вылівалася, бо дзеці не ўсведамлялі, што яны робяць.

Цэлыя суткі гэтак доўжылася. Гаспадары з сіл выбіліся. Селі, бедныя, на парозе і рукі ўжо апусцілі. Чым далей дапамагаць — не ведаюць. Маці ўголас заплакала і стала на калені перад абразамі. Як яна толькі ні прасіла Бога, як толькі ні маліла яго, але маляваны Усявышні не выказваў спачування. Гора, вялікае гора запанавала ў гэтай будыніне. Ужо зноў вечар настаў. Змрок пачаў апускацца на падвор'е. Вялікі страх нёс ён гэтым людзям. Чакалі самага горшага. І ў гэты самы момант пачулі, ці мо спачатку падумалі, што падалося, стук у дзверы.

— Хто там ідзе? — запытаўся гаспадар.— Заходзь, не да цырымоній тут...

Дзверы адчыніліся, і на парозе паўстаў сівы дзядок з хлапчуком-павадыром.

— Дзень добры, людзі, вам у хату! Хай толькі радасць у вас гасцюе, бяда-гора абыходзіць.

У адказ голасна заплакала-застагнала гаспадыня.

— Дзеду, дзеду,— пацягнуў старога за крысо хлапчук,— у іх гора... Гора ў іх вялікае...

— Што такое? Што здарылася? — занепакоіўся старац.— Раскажыце мне, каб я ведаў, то, можа, дапамагу.

— Дапаможаш? Эх, чалавеча... Ды тут, мабыць, толькі Усявышні ўжо дапаможа.

— І тым не меней раскажыце,— не адставаў падарожны.

Выплакалі-вылілі яму душы гаспадары. Не толькі ад чаго дзеці захварэлі, але пра ўсё падрабязна распавялі, нічога не прамінулі.

Горка ўздыхнуў стары. Устаў, выпрастаў згорбленыя плечы і звярнуўся да малога:

— Падвядзі мяне, унучак, да хворых, паглядзець хачу.

Пастаяў старац над дзецьмі, пакратаў іх, каго за рукі, каго за гарачыя галовы і ціха прамовіў:

— Не ўсё так страшна, як вы мне сказалі, не ўсё... Магу вам крыху нават дапамагчы. Калі б прыйшоў пазней, то сапраўды было б позна.

Гаспадары прыўсталі, хутчэй ад нечаканасці таго, што пачулі, чым ад нечага іншага.

— Унучак, падай мне торбачку. Тую, маленькую, што на лаўцы я пакінуў. У ёй ёсць сродак, які вылечыць хворых.

Стары дастаў з торбы нейкі дзіўны мох і працягнуў яго гаспадыні:

— Трэба нагрэць вады і ўкінуць яго ў кіпень. Няхай пакіпіць, а потым адварам тым націраць хворыя месцы. Некалькі разоў на ноч. Давай, гаспадынька, грэй ваду. Бялец гэта. Мох такі белы, што на высокіх балотах расце. Вы бачылі, толькі не ведаеце, ад чаго ён дапамагае. Ад таго скулля, што целы вашых дзетак пакрыла, самы верны сродак. Праз тыдзень вясёлыя вашы блазняты бегаць будуць. Грэйце ваду, я сам ноч прыглядаць буду за хворымі, а вы паспіце крыху. Глядзець на вас нельга. Счарнелі ад стомы ды ад адчаю.

Нагрэла вады гаспадыня і хацела побач з палацямі сесці, каб назіраць за тым, што стары падарожны рабіць будзе, але заснула нібы забітая.

Раніцай прачнуліся муж з жонкай і здзівіліся: у хаце ціха, спакойна, ніхто не трызніць. Падскочылі да дзяцей, а тыя спяць смачна, рукі раскінуўшы, як і раней было. Пачалі яны дзякаваць старому, а той пасміхваецца і кажа:

— Ды не я гэта зрабіў, бялец дапамог. Яго многа на вашым балоце. Насушыце і іншым добрым людзям дапамагайце. І пайшоў сваёй дарогай.

Пасля гэтага ўся сям'я перабралася жыць бліжэй да балота, і паселішча назвалі спачатку Бялец, а потым ужо стала Белічаны.

## ВЫСОКАЯ ГАРА

Тады, мабыць, так усё і адбывалася, што кожнаму паселішчу, вялікае яно было ці малое, давалі назву па нейкай канкрэтнай прыкмеце ці прычыне. Як нам пачнуць, бывала, згадваць старыя людзі мясцовыя назвы не толькі вёсак, але і вуліц, завулкаў, урочышчаў, то хоць ты падай са смеху! Чаго там толькі не было і каго не згадвалі: і Свінюховічы, і Бляўковічы, і Цюцькавічы, і Свістуны. А то яшчэ пакажуць нейкага чалавека і будуць сцвярджаць, што ён пайшоў

непасрэдна з роду, які першым тут пасяліўся, ці з той сям'і, якая менавіта і пабудавала першыя хаціны на гэтай зямлі. Яно-то і цікава ж надта ведаць пра даўнейшае, пра тое, што ўжо ніколі да нас не вернецца. На паперы, бясспрэчна, застанецца, ды ў народнай памяці яшчэ там-сям захаваны карані радаводу.

У нас назва вёскі, як бачыце, прыгожая — Высокая Гара. Так, як некалі празвалі, так і да гэтага часу дайшло. Не часта здараецца такое. Некалі майму дзядулю апавядалі пра саму назву. Ён сцвярджаў, што людзі тыя сюды аднекуль перасяліліся. Хто яго ведае, ці ўсё праўда, але ж паслухайце. Як сам ведаю, так і вам перакажу.

Некалі надта часта войны на гэтай зямлі ішлі. Адкуль толькі захопнікі ні кіравалі на Беларусь ці праз Беларусь на іншыя княствы ды дзяржавы! Таму нашаму народу болей за іншыя перападала. Выбівалі людзей так, што на дзесяткі вёрстаў навокал жывой душы не заставалася. Толькі коміны ды парослыя бур'яном курганы сведчылі пра тое, што некалі тут квітнела жыццё.

І тады, калі тут падзеі крывавыя адбываліся, таксама мясцовых жыхароў паблізу не было, ды і быць не магло, бо тут яшчэ ніхто не жыў. Аднекуль з захаду найшло вялікае войска, ці то шведы, ці то французы, сказаць вам дакладна не магу. Старыя мне таксама нічога канкрэтнага адносна гэтага не гаварылі, можа, не ведалі, а можа, забыліся. Адным словам, прыйшоў нечаканы госць і лютаваў бязлітасна і крыважэрна. А хто ён, да якога народа належаў, гэта ўсё роўна. Дзейнічалі яны так: паб'юцца з княжацкай дружынай, а потым назад адбягуцца і давай шныраць па наваколлі, мірныя паселішчы адшукваць. Вось тады толькі трымайся. Добра, калі заранёй убачыць нехта і папярэдзіць вяскоўцаў, то хоць схавацца паспеюць, у адваротным выпадку — пераб'юць ні ў чым не павінных людзей або ў палон за трыдзевяць зямель павядуць.

Стаяла тут невялічкая вёсачка. Можа, усяго двароў з дзесяць ці крыху болей. Знаходзілася яна ў такім глухім месцы, што ворагі да яе ніякія дабрацца не маглі. Таму і жылі сяляне ціха-мірна, бяды-гора не ведаючы. Але неяк і ў іхнюю вёску прабралася страшная навіна. А здарылася ўсё наступным чынам: паляўнічыя надта далёка ад роднай мясціны

адышлі і ўжо збіраліся назад вяртацца, як на тура буйнога наскочылі. Дзе ж вы бачылі, каб людзі, якія на звяроў палююць, некалі ад здабычы адмаўляліся, тым болей ад такой жаданай! Давай яны бегчы за турам, а той уцякае. Вядзе іх усё далей і далей ад вёскі. Можа, з паўдня праследавалі звера. Нарэшце акружылі і давай з лукаў расстрэльваць, дзідамі ў яго кідаць. Забілі жывёліну і селі непадалёку адпачыць. Мяркуюць мужчыны, гледзячы на гэткую гару мяса і поўсці, як жа ўсё ўпарадкаваць. Самы стары і вопытны гаворыць:

— Трэба дваіх адправіць у вёску за падмогай, а астатнім, траім, тут заставацца і чакаць. Інакш нельга ніяк зрабіць. Самі столькі не дацягнем, а мяса кідаць шкада. Вось толькі хто пакіруе дамоў?

Пасядзелі, пагаманілі і вырашылі, што пойдуць двое самых маладых і вынослівых. Не паспелі тыя за дрэвамі схавацца, як падалося астатнім, што недзе нехта крычыць, на дапамогу кліча. Пасталі, слухаюць, адзін кажа:

— Не, падалося, відаць. Ды і хто тут можа крычаць, калі мы ад нашага паселішча далёка, а іншых ніколі не сустракалі ў гэтым краі.

Другі яго падтрымаў:

— Тыя хлопцы, што пабеглі, не маглі ж гарлаць. Ды і чаго? Не, падалося гэта нам, браткі, не іначай.

Зноў селі, нават драмаць пачалі. Толькі крык зноў пачуўся, ды ўжо больш выразны, адчайны. Нібы прутом якім паляўнічых падкінула, пераглянуліся трывожна. Нехта ціха мовіў:

— Цяпер не падалося. Я выразна чуў, што чалавек крычаў. Магу паспрачацца.

Але ніхто спрачацца і не збіраўся, бо астатнія таксама не сумняваліся ў тым, што чулі чалавечы голас. Старэйшы з мужчын яшчэ з хвіліну паслухаў і прапанаваў:

— Вось што, сябры, пойдзем на крык. Мала што можа там быць. Не зяхайце ратамі асабліва, пільнуйцеся. Можа, хто спецыяльна ў пастку такім манерам заманьвае. Трымайцеся напагатове.

Пайшлі амаль нячутна мужчыны, нібы на самага асцярожнага звера палявалі. Ажно крык зноў пачуўся, ды ўжо зусім побач:

— Дапамажыце, людзі! Дапамажыце, хто тут ёсць! Ратуйце! Дапамажыце, родныя! Дапа...

Не стрываліся паляўнічыя і паімчалі прама на тое месца, адкуль крычалі. Вылецелі на невялічкую паляну і ажно аслупянелі ад нечаканай сустрэчы: прама перад імі, на густой траве, валтузіліся некалькі цел. Імгненняў праз колькі разабралі — пара мужчынскіх і адно жаночае. Тая дзяўчына ці жанчына і крычала, спрабуючы неяк адбіцца. Але дзе ж вы бачылі, каб адзін дваіх адолеў, ды яшчэ жанчына мужчын?

Толькі зірнулі на іх вопытныя паляўнічыя, і вострыя нажы ўваткнуліся ў спіны гвалтаўнікам, тыя нават і не пікнулі. Узнялі жанчыну і ўбачылі, што яна надзіва прыгожая і стройная, што ніякая гэта не жанчына, а дзяўчына гадоў, можа, сама болей, семнаццаці... Яна працягвала драпацца і кусацца, відаць, думала, што гэтыя дамагаюцца ад яе таго ж самага, што і папярэднія. Неяк крыху супакоілі незнаёмку і запыталіся:

— Хто ты такая? Адкуль тут з'явілася? Навокал жа вёсак няма, дакладна ведаем. Хто такія тыя, што цябе вунь як падралі ды паабарвалі?

— Я з палону,— ледзьве вымавіла дзяўчына.

— З якога палону? — пераглянуліся паляўнічыя.— Не чулі мы тут такога.

— Як не чулі? Тут ворагі гоняць, можа, дзесяткі тысяч мяшчан ды вяскоўцаў, якіх па нашых гарадах ды іншых паселішчах пахапалі. Колькі людзей дарма пабілі, пасеклі, пакалечылі, коньмі стапталі... Злыдні яны клятыя! За што безабаронных панішчылі?! Адальюцца ім слёзы! Адальюцца! Вось толькі б нашаму князю хто давёў, дзе на іх лепей напасці, каб знячэўку наскочылі, тады і падрыхтавацца да абароны не паспелі б чужынцы. Самі ж усё цішком-цішком нападалі. Каб і на іх гэтаксама ваяры наскочылі! Яшчэ не позна, можна адбіць палон і людзей нашых выратаваць. Вось толькі каб князю сказаць, дзе шукаць, бо яны ж прабіраюцца такімі глухімі мясцінамі, што і чорт нагу зломіць.

Паляўнічым ужо і мяса тое не ў галаве стала, якое яны пакінулі. Пытаюцца:

— А дзе князя, дзяўчына, шукаць, ты скажы, астатняе не твая справа, мы самі да канца давядзём.

— Дзякуй вам, добрыя людзі! Дзякуй, я ягоная суджаная, ворагі мяне ўкралі, калі я з сяброўкамі на рацэ бялізну мыла. А князь наш павінен быць не надта далёка. Ён з дружынай па слядах чужынцаў

ішоў, ды яны потым яго са следу збілі хітрыкамі. Я з вамі пайду, вы толькі мяне на дарогу выведзіце, там мы ўправімся.

Пайшлі паляўнічыя з дзяўчынай, а калі дакладней, то панеслі на самаробных насілках, бо яна не магла сама ісці, ды яшчэ гэтак хутка, як спрыктыкаваныя мужчыны. Блізка не блізка, але амаль двое сутак дабіраліся да княжацкай дружыны, да лагера, дзе ваяры расчараваныя адпачывалі. Гэта ж трэба! Сляды ворага згубілі, а заадно і шанц палон назад вярнуць, людзям волю даць.

Калі дзяўчыну з паляўнічымі дружыннікі затрымалі і да свайго валадара прывялі, то той ажно ўскрыкнуў ад нечаканасці:

— Ясачка мая! Нарэшце я цябе дачакаўся!

Сказаў так князь і, людзей сваіх не саромеючыся, кінуўся да былой палонніцы. А тая, галаву ўткнуўшы ў ягоныя шырачэнныя грудзі, зашаптала:

— Дзякуй гэтым людзям, княжа! Ды няма калі нам асабліва стаяць, напярэймы трэба кіраваць, цябе паляўнічыя на ворага выведуць, туды, дзе ён з палонам шматлікім хаваецца.

Паімчалі хуткія коні, застукалі капыты па зямлі, закурэў пыл густы ззаду.

Дагналі злых чужынцаў княжацкія дружыннікі. Перабілі іх усіх да аднаго, нікога не пашкадавалі. Сапраўды адліліся няпрошаным гасцям горкія людскія слёзы. Каб косці іхнія не валяліся па бліжэйшых мясцінах, то сцягнулі трупы і насыпалі над імі вялізны курган, які потым у народзе сталі называць Вялікаю гарою або Высокаю гарою. Вось адкуль назва пайшла такая прыгожая. Хоць у такіх успамінах і мала прыгожага, хіба што толькі людская самаахвярнасць ды самаадданасць.

## ЖУРАЎКА

У нашым народзе апавядаюць пра тое, што журавы некалі былі белымі, нібы снег. Як убачаць іх людзі, то ажно тварамі святлелі ад радасці. Яшчэ б, здавалася, што сама святасць, цнатлівасць на зямлю вярнулася. Віталі іх крыкамі, спевамі: «Ого-го! Журавы! Журавы ляцяць! Радасць на зямлю нясуць, лета светлае і чыстае, без бядот, без гарот! Ого-го! Журавы

ляцяць! Страчайце птушак, глядзіце, каб іх ніхто і нідзе не крыўдзіў! Гнёзды іхнія не парушайце! Дзяцей добраму навучайце!»

Вось так птушак страчалі. Даўно гэта было. Потым гора здарылася. Паслухайце, як усё адбывалася.

Журавы-то спачатку жылі там, дзе і людзі: на стрэхах будавалі гнёзды, на дрэвах, на іншых гаспадарчых будынінах. Не баяліся вяскоўцаў, бо тыя ніколі нічога благога ім не рабілі. Людзі радаваліся нейкай падзеі, і птушкі таксама высока ў небе пачыналі лётаць-танцаваць ды курлыкаць весела, ніба і сапраўды разумелі. А калі гора якое ці бяда надаралася, то і жураваў нельга было пазнаць. Сядзелі самотныя, панурыя, не лёталі дзень-другі, толькі зрэдку якая птушка ўздымалася ды некуды на непрацяглы час знікала, каб птушанятам што перакусіць прынесці, не галадаць жа малым. Так доўжылася не год-два, а стагоддзі цэлыя, пакуль ліха не здарылася.

Справа ў тым, што людзі ж не ўсе аднолькавыя, і сярод іх, няхай сабе і зрэдку (зараз, праўда, намнога часцей), сустракаюцца благія ды сквапныя. І ў адной невялікай лясной вёсцы жыў такі чалавек. Што ўжо ў яго за душа была, то і сказаць цяжка адназначна. Усяго, здавалася, хапала яму, усяго насцягваў у свае сусекі і будыніны, не было ўжо куды дабро хаваць, а ўсё роўна, як убачыць у суседзяў нейкую рэч, якой не меў пакуль што, то калі не знойдзе сабе, дык зробіць так, каб і ў таго гаспадара яе болей не было: спаліць, вынішчыць ці які праклён нашле. Потым радуецца, месца сабе не знаходзіць.

Казалі, што яшчэ бацька ягоны злым чараўніком быў, не адзін вясковец ад яго паплакаў, не адна маці над хворымі дзецьмі плачам зайшлася, не адзін селянін не даў рады без дай прычыны захварэўшай жывёле і застаўся без асноўных карміцеляў: кароўкі ці коніка. І праз дзесяткі гадоў, калі пра таго чараўніка распавядалі, то жахліва азіраліся — баяліся, каб ненарокам не падслухаў.

Праўда, потым Усявышні дапамог вяскоўцам — пазбавіў іх ад зласлівага суседа. Пайшоў чараўнік аднаго разу ў лес. Што ён там рабіць збіраўся — ніхто і не ведае зараз. Але прысеў адпачыць пад магутным дубам, ды, відаць, задрамаў і не пачуў, як велічнае дрэва зламалася і прыдавіла яго. Хаваць ніхто з сялян

не хадзіў такога злыдня. Адзін сын з сям'ёй за труной ішоў. Потым стаў людзям помсціць.

Дык вось, ішоў ён неяк па вёсцы, зыркаў па баках, каб дзе што цікавае заўважыць ці ўхапіць нейкую драбніцу. Але не шанцавала на гэты раз. Нічога не бачыў такога, што можна было б дахаты сцягнуць. Павярнуўся і пацёгся назад, да свайго падвор'я. Ажно пачуў вясёлае курлыканне над галавою. Задраў рэдзенькую бародку, прыжмурыў вочы і сочыць. Потым нечаму засмяяўся, радасна паціраючы рукі.

А тая сям'я журавоў жыла побач з ягоным домам, на высокай разгалістай ліпе. Не адну вясну прылятаў яны на старое месца, аднаўлялі гняздо і заставаліся ў ім да восені.

Дачакаўся той чараўнік глыбокай ночы, з хаты ціхенька выйшаў і да дрэва падаўся. Падкрадваецца і сам сабе шэпча: «Я вам зраблю! Я вам зраблю! Болей не будзеце мне вушы забіваць сваім радасным курлыканнем ды пер'е белае па падвор'і рассыпаць! Знайшліся мне вешчуны радасці! Пагляджу, як пасля гэтага паскачаце! А то хто ні ўбачыць, то вітае іх з радасцю! Са мной жа ніхто ні паручкацца, ні павітацца не жадае! Зараз, зараз усё скончыцца!..»

Прыставіў драбіну да ліпы і палез наверх. Дрэва таўшчэразнае і надта высокае, а гняздо на самым вільчыку, не так проста і дабрацца да яго. Але чараўнік лез, соп ад напругі і ўсё баяўся, каб журавы не пачулі, што ён да іх падбіраецца. Мо з гадзіну якую так караскаўся. Ужо амаль дасягнуў мэты. Стаіўся, каб адпачыць і сваю страшную задуму здзейсніць, але ў гэты самы момант сук пад нагамі затрашчаў і злыдзень паляцеў уніз. Праўда, не ўпаў, бо нейкую сажань усяго праляцеў і паспеў ўхапіцца за другі сук. І што ж вы думаеце? Не спалохаўся, не палез уніз, а, наадварот, яшчэ з большай настойлівасцю пачаў прабівацца наверх. Старыя птушкі пачулі валтузню і трэск і ўзляцелі, а птушаняты малыя не ўмелі яшчэ лётаць, крылы ў іх слабыя былі. Працягнуў чараўнік свае сквапныя рукі да гнязда і давай яго рваць-разбураць, давай малых журавоў на зямлю кідаць. Нішто яго не кранала, ні піск-енк птушанят, ні крыкі-плач старых журавоў. За хвілін колькі ўсё зрабіў, што задумаў, і ўніз стаў апускацца. Стаў ля дрэва ды нагою пабітых птушанят пачаў падкідваць:

«Цяпер будзеце ведаць, як побач са мною жыць і ніякай карысці не прыносіць! Трэба, каб чалавека не любілі, не паважалі, а баяліся — вось што самае галоўнае! — З такімі словамі злы чалавек звяртаўся да журавоў, якія крычалі-галасілі, лётаючы над маўклівай сведкай трагедыі — ліпай.— Цяпер вы тут не хутка з'явіцеся! Бокам будзеце маю хату аблятаць, за дзесяткі вёрстаў убок скіруецe!..»

Доўга кружылі потым няшчасныя журавы над непрыветнай, жахлівай для іх хатай. Курлыкалі-крычалі, можа, выказвалі свой боль, абурэнне, а можа, пыталіся ў злачынцы, за што ён перавёў іхніх дзяцей, што благога яны яму зрабілі, каб такою дарагою цаною плаціць. Вяскоўцы глядзелі на растрывожаных птушак і ніяк не маглі зразумець, што там адбылося. Ніхто і дадумацца не мог, што чараўнік такое зло ўчыніў. Думалі, мо які кот да гнязда лезе ці што іншае.

А журавы пакружылі, пакружылі яшчэ да вечара і адляцелі некуды. Доўга потым не бачылі іх у гэтай вёсцы. Заўважылі іх людзі далёка ў лузе, на высокім дубе, і пайшлі паглядзець. Але калі падышлі зусім блізка, то спалохаліся — гэта былі зусім не тыя чысцютка-белыя птушкі, не тыя вясёлыя журавы, а нейкія напаўчорныя, напаўшэрыя істоты, якія і курлыкалі неяк па-іншаму. Нехта ціха прашаптаў:

— Глядзіце, людцы, гэта ж яны ад гора і бяды пачарнелі. Зусім як і мы, калі нас прыцісне...

Астатнія ашаломлена пазіралі і маўчалі. Сапраўды гэта было так.

Пазней на гэтым таўшчэразным дубе журавы пабудавалі сабе новае гняздо.

Што зробіш, жыццё як ішло, так і працягвала ісці далей. Яно заўсёды так было. Таму ў непрацяглым часе і тут запішчалі-зашчабяталі маладыя журавы, потым пачалі спрабаваць на моц уласныя крылы. І гэтак жа, як і даўней, іх вучылі старыя птушкі. Пільна сачылі за ўсім, што адбывалася навокал. Гора навучыла. Нават ноччу, калі птушаняты спалі, адна з дарослых птушак не змыкала вачэй, каб не падкраўся блізка які чарговы злыдзень і не ўчыніў злачынства.

Толькі вось што характэрна. Птушаняты вылупліваліся гэткія ж чысцюткія і бялюткія. Але калі крыху падрасталі і даведваліся ад бацькоў пра тое

жахлівае, што адбылося з іхнімі папярэднікамі, то таксама адразу ж чарнелі, шарэлі, апраналі жалобную вопратку, якую не скідалі з сябе да канца сваіх дзён. Так і адляталі такімі ж чорымі ў далёкі вырай, дзе іх таксама спачатку не пазнавалі, але, калі даведваліся, што да чаго, спачувалі і прымалі, як і раней, нібы родных.

Вясною журавы вярталіся дамоў, на Беларусь. Але ляцелі ўжо не ў вёску, а ў пушчу.

Потым усё зноў перамянілася. Той злы чараўнік заплаціў за сваё вераломства. Неяк ноччу загрымеў магутны гром, пачалі біць-паласаваць маланкі, і занялася ягоная хаціна зыркім полымем. Злыдзень нават не паспеў выскачыць з будыніны. Згарэў чараўнік разам са сваім набыткам.

Але хоць таго злога чалавека ўжо даўно не было на свеце, птушкі ніяк не маглі забыцца пра сваю крыўду і кожны год зноў і зноў аблядалі бокам, але ўжо не толькі тое паселішча, дзе іх напаткала бяда, а і ўсе астатнія вёскі, няхай сабе яны і знаходзіліся ў самых глухіх мясцінах.

Так яны помнілі пра людскую сквапнасць і бязлітаснасць.

Праўда, іншы раз журавы падляталі блізка да населеных пунктаў, асабліва там, дзе была паблізу вада, і неяк самотна, маўкліва глядзелі на вясковыя хаты. Глядзелі і нават не курлыкалі, а толькі стаялі. Паглядзяць і паляцяць далей, да сваіх гнёздаў.

Доўга так цягнулася. Паступова на роднай зямлі стала з'яўляцца намнога болей вёсак і гарадоў. І там, дзе некалі жыла гаротная жураўліная сям'я, ля таго магутнага дуба, стала будавацца вёска. А назвалі яе людзі, паглядваючы на самотную птушку, ласкава, нібы аддаючы даніну павагі і пашаны птушынаму гору, Жураўка. Так з тых часоў і засталося. Ніхто назвы і не мяняў.

## ЛЮБУШАНЫ

Кахаліся заўсёды аднолькава. Хто ж маладым не быў, у каго ж сэрца не заціхала, калі любы чалавек паблізу аказваўся, калі словы ласкавыя шаптаў? Хто не зведаў, той абавязкова зведае. Не можа такога быць. Колькі з-за гэтага кахання на зямлі

слёз і крыві пралілося. І назва нашай вёскі пайшла ад адной такой гісторыі.

Жылі ў нас тут некалі людзі. Адкуль з'явіліся? Можа, прыйшлі з іншых земляў ці ўцякалі ад каго і тут супыніліся. Займаліся тым, чым і мы зараз займаемся. Зямлі многа было, працы хапала, на рыбалку хадзілі, у лес на паляванне і г. д.

Быў у гэтай вёсцы хлопец Мікалай. Нічым асаблівым не вылучаўся. Гэткі ж працавіты, вольналюбівы, толькі прыгожы быў надзіва і вясёлы. Як заспявае песню, то ўсе людзі заціхалі, слухаючы. Словы простыя — то пра казака маладога, то пра дзяўчыну, што калінай самотнай нахілілася над ракою, то пра злую свякроўку. Слухалі вяскоўцы, а самі згадвалі ўласнае, перажытае, што ў кагосьці далёка за плячыма засталося, у кагосьці не надта, а хто яшчэ і ў гэты час з тым самым сутыкаўся. Спяваў хлопец, сялянам і працаваць не гэтак нудліва было. Часам прасілі:

— Зацягні, Мікалай, што-небудзь весялейшае. Пра наша прырэчнае жыццё. А то ўжо надакучыла пра сумнае, пра крывавае. Давай вясёлую, то і мы падцягнем.

Узвіваўся высокі голас над палеткамі, ці над лугам, над лесам, ці над вуліцай і ляцеў вольнай пташкай, якая не ведала ніякіх перашкод, куды хацела, туды і кіравала. Ведама ж, калі сумная песня, то да роздумаў цягне, а калі вясёлая, то — падцягваць. І праз якую хвіліну ўсе навокал спявалі, радуючыся і жыццю, і таму, што могуць яшчэ працаваць, сустракаць заходы і ўзыходы сонца.

Але ў гэтага Мікалая была ў вёсцы дзяўчына каханая. Сарамлівая надта, не тое што хлопец. Скажа слова-другое, а калі распытваць пра што якое пачнуць, то густа пачырванее, вочы долу апусціць і не выпытаеш ты ў яе болей нічога. Працавала як агонь. Толькі рукі мільгалі, толькі пальцы перабіралі. Пашукаць, то ці знойдзеш гэткую ўвішную. Звалі Анэткай. Упадабалі маладыя адзін аднаго і імкнуліся трымацца разам заўсёды. Так і лягчэй працаваць было, ды і цягнула каханых адно да аднаго. Дзе Мікалай робіць нешта, там і Анэтка завіхаецца. Паглядзяць у вочы і засмяюцца, ды гэтак шчыра, што ўсе, хто гэта бачыў ці чуў, разумеў — трэба адысці ўбок і не перашкаджаць любым быць удваіх.

Аднаго разу закаханыя паехалі на кані сена грэб-

ці. Бацькі ўсё бачылі і дамовіліся, што іхнія дзеці восенню пабяруцца, таму і адпускалі ўсюды. Едуць сабе, Мікалай песні спявае, а Анэтка прыхінулася да яго і маўчыць. Дарога даволі далёкая, таму не спяшаліся асабліва. Пакуль даехалі, то справа пад полудзень рухалася. Пакуль туды-сюды павярнуліся, ужо і вечар настаў. А працаваць ездзілі не на дзень, здаралася, што і на тыдзень выбіраліся, асабліва калі надвор'е добрае стаяла і нішто не прыспешвала. Падладзілі будан, які ад мінулых разоў застаўся, запалілі вогнішча і паселі ля яго, чакаючы, пакуль у гаршку страва закіпіць. Заспяваў Мікалай песню. Не голасна, як звычайна гэта рабіў, а ціха, спакойна выводзіў словы, хістаючыся ў такт мелодыі:

Ой, прапіў лейцы, прапіў каня,
Адам Грэцкі, хадзі да мяне...

Анэтка толькі ўсміхалася ласкава. Так першы вечар і скончыўся. Раніцай за працу ўзяліся. Столькі работы за дзень перагарнулі, што дзіва, як толькі здолелі. Усяго ж удваіх, але затое якія працаўнікі! Хацелася ім да суботы дамоў трапіць, бо, бачыце, справа гэтая перад самым Купаллем адбывалася. Ім жа таксама жадалася з сябрамі ды сяброўкамі ля святочнага вогнішча паскакаць, паваражыць, паслухаць, як старэйшыя розныя здарэнні згадваць будуць, ці пашукаць цудадзейны цвет папаратніка. Таму і рваліся, сена зграбаючы ды стагі высачэзныя скідаючы. Стараліся, але ўсё роўна не паспелі, як меркавалі. Якраз да полудня ў суботу ўсё і зрабілі. Хуценька сабраліся, паклалі ўсё на воз, самі паселі і паехалі дахаты. Конікі, адпачыўшы столькі часу, з месца самі пабеглі, і паганяць надта не трэба было.

Добра сядзець, даўшы адпачынак стомленаму целу, падстаўляць твар ласкаваму ветрыку і слухаць, як птушкі спяваюць-перамаўляюцца напярэдадні такога таямнічага моманту — яны ж таксама ў купальскую ноч атрымлівалі магчымасць апоўначы размаўляць чалавечымі галасамі.

Але не паспелі яны даехаць да вечара дамоў, бо кола зламалася. Неяк нечакана гэта здарылася, толькі ткнуліся потырч, і ўсё. Гэта ж вам не ў вёсцы, дзе да каваля адразу ж пры такой бядзе пакіруеш. Тут навокал, можа, на дзесятак вёрстаў людзей не было, не тое што нейкай кузні. Добра, што Мікалай да ўсяго

здатным нарадзіўся. Агледзеў, памеркаваў крыху і вырашыў наступнае: замест кола зламанага прыстасаваць невялікі полаз, зроблены з сырой бярэзінкі. Ён будзе слізгаць па зямлі, і можна кіраваць далей. Ведама ж, коні ўжо бегчы не будуць, але дахаты дабрацца будзе няцяжка. Так і зрабілі. Пакуль тое, другое, то і змрок стаў апаноўваць наваколле. Калі з месца зрушылі, дык і добра сцямнела. Коні ледзьве сунуліся.

Якраз ужо недзе і сярэдзіна ночы настала. Чуюць Мікалай з Анэткай, як кусты абапал дарогі перашэптваюцца ды навінамі шматлікімі, якімі за год узбагаціліся, дзеляцца. Птушкі не спяць, а памяркоўна ў гнёздах гамонку вядуць, гавораць, што бачылі, калі ў далёкія краіны на зіму лёталі, куды ў гэтым годзе паляцяць. Звяры таксама, да дарогі выбягаючы, не кідаліся на падарожных, а весела пра нешта перамаўляліся і беглі спакойна прэч, былі ў іх справы больш важныя і неадкладныя ў гэты час.

Прыціхлі хлопец з дзяўчынай, ужо і коней не падганяюць, а толькі па баках зыркаюць: страшнавата ім стала. Мала чаго можна чакаць ад купальскай ночы. Але неяк выбіліся амаль да самай вёскі. Ужо ніва Мікалаевых бацькоў пачалася, тут і ўздыхнулі з палёгкай, маўляў, усё самае жудаснае ззаду засталося. Эх, ведалі б яны, што іх наперадзе чакала, то не спяшаліся б гэтак дамоў, не імкнуліся б да купальскага вогнішча, а перачакалі б гадзіну-другую, дзе-небудзь стаіўшыся. Толькі хто ж гэта ведаў, хто ж мог падумаць. Але пра ўсё па парадку.

Едуць яны ўздоўж поля, а зямлі ў Мікалаевых бацькоў было шмат, бо сям'я была вялікая ды працавітая, так што ўсё заправіць паспявалі. Глядзяць — ажно пасярод жыта нехта поўзае. Мікалай, як убачыў, дык і аслупянеў, не можа зразумець, хто гэта збожжа выкачвае ў такую пару, яно ж болей ўжо не падымецца, а гэтак і застанецца прыбітым да зямлі, згніе, спрахне, ніякага прыбытку не прынясе. Усхапіўся на калёсах і крыкнуў:

— Эй, хто гэта там па нашым жыце качаецца? Што ты там згубіў? Вось як вазьму граблі, то добра па спіне папрацую!

Стаілася тады незнаёмая здань, нібы гэта не да яе звярталіся. Прыціхла. Бачыць хлопец, што нічога так не змяніцца, узяў граблі і пакіраваў напрасткі. Падышоў ды як лупяне яе раз-другі па спіне, а тая як зараве:

— Ой, чалавеча, не бі, не губі мяне! Ой, не бі!

А Мікалай як трэсне яшчэ раз ды як закрычыць на яе таксама:

— А што гэта ты ноччу на чужой ніве робіш? Вядзьмарствам, мабыць, займаешся? Га?! Гавары, бо яшчэ ўсыплю!

— Ой, гэта ж я шукаю ежу. Ой, нічога благога не раблю! Толькі не бі мяне болей! Ой!..

— Якую такую ежу? — не зразумеў хлопец.— Нешта ты не тое вярзеш! А ну ўставай, я табе ў твар гляну! Заломы, відаць, па жыце закручваеш ды намаўляеш на благое? Вось я табе!

— Ды не, праўду кажу, толькі праўду! Я траўкуквецікі шукаю на ежу сваім пчолкам, якія ў мяне мёду мала чамусьці сталі насіць...

— А чаму не днём, а ноччу гэтым займаешся?! Не веру я табе,— сурова вымавіў хлопец і замахнуўся граблямі.

— Не чапай яе, Мікола,— пачулася ззаду, і да жанчыны, што ляжала на зямлі, кінулася Анэтка. Лепей бы яна гэтага не рабіла! — Не чапай, бо ёй жа надта баліць, а можа, нічога жанчына благога і рабіць не рабіла...

Сказала так і схілілася над распасцёртым целам. Потым узялася за плячук і перавярнула на спіну, але толькі Анэтка гэта зрабіла, як жудасна зарагаталазагарлала вядзьмарка і... знікла. Дзяўчына засталася на зямлі. Дзіва здарылася на вачах: прыгожая, стройная Анэтка ператварылася ў састарэлую, ссівелую жанчыну. Мала гэтага, з таго самага моманту яна страціла розум. Бясшкодная была, праўда, але што рабіла — не ведала. Прывёз яе хлопец дамоў і болей ад сябе не адпусціў. Сам хадзіў за ёю, есці варыў, апранаў, ды не адмаўляўся, хоць ніхто б з людзей на яго з-за гэтага і слова благога не асмеліўся б сказаць. Толькі і чулі ад хлопца:

— Што ты хочаш, што, любая мая? Што, любая?..

Потым у бацькоў дазволу папрасіў пабудаваць сабе асобную хаціну крыху ўбаку ад вёскі і стаў там з Анэткай жыць. Зваў яе не інакш як любай. Вось гэта, мабыць, і дапамагло. Гадоў праз колькі дзяўчына выздаравела і стала такой жа прыгожай і харошай, як і раней. А месца тое, дзе яны потым з мужам век дажывалі, людзі Любушанамі назвалі, у памяць пра іхняе светлае і чыстае каханне.

## ПАДКАМЕНЬ

Там, дзе сёння наша вёска знаходзіцца, некалі не было ніякіх будынкаў. Не, людзі тут жылі, толькі паселішча ў іншым месцы стаяла, а тут жыта сеялі, збажыну ўсялякую ды агароды выкарчоўвалі сабе сяляне. Так здаўна вялося, што з-пад лесу трэба было ворную зямлю сабе здабываць, інакш не пражывеш. Год-два пасееш жыта на новым участку, а там зноў карчаваць даводзілася, бо хутка ніва выраджалася. Тады гною з хлявоў на поле не вазілі, не мелі яшчэ вяскоўцы такой практыкі. Папаляць суччa, голле, дрэвы, іржышча, якое восенню, пасля ўраджаю, заставалася, і попел той пераворвалі старанна, па ім і сеялі на зіму ці вясною. Ведама ж, такое ўгнаенне доўга дапамагаць не будзе. Самае галоўнае было ў тыя стагоддзі не апрацаваць поле, а адшукаць яго ці выпаліць ляда.

Дык і на месцы нашай вёскі тады людзі сабе такія ўчасткі выраблялі. Дапамагалі адзін аднаму, звярталіся то валоў на пару дзён пазычыць, то дрэвы таўшчэразныя вывезці куды-небудзь далей ці на падвор'е іх прыцягнуць, каб потым нейкую будыніну можна было агараць. Спаліць — штука няхітрая, але дзе потым знойдзеш лясіны. Зноў жа ў лес трэба перціся, двайную працу рабіць. Усё так было, усё так працягвалася, і ніхто на лёс уласны асабліва не наракаў.

Але жыў, кажуць, у вёсцы адзін надта дзіўны мужык. Звалі яго, як і многіх іншых, проста — Ясь. Вось з ім менавіта і звязана ўсё наша далейшае апавяданне. Паслухайце старанна ды запамятайце, чаго нельга ніколі ў жыцці рабіць, каб людзі праклёнаў на галаву ніколі не насылалі, а добра адносіліся. Самае гэта дрэннае, калі іншыя адварочваюцца, калі вітацца не жадаюць, рукі падаваць не хочуць.

Нарадзіўся ён у звычайнай сялянскай сям'і, якіх многа было навокал, але ўжо з дзяцінства вылучаўся сярод іншых дзяцей сквапнасцю і жорсткасцю. За самую дробязную прычэпку, за нейкі напаўгнілы яблык мог так бязлітасна збіць свайго равесніка ці маладзейшага за сябе, што таго потым ледзьве адходжвалі бацькі. Каб сказаў хто, што гэткая бессардэчнасць перайшла да яго ад бацькоў, дык не, тыя апошнім, асабліва з беднымі ды жабракамі, заўсёды дзяліліся. Але ж нездарма кажуць у народзе, што ў сям'і не ўсе роўныя. Так і з гэтым хлопцам здарылася. Баяліся

яго не толькі малыя, дарослыя і тыя не жадалі звязвацца, бо Ясь мог, разлютаваўшыся, і будыніну падпаліць, і жывёлу куды-небудзь у балота загнаць ці ўвогуле жыцця пазбавіць. Маткі ўжо сталі ім непаслухмяных дзетак палохаць:

— Ідзі спаць, бо вось зараз Яся паклічу, то ён табе пакажа! Неслух ты гэткі!

Браты і сёстры адвярнуліся ад такога сваяка, не хацелі з ім спрачацца. Бацькоў па чарзе глядзелі, а самаму малодшаму, як гэта ў іншых было заведзена, не давяралі, не пускалі ў яго хату старых, каб чаго дурнога той злыдзень над роднымі душамі не ўтварыў. Самы лепшы надзел ён сабе выбраў, ніхто і слова супраць не сказаў, толькі ў бацькі вочы слязьмі затуманіліся, сорамна яму было перад астатнімі дзецьмі, бо яны ж яму намнога болей дабра рабілі. Але што зробіш, у жыцці ўсялякае здараецца. Каб жа ведаў, што такім вырасце, то і на свет не нараджалі б!

А Ясь як хату сабе вялікую і прасторную пабудаваў, як гаспадарку спраўную завёў, парабкаў з дзесятак наняў, то сваіх родных і на парог нават не пусціў. Няхай сабе ў самае вялікае свята нават не прасіць нечага, а толькі віншаваць прыходзілі, яму ўсё роўна! Дзяцей іхніх і тых прызнаваць не жадаў. Хоць малыя-то ў чым вінаваты? Шкадаваў парабкам есці. Яны ўжо ледзьве ногі перастаўлялі і нецярпліва чакалі, калі тэрмін разліку надыдзе, каб да каго другога наняцца працаваць. Больш іх да скнары гэтага ніякімі абяцанкамі не прывабіш. Гаварылі людзі, што ён не толькі чужым, але сабе і жонцы на стол, акрамя нішчымнай капусты, расолу ды бульбы, нічога ніколі не ставіў. Усё ў пограб пад цяжкія замкі хаваў. Чаго там толькі не было! Усё цвіло, гніло, псавалася, але дарма. Нельга было даказаць Ясю, што гэта не ўпрыгожвае чалавека, а наадварот. Жонка, бедалага, трывала, трывала дый памерла. Малых дзетак яе бацькі да сябе сілаю забралі, збаяліся, што і іх у магілу заўчасна справадзіць бязлітасны гаспадар.

Многія дзівіліся, калі толькі Ясь паспяваў спаць ці адпачываць, адкуль у яго гэтулькі сілы ды здароўя бралася? Сонца яшчэ добра не ўзыдзе, а ён ужо парабкаў па падвор'і катурхае, у поле ці ў лес, на луг ці на ніву працаваць адпраўляе. Накіруе іх у пяць месцаў, але тыя ведалі, што ўсё роўна адпачыць і хвілінкі не давядзецца. Паспрабуй прысядзь, то адразу ж

з'явіцца перакошаны твар гаспадара, які зараве немым голасам:

— А працаваць за вас, лайдакі, хто будзе?! Можа, я?! Ці не за гэта тады вам плачу?! А не хочаце, каб бізуном па плячах пахадзіў?!

Таму, дзе ні былі, ніколі не стаялі, не сядзелі, а толькі, гарбеючы, рабілі тое, што было загадана.

Усіх навокал трымаў у сваіх прагных руках Ясь, усе залежалі ад гэтакага багатыра, нават паны і тыя не маглі памерацца з ім сваім багаццем, бо ў мужыка яго было значна болей. Таму нікога жывадзёр і не баяўся, нікога не палохаўся. Але знайшоў усё-ткі сваю пагібель ваўкалак крыважэрны! А здарылася ўсё наступным чынам.

Быў непадалёку ад той вёскі, дзе жылі гаротныя людзі разам з Ясем, вялікі-вялікі камень, мо большы за звычайную хату. Яму з даўніх часоў людзі пакланяліся, ахвяры розныя прыносілі, паднашэнні. Ад пакалення да пакалення перадавалася паданне, паводле якога гэтую глыбу нельга было крыўдзіць, бо калі ёй стане на душы балюча, то яна можа жорстка расправіцца са сваім зневажальнікам, шкадаваць тады будзе запозна. Вяскоўцы, калі міма праходзілі, абавязкова што-небудзь ля яго пакідалі: хто кветачак якіх па дарозе нарваў, хто акрайчык хлеба, што на полудзень сабе браў, хто капейку, калі такая вадзілася ў кішэні. Адным словам, не забываліся пра засцярогу продкаў.

Бачыў Ясь, якую пашану каменю аказвалі, і зайздросна яму станавілася. Чаму нейкай камянюцы кланяюцца, а яму не. Вырашыў скнара на зло людзям зрабіць. Прыйшоў дамоў і гаворыць на парабкаў:

— Вось што. Заўтра з раніцы пойдзем камень-велікан падкопваць! Закапаем яго ў зямлю, а на тым месцы поле выраўняем і збожжам засеем, усё нейкі прыбытак будзе, а то гэтулькі месца дарма пустуе!

Ніхто не супярэчыў, хоць ведалі, што нельга камень кранаць, бо можа здарыцца бяда. Але што ты тут зробіш, калі парабкі — людзі паднявольныя, іх, куды хочаш, туды і накіруюць.

Пайшлі і сталі капаць. Вяскоўцы прыбеглі і давай Яся адгаворваць не рабіць гэта, ды той і ў вус не дзьмухае:

— Пляваць я хацеў на вашы паднашэнні! Нічога не было і не будзе. Здарыцца з тым, у каго няма грошай, а ў мяне іх на паўзямлі хопіць! Каму хочаш

насыплю, толькі вось задарма іх раздаваць ахвоты няма! А што камянюкі баяцца?.. Не, няма чаго яму тут ляжаць, месца займаць! Закапаем і разраўняем усё, тады і паглядзім, як яно будзе на самай справе!

Вялізную яміну выкапалі парабкі за дзень, але ж трэба было яшчэ большую, за адзін заход тут не ўправішся. Можа, з тыдзень хадзілі работнікі да каменя. Нарэшце падалося ім, што ён пачынае ссоўвацца ў ямку. Выскачылі і давай крычаць Ясю:

— Гаспадар! Гаспадар! Камень ужо сунецца ў яму!

Падскочыў той да краю, глянуў — нічога такога не ўбачыў і загарлаў:

— Вам бы толькі мяне вакол пальца абводзіць! Адпачыць захацелася? Лезце ў яму і далей працуйце! Ну!..

Дзіўна, але ніхто з парабкаў нават і з месца не зварухнуўся. Толькі нехта ціха прамовіў:

— Табе трэба, ты і лезь, а мы не палезем, бо жыць хочацца.

— Ах так,— ускрыкнуў Ясь,— тады глядзіце, як трэба!

Ухапіў лапату і слізгануў уніз. Толькі махнуў раздругі, ажно камень і гопнуўся і заваліў злыдня на тым самым месцы. Там пазней і вёска стала, а назвалі яе Падкамень, ад той незабыўнай падзеі.



# ВАЛОЖЫН

У кожнай сям'і даўней, не тое што зараз, працаваць пачыналі з самага ранняга маленства. Ледзьве толькі дзіця крыху адрасце ад зямлі, навучыцца самастойна бегаць, то яму ўжо і шукаюць нейкі занятак па сілах. Так з малых гадоў і прывучвалі да таго, каб сапраўдны чалавек рос: працавіты, дужы, каб ніякага ліха не палохаўся ды да сталых гадоў навучыўся амаль усё самастойна рабіць. Маецца на ўвазе да таго часу, пакуль жаніцца. Там ужо ён гаспадаром станавіўся (калі гэта хлопец быў, а калі дзяўчына, то, адпаведна, гаспадыняй). Так колькі стагоддзяў вялося, што маці дачку падрабязнасцям жаночых заняткаў вучыла, а бацька сына — мужчынскім рамёствам. І ўсё добра атрымлівалася. Лайдакоў было значна меней, чым у цяперашнія гады, калі амаль ніхто працаваць не хоча.

Тады ж тое дзіця, можа, сустрэла пяць-шэсць вёснаў, а яго ўжо пасылалі самастойна гусей пасвіць ці курэй дзе з патравы выганяць. Вось яму і работа на ўвесь белы дзень. А калі правініцца ў нечым, то лупцавалі, што ж вы думаеце. Гэта каб іншы раз не зай-

здросна было ды каб уважліва слухаў і выконваў тое, што старэйшыя гаварылі. Так прывучвалі да бездакорнага падпарадкавання. Бацьку, маці паважалі.

Вось падрасце яшчэ крыху тое дзіця, то яго ўжо нібы на пасаду чарговую ўзвышалі — свіней пасвіць пасылалі. Тут справа была больш адказная. Гэта ўжо жывёліны буйныя і крыку не надта баяцца, толькі паспрабуй адвярніся, то яны табе зараз свой агарод перакапаюць ці ў чужы залезуць і там шкоду вялікую наробяць. Гэта магло прывесці да значных непрыемнасцей у суседскіх ці ў сямейных адносінах. Таму дзеці разумелі, што да чаго. Гульні гульнямі, але і пра абавязкі не забываліся, добра рабілі ўсё, належным чынам пасвілі.

Потым ужо, у каго ў сям'і нястача вялікая была ці бацька памёр або ўвогуле бацькі, таго ў падпаскі аддавалі да дарослых пастухоў. Яны глядзелі за цэлымі чародамі і выконвалі тое, што ім загадвалі пастухі: кароў, авечак, цялят паадганяць, паадварочваць ад патравы, сачыць, каб, не дай Бог, куды ўбок не адбіліся, бо ваўкоў жа, ой, ваўкоў было! Мноства! Толькі хто карову ці каня дзе пакіне, то назаўтра знаходзілі кавалкі шкуры і акрываўлены пясок ці кустоўе на месцы, дзе драпежнікі жывёліну ўпалявалі.

І наш Валожын ад таго ж пайшоў. Ад таго... Пра бедных дзяцей гамонка далей пойдзе, пра тое, як ледзьве дамоў з пашы вярнуліся. Слухайце толькі...

У аднаго бацькі было чацвёра дзяцей: трое сыноў і дачушка. Двое ўжо амаль дарослыя, добра дапамагалі па гаспадарцы, сталі сапраўднымі работнікамі, а двое іншых яшчэ не падраслі і таму дома пераважна знаходзіліся ды маці дапамагалі ці дзе гусей на лузе глядзелі, каб ніхто іх не пазарыў. Але як надаралася патрэба, то даручалі і больш важныя абавязкі. Напрыклад, калі ехалі на сенакос, што знаходзіўся на далёкім балоце, ды заставаліся там на некалькі сутак, а то і на тыдзень-другі, дык хату сцераглі старыя-старыя дзед з бабай і двое малых дзетак. Яны ж і за жывёлай усёй хадзілі, і іншыя якія работы па гаспадарцы выконвалі. Які гаршчок да печы паднесці ці там абярэмак дроў, каб ежу зварыць, свінням замяшаць і г. д.

Сядзіць дзед глухі, як пень, на прызбе і моцна, ва ўвесь голас, сам з сабою размаўляе:

— Гэта ж заўтра з раніцы трэба кароў і авечак на пашу гнаць. Валоў таксама дома не пакінеш. А калі той гаспадар вернецца — аднаму Богу вядома. Толькі ж сёння выправіліся на луг. Калі надвор'е пастаіць, то пакуль усё не зробяць — не прыедуць. Трэба ж жывёлу гнаць — гэта не справа на падвор'і яе трымаць. Не справа... Я б сам пагнаў, ды ногі слухацца не жадаюць. Старая таксама не памочніца ў такой справе, ледзьве ад ложка да печы даджгае, каб зварыць што. Толькі Колька і Полька застаюцца. Малыя занадта. Мяне і то бацька некалі ў такім узросце пасвіць буйную жывёлу не пускаў. Баяўся, каб чаго ліхога не здарылася. У нас жа тады і мядзведзі, і ваўкі па наваколлі шасталі, не хаваліся асабліва. Мярцвячыны ім заўсёды тады хапала. Войны, усялякія бітвы, трупы не было каму прыбіраць. Як коні ваўкі хадзілі, нікога не палохаліся. Дабычу і тую сабе выбіралі, на абышто проста так не кідаліся. Нічога, як-небудзь паціху пераажывём і часовую цяжкасць. Што ўжо зробіш, падкажу, дзе трымаць чараду, куды нельга пускаць, каб на іншых пастухоў глядзелі ды ад хаты асабліва далёка жывёлу не адпускалі, і ўсё будзе добра. Затое бацька, маці як узрадуюцца, што ў іх дома гэткія памочнікі засталіся. Нічога, як-небудзь перагораем...

Дзед узняўся і памкнуўся ў хату вячэраць, каб там за сталом і вырашыць, хто чым заўтра будзе займацца.

Паселі ўсе чынна, як гэта было, калі ўся сям'я збіралася есці, і стары звярнуўся да старой, гарлаючы на ўсю будыніну:

— Чуеш, баба? Чуеш?

Тая азвалася, нецярпліва махнуўшы рукой:

— Чую, чаго ты так равеш? Я ж не глухая! Чую!

Але дзед крычаў яшчэ, можа, мацней, не звяртаючы ўвагі на пратэст жонкі:

— Гэта ж я кажу, што заўтра трэба некаму жывёлу пасвіць выганяць, дык у нас і няма каму... Калі нам з табою ісці, то некага следам накіраваць абавязкова давядзецца, каб і нас ужо заадно пасвіў, у адваротным выпадку жывёла сама дахаты прыйдзе, нас жа не дачакаюцца — не дойдзем...

— Сядзі ўжо, пастух,— гаротна выдыхнула старая.— Ты ўжо вунь і так дыхаеш, як той капшук парваны, а там жа пабегаць, калі што якое, трэба, адвярнуць ад шкоды, у месца сагнаць...

— Дык што ж рабіць, баба, будзем, га?!

— Давай памяркуем,— пагадзілася тая і сумна глянула на маленькіх унукаў, якія спрытна завіхаліся ля стала.

— Нічога іншага не застаецца, як Колю і Полю за жывёлай глядзець паслаць. Падкажам ім, я крыху з раніцы праганю да месца, там пакажу, а пад вечар надыду, то і добра будзе... Ты з вечара есці ім нарыхтуй, ды не шкадуй, скварку якую пакладзі, яек. Маленькія ж яны ў нас зусім яшчэ. Сама бачыш. Выйсця іншага няма. Добра, што яны такія паслухмяныя і дружныя, куды адно — туды і другое кіруе. Як хвосцікі бегаюць-шныраюць, не разлучаючыся.

— Зраблю, усё зраблю, стары, няўжо ж я не разумею, няўжо ж мне не шкада? Ці сама некалі такою не была, ці сваіх дзяцей не адпраўляла? Але ж ведаеш, што ўнукаў удвая бліжэй да сэрца хочацца прыгарнуць, чым родных сыноў і дачок.

— Ешце, родненькія, ешце, каханенькія,— звярнуўся дзед да малых,— набірайцеся сілкі, бо яна вам заўтра спатрэбіцца — кароў ды валоў на пашу пагоніце.

Коля з Поляй пераглянуліся і давай смяяцца. Гэта ж трэба, ім, як дарослым, давяраюць гэтакую важную справу. Тут і пытацца няма чаго — ведама ж, пагоняць. Трэба ж дапамагаць.

Паляглі спаць хутка, але нікому не спіцца. Старыя сабе перажываюць, хоць бы заўтра ўсё добра было, а дзеці — радуюцца, што так далёка пойдуць за каровамі, яны ж там яшчэ ніколі ў жыцці не былі. Гэта ж столькі цікавага можна будзе ўбачыць, столькі паглядзець! Не паспелі яны, бедалагі, і вочкі свае маленькія заплюшчыць, а дзед ужо стаіць над ложкам ды катурхае ціхенька:

— Уставай, Колька! Уставай, Полька! Каровак пара выганяць! Валоў час настаў займаць! Уставайце, родненькія, уставайце!

Ледзьве збудзіў, гэткім моцным сном малыя прыпалі. Гледзячы на іх, бабуля ажно слязу пусціла, ды стары на яе цыкнуў:

— Маўчы, не раві, і без цябе на душы гаротна, а ты яшчэ настрой псуеш! Памаўчы ды на стол пастаў малым, хай падсілкуюцца!

Сабраліся паціху ўнукі, перакусілі і на двор выйшлі, жывёлу ж з хлявоў выганяць трэба. Дзед іх падвучвае,

яны выконваюць усё, стараюцца, задаволены, што гэтак добра атрымліваецца. Падышоў стары з імі, можа, крокаў трыста і прыстаў, задыхаўся,ісці далей не можа, прыпыніўся і гаворыць паціху:

— Колька! Ты за старэйшага будзеш! Глядзі ў мяне, каб усё акуратна было, каб нічога благога не выйшла! Далёка да суседскіх чарод не адпускайцеся, але і блізка не падлазьце, бо тады каровы ды валы біцца паміж сабою пачнуць, рады ніякай не дасцё ім. Калі што трывожнае пачуеце, то да старэйшых бяжыце і жывёлу перад сабою зганяйце! Не губляйцеся толькі, ды не пасніце, каханенькія, а я вечарам вас сустракаць выйду. Не доўга пасвіць прыйдзецца — усяго некалькі дзён, а там і бацька з маці ды з братамі прыедуць, вас падменяць, дзякаваць будуць, што гэтак выручылі іх. А сёння, калі цень даўжэй за бярозы пачне выцягвацца, дык і дамоў кіруйце, не зацягвайце, бо тады можа змярканне на дарозе прыспець. З Богам, міленькія.

Малыя, пакрыкваючы тоненькімі галасамі, пагналі статак далей, а дзед застаўся на месцы, гледзячы з-пад рукі ім услед. Дзень летні — не тое што зімовы. За такі дзень можна жаніцца два разы і малых завесці, а то дзяцей адправіць з жывёлай і самім у хаце чакаць. Чаго толькі не перадумалі старыя, пра што толькі не перагаварылі, седзячы на прызбе і пільна ўглядаючыся ў той бок, адкуль павінны былі з'явіцца іхнія каровы ды валы. Разумелі, што яшчэ рана, але тым не меней узіраліся. Потым нехта не вытрымліваў:

— Рана яшчэ, старая (ці стары), ой як рана! Няма чаго турбавацца, усё будзе добра... Няма чаго хвалявацца...

Скажа гэтак каторы, а ў самога на сэрцы яшчэ болей зашчыміць.

Ледзьве дачакаліся вечара, калі пачалі туманы на наваколле пакрыху апускацца. Узяў стары дзед жонку пад руку, і паціху падаліся насустрач па той дарозе, адкуль павінны былі іхнія ўнукі прыйсці. Хацелася ім і хутчэй прыпусціць, ды ўжо сілы неставала, ногі не тыя, гадоў надта многа на спіну душыць. Як бы там ні было, але падышлі-такі мо з вярсту нейкую. Бачаць — пыл закурыўся наперадзе. Дык баба не вытрымала і гаворыць:

— Нашы гэта. Нашы. Колька з Полькай каровак да хлява гоняць. Болей ніхто іншы, як нашы...

У дзеда таксама вочы радасцю засвяціліся, але ён трымаўся больш стойка:

— Хто ж яго ведае, а можа, і не, бо пастухоў-то чароды многа сюды пагнала. Зараз пабачым, не доўга ўжо чакаць засталося. Зараз глянем.

Нарэшце статак падышоў бліжэй, і старыя ўжо выразна пачулі знаёмыя да болю дзіцячыя звонкія галаскі:

— Куды, Лыска! Куды, Чырвоная! Дахаты, дахаты кіруйце! Дамоў, Чорны, дамоў! Не наеўся за цэлы дзень! — прыкрыкваў Колька, як дарослы.

Праз нейкую хвіліну малыя радасна кінуліся да старых:

— Дзядуля, бабуля! Ой, што мы там бачылі, што мы там чулі! Каб вы толькі ведалі! Колька дык зайца заўважыў, які спаў, яшчэ б крыху, і злавіў бы, ды позна было бегчы, бо ў яго ж вунь якія ногі доўгія.

— А Полька кветачакназбірала, дахаты прыйдзем, то пабачыце, якія яны прыгожыя. Вы, можа, такіх і не бачылі ніколі.

Старыя слухаюць гэткія навіны, і так ім добра, так лёгка стала, нібы ў сваё дзяцінства на некаторы час сягнулі. Прыгналі жывёлу дамоў, бабуля каровак падаіла, і за стол есці селі. Малыя што самыя ні на ёсць дарослыя трымаюцца, разважаць неяк па-іншаму спрабуюць, і дзядуля за гэта на іх не дакарае. Столькі ўжо іх малыя нараспавядалі, што і на тыдзень хапіла б. А потым Колька і пытаецца:

— Дзеду, а што гэта там на выспе гудзе, калі вуха да зямлі прыкласці? Сапраўды гудзе, я не прыдумляю, бо і Полька разам са мною слухала, пацвердзіць можа. Так, Полька?

— Праўда, дзеду, праўда. Гудзе, нібы ў царкве якой падземнай: глуха, самотна так, жаласліва. Што гэта, родненькі?

— Што я вам скажу, унучкі,— пасля некаторага маўчання адказаў стары.— Даўняя гэта гісторыя, надзвычай даўняя...

Бабуля таксама прысела на ўскраек услона і сабралася ўважліва слухаць.

— Некалі, недалёка ад нашай вёскі, дзе мы з вамі зараз жывём, там, дзе была сенажаць усёй грамады... Луг вялікі перад выспай вы бачылі?

— Так, бачылі. Сапраўды надта вялікі і прыгожы луг,— пагадзілася Полька.

— Там яшчэ, акрамя сенажаці, сажалка ёсць, дзе даўней каноплі мачылі. Там, старыя мне гаварылі таксама, балота было бяздоннае. У яго калі хто трапляў, то назад яму ўжо дарогі не існавала. Дык вось тады, за сівымі стагоддзямі, ніхто мо і не памятае, як усё адбывалася. На той выспе стаяла вялікае, прыгожае мястэчка, у якім штотыдзень збіраўся вялікі і шматлюдны базар (гэтак па-нашаму казалі). Пасярод мястэчка быў шырокі пляц, і на ім ладзілі кірмаш. А з аднаго боку пляца ўзвышалася высокая царква, куды людзі, перш чым гандляваць, заходзілі, ставілі колькі свечак, давалі грошы на святую справу, малітвы шапталі і ўжо пасля гэтага адыходзілі займацца будзённымі справамі. То ўсё і добра ішло, ніякіх парушэнняў не здаралася. Але ж ведама, людзі, яны такія стварэнні, што ім нельга толькі харошае рабіць, бо адвернуцца хутка, прыесца такое, і паспрабуюць нешта новае прыдумаць. Вось і ў гэтым мястэчку вяскоўцы з цягам часу навучыліся ашукваць адзін аднаго, выцягваць апошнюю капейчыну, і, што самае галоўнае, рабілі гэта з задавальненнем. Каб жа толькі такім чынам грашылі, то, можа, кара на іх такая вялікая не ўпала б...

— Якая кара, дзеду? — ціхенька запытаўся Колька і шмаргануў носам у рукаў світкі.

— Зараз, унучак, пра ўсё пачуеш, пра ўсё па парадку. Каб жа тыя людзі адзін аднаго толькі ашуквалі ды па-ўсялякаму абдурвалі. А то пачалі яшчэ і забіваць. Не падумайце. Гэта не жарт вам які-небудзь, а пазбаўленне жыцця чалавека. Здаралася, што ў забітага і грошай-то аказвалася ўсяго там колькі капеек, ды ажывіць яго ўжо было немагчыма. Пра царкву і гаворкі ніякай увогуле не вялося. Месцачкоўцы пра яе і думаць перасталі. Ім бы хутчэй да ўлюбёнай справы дарвацца, а не перад абразамі калені згінаць, каго абкруціць, а не свечкі ў Божым храме ставіць. Злаваўся на іх за гэткія вялікія грахі Усявышні, але пакуль яшчэ трываў, не выказваў адкрыта сваё абурэнне. Праўда, некалькі разоў насылаў на пустагаловых жыхароў то засуху, то залеву, ды тым усё роўна, як займаліся сваімі чорнымі справамі, так і працягвалі далей імі займацца. І вось аднаго дня здарылася тое, да чаго справа і рухалася.

Сабраўся з самае раніцы вялікі кірмаш. Чаго там толькі не было, чаго толькі не прывялі і не прывезлі. Гандлюй, здавалася б, і ўсе справы. Дык жа не. Прадаваў адзін селянін карову. Добрая была карова, сытая, спраўная, малака таксама многа давала. Вызначыў ён ёй там нейкую цану і не саступае нікому. А некаму з местачкоўцаў надта ж гэтая жывёліна спадабалася, і не, каб па цане дамаўляцца ды па-добраму браць сабе. Ён пачаў па-ўсялякаму лаяць гаспадара, такога яму зычыць, што каб тое спраўдзілася, то ў той момант зямля расчынілася б і ўсё ў яе нутры прапала б. Гаспадар спачатку думаў, што той нахабны местачковец пагамоніць-пагамоніць дый адыдзе куды ўбок. Але злыдзень і не збіраўся адступаць. Тады і селянін стаў адказваць на брыдкую ў свой адрас лаянку. Слова за слова, і яны счапіліся не на жарт. Загарлала што было сілы жонка гаспадара каровы:

— Людцы! Што ж гэта робіцца! Яго ніхто не чапаў, ніхто яго не лаяў і праклёнаў на галаву не сыпаў, як ён нам! То ён яшчэ і з кулакамі кідаецца! Дапамажыце, людзі добрыя! Дапамажыце!

З гэтага і распачалася бойка, ды такая крывавая і бязлітасная, што і глядзець было страшна. Ужо і пакалечаныя, і забітыя з'явіліся. Жанкі галосяць, дзеці пішчаць не сваімі галасамі, але мужчын гэта не супыняе, малоцяць адзін аднаго дзе кулакамі, а дзе і каламі. Валяцца на зямлю, нібы снапы. Выйшаў бацюшка з крыжам з царквы, звярнуўся да раз'юшаных сялян з Божым словам:

— Супакойцеся, вяскоўцы! Супакойцеся, местачкоўцы! Паслухайцеся слова Божага! Дзеля чаго вы гэта ўсё ўчынілі? Дзеля чаго самі сябе калечыце і забіваеце? Ніхто з вас і не адкажа. Канчайце бойку ды ў царкву кіруйце грахі свае замольваць перад Усявышнім, пакуль не позна...

Болей бацюшка нічога сказаць не здолеў, бо нехта з мясцовых абібокаў гэтак моцна даў яму ў нос, што беднаму і неба маленькім паказалася. Пакаціўся, нібы сноп, пад плот і болей адтуль не вылазіў, баяўся, каб не дабавілі. Але нечакана, самі па сабе, зазвінелі жалобна званы на званіцы, і ўсе сцішыліся. А званы працягвалі разгойдвацца і гудзець:

— Па-ку-туй-це... Па-ку-туй-це...

Пападалі людзі на калені і давай жагнацца, ды позна апамяталіся. Не захацеў ад іх Бог гэткага малення

прымаць. Раскрылася зямля на тым самым месцы, дзе ўсё гэта адбывалася, і знікла ў бяздоннай прорве царква разам з людзьмі, якія правінаваціліся перад Усявышнім.

З тых дзён, унучкі, калі надвор'е ціхае ды яснае і на выспе прыкласці вуха да зямлі, то можна выразна пачуць, як званы звоняць і галасы жаласліва ім падпяваюць...

Стары скончыў і зірнуў на дзяцей. Тыя соладка спалі, схіліўшыся на стол.

— Стаміліся, мае даражэнькія, стаміліся. Давай, маці, я іх спаць на ложак занясу. Заўтра ж зноў давядзецца маленькім каровак нашых пасвіць. Хутчэй бы ўжо сын прыехаў. Шкада, натомяцца нашы памочнікі.

На досвітку гаспадыня будзіла Кольку і Польку:

— Уставайце, мае птушачкі, уставайце! Каровак, волікаў на пашу зноў пагоніце. Яшчэ чаго цікавага там убачыце ды нам з дзедам раскажаце потым! Толькі ж глядзіце, выконвайце ўсё так, як ён вас падвучыў, каб нічога самі не выдумлялі, мала чаго ў жыцці здараецца! Глядзіце, каханенькія, беражыцеся самі і жывёлу ахоўвайце.

— Не бойся, бабуля,— нібы дарослы чалавек, адказаў Колька, і Полька з ім пагадзілася,— не першы раз ужо пагонім, цяпер ведаем, што да чаго...

Зноў дзядуля ім статак прагнаў крыху і застаўся стаяць на ўчарашнім месцы. Малыя пагналі далей самі. Звярнулі каровак з дарогі і пусцілі пасвіцца, травы хапала, дажджы тады часта ішлі, сонца добра грэла. Час марудна цягнецца, малыя пра нешта размаўляюць ды бегаюць-ганяюцца, калі час ёсць, то за птушачкамі, то за матылькамі. Потым прыселі на той самай выспе, пра якую ім стары гаварыў, і сталі ўслухоўвацца. І сапраўды — званы зазванілі. І так выразна іх было чуваць, нібы дзесьці прама за плячыма ўсё адбывалася. Жудасна стала малым, кінуліся з выспы бегчы, ляцяць, куды вочы глядзяць. Супыніліся толькі тады, калі моцна стаміліся, і тут згадалі пра жывёлу. Колька вымавіў:

— А як жа каровы, а хто ж за волікамі глядзець будзе?!

Адпачылі крыху і давай назад прабірацца. Доўга ішлі. Нарэшце падышлі. Бачаць — каровы ляжаць і перажоўваюць тое, што да полудня з'елі, а валоў няма

нідзе. Яны туды, яны сюды — не, няма. Заплакалі бедныя. І тут падалося, што з кустоўя, якое, можа, крокаў за пяцьсот расло, пачулася нудлівае мыканне.

— Там яны,— усклікнула Полька і прыпусціла да кустоў. Колька паджгаў за сястрычкай. Падбеглі да месца, а крык яшчэ далей нясецца, то і яны туды памкнуліся. Толькі і на гэты раз нічога не знайшлі. Малыя яшчэ былі, не маглі зразумець, што гэта рэха іх абкручвае, у гушчар непралазны заводзіць. Цягнуцца за галасамі, вось-вось, здаецца, убачаць сваіх рагатых валоў. Аж не тут-то было! Залезлі ў нейкую дрыгву, чвякае пагрозліва пад нагамі, угінаецца пакрытае рэдзенькаю траўкаю балота, не так ступіш — на той свет адразу трапіш. Валоў і блізка не чуваць, голас жа, наадварот, выразней стаў, то якіх крокаў сто засталося. Сабралі апошнія сілкі дзеці і... выбіліся на нейкі груд, а на ім валы іхнія пасуцца сабе мірнадружна, хвастамі тоўстымі памахваючы. Ужо і сонца за лесам садзіцца, дамоў пара жывёлу гнаць. А куды ж кіраваць? Заплакалі Колька з Полькай ад адчаю. Ды аднекуль здалёку данёсся да іх магутны голас:

— Валы ганіце! Валы ганіце! О-го-го! Валы ганіце!

— Дзядуля гукае, чуеш? — звярнуўся да сястры Колька.

— Ага,— узрадавалася тая.

— Ганіце, унучкі, ганіце,— здалёку неслася магутнае гарланне.

На той голас і накіравалі жывёл малыя. Валы-то не надта хутка ідуць, аглядваюцца, нібы нічога і не здарылася.

Пакуль выбіліся Колька з Полькай на знаёмую дарогу, пакуль здагадаліся, як далей прабівацца, то і голас той, што крычаў, каб валы дамоў гналі, паслабеў.

На тым самым месцы, дзе яны раніцай рассталіся, іх чакаў дзядуля, які ўжо нават і гаварыць не мог, не тое што крычаць. Узрадаваўся ён і павёў дзяцей дамоў. З таго часу тую вёску сталі зваць Валыжэнь, а потым ужо і горадам Валожынам яна стала.

## ІВЯНЕЦ

Даўно, надта даўно ўсё гэта было. Колькі стагоддзяў прайшло — вам дакладна ніхто і не скажа. Усё

мяняецца, і жыццё міма бяжыць, як вада ў рацэ.

Гэты куточак нагадваў сабою райскі сад. Усё навокал цвіло, буяла. Птушкі, нібы званочкі, пастаянна спявалі, і нават чорныя хмары не жадалі тут спыняцца, каб не перашкаджаць такому адвольнаму існаванню раслін і жывёл. Людзей жа тут не было. Ці то яны неяк міналі край гэты, ці па якой іншай нагодзе, але ні адзін чалавек не заначаваў у гэтым краі, ні адзін нават проста не праехаў.

Ішлі часы, міналі стагоддзі. І вось аднаго разу паказалася на ўскрайку карэта, ды такая прыгожая, што ажно зіхацела-пералівалася на сонцы, нібыта хто каляровае шкельца пад ясныя прамяні падсунуў. За карэтай ехалі добраўзброеныя здаравенныя коннікі і пільна сачылі за наваколлем. Па ўсяму было відаць, што ў карэце падарожнічаў не абы-які чалавек, а заможны, якога старанна ахоўвалі і баяліся, каб нават волас не ўпаў з яго галавы. А на самай справе аказалася, што ехала ў ёй вяльможная паненка. Ад бацькоў перайшлі ёй у спадчыну шматлікія землі, і вырашыла яна кіраваць сваім княствам не з пакоя, а паглядзець на ўласныя вочы свае ўладанні — і зямлю, і людзей. Таму і загадала запрэгчы карэту. А раз гаспадыня сказала, то слугі ды воі абавязкова павінны выконваць. Умомант усё было падрыхтавана для паездкі. А яшчэ праз пару гадзін рушылі ў невядомую далячынь. Ехалі тыдзень, ехалі другі, а краю княства ўсё не было відаць. Пайшоў чацвёрты тыдзень — навокал усё роўна адны палі, лясы, лугі, а межаў не бачна. Тады загадала князёўна:

— Дамоў не вернемся да таго часу, пакуль усе ўладанні не аб'едзем.

— Але ж, мая вяльможная...— пачаў было стары ваявода.

Ды гаспадыня яго абсекла:

— Як сказала — так і зробім, няма чаго нейкія адгаворкі шукаць, каб дамоў хутчэй вяртацца!

— Ды...

— Калі нехта з маладых паноў азадак сядлом нацёр, то няхай сабе вяртаецца, стрымліваць нікога не стану.

— Але ж...

— Я, здаецца, ясна сказала?!

— Так, мая вяльможная. Толькі я хацеў параіць.

— Што?

— У гэтых мясцінах я ніколі не быў. Не трэба, відаць, так гнаць коней, лепш рухацца наперад павольней.

— Чаму гэта?

— Мала што можа здарыцца.

— Раз так гаворыш, то баішся!

— Не ў тым я ўзросце, вяльможная пані, каб баяцца. За сваё жыццё мне давялося гэтулькі страшнага ды жудаснага пабачыць, што і палохацца развучыўся. Проста...

— Што проста?

— Мясціны незнаёмыя, усялякае можа здарыцца.

— У нас жа ахова шматлікая і добра навучаная.

— Адносна аховы і я, гаспадыня, спакойны, але ж...

— Ну колькі можна, гавары!

— Здараюцца такія сітуацыі, што і ахову можна знянацку заспець.

— Як гэта?

— Калі нечакана нешта ў прыродзе пераменіцца, тады і воі, як ні будуць старацца, нічога не перайначаць. Таму і прашу, каб не надта гналі. Лёкаю што — яму бізуном палыскáй па конскіх спінах і ўсё на тым, а нам жа і асцерагацца трэба. Загадайце, каб так не гналі, мая вяльможная пані,— зноў схіліўся ў паклоне стары ваявода.

— Добра, раз ты ўжо так мяне просіш ды перажываеш, загадаю.

Некалькі дзён ехалі павольна, а потым паненка забылася на перасцярогу. І паляцелі коні, нібы стрэлы, а яна толькі рагоча, высунуўшы галаву з карэты. Ахова ледзьве паспявала за экіпажам, пра пільнасць ужо гаварыць не прыходзілася. Праўда, заўважыўшы гэта, ваявода паклікаў да сябе лёкаяў і папярэдзіў, што пакарае за свавольства, ды тыя спаслаліся на загад гаспадыні.

Так падарожнічалі яшчэ колькі часу, усё было добра. І ўсё ж нечакана на бяду наскочылі. А здарылася вось што.

У адным месцы даўней была вялікая балаціна. З году ў год яна падсыхала і меншала. Але пасярэдзіне засталася твань-багна, густа парослая травойасакой. На першы погляд і не здагадаешся, што там да чаго. Разагналі коней лёкаі, і яны паляцелі прама ў тое балота. А дарогі ж не было, бо тут жа даўней

ніхто ўвогуле не ездзіў і не хадзіў. Як пёрлі коні, так і ўляцелі на поўным скаку ў балота, карэта па самыя дзверцы ў той твані загрузла. Тады стары ваявода і прамовіў:

— Ну вось — здарылася... Я ж яе папярэджваў... А зараз...— павярнуўся да вояў і закрычаў: — Воі, ратуйце паненку! Паненку глядзіце!

Кінуліся тыя на злом галавы, але дзе там! Неўзабаве пярэднія закрычалі:

— Падступіцца нельга! Нельга!

— Наперад! — трацячы кантроль над сабою, закрычаў ваявода.— Выцягніце карэту!

— Нельга! Нельга падступіцца! Коні нашы пагрузлі і самім не падабрацца!

— О Божа! — заламаў рукі стары ваявода. — Няўжо князёўна на нашых вачах загіне і мы нават не паспрабуем вызваліць яе?!

Праз хвіліну ён аддаваў ужо іншую каманду:

— Сячыце голле, дрэўцы, кустоўе! Гаціце гаць! Хутчэй, бо карэта тоне! Хутчэй!

Пабеглі людзі. Застаўся на месцы адзін ваявода і ягоны ахоўнік — малады дружыннік. Сталі чакаць, бо здавалася, што час цягнецца надзвычай марудна. І тут ахоўнік звярнуўся да ваяводы:

— Глядзіце!

— Куды? Што ты ўбачыў?

— Вунь туды.

Стары глянуў туды і аслупянеў. У нейкім дзесятку крокаў ад іх на невысокім пагорачку сядзела прыгожая незнаёмка і пляла з кветачак вянок.

— Адкуль яна тут? — міжволі вырвалася ў ваяводы.

— Не ведаю,— пацісну ў плячыма асілак.— Сам толькі што ўбачыў.

Пераглянуліся, і ваявода загаварыў, звяртаючыся да дзяўчыны:

— Дзяўчына, ці не падкажаш ты нам выйсце з нашага становішча?

— Падкажу,— ускінулася тая.

— Ну дык гавары, хутчэй!

— А скажыце сваёй князёўне, каб яна выканала маю просьбу.

— Зараз, ты толькі не ўцякай, пачакай хвіліну-другую.

Закрычаў ваявода, да сваёй князёўны звяртаючыся. У адказ гаспадыня прахліпала, што згодна на

любыя ўмовы, каб толькі яе выратавалі з балота, бо гінуць не жадае.

— Што ж ты просіш, незнаёмка? — запытаўся ваявода.

— Ды так, дробязь.

— А ўсё ж?

— Няхай твая гаспадыня загадае засяліць гэтую мясцовасць людзьмі.

— Згаджаюся! — данеслася нецярпліва з карэты.

— Вось і добра,— усміхнулася дзяўчына.— Болей мне нічога і не трэба.

Толькі так прамовіла — коні самі, без дапамогі, выцягнулі карэту з балота. Ваявода з дружыннікам нават і не паверылі, гэтак лёгка яна пакацілася.

Узрадаваная князёўна высунулася ў дзверы і запыталася ў незнаёмкі:

— Як жа цябе завуць?

— Ат, навошта вам гэта?

— То хоць скажы, як мне месца гэтае пазней назваць.

Дзяўчына на хвіліну задумалася, а потым бойка адказала:

— Ці бачыш, князёўна, у маіх руках вянок?

— Вядома ж.

— Прыгожы ён?

— Вельмі.

— То і назаві тады месца гэтае Івянцом. Яно ж таксама надзвычай своеасаблівае і непаўторнае.

Так і стаў з таго часу Івянец.

## ДУБІНА

Раней у нашых мясцінах існавала вёска без назвы. Вакол яе прырода надзвычай прыгожая была — лясы, лугі, палі жытнёвыя. Жылі сабе вяскоўцы і ў вус не дзьмулі. Хлеба хапала на кожны дзень, апранушца было ў што, таму падстаў для асаблівых хваляванняў не было. Весяліліся, песні спявалі, святы ўсялякія адзначалі. Адным словам, жылі людзі!

Але ж не ўсе прызвычаіліся з дзяцінства ежу сабе на стол зарабляць салёным потам ды крывавым мазалём. Колькі іх такіх было, што на карку ў селяніна сядзелі? Зараз і палічыць цяжка. І ў наш час, трэба сказаць, хапае ўсялякіх абібокаў ды лайдакоў.

Але можна адно сказаць дакладна: у даўняй, старажытнай вёсцы найбольш лёгка жылі папы і карчмары. Хітрыя гэта былі людзі. Са звычайнай вады святую рабілі, з галубкі — райскую птушку на вачах ляпілі і г. д. А карчмары!.. Ні для каго не сакрэт, што ў карчмары ішлі хітрыя яўрэі і не менш сквапныя ды прадпрымальныя вяскоўцы, якія б і з роднага бацькі апошнюю кашулю садралі.

Дык вось у тагачаснай нашай вёсцы жылі такія ж сквапныя і ненажэрныя поп і карчмар. Сябравалі, былі як дзве рукі ў аднаго тулава. І яно зразумела. Трэба ж да каго за падтрымкай, за дапамогай звярнуцца, калі, часам, няўдача напаткае. Сам жа ўсяго не перахапаеш, ды і цяжка нешта новае аднаму прыдумваць, няма з кім параіцца. Хіба жонцы-дурніцы такія справы можна давяраць? Яна ж доўгі язык мае, не паспееш сказаць, а ўжо ўсё наваколле пра гэта ведае. Чарку-другую прапусціць таксама найлепей за ўсё з верным сябруком.

Вось пасядуць поп з карчмаром у карчомцы, калі там людзей няма, ці ў бацюшкавай хаціне і думаюць-разважаюць, як зноў дзе-небудзь лішнюю капейку сабе ў кішэню ўкінуць. Не часта, але, здаралася, і атрымлівалася, ды такое, што іншыя дзіву даваліся, як гэта толькі чалавек здольны да такога дадумацца. Аднаго разу бацюшка і гаворыць свайму паплечніку:

— Ведаеш што, каханенькі? Хачу вось такую справу з табою правярнуць. Перастаюць паціху вяскоўцы ў царкву хадзіць, а калі і прыходзяць, то толькі пад сценкамі стаяць, іх старанна падпіраюць, ды яшчэ і не нясуць амаль нічога. Так хутка і галадаць давядзецца. Ты-то хоць віно вадою разводзіш, і то нейкі набытак ёсць, а мне хоць памірай. А жыць хочацца добра, каб усё было, каб усяго ставала, бо і матушка, і дочкі паесці любяць, паспаць, а працаваць з-пад кія не прымусіш. Думаю, знаеш што? Трэба ікону занесці куды-небудзь ды сказаць, што гэта дух Божы зрабіў, і грошы будзем дадатковыя браць... Вось толькі куды ўсё засунуць, як здзейсніць, каб не здагадаліся вяскоўцы, бо тады не паверацьі смяяцца будуць. Надзейнага чалавека знайсці б, абы-каму не даверыш такую справу адказную.

— Ёсць у мяне, бацюшка, такі чалавек,— азваўся карчмар,— ёсць, і абавязаны мне многім. Дапамагаў

я яму, калі сям'я ягоная амаль уся пры смерці ляжала. Выручыў тады моцна, таму і выканае любое даручэнне. Сам мне пра гэта колькі разоў даводзіў. Я калі-нікалі яму чарку-другую за так наліваю, каб мацней трымаць за каршэнь. Калі што, дык падсуну разлік, тут ужо не да супярэчання будзе.

— Малайчына ты ў мяне,— задаволена загуў поп і паляпаў сябе далонямі па вялізным чэраве, якое, як чыгун, выпірала з-пад расы.— Малайчына... Клікай яго сёння на вечар да сябе, мы яму тут і скажам, што зрабіць трэба. Справа не надта складаная, але прыбытак павінна прынесці, і не малы.

Абодва суразмоўцы радасна пацiралі рукі ў прадчуванні хуткай удачы.

— Добра, бацюшка, добра,— адказаў карчмар,— усё зраблю, як і належыць, і вяскоўца таго паклічу на вечар. Ды вы яго і самі добра ведаеце.

— А хто гэта? — не ўтрываўся цікаўны поп.

— Васіль-пастух. Васіль-пастух,— чамусьці паўтарыў карчмар.

— Як жа, ведаю добра, ведаю.

Вечарам абодва хаўруснікі сядзелі ў карчмаровай хаце і чакалі, калі ж з'явіцца да іх Васіль, па якога паслалі карчмарову дачку. Нарэшце стукнулі дзверы, і на парозе ўзнікла высакаватая постаць здаровага чалавека, які ажно галаву прыгінаў, каб не стукнуцца ёю ў нізкую столь.

— Вечар добры,— павітаўся ён,— вечар добры вам.

— Здароў, Васілька, здароў,— ласкава затараторыў карчмар.— Праходзь, сядай да нас за стол. Чарку-другую вып'еш. Чаго стаяць, у нагах праўды няма, як гавораць,— выпаліў гаспадар і задаволена закірхаў-засмяяўся.

Пасунуліся за сталом, налілі ёмкую чарку і паднеслі пастуху.

— Глыні, братка, глыні, лягчэй размаўляць будзе!— запрапанаваў поп.

Васіль доўга не прымушаў сябе ўпрошваць і глынуў. Выцер далонню вусы і сказаў:

— Добрая гарэлка, добрая, гаспадар. Дзякую за пачастунак.

Але не паспеў ён прыхапіць нейкім там агурком, як карчмар зноў наліў і запрасіў:

— Лясні яшчэ, Васілька, а то скісне! Не цягні, святая справа!

Пастух зноў перакуліў і схіліўся над міскай з кіслай капустай, пачаў шпарка працаваць лыжкай. Бацюшка і карчмар пераглянуліся, ім, мабыць, падумалася: «А можа ўжо хопіць паіць?» Але поп пацягнуўся да гляка і наліў яшчэ поўную чарку гарэлкі.

— Эй, добры чалавек, як вяскоўцы кажуць, трэба тры разы добра выпіць, каб нешта важнае меркаваць!

Васіль выпіў і на гэты раз. Тады ўжо карчмар не ўтрываўся і пачаў гаварыць:

— Васіль, ці ты памятаеш, як я цябе выручыў у той жудасны год?

— Памятаю...— панура адказаў той.

— Вось і цяпер табе крыху дапамагаю, бо нельга ж па-іншаму. Мы, аднавяскоўцы, як родныя дзеці...

Пастух хітнуў галавою, але нічога не сказаў.

Далей гаварыў бацюшка:

— Тут, Васілька, справа нескладаная. Але твая дапамога нам неабходна. Не, не падумай чаго дурнога. За гэта караць ніхто не будзе. Мы яшчэ і даплацім табе рублёў колькі. Толькі выручай.

— Дзесяць,— ціхенька шапнуў пастух.

— Чаго дзесяць? — не зразумеў карчмар.

— Рублёў дзесяць,— адказаў Васіль.

— Дык гэта ж колькі грошай! — узвіўся поп.

— А я што, не ведаю? Вы ж нешта такое задумалі, ад чаго бедным сялянам палёгкі не будзе. На такую дрэнь вы здольны. На ўласнай шкуры адчуў...

— Што ты, што ты, Васілька,— адразу палагоднеў карчмар,— што ты такое кажаш? Не трэба гэтак нас няславіць. Грошы мы табе дамо, толькі зрабі.

— Тады іншая справа, тады зраблю,— паспакайнеў пастух адразу.— Кажыце, што трэба зрабіць.

Бацюшка з карчмаром нахіліліся да яго і пачалі шаптаць. Твар Васіля палагоднеў:

— Гэта зраблю, гэта не надта складана.

Аказваецца, хаўруснікі загадалі пастуху зацягнуць ікону на высачэзны дуб, які мо дзесяць стагоддзяў ужо рос на гэтай зямлі.

— Давайце грошы адразу, бо ведаю я вас: ашукаеце, калі на потым справу гэтую пакіну.

Аддалі поп з карчмаром яму дзесяць рублёў, усунулі ў рукі ікону, і пастух пайшоў з хаты.

А днём хаўруснікі, бегаючы па вёсцы, усім аб'яўлялі,

што на дубе з'явілася ікона, і з'явілася не сама па сабе, а яе туды ўзнёс дух Божы.

Павалілі тады людзі з розных вёсак спачатку ў царкву, а потым і ў карчму. Плацяць грошы не шкадуючы ды пытаюцца ў бацюшкі і ў карчмара, ці памагае гэтая боская іконка?

Тыя, хітра прыжмурваючы вочы, гаварылі:

— Наколькі нам вядома, то дапамагло дваім. Нават, чакайце, траім добра дапамагло.

З той часіны і сталі вяскоўцы пакланяцца іконе на дубе, а вёску адтуль і празвалі Дубіна.

## КАМЕНЬ

Мясцовыя жыхары лічаць: вёска іхняя носіць сваю назву не таму, што вакол яе некалі, у даўнія стагоддзі, «раслі» камяні, драбіліся і перасоўваліся на значныя адлегласці (цяпер большасць палеткаў саўгаса імя Маякоўскага ачышчана ад камянёў). Імя сваё вёска атрымала ад валуна-волата (які найчасцей называюць не іначай як «возам»), паблізу ад якога і пачала будавацца.

Можа, яно і не надта праўдзіва атрымліваецца, але слухайце, гэтак і мне даводзілася чуць. Розныя людзі казалі, але найбольш старыя, якія ўжо даволі пажылі-пагаравалі на белым свеце і ведалі, што да чаго атрымліваецца. Распавядалі і мае равеснікі, ды рабілі гэта пасля таго, як самі пачулі ад некага. Нехта нават даводзіў, што знаў ці то самога таго селяніна, з якога ўсё і пачалося, ці то некага з яго родных. Забылася ўжо, праўда, за даўнасцю гадоў. Але самае галоўнае памятаю добра, бо ў ім нічога мудрагелістага няма. Даўней не з адным, казалі, такое магло здарыцца (і што самае галоўнае — здаралася!). Прыводзілі прыклады, ды і самі паглядзіце, колькі населеных пунктаў носіць такую назву. Многа, надта многа.

Але цяпер будзем распавядаць пра нашу вёску. Слухайце.

Здарылася гэта ў даўніну, пра якую ўжо і дзяды нашы не памятаюць. Жыў тут Мітрык. Чалавек, як шмат іншых. Нічым асаблівым не вылучаўся. Хіба што толькі адным — так па-майстэрску лаяўся і праклёны слаў на чужыя галовы, што другога такога, можа, і ва ўсім свеце не знайшлося б. З самае раніцы,

бывала яшчэ вочы добра не прадраўшы і ад сну не ачомаўшыся, пачынаў:

— Каб яны, гэтыя злыдні, жыцця не ведалі! Каб яны штодзённа за камень гарачы хапаліся, а не за дзяцей сваіх! Каб вы скакалі, як рыба пад нажом! Каб вы на хваробу тое аддалі, што з мяне гвалтам садралі! Каб ваша нага ў далейшым тут ніколі не ступала! Каб вашы дзеці вам «здароў быў!» не казалі! Каб сонца вы яснага не бачылі і зорак не сустракалі, адно толькі ў цемры вочы свае прадзіралі! Каб вам усё тое стала, што вы мне думаеце-жадаеце! Каб вашы двары травою-лебядою пазарасталі і каб вы тудою нагамі не праступалі!

Жонка не ўтрывае часам і спытае:

— Мітрык! Ну каго ты ўжо сёння клянеш-апаганьваеш? Здаецца ж, яшчэ нікога з раніцы і не бачыў, не сустракаў, а ўжо столькі ім нажадаў, што каб спраўдзілася, то і не ведаю, што было б...

— Каму, каму,— злосна вымаўляў гаспадар,— вядома ж, суседзям! Ты думаеш, я не адчуваю, пра што яны думаюць-мрояць? Ведаю, да самых драбніц ведаю. Нічога там добрага для нас няма! Не, няма! І таму ім таксама такога ж трэба пажадаць, каб не надта супакойваліся, а ведалі, што ў любым выпадку здачы атрымаюць!

Перадыхнуўшы, паразмаўляўшы крыху з гаспадыняй, Мітрык працягваў далей, асабліва нават і не задумваючыся, не падбіраючы слоў ды «зычанняў», бо яны ў яго былі ўжо зараней падрыхтаваны, ці, як кажуць, засталіся з мінулага разу.

— Каб з вашых ратоў гноем несла! Каб вы сярод ночы, спрасонку, крычалі! Каб вас усіх, разам узятых, зямля не насіла, як вы ўжо мне надакучылі! Каб вас маланкі-распеОт разанкі пабілі, а каго не зусім, то каб прышалопленыя хадзілі!

— Сядай ужо есці,— пасміхваючыся, адцягвала ад улюбёнага занятку жонка мужа. Яна ўжо на такія справы і ўвагі не звяртала — прызвычаілася.— Астыне ўсё на стале, тады мяне клясці будзеш!..

Мітрык, пачуўшы пра ежу, працягваў з новымі сіламі:

— Каб вы есці ніколі не хацелі, раз вы чужога дабра жадаеце! Соль вам у вочы, перац вам у нос, у дыхавіцы, каб вы, яго ўдыхнуўшы, ажно распеpазаліся,

ды не на дзень-два, а на тыдзень, а хто злейшы, то той каб і на болей!

— Сядай хутчэй, ды ў лес жа ехаць час настаў, бо адстанеш ад усіх, зноў каго-небудзь крайнім зробіш,— пачынала злаваць жанчына.

Муж садзіўся і, сёрбаючы ежу, супакойваўся. Але гэтак працягвалася нядоўга, бо калі выходзіў, апранаючыся, з хаты, то зноў заводзіў сваё, толькі яму аднаму вядомае:

— Нічога, нічога, натрапіце і вы на сваё! Паглядзім, з якога вы поля ягадкі, з якога вы гняздзечка птушачкі. Няўжо думаеце, што не здагадваюся? Як бы не так!

Хвіліну памаўчаўшы, пачынаў брыдка лаяць небараку-каня, які і адказаць не мог належным чынам:

— Каб на табе шкура трэснула, ваўкарэзіна чортава! Каб табе ногі пакурчыла! Каб табе зубы павыпадалі ўсе да аднаго! Бач ты на яго, раз'еўся на маіх харчах ды яшчэ і зубы на мяне шчэрыць?! Гэта ж трэба, гэта ж нідзе даўней такога чуваць не было!

Карацей кажучы, пакуль Мітрыку ў поле ехаць ці ў лес, а ў гэты дзень ён якраз у лес і кіраваў, то ўсіх блізкіх, родных, суседзяў і жывёлу таксама абняславіў і закляў на доўгія часы. Каб толькі такое спраўдзілася ў адзін момант, то, мабыць, усё прапала б, знішчылася, высахла на корані.

Едзе дарогаю ў пушчу ды не забываецца яшчэ пра каго-небудзь згадаць:

— Каб ты сто гадоў жыў і ўсё не лётаў, а ракам поўзаў! — гэта вясковец ворану адпусціў, які асмеліўся каркнуць над галавою.— Рассеўся, скрыдлы свае чорныя распусціў! Каб на цябе хмару цёмную напусціла! Каб ты ніколі болей у неба не ўзняўся, хапуга чорны!

Абражаны воран нават каркнуць болей баяўся пасля такіх пажаданняў. Сцішыўся, дый годзе на тым.

А Мітрык далей кіруе, ужо хутка і ягоная дзялянка, дзе дровы трэба было на воз грузіць. Іх ён раней нарыхтаваў, ды цяпер настаў прыдатны час на падвор'е вазіць, каб было чым у печы тапіць, есці варыць ды хату абаграваць.

Пад'язджае крокаў трыста, ажно заяц касавокі праз дарогу як улупіць, конь як захрыпіць з перапуду, а гаспадару толькі гэтага і трэба. Узвіўся зноў і з такімі праклёнамі накінуўся на ўцякаючага зайца, што

лес і той панурыўся, бо не чуў, мабыць, раней такіх брыдкіх слоў.

— Каб табе твае лапы назад павыкручвала, чорт лапавухі! Каб ты апошні раз па гэтым лесе бегаў! Каб цябе да вечара звер які ўпаляваў і адно ад цябе засталося, што толькі шматок хваста!

Прыехаў на дзялянку, прывязаў коніка і давай дровы накладваць. Наваліў столькі, што і ў два кані трэба было б падумаць, як іх дамоў давезці, а ў яго ж толькі адзін, ды і той не вельмі каб спраўны быў. За такімі праклёнамі, можа, і жывёліна не развівалася добра. Што ж вы думаеце? Калі на яе казаць абы-што, то і яна можа абразіцца.

Стаў запрагаць коніка, а той нібы палохаецца, гэтулькі дроў на возе ўбачыўшы. Тады гаспадар як перацёг яго пугай ды зноў праклёнамі ўзнагародзіў:

— Каб жа ты, ваўкарэзіна, пасля гэтага бегаў не супыняўся, каб ты спакою не меў!

Але конік быў нягеглы, слабы і калі спачатку неяк яшчэ цягнуў воз, то на пад'ёме на невысокую горку зусім выбіўся з сіл. Колькі ні паганяў яго Мітрык — ні з месца жывёліна, нават колы не скране. Пачаў тады яго Мітрык пугай хвастаць ды ад злосці яшчэ праклінаць-прыгаворваць:

— А, каб ты, воўчы недаедак, у камень непарушны ператварыўся!

Пачуў конік такі страшны праклён, паднапружыўся, неяк усцягнуў-такі воз на гару ды зноў прыстаў. Вясковец хвошча яго пугай, сячэ-паганяе, а конік стаіць, унурыўшы галаву, і анічога ўжо не чуе і не адчувае. Хоць ты бі яго ці забі — ўсё роўна. Але Мітрык, замест таго каб супакоіцца, далей праклінае. Потым азірнуўся нечакана паглядзець, як там воз, ці трымаецца, і аслупянеў ад здзіўлення і страху: няма воза з дровамі, замест яго ляжыць шэры камень велічынёй з добры воз. Кінуўся тады каня распрагаць, ды толькі і тут запазніўся, бо як за хамут узяўся, дык убачыў паміж аглабель цёмна-шэры, такой жа, як ягоны конік, масці, камень...

Вось з таго самага часу і пайшла назва вёскі — Камень. Бачыце, да чаго можа прывесці людская злыбеда ды жорсткасць. Яна і праз стагоддзі да нас дайшла, дзякуючы такім своеасаблівым паданням і легендам.

## РУМ

Гаварылі старыя людзі наступнае: некалі ў сівыя стагоддзі было заснавана наша паселішча. Многа яму гадоў. Колькі — адназначна нельга сказаць, але што многа, то гэта дакладна. Расказваюць легенды і паданні пра тое, адкуль яно ўзнікла. Мне даводзілася такое вось чуць. Зараз і вам перакажу, калі ахвота ёсць паслухаць. Ад вопытных людзей чула, не думайце, што сама выдумала. Праўда гэта, чыстая праўда.

Жыла некалі тут жанчына маладая. Нарадзіўся ў яе сыночак. Муж некуды адлучыўся быў і назад не вярнуўся — ці, можа, у рацэ ўтапіўся, ці звер дзікі напаў, ці, што найбольш верагодна, ліхія людзі жыцця пазбавілі. Але здарылася так, што толькі маленькі на свет з'явіўся, нейкі год ці два прайшло, і жанчына тая дужа захварэла. Суседзі спрабавалі неяк дапамагчы. Але ж тады дактароў не было, лекаў добрых таксама. Паклікалі старую бабульку, што ведала шмат замоў, каб яна паспрабавала зняць хваробу, ды тая ў адказ толькі рукамі развяла:

— Не магу, мае дзеткі, нічога зрабіць, бо хвароба надта запушчаная і маім словам не паддаецца! Ужо ёй і дзіў-траву завараную піць давала, і замовы самыя моцныя шаптала — нішто не дапамагае. Нават не ведаю, як далей і падступіцца. Хіба трэба да Восіпа-краўца каго паслаць, хай ён прыйдзе. Калі й Восіп не дапаможа, то толькі на волю Божую можна спадзявацца і чакаць з неба міласці.

Паджгалі па Восіпа-краўца ў суседнюю вёску. Пад вечар і той чалавек прыйшоў, але яшчэ ад парога глянуў на маладзіцу і спахмурнеў яго твар:

— Цяжка хварэе родненькая, цяжка. Паспрабую, але не гарантую, што дапамагу. Не гарантую...

Выгнаў усіх з хаты вараджбіт і давай свае справы правіць. Доўга ўсё гэта працягвалася. Ужо і прыцемкі па дварэ папаўзлі. Потым выйшаў, узмакрэлы, з хаціны і гаворыць:

— Выбачайце, людзі добрыя, усё, што мог, я зрабіў, а далей як Бог дасць. Будзем спадзявацца на лепшае. Вось каб вы раней па мяне прыйшлі, то тут нічога складанага не было. Застудзілася бедалага недзе надта моцна, не вылежалася, а ўвесь час на нагах знаходзілася. Бачыце, да чаго дабегалася. Што Бог дасць — тое і будзе...

Не дапамагло ягонае чараванне, не дапамаглі замовы і бабкі-варажбіткі. На світанні сканала маладзіца, адно толькі, нібы ачнуўшыся ад хваробы, паспрабавала рукі да сына працягнуць, ды так і не здолела гэтага зрабіць. Памерла бедная, такая маладая ды прыгожая.

А ў яе нікога з блізкіх родных не было сярод жывых. Таму немаўля ўзялі да сябе чужыя людзі, зжаліліся над дзіцём. Раней людзі ўвогуле намнога лепшымі былі, чым зараз. Спачувалі надта адзін аднаму. Жыццё такое было, што прымушала ўсіх разам трымацца, каб злыбеду якую пераадолець, гора не баяцца. Забралі ў сваю хату хлопчыка, а ён жа маленькі зусім, карміць малаком трэба, плача па начах. Вяскоўцы, праўда, на гэта нічога злога не гаварылі і, даруй Божа, праклёнаў ніякіх не мовілі. Хто ж ведае, які чалавек потым з дзіцяці вырасце. Будзеш да яго дрэнна адносіцца, то і ён потым табе гэткім самым адплаціць.

Некалькі дзён так пабыло, што плача хлопчык начамі, есці просіць, а далей сціхла дзіця і спіць сабе, як ні ў чым не бывала. Пачалі гаспадары прыглядвацца, каб, чаго добрага, і немаўля не захварэла. Але нічога — ружовенькае, спіць соладка, расце, нібы на дражджах. Дзівуюцца з такога: і есці не просіць дзіця, а расце. Але ўсю справу праясніў стары дзед, які жыў са сваім сынам у гэтай жа хаціне. Спаць ён мала спаў. Ат такое там. Драмаў, дый годзе. Ледзь толькі што шкрабне, то вочы старэча і адкрывае. Дык ён аднаго разу і сказаў хатнім:

— Ведаеце што, мае каханыя? Цяпер я дакладна ведаю, чаму наш Васька есці не просіць. Чаму толькі спіць спакойненька і расце гэтак хутка. Да яго начамі карміць нехта прыходзіць. Вы напрацуецеся за дзень і спіце, нібы забітыя, нават не чуеце, як ён закірхае, просячы чаго-небудзь. Толькі ўсплакне раз-другі, і адразу выразна чуюцца нечыя крокі, потым калышацца калыска і немаўля заціхае, цмокаючы губкамі. Значыцца, яго нехта і корміць тым часам...

— Быць такога не можа,— неяк устрывожана не пагадзілася старая і гаспадыня хаты з ёю.— Гэта ж нячыстая сіла ў нашай хаце завялася ці што яшчэ такое? Хто ж можа хадзіць па хаце і заставацца нябачным?

— Чаму адразу нячыстая сіла? — умяшаўся ў га-

ворку сын.— А можа, гэта ягоная маці. Можа, нават не сама маці, а яе душа да сына па першаму ж крыку прыходзіць. Чаго ў гэтым дрэннага?

— Дрэннага-то, сыночак, можа, і не многа, але ж неяк атрымліваецца незвычайна. Каб чаго дурнога зноў не выйшла. Тады людзі на нас будуць гаварыць, што мы малога са свету белага звялі.

— Але ж і матулі ягонай нельга забараніць да немаўляці прыходзіць,— не здаваўся сын.

Пастунова ўсе хатнія яго пераканалі, што душу, якая ноччу па хаціне тупае, трэба неяк адвадзіць, бо можа здарыцца непапраўнае.

Пайшлі зноў за парадаю да таго ж Восіпа-краўца. Выслухаў людзей варажбіт уважліва і таксама прызадумаўся, потым ціха прамовіў:

— Можа, гэта і душа ягонай маці ходзіць, толькі небяспечная такая з'ява. Калі малы падрасце, то можа страшэнна напалохацца і потым ці памерці, ці да зляку спалохацца. Дам я вам верны сродак, які разоў за колькі адвадзіць таямнічую душу з'яўляцца надалей у вашай хаце.

Выйшаў Восіп з хаціны, некаторы час яго не было, а калі вярнуўся, то трымаў у руках невялічкі вузельчык. Падаючы яго вяскоўцам, сказаў:

— Вось гэтым попелам будзеце пасыпаць падлогу ў хаце на працягу тыдня. Асабліва высыпайце старанна там, дзе ходзіце да калыскі, каб дарогу перасыпаць ад парога. Душа тая памкнецца, памкнецца, адчуе, што шляху ёй болей няма, і не з'явіцца.

Прыйшлі дамоў гаспадары і гэтак, як Восіп вучыў, зрабілі. Ноччу выразна чулі ўсе, бо стараліся ўжо не спаць, як нехта доўга і цярпліва тупацеў ля парога, вохкаў, плакаў, але калыска не калыхалася. Так рабілі на працягу цэлага тыдня. Болей ніхто не хваляваў дзіця, не ішоў па начах у хату.

У хуткім часе хатнія забыліся пра гэта, бо не да таго было. Васька вырас неўзабаве такім магутным і спрытным хлопцам, што ўсе навокал толькі дзівіліся, ад каго ён стаў гэткім асілкам. Бацьку яго добра памяталі, але ж той і ростам і па сіле быў звычайным чалавекам, а тут здаравяка, што мядзведзя паваліць зможа папросту. Гаспадароў, якія яго выгадавалі, бацькам і матуляй зваў, бо не ведаў усёй трагічнай гісторыі, ніхто яму пра гэта не даводзіў, шкадавалі хлопца, каб душу не раніць.

Стаў Васіль значнай падмогай у гаспадарчых справах сваім бацькам, але найболей да яго прывязаўся і шкадаваў стары-стары дзед, які дачакацца не мог, калі хлопец у хату ўвойдзе, каб пагаварыць з ім, паразмаўляць. Неяк асілак падзяліўся з дзедам патаемным:

— Я вось што задумаў. Падбяру чалавек з пяць добрых, спрытных хлопцаў ды буду з імі плыты сплаўляць туды, дзе лесу няма, дзе ён у вялікай цане. Капейку можна добрую зарабіць і гаспадарку зрабіць моцнай, на ногі стаць, каб ні ад каго не залежаць. Пару чалавек ужо пагадзілася. Яшчэ пару — і пойдзем зімою лес да Іпуці звозіць, каб вясною плыты вязаць і праводзіць куды далёка.

Сапраўды, у хуткім часе Васіль з сябрамі пачаў вазіць здаравенныя бярвенні на бераг і складаць іх у месца, каб потым лягчэй і спрытней было вязаць у плыты. Па веснавой вадзе паплылі хлопцы ад роднай вёскі. Дамоў вярнуліся толькі позняй восенню: узмужнелыя, засівераныя, з багатым прыбыткам. Гаспадары нарадавацца не маглі, гледзячы на такога хлопца. Дзед дык той ажно ў скокі пусціўся, убачыўшы яго на парозе.

Аднаго разу гаспадары параіліся паміж сабою і вырашылі расказаць Васілю ўсё пра ягоных бацькоў, каб ведаў, што там да чаго. Але хлопец іх мякка перабіў:

— Я ведаю, родныя. Усё ведаю...— вымавіў ён, і спахмурнеў яго мужны твар.— Мне Восіп-варажбіт распавёў, калі я ягоную кароўку з балота вывалак, адкуль яе ўжо, думалі, ніякая сіла не дастане. Не трэба пра гэта. Вы цяпер мае бацькі, і ні на каго я вас не памяняю.

Там, дзе Васіль з сябрамі лес складваў, пазней карчма стала, будыніны розныя з'явіліся. А назву Рум даў не хлопец і не самі людзі, а немцы, якія нечага тут апынуліся. Рум, па-іхняму, нешта азначала. Яны зніклі некуды, а вось назва так і засталася да нашых дзён.

## САЛАНАЯ

Пра тое, адкуль вёска наша пайшла, мне мой родны бацька распавядаў, зямелька яму пухам. Асабліва калі крыху дзе вып'е, бывала, то горкімі слязьмі

заліваецца і расказвае. Было пра што яму прыгадаць, бо такога набачыўся ды наперажываўся, не дай Божа каму іншаму.

Ёсць чалавек, які да апошняга за жыццё трымаецца, упарціцца, не дае здзейсніцца дурным думкам: утапіцца, павесіцца, адным словам, накласці на сябе рукі. Хіба ж мала пра такія здарэнні расказваецца ў былічках і казках, у песнях і прыпеўках? Хто ж не памятае пра злыбеду прымацкага жыцця? Ой, Божа высокі і далёкі! Тут і смех і грэх, інакш і не скажаш. Самі можаце ўявіць.

Прыйшоў малады чалавек за любай дзяўчынай ці, можа, і за жанчынай у чужую сям'ю. Гэта ж не тое што сваю сям'ю стварыць і жыць абасоблена, каб ніхто не ўмешваўся. А ў такой жа сітуацыі хто хоча, той і пакрыўдзіць. Зрабіць што загадаюць, і нікуды не дзенешся, будзеш рабіць. Скажуць, каб хадзіў і ўсім пакланяўся, і пакланяецца прымак, бо ці галоднага пакінуць, ці начаваць у хату не пусцяць. Калі цёпла, то гэта яшчэ паўбяды, але падумайце толькі, калі кожны божы дзень чалавека без дай прычыны грызуць-загрызаюць. Асабліва ў гэтым плане цешчы вылучаліся. Таму і да нашых дзён з іх смяюцца, як яны, не маючы падстаў для сваркі, знаходзілі самыя дробязныя зачэпкі, з якіх потым раздувалі такое, што вяскоўцы праз дзесяткі, а то і праз сотні гадоў прыгадвалі ды смяяліся з людзей-пустадомкаў, якія не давалі прымакам спакойна жыць і працаваць. Так і майму дзеду давялося хлебануць з дзіравай міскі, і бацьку-нябожчыку таксама. Ад апошняга я і даведаўся, што здаралася ў такіх сем'ях.

Калі па парадку распавядаць, то так атрымаецца. Жыў некалі, даўным-даўно, каля Вішнёва, у вёсцы Шаўканы, адзін пан. Нельга сказаць, што ён надта добры быў да людзей, хутчэй наадварот. Калі што якое, дык такое зробіць — да канца жыцця памятаць будзеш. Сядзіць сабе ў палацы з вернымі слугамі ды ў карты гуляе ці ў косці з імі перакідваецца. Круцель знатны быў. Таму з ім іншыя памешчыкі і гуляць не браліся. Толькі сядзе каторы, то абдзярэ яго гаспадар як ліпку і паскардзіцца не дасць на тое, што нешта там не па правілах ці недзе змухлявана. Не глядзеў надта, хто перад ім — знакаміты пан ці бедны шляхціц, у якога і набытку ўсяго было, што на нагах ды на плячах на сабе насіў. Аднолькава

да іх ставіўся. І слугі гэтаксама, як і гаспадар, глядзелі на гасцей. Няхай падміргне ім сваім хітрым вокам, то адразу яснавяльможнага хапаюць з-за стала і цягнуць куды ў цёмны пакой, а там ужо яму такую бубну выб'юць, што той і не рады быў нават чуць пра ўласныя грошы, якія нядаўна прайграў, толькі каб жывога выпусцілі. Крычыць, бедалага, моліцца ласкавым голасам:

— Людцы добрыя, адпусціце! Адпусціце! Няўжо вы жартаў не разумееце? Пажартаваў я, пажартаваў! Ваш гаспадар правільна гуляе! Правільна! Яму шанцуе! Адпусціце!

Адлупцуюць госця, каб памятаў на астатняе жыццё, як на гаспадара дрэнныя словы казаць, ды ў каршэнь яшчэ, нібы молатам, улупяць, каб ляцеў з двара, не супыняўся да самага свайго палаца. Прыбяжыць такі памешчык дамоў, ці прывязуць яго, збітага на горкі яблык, заляжа ў пакоі і саромеецца на вочы суседзям паказацца. Тыя ж ведаюць, што да чаго, бо і з іх не адзін, не два ў свой час у такіх гасцях пабывалі.

Праз пэўны час да гаспадара ўжо паны баяліся ехаць у госці. Каму з дурнем ахвота звязвацца, калі наперад вядома, чым справа скончыцца. А той, не баючыся нікога і жадаючы неяк прыцягнуць да сябе людзей, пачаў абяцаць:

— Хто ў мяне выйграе, таму палову сваёй зямлі аддам! Не падумайце, што хлушу, не! Аддам. Бог маім словам сведка! Калі хочаце, то на Бібліі вам прысягну, што буду гуляць толькі па правілах і слова сваё стрымаю!

Найбольш зайздрослівыя і бедныя не вытрымлівалі і дапытваліся ў ліхога чалавека:

— А біцца ласкавы пан не будзе? Ганьбаваць нас і шэльмаваць ні за што перастане?

— Ведама што,— пагаджаўся той,— нават і пальцам не крану! Рот нібы на замку трымаць буду! Няхай шаноўныя спадары не сумняваюцца ў гэтым!

Толькі і пасля такіх абяцанняў баяліся памешчыкі да зласлівага суседа паказвацца. Тады стаў той са сваімі слугамі гуляць. Калі вяльможныя паны слова супраць гаварыць не маглі, то што ўжо пра дваровых казаць. Маўчалі, дый годзе, гледзячы, які іхні пан гіцаль. А ён выйграе і задаволены крычыць:

— Нічога, родненькі! Добра, што звараны, нічога,

што не солана! Даць яму пару дзесяткаў гарачых, каб лепей думаў, і зноў за стол валачыце!

Так штодзень памешчык забаўляўся, бо болей не было чаго рабіць. А слугі ўжо хадзілі, нібы да смерці зараней асуджаныя, ведалі, што не сёння, то заўтра абавязкова некаму з іх давядзецца атрымаць чарговую «порцыю».

Ажно неяк бяжыць нехта з дваровых і гарлае не сваім голасам:

— Пане! Пане! Там госць прыехаў! Госць прыехаў! Жадае з вамі ў карты згуляць! Ягоны экіпаж у двары стаіць!

— У двор, хутчэй! — загадаў слугам гаспадар.— Стол накрывайце багаты, нічога не шкадуйце. Можа, якраз нейкі пан надзвычай знакаміты завітаў, будзе чым пажывіцца!

Забегалі слугі, нібы варам абвараныя, закруціліся. Стол накрылі ў момант вока. Госця ў хату, кланяючыся, запрашаюць. Той заходзіць, смела трымаецца, не азіраецца палахліва, не спрабуе нешта выпытаць зараней. Павітаўся гучна з гаспадаром:

— Дзень добры ў палац твой, пане! Шчасце і дабрабыт каб не пераводзіліся! Грошы каб лапатаю гроб — не перагроб! Здароўя каб, што ў таго дуба, было!

— Дзякую, дзякую,— лісліва адказвае гаспадар.— Прашу шаноўнага госця за стол, перакусім ды, можа, у карты згуляем раз-другі?..

— Згуляем, чаго ж не згуляць. Згуляем,— заспакоіў пана госць. Быў ён сабою прыгожы, высокі, магутнага целаскладу, што грыб маладзенькі, крамяны і вясёлы.

Селі, пад'елі і давай у карты рэзацца. Памешчык спрабуе змахляваць, але госць не дрэмле, чуць толькі што якое — адразу перабівае гаспадара:

— Нягожа так рабіць, вяльможны, нягожа. Чэсна трэба лёс выпрабоўваць. Круцялі ўсялякія не да твару багатаму чалавеку.

А гаспадар ужо ледзьве трымаецца, каб не загарлаць слугам:

— Хапайце яго ды на стайню! Усыпце там добра, каб паразумнеў!

Потым госць і гаворыць:

— А што мы ўсё на грошы ды на грошы гуляем! Нецікава стала. Давайце на зямлю паспрабуем!

Можа, інтарэс які з'явіцца дадатковы. Калі я прайграю, то аддаю палову сваіх уладанняў, а калі пан гаспадар, то, адпаведна, ён уступае палову сваёй зямлі.

— Добра,— задаволена паціраe рукі памешчык.— Добра, я згодны, згодны...

Селі гуляць. Абодва напружаныя, не размаўляюць, па баках не глядзяць, толькі ў карты ўтаропіліся. Некалькі разоў згулялі, усё пароўну ідзе. То аднаго верх, то другога. Потым гаспадар запрапанаваў:

— Давай, даражэнькі, хто з трох разоў два разы пераможа, той і выйграў.

— Згода,— пагаджаецца госць.

Выпілі добра перад гэтым, закусілі, прагуляліся па панскім садзе. Адпачылі перад рашаючым паядынкам. Кожны гаворыць нешта, а сам думае, як бы не прайграць, а выйграць ды ўзбагаціцца ў момант вока. Прыйшлі назад у пакой, слугі прынеслі непачатую калоду карт, і пачалася гульня. Першую партыю выйграў госць. На гаспадары ажно сарочка ўзмокла, слугам верным падміргвае, тыя за спінаю стаяць, нібы слупы, гатовыя ў любы момант на незнаёмца кінуцца. Другую гаспадар выйграў і нават замурлыкаў нейкую песеньку сабе пад нос. Раздалі карты ў трэці раз. І што ж вы думаеце? Выйграў яе прыезджы памешчык. Выйграў і спакойна гэтак гаворыць:

— Ну што ж, гаспадар, дзякую за хлеб-соль, за пачастунак, за тое, што так добра гуляў, ні разу не змікіціў нідзе. Не крычаў, а паводзіў сябе надзвычай добра. Зараз паедзем, пакажаш мне зямлю, якую прайграў...

Але ж і гаспадар не дурань. Кінуў вокам на слуг, тыя да госця, а той як лупянуў дваіх з іх лоб у лоб, то абодва і сканалі на месцы. Ён жа ціха так гаворыць:

— Яшчэ каторы дрыгнецца, і яго такі ж лёс чакае.

Супыніліся слугі, раты разявіўшы, каму ж ахвота паміраць няведама за што.

Паехалі памешчыкі ўдваіх на брычцы госцевай зямлю аглядаць. Ад'ехаліся, можа, вёрстаў пару, незнаёмец-здаравяка гаспадара за шкуру, нібы кацяня якое, вывалак з экіпажа і да бярозы прывязаў. Узяў добрую пaпліску і давай пярэсціць-лупасіць гіцля, не шкадуючы. Б'е і прымаўляе:

— Нічога, што не зварана, абы не солана! Нічога, што не зварана, абы не солана! Калі яшчэ над людзьмі будзеш здзекавацца, то абавязкова да цябе завітаю! А зямля гэтая мая з сённяшняга дня!

Збіў памешчыка так, што таго ледзьве адхадзілі потым. А на прайграную зямлю пан болей і нагою не ступіў, толькі адсылаў туды сваіх непакорлівых сялян.

— Ідзі,— кажа,— ты з маёй зямлі! Туды ідзі! Там у прымах пажыві! Будзеш ведаць, што такое салёна!

Там прымакі пастаянна і жылі, а потым і вёску сваю пабудавалі і назвалі яе — Саланая.

## СЕМЕРНІКІ

А ведаеце, адкуль наша вёска такая пайшла? Чаму так стала называцца?

У маткі адной было сямёра сыноў. І назвала яна іх пад адно імя — усіх Сямёнамі. Самы старэйшы быў Сямён, і самы малодшы таксама Сямён. Усё спачатку добра ішло ў гэтай сям'і, але потым сталі браты прападаць адзін за другім. Вось прачнуцца раніцай, а аднаго ўжо і няма, і што самае дзіўнае, то ніхто не ведае, куды ён падзеўся. Праз некаторы час у маці застаўся толькі самы малодшы Сямён. Сядзіць яна, бедалага, і плача горкімі слязьмі, што не сённязаўтра і апошняга нячыстая сіла з хаціны ўкрадзе. Не вытрымаў болей Сямён і кажа матулі:

— Пайду я, маці, шукаць братоў сваіх родных. Усё роўна адзін канец мяне чакае: ці дома забяруць, ці там, шукаючы, прападу. Затое буду ведаць, калі што, дзе мае браты падзеліся.

Сабрала яна яму паесці ў кайстру, закінуў яе хлопец за плечы і надвячоркам пакіраваў з дому. А непадалёку ад іхняй хаты стаяў вялізны палац. Гаспадар ягоны, пан, памёр, і хто ў ім жыў цяпер, невядома было. Падышоў Сямён да велічнага гмаху. Нікога не відаць і не чуваць, а начаваць жа недзе трэба. Зайшоў ён у будыніну, знайшоў самы маленькі, утульны пакойчык и запаліў у печцы, каб было відна і цёпла. Сам жа сеў каля печы і разважае, як далей быць, што рабіць, дзе братоў шукаць. Ажно праз некаторы час штосьці моцна стукнула аб падлогу. Узяў Сямён лучынку і асвяціў памяшканне. Нікога побач

не было. Ужо хлопец збіраўся сесці назад, ажно бачыць — каля сцяны ляжыць валасатая чалавечая нага. Паглядзеў-паглядзеў падарожны ды і, не доўга разважаючы, шпурнуў яе ў вогнішча. Задымілася нага, засмярдзела. Тады Сямён яшчэ дроў падкінуў, і яна згарэла дашчэнту. Болей нічога страшнага і дзіўнага ў гэтую ноч не адбылося.

З раніцы хлопец пайшоў па наваколлі братоў шукаць, а пад вечар зноўку ў памешчыцкі палац начаваць прыйшоў. Стаміўся надта. Спачатку нават не хацелася вогнішча распальваць, але потым неяк адсопся і ўзгадаваў цяпельца. Падсмажыў пару бульбін, з'еў і збіраўся ўжо заваліцца спаць, світку пад галаву паклаўшы, ды чуе, хтосьці ў дзверы шкрабецца. Устаў, не спяшаючыся падышоў і адкінуў зашчапку. Адкінуў і ледзьве не ўпаў беспрытомны: прама ў дзвярным праёме стаяў ягоны старэйшы брат Сямён, толькі нежывы. Запрасіў яго падарожны прысесці за стол ды давай распытваць, як яму на тым свеце жывецца і як гэта здарылася, што ён так раптоўна з дому прапаў. Мярцвяк, нягледзячы на тое, што быў нежывы, але гаварыў таксама:

— Мяне, братка, нейкая нячыстая сіла пад самую раніцу закруціла. Мы ж тады, памятаеш, сена ля далёкага луга касілі. Стаміліся моцна, дамоў амаль паўзлі, пад рукі адзін аднаго трымаючы. Есці нават не захацелі, спаць адразу заваліліся, бо на досвітку трэба было зноў на луг кіраваць. Пад самую раніцу мяне нібы нешта пад бакі стала штурхаць, каб на вуліцу выйшаў. Падняўся і выцягся за парог. Толькі яго пераступіў, як нейкая магутная сіла мяне скруціла і панесла ад роднага дому...

— А ці не бачыў ты, братка, нашых астатніх братоў? Іх жа таксама дома няма, толькі адна маці засталася,— запытаўся Сямён.

— Бачыць не бачыў, але чуў, як нехта зусім побач ад мяне хваліўся, што здаровых хлапцоў пахапалі ў палон. Вось так...

— Дзякуй табе, давай спаць паляжам, а то стаміўся я сёння незвычайна,— прапанаваў Сямён свайму старэйшаму брату-нябожчыку. Той пагадзіўся.

Ляглі яны і паснулі. Нябожчык ляжаў на падлозе, а Сямён — на услоне, які стаяў ля акна. Недзе пад раніцу адчуў ён, як на яго навалілася нешта цяжкае. Пачаў ён працівіцца. Гэта нічога, што ён у сям'і быў

самым малодшым, але сілы ў яго было намнога болей, чым у астатніх. Раскрыў вочы і ўбачыў, што яго душыць мярцвяк. Сабраўся з сілаю ды як лупяне таго ў лоб — толькі зубы ў таго заляскацелі ды закрычаў нема:

— Дапамажыце!

Толькі ў гэты момант запялі недзе далёка-далёка пеўні і ўсё прапала. Каб не сінякі на целе, то Сямёну магло б падацца, што гэта яму прыснілася.

Сабраўся на досвітку хлопец і задумаў схадзіць дамоў, каб параіцца з матуляй, як быць далей, куды пакіраваць, бо тут братоў можна і не знайсці.

Прыйшоў дахаты, сабраліся там усе суседзі і давай дапытвацца, ці не бачыў Сямёнаў. Распавёў ён тады ім усё па парадку, і як нага ноччу аднекуль звалілася, і як нябожчык у выглядзе брата ледзьве не задушыў яго. Не забыўся прыгадаць таксама і пра размову. Паспачувалі людзі, але нешта канкрэтнае падказаць ніхто не здолеў. Маці толькі зайшлася адчайным плачам-крыкам:

— Не пушчу цябе, Сямёнка, болей, не пушчу! Не знойдзеш ты іх, не вернеш, толькі сваю галаву ў пельку ўсунеш! З кім я тады застануся?

Супакойваюць яе суседзі, а самі хлапца адмаўляюць:

— Паслухайся, чалавеча, маці, не хадзі болей туды.

— Дзякуй вам, людзі, за спачуванне, але ж трэба неяк братоў выратоўваць,— адказвае ім Сямён.— Калі не я гэта зраблю, то хто?

Пайшоў ён, нікога не паслухаўшыся, і на трэцюю ноч у той таямніча-закляты палац. Зноў, як і раней, запаліў у печы, а сам сеў побач і ў руках ужо трымае ёмкі цурбалак, на ўсялякі выпадак, калі зноў які не надта пажаданы госць прылезе. І сапраўды, недзе пасля паўночы пачулася, як рыпнулі адны дзверы, другія, і на парозе з'явіўся страшны... чорт. Бараду меў ледзьве не да падлогі. Падышоў смела да Сямёна і гаворыць таму:

— Час настаў, хлопец, нам з табою разлічыцца! Хадзі-тка цяпер са мною!

— Што гэта ты мяне палохаеш? — не збаяўшыся, адказвае Сямён.— Ідзі сваёю дарогаю, бо зараз як трэсну, то мала не будзе.

Палагоднеў тады чорт і давай ужо спакайней Сямёну вымаўляць:

— Дакуль ты будзеш, чалавеча, жыць у нашым доме? Хіба ж можна займаць чужую будыніну, ды яшчэ і злачынствы ўчыняць?

— Якія злачынствы? — не зразумеў Сямён.— Нічога благога я тут не рабіў.

— Нічога, кажаш? А нагу майго бацькі хто спаліў? Можа, нехта іншы? Ці брата майго ледзьве не задушыў нехта з вуліцы? Цяпер ты нам за ўсё заплаціш! Уздумаў з намі змагацца, то і далей не палохайся!

— А я і не палохаюся,— адказаў хлопец.

— Тады пайшлі,— запрапанаваў чорт,— сілаю памераемся.

— Пайшлі.

Выйшлі яны на двор. А на двары якраз стаяла вялізная калодка, на якой раней дровы секлі, і тырчаў у калодзе калун. Тут Сямёнка і гаворыць на барадатага чорта:

— Ты ж надта дужы, у цябе сілы, відаць, мнагавата, вось падымі гэтую калодку, бо я чалавек, мала сілы маю, але і то падымаю спакойна.

Чорта доўга не трэба было ўпрошваць. Спадабалася яму тое, што чалавек, ягоную сілу пахваліў.

— Добра,— адказвае,— што мне падняць гэту калодку, я яе, як мячык, падкіну.

Нагнуўся нячысцік падымаць калоду, а барада тым часам лягла на калоду. Сямён ухапіў хуценька вострую сякеру і адсек чорту даўгую бараду. Аказваецца, уся сіла чорта была схавана ў гэтай самай барадзе. Тады заплакаў зняважаны чорт і прамовіў:

— Пусці мяне, ты перамог чэсна, жыві ў гэтым доме, мы цябе болей не кранём.

Адпусціў чорта Сямён, паверыў яму, а не трэба было гэтага рабіць. Пайшоў сам у палац, сеў ля печы ды трэсак падкінуў. Не паспеў ад таго перапуду адысці, як чуе — трашчыць страшэнна нешта навокал. Бачыць: сыплюцца шыбы ў вокнах і праз іх адусюль лезуць чэрці, ды столькі іх многа, што і вокам нельга акінуць. Спалохаўся падарожны, а нячысцікі ўсё запаланілі навокал. Тут ужо былі не толькі старыя, але і маленькія, якія яшчэ, можа, і не паспелі ніякай шкоды людзям прынесці. Вось калі, думае, канец мой ужо дакладна прыйшоў. А чэрці кажуць:

— Хопіць valадарыць над намі, нікому не падпарадкоўвацца, зараз мы з табою хутка расквітаемся!

Няма беднаму што рабіць, акрамя як на хітрасць

пайсці. Ён так і ўчыніў: узяў свердзел, пракруціў у сцяне каменнай невялічкую дзірку і гаворыць:

— Так ужо і быць. Перамаглі вы на гэты раз. Але давайце яшчэ раз у сіле і спрыце памераемся, можа, нешта і пераменіцца. Я вось сам чалавек і то змяшчаюся ў гэтай дзірцы, а вы паспрабуйце-ка, а то ўсё крычыце! У акно ж любы пралезе!

Згадзіліся нячысцікі і давай ціснуцца адзін за адным. Нарэшце ўсе туды залезлі і пасміхваюцца:

— Ну што, і гэта табе не дапамагло?

А Сямён схапіў калочак дый забіў адтуліну (дзірку ж хітры хлопец наскрозь пракруціў у суседні, наглуха замураваны пакой). Паставіў палоннікам умову: калі братоў не адпусцяць, то жыцця ім вольнага болей не бачыць. Пасядзелі суткі-другія нячысцікі і давай пішчаць, што на ўсё згодны, толькі каб выпусціў.

Братоў Сямёнаў назад вярнулі. Зажыў тады Сямён з роднымі ў тым палацы панскім, маці сваю туды ж перавезлі. Пазней на тым самым месцы вёска з'явілася. Спачатку невялічкая, потым — буйнейшая, і назвалі яе Семернікі, у памяць аб тых братах.



# ВІЛЕЙКА

Горад як горад. Раней, можа, нават намнога важнейшым быў, чым зараз. Кажуць, што многае ад рэчкі Віліі залежала. Калі яна больш паўнаводная была, то і паселішча на ёй ніколі не памяншалася, а толькі павялічвалася. Назву-то па-рознаму тлумачаць у народзе. Адны гавораць, што паводле іхняй легенды ўсё павялося, іншыя, наадварот, што іхнія словы больш правільныя і пераканаўчыя. Хто яго ведае, як найбольш дакладна, але мы пра ўсё згадаем. Як нам давodзілі, так і мы вам перакажам, каб нічога не забыць, нічога не ўпусціць.

Гавораць людзі, што горад раней быў не там, дзе сёння. Крыху ўбок і бліжэй да ракі. Калі параўнаць розныя паданні, то можна нават пачуць пра даўжэзныя падземныя хады пад ракою, якія вялі ў бліжэйшы лес. Маўляў, гэта было зроблена нашымі продкамі ў мэтах перасцярогі. Усе мы ведаем, як часта ім даводзілася ў тыя даўнія часы змагацца з усялякімі ворагамі і на чужой, і на сваёй тэрыторыі. Добра, калі войска ў горадзе ці дзе-небудзь паблізу знаходзілася, то і ў адкрытым баі можна было з чужынцамі справы вы-

святляць. А калі ў паходзе ці калі непрыяцеляў пад сцены падступала ў дзесяткі разоў болей? Што тады рабіць? Здавацца на міласць ворагам? Ды не, такога ад мясцовых жыхароў дачакацца нельга было. Лепей смерць у баі, чым потым усё жыццё на некага горб гнуць, дзе цябе не тое што за чалавека, але нават за жывёліну лічыць не будуць. Вось і карысталіся ў такіх цяжкіх выпадках падземным ходам, пра які ведала мо ўсяго чалавек колькі. Чым меней ведала пра такую схову, тым большай была гарантыя, што чужыя вушы не пачуюць пра яе.

Можаце сабе ўявіць такую сцэну: прыйшлі чужынцы, абклалі горад, здаецца, нават і птушка не праляціць незаўважнай. А пойдуць на прыступ, і паселішча іх сустракае маўклівымі вулкамі і пустымі будынінамі, нікога з жыхароў нават і блізка ад населенага пункта няма. Спаляць усё навокал разлютаваныя ворагі, але людзей затое не знойдуць, а яны праз некаторы час вернуцца назад ды новыя хаціны і гаспадарчыя пабудовы ўзвядуць. Калі гараджане жывыя, то і горад жывы.

Кажуць таксама, што на беразе рэчкі яшчэ зусім нядаўна былі гурбы старадаўняй цэглы. Праўда, не цэлая яна была, а суцэльны друз, ды справа ў іншым. Менавіта там недзе быў уваход у падземны ход, што пад ракою ішоў. Некаторыя адзначалі, што на месцы гэтых гурбаў даўным-даўно стаяла царква высокая і прыгожая. Здалёку было яе відаць, а яшчэ далей нesліся зыкі вольных царкоўных званоў, якія мядовымі сваімі галасамі спявалі пра радасныя і сумныя навіны, апавядаючы іх наваколлю. У гэтай царкве заўсёды збіраліся гараджане падчас вялікіх святаў. Адсюль ляцелі да высокага Бога іхнія шматлікія малітвы. Даводзілася чуць, што ў гэтай каменнай будыніне былі сабраны каштоўнасці найбольш заможных жыхароў: грошы, упрыгожанні, іншае якое срэбра-золата.

Адзін раз, калі горад акружылі чужынцы, і здарылася гэта так нечакана, што не паспелі як мае быць агледзецца людзі, яны ўзарвалі царкву, не даючы тым самым няпрошаным гасцям магчымасці парабаваць боскі храм і забраць іхнія каштоўнасці. Падкрэслівалі, што золата ўсё засталося знізу і што з-пад царквы таксама ішоў падземны ход да таго вялікага, суцэльнага лесу, праз які можна было ўцякаць.

Не раз і не два даводзілася чуць, як мясцовыя

хлопцы і мужчыны, пабраўшы рыдлёўкі, кіравалі на курган, каб раскапаць яго і завалодаць незлічонымі скарбамі. Толькі колькі ні падыходзілі, а давесці справу да канца не маглі, заўсёды нешта перашкаджала: то дождж ішоў праліўны, то пясок пачынаў асыпацца, то, калі ўжо вялізны склеп адкапалі, напалохаў нехта агромністы і магутны, моцна ланцугамі бразнуўшы. Аднаго разу вырашылі ўжо, што назад не пабягуць да таго часу, пакуль не дастануць шматлікія залатоўкі.

Прыйшлі сабе, пасталі, месца старанна агледзелі, дзе капаць пачынаць, каб потым хутчэй да мэты дабрацца. Самы стары і вопытны сярод іх прамовіў:

— Трэба побач з курганом, то і друзу ўсялякага меней будзе, і, можа, на падземны ход адразу выб'емся, тады справа пойдзе, адно толькі — паспяваць пясок адкідаць. Вось толькі каб спачатку пашанцавала і ў мяккі грунт урэзаліся...

Пачалі лапаціць. І сапраўды, як гаварыў стары вясковец, так і атрымалася — дасягнулі падземнага хода. Пачатак добры, можна было і адпачыць. Селі сяляне, а самім не сядзіцца, дзе ж тут спакойна будзеш сябе паводзіць, калі золата вунь пад рукамі ляжыць, чакае, пакуль ты яго возьмеш. Можа, хвілін колькі ўсяго і пасядзелі ды давай зноўку шчыра працаваць. Гурбы вялікія пяску ў момант вока насыпаюцца, і чуваць, як лапаты стукаюць аб жвір і дробныя камяні. Раптам адзін з маладых хлопцаў, які з боку ямы стаяў, закрычаў:

— Вунь скрыня! Скрыня вунь! Глядзіце, якая вялікая і жалезам акутая! Вунь жа край выпіраецца! Няўжо не бачыце?!

Прыглядзеліся ўсе, і сапраўды — скрыня тырчыць. Яшчэ хутчэй замільгалі рыдлёўкі. Нарэшце скрыню вызвалілі з пяску, і яна асунулася на дно. Стаяць над ёю вяскоўцы і ледзьве дыхаюць ад хвалявання. Потым стары выдыхнуў:

— Што ўжо зыркаць? Давайце адкрываць будзем. Трэба ж глянуць, што там гэтулькі стагоддзяў захоўвалася...

Узялі сякеры ды й давай абухом у вечка грукаць. Але не адразу адчынілі, жалеза было хоць і пражавелае, ды яшчэ даволі трывалае. Праз некаторы час зарыпела вечка, і ўсе падаліся бліжэй, каб нічога не прапусціць, усё пабачыць на ўласныя вочы. Толькі адчынілі скрыню, ажно адтуль як слізгане здаравенная

гадзюка і, сыкаючы,— да людзей. Магутны і шматгалосы роў разлёгся над наваколлем, і пачуўся ўслед за гэтым дружны тупат ног. Болей ніхто золата тое шукаць не спрабаваў, а яма глыбокая, нібы сама па сабе, дзён праз колькі засыпалася. Таму ў народзе паступова перасталі гаварыць пра той падземны ход, царкву і пра тое, што непасрэдна з імі звязана паходжанне горада.

Другія легенды распавядалі бабулі ды дзядулі яшчэ нашым прадзедам і прапрадзедам.

Жыў некалі тут шавец, і звалі яго па-простаму — Сцяпан. Славіўся залатымі рукамі чалавек на ўвесь навакольны край, і надта яго тубыльцы паважалі, бо было за што. Хто ні прыйдзе да шаўца з просьбаю: багаты князь, заможны пан ці звычайны селянін, нікому не адмаўляў. Скажуць пашыць дарагое футра ці андарак з грубага сукна або світку сялянскую — ніколі грэбліва не адмахваўся, а толькі казаў чалавеку, калі прыходзіць за гатовай рэччу, і браўся за працу. Так не год, не два доўжылася, а пару дзесяцігоддзяў.

Але заўважылі местачкоўцы, што нешта ён спахмурнеў апошнім часам, а потым і здагадвацца пачалі: туга душыла маладое сэрца. Хоць і багаты Сцяпан, і сабою прыгожы і дужы, а няма ў яго жонкі-красы. Устане шавец спахмурнелы, невясёлы за працу бярэцца і такі ж сумны штодзень спаць кладзецца. Здзіўляліся людзі, чаму гэта так адбываецца? Навокал гэтулькі дзяўчат вясёлых, працавітых ды прыгожых — толькі сватоў пасылай да іхніх бацькоў, ніякіх перашкод не будзе. Але ніхто не мог здагадацца, што тая адзіная, якую ён надта ўпадабаў, дзівосная прыгажуня-дзяўчына ад яго ўцякала, хавалася, а калі дзе ненарокам і сустракаліся, то яна вочкі свае сінія ў зямлю патупляла. Вось і паразмаўляй тут. Да таго ж па характары шавец быў чалавекам надта сціплым, нясмелым, гэта таксама ў многім яму перашкаджала.

Неяк асмеліцца, набярэцца духу хлопец і скажа ёй слоўкаў ласкавых колькі, а яна загарыцца, як макаў цвет на світанку, ды маўчыць зацята. Ужо і людзі гаварылі: «Чаго толькі яна ад такога добрага жаніха дабіваецца? Няўжо думае недзе яшчэ лепшага знайсці ці проста паздзекавацца вырашыла? Да добрага гэта не прывядзе. Ужо колькі разоў у жыцці гэтак здара-

лася, што вылузваецца чалавек са скуры, не ведае, як пахваляцца ды мудравацца, а потым і рад бы атрымаць абяцанае лёсам, ды назад нельга жыццё павярнуць. Ой, даскачацца дзеўчына...»

І як жа тут добраму малайцу не тужыць, не хмурыцца, калі сэрца гарыць, як нарог у горне, дабяла накалены, і стукоча ў грудзях, як молат цяжкі па накавальні, а палёгкі яму няма ніякай. Нават яшчэ горай на душы становіцца, асабліва калі пачуе меркаванні людзей. Ведаў хлопец, што вяскоўцы ў многім рацыю маюць, пагаджаўся з імі, але ж сам не перайначыш, не пераробіш так, як табе менавіта хочацца.

Смуткуе Сцяпан, бо праўды, аказалася, і ён усёй не ведаў. Не ведаў таго, што каханая ягоная, у буйных думах калыханая, гэтаксама, як і ён да яе, к яму ўсім сэрцам хінецца, як хмялінка да крэпкай тычынкі цягнецца. Толькі празмерная сарамлівасць дзявочая няволіць нябогу на хлапца ўзірацца, калі людзі навокал. Заставалася бедалазе толькі ўздыхаць па ім майскія ночы, цёпла-парлівыя, паглядваючы з-пад бярозкі маладзенькае, касістае на ясны месячык, які востранькім сярпом штоночы вісеў у цёмным небе.

Але ж і прыгожая была дзяўчына. Людзі звалі яе Ульяна, але потым, з цягам часу, перайначылі крыху імя за высокі рост, за гібкі-перагібісты стан ды тварык чырвоненькі і шчокі ружовенькія — Вяльянай празвалі.

Доўга трываў Сцяпан, але далей ужо не мог, бо сэрца на кавалкі рвалася, душа гаротная плакала, да дзяўчыны яго цягнула. Нічога іншага не прыдумаў шавец, як звязацца з магутнай нячыстай сілай і ў яе прасіць дапамогі. Вядома ж, што не за так, а аддаючы ўзамен нячысцікам душу сваю хрышчоную, хрысціянскую. Выйшаў у двор, уздыхнуў глыбока дый гаворыць:

— Каб зараз тут які чорт ці варажбіт з'явіўся, то я б яму, не задумваючыся, душу сваю запрадаў, каб толькі ён мне з дзяўчынай справіцца дапамог. На ўсё згодны, усё выканаю...

Толькі такія словы вымавіў, ажно чуе, нехта за спіною дыхае і радасна вішчыць. Азірнуўся, а там сапраўды чорт сівы стаіць, хвастом сваім агідлівым памахвае:

— Што, чалавеча, наша дапамога спатрэбілася?

Мы любому дапаможам. Толькі ж ведаеш, што ўзамен патрабуем?

— Ведаю,— гаротна адказаў Сямён.

У гэты самы момант чорт прапаў. Пачаў азірацца шавец, шукаць яго. Не, няма нідзе. Нават пачаў думаць, што падалося. Але скалыхнуўся лес ветрам-бураю, з чатырох дарог узняўся ўверх лейкаю пясок, і з таго пылу-буры выскачыў яшчэ старэйшы, вышэйшы ростам і здаравейшы чорт. Падскочыў да хлопца і запытаўся:

— Што зняволіла цябе, асілак-хлопец, мяне клікаць? І чаму стаіш на двары цёмначы?

Сказаў так і засмяяўся задаволена. Яшчэ б, такі мажны хлопец да яго ў рукі трапіў, такі паважаны ўсімі местачкоўцамі майстар сам па сабе скарыўся перад ім.

— За падарунак-мену, за душу хрышчоную, як сам ведаеш, я змагу ўсё на свеце здзейсніць, толькі скажы своечасова, каб паспець зрабіць. Растлумач усё да драбніц і можаш не сумнявацца — стане ўсё належным чынам.

Стаіць Сцяпан, а сэрца ажно заходзіцца, гэтак моцна ў грудзях стукае. Ды не ад таго, што надта спалохаўся, што нячысціка ўпершыню перад сабою гэтак блізка ўбачыў, а ад таго, што за дапамогу чортаву давядзецца заплаціць надзвычай дарагою цаною — сумленнем і гонарам каханкі, ягонай непаўторнай Вяльяны.

А чорт не адступае, не ўцякае, не палохаецца, скача навокал, круціцца, спажыву хуткую адчувае:

— Цяжка, вядома ж, будзе да дзяўчыны-прыгажуні падступіцца. Ой як цяжка, але нічога — гэта ўжо мой клопат, мае хваляванні-турбаванні, хай табе галава не баліць...

Скажа, падскочыць, за вухам паскрабе, хвастом стрэльне-свісне, выгнецца вужакай слізкай і зноў працягвае:

— Адной душы, Сцяпане, за такое цяжкае заданне будзе малавата...

— Што табе яшчэ трэба, нячысцік смярдзючы? — гнявуліва запытаўся шавец, але чорт не звярнуў увагі на абразу, а толькі яшчэ весялей засмяяўся:

— Ды ты не хвалюйся. Не хвалюйся, хлопча. Усё будзе як нельга лепей, але даплаціць давядзецца.

— Кажы, чым яшчэ даплачваць?

— Ды нямнога даплаты патрабуецца. Нямнога, шавец. Хіба што, на радасць нам, мне і маім паплечнікам, здымеш з грудзей крыжык, які быў на цябе накінуты, калі яшчэ ў маленстве хрысцілі ў царкве. Здымеш гэты крыжык і...

— І хопіць? — перабіў нячысціка Сцяпан.

Але той, нібы не пачуўшы, працягваў далей:

— Пакладзеш яго на жарнавы круг і будзеш пабіваць пацііху цяжкім каменем. Не спяшаючыся пабіваць, каб мы маглі палюбавацца.

Такую ўмову паставіў нячысцік перад шаўцом за дапамогу.

Пабялеў Сцяпан, як кужэльнае палотнішча, што некалькі вёснаў запар у лугах бялілі. Гэта ж трэба, ён сам чарцям выгоду чыніць будзе, каб толькі яны яму дапамаглі пакарыць ганарлівую прыгажуню. Але што зробіш, раз паабяцаў ды звярнуўся да злой сілы, то назад звароту ўжо ніколі не будзе. Трэба трымаць дадзенае слова, яго вымавіў уголас, калі з першым нячысцікам размову вёў.

Ідзе пацііху, а ногі не надта слухаюцца. Кіруе туды, куды чорт загадаў,— да жарнавога каменя, які ляжаў на раздарожжы, дзе некалі вялікі ветраны млын стаяў. Падышоў, азірнуўся старанна, каб ніхто не ўбачыў, хуценька шмаргануў крыжык з шыі і паклаў яго на камень. Толькі ззаду засмяяліся-закірхалі шматлікія нячысцікі. Але шавец не звярнуў на іх увагі, скрывіўся грэбліва, дый годзе.

Пачаў Сцяпан пад ногі ўглядацца, каб камень дзе меншы знайсці і ім крыж пачаць таўкці. Знайшоў нарэшце, ухапіў яго і давай лупасіць па крыжыку. Як толькі першы раз ударыў, адразу занямела ўсё чысцютка навокал з пералякy-чакання. Усё баялася, што ж зараз здарыцца, што за пакаранне абрынецца за гэткі нябачны і нячутны грэх. Месячык той таксама схаваўся ў густых, груваcткіх хмарах і не асмельваўся адтуль болей паглядаць на зямлю, зоркі-весялухі, дык тыя, заіскрыўшыся раптоўна, патухлі. Бор зялёны і векавечны нахмурыўся і шалёна засвістаў аб нечым, толькі яму вядомым, вершалінамі: дубы да зямлі прыгнуліся, стромкія хвоі і елкі затрашчалі стваламі, яшчэ хвіліна — і пераломяцца. Зямля пад нагамі і тая задрыжэла, задрыжэла і ўвагнулася, вады стала пад нагамі па калені. Але Сцяпан не зважае на такі

паварот справы, лупасіць сабе каменем з усяе сілы, дый годзе.

Чэрці, як заўважылі, што вада прыбывае, то пабеглі далей, каб шкуры ўласныя выратаваць. Нясуцца прэчкі, толькі вада пад іхнімі лапамі цыбатымі пляскоча. Бягуць, знай сабе параготваюць, што з чалавека гэтакага дурня ўтварылі.

Ды нядоўга давялося нечысціўцам радавацца, не дапусціў Усявышні іхняга валадарства на зямлі. Як пабачыў Бог, што такое злачынства здзяйсняецца, то вырашыў умяшацца неадкладна: толькі замахнуўся Сцяпан у чарговы раз каменем па крыжыку пляснуць, як грымнуў-стрэліў з неба нечакана гром-маланка, і пякуча-агністая змяя навылёт працяла самага старшага чорта, які весяліўся па-ранейшаму, супакоіцца не мог, што гэтак шаўца надурыў. Толькі дым смярдзючы ад нячысціка закурэў і паленым пацягнула па баках. Астатнія чэрці хто ў камяні, хто ў карчы ператварыліся. Як заспела іх Божая воля ў той момант, так яны і замерлі ў дзіўных позах. Самому шаўцу таксама не пашанцавала: абярнуў яго Усявышні за вялікі, непапраўны грэх у камень. На гэтым жудасная начная справа і скончылася.

На раніцу агледзеліся вяскоўцы — няма нідзе Сцяпана-шаўца. Давай яго шукаць, але куды толькі ні зазіралі, куды ні залазілі — нідзе майстра не маглі знайсці. Потым нехта з людзей прыгадаў, што бачыў прыцемкам, як Сцяпан кіраваў да раздарожжа. У невялікім паселішчы ад людскога вока нікуды не схаваешся. Прыйшлі туды, і што ж вы думаеце? Убачылі вялікі камень, які сваімі абрысамі надта нагадваў шаўца. На разбітым жарнавым камені заўважылі патрушчаны медзяны крыжык, які тоўк хлопец, імкнучыся заслужыць дапамогу нячысціка. Цяпер толькі здагадаліся сяляне, што здарылася і каму была закладзена чалавечая душа. Спахмурнелі тварамі, маўляў, вось яно як на самай справе разгарнулася. Мы спадзяваліся, верылі шаўцу, а ён што ўдумаў... Пастаялі колькі часу і разышліся, хто шкадуючы, што болей не будзе адмысловага майстра, хто задумваючыся над жыццём чалавечым, а хто праклінаючы такога пярэваратня.

Вяльяне ніхто спачатку не казаў пра жудасную падзею, дзяўчына працавала, як ні ў чым не бывала, у полі, спявала сабе ціхенька жніўную песню ды каласы зжынала буйныя. Ажно падыходзіць суседка і кажа:

— Хіба ж ты, Вяльянка, не ведаеш, што з тваім Сцяпанам сёння здарылася?

Дзяўчыну адразу кальнула балюча ў сэрца, яна войкнула і павярнулася да суседкі:

— Што здарылася, што?!

— Дык ён жа каменем стаў вялікім...

Як пачула дзяўчына такую навіну, то што было духу паімчала на раздарожжа. Прыбегла да каменя і ўпала ля яго. Галосіць, ужо нікога не саромеючыся, рукамі яго абдымае, цалуе халодную глыбу, слёзы гаручыя лье, нібы боб коцяцца.

Плакала яна так не гадзіну, а цэлы дзень, плакала ноч потым, а з усходам сонца, ледзьве толькі золак з-за лесу далёкага паказаўся,ператварылася дзяўчына ў крыніцу, са слёз яе пачатак таго невялічкага азярца ўтварыўся.

Вяльяну людзі пахавалі належным чынам, на мястэчковых могілках, і пабудавалі ля магілкі невялічкую царкву, каб ушанаваць памяць аб чэснай дзяўчыне, аб яе светлым каханні.

А крыніца з-пад вялікага каменя разлілася па ваколіцы, затапіла ўсе бліжэйшыя абшары. Дзе ўвагнулася той страшнай ноччу зямля, ператварыла паступова тую невялікую нізіну ў непралазнае балота, і там яшчэ доўга ўсялякія чэрці-нячысцікі вадзіліся. Праз гэтую балаціну, якраз пасярэдзіне, пацякла ўдалячынь вольная і прыгожая, як сама Вяльяна, рэчка. Празрыстая, гаваркая яна была, нібы характар дзяўчыны, такі пры жыцці спакойны і сарамлівы, зараз сабою дапаўняла, раскрывала яго. Рэчку гэтую ў памяць Вяльяны Вельяй назвалі і доўга так звалі, пакуль нейкія людзі-чужынцы ў мясцінах нашых не з'явіліся. Чаго яны тут былі, ніхто не ведае: можа, плыты сплаўлялі, можа, на лодках некуды далей плылі, можа, яшчэ па якой патрэбе. Хто ж яго зведае. Даўней часта жыхары розных краін тут сустракаліся. Але справа не ў гэтым, а ў тым, што ім цяжка было вымавіць назву рэчкі на тутэйшы лад — Велья, таму яны яе крыху перайначылі і атрымалася Вілія, а горад, які пазней узнік на высокім беразе, стаў Вілейкай.

Вось такая дзіўная гісторыя.

# КРЫВАЗНАКІ

Вы думаеце, можа, што нашы продкі дурней за нас з вамі былі? Памыляецеся глыбока, калі такую думку ў галаве трымаеце. Намнога болей ведалі прашчуры, асабліва ў практычных адносінах, у сваім разуменні прыроды і прыродных стыхій ды з'яў. Ледзьве толькі першы гром загрыміць, а яны ўжо маглі сказаць, якім вясна будзе хлебам частаваць — раннім ці позьнім. Я спачатку таксама не разумела гэтага выслоўя, думала, што нешта не так, але аказалася, што тут мелася на ўвазе — засушлівы ці мокры будзе год. Або, гледзячы на тое, як у лесе ці ў лузе распускаюцца краскі, нашы продкі маглі дакладна сказаць, будзе ці не радзіць збажына і бульба ў гэтым годзе, ці надарыцца на іх неўраджай. Што датычыць прыродных стыхій, то тут і ўвогуле толькі дзіву застаецца давацца, як яны маглі ўсё прадбачыць наперад, прадчуць, прадказаць. Яшчэ глыбокі снег на палях ляжыць, цэлымі гурбамі з голек звісае, а старыя людзі ўжо збіралі і рамантавалі гаспадарчыя прылады, якія вясною ды летам у ход пойдуць. Таксама і з заняткамі ўсялякімі здаралася. Не складалі нейкага выключэння і плытагоны. Чаму менавіта яны? Таму што пра іх далей гаворка пойдзе, бо непасрэдна гэтыя людзі далі назву нашаму старадаўняму паселішчу.

Горад Вілейка знаходзіцца зусім непадалёку ад нашай вёскі. На тым самым месцы ён і даўней быў. Да яго пастаянна купцы з чужых зямель ехалі, тавары дарагія і рэдкасныя везлі, каб прадаць на мясцовым рынку ці абмяняць на тое, чаго ў іхнім краі не хапала. І зверху ракі дабіраліся, і знізу таксама. Тады ж асноўнымі шляхамі зносін былі менавіта рэкі, а калі ўлічыць, што вады ў іх плыло не тое, што цяпер, то ўсё станавілася зразумелым. Плыць добра тады, калі ўжо не першы раз у гэтым краі ды ведаеш нораў рэчкі, а калі наадварот, дык намучышся па дарозе, натомішся, мазалёў такіх назбіваеш, да канца жыцця згадваць будзеш. Дзе ж вы бачылі, каб русла толькі прама цягнулася? Звычайна так было толькі вярсту-другую, а потым такія выкрунтасы рэчка пачынала вырабляць, такія рэдкія загібы заламваць, віхляць паміж высокіх чаратоў, паміж балоцістых берагоў, паміж густых лясоў, што неяк не па сабе рабілася, гледзячы на такі першаствральны край. Даўней пра-

вільна адзначалі: дзе невысокія берагі, там глыбіня вялікая, а вось дзе берагі крутыя, там і дно блізка. Ведаць такое мог чалавек, які пастаянна па рацэ туды-сюды ездзіў, плаваў, чаўны ці плыты ганяў. Але такіх мала было. У асноўным жа вяскоўцы і гараджане ўсяго разоў колькі за год на раку выбіраліся, а то гаспадарчымі справамі якімі неадкладнымі займаліся ці іншым чым. Хіба ж за такі кароткі тэрмін можна было нораў ракі вывучыць? Калі нешта і прыкмячаў, то з цягам часу забываў зноў.

Або вось яшчэ што магло здарыцца. На адным месцы быў пасярод ракі грудочак, і нават лаза на ім парасці паспела, але праз некаторы час, калі чалавек выбіраўся плыць па гэтым месцы, то чамусьці ўзбіраўся на мель і вымушаны быў шчыра папрацаваць, пакуль сцягваў свой човен ці плыт з пяску і зноў накіроўваў яго на чыстую ваду. Уся справа ў тым, што цячэнне паспявала размываць ранейшы пясчаны астравок і нацягваць яго ў іншым месцы, якога чалавек не ведаў яшчэ.

Так доўжылася з году ў год. Ды толькі людзі прывыклі неяк супрацьпастаўляць сябе і прыродным стыхіям, і ўсялякім з'явам. Знайшлі яны выйсце і з такога складанага становішча. А ўсё рабілі надзвычай проста. Плыве лодка першы раз па рацэ, прамяраюць людзі дно, глядзяць, ці глыбока тут, робяць гэта для таго, каб потым, пазней, правесці сюдою вялікія плыты ці цяжканагружаныя судны з таварамі і грузамі ўсялякімі. Недзе на беразе, насупраць найбольш небяспечных мясцін, ставілі своеасаблівыя вышкі або ўвогуле па начах палілі вогнішчы, каб здалёку было відаць, дзе трэба бяды асцерагацца, дзе трэба быць асабліва пільнымі. А ў асноўным ставілі па самой рацэ знакі. Секлі ў лесе доўгія жэрдкі і ўторквалі іх па рэчышчу, каб такім чынам акрэсліць глыбокі шлях па воднай прасторы.

Ідуць плыты, глядзяць плытагоны наперад і заўважаюць такую жэрдку, або, як яе называлі, «знак» ці «вешку», і пачынаюць стырнавыя вёсламі выкручвацьстарацца, каб на мель не ўзлезці, не ўсперці свой цяжар. Крычыць-падганяе самы вопытны і спрактыкаваны:

— Не зяхай, хлопцы! Не зяхай! Глядзі, каб рака не надурыла! Вілія — яна свавольніца! Маці яе так празвала за тое, што своеасаблівы характар мела —

гуллівы, непакорлівы, нікому не даравала памылак! Глядзіце, бо спераду яшчэ не адзін астравок, не адна мель падпільноўвае! Вунь, бачыце, зноў вешка тырчыць? Старанна вёсламі працуйце! Не лянуйцеся, калі хочаце, каб мы ацалелі ды капейку нейкую дамоў потым прынеслі! А далей адпачнём, там рака будзе лагоднейшая, спакайнейшая, там і паспім, дамо перадых стомленым целам.

Рака закруціла, застагнала ў берагах, здаецца, яшчэ хвіліна-другая і панясе плыты на бераг ці на востраў, аж не тут-то было, плытагоны людзі спрактыкаваныя і ведаюць, як ад такой бяды ратавацца: неяк незаўважна зарыюць носам першыя бярвенні, нібы нехаця ўспорваючы ваду, а за імі і астатнія маруднаю змяюкаю пацягнуцца міма перашкоды, агінаючы яе, абходзячы, кіруючы далей, да новых перавалаў і запруд.

Аднаго разу плыў вялікі караван па рацэ. Аднекуль гандляры замежныя дабіраліся — ці то, мажа, з Еўропы, ці з Візантыі. Хто іх там ведае, адкуль дакладна. Але адно вядома: судны іхнія такія былі перагружаныя, што глыбока ў вадзе сядзелі і чуць што, дык дно даставалі і на месцы застывалі, нібы маўклівыя асілкі. Ужо і гандляры самі, і ахова, і слугі шматлікія з сілы выбіліся, а груз жа трэба неяк яшчэ далей везці, да буйных гарадоў, там толькі прадаць ці выгадна абмяняць яго можна. Што толку ў тым, калі пасярод лесу спынішся? Куды тавар свой дзенеш? Хіба што з камарамі ды сляпнямі гандляваць будзеш? Дык і не да жартаў тут, бо да смерці загрызуць, апошнюю кроў вып'юць крывасмокі. Не ведаюць чужынцы, што і рабіць далей, як адсюль, з мелкаводдзя, выбрацца. Толькі пачулі, мабыць, іхнія малітвы багі, паслалі ім дапамогу. І прыйшла яна не ў выглядзе нейкіх там асілкаў-волатаў, а ў выглядзе звычайнага чалавека: невысокага росту, каранастага, даўгавусага і барадатага. Заўважыў ён судны на мелкім месцы і сам падышоў да чужых людзей. Ніхто яго не спыніў, толькі адзін з вояў непрыкметна зайшоў яму за спіну, на ўсялякі, відаць, выпадак, бо падарожнае жыццё да многага прывучыла. Але незнаёмец паводзіў сябе спакойна. Павітаўся і пайшоў да суднаў. Паглядзеў на іх пільна, прысеў разоў колькі і ажно прысвіснуў:

— Працы ў вас тут ды працы, людзі добрыя! І сядзець няма асабліва калі, бо вада з ракі ўцякае. Упус-

ціце момант і тады невядома калі з мелі здымецеся. Будзеце чакаць вясновых ці восеньскіх залеваў. Уставайцы ды за працу брацца трэба неадкладна. Вызвалім цяжкія судны, а там і да Вілейкі ўжо зусім недалёка застанецца дабірацца.

— Недалёка,— хмыкнуў нехта,— табе, можа, і недалёка, а нам і Усявышняму, мабыць, невядома, на колькі яшчэ хопіць... Мы ж ракі не ведаем і праз кожную сотню сажняў, нібы кацяняты сляпыя, на мелкаводдзе трапляем. Ужо і чаўны з людзьмі наперад пускаем, і зусім марудна плывём-вяслуем — нічога не дапамагае. Сілы нестае далей плыць. Няхай сабе Вілейка і зусім блізка будзе...

— Блізка, зусім блізка,— зноў паўтарыў незнаёмы чалавек,— усяго дзевяць петляў па Віліі пройдзем, і там ужо горад перад намі паўстане. Няма чаго баяцца.

— Нельга людзей падняць ад вогнішчаў, патаміліся страшэнна, чалавеча,— сказаў самы галоўны купец.— Каб жа гэта так проста было, а то...

— Уставайце, людзі, уставайце,— звяртаўся, падыходзячы да кожнага, мясцовы жыхар,— нельга ляжаць, бо да раніцы вада сысці можа і тады бяда вялікая будзе... Толькі б з месца крануцца, а там я вам дапамагу прайсці, ні разу не спынімся, я гэтыя мясціны з заплюшчанымі вачыма прайду і плыты правяду, не тое што судны. Толькі не засынайце, ісці трэба.

Паціху, паціху, але неяк раскатурхаў людзей. Паўставалі тыя і пытаюцца, што рабіць. Паказаў ім чалавек, як прасцей лодкі з месцаў ссоўваць. Стараюцца з апошніх сіл, а самі перамаўляюцца:

— Калі зноў праз сотню сажняў засядзем, то і пальцам не паварухнём дзеля выратавання тавару, хай будзе, што будзе.

Ды не давялося ім болей надрывацца, бо сапраўды правёў іх незнаёмец спакойна і без нейкіх там выкрунтасаў. Толькі прымаўляў пастаянна, пярэднім суднам кіруючы:

— Тут зусім нескладана, вы, ведама ж, паглядзець і запамятаць нешта не здолелі, бо тут усё крывымі знакамі пазначана. Бачыце, вунь бярозка падсечана, а вунь вярба завязана, і гэтак да самай Вілейкі знакі патаемныя стаяць. Хто іх ведае, знае, як карыстацца, таму і бяды асаблівай няма. А каму гэтыя крывыя знакі добра даюцца ў знакі...

Вось адтуль і пайшла назва вёскі — Крывазнакі.

## ЛАТЫГАЛЬ

У нашай мясцовасці ёсць такія вёскі з дзіўнымі, здавалася б, назвамі: Латыгаль (па-іншаму яшчэ яе называюць Латаголь), Мазалі, Вязынь і некаторыя іншыя. Не ад лёгкага жыцця, як здагадваецеся, яны пайшлі.

Даўно гэта было, у тыя старадаўнія часы, калі паны з мужыкоў здзекаваліся, што хацелі, тое і выраблялі, і дазволу на гэта ні ў кога не пыталіся. Суддзяў над імі не было, вышэй за сябе ўлады ніякай не прызнавалі. Скардзіцца на іх мо ніхто і не здагадваўся, бо надта ж часта адвучвалі гэткіх сумленных вернікаў. Калі зловяць, як пойдзеш да якога князя ці да ваяводы на жыццё-бядоту жаліцца, то ссякуць на горкі яблык, калі ўвогуле жыцця не пазбавяць. Вось і выбірай сабе што хочаш: ці сядзі ціха і трывай, як і астатнія навокал, ці паскардзіцца збегай, мо хто пану і данясе, тады адплаты хутка дачакаешся.

Колькі пакаленняў так жыло, колькі сялян-гаротнікаў здзекі жудасныя трывала! Ды што ты зробіш, раз лёс выпаў бядотны, як ні круціся, як ні імкніся, а ад яго не ўцячэш.

Рознае гаварылі ў тыя гады пра жыццё сваё людзі. Як пачнуць згадваць пра старое, то валасы дыбарам становяцца. У некаторых выпадках сялянам цяжка было жыць з-за таго, што надзвычай мала ведалі аб нейкіх патаемных прыродных з'явах ці таямнічых гуках і рухах. Спрабавалі тлумачыць, ды дзе там да праўды дайсці? Напрыклад, мая бабуля расказвала, як яны некалі жалі жыта і ім нехта пазавіваў па збажыне завоі. А гэта ж не дай Божа такога! Баяліся рукою дакрануцца да сплеценых у вузел каласоў, лічылі, што абавязкова надыдзе пакаранне і будзе яно надзвычай жорсткім і бязлітасным. Жанчыны ўсе ў слёзы, давай галасіць. Жаць пакінулі, дамоў прыйшлі зарана. Пытаецца стары дзед-гаспадар:

— А што ж гэта такое здарылася, мае каханенькія? Яшчэ вунь сонейка толькі на полудзень паказвае, а вы ўжо дамоў прыджгалі? Чым можна такія паводзіны растлумачыць?

Адказвае тады яму жонка:

— Не крычы на нас, мужу, не сварыся, бо не мы ў гэтым усім вінаваты. Не сварыся, а лепей паслухай, то і сам напалохаешся. Гэта ж нам нехта завоі па

жыце пазавіваў. Многа іх там. Мы спалохаліся і дамоў пакіравалі, сам жа ведаеш, што ад судакранання з імі можа быць...

— Так,— ціха пагадзіўся гаспадар і болей нічога благога на жанчын не казаў, а сеў на парог, галаву абшчаперыў дый думае, як жа ад такой злыбеды вызваліцца. Колькі так часу сядзеў — цяжка сказаць, але потым да гаспадыні звярнуўся:

— Ведаеш што, жонка, трэба ісці да варажбіта нашага, прасіць у яго дапамогі, іначай не выпадае. Заплачу добра, то і выручыць...

— Ведама ж, трэба ісці, бо болей няма да каго звярнуцца,— пагадзілася жанчына.

Пад вечар селянін узяў харчоў ды грошай і пакіраваў да варажбіта, а старэйшы сын, убачыўшы гэта, кажа на маці:

— Пайду я пагляджу, што там на нашай ніве робіцца, як хоць тыя завоі закручваюць. А то ўсё гавораць, гавораць, а што да чаго — я добра і не ўяўляю.

Пакіраваў у поле, знайшоў тыя завоі і вырваў іх сваімі ж рукамі. Зрабіў гэта, стаіць і чакае, што зараз на яго пакаранне абрынецца, але нічога не здарылася. Прыйшоў ён тады дахаты задаволены дый гаворыць:

— Няма там болей нічога, трэба заўтра коней у вазы запрагаць ды ехаць снапы вазіць у гумно, пакуль надвор'е добрае стаіць, бо дачакаемся дажджоў.

Гаспадар з гаспадыняй адно толькі — пераглянуліся. Справа ў тым, што стары ёй распавядаў, як ён да варажбіта схадзіў і той паабяцаў толькі праз тры дні завоі звесці начыста, а сын нешта зусім іншае мовіць.

З самае раніцы пазапрагалі коней, паселі ўсе і паехалі на ніву. Едуць, песні зычныя спяваюць, вераць, што самае дрэннае засталося ззаду. Прыехалі, і сапраўды, няма ніякіх завояў, чыстая збажына стаіць, толькі каласы шапочуць нешта адвечнае пад лёгкім ветрыкам. Злезлі і кінуліся шчыраваць, але вось тут менавіта і здарылася непрадбачанае: у таго сына, які завоі цішком павыдзіраў, вочы назад перавярнула і ён свету Божага болей не ўбачыў. Качаецца па зямлі, галосіць, а родныя навокал стаяць ды таксама плачуць. Гэткага работніка страцілі, калекай да скону жыцця застанецца. Бацька разгубіўся, стаіць ды толькі азіраецца. Маці не вытрымала і крыкнула:

— Чаго ты тут ціскаешся? Давай сядай на каня

ды ў вёску хлопца вязі! А там трэба па варажбіта тэрмінова бегчы, каб прыйшоў, можа, чым дапаможа! Давайце хутчэй, кладзіце яго на воз! Збожжа пачакае! Тут вось якое гора!

Гаспадар пагнаў каня, толькі пыл закурэў за возам. Прыехаў і не да сябе, а да варажбіта сына падвёз, каб справу паскорыць. Выйшаў той з будыніны, падышоў да воза, паглядзеў і нечаму... усміхнуўся:

— Гаварыў жа, каб без мяне нічога не чапалі, а то гора якое на сям'ю скінецца. Дык не паслухаліся. Вось цяпер і маеце гарох з макам. Гэта яшчэ, гаспадар, не ўсё. Твая жывёла на лугу пападала ад хваробы, і яе давядзецца ўсю на ногі ставіць, калі толькі можна будзе яшчэ гэта зрабіць. Вось чым ваша непаслухмянства абярнулася.

— Хто ж ведаў, што такое можа здарыцца з-за нейкіх там завояў,— азваўся небарака-сын,— гавораць усе, гавораць, дык думаў, што гэта хлусня і праклёну на іх няма.

— Ёсць праклёны, ёсць,— адказаў варажбіт,— хто-хто, а я гэта дакладна ведаю. Ведаю...

Пасадзілі варажбіта на воз і прывезлі дамоў, а там галосяць жанчыны, рукі заломваюць:

— Ой, родненькі, гэта ж і каровы нашы, і коні з ног зваліліся, па зямлі качаюцца! Ой, што ж гэта ўжо з імі робіцца! Ой, не дай Божа, не ўстануць, не ачомаюцца, то як жа мы далей жыць будзем?

Варажбіт паціху абышоў вакол жывёлы, пакратаў некаторых з іх і сказаў, да гаспадара звяртаючыся, які неадступна за ім крочыў:

— Ведаеш што, чалавеча, жывёлу я тваю здолею на ногі паставіць. У гэтым нічога дзіўнага і страшнага няма, а вось сына не выратую. Прабач, але не маю такой вялікай сілы. Не маю... Нейкі надта моцны чараўнік наслаў свае праклёны і чорныя чары на тыя завоі. Каб ведаць, як ад іх можна пазбавіцца, то іншая справа, а так... Не выратую я яго... Сканае ён, нягледзячы на маладыя гады, у страшэнных пакутах праз пару дзён.

Заплакаў гаспадар, такую навіну пачуўшы, і пайшоў прэч ад хлява:

— Навошта тая жывёла, калі сын мой памірае? Навошта мне тое багацце, калі дзіця роднае канае ў страшных пакутах?

— Не скажы, чалавеча,— азваўся варажбіт,— ба-

гацце і дабрабыт таксама патрэбны, бо іначай усе вымерлі б ці ў галечы існавалі.

Як сказаў варажбіт, так і здарылася. Жывёлу ён на ногі паставіў, а сын памёр. Пахавалі яго, а на магіле сам па сабе куст бэзу вырас вялікі і пышна цвіў штолета.

Толькі не ўсю праўду сказаў ім прадказальнік лёсаў і людскіх бядотаў. Не ўсю. Аказалася, што ён сам тыя завоі рабіў, каб людзі яго іх выпраўляць клікалі і плацілі добра, тады і жыць можна было, не працуючы. Жывёла, можа, год нейкі пажыла, а потым таксама канаць пачала. Адна за адной каровы спачатку пруцянелі, а там і ад коней нічога не засталося. Мяркуйце самі, як у вялікай гаспадарцы без усяго гэтага жыць. Тады ўжо ні поле не апрацаваць, ні дроў падвезці, і вымушаны людзі галадаць ды пабірацца ісці, каб неяк выжыць.

Такое вось з аднаго боку наварочвалася. А з іншага яшчэ ж паны прыціскалі. Гэта таксама злыбеда была не меншая, а можа, і намнога большая.

Быў у нашай вёсцы памешчык. Казалі старыя сяляне, што вёска, можа, і па-іншаму тады неяк называлася. Што ўжо гэта за пачвара такая была — то і сказаць цяжка. Мабыць, і сабою быў незадаволены, не тое што падначаленымі ці парабкамі. Біў, за што трэба было і за што не трэба. А няхай убачыць у каго кавалак хлеба на стале ці пустую капусту ў місе, то гэтак зробіць, што той праз год-другі ад голаду сканае. Баяліся новую вопратку апранаць, нават у царкву ідучы, бо з-за вугла дзе-небудзь можа памешчык люты паказацца, і тады не рады будзеш сарочцы вышыванай ці андараку: на плячах ад поту згніе. Сам пан хадзіў усё жыццё ў фраку, які, можа, яму ад напалеонаўскіх ці якіх шведскіх салдат застаўся. Смярдзеў, як той кабан дзікі, а фанабэрыўся, даруй Божа, як, можа, ніхто з паноў астатніх у белым свеце. Ні карэты якой, ні фаэтона людскага ў яго не было, затое злосці, сквапнасці ды неміласэрнасці на тысячу самых лютых паноў хапіла б.

Колькі ні прасілі ў яго вяскоўцы хоць крышку палегчыць іхняе становішча — усё дарэмна. Нікому не дараваў нават дробнае парушэнне. Плакалі-стагналі сяляне, забіваліся, вешаліся, тапіліся, бо выйсця іншага не бачылі. Могілкі пачалі займаць такую ж амаль тэрыторыю, як і вёска. Сем'і, даўней заможныя, якія

прыбытак не толькі ва ўласную кішэню мелі, а і гаспадарам сваім давалі, зараз былі пры смерці. Дзеці, калі і нараджаліся, то доўга не жылі — год, паўтара, і іхнія бязгрэшныя душы адляталі на неба, да Усявышняга. І да таго пан гэты народ пваграбіў, што хадзілі ўсе ў анучах падраных, крышы над хатамі дзіравыя і гнілыя былі. Есці ўжо не было чаго, лебяду, крапіву і тую даўным-даўно паелі.

Вось адсюль і сталі паселішча наша называць Латыгаллю, адным словам, латы ды голь.

## ТЭКЛІНАПОЛЬ

Больш чым паўтара стагоддзя таму вёска называлася па-іншаму — Шалавічы. Старыя людзі добра памяталі тую часіну. Перамянілі назву не з-за нейкай трагічнай ці гістарычнай падзеі, не. Проста валодаў гэтымі землямі тады багаты памешчык (сяляне яго называлі князем ці графам) Скірмунт. Вось ён і зрабіў усё.

Справа ў тым, што ў Скірмунта была адна-адзіная дачка, і звалі яе па-народнаму — Тэкля. Вядома ж, калі больш няма на каго свае ласкі і багацці ссыпаць, то яны дзяўчыне і даставаліся. Бацька яе любіў больш за ўсё на свеце. Нічога не шкадаваў, ні ў якой просьбе не адмаўляў. Праўда, трэба сказаць, што паненка расла душэўная, ніяк не паказвала сваё высокае становішча, а наадварот, з дзяўчатамі-служанкамі сябравала, па вёсках ездзіла ў экіпажы ці пешкі хадзіла. Прыпыніцца дзе-небудзь сярод поля, калі вяскоўцы жыта жнуць, і пачынае ім дапамагаць ці слухае, стаіўшыся, самотныя народныя песні, у якіх вельмі часта спявалася не толькі пра цяжкую працу, але і... пра каханне, пра галубоў-пташак, якія каханым прывітанне за многа вёрстаў прыносілі. Бацька спачатку палохаўся, што набярэцца ад мужыкоў дурнога чаго, але потым пераканаўся ў адваротным: дзяўчына яшчэ лепшай стала. Спачувала ўсім, заступалася за гаротных і бедных і Скірмунту ў вушы ўводзіла, што, маўляў, мы не збяднеем, калі селяніну кароўку купім ці жабраку дамо пераспаць у гумне ды кавалак хлеба з малаком перакусіць, а на небе нам гэта ўсё залічыцца. Пан не пярэчыў болей, толькі прасіў папярэджваць

яго, куды будзе ад'язджаць ці ісці, каб ведалі слугі, дзе яе шукаць.

Прыгожая надзвычай, казалі, была паненка. Як стане Тэкля, як павядзе сваімі тонкімі ручкамі, як выгнецца сваім страйнюткім станікам ды як зацягне гучным голасам народную песню, то ажно вада ў стаўках пакалыхвалася ў такт мелодыі. Потым пачнуць дзяўчаты падцягваць і гэткі ўжо карагод наладзяць, што да позняе ночы нельга па хатах паразганяць.

Прачулі пра прыгажуню багатыя паны ды давай сватоў да яе засылаць. Вось дзе ўжо смеху было! Тэкля весялуха была, за словам у кішэню ніколі не лезла і за сябе магла пастаяць. Едзе чарговы жаніх, слугі ў палац бягуць Скірмунту дакладваць, а той рукі за пояс заторкне і гаворыць:

— Ну што ж, вядзіце жаніха ў пакоі!

Прывядуць таго, гляне гаспадар, і вусы ўгару самі па сабе ўздымуцца: перад ім ягоны равеснік стаіць, а то яшчэ і старэйшы. Але ж нельга паводзіць сябе насуперак дваранскаму этыкету, трэба прытрымлівацца яго, бо суседзі потым будуць адварочвацца. Запросіць пан сесці госця, а сам скажа слугам:

— Ідзіце дачку паклічце! Скажыце, жаніх прыехаў!

Слугі папярэдзяць паненку, а дваровыя дзяўчаты дапамогуць ёй апрануцца. Яна і кажа сяброўкам:

— Зараз я ім наладжу свята! Зараз пакажу, дзе іхнія крылы растуць!

Расчырванеецца Тэкля са злосці, на кветку-ружу стане падобнай і ў пакой да гасцей кіруе. Як убачыць, хто яе там чакае, то і не ўтрываецца, каб што востранькае не падкінуць:

— А татачка, а родненькі мой, а ты ж гаварыў, што я свайго дзядулі каханага не памятаю? Вось жа ён сядзіць перада мною! Хіба ж не так? Нават у сядзячага ногі трымцяць, рукі калоцяцца! Не ад хвалявання ж гэта?

Скірмунт маўчыць, маўчыць, ад гасцей адварочваецца, а потым як зарагоча на ўвесь палац:

— Ну дачушка! Ну і сказала! Вось дык адзначыла!

Разгневаныя госці з жаніхом разам за дзверы ляцяць, слінаю пырскаючы, абяцаюць разабрацца, а бацька з дачкою са смеху душацца. Потым адыдуць абое і Скірмунт скажа:

— Як жа мы, Тэкля, далей будзем? Усе табе не

падабаюцца! Усіх ты высмейваеш, дражніш, а дзе ж я табе добрага жаніха знайду, калі ўсе такія вось трапляюцца? Ты ж ведаеш, што сярод нашага брата, памешчыка, працавітых ды шчырых людзей мала.

Такое вымавіць і прыціхне сумны. Дачка прыхінецца да плечука і ласкава гэтак вымавіць:

— Ай, татулька, ты не чапай мяне з гэтымі жаніхамі! Надакучылі гэтыя перастаркі ды дзяды сівабародыя! Я ж супраць іх як унучка! Ці ж можна пра нейкае там сумеснае жыццё гаварыць?

— Але ж недзе трэба, Тэкля, і пару сабе знаходзіць, каб потым было на каго ў жыцці абаперціся. Вунь як мы з тваёй нябожчыцай матуляй. Душа ў душу ў нас усё было. Толькі вось Усявышні чамусьці ёй такі кароткі жыццёвы шлях вызначыў...

Замаркоцяцца абое. Дзяўчына змахне непрыкметную слязу і скажа:

— Не трэба, тата, болей нікога. Калі ўжо такое надарыцца, то я сама сабе шчасце знайду. Добра?

— Добра,— пагаджаўся той, і ўсё наладжвалася.

Вось такі быў пан Скірмунт і такая ягоная дачка Тэкля. Незвычайныя людзі. З багатага калена, а вось проста і даступна было ў іх маёнтку.

Тэкля па-ранейшаму хадзіла да сялянскіх дзяўчат, удзельнічала з імі ў гульнях і скоках і неяк пачала заўважаць на сабе нейчы пільны позірк. Аглянецца — нікога няма такога, каб на яе не пазіраў. Яшчэ б, паненка, і надзвычай багатая, і прыгожая. Думала спачатку, што падалося. Аж аднаго разу, калі пусціліся іншыя дзяўчаты з хлопцамі «Казака» танцаваць, да паненкі Мікіта падышоў і за руку пацягнуў у кола. Таньчаць абое, а твары расчырванеліся, вочы гараць, смяюцца радасна. Нічога такога і не гаварылі, ды пачулася, што цягне іх адно да аднаго. Пайшлі з вячорак разам. Хлопец ідзе побач з Тэкляй, а слова вымавіць баіцца. Як жа пачаць размову? Дзяўчына і граматная, і надзвычай прыгожая, ды і бацька ж памешчык, не роўня шматлікім панам. Здагадалася Тэкля, што на душы ў юнака творыцца, і сама гаворыць:

— Чаго спахмурнеў, Мікітка? Такі вясёлы кавалер мне сёння трапіўся, што заснуць па дарозе можна. Вось сяду ў экіпаж, то там мне фурман будзе байкі ўсялякія казаць, раз ты не можаш. Што маўчыш усю дарогу, гавары што-небудзь, а то дамоў і сапраўды паеду,— прыстрашыла хлопца.

— Не трэба дадому,— неяк само па сабе вырвалася ў Мікіты,— давай яшчэ паходзім. Паглядзі, як хараша, як ціха навокал...

— Не бойся, дурненькі,— ласкава адказала Тэкля і... прыхінулася да пляча свайго абранніка.— Мне таксама падабаецца...

З таго самага дня паненка страціла спакой. Ледзьве толькі за полудзень час хіліцца, а яна ўжо фурмана ганяе, каб хутчэй коней запрагаў, і ехаць на вячоркі да дзяўчат збіраецца. Дзівіўся Скірмунт:

— Не разумею нічога. Нешта тут не тое. Не тое творыцца.

Але дзяўчына цалавала бацьку ў шчаку і, весела спяваючы, ехала з двара. Так не доўга цягнулася. Можа, паўгода, а можа, болей ці меней крыху, хто яго там падлічваў. Зайшла аднаго надвячорка Тэкля да бацькі ў пакой і гаворыць:

— Тата, давай мы з табою сёння праедземся да нашых далёкіх хутароў. Каб ведаў ты, якая там прыгажосць. Паглядзіш — і спаць спакойна не зможаш, пакуль другі раз туды не трапіш.

— Ай, дачушка,— пачаў адмаўляцца той,— спаць лягу. Стары я ўжо стаў, каб прыгажосць глядзець некуды ездзіць.

— Татачка,— умільна глянула на яго дачка.

Пан не вытрымаў:

— Так ужо і будзе — паехалі!

Едуць яны па дарозе паміж жытнёвых палёў, агледваюцца, ды адчувае Скірмунт, што нешта тут не тое. Не для гэтага паклікала яго сёння дачка.

— Гавары ўжо, гавары, лісічка хітрая,— сказаў ён Тэклі.

Тая павагалася крыху і пачала:

— Памятаеш, тата, нашу даўнюю размову?

— Якую?

— Пра censatoў...

— А-а-а...

— Дык вось, знайшла я свой лёс, міленькі. Сама знайшла...

— Ну і хто ж ён?

— Чалавек, тата, добры чалавек.

— Разумна сказана, разумна. Як бы мне хоць адным вокам на яго зірнуць, Тэкля?

— Зараз, пачакай, зірнеш.

Прыпыніла коней паненка, выскачыла з экіпажа і кінулася да бярозавага гаёчка:

— Мікітка! Мікітка! Хадзі сюды, не палохайся!

Праз колькі хвілін з гаю паказаўся высокі, шыракаплечы хлопец. Падышоў да пана Скірмунта і ўпаў на калені. Памешчык спачатку не разумеў, што да чаго, і ўсё ашаломлена глядзеў на дачку, але тая і выгляду не падавала, што хвалюецца. Потым пан не здагадаўся зрабіць нічога іншага, як... зарагатаць:

— Вось дык дачушка, вось дык выкінула штуку! Знайшла сабе жаніха! Мужыка... Так?

— Не мужыка, а шляхцюка! — бойка адрэзала тая, і Скірмунт зразумеў, што тут ужо ўсё вырашана.

Аддаў ён сваю дачку за Мікіту, зямлі ім мноства перадаў у спадчыну, ссяліў адсюль сялян і пабудаваў шыкоўны маёнтак, які ў гонар дачкі Тэклі назваў Тэклінаполем. Але людзі дасюль называюць гэтую мясціну, як і раней, Шалавічамі.

## ШВЕДЫ

Калі вам пра ўсё падрабязна распавядаць, то сённяшнія Шведы — гэта не што іншае, як даўнішнія аддаленыя выселкі. Яны існавалі на рацэ Віліі і тады называліся па-свойму — Высокая Прыстань. Такая назва азначала, што паселішча ляжала вышэй па цячэнні, а ніжэй таксама вёскі ўсялякія існавалі, толькі такой вось назвы ніякая з іх не мела.

Першымі людзьмі, якія сталі жыць у Верхняй Прыстані, былі чацвёра вяскоўцаў, высланых з Шаловіч. Не надта добрыя гэта былі сяляне. Калі адным словам, дык зладзеяватыя. Вы ж ведаеце, што ў тыя часы зладзейства было найгоршым грахом, за яго пастрашнаму каралі. Зловяць, то на месцы могуць і жыцця пазбавіць, асабліва калі сведкі побач былі. Законы суровыя існавалі, і іх прытрымліваліся не адно стагоддзе. Дзякуючы такому суду, хаты на ноч ніхто не зашчэпваў, бо не баяліся, не вадзілася ліхіх людзей па наваколлі. Але неяк пачалі сяляне заўважаць, што то ў адной гаспадарцы, то ў другой нешта прападзе. Пагамоняць паміж сабой вяскоўцы, паскардзяцца і далей працуюць. А страчанага гэтак і не знаходзілі. Спачатку казалі, што ваўкі ды мядзведзі з пушчы тут гаспадараць, калі паблізу нікога няма і пастухі не-

куды адлучыліся. Такому і верылі. Верылі да аднаго выпадку.

Прыбягае неяк у паселішча скрываўлены падпасак і немым голасам крычыць, што яго ледзьве не забілі за каровамі. Не верацць сяляне:

— Табе, можа, хлопча, калі заснуў, то ў сне такое прыснілася! Ці мо на патраву жывёлу выпусціў, дык, каб нас з глузду збіць, навыдумляў рознага?!

Божыцца падпасак, клянецца самым святым, што нікуды ён не адыходзіў, не спаў і патравы блізка не было. Тады людзі пачалі даводзіць, што, можа, гэта ваўкі на чараду накінуліся. Не вытрымаў хлапчук, заплакаў і гаворыць:

— Дык, можа, я сам сабе і галаву разбіў, каб кроў цурчэла? Зрабіў так для таго, каб вы не здагадаліся, што я ў нечым вінаваты?.. Каму мне паскардзіцца? Да чужых людзей, можа, бегчы?

Сцішыліся тады вяскоўцы, сапраўды, многае не супадала ў апавяданні падпаска. Адзін з сялян стрымана спытаўся:

— А ты дакладна ведаеш, што гэта людзі былі, а не ваўкі ці якія іншыя звяры?

— Я нават аднаго з нападаючых у твар бачыў,— усхліпваючы ўсё яшчэ, адказаў хлапчук.

— Хто гэта? — і сяляне цясней абступілі падпаска.

— З таго краю яго хата... Другая ад канца... Івана Сівага...

— Такі нездарма на яго ў апошнія часы ўсе гавораць, што красці пачаў...

— Але ён жа не адзін быў?

— Не... Іх некалькі чалавек было. Бо як мяне білі, то світку на галаву накінулі і перамаўляліся паміж сабою.

— Пайшлі да таго злыдня і глянем, што ён робіць,— запрапанаваў нехта.

Натоўп дружна пакрочыў на другі канец вёскі. Заходзяць людзі да Івана ў будыніну, а там... сядзяць чацвёра вяскоўцаў за сталом і п'юць сярод белага дня.

— Дык вось чым яны ў будні дзень займаюцца!— выгукнуў нехта.— І дзе толькі грошы бяруць?

Запанавала напружаная цішыня. Потым хтосьці з вяскоўцаў выгукнуў:

— Ды што на іх глядзець? Каламі па плячах ды на могілкі, ваўкалакаў гэтkіх!

Можа, усё гэтак і завяршылася б, ды знайшлася нейкая цвярозая галава, якая паспела падумаць, што можа далей атрымацца, і супакоіла аднавяскоўцаў:

— Забіваць толькі з-за таго, што адзін чалавек іх бачыў і падазрае ў злачынстве, мы не можам. Трэба каб былі сведкі, а іх няма.

Людзі крыху супакоіліся. Меркавалі, што ж рабіць з вясёлай кампаніяй. Стары, сівы дзед, які прыцёгся сюды для таго, каб глянуць на злачынцаў, прамовіў старэчым голасам:

— А ведаеце, дзеткі, як у даўнія часы з такімі людзьмі абыходзіліся?

— Як жа гэта?

— Калі віну цалкам не даказвалі, то іх з вёскі высылалі. І ім добра, і паселішчу лепей.

— А давайце і мы так зробім,— пачулася з натоўпу. Астатнія пагадзіліся. З таго самага дня чатырох чалавек разам з сем'ямі прагналі за межы вёскі і грамадскіх земляў. Сталі яны жыць на беразе Віліі. Цягнула, канечне, іх да вяскоўцаў, ды, баючыся за ўласнае жыццё, не лезлі болей. Зямелька там была надта неўрадлівая, і трэба было дзень і ноч рук не пакладаючы працаваць, каб нейкі кавалак хлеба на стале мець. Тут ужо не да зладзейства было. А калі нешта падобнае і надаралася, то жыхары навакольных вёсак адразу зазначалі:

— Ды гэта ж тыя, ваўкалакі, з Высокай Прыстані, пагаспадарылі, болей няма каму!

І беглі разлічвацца са зневажальнікамі. Даволі часта здаралася, што тыя і не былі вінаваты, але ж...

Саму назву Высокая Прыстань, сцвярджаюць людзі, далі таму хутару плытагоны, якія некалі вырашылі прыпыніцца ля гэтай мясціны і адпачыць. Падагналі плыты да берага, папрывязвалі іх за бліжэйшыя дрэвы і самі на бераг падаліся, каб пераспаць на сухім, пагаманіць спакойна ля вогнішча. Агледзеліся, прымеркавалі, што да чаго, і адзін з чужынцаў прамовіў:

— Але ж тут, браткі, і высокая прыстань. Трэба будзе на далейшае яе запомніць. Ці апошні раз мы тут апынуліся... Бачыце, дзе вада засталася, а тут вышыня. Высокая прыстань. Займаць паводка тут не будзе.

З тых слоў і засталася назва.

Значна пазней Высокая Прыстань стала называцца Шведамі. Гавораць, што ў нейкай вярсце ад вёскі

знаходзяцца шматлікія, гэтак званыя шведскія магілы. Сапраўды, там і сёння відаць з дзесятак невялікіх курганоў, якія ўжо дзесяткі разоў раскопваліся прагнымі да дармовага багацця вяскоўцамі, і не толькі імі, бо з'яўляліся скарбашукальнікі і з далёкіх мясцін. Чамусьці менавіта са шведскімі захопнікамі народныя паданні звязваюць маўклівыя курганы.

Распавядаюць, што калі ішла тая бязлітасная вайна, то ваявалі расейцы і шведы. Сама вёска Высокая Прыстань апынулася нібы разарванай на два варожыя лагеры. З аднаго канца яе стаялі расейскія пазіцыі, а з другога — шведскія. Як змрок апускаўся на наваколле, то салдаты не ваявалі, не стралялі, а клаліся адпачываць, і толькі вартавыя не драмалі ды пільна сачылі, каб чаго непажаданага не прыключылася. Сонца ледзьве ўзыдзе, а гарматы ўжо пачыналі страляць, конніца з аднаго боку на другі кідалася, пяхота рэзала-калола і так да самага вечара. І зноў разыходзіліся, нават загінуўшых не прыбіралі, пакідалі на скрываўленым полі бою.

А справа летам адбывалася, і як прыгрэла добра, то засмярдзелі трупы страшэнна, нельга было дыхаць. Тады дамовіліся паміж сабою высокія начальнікі, што ваяваць не будуць да таго часу, пакуль забітых і памёршых ад ран не пахаваюць. Вось тады і панасыпалі вялікія курганы над мерцвякамі. Ляжалі там і шведы, і расейцы, але назва засталася адзіная — Шведскія Магілы. За той часткай вёскі, дзе стаялі варожыя войскі, замацавалася назва — Шведы, якая з цягам часу канчаткова выціснула старую назву вёскі — Высокая Прыстань.



# ДЗЯРЖЫНСК (КРУТАГОР'Е. КОЙДАНАВА)

Горад гэты мае надзвычай багатую гісторыю, можа, як рэдка які на Беларусі. Ужо толькі тое, што ў яго зараз трэцяя назва, гаворыць само за сябе. Спачатку Крутагор'ем людзі назвалі сваё паселішча і мелі для гэтага ўсе падставы, бо хаціны знаходзіліся нібы паміж невысокіх пясчаных гор, што з усіх бакоў узвышаліся на тутэйшай мясцовасці. Гаварылі, пра такія ўзгоркі існавала таксама паданне. Паводле яго, станавілася вядома наступнае.

Калі Усявышні ствараў Сусвет, то паўсюдна імкнуўся зрабіць зямельку святою аднолькава, каб першыя людзі не скардзіліся, што, маўляў, у тых вунь якая добрая, а ў нас адзін пясочак ды лебяда па ёй расце, і болей нічога. Не спяшаўся Бог, меркаваў поле да поля, луг да лугу, балацінку да балацінкі, і ўсё прыгожа атрымлівалася ў яго. З раніцы да вечара шчыраваў, нават не прысядаў, бо хацеў як мага хутчэй справу завяршыць, людзей выпусціць з неба. Паглядзець і самому карцела, як жа яны будуць весці зямныя справы, бо ўпершыню такое адбывацца будзе. Задаволены быў Бог, што ўсё так хараша ішло. За дзень гэтулькі

зямной цвердзі ствараў — дзесяткі тысяч людзей можна смела на ёй размяшчаць. І ўсё, магчыма, так і завяршылася б, каб не гаротны выпадак.

А здарылася наступнае. Нездарма ж у народзе гаворацъ, што дзе Бог ступае, там за ім чорт драпае. Гэта значыцца, сочыць, глядзіць, цікуе. Такое і тут надарылася. Усявышні важна зямлю па спрадвечнай вадзе сее, а нячысцік на сонейку грэецца пад недалёкім лазовым карчом. «Сей,— думае,— сей, а я пагляджу, што атрымаецца...» Усявышні кідае жменю за жменяй, а чорту, можа, ужо за гэтулькі дзён і глядзець надакучыла. Каб яшчэ сам працаваў, а то іншы шчыруе, а ты адно — ляжыш ды пазіраеш. Хочацца і яму што-небудзь новае ў сваю чарцячую душу ўнесці. Але не прыдумляецца пакуль. Павярнуўся нячысцік на другі бок, лахматы азадак да сонца падставіў, і тут найшло: «А што, калі Бога ўзяць і напалохаць? Ён жа мяне не бачыць. Я нечакана як гыркну, то і пясок ва ўсе бакі пасыплецца без ладу. Во дзе смеху потым будзе! Во людзі парагочуць, а ўжо калі сваім братам па крыві параспавядаю, то ўвогуле імя маё бессмяротным назаўсёды застанецца...»

Вырашыў дачакацца вечара, каб не гэтак бачна было,— сонца сядзе, змрок апусціцца... Але Усявышні дапазна сее. Галава зусім іншым у яго забіта: як бы працу найхутчэй скончыць ды адпачыць да раніцы. Паціраецца бакамі аб корч чорт, круціцца, ведама ж, не сядзіцца яму на адным месцы, калі такую штуку ўдумаў. Ледзьве дачакаўся, калі сонца садзіцца пачало, на большае сілы не стала. Вылез са свайго ўтульнага схові́шча і крадзецца да Бога. Толькі ж дурны ён, дурны. Дзе ж гэта вы бачылі, каб Усявышні не ведаў, што нехта супраць яго злое задумаў? Даўно ўжо бачыў і знаў Бог, дзе нячысцік сваё кубло ўсталяваў, але не было яму справы да гэтай агіднай пачвары. Ляжыць сабе, няхай і ляжыць, больш важная справа стаяць будзе, калі пачнеш гэтага лайдака тудысюды ганяць, каб не пасмейваўся ды чаго дурнога не прыдумляў назло. Ну, а раз ужо нячысцік падкрадвацца пачаў, то нічога іншага не заставалася, як прыняць ягоны выклік і ўтварыць яму якую-небудзь дрэнную штуку. Але робіць выгляд Усявышні, што не толькі не бачыць, але нават і не адчувае, як чорт падкрадаецца ўсё бліжэй і бліжэй. Нячысціку ж здаецца, што гэта ён так добра маскіруецца. Прыпыніўся,

перавёў дух і зноў далей кіруе. Усявышні сее і сее, толькі дробны пясочак ва ўсе бакі разлятаецца. Засталося, можа, нейкіх крокаў пару. Чорт рот разявіў, а крыкнуць не здолеў — смех гэтак душыў. Ужо разоў колькі так спрабаваў, і нічога не атрымлівалася. Нарэшце з духам сабраўся, вочы прыкрыў, каб не бачыць, як Бог з перапуду падскочыць, і рот як мага шырэй разявіў. Ды не ўсё па-ягонаму атрымалася. Усявышні ў апошні момант рэзка адвярнуўся, хоп чорта за хвост і да сябе падцягвае. Наматаў хвасцішча вакол рукі, ухапіў цурбалак, што зараней нагледзеў, і давай аходжваць ім свайго дармовага памочніка. Лупасіць без перадыху, б'е і прымаўляе: «Не за тое, што з мяне смяяцца ўздумаў, а за тое, што ўсім астатнім людзям назло жадаў зрабіць!»

Чорт ляціць паперадзе так хутка, што Усявышні і ногі за ім не паспявае перастаўляць. Балюча нячысціку, а што зробіш, трэба трываць. Не падумаў загадзя, што справа і такім чынам можа абярнуцца. Вось і адплата настала. Слёзы з вачэй, што боб, буйныя коцяцца, і дзе пройдзе след, там ззаду рэчка крывая ці балацінка застаецца. А дзе супыніцца крыху гэтая своеасаблівая пара, каб дух перавесці, бо чорт спатыкнецца і носам зарые, а Бог стаіць, сапе сабе, але не падганяе, каб і самому крыху сілы набрацца ды далей лешака вучыць, там азярцо цэлае, чаротам ды аерам парослае, утворыцца. Нарэшце стала ўжо і нячысціку не па сіле такія пакуты вытрымліваць:

— Адпусці, Божа! Ніколі болей... Чуеш, ніколі болей не буду. Толькі адпусці і не бі, бо памру хутка, калі не перастанеш.

Але Бог не мог дараваць лайдаку, які нічога не рабіў, нават пальцам ніводным не паварухнуў, каб дапамагчы ці недзе садзейнічаць добрай справе, наадварот, толькі зло чыніў. Зноў схапіўся за цурбалак і давай лупасіць свайго зневажальніка. Тут ужо чорту стала ўвогуле не да просьбаў. Ляціць ён, толькі пыл і пясок у бакі разлятаюцца, ды гарлае-галосіць так, што ўсе іншыя гукі навокал глушацца. Птушкі божыя і тыя разлятаюцца куды вочы глядзяць, каб толькі не бачыць, што там адбываецца.

Зноў стаў прасіцца нячысцік, бо збаяўся, што раз'юшаны Бог увогуле жыцця пазбавіць:

— Усявышні, працу любую мне прызначай, куды хочаш пасылай, усё буду як мага лепей выконваць.

Шчыра табе гавару. Хочаш, нават пабажуся?

— Ты яшчэ і тут здзекавацца ўздумаў,— загрымеў Бог,— табе яшчэ мала? Бажыцца ён мне будзе! Ваўкарэзіна недабітая, гіцаль смярдзючы!

Тады ўпаў на зямлю чорт і прыкінуўся мёртвым. Але і Бог не дурань, ураз здагадаўся, як праверыць:

— Мабыць,— гаворыць,— сканаў... Шкада, хацеў яшчэ болей яго палупасіць, каб на ўсё астатняе жыццё навука была. Шкада... Але нічога, я яму і здохламу дагаджу. Вунь вогнішча дыміць, панясу і тым часам, пакуль дамоў ісці, шыбну яго ў прысак, хай спячэцца, то хоць іншыя звяры ці птушкі пажывяцца. Усё роўна з яго ніякай карысці на зямлі раней не было.

Ухапіў чорта за хвост і зрабіў выгляд, што валачы сабраўся да агню. Не да прытворства стала нячысціку, усхапіўся на ногі гэтак жвава, нібы яго і ўвогуле ніхто ніколі не дубасіў:

— Божа! Чым хочаш табе паклянуся, што болей ніколі нават драбніцы на зло не зраблю. Толькі добрае і справядлівае чыніць буду! Адпусці, Божа! Адпусці, бо і сапраўды сканаю! Ужо не магу ісці нават, не тое што ад цябе ўцякаць!

Усявышні пастаяў-пастаяў, падумаў і кажа ў адказ:

— Ну, так ужо і быць па-твойму! Адпушчу, пашкадую цябе ў апошні раз! Толькі ты мне за гэта ўсю зямлю, якую я, за табою бегаючы, перакалашмаціў і няроўнае поле зрабіў, засыплеш, усе яміны і балаціны зраўнуеш. Калі лугі сапраўднымі паробіш, то, можа, і дарую табе гэты грэх! Не думай, што я не праверу ці забуду! Не! Запомні, калі нешта не зробіш, то каб болей не прасіўся і не маліўся, нішто табе не дапаможа!

— Засыплю... Зараўняю... Прыбяру... Будзе чысцютка і раўнютка, як на далоні. Вось пабачыш. Не падвяду і не падману, можаш не сумнявацца.

— Эх, што ўжо будзе, тое і будзе, але навука табе добрая, нячыстая твая душа! Дзецям нават закажаш, як са мною жартаваць. Праз пару тыдняў мясціны гэтыя сам праверу. Калі не выканаеш, то яшчэ не раз спаткаемся. Будзе ў мяне магчымасць з табою расквітацца.

— Не сумнявайся, Божачка, не сумнявайся,— ласкава зазіраючы ў вочы Усявышняму, тараторыў чорт,— зраблю. Каб мне на гэтым самым месцы праваліцца, калі падману. Зраблю...

— Не хапае яшчэ, каб ты на гэтым месцы праваліў-

ся, смярдзець жа нечысцю вечна будзе мая зямелька. Не трэба. Лепей зрабі тое, што табе загадваю. Запомні, праз два тыдні сам прыйду і праверу.

Сказаў гэтыя словы Бог і разжаў руку, а чортаў хвост слізгануў, нібы шаўковая нітка, і панёсся нячысцік уцякаць, толькі кустоўе затрашчала ды дрэвы пагнуліся. А Усявышні стаіць ззаду ды пасміхваецца:

— Вось дзякуй чорту, хоць трохі душою адпачыў, а то ўсё працуй і працуй, ніякага перадыху няма! Цяпер і ён пры справе будзе, не стане галёкаць цэлымі днямі напралёт!

Але, як пазней аказалася, дарма ўзрадаваўся Бог, бо не выканаў нячысцік наказу, не стрымаў свайго слова. Можа, спачатку і браўся нешта рабіць, бо некаторыя мясціны аказаліся роўнымі, а потым, відаць, надакучыла яму гарбець і ён проста збег у невядомым накірунку.

Калі Бог прыйшоў роўна праз два тыдні, каб глянуць на тое, што ягоны сапернік зрабіў, то, бедалага, ажно за галаву ўхапіўся: навокал кустоўе дзікае панарастала, дрэвы нейкія нізенькія і крывыя, а самае галоўнае — узвышшы ўсялякія, горы пясчаныя, толькі дзе-нідзе невялічкія палі бачны, дзе сеяць збажыну можна будзе. Пра лугі і гаворкі не было чаго распачынаць, бо на іх месцах суцэльныя балоты ляжалі. А рэкі-то таксама дрыгвяністыя, небяспечныя, да такіх блізка не падступішся. Давай Усявышні аберучкі сам усё правіць, але дзе вы бачылі, каб, калі ўжо ўрасло, нешта людскае зрабіць можна было? Шчыраваў-шчыраваў Бог, стаміўся моцна, прысеў адпачыць і ў адчаі, што не надта атрымліваецца, прамовіў:

— Але ж тут і крутагор'е! Але ж і крутагор'е!

Вось з таго часу Крутагор'е і пайшло. Людзі старадаўнія гаварылі, што паселішча пад такой назвай існавала даволі працяглы перыяд, можа, нават з тысячу гадоў, хто ж яго ведае. Захавалі і рэшткі былога гарадзішча. А яшчэ прыводзяць цікавы факт, што ў праваслаўнай царкве, якая дзейнічае і ў нашыя дні, некалі была дзіўная ікона, яна згарэла дзесьці ў канцы мінулага стагоддзя. На той іконе нібыта было напісана: «Крутагор'е, 1146 год». Вось калі яшчэ такая назва існавала. Потым яна перамянілася, і перамянілася не без дай прычыны, а з нагоды слаўнае перамогі беларускага войска над татарскімі заваёўнікамі.

Ні для каго не сакрэт, што нашы продкі найбольш часта сутыкаліся ў даўнія часы на палях баёў менавіта з татарскімі войскамі. Пры качавым спосабе жыцця яны доўга не затрымліваліся на адным месцы, а пастаянна пераязджалі. Для таго, каб неяк карміць свае шматлікія сем'і, не знаходзілі нічога лепшага, як рабаваць чужыя землі, бо самі гаспадарак не вялі, не гандлявалі. З'явяцца нечакана, выпаляць, вынішчаць усё пад корань, захопяць багаты палон і ўцякаюць далей ад месца бою, каб сапернікі не паспелі ў сябе прыйсці ды за мячы ўзяцца, бо тады зусім іншая справа. Тады ўжо пакрыўджаныя каварствам і злаславасцю мясцовыя жыхары нікога з чужынцаў не шкадавалі і секліся з патроенай сілаю, помсцячы за родных і блізкіх, за сяброў і знаёмых. І ўдовы за зброю хапаліся, каб за мужоў сваіх адплаціць. З такім народам заўсёды надта цяжка змагацца. Ведалі гэта захопнікі, таму і прытрымліваліся своеасаблівай тактыкі, якая пераходзіла з пакалення ў пакаленне.

І на той раз таксама ціха выбраліся няпрошаныя госці з родных мясцін. Па дарозе да іх далучаліся ўсё новыя і новыя орды. Войска столькі сабралі, што і самім страшна стала, як жа яго пракарміць, дзе прыбытак які шукаць? Так хутка падышлі і да граніцы княства галіцкага князя Данілы, які цешыўся ўжо думкай аб сваёй поўнай незалежнасці. І вось незлічоныя войскі манголаў, што вёў жорсткі Бурундай, наступнік слабага Курамсы, апынуліся на мяжы Літвы з Расеяй.

— Ты друг ці вораг хана? — запыталіся ў галіцкага князя ганарлівыя паслы Бурундая.— Калі ты і сапраўды друг, то ідзі з намі неадкладна на Літву.

Даніла паспрабаваў было пацягнуць час, але яго сурова папярэдзілі:

— Не думай з намі хітраваць! Няма чаго есціпіць ставіць, тут найбольш важнае пытанне вырашаецца! Вояў давай, ды сам у паход збірайся! Пойдзем непакорлівых сапернікаў біць-паланіць, тады і пажывішся добра, бо, сам ведаеш, у нашага хана войска столькі, што паўзямлі можна смела паланіць, і яшчэ крыху застанецца! Можам і без цябе абысціся, але потым каб не шкадаваў і ў нагах нашага сонцалікага правадыра не валяўся!

— Вы не так мяне зразумелі, шаноўныя паслы вялікага хана! Вы не так мяне зразумелі! — пачаў

выкручвацца хітры галічанін.— Я і не думаў адмаўляцца ад такой, шчыра вам скажу, пачэснай для мяне прапановы! Гэта ж мне гонар робіць, а вы пра нейкія хітрыкі мовіце! Несправядліва так, несправядліва... Зараз клікну ваяводу і аддам загад.

Неўзабаве па палацы разнёсся зычны голас:

— Васілька! Васілька! Хутчэй да мяне! Справа тэрміновая, чакаць не можа! Дзе ты там валтузішся?

Прыбег князёў брат Васілька. Зірнуў спадылба на паслоў і ўтаропіўся на Данілу:

— Што такое здарылася?

— Слухай маю волю! Збірай вялікі полк і паедзеш на чале яго ваяваць з татарамі літвінаў. Так табе загадваю, бо іншага выйсця не бачу!

Васілька схіліў галаву і памчаў у двор выконваць загад.

На світанку наступнага дня Васілька разам з вялікім палком галіцкага войска выступіў на дапамогу хану Бурундаю. Далучыліся да войска татарскага і пайшлі вайною на Літву. Спачатку ўсё ішло добра, бо праваднікі былі, якія ўжо не раз, не два на гэтыя мясціны наязджалі і праводзілі чужынцаў патаемнымі сцяжынкамі да багатых паселішчаў і гарадоў. Аблогай татары не надта любілі займацца, тым болей на штурм адкрыты ісці. Гэтую тактыку яны не абіралі. Ім бы парабаваць, пазабаўляцца з жанчынамі, нахапаць золата і схавацца. Абміналі моцныя замкі і крэпасці няпрошаныя госці і кіравалі ў глыбіню тэрыторый, дзе ніколі не ступала нага чужынцаў. І што вы думаеце? Так далёка забраліся, што амаль Менск тагачасны, Наваградак не захапілі. Палону набралі столькі, што аховы не хапала. Ужо некаторыя найбольш цвярозыя галовы пачалі гаварыць аб хуткім звароце дамоў. Толькі дзе ж вы бачылі, каб той, хто ад думак пра золата начэй не спіць, пайшоў тады, калі яно амаль што пад нагамі валяецца? Большасць крычала за працяг рабавання, бо яшчэ хацелі ўзбагаціцца, каб не толькі сабе, але і дзецям сваім прыбытак з паходу прывезці.

Пакуль рабілі яны сваю жудасную справу, мясцовыя ваяры ачомаліся, да сілы вярнуліся, у дружыну буйную і надзвычай моцную сабраліся. Князь у іх быў дакладна вам і не скажу які. Адны гавораць, што Міндоўг, іншыя — што вялікі валадар Скірмунт. Тут,

самі ведаеце, рознае гаворац, асабліва калі некага жадаюць уславіць.

Князю, вядома ж, данеслі, якая сіла вялікая на Літву прыступіла. А ён мудрым чалавекам быў, спрактыкаваным ва ўсялякіх бітвах і сечах, таму правільна вырашыў — не лезці абы-дзе ў бой, пакуль вораг сам сутычкі шукае штодзённа, а пачакаць крыху. Чужынцы пашукаюць-пашукаюць ягонае войска і супакояцца. Будуць адчуваць сябе тады, нібы дома, вось і надыдзе чаканы час адплаты за ўсе здзекі і пакуты роднага народа. Загадаў валадар пільна сачыць за непрыяцельскімі атрадамі і даносіць яму аб усіх перамяшчэннях татарскіх ордаў. Не надта доўга чакаць давялося. Неяк надвячоркам прыляцеў далёкі княжацкі дазор на ўзмыленых, стомленых конях, і старшы дружыннік, нават не сапнуўшы духу, падбег да самога валадара:

— Княжа! Княжа! Татарскі атрад, што ля Менска паблізу быў, назад павярнуў! Можа, яны проста палон да аднаго месца зганяюць, а можа, і...

Вой не паспеў дагаварыць, бо яго перабіў сам князь:

— Не, чалавеча, не! Не палон яны да аднаго месца зганяюць, а ў зваротную дарогу сабраліся. Вось і надышоў наш час, сябры, з імі палічыцца, паглядзець, якія яны ваякі, калі супраць іх выступаюць не бяззбройныя старыя і жанчыны! Яшчэ пару дзён паназіраем і пакажам ім, дзе ракі зімуюць!

— Ваявода,— звярнуўся князь да сівога, магутнага чалавека, які стаяў ззаду і ўважліва слухаў разведчыка,— дзе ты мне параіш рашаючую бітву ўчыніць? Ты ж недзе ўвесь час прападаў, нешта ж усё выглядаў, прыцэльваўся... Скажы, час надышоў, ваявода, цягнуць далей не мае сэнсу, бо давядзецца татараў далёка ад роднай зямлі шукаць! Зараз самае важнае — зручнае месца выбраць...

— Сапраўды, княжа,— нечакана жыва азваўся той, да каго звярталіся,— падабраў я мястэчка, і не абы-якое, а такое, дзе ворага ўшчэнт разаб'ём, нават калі нас у некалькі разоў меней будзе. Там узвышшы, пагоркі навокал, конніцы няма дзе развярнуцца, а пехатою татары не ваякі. Вам гэта даўно вядома. У іх зараз мноства палону, абозаў і гэтак далей. Яны страшэнна абцяжараныя, марудна сунуцца, да таго ж, страцілі пільнасць і не чакаюць нападу. Усё гэта нам

на руку, і трэба выкарыстаць неадкладна, княжа, каб дарагі час не ўпусціць ды потым крывёю не плаціць...

— Дзякуй за параду, дарагі,— азваўся князь і крыкнуў дружыннікам: — Ну што, хлопцы, надакучыла ў жмуркі з татарамі гуляць? Час настаў і іх у мех заперці!

— Вядзі нас, княжа, на ворага, вядзі! — магутнымі галасамі адказаў абуджаны лагер.

Дзён праз колькі княжацкія войскі былі сабраны ў адзіны кулак. Але пакуль што на ворагаў не нападалі, чакалі, калі ўсе орды збяруцца разам, каб накрыць усіх адным махам. Зайшлі спераду і сталі баявым лагерам. Князь і ваявода былі пераканананы, што толькі на Крутагор'е праляжа шлях чужынцаў. Гэта быў самы адказны момант. Баяліся, што ворагі што-небудзь пранюхаюць, зменяць накірунак, і тады ўсё прапала.

Час цягнуўся марудна. Нарэшце на досвітку прыехаў дружыннік і сказаў, што на перадавую заставу наехалі ўжо татарскія вершнікі і што бою з імі, як і было загадана, воі не прынялі, а ціха і непрыкметна адступілі.

— Дзякуй Богу, што пачуў нашыя малітвы і не адвярнуў ворага ад нас! — сказаў валадар.— А цяпер няхай дапамагае нам у бітве!

Лютая сеча пачалася зусім нечакана для татараў. Біліся яны, праўда, упарта, але калі забілі іхняга хана Бурундая, то загаласілі, закрычалі, паскакалі хто куды, пакідаючы шматлікую здабычу, абы выратавацца. Але мала каму гэта ўдалося. Сведкі распавядалі, і гэта дайшло да нас праз стагоддзі, што столькі ворагаў набілі, столькі намалацілі — нельга было прайсці-праехаць на дзесяткі вёрстаў навокал. Палон увесь адбілі, людзей тутэйшых вызвалілі. Мала гэтага, войскі літоўскія пайшлі далей і вызвалілі ад навалы варожай многія іншыя гарады і населеныя пункты, сярод іх Мазыр і Чарнігаў, Старадуб і Карачаў.

У гэтых месцах быў не толькі Бурундай (некаторыя з людзей яго клікалі Койданам), але і вядомыя татарскія ханы Баюк і Балаклаў. Яны таксама знайшлі смерць пад гэтым старадаўнім беларускім паселішчам. З тае страшнае бітвы і стала Крутагор'е Койданавам.

Калі ў тутэйшых татараў, якія пусцілі на нашай зямлі свае карані, пытаюцца, што гэта за курганы навокал старадаўняга гарадзішча стаяць, яны адказ-

ваюць, што тут іхнім продкам мясцовыя ваяры паказалі, як трэба бараніць родную зямлю, аберагаць сваіх людзей і мілыя сэрцу вёскі і гарады. Вось такая даўняя гісторыя, такія паданні і легенды.

Ну, а адносна Дзяржынска, то тут не надта каб і цікавае што хавалася. Пасля смерці Дзяржынскага горад перайменавалі. Нікога і не пыталіся, трэба ці не гэта рабіць. Не, не пыталіся. Пры Саветах гэта ўжо адбывалася. Параўнаўча нядаўна, я добра памятаю. На маёй памяці...

## ФАНІПАЛЬ

У нас у старыя часы такая падзея тут здарылася, што і назву вёсцы тады дала. Немагчыма без смеху яе слухаць. Чыстая казка, ды іх жа, відаць, не на пустым месцы выдумлялі, падставы нейкія патрэбны, каб усё добра атрымлівалася, не папракалі ў тым, што такія цуды не дзеюцца на белым свеце.

Дык вось, мае даражэнькія, у аднаго мясцовага селяніна, звалі яго, здаецца, Антось, была дачка. Ну і лайдачка ж вырасла! Можа, на ўсёй мясцовай зямлі на дзесяткі вёрстаў такой болей знайсці не змаглі б. Ёй было ўжо семнаццаць гадоў, а яна нічога не рабіла. Увогуле нічога. Разумееце, не тое што па гаспадарцы не дапамагала ці адмаўлялася нешта выконваць, нават пальцам аб палец стукнуць ленавалася. Сядзела цэлымі днямі то на прызбе са старымі, якія ўжо рухацца самастойна амаль не маглі, то з дзеткамі, якія яшчэ нічога асабліва не разумелі, у пясочку корпалася. Бацькі ўжо змірыліся з тым, што такая вырасла. Бацька спачатку біў-лупцаваў, працаваць прымушаў, але і гэта не дапамагала. Раскрычыцца тады Фаня (гэтак яе звалі) на ўсю вёску:

— Ой людцы, ой міленькія, забіваюць! Дапамажыце хутчэй, бо жыцця пазбавяць!

Прыбягуць вяскоўцы, думаюць, што і сапраўды нехта да дзяўчыны прычапіўся, ратаваць трэба, а там... Антось стаіць з дубцом і дапытваецца ў дачкі:

— Пойдзеш ты матулі дапамагаць у поле жаць ці не? Колькі мяне за нос вадзіць будзеш?! У цябе ўжо ўсё перабалела, чаму можна і чаму не! Ідзі, бо зараз добра ўлуплю!

Ды Фаня мала на гэта ўвагі звяртала. Убачыць,

што чужыя людзі глядзяць, то рот як разявіць, як заверашчыць на ўсю глотку. Вушы ўсе пальцамі затыкалі, каб не чуць. І не лайдачцы, а Антосю спачуваючы, раілі:

— Кінь ты яе, браце, бо ўсё роўна толку ніякага з такой працаўніцы не атрымаецца, сам толькі намучышся і напеäражываешся!

Заплача гаспадар ад крыўды, што ва ўсіх людзей дзеці як дзеці, памочнікамі і дарадчыкамі растуць, а ў яго... і адпусціць Фаню. Пойдуць усе ў поле працаваць, дома яе пакінуўшы. Гультайка і выспіцца, і паесць у час, і не перапрацуецца...

Дык мала яшчэ гэтага. Аднаго разу дачка, адчуўшы, што яе не турбуюць болей і не прымушаюць спіну гнуць, пачала парадкі ў сям'і наводзіць. З раніцы заявіла бацьку:

— Няма чаго мне па прызбах аціраццa! Зрабі, бацька, люльку, я ў яе залезу, а вы па чарзе гушкаць будзеце!

Хто чуў гэткую заяву, тыя раты нават паразяўлялі. Як гэта гушкаць? Дык ёй жа семнаццаць гадоў, замуж час аддаваць... Якую ж люльку трэба адштукаваць, каб такую дзяціну вытрымала?

Спахмурнеў Антось і за вілы ўхапіўся, але маці прытрымала:

— Чакай, мужу, хіба табе мала той ганьбы, калі людзі сюды пасля яе крыкаў, нібы на пажар, збіраліся? Хіба гэта пераменіць нешта? Ці ты ўжо забыўся? Зрабі лепей, ды будзем выконваць, што патрабуе. Зараз і працы няма асаблівай, усё ж парабілі... А там, можа, і сама супакоіцца...

Пайшоў гаспадар, зрабіў з дошак вялікую люльку і ледзьве з сынамі прынёс яе ў хату. Павесілі пад столь, і маці загадала:

— То лезь ужо, каб ты назад не вылезла, калі табе яшчэ мала тых здзекаў, якія мы з-за тваёй ляноты трываем. Лезь, а мы будзем па чарзе цябе гушкаць! Лезь, ды хутчэй, каб вочы мае гэтага не бачылі! Бярыся, бацька, ты ж самы старэйшы!

Ухіліў галаву Антось, прысеў на зэдлік і давай пакалыхваць, а Фаня з люлькі голас падае:

— Што ж ты маўчыш? Ты мне і песню мармычы якую-небудзь! Я ж проста так задрамаць не змагу!

Гаспадар адвярнуўся да жонкі і ціха сказаў:

— Што нам з ёю рабіць? Столькі гадоў, а гушкаць

даводзіцца. А калі хто даведаецца, як жа мы з табою, маці, людзям у вочы ад сораму глядзець будзем?

Гаспадыні таксама на душы было млосна:

— Хай ужо пажыве і так... Што ж нам рабіць? Выйсця ніякага не бачу, каб падказаць табе, Антоська. Сваё ж дзіця. Наша з табою крывіначка. Шкада... Не заб'еш жа і не выкінеш.

— Не,— адказаў і Антось, працягваючы гушкаць і гучна зацягваючы своеасаблівую калыханку, якая складалася і з мацюкоў, і з праклёнаў, і са скаргаў на ўласнае жыццё.

Доўга ў той дзень у хаце гулі-спявалі ўсялякія песні, калышучы люльку з Фаняй. Толькі далёка за поўнач моцна заснула лайдачка...

Так доўжылася з месяц. Зусім з сілы выбіліся родныя гультайкі. Яны ж дзень не адпачывалі, і ноч па-людску не спалі. Ужо маці з бацькам хацелі пайсці да мясцовага варажбіта, каб парады якой запытацца, але не давялося, бо выйсце само па сабе знайшлося.

Аднаго надвячорка ў хату да Антося завітаў падарожны: высокі, плячысты хлапец. Зайшоў, павітаўся і здзіўлена працягнуў:

— Колькі па свеце ні хадзіў, дзе ні пабываў, але такога яшчэ бачыць не даводзілася! Гэта ж што, яна ў вас такая нарадзілася ці стала такой?

— Нарадзілася-то яна, даражэнькі, як і ўсе — маленькай, а вось якой зрабілася за семнаццаць гадкоў, што і людзям нельга нават сказаць. Не дай ужо, Божа, такога нікому,— плачучы, адказала маці.

— Але ж і прыгожая яна ў вас, гаспадары,— працягваў далей падарожны.— Каб яна хоць хадзіла, то я на ёй адразу і жаніўся б. Прыгажосці не малой... Дык не ходзіць жа...

— Чаму не хаджу? Хаджу,— гучна выкрыкнула Фаня і хуценька выслізнула з люлькі.— Во, глядзі, як атрымліваецца!

— А чаго ж ты туды залезла і сваіх родных муштруеш? Хто гэта табе дазволіў так з імі абыходзіцца?

— Ды мне працаваць не хочацца, а яны ж пасядзець не даюць дома, прымушаюць разам з імі хадзіць.

— То можна жыць і ўвогуле не працаваць! — адрэзаў хлопец.

Гаспадыня з гаспадаром здзіўлена пераглянуліся, а Фаня ўсклікнула:

— А як жа гэта?

— От пойдзеш за мяне замуж, там і навучу!

— Пайду, чаму ж не, пайду,— пачала, чырванеючы, гаварыць дзяўчына.— Такое замужжа мяне не палохае. Калі толькі муж будзе працаваць, а я дома сядзець...

Антось не ўтрымаўся і выпаліў:

— Хлопча, міленькі, ды ты ж з ёю прападзеш! Яна ж рабіць нічога не ўмее і не жадае!

— Вось, бачыш, які ў мяне бацька! — загаласіла Фаня.— Роднай дачцэ шчасця не зычыць! Жаніх знайшоўся, а ён яго адгаворвае.

— Не палохайцеся, людзі добрыя, не перажывайце надта, усё ў нас будзе хораша. Паглядзіце самі потым!

Прайшло колькі часу, дамовіліся адносна вяселля, які пасаг дадуць бацькі за Фаняй. Нарэшце і вяселле пачалося. Уся вёска гуляла, а баяўся хто ісці, каб не прыгадалі потым гаспадары, як ён смяяўся з дачкігультайкі, таго амаль сілаю прыводзілі, бо Антось крычаў:

— Ні на каго крыўды не трымаю, людзі! Не палохайцеся і няхай вас сумненне не грызе! Што было, тое было і ці мала чаго ў жыцці можа здарыцца? Прыходзьце, радасць у нас вялікая! Зяць працавіты, дай Бог кожнаму такога! На ўсіх пачастунку хопіць! На ўсіх! Прыходзьце, прашу вас!

І сяляне ішлі, бо бачылі, што сапраўды чалавеку шчасце ў рукі прыйшло, а што ўжо ім за таго перажываць, хто ўзяў? Няхай сам над гэтым думае! Калі жонка гультайка, то і гаспадаркі добрай не атрымаецца і хаціны заможнай не будзе. Гэта ўсім даўно вядома, чаго тут сумнявацца...

Адгулялі вяселле, час прыспеў за працу брацца. Усё пайшло сваім шляхам. Антось за дачкою пасаг аддаў і ў чужое паселішча жыць паслаў з маладым мужам. Аддаць-то аддалі, ды карціць абодвум, як жа там Фаня сябе паводзіць, бо не чужы ж чалавек, родная дзяціна! Сядуць вечарам і перамаўляюцца ціхенька. Ужо і шкада дачкі. Дзеці астатнія размову гэткую ж вядуць:

— Як там наша Фаня жыве? Бедная, відаць, гаруе на чужыне! Хоць бы адным вокам глянуць. Ці робіць што, ці гультайнічае, як і ў нас? Хоць бы тата з мамай схадзілі, праведалі і нам бы распавялі...

Антось на жонку, не ўтрываўшы, кажа:

— Ведаеш што, схадзіла б ты сама, бо я-то не пай-

ду! Тут мяне ганьбіла, а калі і там тое ж самае паўтараецца?

Жонка адразу ж замітусілася:

— Сама тое кажаш, чалавеча, сама тое... Калі ты пойдзеш, дык смяяцца будуць і галовамі ківаць. Бацька, скажуць, прыйшоў праведваць. Маўляў, не сядзіцца яму дома. Не мог навесці належнага парадку ва ўласнай сям'і, а зараз яшчэ і ў чужую нос суне. Ды і аблаяць не збаяцца. У нас жа, у жанчын, зусім іншае. Мы ж бабы... А з баб што можна ўзяць? Нічога. Скажу, што хачу глянуць, як зяць мой маецца, як гаспадарку вядзе... Падарунак які вазьму з дому, каб усе бачылі, што не з пустымі рукамі ў госці шпацырую. Так што, Антоська, за мяне надта не перажывай і не хвалюйся. Усё разведаю і распытаю самым падрабязным чынам.

Вымавіла так хуценька, яшчэ хутчэй сабралася і, нават не развітваючыся, паджгала па прамой дарозе да вёскі, дзе Фаня замужам жыла. Гаспадар, гледзячы ўслед, нявесела падумаў:

— Чакай, чакай, пагляджу, якая ты назад ляцець будзеш. Каб хоць паціху ды не хаваючыся прыпаўзла, бо невядома, як яно там скончыцца. Але ж захацела праведаць, то праведай, потым жа пакою даваць не будзеш, маўляў, забараніў, не дазволіў і гэтак далей. Пасядзеў колькі часу і пайшоў з астатнімі дзецьмі неадкладнымі гаспадарчымі справамі займацца.

Гаспадыня тым часам не адседжвалася па дарозе і ўжо амаль да патрэбнага ёй паселішча падлятала. Напаткала адну цётку, але запытацца не асмелілася, другую таксама прапусціла, а параўнаўшыся з трэцяю, не стрымалася і запытала:

— А скажыце, будзьце ласкавы, цётачка, ці не ведаеце вы, як там мая дачушка Фаня з маладым мужам жыве? Ці не аблайваюць яе вашы вяскоўцы?

Пытанні такія ў тагачасным жыцці былі нярэдкімі, таму ніякай адмоўнай рэакцыі ў сустрэчнай сялянкі не выклікалі. І ў яе ж былі дзеці, і ёй жа некалі цікава будзе даведацца, што ды як.

— Не,— гаворыць маладзіца,— нічога благога не чула. Відаць, усё добра, калі не гавораць. Сама ж ведаеш, як нешта не атрымліваецца ці не так пойдзе, то ў вёсцы адразу ж вядома стане. Жывуць, дай Бог ім дабра ды шчасця.

— Дзякуй, цётачка, за добрыя словы,— адказала шчаслівая маці і прыпусціла далей.

Падбегла да хаты, дзе маладыя жылі, а парог пераступіць баіцца. Але ж неяк асмелілася, зайшла. Глядзіць — пад столлю вялізнай люлькі няма. На душы лягчэй зрабілася. Бачыць, дачка дома сядзіць і перабірае нешта, спінаю да дзвярэй адвярнуўшыся. Падкралася ціхенька і ласкава гэтак мовіла:

— Дзень добры, дачушка! Як маешся, як жывеш? Што раскажаш цікавага?

А тая, як убачыла матулю, засвяцілася радасцю, ускочыла і давай цалавацца:

— А мая ж ты родненькая! А я толькі сядзела і пра вас думала! Як добра, што ты наведалася! Пасядзім, пагаворым, хутка і муж з поля вернецца, у яго там сёння працы няшмат.

— Ну, а як, Фанечка, жыццё?

— Ды, матуля, наладзілася крыху. Спачатку неяк дні два-тры не атрымлівалася, а зараз нічога, наладзілася, ніякіх цяжкасцей няма.

— А што ж спачатку, дачушка, было?

— Пра ўсё па парадку раскажу. Першы дзень, як мы прыехалі, муж запрагае зрання каня, збіраецца ехаць араць ніву дый гаворыць, да мяне звярнуўшыся:

— Я зараз паеду, а ты каб не сядзела ў хаце, склаўшы рукі, звары есці на полудзень, каровы прыйдуць з поля пасля ранішняй пашы — загані іх і падаі, авечкам есці падкінь. Пра курэй, гусей не забудзься, бо галодныя будуць.

— Ну, а я, як ляжала, так і ляжаць засталася. Думаю, сам прыедзе з поля і ўсё, што трэба, паробіць. Вярнуўся ён з поля. Каровы не загнаны і нядоены, свінні па агародзе галёкаюць, авечкі мэкаюць не сваімі галасамі, куры-гусі на платы паўзбіваліся, таго і глядзі, на людзей кідацца з голаду пачнуць. Мужык зазлаваўся, але выгляду не падае, што не ўсё так зроблена, як загадана было. Заходзіць у хату і, убачыўшы мяне сонную, гаворыць:

— А што гэта з табою здарылася? Чаго ляжыш, ці мо захварэла?

— Ды не, не захварэла...

— Тады стаў на стол тое, што наварыла, палуднаваць будзем. Нешта есці мне надта хочацца.

— І я пад'ела б, каб хто падаў...

— А хіба ж ты не наварыла?

— Не... Я і не ўмею...

— Ну, то сёння неяк пераб'ёмся, а заўтра я сам навару, калі ты лянуешся ды не ўмееш...

— З раніцы ўсё па-старому ідзе: гаспадар на поле збіраецца і звяртаецца да мяне:

— Я ў поле еду, а ты есці звары і за жывёлай глядзі, ды не як учора, бо галодныя застанёмся...

Але я і на гэты раз нічога не зрабіла. Узлаваўся муж, а выгляду не падае. Бегаў-гуляўся коцік маленькі па хаце, то ён яго злавіў і прымаўляе:

— Коце-браце, не будзе яна нам варыць полудзень, дык ты навaрыш. Я і цябе накармлю, і сам пад'ем.

Прыехаў з поля на наступны дзень — ніякіх змяненняў: я ляжу, жывёла апошняе ў агародзе выядае-вынішчае, а коцік, як нічога не ведаючы, на прыпечку ляжыць і песеньку спявае-выводзіць. Гаспадар ухапіў яго за вушы і крычыць на мяне:

— Трымай моцна за хвост!

— Навошта, ён жа драпацца будзе.

— Трымай, табе гавару, а то будзе і табе, як гэтаму кату!

Ён ката небараку б'е, а кот мне рукі падраў, твар раскрывяніў. Муж не супыняецца, хвошча ката па спіне. Я не вытрымала, заплакала і пачала прасіцца:

— Можа ўжо адпусцім, бо ён жа ўсё мне пааб-дзіраў?

— Пускай, калі так,— адказаў муж.

На трэці дзень едзе ў поле і да ката малога звяртаецца:

— Ну, коцік, напячы бліноў, навары ўсяго, жывёлу пазаганяй і накармі, а то — галаву адсяку і не пашкадую ўжо сёння, бо надакучыла. Гавару, гавару — і ўсё дарма...

Ён паехаў, а я села пасярод хаты і давай думаць: «Гэта ж, мабыць, мне сказана, а не кату, ды я не здагадваюся. Гэта ж вернецца і мне галаву адсячэ, бо ў ката ж рук няма і есці ён, адпаведна, не зварыць...»

Прыязджае гаспадар пад полудзень, у хату заходзіць, а там усё блішчыць, як ніколі, і на стол пастаўлена. Зрабіў чалавек выгляд, што здзівіўся надта, і гаворыць:

— А хто ж гэта, Фанечка, наварыў — коцік?

— Не, я сама...

— Ты наварыла? Ну то і добра, а каб коцік не

навары́ў, то я і яму і табе галаву адсек бы. Здагадалася...

— Вось і ўсё, матулечка, пра тое, як мы жывём,— закончыла дачка.

— То добра, мае дзеткі, калі так справа абярнулася. Надта добра, бо магло быць намнога хужэй. Паважайце адзін аднаго, шануйце, слухайцеся, то і коцік ніякі не спатрэбіцца...

Так вось малады чалавек сваю жонку да працы прывучыў, і стала яна нічым не горшай за іншых жанчын, якія штодзень дапамагалі на палетках і на лугах, у хатах і ў свірнах. Там, дзе некалі іхняе поле было, на якім збажына каласавала, пазней людзі сталі хаты будаваць, а ў памяць пра таго, каму зямля належала, назвалі паселішча Фаніна поле, а потым і Фаніпаль, як і да нас дайшло.

## КОЎШАВА

Так сталася, што ў гэтых мясцінах раней раслі надта густыя і непралазныя лясы ды пушчы. Што толькі людзі ні рабілі, дратавалі ўжо, здавалася б, адваяваныя ў хмызнякоў і кустоў лапінкі зямлі, а яны наступалі на палі і нівы. Пачнуць вяскоўцы ўраджай збіраць, а там карчы ды бярвенні аднекуль панабіраліся. Поле, перад тым як нешта садзіць ці сеяць, выраблялі сумленна, шчыра, а ў выніку атрымлівалася, што не маглі нават пасеянага ці пасаджанага сабраць. Вось табе і маеш пірог з макам! Вось і думай, як далей выкручвацца будзеш. Ад лесу карміліся многія, але яшчэ больш людзей ад яго пакутавала і плакала. Баяліся векавых дрэў. У непралазных барах вадзілася мноства ўсялякага звяр'я, якое таксама добра ўядалася сялянам у грудзі: то жывёлу хатнюю ваўкі ды мядзведзі перадушаць, то дзяцей напалохаюць, то саміх дарослых да перапуду давядуць, а то, што самае горшае, жыцця пазбавяць.

Вёска была заснавана даўным-даўно, калі — то дакладна вам і не адкажа ніхто. Але ў тыя часы жыў на гэтай зямлі пан Пятроцкі. Ён і валодаў усімі бліжэйшымі абшарамі. Неблагім чалавекам быў памешчык. Таму і беглі да яго ад іншых паноў людзі. Уцякалі, шукаючы паратунку, хто ад несправядлівага пакарання, хто ад панскіх гайдукоў, хто ад невыцерп-

нага прыгнёту, каб неяк жыць па-іншаму. Кожнаму трэба ж было не толькі пра панскае думаць, але і ўласную сям'ю карміць і гадаваць. А дзе ж ты чаго возьмеш, калі ўвесь час на памешчыцкіх палях прападаеш, дамоў толькі прыцемкам вяртаешся? Пятроцкі нікога назад не вяртаў, не выдаваў, не тое, каб за гэты кошт узбагаціцца, проста не жадаў здзекаў над нявіннымі людзьмі. Прыбягуць служкі нейкага памешчыка, упадуць да яго ў ногі:

— Пане яснавяльможны, вядома, што да вас наш чалавек з сям'ёю на мінулым тыдні перабег! Аддайце нам яго. Бо нельга без уцекача назад вяртацца, наш гаспадар не даруе. Вярніце таго чалавека, а то...

— Вы што, можа, мне яшчэ і пагражаць будзеце? — не вытрымліваў гаспадар такіх манер.

— Пане яснавяльможны,— лагоднелі адразу паслугачы,— мы не тое хацелі сказаць, вы няправільна зразумелі. Нам нельга дамоў вяртацца, бо пан загадае адлупцаваць за нявыкананы загад.

— Ну, гэта ўжо вашы справы! Са сваім панам самі і разбірайцеся! А вось пра нейкага там уцекача ад вас упершыню чую...

Пасля такога адказу прыйшоўшым нічога не заставалася рабіць, як угнуцца і кіраваць назад, нібы рэпы паранай з'еўшы.

Здаралася, што адшукваць уцёкшых прыгонных заяўляўся сам іхні памешчык на чале з атрадам гайдукоў. І тут ужо гаворка вялася ў павышаных танах. Прыехаўшы проста патрабаваў вярнуць ягоную ўласнасць. Пыхлівы гаспадар людскіх душ пакручваў вус, нават не злазячы з каня, і прыпалохваў:

— Ведаю, ведаю, шаноўны, што толькі да вас бягуць паспалітыя! У вас толькі паратунку шукаюць! Ведаю таксама, што вы не жадаеце іх нікому вяртаць! Але са мною гэта не пройдзе, бо адно слова насуперак — і загадаю сваім людзям не толькі вас схапіць ды скруціць, нібы якога мужыка, але і будыніны па бёрнам раскатаць! Таму не раю некага прыхоўваць і не выдаваць сапраўднаму гаспадару!

— З людзей не трэба здзекавацца, нібы з жывёлы, то яны нікуды і ўцякаць не будуць! — адказваў гаспадар, якога, здавалася, не кранялі пагрозы.

— Мая гэта справа, вяльможны, як мне з маімі людзьмі абыходзіцца! Нікому іншаму не раю не ў свае

справы лезці! Бо не дарую, да скону веку не дарую! — гарлаў свірэпы госць.

Толькі Пятроцкі і на гэта спакойна адказваў:

— Няма чаго мяне палохаць! Тым болей, што вы на маёй зямлі. Прашу не забываць пра гэта, бо справа і для вас можа блага скончыцца! Прыйшлі ў двор, ды яшчэ палохаць узяліся!

Непажаданы госць не хацеў здавацца проста так:

— Не хавайце чужых людзей, пане, то ўсё будзе добра і ніхто вам пагражаць не стане! Галота пра адно толькі і гаворыць, што ў памешчыка Пятроцкага можна ад ліха схавацца! За такое не я адзін на шаноўнага скрыва гляджу!

Але гаспадар не даваў дагаварыць пыхліваму пану:

— Вось што, надакучыла мне сядзець і слухаць пагрозы! Збірайцеся ды кіруйце дахаты, бо ніякіх чужых людзей у мяне не было і няма! І хутчэй, каб чаго дурнога не выйшла!

Прыезджыя рагаталі так, што ажно коні з перапалоху прысядалі. Іхні валадар хістаўся ў сядле і торкаў пальцам:

— Вы толькі гляньце, родненькія, ён мяне яшчэ і палохае?! Відаць, забыўся, з кім размаўляе! Прызвычаіўся тут сярод мужыцкіх рыл сябе Богам адчуваць! Не ведае, мабыць, што мяне ва ўсім наваколлі не толькі паспалітыя, але і памешчыкі баяцца за круты нораў! Ды ў мяне людзей вунь колькі! Слова скажу — і ўсё на вушы паставяць!

А панскія паслугачы, нібы падмаўляючы свайго памешчыка, падказвалі:

— Ён не ведае, як вы, яснавяльможны, таго (ці таго) пана частавалі! Як верашчаў, бедалага, просячыся, каб даравалі ды жывога з рук выпусцілі!

Здавалася, што і тут гэтым ваўкалакам ніхто не мог нічога зрабіць ці супрацьпаставіць. Хвіліна-другая, і засвішчуць бізуны, пальецца кроў, панясуцца жалобныя крыкі і праклёны. Але, тым не меней, Пятроцкі трымаўся малайцом. Глядзеў на прыехаўшых і думаў аб нечым сваім. Потым, відаць, надакучыла слухаць пахвальбу неўтаймаваных слуг і іхняга памешчыка, таму коратка прыкрыкнуў:

— А ну цішэй! Прэч адсюль! Каб нагі вашай болей тут не было! Вылюдкі! Знайшлі мяне чым палохаць! Не раз, не два вашымі сабутэльнікамі палоханы і парэзаны! Але ўсё роўна не баюся! Не на таго натрапі-

лі! Тое, што паноў б'еш, тваямосць, табе гонару не робіць, як і здзекі над сялянамі! Зразумеў?!

— Ах так! — гыркнуў валадар вершнікаў і наважыўся выхапіць шаблю, якая целяпалася на баку, але не паспеў, бо раздаўся такі магутны свіст, што ажно коні застрыглі вушамі і пачалі круціцца на месцах. З усіх бакоў да няпрошаных гасцей імчала мноства людзей з віламі, рагачамі, граблямі, косамі, цапамі, замашнымі цурбалкамі. Але ва ўмелых і дужых руках такая, здавалася б, простая зброя станавілася страшнай.

Не паспелі паслугачы панскія зразумець, што збіраюцца рабіць мясцовыя вяскоўцы, як нейчы дубовы цэп высока ўзвіўся і з усяго маху перацягнуў памешчыка-вершніка ўздоўж спіны. Шабля паляцела далёка ў бок, пан шмякнуўся ў густы пясок. Пакуль ляцеў, то яго аперазалі яшчэ колькі разоў, і ён нема ўзвыў:

— Слугі! У бізуны іх! Біць да смерці!

Але гайдукам было не да бізуноў, бо і іх лупцавалі так, ажно водгулле неслася далёка па наваколлі. А калі ўлічыць яшчэ і тое, што сярод прыезджых было многа тых, хто добра-такі ўеўся ў косці сялянам, то іх білі не шкадуючы. Зрэдку толькі прымаўлялі:

— Каб ведалі, як на гэтую зямлю з пагрозамі ступаць!

— Каб дзесятаму дарогу сюды замовілі!

— Каб і вашы дзеці пра гэта згадвалі і жагналіся!

— Няма чаго нашага пана палохаць!

— Бі іх, хлопцы, яны нас не пашкадавалі б!

Гаспадар сядзеў на невысокім пяньку і не прымаў удзелу ў бойцы, а толькі глядзеў і пакрэктваў, калі нехта з ягоных людзей дзейнічаў вельмі ўдала. Потым, бачачы, як разышліся дваровыя, стаў супакойваць:

— Толькі, родненькія, не да смерці... Да смерці не забівайце, навошта нам грэх на душу браць?.. Не забівайце, то яны і суседзям сваім пазаказваюць, як сюды з'яўляцца...

Нарэшце сутычка завяршылася поўнай перамогай местачковых, бо іхнія сапернікі ляжалі і толькі стагналі. Тады Пятроцкі загадаў:

— Грузіце і адпраўляйце, няхай едуць з Богам.

Падагналі колькі звычайных сялянскіх вазоў і пачалі грузіць, нібы кулі, на іх прыехаўшых.

— Пана, хлопцы, пад ніз пакладзіце, каб не ўпаў,— падказаў гаспадар.

Так і зрабілі. Памешчыка ляпнулі на дошкі, а зверху наклалі з дзесятак цел. Асядланых коней пакінулі сабе, а ў вазы запраглі тых, якія ўжо не тое што бегаць, але і ў баразне хадзіць не маглі ад старасці ды ад усялякіх хвароб.

Пасля такіх паходаў наваколле заціхала. Усе чакалі развіцця падзей. Але людзі толькі смяяліся з нямаўдалых памешчыкаў і іхніх паслугачоў, болей жа нічога не адбывалася.

Так да добрага пана Пятроцкага назбягалася надта многа сялян. Ужо проста не было ім дзе жыць. Цесна ў хацінах, цесна ў паселішчах. Тады гаспадар загадаў:

— Сяліцца будзеце на новым месцы, сярод лесу, там, дзе дзялянку выразалі!

І вось тады вёска ўзнікла сярод лесу. Яна знаходзілася быццам бы ў коўшыку. Таму і назву атрымала Коўшава.

## МАРС

Жывуць людзі на тутэйшых землях, адзін толькі Бог ведае, колькі. Жылі нашы дзяды і прадзеды, жывём мы з вамі. Калі ўсё добра будзе, то і дзеці і праўнукі нашыя жыць будуць. Зямля, яна і створана Усявышнім для таго, каб на ёй жылі і нешта рабілі. Але ж нельга забывацца і пра тое, што першапачаткова меркавалася стварыць толькі самае неабходнае для існавання людзей, усё астатняе — сама прырода давала. Потым, як пачалі перарабляць, як пачалі будаваць, асушваць балоты ды лугі зялёныя, высякаць стогадовыя лясы і дубровы, то паволі да сённяшняга стану нашу прыроду і прывялі. А яна ж ніколі проста так не здаецца, яна адбіваецца. Войны, катастрофы, трагедыі ўсялякія нічога добрага нікому не прынеслі, акрамя гора і бядоты.

Не тое што я вас спрабую павучаць. Не. Проста надакучыла глядзець на ўсё, што адбываецца навокал. У зман людзей увялі і не даюць ім магчымасці вочы адкрыць. Хто жадаў, той і кіраваў намі. Чаго толькі не выраблялі. Прыгадаць жудасна, як над вяскоўцамі здзекаваліся. Не толькі ўсялякія захопнікі. Не думайце,

што толькі немцы нейкія ці палякі ў гэтым вінаваты. Свае таксама не адставалі, а то яшчэ і пераўзыходзілі захопнікаў, асабліва калі праводзілі нейкія рэформы, быццам бы накіраваныя на карэнныя змены жыцця сялян. Божачкі! Ды ў нас жа нават вёску нейкі неадукаваны салдат па-свойму назваў! Якая там у яго адукацыя? Паваяваў год-другі і дамоў вярнуўся, а тут за начальніка, няхай сабе і не надта высокага, стаў, адчуў уладу і пайшло-паехала... Паслухайце, як усё адбывалася. Гісторыя не надта старая, на маім вяку сталася.

Тая вёска, ад якой усё пачалося ў гэтай гісторыі, існуе і цяпер. Назва яе — Кукшэвічы. Вялізнае паселішча было, калі не сказаць што агромністае, бо для тых часоў былі характэрны, асабліва для вёсак, невялічкія населеныя пункты, на якіх дворыкаў пятнаццаць-дваццаць, не болей. А ў Кукшэвічах жа было дзесьці, можа, двароў трыста ці і таго болей. Можаце сабе ўявіць. Галоўная вуліца доўжылася амаль на вярсту. Вяскоўцы ганарыліся гэтым. Не дзіва, праязджаючы праз маленькую вёсачку ці які хутарок, звысоку кідалі:

— Знайшлі вёску... Вось каб вы ў нас пабылі, у Кукшэвічах, ды паглядзелі, што да чаго, то перасталі б выхваляцца...

Старажылы добра памятаюць (я-то не, бо ў тыя гады мне яшчэ пад стол даводзілася пехатою бегаць), што яшчэ да першай сусветнай вайны — гэта калі з германцамі першы раз расейцы тут біліся, наша вёска была ў два разы большая. Цяпер вялікая, а то ў два разы большая! Дзве вуліцы ішлі паралельна адна другой, і галоўная, пра якую мы ўжо згадвалі, перасякала іх. Каб па колькасці людзей, то Кукшэвічаў бы хапіла на добрае мястэчка.

Але жылі тады ў страшэннай цеснаце. Ашчаджалі сяляне зямлю і асабліва не выдзялялі з грамадскіх надзелаў месца на вуліцы і на гаспадарчыя пабудовы. Здаралася, што ў некаторых такія двары былі, што возам нельга было заехаць, не тое каб яшчэ і развярнуцца. На вуліцы звальвалі сена, жыта ці дровы і адтуль ужо потым пераносілі ў гумно ці хлеў. І, што самае галоўнае, у большасці выпадкаў датычылася гэта багатых вяскоўцаў, якія мелі і скварку, і чарку на кожны дзень. Але вось ужо ў крыві сядзела, каб нават лапінку ворнай зямлі не займаць дарэмна.

Сем'і ж таксама нераўня сённяшнім былі ў сялян.

чалавек па пятнаццаць — гэта самыя меншыя, а каторыя не рассяляліся, трымаліся разам, дык і сказаць цяжка. Там жа маглі жыць адначасова: дзед з бабай, сын з жонкай і дзецьмі і ўжо дарослыя ўнукі, якія таксама сем'і пазаводзілі і праўнукаў панараджалі. Прыбудоўвалі да некалі галоўнай хаты ўсемагчымыя катухі, выводзілі адтуль коміны і жылі. Ведама, што за жытка ў такіх умовах была! Прызвычайваліся проста з цягам часу і не заўважалі цяжкасцей. Не дай Божа якая хвароба ўбівалася, вось тады бяда-гора сапраўднае было, вось дзе людзей памірала. З кожнай хаты да дзесятка чалавек за дзён колькі на могілкі вывозілі. Плакаць не было нават каму, месца на могілках не хапала, каб новыя і новыя магілы капаць, таму адрывалі вялізныя яміны, як вось на брацкія магілы падчас вайны рабілі, і зямлёю зверху засыпалі. Усялякае надаралася... Усяго давялося перажыць і ператрываць...

Зямлі ворнай на ўсіх гаспадароў не хапала. Справа зразумелая, дзе ж яе можна было набрацца, калі сем'і былі вялікія, а надзелы ніхто не павялічваў. Каштавала зямелька тады надзвычай дарага. Каб прыкупіць які морг-другі, трэба было напнуцца так, што і хлеб на стале за дзіва станавіўся. Таму многія наймаліся парабкаваць. Далёка ад родных мясцін адыходзілі, каб якой капейкай разжыцца ды дамоў потым вярнуцца і нешта прыкупіць. Толькі і гэта не ўсім удавалася, бо працы такой знайсці не маглі. Хіба ж мала сялян хадзіла па паселішчах, дапытваючыся, ці не шукае хто работніка для гаспадаркі? Не пойдзеш жа куды на фабрыку ці там на завод, бо не вельмі цябе возьмуць, там жа валодаць спецыяльнасцю трэба. Але, тым не меней, і ў Мінск надта многа сялян з нашай вёскі адпраўлялася на працу. Уладкоўваліся дзе хто мог: тавары перавозілі коньмі, дворнікамі станавіліся, вартаўнікамі, рэдка каго і да рабочых залічвалі. Плацілі мала, але і гэта было вялікім прыбыткам у параўнанні з тым, што можна было зарабіць, парабкуючы.

Яшчэ добра, калі ніякія стыхіі не ўмешваліся ў будзённае жыццё. Гаспадары меркавалі, што прадаць, што абмяняць, і дацягвалі да будучага ўраджаю. Дзеці падрасталі, апора з'яўлялася ў сем'ях, і можна было смялей зазіраць у будучыню. Але часта здаралася і адваротнае, калі вёска выгарала дашчэнту, бо

ўсе будыніны былі драўлянымі і стаялі адна ад адной на адлегласці выцягнутай рукі.

Так і ў той страшны год адбылося. Справа ў тым, што лета 1914 года было надзвычай засушлівае. Мала што вясною вільгаці амаль не выпадала, то і за два летнія месяцы толькі адзін невялічкі дождждык памарасіў — і ўсё на гэтым. Ураджай выгарэў на карані. Бульба, якая гэтак выручала заўсёды, на гэты раз нават завязацца не паспела. Зелле і тое не расло, не кажучы ўжо пра збажыну.

Прыціхлі вяскоўцы, нават вечарамі перасталі збірацца, як гэта звычайна рабілі, на прызбах, ля хат, дзе пастаянна абмяркоўвалі апошнія навіны і падзеі. Пра што было гаварыць, калі есці не было чаго, дзеці галодныя пухлі, жонкі галасілі, самім сорамна было вочы ад зямлі ўздымаць, хоць і віны за душою не адчувалі. Але ж здаўна так вялося, што менавіта мужчыны займаліся справамі забеспячэння ў сялянскіх гаспадарках, і калі нечага неставала, то такога рэдка лічылі заможным.

Дык вось. Стваралася дзіўнае ўражанне, нібыта вяскоўцы чакалі нейкай яшчэ больш змрочнай навіны. І дачакаліся... У адну з душных жніўеньскіх начэй, калі ўсе жыхары Кукшэвічаў спалі беспрабудным сном, нечакана загарэлася нечая хаціна. Чыя — людзі пазней і самі не маглі дакладна прыгадаць. Пакуль прачнуліся сяляне, пакуль ачомаліся і пачалі за вёдры хапацца, то гарэла ўжо ўся вёска, з канца ў канец. Кінуліся да студняў і супыніліся ў роспачы: вады-то амаль не было, каб напіцца ўзяць, не тое што пажар гэткі патушыць. Так і стаялі, моўчкі пазіраючы, як вогненная стыхія прагна ела тое, што было імі створана за шматлікія гады напружанай працы. Дзяцей, жанчын, старых ператавалі, і то дзякуй Богу! А што ўжо зробіш, калі Усявышні не ўбярог. Ад лёсу не схаваешся, не заслонішся нідзе.

Калі выглянула сонца, то і яно спачатку назад, за лес, схавалася, зірнуўшы на такое гора людское. А тут яшчэ пачалася вайна з германцамі, тая самая, першая. Падступіў да нашых мясцін фронт, з гармат ды кулямётаў сталі паліць, то кожны думаў, як бы ўцалець, жыллё на задні план адступіла. Туліліся па зямлянках, па буданах, па адрынах у суседніх вёсках. Так вось, мае родныя, і бедавалі. Ды не дзень, не два...

Потым рэвалюцыя пачалася, з панамі біцца сталі.

Паны прыйшлі і засталіся на пэўны перыяд. І толькі пасля таго, як палякаў прагналі ў 1924—1925 гадах, становішча паступова пачало змяняцца: пагарэльцы атрымалі лес на пабудову. Вось тады вакол Кукшэвічаў, якія таксама сталі адбудоўвацца, і былі закладзены восем невялічкіх вёсачак (па-новаму іх называлі ўжо не вёскамі, а пасёлкамі). Назвы новым паселішчам даваў не нейкі прыезджы чалавек, а свой жа вясковы хлопец з Койданава, які служыў раней у Чырвонай арміі і цяпер быў прызначаны ўладай землямерам. Дык ён, калі зямлю наразаў, то, па просьбе сялян, і назвы прыдумваў. Гэта дзякуючы менавіта яму такая неразбярыха потым утварылася. Вёсачкі атрымалі аднатыпныя назвы: Рабінаўка, Арэхаўка, Малінаўка, Гарохава... Потым, відаць, і прыхільнік новай улады зразумеў, што нешта не тое выходзіць, і каб неяк выйсці з цяжкага становішча і паказаць, што ведае нешта такое, да чаго вяскоўцам яшчэ надзвычай далёка, назваў дзве апошнія вёскі па-дзіўнаму: Марс і Юпітэр... Што гэта такое, можа, і сам не ведаў, але ж назваў. Вось адтуль наш Марс і пайшоў.

## СКАРАБАГАТАЎШЧЫНА

Дзіўная назва ў вёскі. Некаторыя сцвярджаюць, што ў гэтых мясцінах некалі пасяліўся багаты надта памешчык і прозвішча ён меў не нашае — Скарабагатаў, ад яго, маўляў, усё і пайшло, усё і пачалося. І было ў гэтага памешчыка столькі ўсялякага багацця, і да нашых дзён хапіла б, не тое што там на нейкія два-тры пакаленні. Іншыя даводзяць думку адносна таго, што знайшлі неяк вяскоўцы незлічоны скарб у густым лесе і па-брацку яго падзялілі паміж усімі сялянамі. Золата-срэбра мнагавата было, на ўсіх хапіла. Людзі адразу гаспадаркі моцныя завялі, зямлі прыкупілі, жыць сталі надзвычай заможна. Дык вось суседзі зайздросныя з гэтай нагоды пачалі іх клікаць скарабагатымі.

Даводзілася чуць і іншае. Паслухайце і вы.

Жыў у нашай вёсцы некалі адзін чалавек. Даўно гэта было, калі паселішча яшчэ і назвы ўласнай не мела. Звалі таго чалавека Максімам. Меў невялічкую хатку, сям'ю шматлікую. Карміць дзяцей і жонку не было чым. Ды і што на тым лапіку зямлі вырасце, калі на ім і не павернешся, і не надта разгонішся, каб

пасеяць што ці пасадзіць. Крок-другі ўбок зробіш, і на суседскую мяжу ўзапрэшся. А мяжа тады была святой справай, колькі слёз ды крыві з-за межавых сутычак пралівалася штогод!

Жонка ела поедам свайго мужа, каб неяк з хлеба на ваду перабівацца, каб шукаў выйсце. Той слухаў, круціўся, нібы ўюн, але нічога не атрымлівалася. Можа, не шанцавала вяскоўцу, а можа, лёс у яго такі быў — гараваць да скону жыцця.

Аднаго разу наела Максіма жонка так, што той ужо месца сабе не знаходзіў, хадзіў па падвор'і сюды-туды, а потым сабраўся і пайшоў у карчму, каб неяк там, сярод гэткіх жа самых гаротнікаў ды бедакоў, развеяць сваю тугу-смутак. Падыходзіць да Хаімавай карчомкі, ажно бачыць — цісне туды ж ягоны кум Пятрок.

— Здароў, чалавеча! Што гэта ты? — запытаўся ў яго Максім.

— Ды вось, браце, жонка нагрызла, то ўцёк з двара, каб хоць дух перавесці, адпачыць крыху ад згрызотаў, кручок-другі выпіць. Потым зернем ці чым яшчэ аддам Хаіму...

— Я з тае ж нагоды сюды прыджгаў,— паведаміў Максім.

Так, размаўляючы, зайшлі яны ў карчомку, а там народу даволі многа сядзіць, хто ўжо на добрым падпітку, хто гаворыць-мяркуе пра нешта, а хто шукае вачыма, да каго б за стол уваліцца. Максім з Петраком прыселі ў куце, узялі пару кручкоў з селядцом, дый сядзяць сабе, папіваючы гарэлку. Але потым неяк непрыкметна зноў вярнуліся да свае ранейшае тэмы. Павялі, здавалася б, гутарку пра тое-сёе, ды спыніліся на грашах.

— Ведаеш,— кажа Максімаў кум,— дзе нам можна даволі лёгка грашыма разжыцца? Прычым без асаблівага напружання.

— А дзе ж гэта, кумок? — пасунуўся бліжэй Максім.

— Няўжо не ведаеш? У панскім лесе, вось дзе. Колькі дзён таму я там быў і нагледзеў на грудзе, што ля Гнілога балота, дубовыя брусы. Каб ты толькі глянуў — таўшчэразныя, даўгія, сажняў, можа, па сем-восем. Вось узяць адзін-другі, вывезці неўпрыкметку і прадаць людзям, якія ў такіх брусах пільную патрэбу маюць.

— А што?.. Сапраўды... Вось каб толькі пашэнціла!..

— Не сумнявайся, я ўжо ўсё прадумаў,— перабіў яго Пятрок.— Шукаў сабе другога чалавека, бо, сам ведаеш, аднаму нязручна і цяжкавата будзе такія камялі на воз закідаць.

— Яно-то так...

— Як прыцямнее добра, то, час не губляючы, запрагай сваіх валоў і кіруй на Гнілое балота, я там буду цябе чакаць з парай валоў і возам.

— Згода, братка, згода,— замармытаў Максім,— можа, і сапраўды з галечы выб'емся, бо так усё надакучыла.

— То пайшлі, не будзем тут болей бавіцца.

— Пайшлі.

І кумы шпарка пакіравалі з карчомкі.

Як дамовіліся, так і зрабілі. Максім прыбег дамоў, запрог валоў, ухапіў кавалак хлеба ў кішэню і, не адказваючы нічога на здзіўленыя запытанні жонкі, паехаў з двара. Прыехаў на Гнілое балота, а Пятрок ужо чакае кума. Прыслухаліся ўважліва, не, нічога не чуваць падазронага, не бачна чужых. Узяліся завіхацца ля бруса. Добра прапацелі і натаміліся, пакуль ускінулі на вазы два здаравенныя дубовыя камялі. Валы і тыя падазрона аглядваліся, нібы адчуваючы, які непасільны цяжар хутка давядзецца ім цягнуць. Нарэшце пагналі жывёлін далей ад месца зладзейства. Але валы яны і ў такіх выпадках валамі застаюцца, не надта іх пагоніш! Крок-другі, марудны, цяжкі, а то яшчэ і прыпыніцца могуць без дай прычыны.

Едуць кумы, азіраюцца, сталі весялейшымі, бо ад'ехалі ўжо далекавата, а золак нават яшчэ і не ўсчаўся. Ажно валы спыніліся і далей ні кроку. Пачалі вяскоўцы злавацца і добра лупасіць па іхніх спінах — нічога не дапамагае. Глядзяць сяляне — ажно на дарогу, прама перад імі, чалавек незнаёмы выходзіць. Пералякаліся, бедалагі, ведама ж, падумалася, што нехта з дваровых высачыў і зараз загадае ў маёнтак кіраваць. Сядзяць ні жывыя ні мёртвыя. Потым неяк усё ж агледзелі, што гэта не з дваровых чалавек, што гэта хтось чужы: у кароткім сурдуціку, у вузенькіх, франтаватых штоніках, у брыліку, і стаіць неяк не пасялянску, нагу за нагу закруціўшы, ды яшчэ і кіёчкам гладзенькім перад сабою памахвае. Падумалі вяскоўцы, што, можа, нейкі пан, але потым сумнявацца пачалі, чаго сярод ночы памешчыку якому ў лесе рабіць? На

падпанка ж і не вельмі падобны, бо калі б гэта быў падпанак, то даўно б ужо загарлаў на ўсю пушчу не сваім голасам: «Зладзеі! Трымайце іх, зладзеі!»

Крычаў бы так, бо сам падступіць блізка баяўся б, а на крыкі, можа, нехта і падскочыў бы.

Сяляне сядзяць, з месца не рухаюцца. Але ж і сонейка хутка зайграе, няма калі асабліва чакаць, бо на сапраўднага вартаўніка ці палясоўшчыка нарвешся. Паўставалі з вазоў і наблізіліся да чужынца. І што ж вы думаеце? Аказалася, што ў яго ззаду ніякі не кіёчак, а самы сапраўдны хвост, а з-пад брыля невялічкія рогі выглядваюць. Пераглянуліся кумы, але сказаць нічога не паспелі, бо той, хто стаяў пасярод дарогі, запытаўся:

— Куды гэта вы, людцы, кіруеце? Чаго сярод ночы ў гэтых месцах ездзіце?

— Ды мы, паночку, да ракі кіруем. Трэба ж неяк брусы да вады падвезці, каб далей іх сплавіць. Там ужо ні коні, ні валы не пацягнуць...

— Гэта ж трэба так здарыцца! Аказваецца, вы заблудзіліся ў лесе,— перабіў іх незнаёмы.

— Не можа такога быць, мы ж тут усе сцежкі-дарожкі з завязанымі вачыма пройдзем, не тое што калі месяц свеціць ды зоркі гараць...

— Агледзьцеся добра, калі не верыце мне.

Зірнулі туды-сюды сяляне, і сапраўды здалося, што заехалі ў зусім незнаёмае месца.

— Ваша праўда! І што ж мы цяпер рабіць будзем? Можа б вы былі так ласкавы і паказалі нам дарогу? Інакш жа мы і дамоў не дабяромся...

— Добра, раз ужо так здарылася. Справа ў тым, што і мне трэба туды дабірацца. Таму не сядзіце, не цягніце час, а варочайце валоў ды кіруйце за мною...

Падзякавалі кумы незнаёмцу, павярнулі валоў і паехалі за ім. А той шпарка крочыць наперадзе, і лес над галовамі становіцца ўсё цямнейшы і гусцейшы. Ехаць даводзілася па пакручастай, вузенькай дарозе, дзе і слядоў нічыіх не было відаць.

І невядома, як доўга давялося б вяскоўцам так ехаць, каб не выпадак — адзін вол не вытрымаў цяжару і такой дарогі і здох. Падбеглі сяляне да яго і давай сябе крыжам святым жагнаць. А той незнаёмец стаяў зусім побач і ўсё пляваўся ды адварочваўся, калі яны хрысціліся, потым не вытрымаў, папёр у балота,

толькі лаўжы за ім затрашчалі, ды як зарагоча на ўвесь лес, як закрычыць...

Лыпнуў вачыма Максім на Петрака і гаворыць:

— Братачка, дык гэта ж чорт нас круціў. Гэта ж нячысцік за нос усю ноч вадзіў, і вала нашага аднаго да смерці давёў.

Пагадзіўся з ім кум дый кажа:

— Няма нам цяпер шляху назад. Калі толькі людзі даведаюцца пра такое здарэнне, то засмяюць, пальцамі паказваючы. Давай добрую мясціну знойдзем, хаты паставім, а потым і сем'і свае перавязём...

На невялікай паляне скінулі дубовыя брусы, якія як нельга лепей падыходзілі на падваліны, і сталі будаваць хаціны. Потым сем'і забралі і хутка сталі жыць добра і заможна. Пазней ужо іх паселішча зайздросныя суседзі назвалі Скарабагатаўшчына.

## СКІРМУНТАВА

Адкуль такая назва пайшла? Мне даводзілася вось што чуць. Раскажу, бо не саромеюся і не палохаюся, што смяяцца ці як па-іншаму рэагаваць будуць...

Вось, гавораць, жыў неяк даўнавата ў нашай вёсцы адзін гаспадар з жонкай. Добра жылі, у міры-згодзе, ніколі з-за нейкіх там дробязей не сварыліся, не біліся, не праклiналі адзін аднаго. Паробяць працу, падзякуюць Богу і людзям, якія дапамагалі, і дамоў сабе пакіруюць. Там па гаспадарцы ўсё паробяць і песню запяюць. Спявалі абавязкова, кожны дзень. Вяскоўцы дзіву даваліся. Здавалася б, намарыліся, як і астатнія, і працы перавярнулі не меней, а бачыш ты, што выраб-ляюць.

Расла ў іх адна толькі дачка. Звалі яе Марынкай, ці, можа, і Мар'яй, але гэта калі тая падрасла. Гадавалі дзіця гэткай жа сумленнай і шчырай, як і самі. Прычым імкнуліся рабіць усю працу, каб дачушка рук ні да чаго не прыкладала, а толькі бегала з сяброўкамі ды адпачывала. Маўляў, мы і самі ўправімся, няма чаго маладзенькіх рук таміць. Мы з-за працы адпачынку ніколі, ні ў дзяцінстве, ні зараз, не бачылі, то няхай хоць Марынка за ўсіх адгуляе.

Але не ўсё па-іхняму атрымлівалася. Справа вось у чым была. Не жадала дзяўчына гуляць проста так.

Хацела дапамагаць бацькам, і як яны ні імкнуліся яе адгаварыць, нішто не дапамагала. Стане побач і працуе. Бацькі спачатку нібы злуюцца, а потым пераглянуцца паміж сабою і радасна ўсміхнуцца. А чаго б і не пасмяяцца, калі гэтакая памочніца падрастала. Рабіла ўсё Марынка хутка і добра. Перарабляць за ёю ніколі не трэба было, як і не трэба было наглядаць, пойдзе ці не. Скажуць адзін раз — і ўсё на гэтым. Не хацелі крыўдзіць дачку, бо дакладна ведалі, што зробіць усё як мае быць.

Неяк год за годам і не заўважылі бацькі, як дачка вырасла. Ды такой прыгожай і прывабнай дзяўчынай стала, што ні сказаць, ні апісаць. І ў каго толькі пайшла? Пачалі паступова сватоў прысылаць. Але Марынка ўсім адмаўляла, а гаспадары не жадалі няволіць адзіную дачку.

Бывала, маці пачуе, што бацька неяк сарамліва стане даводзіць:

— Дачушка, гэты жаніх... Ён і неблагі хлопец, кажуць. Працавіты, прыгожы сабою. Можа і не трэба было б адмаўляць? Час цячэ... Потым людзі пачнуць гаварыць, што нос дзярэш, з нашым братам, мужыком, і знацца не жадаеш. Я-то нічога, але каб людзі не гаварылі, сама ж ведаеш...

Тады і гаспадыня не ўтрымаецца:

— Што гэта ты, мужу? Чаго абы-што кажаш на Марынку? Ці ж яна не прыгожая, ці ж яна не працавітая? Іншых хваліш, а на сваю то ўжо абы-што гаворыш? Ці ж так можна?

— Ды я, маці, нічога дурнога сказаць не хацеў,— апраўдваўся гаспадар,— проста, каб іншыя чаго не падумалі...

— Не падумаюць, не палохайся надта. Чаго тут думаць? Што, наша дачка недзе начамі прападае ці працаваць лянуецца? Усе бачаць, якая памочніца вырасла. Няхай яшчэ пагуляе, павесяліцца. Нажывецца яшчэ за чалавекам, дай толькі, Божа, каб добры чалавек трапіўся...

Марынка, пачуўшы, як яе бацькі лагодна спрачаюцца-разважаюць адносна будучыні, супакойвала:

— Не палохайцеся, родненькія, усё атрымаецца. Усё будзе добра. Толькі не надта мне хочацца замуж, бо вас жа давядзецца адных пакінуць. Як падумаю, што станеце вы старымі і нікога побач не будзе, то сумна мне становіцца і не хочацца пра ўласны лёс

думаць. Нікога з жаніхоў я не збіралася крыўдзіць і адмаўляла, каб не даваць ім надзеі.

Сказала такое Марынка, тады і бацькі неяк адразу спахмурнелі. Сапраўды, у іх жа болей дзяцей няма, а калі дачку забярэ які далёкі вясковец, то і ўвогуле, нібы самотныя вербы ля ракі застануцца...

Потым дзяўчына, каб развесяліць гаспадароў хаты, тупнула ножкаю і прамовіла, нібы злуючыся:

— Ну, што гэта яшчэ такое? Як вам не сорамна? Я ж не збіраюся ў бліжэйшы час нікуды. Не палохайцеся. Весялей глядзіце, а можа, я за каго-небудзь з нашых вясковых хлопцаў замуж выйду, то і ўвогуле ўсе разам жыць будзем. Паспявайце лепей песню пра каханне ды пра каліну чырвоную, каня вараненькага, казака маладзенькага... Як пачую яе, то нібы ў казцы якой апынуся, так хараша яна ў вас атрымліваецца. І я вам дапамагу. Паспявайце, то і на сэрцы лягчэй стане.

Праз хвілін колькі песня вольнай птушкай панеслася праз адчыненае акенца над прыціхлымі абшарамі.

Так колькі разоў пачыналі развражаць Марынчыны бацькі, і супакойвала, стрымлівала іх дачка, не давала завесціся ды пасварыцца. Але нездарма ж гавораць, што прырода ды жыццё свой шлях людзям прынараўляюць. Так і з Марынкай здарылася. Жала яна аднаго дня разам з матуляй жыта. Справа рухалася пад полудзень. Сонца прыпякала бязлітасна. Здавалася, яшчэ гадзіна-другая і не вытрымаюць жнейкі, пападаюць на ніўцы ад стомы і спёкі. Але тым, бедалагам, ужо не прызвычайвацца да такой цяжкай, амаль невыноснай працы. У белых кашулях, на галовах такія ж белыя хусцінкі. У руках спрытна мільгаюць вострыя сярпочкі, і ззаду застаюцца толькі невялікія гурбачкі высокага жыта, якое маці з дачкой пазней пазвязваюць у снапы і пастаўляюць у копы. Звычайна гэта рабілі ў другой палове дня, каб даць хоць нейкі адпачынак стомленаму целу, сагнутай з раніцы спіне. Тут можна і выпрастацца і агледзецца, колькі зроблена, колькі яшчэ засталося. Глянула маці на цень і звярнулася да дачкі:

— Давай хіба, дачушка, заспяваем якую жніўную песню, то і да полудня лягчэй дацягнуць будзе, а то надта нешта сёння цяжка працуецца...

— Давай, мама,— пагадзілася тая.

І палілася над палеткам сумная-сумная песня.

Простая, нібы сама зямля, але, разам з тым, гэткая чуллівая, што так і хацелася паспачуваць людзям, якія спявалі яе, не разгінаючыся, шчыра жнучы.

Дапяялі адну, пачалі іншую і гэтак незаўважна песень колькі праспявалі. Нарэшце матуля апамяталася:

— А мая ж ты Марынка! Замару цябе зусім сёння! Зусім ужо галава не памятае, што язык абяцае... Гэта ж мы збіраліся адну толькі праспяваць і сесці палуднаваць, а бач...

— Нічога, мама, нічога. Я ж маладзейшая, таму і стамілася намнога меней, чым вы. Не перажывайце. Вечарам адпачнём.

Прыселі палуднаваць пад бярэзінкай ды і задрамалі непрыкметна. Прачнуліся ад таго, што да іх нехта звяртаўся:

— Жнейкі! Жнейкі! Прабачце, але ці не будзе ў вас вадзіцы напіцца?

Усхапіліся і ажно аслупянелі: перад імі стаяў вараны конь, а на ім сядзеў прыгожы хлопец і ласкава ўсміхаўся:

— Прабачце яшчэ раз, што патурбаваў, але піць надта хочацца, а дзе тут якая ручаіна ці крынічка, я і не ведаю. Жыву далекавата ад гэтых мясцін...

— Нічога, нічога, што разбудзіў, чалавеча. А то мы б і да ночы, лайдачкі, праспалі,— жыва азвалася жанчына.— Кажаш, не адсюль? А чаго ў нашых палях апынуўся? — І з цікаўнасцю зірнула на вершніка.

— Ды нас у бацькі было пяцёра сыноў. Я самы малодшы. Старыя ўжо памёрлі, і жывём мы кожны паасобку, скірмунтамі... Дык ездзіў зараз людзей да сябе на працу запрашаць, бо сам маю вялікую гаспадарку не падыму.

Гаворыць хлопец, а з Марынкі вачэй не спускае. Маці гэта заўважыла і падае дачцэ гладыш з вадою:

— На, падай, няхай чалавек нап'ецца.

Жнейка падышла да вершніка і працягнула посуд з вадою:

— Піце, калі ласка. Піце на здароўе!

Напіўся хлопец, падзякаваў шчырым жнейкам і паехаў сабе далей. Але не назаўсёды паехаў, праз колькі тыдняў сватоў прыслаў. На гэты раз Марынка не адмовіла. Хто яго ведае, можа, спадабаўся надта будучы муж, можа, ужо пачала задумвацца над тым, што бацька з маці казалі... Прызначылі дзень вяселля,

адгулялі яго, і паехала яна з маладым мужам на новае для сябе месцажыхарства. Там пазней многа людзей сялілася, а паселішча ад таго хлопца і празвалі Скірмунты — жывём паасобку, значыцца. Можна пачуць і Шкірмунты.

## ЮЦКІ

Вось што мне даводзілася чуць пра назву паселішча. Мая прабабка, якая пражыла, можа, гадоў сто дваццаць і многа пабачыла і зведала, такое распавядала.

Ото ехаў некалі багаты памешчык па вясковай дарозе. Фурман коней шпаркіх падганяў, а ён, знай сабе, толькі сядзеў, важна надзьмуўшыся, ды па баках зыркаў. Ехалі, мабыць, некуды ў госці, да такога ж самага пана. Ажно бачаць — на дарозе селянін здаравенным цурбалкам лупасіць сваю кабылку. Тая ўжо і на ногі ўзняцца не можа, а ён усё роўна не супакойваецца. Загадаў памешчык супыніць коней і, паклікаўшы да сябе мужыка, пытаецца:

— За што гэта ты, чалавеча, гэтак жывёліну бічуеш? Няўжо думаеш, што яна пасля такіх пабояў працаваць на цябе далей будзе?

А селянін яму адказвае, асабліва не спалохаўшыся:

— Гэта, пане ласкавы, не кабыла, а мая жонка, з якой мяне бацюшка ў царкве павянчаў!

Узарваўся пан:

— Што ты мне тут галаву марочыш! Хіба ж мне вочы павылазілі і я не бачу?! Гэта ж не жанчына, а кабыла!

— Не, яснавяльможны, паслухайце, як усё адбывалася па парадку, тады і пераканаецеся...

Калісьці, як быў я яшчэ зусім маладым і працаваў у паноў, то спадабалася мне надта адна дзяўчына з мясцовых. Зразумелая справа: калі спадабалася — то і ажаніліся. Надта ніхто і не пярэчыў, тым болей мая Гапка таксама да мяне добра адносілася. І надта ж харошую жонку я сабе ўзяў. Зайздросцілі ўсе знаёмыя і родныя. Прыйду з працы, стаміўшыся, а ў хаце ўсё чысценька прыбрана і на стол ежа пастаўлена. Мыйся ды сядай есці. Я калі сядаў, то заўсёды і жонку запрашаў:

— Садзіся, родненькая, побач, разам пасёрбаем!

Але яна не пагаджалася:

— А не, мой каханенькі, я ўжо паела. Ведаеш жа сам, што гаспадыня ў хаце ніколі галоднай не будзе!

І так не тое што нейкі там дзень, добрых паўгода прайшло. Гапка побач есці не сядала. Болей таго, не даводзілася бачыць, каб яна што-небудзь і без мяне ў хаце ела, усё, што стаяла, цэлым заставалася. Думаю, што за ліха? Падазрона неяк і боязна мне стала. Можа есці куды ў іншае месца ходзіць, ці што? Вырашыў праверыць. Цяжка, канешне, гэта зрабіць было, бо і на працу трэба кіраваць, але і далей так працягвацца не магло. Цікава стала.

Вось надышоў вечар, палеглі мы спаць з жонкай. Я прыкінуўся, што моцна заснуў, і пачаў храпці на ўсю хату. Ледзьве і на самай справе не заснуў, ажно чую, што мая Гапка ціхенька ўстала, апранулася і выйшла з хаты. Я хуценька накінуў на плечы світку і пабег следам.

Што ж вы думаеце, паночак? Пайшла яна да нашых вясковых могілак. Там невысокі густы беразнячок рос. Стаіўся я на ўскрайку, за тоўстым, пахіленым крыжам і пачаў сачыць уважліва. Бачу, Гапка падышла да свежазасыпанай магілы і... туды ж падышоў нейкі чалавек. Яны павіталіся, нават пацалаваліся на маіх вачах. Потым узялі рыдлёўкі ў рукі і пачалі тую магілку раскопваць. Пералякнуўся я, бо думаў, што падалося, але куды там, на самай справе ўсё адбывалася.

А ў той магілцы хлопчык маленькі быў дні два таму назад пахаваны. Нарэшце адкапалі труну, знялі вечка, узялі нажы, разрэзалі цельца на кавалкі і давай сабе... есці. Толькі беленькія костачкі засталіся ад памерлага. Тады закінулі костачкі ў труну, накрылі яе і закапалі.

Паджгаў я дамоў. Баяўся, што Гапка прыбяжыць першай і пра ўсё даведаецца. Ляжу ў ложку, а сам зубамі з перапуду ляскачу, як жа гэта я буду знаходзіцца з ёю разам. Яна ж нейкая вядзьмарка. Таму і кажу:

— Ой, нешта мне з жыватом стала! Пайду прагуляюся крыху!

Але гуляў не гадзінку-другую, а пакуль сонейка не ўзышло і не давялося ісці на працу. Дамоў ехаць не надта хацелася, бо ведаў, што мяне там чакае. Прысунуўся, не гляджу Гапцы ў вочы, а яна па-ранейшаму ласкава рассыпаецца:

— Сядай, родненькі, за стол ды перакусі, бо стаміўся ж мабыць.

А я і гавару:

— Цяпер і ты сядай побач!

Дык Гапка, нібы штосьці адчуўшы, хуценька:

— Я сытая, наедзеная, не бойся за мяне!

Не ўтрываў я болей і выкрыкнуў са злосці:

— Што, мярцвячыны наелася ад пуза?

— А адкуль жа ты ведаеш? — зацікавілася яна.

Распавёў Гапцы, што бачыў і што пра гэта думаю. Закруцілася тады жонка, адчула, што гарэлым смярдзіць, пабегла ў цёмны кут і нясе адтуль бутэлечку з нейкім зеллем.

Адчыніла яе ды паціху на мяне пазірае, а потым як выгукне: «Будь ты сабакам!» — і абліла з бутэлечкі.

Кінуўся я ўцякаць! Выскачыў за парог, і падумалася мне, што пранесла ліха, ажно куды там, глянуў на сябе і аслупянеў: я ўжо не той чалавек, якім быў раней, а сабака, які толькі што выскачыў аднекуль з падвор'я і не можа ачомацца...

Як жа тут жыць далей у вёсцы? Давай гэта я ўцякаць, куды вочы глядзелі, а сабакі тым часам на мяне як напалі ды як пачалі грызці, ледзьве жывым выратаваўся ад іхніх зубоў.

Уцякаў, пакуль да пастухоў не прыбіўся, якія кароў пасвілі. Давай я да іх лашчыцца. Адзін пастушок кінуў мне кавалачак хлеба, які крыху падтрымаў мае сілы, ажно праз галаву стаў куляцца. Чую раптам, як старэйшы гаворыць на малодшага:

— Бяжы, братка, адгані кароў ад патравы, а то зусім жыта стопчуць, тата сварыцца будзе вечарам, калі дамоў прыгонім жывёлу.

Хоць я і сабачы выгляд меў, але разумеў мову па-ранейшаму. Як пачуў, што каровак трэба адагнаць, з усіх ног кінуўся іх варочаць. Пастушкам гэта спадабалася, і яны хацелі забраць мяне дамоў, але, заўважыўшы, што мяне ўсяго трасе пры гэткіх словах, пабудавалі невялікую будачку, дзе я і пераляжаў першую ночку.

А раніцай мне не давялося болей кароў пасвіць, бо ехаў дарогаю памешчык і, ўбачыўшы, як спрытна і лоўка я ўпраўляюся ля жывёлы, купіў мяне ў пастушкоў. Пасадзілі ў экіпаж, нягледзячы на тое, што сабака, і паехалі далей. У адной вёсцы пан вырашыў мяне пакарміць, папрасіў у нейкай гаспадыні даць чаго-

небудзь перахапіць, але тая, як прынесла, то стала ўважліва глядзець мне ў вочы. Потым неяк дзіўна вымавіла:

— Паночку, дык гэта ж не сабака, а самы звычайны чалавек! Паглядзіце, якія ў яго валасы над вачамі.

Угледзеўся пан, і сапраўды — чалавечыя валасы. Тады запытаўся:

— А як жа, жанчынка, чалавека гэтага ад праклёну ці злога слова выратаваць?

— Зараз, паночку, я вам дапамагу. Калі не доўгі час ён у сабачай шкуры знаходзіцца, то хутка ўсё выправім.

Убегла гэтая жанчынка, дай ёй Бог здароўя, у хаціну і праз момант выскачыла з нейкімі зёлкамі і вадой. Штосьці, гледзячы мне ў вочы, пашаптала, а потым разоў колькі пакрапіла мяне зёлкамі.

Праз колькі імгненняў я зноў стаў чалавекам. Сам сабе не верыў, не ведаў, каму і дзякаваць, ці то пану, ці то вяскоўку. А жанчына далей і гаворыць:

— Ці хочаш ты адпомсціць жонцы? То я магу дапамагчы. Не трэба, чалавеча, такога зладзейства ніколі дараваць!

А мне так добра, так хораша, што і гавару варажбітцы:

— Я так рады, што чалавекам зрабіўся, і не хочацца мне ні помсты ніякай, ні здзекаў. Але, калі яна і іншым будзе пагражаць, то трэба тады абавязкова правучыць!

— Ну дык глядзі, я дам табе другія зёлкі. З імі ты прабярыся паціху да сваёй хаты, каб жонка цябе не бачыла. Як выйдзе яна ў двор, дык ты дакраніся да яе зёлкамі, гаворачы: «Будзь канякай! Будзь канякай!» — то яна і стане ёю. А гэта не абы-каго ты за жонку сабе ўзяў, а Юцкову дачку. Яе бацька надта злосны чараўнік быў і сваім дзецям такое ж рамяство перадаў. Ягоны сын таксама недзе дрэнныя справы ўчыняе...

Пан адпусціў мяне на волю, пажадаўшы ўсяго найлепшага і каб болей не кранала нідзе маю душу нячыстая сіла, і я пайшоў дахаты. Падабраўся непрыкметна да хаціны і стаіўся. Стаю ды баюся, каб выпадкова Гапка першая не заўважыла, бо тады капцы мне будуць. Ажно чую: скрыпнулі ціхенька дзверы і выйшла мая жонка, каб карову падаіць ці яшчэ што

такое. Я падкраўся ззаду і пакрапіў яе зёлкамі, сказаўшы пры гэтым: «Будзь канякай! Будзь канякай!»

І што ж вы думаеце, пане? Стала яна адразу канякай, а каб добра адплаціць і адвучыць ад далейшага чараўніцтва і вядзьмарства, я павёў яе на пожню, ля дарогі, і давай штосілы дубасіць. А тут якраз і вам надарылася ехаць. Так што гэта не кабыла-каняка, а мая жонка.

Памешчык пастаяў яшчэ колькі хвілін, пачухаў патыліцу дый прамовіў, сядаючы ў экіпаж:

— Разбірайся, селянінку, тут сам. Разбірайся з гэтымі, як іх, з Юцкамі...

Ад таго вось часу і пайшлі нашы Юцкі, мае дзеткі. Ад таго даўняга часу.



# КАПЫЛЬ

Многія населеныя пункты Беларусі звязаны з імёнамі знакамітых, славутых пераможцаў ці князёў, земляробаў-працаўнікоў. Але не толькі з імі. Даволі часта назву давалі і па імёнах закаханых. Тут ужо столькі існавала варыянтаў, што дзіву можна было давацца: багатая князёўна кахала беднага парабка, ці наадварот: заможны князь вырашаў звязаць далейшае жыццё з простай сялянкай ці збяднелай да жабрацтва паненкай. Але хочацца адзначыць, што ўсе гэтыя вусна-паэтычныя творы яднала адна характэрная рыса — трагізм. Рэдка ў якой легендзе ці паданні героі заставаліся жывымі і былі потым шчаслівымі, задаволенымі жыццём. У большасці выпадкаў каханне было трагічным, у выніку яго гінуў нехта з галоўных персанажаў ці, здаралася і такое, паміралі абодва: ён і яна.

Вось і пра Капыль такое паданне распавядаюць. Не думайце, што я многае прыдумала. Не, пачытайце лепей самі, пра ўсё ўжо напісана і расказана, таму і дзіўнага нічога няма, але, калі просіце, то паведаю, чаго ўжо там хітраваць ды ўхіляцца.

Даўно гэта было, стагоддзяў колькі таму назад. Там, дзе зараз Капыль, некалі стаяў замак багатага князя, можа, нават самага багатага ва ўсім краі. Ён быў не толькі багаты, але і страшны, любіў, каб усё толькі гэтак адбывалася, як ён жадаў, інакшага і не ўяўляў. Колькі жыццяў загубіў марна, і палічыць немагчыма.

Замак свой князь пабудаваў у прыгожым месцы. Ведама ж, лепшыя майстры над ім працавалі, баяліся, каб, даруй Божа, чым не прагнявіць свайго валадара, бо тады жыццём расплацішся.

Непадалёку ад замка цякла рэчка, якая разлівалася шырокім возерам каля княжацкіх харомін. А ў князя была адзіная дачка, ды такой прыгажосці, што князь не дазваляў, каб глядзелі на яе простыя людзі. Князёўна жыла ў невялічкай святліцы, якая знаходзілася ў высокай вежы замка. Бацька не дазваляў ёй нават уніз спускацца, не тое што з дваровымі гаварыць. Толькі зверху праз акно яна магла пазіраць на навакольны свет, любавацца хараством палёў, лясоў і рэк. Слухала дзяўчына спевы птушачак, і так хацелася ёй, каб яны дзесьці побач сядзелі і спявалі, але ж далёка не кожная птушка на такую вышыню ўзняцца магла. Таму князёўна рада была, калі да яе на акенца залятала якая-небудзь птушачка і пра нешта, толькі ім дваім вядомае, шчабятала-апавядала. Потым пырхне крылцамі нечаканая госця і знікне ўдалечыні, а дзяўчына зноў заставалася адна ў надакучыўшай святліцы. Ды што тут зробіш, калі жыццё такое...

Сама па сабе князёўна была чалавекам простым, сарамлівым, да таго ж надзвычай прыгожым ды разумным. Хацелася ёй з кім-небудзь паразмаўляць, але баялася не толькі таго, што бацька злосны на яе будзе пазней гарлаць, а і таго, што загадае пакараць нявіннага чалавека, якому дзяўчына раскажа пра свае душэўныя хваляванні і перажыванні. Таму, калі і выходзіла са свайго пакойчыка і сыходзіла ўніз па стромкай лесвіцы, то доўга-доўга ўглядалася і ўслухоўвалася, каб каго з прыслужнікаў ці самога гаспадара побач не было. Тады ўжо звярталася да каго з просьбаю ці з нейкім пытаннем.

Кажуць людзі, што і маці яе таксама такой жа была. Адносілася да людзей як да роўных, нягледзячы на сваю высакароднасць. Яна і імя дачушцы дала, настаяла на сваім, не падпарадкавалася лютаму мужу.

Захацелася назваць па-народнаму і назвала — Поляй, Палінкай. Не вытрымала бедалага-жонка здзекаў мужа і заўчасна памерла, пакінуўшы пасля сябе адзіную радасць — дачушку. Тая яшчэ нічога не ўсведамляла, што заўтра ўжо не будзе побач з ёю мілай матулі, што яна ўжо ніколі не стане побач, не прылашчыць. Калі маці канала ў ложку, то папрасіла пакаёўку, каб тая неяк умудрылася і прынесла да яе маленькую Полю развітацца. Справа ў тым, што князь забараніў дапускаць дачку да паміраючай:

— Няхай ляжыць сабе спакойна! Няма чаго асабліва плакаць! Тут справа такая: што захацеў Бог — тое і даў, а захацеў — тое і забраў! І мы нічога супраць зрабіць не здолеем! Няма чаго слёзы ліць — Бог да сябе лепшых забірае! Таму дачушку не нясіце да жонкі, а то яшчэ што якое здарыцца! Хто ўздумае аслухацца — таго непазбежная смерць чакае!

Адчувала гэта і князёўна, ведала, што стары князь не дасць ёй па-людску развітацца з гэтым светам і са сваёй адзінай радасцю. Таму, калі прасіла пакаёўку аб такой небяспечнай справе, то адразу папярэдзіла і тую:

— Ведаю, што цябе можа чакаць, калі трапіш на вочы гаспадару ці каму-небудзь з ягоных служкаў. Ведаю, даражэнькая... Таму не загадваю, не прымушаю, а толькі прашу. Але калі баішся, калі не хочаш, то і не трэба. Я зразумею правільна. Проста ўжо адчуваю, што жыць мне засталося зусім мала. Не гэтай ноччу, то наступнай абавязкова памру. Сон мне сёння страшны прысніўся. Смерць я там сваю бачыла. У апошнія ж дні сон мяне не браў, а тут вось — заснула і нават сон убачыла,— паспрабавала князёўна пажартаваць, але ад такой спробы толькі слёзы вочы залілі.

— Я паспрабую, гаспадыня, чаго б ні каштавала мне гэта — усё роўна паспрабую. Губляць мала што засталося мне ў гэтым жыцці. Усё найлепшае засталося ззаду: муж на вайне загінуў, сыны недзе са сваімі сем'ямі жывуць, дзяцей, дай ім Бог здароўя, гадуюць... А вам паслужу, няхай сабе і ў апошнюю сваю хвіліну, бо вы за колькі гадоў мяне ні разу не пакрыўдзілі, слова благога не сказалі. Таму і пайду на такую рызыку. А калі мне не пашанцуе, то не перажывайце, не на вашым сумленні гэта будзе, не на вашым... Мне таксама тут ужо надакучыла.

Глыбокай ноччу старая пакаёўка прынесла маленькую Полю... Гаспадыня не спала, і калі ўбачыла дачушку, то зайшлася няўтрымным плачам:

— Родненькая мая, на каго ж ты цяпер абапірацца будзеш? Хто ж цябе пашкадуе, сіротку маленькую? Хто ж цябе прылашчыць, кацянятка ты маё ненагляднае?..

Ціхенька галасіла паміраючая князёўна, гладзячы па валасах дачушку, якая правалілася на матуліных грудзях у глыбокі сон, а ля парога залівалася слязьмі старая жанчына, якой таксама многае набалела, многае прыгадалася. Так і не пачулі жанчыны, калі на парозе раптоўна ўзнік стары князь:

— А-а-а, трапіліся мне, галубкі! — зароў ён звярыным голасам.

— Цішэй, ваўкалача, а то дачушку разбудзіш! — рэзка перабіла яго саслабелая князёўна.— Што табе яшчэ трэба? Мала адной мяне? Мала людзей, косці якіх у шматлікіх курганах гніюць? Дачушку, можа, ужо ўдумаў звесці? Пакаёўку пакараць? Табе мала той крыві, якую высмактаў?!

— Мая справа, каго караць, каму жыццё дараваць! — пагардліва адрэзаў князь.

Ды і тут князёўна не пагадзілася:

— Можа, над некім ты яшчэ і ўладарыць можаш, але толькі ўжо не нада мною. Нада мною зараз адзін Бог валадар. У яго рукі сябе і аддаю, а таксама прашу за маю адзіную дачушку Полю.

Сказала такія словы хворая і памерла, а князь перавёў свой погляд на пакаёўку:

— Ты ж, старая, добра ведала, чым пагражае непаслухмянства ў маім палацы?

— Ведала, княжа...

— Чаму ж парушыла? Няўжо жыць не хочацца?

— Хіба гэта жытка, княжа, калі сабака ў любой вёсцы і той вальней сябе адчувае. Надакучыла мне на гэтым свеце мучыцца, пакуты ўсялякія прымаць. Да мужа свайго, да Антоські любага хачу. Можа, хоць там шчасце сваё страчанае знайду, там супакоюся. Я таксама маці і ведаю, што такое ў апошнюю хвіліну твар любай дачушкі ўбачыць...

Доўга чакаў нечага князь. Маўчаў усё. А потым сказаў, нібы нешта надзвычай важнае вырашыўшы:

— Я цябе ўсё роўна пакараю, не дарую, каб іншыя не падумалі, што разжаліла ты мяне...

З таго часу прайшло ўжо семнаццаць вёснаў і зім. Паліна зрабілася сапраўднай прыгажуняй. Прачулі пра яе і іншыя суседзі, сватоў давай прысылаць, але дзяўчына бацьку прама ў вочы гняўліва заявіла:

— Калі толькі вырашыш за каго-небудзь мяне замуж супраць маёй волі аддаць, адразу ў манастыр пастрыгуся. Так і ведай, за нялюбага не пайду! Каго ты выбярэш — твая справа, каго я — мая!

— Добра! — злосна вымавіў князь.— Толькі не думай, што я табе ў нечым саступаць буду!

На тым і разышліся. З таго ўсё і пачалося. Бацька пільна сачыў за кожным крокам дачкі, не выпускаў яе з-пад кантролю ні на хвіліну. Калі нешта заўважаў, то не выходзіла Поля са святліцы па тры дні запар. Той даводзілася, як мы ўжо адзначалі, размаўляць хіба што толькі з птушкамі ды з вольным ветрыкам, якому ніякія законы не пісаны.

Аднаго лета здарылася непапраўнае. Поля з самай раніцы спусцілася па лесвіцы да вояў на баявую пляцоўку і стаяла побач з імі, аглядаючы наваколле. Цішыня незвычайная стаяла. Водар палёў і лугоў дыханне перабіваў. Здавалася, што няма нічога на свеце лепей, чым вось так стаяць і ўслухоўвацца ды ўглядацца. І раптам аднекуль пачулася дзіўная музыка. Раней такога Поля не чула: нешта надзвычай тужлівае і простае, даходлівае і самотнае неслася ўвышыню, уздымаючыся аднекуль з-за недалёкага кустоўя. Княжна стаяла, нібы заваражаная, маўчалі і суровыя воі. Кожны думаў пра сваё. Некаму згадалася маладосць, нехта ўбачыў бацькоў, нехта падумаў пра страчаных у баях сяброў. Поля ажно наперад падалася, бо ёй здалося, што такую песню спявала ёй некалі ў дзяцінстве нябожчыца-матуля. Малая была, але мелодыя тая ў памяці засталася...

Паслухалі ўсе дзіўную мелодыю і разышліся кожны па сваіх справах. Прыбегла дзяўчына ў святліцу, сэрца ўзрушана стукае, кроў гарачая па жылах зайграла. Не ведае нават, ад чаго. Не можа спаць, музыка тая гучыць у вушах. Круцілася туды-сюды, ледзьве раніцы дачакалася. Захацелася паглядзець на таго, хто гэтак хораша і сардэчна іграў. І дадумалася вось да чаго: пераапранулася ў вопратку сваёй пакаёўкі і стала падобна на звычайную вясковую дзяўчыну, ростам высокую ды прыгожую тварыкам. Выбралася з пакоя і зноў на баявую пляцоўку пракралася. А там

аховы не было, можа, яе на дзень знялі, бо не чакалі нападаў і таму паслабілі пільнасць. Тады князёўна хуценька скінула з пляцоўкі доўгую вяроўку і па ёй спусцілася на дно высахшага рова. Далей, за кустоўем, было невялічкае, але надзвычай самабытнае возера. Яна туды і скіравала. Пачала ўслухоўвацца, але не чуваць было ўчарашняй музыкі, не іграў музыка. Засумавала дзяўчына, падумалася ёй, што давядзецца ні з чым дамоў вяртацца. Прысела пад невысокай бярозкай і задумалася. Таму і не пачула адразу, як непадалёку зноў заіграла дудачка. Падскочыла князёўна і паімчала на гукі. Потым прыцішылася і падкралася зусім блізка да таго месца, адкуль неслася мелодыя. Глянула з-за густога куста і ўсё адразу зразумела: сядзеў на невысокай купіне хлопец-пастух і іграў на жалейцы чарговую сумную песню. Скончыць адну і адразу пачынае іншую, а князёўну не заўважае. Сядзела там дзяўчына, можа, гадзіну, можа, і болей. У такіх выпадках час ляціць, нібы маланка. Схамянулася, што ў замку яе могуць спахапіцца, і пабегла да ўязной брамы. Варта ўважліва глянула на дзівосную прыгажуню, але ніякіх пытанняў не задала. Поля прыбегла ў святліцу і стаілася. Стала чакаць. Калі бачылі, што адсутнічала, то зараз пачнуць шукаць, а калі не, то ўсё будзе ціха. На вялікае шчасце, ніхто нічога не западозрыў. Весялей на душы стала ў дзяўчыны. Цяпер адчувала гаротная, што недзе ёсць яшчэ мелодыя, якую ёй хочацца пачуць, што жыве чалавек, які яе разумее.

Так, пры першай магчымасці, князёўна не раз і не два ўцякала з замкавай вежы і бегла на бераг возера, каб паслухаць цудоўнае гранне. А пастух, нібы ведаў, што нехта падслухоўвае, кожны раз іграў усё болей і болей. Устане, азірнецца і пакіруе, як ні ў чым не бывала, дамоў за кароўкамі, тады і Поля ўцякае ў сваю святліцу.

Аднаго разу дзяўчына асмялела і выйшла да хлопца. Уздрыгануў той ад нечаканасці. Не спадзяваўся такую прыгажуню тут убачыць. Глядзіць і слова вымавіць не можа. Поля таксама маўчыць. Ступіла яшчэ крокаў колькі насустрач і запыталася:

— Прабач, але хто ты? Адкуль тут з'явіўся, бо раней я цябе ніколі не бачыла? Усіх ведаю, але цябе не сустракала.

— Я пастух. Кароў вясковых пасу на бліжніх

абшарах. А тут заўсёды надта многа пашы, і патравы блізка няма.

— А на чым гэта ты граеш? Раней такой музыкі мне чуць не даводзілася.

— Гэта жалейка звычайная. Дудачка такая. А іграю, каб не так сумна было і час не надта марудна цягнуўся. Навучыў мяне дзядуля мой.

— А як цябе завуць? — запыталася дзяўчына і пачырванела.

— Коля,— адказаў спакойна хлопец, але вочы таксама адвёў.— А цябе?

— А мяне Поля.

— Вось і добра. Хочаш паслухаць якую-небудзь песню?

— Ды я з-за гэтага тут і апынулася...

— Хадзем вунь туды, да таго дуба, там сядзем. Мне кароў відаць добра будзе.

— Пайшлі...

Селі яны пад магутным дрэвам, і хлопец зайграў. Але мелодыя на гэты раз падалася князёўне не жалобнай, не самотнай, а, наадварот, нейкай радаснай, вясёлай, і так добра стала ёй на сэрцы, што здавалася, быццам бы па-новаму на свет нарадзілася. Прытулілася яна да шурпатага ствала, а сама на пастуха паглядае сціху. Дзяцюк — што трэба: высокі, загарэлы, вочы сіняватыя, плечы — што тая сцяна, і такі сарамлівы...

Пакахалі маладыя людзі адзін аднаго, дня пражыць не маглі, не спаткаўшыся. Толькі і глядзелі, каб знайсці магчымасць пабачыцца. Колю ў гэтых адносінах намнога прасцей было. Яму што — прыгнаў каровак да возера і чакай сабе, а вось Полі цяжка было выбірацца з замка. Не кожны ж раз уцячэш, нават пераапрануўшыся, бо і варта нешта можа западозрыць, і якія паслугачы, няхай сабе і выпадкова, напароцца могуць. Паспрабуй тады дакажы, што выбіралася за сцяну, каб якіх кветачак назбіраць, бо нават са святліцы забаранялася выходзіць. Але ўжо як спаткаюцца, то нагаманіцца ніяк не могуць, а разлучацца часіна надыдзе, дык нібы апошні раз у жыцці бачацца.

Аднаго разу Коля прапанаваў Полі ноччу, калі ўзыдзе ясны месячык, пакатацца на чоўне на тым самым возеры, што прылягала да замка. Дзяўчына з радасцю пагадзілася. А што ж вы думаеце? З каханым ды любым і ноччу ўцешыцца можна, справа тут

вядомая. Так ім спадабалася на начным возеры, так доўга потым згадвалі пра тую паездку.

Злы князь тым часам паехаў некуды ў далёкі паход разам са сваім войскам. Працяглы час яго не было дома, а калі заявіўся, то ягоныя віжы адразу ж данеслі пра спатканні дачкі з бедным пастухом. Князёўну замкнулі ў святліцы. Бацька меркаваў, як і раней, выдаць яе замуж за багатага якога чалавека.

І вось у канцы лета, у цёмную рабінавую ноч, калі шугала навальніца і гняўліва бушавала возера, пастух падплыў на чоўне да самага замка і на жалейцы падаў голас сваёй любай. Князёўне нейкім чынам удалося выбрацца з вежы, і маладыя людзі кінуліся наўцёкі. Кіравалі да супрацьлеглага берага, каб там знайсці паратунак. Хвалі вялізныя залівалі невялічкі човен, вецер шалёна выў і перашкаджаў веславаць, але, тым не меней, уцекачы аддаляліся.

Стары князь нечага зайшоў у пакой да дачкі і не знайшоў яе там. Загарлаў валадар замка на шматлікіх слуг і дружыннікаў:

— Не ўберагліі! У пагоню! Знайсці яе!

Сваімі крыкамі гаспадар падняў на ногі ўсю чэлядзь, каб злавіць уцекачоў. Забегалі ўсе, замітусіліся. Нарэшце вартавы з баявой пляцоўкі закрычаў, перадольваючы шум ветру:

— Княжа! Вунь яны!

Усе кінуліся да яго. Дружыннік выцягнуў руку ў бок возера. І сапраўды, калі бліснула маланка, усе заўважылі далёка, сярод хваль, човен.

— Схапіць іх! — узвыў князь.

Але зноў бліснула маланка, і чоўна на вадзе ўжо не было — заглынула яго сквапнае возера. Тады ў роспачы бацька пракляў і возера, і рэчку, якія ў той жа момант праваліліся ў зямлю, а месца гэтае сталі называць, злучыўшы імёны тапельцаў Колі і Полі, — Ко-Поль, а пазней Капыль, ды так і засталося — Капыль. І сёння Капыль.

Спачатку гэта было звычайнае невялічкае паселішча, але потым, з цягам часу, разраслося і цягнулася ажно на пятнаццаць вёрстаў. Нават бліжэйшыя вёскі былі злучаны з мястэчкам. Гэта Кацельнікі, за тры вярсты, названы так ад таго, што там быў катляны завод; Ніскавічы, за чатыры вярсты — нізкі рынак; Стары Капыль, у шасці вярстах — Старое месца. Але бязлітаснымі пажарамі, якія і цяпер часта зда-

раюцца, усё было знішчана, засталося толькі маленькае мястэчка, славутае сваімі кірмашамі і штотыднёвымі базарамі.

## ЦІМКАВІЧЫ

Даўно-даўно, тысячы, а можа, і дзесяткі тысяч гадоў таму назад, з-пад звычайнага шэрага каменя, які хіба што толькі і вылучаўся сваімі памерамі, ды тым, што з-пад яго бруілася прыгажуня-крынічка, нарадзіўся славуты асілак. Ніколі яшчэ на нашай зямлі не было такога дужага чалавека. Што б ні стаяла на яго шляху, ён спакойна перамагаў, перакульваў, ламаў або адганяў прэч. Не было такой сілы на свеце, якой бы ён спалохаўся і перад якой бы адступіў. Людзі назвалі яго Цімкам. Нічога, што сілай чалавек гэты валодаў агромністай, але характарам быў надзвычай мяккі, не мог нікога пакрыўдзіць задарма, не мог адмовіць у дапамозе беднаму ці слабому. Спаць потым не мог спакойна, калі недзе не паспяваў падставіць свае грудзі ці магутны плячук. Здавалася, што з-за яго тут адбылася трагедыя, з-за таго, што не паварушыўся жвавей, што не падбег... Сядзе тады асілак, схіліць у журбе галаву і доўга-доўга маўчыць, толькі губы аб нечым бязгучна шэпчуць, нібы малітвы своеасаблівыя прамаўляюць і просяць прабачэння ў дарма загінуўшых людзей. Пасля такога выпадку Цімка, можа, з тыдзень не даваў сабе ні хвіліны адпачынку, спакойнага жыцця, такім чынам імкнучыся адпрацаваць ці вымаліць сабе дараванне за дапушчаныя памылкі і пралікі.

Жыў гэты чалавек сярод дрымучых-дрымучых лясоў, за шырокімі лугамі ды гнілымі балотамі. Але што яму, пры ягоным росце, было пераадолець нейкую там значную адлегласць. Ступіць крок-другі — і прайшоў дзесяткі вёрстаў, азірнецца назад, а ягонае жыллё ўжо далёка засталося, і не відаць зусім.

На паляванне як кіраваў, то зброі ніякай з сабою не браў. Так з голымі рукамі зуброў і тураў па пушчах і ганяў. Бяжыць за імі, але і тыя ж на месцы не стаяць, таксама джгаюць што сілы маюць. Ды ад Цімкі не надта-то ўцячэш! Пстрыкне кулаком самага вялікага зубра ў лоб, і той адразу ж валіцца долу, дух папярэдне выпусціўшы. А хлопцу многа і не трэба было,

проста ўволю пабегае ды назад заверне. Прынясе жывёліну да сваёй хаціны і там ужо да ладу давядзе.

Нічога, што такі высокі і здаровы быў асілак, але і прыгажосцю яго прырода-маці таксама не пакрыўдзіла. Што тое сонейка яснае свеціцца, што той салоўка спявае, калі якую песню зацягне. Не тое каб голас надзвычай магутны, але мілагучны. Птушкі, здаралася, і тыя не заўсёды пры ім спявалі, імкнуліся ў некаторых выпадках мелодыі для сябе пераняць, каб потым па ўсяму беламу свету іх разнесці.

Цімка прыродзе і людзям толькі дабром плаціў. Усё жывое надзвычай шанаваў, ніколі не крыўдзіў. Дрэвы, кустоўе не чапаў без дай прычыны, толькі пры пільнай патрэбе мог дазволіць сабе дрэва-другое высекчы ці выламаць, каб нешта пабудаваць ці для вогнішча на дровы пусціць.

Неяк хадзіў асілак, можа, за трыдзевяць зямель ад сваіх родных абшараў і напаткаў там надзвычай прыгожую дзяўчыну. Такая ўжо красуня была, што не змог яе забыць Цімка, хоць і зірнуў толькі пару разоў. Вярнуўся дамоў і засумаваў. Ды не тыдзень-другі, а можа, паўгода нічога рабіць не мог, не лезла нічога ў душу, у сэрцы толькі тая прыгажуня была, і ўсё. Перажываў-хваляваўся хлопец, а потым сабраўся і вырашыў: «Пайду да яе бліжэй, хоць пагляджу, чым яна займаецца, то і на душы спакайней стане».

Як сказаў асілак, так, ведама ж, і зрабіў. Доўга, праўда, ішоў, бо надта далёка дзяўчына жыла, але да полудня прыйшоў. Лёг на зямлю і за дрэвамі схаваўся, каб людзям на вочы не трапляць. Бачыць — ягоная прыгажуня ляжыць сабе ў цяньку, пад бярэзінкай, ды голькай мух адганяе. Вяскоўцы ж астатнія пад гарачым сонейкам у полі завіхаюцца, збажыну жнуць. Падумалася асілку тады: «Чаго ж гэта такая маладая і здаровая адлежваецца, калі дзеці і тыя гнуцца ды імкнуцца як мага болей дапамагчы бацькам?» Да самых прыцемкаў назіраў Цімка за прыгажуняй, але тая так і не пайшла да вяскоўцаў на поле. Толькі калі каровы дамоў пайшлі, лайдачка паціху дахаты падалася.

Колькі часу асілак яшчэ заставаўся на ранейшым месцы, а потым устаў і пайшоў. Ішоў неспяшаючыся, думаючы над тым, што ўбачыў. І пасля гэтых роздумаў сумненне закралася ў душу. Прыцёгся дамоў і, нават

не паеўшы, лёг адпачываць, ды не спіцца, хоць і многа прайшоў. Устаў і выйшаў з будыніны на двор. Сеў на ганку і задумаўся. Нейк непрыкметна і ноч праляцела. Калі ачнуўся Цімка, то ўжо птушкі весела пялялі-сноўдалі, бо новы дзень пачынаўся...

Пасля таго, як убачыў, што ўлюбёная ім прыгажуня не любіць працаваць, хлопец спакой страціў. Ды і зразумець яго можна: з аднаго боку, да дзяўчыны цягне, паратунку ніякага няма, а з іншага — вазьмі, прывядзі такую ў дом, пабудуй з ёю сям'ю. Так у косці ўесца, што і не рады будзеш потым.

Пачне рабіць асілак што-небудзь, а думкі міжволі да дзяўчыны звяртаюцца. Стане дровы секчы-пераломваць, хоць іх у яго заўсёды хапала, а твар яе з памяці не зыходзіць. Пойдзе на паляванне, бяжыць за звярамі, а яму здаецца, што каханку сваю даганяе. Прыпыніцца, стане на месцы ды ўслухоўваецца ў пошчак капытоў і трэск раздзіраемых кустоў. Развернецца і падасца назад, туды, адкуль прыйшоў. І зноў самотна прасядзіць на ганку немаведама колькі часу.

Прырода навокал разумела, як яму цяжка, але дапамагчы нічым не магла, бо і птушкі-весялушкі не выклікалі ўсмешкі ў Цімкі, як гэта заўсёды раней было. Маленькія звяры прыбягалі да хаціны асілка і там па-ўсялякаму куляліся-перакручваліся, але ён толькі ласкава гладзіў іх сваімі таўшчэразнымі пальцамі і нічога не гаварыў. Адбягалі тады ягоныя лясныя сябры, адчувалі, што нічым не могуць дапамагчы.

Аднойчы Цімка пайшоў на бераг рэчкі, сеў на беразе і стаў глядзець, як вада круціцца-пераварочваецца і ўсё некуды спяшаецца. Думаў-разважаў, а потым сам сабе і гаворыць: «Добра гэтай вадзе, яна пастаянна ў руху, пастаянна некуды спяшаецца. Не стаіць на адным месцы і сумаваць ад гэтага ёй няма калі. Вось каму можна пазайздросціць. І душа, калі яна ў вады ёсць, заўсёды спакойная і суцішная...»

Мовіў так асілак, і яшчэ маркотней яму на душы зрабілася. Ажно чуе — нехта адказвае яму:

— Няпраўду ты думаеш, чалавеча, ой, няпраўду... Не так ужо і спакойна ў вады на душы. Падумай сам, паразважай. Яна ж бяжыць-цячэ па многіх землях. Колькі гора-бяды, колькі ліха-крыві ў яе трапляе? Не задумваўся ты над гэтым, чалавеча... Часам цячы нават неахвота туды, дзе кроў нявінная ракою льецца, ды што зробіш, супраць цячэння не павернеш...

Так нельга ў нас рабіць. У людзей свае цяжкасці, у нас — свае перашкоды. Так ужо прырода-маці стварыла, так нам і даводзіцца існаваць.

— А я думаў, хоць вада бяды не ведае,— выдыхнуў у скрусе асілак.

— Ды што ты, родны...

— Няма мне спакою з-за дзяўчыны. Увесь свет яна запаланіла і сабою засціла. Што ні раблю — пра яе думаю, дзе ні бываю — яна перад вачыма...

— Дык, можа, ты ўжо гэтак не ўбівайся,— яму вада адказвае,— а жаніся. Там відней стане. Калі прыціснеш жонку адразу, то яна і перайначыцца, будзе дапамагаць, працаваць, як і ўсе астатнія. Колькі разоў такое здаралася, але ж мужыкі неяк трываюць...

— А можа, і праўду ты, вадзіца-царыца, кажаш. Можа, і перайначыцца,— адразу павесялеў тварам хлопец.

— Падумай, падумай над гэтым, асілак,— яшчэ раз прагула рака ў адказ.

Можа, з месяц разважаў Цімка над тым, што пачуў на беразе рэчкі, і нарэшце рашыўся. Сабраўся і пайшоў да той самай вёскі, дзе тая прыгажуня была, каб сватацца за яе. Калі далекавата было, то ішоў смела, бойка, а калі бліжэй стала, то і крок прымарудзіў, і азірацца пачаў. Усё хацеў каго напаткаць, каб параіцца ці запытацца, але, як назло, нікога не было. Прыйшоў да хаты і пытаецца ў бацькоў:

— Ці тут самая прыгожая дзяўчына жыве?

— Тут,— азваліся тыя, але чамусьці без асаблівай радасці.

— А чаго гэта вы такія сумныя?

— А што тут, чалавеча, радавацца, калі хто як даведаецца, што наша Анэтка працаваць не надта любіць, то і праходзіць бокам далей. Не любіць яна працаваць і не прымусіш. То мы, каб людзей не падманваць, і гаворым усім праўду...

— Нічога, што не любіць працаваць, у мяне перайначыцца ваша дачка. Вы толькі дазвольце мне на ёй жаніцца.

— Ды калі працаваць стане, то мы не супраць, бо вяскоўцы пастаянна толькі і робяць, што над нашым горам смяюцца. Жаніся, калі ахвоту маеш, але потым каб на нас не скардзіўся...

— Не буду я на вас скардзіцца, раз сам да такога

дадумаўся. Спадзяюся на лепшае, што ўсё атрымаецца зусім інакш, чым людзі прадказвалі.

— Тады мы згодны.

Вяселле гулялі такое, якога да гэтага часу ніхто і не бачыў, і не чуў. Усіх людзей з наваколля запрасіў Цімка за святочныя сталы. Падрыхтаваўся адпаведным чынам: тыдняў колькі мяса рыхтаваў, па пушчах бегаючы, рыбу вэндзіў, з рэчкі не вылазячы, усялякія прысмакі яму найлепшыя майстрыхі выпякалі. Сталы дубовыя ад пачастункаў гнуліся, песні такія вясёлыя спявалі, што ажно зямля сама, здавалася, у скокі пускалася. Вада ў крыніцах, азёрах, ручаях і рэчках з берагоў выходзіла, гулліва пагушкваючыся, звяры на дзіва гэткае глянуць з лясоў далёкіх збягаліся, птушкі зляталіся. Вяскоўцы так загуляліся, што цэлы тыдзень толькі і рабілі, што песні гарлалі ды карагоды правілі. Пілі, балявалі, маладым шчасця ды добрай долі, дзетак шматлікіх і паслухмяных жадалі. Але колькі вяселле ні доўжыцца, яно ўсё роўна некалі скончыцца павінна, і тады абавязкова пачынаецца будзённае жыццё. Не намі гэта ўсталёўвалася, не нам яго і адмяняць.

Зноў Цімка не ведаў ні дня ні ночы. Паіў, карміў, туліў усіх, хто да яго гарнуўся ці звяртаўся за дапамогай: і чалавека, і звера, і птаха, і рыбу, і жыўнасць усялякую. Цешыў сваёй шчырай працай палі і палеткі, лугі і сенакосы, нівы і лясы. Дзе прыкладваў сілу, там упарадкаванае поле ці выкашаны чыста луг заставаўся, расчышчаны лясны завал ці збажына ў копах стаяла. Ягоныя магутныя грудзі, здавалася, увогуле стомы не ведалі, толькі і рабіў асілак, што працаваў.

Затое жонка ягоная, як і некалі дома, сядзела перад люстэркам ці над чыстаю вадою ды сабою любавалася. Муж малады спачатку ўвагі на гэта асабліва не звяртаў, рабіў выгляд, што не заўважае, як ягоная Анэтка пад любымі падманамі ад працы ўхіляецца. Потым заўважыў, як спачувальна глядзяць на яго людзі, якім ён дапамагаў, без якіх не ўяўляў далейшага жыцця. Аднаго разу стары селянін не ўтрымаўся і ў адкрытую сказаў асілку:

— Ведаеш, што, Цімка, шкада нам цябе. Не наша гэта справа, канечне, але ж мы не сляпыя і ўсё бачым. З'есць яна цябе, згубіць. Прагані ты яе з хаты, каб і духам лянотным не смярдзела!

— Што ты мовіш такое на маю жонку, дзядуля! Хіба ж так можна? Хіба ж гэта не грэх?

— Не грэх, волаце, не грэх, грэх можа значна пазней здарыцца, але ўжо позна будзе, не стане ў цябе магчымасці яго выправіць,— не пабаяўся закончыць стары вясковец.

А жонка Цімку ў рукі стала браць. Не так зусім атрымалася на самай справе, як яму некалі вада прадказвала, наадварот усё выйшла. Прымушала такія загады выконваць, што нават мароз па скуры прабягаў, настолькі яны лютымі і бесчалавечнымі былі, настолькі ад іх варожасцю павявала. Ляжыць, бывала, ляжыць сабе маладзіца, а потым і заверашчыць:

— Хачу, каб у нас палац быў да самага неба, ды не просты, а залаты, ды не праз год, а да раніцы! Не будзе, дык да бацькоў вярнуся, сам тады заставайся!

Угнецца асілак і давай шчыраваць, спяшаючыся, каб паспець завяршыць справу да раніцы, бо надта баяўся страціць Анэтку. Глядзіш — і замак высокі ды непаўторны па прыгажосці стаіць, пераліваючыся на сонейку ўсімі колерамі вясёлкі.

Дзівіліся людзі, жагналіся на яго, бо не верылі, што гэта за адну ноч здолелі чалавечыя рукі стварыць. Перашэптваліся паміж сабою, але думка заставалася адна і тая ж: згубіць яна Цімку, не дасць яму шчасця-долі...

Гаманілі, гаманілі паціху ды разыходзіліся, бо баяліся, каб Анэтка часам і на іх асілка не напусціла. Мала што той у галаву магло прыйсці.

Маладзіца ж як распанела, дык і ўвогуле ні з кім ні знацца, ні размаўляць не хацела. Адно толькі і рабіла, што прыдумвала ўсё новыя і новыя найскладанейшыя выпрабаванні-задачы для свайго мужа.

Неяк замаркоцілася жанчына і гаворыць на Цімку:

— Нешта зямелька наша стала халодная ды мокрая, можа б ты, мужу, узяў ды і перавярнуў яе на іншы бок! Мне так хочацца!

Ажно рот разявіў Цімка ад здзіўлення:

— Ды ці ж можна такое рабіць? Што ты гаворыш? Мы ж усё на свеце згубім, усё перавядзём!

Але жонка і не збіралася саступаць:

— Мне так хочацца, а іншае мяне не цікавіць...

Пайшоў муж на двор, прысеў ля студні і горка-горка заплакаў. Ажно чуе, як гаворыць яму вада:

— Не рабі такога, чалавеча, не рабі, бо жыццё страціш.

Не паслухаўся Цімка папярэджанняў вадзіцы-царыцы, пайшоў у чыстае поле, ухапіўся за таўшчэразны дуб і давай яго да сябе цягнуць, зямлю стараючыся перавярнуць. Ды колькі ні стараўся, усё дарма. Сам толькі ў зямлю пачаў грузнуць і неўзабаве знік з вачэй зусім. Там доўгі час нібы гуз на зямлі стаяў, то яго і звалі Цімкава, а потым сталі клікаць і паселішча Цімкавічамі.

## КАКОРЫЧЫ

Жыў на нашай зямлі некалі адзін пан. Як яго звалі — не скажу дакладна, бо і мне ніхто пра такое не казаў. Але што круцель быў гэты памешчык, свет белы ўхапіў бы сабе, каб толькі магчымасць такая надарылася, то гэта праўда. Худы, нібы жэрдка якая, росту даволі высокага, а сілы ніякай не меў, бо як добра штурхнеш, гаварылі, то мог не толькі ногі ўгару задраць, але і перакуліцца яшчэ разоў колькі. Злосці меў столькі, што каб сабраў самых лютых памешчыкаў усіх разам, то гэты пан адзін меў бы болей за ўсіх астатніх. Калі што не так выходзіла, хоць і не па віне людзей, а якія прыродныя сілы ўмешваліся, то ўсё роўна памешчык крайніх шукаў, каб на іх злосць выліць, сваю душу супакоіць.

Аднаго разу, прыгадвалі і такое, спрабаваў нават на дождж злавацца, і загадаў бедным вяскоўцам падпальваць будыніны, каб вада высыхала, бо неба адмаўлялася гэтаму дурню падпарадкоўвацца. Плакалі сяляне, маліліся, прасілі, каб адмовіўся ад сваіх слоў пан, але не тут-то было. Дзе ж гэта вы бачылі, каб які пан ад таго адмовіўся, чаго хвілін колькі назад патрабаваў? Запылалі сухія з сярэдзіны будыніны, пацягнуліся слупы дыму па зямлі. Дождж як ішоў, так і працягваў ісці, а людзі без прытулку засталіся, пад голым небам павінны былі жыць.

Дзяцей у пана сваіх не было. Згадвалі, што жонка ўцякла разам з дачкою з нейкім афіцэрам ці то стражнікам. Ды хто з такім злыднем жыць пагодзіцца? Калі спаць кладзешся, пра адно думаеш, а ўстанеш, то зусім пра другое галава баліць будзе, дый надакучыла, відаць, глядзець на здзекі над безабароннымі людзьмі, на самадурства мужа. Таму бедная жанчына

і плетанула з двара з першым жа добрым чалавекам. Хужэй, чым тут, ужо не будзе.

Так дзесяткі гадоў цягнулася, бо мясцовы памешчык толькі іншых людзей вынішчаў, а самога смерць не забірала. Відаць, і тая кастлявая істота ў дадзеным выпадку адвярнулася ці Усявышні забыўся на існаванне гэткага пачварнага чалавека на зямлі.

Народзіцца, бывала, дзіця ў вёсцы, дык збяруцца ўсе вяскоўцы, выкарыстаўшы зручны выпадак, і давай галасіць-убівацца. Валасы на сабе рвуць, качаюцца па траве ды па глебе, стогнуць, нібы ад страшнага болю, слёзы ручаінамі праліваюць.

Ідзе гэта аднаго разу стары дзядулька. Хіба ўжо ўвесь свет пешкі абышоў падарожны, але з такім яшчэ ніколі не сутыкаўся. Як пачуў крыкі і праклёны, то падумалася яму, што нехта памёр у вёсцы і яго аплакваюць. Таму хацеў спачатку абысці паселішча бокам, каб не заўважылі яго, ды не атрымалася, якраз на жанчыну нейкую выйшаў, што нечакана з-за крайняй хаціны выйшла.

— Што-то ў вас, маладзічка, такое дзеецца ў вёсцы сёння? Відаць, нехта памёр надта паважаны ці добры, раз так усе ўбіваюцца? Колькі хаджу па свеце, але такога плачу і праклёнаў яшчэ нідзе не сустракаў і не чуў? Што ж адбылося? Можа скажаш?

— Чаму б і не сказаць, добры чалавек. Дарма ты думаеш, што ў нас нехта памёр і ягоную душу выпраўджаюць на той свет. Зусім не тое...

— А што ж яшчэ можа быць? — зусім зніякавеў стары.

— Ніхто не памёр, а, наадварот, нарадзіўся,— прамовіла вяскоўка.

Вандроўнік як стаяў, так і сеў прама на траву, і толькі рот ягоны бязгучна зяхаў. Хацеў старэча нешта сказаць, ды не здолеў. Рукі ўбакі развёў і прыціх.

Убачыўшы такія паводзіны, жанчына ўзялася тлумачыць незнаёмаму чалавеку, што ж адбылося тут на самай справе:

— У нас, даражэнькі, з давён веку так ужо вядзецца, што калі чалавек памірае, то над ім не плачуць, а скачуць. Весяляцца родныя і блізкія, знаёмыя і суседзі, як толькі могуць... Услаўляюць тое, што адмучыўся на гэтым свеце божы працаўнік, перастануць цяпер панскія паслугачы і сам памешчык над ім здзека-

ваццa, а душа ягоная спачне далёка на небе, дзе Усявышні адвядзе ёй спакойнае месцейка і дзе не будзе ні здзекаў, ні жорсткасцей... Так у нас ад старых павялося, то і мы гэтаму звычаю не здраджваем. Не таму, што не можам яго забыць, а таму, што ў нас надзвычай пан бязлітасны.

Сказала такія словы сялянка і давай азірацца, каб нікога паблізу не было, каб ніхто не падслухаў ды не данёс выпадкова памешчыку, бо тады жывою згнояць. У той момант і стары падарожны ўжо крыху ачомаўся, пачаў пра нешта меркаваць. Устаў і кажа на жанчыну, ціхенька гэтак, каб ніхто не пачуў, што параіць ён незнаёмай вяскоўцы:

— Цяпер мне, галубка, усё зразумела. Раз чалавек нарадзіўся, то вы, значыцца, аплакваеце ягоную будучую жытку. Жадаеце, каб лепей дзіця памерла яшчэ ў калысцы, чым яно сутыкнецца з тымі цяжкасцямі і горам-злыбедаю, якія яго чакаюць наперадзе. Вы зайздросціце нябожчыкам, але па-свойму шкадуеце і аплакваеце жывых. Цяпер я зразумеў, чаму так горка плачуць і крычаць сяляне ў гэтым паселішчы. Не чуў такога яшчэ нідзе і бачыць не даводзілася... Але калі ўжо да такога дайшло, то, мабыць, на самай справе не надта салодка вам жывецца.

— Ой, не кажыце, дзядзечка,— пляснула рукамі жанчына,— якая там жытка, калі кожную ночку думаеш толькі аб адным — хоць бы на світанні не прачнуцца, бо зноў давядзецца маўчаць і трываць, сціснуўшы зубы.

— Што ж тут рабіць? Чым вам дапамагчы? Якое выйсце знайсці? — пачаў разважаць незнаёмы, а сялянка не адыходзіла, стаяла побач і ўважліва слухала.— Добра. Паспрабую зрабіць так, каб перайначылася жыццё ў вашай вёсцы. Толькі, можа, давядзецца вам перайсці жыць на новае месца куды...

— Ой, каханенькі,— бухнулася жанчына ў ногі падарожнаму,— толькі дапамажы. Толькі выратуй, то мы цябе да скону жыцця свайго не забудзем. Маліцца за цябе будзем. Паспрабуй... Паспрабуй, родненькі, нам губляць усё роўна ўжо няма чаго...

— Добра, жанчына, добра. Ідзі сабе дамоў, толькі маўчы пра ўсё.

Стрымаў сваё слова той стары дзядулька. І здарылася ўсё наступным чынам.

Памешчык звычайна надта позна клаўся спаць,

а сонца не паспее яшчэ ўзысці, то ён ужо гарлае па падвор'і, слуг, парабкаў, вяскоўцаў ганяе. Накрычыцца за дзень, набегаецца, здавалася б, ног пасля гэтага не будзе смыкаць — толькі не, на наступны дзень паўтараецца тое самае.

Аднаго разу прыйшоў ён да сябе ў пакоі, калі ўсё наваколле ўжо спала. Заваліўся ў ложак на пуховыя пярыны і задрамаў. Ажно падалося яму, што пад акном нехта тупае-ходзіць. Усхапіўся і кінуўся туды. Як ні ўглядаўся ў начную цемру, нічога там не ўбачыў. Плюнуў са злосці і зноў прылёг. Праз колькі хвілін зноў усхапіўся, ды зноў нічога не высачыў. Закрычаў раззлавана:

— Эй, слугі! Бягом сюды!

Калі тыя прымчалі, то загадаў:

— Стойце пад маімі вокнамі і сачыце, каб там нікога не было, бо здаецца мне, што нехта лазіць! Калі зловіце, то валачыце адразу ў пакоі! Тут мы яму наладзім баль!

Слугі сталі адразу на вуліцы пад самымі вокнамі. Заваліўся пан зноў у ложак. Але толькі заплюшчыў вочы, толькі іх звёў, як зноў падалося, што нехта ў акно ўжо не глядзіць, а моцна тарабаніць. Усхапіўся гаспадар палаца і гопнуўся назад у пярыны — прама з акна на яго таропілася... адрэзаная жарабячая галава. Хацеў крыкнуць пан — голасу не было, хацеў рукамі ці нагамі дрыгнуць — сілы неставала... Неяк усё ж выкараскаўся і ўзняў галаву. Паспрабаваў крыкнуць што было моцы, ды з горла вырваўся толькі нейкі хрып, і ўсё на тым заціхла...

Слугі, якія пад раніцу прыйшлі ў пакой, каб сказаць, што ўсё ў парадку і нікога не бачылі ні на вуліцы, ні пад вокнамі, заспелі ўжо халоднае цела свайго былога ўладара. Пачалі бегаць па палацы, шукаць, хто ж забіў іхняга гаспадара, але ніякіх слядоў не знайшлі. Калі нехта з паслугачоў прыадчыніў акно, то яму падалося, а можа, і не, быццам бы хістануліся кусты і нешта затупала па зямлі.

Пахавалі памешчыка і не ведаюць, ці то галасіць, ці то смяяцца і радавацца, як рабілі над сваімі нябожчыкамі. Закапаць-то закапалі, дый пасталі над магілай у роспачы. Як жа ім далей жыць? І злыдня-пана няма, але ж зямля ўсё роўна за ім застаецца.

Потым нехта смелы прапанаваў:

— А ведаеце што, давайце да якога іншага пана

жыць падамося. Там зямля таксама знойдзецца, але ж здзекавацца так, як тут, не будуць.

Сабраліся і рушылі на новае месца. Знайшлі памешчыка, і той згадзіўся іх прыняць, толькі папярэдзіў адразу:

— Зямлю, людцы, самі сабе будзеце раскарчоўваць ад лесу і хмызоў, бо ў мяне яна ўся такая.

— Гэта, пане, нічога, да гэтага мы звычныя,— адказалі навасельцы і прыняліся за працу.

Многа сілы і здароўя яны на гэта паклалі, але ніхто не адчайваўся, тут можна было жыць спакойна. Паселішча новае назвалі Какорычы, бо многа даводзілася карчаваць. Ад тых карчоў і вёска стала.

## ПАЦЕЙКІ

Наша паселішча так сталі зваць таму, што людзям не надта лёгка жылося. Ім даводзілася працаваць удвая ці ўтрая больш, чым тым, якія жылі дзе-небудзь на больш урадлівых землях. Хоць зямельку і шанавалі, але яна ў нас не асабліва добрая. Гэта ўсе і зараз бачаць.

Дык вось, старыя людзі і казалі, што хлеба не з'ясі, а ўжо поту на сарочцы месца дасі. Гэта значыць — трэба добра прапацець, каб кавалак хлеба на стале займець. Не раз, не два зношвалася сарочка на плячах земляроба-працаўніка да дзірак, спаўзала бруднымі лахманамі, бо не было калі саткаць новую, супыніцца, пераапрануцца, асабліва падчас сезонных работ, дзе кожная хвіліна цанілася на кошт золата.

Добра, калі толькі на сябе працаваць даводзілася, але такое рэдка здаралася, бо трэба ж было яшчэ і на пана спіну гарбаціць, прычым і днём і ноччу. Свайго не давалі зрабіць, а памешчыкава прымушалі своечасова выконваць. Чуць што — засвішчуць бізуны, заляскаюць па мужыцкіх плячах, і пацячэ кроў, уперамешку з салёным потам. Вось вам і Пацейкі, мае ласкавыя.

Пан сядзіць дома, каву папівае дзе-небудзь у цяньку, за столікам, а людзі ягоныя на полі шчыруюць, пакінуўшы ў хацінах толькі старых знямоглых ды маленькіх дзяцей (якім, можа, два-тры гады), бо немаўлят неслі жанчыны за плячыма. Хай толькі данясуць памешчыку верныя паслугачы, што нехта правінаваціўся ці норму не паспеў за дзень выканаць, то

і адлупцуюць бязлітасна, і ў халодную кінуць, а не дамоў адпусцяць. Такі крывавы пот быў. Па сцверджаннях некаторых сялян, ён і даў назву нашай вёсцы Пацейкі.

Іншыя гавораць пра іншае. Быццам бы некалі на гэтым самым месцы, дзе зараз стаіць паселішча, была непралазная балаціна, гразюка такая ўтваралася, асабліва вясною і восенню, што прайсці было немагчыма, не тое што возам праехаць. Вось і даводзілася вяскоўцам і тут рваць жылы, бо коні, бедалагі, не маглі самі выцягнуць нагружаныя колы. Часта яны адрываліся, рвалася вупраж, і падалі знясіленыя жывёліны прама ў смярдзючую ваду. Пакуль выцягнуць воз сяляне, пакуль дапамогуць таму, хто ў бяду трапіў, то не раз спіна намокне і высахнуць паспее. Таму, калі заўважалі, як нехта кіраваў на кані да гэтага страшнага балота, то звычайна казалі: «Пайшлі, хлопчыкі, зараз нам пацейкі на ўсе плечы будуць! Вось дзе ўжо пагрэемся! Можа, хто-небудзь замарозіўся, дык якраз часіна настала размяцца, сілу дурную выпусціць...»

Адтуль, маўляў, і пайшла назва такая дзіўная — Пацейкі.

Але даводзілася чуць яшчэ і такое паданне, яно, па-мойму, больш прыгожае, паэтычнае.

Жылі даўным-даўно ў гэтым месцы людзі. Займаліся звычайнай вясковай працай: сеялі, аралі, скародзілі, адным словам — вырошчвалі хлеб, а калі шанцавала, то і да хлеба.

Ды не ўсе такія сумленныя і шчырыя былі. Яно і не дзіва, што нехта там не хоча працаваць, ці шукае, дзе можна так уладкавацца, каб рукі і спіна не балелі, а багацце само ў хаціну плыло б. Іх па-рознаму называлі: каго лайдакамі ці абібокамі, каго дурнямі, а каго, што найбольш характэрна,— чорнымі варажбітамі ці чараўнікамі. Такія былі самыя страшныя, бо самі працаваць не тое што не жадалі, але актыўна гэтаму супрацівіліся і, акрамя гэтага, па-чорнаму зайздросцілі тым, у каго ў гаспадарцы ўсё ішло больш-менш гладка, спраўна. Напускалі на заможнага селяніна праклён, на жывёлу ягоную наводзілі паморак і ўсё — да скону жыцця не мог выбрацца селянін з галечы і гора. Ведалі людзі, хто на такое здатны, але бокам абыходзілі жыллё варажбітоў, не звярталіся да іх ні за парадамі, ні за дапамогаю.

Такі дзядзька жыў у тыя даўнія часіны і ў нашай вёсцы. Звалі яго Ахрым. Імя як імя, тысячы сумленных людзей такое насілі. Гэты чалавек жыў адзін. Справа ў тым, што нарадзіўся ён у шматлікай і працавітай сям'і. Мелі яны многа поля і лесу, але ж зямлю трэба было апрацоўваць, лес даглядаць, каб справа добра ішла. Бацькі працавалі, не разгіналіся, браты і сёстры шчыравалі таксама ад раніцы да вечара, а вось Ахрым, малодшы ў сям'і, не надта да працы цягнуўся. Хто яго ведае, адкуль так пайшло. Можа, шкадавалі, што апошненькі, маленькі, таму любую працу за яго старэйшыя выконвалі, а можа, надта рана зразумеў, што не працуючы можна пражыць не горай, чым не разгінаючыся ад працы. Хто ж там ужо ведае...

Бацька, калі заўважыў, як сын ухіляецца, любыя зачэпкі знаходзіць, каб толькі дома застацца, а не ў поле ці на луг працаваць ехаць, паспрабаваў было ўгаворваць — не дапамагло, лупцаваць вісуса пачаў — вынік той жа самы: крычыць хлопец, верашчыць не сваім голасам, але як кіне гаспадар папружку ці пас, то зноў гаворыць, што не паедзе з усімі, бо блага сябе адчувае (ці яшчэ якую прычыну знойдзе).

Пакутавалі з ім старыя, сорамна было астатнім братам і сёстрам, але што ж ты зробіш, калі гора такое менавіта на іхнюю сям'ю абрынулася. Калі пачалі дзеці жаніцца ды замуж выходзіць, то ўсім зямлю бацька наразаў, пасаг даваў, будавацца дапамагаў. Ахрыму ж збудавалі проста невялічкую будыніну, лапінку зямлі ля яе пакінулі і перасталі да яго хадзіць, бо людзі ўжо тады гаварылі, што ён навучыўся выклікаць нячыстую сілу сабе ў дапамогу, што з ёю разам каго хочаш са свету здольны зжыць. Але малады абібок пакуль такога не рабіў, яму падабалася іншае — напусціць на чалавека ці на жывёлу хваробу і глядзець, як тыя пакутуюць. Сядзіць сабе, ад задавальнення ажно рукі паціраe, так яму добра.

У хуткім часе памерлі старыя. Паміраючы, думалі, што Ахрым хоць развітацца з імі прыйдзе, ды не дачакаліся такога ад свайго малодшанькага. Не прыйшоў хлопец, і на могілкі потым не паказаўся. Нібы і не было ў яго ні бацькі, ні маці. Але пакуль старых не пахавалі, варажбіт нічога страшнага людзям не рабіў, мабыць, усё ж з-за бацькоў. А калі іх не стала, то паказаў, на што здатны. Дзесяцігоддзямі здзекаваўся над вяскоўцамі, потым і гэта, мабыць, надакучыла.

Багацця ж ніякага не нажыў, павагі сярод сялян не здабыў, адзінага толькі дасягнуў — баяліся вяскоўцы, нібы чорта якога.

Прачуў Ахрым ад некага, ці мо і сам пра гэта ведаў, што ў купальскую ноч можна ўзбагаціцца, прычым, што самае галоўнае, асабліва не напружваючыся.

Нарэшце і Купалле надышло. Ледзьве дачакаўся варажбіт часу, каб за скарбамі прыпусціць. Колькі разоў выбягаў у двор і пазіраў, ці не прыцямнела. Сабраўся старанна, усё самае неабходнае ўзяў. Лічыў, што прыцягне столькі золата, што да канца жыцця хопіць.

Вось і густы туман ахутаў усё наваколле. Выбег Ахрым з хаты разам з усім сваім начыннем. Цікава, што ўзяў ён з сабою не абы-што, а Псалтыр, гадзіннік і агарак. Ідзе ды аглядваецца. Не так баяўся, як перажываў, што хто-небудзь заўважыць і тады давядзецца будучым багаццем дзяліцца. Каму ж гэта хочацца гатовае золата-срэбра ў іншыя рукі аддаваць? Месяца на небе не было, зоркі некуды пахаваліся, толькі вецер нечага ўсхадзіўся і дзіка завываў у вершалінах дрэў. Стогнуць таўшчэразныя дубы, гнуцца, нібы чараціны, елкі і хвоі, а варажбіт не палохаецца, кіруе далей. Загадзя ўсё прадумаў: прайсці да высокага грудка, дзе спрадвеку расло надзвычай многа папаратніку. Менавіта там ён і думаў спаткацца з цудадзейным цветам, які яго ўзбагаціў бы. Пакуль дацёгся Ахрым, то добра-такі ўзмакрэў, ажно пот буйнымі кроплямі на ілбе выступіў. Нідзе не спыняўся чараўнік, мабыць, баяўся, што не паспее да часу, бо ўсё на гадзіннік паглядваў ды крок прыспешваў.

На высокай выспе спыніўся, сеў на невысокі пянёчак, каб дух перавесці, і пачаў аглядвацца навокал. Можа, месца найлепшае шукаў, а можа, спадзяваўся доўгачаканы агеньчык заўважыць. Потым перасунуўся да маладога дубка, прысеў пад ім і стаў чакаць апоўначы. Запаліў свечку, стаў перад ёю на калені і, што ж вы думаеце, давай паціху Псалтыр чытаць. Маліўся, але толькі не для другіх, а дзеля сябе.

Дык вось, адбівае ён паклоны, бармоча боскія словы — ажно пачуўся аднекуль здалёку спеў пеўня, які, відаць, азначаў, што ўжо сярэдзіна ночы прыспела. Тут самыя дзівы і ўзыграліся. Адчувае Ахрым, як валасы на галаве ўздымаюцца, і не па ягонай волі, а нейкая іншая сіла моцна ўздзейнічае. Потым бачыць,

быццам бы гарыць ягоная хаціна ў вёсцы, гарлаюць нейкія людзі, крычаць аб нечым, рукі да яго працягваюць, клічуць на дапамогу. Зніякавеў варажбіт, не ведае, як далей быць, бо раней жа ніхто паратунку ў яго не прасіў. Яшчэ хвілін пару пачытаў Псалтыр і болей не ўтрываў — усхапіўся ды паджгаў да паселішча, пакінуўшы пад дубком і рыдлёўку, і гадзіннік, і ўсё астатняе. У два разы хутчэй назад прыляцеў, чым калі ў лес дабіраўся. Стаіць, ледзьве дыхае, на ўскрайку. Не відаць яму ніякага полымя, ніхто тут не крычыць аб дапамозе, толькі чуваць, як песні вяскоўцы спяваюць на Лысай гары ля святочных вогнішчаў.

Зразумеў чараўнік, што астатнія проста святкуюць Купалле і ніхто не хадзіў за незлічонымі багаццямі-скарбамі. Плюнуў са злосці і хацеў ужо назад павярнуць, каб даглядзець, дзе ж каштоўнасці закапаны ці схаваны. Крутнуўся да лесу, і тут нечаканае здарылася — ускочыла нешта цяжкае і вялікае, з вострымі кіпцюрамі яму на шыю. Душыць, крэпка прыціскае, крыкнуць няма як. Цяпер ужо насуперак уласнай волі паляцеў варажбіт дахаты. Бяжыць, дыхаць амаль нельга, бо тая пачвара за шыю жме, да горла цягнецца. Ледзьве дасунуўся да будыніны, гопнуўся на прызбу і з апошніх сіл, як і ўсе хрышчоныя людзі, перажагнуўся. Тады адразу ж і адпусціў яго гэты звер. Да раніцы Ахрым не ішоў у хату, бо сілы неставала, ачомацца не мог.

Калі сонейка яснае ўзышло, яму лягчэй зрабілася. Пакляўся тады варажбіт, што болей ніколі ў жыцці не будзе рабіць назло людзям, не будзе шукаць скарбы ў купальскую ноч, а будзе працаваць, як і ўсе вяскоўцы. Так і здарылася. Навёў такі парадак Ахрым у сваім агародзе, што дзівіліся людзі, няўжо можна зрабіць такое на пустцы. Калі да гаспадара звярталіся з запытаннямі, то ён з ласкавай усмешкай адказваў:

— Не дай Божа, вам, мае родныя, таго, што я перажыў, перапакутаваў... Не жадаю нікому такога. А што тычыцца агарода, то тут ніякага сакрэту няма. Працуйце, пацейце добра, дык і расці будзе надзіва... Папацееце, то і прыдбаецца вам.

Адтуль, маўляў, ад гэтых слоў і пайшла назва Пацейкі.

## РАКІНІ

Здаўна людзі любілі лес, абагаўлялі яго і паасобныя пароды дрэў. Лес быў асновай жыцця і працы нашых далёкіх продкаў. Амаль усё тады рабілася з дрэва ці з таго, што расло ў лесе: рабілі будыніны і прылады працы, лодкі і чаўны. А хто не памятае, дзе чалавек прызвычаіўся хадзіць на паляванне ці прыручаць дзікіх жывёлін? Вядома ж, у пушчах ды барах. У нас тут яны былі непралазныя.

Нашы бацькі кожнаму дрэву прыпісвалі асобныя ўласцівасці. Усё навокал для іх было жывым. Хто з вас не памятае паданняў і легендаў пра ноч на Купалле? Казалі, нібыта ў гэтую ноч дрэвы пераходзяць з аднаго месца на другое і размаўляюць паміж сабою.

З дрэвамі звязана многа павер'яў. У адным з іх, напрыклад, адзначалася, што калі тры першыя лясіны, якія сустрэліся на тваім шляху, табе не спадабаліся, то ўвогуле нельга секчы бёрнаў у той дзень, бо зробленая з іх будыніна не будзе доўга стаяць — згарыць.

Мой дзед казаў, што калі нараджалася ў хаце дачка, то гаспадар саджаў пад акном рабіну. А калі на дрэве ўпершыню з'яўлялася шмат чырвона-агністых ягадак, гэта азначала, што дзяўчына на выданні. Бабуля гаварыла, што рабіна можа незаўважна і нячутна для людзей лячыць іх, пазбаўляць ад усялякіх злых праклёнаў і чорных позіркаў, паляпшаць жыццё. Такое дрэва нельга ні ў якім разе ні секчы, ні ламаць. Не даруе Усявышні злому чалавеку штонебудзь благое, учыненае супраць рабіны.

У нас казалі, што калі справа адбывалася напярэдадні нейкіх значных будоўляў, то духам дрэваў працягвалі «плаціць». Толькі цяпер ім імкнуліся прыносіць нешта звычайнае, будзённае, а не каштоўнае ці рэдкаснае. Чалавечыя ахвяры замяняліся ўсялякімі ідаламі ці ўпрыгожанымі каменьчыкамі. Без такога абраду нельга было абысціся. Справа ў тым, што чалавек, які пры дапамозе іншых вяскоўцаў ці суседзяў назапашваў дрэвы для будучай будыніны, баяўся, каб нейкае, нават нязначнае, парушэнне старадаўніх канонаў не прывяло на ягонае падвор'е смерць. Засцерагаючы сябе, будаўнікоў і ўсіх хатніх, лічыў за лепшае прынесці ахвяры, каб угаварыць духаў.

Нашы продкі адзначалі, што ў нашых мясцінах даўным-даўно найбольш раслі ракіта (адтуль, маў-

ляў, і назва) і дуб. Цяпер дубоў амаль не засталося, асабліва старых, таўшчэразных, якія стаялі ў далёкія часы. Многае тут паўплывала: войны, пажары, маразы, але галоўным чынам — сам чалавек. Ён павысякаў каштоўныя дрэвы на драўніну. Ракіту ж да апошняга часу (прыкладна канец таго — пачатак гэтага стагоддзя) амаль не чапалі.

Паводле многіх апаведаў, гэтае дрэва быццам бы стварыў не Бог, а ягоны вораг адвечны — нячысцік. Усявышні для людзей прыдумваў, выпускаў на волю ды пакідаў на зямлі толькі самае неабходнае. Чорт жа, наадварот, нарабіў таго, чаго не трэба было, і людзі ўсё жыццё толькі і рабілі, што змагаліся з гэтым. Многія перашкоды і бядоты дайшлі і да нашага часу. Да іх можна аднесці балоты, вербалозы, тую ж самую ракіту. Але навучыліся нашыя продкі і з іх нейкую карысць мець. З балота, што нядзіўна, і рыбу насілі, і птушку, і сена касілі, і ягады бралі; з вербалозу лапці, кошыкі гнулі, іншыя якія прылады.

А вось з ракіты — і таго не маглі ўзяць, бо яна і не гнуткая, і крохкая надзвычай, толькі возьмешся — і трэснула ў руках. Затое разрасталася так імкліва, што рады працаўнікі не паспявалі даваць. Спачувалі таму гаспадару, да якога ў надзел гэтая брыдота ўбівалася. Але што з таго спачування? Змагацца з ракітай трэба было, ды не абы-як, а прадумаўшы ўсё, бо калі толькі зверху павысякаеш дзіўнае дрэва, то на вясну яшчэ большыя і гусцейшыя парасткі з зямлі пойдуць. Там, дзе адзін ствол быў, з'явіцца пяць, а то і болей. Вяскоўцы не аднымі сякерамі секлі, але і рыдлёўкамі яміны капалі ды рукамі карані да нітачкі вырывалі.

Мне мой дзед гаварыў, што назву вёсцы ракіта і дала. А ўсё вось як разгортвалася.

Быў у нашага пана (можа, гадоў трыста ці чатырыста таму гэта здарылася) адзін парабак. Не дужа каб сумленны, але выконваў загады свайго валадара своечасова. Памешчык ведаў, што як пашле гэтага чалавека з нейкім загадам ці яшчэ з чым, то ён абавязкова выканае, але ні пра што іншае пры гэтым нават і не падумае. Скажуць зрабіць тое, ён тое і зробіць, а на астатняе і не гляне.

Неяк надвячоркам сядзеў памешчык у садзе і паважна пацягваў гарбату. І тут яго нібы абухом па галаве цюкнула: «А дзе ж гэта мой маленькі сынок

падзеўся?» Крутнуўся пан туды-сюды — не відаць. Пані з пакаёўкамі сваімі ў той дзень у лес пайшла па ягады. Гаспадару ж даверылі за адзіным сынам наглядаць, то той і тут не справіўся. Захваляваўся памешчык, вядома ж, не дай Бог чаго дурнога, тады і не выкруцішся, і не адмовішся. Колькі ні бегаў — не знайшоў малога. Тады вырашыў паклікаць парабка і загарлаў:

— Хведар (гэтак яго звалі), бягом да мяне! Дзе цябе нячысцік носіць?! Бягом сюды!

Прыляцеў парабак што сілы было, а пан яму і загадвае:

— Бяжы да ракі і паглядзі, ці не ўцёк мой сыночак міленькі туды. Каб ліха якога з ім там не прыключылася...

— Слухаю! — гаркнуў Хведар і паджгаў.

Прыбег на бераг, зыркнуў туды-сюды і бачыць — паніч малюсенькі ўжо па шыю ў вадзе катурхаецца. Паімчаў тады парабак назад да пана. Прыбягае, а памешчык ужо і месца сабе не знаходзіць. Крычыць здалёку Хведар:

— Пане! Пане! Знайшоў!

— Дзе ён?!

— На рэчцы, пане!

— А што ж сыночак там робіць?

— Ды нічога такога!

— А што ж ён табе сказаў?

— Нічога, ваша мосць, не загадаў і не сказаў, бо па шыю ў вадзе гуляўся!

— То чаго ж ты, дурань, яго дамоў не прывалок?

— Дык вы ж і не гаварылі. Сказалі знайсці і паглядзець. Я гэта і выканаў...

Але пан ужо не слухаў далейшых тлумачэнняў, а ляцеў, нібы з тугога лука пушчаны, на бераг. Добра, што бег, колькі сілы хапала, бо паніч маленькі ўжо ротам бурбалкі пускаў. Яшчэ б хвіліна-другая, і развіталася б яго бязгрэшная душа з белым светам. Выхапіў памешчык сына з вады і на бераг хутчэй вылецеў. Лашчыць бедалагу, прымаўляе:

— Сыночак мой родненькі, сыночак мой даражэнькі! А што ж гэта ты надумаў? На каго б ты нас з матуляю пакінуў, каб вада цябе забрала?!

Паніч нічога не адказаў, толькі абвіў бацькаву шыю ручкамі і соладка задрамаў.

Вось з таго разу і зразумеў памешчык, які страшны

чалавек ягоны парабак. Ён жа можа і без злога намеру такое зло ўчыніць, якое потым нічым не выправіш. Адправіў яго з двара і сказаў нібыта пры гэтым:

— Зла я на цябе, Хведар, ніякага не трымаю, таму і зямлёю надзяляю. Якою — я ўжо не вінаваты. Сам працуй, сам яе лашчы... Вось такая мая воля. Бывай здароў, парабак...

Надзяліў ён Хведара зямлёй якраз у той мясціне, дзе сёння наша вёска ляжыць. Ракіты тут было! Божачкі! Ці то чэрці ў ёй сваё гняздо звілі, ці то спецыяльна насеялі. Ох і памучыўся Хведар, пакуль неяк на хлеб у такім пустым месцы выбіўся. Не адзін год, не адну вясну і восень высякаў і выкарчоўваў благія дрэвы. Калі ж працаваў, то пастаянна толькі гаварыў: «Ой, ракіта, ракіта, за што ж ты супраць мяне ўжыта?!»

Адтуль потым людзі і паселішча назвалі ды крыху перайначылі на свой лад — Ракіні.

## СМОЛІЧЫ

Тут, мае дзеткі, цікавая прыгода прыключылася. Каб жа толькі да нейкага стагоддзя яна сягала сваімі каранямі, то і нядзіўна было б. А то ж не, цягнецца ажно некуды ў тую часіну, калі Усявышні ствараў Сусвет, рабіў зямлю, ляпіў мужыкоў і паноў, выпускаў на волю жывёл ды птушак розных. Даўней то часта пра такое распавядалі. Пасядуць дзе-небудзь на прызбе вяскоўцы ў святую нядзельку ці ў якое іншае свята і давай гаманіць. Вось дзе каб хто пазапісваў... Там і гаварылі пра нашу вёску, пра балоты, якіх занадта многа было на нашай зямлі. Колькі легендаў тых і я добра памятаю, магу распавесці.

Ото ж, калі Бог стварыў зямлю, то ён з нячысцікам на першым часе сябраваў, нават вельмі блізка. Загадаў таму, і чорт прыпёр з дна марскога няблізкага жоўтага пясочку. Усявышні з яго пасля працёр саму маці-зямлю шырока, як кляновы ліст. Але ж нячысціку зайздросна было. Як гэта так? Ён пясочку прынёс, а нехта ім карыстаецца, і яму не дае.

А чорт тады не такі выгляд, як пазней, меў, а быў лебедзем белым. З тае часіны і кажуць людзі, што гэтая птушка на свет з яйка дужа агідная з'яўляецца, і ўжо потым, за добрыя паводзіны, ператвараецца ў прыгожую істоту. Дык вось, гэты нячысцік ухапіў

у дзюбу крыху пясочку і прыхаваў яго. А як толькі Усявышні адвярнуўся па сваёй патрэбе, то пачаў тварыць на зямлі тое, што яму жадалася. Адтуль і з'явіліся ўсялякія балоты, горы, балаціны, непралазныя гушчары. Адразу і не зразумеў Бог, што гэта сталася там, дзе ён стварыў раўнюткае поле. Прыгледзеўся і сказаў:

— Навошта ж ты панарабляў гэткіх вялікіх і высокіх гор? Ці ж можна будзе мець нейкую карысць з балотаў, дзе дрыгва хлюпае-калышацца? Як жа тут людзям будзе гаспадаркі свае падымаць, сякім-такім набыткам разжывацца?..

А чорт, не быў бы ён чортам, і адказвае Усявышняму:

— Ай, Госпадзі, гэта толькі здаецца, што дрэнна будзе, цяжка працаваць. Я ж наадварот думаю. Цябе, канешне, усе прыгадваць і дзякаваць будуць, але ж мне хочацца, каб і маё імя не забывалі. Вось пойдзе, напрыклад, чалавек нейкі на такую крутую і высачэзную гару, з апошніх сіл будзе караскацца і прамовіць паціху: «Дапамажы, Божа!» Але гэта яшчэ не ўсё. Некалі ж яму трэба будзе з гары спускацца. Вось тут ён і пералякаецца. Тут не толькі цяжка будзе, але і надзвычай страшна. Тады чалавек перажагнецца, мяне прыгадае і скажа абавязкова: «І чаго гэта чорт панёс мяне на такую вышыню? Чаго я тут забыўся? Лепей бы дома сядзеў ды адпачываў, а то пасклізнуся вось зараз і паляціць галава з плеч...»

Падумаў Бог ды пагадзіўся з такімі довадамі свайго суразмоўцы. Так з таго часу і стала на зямлі.

Гавораць, што змалу ў нашай мясціне нездарма пачалі здабываць, і звязана гэта таксама з нячысцікамі, з іхнімі праступкамі перад Усявышнім, з пакараннем, якое засталося на стагоддзі.

Жыў-быў адзін анёл побач з Богам на самым высокім небе. Але ленаваты быў, не надта стараўся рабіць тое, што яму загадвалі, усё выкручваўся, каб хтонебудзь іншы за яго гарбаціўся. Тады Усявышні, колькі разоў паспрабаваўшы яго выправіць і заўважыўшы, што нічога не дапамагае, ухапіў гэтага анёла за чуб і скінуў на зямлю, якраз туды, дзе адвечныя балоты стаялі ды камары з усялякім гнюсам лёталі.

А там ужо жыў самы галоўны сярод нячысцікаў — Люцыпар. Галоўным ён крыху пазней стаў, а тады сам жа толькі існаваў, і сумна яму, канешне, было,

самотна незвычайна. Убачыў, як нехта гопнуўся ў балота, і хутчэй туды кінуўся. Прыбег — ажно і сапраўды, валтузіцца ў гразюцы нехта мурзаты і валасаты. Як можна ласкавей запытаўся:

— Хто ж гэта такі да мяне ў госці прыйшоў? Каго гэта да мяне лёс паслаў?

А тая пачвара з балота, замест таго, каб гэтак жа ласкава і шчыра адказаць, як гыркне:

— А якая твая свінячая справа?! І хто ты сам такі?! Ваўкарэзіна дзікая!

Спалохаўся Люцыпар, адскочыў убок, мала чаго можна чакаць ад шалёнага стварэння.

— Дык хто ж ты такі? Чаго гэтак лаешся? Нічога благога я супраць цябе не меў, хацеў толькі пазнаёміцца...

— Пазнаёміцца, пазнаёміцца,— ужо больш паблажліва перадражніла незнаёмая істота,— анёл я з неба.

— А чаго ж ты тут апынуўся?

— Чаго, чаго, Богу нечым, мабыць, не дагадзіў, вось ён мяне і лёпнуў у балота,— ужо заплакаў былы нябесны жыхар.

Люцыпар узрадаваўся. Гэта ж ён быў толькі адзін, а цяпер, удваіх, бяды-гора яны прынясуць куды болей. Пасябравалі за колькі дзён, ды ўсё роўна сумна. Тады былы анёл і гаворыць:

— Ты ж з Усявышнім у добрых адносінах?

— У неблагіх.

— То папрасі, каб яшчэ каго да нас, хоць аднаго, скінуў.

— А што, справу кажаш,— захапіўся і Люцыпар. Борздзенька пабег да высокае гары, ускараскаўся на яе і, забачыўшы Бога, пачаў у яго прасіць-маліць саслаць на зямлю якую істоту яшчэ, каб весялей стала. Паглядзеў Усявышні на Люцыпара і вырашыў дапамагчы. Вярнуўся да свае хаціны, узяў там бутэлечку з чароўнай жывой вадой і пусціў кропельку — адразу ўзнік яшчэ адзін чорт, ды такі прыгожы і вясёлы, што Люцыпар ажно ў ладкі запляскаў:

— Яшчэ, яшчэ...

— Хопіць табе, нячыстая твая душа,— узлаваўся Усявышні,— бяжы дамоў і сядзі ціха, а то пракляну!

Паджгаў Люцыпар у балота, а новы жыхар за ім прыпусціў. Сабраліся ўжо ўтраіх і давай галёкаць, толькі багна пад капытамі іхнімі вухкае-стогне.

Вечарам, калі добра натаміліся, прыселі адпачыць ля лазовага карча і далі ўзлёт думкам, былы анёл і гаворыць:

— Вось добра было б, каб нас на зямлі ў кожным балоце, у кожнай балаціне ў дзесяткі разоў болей было! Толькі крыкні-свісні, а табе ўжо твае браты адгукаюцца! Толькі папрасі чаго, ці загадай — у адзін момант дапамогуць і ўсё выканаюць! Ніякі вораг тады не страшны, ніякаму зласліўцу падпарадкоўвацца не будзем!

Малады чорт ажно завішчаў ад радасці і заляпаў хвастом, тым самым выказваючы самую высокую ступень задавальнення.

Люцыпар паважна, як і належыць старэйшаму, мовіў:

— А ніякай цяжкасці ў гэтым няма...

Астатнія двое так і ўтаропіліся ў яго, што б гэта азначала?

— Я кажу, што ніякай цяжкасці няма, бо бачыў, куды Бог тую бутэлечку з чароўнай вадой паставіў. Калі так ужо трэба нам, браты родныя, то дачакаемся цемры і рушым на высокую гару, а там выкрадзем бутэлечку і наплодзім сабе сваякоў. Толькі і бяды тае. Зараз трэба адпачыць добра, сілы набрацца, бо заданне складанае, дарога цяжкая чакае нас ноччу.

Паляглі нячысцікі, жываты свае лахматыя павыставілі, але не спяць, разважаюць, колькі войска, колькі іншых нячысцікаў створаць, каб ні ад каго не залежаць, каб нікому не падпарадкоўвацца. Ледзьве дачакаліся тае часіны, калі туман сівець над балотамі пачаў. Сабраліся хуценька і рушылі ў далёкую дарогу. Люцыпар — наперадзе, а тыя, два, за ім.

Люцыпар палез на самы верх і знайшоў тую бутэлечку. Прынёс да сваіх падначаленых і пытаецца ціха:

— Колькі рабіць будзем?

— Давай з усяе вады...

— Бог празнае і раззлуецца.

— А чаго нам тады баяцца, калі наша войска будзе мацнейшае?

І ўгаварылі-такі свайго галоўнага, з усяе вады напладзіў ён чарцей. Глянулі тыя і за галовы схапіліся — гэта ж трэба, столькі нячысцікаў атрымалася! Нібы жыта густое пад ветрыкам калышацца, так і шэрагі войска іхняга стаялі.

Засмяяўся Люцыпар:

— Зусім іншая справа! Зусім іншая! Цяпер і саперніка нам ва ўсім свеце няма!

— Як гэта няма? — усхадзіўся былы анёл.— А Бог? Ты што, забыўся, колькі крыўды ён нам прычыніў? Выклікай яго на бой!

Усявышні ў той момант спаў, ні пра што не думаючы, ды падалося яму, што нешта не тое адбываецца навокал. Расплюшчыў вочы і застагнаў ад адчаю:

— Што ж я нарабіў?! Чаго ж не захаваў сваю ваду добра?! Цяпер вунь якой брыдоты Люцыпар напладзіў! Гора мне!

А Люцыпар ужо не палохаецца, у адкрытую гукае:

— Выходзь на бой! Што, можа, спалохаўся, ці сілы нестае? То аддавай сваё царства за так!

— Ну, за так ты ў мяне болей нічога не атрымаеш,— азваўся Бог,— цяпер я ўжо табе добра адплачу, каб да дзесятага калена дайшло!

У гэты самы момант, калі Люцыпар пагражаў Усявышняму, здалёку нешта загурчэла-затрашчала, заблісকацела. Галоўны нячысцік зацікавіўся:

— А што гэта такое?

Бог не стаў хавацца:

— Войска маё з месца рушыла, зараз тут будзе!

— Цяпер пабачым, чый верх будзе!..

— Цяпер пабачым!..

Толькі так Бог адказаў, гром і бліскавіцы як загрымелі, заблісkалі, сталі перуны шматлікія страляць — страх! Усё неба дазвання скалыхнулася, затраслося, дык чэрці і пападалі, куды каторы: хто ў балота, хто ў ваду, хто ў лес, хто ў поле — куды папала. У паветры моцна засмярдзела смаленым і паленым.

Сядзіць Люцыпар са сваімі найбліжэйшымі сябрамі ў балоце, трымціць пад карчом і радуецца, што неяк жывому ўдалося вырвацца. А з неба голас магутны гучыць:

— З гэтага часу толькі ў балоце будзеце жыць! Толькі там смалу варыць, ваду да яе вазіць, усялякімі грэшнікамі запраўляць! Калі дзе ў іншым месцы каторага напаткаю, то да смерці ўпалюю!

З таго дня Люцыпар там і стварыў сваё котлішча. Чэрці ўзяліся смалу вазіць, вогнішчы паліць ды ўсялякіх зладзеяў ці злыдняў да сябе на працу прыцягваць. Потым, калі балота сталі асушваць, людзі бліжэй сяліцца пачалі. Самі смалу выраблялі, дзёгаць, а назва засталася старая, можа, яшчэ ад чарцей — Смолічы.

# ТРАЯНАВА

Вёска такая ўтварылася надта даўно, бо ніхто і не ведае дакладна, колькі гадоў назад.

Было ў аднае маці тры сыны. Што зробіш, не ўсё атрымліваецца, як жадалася, таму і ў яе так выйшла: двое былі разумныя і прыгожыя, а адзін непрыгожы, і, што горш за ўсё, не такі хітры і практычны, як першыя. Плакала маці, гледзячы, як над яе малодшым суседскія дзеці ды і самі браты насміхаліся. Выдумлялі на яго абы-што, прыплятала такое, чаго хлопец гэты ніколі ў жыцці не рабіў і зрабіць не мог.

Звалі яго Змітрыкам. Малое дзіця і тое магло пакрыўдзіць гэтага хлопца. А ён, здавалася, і ўвагі не звяртаў, не крыўдаваў на зневажальнікаў, да ўсіх быў аднолькава ласкавы і ўважлівы.

Гэтак бы, можа, доўжылася не год і не два, а да канца жыцця, каб не выпадак, які і дапамог усё расставіць на свае месцы, паказаць, кім у сапраўднасці былі браты Змітрыкавы і кім з'яўляўся ён сам. А адбылося вось што.

Недзе за далёкімі морамі, за сінімі горамі, за густымі лясамі і за жытнёвымі палямі пасяліўся здаравенны цмок. Ды каб толькі пасяліўся, а то ж пастаянна лётаў над вёскамі і гарадамі і патрабаваў ахвяр. А калі не давалі, то без дазволу хапаў ды імгненна знікаў. Колькі крыві ён павыпіў — цяжка сказаць, але на ўсёй тутэйшай зямлі не было ніводнага больш-менш буйнога паселішча, дзе б цмок не ўчыніў нейкага злачынства. Мінаў пакуль што малыя вёскі і хутары. Можа, пакідаў іх на потым, а можа, думаў, што там яму асабліва не будзе чым пажывіцца.

Так тая вёсачка, дзе жыла маці з трыма сынамі, апынулася ўбаку ад страшных падзей. Але аднаго разу і сюды дайшла чутка пра тое, што ў добрага памешчыка, які жыў не так ужо і далёка ад іх, цмок украў прыгажуню-дачку. Бацькі, ведама ж, убіваліся ад гора, а ўлічваючы тое, што прыгажуня была адзіным дзіцем, то і ўявіць нават цяжка, якое гэта было гора для пана з жонкай. Як толькі ні спрабаваў ён вызваліць дачку — нішто не дапамагала. Тады бацька адчаіўся і аб'явіў: аддасць усё, што папросіць, таму, хто выратуе ягоную прыгажуню.

Сабраліся разумныя браты на дапамогу ісці, ды і чаго ўжо там хавацца — разбагацець такім чынам

спадзяваліся. Маці дала ім з сабою ежы на тыдзень, і яны падаліся з хаты. Ідуць браты, ідуць, прытаміліся і селі адпачыць ды перакусіць, каб потым далей кіраваць. Толькі селі, ажно падыходзіць да іх нейкі дзядок старэнькі, невялічкага расточку, трасецца ўвесь ад бяссілля. Абапёрся ля іх на кіёчак і гаворыць:

— Хлопчыкі, можа, закурыць дасцё?..

Пераглянуліся браты. Што яшчэ за ліха, ледзьве стаіць, а курыць просіць? Махнулі рукамі, каб далей ішоў, бо не да яго ім, маўляў:

— Няма нам, старэча, калі з табою няньчыцца. Ідзі сваёй дарогай, бо як дамо ў каршэнь, то доўга яшчэ дым з вушэй валіць будзе.

Дзядок не пакрыўдзіўся, адно толькі мовіў вясёлым падарожнікам у адказ:

— Нічога ў вас не атрымаецца, галубкі! Нікога вы не знойдзеце і не вызваліце, і ўзнагароды вам, адпаведна, няма адкуль чакаць!

— Ідзі, ідзі! Яшчэ і пагражае! Ледзьве хліпае на гэтай зямлі, а таксама напалохаць спрабуе!

Тым часам, пакуль браты кіравалі нібыта да злога цмока, Змітрык сядзеў сабе дома. Маці перажывала за старэйшых сыноў, а таму часта падыходзіла то да акна, то на вуліцу выбягала. Малодшы яе супакойваў:

— Усё добра будзе, мама, усё выйдзе як нельга лепей... Калі да вечара не вернуцца яны, то раніцай я пайду шукаць і паннaчку-прыгажуню, і сваіх братоў.

Горка заплакала гаспадыня ў адказ на такія словы: супакойваць бярэцца, а сам не ведае, што гаворыць. Хіба ж некалі недзе чулі, каб такі хлопец, ды яшчэ і на галаву не надта здаровы, цмока ўсемагутнага перамог?

Не дачакаліся яны братоў да вечара, не з'явіліся хлопцы і ноччу. Прачнуўся раніцай, а матуля галосіць голасам, сэрцам сваім адчувае, што нешта адбылося з імі. Устаў тады малодшы і кажа:

— Збірай мяне, мама, пайду я супраць цмока таго ваяваць! Есці давай у торбу, вады вазьму ў якую бутэлечку і пакірую! Ведаю, дзе ён можа жыць! Чуў ад старцаў, якія многа па зямлі падарожнічалі, што ён за Чортавымі азёрамі, за іхнімі балотамі сядзіць, там і людзей трымае, якіх у палон пахапаў!

— А як жа ты, сыночак, яго пераможаш? Ён жа цябе не пашкадуе, не злітуецца над табою. Галаву адсячэ і вокам не міргне!

— Прыдумаю што-небудзь, не дамся цмоку ў рукі лёгка. Не думай, я таксама крыху мазгамі параскінуў. Маю свой план і думаю, што давяду яго да канца...

Склала маці сыну торбачку, пацалаваліся на развітанне, і ён пайшоў. А гаспадыня яшчэ больш плакаць-галасіць пачала: ведала, і гэты пайшоў і не прыйдзе, але ўтрымаць яго было немагчыма.

Змітрык ішоў доўга, амаль да самага вечара, імкнуўся як мага хутчэй дайсці да клятага балота. Стаміўся і прысеў перадыхнуць. Толькі сеў і разоў колькі азірнуўся, бо трэба ж было і пра начлег падумаць, ажно ўзнік перад ім, нібы з-пад зямлі, дзядок. Сівы такі ўвесь, згорблены, барада да калень. Абапіраецца на кіёчак, трасецца і гаворыць надзіва бадзёрым голасам:

— Чалавечку, ці не дасі ты мне закурыць? Ужо колькі дзён без табакі хаджу, ажно ў роце смыліць. Каб хоць раз-другі зацягнуцца...

А Змітрык не спяшаецца адказваць, не спяшаецца старому рэзка адрэзаць, уважліва яго разглядвае. Потым выцягнуў стомленыя ногі і кажа:

— А я не куру, дзядулька, таму і дапамагчы нічым не магу. Вось калі б перакусіць, то тут будзь ласкавы, сядай бліжэй, мне матуля паклала ў торбачку нешта. Падсілкуемся і разыдземся, куды каму трэба...

Старэнькі павагаўся крыху, але потым прысеў побач, і яны разгаварыліся.

— А куды ж ты, чалавеча, кіруеш?

— Ды гора ў мяне вялікае здарылася, дзядулька,— адказаў Змітрык.

— Якое ж?

— Ды цмок украў у нашага суседа-памешчыка прыгажуню-дачку. Яе пайшлі шукаць мае браты і не вярнуліся. Матуля плача-заліваецца, таму я пайшоў іх усіх адшукваць. Гаварылі мне, што цмок за Чортавымі азёрамі жыве. Мне б толькі дабрацца туды, а там ужо разбяруся, што да чаго! А вы куды, старэча, кіруеце? Нешта ж і вам дома не сядзіцца, вунь куды прыджгалі, на ноч гледзячы!

— Ды таксама, чалавеча, ліха-бяда з хаты выгнала. Не хадзіў бы па лясных дарогах, не прабіваўся б праз пушчы і бары. Маю ўнучку цмок той бязлітасны ўкраў яшчэ, можа, гады два назад. Няма цяпер мне жыцця, яна ж у мяне адзінай радасцю была, сонейка маё яснае... Вось блукаю і я, шукаю яе, ці не знайду дзе

сляды. Даведаўся дакладна, што і як трэба рабіць, але ж сам бачыш, сілы нестае ў маіх старых руках, няма той моцы, якая ў маладосці была...

— То я вам дапамагу, ад усёй душы дапамагу,— супакоіў Змітрык,— вы толькі падкажыце, што ды як рабіць. Не сумнявайцеся, усё зраблю належным чынам.

— Добра, хлопча, падкажу, бо сам не здолею, а болей прасіць няма ў каго. Сам разумееш... Эх, каб сіла ў мяне была! А так...

— Не хвалюйся, дзедку, ты кажы, што трэба рабіць.

— Вось бачыш там, пасярэдзіне лесу, узвышаецца высачэзны дуб?

— Так, бачу.

— Дык побач з ім ляжыць яшчэ больш таўшчэразны. У яго ўбіты вялізны клін. На дне расколіны ляжаць залатыя чырвонцы. Калі падыдзеш да гэтага дуба, то пачынай крычаць, колькі многа золата ты знайшоў. Цмок не вытрымае, абавязкова прыляціць. Я ў гэтым не сумняваюся. Ён і на менш значныя багацці прылятаў, крылаў за сабою не адчуваючы. Пасунецца за золатам, на цябе адразу і ўвагі звяртаць не будзе, а ты тым часам выбівай клін абухом. Ушчэміш яго за бараду і патрабуй, каб вярнуў нашых палонных ды людское дабра пааддаваў. Нічога іншага не слухай, не шкадуй яго, лупі па спіне колькі сілы маеш. Хай крычыць, хай плача-стогне, ён не такога нарабіў...

— Добра, дзедку, усё зраблю, як ты мне параіў. Ты не ідзі за мною, а тут лепей чакай. Мала што можа здарыцца. Пачуеш, калі можна падысці, тады і кіруй да мяне...

Сказаў так Змітрык і пайшоў, каб загадзя ўсё як мае быць падрыхтаваць.

Раніцай па ўсім навакольным лесе разнёсся магутны крык:

— Ой, колькі ж тут золата! Ой, колькі ж тут багацця! Ой, як жа мне яго пабраць?!

Праз колькі часу залапацела нешта, затрашчала, і на паляну ля дуба шугнуў вялізны і касматы цмок. Утаропіўся на хлопца, а потым запытаўся:

— Дзе яно?

— Ды ў дубе, хіба ж не бачыш?

— Не...

— А ты паглядзі ўважліва!

Нахіліўся тады цмок да расколатага дрэва і давай узірацца, а Змітрык адным махам і выбіў клін абухом.

Зашчыміла калода бараду цмока, заверашчаў ён, закруціўся, але хлопец не спачувае, а ўхапіў цурбалак і давай пярэсціць злыдня. Нават не слухаў спачатку, што той абяцаў, прыслухаўся толькі, калі прысеў адпачыць.

— Адпусці мяне, чалавеча! Колькі хочаш табе золата-срэбра адсыплю! Зраблю сваім першым намеснікам! Жыццё толькі не забірай!

— Адпусці спачатку ўсіх палонных. Каб мае браты родныя, суседка-прыгажуня, дачка суседзяў нашых, унучка дзедава праз момант тут стаялі жывыя-здаровыя!

— Добра! Толькі адпусці!

— Тады пабачым!

Зашумела нешта, застагнала, і на паляне з'явілася мноства людзей, сярод якіх Змітрык убачыў і тых, за каго прасіў. Закрычалі бедныя, загарлалі:

— Забі яго, хлопча! Не выпускай жывым!

Узмахнуў тады Змітрык цурбалкам і як чомкнуў цмока па галаве, дык той дух адразу і выпусціў.

Сабраліся ўсе і пайшлі па хатах, а дзед сваю ўнучку замуж за Змітрыка аддаў. Прыйшлі дахаты, маці нарадавацца не можа. А болей за ўсіх задаволены быў памешчык, да якога дачка вярнулася. Стрымаў сваё слова, аддаў Змітрыку ўсё, што той прасіў. А прасіў хлопец зямлі, каб на ёй весці гаспадарку. Вось і сталі там жыць маці з сынамі ды з нявесткамі, а раз сыноў было трое, то і новую вёску назвалі Траянава.



# КЛЕЦК

Жыў на гэтай зямлі даўным-даўно люты князь-крывасмок. Жорстка распраўляўся з паспалітымі. Варам людзей абварваў, валасы на галовах ды на барадах уласнаручна вырываў, жывых у мяшкі скураныя зашываў ды сабакам, спецыяльна для гэтага ў замку гадаваным, у загон кідаў. На кавалкі такога няшчаснага раз'юшаныя істоты рвалі, толькі і паспее зрабіць, што перад смерцю немым крыкам-стогнам зайсціся. Можа, ахвяры гэтыя і не плакалі ці вылі ад болю, а крычалі-праклінялі вылюдка ў чалавечым абліччы за тое, што ён над імі вырабляў.

Так павялося і доўжылася не год-два, а цэлыя дзесяцігоддзі. Чуць што, а князь ужо верашчыць немым голасам сваім верным здаравенным цівунам, якія норавам і паводзінамі амаль нічым не адрозніваліся ад гаспадара:

— У клець яго! На ваду і на хлеб! У клець! Згнаіць! Жывога замураваць, каб ведаў, як на мяне з нянавісцю пазіраць!

Схопяць бедалагу і калі не закатуюць адразу да смерці, то ў падзямеллі згнояць. Не бачыць яму ўжо

болей роднай мясцовасці, сямейкі мілай і ласкавага сонейка.

Жыхары з наваколля баяліся нават ноччу са сваіх хацін выходзіць, каб не патрапіць на вочы гэтаму ваўкалаку, што, здавалася, і не спаў, каб хутчэй знайсці новую ахвяру для здзекаў. Яны і празвалі яго Клецак ад таго жахлівага слова «клець».

Здаралася, што бацькі, ідучы на працу да бязлітаснага прыгнятальніка, цалавалі дзяцей, плачучы, нібы ішлі на смерць. А яно і на самай справе так адбывалася даволі часта, калі маці ці бацька не вярталіся з поля або з лесу. Іх прама адтуль валаклі ў страшнае падзямелле, дзе жудасная пачвара нібыта пажырала ўсё новыя і новыя ахвяры. Здавалася, што нават камяні і цагліны, з якіх былі складзены замкавыя муры, пачырванелі ад крыві людзей, якія знайшлі недзе там сваё апошняе прыстанішча.

Здавён казалі нашы продкі, што той, хто да ніжэйшых высока ставіцца, здзекуецца з іх, катуе і забівае, той паступова ператвараецца ў звера. Так і князь. Ужо сівым стаў ад пражытых гадоў, але нораў свой не перайначыў, наадварот, яшчэ больш страшным зрабіўся. Відаць, ужо адчуваў, што хутка і яго зямля прыбярэ, таму і лютаваў у апошнія гады, каб дацца людзям як мага болей у знакі. Усё наваколле нібыта вымерла. Нават птушкі-весялушкі і тыя маўчалі, не азываліся сваімі звонкімі галасамі. Яны таксама, мабыць, баяліся, што могуць і за гэта адказаць перад людажэрам. Звяры не выбягалі з лясоў да вадапою, а толькі цішком пад покрывам ночы прабіраліся да лясных ручаінак і азёраў.

Людзі хавацца-то хаваліся, але знаходзіліся і адчайныя галовы, якія не надта баяліся страціць уласнае жыццё для таго, каб прыкончыць злачынцу. Сядзелі хлопцы ў шматлікіх засадах, пільна сачылі за тым, кудою ён ездзіў, дзе знаходзіўся. Пра ўсё даносілі віжы-лазутчыкі, пільнавалі яго. Толькі дарэмна гэта рабілі, бо з вялікай і надта моцнай аховай ездзіў Клецак. І ў яго, адпаведна, былі свае верныя людзі па вёсках ды па мястэчках. Перш чым куды ехаць, ён спачатку даведваўся, што там адбывалася, ці не з'яўляліся якія-небудзь ліхія валацугі.

Аднаго разу ён усё ж пралічыўся і нарваўся на засаду, ды не пашанцавала нападаючым — прыспела дапамога да князя, якую прывёў нехта са слуг. Адбіліся

яны. Страцілі каля двух дзесяткаў чалавек на месцы бою, але самога Клецака вынеслі хуткія коні, выратавалі яго змучаныя жывёліны.

Доўга пасля гэтага выпадку нікуды не вылазіў са свайго логава гаспадар страшнага замка, але затое гайдукам даў поўную волю, і тыя ўжо стараліся як мага лепей паказаць сябе ў вачах валадара. Да таго давялі бяспраўны народ, што да неба пачалі людзі звяртацца, каб ужо ці іх забрала да сябе, ці пачвару гэтую з чалавечым абліччам перастала па зямлі насіць. Ды толькі неба не жадала забіраць да сябе бязвінных працаўнікоў і тым самым выратаваць ад здзекаў, а Клецака і яно, відаць, баялася пазбаўляць жыцця, бо не ведала, куды яго можна будзе адаслаць пасля смерці. Нават самае гіблае, дрэннае месца ў апраметнай было б для яго раем за ўсе здзейсненыя на зямлі грахі. А ён нібы адчуваў усё гэта і па-ранейшаму рабіў, што толькі ўздумвалася ягонай старэчай галаве.

Але ўсё-ткі, нарэшце, прыйшло і на яго пакаранне смяротнае. І вось як гэта здарылася-адбылося.

Неяк заехаў князь са сваёй аховай у адну са шматлікіх вёсачак, якая яму належала, і там, сярод упаўшых ніцма вяскоўцаў, здолеў разглядзець дзівосную прыгажосць дзяўчыны Настулі. Як убачыў ён яе, так і ўсхадзіўся: ажанюся, дый годзе! Толькі міргнуў гайдукам. Тыя ў момант вока выхапілі Настулю з натоўпу і панеслі да княжацкага экіпажа. Густы пыл закурыўся ззаду за хутка ад'язджаючымі вершнікамі. Маўчалі людзі, панура гледзячы ўслед, ды матуля ціхенька хліпала, бо баялася завыць уголас, праклінаючы сваю ліхую долю. Кожны спачуваў беднай жанчыне, якая пазбавілася адзінага суцяшэння — дачкі-працаўніцы, але рабіў гэта глыбока ў душы, каб ніхто, крый Божа, не данёс пра гэта князю, інакш — смерць!

А ў замку, тым часам, князь весела памуркваў матыў толькі яму аднаму вядомай песні і нават, здавалася, усміхаўся, што ўвогуле не пасавала да ягонага крумкачынага твару. Ледзьве раніцы дачакаўся «жаніх». Выклікаў слуг і загадаў прывесці да яго дзяўчыну. Калі тая, баючыся, пераступіла парог багата ўпрыгожанага і абстаўленага пакоя, яе сустрэў гаспадар скрыпучым голасам, які не абяцаў нічога добрага:

— Праз два дні, міленькая, наша вяселле. Табе пашыюць самую што ні на ёсць прыгожую вопратку. Падрыхтуйся як след, вянчацца будзем у нашай цар-

ве. Вось так... Няма чаго палохацца. Няма чаго... Усё зразумела, ці нешта не так?

Але дзяўчына ў адказ толькі залілася горкімі слязьмі ды бухнулася на калені перад Клецакам:

— Не губі мяне, княжа! Не губі, прашу цябе, яснавяльможны! У мяне суджаны ёсць, я яго кахаю. З ім мы пабрацца збіраліся. Восені толькі чакалі, пакуль усю справу, і сваю, і княжацкую, па гаспадарцы паробім, каб перадыхнуць можна было. У чым я так правінавацілася? За што на мяне гэткае пакаранне неба спаслала? Няўжо багатай паненкі для вас не знайшлося, каб з мяне насміхацца? За што, за што, княжа?..

Тут сярдзіта зароў уладар замка:

— Каханы?! Ды я яго сёння ж у клецьпасаджу, замурую там жывым! Хто ты такая, каб мне пярэчыць? За мяне пойдзеш, і ўсё на гэтым! — грохнуў ён абцасам аб бліскучую падлогу.— Рыхтуйся! Не ўздумай чаго дурнога ў галаву сабе браць, бо ўсё роўна па-мойму будзе! Толькі так, а не інакш!

— Не пайду я за цябе, князь,— ужо гучна вымавіла Настуля і ўстала з каленяў. Твар яе ажно гарэў ад абурэння і нянавісці.— Не пайду, хоць забі!

Клецак ажно рот разявіў ад нечаканасці і смешна торгаў ніжняю губою. Потым яго прарвала, і ён ажно завішчаў:

— Пойдзеш!

— Не, лепей у сыру зямлю, чым за цябе, кат!

— Ты што, не ведаеш маёй сілы і магутнасці?! Ты не ведаеш, што я ўсё на свеце магу? Ды я нагою тупну і зямля расступіцца! — зароў Клецак і штосілы бухнуў нагою. І дзіва нябачнае! Дзяўчына ўмомант тут жа ператварылася ў невялічкую птушачку і беспярашкодна паляцела ў закратаванае акно, а князь важкім каменем пайшоў на дно ямы, што імгненна залілася вадою, толькі і паспеў нешта незразумелае прабулькаць. Да раніцы і замак ягоны зямля праглынула...

Доўга яшчэ потым людзі яму глыбокую на тым месцы называлі Клецакаваю. З цягам часу тут горад стаў, таксама Клецак, а потым ужо Клецк.

Вось адкуль такая назва дзіўная з'явілася, мае дзеткі. Не ведаю, праўда ўсё, што мне расказвалі, ці не, але я і вам распавяла, каб і вы ведалі ды каму іншаму яшчэ давялі.

# СІНЯЎКА

Даўно гэта было, яшчэ ў тыя старажытныя часы, калі пад прыгонам усе жылі-пакутавалі, ніякага ні права не мелі, ні голасу. Што пан скажа — тое і святы закон, не пераступіш яго і не абыдзеш, дзе ні ступіш — нешта абавязкова парушыш. Там табе і выб'юць бубну на спіне, там табе і пакажуць, дзе тваё, а дзе адвеку панскае!

Так і жылі нашыя продкі, так і пакутавалі, бо выйсця ніякага не ведалі, людзей разумных ды хітрых, смелых ды адважных не знаходзілася, якія б праўдзе навучылі, падказалі б, як ды што рабіць. Адно пакаленне паміралa за другім, старыя ішлі ў магілу, цягнучы за сабою маладых, і ніхто ніколі слова наперакор панам не казаў. Жылы з сялян цягнулі, кроў пілі, а яны ўсё роўна маўчалі, нібы змярцвелыя, быццам бы ў іх ні голасу не было, ні сіл, каб хоць крыкнуць на ўсю моц.

Нашы мясціны падпадалі пад валадарства вялікага і магутнага князя Радзівіла. Колькі ўжо ў яго ўсялякіх багаццяў і маёнткаў, зямель і палацаў было, то, можа, ні ў кога з цароў ці каралёў вяльможных такога не ставала. Самім каралям гарады дараваў. Захоча паздзекавацца з каторага, у якога карані не надта радавітыя, і папікне такім чынам. Вазьмі, маўляў, вазьмі ды памятай пра маю шчырасць, бо ў цябе ж усё роўна такога няма і не будзе, як у мяне. Захоча, то ў самага багатага пана ці памешчыка, князя ці якога іншага магната, які таксама над беднымі панаваў, жонку ці каханку звядзе і да сябе ў ложак прысуне. І нічога не зробіць абражаны муж ці там палюбоўнік, бо ў Радзівіла войска было столькі, што не толькі на нейкую прыватную асобу маглі страху-пераляку навесці, але і на любога валадара дзяржавы. Вось так, людцы, і цягнулася, вось так і доўжылася тут жыццё.

Гаварылі, быццам бы сонейка яснае і тое бокам абыходзіла ўладанні гнявілівага магната, баялася, можа, а можа, проста не жадала звязвацца з дурнем, які мог што брыдкае ўдумаць ды ўчыніць.

Радзівіл нават летам прымушаў сваіх сялян ды шляхціцаў зіму рабіць. Збіралі, зганялі людзей, і яны пасыпалі дарогу на шмат вёрстаў соллю, якая тады была на кошт золата. Стаіць чалавек абапал яе, аблізваецца, бо, можа, ад нараджэння ежу несалёную сёрбае, а ўзяць хоць крышку баіцца, таму што, калі

заўважаць, адразу ж адлупцуюць і ў пакражы абвінавацяць.

Вырашыў гэты самы Радзівіл, на іншых багацеяў гледзячы, а можа, каб яшчэ больш вылучыцца сярод іх, завесці сабе пародзістых сабак. Каб жа там аднаго ці двух, а то ж, можа, сотні тры ці чатыры. З усяго свету куплялі і звозілі ў ягоныя маёнткі ды палацы. Муштравалі на любога звера: і на буйнога, і на дробнага, і на птушку, і нават... на людзей. Так, мае каханенькія, і на людзей. Я не абгаварыўся, бо далей наша гамонка якраз пра гэта і пойдзе. Распавядаць буду пра тое, як узнікла наша Сіняўка і чаму яе так назвалі. Казалі, колькіх нешчасліўцаў раз'юшаныя людажэры на кавалкі парвалі! Ох, дай ім, Госпадзі, хоць пазамагільнае шчаслівае жыццё! Даўно надта гэта было, але трэба, каб там ім добра жылося, бо душы іхнія нявінныя былі!

Князь, калі ўвайшоў у ахвоту, то без сабак ужо і далейшага жыцця не ўяўляў. З імі разам спаў, з дзесятак, нібы цялушкі, бегалі па палацы, з імі на адпачынак шпацыраваў, а пра паляванне і гаварыць няма чаго. Напярэдадні вялікай зборкі і без таго злых ганчакоў не кармілі, можа, двое-трое сутак, і яны станавіліся настолькі раз'юшанымі, што ўсё жывое навокал гатовы былі зубамі рваць і глытаць. Асабліва былі вымуштраваны на крык ці на стогн. Здарыцца, што якога чалавека падраняць ці злёгку пакусаюць і гэты небарака, сам таго не ведаючы, крычаць пачынае, то такога разарвуць і паядуць ягонае мяса.

Аднаго разу Радзівіл сабраўся на паляванне і запрасіў надзвычай многа вяльможных гасцей. Так ён рабіў не кожны раз, а тады, калі знаходзіўся ў добрым настроі і хацеў паказаць сваім блізкім ды далёкім суседзям, які ён шчыры і бескарысны. Усё было, як і звычайна: старанна рыхтаваліся паляўнічыя, не менш старанна аглядалі і рыхтавалі ўсё загоншчыкі ці егеры, але асабліва круціліся і бегалі тыя слугі ды шляхціцы, якія былі прыстаўлены да сабак. Найвышэйшым эфектам на паляванні лічылася не забіць звера трапным стрэлам, а затравіць яго сабакамі. Каб бачылі і госці, і служкі, якія ганчакі ў Радзівіла, каб хвалілі і па ўсяму беламу свету разносілі княжацкую славу.

Служыў тады ў двары сярод шматлікіх слуг і падпанкаў просты сялянскі хлопец. Звалі яго Сінько, ці то Сынько. Ніхто зараз дакладна і не скажа. Адно толькі

дайшло да нас — што чалавек гэты быў надта добры і здаравенны. Мядзведзі і тыя, забачыўшы перад сабою гэткага асілка, пераставалі рыкаць пагрозліва, а нейк адразу нібы паблажліва пачыналі прасіць прабачэння на сваёй звярынай мове, бо адчувалі, што гэткі здаравіла ім добра намне бакі, натрэ вушы. Кажуць таксама, што нікога гэты асілак не пакрыўдзіў дарма, характар меў памяркоўны. Калі нехта яго спрабаваў зачапіць ці прыдрацца, каб якую бойку ўсчаць ці сілаю памерацца, то Сінько, пасміхваючыся, браў таўшчэзнае бервяно на адну руку і падкідаў яго, як саломінку, высока-высока. А пакуль яно ляцела, то хлопец паспяваў яшчэ сказаць свайму саперніку:

— Калі так падкінеш, то буду з табою барукацца, а калі не здолееш, то ўцякай лепей, бо адляпаю па азадку, што потым пыл не толькі з носа ляцець будзе, але і з вушэй!

Прамовіць так і падставіць пад падаючае бервяно другую руку. Тое слізгане і ўторкнецца ў глебу. Вядома ж, пасля такога ніхто ні барукацца, ні спрачацца не жадаў. Хвацкія ганарліўцы ці ўцякалі, ці хуценька пераводзілі гаворку на што-небудзь іншае.

Сабакі княжацкія і тыя хутчэй за ўсё не баяліся, а па-свойму паважалі здаравеннага чалавека за тое, што ён ніколі не адпускаў іх далёка ад сябе, глядзеў, каб разлютаваны звер не параніў якога з ганчакоў.

Радзівіл вельмі цаніў мужнасць і сілу Сінька. Узяўшы яго ў двор падлеткам, валадар павысіў свайго служку да старшага сабачніка і даверыў найбольш каштоўных і рэдкасных ганчакоў. А быў у князя вялізны, нібы вол, страшны, нібы ваўкалак, здаровы, нібы тур, сабака па мянушцы Бой. Яго кідалі на паляванні толькі ў тых выпадках, калі Радзівіл жадаў асабліва фарсануць перад сваімі гасцямі. І глядзеў за гэтым волатам сам Сінько, бо ніхто іншы не мог саўладаць з ганчаком.

Вось і ў той раз, калі ўсё сабралі, падрыхтавалі, то першымі на месца будучага палявання рушылі пешыя загоншчыкі, слугі ды людзі паспалітыя, якія коней не мелі і павінны былі да сігналу паляўнічага рога прыспець на месца.

Потым выбраліся самі госці і гаспадар з імі. Не спяшаліся надта, па дарозе разоў колькі супыняліся, балі закочвалі не на адну ноч. Ім-то не карцела ў полі ці ў лузе шчыраваць. А што столькіх людзей ад на-

дзённай працы адарвалі — пра гэта ніхто і не думаў.

Мясцовыя жыхары, якіх не прыхапілі на такую справу, уцякалі як мага далей ад нечаканых гасцей і паляўнічых, бо шматлікія конныя атрады насіліся па палях і лугах, па лясах і пералесках, усё вынішчаючы на сваім шляху. Трапіш разгарачаным коням на іхнім шляху — забывайся, як цябе клікалі.

У апошнім экіпажы ехалі Сінько з Боем. Магутны сабака ніяк не рэагаваў на тое, што адбывалася навокал, прызвычаіўся за доўгія гады свайго жыцця да такой справы. Яго жывёльны інстынкт падказваў яму момант пачатку палявання на звера, і тады ён адразу ж перайначваўся, змяняўся на вачах.

Гэткі ж спакойны і непарушны сядзеў побач са сваім сабакам і чалавек. Толькі ў вачах Сінька можна было заўважыць скруху і боль за тое, што адбывалася навокал. Не, ён шкадаваў не паноў і падпанкаў, якія панаціралі ўласныя азадкі ў сёдлах, а тых, каго адарвалі ад сем'яў і хацін, хто ішоў-плёўся на паляванне, не адчуваючы ніякай асалоды. Іх, бедалаг, можа, нават і не пакармілі, і адпачыць не далі. Але ад хлопца нічога не залежала, таму яму адно і заставалася — шкадаваць сялян.

Нарэшце дабраліся да ўмоўленага месца і заначавалі, каб з раніцы рушыць на ловы, развесяліць панскую кроў, разагнаць яе па жылах. Боя па загаду Радзівіла накіравалі на ноч у асобную хаціну, з якой перад гэтым выгналі ўладальнікаў. Сінько ўладкаваўся спаць на вуліцы, непадалёчку ад парога. Неўзабаве да яго перабраўся і Бой, які нібы адчуваў, што павінна было здарыцца нешта непрадбачанае. Заснулі кароткім і трывожным сном, а праз гадзін колькі ўжо штурхалі асілка князёвы слугі:

— Уставай, Сінько, уставай! Час прыспеў на паляванне выязджаць, валадар ужо паехаў з гасцямі! Спяшацца трэба, каб не запазніцца! Уставай!

Бой злосна гыркнуў, а Сінько толькі плюнуў на княжацкіх паслугачоў:

— Ні паспаць, ні адпачыць ад вас! Лезеце, як слата, у вочы!

Селі ў экіпаж і прыпусцілі даганяць астатніх. Дагналі, калі паляўнічыя былі ўжо ля лесу і займалі азначаныя для стральбы месцы. Хвілін праз колькі прагучаў недзе далёка-далёка паляўнічы рог, і лес адразу ж запоўніўся шматлікімі галасамі. Загоншчыкі

крычалі, верашчалі, свісцелі, галёкалі, стралялі, білі ва ўсялякія рэчы. Стваралася ўражанне, што нейкая нячыстая сіла ачнулася на світанні і рушыла некуды на новае месца жыхарства. Трашчалі кусты і дрэвы, вішчалі звяры і птушкі. Але стралкі пакуль маўчалі. Яны чакалі буйных звяроў, іх не цікавіла драбяза, якая, як заўсёды, уцякала наперадзе. Ведалі, што праз некаторы час з'явяцца значна буйнейшыя валадары глухіх лясных нетраў.

Нечакана пранёсся ціхі крык:

— Зубр! Зубр! Глядзіце пільна, зубр рушыў на стралкоў...

Яшчэ момант — і нехта не вытрымае, сарвецца. Але ў гэтым і была найвышэйшая асалода паляўнічага жыцця. Кожнаму хацелася праверыць сябе і думалася, што менавіта на яго вылезе з гушчару лясны асілак.

Хто яго ведае, чаму так адбылося, але зубр нарваўся якраз-такі на самога Радзівіла. Звер ішоў не спяшаючыся, нібы і не было ніякай небяспекі. Перавальваўся з нагі на нагу, супыняўся, прынюхваўся ці то прыслухоўваўся і кіраваў далей. Князь злаўчыўся і грохнуў з гакаўніцы. Зубр падскочыў, але не ўпаў, бо падскочыў, відаць, не ад смяротнага стрэлу, а ад нечаканасці. Хвілінку пастаяў і... рушыў, як ні ў чым не бывала, наперад. Страляць Радзівіл ужо не мог, бо не паспеў пераzарадзіць сваю стрэльбу, але ля яго стаіліся шматлікія слугі і палясоўшчыкі, якія, ахвяруючы ўласным жыццём, кінуліся б ратаваць свайго валадара. Князю ж карцела самому справіцца з асілкам, каб іншыя не падумалі, што ён нявопытны паляўнічы ці дрэнна страляе. Таму Радзівіл гыркнуў:

— Рагаціну мне!

Пералякаліся слугі — вяльможны гаспадар загадваў падаць зброю простых палясоўшчыкаў. Толькі загаду нельга было аслухацца, і ўмомант нехта працягнуў да бляску адшліфаваную рукамі рагаціну:

— Трымайце, вашамосць!

Радзівіл зрабіў колькі крокаў насустрач зубру і спыніўся, спрабуючы прызвычаіцца да гэткай простай зброі. Звер неяк занадта спакойна глядзеў на чалавека, які паўстаў перад ім. Потым рвануў з месца, рвануў надта хутка і імкліва для ягонага здаравеннага і магутнага цела. Пачуўся трэск, і князь узляцеў высока ў паветра, падкінуты здаравеннымі рагамі. Яшчэ

хвіліна і... яго б растаптаў звер, але ў гэты момант прагучаў нізкі голас Сінька:

— Бойка! Вазьмі яго! Ратуй князя, Бойка!

Спушчаны сабака рвануўся насустрач зубру і ўлупіў у яго што было сілы. Але збіць з ног, як гэта здаралася раней, зубра не здолеў. На падмогу Бою бег Сінько і ў руках трымаў толькі звычайны нож, што пастаянна насіў за халявай бота. У гэты ж самы час раздаўся шматногі тупат — уцякалі госці і слугі, падпанкі і палясоўшчыкі. Уцякалі, пакідаючы на волю лёсу свайго сябра і валадара, якому яшчэ хвіліну назад кляліся ў вернасці і адданасці.

Сілы змагаўшыхся былі прыкладна роўныя, калі не сказаць, што перавага ўсё ж была на баку раз'юшанага звера. Бой вісеў на хрыбце ў зубра, упіўшыся ў ягоную шкуру зубамі, а Сінько круціўся, стоячы на месцы, каб не быць лёгкай мішэнню для рагоў свайго саперніка. Круціўся і адводзіў зубра ад таго месца, дзе ляжаў паранены князь. Ужо і звер, і Бой, і асілак моцна стаміліся, але пакуль што ніхто не мог перамагчы.

Нечакана Сінько пасклізнуўся і ўпаў на спіну. Маланкай пранеслася думка, што не паспее падхапіцца, бо зубр ужо прыгнуў галаву і быў зусім побач. Ратуючыся, асілак неяк шмаргануў нажом у паветры, і аказалася, што зрабіў гэта надзвычай удала — перарэзаў зверу горла. І цяпер таму ўжо было не да паядынка, бо кроў лілася, нібы з бочкі, і ён з кожнай хвілінай траціў магутныя некалі сілы. Праз некаторы час зубр задрыжаў і ўпаў на калені, потым і ўвогуле перастаў хрыпець. Чалавек, хістаючыся, устаў і падаўся да Радзівіла. Князь ляжаў на баку і стагнаў, але калі ўбачыў Сінька, то спытаўся:

— Дзе Бой? Глядзі за ім!

— Ён тут, княжа, нічога з ім не здарылася, вось каб толькі цябе зубр моцна не пабіў...

— Я ўстану, глядзі Боя,— зноў паўтарыў Радзівіл.

Асілак пайшоў да паваленага звера і паспрабаваў вызваліць Боя, якога, падаючы, моцна прыдавіў зубр. Вывалак яго з-пад шматпудовага цела і жахнуўся: сабака быў моцна паранены, аказалася, што зубр паспеў ударыць яго рагамі некалькі разоў, а потым яшчэ і прыдавіць. Бой не скавытаў, ён, як і мужны чалавек, пераносіў боль цярпліва, ды Сіньку ад гэтага не было лягчэй.

Праз пару гадзін з'явіліся княжацкія паслугачы.

Радзівіла паклалі на насілкі і панеслі, а ззаду нёс на руках свайго вернага сябрука Сінько.

Калі князю стала лягчэй, ён адразу ж паклікаў да сябе чалавека-волата:

— Што, згубіў сабаку? — яшчэ з парога зароў на асілка.— Пусціў мяне па белым свеце? Куды ты глядзеў?!

— На цябе, княжа. Баяўся, што даб'е цябе зубр.

— Лухта ўсё гэта. Мае слугі навокал, як дубы, стаялі, яны не аднаго такога звера, а дзесятак-другі завалілі б...

— Паўцякалі твае слугі, валадар...

— Што ты тут яшчэ мне ў вочы хлусіш?

— Я не хлушу.

— То хто ж зубра забіў?

— Я.

— Ты?.. Чым?..

— Нажом, княжа.

— Нажом?..— і князь зайшоўся дзікім, нястрымным смехам.

— Ты думаеш, што я табе дарую?

— Я нічога не думаю, проста я не прывык хлусіць, княжа.

— Ды я цябе...

— Воля ваша...

Але не адважваўся Радзівіл нават пры наяўнасці шматлікіх слуг і аховы сказаць нешта непрыемнае Сіньку, баяўся ягонай сілы, ведаў, што можа здарыцца, калі асілка вывесці з раўнавагі. Тады не стрымаць яго, не супыніць.

На раніцу выгнаў Радзівіл Сінька з палаца і сказаў:

— Шкуру б з цябе жывога садраць. Але ж...— нечага не дагаворваў князь.— Забірай і Боя, мне калека непатрэбны. Жыві, дзе хочаш. Ніхто цябе не кране.

— А я нікога і не баюся,— адказаў Сінько,— бо я не вінаваты.

Не пайшоў Сінько далёка ад таго месца, дзе палявалі на зубра, застаўся побач. Пабудаваў хаціну і стаў займацца сялянскай працай, якая яму была даспадобы. Бой адышоў, зацягнуліся ягоныя раны, зажылі паламаныя рэбры, але на паляванне яны ўдваіх ніколі не хадзілі. Можа, не жадалі, а можа, забыцца не маглі пра апошняе здарэнне. Калі Бой памёр, то Сінько пахаваў яго ля сваёй хаціны, на высокай горцы. Потым на той гары і яго людзі пахавалі, а гару тую

назвалі Сіньковай, ці Сіняўчынай. Пазней ужо, калі паселішча тут стала, то яго назвалі Сіняўкай. Так з тае пары і засталося.

## АРДА

У нас тут часта пра татараў-захопнікаў раней гаманілі. Самі ж ведаеце, колькі разоў іх на нашай зямлі білі. А калі князь Міхал Глінскі разбіў іхнюю надзвычай буйную арду, то болей раскосыя сюды і не паказваліся. Ці то ўжо так баяліся, ці то ўжо не маглі з сіламі сабрацца, каб на роўных ваяваць з мясцовымі дружынамі. Нездарма ж гавораць, што татары толькі тады смелымі былі, калі пераболышвалі колькасна, а калі пароўну, ці мясцовых болей, то яны проста ўцякалі ці імкнуліся патаемнымі сцяжынкамі выбрацца з небяспечнага месца.

Хітры гэта вораг быў, надзвычай небяспечны, але ж і нашыя продкі таксама не лыкам шытыя, не ботамі рукі пасля мыцця выціралі. Былі такія военачальнікі, якія татарскую тактыку баёў выдатна ведалі і зналі, як ды дзе лепей заставы выставіць ці да адкрытага бою нечысціўцаў прымусіць.

У той раз татары наскочылі, як і раней здаралася, нечакана. Папалілі, панішчылі будыніны, павытапталі збажыну, пахапалі людзей, якія не загінулі, у палон і павярнулі ў накірунку да Клецака. Можа, ужо назад вярталіся, а можа, там нейкая больш буйная сіла стаяла, хто ж яго зараз ведае? Толькі дымы ў сіняе неба ззаду пацягнуліся ды енк-плач стаяў над дарогамі, кудою захопнікі палон гналі. Асабліва з людзьмі не цацкаліся чужынцы, чуць што якое, то махне каторы з іх шабляй вострай і галава, нібы капусны качан, пакоціцца ў прыдарожны пыл. Таму плакалі, але ішлі, бо чулі не раз і не два, што мясцовыя дружыны потым ворагаў перахоплівалі. Вось і спадзяваліся на такі выпадак.

Гоняць, значыцца, татары палон, то прыкрыкваюць, то бізунамі перацягваюць. Ім дык што? Яны на конях сядзяць, а ззаду яшчэ па аднаму ці па два зацугляных бягуць, хвалявацца няма чаго. А вось як людзям, якіх яны, нібы жывёлу, з усіх бакоў атачылі, пазвязвалі і дзе пехам, а дзе і бегам прымушаюць джгаць? Як ім, бедалагам, трываць? Нарэшце ўбачылі захопнікі,

што яшчэ з вярсту прагоняць, і нікога ўжо ў жывых не застанецца, бо ці пападаюць дзеці і жанчыны на зямлю і болей з яе не ўстануць ні пад якім прымусам, ці нешматлікія мужчыны і старыя кінуцца на іх і загінуць у гэтым апошнім няроўным баі, але далей не пойдуць. Загадаў тады хан спыніцца і заначаваць на гэтым самым месцы. Сконіліся вершнікі, пацягнуліся ў вышыню па-над дрэвамі негустыя вогнішчы, бо баяліся чужынцы. Атрымалі магчымасць перадыхнуць і палоннікі. Кожны думаў пра сваё, адны пра тое, як хутка вырвуцца ў вольны стэп, дзе ім не будзе страшны ніякі вораг, іншыя — пра тое, ці пашанцуе ў гэты раз, ці знойдуць іх мужчыны-дружыннікі і адаб'юць назад.

А ў тым татарскім загоне быў адзін надта сквапны вершнік. Калі астатнія ваяры сабе есці варылі ды думалі-марылі пра хуткае вяртанне, то гэты бегаў-насіўся сярод палонных і адбіраў сабе найбольш прыгожых ды стройных дзяўчат. Адабраў, можа, з дзесятак і ўсё талдычыў адно і тое ж:

— Арда! Арда! У ардзе добра будзе! Арда!..

Больш нічога не казаў, толькі языком цмокаў. Падалося яму, што мала палонніц адабраў, і давай зноў шныраць сярод жанчын. Прыглянецца каторая, то і пад спадніцу залезе, ногі абмацае-агледзіць, за грудзі пациcкае, і нават у рот, нібы кабыле, загляне. Знямоглыя палонніцы адбіваліся, плявалі яму ў твар, але гэта не надта дапамагала. Татарын толькі аскальваўся ды смяяўся так, што гідка рабілася, і ўсё паўтараў бясконцае:

— Арда! Арда! У ардзе добра будзе!..

Ніхто з татарскіх ваяроў не мог яго за гэта зачапіць ці пакараць, бо не радавым быў чужынец, а сынам самога хана. Ведама ж, тут нельга было пярэчыць, што ён забірае сабе найлепшых жанчын і дзяўчат, хоць сам іх у палон і не браў.

Але неяк само па сабе ўсё супакоілася. Гэты скнара пайшоў да вогнішча, і адтуль неўзабаве пачалі даносіцца выбухі смеху, відаць, штосьці гнюснае распавядаў сваім паплечнікам.

Палонныя не спалі. Яны моўчкі ляжалі на сырой зямлі, і кожны ў думках прасіў Бога забраць яго да сябе ці выратаваць якім іншым шляхам ад далейшых прыніжэнняў. Сярод палоннікаў была адна надзвычай прыгожая дзяўчына. Звалі яе Марылькай. Заручоная прыгажуня была. Сватоў дасылаў да яе княжацкі

дружыннік Пятрок. Дамовіліся з бацькамі і адносна вяселля, і адносна пасагу, нават сам князь задаволена хмыкнуў свайму смеламу вою:

— Што ж, Пятрок, ад цябе запрашэння на вяселле чакаю...

Узрадаваны такім паваротам справы, дружыннік весела ўскрыкнуў:

— Канечне, княжа, канечне, калі толькі наш час надыдзе вяселле гуляць, то ласкава просім не адказаць...

— Не адкажу, не адкажу, каб толькі ўсё добра было,— прагуў лагодна валадар у адказ.

Ды вось якому ліху трэба было здарыцца. Бяда такая напаткала не толькі Марыльку, але і ўсіх людзей, што тут зараз знаходзіліся. А колькі ўжо ніколі не ўстане і не сустрэне промняў сонейка?.. Так і заснула кароткім, цяжкім сном дзяўчына. Не адчула сама, як навалілася непамернай ношай стомленасць і вочы заплюшчыліся. Ачнулася ад таго, што нехта ціхенька катурхаў яе за плячук. Марылька ўсхапілася і збіралася ўжо закрычаць, бо падалося, што гэта той сквапны татарын прыйшоў да яе, каб зацягнуць да вогнішча. Толькі крыкнуць не паспела, бо нечая шырокая і цвёрдая далоня закрыла ёй рот і прыціснула да зямлі. Дзяўчына паспрабавала супрацівіцца, ды... пазнала свайго суджанага — Петрака. Узрадавалася, кінулася да яго, а той паказвае пальцам, каб ціха сябе паводзіла, бо войска варожае навокал. Потым папрасіў Марыльку дапамагчы яму людзей папярэдзіць: калі бітва пачнецца, то няхай не ўстаюць з зямлі, а куды пад коней залазяць ці ў густое кустоўе.

Так і зрабілі. Папярэдзілі ўсіх, і Пятрок ціхенька прашаптаў любай:

— Праз хвілін колькі пачнецца, так што не перажывай, хутка ўсе будзеце вольнымі, і мы ніколі ўжо не разлучымся. Рабіце толькі тое, пра што вам гаварыў,— і вой знік у цемры.

А хвілін праз колькі ўсё навокал затрашчала, загаманіла, загаласіла. Бітва доўжылася не болей чым паўгадзіны. Ашаломлены вораг нават і супраціўляцца не здолеў у поўную сілу. Хто хапаўся за шаблю ці спрабаваў уцякаць; таго канчалі на месцы, а таго, хто ўздымаў рукі, просячы літасці, зганялі ў адно гурбішча.

Калі ўзышло сонца, усё ўжо было скончана. Воі-дружыннікі шукалі сваіх родных, і калі знаходзілі, то

радасна перамаўляліся, адыходзілі ўбок, а хто не напаткаў блізкіх, то толькі яшчэ болей пахмурнеў ды пазіраў у бок палоннікаў-татар. Неўзабаве князь сказаў:

— Суд будзем здзяйсняць на месцы. Няма чаго палонных за сабою цягаць. Што будзем з імі рабіць? Гаварыце...

— А што тут гаварыць, княжа? — прагучаў нейчы голас.— Месца ім на бярэзіне. Столькі гора ўчынілі, столькі нявінных душ згубілі...

Як сказалі, так і зрабілі, і першым задрыгаў у пельцы той татарын, які ўсё пра арду нешта бубніў. Нехта з былых палоннікаў са злосцю прамовіў:

— Вось тут табе і арда! Тут табе ўдосыць багацця будзе! Тут табе і арда!

Вось так і сталася, што на тым месцы пазней паселішча невялікае ўзнікла, і назвалі яго — Арда.

## КОЛКІ

Калі расказвалі даўней пра мінулае, то ніколі не забываліся распавесці і пра тое, якія крывавыя войны адбываліся на тэрыторыі Беларусі. Нядзіўна было і такое пачуць, што ад цэлай воласці ў жывых заставаліся лічаныя дзесяткі людзей, а на месцах вясёлых і шумных некалі населеных пунктаў адны толькі папялішчы дыміліся. Гэта ўсё, каханенькія, не байкі-казкі, а так і было на самай справе. Дзе вы чулі, каб нехта з людзей такім жартаваў? Не дай Божа каму-небудзь перажыць гэткія бядоты, як давялося нашым продкам. Войны з усіх канцоў нібы рвалі Беларусь на часткі: то палякі, то немцы, то шведы, то расейцы, то татары, то яшчэ якая трасца ўваб'ецца. А дзе было сілы ўзяць адбівацца ад усіх? Кінуцца, бывала, воі за адным ворагам, а другі толькі і чакае зручнага выпадку, каб напасці на безабаронныя вёскі ды гарады і парабаваць іх.

З нашых продкаў смяяліся, што амаль усе яны шляхціцамі былі. А вы ведаеце, тут мала смешнага, тут разабрацца трэба. Справа ў тым, што шляхецтва — гэта ж тое самае дваранства, і давалася яно ў нас не па нейкаму там багаццю, хоць і такія выпадкі былі, а ў пераважнай большасці людзей узнагароджвалі за подзвігі на палях бітваў. Вось адтуль і выходзіла,

што амаль усе шляхціцамі былі. Ніхто не хаваўся, ніхто перад няпрошанымі гасцямі на калені не станавіўся, нягледзячы нават на тое, што іх магло быць у дзесяткі ці сотні разоў болей. Лічылі за лепшае памерці ў баі, чым потым на кагосьці спіну гнуць і забыцца пра тое, што такое воля!

Даўней вёска наша размяшчалася не тут, дзе зараз, а ўбок крыху, дзе цячэ рэчка Морач. Там, на самым беразе, і было паселішча. Называлася спачатку не Колкі, а па-іншаму — Любашоў. Жылі там людзі здаўна, займаліся, хто чым, але перавагу аддавалі земляробству, бо палі навокал ляжалі надта ўрадлівыя. Некаторыя імкнуліся ў густыя пушчы ды бары, дзе было мноства ўсялякага звяр'я, разнастайнага птаства, і без натугі можна было пракарміць не толькі сябе, але і сям'ю, якой бы вялікай яна ні была. Добрым падспор'ем у гаспадарцы была і рыба, якая вадзілася ў Морачы. Гаварылі, што ў старадаўнія часы не трэба былі нейкія спецыяльныя рыбалавецкія прылады ці рыштунак. Віламі рыбу білі. Можаце сабе зараз такое ўявіць? Мне бабуля гаварыла, што мой прадзед ці прапрадзед, калі толькі ў нашай вёсцы пасяліўся, такімі драўлянымі віламі нанізаў некалькі мяхоў рыбы за адзін падвячорак. А рыба ж была такая вялікая, што качак ды гусей цалкам заглытвала. Вось што рабілася ў тыя часы на рэчцы, якая сёння на брудную канаўку падобна.

Аднае вясны здарылася страшнае гора ў Любашове. Кажуць, што было гэта падчас вайны з расейцамі. Тады ж людзей паспалітых не толькі ў войска забіралі, каб яны там якія другасныя работы выконвалі, але і ў палон валаклі, і забівалі на месцы. Мала таго, што есці не было чаго, што хаціны займалі чужынцы, дык пастаянна трэба было іх баяцца, бо маглі без дай прычыны жыцця пазбавіць.

Так і ў той раз адбылося. Спачатку стралялі, біліся недзе далёка ад Любашова, а потым праз вёску пачалі адступаць мясцовыя войскі. Змрочныя, стомленыя ішлі ваяры. Адзінае, што прасілі,— вадзічкі халоднае папіць ці перакусіць чаго. Нават у вочы сялянам не адважваліся глядзець, ведалі, што акрамя дакору там нічога іншага не ўбачаць. Калі б'ешся з непрыяцелем на полі бою, то тут усё зразумела — вораг перад табою, а сябры-таварышы поруч, яны і выручаць, і падтрымаюць на выпадак чаго. А вяскоўцам

на каго абаперціся, ад каго чакаць дапамогі? Зразумела, што чужынцы, якія прыйдуць сюды па слядах адыходзячага войска, сваю помсту і злосць за тое, што не дагналі саперніка, у першую чаргу выльюць на безабаронных людзей. Таму старэйшы над ваярамі звярнуўся да мясцовых жыхароў з кароткай прамовай:

— Сябры мае! Ведаю, што цяжка вам будзе, тут застаўшыся. Ведаю... Але і з сабою ўсіх вас узяць не можам. Хіба што толькі мужчын, якія зброю могуць у руках трымаць. А куды ж мы жанчын, дзяцей ды старых дзенем? Няма ў нас такой магчымасці, каб усіх хоць у абоз пасадзіць, бо і так ён перагружаны. Але не пра гэта я хацеў вам сказаць, гэта вы і без мяне добра ведаеце. Хацеў я да вас з просьбаю звярнуцца. Справа ў тым, што ў нас многа параненых. З імі мы не можам адарвацца ад ворага, каб непрыкметна злучыцца з асноўнымі нашымі сіламі і потым разлічыцца з няпрошанымі гасцямі. Можа б, вы іх прыхавалі, ды кармілі і даглядалі гэты час... Вось пра што хацеў прасіць вас, мае дарагія. Мясцовасць вы добра ведаеце. Схаваеце дзе-небудзь у глухім месцы, там і перачакаюць нашы таварышы. А мы хутка вернемся, тады ўжо вас і аддзячым, не сумнявайцеся.

— Ды пра якую падзяку тут можна гаворку весці? — выступіў наперад старэнькі, сівенькі дзядулька.— Хіба ж мы не разумеем, хіба ж вы нам чужыя? Нейкую там адплату абяцаеце, ды хіба ж мы маладымі не былі, хіба ж мы грудзьмі на ворага не выступалі? Пакідайце сваіх параненых, схаваем, ніхто іх не знойдзе. Пакідайце, чаго ўжо там...

— Дзякуй вам, родныя, дзякуй, іншага адказу ад вас і не чакаў,— змахнуў няпрошаную слязу з твару ваявода.

Праз колькі часу параненых і пакалечаных вояў на руках перанеслі праз непралазную балáціну. На невысокім грудзе, пад нізкарослымі дрэўцамі пабудавалі буданы. Агонь нельга было распальваць, таму асноўнымі ворагамі хворых былі камары, якія густымі хмарамі віселі над лесам. Але мясцовыя жыхары ведалі, як ратавацца і ад гэтых надакучлівых стварэнняў: голыя месцы на параненых старанна пазакручвалі палатнінай. Нібы лялькі ляжалі і ціха стагналі ад невыцерпнага болю ваяры, ды тут ужо нельга было нічым дапамагчы. Раней так і лячыліся, болей спадзя-

валіся на волю божую, чым на нейкія там лекі ці дактароў. Не было іх увогуле. Хіба што які варажбіт ці чараўнік.

Так і ў гэтым выпадку. Параіліся вяскоўцы паміж сабою і вырашылі, што, пакуль ворагаў няма блізка, у вёсцы трэба займацца будзённымі справамі паранейшаму, на выспе ўсім сядзець неабавязкова. Дастаткова пакінуць тут старога варажбіта і пару чалавек яму на падмогу. Астатнім час кіравацца у Любашоў. Пастаялі яшчэ крыху ля параненых, пагледзелі на тое, як завіхаецца, ні на хвіліну не прысядаючы, ля іх стары дзед, пра якога казалі, што можа нежывога на ногі паставіць, і пайшлі дамоў.

Раніцай, калі некалькі сялян прынеслі есці ваярам і сваім аднавяскоўцам, іх чакала сумная навіна: трое параненых сканалі ад ран. Выкапалі неглыбокую магілу, бо ніжэй магла быць вада, і, аддаўшы апошнюю даніну павагі, пахавалі нябожчыкаў. Ніхто не галасіў, ніхто не плакаў. Толькі цяжка ўздыхалі сяляне, ды адзін ці два з дружыннікаў перажагнуліся, бо мелі для гэтага яшчэ сілы.

Ворагі ўсё не паказваліся, нават не было чуваць пра іх. Таму сяляне пачалі ўжо спадзявацца, што яны абмінулі іхняе паселішча бокам. І тут вяскоўцы пралічыліся, страцілі пільнасць і жорстка за гэта паплаціліся. Неяк, калі на Любашоў ужо апусціўся змрок, з цемры нячутна пачалі з'яўляцца шматлікія вершнікі. Праехалі па соннай вёсачцы, а потым акружылі яе з усіх бакоў так, што і мыш не ўцякла б. На досвітку загрукалі ў дзверы, у вокны, выганяючы жыхароў на вуліцу. Калі ўсіх сабралі і падагналі да царквы, аказалася, што там стаіць вялікае войска, а яшчэ большае ехала і ішло міма, кіруючы па тых самых сцежках, па якіх адыходзілі мясцовыя дружыннікі. Вяскоўцы панура маўчалі. Маўчалі і тыя, хто іх сабраў сюды, але па другой прычыне — чакалі самага галоўнага начальніка. Неўзабаве той з'явіўся. Нейкі ўвесь чорны, змрочны, перакрыўлены. Пад'ехаў і адразу закрычаў:

— Што, заўсёды так гасцей сустракаеце?!

Натоўп маўчаў, толькі часам заходзілася ад плачу дзіця, ды і тое доўга не плакала, бо маці закрывала яму рот далонню.

— Ну, дзе вашы параненыя ляжаць? — з пагрозай запытаўся чужынец.

Вяскоўцы ажно анямелі, ніхто не мог здагадацца, адкуль ён даведаўся пра іхнюю таямніцу.

З натоўпу пачуўся нейчы ліслівы голас:

— Я... Я пакажу... Толькі забярыце мяне адсюль...

Праз вяскоўцаў прабіваўся невялічкі чалавечак. Усе спачатку расступаліся, але потым пачалі спецыяльна паўставаць на шляху здрадніка. Той не вытрымаў і запішчаў:

— Прапусціце! Калі вам усё роўна, то я жыць хачу, і мне напляваць на нейкіх там ваяроў! Правяду — і ўсё на гэтым!

— Не паспееш! — хмура адказаў нехта з любашоўцаў, і ў паветры мільганула бліскучае лязо нажа.

— Яны яго зарэзалі, валадар! — завыў нейкі ваярчужынец.— Яны яго зарэзалі!

— Што? — не зразумеў спачатку той, да каго звярталіся, але імгненнем пазней ужо гарлаў:

— У царкву іх усіх заганяйце! У царкву, раз яны такія! Спаліць, усіх спаліць!

Заплакалі дзеці, закрычалі жанчыны, паспрабавалі неяк супрацівіцца мужчыны, але супраць сілы ды зброі не папрэш. Праз некаторы час да неба пацягнуўся яшчэ адзін слуп дыму, пацягнуўся разам з малітвамі і праклёнамі.

А на выспе нічога не ведалі пра тое, што адбылося ў Любашове. Параненым станавілася лягчэй, некаторыя з іх ужо прасіліся, каб ім дапамаглі ўстаць і пасадзілі на сонейку. Толькі стары варажбіт нешта ўсё азіраўся і непакоіўся.

— Чаго ты, бацька, хвалюешся? — запыталіся ў яго.

Не адразу, а праз колькі хвілін, ён адказаў:

— Мабыць, нешта здарылася, бо я прасіў вяскоўцаў сёння раней ежу прынесці, вопратку сабраць якую... Нешта здарылася...

— Можа, не атрымалася, нешта не выйшла,— паспрабавалі супакоіць дзядульку дружыннікі. Потым нехта прапанаваў паслаць аднаго з любашоўцаў у разведку, каб той на месцы ўсё паглядзеў. Так і зрабілі. Дзесьці праз пару гадзін разведчык вярнуўся, яго нельга было пазнаць: чалавек пасівеў амаль цалкам.

— Што?.. Што здарылася, гавары? — кінуліся да яго ўсе, хто мог хадзіць.

— Няма болей нашага Любашова... Няма нашых

людзей... Няма нашых сем'яў... Усіх вынішчылі... Усіх спалілі...

На выспе запанавала страшная цішыня.

А дзён праз колькі ворага пагналі, пагналі так, што тым некалі было нават перадыхнуць. Прыехаў на месца былой вёскі князь са сваёй дружынай і пачаў дзякаваць людзям. Але перад ім стаялі толькі трое любашоўцаў...

— Чаго ўжо там, княжа,— адказаў за ўсіх стары варажбіт,— сваіх людзей хавалі... Засталіся мы, як тыя колкі, што ў агародзе тырчаць. Пойдзем з хлопцамі ды новае паселішча непадалёку закладзём. Што рабіць...

— Дзякуй вам, людзі,— ціха мовіў князь і пакланіўся на свежы курган да самай зямлі.

А дзядулька і сапраўды пачаў будаваць з двума хлапцамі новае паселішча і назваў яго так, як і тады сказаў,— Колкі.

## МОРАЧ

Тут у нас у старадаўнія часы раслі густыя, непралазныя лясы. Звяр'я многа ў іх было, птаства ўсялякага таксама вадзілася процьма. Па пушчах, канешне ж, людзі не жылі, а сяліліся там, дзе можна было хоць крыху зямлі агораць ды засеяць, каб хлеба кавалак на стале не пераводзіўся. Адна вёска ад другой знаходзілася на значнай адлегласці. Дарог паміж сабою людзі амаль не ведалі. Хіба што выпадкова выбіваліся да іншых паселішчаў, калі на паляванні недзе занадта ўжо занурыліся ды не заўважылі, як такую адлегласць праджгалі ці калі заблукалі ў лесе, што таксама нярэдка адбывалася. Праўда, тады крыху па-іншаму гаварылі — сцвярджалі, што лесавік іх завадзіў спецыяльна, бо надта наблізіліся да ягоных уладанняў ці да ягонага жылля. Верылі ў гэта і без асаблівай патрэбы не імкнуліся ў няходжаныя гушчары ды першаваральныя нетры лезці.

Потым і паны-памешчыкі з'явіліся. Тады ўжо прыгон пачаўся, самае цяжкае жыццё прыспела для мясцовых жыхароў. Яны ўжо ніякіх правоў не мелі, нікуды паскардзіцца не маглі, бо за гэта таксама каралі бязлітасна. Прызвычаіліся вяскоўцы працаваць на сваіх прыгнятальнікаў не разгінаючыся, не выказваючы

абурэння ды нянавісці. З пакалення ў пакаленне так і перадавалася. Часам, праўда, здаралася, што найбольш смелыя і адчайныя галовы не вытрымлівалі і рабілі нешта насуперак панам. Тады іх каралі. А пакаранне якое ж вы думаеце вынайшлі? Адразу і не здагадаецеся. Возьме, значыцца, памешчык такога гордага чалавека, загадае адлупцаваць да паўсмерці, але да смерці забіваць не дае, каб яшчэ болей паздзекавацца. Адальюць бедалагу вадою і прывядуць да гаспадара, а той задаволены, свеціцца, нібы патэльня начышчаная:

— Што, голубе, не паразумнеў? Прабачэння прасіць не збіраешся? Прасі, то, можа, і дарую, я чалавек добры, спачуваю бедным ды гаротным...

— Не каюся, пане...— ледзьве хрыпіць ахвяра,— не каюся, а, болей таго, жадаю, каб і табе некалі ці тваім дзецям давялося пакаштаваць таго ж пачастунку...

— Яшчэ і пагражаеш, галгане,— раве памешчык.— Кідайце яго тады да Морачы, няхай там свае словы прыгадае. Вязіце да Морачы. Там ягонае адвечнае месца.

Падхопяць служкі вяскоўца, укінуць, нібы мех, у воз і папруць, коней падганяючы, пасвістваючы на іх, бізунамі паляскваючы. Завязуць, можа, вёрстаў за сотню ў такі глухі лес, што і сонца там не прабіваецца, і кінуць аднаго, без ежы, без вады, без аніякай зброі. Пастаяць, паглядзяць на нежывое цела, пасмяюцца над людской бездапаможнасцю і паімчаць сабе назад. І гінулі тут людзі. Не было такога выпадку, каб нехта вярнуўся, бо навокал толькі балоты, лясы ды гнюс усялякі.

Але аднойчы здарылася тое, чаго ніхто не чакаў. Мясцовага каваля, магутнага і здаровага чалавека, памешчык загадаў адлупцаваць і выкінуць у Морач. Усё выканалі верныя служкі, усё найлепшым чынам зрабілі. Толькі ён не памёр, а ачуняў, устаў і пайшоў блукаць па пушчы. Доўга туды-сюды хадзіў, праз зараснікі і кустоўе прадзіраючыся, у балаціны правальваючыся, ды яму ці то лёс, ці то Бог дапамог. Выбіўся каваль да таго самага месца, дзе сёння знаходзіцца вёска Колкі. І ўбачыў такое, ад чаго валасы на галаве дыбарам сталі: да дрэва была прывязана жанчына. Голая, у чым маці нарадзіла, але цела было нейкае чырвона-шэрае. Прыглядзеўся чалавек і затросся ад

гневу — гэта ж камары бедную так даймалі, яшчэ нейкая гадзіна — і ўсю кроў высмакталі б. Пачала яна прасіцца:

— Развяжы мяне, чалавеча, не бойся, я табе пра ўсё падрабязна раскажу...

Ён гэтак і зрабіў, і сталі яны гаварыць. Яе таксама прывезлі сюды паміраць, вопратку садралі, прывязалі да дрэва, каб камары замучылі. Каваль распавёў сваю гісторыю. От яны сышліся і сталі жыць удваіх. І гэтак атрымалася, што ў тым месцы, дзе жанчына знайшлася, паселішча назвалі Колкі, бо гэты чалавек быў, як кол, адзін на ўвесь свет. А Морач — гэта значыцца замарыць чалавека, каб і канец яму прыйшоў. Вось з таго часу вёскі гэтыя так і называюцца...

## СЯКЕРЫЧЫ

Назва нашай вёскі звязана са старажытным богам Перуном, што валадарыў над маланкамі ды грымотамі. Да сённяшняй веры, хрысціянскай, была яшчэ больш даўняя, язычніцкая, з мноствам багоў. Дык ён сярод тых шматлікіх багоў займаў самае галоўнае месца, менавіта яму падпарадкоўваліся, паводле народнага, астатнія багі, менавіта яму прыносілі нашы продкі ахвяры і паднашэнні.

Гавораць, што бог Пярун быў падобны на звычайнага чалавека, толькі вылучаўся значна большымі памерамі. Ногі ў яго былі жалезныя, вочы з каштоўных камянёў, а ў руках трымаў стралу, упрыгожаную яхантамі.

Сякера лічылася свяшчэнным сімвалам бажаства грому — Перуна. На знойдзеныя ў месцах старажытных паселішчаў каменныя сякеры ў сярэднявечча глядзелі як на кінутую ў зямлю зброю нябесных багоў. Ім прыпісваліся магічныя ўласцівасці — здольнасць выратоўваць ад маланкі, хвароб, садзейнічаць ураджайнасці, засцерагаць ад усялякіх здарэнняў. Для гэткіх жа магічных мэт старажытнымі людзьмі рабіліся касцяныя коп'і. У вялікай колькасці былі распаўсюджаны падвескі, якія паўтаралі форму старажытнарускіх сякерак і выкарыстоўваліся як засцерагальныя талісманы.

Так што, усё гэта павялося з надзвычай старадаўніх часоў. У нашых мясцінах таксама пакланяліся

Перуну і прыносілі яму ахвяры. Ды, відаць, у любыя часы такое здараецца: адзін з мясцовых сялян толькі пасміхваўся, калі астатнія вяскоўцы неслі паднашэнні велічнаму богу, крыўляўся і паказваў усім сваім выглядам, што нічога ён не баіцца. Яму жыхары казалі:

— Чалавеча, глядзі, пакрыўдзіш Перуна, і тады ён табе такое ўтворыць, што не толькі ты, але і твае нашчадкі пакутаваць будуць! Што ты хочаш нам даказаць сваёй фанабэрыстасцю і ўпартасцю? Не хочаш пакланяцца — не пакланяйся, не прызнаеш ты нашага бога за вярхоўнага — не прызнавай, але рабі гэта ціхенька, не выстаўляйся, бо можаш не толькі Перуна раз'юшыць, а і ягоных прыхільнікаў... Праб'юць галаву ці накінуць на тваю шыю пельку, позна будзе крычаць аб міласці. Глядзі, просім цябе і папярэджваем... Болей гаварыць нічога ўжо не будзем — надакучыла. Каб ты незнаёмы быў, то мы і не вагаліся б у тым, што далей рабіць, але ж і бацькоў тваіх ведалі — надта сумленныя людзі былі...

Толькі не дапамагала нічога. Калі ўсе беглі ў лес ці ў поле шчыраваць, то злы чалавек імкнуўся любым чынам зрабіць што-небудзь ім на шкоду. Не раз, не два заўважалі сяляне, што нехта то студню засыпаў, якую абагаўлялі з незабыўных часоў, то вогнішча ля свяшчэннага дуба загасіў, то параскідваў дубовае паленне, спецыяльна нарыхтаванае вешчунамі для найбольш урачыстых момантаў язычніцкага жыцця. Можа, і здагадваліся, але ў тыя часы ніколі не гаварылі благога на чалавека, пакуль не бралі яго на месцы здарэння.

Таму, сабраўшыся ў чарговы раз ля студні, у якую было накідана нейкае ламачча, вырашылі ўсё ж падлавіць злачынцу і жорстка яго пакараць, каб іншым была добрая навука на будучае. Стары вяшчун паспрабаваў адгаварыць народ, каб не турбаваліся, не адрываліся ад неадкладных будзённых спраў, пераконваў, што і сам усё высветліць, але пад націскам аднавяскоўцаў вымушаны быў адступіць.

— Калі ўжо так вы настойваеце, то няхай папашаму і будзе. Аб адным толькі прашу вас, сяляне: не распраўляйцеся са злыднем самі. З ім павінны пакеітацца нашы багі, калі ён так сябе вольна адчувае, калі не палохаецца кары нябеснай... Пільнаваць лепей за ўсё па чарзе і ў святых месцах, бачыце, ён менавіта там і вырабляе свае чорныя справы. Калі зловіце,

то толькі да мяне яго прывядзіце. Толькі багі будуць судзіць злачынцу, выносіць яму свой прысуд...

Доўга гаманілі ўзрушаныя людзі, доўга выказвалі ўсялякія прапановы, але ў рэшце рэшт пагадзіліся з мудрым вешчуном. Раз ужо нехта абражаў багоў, то хай яны самі ў першую чаргу і разбяруцца...

Разыходзіліся па хатах ужо ў прыцемках. А раніцай, калі ўсе пайшлі ў поле, у вёсцы засталося чалавек колькі надзейна схаваўшыхся мужчын. Ніхто б не здагадаўся, што за ўсім, што адбываецца навокал, назіраюць пільныя чалавечыя вочы. Ноччу на іх месца заступілі іншыя. Сцераглі не толькі студню і будынкі, але і свяшчэннае вогнішча, і гару, на якой знаходзіліся ідалы язычніцкіх багоў. Нічога падазронага пакуль што не адбывалася. Так прайшоў, можа, з тыдзень. Ужо некаторыя, найбольш нецярплівыя, пачалі казаць, што, можа, рабілі ўсё не мясцовыя, а жыхары суседняга паселішча, мо зайздросцілі ім у нечым.

Стары вяшчун супакойваў вяскоўцаў і не даваў ім гаварыць благога на суседзяў:

— Людцы мае, не забывайце закон нашых продкаў: не злоўлены — не злачынец! Можа, яны і душою і памкненнямі не вінаваты, а мы іх так граззю паліваем! Грэх гэта вялікі!

Мудрыя словы крыху суцішылі адчайных гаваруноў. Нехта з мужчын прапанаваў:

— Ведаеце што? Калі ўжо тыдзень ніякіх парушэнняў няма, ніякай злыбеды не заўважаем, то можа і ахову зняць? Навошта нам, нібы малым дзецям, бегаць ды хавацца? А калі ніякага злачынцы ўвогуле не існуе, тады што? Хто даведаецца — смяяцца з нас будзе!..

— Ага, смяяцца будзе, як бы не так,— не ўтрываў нехта,— а студня засыпаная, а вогнішча згашанае, а дубовыя дрэвы паскочваныя ў рэчку? Што ты на гэта скажаш, суцяшальнік? Надакучыла вартаваць, спаць хочацца, дык так і скажы, а не круці хвастом перад намі!

Навокал засмяяліся, і гэты смех зняў напружанасць.

— Добра, людзі, разыходзьцеся, вартаваць будзем, як і раней,— прамовіў павесялелы вяшчун.

І што ж вы сабе думаеце? Злавілі таго злачынцу. Злавілі, родненькія. Можа, яшчэ тыдзень пільна сачылі вяскоўцы, нікога не было. Але ж яны адчувалі, хто гэта мог рабіць, таму сталі вартаваць хаціну таго

самага вяскоўца, якога папярэджвалі. І дачакаліся-такі.

Аднае ночы ціхенька рыпнулі дзверы і на падворак бязгучна сягнуў высокі цень. Чалавек пастаяў колькі часу, услухоўваючыся ў цішыню, і шпарка пакрочыў да... студні. Вартавыя краліся за ім так непрыкметна, што злачынца заўважыў іх толькі ў той момант, калі ўжо кінуў нейкае ламачча ў чысцюткую ваду. Ён яшчэ паспеў выхапіць востры нож, але ніхто з ім біцца не збіраўся, проста лупянулі кіем па галаве і ўсё на гэтым. Асунуўся пярэварацень мяшком на пясок. Падхапілі яго вартавыя пад пахі і павалаклі да свяшчэннай гары, да вешчуна, усё рабілі, як той і прасіў.

Раніцай, калі ля ідалаў сабраліся вяскоўцы і вяшчун вырашыў учыніць суд, сюды прывалаклі нядобразычліўца. Яго выцягнулі з невялічкай зямлянкі і паставілі на ногі перад людзьмі, тварам да іх, а спінаю да багоў, каб так ён адчуваў магутны подых вышэйшых істот.

— Багі! Якое пакаранне вы прызначаеце гэтаму чалавеку? — звярнуўся да ідалаў вяшчун. Хацеў сказаць яшчэ нешта ды не паспеў, бо злачынца павярнуўся і мовіў:

— Пляваць я хацеў на вашых багоў! Пляваць!

Плюнуць ён, праўда, не паспеў, бо нешта загрымела моцна ў небе і праз момант бліскучы прадмет распалавініў галаву злыдню...

Усе кінуліся ўцякаць. Не чакалі, што пакаранне будзе такім хуткім.

Пазней ужо, калі прайшло колькі часу, на тым самым месцы знайшлі бліскучую, пазалочаную... сякерку і вырашылі, што гэта сам бог Пярун забіў свайго ворага.

Доўга на высокай гары ніхто не жыў, бо месца ж было свяшчэннае. Але потым сталі будаваць людзі хаціны. Прыйшла новая вера, якая ўсё перайначыла. Толькі назва ў паселішча засталася ад той свяшчэннай рэчы — Сякерычы.

## ЯКШЫЦЫ

Гэта было вельмі даўно, калі татары прыйшлі на Беларусь. Там, дзе зараз вёска Арда, стаяў іхні вялікі хан са сваімі шматлікімі вершнікамі. А ў ханскім войску такая завядзёнка была. Калі вярталіся з набега, ці

паходу, то ўсе адкладвалі значную частку захопленага самому хану, потым лепшае забіралі больш знакамітыя воі, і ўжо астатняе заставалася звычайным татарам.

Быў у гэтай ардзе вершнік, якога звалі Хусейн. З сям'і ён быў беднай. Бацькі толькі і рабілі ўсё жыццё, што гарбаціліся на ханаў ды на служкаў іхніх. Хацеў вой ажаніцца, але не было грошай заплаціць за дзяўчыну. Усе спадзяванні Хусейна былі звязаны з паходам у чужыя землі. Тут ён марыў разбагацець і выкупіць бацькоў з галечы, ды і сваё жыццё павесці належным чынам.

У сутычках Хусейн паводзіў сябе надзвычай мужна, лез у самую гушчу, яму пакуль што шанцавала, нават паранены не быў. Спачатку ніхто не заўважаў яго, але потым, нeяк неўпрыкметку, сталі зайздросціць дужаму і спрактыкаванаму ў бітвах вою. Можа, ад таго, што ён стаў ужо дзесятнікам і яму падпарадкаваліся дзевяць вершнікаў, а можа, ад таго, што браў Хусейн багатыя трафеі. Некаторых злавала тое, што хлопец ніколі не браў вопратку ці ўпрыгожванні з забітых людзей. Дазваляў сабе ўхапіць толькі там, дзе багацце ляжала на паверхні: у будыніне, на возе. Не здзекаваўся надта з палонных, не дазваляў гэтага рабіць і сваім падначаленым, пастаянна сцвярджаў, што маладыя, здаровы воін павінен паказваць сябе на полі бою, у сутычках з ворагам, а не перад бяззбройнымі ды зраненымі людзьмі. Гэткага гераізму ва ўсіх хапае. І што самае дзіўнае — вершнікі з ягонага дзесятка падтрымлівалі Хусейна, і гэта, вядома, было надзвычай адметнай з'явай. Цяпер на воіна скрыва глядзелі многія. Нават хану данеслі пра дзівака, але той, па-першае, спытаў:

— Што, ён многа забірае сабе з маіх трафеяў?

— Ды...

— Што, ён ваша забірае?

— Ды...

— Што, ён вашых палонных паадбіраў?

— Ды...

— Што вы ўсё «дыкаеце»?

— Ды ён, валадар, увогуле нічога сабе не бярэ.

— Вось як... Чаго ж вы прыйшлі скардзіцца на такога чалавека? Толькі з-за таго, што ён не крадзе, як гэта робіце самі? Прэч з вачэй, бо зараз загадаю ўсыпаць, каб ажно іскры з вачэй паляцелі!

Пабеглі даносчыкі ад хана, дзякуючы Алаху за тое,

што на гэты раз усё так добра абышлося. Уцяклі, параіліся паміж сабою і вырашылі, што ўсё роўна давядуць Хусейна ці да самагубства, ці да смерці якім іншым шляхам. Вядома ж, для гэтага ў іх было мноства магчымасцей. Адна ў хуткім часе прыспела. А здарылася вось што.

Атрад вершнікаў, у якім быў і дзесятак Хусейна, атрымаў загад прывезці для згаладалых коней сена. Цэлы дзень скакалі воіны, вечарам толькі прыпыніліся на пару гадзін перадыхнуць і зноў прыпусцілі далей. Пад раніцу выбіліся да паселішча. Хусейн са сваімі людзьмі знаходзіўся наперадзе. Яны віхурай праляцелі па пыльнай вясковай вулачцы і прысталі ў другім канцы, каб такім чынам адрэзаць шлях да ўцёкаў жыхарам вёскі. Неўзабаве застагнала, закрычала, загаласіла ўсё наваколле. Спяшаючыся, татары грузілі і грузілі розныя тавары, вопратку, прылады працы. Палонных зганялі ў адно месца, дзе сабралася ўжо шмат людзей.

Хусейн са сваім дзесяткам пакіраваў да крайніх будынін і прыспеў, як пазней аказалася, своечасова, бо ля адной з хацін некалькі сконеных вершнікаў, забаўляючыся, бегалі за дзяўчынай. Можа, і праехаў бы воін міма як ні ў чым не бывала. Але ў гэты самы момант сялянка прытулілася спінаю да сцяны і з адчаю загарлала на ўвесь голас:

— Дапамажыце, людзі! Дапамажыце! Татка, браткі мае мілыя, дапамажыце!

Азірнуўся Хусейн на крык і... ажно каня спыніў. Такой прыгажосці яму яшчэ бачыць нідзе не даводзілася. Сам, мабыць, не ведаючы чаму, воін скіраваў каня прама да татар, якія ўжо рвалі вопратку на прыгажуні. Саскочыў і, нібы кацянят, параскідаў грабежнікаў:

— А ну, пакіньце яе! Не чапайце! — зароў Хусейн сваім магутным голасам.— Пакіньце, бо галовы паадрываю!

— Ты хто такі, каб намі камандаваць? — злосна заверашчаў адзін з татар.— Можа мурза ці сам вялікі хан? Тады пакажы нам залатую зброю ці яшчэ які знак улады або багацця! Пакажы!

Астатнія двое гучна зарагаталі і выхапілі шаблі. Злосныя, расчырванелыя твары набліжаліся да ваяра. Але Хусейн іх не надта спалохаўся, бо ў бітве яму часта даводзілася аднаму змагацца і з большай колькасцю

воінаў, не менш вопытных. Ён таксама выхапіў шаблю і прыціснуўся да сцяны, каб ззаду ніхто не зайшоў. Дзяўчына тым часам, яшчэ разоў колькі зірнуўшы на свайго выратавальніка, хуценька паджгала да блізкага ўжо лесу. Ёй ніхто не перашкаджаў.

А ля хаціны завязаўся крывавы паядынак, дакладней, не паядынак, а бой з перавагай з аднаго боку. У паветры хутка мільгалі шаблі, высякалі іскры, звінелі. Хусейн злаўчыўся і сакануў аднаго з нападаючых па грудзях. Цяпер іх было толькі двое, і гэта значна спрашчала ягоную задачу. Цяпер можна было і ад сцяны адступіцца, што спрактыкаваны вой і зрабіў. Рэзка кінуўшыся на праціўнікаў, Хусейн прымусіў іх адступаць. Болей таго, адзін з татар пасклізнуўся і ўпаў на спіну. Праз імгненне ягоная галава пакацілася ўбок.

Адзін на адзін. Саперніку Хусейна ніякіх шанцаў на выратаванне не засталося. Дзесятнік славіўся тым, што ў паядынках заўсёды выходзіў пераможцам.

Бой скончыўся. Выцершы лязо акрываўленай шаблі, Хусейн сеў на каня і задумаўся. Назад, да арды, яму шлях быў ужо назаўсёды адрэзаны. Можна, канечне, было вярнуцца, але тады яго чакала пакутлівая смерць за тое, што пасек сваіх жа воінаў. Не, вой не палохаўся смерці. Ён не раз і не два сутыкаўся з ёю твар у твар і ніколі не адварочваўся, не саступаў дарогі. Проста яму, маладому зусім чалавеку, вельмі хацелася жыць. Пастаяў хвілін колькі Хусейн і пакіраваў коніка ў напрамку, адваротным таму, дзе стаяў татарскі атрад. Ад'ехаў, можа, з паўвярсты, ужо лесу дасягнуў і пачуў ззаду стук капытоў. Спачатку вою падалося, што гэта пагоня, але калі азірнуўся і ўважліва прыглядзеўся, то пазнаў воінаў са свайго дзесятка. Прыпыніўшыся, пачакаў, пакуль яны пад'ехалі да яго.

— Куды ж ты, Хусейн? — запытаўся самы стары і паважаны вершнік.— Куды ты едзеш? Што ты сабе, хлопча, думаеш?

— Няма мне дарогі назад, няма. А сам сунуць галаву ў пельку я не збіраюся. Мне жыць хочацца,— адказаў вой.

— Жыць яму захацелася... А ты пра нас падумаў?.. Ты ж ведаеш законы арды...

Так, ён добра ведаў законы арды і толькі зараз зразумеў, што калі б ягоныя воі вярнуліся без свайго

камандзіра, то іх усіх таксама чакала б смяротнае пакаранне. Пра гэта раней ён і не падумаў.

— Дык што ж тады рабіць? — разгублена павёў Хусейн плячыма,— я вырашыў ехаць наймацца, калі не пакараюць смерцю, на службу да мясцовага князя. Іншага выйсця ў мяне цяпер не застаецца...

— То і мы з табою паедзем. Нам таксама нельга назад вяртацца.

Праз пару дзён Хусейн са сваім невялікім атрадам выехаў прама на войска мясцовых дружыннікаў. Крыкнуўшы здалёк і паказаўшы, што кідаюць зброю, вершнікі падаліся да іх. Пакуль дапыталі чужынцаў, прайшла добрая гадзіна, і толькі ўжо потым павялі татар да князя. Хто яго ведае, як бы ўсё скончылася, але тая дзяўчына, якую выратаваў Хусейн ад згвалтавання і палону, таксама была ў лагеры і пазнала яго. Прыбегла прыгажуня да князя і пра ўсё падрабязна распавяла. Таму і залічылі чужых вершнікаў у войска князя.

Шчыра і сумленна служыў Хусейн са сваім дзесяткам новаму гаспадару. Не раз, не два ў крывавых паядынках скрыжоўваў зброю са сваімі былымі сабрацьцямі. Калі ён быў ужо ў сталым узросце, князь вырашыў аддзячыць татар.

На месцы цяперашніх Якшыц была паляна. Кругом яе рос густы лес са мноствам усялякага звера. На паляне было вельмі прыгожа. Аблюбаваў князь гэтае месца і надумаў падарыць яго свайму вернаму воіну. Той папрасіў дазволу, каб і ацалелыя вершнікі, з якімі некалі перайшоў на службу, таксама побач сталі жыць. Валадар супраць гэтага нічога не меў. А «прыгожае, харошае» па-татарску гучыць «якшы». Вось адтуль і вёска пачала называцца Якшыцы.



# КРУПКІ

Крупкі — яны крупкі і ёсць. Ад такіх, можа, грэчневых, а можа, яшчэ якіх, назва і пайшла. Усё вось як адбывалася.

Жыў-быў дзед з бабаю. Старыя яны ўжо былі, а сыны іхнія — не вельмі дарослыя. Познія ў іх дзеці. Тры сыны — што дубы, а яшчэ ніводзін не жанаты. Гэта падумайце толькі: бацька ў крук ад старасці гадоў сагнуўся, маці — ледзьве ногі перасоўвае, а ўнукаў не дачакаліся. Праўда, слухаліся іх сыны з першага слова. Не трэба было ім нешта ў спрэчцы даводзіць ці прымушаць рабіць. Сказалі што бацька ці маці — для дзяцей закон. Сыны здаравенныя, што мядзведзі, працавітыя надзіва, а гаспадарка ў бацькі не дужа вялікая была, не меў ён ладнага кавалка зямлі, не было чым заняць дзяцей. Таму, калі ўбралі сваю ніву, адзін з сыноў падышоў да бацькоў і кажа:

— Дазвольце, родныя, мне ў парабкі ці ў работнікі да каго наняцца. Пахаджу, папрацую год ці паўтара. І ў сям'ю прыбытак будзе, і сам не буду лайдачыць. Седзячы, разумныя думкі ў галаву не лезуць. Лайдаком за зіму такім стану, што вясною да плуга і блізка не падыду.

Бацькі для прыліку павагаліся, а потым і адказалі:

— Неблагую справу ты, сынку, задумаў. Не гонім мы цябе з хаты, але раз маеш ахвоту папрацаваць, то ідзі. Памятай, што і свайго хлеба ў нас да наступнага ўраджаю хопіць. Глядзі толькі, рабі ўсё так, каб потым людзі з нас не смяяліся, не папікалі.

Пайшоў самы старэйшы сын, а звалі яго Мартын, з бацькоўскай хаціны. Ішоў амаль да вечара па дарозе — нікога не сустрэў. Ажно нарэшце бачыць — едзе вазок і сядзіць у ім бацюшка.

— Куды ты ідзеш? — пытаецца ў дзецюка.

— Іду я, бацюшка, у свет, каб праверыць сябе. Ды і не хочацца мне сядзець гэтулькі часу на печы ці з дзяўчатамі пагульваць. Грошай крыху зараблю, сабе добра будзе і бацькам дапамагу. Усё ж нейкі прыбытак...

Дык бацюшка і ўхапіўся за слова:

— А вось што, хлопча, заставайся ў мяне служыць. Я табе абяцаю, што ўсё будзе добра. Ежу стану даваць, грошы... Не пашкадуеш. А праца ў мяне не надта цяжкая, так сабе — па падвор'ю корпацца...

— Тады я ў вас, бацюшка, і застануся. Толькі ж вы глядзіце, не падманіце мяне.

— Ды што, на мне крыжа няма ці што? Раз сказаў, так і зраблю, сам пабачыш.

Так і паехаў Мартын да бацюшкі дамоў. Прыехалі, калі ўжо зоркі ў небе засвяціліся. Заводзіць гаспадар будучага работніка ў хату і за стол саджае. Ежу, праўда, добрую паставіў. Відаць, каб дзяцюк не западозрыў чаго-небудзь. Павячэралі, і тады гаворыць бацюшка:

— Ідзі, Мартыне, ды кладзіся спаць, бо заўтра, ледзь толькі пашарэе на вуліцы, я разбуджу цябе малаціць...

— Малаціць дык малаціць, няма чаго асабліва баяцца, ці мне ўпершыню такі занятак... Толькі скажыце, і ўсё зробім у найлепшым выглядзе...

Пакаёўка павяла работніка спаць. Паказала месца, там ён адразу снопам і зваліўся, бо здарожыўся дужа за дзень.

Яшчэ і пеўні трэція не прапялі, не распалавінілі ночку і дзень, а бацюшка ўжо хлопца катурхае, злуючыся:

— Уставай, уставай. Чаго ляжыш? Ужо дзень даўно

пачаўся, а ты яшчэ за працу не браўся. Час уставаць і ісці малаціць...

Хуценька Мартын на ногі ўзняўся, апрануўся і аслупянеў: на вуліцы яшчэ ноч глыбокая стаяла, і не днела, а, наадварот, цямнела. Але што рабіць заставалася? Калі працаваць наняўся, то любы гаспадар — твой валадар, і нічога ўжо не зробіш. Ухапіў цэп і пайшоў за бацюшкам да гумна. Усярэдзіну як зайшлі, то хоць ты вока выкалі — нічога не відаць. Гаспадар паказаў, дзе што рабіць, куды ссыпаць, і сам джгануў дасыпаць у мяккую пасцель, пакінуўшы Мартына аднаго.

Малаціў-малаціў, малаціў-малаціў хлопец, стаміўся незвычайна, але яшчэ болей — есці захацелася. Смокча пад лыжачкай, а нікога няма: ні гаспадара, ні гаспадыні, ні нават той пакаёўкі, якая яго спаць праводзіла. Ужо такую гурбу зерня намалаціў, што ўтраіх за суткі не зрабілі б, а першыя прамяні сонейка толькі-толькі з-за лесу выглянулі. Сеў, бо сілы неставала, пот выцер і думае, як жа далей быць. У гэты самы момант матушка прынесла яму ў збаночку вады халоднай:

— На, Мартынка, падмацуйся. Бацюшка сказаў, што ты павінен да полудня яшчэ і гэтае жыта памалаціць,— і на другую, яшчэ большую, гурбу снапоў паказвае.

— Я, матушка, вадзіцы не хачу, мне надта есці хочацца...

— Але мне бацюшка пра гэта нічога не казаў. Ён сказаў, што вы дамаўляліся паміж сабою...

— Дамаўляцца-то дамаўляліся, але ж есці хочацца. Як жа я вам далей працаваць буду, калі сілы нестае? Упаду хутка, і ўсё на тым...

Бацюшка ж хітры надта, за дзвярыма сам стаяў і ўважліва слухаў, пра што Мартын з матушкай гамонку вядуць. Як пачуў пра заяву дзецюкову, то адразу выскачыў:

— Бачыш ты на яго! А хіба ж ты забыўся пра нашыя ўмовы?

— Я пра ўмовы не забыўся, але ж і вы казалі, што будзеце добра мяне карміць.

— Абяцаць-то абяцаў, але ж ты яшчэ збожжа не ўсё памалаціў, значыцца, і не зарабіў.

— Як гэта?

— А вось так.

— Ды я тады...

— Памалаціў палову майго збожжа і пагражаеш? Мне такія работнікі не патрэбны, пайшоў прэч з майго падвор'я! Хутчэй, а то яшчэ сабак спушчу!

Так і пайшоў бедны дзяцюк: галодны і стомлены, нават слова падзякі простае ў свой адрас не пачуў. Пахадзіў яшчэ, можа, з тыдзень, але нідзе болей на працу не ўладкаваўся, таму вымушаны быў вярнуцца дамоў. Убачылі яго родныя і ўсё зразумелі. Ніхто не дакараў, слова благога не сказаў, бо бачылі, што Мартыну і так балюча.

Раніцай падышоў да бацькоў другі сын, якога звалі Антось. Стаў і, нерашуча перамінаючыся з нагі на нагу, прамовіў:

— Тата, матуля, я... гэта... вырашыў таксама ісці... пашукаць працы... Мартыну не пашанцавала, то, можа, мне болей падфарціць. Трэба ж, каб нехта працаваў. Грошы нам неабходны, ды і збожжа мех-другі не пашкодзіць...

— Можа, сынку, не трэба... Сядзі лепей дома, адпачні, да вясны сілы набярыся. Хлеба і свайго хопіць.

— Не, родныя, пайду. Няўжо не пашанцуе? А адносна таго, што нехта благія словы пра мяне казаць стане,— не сумнявайцеся. Усё будзе добра.

— Ідзі тады з Богам. І каб усё сапраўды найлепшым чынам атрымалася...

Сабраў Антось такія-сякія рэчы і пакрочыў, як зусім нядаўна Мартын, з дому.

Ідзе па дарозе, ідзе — ніхто насустрач не трапляецца. На колькі хутароў заходзіў, але там работнікі не патрабаваліся.

Пашанцавала недзе пад самы вечар. Антось ужо да таго стаміўся, што ледзьве ногі пераастаўляў, і бачыць — едзе наперадзе вазок, а ў ім нехта сядзіць. Параўняўся з дзяцюком конь, а ў вазку тым бацюшка. Заўважыў дзяцюка і звяртаецца да яго:

— Куды гэта ты, чалавеча, на ноч гледзячы, крочыш?

Антось ідзе далей, нібы не да яго звяртаюцца. Але і бацюшка не адстае, цікаўны надта трапіўся:

— Куды, пытаюся, ідзеш, на ноч гледзячы?

Устрапянуўся хлапчына дый гаворыць:

— А вось іду па беламу свету, службу-працу сабе шукаю. Можа, недзе пашанцуе. Справа ў тым, што ў нас сям'я і не надта вялікая, але зямлі мала, дык да-

водзіцца шукаць месца, дзе можна было б разжыцца...

— У мяне ёсць многа працы, то, можа, застанешся?

— А якая праца?

— Ды самая простая: па падвор'і падбіраць, на ніве зрэдку пабываць і гэтак далей...

— А плату якую мне пакладзеш?

— Многа не дам, але думаю, што будзеш задаволены: грошай заробіш, колькі мяхоў зерня, ды яшчэ з ежы буду пастаянна падкідваць...

— Што ж, раз так усё будзе, то я згодны. Застануся.

— Заставайся, але пры адзінай умове, што не будзеш ні мне, ні маім блізкім і родным пагражаць.

— Такога не будзе.

— Ну, то садзіся ў вазок.

Селі яны ў вазок і паехалі. Пакуль прыехалі на падвор'е, неба было ўжо зоркамі ўсыпана. Селі за стол, давай вячэраць, а бацюшка ўсё выпытвае:

— А ці няма ў цябе, чалавеча, братоў?

— Ёсць. Два браты яшчэ, адзін старэйшы, а адзін малодшы. Нядаўна старэйшы хадзіў працу шукаць, ды няўдала, на нейкага скнару нарваўся. Таму дамоў вярнуўся, а я пайшоў па ягоных слядах, каб у хаце не сядзець.

— Усялякае здараецца,— прамямліў бацюшка і працягваў: — Пайшлі, Антось, спаць, бо заўтра раніцай разбуджу цябе на працу.

— Працы я не баюся, нават самай цяжкай,— адказаў работнік, кіруючы за пакаёўкай, якая вяла яго спаць. Хлопец жа думаў, што ўсё будзе па-чэснаму, як і дамаўляліся.

Толькі, здалося Антосю, заснуў, як яго ўжо нехта катурхаў з усяе сілы:

— Уставай, чалавеча, час малаціць прыспеў.

Зірнуў ён праз дзверы ў двор, а там не святлее, а, наадварот, цямнее. Ды нічога рабіць не заставалася, пашкандыбаў за гаспадаром. Бацюшка і на гэты раз паказаў кучу збожжа:

— Вось гэта перамалоціш. Малавата тут, сам жа бачыш, але на сёння досыць...

Малавата толькі на першы погляд, бо калі пачало днець, Антось заўважыў, колькі сапраўды збожжа ў гумне навалена. Малоціць і малоціць, лупцуе цэпам, не разгінаючыся. Спіна ажно задубела, кашуля ад поту зацвярдзела, а ён шчыруе, стараецца зрабіць усё

і потым ужо адпачыць. Развіднела добра, сілы ўжо нестае далей гэтак малаціць, есці страшэнна захацелася, пазірае і пазірае ў дзверы, можа, там нехта есці нясе. Але нікога не было. «Вось гэты сноп дамалачу і сяду адпачываць. Няхай яно згарыць...» — падумаў хлопец. Дабіў сноп і сесці збіраўся, але ў гэты момант пачуўся голас матушкі:

— Антоська, а я табе вадзічкі халодненькай прынесла. Можа ты піць захацеў?..

— Піць-то не вельмі, патрываць можна, а вось есці хачу, нібы тыдзень галадаў... Можа нешта перакусіць прынеслі?

— Я нічога не прынесла. Вы ж неяк там з бацюшкам дамаўляліся... Адносна гэтага я нічога не ведаю. Ён прыйдзе, тады і разбірайцеся...

— Дык што, есці нічога не прынеслі?..

— Не...

— А як жа мне далей працаваць, калі сілы нестае?..

— Можа, бацюшка хутка прыйдзе, Антоська, то ты з ім разбірайся. Я ж не магу табе дапамагчы.

А бацюшка той хітры быў, скнара, якіх пашукаць ды і ці знойдзеш. Стаіўся за дзвярыма і ўважліва слухае, як Антось матушку дапякае. Чуць-то чуў, але ж прыдрацца не было за што, а як пачаў работнік гаварыць, што без ежы працаваць не здолее, дык тут гаспадар і выскачыў неспадзеўку:

— Што ты, чалавеча, працаваць на мяне не жадаеш? А ўмова наша, дамоўленасць як жа?

— Дамаўляцца, сапраўды, дамаўляліся, але ж трэба і вам свае абавязкі выконваць. Вы ж мяне абяцалі добра карміць, калі я, адпаведна, добра працаваць буду. Я стараюся, бачыце, якая кашуля на мне, а вы і карміць не жадаеце...

— Ты ж яшчэ працу не скончыў, пра якую ежу можа гаворка весціся?..

— Але ж...

— І чуць нічога не хачу!

— Ды я...

— Збірайся і кіруй за вароты, мне такія працаўнікі не патрэбны ў двары. Мала чаго каму захочацца. Ці ж я ўсё здолею выканаць, выправіць?

— Ой, як вам не сорамна, бацюшка...

— Кіруй з двара, пакуль сабак на цябе не натравіў!

Нічога іншага не заставалася Антосю, які ісці з падвор'я галоднаму і пакрыўджанаму. Угнуўся так,

што галава ажно да пояса схілілася, і паджгаў. Куды ісці, яшчэ не думаў, але ў работніках хадзіць расхацелася. Пераначаваў ночку-другую ў глухіх мясцінах, каб ні з кім не спаткацца, і пасунуўся паціху дамоў. Падышоў да роднай хаты, а ногі, нібы чыгунныя, ісці не хочуць. Ведама ж, сорамна, ды што ўжо рабіць. Прысунуўся неяк на падворак і сеў прысаромлена ля калодзежа. Тым часам выйшаў бацька з хаты, браты папрыбягалі, што ды да чаго распытваюць. Антось маўчыць, здаецца, вось-вось заплача небарака ад усёй той гаркоты, якая на сэрцы сабралася.

— Чаго ўжо, сынку, гэтак убівацца? — сказала матуля і ласкава пакратала Антося за плячук.— З кім не здараецца ў жыцці? Каб жа ведаў наперад, што будзе, то бокам абышоў бы ці ўвогуле схаваўся б і не вылазіў. Чаго ўжо так перажываць? Жылі ж неяк і далей жыць будзем...

Браты пачалі суцяшаць хлопца, бацька сказаў, каб кінуў дурное, бо і на сваім двары працы па вушы хопіць, не трэба недзе лазіць ды шукаць немаведама чаго.

Супакоілі крыху Антося, адгаварылі ад чорнага смутку і, перакусіўшы, спаць палеглі, а раніцай, як толькі ўсталі, стаў перад бацькамі трэці сын іхні — самы малодшы, Юрась.

— Браты мае родныя пахадзілі, пашукалі свае долі, адпусціце і мяне, а можа, мне пашанцуе якраз...

— Чаго ўжо табе, сыночак, не сядзіцца?

— Не магу глядзець на братоў, як яны пакутуюць, а калі я працу знайду і падзараблю, то і ім будзе суцяшэнне.

— Не трэба, паслухайся ты нас.

— Не адгаворвайце мяне, тата і мама, усё роўна я на сваім настою і ў дарогу пакірую.

— Як хочаш. Толькі глядзі, каб не пашкадаваў потым. Сам бачыш, як браты пасля няўдачы перажываюць.

— Бачу, таму і слова дрэннага не скажу, і ў думках нічога такога не падумаю.

Так і не адгаварылі бацькі Юрася. Сабраў ён сабе нешта ў кайстру і пайшоў з дамоўкі, нізка перад развітаннем усім пакланіўшыся.

Ідзе ён, ідзе, ужо другі дзень пайшоў, але ні да каго пакуль што на працу ўладкавацца не здолеў. Не патрабуюцца работнікі, дый годзе. Замаркоціўся хлопец.

Аглядваецца па баках, шукае сабе прытулак на ноч. А дзе ж ты яго знойдзеш, калі навакол толькі кустоўе ды лясы густыя раскінуліся. Ажно бачыць — едзе насустрач вазок, парай коней запрэжаны. Параўняўся вазок з падарожным, а ў ім бацюшка сядзіць:

— Куды гэта ты крочыш, на ноч гледзячы, чалавеча?

— Шукаю сабе працу.

— Вось як...

— Ага...

— А якая ж табе праца патрэбна?

— Ды мне асаблівай розніцы няма, каб толькі заплацілі грашыма і збожжам добра, бо ў нас сям'я невялікая, але зямлі таксама малавата і зерня не хапае да вясны. Вось па гэтай прычыне я і пакінуў родны дом ды ў свет белы пайшоў.

— Слухай, а можа, ты ў мяне працаваць застанешся?

— А якая ў вас праца?

— Праца не надта цяжкая: па падвор'і парадак наводзіць, у агародзе ды ў полі паглядзець, па гаспадарцы нешта дапамагчы...

— А плаціць чым станеце?

— Як ты і просіш, чалавеча, грашыма ды збожжам.

— Можа і крупак накінеце?

— А чаму ж не.

— То я згодны.

— Дык сядай у вазок, да мяне дамоў паедзем, чаго дарма час бавіць ды ногі таміць.

Якраз добра сцямнела, калі яны да папоўскай хаты дабраліся і есці селі. Перакусілі, бацюшка пацягнуўся соладка і гаворыць:

— Ідзі спаць, Юраська, а то заўтра з раніцы працаваць пойдзеш.

— А мне не прывыкаць, бацюшка,— адказаў хлопец і пайшоў за пакаёўкай, якая павяла яго на начлег.

Не паспеў дзяцюк яшчэ і вачэй добра самкнуць, а гаспадар яго ўжо будзіць:

— Уставай, Юрась! Уставай! Час малаціць!

Усхапіўся работнік, а на вуліцы яшчэ і зоркі, нават самыя першыя, не патухлі. Ды што тут пярэчыць станеш, калі сам наняўся на такое.

Заводзіць яго бацюшка ў гумно і на вялізную гурбу снапоў паказвае:

— Вось гэта сёння змалоціш і хопіць. Колькі тут таго збожжа...

Пачаў завіхацца хлопец. Малоціць-малоціць, а тым часам і сонца ўзышло і дзень ужо да полудня набліжаецца. Есці захацелася работніку, паглядвае на дарогу да хаты, ці не ідзе там хто. Нікога не было. «Ну, што ж,— думае,— як-небудзь дараблю да канца. Патрываю...» Лупіць цэпам, а ў вачах ад стомы ўжо пацямнела. І ўсё-ткі закончыў малаціць. Сеў ля парога — ажно і матушка з глякам:

— А я табе, Юраська, вадзіцы халодненькай прынесла.

— Вось дзякуй,— адказаў хлопец і выпіў нагбом увесь гляк адразу.

— А можа, ты і есці хочаш?

— Не, не хачу. Спаць пайду, бо я працу на сёння, як бацюшка і сказаў, ужо зрабіў...

Пачуў такія словы гаспадар, выскачыў, а зрабіць нічога не можа — сам сказаў. Папрыгаў, папрыгаў і пайшоў прэч.

Юрась выспаўся і на падвор'е выйшаў. Гаспадар жа ажно счарнеў ад злосці, але выгляду не паказвае.

— Паспаў? — пытаецца.

— Ат, перадрамаў крышку,— адказвае работнік.

— То пойдзем, можа, да вечара яшчэ нешта зробім?

— Зробім, чаму не, але плаціць вы мне будзеце асобна за кожную выкананую работу. Згода?

— То можа, табе ўжо і сняцца мае крупкі?

— Сніцца не, але свайго я вам не пакіну, і не падумайце!

— Бачыш ты які работнік у мяне,— зазлаваў бацюшка, але што ён мог зрабіць здаравеннаму, нібы мядзведзь, дзецюку? Юрась запатрабаваў, то гаспадар адразу ўсё і выплаціў, напярод даў. Шкада было гэтулькі збожжа ды грошай аддаваць, але і пярэчыць не станеш, бо работнік не з жартаўнікоў, як трэсне магутным кулаком, як возьме за каўнер, то і вішчаць будзеш, але не надта гэта дапаможа.

Так у іх і павялося: бацюшка загадвае — работнік выконвае, але пры гэтым патрабуе:

— Гаспадар, адразу ж і плаціце.

Бацюшка злуецца і скрозь слёзы кажа:

— І крупак насыпаць?

— І крупак,— мовіць Юрась і рагоча.

Адбыў ён увесь тэрмін і ледзьве завёз на двух вазах

дамоў заробленае. А бацюшка застаўся ні з чым, на гэты раз яго пакінулі з носам, але замацавалася затое за злыднем мянушка. Ледзь што — дык нехта з жартаўнікоў і кіне:

— А, гэта той, што крупак набаўляў...

Бацюшка той неўзабаве памёр, але назва засталася ў паселішча, якое на ягоным падвор'і пазней узнікла, дзіўная — Крупкі.

## ХАЛОПЕНІЧЫ

Гэта ўсё ад аднаго пана павялося, крывасмока. Ён застаўся ў памяці людской не сваёй дабрынёй ды шчырасцю, а злосцю, ненажэрнасцю, крывадушнасцю.

У адным месцы, далекавата яно было ад сённяшняга нашага паселішча, гаспадарыў памешчык, ды такі дзікі і страшны, што ім заўсёды людзі дзяцей сваіх палохалі. Вось ужо для каго людское жыццё нічога не каштавала. Нашы продкі нават імя ягонае ці прозвішча да нашчадкаў не данеслі, бо нікчэмны быў чалавек, і памяць пра яго справядліва павінна зраўняцца з тым чартапалохам, што на яго магіле недзе вырас. Прыгожыя краскі ў добрых душах цвітуць, а такія...

Меў ён зямлі і ўсялякага набытку вельмі многа. Ад бацькоў усё да яго перайшло ў спадчыну. Але па характары сваім быў, то, можа, на зямлі ўсёй Божай за яго хужэйшага нідзе і не сустракалася. Каб мог, то, відаць, і за ваду з сялян браў бы грошы, за паветра, якім яны, небаракі, у такога ваўкалака знаходзячыся ў падпарадкаванні, дыхалі. Слуг усялякіх, цівуноў ды войтаў заводзіў, на сябе падобных. Спачатку доўга прыглядаўся да вяскоўца, толькі потым ужо да сябе ў двор забіраў. Як яны ні імкнуліся заслужыць павагу нейкую ці падзяку — усё роўна пан і ім не давяраў, сам усё пераправяраў і калі ўжо знаходзіў нейкі хіб, то не глядзеў, што надта прыбліжаным да яго быў былы селянін. Раўне страшным голасам, ажно коні папрысядаюць:

— На стайню галгана! На дубовы палок яго! Усыпаць так, каб да скону жыцця памятаў пра тое, чым трэба займацца на панскай гаспадарцы і як усё выконваць! Не шкадаваць яго, каб іншым не зайздросна было такое вырабляць! На палок яго!

Ведалі ўсе людзі дурнога памешчыка, што такое

«дубовы палок». Гэта быў звычайны ўслон-раскірэка, толькі зроблены з таўшчэразнай дубовай плахі. Да яго прывязвалі распранутага чалавека і пачыналі катаваць. Таму, калі толькі чуўся голас гаспадара і згадванне пра дубовы ўслон ці палок, то ўсе, хто знаходзіўся недзе ў патаемных мясцінах і іх там не мог заўважыць вылюдак, пачыналі жагнацца. З палка назад, у жыццё, небарацы шляху ўжо не было. Вывезуць за вёску, нібы сабаку бязроднага, і ўкінуць у наспех вырытую яміну, каб гаспадар чаго не заўважыў і не ўзлаваўся.

То ён са слугамі сваімі гэтак абыходзіўся, а што ўжо пра простых сялян казаць. Мала, што сам пан цікуе-вызірае, то шматлікія паслугачы жыцця не даюць сваімі прыдзіркамі. Паспрабуй толькі не зрабі, як было загадана, ці недзе агрызніся або зірні скоса, то спіну да жывога мяса спаласуюць ды соллю прысыплюць, каб надалей безагаворачна выконваў загады.

Адным словам, не жытка, а суцэльныя пакуты былі ў тамтэйшых жыхароў. Што захоча памешчык — тое і зробіць. Нікому нават не паскардзішся, не выплачаш набалелае. Паспрабуй толькі! Сам потым пашкадуеш, калі ў жывых застанешся!

Старэў пан, але нічога не мянялася ў лепшы бок. Наадварот, яшчэ болей лютаваў гаспадар. Ужо звярталіся людзі да Бога, каб хутчэй забраў гэтага крывасмока, але Усявышні забіраў тых, хто прасіў і маліўся, а яго пакідаў. Відаць, і сам не ведаў, куды запіхаць душу гэткага ваўкалака пасля смерці. Так і вялося дзесяткі гадоў, і што ні год, то ўсё горай і горай станавілася тубыльцам.

Аднаго разу панскі войт сабраў жыхароў з пяці ці шасці бліжэйшых вёсак і, пачухваючыся ды пасмейваючыся, бо перад сялянамі адчуваў сябе вяльможным, пракрычаў:

— Слухайце, смердзюхі! Тут наш пан загадаў...

Пачулася выразнае пакрэктванне войта, ніяк не мог пераадолець смех, які, мабыць, рваў яго зараз на часткі.

— Карацей, пан загадаў, каб з заўтрашняй раніцы... у ягоны палац пазбіраліся ўсе маладзіцы, якія маюць немаўлят...

Натоўп панура маўчаў. Толькі пераглядваліся ачмурэлыя людзі паміж сабою і ніяк не маглі дайсці да сэнсу пачутага. Такога яшчэ не было.

— Зразумелі? — запытаўся войт і спахмурнеў.— Не можаце дацяміць? То я вам крыху болей раскажу. Пан жадае, каб да яго папрыходзілі да сняданку жанчыны, якія кормяць грудзьмі дзяцей... Цяпер зразумелі?

Людзі толькі перашэптваліся, але ніхто не асмельваўся гучна адказаць. Войт не вытрымаў і гыркнуў:

— Глядзіце, няхай толькі каторая не пойдзе ў двор, а дзе схаваецца... То я хутка знайду!

Памаўчаўшы, дадаў:

— І сам здаю...

Голасна зарагаталі толькі ягоныя паслугачы, а вяскоўцы пасунуліся па хацінах.

Раніцай перад панскім палацам сабралося некалькі соцень жанчын. Тут былі кабеты сталага ўзросту, якія выгадавалі ўжо з дзесятак дзяцей, і маладзіцы, якія толькі нарадзілі першы раз у жыцці. Спалоханыя жанчыны, апранутыя ў самую лепшую вопратку, стаялі і маўчалі. Кожная з іх баялася таго, што чакала наперадзе. Глядзелі на панскі ганак, нібы на мясціну, адкуль павінен быў з'явіцца нейкі цуд.

Прайшла добрая гадзіна, але нікога не было. Толькі слугі, нібы здаравенныя слупы, знерухомелі вакол палаца. Мінула другая гадзіна — ніхто на ганак не выходзіў. Сонейка залівала сваім шчырым святлом усё навокал. Некаторыя з жанчын захваляваліся, і пачуліся шэпты:

— Як жа там маё немаўлятка?

— У мяне малако ў грудзях гарыць...

— Што рабіць, я свайго, калі сюды бегла, то і не карміла...

— Думала, на нейкую гадзіну, а тут...

— Там плача-разрываецца мая дачушка... Яна ж у мяне гэткая неспакойная і хваравітая, не дагледзіш, то і адкідвае якая пошасць...

— Эх, маладзічка, ды не ў адной жа цябе такое гора...

Жанчыны занепакоіліся і гаманілі ўжо крыху грамчэй, але ў гэты самы момант разлёгся вокліч аднаго са слуг:

— На калені, кароўкі! На калені! Сам пан-гаспадар да вас кіруе!

Праз нейкую хвіліну на парозе паказаўся той, каго гэтак баяліся і кім палохалі дзяцей. Ён быў падобны на ссохлага смарчка. Невялічкага расточку,

у бруднай, але надта дарагой вопратцы, памешчык і хвілінкі не мог пастаяць спакойна на адным месцы. Яго то падкідвала і перакочвала з аднае нагі на другую, то трасло ў нейкай невядомай іншым хваробе. Вочкі гэтаксама бегалі па жаночых тварах. Той, на кім яны спыняліся хоць на момант, адразу адчуваў, як у яго па спіне беглі мурашкі.

— Я чаго вас сабраў...

Гаспадар гаварыў надзіва гучным голасам.

— Для таго... Для таго, каб вы сваё малако, якім дзяцей корміце, тут сцэджвалі і злівалі вунь у тую балею. Малако пазліваеце — і па хатах... Вечарам каб зноў тут збіраліся і тое ж самае рабілі...

— А чым жа мы сваіх дзетак карміць будзем? — ненарокам, мабыць, вырвалася ў нейкай матулі.

— Хто гэта сказаў? — адразу ўскінуўся памешчык.— Хто асмялеў гэтак? Пакажыце мне яе,— звярнуўся ён ужо да сваіх слуг, але тыя толькі разгублена насіліся вакол натоўпу. Не бачылі яны тую жанчыну, якая запыталася, не маглі на гэты раз дапамагчы гаспадару. Той ад такога ажно ўзвіўся:

— За што я вас кармлю, дармаеды? Маю вопратку носіце, мой хлеб ясцё, а нічога не робіце! Шукайце яе, а не — то загадаю кожнаму другому з вас урэзаць добра бізунамі!

Кінуліся пранырлівыя служкі ў натоўп і... неўзабаве выхапілі з яго зусім маладзенькую жанчыну, якая была падобна хутчэй на падлетка, чым на кормячую маці. Яна адбівалася, крычала, што не вінавата, што не казала тых слоў, ды хто там слухаў. Нехта з жанчын не вытрымаў і крыкнуў:

— Яны ж, пане, проста схапілі бедалагу, бо баяцца, што іх пакараюць! Схапілі абы-каго, каб толькі самім на стайню не ісці!

Памешчык не слухаў крыкаў з натоўпу, ён утаропіўся ў жанчыну, якую валаклі да яго.

— Што ж гэта ты, шаноўная, гэтак мяне абражаеш? Што ж гэта ты не паважаеш маіх сівых валасоў? Няўжо і я, твой пан, для цябе нічога не значу? Га?!

— Я нічога не казала... Я нічога не гаварыла...

— То што, можа, памыліліся мае слугі?..

— Так...

— Ого, дык ты яшчэ і маіх слуг абражаеш! Цягніце сюды дубовы палок і тут яе адлупцуйце, каб астатнія бачылі і ніколі болей мяне не перабівалі!

— Паночку! — загаласіла маладзіца.— За што?

— Хутчэй! — вызверыўся памешчык, і чалавек колькі служак плетанула на стайню.

Як ні малілася, як ні поўзала на каленях бедная жанчына, памешчык яе не пашкадаваў. Збілі бедную так, што сялянкі ў натоўпе галасілі, гледзячы, як яе, непрытомную, неслі да іх. Толькі надта плакаць ім не далі.

— Злівайце сваё малако, куды вам сказалі, і кіруйце па хатах. Ды на працу выбірайцеся, а вечарам каб зноў тут былі, усе да адной! — прагучаў нейчы голас.

Што заставалася рабіць жанчынам? Выканалі загад і пайшлі-пабеглі, а дарогаю некаторыя з іх перапытвалі:

— Навошта гэта яму? Няўжо зусім, злыдзень, здзяцініўся?

— Можа піць наша малако стане?

— Каб яно яму смалою стала!

— Я чула некалі ад сваёй матулі, жанчынкі, вось што,— мовіла кабета, якая ажно задыхалася ад таго, што была задужа тоўстай.— У малацэ старыя паны купаліся, каб захаваць жыццёвыя сілы, вярнуць маладосць састарэламу целу... Мне нябожчыца-маці так і казала...

— Каб ён купаўся ды не выплыў! Каб ён у ім глотку сваю заліў назаўсёды!

Пагаманілі ўподбежкі небаракі ды па хацінах разбегліся, бо да сваіх немаўлят трэба было зазірнуць ды на працу панскую кіраваць, а то паслугачы свае абавязкі добра ведалі, адразу б данеслі.

Калі вечарам сабраліся зноў ля панскага палаца, то ўсіх іх ажно затрэсла. Ля той здаравеннай балеі бегалі панскія сабакі і, весела пагірквалючы, часам, прыпадалі да таго, што яшчэ заставалася ў пасудзіне.

— Сабак сваіх нашым малаком карміць, а вы ж казалі, што купаецца... Дадумацца нават не маглі мы да такога, не тое што...

Натоўп панура змоўк. Найбольш здарожаныя і знясіленыя за доўгі дзень цяжкай працай прыселі на траву. Слугі не перашкаджалі, бо пана не было і ніхто такога парушэння парадку заўважыць не мог.

— Людцы, людцы, чуеце, што я вам зараз скажу,— ціха зашаптала жанчына, якая толькі прыбегла.— Наша Тэкля памерла ўжо...

— Якая Тэкля? — не зразумелі многія і цясней абступілі жанчыну.

— Маладзіца, якую тут раніцай моцна збілі... Тую, якую неслі дамоў беспрытомную...

— Вось табе і на...

— А хто ў яе застаўся?

— Немаўлятка... Алеськай завуць, ды муж-здаравяка... Сымонам у нас яго клікалі... Кавалямі былі яго дзед, яго бацька, і ўнуку перадалі гэты занятак... Старых ужо няма сярод жывых, і жонка памерла...

— Як жа ён будзе адзін з такім маленькім дзіцём на руках?

— Аднаму Богу, жанчынкі, вядома, аднаму Богу...

Усе заціхлі, бо на ганак выйшаў гаспадар.

Дамоў людзі вярталіся, калі ўжо добра сцямнела. Зацята маўчалі, адно толькі — звінелі шматлікія камары ды патрэсквала голле пад нагамі.

У хаце Сымона стаяла труна, і ў ёй ляжала зусім яшчэ нядаўна прыгожая і вясёлая Тэкля. Гаспадар сядзеў, абхапіўшы галаву магутнымі рукамі, і аб нечым думаў. Калі заходзілі вяскоўцы, то, здавалася, ён іх не заўважаў.

Пахавалі жанчыну ноччу, бо днём нестала б часу, а трымаць яе болей у душнай хаціне не выпадала, памерлая пачынала смярдзець і чарнець. Загрукалі па дамавіне камякі глебы, ціхенька зашурпацелі рыдлёўкі, і ўсяго праз нейкую хвіліну ўсё было скончана. Магло нават падацца, што чалавек той увогуле не існаваў сярод жывых, яго не было. Можа, яно і так. Але толькі для людзей, якія не ведалі Тэклю, не размаўлялі з ёю, не лашчылі яе сваімі рукамі, не змыкалі вачэй, гледзячы на яе прыгажосць. А для Сымона яна пакуль што была жывою: гучаў родны голас, здавалася, што зараз нябожчыца звернецца да мужа з нейкім пытаннем. І самае галоўнае, што дома соладка спала немаўля — Алеська, якая пакуль яшчэ нічога такога не разумела.

З таго самага вечара пачалі адбывацца ў наваколлі нейкія дзіўныя з'явы. Аднаго разу войта, які ехаў з далёкай вёскі да свайго пана, знайшлі толькі раніцай — ён вісеў, высалапіўшы язык, на прыдарожнай бярозе, і вецер ціха пагойдваў яго тоўстае цела. Падумаць, што гэтаму служку надакучыла жыць і ён сам павесіўся, ніхто нават не мог.

Потым колькі разоў гарэлі зыркім полымем панскія

сцірты з хлебам, гінулі дзесяткі коней і кароў. Яны то проста не вярталіся з пашы, разам з пастухамі, і канцоў нельга было адшукаць, то знаходзілі жывёлу, але ўжо нежывую.

Можа, праз год вяскоўцы патаемна зашапталіся, што з'явіліся нейкія людзі, якія не палохаюцца памешчыка і ягоных слуг, а толькі чакаюць зручнага выпадку, каб з ім расквітацца. Будзе нейкі знак, і тады трэба прыйсці на дапамогу, бо людзей тых, смелых і адчайных, яшчэ вельмі мала і яны могуць не перамагчы ў адкрытым нападзе на маёнтак.

Чакаць давялося не так ужо і доўга. Недзе позняй вясною наступнага года, калі ўсё наваколле спала непрабудным сном, зазвінелі званы ў мясцовай царкве. Пачалі выскакваць з хацін перапалоханыя вяскоўцы, не надта разумеючы спрасонку, што там да чаго, і перапытваючы ў суседзяў:

— Што? Што здарылася, братка? Можа ты ведаеш?

— Ды не таксама... Толькі выскачыў, нават апрануцца як след не паспеў... Нічога не разумею... Можа нехта ўжо пачуў, то давай туды падыдзем...

— Давай...

Гэтак збіраліся людзі ў невялічкія купкі і гадалі, чаго гэта за высокім і непралазным лесам гудуць званы, не заціхаюць, а, наадварот, яшчэ больш голасна і трывожна клічуць...

Так, магчыма, і да раніцы не здагадаліся б, але недзе з цемры выскачыў на вясковую вуліцу вершнік і зычным голасам, нікога не палохаючыся, загарлаў:

— Чаго не радуецеся, сяляне? Чаго шэпчацеся? Не бойцеся болей нікога! Няма чаго баяцца, жыць трэба!

— Бач ты, раскрычаўся нечага,— абарваў крыклівага конніка нехта з сялян,— паглядзім, як ты завярашчыш, калі па тваёй спіне панскія бізуны паскачуць... Мабыць, яшчэ галасней выць станеш...

Навокал зарагаталі. Не надта весела, але ўсім прыгадалася, як такія, што любілі павыхваляцца, паводзілі сябе на дубовым палку. Ды толькі вершнік не пакрыўдзіўся, а таксама зарагатаў з людзьмі. Потым, калі ўсе супакоіліся, працягваў:

— Ды я ж таго і прымчаў да вас сярод цёмнай ночы, баючыся сабе шыю скруціць дзе-небудзь на лясной дарозе. Пана нашага болей няма... Апруцянеў

злыдзень, і дабро ягонае яркім полымем пайшло... Таму і сам радуюся, і вас хачу парадаваць...

Такой навіне адразу не паверылі.

— Ты, чалавеча, ведаеш, што за такія жартачкі табе можа быць? Думаеш, як зараз ноч, то ніхто за табой з панскіх паслугачоў і не сочыць? А як жа! У нас і ноч вушы ды вочы мае. Сцеражыся, ды едзь хутчэй адсюль,— запрапанаваў нехта з сялян, азіраючыся па баках.

— Не палохайцеся, родныя, не бойцеся. Нас таксама нямала, і няма нам болей каго баяцца. Злыдня гэтага мы са свету і перавялі. За ўсё яму адплацілі, за ўсіх адпомсцілі... Пабачылі б вы, як наш грозны некалі пан прасіўся і маліўся, калі яго, перад тым, як павесіць, лупцавалі бізунамі, бо не маглі стрымацца. Вужом поўзаў, за ногі нашыя хапаўся, плакаў, нібы дзіця-немаўля, але ніхто яго не пашкадаваў. Ніхто не змог дараваць таго, што ён тут у нас панарабляў за гэтыя дзесяцігоддзі...

— Правільна зрабілі, калі ўсё менавіта так атрымалася. Нехта і яму павінен быў давесці, што прыйдзе і ягоны смяротны час...

— Прыйшоў. І знайшоў ён сваю смерць не ў мяккіх пуховых падушках, а на гарбатай асіне, як той Юда, што сваіх блізкіх і родных запрадаў. Вісець будзе пад сонцам да таго часу, пакуль крумкаччо яму вочы не павыдзяўбе, ды не засмярдзіць, нагадваючы іншым прыгнятальнікам, што іх чакае, калі будуць гэтак здзекавацца з простых людзей...

— Нарэшце, дачакаліся,— выдыхнуў стары вясковец і шырока перажагнуўся.

Астатнія маўчалі. Кожны, мабыць, думаў пра тое, што зараз прыйдзецца чакаць новага пана, і, можа, ён будзе яшчэ горшым і злейшым. Праўда, думкі гэтыя зноў перарваў зычны голас вершніка.

— Не стойце тут, нібы валы, якія доўбні ў лоб чакаюць, а збірайцеся разам ды набытак свой на вазы грузіце, жывёлу ў чароды зганяйце...

— Навошта ўсё забіраць і зганяць? — пачуўся нечы спалоханы голас.— Куды гэта?..

— Куды, куды? — перадражніў коннік.— Пойдзем жыць у іншыя мясціны, далей ад гэтых, бо смерць памешчыка нам ягоныя суседзі не даруюць. З нашымі працавітымі рукамі мы нідзе не прападзём. Збірайцеся, надта не марудзьце...

— І праўда, людцы,— сказаў нехта.— Забяромся туды, дзе ні паноў, ні войтаў няма.

— А ці ёсць, чалавеча, такое месца на ўсёй зямлі, дзе гэтых пачвар няма? — нясмела запытаўся нехта.

— А раптам пашанцуе — і знойдзем...

Не ўсе, праўда, але сабраліся людзі з навакольных вёсак і падаліся ў чужы край. Доўга ішлі. Прабіраліся начамі, круглялі па глухіх сцяжынках, але ішлі і ішлі, а калі ўжо ўсім надакучыла, то выбралі прыдатны куточак і сталі будаваць хаціны. Калі натрапілі на іх мясцовыя людзі, то на запытанне: «хто такія?» — адказалі:

— Халопы мы... Халопы нашага пана... Ды вы нас не палохайцеся, мы нічога дурнога вам не зробім. А паноў ніякіх у гэтых мясцінах няма. Вольныя мы людзі. Нікому не служым і не прыслужваем, самі для сябе жывём.

Так тое паселішча Халопенічамі і назвалі. Яно потым разраслося, вялікай вёскай стала, а потым ужо і мястэчкам. Вось адкуль такая назва. Ад тых самых людзей, што сюды хавацца ад ліхога жыцця прыйшлі.

## ІГРУШКА

Гадоў, можа, трыста таму назад здарыўся тут жудасны выпадак. Ад яго ўсё і пачалося.

Даўней звяр'я ўсялякага навокал надта многа вадзілася. Баяліся людзі ноччу далёка ад свайго жылля адыходзіць, бо назад можна было і не вярнуцца. Толькі адыдзі, то ці сіла якая нячыстая цябе закруціць, ці чэрці запрагуць у працу, што тыдзень потым плечы, рукі ды ногі балець будуць, ці ваўкі парвуць на кускі.

Ваўкоў надзіва многа вадзілася. Калі які хутар стаяў ля лесу, то за агародам у якім кустоўі і малых вывесці маглі. Людзей яны не надта баяліся, нібы адчувалі, што непадалёку ад чалавека можна намнога лягчэй пракарміцца самім і ваўчанят прывучыць да далейшага жыцця.

Вось і на месцы нашай сённяшняй вёскі тады, у даўнія гады, быў хутар усяго з трох хацін. Двое заможных сялян з сем'ямі жыло ды ўдава адна з сынам, у якім душы не чула, шкадавала і лашчыла. Справа ў тым, што ў Мар'і, а яе так звалі, мужа ў салдаты праз год пасля

вяселля забралі. Калі ён пайшоў у царскае войска, то ў яе толькі і радасці засталося, што сыночак малюсенькі, якому, можа, усяго тры-чатыры месяцы было. Міхаськам яго звалі. Пра мужа потым праз іншых даведалася, што загінуў недзе на Каўказе, і ёй, маладзіцы, самой усё даводзілася рабіць: і па гаспадарцы шчыраваць, і на ніве гараваць. Добра, што суседзі добрыя былі. Ніколі ў бядзе не кідалі. Бачылі, што рвецца жанчына, то ўсе разам то ніву ёй выжнуць, то збожжа змалоцяць, то яшчэ што. Заплача Мар'я і прамовіць:

— Чым жа я вам аддзячу, людцы добрыя? Чым жа я вам дапамагу? Вы мяне колькі разоў выручалі, а я?..

А тыя нібы і не чуюць, як удава ўбіваецца, азірнуцца на жанчыну і скажуць:

— Чаго гэта ты ўсхадзілася? Няўжо не бачыш сама, што мы сваё ўсё ўправілі, а каб тваё засталося на полі непрыбраным — таксама нельга, Бог нам такой абыякавасці ніколі не даруе. Пра якую там адплату ты яшчэ гаворку вядзеш? Ты вунь сыночка свайго на ногі стаў. Ведаем, як табе цяжка адной даводзіцца...

Пастаяць, пагамоняць, каб Мар'і лягчэй на душы стала, і пойдуць па хатах.

Дружна людзі жылі тады, не тое, што зараз. Нікому асабліва не зайздросцілі.

Міхаську ўжо гадоў, можа, шэсць было. Надта кемлівы хлапчук рос. Маці ніколі не прымушала яго нешта рабіць, бо маленькі ж яшчэ, не выцягне, то сынок сам пачаў да працы прызвычайвацца. Неяк незаўважна гэта рабіў. То трэсачкі на падвор'і пазбірае, то курэй ці гусей з агарода адгоніць, а Мар'і і такая дробязь значнай дапамогай была. Сядзе, глядзіць на Міхаську, а сама мужа прыгадвае, які таксама ніколі без працы не сядзеў, усё гарэла ў ягоных руках, усё ён умеў, ніякай працы не баяўся.

— Сыночак, міленькі мой, пасядзі, саколік, адпачні, працаўнічок мой ненаглядны.,. Стаміўся ж...

— Ды не, мамачка,— адказваў малы і працягваў займацца сваёй справай.

Так ён да працы прызвычайваўся і Мар'і дапамагаў. Калі жанчына ішла некуды далёка: жаць ці ехала скародзіць поле або яшчэ куды, то папярэджвала Міхаську, каб жывёлу на ноч у хлеў пазаганяў, каб ку-

рэй ды гусей з патравы выганяў, даглядзеў усё. Той так і рабіў.

Нічога, здавалася, бяды не прадказвала. Толькі яна здарылася. І паслухайце, як усё там адбылося.

Аднаго разу суседзі-мужчыны падказалі Мар'і:

— Мы заўтра едзем на нашы далёкія нівы, то давай і ты з намі, каб потым самой не ехаць. Там у нас працы не надта многа, хутка абробімся і табе дапаможам.

Мужчыны заўсёды так рабілі, каб не кідаць Мар'ю саму, каб непрыкметна дапамагаць. І ў гэты дзень усё было як звычайна. Жанчына паклікала Міхаську, які бегаў-галёкаў з суседскімі дзецьмі непадалёку ад хаціны, і сказала:

— Сынку, паеду я з суседзямі на далёкую ніву. Там працы да самага вечара будзе, можа, нават, да глыбокай ночы, то ты ўжо дома ўсё да парадку давядзі.

— Добра, мама, не перажывай,— як дарослы пачаў Міхаська,— ці ж упершыню? Абавязкова зраблю. Бульбы і той начышчу і навару.

— Так ужо?..

— Пабачыш...

— Толькі ты, сынку, далёка ад дому не адыходзь ды глядзі, каб у агарод ніякая птушка не лезла, бо там усё перадзярэ, перакапае. Агароднiна ж гэтак добра расці ўзялася. Ураджай надзвычай багаты будзе.

— Нікуды далёка не пайду, ля дома гуляць з сябрамі буду, можаш ехаць спакойна.

Пацалавала Мар'я сына на развітанне і, не азіраючыся, скочыла ў воз ды пакіравала коніка за мужчынамі. Ведала б, якое гора яе ў гэты дзень чакала, то нікуды не паехала б, а так...

Калі дарослыя паехалі, то дзеці, сабраўшыся ўсе разам, а было іх чалавек пяць, сталі пераказваць адзін аднаму, што ім бацькі загадалі зрабіць. Ды малыя ёсць малыя. Якая праца ні чакае, пагулянца ж хочацца. Таму праз некаторы час самы старэйшы з іх запрапанаваў:

— Давайце мы пакуль што ў хованкі пагуляем. Потым і работу, якую бацькі задалі, выканаем.

Астатнія малыя горача падтрымалі прапанову, усе, акрамя Міхаські. Ён заўпарціўся і сказаў:

— Вы сабе як хочаце, а я пайду і параблю ра-

боту, бо загуляюся і забуду. У вас бацькі зробяць ды старэйшыя браты і сёстры, якія з імі паехалі, калі вернуцца, а ў мяне ж нікога няма...

Падумалі тады дзеці і згадзіліся з хлопчыкам. Дамовіліся, што ў хованкі пагуляюць пасля полудня. Так і зрабілі. Пайшлі па хатах. Міхаська сядзеў ля агарода і пільнаваў, каб куры ды гусі не лезлі ў грады. Час цягнуўся марудна, але ён сваё слова стрымаў, ні разу свойская птушка ў агарод не залезла.

Потым зноў сабраліся дзеці і пачалі гуляць. Разоў колькі ўжо ўсе хаваліся і іх знаходзілі, і пачыналі спачатку.

— Хавайцеся, бо зараз пайду шукаць,— катэгарычна заявіў той, якому гэта выпала.

Астатнія кінуліся ўрассыпную. Міхаська з дзяўчынкай-суседкай прыпусцілі ў канец агарода, дзе раслі густыя і невысокія елачкі, з-за якіх не тое што чалавека, нават дзённага святла не ўбачыш. Прыляглі там і цікуюць, пасмейваючыся, як астатніх дзяцей даволі хутка пазнаходзілі. Стаяць усе, з нагі на нагу перамінаюцца дый перагаворваюцца:

— Міхаську з Аленкай табе давядзецца доўга пашукаць... Яны добра схаваліся, папакруцішся...

Той, хто вадзіў, сапраўды не знайшоў і нават не здагадваўся, дзе схаваліся Міхаська з Аленкай, але затое іх знайшоў... воўк. Стары, спрактыкаваны ў сваёй справе драпежнік высачыў дзяцей і ўжо даўно цікаваў за імі, чакаў зручнага моманту, каб накінуцца на каго-небудзь. Пакуль што такая хвіліна не надыходзіла.

Нарэшце Аленка не вытрымала і ўстала ў поўны рост, бо надакучыла сядзець і чакаць. Міхаська ж застаўся на ранейшым месцы. Хацелася паглядзець, як усё будзе разгортвацца далей. Хлопчык смяяўся і не бачыў, як ужо амаль за самай яго спінай стаіўся здаравенны воўк. Варухнуўся Міхаська і ў гэты ж самы момант адчуў, як яго за плечы тузанула нешта вострае і гарачае. Азірнуўся і загарлаў:

— Дапамажыце!!! Дапамажыце!!!

Але дзеці, мабыць, падумалі, што ён нечага проста так спалохаўся, і спачатку дружна засмяяліся.

— Ага! Так табе і трэба, раз гэтак доўга не вылазіш! Так табе і будзе! Сядзіш паўдня!

Зразумелі, калі Міхаська зноў закрычаў:

— Дапамажыце!!! Воўк!!! Воўк!!!

Малыя сумеліся і не краналіся з месца. Потым самы старэйшы ўскрыкнуў:

— Да Міхаські! Хапайце якія сучкі-driучкі, ды на шэрага! Выручым сябра!

Дзеці пабеглі да ельніку, але і воўк не стаяў на месцы. Ён закінуў малога сабе на спіну і прыпусціў што было сілы. Уцякаў шэры не ў лес, які быў у нейкай сотні крокаў, а ў чыстае поле. Ведаў, што дрэвы будуць перашкаджаць хутка бегчы. Міхаська хапаўся ручкамі за кустоўе, за голькі, што хоць крыху ды стрымлівала звера. Сябры не адставалі. Тады шэры разбойнік кінуў сваю ахвяру і паджгаў у лес.

Узрадаваныя сябры абступілі Міхаську, які моцна перапужаўся, але сур'ёзных ран на целе не было.

Калі Мар'я прыехала з суседзямі з поля і даведалася пра ўсё, то доўга галасіла. Відаць, адчувала матуліна душа, што гэтым справа не скончыцца. Так яно і здарылася. Праз колькі дзён хлопчык сканаў.

На тым месцы, дзе Міхаську адпусціў воўк, вырасла невялічкая груша-дзічка. Але, што самае дзіўнае, то грушкі на ёй заўсёды былі толькі чырвонакрывавага колеру, нібы сваім колерам нагадвалі, што здарылася тут у недалёкім мінулым. З цягам часу там сталі жыць людзі, пабудавалі хаціны, узніклі падвор'і, але памяць пра матуліна гора засталася. Назву вёска атрымала ад той самотнай дзікай грушы — Ігрушка.

## КАСЕНІЧЫ

Раней людзі ўсяму верылі, не выключалі, што нейкія патаемныя нячыстыя сілы могуць вельмі моцна ўздзейнічаць на чалавека, і як ён ні будзе спрабаваць ухіліцца, схавацца ад іх, нічога не атрымаецца. У нас старэйшыя распавядалі гісторыю, якая і дала падставы для назвы паселішча.

Тут, дзе зараз наша вёска стаіць, і раней людзі жылі. Праўда, паселішча было крыху ўбаку і значна меншае, але ж усё роўна існавала — гэтага не адымеш. І жыў у тагачаснай вёсцы адзін вяшчун. Чорны надта быў, значыцца — дрэнны. Ніхто яго не зваў па імені, а толькі па мянушцы — Касы. Ды і мянушку вымаўлялі толькі тады, калі яго нідзе блізка не было, каб, не дай Божа, не пачуў, бо тады жорстка расправіўся б з чалавекам, які сказаў пра яго нешта благое.

Спачатку думалі, што Касы не чуе і не бачыць на адлегласці, але потым здарыўся выпадак, які пацвердзіў адваротнае.

Аднаго разу сабраліся мужчыны на прызбе. Ведама ж, сядзяць, размаўляюць, навіны адзін аднаму пераказваюць, мяркуюць, як далей жыць. Нічога дзіўнага ў гэтым не было, здавён так вялося. Потым і маладыя дзецюкі ды хлапцы да іх падселі. Гэтыя, як заўсёды, жартавалі ды пасмейваліся з прымхаў і былічак старэйшых. Неяк незаўважна размова перакінулася на цудадзейныя магчымасці злога вешчуна. Як сталі прыгадваць сяляне, колькі ды каму ён гора ўсялякага прычыніў, то некаторыя ажно прыселі. Не верылі, што такое можа здзейсніць адзін чалавек, няхай сабе і звязаны з нячыстай сілай. Самы стары з сялян сцвярджаў, што ведаў і бацьку Касога, і ягонага дзядулю, і што яны таксама выраблялі ўсялякія штучкі са сваімі аднавяскоўцамі. Не спадабаецца ім нехта, то як напусцяць на ягоную сям'ю ці на жывёлу які паморак або пошасць, то і вымруць усе да аднаго, згіне жывёла, ніхто не выратуе.

Зніякавелі слухачы, кожны пра сваё думаў, але знайшоўся сярод іх хлопец, які весела зарагатаў з аповеда дзеда і прамовіў ганарыста:

— Знайшлі мне дзіва. Нейкага Касога баяцца. Хай ён мяне баіцца, а не я яго. Ён і так як ідзе па вуліцы, то на людзей ніколі прама не зірне, а ўсё скрыва ды скоса...

— Таму і Касы,— не вытрымаў нехта і перабіў пахвальбу Міканора — гэтак хлапчыну звалі,— хіба ж ты не ведаў?

— Ведаць-то, можа, і ведаў, але баяцца Касога не збіраюся. Хай ён мяне баіцца,— голасна паўтарыў маладзён.

Стары дзед толькі кірхнуў і ціхенька прагуў:

— Вядома, гэта твае справы, але з лешаком лепей не звязвацца. Зачапі шаршнёў, то сам сабе назбіваеш потым гузоў. Не да дарогі будзе, панясуць ногі, куды вочы глянуць... Не трэба, можа, гэтак хваліцца, ты яшчэ зусім малады, мала пажыў, мала пабачыў...

— Вы бойцеся, я ж вам не забараняю, а я не буду, і годзе на гэтым! — адрэзаў Міканор.

Пагаманілі яшчэ колькі часу вяскоўцы, на прызбе седзячы, і разышліся па хатах, бо надышоў час спаць класціся. Старыя ды жанатыя пайшлі, а мо-

ладзь засталася, каб з дзяўчатамі падурэць, пагаманіць з імі, павесяліцца. Доўга яшчэ гучалі па вясковых ваколіцах смех і песні маладзёнаў, пакуль і яны не пакіравалі дамоў.

Міканор правёў сваю Агапку, наабдымаўся ды нацалаваўся з ёю ўволю, таму прыцёгся недзе перад трэцімі пеўнямі. Каб не турбаваць бацькоў і малодшых сясцёр ды братоў, пайшоў спаць у гумно, на свежаскладзенае сена. Улёгся, пацягнуўся, усміхнуўся сам сабе і амаль адразу ж соладка захроп.

Але нядоўга цягнуўся яго бестурботны сон. Прыснілася яму, што нясецца прама на яго нейкае страшыдла, а ён у чыстым полі, і няма ў яго пад рукамі нічога, каб хоць неяк абараніцца. Кідаецца тудысюды, азіраецца, але дарэмна, а страшыдла ўжо вось-вось, усяго за нейкіх пару дзесяткаў крокаў тупоча. Зірнуў сабе пад ногі хлопец і ажно засвяціўся: там ляжала цэлая крушня камянёў. Давай ён іх хапаць і шпурляць у пачварную істоту. Як улупіць, то водгулле нясецца па наваколлі, а яна ад болю курчыццаенчыць, але ж не адступае ні на крок, відаць, спадзяецца разлічыцца са смелым Міканорам. Ды і ён не дурань, ляпае камянямі, нібы бобам у сцяну, бо іх жа за тыдзень не перакідаеш, не тое што за нейкую там гадзіну. Скрывавіў страшыдла на горкі яблык. Як яно ні трымалася, а ўсё ж пачало пастунова назад пасоўвацца. Хлопец кідаў камяні да таго часу, пакуль не стаміўся, і сеў адпачыць. Выцер халодны пот рукавом і ўздыхнуў. А як уздыхнуў дзяцюк, то адразу ж і прачнуўся. І бачыць — ляжыць ён у гумне, але не на сене, а... пасярод стойла, дзе коні іхнія звычайна стаялі. Забруджаны ўвесь так, што ажно глядзець страшна, па ўсім целе і на твар напрыліпала ўсялякае смецце ды гной. Самае ж смешнае і дзіўнае — аказалася, што кідаў ён не камянямі, а ляпёхамі конскага гною, і не па страшыдлу трапляў, а па конях, якія зараз спалохана тупацелі ў куце. Усе сцены ў гумне, асабліва дзверы, былі таксама густа заляпаны гноем.

Тут толькі дацяміў Міканор, хто з ім такую штуку выкінуў. Устаў і, хістаючыся, пайшоў да студні ўмывацца. Хацеў зрабіць гэта, каб ніхто лішні не бачыў і не распавёў потым, але дарма асцерагаўся. Бачыла суседка, які ён быў, і ўжо да сняданка ўся вёска

ведала, што нейкая нячыстая сіла сурова абышлася з хлопцам.

Калі ў наступную суботу, надвячоркам, зноў сабраліся сяляне на ўлюбёнай прызбе, каб пагаманіць, то адразу ж запыталіся ў хлопца:

— Ну, то раскажы нам, чалавеча, як гэта з табою Касы пажартаваў. Ці мо і цяпер не верыш у тое, што ён што захоча, тое і зробіць з чалавекам? Ці можа, гэта не Касы падрабіў, а ты сам пачаў кідацца гноем, па сваёй ахвоце?

— Сапраўды, браткі, рабілася са мною нешта дзіўнае. Здаецца, і памятаю ўсё і не памятаю, і не хацеў гэтак рабіць, а выкруціў жа, што цяпер да канца жыцця прыгадваць стануць...

— Я ж табе казаў, хлопча,— пачаў стары дзед, які папярэджваў Міканора ў свой час,— што Касы нікому не даруе. Не ведаў толькі я, што ён і на адлегласці разумее нашы думкі ды пра ўсё, што мы тут размаўляем, ведае. Гэтага не ведаў, таму нікому і не сказаў такога...

Так Касы даказаў сваім аднавяскоўцам, што валодае таямнічымі здольнасцямі. Ды адзін раз і яны не дапамаглі яму выратавацца ад смерці. Здарылася гэта вось як.

Пайшлі мужчыны касіць сена на луг. А ў нас даўней усе разам касілі і грэблі, а потым ужо сена дзялілі паміж гаспадарамі. Косяць ды косяць, расцягнуцца цугам, адзін за адным, на ўсю даўжыню сенажаці, і ідуць паволі, памахваючы косамі, нібы журавы крыламі ў клін склаўшыся, калі ў вырай адлятаюць. Сярод іх быў і Міканор. Надакучыла ўжо яму слухаць кпіны аднавяскоўцаў, але нічога не зробіш — сам выхваляўся. Цяпер даводзілася трываць. Да полудня вымахалі ўсю раўніну, а пасля, перакусіўшы ды адпачыўшы крыху, разышліся па двое, па трое, а то і па аднаму па кустоўі, каб і там дачыста выкасіць траву.

Хлопцу выпала касіць аднаму. Задумаўся ён аб нечым і стараецца як мага хутчэй дакасіць, дайсці да наступнага касца, бо потым зноў пачнуць жартаўнікі зубы выскальваць, што косіць няспраўна. Але нешта ў яго на гэты раз не надта атрымлівалася: то каса ў купіну ўвапрэцца, то зрэжа яе, не раўнуючы, нібы каровін блін, то сверддам у зямлю ўваб'ецца. Не мог дацяміць хлопец, што гэта робіцца. А калі назад азірнуўся, дык увогуле ледзьве не гопнуўся

долу. Амаль паўсюдна трава, чыста і акуратна скошаная ім... стаяла. Здавалася, што яе ніхто і не касіў. Не паверыў сваім вачам касец, падскочыў і паторгаў рукою. Не, не падалося. Сапраўды стаіць, як і да яго стаяла. Ажно прысеў з адчаю Міканор, не ведае, што рабіць далей. Хацеў нават на дапамогу каго клікаць, ды пасаромеўся, хто ж яму паверыць? Ледзьве не плача хлапчына і тут выразна чуе крокі. Азірнуўся на іх — няма нікога. Нахіліў галаву — і зноў тое ж самае. Цяпер толькі хлопец здагадаўся, што гэта ж... Касы, ператварыўшыся ў нябачную істоту, побач шкандыбае. Ухапіў тады касу Міканор і давай ёю махаць у паветры ў тым месцы, дзе крокі чуліся. Памахае, пастаіць, прыслухаецца і далей кіруе.

Аднаго разу нават выразна пачуў, як заенчыў чалавечым голасам нехта, але не спыніўся. Выскачыў на чысты луг, усе глядзяць, зразумець нічога не могуць. А касец джгае па пракосах, толькі ногі высока падкідвае, бо праз траву дрэнна бегчы. Вылецеў на бераг і далей папёр. Толькі ля самай вёскі джгнуў касою і пачуў выразна, як яна аб нешта чмякнула. Адразу ж пасля гэтага палілася на пясок чорная кроў і з'явіўся труп вешчуна з адсечанай галавой. Людзі потым не паверылі б, каб на ўласныя вочы не бачылі, і не даказаў бы ім ніхто.

Пасля таго выпадку вёску нашу сталі зваць Касенічамі. Ці то ад таго вешчуна Касога, ці то ад Міканора-касца, які зарэзаў пярэваратня і пазбавіў сялян ад многіх бядот.

## УХВАЛА

Жыў на свеце адзін не надта багаты паніч. Малады быў, прыгожы надзіва і занадта ганарлівы. Можа, уся гэтая ганарыстасць у яго была ад таго, што нічога іншага не паспеў нажыць. Бацькі ягоныя рана памерлі, па спадчыне мала што перадалі. Маёнтак той быў меншы за сядзібу добрага гаспадара. Паперы, праўда, пацвярджалі, што са старога дваранскага роду паходзіў паніч. Не раз, не два каралям ды князям прыслужвалі ягоныя продкі, смеласцю ды храбрасцю сваёй вылучаліся. Ды заўсёды чамусьці болей узнагароджваюць тых, хто першымі даносяць

аб перамозе, а не тых, хто грудзьмі ў бойцы шлях да перамогі пракладваюць.

Адным словам, паніч быў прыгожы, прывабны і звалі яго Фёдарам. Сялян амаль не меў. Можа, нейкіх чалавек пяць-шэсць усяго ды пару састарэлых слуг, якія яго яшчэ ў калысцы гушкалі. Яшчэ конь гарачы і дагледжаны стаяў. Вось і ўсё.

Аднаго разу паехаў Фёдар на паляванне. Ездзіў на сваім коніку па глухіх мясцінах, на балаціны выбіваўся, па гушчарах лазіў, але не шанцавала яму ў гэты дзень. Плюнуў паніч сярдзіта і прамовіў, злуючыся:

— Раз да гэтага часу нічога ладнага не напаткаў, то і далей сэнсу ніякага няма лазіць тут. Паеду дамоў ды лепей паляжу, дам адпачынак стомленаму целу, коніка свайго ў стайню выпушчу.

Павярнуў і сапраўды дамоў пакіраваў. Едзе і па баках азіраецца — а раптам нешта выскачыць, то хоць стрэліць і ахвоту крыху згоніць. Ды ўсё дарма. Не было нічога. А заехаў ён тады надта далёка, не адзін дзесятак вёрстаў бедалага-конік наматаў на капыты. Ужо вечарэць пачынала. Фёдар пачаў, каб неяк дарогу скараціць, сам сабе песню пад нос спяваць. І конік тады весялей тупаціць. Так і ехалі. Ажно падалося паляўнічаму, што нехта на дапамогу кліча. Плюнуў паніч і прамовіў:

— Даездзіўся! Ужо і мроіцца ўсялякая злыбеда пачынае. Стаміўся надта. З самае раніцы ў сядле, галава шуміць, ногі — нібы волавам паналіваліся. Мроіцца...

Але падалося зноў, што нехта кліча-надрываецца на дапамогу. Спыніў тады Фёдар свайго коніка і пачаў услухоўвацца. Хвілін праз колькі да ягоных вушэй данеслася далёкае-далёкае:

— Дапамажыце!!! Дапамажыце, людзі добрыя!!! Выратуйце!!!

— Хто гэта можа гарлаць у такой глушы? — здзівіўся паніч і, не чакаючы ні ад каго адказу, прамовіў:

— А можа, нехта і сапраўды ў дапамозе патрэбу мае, то трэба імчаць. Вось каб жа толькі дакладна ведаў, дзе шукаць таго чалавека. Крычаць-то ён крычыць, але ж па лесе рэха разносіцца, нібы хвалі па вадзе, паспрабуй знайсці, адкуль ідзе...

Пастаяў яшчэ колькі хвілін, паслухаў, памерка-

ваў, адкуль вецер дзьме, і, павярнуўшы туды коніка, паехаў. Імчаць хутчэй не дазваляла густое кустоўе і паваленыя абы-як дрэвы. Праехаў, можа, з вярсту, спыніўся. Крык нёсся, як і раней, толькі ўжо здавалася, што на дапамогу клікалі недзе зусім побач. Фёдар зірнуў у той бок і вырашыў, што яшчэ нейкую сотню-другую крокаў пад'едзе на коніку, а далей пакіруе пешкі. Мала што можа здарыцца і якая прыгода яго там чакае. Так і зрабіў. Прывязаў свайго вернага спадарожніка да высачэзнай елкі і сам паціху стаў красціся далей. Зробіць пару крокаў і ўслухоўваецца. Але крыкі перарваліся. Паніч разгубіўся. І ў гэты самы момант высокі голас зноў узарваўся:

— Дапамажыце!!! Дапамажыце хто-небудзь!!!

Фёдар выбраўся на ўскраек невялічкай палянкі, і тое, што ён там убачыў, зусім выбіла яго з каляіны: да высокага, разгалістага дуба была прыкручана нейкай тоўстай вяроўкай зусім голая дзяўчына. Яна і клікала на дапамогу. Паніч спачатку заўсміхаўся, бо падумалася: «Вось падыду яшчэ бліжэй і паназіраю, як жа яна сябе паводзіць далей будзе. Выратаваць-то яе я змагу цяпер у любы момант, вяроўку перарэжу, і ўсё на гэтым...» Пайшоў вакол палянкі, каб стаць непадалёку ад дзяўчыны і паназіраць. І добра, што гэтак зрабіў, бо калі б пайшоў напрасткі, то напаткаў бы смерць у высокай траве. Заўважыў небяспеку паніч толькі тады, калі падышоў зусім блізка да дуба. Кроках у дзесяці ад дрэва ляжалі трое здаравенных мужчын. Яны паціху размаўлялі паміж сабою, зусім не звяртаючы ўвагі на дзяўчыну, таму ён іх адразу і не ўбачыў. У кустоўі стаяла залачоная карэта, пасвіліся выпражаныя коні, ляжалі некалькі забітых людзей. Фёдар спыніўся і стаў слухаць, пра што гаварылі тыя трое.

— Чуеш, як паненка крычыць?

— А то не...

— Каб хоць голас свой не сарвала.

— Не сарве.

— Будзе ведаць, як нам у ласцы адмаўляць. Бачыш ты, мы яе па чарзе палашчыць пажадалі, а яна драпацца кінулася, нібы ваўчыца якая. Хай цяпер пад сонейкам пастаіць голая, камарыкаў сваёй крывёй панскай пачастуе. Да вечара паразумнее... Спяшацца нам няма асабліва куды, а яе тут ніхто шукаць

і не здагадаецца, далёка мы завялі экіпаж. Жывых таксама не засталося, няма каго баяцца...

— Як гэта ты ўсё так хітра прыдумаў? — звярнуўся адзін з мужчын да самага старэйшага на выгляд.

— Думаць заўсёды наперад трэба, то ўсё і атрымаецца як нельга лепей.

Разбойнікі замоўклі, і Фёдар зірнуў на дзяўчыну. Зараз, калі яна была ад яго на адлегласці нейкіх там дзесяці крокаў, паніч заўважыў, якая яна прыгожая: высокая, валасы амаль што да пят, высокія грудзі, тварык ажно гарыць ад нянавісці да гвалтаўнікоў. Ягоны роздум перарваў крык бедалагі:

— Людзі, дапамажыце!!! Людзі!!!

— Ага, пакрычы, пакрычы, то прыскочыць сюды храбры прынц і вызваліць цябе з палону,— азваўся нехта з разбойнікаў, і ўсе яны разам дружна зарагаталі.

Дзяўчына апусціла галаву на грудзі і заплакала. Зноў запанавала цішыня. Фёдар стаяў і вырашаў, як жа яму дзейнічаць. Праціўнікаў трое, і ўсе ўзброеныя, акрамя гэтага на іх баку перавага ў фізічнай сіле. Потым рашуча зняў з пляча стрэльбу, яшчэ раз азірнуўся і пакраўся да бандытаў. Але праз колькі імгненняў перадумаў і адступіў назад. Пайшоў вакол кустоўя, каб выйсці ззаду таго дуба, дзе стагнала прывязаная прыгажуня. Падпоўз амаль да яе ног і ціхенька зашаптаў:

— Крычы... Крычы на чым свет стаіць... Я цябе развяжу... Калі тут пачнецца бойка, то ўцякай у гушчар і стаіся дзе-небудзь, каб другі раз цябе не адшукалі і не паланілі... Толькі не азірайся, не выдавай маёй прысутнасці...

— Хто ты? — адразу пачулася пытанне.

— Дух лясны... Я табе што сказаў? Крычы як мага мацней, не паказвай, што нешта адбываецца...

— Дапамажыце!!! Дапамажыце!!!

— Во, гэта лепей,— прамовіў Фёдар і пагладзіў сваёй шурпатай рукой дзяўчыну па сцегняку, нібы баючыся, што болей не ўбачыць такога прывабнага цела. Дзяўчына ўздрыганулася, але нічым не выдала свайго абурэння.

Счакаўшы яшчэ хвілін колькі і паслухаўшы, як палонніца крычыць з усяе сілы, Фёдар раптоўна ўсхапіўся і кінуўся да таго месца, дзе ляжалі разбойнікі.

Бандыты не чакалі такога імклівага нападу, таму паніч аднаго здаравеннага мужыка застрэліў на месцы, а на галаве другога зламаў сваю стрэльбу. Трэці ліхаманкава шукаў нешта ў траве.

— Так я цябе да нажа і дапушчу,— прахрыпеў паніч і наступіў нагой на руку бандыту. Той запішчаў:

— Адпусці...

— Зараз... Адпушчу... На той свет, злыдзень... Як вы гэтых бедалаг...

Рабаўнік паваліўся на калені і заенчыў:

— Не забівай... Грошай-золата столькі дам, колькі ты ў жыцці не бачыў... Адпусці жывым...

Сапраўды, амаль побач ляжалі два вялікія мяхі з каштоўнасцямі.

— Вось будзе і мне набытак,— узрадаваўся Фёдар,— а цяпер уцякай, пакуль я не перадумаў, бо тады цябе ніўто ўжо не выратуе.

Бандыт толькі і чакаў такога слова, бо ажно лаўжы затрашчалі па лесе, як ён паляцеў-папёр у аднаму яму вядомым накірунку.

Толькі тады пайшоў паніч шукаць дзяўчыну, якой таксама на ранейшым месцы не аказалася. Пакрычаў у гушчары, пакуль тая адгукнулася. Саромелася перад прыгожым паляўнічым голай паказвацца. Але як нагрызлі камары, то выскачыла і кінулася да яго.

— Вось і жонка мне,— радасна ўскрыкнуў паніч.

Дзяўчына нічога не адказала, толькі нешта фыркнула, забіраючыся ў карэту і прыкрываючыся там нейкай дзяружкай.

Так яны і пакахаліся. Фёдар збаяўся, што бацька будзе яе шукаць, таму запрапанаваў:

— Давай паедзем куды-небудзь у іншую мясціну жыць. Грошай у нас да канца жыцця хопіць. Станем жыць у дастатку, маёнтак добры прыдбаем...

Паехалі, узяўшы з сабою толькі дваіх састарэлых слуг, а сялян на волю адпусцілі.

Доўга прабіраліся, але нарэшце Фёдар аблюбаваў адно месца, але ж балаціны тут адвечныя былі. Наняў тады ён шмат людзей, пракапалі яны глыбокія каналы і канавы, асушылі балота, збудавалі прыгожы палац, і гаспадар усім хваліў новае месцажыхарства. Адтуль і пайшла Ухвала, ад слова «ухваляць».

## ХУДАЎЦЫ

Тут багатыя землі, і спрадвеку людзі заможна жылі. Гаспадаркі моцныя трымалі, жывёлу цэлымі статкамі на поле выганялі з кожнага хлява. А ўжо князь у іх быў такі багаты і магутны, што і ва ўсім свеце, мабыць, на яго падобнага не знайшоў бы. Бедным, праўда, дапамагаў і падначаленых сваіх не крыўдзіў, даваў магчымасць пажыць. Не надта ва ўласную кішэню ўсё забіраў, глядзеў, каб і ў сялян ды ў гараджан лішняя капейка вадзілася. Раз людзі спакойна сябе адчуваюць, то яны і працуюць, адпаведна, добра, бо ні за што не хвалююцца.

Быў у таго князя адзіны сын. Душы ў ім валадар княства не чуў. З малых гадоў усё паўтараць панадзіўся:

— Вось вырасцеш, сынку, будзе табе і мой стол княжацкі, і мае землі, і мае багацці. Усё табе застанецца, толькі расці хутчэй, толькі цягніся ў плячах ды ў нагах, каб дапамогай сапраўднай мне ў хуткім часе стаў. Усё табе аддам, да капейкі. Навошта мне на старасць тыя землі ды грошы?

Сын рос гэткім жа здаровым і прыгожым, як і ягоны бацька. Яшчэ вусы не прабіліся, а ўжо мог са здаравенным мужыком барукацца на роўных. Што мядзведзь стаў. У сілу ўвайшоў і любіў, па маладых гадах, ёю пахваліцца і з тым-сім разам у паход пайсці ці дзе на далёкай заставе тыдзень-другі пражыць, каб лепей адчуць небяспеку, ад якой ажно заходзілася юнацкае сэрца.

Дзе ж гэта вы бачылі, каб у такі суровы час сапраўдны хлапчына сабе выпрабаванняў не знайшоў? Так і тут атрымалася. Бацька адмаўляў сына:

— Кінь ты, хлопча, дурное. У нас войска вунь сколькі, а спрактыкаваных і дужых вояў дык увогуле не пералічыць. Навошта ўласную галаву пад варожую стралу ці сякеру падстаўляць? Ёсць войска, хай яно і ваюе, а наша справа кіраваць ды ўладарыць. Таксама далёка не кожны на такую справу здольны. Падумай над гэтым.

Сын толькі ўсміхаўся ў адказ сваёй белазубай усмешкай і мовіў:

— Яно-то так, тата, але мне хочацца самога сябе выпрабаваць. Кіраваць, вядома, можна і ў ложку лежачы, але якая ад гэтага карысць будзе? Ці я ра-

зумнейшым стану, небяспекі ды вайны на ўласныя вочы не пабачыўшы, ці людзі, якія мне будуць падпарадкоўвацца, ад гэтага нейкую асалоду адчуюць? Не хочацца сядзець дома, бо не дзед я, кроў маладая і гарачая ў маіх жылах іграе, у дарогу далёкую, у сечы ліхія кліча... Не крыўдуй, але ціхае жыццё не па мне.

Зразумеў бацька, што сына не пераканаць, і пакінуў яго ў спакоі. Адзінае, што зрабіў, гэта прыставіў да хлопца вопытных дружыннікаў, якія павінны былі і ахоўваць яго, калі што, і парады слушныя падаваць у цяжкіх сітуацыях.

Так і насіўся са зброяй у руках на хуткаімгненным кані малады князь па белым свеце. Ужо ворагі многія яго зведалі, баяцца сталі і лічылі за лепшае бокам абысці тое княства, каб на ліха не нарвацца. Слава аб ім па зямлі шырылася, а ён усё не знаходзіў спакою. Маці толькі войкала ды трывожна ўздыхала, калі чула, як цокалі капыты, і сын імчаў некуды разам з аховай, знікаў на тыдзень-другі.

Падказаў тады нехта князю старому выйсце. А было яно вельмі простае — ажаніць нашчадка з якой-небудзь багатай князёўнай, і тады ён супакоіцца, бо на плечы лягуць шматлікія клопаты аб дабрабыце сям'і, людзей, княства. Валадар ажно нагамі задрыгаў ад радасці:

— Слухай, маці, а хіба ж гэта не выйсце? Хіба ж не супакоіцца ён пасля гэтага? Мы з табою перажывалі, клапаціліся, не ведалі, што рабіць, а людзі добрыя бачыш які варыянт нам падказалі... Давай сватаць нявестку будзем.

— Давай,— пагадзілася тая,— але якую?

Прыціх тут і князь. Сапраўды, ажаніць-то не надта складана, але ж трэба будучую жонку сыну адшукаць, каб адпавядала ягонаму і густу, і характару, каб са знакамітай сям'і была, ды бацькі яе не пасквапіліся б зяцю зямлі ладны абсяг даць. Вось тут і зачасаў галаву гаспадар. Ды зноў на дапамогу прыйшлі верныя служкі. Хутка даведаліся, што да чаго, і знайшлі дзяўчыну. Багатую, са знатнага роду, бацькі яе амаль палову ўсяе княжацкае зямлі на пасаг давалі. Дамовіліся маладога князя завезці і паказаць суджаную. Праўды не казалі адразу, баяліся, што княжыч раззлуецца, што без яго ўсё робіцца. Таму да

апошняга маўчалі. Калі ўжо амаль пад'язджалі да месца, стары князь прамовіў:

— Вось што, сынку, кідай ты свае дзіцячыя справы. Чакае цябе наперадзе іншы лёс...

— Які гэта? — здзівіўся той.

— Вырашылі мы цябе ажаніць...

Княжыч у адказ заліўся такім гучным і звонкім смехам, што, здавалася, нават коні яго падтрымалі.

— Ажаніць? Ой, памру... Ой, памру...

— Так, ажаніць, і дарма ты смяешся, бо мы ж зараз у сваты едзем... Хочам, каб і ты дзеўчыну пабачыў на ўласныя вочы...

— Ага, зараз пабачу,— па-дзіцячы прыкрыў вочы малады князь і зноў засмяяўся.

Калі ўбачыў нарачоную, то вытрашчыў княжыч вочы і доўга маўчаў. Чаго? Ніхто не ведаў, мо думаў пра нешта, а мо дацяміць ніяк не мог. Толькі хвілін праз дзесяць усё ж не сцярпеў і сказаў бацькам, калі ўжо выйшлі з пакояў, каб перадыхнуць перад багатым застоллем:

— Што ж гэта вы, родныя, мяне так не шкадуеце? Чаму мяне да такой страшнай дзяўчыны прывезлі? Што, за багаццем пагналіся? Ці ў вас яго мала, ці вам нечага не хапае? Сорам, які сорам... Вы б мяне і на калодзе ажанілі, каб толькі вам грошай паболей далі. Самі сваталі — самі і заставайцеся! А я сабе жонку знайду!..

Скочыў княжыч у сядло і, як ні прасілі, як ні малілі яго бацькі, паімчаў у невядомым накірунку. Ледзьве ахова ягоная ачомацца паспела.

Маці адно крыкнула ўслед:

— Сыночак, ты куды?

Але ў адказ прагучаў звонкі цокат капытоў ды клубам панёсся густы пыл.

Доўга не было княжыча на родным падвор'і. Ужо гаспадар і вояў пасылаў шукаць сына, і падарожных прымушаў апытваць, ці не бачылі дзе, ці не спаткалі. Толькі ніхто нічога радаснага паведаміць не мог.

З'явіўся малады князь нечакана. Неяк надвячоркам радасна загаманілі дружыннікі-ахоўнікі і пачулася з панадворку:

— Княжыч, княжыч прыехаў!..

Выскачылі бацька з маці і хутчэй павялі яго ў пакоі. Ужо і пра сорам той забыліся. Сын яшчэ болей уздужэў і ўзмацнеў. Стаў сапраўдным воям: шы-

ракаплечым, русавалосым, агрубеў ягоны твар. Пасядзелі за сталом, пагаманілі, потым матуля давай распытваць, дзе быў сын, што бачыў, ці не сумаваў па родных. На ўсе пытанні юнак адказваў шчыра. Бацька слухаў, слухаў і сваё кінуў:

— Як бы там ні было, сынку, але жаніцца ўсё роўна трэба. Час прыспеў. Мы, сам бачыш, старэем. Здарыцца што-небудзь — і позна будзе. Трэба жаніцца.

— А я, бацька, не супраць.

— Вось і добра.

— Але хачу вас папярэдзіць, што жанюся я на той, каго маё сэрца выбярэ...

— Добра, толькі бяры са знатнага роду і багатую.

— Гэта ўжо як атрымаецца...

Можа, праз нейкі месяц так і здарылася. Увайшоў сын у пакоі да бацькоў і прамовіў:

— Дык я жаніцца, родныя, задумаў. Жонку сабе нагледзеў. І яна не супраць...

— А чыя яна? З якога роду? — зацікавілася адразу матуля.

— Ды як чыя? З людской сям'і, адкуль жа яшчэ. Палясоўшчыка нашага дачка.

— Што?! Палясоўшчыка?! Ты звар'яцеў?! — бацька болей не мог крычаць, толькі бязгучна зяхаў ротам. Маці тая ўвогуле, як стаяла, так моўчкі і села. Крычалі доўга і гучна. Але, здавалася, княжыч іх не слухаў. Калі гаспадары крыху прыціхлі, то хлапчына ўстаў, усміхнуўся і, развітваючыся, дадаў:

— Вам не падыходзіць, а мне добра...

— Едзь тады з нашых вачэй прэч! Каб і духу твайго тут не было! Прэч з падвор'я, і з княства нашага выбірайся! Худаўцамі станеце — назад папросіцеся! Галадранцамі будзеце!

Ды княжыч ужо не слухаў пагроз і праклёнаў, а кіраваў да сваёй каханай, каб разам з ёю паехаць жыць у іншае месца.

Так усё і адбылося. Жылі яны дружна, заможна, у каханні і згодзе, але прозвішча тое крыўднае, якім перахрысціў яго бацька ў апошні момант перад развітаннем, засталося. Ад яго і вёска наша стала Худаўцы, гэта значыцца — бедныя, гаротныя людзі.

## ЯНАЎШЧЫНА

Назва нашае вёскі з Янам звязана. Быў у нас некалі такі чалавек. Нарадзіўся ён на Яна, свята такое, на змену Купаллю прыходзіць, таму і імя адпаведнае атрымаў. Дзікаваты чалавек, часам такое выкідваў, што ажно за жываты людзі хапаліся, а часам, наадварот, жагналіся ды пляваліся, бо не маглі дадумацца, няўжо гэта ўсё Ян зрабіў.

Паехаў аднаго разу Ян на вяселле. З жонкай запрасілі — з жонкай і паехаў, коніка запрогшы. Ведама ж, ты да родных не паедзеш — то і да цябе потым, калі нагода такая надарыцца, не вельмі спяшацца будуць. Вяскоўцы павагу заўсёды цанілі і за пашану пашанай адказвалі.

Сустрэлі іх ласкава, за сталы запрасілі, дзе ўжо шмат гасцей сядзела і частавалася, ды маладых віншавалі, жадаючы ўсяго самага найлепшага. Селі поруч з жонкай і далучыліся да гаманы. Гаспадыня ведала, што муж часта любіць даць волю языку, асабліва калі рот гарэлкай прапалошча, таму адразу папярэдзіла:

— Глядзі, Яне, не пі многа, каб потым не ляпаў абы-чаго ды людзі з цябе не смяяліся. Нагаворыш усялякага глупства, а потым ад слоў сваіх, калі працвярэзішся, адмаўляешся.

— Не, не бойся. Нічога не скажу,— паабяцаў Ян.

Але дзе там! Як пачаў спрытна куляць чарку за чаркай, як стаў з усімі абдымацца ды пахваляцца, што багацця ў яго ўсялякага гэтулькі, што на чацвярых заможных гаспадароў хопіць, то жонка зразумела — зараз нешта будзе. Не першы ж раз муж такі фокус выкідваў. Паціху-паціху перабралася да кумы і, каб не чуць таго, што п'яны чалавек там нясе, запрапанавала:

— Давай, кумка, лепей паспяваем.

— Давай,— пагадзілася тая.

Узвіліся высокія прыгожыя галасы, паляцелі ў вячэрнюю цішыню, растварыліся недзе далёка-далёка за аколіцай. Цверазейшыя спявалі, а п'янейшыя — слухалі, як заходзіцца Ян. Вяселле яно вяселле і ёсць, усё там доўжыцца да пэўнага часу, а потым і канец надыходзіць, усе разыходзіцца пачынаюць. Добра тым, хто з адной вёскі ды побач жыве, а хто здалёку прыехаў і на падпітку знаходзіцца, то не надта. Па-

спрабуй заехаць, паспрабуй не заблукаць па дарозе. Ведама ж, можна пераначаваць і ехаць на цвярозую галаву, але хто і калі п'янага чалавека ўпрасіў? Ці ж пагодзіцца ён, ці ж паслухаецца?

Жонка Яна ўсё ж неяк выпхала яго з хаціны, з роднымі ды знаёмымі развіталася і загадала:

— Запрагай, п'яніца горкі!

Муж ведаў, што ў такіх выпадках лепей падпарадкавацца безагаворачна, і таму ўзяўся за хамут. З горам напалавіну зрабіў усё і плюхнуўся побач з жанчынай у мяккае, пахучае сена:

— Цяпер, родненькая, і паганяць можна...

— Ну, дык чаго ты? Паганяй весялей.

Выехалі з падворка, а ўжо вечар позні на вуліцы, цёмна, нібы нехта спецыяльна зоркі і месяц на небе пазасціў. Едуць, жонка песні спявае сваім прыгожым голасам, а Ян спрабуе падцягваць, але дзе ж ты там п'яным голасам патрапіш у лад. Таму праз хвілін колькі гаспадыня гупнула яго кулаком у плечы і загадала:

— Ты лепей ляж за мяне, ззаду, і паспі, я буду сама і кіраваць, і спяваць, каб людзі не падумалі, што ноччу некага ваўкі ў нашым лесе дзяруць. Ты ж верашчыш, а не спяваеш. Рот разявіў і абы крычаць...

Узрадаваны Ян спрытненька перапоўз у другі канец воза. Толькі прылёг — адразу ж соладка захроп. А жонка ехала і спявала. Адну песню скончыць — другую пачынае. Так і весялей адной, і прыгадвалася многа, ды і час ляцеў хутчэй. Дарога ж няблізкая. Азіралася толькі зрэдку назад, ці ляжыць там п'яны.

Ян спаў, з боку на бок перакочваючыся. І прысніўся яму сон, нібы збіраецца ён уцякаць з турмы. Пачаў драбіны абмацваць, быццам бы краты на трываласць правяраў. Мацаў, мацаў, а потым рвануўся і ляпнуўся з воза на дарогу, толькі водгулле па кустоўі пайшло ды пыл клубам узняўся.

Жонка тым часам нейкую сумную песню цягнула і назад не адвярнулася, не звярнула ўвагі на тое, што нешта стукнула. Так і паехала далей, а Ян застаўся ляжаць пасярод каляіны. Храпе — і ўсё на гэтым. Потым неяк ачомаўся і памкнуўся было ісці. Ды п'янага не надта ногі слухаюцца, умомант заплятаюцца. Так і тут здарылася. Колькі разоў чалавек уздымаўся, столькі разоў і падаў. Тым не меней, нейкіх крокаў з дваццаць ад дарогі адшкалдыбаў. А па-

абапал яе кустоўе стаяла, невысокае, праўда, але густое. І нехта ж там ямку глыбокую выкапаў. Ці то жвір хто браў, ці то пясок проста на будоўлю вазіў, але яміну вырыў, што сам не вылезеш. У яе і ўляцеў Ян. Цвярозы чалавек дык ногі-рукі пераламаў бы, а п'янаму здаўна ж гавораць у народзе: «Сам Бог падушку сцеле». Упаў чалавек і заснуў. Сніцца яму, што на печы, за комінам плечы свае грэе. А пясок за дзень нагрэўся і ў яміне за ноч нават не ахаладаў, быў яшчэ цёплы, сухі. Так і ляжаў бедалага.

Жонка тым часам дамоў прыехала і, не зірнуўшы назад, пабегла па гаспадарцы завіхацца, трэба ж было і каровак падаіць, і свінням даць, і дзеткам, пакуль яны ўстануць, есці зварыць. Хапае з раніцы заўсёды работы, асабліва ў гаспадарцы, калі хочаш, каб усё спраўна ішло і людзі не смяяліся, што лайдакаваць любіш.

Управілася са ўсім і гукае ўжо з парога:

— Ян, ідзі ў хату есці, чакаць не будзем! Хутчэй прадзірай вочы і да нас кіруй, п'яніца сонны. Давай, умывайся і за стол, дзеці ўжо есці хочуць.

Сказала і пайшла. Паселі ўсе за стол, чакаюць, а Яна няма. Тады гаспадыня і кажа свайму старэйшаму:

— Сходзі, сынку, паглядзі, што там наш тата робіць, і прыспеш яго...

Выскачыў хлапчынка, але нідзе бацькі не знайшоў. Таму прыбег і матулі пра гэта паведаміў.

Тая зазлавала:

— Ну, зараз я яму пакажу!

Колькі ні хадзіла, колькі ні гукала — не знайшла чалавека. Толькі тут зразумела, што не прыехаў ён дахаты, а недзе на дарозе прапаў. Загаласіла сама, дзеці заплакалі, ажно суседзі дзівіцца пачалі, што гэта там такое здарылася.

Жонка плача-залівaецца, дзеці ўбіваюцца, а Ян тым часам ачомаўся ў яміне і зразумець не можа, дзе гэта ён і як тут апынуўся? Глядзіць, галавою круціць, але да розуму не даходзіць. Сонца высока ўжо ўзнялося, прыпякаць стала. Горача чалавеку ў ямцы, ды яшчэ з перапою, але што зробіш, трэба ж трываць, бо сам не вылезеш.

Па дарозе ж, ведама, хоць і не вельмі часта, але ж людзі ездзяць. Так і тут атрымалася. Нейкі дзед з ба-

бай да дачкі ў госці на вазку ехалі. Конік бегчы не хацеў, таму гаспадар зазлаваў і кажа:

— Чакай жа, зараз я ладны дубец адламаю, то куляй ты ў мяне паляціш...

Саскочыў з воза — і ў кустоўе, што ля дарогі. Выкручвае дубец, а тут з-пад зямлі крык:

— Чалавечку, не кідай мяне тут! Дапамажы вылезці! Дапамажы, бо загіну без вады, без хлеба...

Дзед як пачуў, то і не памятаў, як на дарогу выскачыў. Баба як загарлала, то каня нібы варам аблілі, памчаў, нават гаспадара не дачакаўшыся, а сам дзед да вёскі ляцеў бегам, нібы на крылах яго анёлы неслі.

Прыляцелі да дачкі і толкам нічога распавесці не могуць. Тая бачыць, што нешта незвычайнае здарылася, а вось што — зразумець не можа. Паклікала мужа, той быў чалавек памяркоўны, жартаваць любіў і ўмеў. Неяк усё ж дапытаўся, як усё атрымалася, і... так весела і залівіста зарагатаў, што ажно прывязаны конь азірнуўся, мабыць, правяраў, ці не збіраецца які нячысцік яго і тут падкузьміць.

Жонка і кажа на мужа:

— Як жа табе не сорамна, мужу. Бацька з маці ледзьве з перапуду не памерлі, а ты з іхняга гора смяешся...

— Ды не з іх я смяюся. Не з іх. Ты ж сама чула, як сёння Янава жонка галасіла, што муж згубіўся ўчора...

— Ну...

— Дык гэта ж Ян, відаць, у ямку ўляцеў п'яны... У тую самую, дзе мы з табой вясной жвір капалі...

Цяпер ужо ўсе рогатам зайшліся. Потым пабеглі сказаць беднай жанчыне, каб не хвалявалася, і падказалі, дзе мужа шукаць.

Яна тады з драбінай даставалі. Во дзе смеху ўжо ды жартаў было. Старэйшыя згадвалі, што ён пасля такога выпадку болей ніколі гарэлкі ў рот не браў.

Месца тое Янаўшчынай празвалі, таму, калі там сталі людзі хаты будаваць, назва для вёскі была ўжо гатова.



# ЛАГОЙСК

Жыў-быў некалі ў гэтых мясцінах адзін вельмі багаты селянін. Звалі яго проста — Логвін. У яго было дзесяць дзесяцін зямлі, а хто ў гаспадарцы разбіраецца, той ведае, што гэта нямала. Жонку ягоную звалі Агрэсяй. У іх расло-падрастала трое сыноў. Дапамагалі бацькам дзеці амаль з калыскі. Толькі, глядзіш, на ногі стане, а ўжо нешта па гаспадарцы робіць, з дзецьмі нават нагуляцца добра не паспеўшы.

Але час браў сваё. Хочаш-не хочаш, а людзі старэюць. Састарэлі і Логвін з Агрэсяй. Сілы ўжо былі не тыя, здароўе падводзіла, вочы дрэнна бачылі.

Аднаго разу, калі сыны дарослыя павячэралі разам з імі і пайшлі адпачываць, бо з раніцы новая праца чакала, селі муж з жонкай за стол і павялі гамонку між сабою. Дзед на бабу і гаворыць:

— Ведаеш што, жонка, у нас жа лесу даволі многа, і добрага лесу, людзі зайздросцяць. Не адзін, не два з вяскоўцаў ды і з паноў таксама падыходзілі да мяне, каб прадаў, але тады я здаровы быў і толькі пасміхваўся ў адказ. А зараз зусім іншыя справы прыспелі...

— Чаго ўжо ты, чалавеча, так убіваешся? Хіба ж мы дрэнна працавалі? Хіба ж на нас некалі людзі пальцамі за такі грэх торкалі? Усе старэюць, то і мы не выключэнне...

— Ды я не пра гэта, я зусім пра іншае гаворку вяду. Цябе добра разумею. Частку лесу давядзецца прадаць, навошта нам зараз столькі. З астатняга будзем выбіраць лепшыя лясіны для будоўлі. Нам жа яшчэ трэба пабудаваць два прасторныя і светлыя дамы. Адзін сын з намі застанецца, а двух у асобныя дамы паселім, ды яшчэ трэба маёмасць так падзяліць, каб жылі яны без крыўды, не сварыліся паміж сабою, бо для людзей насмешкай стануць. Эх, жыццё...— выдыхнуў Логвін.

— Нічога, стары, усе жылі і дажывалі, і мы за іх не горшыя, а лепшымі быць мы не надта імкнуліся, старых правілаў прытрымліваліся...

— Добра, жонка, пагаманілі мы з табою, а зараз сыноў сюды кліч.

— То хай бы, можа, паспалі... Заснулі ж ужо...

— Паспяць яшчэ. Гамонка ў нас з імі не надта працяглая будзе, але неабходная. Трэба ім пра ўсё распавесці, каб потым за чубы не ўзяліся...

— Раз так, то пайду паклічу,— і гаспадыня ціхенька адчыніла дзверы.

Праз нейкую хвіліну заспаныя сыны паволі ўсунуліся на бацькоўскую палавіну.

— Клікаў, бацька?

— Так, сынкі, клікаў. Сядайце на лаву ды будзем гаворку весці...

Старэйшы незадаволена прамовіў:

— Можна было б і заўтра з раніцы...

— Яно-то канешне, можна, але мы з маці зараз вырашылі пра гэта пагаварыць.

Запанавала цішыня, якую зноў-такі парушыў гаспадар.

— Мы тут, хлопцы, вось пра што гаманілі: пра далейшы лёс наш. Трэба вас, сынкі, ажаніць усіх, пакуль мы яшчэ ходзім ды на свет божы глядзім, бо дзень за днём — і нас можа не стаць на гэтай зямлі. Хацелася б унукаў пабачыць. Што ты, Сцяпанка, думаеш?

— Я, бацька, з вамі пагаджаюся, бо колькі ж нам халасцякаваць, колькі хадзіць без уласных сем'яў...

Маці задаволена пляснула рукамі і замілавана глянула на старэйшага.

— Ну, а што ты скажаш, Васіль? — звярнуўся стары гаспадар да сярэдняга.— Трэба ж і табе нешта рабіць.

— А што мне гаварыць? Я таксама пагаджаюся, нават болей вам скажу, я ўжо і дзяўчыну нагледзеў. Таму за мной справа не стане, толькі вы не марудзьце...

— Вось табе і маеш,— войкнула Агрэся.— Маўчаў-маўчаў, ніколі і словам не абмовіўся, а і дзеўку сабе завёў...

Усе ў хаце коратка, але гучна рагатнулі.

Выціраючы слёзы на вачах, Логвін прагаварыў:

— Ну, а ты, Іванка, што маеш сказаць?

Малодшы ўстаў, зірнуў на родных і бойка прамовіў:

— Мне жаніцца, тата, яшчэ рана. Колькі я на гэтым свеце пажыў? Яшчэ і не навучыўся добра гаспадарку весці, не дайшоў да ўсяго сваім розумам. Які ж з мяне гаспадар атрымаецца? Як жа я самастойна справу павяду? Хочацца мне па свеце пахадзіць, на людзей усялякіх паглядзець, ад іх што пераняць, каб потым ніякіх цяжкасцей не ведаць. Калі б вы дазволілі, я пайшоў бы вандраваць...

Маці апусціла вочы долу і ўсхліпнула, бацька спахмурнеў і пасля некаторага вагання прамовіў:

— На тое мы ўсе сёння тут і сабраліся, каб справы мірам-ладам вырашаць, не спрачаючыся, не злуючыся адзін на аднаго. Кожны з вас сваю волю выказаў, мы яе выслухалі, а раз ужо Іванка захацеў гэткім шляхам пайсці, то што рабіць... Не будзем яго адмаўляць, кожны сабе шлях сам выбраў. Каму жаніцца, а каму па свеце вандраваць, каб мудрасці ды практычнасці ад людзей навучыцца. Таму мы з матуляй не будзем супярэчыць, толькі просім, каб, як наглядзішся, сыночку, назад да нас вяртаўся. Мы ж тут адны застанёмся, братоў тваіх на ўласныя гаспадаркі адпускаем...

— Даю табе слова, тата, што абавязкова вярнуся назад, не пакіну вас. Вось толькі пахаджу-павандрую, пагляджу, як іншыя людзі жывуць, і назад прыйду. Не падману, вы ж мяне ведаеце.

— Вось і ўсё, дзеткі, што мы хацелі вам сёння па-

ведаміць. Як бачыце, не так многа часу прайшло, і пра ўсё спакойна дамовіліся. Зараз і спаць можаце сабе кіраваць, адпачыць яшчэ паспееце. Ты, Іванка, можа, заўтра яшчэ дома пабудзеш? — на развітанне запытаўся бацька.

Той вымушана ўсміхнуўся неяк вінавата і прагаварыў:

— Ды не, тата, я пайду з самай раніцы, пакуль сонейка не прыпячэ моцна. Што ўжо нас той дзень выратуе? Хутка дамоў вярнуся, тады пра ўсё і раскажу...

— Ну, то спаць час настаў. Добрай вам ночы, сынкі...

— І вам таксама — спакойнай ночы.

Яшчэ толькі сонейка зайграла на небе, а маці ўжо бегала па падвор'і, нібыта працай занята была, а на самай справе чакала, калі Іванка пакажацца, каб паспрабаваць адмовіць яго ад гэткай дзіўнай задумы. Нарэшце той выйшаў да студні. Агрэся да яго адразу і падкацілася:

— Сыночак, а можа перадумаеш? Навошта табе тая вялікая дарога? Куды ты пойдзеш? Што гэта ты, мой міленькі, надумаў? Як жа мы без цябе застанемся, бо заўсёды ж на цябе менавіта болей глядзелі. Спадзяваліся, што галовы свае на тваё магутнае плячо прыхілім. Старэйшыя браты, яны і ёсць старэйшыя. Пажэняцца, і толькі мы іх тут і бачылі... Не ідзі, сыночак. Невядома яшчэ, што цябе там чакае, ці дасць хто кавалак хлеба, калі галадаць будзеш, ці пакажа хто дзе вады напіцца, калі смага адолее... Паслухай лепей мяне, не ідзі, надта прашу цябе.

Прыгарнуў сын Іванка матулю да сваіх грудзей, затуманіліся слязьмі ягоныя вочы, але ўсё роўна прамовіў:

— Вось вырашыў, матуля, сябе выпрабаваць. Калі так атрымаецца, як задумаў, то наступнай вясною сустракаць мяне будзеце, і ўсё далей добра пойдзе. Блаславі мяне лепей у дарогу невядомую, ды пайду я збірацца, бо баюся, каб што неабходнае не забыць, а без самай малюсенькай дробязі потым падарожнаму чалавеку бывае нявыкрутка... Не злуйся, матуля, але пайду я.

Не вытрымала тут Агрэся і заплакала ўголас, нібы нябожчыка з двара збіралася выпраўляць, а не жы-

вога сына. Выйшлі на плач той астатнія. Логвін хвілін колькі памаўчаў, паслухаў і прыкрыкнуў на жонку:

— Ну, хопіць ужо! Не на смерць жа Іванка сабраўся, павандруе па свеце і назад вернецца! Кінь галасіць, а то людзі невядома што падумаць могуць!

Браты моўчкі пастаялі, развіталіся з малодшым братам і падаліся ў хлеў да жывёлы, яе ж трэба было на пашу выганяць. Бацька з маці ў хату вярнуліся і сталі дапамагаць Іванку мяшок заплечны збіраць. Потым прыселі на дарожку, і Логвін не ўтрымаўся, сказаў, не гледзячы ў вочы сыну:

— Ты толькі, сынок, нас не падвядзі, назад абавязкова вяртайся. Мы цябе вельмі чакаць будзем...

Нічога не адказаў Іванка, моўчкі пакланіўся і выйшаў за вароты.

Так і пачалося яго вандроўнае жыццё. Спачатку, калі ішоў яшчэ па роднай старонцы, то неяк вясялей было, не гэтак самотна, бо згадваў, што некалі тут бываў то з братамі, то з бацькам па нейкай нагодзе. А вось калі ступіў на чужую зямлю, у незнаёмы край, то нібы які цмок усеўся пад сэрцам і не даваў яму спакою. Падыдзе крыху, азірнецца назад, і здаецца, што яшчэ крок-другі, і не вытрымае, паверне назад. Ды Іванка меў цвёрды характар, не паддаваўся на гэткія думкі, упарта крочыў наперад.

Можа, гэтак з месяц доўжылася. Зайшоў ён у такі глухі край, дзе і людзі вельмі рэдка сустракаліся. Калі ў тыдзень чалавека напаткаеш, то добра, а можна і дзён дзесяць крочыць у самоце.

Аднаго дня, пад вечар ужо справа набліжалася, выйшаў падарожны па лясной сцяжынцы на невялічкую палянку. Падалося яму, што нехта сочыць за ім. Колькі разоў глянуў уважліва — не, не відаць. Але ўсё ж адчувае, быццам бы нечыя вочы яму ў спіну зіркаюць. Стаў і галавой навокал паводзіць, узіраецца. І што ж вы думаеце? Заўважыў невялічкую хацінку. Такая ўжо старая яна была, што амаль з зямлёю зраўнялася. Не асмельваецца малодшы брат да яе бліжэй падыходзіць, баіцца, каб якая сіла нячыстая не ўхапіла ды не наздзекавалася. Потым неяк рашыўся. Падышоў ушчыльную і за дзверы пацягнуў. Зарыпелі тыя страшэнна, закалаціліся пад рукою, нібы ў іх хто з усяе сілы лупянуў добрым дрынам. Пе-

растуціў падарожны парог і спыніўся ў нерашучасці. Нічога амаль не відаць, ажно чуе голас:

— Хто там? Хто там зайшоў?

А Іванка не адзываецца, усё глядзіць, каб знайсці, хто ж там яго кліча. Нарэшце ўбачыў бабулю ў вельмі брудным адзенні.

— Я гэта, Іванка-вандроўнік...

— А чаго ты тут ходзіш, чалавеча? Што шукаеш? Чаго табе трэба ў нашым глухім краі?

— Пайшоў я, бабуля, з роднай хаты, каб пабачыць, як людзі ў іншых мясцінах жывуць, чым займаюцца, ды навучыцца ад іх жыццёвай мудрасці і практычнасці...

— Практычнасці табе захацелася? — ці то запытала, ці то перадражніла старая гаспадыня і залілася горкімі слязьмі.

— Што здарылася? Чаго ты гэтак плачаш-убіваешся?

— Не ела я, добры чалавек, можа, цэлы тыдзень, таму і злягла, што сілы нястала. Ні расінкі макавай, ні вадзіцы сцюдзёнай ніхто не падасць. Здаецца, каб крыху перакусіла, то і на ногі стала б адразу...

— І рады б табе, старэнькая, дапамагчы, ды не ведаю чым, бо з ежы ў мяне ўсяго і засталося, што адзін сухарык. Мне не шкада, але ці станеш ты яго есці?..

— А ты размачы вадзіцай і падай, а заадно і вадзіцы ў конаўцы прынясі...

Так Іванка і зрабіў. Калі яна з'ела ягоны сухарык, то крыху павесялела і пачала распавядаць пра сваё жыццё-быццё. Выяснілася тут, што яна некалі мела і мужа, і дачок, і нават дваіх сыноў-асілкаў. Але прайшоў час, муж памёр, дачок замуж пааддавала, а сыны ў свет пайшлі шчасця-долі шукаць. Калі адыходзілі, то ўсе абяцалі назад вяртацца і дапамагаць, не кідаць яе адну, а на самай справе вось як здарылася. І жыве яна гэтак ужо не адзін год, а можа, добры дзесятак. Раней хоць крыху здароўе трымалася, а ў гэтым годзе дык зусім здала гаспадыня. Вось і зараз ляжала ўжо і смерці чакала.

— Таму табе мая парада, чалавеча: вяртайся дамоў, пакуль часу нямнога прайшло, бо, можа, і твае бацькі сядзяць недзе і слёзы льюць, а сыны на іх зусім забыліся...

— У нас такога не можа здарыцца, бо мае старэй-

шыя браты абяцалі глядзець за бацькамі, пакуль мяне не будзе. Калі вярнуся, то я стану сачыць-даглядаць тату і маму.

Пераначаваў Іванка, убачыўшы, што старэнькая яшчэ вельмі слабая, а раніцай далей выбраўся. Гаспадыня зноў паўтарыла:

— Не ідзі, сыночак, далей, вяртайся да бацькоў, яны, можа, дапамогі тваёй чакаюць...

— Яшчэ, бабулька, крыху пахаджу, пагляджу і назад вярнуся. Я ж і не так даўно з дому выбраўся.

І зноў, ці доўга, ці не, ішоў хлопец, але надта стаміўся, здарожыўся так, што ўжо ледзьве ногі перастаўляў. Цяпер і яму добра было б, каб хто-небудзь кавалачак хлеба падаў. Ды дзе ж табе яго пададуць, калі людзей навокал няма. Заснуў Іванка, да нейкага каменя прыхіліўшыся. Ляжыць і мроіцца яму, што падышоў да возера шырокага-шырокага, і вада ў ім такая чысцюткая, што ажно неба на дне адбіваецца. Калі так прыснілася, то і прачнуўся. Усхапіўся і далей пайшоў. Нейкіх ягадак перакусіў, і ў страўніку ўжо не гэтак пякло.

Праз пару гадзін і сапраўды падышоў да прыгожага возера, якое раўнюткім люстэркам раскінулася паміж густых лясоў. Стаў на беразе, каркнула над галавою варона, нібы вітаючы яго, і ўсё зноў заціхла. Так спадабалася тут Іванку, што далей ён не пайшоў, а, расклаўшы вогнішча, пачаў лавіць рыбу, якая з вады сама на бераг выскаквала.

— Вось бы тут жыць застацца! Прыгажосць якая навокал! — сам сабе ўвесь час паўтараў падарожны, ладкуючыся ля вогнішча на ноч.

Зноў неяк непрыкметна заснуў Іванка. Толькі добра ўспаўся, як сніцца яму сон, што прыляцелі на бераг возера гусі-лебедзі. Ды на самай справе аказалася, што гэта не птушкі, а прыгажуні-дзяўчаты, якіх злая чараўніца ператварыла ў гусей-лебедзяў. Вось паселі яны на хвалях і давай паміж сабою размаўляць.

— Хутчэй бы другія пеўні прапялі, тады б і нам можна было крыху пажыць, як людзі жывуць...

— Праўду кажаш, сястрыца,— азвалася другая.

— Калі ўжо гэтае гора для нас, родненькія, скончыцца? — запыталася трэцяя.

— Ох, гора нам, гора,— завохкалі-загаласілі дружна астатнія, толькі водгулле пайшло па ціхіх хвалях.

Бачыць усё гэта ў сне хлопец, потым нечакана вочы расплюшчыў і ажно знерухомеў: на возеры, зусім непадалёку ад яго, гойдаліся на сінюткіх хвалях штук дваццаць гусей-лебедзяў. Іванка выразна чуў іхнюю гамонку, бачыў іхнія скрыдлы і пёркі. Недзе здалёку данёсся крык пеўняў. І ў той жа самы момант птушкі панесліся да блізкага берага, павыскаквалі, як адна, і пачалі... распранацца, бо на самай справе, як яму і прыснілася, гэта былі дзяўчаты. Ды такія прывабныя і прыгожыя, усе маладыя, здаровыя, пад месяцам адсвечвалі круглыя, высокія грудзі, паблісквалі загарэлыя спіны. Хлопец ажно прыўзняўся на калені, але адразу дацяміў, што можа сапсаваць усю справу, і зноў стаіўся. Ляжыць у засадзе і мяркуе, што ж яму далей рабіць.

Дзяўчаты-птушкі, весела гамонячы, купаліся і не падазравалі, што нехта чужы за імі назірае. Галасы несліся над вадою, над наваколлем і недзе далёка-далёка патухалі.

І тут прыдумаў Іванка, што яму рабіць. Падкраўся да вопраткі самай прыгожай дзяўчыны, схапіў яе і панёс у густыя кусты. Стаіўся там і чакае, калі яны з вады павылазяць і заўважаць прапажу. Ды дзе там, можа, добрых пару гадзін купаліся-плавалі прыгажуні і нават не падплывалі да берага. Хто яго ведае, чым бы ўсё завяршылася, каб не прапялі трэція пеўні. Не паспеў іхні спеў у лясах заціхнуць, як дзяўчаты закрычалі:

— Хутчэй, хутчэй, сястрычкі, бо не будзе нам паратунку ад злой чараўніцы, калі запознімся! Паплылі да берага, дамоў час прыспеў збірацца!

— Плывём! Збірацца! — толькі і паўтарыла рэха занепакоеныя крыкі.

Хуценька падплылі дзяўчаты да берага і кінуліся да сваёй вопраткі. Яшчэ колькі імгненняў — і ўсе стаялі, пераўвасобіўшыся ў гусей-лебедзяў. Толькі адна плакала і бегала, не знаходзячы вопраткі.

— Шукай, сястрыца, ды даганяй нас, а мы палящім, каб не запозніцца!

— Спяшайся і ты, каб позна не было!

Сказалі так і паляцелі, а бедалагу-дзяўчыну на зямлі пакінулі. Заплакала прыгажуня горка і села на камень ля вады. Чакала, мабыць, самага што ні на ёсць горшага. У гэты момант Іванка выйшаў з кустоўя і звярнуўся да дзяўчыны:

— Не плач, прыгажуня. Гэта я тваю вопратку схаваў, бо надта ж ты мне даспадобы прыйшлася. Хацеў бы на табе ажаніцца, але як загаварыць — не ведаў, таму так і зрабіў. Калі паабяцаеш, што выйдзеш за мяне, то аддам табе вопратку, а калі не, то як сабе хочаш, але яе болей не апранеш...

— Выйду, выйду, родненькі, толькі давай хутчэй сюды вопратку, а то мне позна будзе дамоў вяртацца...

— А ты мяне не падманеш?

— Не, толькі давай вопратку.

— Тады зробім так. Я схаджу да бацькоў дамоў і вярнуся назад, за табою. Тут і сустрэнемся...

— Згодна,— прамовіла дзяўчына і, імгненна ператвасобіўшыся ў птушку, паляцела ў неба.

Доўга ці не вяртаўся Іванка да бацькоў, але яму здавалася, што ён на крылах ляцеў. Гэтак хацелася хлапцу з роднымі сваёй радасцю падзяліцца. Толькі і час на месцы не стаяў. З таго дня, як ён пайшоў з дому, прайшло ўжо амаль тры гады, і многае перамянілася. Нарэшце выбіўся падарожны ў знаёмыя мясціны. Ідзе сабе і мяркуе, як яго дома сустрэнуць. Неўзабаве і хутар родны паказаўся, сэрца часцей забілася-зацёхкала ў грудзях. Калі ўжо амаль падышоў, нешта трывожнае закралася ў душу. Поле было недагледжанае і зарослае, хаціна і гаспадарчыя пабудовы — таксама запушчаныя. Ступіў на падворак і тут толькі здагадаўся, што праўду некалі казала яму тая старая бабулька, якая перасцерагала, каб надта доўга ўдалечыні ад дома не хадзіў, бо некаму будзе сустракаць яго. Так і здарылася. Не дачакаліся бацькі малодшага сына з далёкай дарогі — памерлі, браты родныя перасварыліся-перабіліся, ды ці адзін раз, за бацькоўскую зямлю.

Пагараваў Іванка над магілкамі і пайшоў назад, бо не было чаго яму тут болей рабіць. Знайшоў сваю суджаную і стаў з ёю разам жыць, дзетак сваіх гадаваць. Доўга толькі іхняя сям'я жыла ля возера, але з цягам часу сталі іншыя людзі хаціны будаваць, паселішча ўзнікла, а вось возера тое, прыгожае і сіняе, за многія стагоддзі зусім з твару зямлі знікла.

Тут невялічкую вёсачку месточкоўцы назвалі Лагвойск, у памяць пра Іванку, які вёў свае карані ад бацькі Логвіна.

## ПЛЕШЧАНІЦЫ

Непадалёку ад вёскі біла з зямлі крынічка. Такая чысцюткая і халодная ў ёй была вада, што калі пап'еш, то ажно зубы ломіць, здаецца, што дух зойдзецца ў грудзях. Людзі зрабілі дубовы зруб і паставілі яго на крынічку, каб яна ніколі не засмечвалася ды пяском не зацярушвалася. Глядзелі за ёю,. нібы за жывой істотай якой. Сцвярджалі нават, што такая пашана да крынічкі засталася з яшчэ даўнейшых часоў, калі продкі тых вяскоўцаў пакланяліся вадзе і абагаўлялі яе.

Непадалёку ад зруба таго рос прыгажун-дуб і некалькі таўшчэразных ды агромністых вербаў, якія, здавалася, ажно неба сіняе і сонца яркае сваімі разгалістымі кронамі закрывалі. Летам сонейка смаліцьпячэ, а ў цянёчку тым зусім іншае жыццё.

Да крынічкі прыходзілі і маладыя людзі, і старыя. Малых усе павучалі, каб нічога благога тут не ўдумалі зрабіць. Так стагоддзі праходзілі. Усё добра было, як і мае быць. Ды усё ж здарылася бяда аднаго разу.

У вёсцы той жыла дзяўчына-прыгажуня. Хто яе ведае, як яе звалі, але мне дзядуля казаў, што Юляй. Працавітая дзяўчына вырасла, надта прывабная. Вясёлая ў меру і гэткая ж спакойная, калі трэба. Ветлівая да людзей, ніколі міма не праходзіла, каб не папытацца пра здароўе ў старэйшага ці не дапамагчы, як убачыць, што нешта не атрымліваецца або цяжкавата аднаму спраўляцца. Таму і яе паважалі, таксама спагадліва адносіліся. Зайздросцілі тым бацькам, якія такую дачку выгадавалі. Калі дзе збіраліся пасядзець старэйшыя, то толькі і чуваць было!

— Што табе, Вольга (маці Юльчына), хіба ж табе на лёс скардзіцца? Такую дачку выгадавала, на зайздрасць іншым. Не прагуляе ніколі, не адстане ў працы, а як у танок стане ці песню запяе, то, здаецца, ля яе адной і прастаяў бы, слухаючы ды наглядаючы. Што ўжо і казаць...

— Ды я, жанчынкі, нічога такога і не гавару,— мовіла ціхенька ў адказ маці, а ў самой сэрца ў грудзях тухкала ад радасці.

Калі Юльцы мінула семнаццаць вёснаў, яна ўжо гэтак расцвіла, што і сказаць цяжка. Бацька часам выходзіў на падворак і глядзеў на гэткую ж прыгожую

рабіну, якая расла пад самым акном. Яе ён пасадзіў у той дзень, калі нарадзілася Юлька. І вось цяпер яны прыгажэлі разам. Быў бы сын — рос бы на месцы рабінкі дубок, такі ўжо старадаўні звычай вёўся. Стаяў ён, глядзеў колькі хвілін, і сэрца пачынала часта біцца, бо разумеў гаспадар, што недалёка той час, калі пастукаюцца ў дзверы сваты і... павязуць з ягонага падворка адзіную дачку. Сымон нават уявіць сабе не мог, як ён будзе без Юлькі, на каго хата застанецца... Ды стараўся гнаць ад сябе прэч гэткія думкі, спадзеючыся, што яшчэ год-два прабудзе з імі іхняя ўцеха.

Каб жа так адбылося, як бацьку думалася. Толькі наадварот здарылася. Ліха-бяда прыйшла ў хуткім часе.

Аднаго разу пайшла Юлька з матуляй жыта жаць на далёкую ніву. Памкнуўся было з імі і бацька, коніка ўжо запрог, але ў апошні момант прыспела нейкая тэрміновая праца ў іншым месцы, і ён павінен быў застацца дома, каб паехаць туды крыху пазней. Жнейкі пайшлі самі. Спявалі-залівалiся, толькі водгулле-рэха па наваколлі ляцела ды віталася з лясамі-пералескамі, з лугамі-мурагамі, з жытнёвымі палямі. Галасы абедзьве мелі непаўторныя, што тыя птушкі паднябесныя спявалі. А чаму ім і не спяваць было, калі жыццё на радасць ішло, калі ўсё добра атрымлівалася?

Зайшлі яны на ніву, памаліліся, і за працу ўзяліся. Спяваць любілі, а працаваць яшчэ лепей умелі. Як возьмуцца ўдваіх, то за дзень гэтулькі зробяць, што і пяць жнеек за імі не паспеюць. Гэта вам не спяваць, а жыта жаць. А маці з дачкою працуюць, працуюць, а потым заспяваюць. Ды ўжо не вясёлую, не жартоўную зацягнуць, а жніўную песню, гэткую ж тужлівую і сумную, як і беспрасветнае сялянскае жыццё, што кожны дзень можа прынесці самыя нечаканыя навіны. Добра дачцы ў сваёй сям'і, са сваімі роднымі, а прыйдзе час, і трэба будзе пакінуць родную хаціну. Каб жа ведаў, да каго трапіш, то, можа, і не надта перажываў бы, але ж людзі самыя розныя бываюць. Нярэдка ставалася, што маладая жанчына не вытрымлівала здзекаў і канчала жыццё самагубствам. То тут, то там распавядалі пра такія здарэнні. Таму і песня зараз лілася не надта жыццярадасная.

— Чаго, дачушка, засумавала? — запыталася маці, калі скончылі песню.

— А нешта на душы самотна стала. Нязвычна. Чаго — і сама не ведаю. Даўней такога не здаралася.

— Не ўбівайся, Юлечка. Не трэба гэтак перажываць. Рана табе яшчэ. Пажывеш з намі пару гадочкаў, парадуешся жыццю. Не ўсім дрэнныя хлопцы трапляюцца, не ўсім замужам дрэнна. Гэта толькі ў песні так, а на самай справе ўсё інача бывае.

— Хто ж яго, матулечка, ведае,— са скрухай у голасе прамовіла маладая жнейка,— а раптам і мне не пашанцуе...

— Тут толькі воля лёсу. Будзем спадзявацца на лепшае.

Пагаманілі гэтак і далей працуюць. Потым і поўдзень прыспеў. Схаваліся пад бярозкаю ў цень і перакусваюць тым, што ўзялі. Тут Юлька нечага ўсхадзілася і кажа:

— Мамачка, а можна я збегаю, пакуль час ёсць, да святой крыніцы?

— Чаго гэта табе туды, Юлька, захацелася?

— Ды я хутка збегаю. Пакуль вы адпачываць будзеце, то я і абярнуся. Толькі на пару хвілін. Туды дабягу, вадзіцы сцюдзёнай пап'ю і адразу ж назад.

— Ды ты лепей побач са мною паляжы, адпачні крыху, вады ж мы з сабой прынеслі. Да вечара яшчэ далёка, намучышся...

— Я хуценька, матулечка.

— Ды ўжо ж збегай. Толькі надта не ляці, бо і так шкада цябе, ні хвілінкі не адпачнеш...

Маці прылягла, каб адпачыць хоць якіх з паўгадзінкі, а дачка паімчала да крыніцы. Ведама, маладыя ногі — не тое, што старыя, і нейкая там вярста для іх не адлегласць. Праз колькі хвілін Юлька сядзела ўжо ля дубовага зрубчыка, праз які цурчэла-звінела чысцюткая вада. Спачатку напілася, а потым сцішылася і задумалася аб нечым сваім, патаемным. І не пачула, як да крынічкі падкраўся вершнік. А ён пад'ехаў з нейкай сваёй мэтай, можа, хацеў вады напіцца, а можа, паглядзець, ці няма паблізу людзей, і напаіць свайго каня. Але калі ўбачыў дзяўчыну, то падкраўся і пачаў назіраць. Так доўга і стаяў бы, каб конь не фыркнуў. Усхапілася ад нечаканасці Юлька.

— Хто тут?

— Не палохайся, дзяўчына, не палохайся. Нічога ліхога табе рабіць я не збіраюся,— прамовіў вершнік.

А сам як убачыў тварык прыгажуні, то і язык праглынуў. Глядзіць не мігаючы, дый годзе.

Дзяўчына крыху супакоілася і пачала таксама яго разглядваць. Перад ёю быў не проста вершнік, а багата апрануты паніч. «Што ж гэта ён на мяне так вылупіўся?» — падумала Юлька і галасна засмяялася. Засмяяўся і паніч. Заўважыўшы, што дзяўчына ўжо не баіцца яго, ён накіраваў коніка бліжэй. Юлька адступіла крокаў пару назад і занепакоена запыталася:

— Гэта яшчэ што такое? Мне трэба бегчы, бо матуля зачакалася на ніве. Я паабяцала вярнуцца праз паўгадзіны. Збожжа жаць трэба, такое надвор'е добрае стаіць, а то яшчэ дождж ліне ці віхура якая ўсходзіцца...

— Не палохайся, не палохайся, прыгажуня. Нічога благога я не збіраюся рабіць,— паўтарыў незнаёмец.— Скажы толькі, як цябе завуць?

— А гэта навошта?

— Ну-у-у...

— Юлька мяне завуць,— крыкнула дзяўчына і лупянула ад крынічкі так, што ажно пяткі замільгацелі пад сонейкам.

— Я буду вечарам цябе чакаць тут, Юлька! — данеслася ззаду.

Прыгажуня прыпынілася, а потым яшчэ хутчэй паімчала да нівы, баючыся, што не паспее ў час.

Да самага вечара працавалі-шчыравалі жнейкі. Калі пайшлі дамоў, матуля зноў зацягнула песню. Але Юлька не падтрымала, яна ўсё паглядала ў той бок, дзе знаходзілася крынічка. Маці даспявала сама і пачала іншую, а дачка ізноў маўчала. Тады яна спытала:

— Што гэта з табою, дачушка, робіцца? Чаму не спяваеш? Можа надта стамілася, і сілы нестае, каб голас падаць, ці якая іншая прычына? Скажы, не хавай ад мяне.

— Ды не, матуля, усё добра. Усё добра. Дамоў хутчэй хочацца, бо адчуваю сябе не вельмі добра...

— Тады зразумела, тады і я не буду песні гарлаць. Пайшлі хутчэй, бацька, відаць, ужо нас там зачакаўся. Пайшлі, мая дачушка, мая памочніца.

І стомленыя жнейкі прыбавілі кроку. Бацька сапраўды чакаў іх. Ён агледзеў усю гаспадарку, навaрыў есці і нервова хадзіў па падворку.

Убачыўшы жонку і дачку, сярдзіта запытаўся:

— Ці то вы ўжо там і начаваць збіраліся? Ці то вам ужо і вячэра не трэба? Ужо прыцемкі на дварэ, а іх няма і няма... Хіба ж так можна, маці, дачку таміць дый самой так доўга шчыраваць? А адпачываць вы калі думаеце? Ці ж летняя ночка такая доўгая, як зімовая? Не паспееце вачэй заплюшчыць, а трэція пеўні праспяваюць, і ўставаць трэба будзе.

— Не сварыся, мужу, не сварыся. Мы болей не будзем так позна працаваць. Толькі супакойся і не крычы на нас, бо нешта Юлька сябе сёння блага адчувае.

— Што здарылася, дачушка? — адразу забыўшыся на сваю злосць, звярнуўся да Юлькі бацька.— Можа захварэла, ці перапрацавалася?

— Ды не, тата, мама пажартавала. Усё са мною добра. Засумавала крышку, вось і ўсё. А так усё добра. Не перажывайце.

Перакусілі ў прыцемках і пачалі спаць збірацца. Тут Юлька зноў здзівіла сваіх бацькоў.

— Можна я на пару хвілін да сяброўкі збегаю? Я хуценька. Пару хвілін пабуду і прыбягу. Нешта пабачыцца захацелася...

Бацькі пераглянуліся паміж сабою, і маці прамовіла:

— Дачушка, позна ж ужо. І так стамілася. Ляж ды паспі, а заўтра спецыяльна раней прыйдзем, тады і збегаеш.

— Я толькі на пару хвілін. Усяго на пару — і назад.

— Ну, то бяжы, раз ужо так трэба, толькі доўга не хадзі, бо і час позні, і мала што можа здарыцца...

Юлька выбегла з хаціны. Але пакіравала не да сяброўкі на суседні хутар, а да крынічкі, ля якой днём напаткала прыгожага паніча. Бяжыць, а сэрца стукае, кроў у скронях тахкае: «Не бяжы, не бяжы...» Хвілін праз колькі амаль даджгала. Тут ужо прыпынілася, перавяла дух і стала падкрадвацца цішком, цікава ж было даведацца, ці чакае той вершнік, ці не, а можа, толькі пасмяяўся і проста так крыкнуў тады наўздагон. Неўзабаве Юлька пачула, як фыркнуў конь. Не, не падмануў, прыехаў. Потым убачыла і самога паніча, які таропка хадзіў вакол зруба, бо, мабыць, даймалі і не давалі спакою шматлікія камары. Пастаяўшы колькі хвілін за бліжэйшым кустом, дзяўчына ўсё ж выйшла да крынічкі.

— Прыйшла, Юлька, а я думаў, што ўжо не будзе цябе. Я тут ужо, можа, гадзіны тры хаджу, цябе чакаю...

— Навошта было так рана прыходзіць? Мы ж працавалі дапазна...

— Не цярпелася цябе ўбачыць, прыгажуня.

— Так ужо і прыгажуня. Скажаце такое, ажно слухаць няёмка...

— Кажу тое, што бачу перад сабою.

Так, слова за слова, і пазнаёміліся бліжэй. Цяпер дзяўчына ведала, што паніча завуць Мсціславам і што ён служыць у багатага князя. А ў гэтых мясцінах апынуўся таму, што павінен быў нагледзець добрае месца для будучага ўмацаванага паселішча. Калі выканае загад свайго ўладара, то вернецца назад, у палац, а потым ужо прывядзе на прыгледжанае месца людзей, якія пачнуць узводзіць будынкі.

Пахадзілі колькі часу, і Юлька нясмела прагаварыла:

— Мсціслаў, мне трэба бегчы дамоў, бо бацькі хвалявацца будуць. Яны ж не лягуць спаць да тае пары, пакуль мяне дома не будзе.

— Чаго бегчы? Давай да мяне ў сядло сядай і конь, нібы віхура, дамчыць нас абодвух, а ля хутара і саскочыш...

— А можна?

— Канешне...

Ніколі, мабыць, не прасіў у думках Мсціслаў свайго каня, каб той не спяшаўся і ішоў павольна. Але на гэты раз поруч з ім сядзела самая прыгожая дзяўчына на зямлі. Ён адчуваў пах яе валасоў, датыкаўся да яе маладога і гарачага цела. Гэта ўсё ўзбуджала маладога і здаровага хлопца. Калі развіталіся, то вершнік зноў папрасіў дзяўчыну надвячоркам сустрэцца ля крынічкі, і тая згадзілася.

Так, з таго самага вечара, і пачалі кахацца Юлька з Мсціславам. Цяпер яны ўжо праседжвалі дзе-небудзь у ціхім месцы цэлыя ночы напралёт. Бацькі сталі дакараць дачку:

— Глядзі, дачушка, каб ліха якога не здарылася. Хлопцы ўсялякія сустракаюцца. Пажартуе з табой, насмяецца, а потым, зрабіўшы сваю справу, уцячэ. Як будзеш тады людзям у вочы глядзець? Добра, калі адну пакіне, а калі з дзіцём, што тады?..

— Кіньце вы дурное, родненькія, Мсціслаў зусім не такі. Не такі, я вам праўду гавару.

Прайшло колькі часу, і Юлька прывяла свайго суджанага дамоў. Бацькоў зараней папярэдзіла, таму тыя добра падрыхтаваліся да сустрэчы, і ўсё адбылося належным чынам. Тут юнак папрасіў у іх рукі дачкі. Паваганіся бацькі, паваганіся, але, заўважыўшы, як нецярпліва пацірала рукі дачка, з якім замілаваннем пазіраў на яе Мсціслаў, далі згоду. Паабяцаў малады паніч, што вяселле згуляюць і забярэ да сябе Юльку тады, калі прывядзе княжацкіх дружыннікаў ды людзей майстравых новае паселішча тут будаваць. Так і дамовіліся. А раніцай вершнік паскакаў у далёкую дарогу. Засумавала дзяўчына, пазіраючы ў той бок, куды ён пакіраваў. Бацькі суцяшалі яе, як маглі, казалі, што неўзабаве вернецца хлопец, але сэрца прыгажуні, відаць, адчувала небяспеку.

Аднойчы пачуўся выразны цокат капытоў. Юлька выскачыла з хаціны на падворак, але гэта быў не Мсціслаў, а здаравенны, барадаты дзядзька ў дарагой кальчузе.

— Ты Юлька? — запытаўся ён магутным басам.

— Так,— ледзьве дыхаючы, прамовіла тая.

— Сядай хутчэй да мяне ў сядло, паедзем на апошняе спатканне з Мсціславам...

— Чаму на апошняе?

Па дарозе давёў ёй дружыннік, што нейкія ліхія людзі, зусім непадалёку адсюль, зрабілі на іх засаду, і стралою быў цяжка паранены Мсціслаў. Адчуваў, мабыць, небарака, што доўга не працягне, таму надта прасіў, каб прывезлі да яго развітацца любую дзяўчыну і пахавалі непадалёку ад крынічкі, пад дубам, там, дзе першы раз напаткаў яе.

Калі вершнік прывёз Юльку да крынічкі, Мсціслаў ужо развітаўся з гэтым светам, і людзі капалі яму магілу. Загаласіла-заплакала прыгажуня, але ці ж ажывіш мёртвага.

Пахавалі Мсціслава пад дрэвам, а той жа ноччу, на галіне, павесілася дзяўчына. Яе таксама закапалі побач з любым. Калі маці стагнала-трызніла над магілай, то праклінала святую крынічку, бо менавіта яна бачыла першую сустрэчу маладых, менавіта яна была сведкай іх кахання:

— Ой, каб жа плёскалася, не заціхала! Ой, каб жа ты сабе дарожкі роўнай не знала! Ой, каб жа ты назаўсёды плешчаніцай стала! Якое ж гора ты мне прынесла!

З таго часу новае паселішча, якое ўзвялі прыведзеныя Мсціславам людзі, назвалі Плешчаніцы.

## ГАЙНА

Кажуць з даўніх часоў, што нашу вёску так назвалі з-за прыгожых бярозавых гаёў. З усіх бакоў паселішча акружалі раўнюткія, высачэзныя дрэвы, якія, здавалася, гаманілі з самім небам, хмарам бегчы перашкаджалі. А які прытулак быў для птаства! Магло падацца, што тут раскінуўся райскі куточак — гэтак голасна і непаўторна спявалі боскія стварэнні. Вось у гэтых мясцінах, гавораць, некалі і пабудаваў нейкі падарожны сабе хаціну. З цягам часу да яго іншыя людзі сталі далучацца і ўтварылася старажытнае паселішча. А назва ўжо была загадзя падрыхтавана. Раз у гаі пасяліліся, то і назвалі Гайнай, каб галаву не ламаць ды чаго-небудзь мудрагелістага не выдумляць.

Але існуе і іншае паданне, мабыць, яшчэ больш старажытнае.

У гэтых мясцінах, у густых і непралазных лясах вадзілася мноства звяроў. А ад іх, вядома ж, не адна карысць. Даволі часта тыя лясныя звяры і на людзей накідваліся, падпільноўвалі іх, нібы злосныя ворагі, цярпліва ў засадах. Паўзлі чуткі, што то маладзіцу парвалі ваўкі, калі яна з поля вярталася, запрацаваўшыся крыху пазней звычайнага, то селяніна мядзведзь да смерці задушыў, калі той у лес па дровы паехаў... Але найбольш пакутавалі дзеці. Звяры, мабыць, разумелі, што з малымі ім спраўляцца значна прасцей, чым з дарослымі, таму і выбіралі іх у ахвяры часцей за ўсё. Аднойчы вось што здарылася.

Тут, дзе зараз вёска, стаяла ў тыя сівыя гады толькі некалькі хацін. Сем'і былі вялікія, але гэта характэрная рыса ўсіх амаль што без выключэння сялянскіх сем'яў таго часу. Жывёлу пасвілі не кожны сваю паасобку, а дамаўляліся і рабілі гэта па чарзе. Такім чынам некалькі дзён можна было спакойна займацца іншымі гаспадарчымі справамі, ведаючы, што жывёла твая дагледжана і яе ў час прыгоняць дамоў. Ад кожнай сям'і адпраўлялі пастуха. І, ведама ж, пільнавалі, каб, даруй Бог, чаго не здарылася.

У адной сям'і самым старэйшым з дзяцей быў хлопчык Міхалка. Вельмі хацелася бацькам, каб ён

дапамагаць хутчэй стаў, зрабіўся іхняй апорай, але хлопчык рос невялічкім і хваравітым. Слабенькі надта быў. Ягоныя аднагодкі бацькам сваім ужо да грудзей даставалі, а гэты, нібы яго чым прывязалі, так і не падымаўся вышэй. Гаспадар, здаралася, трывае, трывае, а потым і запытае:

— Ну што ж гэта з табой, сынку? Іншыя вунь ужо араць хутка самі будуць, а ты ў мяне толькі гусей пасвіць і здатны... Калі ўжо мне ад цябе падтрымка нейкая будзе? Эх, жыццё, жыццё, і чаму мне гэтак не шанцуе? Пнуся, пнуся, а ўсё на адным месцы таўчомся. І маці твая працавітая, і дзяцей у нас многа, але яшчэ маленькія ўсе, нібы той гарох у гарошыне, адзін аднаго не падніме, каб панесці. На цябе ўся мая надзея была, а тут...— і схіліць журботна галаву, вось-вось, здаецца, з адчаю слязу пусціць.

Убачыўшы такія справы, маці звычайна ўмешвалася:

— Чаго ўжо ты, чалавеча, гэтак убіваешся? Не ўсё так у нас дрэнна, як ты думаеш. Пачакай год-другі, нічога, што Міхалка маленькі расточкам, але ж ён ніколі не адмовіўся нешта зрабіць. Сам паглядзі: дзе мы — там і ён. Можа, у яго яшчэ сілкі нестае, можа, ён і рады зрабіць, ды не ўмее, а ты адразу так хлапчанё дакараеш. Навошта так рабіць? Паглядзі, ужо і астатнія дзеці падрастаюць. Пройдзе гадоў колькі, і мы з табою толькі паседжваць будзем ды камандаваць, куды катораму ісці, што рабіць... Навошта ж сына так крыўдзіш? Не трэба, мужу, гэтак казаць на яго болей. Ён ужо ўсё разумее і можа некалі пакрыўдзіцца. Каб потым чаго благога сабе не зрабіў.

Пачуе такія словы сам Міхалка, і лягчэй яму стане ад таго, што матуля заступаецца, а з другога боку, і цяжэй, бо ён жа ні ў чым не вінаваты. Пабяжыць тады хлопчык з хаты, зашыецца куды-небудзь і сядзіць там, слёзы глытаючы.

Доўга шукаюць яго потым родныя, бо на голас ён не адклікаецца. А калі знойдуць ды прывядуць у хату, бацька тады пачынае нібы перапрошваць сына:

— Чаго ж ты, дурненькі, гэтак пакрыўдзіўся? Гэта ж я не на цябе крычаў ці гаварыў нешта благое, а сам сабе жаліўся, набалела на душы. Хіба ж ты не разумееш мяне, сыночак?..

— Разумею, татка,— адказваў малы і заліваўся ўжо ўголас слязьмі.

Аднаго разу, калі гнаць каровак і авечак у поле выпала якраз Міхалкавым бацькам, ім трэба было яшчэ ехаць на далёкі луг па сена. Запраглі адразу трох конікаў у вазы, каб забраць увесь стог і позна ўвечары вярнуцца дамоў, і бацька кажа, звяртаючыся да Міхалкі:

— Ну, сыночак, заўтра з самае раніцы пагоніш кароў у поле. Глядзі ж, родненькі, сам ты яшчэ не пасвіў, а толькі з сястрычкай, так і весялей і смялей было. Яна хоць і меншая за цябе, але ж усё роўна дапамагала. Тут жа глядзі, братка, каб нічога благога не здарылася, бо як мы тады з людзьмі разлічвацца будзем, як ім у вочы глянем? Калі што якое адчуеш, то крычы, можа, хто пачуе і на дапамогу прыйдзе. Але гэта я сказаў на крайні выпадак. А так не перажывай, не хвалюйся, усё будзе добра. Вечарам каровак дамоў прыгоніш, а ў хуткім часе і мы з сенам на падворак прыедзем. Сястрычку тваю з сабою бяром, каб трэцім конікам кіравала. Глядзі ж, сынку, на цябе ўся мая надзея, ты ж у мяне за галоўнага памочніка заўсёды быў, і цяпер застаешся...

— Добра, татка, не хвалюйся. Я ўсё зраблю, як належыць. Жывёлу буду пільнаваць, нават не прысяду нідзе, не прыпынюся. Не перажывайце і вы з матуляй. Дома буду вас чакаць...

Так увечары пагаманілі бацька з сынам, а з самае раніцы паехалі гаспадары па сена, а Міхалка жывёлу пагнаў пасвіць.

Нічога бяды не прадвяшчала. Спакойна, ціха ўсё было, толькі птушкі ў небе заліваліся-шчабяталі, ды ветрык лагодна гойдаў верхавіны дрэваў, якія стаялі непадалёку суцэльнай сцяною. Хлопчык увесь час глядзеў за тым, як каровы ды авечкі спакойна скублі траву, і думаў, што хутка скончыцца гэты дзень і яму будуць дзякаваць дома родныя за тое, што ён гэтак іх выручыў у цяжкі момант.

Ужо сонейка за полудзень пераваліла, потым і на вечар паказваць стала. Міхалка радаваўся і павараціў жывёлу ў накірунку да дома. Статку трэба было прайсці праз невялічкую дуброву. Вось тут і здарылася бяда. Калі прагнаў пастушок жывёлу праз яе і пачаў глядзець, ці ўсе каровы ды авечкі на месцы, то спалохана ўбачыў, што самай буйной авечкі нестае. Кінуўся і туды, і сюды, а яшчэ ж баяўся, каб астатняя жывёла не разбрылася ў розныя бакі. Крычыць бедалага,

плача, але што ты зробіш, калі ніхто не чуе і прыйсці на дапамогу не можа. Уплакаўся так хлапчынка, што ўжо і крычаць моцы не было, толькі хліпаў носам ды слёзы брудным рукавом выціраў. Вырашыў, што жывёлу дамоў падгоніць, а сам вернецца авечку згубленую шукаць.

Так і зрабіў. Аббег усё кустоўе, усю дуброву, дзе яна згінула, гай — нідзе не было. Ажно чуе — зусім у іншым месцы нібы нешта падобнае на авечку азвалася. Ён туды — а крык ужо даносіцца з іншага месца. Каб жа ён ведаў, што гэта старая ваўчыха яго кружыла. Яны ж, ваўкі, умеюць і чалавечым, і голасам усялякай жывёлы крычаць, калі спатрэбіцца. Так і тут ліхая звярына зрабіла. А Міхалка з радасцю бег на крык і... нічога там не знаходзіў. Круціўся, круціўся і заблудзіўся канчаткова. А ўжо і цёмна на дварэ зрабілася. У лесе ж зусім, хоць вока выкалі, стала.

Сеў тады Міхалка на пянёк і заплакаў. Што яму болей рабіць заставалася? Дамоў ісці баяўся, бо паабяцаў жа бацькам, што за ўсім даглядзіць, ды і як выйсці — не ведаў. Незнаёмая мясціна трапілася. Заснуў небарака і нават не чуў, як да яго ваўчыца з падросшымі ваўчанятамі выбралася...

Толькі праз некалькі тыдняў, зусім выпадкова, нехта з хутаранцаў напароўся на тое месца. Там і вопраткі кавалкі валяліся, і торбачку парваную знайшлі. Непадалёку ад дома ўсё здарылася. Звяры так яго падвялі і разарвалі.

Бацькі надта па сыну ўбіваліся. Плакалі-галасілі, маці дык тая валасы на сабе рвала і ўсё паўтарала:

— Каб жа хто ведаў, што гэтая гайня за табою пільнавала... Каб жа хто да такога дадумацца мог, то ці паехалі б мы па тое сена, каб яно згарэла... Ой, гайня гэтая, што яна нам нарабіла...

Так і засталася назва Гайня, а потым ужо крыху перайначылася і стала — Гайна.

## КРАЙСК

На месцы сённяшняй вёскі Крайск некалі стаяў на беразе прыгожы і надта вялікі горад Райск, а раку звалі Крашчанкай. Чаму так называлі? Таму, што, калі прыйшла новая вера ў гэтыя мясціны, людзей

хрысцілі папы не крынічнай вадою, не калодзежнай, а заганялі сілай у рэчку і, калі адтуль выходзілі мокрыя тубыльцы, давалі ім новыя і пакуль яшчэ нязвыклыя імёны. Расказвалі, што цэлы тыдзень такое своеасаблівае хрышчэнне адбывалася. Некаторыя з сем'ямі ўцякалі ў новыя, яшчэ не заселеныя, мясціны і там жылі спакойна колькі дзесяткаў гадоў. Такіх непралазных і цяжкадаступных земляў было тады даволі многа. Народ сядзеў не гэтак густа, як сёння, на вярсту, а то і на сотню вёрстаў якая сям'я-другая. Тыдзень можна было ісці і жывой душы не напаткаць.

Што за жытка ў Райску была! І сёння нават можна пазайздросціць далёкім продкам, бо ў іх усяго ставала. Не трэба было надзвычай далёка хадзіць, каб мяса здабыць ці рыбы свежай прызапасіць, побач усё спажывалі. У рацэ рыбы ўсялякай вадзілася вялікае мноства, а ў лесе, адпаведна,— звяр'я. Таму і людзі жылі заможна. Займаліся рознымі рамёствамі, хлеб на зямлі вырошчвалі, палявалі ці рыбнай справай душу адводзілі. Дружныя былі, дапамагалі адзін аднаму, старэйшых паважалі, бо такая завядзёнка ў іх з даўніх стагоддзяў была. Вось за ўсё такое жыхары і гарадок свой Райскам празвалі. Сапраўды, жылі што ў тым раю!

Але ж не заўсёды ўсё гэтак гладка і прыдатна атрымліваецца, як хацелася б. Здарылася і ў іхняй мясціне ліха, ды такое, што і сказаць жудасна!

Тады ж войны ды бітвы ўсялякія значна часцей адбываліся, чым у нашыя гады. Вось зазлуецца які цар ці кароль на свайго суседа, ці падасца яму, што той яго неяк абразіў, і адразу, замест таго, каб неяк мірна дамовіцца, разысціся, ідзе на свайго зневажальніка вайною. Б'юцца войскі не дзень, не два, а месяцы, гады, а то, здаралася, і многія дзесяцігоддзі запар. Можаце сабе ўявіць, колькі людзей гінула ў такіх кровапралітных сутычках. Некаторыя мясціны на нашай зямлі пасля такой навалы на многія гады заставаліся незаселенымі, бо жыхароў ці павынішчылі, ці ў палон павялі, ці яны самі, ад ворагаў уцякаючы, у іншы свет пайшлі. Рэдка які з мужчын тады сваёй смерцю паміраў — ці на полі бітвы галаву сваю складваў, ці ад ран канаў.

На той раз на гэтую зямлю прыйшло шведскае войска. Шматлікае яно было, добра ўзброенае. Ішлі шведы на Расею, хацелі яе землі заваяваць ды сабе

нейкі прыбытак мець. Але не гэтак атрымалася, як яны ўсё задумалі, бо расейскі цар са сваім войскам чакаць на месцы не стаў, а насустрач выступіў. Вось дзе ўжо страшная калатнеча пачалася! Ваякам то што? Яны пастралялі, пакалолі штыкамі ці шаблямі памахалі і раз'ехаліся, каб забітых палічыць ды раны залізаць. А вось мужыкам даводзілася значна хужэй, бо на іх плечы і паборы ўсялякія валіліся, і пасевы дашчэнту вытоптвалі, і апошняе з гумнаў ды сусекаў забіралі. Галасілі жанчыны, пухлі дзеці, скрыпелі зубамі тыя з мужчын, якія яшчэ заставаліся ў паселішчах. Ды што ты зробіш супраць сілы? Яна ж цябе, нібы салому тую віхор, змалоціць, нічога ад цябе не пакіне, ні следу, ні знаку!

Сутычкі паміж ворагамі часта здараліся, а буйныя бітвы — значна радзей. Але ўжо калі разгаралася такая, то рэкі станавіліся крывавымі, берагі касцямі густа пакрываліся, кустоўе паламанае заставалася, дрэвы пасечаныя, усё наваколле, адным словам, стагнала, а найболей, зноў-такі, людзі. Уявіце сабе толькі, як можна выжыць у такіх умовах.

Вось і ля Райска тады сышліся два вялізныя войскі. Стаялі насупраць адзін аднаго, усё зручны момант выбіралі, не рашаўся хто-небудзь першым напасці. Ваяводы-цары ды каралі ў багата абстаўленых шатрах балявалі, а простыя воі пад адкрытым небам службу сваю неслі. Пасміхваліся начальнікі на добрым падпітку, што вораг не рашаецца пайсці наперад, выклікаць на двубой, памерацца сілай адзін на адзін. А на цвярозую галаву і ў думках такога не было. Каму ж ахвота галаву за проста так скласці?

Але неяк расейскі цар усё ж вырашыў напасці на злыдняў. Сабраў вечарам сваіх найвышэйшых ваявод, не даў піць віна-гарэлкі, а звярнуўся з прамовай:

— Час прыспеў, мае воі, на ворага ісці. Заўтра з раніцы, памаліўшыся ды адзін з адным развітаўшыся, і пачнём. Заклікаю вас быць мужнымі. Ды ці вам пра такое казаць?.. Ці ж гэта мы першы раз на вайну выбраліся?.. Таму, толькі паклічуць трубы вайсковыя, адразу кідайцеся са сваімі палкамі на чужынцаў. Бач ты на іх, зямлі ім нашай захацелася... Добра яшчэ, што паспелі тут пераняць, а то пад самой Масквой затрымліваць давялося б. З раніцы яны нас чакаць не будуць, а мы ўдарым, парушым іхні спакой. Ды і людзі стаміліся чакаць. Усё зразумелі?

— Зразумелі,— дружна адказалі ваяводы.

Цар, гледзячы на іх, падумаў: «Вось каб заўтра вы гэтак адчайна ў бой іргаліся, як зараз перада мною кідаецеся навыперадкі. Думаеце, не ведаю, што жадаеце, каб кожнага з вас заўважыў і ўзнагародзіў?.. Ведаю добра я вашу тактыку. Перасядзіце дзе-небудзь ззаду ці ў якім кустоўі... Войска пераможа — то першымі з навінай прыбяжыце, а калі паразу атрымае — то ўцячы паспееце. Эх, былі б у мяне сапраўдныя ваяводы, ці стаяў бы я тут гэтулькі часу, ці забіваў бы галаву думамі ўсялякімі?.. Але ж няма мне з чаго выбіраць, таму і гэтым радавацца даводзіцца...» Так толькі падумаў, а мовіў зусім адваротнае:

— Што ж, дзякую вам, мае верныя ваяводы, за баявы настрой! Спадзяюся, што і заўтра вы мяне ў крыўду не дасцё, не дапусціце, каб вораг нас адолеў! Пастаіце за айчыну галавой і целам!

— Пастаім, цар-бацюхна! — узвылі ашалелыя ад пахвалы военачальнікі.

— Тады кіруйце да палкоў і там парадак наводзьце. Ды толькі ж рабіце ўсё ціха і патаемна, каб вораг не пачуў, не пранюхаў, бо ягоныя віжы недзе непадалёку...

— Усё зробім належным чынам,— запэўнілі ваяводы, пакідаючы царскі шацёр.

Ноч для расейскага войска прайшла трывожна. Амаль ніхто не клаўся спаць, невядома ж было, ці заўтра застанешся жывым, ці грукнешся долу з рассечанай, нібы капусны качан, галавою. Старыя воі ляжалі з расплюшчанымі вачыма ды пра нешта ледзьве чутна гаварылі. Хто іх ведае, пра што. Можа, згадвалі даўнія бітвы, а можа, родных ці сяброў, якія ўжо даўным-даўно парылі косці ў зямельцы-маці пасля вось такіх жа баёў. Маладыя, асабліва тыя, хто першы раз збіраўся паказаць сваю сілу і моц ворагу, перашэптваліся таксама, але ў іх былі іншыя думкі: як бы вызначыцца, як бы сябе паказаць.

Сонейка нават і ўзысці не паспела, толькі-толькі золак акрэсліўся, як зараўлі баявыя трубы, закрычалі камандзіры ўсялякіх рангаў, і войска расейскае імкліва рушыла на шведаў. Правільна разлічыў цар. Тыя не чакалі нападу і спакойна сабе адпачывалі, як і ў ранейшыя дні. Пабеглі чужынцы ўцякаць, спрабавалі хавацца на першым часе, ды дзе ты прыткнешся, калі за плячыма адразу вырастаў бязлітасны вой

і жыццё чарговага чалавека на гэтым перарывалася.

Многіх перабілі расейцы, пакуль шведы наладзілі нейкую больш-менш стройную абарону. А калі гэта ім удалося, вось тут і пачалася сапраўдная крывавая бітва-сеча. Гэтулькі народу сабралася ў адно месца, што коні не маглі размінуцца і тапталі ваяроў, а расейцы і чужынцы, ухапіўшыся мёртвай хваткай, падалі на груды цел, у ручаіны крыві, і там гінулі.

Ужо полудзень прыспеў, а пераможца так і не выявіўся. Толькі бітва перамясцілася крыху ўбок ад таго месца, дзе пачалася. Расейскі цар са сваёй аховай кідаўся то ў адзін бок, то ў другі і імкнуўся падтрымаць людзей крыкамі ды парадамі. Тое ж самае рабіў і шведскі валадар. Ён таксама быў спрактыкаваным ваяром, не ўпершыню сустракаўся з ворагам. Расейскі цар стаў выглядваць военачальнікаў, якія павінны былі кіраваць боем, толькі іх нідзе не было бачна. Збылося тое, пра што ён думаў, калі з імі развітваўся: пахаваліся за спіны храбрыя на словах ваяводы. Узлаваўся не на жарт цар і закрычаў:

— Ахова! Прывядзіце да мяне хоць каго-небудзь з ваявод!

Тыя хуценька выканалі загад і прывалаклі не аднаго, а ажно пецярых. Не паспелі тыя і слова сказаць, як жыкнула шабля ў царскай руцэ, і галовы іхнія пакаціліся пад ногі.

— Гэта вам за тое, што мне хлусілі, што людзей сваіх кінулі!

Як убачылі іншыя, які лёс палахліўцаў ды здраднікаў чакае, то адчайна ў бой кінуліся. Разгарэлася сеча з новай сілай. Прыгожы некалі горад Райск, а цяпер ад яго засталіся толькі галавешкі, ажно сем разоў пераходзіў з рук у рукі. Людзей загінула столькі, што ад пралітай крыві пачала выходзіць з берагоў рака Крашчанка. Але перамогі ніхто так і не атрымаў у той раз. Разышліся войскі па сваіх землях, і на гэтым усё скончылася.

Быў знішчаны і горад Райск, засталася толькі адна, крайняя, вуліца. Адсюль нібы і пайшла назва самога мястэчка — Крайск.

А там, дзе пачыналася бітва, засталося ўрочышча Разанка, ад слова «рэзаць».

## УКРОПАВІЧЫ

Жыў тут адзін памешчык. Даўно гэта было. Можа, і памешчыкам яго нават нельга было назваць, бо меў усяго пару двароў ды з дзесятак сялян. Але ў памяці людзей ён застаўся зусім з іншай нагоды. Справа ў тым, што той пан валодаў здольнасцямі чорнага чараўніка. Нікому ў свеце не дараваў ні крыўды, ні абразы, ні нядобразычлівага позірку. Няхай толькі хто яго закране, то чары дабяруцца не толькі да самога крыўдзіцеля, але і да ягоных нашчадкаў. Пра тыя здольнасці многія распавядалі. Вось што мне чуць давялося ад маёй бабці.

Калі памёр мой дзядуля, а яе муж, то было гэта зімою. А маразы тады стаялі такія, што ажно трашчала ўсё на двары, птушкі ў палёце замярзалі. Дзяцей на вуліцу не выпускалі, каб яны не запруцянелі. Сядзелі па хатах ды Богу маліліся, каб усё жывое стыхія не панішчыла.

Яму пад магілу два дні высякалі. Спачатку вогнішча раскладвалі, на нейкую пядзю ў глыбіню прабіраліся, потым усё зноў паўтаралі. Натаміліся і суседзі, якія дапамагалі, і родныя. Бабця ужо і перажываць не надта перажывала, бо неяк крыху супакоілася, пакуль гэткія пакуты вытрывала.

Нарэшце дзядулю пахавалі. Яна лягла спаць зараней, каб адпачыць крыху. Заснула, здавалася, беспрабудным сном. Ды дзе там! Недзе пасля апоўначы (спявалі другія пеўні) пачулася ў хаце груканне і шорганне. Гаспадыня расплюшчыла вочы і пачала ўслухоўвацца. Усё паўтаралася з пэўнымі перапынкамі. Спалохалася жанчына, загаманіла сама з сабою:

— Хто гэта ў маёй хаціне тут лазіць? Каму спакою сярод ночы няма? Адгукніся, калі хто ўвайшоў?

У адказ — цішыня. Перажагнулася тады гаспадыня і падумала, што ёй ці то прымроілася, ці то прыснілася пасля такога вялікага гора. Павярнулася на бок, да сцяны, і паспрабавала заснуць. Толькі пачаў яе сон адольваць, як зноў выразна пачулася шорганне. Вось такое, як чалавек знямоглы ідзе і па падлозе ногі не перастаўляе, а валочыць. Потым грукнула за печчу моцна нешта — ці то палена, ці што іншае. Ускінулася жанчына:

— Хто ходзіць? Адзавіся. Ой, Божачкі, ды што ж гэта робіцца? Каб быў муж, дык зараз бы ён такое

ўчыніў, што гэтае невядомае стварэнне кулём вылецела б з хаты. А што я адна... Што трэба, калі ўжо хто баіцца азвацца? Бяры ў хаце любую рэч ды ўцякай...

Гаспадыня гамоніць, а тое, невядомае, і не палохаецца ўжо, а працягвае грукаць ды шоргаць, толькі водгулле па кутах разносіцца. Як да стала дабралася, то загрукацела пабітым посудам.

Бачыць бабця, што нічога не атрымліваецца, а рабіць жа нешта трэба. Устала, спадніцу нацягнула і стаіць на месцы, далей рухацца баіцца. Хто яго знае, чым можа гэткая спроба скончыцца. Тут у коміне як гопнула, то ажно пыл ды сажа па ўсім памяшканні паляцелі.

Вырашыла гаспадыня не рухацца з месца, а маліцца, стаўшы на коленцы. Так і зрабіла. Моліцца, а сама паміж малітвамі азірнецца ды зноў пачынае:

— Хто ж гэта тут у мяне лазіць? Каму ўжо я на гэтым свеце надакучыла? Здаецца, і людзям благога не раблю, а бачыш ты... Хто ж тут можа быць?..

Але ніхто не азваўся і зараз. Зноў зашаптала малітвы жанчына.

Праз некаторы час ёй у галаву прыйшла думка: «А што, калі паспрабаваць вырвацца і збегаць ды паклікаць на дапамогу суседзяў?» Стала на каленях да дзвярэй прабірацца. А ў хаце па-ранейшаму стаяў грукат. Ухапілася гаспадыня за клямку і бягом да суседскай хаціны. Залапатала ў акяніцу:

— Зміцерка, родны, дапамажы! Выручай! Хутчэй, бо болей ужо не магу!

— Што такое? Што здарылася? — пачулася неўзабаве.

— Сама добра не ведаю, але нешта не тое... Хутчэй пайшлі да маёй хаціны, бо не ведаю, чым усё можа скончыцца... Каб хоць дамоўку тое ліха не падпаліла... Ой, Зміцерка, хутчэй!..

— Ды ўжо ж, пабеглі,— прамовіў вясковец, хутаючыся ў вялізны кажух, неахвота яму было адразу на мароз вылазіць пасля цёплай ляжанкі.

Прышкандыбалі да бабулінай хаціны і стаіліся. Але нічога падазронага не пачулі — ні таго грукату, ні таго шоргання.

— Дык можа табе гэта прымроілася ці прыснілася? — паглядваючы на гаспадыню, прамовіў Зміцер.— Сама ж бачыш, усё ціха, нікога няма. Пайду я лепей спаць. Кладзіся і ты, няма чаго па марозу лазіць.

— Ой, Зміцерка, я ж адна і ў хату зайсці баюся, не тое што спаць легчы.

— Ды чаго ты, дурніца, сама ж чуеш, няма там нікога...

Толькі ён гэтак сказаў, як нешта даволі моцна грукнула ў хаце, і бабця ўхапіла суседа за рукаў:

— Вось, чуеш?.. Чуеш, як малоціць?.. Сам бачыш, што робіцца, а ты — не палохайся, падалося...

— Ага, зараз і я добра чуў,— пагадзіўся Зміцер.

— То пайшлі, паглядзім.

— А раптам там...

— Ты што, ужо спалохаўся сам?

— Ды не. Але ж яно неяк... Ноччу, у чужую хаціну... Каб яшчэ днём, то іншая справа.

— Дык ты ж не сам у чужую хату ідзеш, а з гаспадыняй. І не на грэх нейкі крадзешся, а выручаць бедную жанчыну прыбег. Так што з гэтага боку няма чаго баяцца. Пайшлі...

— Зараз пойдзем. Дай толькі я з духам збяруся, каб потым, у патрэбны момант, не разгубіцца.

— Толькі цішэй.

— Ага.

Нібы змоўшчыкі якія краліся ў хату гаспадыня з суседам. Ціхенька адчынілі дзверы і... скалыхнуліся ад жудаснага крыку:

— Ого-го! Я вам яшчэ пакажу! Я вам яшчэ прыгадаю! Будзеце памятаць мяне! Будзеце баяцца! Разбэсціліся, няма на вас управы! Будзеце ведаць!

Як стаялі сусед з жанчынай ля дзвярэй, так і прыкіпелі хвілін на колькі. Калі прыйшлі ў сябе, то гаспадыня развяла агеньчык на прыпеку, і тады яны ўбачылі на жэрдцы, якая вісела ад печы да сцяны, вялікую саву-начніцу.

— Вось хто цябе палохаў,— сказаў сусед.

— Ага,— не пагадзілася бабця,— яна і чалавечым голасам гарлала...

— Сапраўды,— выдыхнуў сусед.

Пад гэтыя словы сава гухнула і паляцела да дзвярэй. Людзі выйшлі за ёю следам, і тут гаспадыня здзівілася яшчэ болей:

— Глядзі, Зміцерка... Глядзі, бачыш?..

— Што?

— Сляды бачыш?

— Ага...

— Дык гэта ж не нашыя, бо мы з другога боку прыйшлі.

— Так...

— А чые ж?

Пытанне так і засталося без адказу. Калі пра здарэнне расказалі вяскоўцам, то яны амаль аднагалосна зазначылі:

— Ніхто іншы, акрамя пана, на гэта не здатны.

Потым, з цягам гадоў, той памешчык ці то з глузду з'ехаў, ці то нешта з галавою ў яго адбылося, але пачаў ён з вясны прымушаць сваіх сялян сеяць не жыта-пшаніцу, а ўкроп. Усе палі засяваў. Дзе толькі якую лапінку вольную знойдзе, то адразу ж і верашчыць:

— Насення сюды! Укропчыку! Засеяць, каб не пуставала!

Глядзелі на яго людзі і зразумець ніяк не маглі, навошта яму аднаму столькі ўкропу. Калі прадаваць, то не надта гэта бойкі тавар, бо ў кожнага ў агародзе расце, але там садзяць столькі, колькі неабходна для ўласных патрэб. Сказаць што пану сяляне не рашаліся, бо гэта магло ім бокам вылезці. Надта разбірацца гаспадар не любіў, пры першым жа выпадку загадваў улупіць бізуноў — і ўсё на гэтым.

Але аднаго разу ўсё ж выплыла прычына сапраўдная наверх.

Жыў непадалёку стары дзядулька, які таксама чарамі валодаў, але ён людзям дапамагаў. Калі да яго звярнуліся за парадай, то стары, не задумваючыся асабліва, адказаў:

— Гэта ж злыдзень канец свой пачуў і ўкроп разводзіць, каб у ім усялякую нячыстую сілу завесці. Не дапаможа яму гэта, не дапаможа...

І сапраўды, у хуткім часе сканаў памешчык. Закапалі яго за агароджай могілак, а ўвесь укроп павырвалі і спалілі. Толькі вось назва з таго часу ўсё роўна засталася — Укропавічы.

## ХАРОШАЯ

Адслужыўшы ў войску, вяртаўся адстаўны салдат у родныя мясціны. Ішоў куды вочы глядзелі, таму што на радзіме ў яго нікога не засталося — забраў мор бацькоў, родных і сваякоў. Такое даўней нярэдка

здаралася, калі людзі цэлымі вёскамі выміралі, заставаліся толькі напаўразбураныя ды напаўгнілыя хаціны, гумны, хлявы, і ў іх — шкілеты. Дзе смерць прыспела гаспадароў, там і пападалі, там іх і пааб'ядалі растлусцелыя мышы ды пацукі. Жах, Божачка, каб ніколі такога і нідзе не паўтаралася!

Ото, звярнуў той салдат са знаёмай яшчэ з дзяцінства дарогі і далей паціху кіруе. Паглядвае па баках, дзе б прыпыніцца, дзе б застацца век векаваць. Майстрам ён быў адмысловым, на ўсе рукі, як гавораць у народзе: мог боты любыя зладзіць, кажух за адзін дзень пашыць, а калі ля саней ці ля брычкі завіхаўся, то такія ўжо рабіў, што вачэй не адарвеш, не налюбуешся на іх. Стаіш, і здаецца, што сані тыя зараз самі па сабе з месца сарвуцца і паімчаць, нібы віхура, то з гары, то пад гару. Кавальскай справай таксама выдатна валодаў былы ваяка. Молат ды абцугі ў руках трымаў упэўнена. Гэтым і карміўся ў сваёй доўгай і, як яму ўжо часам самому падавалася, бясконцай дарозе. Усё так і далей было б, каб не адзін выпадак.

А адбылося вось што.

Нияк ужо пад самы вечар убачыў адстаўны салдат хутар непадалёку ад гасцінца, па якім з самае раніцы шпацыраваў. Прыпыніўся на хвіліну і думае: «Дай зайду і пераначую тут, бо невядома яшчэ, ці хутка якая наступная вёска або хутар мне патрапяць». Звярнуў з дарогі і пакіраваў да хаціны, што стаяла не ля кустоўя, а ля здаравенных і высачэзных дрэваў. Пастукаў у хату і пачуў запытанне:

— Хто там? Чаго стукаеш? Заходзь, будзь ласкавы.

Зайшоў салдат у хату. Бачыць — за сталом сядзіць самотна старэнькі дзядулька. Сядзіць, бедалага, ды на вогнішча, якое на прыпечку гарыць, пазірае. Распавёў салдат, хто ён такі, ды па якой нагодзе ў гэтай мясціне з'явіўся. Выслухаў дзядулька ўважліва, змахнуў чамусьці слязу з даўно няголенай шчакі і прамовіў:

— Не хадзі, сынок, далей, заставайся ў мяне тут. Не вечны я. Ужо ледзьве па зямлі клыпаю. Памру хутка, адчуваю ўжо. Кожную ноч жонка-нябожчыца ды дзеткі мае, заўчасна свет пакінуўшыя, сняцца. Да сябе, мабыць, клічуць... Таму глядзі, не ідзі далёка, не трэба табе там шчасця-долі шукаць. Памру я, то толькі пахавай па-людску, а ўвесь мой нажытак сабе забірай. Няма мне каму яго пакідаць. Няхай табе

застанецца. Адчуваю, што ты чалавек неблагі, такому не шкада нажытае адказаць. Паслухай мяне, сынок, не ідзі далей, не трэба. І мне будзе весялей на гэтай зямлі апошнія дні правесці. Добра?..

— Добра,— пагадзіўся салдат.

Пагаманілі яны яшчэ колькі хвілін, перакусілі, чым Бог пачаставаў, і спаць палеглі.

Дзядулька спаць, праўда, не мог, усё марыў пра нешта сваё, адвечнае, а салдат думаў, ці заставацца, ці, можа, ўсхапіўшыся, каб гаспадар не чуў, далей пайсці. Так да трэціх пеўняў і перакачаліся, а пасля іх у вёсцы раней ужо ніхто не спаў.

З тае раніцы застаўся ўсё ж на хутары, непадалёку ад гасцінца, салдат. Звалі яго Іван Харошы. Чутка пра тое, што чалавек ён трывалы ды майстравы, ды яшчэ на скрыпачцы іграць умее, хутка разнеслася па ўсіх навакольных хутарах і бліжэйшых вёсках. Цяпер завялося ў салдата шмат сяброў, якія яму ў многім дапамагалі, бо цяжка было аднаму, пасля стολькіх гадоў службы, гаспадарку ўздымаць. Гэта ж вам не жартачкі, калі ўсё запушчана і даўно не даглядалася. Хто б ні ішоў, ні ехаў па бойкаму тракту, абавязкова на хутар да яго заязджаў пагаманіць-паразважаць з чалавекам, які многае пабачыў, бо па свету беламу яго жыццё бязлітасна пакідала, дый скрыпачку паслухаць многім даспадобы было. Якая ж душа музыкі ды песняў не ўспрымае? Толькі тая, якая ўжо нічога зразумець не можа, якой багацце сонца засціць.

Праўда, з таго часу, як завялося ў Івана мноства сяброў, з'явіліся ў яго і ворагі. Надта не падабалася ўсялякім панам-памешчыкам ды падпанкам розным, што тут, непадалёку, стаў жыць разумны чалавек, які і параіць што мог вяскоўцам, і заклікаць разам сабрацца ў цяжкую хвіліну, каб усім, грамадою, небяспеку або навалу якую перажыць. Мала гэтага, часам падбіваў хлопцаў, каб не ішлі да якога вяльможнага гаспадара сена касіць, бо той плату нізкую прызначаў.

— За гэтыя капейкі, хлопцы, хай яму сабакі сена косяць, а мы да іх у памочнікі пойдзем! Пакруціцца пан — сам да нас прыбяжыць, калі сонца добра прысмаліць і часіна сенакосу пачне адыходзіць!

Рагочуць вяскоўцы, і, што самае дзіўнае, заўсёды так і атрымлівалася. Мінаў які тыдзень, і ляцеў войт

людзей клікаць, прапануючы ўжо другую плату. Але салдат стрымліваў сялян:

— Не спяшайцеся надта, не спяшайцеся. Няхай паскачуць, праз пару дзён мы ім будзем умовы дыктаваць...

Праз пару дзён ужо сам пан прыязджаў і слёзна да касцоў звяртаўся, каб выручылі, а за грашыма ды за іншым чым ён не пастаіць.

— Бачыце? А што я вам гаварыў? Цяпер з панам можна размаўляць і цану сваю выстаўляць. Усё будзе аплачана. Задарма спіну гнуць не давядзецца. А то раскрычаліся. Палохаюць, лаюцца, абражаюць. Не трэба забывацца і на тое, што мужыкі таксама людзі, і не абы-якога гарту...

Здаралася, што ў самы разгар сезонных работ Іван збіраў ладную арцель з гэткіх жа, як і сам, майстравітых вяскоўцаў і вёў іх то лес секчы ды плыты па рэках ганяць, а то па навакольных вёсках новыя хаты ставіць. Тады ўжо памешчыкам і ўвогуле спакойнага жыцця не было. Толькі што не так — сяляне цяпер ужо не маўчалі, не трывалі абразы:

— Не падабаецца, пане, то мы да Івана пойдзем. З ім працаваць станем. Там і адносіны, і плата зусім іншыя.

Вось і думай пасля такой заявы, што рабіць.

Іванаў гаспадар, дзядулька, сапраўды ў хуткім часе стаў цяжка хварэць і неўзабаве памёр. Пахаваў яго Іван Харошы з вялікай пашанай, як і абяцаў яму ў той першы вечар, калі яны сустрэліся. А сам ужо і пра жаніцьбу стаў думаць. Ведама ж, жыццё свайго патрабуе і нічога тут не папішаш, як ні спрабуй, як ні ўпірайся.

Дзяўчына, якую адстаўны салдат пакахаў, жыла з бацькамі тут жа, у вёсцы. Ведала яна пра пачуцці Івана, але не адважвалася сказаць сваё апошняе слова. Баялася не з нейкай там канкрэтнай прычыны, а з-за таго, што ўзрост-то ў яго ўжо быў паважаны. А салдат гэтак марыў, што ягоная каханка стане яму жонкай!

Дапамог адзін выпадак, дакладней кажучы, бяда. Неяк ноччу падкраліся панскія паслугачы да хаты Харошага і падпалілі яе з чатырох бакоў. Загарэўся стары і сухі будынак, нібы свечка. Адзінае, што паспеў гаспадар,— гэта сам выскачыць ды скрыпачку сваю вынесці пад пахай. Вылецеў праз акно, а на двары —

крыкі, свіст, улюлюканне. Гэтак радаваліся-пацяшаліся панскія найміты з чалавечага гора. Радыя былі, што і яго дасталі. Не толькі ж яму з паноў насміхацца, няхай і салдату прыпячэ!

Ды толькі Харошы не разгубіўся, не спалохаўся, бо не з тых людзей ён быў. Падчас службы не тое што страх, але і смерць не раз побач насілася, і нічога, выжыў, а тут — усяго толькі пажар! Агледзеўся гаспадар і бачыць: набегла з вёскі шмат людзей, спрабуюць патушыць пажар, хату выратаваць. Ускінуў Іван сваю скрыпачку і, асветлены полымем, зайграў. Хата гарыць-палае, а Іван стаіць сабе пасярод двара ды грае на скрыпачцы, ды так весела, быццам у каго на вяселлі.

— Грай, грай, прыблуда, паглядзім, пад якім дахам ты сёння начаваць будзеш,— чуе салдат за спінай зласлівы голас.

А другі яму на падмогу кінуўся:

— Лепш ідзі адсюль, выбірайся з нашых мясцін, пакуль жывы, бунтаўшчык акаянны!..

А Іван вухам не вядзе, як іграў на скрыпачцы, так і грае.

І тут раптам выйшла з натоўпу Іванава дзяўчына, падышла да яго, узяла за руку і, звяртаючыся да ўсіх, сказала:

— Нікуды Іван Харошы не пойдзе, а будзе жыць у нашай хаце, у жонкі сваёй... Нікуды не пойдзе, бо няма яму дзе галаву прыхіліць, а мне ён мужам будзе...

Так усё і сталася. Ажаніўся Іван са сваёй каханай. Добра яны зажылі, душа ў душу. Восем сыноў яна яму нарадзіла. Кожны з сыноў прозвішча бацькі атрымаў — Харошы. А калі сыны пажаніліся ды сталі жыць у сваіх хатах, новую вёску, што пайшла ад нашчадкаў Івана, людзі назвалі Харошая.

## ШВАБЫ

Наша вёска ўжо старая. Даўно яна тут узнікла. Не адно стагоддзе назад. Стаяла, можа, крыху ўбаку, не тут, дзе зараз, бо людзі паступова нібы пасоўваліся туды, дзе зручней сяліцца было. Нават могілкі сённяшнія, якія ў вёсцы ёсць,— не першыя, а трэція ад часу заснавання паселішча. Вось таму і мяркуйце, колькі прыкладна гадоў можа быць вёсцы. Усялякае пра яе

расказваюць. А што назвы тычыцца, то і мне самому даводзілася чуць легенды ды паданні, у якіх па-рознаму тлумачыцца і тое, хто першы жыць тут стаў, і тое, чаму гэтак назвалі. Колькі апавядальнікаў — столькі і варыянтаў. Ды яшчэ спрачаліся часам, хто праўдзівей кажа. Дзіўна нам было наглядаць і слухаць, як старыя, ссівелыя людзі нешта не надта нам зразумелае спрабавалі даказаць. Што запомнілася, тое і вам раскажу.

Тады яшчэ прыгон быў, калі ўсё гэта адбылося. У нашых мясцінах быў надзвычай багаты памешчык. Колькі ў яго тых лясоў ды лугоў, вёсак ды мястэчак было, ён, можа, і сам сказаць не мог. Надта багаты вяльможа быў. Бацькі ягоныя тут недзе і жылі непадалёку, трымаліся радзімы, не выязджалі, хіба што ў госці да каго з суседзяў ды на які сейм ці на вайну. Але паціху старыя парадкі пачалі мяняцца. Ужо памешчыкі не самі сачылі за зямлёю, не самі прымушалі людзей працаваць, а сталі даручаць рабіць гэта наймітам усялякім. Калі адзін пан быў — шкура трашчала, а калі іх двое ці трое над табою вісіць, то і жыць намнога цяжэй.

Дык вось той пан, які пасля смерці бацькоў у нас стаў валадарыць, вырашыў завесці новыя законы: даручыў эканомам справу весці, а сам сабраўся і паехаў жыць ажно ў Пецярбург. Цяпер кожны падпанак імкнуўся як мага хутчэй узбагаціцца, бо невядома, на колькі гадоў яго пан да сябе ўзяў. Прыедзе ненарокам ды скіне з пасады, і ўсё тады, прапала выгоднае месца, не будзе дзе болей ухапіць дармовых грошай.

З самага рання да змяркання трымалі сялян на полі. Мала гэтага. Калі памешчык чатыры дні на паншчыне прымушаў адпрацаваць, то новыя гаспадары загадвалі гнуцца не меней чым шэсць; калі гаспадар адзін раз у год загадваў збіраць з прыгонных аброк, то цяпер сталі прымушаць рабіць гэта два разы; раней дзецям нейкая ўступка была, а пасля ад'езду памешчыка яны сталі працаваць нароўні з дарослымі. Збяруць грошы з вяскоўцаў эканомы, палічаць і задаволеныя ходзяць. Яшчэ б! І пану хопіць, і сабе застанецца. За пару гадоў добры сундук можна назбіраць. А ў каго грошай дастаткова ёсць, той і панам заўсёды стане. Гэта ўсе ведалі.

Падпанкам добра, а што бедным сялянам казаць? Іх жа ніхто не пашкадуе, ім жа ніхто дармовага і на

капейку не падкіне. Усё трэба сваім крывавым мазалём здабываць. Мала гэтага, сям'я спакою не ведае, дзеці мруць ад стомы, жонка пастаянна хварэе, вось і пажыві тут. Якое свята надарыцца, то збяруцца ціхенька вяскоўцы ды хаваюцца, каб які падпанак не падгледзеў, што яны без працы сядзяць, бо тады хутка прычыну для зачэпкі знойдзе:

— Што гэта быдла сёння не працуе? Ці ўся праца пароблена на панскіх палетках? Толькі і робіць гэтае мужыччо, што сядзіць ды хлеб дармовы жарэ, а як пачнеш прымушаць лішні раз спіну сагнуць, дык крычаць пра здзекі нечуваныя... На працу, злыдні!

Так даводзілася бедным сялянам адпачываць. Песню ніхто, можа, дзесятак гадоў не чуў, толькі галашэнні па заўчасна пакінуўшых гэты свет родных ды блізкіх. Бацькі гэтага памешчыка былі зусім іншымі, яны і самі добра жылі, і сялянам жыць давалі.

Усё думалі-гадалі, як палепшыць сваё становішча вяскоўцы. Рознае гаварылі, але сышліся на адзінай думцы — трэба дачакацца, калі прыедзе памешчык з Пецярбурга, і паслаць да яго найбольш хітрых і кемлівых, каб яны давялі гаспадару пра ўсё праўдзіва. Ужо і такіх вяскоўцаў знайшлі, пачалі іх прыспешваць, каб думалі, пра што казаць пачнуць, калі перад грознымі панскімі вачыма паўстануць, бо нешта забудуць, а потым калі выправіш... Ці ж будзе памешчык сюдытуды ездзіць толькі дзеля вырашэння нейкіх дробязных для яго сялянскіх праблем.

Каб жа так, як падумалі, дык адразу і адбылося. Чакаць прыезду сапраўднага гаспадара давялося некалькі гадоў. Ужо і верыць тубыльцы перасталі, што ён можа заявіцца ў родныя мясціны. Палова з тых найбольш хітрых і кемлівых памерла, а астатнія ледзьве хадзілі. І тут, нібы снег на галаву:

— Пан прыехаў! Пан прыехаў! Сам пан прымчаў з Пецярбурга! Коні цугам у палац папёрлі!

Здавалася, што гэтай сустрэчы чакалі не толькі змарнелыя людзі, але і сама маці-прырода, якой таксама даставалася ад злыдняў-падпанкаў.

Неяк сабралі пасланцоў. Яшчэ з вечара заняліся гэтай справай, каб раніцай да палаца падацца, у панскія ногі кінуцца і пра ўсё чыста паведаміць.

— Глядзіце ж, толькі не забудзьцеся пра ўсё згадаць...

— Не палохайцеся надта, бацькі ж іхнія (маецца

на ўвазе памешчыкавы) былі людзі спагадлівыя, то і сын павінен па іх характары пайсці...

— Прасіцеся-маліцеся, на ласку панскую спасылайцеся, можа, нешта і памяняецца...

Прыкладна такімі словамі выпраўлялі пасланцоў да пана. Тыя, падбадзёраныя, смела пайшлі да палаца. Але чым бліжэй падыходзілі, тым цяжэй даваліся ім крокі. Не, не ад стомы, да яе сялянскія ногі звычныя, а ад хвалявання і страху. Хто ж ведае, што іх там чакае. Зайдуць зараз, а памешчык, замест таго, каб выслухаць, загадае бізунамі пачаставаць. Тады не толькі спіна балець-смылець будзе, але і аднавяскоўцы пазней смяяцца пачнуць, што вось, маўляў, да чаго дагаманіліся! Хіба ж мы вас на гэта пасылалі?!

Да агароджы яшчэ неяк дадыбалі, а далей ужо хоць ты іх страляй, ісці не могуць. Тут вяскоўцаў заўважыў вартаўнік, наблізіўся да сялян і, адчуўшы іхні спалох, запытаўся:

— А вам што тут трэба, мяшкі з торбамі?! Чаго прыпёрліся да панскага палаца?! Нешта згубілі тут ці што?!

— Згубілі, чалавеча, згубілі,— пачаў было самы бойкі і кемлівы з пасланцоў,— праўду згубілі... Да пана прыйшлі яе шукаць... Ці не прапусціш нас далей?..

— Ага, злітуйся над намі,— звярнуліся і іншыя да злога служкі.

— Зараз я вам як прапушчу, то скура ў вас на спінах патрэскаецца! — не доўга думаючы, зароў вартаўнік.— Прысунуліся сюды, ды яшчэ да пана Шваба іх прапускай! Вон, каб і вочы мае вас не бачылі!

— А чаго ты тут развярашчаўся? — неяк зусім спакойна звярнуўся да вартаўніка адзін з пасланцоў. Служка не чакаў такога павароту справы і адно толькі — рот разявіў у адказ.— Мы ж на тэрыторыю палаца не ўвайшлі, і за агароджу таксама! Так што стой на сваім месцы, а мы цябе і ведаць не ведаем! Патрэбны ты нам. Знайшоўся гаспадар,— дадаў ён ужо з'едліва,— сам, можа, толькі ўчора лапці на боты памяняў, а ўжо лаяцца будзе...

Адышлі пасланцы ад брамы і прыселі на траву пад дрэўцам. Сядзяць і мяркуюць, як далей быць. Колькі часу прайшло, і сказаць ніхто не мог. Неяк усталі і пасунуліся зноў да брамы.

— Ды тут зараз ніякай варты ўвогуле няма... Можна да самага ганка смела кіраваць,— паціху прашаптаў нехта з вяскоўцаў.

— То давай і пойдзем, а там ужо што будзе, бо назад вяртацца без нейкага адказу нам нельга...

Падаліся да ганка і сталі побач з ім, а што далей рабіць — не ведаюць. Нарэшце выйшаў нейкі багата апрануты чалавек, то яны да яго і кінуліся ў ногі:

— Дапамажы, пане Шваб! Выручай нас, бо прападзём усе праз якіх пару гадоў! Не будзе каму табе грошы і хлеб зарабляць! Выручай!

Галовамі ў пыл уторкнуліся, толькі азадкі, нібы капуры, да сонца выставілі. У адказ той пан як зарагоча, ды як стане на іх пальцамі паказваць:

— Авохці мне! Ой, Божачка! Ды які я пан Шваб. Я толькі яго пакаёвы! Пан яшчэ спіць. Як прачнецца, тады яго паклічу. А зараз тут чакайце.

Прамовіў так і назад пайшоў. Недзе ажно пасля полудня вылез памешчык на ганак. Свірэпа глянуў на схіленыя долу галовы і запытаўся:

— А гэтыя чаго тут топчуцца? Што ім тут трэба?!

Падскочыў да яго пакаёвы і гаворыць:

— Ды яны, ваша вялікасць, прыйшлі скардзіцца на благое жыццё... На эканомаў тваіх, якія тут за парадкам сочаць...

— Што?! Скардзіцца прыйшлі?! На эканомаў?! На маіх верных служак?! Ды як вы толькі да гэтага дадумаліся, дурныя галовы?! Гані іх адсюль, пакуль не загадаў бубну на спінах павыбіваць! Авечкі гэтыя!

Як плētанулі мужчыны з панскага падворка — толькі пыл слупом ззаду ўзняўся і курэў за імі. Прымчалі да вёскі і сядзяць, адзін на аднаго з сораму глянуць не могуць. А тут і аднавяскоўцы пачалі падыходзіць, каб распытаць, што ды да чаго там выйшла. Выслухалі людзі даволі звычайную для іх гісторыю і нізка апусцілі гаротныя галовы, толькі нехта з пасланцоў гігікнуў коратка і дадаў:

— І пра авечак нешта крычаў... Мабыць, забараняў у лесе пасвіць...

Ціха-ціха стала. Потым дзядулька стары, якога сюды пад рукі прывялі, мовіў:

— Эх, швабы, швабы...

І невядома да каго ён гэтак звяртаўся. Толькі назва за паселішчам такая дзіўная з таго моманту і засталася — Швабы.



# ЛЮБАНЬ

Ну, што тут можна сказаць? Раз Любань, то, значыцца, ад слова «любіць» пайшло паселішча. Іншае неяк і не надта складна атрымліваецца. Толькі не ўсе так гавораць. Ёсць і іншыя показкі, дзе тлумачаць, быццам бы па нейкай другой нагодзе назву далі. Мне і самому даводзілася чуць, праўда, зрэдку, бо ўсё ж пераважная большасць кажуць так, як і я. Але раз чалавек гаворыць, то ён жа неяк спрабуе аргументаваць легенду ці казку, проста так не будзеш жа сцвярджаць. Можа, і лепей, калі многа ўсялякіх варыянтаў існуе, гэта лішні раз падкрэслівае, якая багатая ў нас гісторыя, вусная творчасць, традыцыі. Цяпер запісвайце.

Якое толькі плягі няма на людзей! Праўду кажуць, што бяда на бядзе едзе і бядою паганяе. Не паспееш ад адной ачомацца, другая на плечы ўскочыць, тую зграбеш — яшчэ адна ўзлезе, і гэтак да бясконцасці, да самае магілкі сырой. Пастаіш — бяда нагоніць; кудынебудзь знянацку пабяжыш — на чарговую бяду наляціш. Таму і жывеш усё жыццё ў якойсьці ліхаманцы: куды ні сунься — усё роўна бядзе ў зубы трапіш, не

мінеш гэтага пачварнага стварэння. Даўней казалі, што бяда яна жывая, гэтаксама, як і чалавек, і выгляд адпаведны мае — худой, зморшчанай, непрывабнай на выгляд жанчыны.

Каб жа толькі на здароўе ці на жывёлу валіла ўсё, а то і з іншых бакоў прыцiскае. Есць бяда, як бяда — з-за недагляду людзей, з-за сквапнасці ды крыважэрнасці звяроў. Там зірнеш — бяда ад Бога: то нахапіўся мароз і памарозіў сады, агароды, а то й хлеб на полі ды траву на сенажацях; то град пабіў усё, што нейкім цудам ацалела ад марозу або сіверу; то нечаканая слота панішчыла ўсё збожжа з налітымі ўжо каласамі, яно да зямлі прыгнулася, і пакуль жаць — счарнела-пагніло; а то прыпякло сонца і зямля стала гарачая, нібы прысак, хоць ты ў ёй яйкі пячы. Вось як часта здаралася.

А то дасць нарэшце Бог добрае лецечка, цёплае, яснае, дык тут адкуль толькі возьмуцца ўсялякія пошасці ды паморкі на жывёлу або і на саміх людзей. Тады самае гора і настае. Ды гамоняць вяскоўцы, што гэта ўжо не ад Бога ідзе, а ад ліхіх людзей.

Ото і я вам распавяду, як такое гора-ліха адбывалася ў адным месцы. Ніхто бяды не чакаў, ніхто не ведаў, што яна прыйдзе на гэты раз, аж не мінула гаротных. Выдалася тады надзіва ранняя ды прыгожая вясна-чараўніца. Кожную ночку ішоў ціхі, ласкавы дожджык, які нібы абуджаў зямлю ад зімовага працяглага сну, а ўдзень свяціла яснае сонейка ды прыгравала, нібы матуля дыхала і абагравала ўласнае дзіцятка. А паветра было такое лагоднае, такое пяшчотнае, што, здавалася, пасадзі на полі малое дзіця, то яно само па сабе і вырасце, нібы гарбуз на агародзе. Усё навокал расло нібы на дражджах. Радаваліся людзі, перадавалі адзін аднаму толькі добрыя навіны, каб не спалохаць дабрабыт, не наклікаць якую пошасць ці яшчэ што дурное.

Нарэшце прыспела лета. Бог ўратаваў ад граду і навальніц, ад скрухі і буйных вятроў, і так зарадзіла, што звозіць ужо не было куды. Звычайна здараецца, што родзіць нешта адно: жыта там ці якая іншая збажына, а тут усё зарадзіла. Збіралі вяскоўцы ўраджай, але не смяяліся, не спявалі, а адзін на аднаго пазіралі трывожна. Так ужо прызвычаіліся да бед, што не маглі паверыць у такі шчаслівы выпадак. Пакуль усё прыбралі, пахавалі, то і чутка маланкай пранеслася па на-

ваколлі: хоць Бог даў у гэтым годзе незвычайны ўраджай, але ў хуткім часе надарыцца паморак і некаму будзе спажываць збожжа і гародніну. Задрыжэлі тады жыхары больш, чым падчас самага ліхога гора. Хадзілі засмучоныя, нібы ў халодную ваду ў мароз апушчаныя.

І нездарма гаварылі, нездарма баяліся вяскоўцы. Не паспела восень на парог ступіць, як з'явіліся ў паселішчы першыя хворыя. Праўда, спачатку не людзей хвароба нібы касою касіла, а жывёлу. От пагоніць пастух статак на пашу, а назад прыганяе на некалькі кароў меней. Пытаюцца людзі, што да чаго, а ён ім адказвае:

— Даражэнькія, я ні ў чым не вінаваты, хоць бы вы і хацелі мяне звінаваціць. Ляжаць вашы кароўкі на полі (ці на лузе) там, дзе сёння пасвіў, не ўстаюць на ногі, а толькі мукаюць жалобна... Не паспеў нават да вёскі дабегчы, бо пад самы вечар гэта здарылася.

Пабягуць сяляне туды, куды пастух скажа, а жывёла ўжо сканае да гэтага часу. Ляжыць, нібы жывая, не ўздутая, не пакусаная, але бездыханная. Заплачуць жанкі, спахмурнеюць мужчыны, ды позна ўжо галасіць. Так за нейкіх пару тыдняў усю жывёлу і выкасіла. Засталося на вёску пару кароў ды адзін бычок-пярэзімак, які весела выбрыкваў на лузе, нібы быў замоўлены ад усялякіх пошасцей і паморку.

Калі захварэлі першыя вяскоўцы, то сяляне сабраліся параіцца. Розныя гучалі прапановы, кожны імкнуўся неяк дапамагчы не толькі сабе, але і астатнім, таму крычалі і спрачаліся, нібы на шматлюдным кірмашы. Ужо вечар пачаў садзіцца на кустоўе, туманы паплылі, а ніхто слушнай прапановы, з якой бы ўсе пагадзіліся, так і не ўнёс. Прыціхлі сяляне, бо кожны разумеў, што, калі сёння не знайсці выйсця, заўтра можа быць позна. Недзе пад самы канец пачуўся ціхмяны старэчы голас:

— Я, людцы, ведаю, што трэба рабіць. Я добра ведаю... Паслухайце ўважліва.

Слухалі моўчкі, не перабівалі, разумелі цану гэтай падказкі. А стары расказваў не абы-што, а тое, як некалі, даўным-даўно, калі ён сам быў маленькі, ягоныя бацькі і аднавяскоўцы ратаваліся ад пошасці.

З самае раніцы закіпела ў вёсцы праца. Бо нездарма ў народзе кажуць, што беражонага і Бог беражэ. Дык вось, пайшлі ўсе мужчыны і дзецюкі ў лес, звалілі

там высачэзную і таўшчэразную сасну, а з яе ствала зрабілі гладкаабчасаны крыж, можа, сажняў на дзесяць у вышыню. Ледзьве на плячах прынеслі да паселішча. Перадыхнулі крыху і пачалі стаўляць новы крыж на высокім узгорку, каб ён быў бліжэй да нябеснага Бога, каб Усявышні бачыў іхнія памкненні і пачуў малітвы. Здалёку стала відаць крыж, хто ні ішоў, то яшчэ, можа, за дзве вярсты жагнацца пачынаў.

Дзядулька таксама з мужчынамі быў, камандаваў, паказваў, як лепей рабіць і каб усё правільна было, каб не схібілі дзе. Калі крыж паставілі, то ля яго паднгожжа паклалі брусок засушанага ясеню, а другім напераменку пачалі яго церці. Доўга справа цягнулася, не адзін з сялян адыходзіў, саступаючы месца, нарэшце прыклалі губку, і тая патлела-патлела дый загарэлася зыркім полымем. Калі добра разгарэлася, то вяскоўцы ўзялі ад таго агню запаленыя трэсачкі і ва ўсе хаціны пазаносілі, каб ён там не пераводзіўся. А на ўездзе і выездзе з паселішча пачалі дзень і ноч паліць вялікія вогнішчы, каб пошасці ды паморку не было ўваходу ў вёску. Вогнішчы тыя палілі толькі з дуба і ядловец яшчэ падкідвалі, іншай драўніны не падмешвалі, баяліся апаганіць свяшчэнны ачышчальны агонь.

Тых двух каровак і бычка сяляне загналі далёка ад сяла, на астраўкі пасярод балота, зрабілі для іх часовую будыніну і пасвілі да самае глыбокае восені. Тры жывёліны даглядалі чалавек дзесяць мужчын, бо баяліся, каб выпадкам якія воўк ці мядзведзь не накінуліся і апошніх не перадушылі, тады б увогуле невядома было як існаваць. Болей таго, з раніцы і пад самы вечар абкурвалі жывёлін, чым бы вы думалі? Ніколі не адгадаеце — тхарынаю. Спецыяльна для такой справы давілі тхароў, забівалі, чакалі, пакуль яны пачыналі смярдзець, і толькі потым ужо кідалі ў вогнішча. Каб болей едкага дыму ішло, клалі на вуглі рэшткі тхара. Смурод навокал стаяў такі, што здавалася, насы паразрывае. Тут ніякая хвароба не падлезе, бо дым засцерагае надзейна. Вось ужо і апошні месяц восені надышоў, а адусюль навіны благія да вяскоўцаў даходзілі: па-ранейшаму лютаваў мор. Ужо гаварылі, што ў некаторых населеных пунктах жывых амаль не засталося, мерцвякоў не было каму ў зямлю закопваць.

Зноў сабраліся сяляне, каб параіцца, як жа далей справу агульную весці. Зноў доўга гаманілі, але ўжо і

ведалі, да каго за дапамогаю звяртацца. Прыціхлі, і нехта прамовіў:

— Дзедку, як нам быць, паведай, што рабіць. Пакуль усё, што ты нам параіў, мы зрабілі і таму страт не панеслі. Калі і далей так пойдзе, то на руках цябе насіць да самай смерці будзем!

Па натоўпе пралёгся водгалас адабрэння.

Стары нават слязіну з твару змахнуў і пачаў сваю прамову:

— Людцы добрыя, ды за што ж мяне на руках насіць? Пакуль сілы Бог дае, то і сам хаджу, а калі яе не стане, то паміраць трэба, не сядзець на плячах у іншых. Я вам не з-за нейкай уласнай выгоды дапамагаю, бачу, што цяжка супраць паморка змагацца, калі вернага сродка не ведаеш. Недзе памылішся — і лічы прапала. Колькі ўжо такіх выпадкаў было за маё доўгае жыццё. Але я спадзяюся на лепшае. Здаецца мне, што, калі будзем асцярожнымі, ніякі чорт нам не страшны, як бы ён ні імкнуўся прабрацца, як бы ні лашчыўся і ў каго б ні пераўвасабляўся. Трэба быць пільнымі. Раз бяда не прайшла прама, яна будзе шукаць патаемныя шляхі, каб усё роўна прабрацца ў паселішча. Глядзіце, нічога каб міма вашых вачэй не прайшло і не прабегла, інакш — справа дрэнь можа атрымацца. Вось такое хацелася мне параіць. Лічу, што самае цяжкае мы ўжо перанеслі, засталося лягчэйшае, але памыляцца нельга...

Сказаў так старэча і злез з калоды, на якую ўзбіраліся ўсе, у каго было што сказаць.

Яшчэ хвілін колькі людзі не разыходзіліся, дзяліліся ўражаннямі адносна пачутага. Потым прызначылі вартавых і ахоўнікаў на ноч, прыкінулі, дзе трэба найбольшую пільнасць праяўляць, і толькі тады пацягнуліся па хатах.

Як казаў стары дзядулька, так і атрымалася. Паморак не прымусіў доўга чакаць сустрэчы з сабою. Ужо на наступны дзень, дзесьці пад полудзень, калі сонца прыгрэла і здавалася, што на дварэ нібыта не восень, а вясна, ішоў адзін селянін у вёску. Ажно бачыць, наперадзе яго, па лясной сцяжынцы кульгае старая бабулька. Прыспешыў ён крок і нагнаў жанчыну, глянуў пільна раз-другі, нічога спачатку не сказаў. Так прайшлі некаторую адлегласць, а потым селянін нібы абыякава пытаецца:

— Куды гэта ты, баба, ідзеш?

— Ды вось, голубе, ратуюся і іду ў тую вёску, дзе паморку не было і няма...

Прагаварыла, а сама як глянула на вяскоўца, то ў таго ў сярэдзіне ўсё ўскалыхнулася, гэтакі страшны погляд у яе быў. Здагадаўся тут чалавек, што гэта паморак, пераўвасоблены ў старую, але прамаўчаў. Хоць і страх яго апанаваў, але трываў, ідучы поруч. Болей таго, каб не выдаць сябе, прапанаваў:

— Хадзем, баба, разам, калі цяжка дзе будзе, я табе дапамагу, ды і весялей удваіх...

— Вось дзякуй табе, добры чалавек, вось дзякуй,— замітусілася жанчына.

Ідуць так крок за крокам, нават размаўляюць пра нешта, а мужчына (не дурань) усё па баках непрыкметна паглядае і кіруе туды, куды зараней прыдумаў. З гадзіну прайшлі і падышлі да гразкага балота. Такая ўжо твань-дрыгва там была, што нячысцікі і тыя баяліся па ёй гуляць, бо правальваліся з рагамі. Цераз балота трэба было ісці па залітых вадою кладках і бярвеннях, а яны ж слізкія, пакручваюцца пад нагамі.

Тады вясковец і гаворыць:

— Ідзі ты, баба, уперад ды моцна трымайся за мой кій, а я цябе такім чынам падтрымліваць буду...

— Дзякуй табе, голубе, дзякуй, што не забываеш пра мяне, старую,— ашчэрылася тая.

Сунецца баба па бярвеннях ды з усяе сілы за кій трымаецца. Але калі ўсцягнуліся яны да самае багны, селянін як хісне бярвенні ды як папіхне кіем бабу ў «чортава акно» — толькі пыркі ўбакі паляцелі, а тая і ўскрыкнуць не паспела, як рот тванню забіла і захлынулася. Пастаяў чалавек, паглядзеў, як зверху кругі разыходзяцца, і пакіраваў да вёскі. Выйшаў на добрую дарогу і пабег. Прыляцеў, нібы на крылах, ды давай усім распавядаць пра дзіўнае здарэнне. Пытаецца, ці правільна зрабіў, а можа, гэта сапраўдны чалавек быў, а не пераўвасоблены паморак? Але стары дзядулька, які ім раіў, што рабіць, супакоіў яго:

— Не палохайся, чалавеча, не перажывай. Усё правільна зроблена. Малайчына, што ўтапіў у багне гэты паморак, а гэта іменна ён быў, можаш не сумнявацца... Астатнія таксама гэткія ж пільныя і ўважлівыя будзьце, то ён разоў колькі паспрабуе прабрацца, напорацца на нашу пільнасць і назад паверне...

Ды каб жа так было, як хочацца. Абавязкова ж

нехта знойдзецца, хто парушыць ці пераблытае запаветнае, зробіць, можа, і не спецыяльна, назло не толькі сабе, але і іншым. Так і тут атрымалася.

Дзён праз колькі пасля таго, як вясковец паморак у балоце ўтапіў, паехаў іншы селянін на балота па сена. Ведама ж, як гэта восенню, калі ўжо снег выпаў, робіцца: сеў у сані ды паганяе коніка, якіх таксама толькі некалькі ацалела і іх надта аберагалі. Заехаў на груд, развярштыў стог і давай таропка класці сена на сані. Толькі самы ніз вытаптаў, ажно нехта высунуўся з кустоўя і паклікаў яго. Аглянуўся — нікога няма. Падумаў — падалося, і зноў за працу ўзяўся. Але крык стаў выразней, да вушэй данеслася:

— Чалавечку... Чалавечку...

Азірнуўся і бачыць: вылазіць з таго самага кустоўя нейкі страшны дзядулька з доўгаю, па калені, касматаю барадою, з адным вокам і падыходзіць да саней. Ледзьве ідзе, на кіёчак абапіраецца. Глядзіць селянін, а ў самога зуб на зуб з перапуду не пападае, бо ніколі не бачыў такога страшнага дзядулькі. І падумалася яму, а ці не паморак гэта. Тым часам палупаў дзед адным вокам ды і просіць падвезці яго да вёскі. Падумаў, падумаў мужык і адказвае:

— Давезці-то я давязу, толькі, мабыць, нашыя людзі не пусцяць цябе туды, бо вартуюць, каб у вёску з кім-небудзь не прасклізнуў паморак ці пошасць якая...

— Ды ты за гэта, чалавеча, не надта перажывай, гэта ўжо мае хваляванні. А палохацца і баяцца мяне няма чаго. Сам бачыш, я калека і ніякай крыўды сумленным людзям ніколі не чыніў і чыніць не збіраюся. Акрамя шчасця не нясу нічога, як перад абразамі табе кажу. Гэта такое шчасце, што раней і не чулі нават.

— Цікава, якое ж ты такое шчасце нясеш, што нікому яно не сустракалася,— нібыта і сапраўды зацікавіўся мужык.

— А такое шчасце, якое будуць мець і самыя багатыя сяляне, і самыя здаровыя, і самыя слаўныя людзі, і самыя бедныя гаспадары. Яно для ўсіх будзе роўным — і для надзвычай багатых, і для жабракоў...

Як прамовіў ён апошнія словы, то чалавек зразумеў, што стары нясе з сабою не што іншае, як саму... смерць. Бо, вядома ж, менавіта яна ўсіх забірае, усім дае роўнае шчасце — і каралям, і мужыкам, і князям, і

ўбогім. Здагадаўся, але па-ранейшаму ласкава гаворыць:

— Ну, калі так, то лезь, дзеду, на сані, а я прыкідаю цябе зверху сенам, можа, такім манерам і праедзем міма пільнай аховы.

Узабраўся стары на сена, а чалавек старанна закрыў яго зверху, прыціснуў моцна рублём і павёз у сваю вёску. Падвёз да выгана, дзе стаяла варта і гарэла вялікае вогнішча, і шапнуў дзецюкам, што вязе паморак у санях. Тыя пайшлі на хітрасць, пытаюцца:

— Дзядзька, а што ты вязеш?

— Дровы.

— Якія дровы? Гэта ж сена.

— А што пытаеце, калі ведаеце?

— А ў сене што?

— Што? Мо нейкія там шышкі ці сучкі...

— Дык ты яшчэ над намі смяяцца будзеш? Хлопцы, бярыцеся за сані знізу.

Падхапілі дзецюкі сані дый нахілілі, а сена, адпаведна, звалілася ў вогнішча. Полымя як шуганула, то вышэй за дрэвы паднялося. А хлопцы не стаяць спакойна, яшчэ пераварочваюць тое, што блага гарыць, дроў сухіх падкідваюць. Круціўся, круціўся паморак ды не здолеў вырвацца, так і згарэў разам з сенам. Не ўдалося яму і на гэты раз кемлівых людзей перахітрыць. Згарэў дашчэнту, нават і дробненькіх костачак не засталося.

Зноў сабраліся пасля гэтага выпадку сяляне, каб перамовіцца-параіцца. Тады стары дзядулька, які ўсё падказваў, першым слова ўзяў і гаворыць:

— Ну, людцы мае добрыя, я думаю, што паморак і пошасці болей да нас не палезуць. Адвучылі мы іх. У наваколлі гэтай нечысці болей не застанецца. Паўцякае, бо ўбачыла, што нас не пераможа. Але трэба нам усё роўна новае паселішча крыху ўбаку ад сённяшняга пабудаваць. Так, на ўсялякі выпадак. Сюды паморак ды пошасці дарогу ведалі, а туды яны яе не знойдуць. Вясною і пачнем будавацца. Вось толькі месца добрае знайсці трэба, каб усё пад бокам было.

Як вырашылі, так і зрабілі вяскоўцы. Месца такое знайшлі, што як свайго дарадчыка прывезлі напрадвесні, то ён, гледзячы на наваколле, толькі і вымаўляў:

— Які ж тут куточак мілы, які ж ён любы...

Адтуль і пайшла назва новага паселішча, якая ўсім спадабалася. Так і наша Любань стала.

# УРЭЧЧА

Некалі быў бязлітасны звычай, паводле якога людзі, якім спаўнялася семдзесят гадоў, на далейшае жыццё-існаванне права не мелі. Паплачуць родныя і блізкія зараней, паядуць урачыстай грамадой за сталом і вядуць дзядулю ці бабулю, матулю ці бацьку да вялізнай ямы, а там ужо ўсё падрыхтавана. Пацалуюцца ў апошні раз са старым і даўбешкай яму па галаве як дадуць, той на месцы і скапыцее. Закапаюць, перажагнаюцца і пойдуць далей працаваць ці нечым яшчэ займацца. Ніхто потым ужо не згадваў пра памерлых, бо так завялося з сівых стагоддзяў, так усё і выконвалася. Пазней і малітвы чыталі над магіламі, і паніхіды адпраўлялі, але ніхто нічога не перайначваў, баяліся кары якойсці. Ды ўсё ж і гэты парадак змянілі. Вось як гэта адбылося.

Жыў-быў бацька гаспадар, і ў яго было трое дзяцей. Усе сыны. Працавітая сям'я. Не такая шматлікая, як іншыя, але за кошт працавітасці пастаянна прымнажалі свой дабрабыт і багацце. Усяго ў іх ставала, нічога пазычаць не хадзілі, на дапамогу людзей не клікалі, колькі б там ні садзілі ці ні сеялі. Як возьмуцца варочаць, то што мядзведзі тыя. Адпачыць ці перакусіць і то без ахвоты садзіліся, шкада было час дарма траціць. Паглядзяць на неба, заўважаць там хмару ці аблачынку і скажуць адзін аднаму:

— Вось калі гэтая хмара сюды насунецца, то тады і палуднаваць будзем, а не, то і пачакаем, вытрымаем да вечара, тады ўжо дома і папалуднуем, і павячэраем. Смачней будзе, затое працы колькі агораем...

Надта добра жыў бацька са сваімі сынамі. Зайздросцілі іншыя. Бо не сакрэт, што ў сям'і ўсялякае здараецца. Былі і такія, дзе лаянкі ды бойкі толькі ноччу на невялікі час заціхалі. Для такіх людзей няма ні божых святаў, ні будзённых заняткаў, ім на ўсё напляваць, толькі б пасварыцца ды чубы адзін аднаму выдраць. А ў гэтай сям'і ніхто ніколі крыкаў, лаянак не чуў, ніхто не бачыў, каб яны паміж сабою біліся ці нейкім падобным чынам разбіраліся. Але надышоў чорны час і для братоў. Справа ў тым, што бацьку праз нейкі месяц павінна было споўніцца семдзесят гадоў і яго трэба было весці да тае жахлівае ямíны. Адчуваў і стары, як глядзяць на яго сыны ў сувязі з гэтым, і шкадаваў іх. Разумеў добра, як гэта ўласнага

бацьку па галаве бухнуць ды ў магілу заўчасна скінуць. Таму імкнуўся неяк падтрымаць дзяцей, паказаць, што сам не надта перажывае:

— Чаго, хлопцы, прыцішыліся? Што сумуеце? Такое надвор'е стаіць, яснае ды цёплае! Вось скончым снапы звозіць, да вечара яшчэ гадзін колькі будзе, то паспеем выскачыць на рэчку з прыладамі ды рыбкі палавім! Юшку зварым, пасядзім на падвор'і, пагамонім. Што лепей можна прыдумаць? Га, хлопцы? Весялей на свет глядзіце, не ўсё гэтак дрэнна, як вы думаеце...

Пасля згадак пра рыбалку вочы ў сыноў і сапраўды загараліся, бо надта ж яны любілі ў вадзе боўтацца, за рыбкай цікаваць. Тут яны таксама майстры неперайзыйдзеныя былі. На хвіліну-другую забываліся пра ўсё і супакойваліся душою.

Наловяць рыбкі, зварáць юшку на падвор'і ды сядзяць ля вогнішча, сёрбаюць і перамаўляюцца. Бацька, ведама ж, сама болей гамоніць. Ён і пражыў намнога болей, і бачыў усялякае на сваім вяку. Але, калі, забываючыся, бацька пачынаў згадваць продкаў, пахмурнелі твары дзяцей, яны вярталіся да будзённага, да тых праблем, якія іх турбавалі ў дадзены момант. З кожным днём усё меней і меней часу заставалася старому пабыць сярод людзей на зямлі, трэба было і яму збірацца. Вось нарэшце надышоў і апошні вечар, з раніцы трэба было ім кіравацць да вялікай ямы. Памыўся бацька, у чыстую бялізну пераапрануўся і паклікаў да сябе сыноў. Увайшлі тыя і з парога яшчэ заплакалі, бо не маглі слёзы стрымаць. Стары хацеў паказаць, што ён трымаецца і лічыць, што ўсё так і павінна адбывацца, але і ў самога слёзы вочы засцілі, гаварыць не давалі. Так колькі часу доўжылася: сыны стаялі і плакалі, а гаспадар хаты за сталом сядзеў і таксама слязьмі заліваўся. Потым усё ж неяк селі, і бацька пачаў сваю апошнюю прамову:

— Ну, хлопчыкі, куды я пайду раніцай, вы і самі добра ведаеце, і не будзем лепей пра гэта лішні раз згадваць, каб не хваляваіцца. Давайце спакойна пагамонім. Калі мяне пахаваеце, то не спрачайцеся паміж сабою, не лайцеся, каб іншыя з вас смяяліся. Хай зайздросцяць па-ранейшаму, як і да гэтага было. Зямлю не дзяліце на надзелы, бо тады абавязкова паспрачаецеся. Гаспадарку вядзіце разам. Сейце, жніце ў час, не спяшайцеся асабліва. Зямлі ў нас многа, то і калі пажэніцеся ды ўласныя сем'і заведзяце,

усё роўна хопіць. Толькі не лянуйцеся, працуйце шчыра. Давайце развітаемся, ды ідзіце сабе спаць, а я пасяджу, падумаю, родных братоў прыгадаю, бацькоў, маці вашу нябожчыцу. Усё гэта засталося за плячыма, а на тым свеце невядома яшчэ, ці будзе такая магчымасць...

Абняліся сыны з бацькам і пайшлі ў гумно спаць. Ідуць, слёзы выціраюць. Прыйшлі, паляглі, а сон не ідзе. Старэйшы з братоў і гаворыць:

— Ведаеце, што, браткі, вы як сабе хочаце, а я нашага бацьку не вёў бы да ямы. Нельга так. Ён жа нас з матуляй гадаваў, на руках насіў, працаваць навучыў... І за ўсё гэта старому чалавеку доўбняй у лоб, нібы якой жывёліне?.. Няўжо ён не заслужыў сабе іншай долі, іншай старасці, каб так з ім абыходзіліся?..

— А што ж рабіць? — азваўся другі з братоў,— каб жа неяк можна было абысці гэты парадак. Усе ж так робяць...

— Ага, усе так робяць,— з'едліва прамовіў малодшы,— то і мы роднага татулю да ямкі падвядзём ды ў лоб даўбешкай? Дакажам, што мы не горшыя за іншых?..

— То можа...— пачаў, але так і не скончыў старэйшы, прыўзняўшы галаву,— то можа...

— А нічога не будзе? — перапытаў сярэдні.

— Нічога, нічога,— таропка перабіў яго самы малодшы,— толькі тату выратуем, жывы ён застанецца. Хай лепей уласнай смерцю памрэ, чым мы яму ў гэтым дапамагаць будзем. Давайце памяркуем, дзе можна схаваць ад людскіх вачэй бацьку, каб яго ніхто не высачыў.

Доўга перашэптваліся браты, спрачаліся, даказвалі адзін аднаму, але не маглі знайсці пакуль што прыдатнай мясціны. Дома пакінуць, бясспрэчна, нельга было, бо тут пастаянна круціцца многа вяскоўцаў і пра нешта могуць даведацца. На хутары, дзе сваякі жывуць, таксама нельга, бо і гаспадары могуць пераказаць, і чужыя заглянуць. Стомленыя ад бесперапыннай размовы, адкінуліся на сена. Малодшы ціха прамовіў:

— Ну і стаміўся, як з Урэчча сена возячы...

— Як, як ты сказаў? — кінуўся да яго старэйшы.— З Урэчча?

— Так,— не зразумеў той.

— То давайце бацьку там і схаваем. Гэта ж далё-

ка ад вёскі, людзі там рэдка ходзяць. Буданчык зробім, харчы падносіць будзем, і няхай сабе чалавек жыве спакойна...

— А калі маразы ўдараць? — не ўтрываўся сярэдні.

— Дык мы да восені яшчэ добрую зямлянку агораем. Цёплую, вялікую.

Пагадзіліся з такой прапановай браты, паджгалі ў хаціну, нягледзячы на тое, што ўжо густая цемра на дварэ панавала. Распавялі ўсё гаспадару, амаль сілаю апранулі і павялі да Урэчча. Ісці туды трэба было добрых паўдня. Пакуль прыйшлі, пакуль буданчык зрабілі ды назад вярнуліся, то ўжо новы світанак над лесам займаўся. Дамовіліся праз тры дні па чарзе насіць бацьку есці. Старанна сляды заблытвалі, каб ніхто ненарокам не заўважыў, сцерагліся. Задаволенымі і сыны засталіся, і бацька вясёлы хадзіў па Урэччы, нейкімі сваімі справамі там займаўся. Так гадоў, можа, з дзесятак доўжылася.

Ужо сыны сваімі сем'ямі абзавяліся, дзеці нарадзіліся. Але жылі, як бацька прасіў: працавалі разам, дапамагалі іншым, каб на ўсялякі выпадак і сабе дапамогу на будучае зарабіць. Ды здарылася бяда. Такое ліха прыйшло ў тую вёску, дзе яны жылі, што ў хаце лепей пра гэта і не згадваць,— неўраджай хлеба. Засуха засухай, але такой, як гэтая, не было ніколі. Высушыла ўсё навокал. Рэчкі нібы канаўкі сталі, азёры да дна перасохлі. Людзі кару елі парануюю, ліпавы ліст рвалі ды таўклі, а потым з гэтае масы хлеб выпякалі. Пасля такога «хлеба» жыхары пачыналі пухнуць, сінець. Але да вясны неяк усё ж пратрымаліся. Ды зноў ліха — няма чым сеяць. Ні зярнятка ні ў каго не захавалася. Пабеглі сыны да бацькі. Выслухаў уважліва стары і гаворыць:

— Не палохайцеся толькі, родныя, не палохайцеся, бо гэта дурная справа. З забітай галавой разумнага выйсця ніколі не знойдзеш. Таму ідзіце дамоў і, як ні ў чым не бывала, пачынайце араць поле. Усё арыце дачыста.

— А-а-а...— пачаў было сярэдні.

— Усё арыце, а там ужо разбірацца будзем.

Аруць тыя хлопцы ніву, а людзі не адыходзяць ад іх, ды ўсё выпытваюць:

— Дзе ж гэта вы, каханыя, столькі збожжа пасеяць возьмеце?

На што браты адказвалі:

— Вось паапом, а то пуставаць жа будзе. Наконт збожжа потым развяжаць будзем. Важна, каб адну справу спачатку зрабіць. Можа, Бог чым дапаможа, то і пасеем...

Зрабілі справу і пабеглі да бацькі, нягледзячы на ўжо добрыя прыцемкі.

— Тата, а што ж зараз рабіць, бо калі не засеем, то людзі пачнуць смяяцца, такога яшчэ ніколі ў нас не выпадала.

— Не будуць смяяцца, бо прычыны для гэтага не стане. Вось што зрабіце. Дамоў як зойдзеце, то з раніцы пачынайце драць з крышы салому. Не толькі з хаціны, але і з хлявоў, з гумнаў. Здзярыце ўсё і вязіце на поле. Бярыце жонак, дзяцей ды на ніву ўсе выбірайцеся. Там кладзіце салому раўнюткімі шнурамі ў баразёнкі і засыпайце зверху зямлёю. Дасць Бог — не прападзём і ў гэты год... Толькі час дарма не губляйце, заўтра ж пачынайце.

Растлумачыў так стары і адправіў сыноў дамоў. Сам пастаяў, гледзячы ім у спіны колькі хвілін, і таксама пайшоў, чамусьці толькі пасміхваючыся.

Браты на досвітку ўзяліся за працу. Назбягаліся аднавяскоўцы, глядзяць і зразумець нічога не могуць. Навошта, здавалася б, драць салому з крышы? Хіба ж гэта дапаможа? Яшчэ больш здзівіліся, калі браты пачалі гэтую салому на сваю ніву вывозіць, а як заворваць узяліся, то ўвогуле сяляне падумалі, што браты ўчора недзе на сонцы галовы перагрэлі, раз такое ўчыняюць...

— Навошта вы, хлопцы, салому закопваеце? — запытаўся нехта з вяскоўцаў і, каб павесяліць астатніх, дадаў:— лепей спалілі б яе на ніве, лягчэй было б...

Нехта засмяяўся, нехта перамаўчаў, а браты, тыя ўвогуле не адрэагавалі, бо працай занятыя былі. І што ж вы думаеце? Пайшлі цёплыя дожджыкі, засвяціла, прыгрэла сонейка, і такое жыта ўзышло, што людзі толькі дзіваваліся. З саломы такія парасткі пайшлі!

Прыджгалі хлопцы да бацькі і давай яму, адзін аднаго перабіваючы, распавядаць пра апошнія навіны. А стары стаіць, пасміхваецца ласкава ды на сыноў паглядае. Нарэшце тыя выгаварыліся і замоўклі. Тады бацька і сказаў ім:

— Гэта, дзеткі, гадоў пятнаццаць назад я зрабіў. Год тады такі ўраджайны выдаўся, як ніколі. Дый мой бацька-нябожчык і падвучыў мяне пакрыць будыніны неабмалочанай саломай. Сказаў, што ўсё ў жыцці можа спатрэбіцца. Вось, бачыце, і спраўдзіліся ягоныя словы. Цяпер і вы, калі жыта жаць будзеце, то палову будынін неабмалочанай збажынай пакрыйце, а на наступны год — другую палову пакрыеце. Можа, яшчэ калі спатрэбіцца. Бачыце, як усё добра атрымалася. Радуецца стары, радуюцца і сыны за тое, што не зрабілі, як астатнія, не забілі свайго бацьку і не кінулі ў глыбокую яміну.

Цяпер ва Урэчча хлопцы бегалі часцей, бо было чым перад старым пахваліцца, пераказаць што. Але і вяскоўцы, убачыўшы, што лёгка браты выйшлі з цяжкага становішча, пачалі дапытвацца:

— Падкажыце, хлопцы, у адной жа вёсцы жывём, дзе гэта вы даведаліся пра такое выйсце? Не можа быць, каб самі да ўсяго дайшлі, сваёю галавою каб дадумаліся. Скажыце. Чаго ўжо там хавацца, вы і так вунь якія багацеі цяпер у параўнанні з намі!

Браты, вядома ж, сказалі б, бо не прызвычаіліся яны радавацца, калі іншым вяскоўцам дрэнна жыць. Але як пра ўсё скажаш, калі вяскоўцы сваіх бацькоў і мацерак пазабівалі, а іхні бацька ўжо дзесяць гадоў жывы?! Пераглядаюцца паміж сабою, ніжэй галовы прыгінаюць, а праўды не кажуць. Людзі ж, нібы нешта адчуваючы, не разыходзяцца па хатах, а стаяць ля іхняга поля ды не перастаюць дапытвацца:

— Няўжо не скажаце? Мы ж ведаем, што не самі дадумаліся. Адкуль вы маглі пра такое прачуць, калі на нашым вяку такога не здаралася тут? Скажыце, хлопцы. Чаго ўжо там хавацца. Усё роўна некалі на паверхню выплыве.

Хлопцы, тым не меней, зноў перамаўчалі. Ледзьве вечара дачакаліся і да бацькі прыпусцілі. Расказалі яму, як цяжка ад вяскоўцаў адчапіцца, бо праходу не даюць. Бацька нічога канкрэтнага тут параіць не мог. Ведаў жа, што калі сыны раскрыюць таямніцу, яму смерць зноў будзе пагражаць. Невядома ж, як да ўсяго гэтага сяляне паставяцца. Так і сказаў сынам. Апусцілі тыя галовы ды дамоў падаліся. Ідуць ціха, ледзьве ногі пераастаўляюць, а самы малодшы і кажа:

— Давайце, браткі, скажам праўду. Можа, адумаюцца нашыя вяскоўцы і не будуць патрабаваць смерці для нашага таты. Ды і іншых старых зберажом, бо яны калі не сілай, то мудрасцю, вопытам жыццёвым будуць карысныя ўсім. І лепшы таму доказ — апошнія падзеі. Хто як не наш стары бацька падказаў выйсце са, здавалася б, безвыходнага становішча?..

З цяжкім сэрцам, аднак пагадзіліся браты са словамі малодшага. Пайшлі раніцай збожжа жаць, а вяскоўцы зноў купкай падышлі і дапытвацца сталі:

— Скажыце, хлопцы...

— Ну што ж, калі просіце, то скажам. І пачнём з таго, што павінавацімся перад вамі...

Людзі маўчалі, нічога не разумеючы, а браты працягвалі:

— Наш стары бацька не памёр, і мы яго не забілі, як павінны былі зрабіць у адпаведнасці з нашымі законамі. Мы яго схавалі і есці яму патаемна насілі, раіліся з ім, калі што якое надаралася. Дзякуючы яму мы не толькі самі з голаду не памёрлі, але і вам вунь колькі збожжа можам на наступную вясну даць, каб вы палі засеялі ды чакалі спакойна ўраджаю. Хто б мог дадумацца, што страха нашых будынін пакрыта неабмалочаным збожжам?.. Хто б такое падказаў, калі б не стары?..

Навокал панавала цішыня. Толькі ледзьве чутна шаптаў нешта сваё, адвечнае, гарэза-ветрык. Старэйшы з братоў працягваў:

— Хочаце — карайце нас, хочаце — даруйце, вось вам чыстая праўда. Дадам яшчэ, што мы не шкадуем, што гэтак зрабілі, няхай і панясём за свой учынак пакаранне. Затое бацька наш жывы і сумленне нашае чыстае...

— І дзе ж вы яго гэтулькі часу хавалі? — запыталася нейкая цікаўная жанчына, якой, відаць, не цярпелася даведацца, як жа гэта дзесяць гадоў хавалі чалавека, і нават жанчыны з іхнімі языкамі-мянташкамі не даведаліся.

— Ды ў такой мясціне, што вы і не падумалі б...

— Але ўсё ж, дзе? — запыталася ўжо некалькі галасоў.

— На балоце, ва Урэччы. Там, дзе высокія выспы сярод багны ўзвышаюцца, дзе адвечны бор расце... Вось там мы тату жыллё і пабудавалі, туды і есці праз два дні на трэці насілі...

— А хто вас падвучыў бацьку схаваць? — пасля некаторага маўчання прагучаў нейчы голас.— Відаць, таксама нехта параіў?..

— Ды ніхто нічога не падказваў, проста наш малодшы такое запрапанаваў...

Пасля гэткай навіны пачалі вяскоўцы спрачацца, што ім рабіць з людзьмі, якія парушылі адвечны парадак, заведзены ў іхнім паселішчы. Крычалі, нібы тыя сарокі на падворышчы. Трашчалі многа, некаторыя нават спрабавалі за вопратку хапацца. Крычалі доўга, але нарэшце вось да чаго прыйшлі. Устаў старэйшы вясковец і кажа:

— Доўга мы тут, браты, спрачаліся, самі ж чулі. Вырашылі зрабіць так: караць не будзем, бо вы нам у многім дапамагалі і зерня на будучую вясну далі — гэтага забываць нельга. Але ж вы і падманулі нас, не сказалі адразу, што бацьку свайго не забілі. Можа б, і мы тады адумаліся... Таму большасць вырашыла, каб вы пайшлі з нашага паселішча і сталі жыць асобна. Не прымушаем рабіць гэта зараней. Дазваляем вясны дачакацца, нават можаце бацьку да сябе забраць. Ніхто болей і слова дрэннага на вас не скажа. Такая воля ўсіх. Выканайце яе і прабачце, калі што не так...

З вясны перабраліся браты да бацькі. Пабудавалі з цягам часу хаціны і хлявы і сталі спакойна жыць. Адтуль і назва Урэчча, бо паміж двума рэчкамі паселішча стала.

## ГАРАДЗЯЦІЧЫ

Жудасная гісторыя здарылася тут.

Жыў на гэтай выспе надта багаты князь. Палац у яго быў са шкла рознакаляровага, з дарагіх камянёў, з такога матэрыялу, якога, можа, зараз і на зямлі ўжо няма. А багацця ў валадара палаца было столькі, што калі госці прыязджалі, то ён, каб павыхваляцца, загадваў слугам выносіць з падзямелля і ссыпаць у гурбу каштоўнасці. За дзень насыпалі гару, амаль роўную з выспай, прычым, аказваецца, золата-срэбра выносілі толькі з аднаго падземнага памяшкання.

Паступова вакол палаца ўтварыўся горад. Як яго называлі, цяжка сказаць, бо ужо, самі бачыце, і сляды сплылі тае гісторыі. Гаворку трэба весці не пра горад, а пра таго князя, бо з-за яго ўсё і атрымалася.

Гаспадар такі злосны быў, такі бязлітасны, што проста жах. Сяляне ці рамеснікі стараліся аб'ехаць горад як мага далей, ды зрабіць гэта глухой ноччу, каб не трапіць на вочы князю ці ягоным слугам, бо пападзешся — назад шляху не будзе. Гэты вылюдак загадваў з жывых мужчын кішкі ды жылы на дрэвы намотваць. Сам жа стаяў побач ды пасміхваўся, гледзячы на мукі людзей. Казалі, што такім ён зрабіўся з-за багацця. Нездарма ў народзе гавораць, што багаты ніколі нікому не спачувае. А яшчэ — што золата кроў ахаладжвае, робіць чалавека абыякавым да чужога гора.

У таго князя з дзяцей толькі адна дачка была. Не тое каб надта прыгожая, але душою сумленная і шчырая. Спачувала людзям гаротным, ніколі слова благога на іх не сказала. Звалі яе Ірынкай. Не адну ночку праплакала яна з-за бацькі-ваўкалака, не адну ноч на каленях перад абразамі прастаяла, грахі замольваючы. Вядома ж, не ўласныя, а бацькоўскія грахі, ды баялася, відаць, нават перад Богам гэта сказаць. Адчувала, што такой бяды, як у іхнім краі, нідзе ў свеце, можа, і не было болей.

За Ірынкай пастаянна хадзілі двое служкаў, і нельга ёй было ні выйсці да людзей, ні паразмаўляць з кім. А калі ўсё ж надаралася такое, то на наступны дзень таго ўжо катавалі ў княжацкім двары, скуру з жывога здзіралі. І што самае страшнае — бацька загадваў ёй у абавязковым парадку прысутнічаць пры пакараннях. Бедалага і вочы закрывала, і галаву нахіляла, каб не глядзець на тое, што навокал адбывалася, але ж крыкі адчайныя ўсё роўна да сэрца даходзілі. А князь побач стаяў ці сядзеў і, пасміхваючыся, дачку супакойваў:

— Ірынка, родненькая, чаго гэта ты так хвалюешся? Чаго ты так перажываеш? Было б за што. Гэта ж не людзі, такія, як мы з табою, гэта ж быдла, нават яшчэ горш. За добрую жывёлу я грошы вялікія плачу, а гэта мне дарма перапала! І няма чаго іх шкадаваць, не заслугоўваюць яны тваіх слёзак!..

Гаспадар дачку суцяшае, а яна яшчэ горай залівaецца і праз плач спрабуе бацьку ўгаварыць:

— Татачка, родненькі, гэтак жа нельга рабіць, бо нас Бог пакарае! Не будзе нам спачыну на тым свеце! Не знойдуць прыстанішча нашыя душы! Не возьме нас маці-сырая зямля! Нельга далей гэтак жыць!

А князь, знай сабе, толькі рагоча:

— Які там Бог, якое пакаранне? Хто нада мною можа быць гаспадаром, калі ў мяне багацця столькі, што паўсвета купіць магу і на другую палову ў падзямеллі каштоўнасцей застанецца? Трэба жыць ва ўласнае задавальненне, а на тым свеце як-небудзь усё ўладкуецца. Не перажывай, дачушка...

Пасля аднаго з такіх катаванняў, калі каралі цяжарную жанчыну, Ірынцы зрабілася дрэнна, і яе ледзьве адхадзілі самыя вопытныя дактары. Але стала дзяўчына нейкай ціхмянай і запаволенай, увесь час толькі і рабіла, што шчыра, са слязьмі малілася ды на словы бацькавы ўжо не звяртала ніякай увагі. Князь болей не загадваў ёй прыходзіць на пакаранні, бо медыкі папярэдзілі, што яна можа сканаць, калі разнервуецца.

Аднойчы Ірынка папрасіла бацьку:

— Тата, загадай пабудаваць касцёл. Няхай майстры зробяць яго вялікім і прасторным. Буду ў ім замольваць свае грахі перад Богам, згадваць матульку, якая рана мяне на гэтым свеце пакінула. І навошта яна гэта зрабіла?.. Загадай, тата, табе ж гэта проста...

Князь адразу сазваў сваіх майстроў і аддаў загад: каб за паўгода на высокім грудзе стаяў касцёл!

Сагналі людзей з усяго наваколля. Дзень і ноч яны гнуліся-пакутавалі на будаўнічай пляцоўцы. Не давалі ім ні есці, ні спаць, толькі працуй, дый годзе. Нават калі дождж ішоў праліўны, работа не перапынялася. Маўчалі гаротныя, бо ведалі, чым можа скончыцца самае нязначнае непаслушэнства: замуруюць у сцяну, абкладуць з усіх бакоў камянямі і будзе табе жывая магіла.

А будыніна атрымлівалася непаўторная. Яшчэ верх не ўзвялі, а ўжо была яна нібы хвоя стромкая, да неба цягнулася, блішчэла-пералівалася на сонцы. Але самае дзіўнае — што ўсе камяні, нягледзячы на прыродны колер (белы, шэры ці чорны), у сцяне рабіліся аднакаляровымі — чырвона-крывавымі. Сяляне, сагнаныя на будоўлю, пачалі казаць паміж сабою, што гэта слёзы і кроў людская пафарбавалі іх у адзін колер.

Нарэшце надышоў дзень, калі ўбілі апошні цвік, замацавалі апошнюю гонту, паклалі апошнюю цагліну. Працаўнікі разагнулі спіны і заціхлі, чакаючы ад князя чарговага загаду. Ён мог загадаць ім разыхо-

дзіцца па хатах, а мог прымусіць зараз жа кіраваць на будаўніцтва нейкага іншага гмаха.

У гэты момант з палаца выйшла Ірынка і пакіравала да касцёла. Народ, гледзячы на яе, пападаў на калені і пачаў жагнацца, бо здавалася, што сама боская чысціня і шчырасць крочыла сярод іх па зямлі. Князёўна была ў белай вопратцы. І гэта яшчэ больш падкрэслівала ўрачыстасць моманту. Нібы лілея плыла пасярод натоўпу да ўзведзенага будынка. Падышла яна да дзвярэй касцёла і таксама ўкленчыла. У напружанай цішыні загучаў голас дзяўчыны:

— Божа! Даруй мне мае грахі, даруй, Божа! Няўжо на зямлі гэтай нічога не перайначыцца? Няўжо так і будзе, што адзін па-ранейшаму стане валадарыць над лёсам другога? Даруй, Божа, грахі майго бацькі! Даруй! За яго менавіта і прасіла пабудаваць зусім новы храм у тваё імя! Няхай надыдзе час, калі ён перайначыць свой нораў, пачне з павагай адносіцца да людзей!

Паспалітыя лавілі кожнае яе слова, бо ўпершыню чулі такія спагадлівыя думкі, выказаныя ад шчырага сэрца, ад чыстай душы. Але Ірынка не паспела скончыць сваю дзіўную малітву. Прагучаў магутны голас князя:

— Ты што гэта сабе дазваляеш, мярзотніца?! Ты прасіла мяне пабудаваць касцёл, каб у ім замольваць грахі свае і прасіць літасці ў Бога за маці, а ўвесь час папікаеш мяне, апаганьваеш маё імя! За каго стала Бога прасіць, за смярдзючых мужыкоў?! Слугі! У падзямелле яе! Няхай там свае малітвы творыць, няхай там да Бога просьбы пасылае! У падзямелле! Каб ніхто не бачыў яе і не чуў! Выконвайце!

Загуў-застагнаў народ, заплакалі некаторыя ўголас, але Ірынка супакоіла іх:

— Не трэба плакаць па мне, людзі! Не трэба! Няўжо вы і гэтак мала слёз штодзень праліваеце? Не бойцеся, я і там Богу маліцца буду. Мне багацця не трэба, золата таксама, яно чалавека не ўзвышае, а прыніжае! Я заўсёды буду маліцца за вас!

— Выратуй цябе Божа, князёўна! — загучалі шматлікія галасы.

Ірынку кінулі ў сырое падзямелле, і там яна дзень і ноч адмольвала грахі людскія і свае і праклінала ўласнага бацьку-вылюдка. Есці-піці не брала і недзе праз месяц сканала. Калі гэта здарылася, то пасярод

ночы загула бура з навальніцай, разлёгся магутны гром, заблісканелі частыя маланкі і горад пачаў правальвацца. Першымі шуснулі ў зямную прастору палац і касцёл, а потым і астатнія будынкі. Да раніцы толькі спакойнае мора калыхалася там, дзе яшчэ ўчора жылі людзі, ды месцамі ўзвышаліся невялічкія астраўкі. Вось як успамін толькі і засталося, што назва — Гарадзяцічы.

## ЗАМОШША

Раней жыла непадалёку ад нашых сучасных могілак адна старая бабулька. Тады тут, можа, самы цэнтр паселішча быў. Бабулька гэтая была сляпая, але хадзіла сама, з кіёчкам. Дзівαваліся людзі, як ёй удаецца знайсці дарогу і нідзе не спатыкнуцца, не ўпасці. Болей таго, сталі заўважаць, што яна ніколі не ішла адна — над галавой віліся чорны груган і дзве сарокі. Сядзе адпачыць — і птушкі на суках бліжэйшых пасядуць ды галовамі ва ўсе бакі пакручваюць. Стваралася ўражанне, што яны ці то сябравалі з жанчынай, ці то падпарадкоўваліся ёй. Аднаго разу двое мужчын нават бачылі, як старая раптоўна пачала без дай прычыны крычаць і размахваць рукамі. Калі падкраліся бліжэй, то пачулі, як яна казала:

— Ці вам вочы павылазілі? Ці чуеце дрэнна? Хіба ж не маглі здагадацца, што яны не гэтай, а іншай дарогай паедуць? Цяпер усё, праваронілі, трэба дамоў вяртацца ды зручнага выпадку зноў чакаць! Вось і даверся вам... Памочнікі! Толькі і ведаеце, што пахваляецеся перада мною, не болей! Дамоў! Кіруем дахаты!

Нічога тады не зразумелі мужчыны. Паціснулі плячыма ды пайшлі па сваіх справах. Але крыху пазней усё праяснілася.

Прыбягае аднойчы Кузьма-вясковец і штосілы гарлае:

— Людцы добрыя, што я зараз бачыў! Ніколі не паверыце! Нават не падумаеце на такое! Дай Бог, не падумаеце!

— А што ўжо ты там такое выглядзеў? — пытаюцца сяляне.— Раскажы, не цягні ката за хвост.

— Як жа пачаць, каб нічога не ўпусціць?.. Зараз, пачакайце хвіліну... Гэта, значыцца, можна адсюль... Слухайце, толькі ўважліва.

— Ды не цягні ты,— раззлаваўся нехта з вяскоўцаў,— а то яшчэ забудзеш, пра што хацеў распавесці.

— Пайшоў гэта я сёння з раніцы на балота. Туды, дзе замшаныя ўзгоркі. Хацеў паглядзець, ці па далінках журавіны спеюць, каб потым падысці з хатнімі ды назбіраць. Пайшоў з Цюлькам, сабакам маім. Да выспаў дайшоў, перабраліся па кладках далей, і чую — сабака брэша, ажно заходзіцца. Падабраўся я бліжэй, а там...

— Хто? — выдыхнуў натоўп.

— Сляпая наша... на пні, а над галавою ў яе груган і дзве сарокі сядзяць і па баках зіркаюць. Я тады заціснуў Цюльку рот і стаіўся, чакаю, чым жа скончыцца ўсё гэта. Ажно груган разоў колькі крумкнуў неяк зласліва, сарокі пратрашчалі, і сляпая ўстала. Павярнулася ў бок сонца, пастаяла колькі часу, потым схілілася і пачала нешта акуратна рассцілаць. Прыгледзеўся я, а гэта травы ўсялякія ды кветкі лясныя. Потым чую — гаворыць нешта. Далёка мне было, таму слоў не разабраў, але адно магу сказаць дакладна: яна варажыла... Хочаце верце, хочаце — не. Плявала па баках, пра Бога ні разу не прыгадала, а ўсё на сілу нячыстую спасылалася. Не раз, не два. Нейкімі дзіўнымі жэстамі словы гэтыя нібы замацоўвала. Потым торбу цэлую зелля напхала і дамоў падалася. Што самае дзіўнае — па балоту гэтак хутка джгала — дагнаць нельга было. Вось табе і сляпая. Калі выйшла на высокі бераг, то падалася адразу не дахаты, а туды, дзе мы пасвілі кароў. Кралася, нібы якая зладзейка. Усё прыслухоўвалася і азіралася. Я збіраўся ўжо кінуць назіраць, але нешта мяне стрымлівала. «А што ёй тут трэба? Што збіраецца рабіць?» І дачакаўся. Стала сляпая з торбы зелле тое заклятае раскідваць. Кідае налева-направа, а сама яшчэ праклёны свае крычыць ды нагамі злосна тупае, пыл уздымаючы. Чулася мне разоў колькі выразна: «Каб яны вам дамоў не папрыходзілі! Каб яны вам малака мала прыносілі! Каб яны, калі і прыйдуць назад, то ад жабы з цягам часу пакапыцелі!»

Вось гэта мяне, людцы добрыя, сама болей і ўзрушыла, таму і бег без супыну да вас, каб усё расказаць, каб і вы ведалі, што можа здарыцца.

Стаяць вяскоўцы, з нагі на нагу перамінаюцца, але не спяшаюцца выказвацца. Толькі нехта крэкнуў:

— Бачыш ты, гэта ж трэба, колькі гадоў жылі і не ведалі, што такая варажбітка ў нашым паселішчы...

Але астатнія не падтрымалі. Потым нехта прапанаваў:

— Трэба дачакацца жывёлу з поля, ужо нядоўга засталося. Вунь, вечарэе. Там і пабачым. Усё стане на свае месцы. Каб ненарокам на добрага чалавека паклёп не ўзвесці... Язык, ён без костак. Спяшацца не трэба.

— І то праўда,— пагадзіўся стары вясковец,— не дай Бог, потым акажацца, што старая не вінаватая. Як мы з ёй потым жыць будзем, як прабачэння прасіць станем? Трэба пачакаць...

Яшчэ хвілін колькі пастаялі і разышліся па хатах.

А там спраўдзілася ўсё, пра што чалавек казаў. Некалькі кароў знікла некуды, некаторыя ледзьве прыцягнулі з пашы ногі, відаць, захварэлі, а ў некаторых малака ўвогуле не стала. Тут ужо зразумелі сяляне, што на іхнюю жывёлу дзейнічаюць праклёны сляпой варажбіткі, але спадзяваліся, што праз дзеньдругі ўсё скончыцца. Ды дзе там! З кожным днём усё болей кароў малака не прыносіла. Жанчыны ўголас выць пачалі. Як дзяцей гадаваць? Малако ў вёсцы, асабліва летам,— асноўная ежа.

Сабраліся мужчыны і давай меркаваць, як ад незвычайнай бяды пазбавіцца. Доўга раіліся, ды ніяк рады даць не маглі, як злавіць чорную душу. Тады стары дзед устаў, зняў шапку і звярнуўся да сялян:

— Ведаеце што, дзеткі? Трэба нам злавіць варажбітку, калі яна будзе ў кароў малако адбіраць. А раз зловім яе на месцы злачынства, то і пакаранне адпаведнае наладзім. Дамо так, што болей нікому не захочацца над людзьмі сумленнымі здзекавацца. Як зрабіць — гэта я вам падкажу, бо чуў, як некалі ў суседняй з намі вёсцы ад такой бяды пазбавіліся. Трэба па чарзе пільнаваць жывёлу і пачынаць, відаць, з сённяшняе ночы і тым гаспадарам, у каго яшчэ каровы даюць малако. Яна абавязкова да некага з'явіцца, раз ужо завялася, то не адчэпіцца...

Так і зрабілі. Прыйшлі дамоў сяляне, перакусілі і пахаваліся па хлявах пільнаваць, калі ж тая варажбітка з'явіцца.

Летам ночка кароткая. Толькі змрок апусціўся,

а праз некаторы час ужо шарэць пачынае. Пад раніцу асабліва спаць хочацца. Вось адзін селянін, які таксама пільнаваў, прыхіліўся да шула і задрамаў непрыкметна. Гэтак яму соладка, гэтак добра спіцца, але нібы хто пад рэбры кулаком штурхае, будзіць, значыцца. Ускінуўся ён, адкрыў вочы і зразумець нічога не можа. Бачыць — цераз парог скача вялізная жаба. Ледзьве не закрычаў чалавек з перапуду, але стрымаўся. Стаў сачыць за тым, што ж далей будзе. Жаба тая прыскакала да каровы і... давай ссаць малако. Усё выдундзіла і збіралася ўжо назад клыпаць, ды тут гаспадар ачомаўся, ухапіў вілы, якія спецыяльна пад рукою паставіў, і за жабай! А яна гопае па зямлі, не раўнуючы, як конь. Ледзьве дагнаў і давай віламі па ёй дубасіць. Ды ніяк патрапіць вастрыём не можа. Нарэшце прылаўчыўся неяк і ўрэзаў прама па галаве. Жаба ажно віскнула і... яшчэ хутчэй прыпусціла.

На раніцу пабег гаспадар да астатніх вяскоўцаў, каб распавесці ім пра тое, што ў ягоным хляве ноччу адбывалася. Паслухалі сяляне дый гавораць:

— Пайшлі да сляпой ды глянем, ці дома яна зараз, ці жывая, бо калі гэта яна была, то нейкі ж знак павінен быць на целе. Дзе ж гэта вы бачылі, каб віламі па галаве аперазаў і ўсё цэлым засталося?

Прыпёрліся да плоту ля хаты варажбіткі, а далей ступаць баяцца. Ніхто не хоча рызыкаваць, а раптам нейкі заклён ці хваробу цяжкую і на яго накіне. Стаяць, маўчаць, толькі пахекваюць. Потым нехта ціхенька сказаў:

— Што ўжо стаяць? Трэба ж неяк зірнуць.

— То давай, зірні.

— А чаму я?

— Дык ты ж пытаешся.

— А і зірну!

— Зірні!

Смяльчак павольна, нібы перад смерцю, пераставіў нагу праз пералаз і падаўся да акенца. Па дарозе разоў колькі спыняўся, уздрыгваў, азіраўся назад. Ды ўжо не выпадала вяртацца, калі сам выклікаўся. Нарэшце селянін прыпаў да слепаватага акенца. Народ ажно падаўся наперад, так жадаў убачыць, што робіцца ў хаціне. Нечакана пачулася:

— У хаце яна. На палку ляжыць. Вунь, бачу... Галава анучай белай перавязана...

— Значыцца, то яна была. Ёй віламі ўлупіў му-

жык, не схлусіў. Цягнуць варажбітку на святло, тут і вырашым, што з ёю рабіць!..

Калі старую вывалаклі на свет божы, яна толькі вохкала і трымалася рукамі за спіну:

— Ой, што ж гэта вы ўдумалі, людзі добрыя? Ой, як жа вам не сорамна, мяне, старую, нібы авечку, валакчы?..

— А табе малако ад нашых кароў адбіраць не сорамна? — пагрозліва данеслася з натоўпу.

— Даруйце мне, даруйце, калі можаце, болей ніколі нічога благога не зраблю! Гэта нячыстая сіла мяне спакусіла! Даруйце! — і сляпая варажбітка бухнулася на калені.

Натоўп панура маўчаў. Глядзелі на старую і думалі: адпомсціць ёй трэба абавязкова, але ж і забіваць шкада. Нешта ўзварухнулася ў вяскоўцах. Той, хто першы заўважыў, як сляпая на балоце варажыла, запрапанаваў:

— Выгнаць яе з вёскі прэч! Няхай жыве сабе ў тым гнілым балоце! За тымі мхамі ды за даламі!

Так і зрабілі. Выгналі варажбітку з паселішча, і стала яна жыць на балоцістых выспах. З цягам часу перастала варажыць, і людзі ля яе пачалі сяліцца. Калі памерла старая, дык пахавалі яе крыху асобна. І нядаўна яшчэ яе магілу паказвалі.

А вёска з тае пары так і стала звацца — Замошша.

## САРАЧЫ

Неяк мне мой дзядуля распавядаў пра дзіўнае здарэнне. А яму пра тое паведаў ягоны дзядуля. Датычылася яно назвы нашага паселішча. Даўно гэта было, але стары добра ўсё памятаў. Гамонку мы будзем весці не ад імя дзядулі, а ад імя прадзеда, з якім такое дзіва і здарылася.

...Аднаго разу прычапіўся да мяне, значыцца, яўрэй (Хаімам яго ўсе ў нас звалі), каб у Любань яго завёз. Нешта там такое надарылася, і з'явілася ў яго пільная патрэба. Прыйшоў, просіцца, нібы слата тая прыліп, абяцае добра заплаціць. Я адразу то і не пагаджаўся, а яшчэ добрую гадзіну з ім павалтузіўся, каб які рубель-другі выгандляваць да абяцанай платы. Яўрэй бачыць, з-за чаго так справа марудна наперад рухаецца, і гаворыць:

— Ну, так ужо і быць, Андрэй (прадзеда майго

так звалі). Калі на месца прыедзем, то там і пабачым, што да чаго. Хутка заджгаем, у час паспеем, то і накіну яшчэ колькі-небудзь.

Я яшчэ для прыліку хвілін колькі нібыта вагаўся, але потым і кажу:

— Можа, каму іншаму і адмовіў бы, але ж не табе, Хаім. Часта і ты мне насустрач ішоў. Калі-нікалі даваў у сваёй манапольцы і тавар напавер, і з ежы што перакідваў, калі было. Таму падвязу да Любані, раз ужо такая патрэба паўстала.

Узрадаваўся яўрэй, крычыць:

— Не пашкадуеш, Андрэйка, не перажывай, добра заплачу. Я зараз пабягу, збяруся ды да цябе прымчу, тады і паедзем адразу. Дарога ж, сам ведаеш, не надта блізкая.

Я яму і адказваю:

— Ой, якая тут дарога, усяго вёрстаў з колькі. Гадзіна-другая — і на месцы. Будзем яшчэ з ночы выязджаць. Лепей раніцай.

— Не,— крычыць яўрэй,— з вечара паедзем!

— Ну, з вечара, дык з вечара. Ідзі збірайся хутчэй тады.

Вось запрог я коней парку ў лёгкія драбінкі, набіў дзяругу мурагом, узяў з паўасьмінкі аўса, пасадзіў Хаіма побач з сабою і патарахцелі. Мала што ў дарозе можа здарыцца, таму трэба, каб коням падсілкавацца абавязкова чым было. Ад'ехалі мы ад вёскі мо з пару вёрстаў, у лес убіліся. А там жа, самі ведаеце, якія дарогі — адны карані ды яміны. Ляскацелі мае драбінкі, падскоквалі па каранях, а потым трэсь — і кола зламалася. Божачкі! Гэтага мне не хапала. І дамоў вяртацца не выпадае, і да месца яшчэ далёка. А тут яшчэ і ноч насоўваецца. Хаім жа яшчэ на душу цісне, балаболіць сваё:

— Ой, чалавеча, што хочаш рабі, а мне да раніцы ў Любань дабрацца трэба...

— Збірайся ды ідзі пешкі,— кажу яму са злосцю.

— А навошта тады я цябе наймаў?! — крычыць яўрэй.

Неяк, з горам папалам, наладзіў я тое кола, і паціху паехалі далей. Пад раніцу, дзякуй Богу, уехалі ў Любань. Хаім задаволены, што паспеў на прызначаны час, песню ажно заспяваў і працягвае мне дзесяць рублёў, пра якія мы раней і дамаўляліся. Пастаяў, падумаў і кварту цэлую падае:

— На яшчэ, Андрэйка, і гэта. Намучыўся ты са мною, не выспаўся, стаміўся.

Пахарчаваў я коней, купіў сабе дамоў солі ды тараноў узяў, бо іх надта жонка мая любіла, вязанку абаранкаў на шыю павесіў, каб дзяцей патрактаваць, і падаўся памалу назад. Еду дый думаю: кварта ў мяне ёсць, а з кім жа яе выпіць? Сам не магу, такім ніколі ў жыцці не грашыў. І тут прыгадалася, што па дарозе, на хутары, жыве мой верны сябар, з якім мы пастаянна разам пчолак трымалі і даглядалі. Да яго трэба было крыху з'ехаць з дарогі і ўбок узяць з нейкую вярсту.

Толькі гэта я збочыў і павярнуў да хутара, бачу — пасярод дарогі стаіць баран. Я вочы вытрашчыў і не магу зразумець, адкуль ён тут узяўся? А баран стаіць, не саступае, толькі бляе галасна. Ён бляе, а коні ад гэтага ісці наперад не хочуць, стаяць на месцы і капытамі зямлю рыюць. Што за ліха, думаю сабе. Мае коні ніколі не былі надта наравістымі, а тут такое вытвараюць! Я й так, я й сяк. І пад чэрава б'ю, і пад хвост торкаю — хоць ты што. На дыбы становяцца, пена ў іх з рота цячэ, а ўперад ні на пядзю.

Злез я з воза, узяў жменю мурагу ў руку, зайшоў уперад дый павёў коней за цуглі. Храпуць яны, упіраюцца, але пакрыху ідуць за мною. Ужо амаль параўняліся з тым бараном. Калі сталі ўпоравень, то ён як забляе, ды як пабяжыць у лес, толькі лаўжы затрашчалі. Сеў я на воз ды як лупяну па конях. Гнаў што ёсць духу, пакуль да хутара не выскачыў, але вырашыў тут не спыняцца, а падацца крыху далей, да карчмы. Там ужо нічога не страшна будзе.

Супыніўся каля карчмы дый зайшоў туды закурыць люльку, а можа, і кварту з кім раздавіць, каб супакоіцца. Ажно там людзей поўна. Ведама ж, у карчме гоман-крык стаіць. Прыціснуўся да печы ды прыслухоўваюся, аб чым гавораць людзі. А яны ўсе як у сухі бубен малоцяць, усе гамоняць аб адным і тым жа: якія хто страхі дзе бачыў. Дзіўным мне гэта падалося. Раней такога не было. Гаманілі, канешне, але, каб усе адначасова... Дадумаць я не паспеў, бо да мяне падышоў Гаўрыла з нашай вёскі. Ён на выселках жыў.

— Здароў,— кажа,— суседзе!

— Здароў!

— А што гэта з табою сёння, Андрэй, па дарозе здарылася?

Ён як сказаў, дык я і прысеў адразу, перапужаўся нешта. Што Гаўрыла вядзьмак, у нас і даўней гаварылі, але што такі моцны і можа ведаць нават пра тое, што здарылася не з ім і не ў яго прысутнасці, я і не падазраваў. Ужо і выпіць расхацелася. Павярнуўся я крута ды да парога пачаў праціскацца. Гаўрыла ж зарагатаў і крычыць мне ў спіну:

— Чаго спалохаўся, Андрэй? Пачакай, пачакай, не спяшайся! Што гэта ты пабег? Яшчэ не ўсё! Сёння з табою яшчэ нешта прыключыцца!

Я ўскочыў на воз і пагнаў коней назад да хутара, туды, дзе жыў мой сябар. Прыляцеў да яго — і ў хату. Там нікога няма. Тады ў сад пабег — пашанцавала: сядзіць Хведар ля вулея і мёд якраз выбірае. Стаў мяне гаспадар частаваць. Кварту на стол ляпнулі. Жонка падсмажыла саланіны нам. Давай мы піць ды закусваць. А як трохі выпілі, дык і адкуль тая гаворка ўзялася. Не вытрымаў я дый расказаў сябру пра здарэнне і пра словы Гаўрылы-ведзьмака. Сябра і кажа:

— Ды не вер ты, чалавеча, гэтаму Гаўрылу. Можа, спецыяльна хацеў цябе напалохаць, каб тым самым сілу сваю паказаць, бо ты ж іншым перакажаш, а яму гэта на руку.

— А як жа яму не верыць, калі ён усё ведае і бачыць? Можа яму самі чэрці прыслужваюць?

— Не думаю,— павагаўшыся, мовіў Хведар і запытаўся зноў:

— Слухай, а як ты Хаіма вёз, то той нічога падазронага не казаў? Прыгадай, будзь ласкавы. Тады, можа, што праясніцца.

— Ён усю дарогу абы-што гаварыў. Памятаю, прымаўляў неяк дзіўна: сарачы, сарачы, сарачэнькі...

— Дзіўна, сапраўды дзіўна...

Вось пагасцяваў я добра ў сябра дый збіраюся дамоў, каб да прыцемкаў паспець. А Хведар і кажа зноў:

— Чаго табе, Андрэй, на ноч гледзячы, дамоў ехаць, начуй у мяне, а заўтра раніцай, халадком, і выпраўляйся.

— Атрымліваецца, я дзве ночы дома начаваць не буду? То ж мяне баба за гэта жывым з'есць. Сварыцца, крычаць пачне. Не, трэба ехаць неадкладна.

У гасцях добра, але ў роднай хаце лепей.

Упёрся я на сваім дый паехаў. Толькі пераехаў за палянкаю пералесак ды грэбельку, як зноў бачу выразна: пасярод дарогі стаіць баран. Пад'ехаў я бліжэй, і ён бліжэй да мяне падаўся. Я гнаць коней, а яны ні з месца, толькі зноў капытамі зямлю рыць сталі. Што тут рабіць? Пачакаю, думаю, пасяджу, можа, яшчэ нехта ехаць будзе. Дарога ж тут бойкая.

Баран бляе, коні храпуць, а я сяджу на возе бы на іголках, чакаю. Дай, думаю, паспрабую зрабіць адну штуку. У мяне з лейцаў было зроблена ў драбінках рыштаванне. От я давай яго распутваць. Нарэшце распутаў, зрабіў з лейцаў пятлю, злез з воза і пайшоў уперад коней. Стаў, прынараві́ўся ды як шыбану пятлю, у самы раз і закінуў таму барану на шыю. Не паспеў ён і варухнуцца, як я моцна зашмаргнуў пятлю, падцягнуў да сябе барана, звязаў яго добра, узваліў на воз дый хацеў ехаць далей. Паганяю коней, а яны нібы ўкапаныя. Стаў біць, гнаць, жывёліны пнуцца, ажно жылы трашчаць, але воза не могуць пацягнуць, нібы яго камянямі цяжкімі набілі.

Здагадаўся я, што гэта не проста баран, а пераўвасоблены нячысцік. Узяў добры цурбалак ды як стаў пярэсціць, то пакуль спіна не ўзмакрэла, нібы падчас малацьбы, не супыніўся. Потым развязаў лейцы і скінуў яго з воза. Баран той забляяў не сваім галасам, пасля зарагатаў ад радасці, што вызвалілі, і рассыпаўся па дарозе на дробныя лісты, нібы мяшок жару. Коні ў той жа момант як рванулі, як панеслі мяне, дык я ўжо думаў не пра тое, як іх падганяць, а як бы мацней утрымацца. Нарэшце коні выбіліся з сіл і супыніліся... якраз насупраць майго падвор'я.

Ніколі я не забываўся пра той страх. Ды справа на гэтым не скончылася. Праз дзён колькі прыбягае да мяне Сара, жонка Хаімава, і пытаецца:

— Андрэй, а дзе ж мой чалавек?

— Не ведаю,— кажу,— ён са мною не ехаў назад і нават не збіраўся.

Потым яго знайшлі. Дакладней, толькі косці, і на тым самым месцы, дзе мяне баран супыняў. Некаторыя людзі нават чулі, як нехта апоўначы гарлаў: «Сарачы! Сарачы!»

Адтуль і назва пайшла, а што яна азначае — не ведаю.

## СОСНЫ

На вяку нашых продкаў часта надараўся паморак. Калі не ведаеце, што гэта такое, то лепей і не ведаць. Падчас такой хваробы людзі выміралі цэлымі сем'ямі, вуліцамі, а здаралася, і вёскамі. Уявіце сабе: стаяла вёска, жылі ў ёй сяляне, а потым раптоўна, за нейкія там пару тыдняў ці месяцаў, усе выміралі і толькі скразнякі ды адзічэлыя каты і сабакі гулялі па апусцелых будынінах, дзе дагнівалі касцякі мерцвякоў, якіх не было нават каму пахаваць. Найбольш часта такое здаралася падчас войнаў ці пажараў, засух ці голаду, калі народ аслаблены. Захварэе адзін-другі, а там ужо перадаецца, нібы па ланцужку. У народнай памяці засталося шмат апавяданняў адносна ўсяго гэтага.

Дык вось, аднойчы і ў тым паселішчы, якое было раней на нашым месцы, успыхнуў паморак. Ды такі страшны, такі свірэпы, што па ўсім княстве аб ім чутка хутка пранеслася. Князь, не надта вагаючыся, загадаў сваім верным воінам шчыльна акружыць вёску і нікога з яе не выпускаць, каб не разносілі хваробу па іншых населеных пунктах. Адпаведна і ў вёску нікога не прапускалі. Па-іншаму нельга было ратаваць вяскоўцаў, не было тады яшчэ нейкіх там лекаў.

З сялянамі тварылася нешта жудаснае. Выходзіў чалавек з хаты, здаецца, здаровы, вясёлы. І раптам ногі пачыналі трэсціся, млявасць расплывалася па ўсім целе. А далей — болей, і праз дзень-другі яго ўжо нельга было пазнаць, ён сінеў на вачах, пухнуў. Спачатку памерлых вывозілі ці выносілі на могілкі, але потым неставала ўжо сілы, не было здаровых сялян. Праз нейкі месяц чорная справа завяршылася. У паселішчы не засталося ніводнага жывога чалавека.

Войскі пастаялі яшчэ з тыдзень і атрымалі загад ад князя ўсё навокал вынішчыць агнём. Прайшлі воіны па паселішчы, у будыніны не заглядвалі, але ўважліва прыслыхоўваліся, а раптам хто жывы застаўся. Да іх не данеслася ніводнага голасу, было ціха, нібы ў магіле. Запалалі хаціны і гумны, хлявы і стагі, у неба пацягнуліся чорныя дымы.

Прайшло, можа, гадоў дваццаць ці дваццаць пяць. На тым месцы, дзе некалі вёска стаяла, лес высокі ўзняўся. Вядома, не дубовы, а бярозавы ды алешнікавы. На былых могілках лес і даўней быў, дакладней, невялічкая купка яго, зараз жа стала высачэзная

сцяна сасновага бору, які ажно з небам гаманіў.

Мінула яшчэ гадоў колькі, і ад магілак людскіх ніякага следу не засталося, бо даўней помнікаў не ставілі, толькі дрэва ці камень які пазначалі і ўсё. Сярод соснаў вылучаліся тры дрэвы высачэзныя ды стромкія, нібыта іх хто спецыяльна сякерай выраўняў і ўторкнуў на гэтае месца. З цягам часу сюдою сталі людзі ездзіць ды хадзіць, і абавязкова прыпыняліся ў замілаванні перад нябачанай прыгажосцю сасновых асілкаў.

Ішлі аднаго разу тры вандроўныя музыкі міма гэтых былых магілак. Селі адпачыць пад разгалістымі дрэвамі і таксама заўважылі высачэзныя сосны. Пераглянуліся паміж сабою і гавораць:

— Вось каб з гэтых дрэваў скрыпкі зрабіць, то, відаць, самі ігралі б!

Загарэліся старыя ды так і злаўчыліся. Звалілі кожны па сасне, выбралі найбольш прыгодныя кавалкі драўніны, астатнюю склалі ў кострышча (нехта з вяскоўцаў сабе на дровы забярэ ці яшчэ на што спатрэбіцца). Парабілі скрыпкі, селі пад дубком і зайгралі. Інструменты атрымаліся не абы-якія, а самыя што ні на ёсць найлепшыя. Дастаткова было смыкамі крануць струны, як яны заліваліся звонкімі, нечуванымі дасюль галасамі.

Пайшлі задаволеныя старыя далей, скрыпкі каштоўныя ў торбачкі за плечы паклаўшы. Зойдуць дзе-небудзь у вёску па дарозе і як зайграюць — усё паселішча адразу ж бяжыць слухаць. У самыя глухія куткі музыка далятала і сэрцы абуджала. І не тое, каб адным маладым даспадобы была. І старых, і знямоглых нават вабіла. Каторы стары ці старая з печы гадамі да гэтага не злазілі, а зараз кіравалі, адзін аднаго падтрымліваючы, на гукі скрыпак.

Абступяць музыкаў паўколам, а тыя сядзяць і граюць, толькі часам каторы з іх ціха прамовіць:

— Можа б, людцы добрыя, чаго-небудзь перакусіць прынеслі, а то здарожыліся мы незвычайна, з учарашняга вечара нічога ў роце не трымалі. Будзьце ласкавы, калі што маеце...

Ачомаюцца сяляне. І сапраўды, чаму ж самі не здагадаліся старцам паесці прапанаваць? Пабягуць хуценька, хто бліжэй жыве, прынясуць, і далей музыкі граюць. І чуецца ў іхняй мелодыі ўся боль чалавечае душы. Вось, нібы наяве, галосяць-заліваюцца жанкі

над магіламі памёршых. І кожны з прысутных прыгадвае сваё: дзядоў, бацькоў, братоў, сясцёр, мацярэй, дзяцей, іншых родзічаў і проста добрых людзей, што заўчасна пакінулі гэты свет. Задумаюцца вяскоўцы над сваёй доляй горкай, над хуткаплынным жыццём чалавечым, і слёзы самі на вочы набягаюць, так млосна на душы робіцца, што, здаецца, уголас бы зараз жа завыў, ды людзі навокал стаяць. Жаласліва іграюць скрыпкі, а навокал стаяць і бязгучна плачуць людзі. І да таго расчуляцца, што і гаварыць ужо спакойна паміж сабою не могуць. Потым нехта ўстрапянецца ды прамовіць:

— Людцы, давайце ўжо разыходзіцца па хатах, бо і самі стаміліся, і людзей падарожных прыталілі.

Старцаў забіралі да сябе найбольш заможныя і ставілі на стол усё самае найлепшае з запасаў, бо надта ўдзячныя былі за выдатнае гранне.

Раніцай старцы ішлі далей. Праводзілі іх усім паселішчам, прасілі не мінаць, калі зноў некалі з'яўляцца ў гэтых мясцінах.

Доўга хадзілі па свеце падарожныя і гралі гэткія прачулыя мелодыі. А потым падумалі: смутку ў жыцці вяскоўцаў і так хапае, трэба неяк развесяліць іх, прыдаць ім новыя сілы, жаданне працаваць, жыць. Вырашылі музыкі весялейшыя мелодыі выконваць. Але тут адбывалася нешта дзіўнае: толькі бывала яны кадрылю ці полечку-весялуху зайграюць, як скрыпкі глухнулі. А калі пачыналі музыкі больш старанна і настойліва вадзіць смыкамі, то рваліся струны, нячутна лопаліся, нібы павуцінне, нават і не дзынькалі пры гэтым. Старцы аглядаліся бездапаможна навокал і ішлі далей, каб ні сябе, ні сялян лішні раз не хваляваць.

Аднойчы патрапілі яны ў адну вёску на вяселле. Усе спяваюць, маладым дабра-шчасця зычаць. Падарожных таксама за сталы святочныя пасадзілі, частуюць ад шчырага сэрца, нічога не шкадуюць — наліваюць і падкладваюць. Пад'елі старцы і вырашылі аддзячыць добрых людзей, сыграць што-небудзь вясёлае, заліхвацкае, каб мястэчкоўцы патаньчылі. Ведама ж — вяселле. Сабраліся зайграць вясёлую мелодыю, а са скрыпак такія сумныя гукі паліліся, што ў адзін момант людзі навокал скамянелі.

Узлаваліся падарожныя не на жарт, ускрыкнулі:

— Дакуль гэта доўжыцца будзе? Ці ж нам нельга зайграць тое, што людзі просяць?

І з таго гневу як лупянуць сваімі скрыпкамі хто аб вугал, хто аб печку, толькі драбнюсенькія кусочкі ва ўсе бакі, нібы пырскі вады, паляцелі.

Глянулі падарожныя на свае скрыпкі, дакладней, на тое, што ў руках ад іх засталося, і шкада ім стала інструментаў. Нагнуліся яны і пачалі збіраць трэсачкі ў торбы. Ды толькі возьмуць нейкі кавалачак у рукі — ён адразу ж ператвараецца ці ў горкія слёзы, ці ў кроў. Зразумелі старцы, што марныя іх намаганні, і пайшлі сабе паціху далей. А на тым месцы, дзе яны скрыпкі разбілі, вясною выбіліся з зямлі і пачалі расці тры сасны, адна прыгажэйшая і страмчэйшая за другую. Ля іх сталі людзі жыць, і вёску сваю назвалі — Сосны.

## ТАЛЬ

Жыў тут хлопец. Звалі яго проста — Сямёнка, ці Сямён. Прыгожы быў, ладны, працавіты, але не шанцавала яму з тае нагоды, што каханка Тэкля не хацела выходзіць за яго замуж, бо хлопец быў бедны, не было ў яго ні багатых бацькоў, ні грошай, ні, адпаведна, зямлі. Ды яшчэ прыпляла дзяўчына, быццам бы Сямёнка баязлівец, нават свайго ценю палохаецца. Язык у Тэклі без касцей, ды дзецюку ад гэтага не лягчэй, людзі пачалі папікаць, смяяцца. Што ж тут рабіць заставалася? Трэба было нейкае выйсце шукаць, каб узняць сябе ў вачах каханай і ў людскіх вачах таксама. Падказаў нехта Сямёнку, што можна на Купалле паспрабаваць знайсці шчаслівую кветку і тады багацця займееш — на паўсвета хопіць. Загарэліся вочы ў хлопца, і стаў ён чакаць тае чароўнае ночы. Ледзьве да лета дажыў — гэтак спяшаўся.

Нарэшце надышло і Купалле. Выйшаў Сямёнка з хаціны, сеў на ганку і пачаў прыслухоўвацца. Надта хацелася пакрочыць да змрочнага начнога лесу, але было яшчэ рана, бо пеўні першыя не спявалі. Неўзабаве закрычалі, залопалі крыллем певуны. Усхапіўся хлопец і шпарка пашыбаваў да пушчы. Ён заранёй ужо выхадзіў, выглядзеў, дзе папаратніку мноства расце, каб не ісці потым наўздагад. Крочыць, ды здаецца, што позніцца, то ажно бягом прыпусціў

дзяцюк. Бяжыць, не заўважае вакол сябе нічога і ўрэзаўся ў корч, што з зямлі выпіраўся, ажно ў вачах пацямнела. Пакуль у сябе прыйшоў — здалося, што цэлая вечнасць прамільгнула. Устаў ды далей пакіраваў, але ўжо не так шпарка.

З цягам часу забраўся ў такі гушчар, што навокал нічога не было відаць, адны совы-начніцы жудасна аб нечым рагаталі, ды гады ўсялякія вішчалі-сыкалі. Закалаціўся Сямёнка з перапуду, спіна потам халодным пакрылася, ужо і назад павярнуў бы, але дзе ж тая дарога, хто яе падкажа. Ледзьве не загарлаў, ды ў гэты момант найвышэйшай напружанасці падалося дзецюку, што неба крыху праяснілася, і на душы зрабілася спакайней. Пачакаў якую хвіліну Сямёнка і не вытрымаў, запрасіўся:

— Божачка! Дазволь мне вярнуцца дамоў... Божачка! Пакажы дарогу назад! Больш не буду шукаць дармавога, толькі падкажы...

У адказ толькі зарагатала-залапатала нейкая невядомая птушка, дзікі рогат пранёсся па начным лесе і зноў настала глухая цішыня. Затрэсліся калені ў хлопца і неяк міжволі апусціўся ён на пянёк побач. Сядзіць, думкі чорныя галаву свідруюць. Жывым бы неяк выбрацца, дахаты дабрацца, а там не трэба яму болей Тэкля, не трэба багацце. Жэніцца на простай дзяўчыне і гора ведаць не будзе. Вось толькі б раніцы дачакацца.

Узняў Сямёнка галаву і страпянуўся — непадалёку ад палянкі, на якой ён адпачываў, свяціўся ясны агеньчык. Устаў дзяцюк і пакіраваў прама на яго. Так і ёсць! Папаратнікаў цвет! Забыўся хлопец і на свой страх, і на абяцанні Богу, толькі б вырвацца адсюль. Ухапіў кветку абедзвюма рукамі і за пазуху хутчэй паклаў. Толькі зрабіў гэта — адразу адчуў подых жывых істот навокал. То сядзеў і нічога не было, а то пачаў разумець Сямёнка таямнічую гамонку лесу і траў, кустоў і нават аблокаў, якія некуды спяшаліся па небе і, тым не меней, шапталі:

— Глядзі ты, як пашанцавала гэтаму Сямёнку. Цяпер ён самы багаты чалавек у свеце! Гэта ж трэба, так пашанцавала...

Узрадаваўся яшчэ больш хлопец, галаву вышэй задраў і ўжо смела ступае, бо ўсё жывое расступаецца, ніц перад ім падае. І нядзіўна — валадар лесу ідзе. Звяры моўчкі пасунуліся ў гушчар, а больш дробныя

стварэнні, наадварот, павылазілі пад самыя ногі, каб таксама выказаць сваё захапленне. Чуецца дзецюку, як дрэвы перамаўляюцца і адно аднаму гаворыць:

— Цяпер тая ганарліўка Тэкля зведае, хто такі Сямёнка на самай справе! Цяпер яна і рота не адкрые, не тое каб яшчэ смяяцца! У яго столькі золата будзе, што іншым і ў сне не снілася!

А што ўсялякія нячысцікі выраблялі, то і сказаць цяжка. Гэта ж яны адразу завалодалі душою Сямёнкі. Радаваліся цяпер, куляліся, вішчалі і краклалі ад задавальнення, падскоквалі да хлопца і паляпвалі яго па плечуку, на што той адно толькі — усміхаўся. Ён адчуваў сябе цяпер не толькі багатым, але і магутным, ад якога многае залежыць.

Вось пачулася Сямёнку, як клічуць яго схаваныя ў зямлі скарбы:

— Гаспадар! Гаспадар! Куды ты крочыш? Чаму не спынішся, не разграбеш лісце, не капанеш раздругі якім сучком, каб забраць нас з сабою? Мы столькі часу чакалі гэтага моманту! Гаспадар! Забяры нас, не праходзь міма! Мы ж спарахнеем тут, лежачы цэлыя тысячагоддзі! Забяры!

Разоў колькі і сапраўды не вытрымліваў хлопец спакусы, нахіляўся і пачынаў шукаць там, дзе яму паказвалі таямнічыя галасы. Знаходзіў адразу, таму праз нейкія паўгадзіны і запазухай, і ў кішэнях, і ў шапцы было поўна залатых дукатаў. Не верылася селяніну, што ён гэтак хутка ўзбагаціўся. Глядзеў на бліскучыя манеты з нейкай перасцярогай, мабыць, баяўся, што яны могуць гэтак жа незаўважна знікнуць, як і з'явіліся. Чым далей крочыў — тым болей гучала галасоў. Прычым крычалі з самых розных мясцін: з кустоў, купін, вулляў, са старых дрэваў, з-пад камянёў, нават з прыдарожнага пахіленага крыжа пачуўся прыцішаны гук:

— Забяры і мяне, гаспадар! Даўно цябе чакаю. З таго самага дня, калі майго першага гаспадара рабаўнікі забілі, калі ён з кірмашу ехаў. Усё злыдні агледзелі, але не знайшлі золата, бо не здагадаліся, што яно ў драбінах, у звычайным мяшку. Так з тае часіны і ляжу ў смецці ды камянях. Надакучыла, забірай з сабою!

Сямёнка павагаўся хвілін колькі. Яно-то і зразумела — усяго адразу не ўхопіш. Але спалохаўся, што нехта іншы знойдзе, бо на паверхні ўсё знаходзіцца,

і стаў перасыпаць тое, што набраў, каб і гэты скарб дамоў занесці. Хлопцаў твар свяціўся гэткай радасцю, што шчаслівейшага чалавека ў той момант у цэлым свеце не было! Нават песню заспяваў.

А нячысцікі ад яго ні на крок не адступалі, вішчалі ад задавальнення. Неяк непрыкметна слізгануў першы прамень сонейка па верхавінах дрэваў, і яны з адчайнымі крыкамі кінуліся як мага хутчэй назад, да свайго дамовішча, відаць, баяліся, што не паспеюць у час прыхавацца і тады стануць лёгкай здабычай для людзей.

Сямёнка пабраў усё золата і вырашыў дахаты кіраваць. А наперадзе балота трэба было перайсці. Перабірацца праз яго і з вольнымі рукамі справа цяжкая, а калі яны занятыя, то і гаварыць не даводзіцца. Але сабраўся неяк хлопец з духам, пастаяў, паразважаў крыху і пайшоў. Ступіць крок-другі, з нагі на нагу пераваліцца і далей ступае. Амаль да паловы ўжо дабраўся. Узмакрэў увесь. Яшчэ б! Гэткі цяжар нясе, ды не проста цяжар, а грошы, пра якія так марыў, з-за якіх усю ноч страхі трываў, душу нячысцікам запрадаў.

Нарэшце заўважыў высокую купіну, а вакол яе нібыта цвёрды грунт. Вырашыў тут перадыхнуць, супакоіцца і агледзецца, далейшы шлях вызначыць. Паклаў грошы на траву і пачаў азірацца. А калі назад глянуў, то валасы дыбарам сталі: прама на яго ад таго лесу, дзе ён ноччу папаратнікаў цвет знайшоў, ляцелі нейкія пачвары, ды такія страшныя і агідныя, што Сямёнка не вытрымаў. Ухапіў золата і пабег што было сілы. Але ж па балоту надта не папрэш. То аступішся, то правалішся, то не ведаеш, куды ступіць. А пагоня ўжо амаль даганяе. Выразна чуваць, як шэпчуць злосна:

— Аддай! Аддай! Аддай наша нажытае! Аддай, бо ўсё роўна ўтопім!

Сямёнка да берага мо крокаў з дзесятак не даступіў і ўляцеў у «чортаву віру». Гопнуўся па самыя вушы, а цяжкія грошы на дно пацягнулі, толькі бурбалкі пайшлі, і папаратнікаў цвет не дапамог. «Чортавыя віры» у нас называюць яшчэ інакш — талі.

Пазней балота адступіла, а месца, дзе Сямёнка згінуў, людзі гэтак і пачалі зваць — Таль. Так і засталося.



# МАЛАДЗЕЧНА

Тут, дзе цяпер самы цэнтр горада, калісьці быў высокі, жоўты груд. На ім багі язычніцкія стаялі, а ля іх пастаянна жыў стары сівавалосы вяшчун, які ўдзень і ўночы сачыў за тым, каб ніхто не пакрыўдзіў драўляныя выявы багоў, не апаганіў свяшчэннае вогнішча. У яго ж задачу ўваходзіла і назапашваць дубовыя дровы ды падносіць іх бліжэй да агню, каб пастаянна знаходзіліся пад рукамі. Спачатку вогнішча раскладвалі проста на зямлі, але яго залівала дажджом, засыпала снегам, задувала моцнымі парывамі ветру. Тады вырашыў вяшчун прасіць у людзей дапамогі і пабудаваць над вогнішчам высокую будыніну, якая б і засцерагала агонь. Прыйшлі местачкоўцы, параіліся з багамі і ўзяліся за працу.

Яшчэ аб адным прасіў вяшчун людзей — не секчы дрэваў у свяшчэннай дубраве, якая раскінулася побач. На такую просьбу самы стары з цесляў выгукнуў:

— Ну, ты нас за нейкіх злачынцаў лічыш, хіба ж мы не разумеем... Адным жа з табою багам пакланяемся...

Праз колькі часу над вогнішчам паўстала высокая

і светлая будыніна. Цяпер можна было не перажываць за тое, што нейкая прыродная стыхія абрынецца на агонь і затушыць яго.

У тым жа паселішчы жыў князь, які валадарыў над усім гэтым краем. Сям'я ў яго была невялікая: жонка ды двое сыноў. Даўней усе такія людзі былі спагадлівымі да сваіх падначаленых, да бяднейшых. Ніколі не было чуваць, каб стары князь некага з местачкоўцаў брыдка злаяў ці загадаў біць-катаваць. Лічыўся магутным той гаспадар, загады якога выконваліся, бо ведалі людзі, што ўсё зараней добра прадумана і робіцца для паляпшэння жыцця. Звалі таго старога валадара Вітка. У тыя часы часта такія дзіўныя імёны ды прозвішчы сустракаліся. Па аналогіі з прыродай людзі і сабе такія ж імёны бралі.

Княства размяшчалася ў зручным месцы: праз яго бралі кірунак усялякія гандляры ды паслы, часта праязджалі розныя падарожнікі. Гэта з аднаго боку. А з другога — хто б ні ішоў куды вайною, імкнуўся выбраць найкарацейшы шлях, таму і скіроўваў на землі валадара Віткі. Амаль усе дарослыя мясцовыя жыхары былі не раз, не два паранены-пабіты ў сутычках з няпрошанымі гасцямі. Ды што рабіць заставалася, калі такі лёс выпаў. Прыйдуць з аднаго паходу, не паспеюць адпачыць, а ўжо ляцяць вершнікі з другой мяжы з заклікам да князя тэрмінова выступаць супраць нейкага іншага ворага, які нахабна прэцца на чужую тэрыторыю. Заплачуць жанкі, застогнуць каханкі, заенчаць малыя дзеці, бо ведаюць: далёка не ўсе вернуцца дамоў, не на пагулянку едуць, не віно-мёд піць, а на крывавую бойку, дзе косці трашчаць будуць пад моцнымі ўдарамі мячоў ды дзідаў.

Дома заставаліся старыя ды жанчыны з малымі. Але потым валадар пачаў пакідаць у мястэчку і некалькіх вопытных вояў. Тыя спачатку супраціўіліся, але князь пераканаў іх:

— Не сядзець будзеце,— сказаў ён сурова.— Не. Будзеце нашых падлеткаў навучаць вайсковай справе. Каму як не вам, не раз, не два зраненым у шалёных бітвах, перадаваць сваё майстэрства тым, хто заўтра прыйдзе нам на змену і будзе супрацьстаяць ворагам?!

— Вось яно што... А я думаў ужо, не магу меч у руках трымаць,— прагуў адзін з дружыннікаў, які павінен быў заставацца дома.— Я думаў...

— Не тое ты, браце, думаў,— засмяяўся задаволены Вітка.— Вучыце да сёмага поту, нікому скідкі не рабіце. Чые б там дзеці ні былі — вучыце старанна. Каб мячом, як і языком валодалі. Раней мы гэтаму ўвагі не надавалі, а цяпер пастаянна будзем займацца з падлеткамі. Так што няма чаго крыўдзіцца.

— Ды раз трэба, то трэба, мы ж не супраць, княжа, але неяк нязвычна, што ўсе ў бітву кінуцца, а нам тут, у зацішку, давядзецца перасядзець,— паспрабаваў нехта больш-менш згладзіць рэзкі і непрыемны для ўсіх тон размовы.— А за маладых не хвалюйцеся. Што самі ведаем, тое і ім перадамо. Палёгкі нікому не будзе, бо вораг у бітве не пашкадуе.

— Маіх ганяйце таксама. Няма чаго ім на траўцы гуляцца. Павырасталі ўжо. Хутка з дзеўкамі бегаць будуць. Няхай спачатку мячы ў руках трымаць навучацца, каб абараніць іх здолелі, а потым ужо і галёкаюць. Бывайце, нам час ехаць!

— Бывай, князь, поспеху і ўдачы табе і войску! Вяртайцеся жывымі ды здаровымі, каб ніхто дома па вас не плакаў.

Паехала дружына, а сталыя ваяры засталіся. Падумалі, паразважалі над тым, як ім дзейнічаць, і вырашылі, што ўсё трэба наладжваць, як і ў дарослых. Сабралі падлеткаў. У некаторых з сабою нават была пржавелая зброя, ужо непрыгодная ў бітвах, але яна магла спатрэбіцца падчас навучання. Паглядзелі настаўнікі, і твары іхнія прасвятлелі. Моладзі набралася даволі многа. Нічога, што ў іх вусы яшчэ толькі прабіваліся, але некаторыя ўжо мелі шырокія плечы і магутныя рукі ды ногі. Майстэрства дадаць такому чалавеку — і ў сечы ён стане спрактыкаваным сапернікам. Тут жа былі і княжацкія сыны. Адзін з іх — высокі, стройны, што тая хвойка, другі — наадварот, ніжэйшы, каржакаваты, плячысты. Старэйшага звалі Нічыпарам, а меншага — Змітрыкам. Стаялі падлеткі і ўважліва ўслухоўваліся ў тое, што ім гаварылі старэйшыя.

— Вось што, хлопцы,— пачаў той, каго самі дружыннікі прызначылі над сабою ваяводам,— трэба нам пастаянную ахову выставіць на сценах ды на валах мястэчковых, каб даводзіла пра ўсё падазронае.

Сказана гэта было сівым чалавекам на поўным сур'ёзе, таму і астатнія ўспрынялі прапанову надзвы-

чай сур'ёзна. Варта пайшла на сакрэтныя месцы, адкуль ўсё наваколле было бачна, нібы на далоні, а самі падлеткі заставаліся незаўважанымі. Астатнім дружыннікі пачалі паказваць, як наносіць і як адбіваць удары мячамі. Дасталі загадзя падрыхтаваную драўляную «зброю», каб нікога не параніць, не пакалечыць незнарок. Неўзабаве застукалі, забрынькалі мячы па шчытах, пачуліся першыя радасныя і першыя... жаласлівыя ўскрыкі, бо некаторыя не паспелі, відаць, ухіліцца і атрымалі ўжо па руках ды па грудзях, а каму бомкнулі і па галаве. Такія ляжалі на траве, і ля іх завіхаўся стары дзядулька з вялікім драўляным вядром. Нахіліцца, ліне вадзічкі халоднай і ласкава запрашае:

— Уставай, уставай, унучак, далей змагайся. Глядзі, каб зноў не трэснулі табе паміж вушэй, бо які ж ты тады ваяка будзеш...

Наладзілі справу вопытныя дружыннікі. Так прайшло, мажа, тыдні два. Хлопцы так падвучыліся біцца драўлянай зброяй, што толькі трэскі ад яе ляцелі. Цяпер ужо і «параненых» меней было, і дапамога дзядулі мала каму патрабавалася, да яго падбягалі толькі тады, калі хацелі піць. Схіліцца падлетак да вядра і таропка п'е, а за ім яшчэ чалавек колькі стаіць. Гаспадар толькі ласкава пасміхваецца ды прымаўляе:

— Эх, вы, ваўчаняткі мае. Ваўчаняткі мае! Вось і вам часіна прыспела вучыцца мужчынскай справе! Цяпер і вы ўжо здольны паказаць свае зубы! Малайцы! Малайцы!

Зноў грукалі мячы, ламаліся дзіды, макрэлі спіны і знемагалі маладыя воі.

Яшчэ праз тыдзень настаўнікі пачалі наладжваць паядынкі паміж сваімі вучнямі. Падбіралі роўных па сіле і па майстэрству падлеткаў і выпускалі на зялёную палянку. Тут яны і даказвалі, хто з іх мацнейшы, хто спрытнейшы, хто лепей засвоіў ратную справу. Гледзячы на некаторыя паядынкі, дружыннікі толькі моўчкі паміж сабою пераглядваліся. Гэта азначала, што хлопец б'ецца, як сапраўдны вой. Калі такому даць у рукі зброю, то саперніку давядзецца нялёгка.

Але найбольш вылучаўся старэйшы князеў сын, Нічыпар. Вось дзе сапраўдны асілак рос! Нягледзячы, здавалася б, на танклявую постаць, хлопец меў такі страшны ўдар, што калі яму далі баявую зброю і ён пачаў адбівацца ад нападаючых на яго падлеткаў, то

адным узмахам парассякаў шчыты. Спалохаліся настаўнікі, так і пакалечыць аднагодкаў можа, і закрычалі:

— Адпачынак! Адпачынак! Адпачынак! Хопіць на сёння, хопіць!

Потым пастроілі сваю дружыну. Перад імі стаялі не тыя хлапчукі, якія прыйшлі сюды першы раз колькі часу таму назад. Гэта ўжо былі людзі, якія не баяліся баявога супрацьдзеяння. Ім патрэбна была сапраўдная зброя і даспехі, яны ўжо маглі выступаць супраць ворагаў падчас небяспекі. Усталі вопытныя ваяры і, падцягнуўшыся, мовілі:

— Станавіцеся! Раўняйцеся! Слухайце ўважліва, хлопцы!

Упершыню назвалі падлеткаў так, як і баявых сабрацяў,— хлопцамі. Прыраўнялі іх такім чынам да сябе. Паказалі, што паважаюць за вайсковае майстэрства, за ўпартасць, самаадданасць і смеласць, якую яны праявілі ў час вучобы.

— Заўтра ўсе атрымаеце баявыя даспехі, мячы і дзіды. Коней на ўсіх, можа, адразу не хопіць, але калі што, дык дакупім. Цяпер ужо будзем не толькі стаяць на сценах і вежах, але і патруляваць бліжэйшыя межы княства. Цяпер мы здольны супрацьстаяць ворагам. Можам выступіць на дапамогу дружыне князя, якая зараз недзе змагаецца з няпрошанымі гасцямі. У вас пачынаецца сапраўднае мужчынскае жыццё, дзе смех пастаянна будзе суседнічаць з горкімі праклёнамі багоў вайны, са стратамі сяброў...

Падлеткі, відаць, ноччу ўвогуле не спалі, бо толькі зайграла сонца, а на падворку, дзе пастаянна адбываліся баі паміж навучэнцамі, ужо было людна. На гэты раз прыйшлі не толькі падлеткі, але і іхнія родныя, прыйшлі, каб правесці і гэтых вояў у паход, праўда, у вучэбны. Толькі сэрцы мацярок адчувалі, што ўсё можа здарыцца на белым свеце. Хто ж яго ведае, ці не налезуць ворагі з якога іншага боку, ці не паспрабуюць адарваць сабе кавалак тэрыторыі, пакуль князь з дружынай адсутнічаюць. Вось і сабраліся на падвор'і, каб глянуць на сваіх дзяцей, якія ў гэты момант станавіліся дарослымі, бо звароту ў дзяцінства для іх ужо не будзе. Затупацелі коні, якіх прыгналі і пачалі сядлаць, забразгацела зброя, заляскалі шчыты — усё было падобна на тое, як ад'язджалі не раз і не два раней старыя дружыннікі, вопытныя ваякі.

— Ну што, будзем выязджаць? — запытаўся адзін з настаўнікаў у астатніх.— Час ужо, а калі сонца прыгрэе, тады лепей дзе сконімся ды адпачнём.

— Так, няма чаго чакаць. Можа, да князя давядзецца дабірацца, бо вунь ужо колькі часу няма ніякіх звестак. Даруй, Божа, але каб якога ліха не надарылася...

— Усё можа, сябры, быць, усё. Толькі час і сапраўды выступаць,— пераняў гаворку трэці.

— Па конях! Па конях, хлопчыкі! — скамандаваў зычны голас.— Доўгім развітаннем сыты не будзеш, толькі сэрца зашчэміць. Па конях!

У адказ на гэты заклік адчайна і, разам з тым, неяк нечакана, загаласілі жанчыны. Тут усё адбывалася пасапраўднаму. І як бы хлапчукі ні адмахваліся ад родных, як бы ні паказвалі, што ўжо выраслі, але і яны непрыкметна пачалі адварочвацца і шморгаць насамі.

Неўзабаве атрад пакіраваў да ўваходнай брамы. Маўчалі падлеткі, маўчалі сталыя ваяры, толькі коні аб нечым, толькі ім вядомым, фыркалі, ды па-ранейшаму галасілі-хліпалі жанчыны, ідучы следам.

Ехалі амаль да полудня. Толькі калі сонца прыпаліла так, што, здавалася, са спін пара валіць, старэйшы загадаў:

— Сконьваемся, тут на беразе рачулкі і адпачнём. Перакусім, дамо адпачынак коням, абмяркуем, куды далей возьмем кірунак...

Асноўная маса падлеткаў засталася на месцы, толькі варта раз'ехалася ўбакі. Ёй было загадана пільна сачыць за наваколлем, бо тут табе не ў крэпасці сядзець, усяго чакаць можна, нягледзячы на тое, што па родным княстве едзеш.

Так працягвалася колькі тыдняў. Знясілелі і людзі, і коні, але маладыя не жадалі паказваць стомы, не хацелі, каб настаўнікі дый паплечнікі бачылі, што ім хочацца хоць на хвілінку трапіць дамоў. Усё было нібы ў сапраўдным паходзе: і засады наладжвалі, і «языкоў» бралі, практыкуючы гэта на сялянах бліжэйшых вёсак, праз якія праходзілі. Адно такое «спатканне» ледзьве не закончылася трагічна. Ці то хлопцы надзвычай прытаміліся, ці то нешта не гэтак зрабілі, як патрабавала вайсковая справа, але той, на каго яны наскочылі ўтраіх ззаду, выкруціўся і, болей таго, ухапіўшы цяжкі цурбалак, паспеў лупянуць дваіх з нападаючых так, што тыя адразу ж брыкнулі на зямлю. Невядома, чым

справа скончылася б, каб не княжацкі сын Нічыпар, камандзір усёй варты і разведкі. Нешта яму не спадабалася доўгая адсутнасць ягоных людзей, і вырашыў хлопец сам праверыць, куды прапалі разведчыкі. Своечасова нарваўся на месца няроўнага паядынку, бо ўжо і апошні з падлеткаў ледзьве адбіваўся ад селяніна. Той валодаў звычайным цурбалкам па-майстэрску. Сам нават паранены не быў, а маладому вою насшываў вышэй галавы. Нічыпар недарма славіўся сярод сваіх аднагодкаў уменнем трымаць зброю. Супраць яго мясцовы жыхар змагаўся нядоўга, праз колькі хвілін ягоная дубовая зброя была выбіта з рук, а самому яму да грудзей прыстаўлена вострае лязо мяча. Калі параненых і палоннага даставілі да месца адпачынку, толькі тут упершыню добра ўсвядомілі сабе вопытныя настаўнікі, што магло б здарыцца, каб не шчаслівая зорка, якая, мабыць, усё ж свяціла ў той момант іхнім падначаленым.

Даведаўшыся, што гэта свае людзі, што тут многа дзяцей багатых баяр, ваявод і нават самога князя, селянін бухнуўся долу і схіліў сваю галаву:

— Прабачце, родненькія, я ж не ведаў, што вы свае! Я ж нават і не падумаў, што гэта вы вучыцеся! Хіба ж я тады адбіваўся б? Прабачце! Добра, што да смерці не пазабіваў!

— Хто ты такі? — запытаўся ў палоннага старэйшы, каб неяк выйсці з нязручнага становішча.

— Я Міцька-каваль. Жыву ў вёсцы, што вярсты за тры адсюль будзе. Пайшоў у лес, каб звера падцікаваць якога. А тут во...

— А чаму без зброі? — здзіўлена хмыкнуў дружыннік.

— Ды я сёння паляваць і не збіраўся, толькі хацеў паглядзець. А зброя... Якая ў нас зброя? Добрую даўбешку ці рагаціну возьмеш і пайшоў... Вы прабачце за хлопцаў. Я ж не хацеў...

Аднаго з тых, хто быў у разведцы і каго Міцька бомкнуў па галаве, нарэшце адлілі вадой, і ён, пакруціўшы галавой і ўбачыўшы непадалёку ад сябе сяброў і палоннага, прамовіў:

— Але ж і здаровы!

Гэтыя словы адразу знялі напружанасць, і воі пачалі жартаваць, павесялелі і настаўнікі.

— Дык можа з намі паедзеш? — запытаўся Нічыпар у свайго нядаўняга саперніка.— Хвацка ты махаеш-

ся. Калі б яшчэ навучыць цябе меч у руках трымаць — незаменны быў бы.

— Калі возьмеце, то паеду,— проста адказаў каваль.

Яшчэ тыдняў колькі ездзіла войска па княстве, пераймаючы таямніцы ратнай справы, даводзячы ўсё да аўтаматызму, прызвычайваючыся разумець адзін аднаго з паўпогляду. Тут іх і знайшоў пасланец ад старога князя. Пад самы вечар, калі падлеткі ўжо адпачывалі ля вогнішчаў, варта затрымала вершніка, які прасіў тэрмінова правесці яго да старшага. Калі чалавека амаль што пад рукі падвялі да настаўнікаў, тыя ўсхапіліся на ногі:

— Чэрня, ты? Адкуль? Што з табою здарылася?

— Князь загадаў вяртацца дамоў і адтуль выйсці насустрач яму. У нас бітва лютая была. Ворага мы супынілі, але ён не пайшоў назад, а стаіць насупраць нашага войска, чакае дапамогі. У нас жа яе няма... Таму князь і сказаў, каб гараджан у лясы звялі, набытак прыкапалі. Няма дапамогі...

— Як гэта дапамогі няма? — узарваўся Нічыпар, які стаяў побач.— А мы?!

— А мы! — адгукнулася стокраццю галасоў наваколле, і ўзбуджаныя падлеткі пачалі таропка хапаць зброю.— Мы пойдзем на падмогу князю і вялікай дружыне!

Вершнік, здавалася, акрыяў і глядзеў шырока адкрытымі вачыма на падлеткаў, якія ўжо сядлалі коней.

— Калі вы іх так падвучыць паспелі? — прахрыпеў ён, звяртаючыся да былых паплечнікаў.— Гэта ж сапраўдныя воі. Яны ўжо, можа, і ў баі трымацца змогуць, можа, і сапраўды надзейная змена вырасце?..

— Не вырасце, а ўжо вырасла. І на дапамогу мы з імі неадкладна кінемся,— з гонарам вымавіў адзін з вопытных дружыннікаў,— няхай ворагі нашы мяркуюць, ці навучылі мы гэтых маладзёнаў чамусьці карысламу.

— Па конях, хлопчыкі! Па конях! — залунаў неўзабаве крык, і атрад сарваўся з месца. Усю ноч гулка тупацелі капыты па лясных дарогах, толькі на золку спыніліся адпачыць. Спяшаліся людзі, баяліся запозніцца. У такой справе кожная хвіліна надзвычай дарагая. Але ж і шлях быў няблізкі. Таму амаль тыдзень дабіралася маладая дружына да таго месца, дзе князь з войскам супрацьстаялі чужынцам. І прыспелі ў самы

час, бо да ворагаў ужо падышло падмацаванне і яны, асмялелыя, чакалі наступнага дня, каб ударыць і перамагчы.

Спачатку людзі князя не ведалі, што рабіць. Падалося ім, што гэта нейкія саюзнікі ворагаў з'явіліся ў іхнім тыле, бо падмогі не чакалі, на яе нават і не спадзяваліся. А тут вялікі атрад, добра ўзброеныя вершнікі, ладныя даспехі... Пачалі рыхтавацца да бою, ды раптам нехта з дружыннікаў ускрыкнуў:

— Хлопцы, дык там жа наш Чэрня! Вунь ён, глядзіце!

— І сапраўды — Чэрня! А вершнікі тады адкуль будуць?.. Нам-то дапамога не ішла?

— Глядзіце — гэта ж нашы маладыя, якіх мы вайсковай справе вучыцца пакінулі! — радасна загарлаў хтосьці з ваяк.— Бачыце, там жа і нашы дружыннікі едуць, што на месцы заставаліся! Вось дык падмога!

Калі князю сказалі, то ён спачатку не паверыў. Прыбег да атрада і з лаянкай накінуўся на старых служак:

— Што вы нарабілі? Вы ж мой загад не выканалі! На каго мацярок ды дзяцей нашых пакінулі? Чаму на месцы не засталіся?!

— Карай нас, княжа, як хочаш, але не маглі мы стрымаць сваіх вояў,— схіліліся вопытныя настаўнікі,— яны чуць нічога не жадалі, да вас імкнуліся на падмогу.

— Яны не вінаватыя, валадар,— пачуліся галасы вершнікаў,— не парушылі яны нічога, толькі нам нельга дома сядзець, калі бацькі ды браты родныя кроў праліваюць на полі бою!

Зірнуў на іх князь яшчэ раз і павесялеў душою, а выгляду не падае. Убачыў і сваіх сыноў, якія таксама нешта ўзрушана крычалі, і прыціх.

— Добра, хлопчыкі, раз прыехалі, то назад праганяць нікога не будзем. Дапамагайце, толькі беражыцеся! Вашыя жыцці мне даражэй у многа разоў за нашыя, вам яшчэ наш род працягваць!

З раніцы такая лютая сеча ўсчалася, якой даўно ўжо не бачылі нават самыя вопытныя воіны. Але княжацкая дружына перамагла чужынцаў і пагнала іх прэч з роднай зямлі. У гэтай бітве вылучаліся смеласцю і храбрасцю многія, але найбольш удала змагаліся Нічыпар са сваім новым сябрам Міцькам. Здзіўляліся спрактыкаваныя дружыннікі, бацька толькі галавою ківаў.

Калі селі адпачываць пасля перамогі, стары князь

абняў і моцна пацалаваў сыноў, а потым асілка Міцьку, вымавіўшы пры гэтым:

— Ну вы, хлопцы, і паказалі нам, што да чаго. Ну і малайцы! Дзякуй і вам, настаўнікі! — звярнуўся да старых дружыннікаў, якія не адыходзілі ад сваіх вучняў.— Добрых вояў падвучылі! Добрых! То цяпер, сыночкі, дома вам і рабіць няма чаго! Заставайцеся тут службу верную несці. Горад сабе, замак-крэпасць будуйце! Дару свайму сыну землі гэтыя! Каб было, дзе пабудаваць і людзей пасяліць! Маладэча ты мая, маладэча,— задаволена паляпаў бацька па плячы Нічыпара.— Малодшага дамоў забяру, а цябе тут пакіну. Маладэча...

Адтуль, кажуць, і пайшло Маладзечна, ад слова таго. Старыя людзі дык і зараз так гавораць — Маладэчна.

## РАДАШКОВІЧЫ

Мястэчка наша мае сваю гісторыю, якая сягае ў далёкія стагоддзі, недзе там яе глыбінныя вытокі. Даследчыкі сцвярджаюць, што калі канкрэтна расшыфроўваць значэнне слова, то атрымаецца наступнае: «радавацца», «весяліцца», або крыху інакш — «радзіцца», «раіцца». Сюды ж адносяць і аднакарэннае слова «радзімічы». У беларускім фальклоры таксама сустракаюцца вусна-паэтычныя творы, якія ў некаторай ступені падкрэсліваюць рэальнасць гэтых сцверджанняў. Вось адна з гісторый.

Недалёка ад гэтых мясцін вельмі даўно жыў князь. Добры быў чалавек, справядлівы. Здарыцца, бывала, што-небудзь, то адразу патрабаваў, каб слугі пра ўсё даведаліся і данеслі яму. Выкліча тады вінаватага і пытаецца:

— Што ж гэта там, голубе, утварылася? Чаму ты маўчыш? Ведаю, як усё было, але ты гавары, пагляджу, ці не хлусіш...

Селянін ці гараджанін стаіць перад валадаром, калені трымцяць і разважае: паспрабуй не сказаць усю праўду — пакарання не пазбегчы, тым болей што гаспадар палаца ўжо ўсё ведае,— і пачынае распавядаць, як на самай справе адбывалася. А часта здаралася, што князь і не ведаў, хто вінаваты. Пакліча ён чалавека, выслухае яго і брывом спачатку не варухне, толькі по-

тым, калі заўважыць, што перад ім невінаваты, ціхенька прамовіць:

— Я так і ведаў, што ты ні ў чым не замешаны. Няма за што і судзіць тады. Ідзі сабе, чалавеча, з Богам, ды асцярожней паглядай па баках, бо ўсялякае здараецца — і аблаяць, і заклён накласці могуць, і паказаць супраць цябе... Памятай пра гэта.

Калі ж вінаваты перад ім быў і ва ўсім сам шчыра прызнаўся, то спачатку горды валадар выпытваў, як ды чаму так атрымалася, да драбніц імкнуўся дайсці, каб пакаранне ці прысуд не быў несправядлівым, бо даволі часта маглі чалавека і прымусіць.

— Што ж ты не ўтрымаўся, родны? Ці ж можна з кулакамі (ці са зброяй) на сваіх кідацца? Дзе ж гэта бачылі? Няўжо нельга па-іншаму разабрацца? Глядзі, каб потым і галавы не страціць праз празмерны гнеў. На сёння табе лупцоўку добрую зададуць, бо без смертазабойства ўсё абышлося, а ў іншы раз... Не дарую, так і запамятай, ні ў якім разе не дарую.

Падаў чалавек да ног князя і пачынаў прасіць, не, не за тое, каб яго ўвогуле не каралі, а за тое, каб мудраму валадару Усявышні даў здароўя ды доўгіх гадоў жыцця.

Вельмі гневаўся князь, калі перад ім злачынца пачынаў выкручвацца і валіць усё на іншых людзей. Ведаў, што сапраўдны злодзей ці забойца перад ім на каленях поўзае, і гарлаў што было сілы:

— У турму яго! На хлеб, на ваду пасадзіць, каб зведаў, што такое гора людское, каб не думаў, што ён толькі правільна ўсё рабіў ды права меў іншых жыцця пазбаўляць! Хай і сам зведае, якія гэта пакуты! Не бачыў ні дзяцей малых, ні жанок, не задумваўся над гэтым! На ланцуг і да сцяны за кольцы прыбіць! Не месца такому сярод нас! Не месца!

Такіх выпадкаў, праўда, было надзвычай мала ў гэтым княстве, бо жыхары ведалі, што нават самае дробнае парушэнне закона не будзе незаўважана і той, хто гэта зрабіў, абавязкова будзе пакараны, таму і імкнуліся прытрымлівацца адвечнага ладу жыцця. Ды і яшчэ была прычына, якая стрымлівала,— суседнія княствы, дзе лютавалі паны і падпанкі, баяры ўсялякія, і там бедны чалавек ніколі і нікому не мог паскардзіцца на свайго зневажальніка ці крыўдзіцеля.

Вось таму радасцю сваёй ці бядою заўсёды дзяліліся з валадаром, і той дапамагаў, чым мог, а калі не

мог, то проста, па-чалавечаму спачуваў. Лягчэй любому станавілася ад такога спачування, супакойвалася ўсхваляванае сэрца.

Слава пра князя ішла далёка за ягоныя ўладанні. Суседскія бednякі зайздросцілі тым, хто апрацоўваў княжацкія землі, служыў у ягонай дружыне, выконваў розныя даручэнні. Але ім заставалася толькі зайздросціць, бо іхнія валадары былі зусім іншыя: злыя, сквапныя, бязлітасныя.

Думалі багацеі, дадумацца не маглі, што зрабіць для таго, каб сурова адплаціць спагадліваму князю, прымусіць быць гэткім самым, як і яны. Як толькі ні меркавалі, з кім толькі ні раіліся, якія толькі сродкі ні выбіралі — усё дарма. А валадар, даведаўшыся пра тое, што супраць яго суседзі нейкае зло задумваюць, пытаўся, пасміхваючыся, у сваіх верных дарадчыкаў і слуг:

— Што ўжо на гэты раз удумалі зрабіць мае нядобразычліўцы? Мінулы раз студні труцілі, то давялося прымусіць злоўленага багацея выпіць вадзічкі атручанай. На некаторы час супакоіліся. Але зайздрасць і злосць ім не дае спакойна жыць, сумленна людзьмі кіраваць, хочацца і мяне пад сябе падмяць. Не выйдзе, бо не з такога я цеста. Не выйдзе...

Слугі з адабрэннем адгукаліся:

— Сапраўды, валадар, трэба быць надта пільнымі, каб ненарокам не прапусціць чаго.

— Хто яго ведае,— згаджаўся князь,— здаецца, пра ўсё думаю, таму своечасова паспяваем прыняць адпаведныя захады, якія ні на што зводзяць зламысныя памкненні нашых суседзяў. Але дзякуй вам за падказку. Лепш асцерагацца, чым потым выпраўляць памылкі...

Але не толькі князь пастаянна радзіўся са сваімі сябрамі. Ягоныя ворагі таксама не сядзелі склаўшы рукі. Знайшлі нарэшце і яны выйсце, якое, як меркавалі, абавязкова прымусіць валадара здацца, скарыцца, прыняць іхнія ўмовы жыцця. Падзеі разгортваліся наступным чынам.

Нехта ўсё ж падказаў, што на дзікіх балотах, куды нават і не кожны звер зойдзе, жыве страшэнная баба-чараўніца. Такая злосная і хітрая, што падобнай і знайсці немагчыма. Кажуць, што ўласных дзяцей і тых жыцця пазбавіла, бо баялася, каб яны не завалодалі яе чарамі. Нікога і блізка да сябе не падпускала.

Дабрацца туды будзе надзвычай цяжка, нават цэлае войска можа адным разам у мерцвякоў ператварыць, але ўжо калі дойдзеш, то на ўсё знойдзеш адказ. Яшчэ падмовілі злыя людзі, што хоць варажбітка і жыве асобна, з людзьмі сувязей не падтрымлівае, але бляск залатовак любіць, што хочаш за гэта зробіць. Сталі думаць, як дабрацца да варажбіткі. Але ніхто не згаджаўся ісці на балоты, валіліся на калені і пачыналі галасіць:

— Лепей адразу пакарайце, чым там пакутніцкай смерцю канаць!

— Ды ніхто цябе караць смерцю і не збіраецца,— спрабавалі супакоіць бедалагу,— яшчэ ўзнагародзім добра. Не палохайся...

Але той не слухаў, крычаў сваё па-ранейшаму:

— Не пайду, хоць на кавалкі рэжце!

Загадвалі тады князі-зламыснікі адлупцаваць непаслухмянага ды новага добраахвотніка шукаць.

Неяк усё ж угаварылі пайсці на балоты аднаго з вартаўнікоў. Быў ён чалавекам старым, глухім, сваякоў не меў, таму і губляць не было чаго. Калі прывялі яго да гаспадара і пачалі горлы драць, каб давесці, чаго ад яго дабіваюцца, вартаўнік толькі палахліва галавою круціў ды паўтараў:

— Што? Што вы кажаце?

Раззлаваныя гаспадары ўсялякае ўжо гаварылі:

— Доўбня глухая!

— Але,— пагаджаўся той.

— Цяцера ты безгаловая!

— Але.

— Пень ты глухі!

— О, так, так...

Але ж крычалі, крычалі, а давялі, што хацелі. Як паказалі поўную шапку залатовак, то стары вартаўнік нібы галаву страціў:

— Пайду, толькі скажыце куды і калі трэба ў дарогу кіравацъ!

Узрадаваныя князі наперабой заталдычылі:

— На дзікае балота пойдзеш. Там трэба табе бабу-варажбітку адшукаць. Яна адна жыве, болей паблізу нікога няма. Людзі гавораць, што надта страшная, дык ты не палохайся, яна толькі з выгляду такая, а на самай справе зла амаль не чыніць нікому...

Спецыяльна так гаварылі, каб стары не спалохаўся ды не ўцёк, бо ўсю задуму тады сапсуе, на нішто яе равядзе.

Ды вартаўніка, відаць, нельга было ўжо нічым здзівіць. Ён толькі паглядваў на князёў ды разважаў, што гэта такое надарылася, калі такія вяльможныя людзі яго ўпрошваюць.

— А што ад яе браць ці што прасіць? Нездарма ж вы мяне туды пасылаеце. Каб справа была абы-якая, то грошай столькі не насыпалі б і не ўпрошвалі, а далі б мне ў спіну бізуноў, дый годзе на тым...

— Ты, стары, гавары, але не загаворвайся, бо зараз і сапраўды атрымаеш тое, што заслугоўваеш! — пагрозліва зашыпеў нехта з князёў, але яго перабілі астатнія:

— Чаго ўз'еўся? Што табе ад чалавека трэба? Хочаш, каб і гэты адмовіўся? Тады сам патопчаш на балота.

Згадка пра балота падзейнічала на крыкуна, нібы сцюдзёная вада.

— Чалавеча, калі дабярэшся, то папрасі ў яе за плату вялікую, вядома ж, чароўнага зелля ці чорнай вады, якая б на людзей хваробу невылечную насылала. Запомні і нічога не пераблытай...

— А што тут можна пераблытаць? — здзівіўся стары.— Чароўнага зелля ці чорнай вады, каб людзей са свету зводзіць. Вы ж нічога лепшага не прыдумаеце.

— Маўчы ўжо,— адмахнуліся ад вартаўніка злачынцы,— лепей збірайся ды джгай на балоты, каб праз пару дзён прынёс тое, што загадалі. Без яго не ўздумай вяртацца, бо і платы не атрымаеш, і галавы сваёй дурной пазбавішся!

— А як жа! — не ўтрымаўся распусны на язык вартаўнік. Але, тым не меней, сабраўся і, буркаючы нешта сабе пад нос, пайшоў. Князі ўздыхнулі з палёгкай. Цяпер ужо нядоўга будзе насміхацца над імі ганарлівы сусед, не будзе папікаць тым, што ён бедных шануе, а не карае дарма, як гэта робяць яны.

Вартаўніка не было, можа, пару тыдняў, затое... прыцягнуў з сабою бабу-варажбітку.

— Вось,— гаворыць,— вы крычалі, каб вам ці чароўнага зелля ці чорнай вады узяў, ды я па-іншаму зрабіў: дамовіўся з варажбіткай, што яна да вас прыйдзе і на месцы ўсё выканае. Але за гэта яна запатрабавала падвоеную плату. Сапраўды страшная баба! Якое хочаш ліха-гора ўчыніць і вокам не міргне, а што ўжо ў яе ўсялякай нечысці ў падпарадкаванні, то ўвесь свет запаланіць хапіла б!

— Будзе тваёй бабе падвоеная плата! — задаволена пацiралі князі рукі.— Няхай не палохаецца, не падманем. І табе яшчэ адну шапку залатовак зараз вось насыплем, каб бачыла, што мы тых, хто нам верна служыць і дапамагае, не забываем, шчодраю рукою ўзнагароджваем!

Ухапіў вартаўнік сваё золата і задаў лататы, толькі чорныя пяткі замільгацелі. Баяўся, відаць, каб не адабралі, бо добра мясцовыя норавы ведаў. Але не да яго зараз было гаспадарам. Яны варажбіткай займаліся.

— Скажы нам, баба-варажбітка, а ці можаш ты на адлегласці чалавека сапсаваць? Наслаць на яго які праклён?

— Лепей хваробу страшную,— не ўтрываўся і падказаў нехта з прысутных.— Больш надзейна будзе!

— Чаму ж не? Хіба гэта ўжо так складана? Заплаціце добра, то і праблем ніякіх не паўстане...

— Мы ж сказалі, што заплацім, што не пашкадуем нічога, толькі дапамажы нам, прымусь таго ганарліўца свой нораў прыцішыць.

— Добра,— пахіхікваючы, адказала баба-варажбітка і пачала рыхтавацца да сваёй страшнай справы-праявы.

А ў таго добрага і справядлівага князя была адзіная дачка. Ён душы не чуў у ёй са сваёй князёўнай, нарадавацца на яе не маглі. Цвіла дзяўчына, як вясна, свяцілася, як заранка, шчабятала, што тая ластаўка. Смяялася, як яснае сонейка, ніколі, як бацькі яе і вучылі, міма чужога гора абыякавай не праходзіла. Ужо ад спачування і то хвораму лягчэй станавілася, ці тым, у каго ў сям'і загінуў нехта з родных. Дзякавалі людзі князёўне, жадалі ёй самага найлепшага, бо адчувалі добрую, ласкавую душу.

Пайшла дзяўчына аднаго разу ў лес з мясцовымі дзяўчатамі. Вядома ж, што маладыя робяць, калі разам збяруцца. Яны не толькі нейкую працу выконваюць, але і песні спяваюць, смяюцца, вясёлыя ды смешныя здарэнні распавядаюць. Так і не надта стамляешся, і час хутчэй ляціць. У лесе асабліва прыгожа. Ягад многа, грыбоў. Нахіляюцца сяброўкі да зямлі, і неяк міжволі галасы іхнія пачынаюць словы песень выводзіць. Сама прырода людзей да гэтага нібы вымушае, сцвярджае, што ў такіх выпадках душа толькі спяваць і павінна.

Так і ў той раз было. Заспявалі прыгажуні, а лес галасы на ўсялякія лады перайначвае, нібы ў жмуркі

з імі гуляе. Нечакана дзяўчаты пачулі, як нехта ўскрыкнуў. Кінуліся яны на той крык і ўбачылі, што князёўна ляжыць на зямлі, а побач з ёю гарлачык перакулены і суніцы рассыпаныя. Пачалі яе вадой адпойваць — не ўздымае дзяўчына галавы і вачэй не расплюшчвае, толькі цяжка дыхае. Пачалі тады галасіць над ёю, некаторыя гаварылі, што, маўляў, гадзюка ўкусіла. Вырашылі пасляць найбольш хуткіх да палаца, а астатнім тут, ля сяброўкі, чакаць. Так і зрабілі. Сядзяць, слухаюць, як князёўна стогне, дапамагчы ж нічым не могуць. Вось дзе сапраўды бяда, калі ў чалавека рукі апускаюцца.

Праз кароткі тэрмін прымчаліся вершнікі і сам князь з імі. Усхапілі дзяўчыну, паміж коней на насілкі прымацавалі і да палаца рушылі. А валадар дык той нават на каня не сеў, а подбегам побач з дачкою крочыў і ўсё дзяўчат спрабаваў дапытацца, як жа ўсё здарылася. Толькі нічога канкрэтнага яны сказаць не маглі. Чулі, як ускрыкнула, а вось ад чаго?

Моцна захварэла дачка княжацкая. Ляжала дзень і ноч у ложку, узняцца не магла, змізарнела зусім. Плакалі бацькі, галасілі людзі, бо ведалі, што азначала гэта для князя. Ніхто не мог дапамагчы хворай. Якія ўжо толькі вешчуны і знахары ні шапталі — ніякай палёгкі. Ужо змірыліся ўсе з тым, што дзяўчына не выжыве і пойдзе да суровых нябесных багоў, якія даўно чакаюць яе душу. Прыводзілі заморскіх лекараў, недзе адшукалі іх верныя князевы сябры-памочнікі. Пра тых чужынцаў гаварылі, што яны мёртвых з пасцелі ўздымалі. Але і гэтыя людзі не выручылі гаспадара. Сядзелі сцішана ля хворай, уважліва ў яе твар углядаючыся, вадзіцы нейкай замоўленай піць давалі, зёлкі ўсялякія ў яе падмешвалі, і так на працягу трох дзён. Ды на чацвёрты ўсталі і моўчкі схілілі галовы перад валадаром. Потым адзін з лекараў сказаў:

— Прабач, княжа, але мы тут нічога прыдумаць не можам. Прабач, гаспадар, калі ласка, але мы бездапаможныя ў гэтым выпадку...

Нічога не сказаў благога ім валадар, толькі адвярнуўся і горка-горка заплакаў, нібы прадчуваў, што гэта яго апошняя надзея згасае. Ціхенька выйшлі з пакоя спрактыкаваныя лекары. Ведалі, як нялёгка зараз гэтаму чалавеку. Не ўпершыню ім было бачыць канаючых людзей.

Гора запанавала ва ўсім княстве. Ужо болей месяца нідзе нельга было пачуць вясёлага смеху, бо людзі лічылі, што нельга смяяцца і радавацца, калі ў іхняга валадара такое няшчасце.

Аднаго разу, зусім нечакана, прыйшоў да княжацкага палаца малады, загарэлы да чарнаты падарожнік і запатрабаваў, каб яго правялі да гаспадаровай дачкі. Без асаблівага спадзявання, але ўсё ж хлопца завялі да князёўны. Паглядзеў ён уважліва на хворую, пахадзіў вакол ложка, пашаптаў нешта і потым гучна мовіў князю:

— Заўтра, княжа, устане яна на ногі і з гэтага дня пачне набірацца сілы. Я ёй яшчэ вады з крыніцы ранічай прынясу,— сказаў так і пайшоў з палаца міма ашаломленага валадара і ягоных слуг.

І дзіва! Назаўтра дзяўчына сапраўды паспрабавала ўзняцца, а калі прыйшоў вандроўнік і даў ёй напіцца з карца чысцюткай, халоднай вадзіцы, то і ўвогуле павесялела і нават усміхнулася.

Узрадаваліся гаспадары, пачалі ў падарожнага дапытвацца:

— Прасі, родны, што хочаш, хоць паўкняства — усё табе адразу аддамо, бо ты нас з бяды нечуванай выручыў, дапамог гэтак...

— Не, княжа, людзям трэба за так проста дапамагаць. Гэта суседзі твае лютыя бабу-варажбітку злую запрасілі ў нячыстай справе дапамагчы. Вось з каго я плату садраў бы, каб людзям гора болей не чынілі! А з вас — не, нічога не хачу.

Тады князь зрабіў наступнае. Як дачка ягоная папраўілася, ён аддаў яе замуж за хлопца і загадаў на недалёкім ад замка ўзгорку пабудаваць прасторны палац, каб было дзе ім жыць ды дзяцей гадаваць. Маці, у сваю чаргу, папрасіла людзей радавацца, весяліцца цэлы месяц запар. Так яно і адбылося. Вось адкуль Радашковічы, ад радавацца.

## БЕНІЦА

Надзвычай даўно вось што здарылася ў гэтых мясцінах.

Жыў тут адзін памешчык. За гаспадаркай не сачыў увогуле, адзіная ўцеха была — добра напіцца ды з сябрукамі на што-небудзь закласціся. На гэта мастак

быў. Як загарыцца, як пачне сцвярджаць, што ў яго ўсё самае найлепшае ва ўсім наваколлі, то і астатніх сваім запалам заразіць, і тыя давай закладвацца. І што ж вы думаеце? Даволі часта пан на дурнога выйграваў. Шанцавала таму лайдаку, адным словам.

Распавядалі пра такі выпадак. Пілі аднойчы паны на ўскрайку лесу. А там месца было дужа прыгожае: высокія дубы, мноства птушак, а побач — крынічка цвірчыць-пераліваецца, пра нешта сваё прыгожа спявае. Сядзяць памешчыкі, гарэлку жлукцяць і гаворкі ўсялякія вядуць. Паспрабавалі было спяваць, але лянота напала. Тады яны, па старой завядзёнцы, давай выхваляцца адзін перад адным. Божачкі, чаго толькі не гаварылі, чаго толькі не крычалі. Нарэшце наш пан ўсё-ткі перакрычаў астатніх і выгукнуў:

— Прашу гасцей крыху суцішыцца! Усё добра, што вы гамоніце! Усё добра! Але такое ў кожнага ёсць, і няма тут нічога незвычайнага. А вось у мяне...

— Што ў пана? — адразу суцішыліся астатнія, ведаючы, што гаспадар нешта ўлепіць,— што ў вас такое ёсць цікавае?

— О, ёсць такое... самае важнае ў жыцці паважаючага сябе памешчыка!

— То не цягніце ўжо, будзьце ласкавы, скажыце, надта просім,— неяк нібыта пакорліва зашапацелі астатнія.

— Стрэльба ў мяне ёсць! — выпаліў пан і далей нічога не мог паведаміць, бо выбухнуў такі рогат, што ажно старыя дубы ад неспадзеўкі галовы ўверх ускінулі і спалохана захісталі голлем.

— Стрэльба ў яго ёсць! Ды ў нас у кожнага па дзесятку стрэльбаў — і то не пахваляемся! А на якім сур'ёзе выдаў!

— Хіба што залатая, тады іншая справа,— паддакнуў нехта, і зноў бухнуў громам смех.

— Прашу не надта выскальвацца,— працягваў, перачакаўшы прыступ смеху, памешчык.— Гэта незвычайная стрэльба! Не думайце абы-чаго. Справа ў тым, што я з яе ніколі промаху не меў! Куды скажаце — туды і патраплю! Вось як!

Тут ужо думкі падзяліліся. Адны не верылі ў такі цуд, каб стрэльба заўсёды трапна страляла, іншыя — наадварот, цікавіліся, што ж там за дзіва такое. Пакрычалі крыху і прыйшлі да агульнага выніку:

— То няхай пан, калі ўжо так усіх захапіў, і сапраўды стрэльбу прынясе ды пакажа сваю трапнасць незвычайную. Усім будзе цікава глянуць.

А быў сярод іх такі таўшчэразны пан, што нагавіцы ў яго нагадвалі цэлую капу. Дык той ускрыкнуў, задаволена сябе па жываце паляпваючы:

— Я сам бегаць правяраць буду, каб ніхто не казаў, што ў нечым некага надурылі. Усе тут ведаюць, што я хлусіць не люблю і круціць нікому не дазволю! Давай, гаспадар, страляй!

На што гаспадар адказаў:

— Зараз, госцейкі, толькі слугу за стрэльбай у маёнтак пашлю, тут недалёка, ён хутка прыджгае. Не хвалюйцеся, усім пакажу, што і да чаго.

Вершнік з месца памчаў так, нібыта за ім гналася цэлая гайня ваўкоў, і гэты момант быў апошнім у яго ным жыцці.

Паны па-ранейшаму сядзелі ля вогнішча і папівалі дарагія напіткі. Меркавалі, куды лепей параіць пану страляць, каб цяжэй было патрапіць. Нехта гаварыў, каб у камень, які тырчаў невялічкім акрайчыкам метраў, можа, за сотню. Другі голас даводзіў, што лепей будзе па птушках, якія на той момант будуць тут праляцаць, іншыя прапаноўвалі павесіць што-небудзь на дрэва і адлічыць пэўную адлегласць. Потым нехта задраў галаву і ўбачыў на самай верхавіне бліжэйшага дуба кубло, дзе сядзелі, зрэдку выторкваючы галовы, нейкія птушкі.

— А што, калі ў гэтую мішэнь пан-гаспадар лупіць будзе?

Памешчык нават не паглядзеў, куды паказвалі, а паблажліва адказаў:

— Мне ўсё роўна, вы самі дамаўляйцеся. Зараз стрэльбу прывязуць, тады вам і дакажу, што не хлушу і не пахваляюся! Вызначайце, пакуль ёсць час! А я адпачну, бо трэба вочы ды рукі супакоіць, каб не падвялі.

Госці ўжо глядзелі на яго з пэўнай павагай, відаць, ім і сапраўды падалося, што чалавек гэты вялікі майстра ў той справе, пра якую толькі што горача спрачаліся, але адступаць ужо было позна. Усіх, праўда, заспакойваў той таўшчэразны пан, звалі якога Бенік:

— Не хвалюйцеся, шаноўныя, усё будзе сумленна і з гонарам выканана, іншага я не дапушчу. Запэўніваю вас у гэтым! Не хвалюйцеся! Падману не дапушчу!

Неўзабаве прымчаўся вершнік на ўзмыленым кані і працягнуў гаспадару стрэльбу. Нельга было сказаць, каб сваім выглядам яна неяк адрознівалася ад мноства іншых. Стрэльба як стрэльба. Усе глядзелі і сумняваліся зараз ужо, што дарма спрачаліся, бо нічога выдатнага не будзе. Іхнія разважанні супыніў голас гаспадара:

— То куды, панове, загадаеце страляць, каб даказаць вам вернасць слоў? Паказвайце, не саромейцеся. На сотню крокаў любую мішэнь саб'ю.

— То што, шаноўныя, загадаем пану-гаспадару ў гняздо бабахаць? — пачуўся нейчы голас.— І відаць добра будзе, і навідавоку мішэнь?

— Няхай туды пан і б'е,— пагадзіліся астатнія.

Сказалі так і сталі ўважліва сачыць за тым, як стралок рыхтаваўся да стрэлу. А той нібы варажыў ля сваёй стрэльбы. Нешта паплёўваў, пашэптваў, пазіраў у бок мішэні. Нарэшце важна адставіў нагу ўбок і пачаў цэліцца. Здалося, што нават лес прыцішыў сваю шматгалосую гамонку і сачыў за падзеяй. Хвілін колькі пан цэліўся. Некаторыя з прысутных ужо сталі праяўляць нецярплівасць, але іх торкалі пад бакі, і яны заціхалі. Стрэл грымнуў нечакана і быў падобны грому сярод яснага неба. Усе ажно прыселі і пачалі спалохана азірацца, а ў паветры павіс густы слуп дыму, з-за якога нельга было нічога ўбачыць. Паступова ён пачаў асядаць, і прысутным адкрылася даволі цікавая карціна — у паветры, акрамя дыму, лёталі нейкія дробныя анучкі, воўна ці то ўжо кудзеля, шматкі паперы і яшчэ неапазнаныя прадметы. Памешчыкі зірнулі на верх дуба, туды, куды цэліўся пан-гаспадар. Гняздо вісела на сваім месцы, і раз-пораз з яго выторкваліся галовы птушак, быццам бы пахваляючыся, што нічога, маўляў, не баімся!

Нехта не ўтрымаўся і крэкнуў:

— Вось табе і без промаху! Толькі дыму многа ды нейкае ашмоцце лётае ў паветры, а гняздо як было, так і ёсць! Не трапіў у яго.

— А вось і трапіў! — выступіў наперад стралок.— Як жа вы адсюль можаце ўбачыць малюсенькую дзюрачку? Га?

Госці сціхлі, бо гаспадар меў рацыю. Тады выступіў пан Бенік:

— Падсадзіце мяне, панове, да ніжняга голля, я

ўскараскаюся на дрэва і пагляджу. Тады і даведаемся праўду!

— Ды куды пан палезе, яшчэ дуб зваліцца,— пажартаваў нехта, але гэты тон не быў зараз успрыняты.

Агульнымі намаганнямі дапамаглі Беніку дацягнуцца і закінуць ногі на ніжняе голле, і ён палез. Залез ужо амаль да самай верхавіны. Усё пагрозліва патрэсквала, але памешчык мужна лез да мэты. І тут — здаравенная дубовая галюка зламалася і разам з правяраючым паляцела долу. «Гуп» — разнеслася па наваколлі, і з цела пана Беніка вылецела душа.

Пазней на месцы смерці памешчыка ўкапалі высокі белы слуп, і хоць цела пахавалі на могілках, але гэты ўзлесак у народзе сталі зваць Бенікавай магілай. Потым тут людзі сталі жыць, і калі ішлі да іх госці, то на пытанні, куды кіруюць, адказвалі звычайна:

— Ды пойдзем у Беніцу, да сяброў!

Так і сталася з тых часоў.

## КРЫНІЦА

З каханнем светлым і чыстым звязана назва нашай вёскі. Даўно падзея адбылася, але дагэтуль людзі яе памятаюць і адзін аднаму перадаюць, каб і надалей жыла, не памірала.

Жыла ў вёсцы прыгожая дзяўчына Мальвіна. Казалі, што з шляхецкага роду была, але бацькі яе надта збяднелі і паступова ператварыліся ў гэткіх жа гаротнікаў-вяскоўцаў, як і астатнія сяляне. З раніцы да позняга вечара на полі працавала ўся іхняя сямейка, адпачынку амаль не ведалі, акрамя святаў боскіх, калі нельга было шчыраваць. Але і ў такія моманты бацькі прыгажуні імкнуліся ў першую чаргу даваць спачынак не стомленаму целу, а душы. Справа ў тым, што любілі ўсе — і старэйшыя, і маладзейшыя — хадзіць куды-небудзь на ўскраек лесу ці на зялёны луг і там пасядзець, пагаманіць, гледзячы на тое, як адпачывае сама маці прырода. А то песню зычную зацягвалі і так ужо стараліся-выводзілі, што ўсё навокал, здавалася, заціхала, услухоўваючыся.

У той жа самай вёсцы жыў хлопец Мікола. Не тое каб прыгажун ці там нейкі надзвычайны майстар,

але здаравенны і адчайны, мог адзін супраць дзесяцярых выскачыць, не збаяўся б. Як пра яго казалі — сапраўдны асілак. Воз, гружаны гноем, падымаў жартуючы адной рукой за заднія колы. Конік пнеццацягне, а Мікола, пасміхаючыся, без ніякага злога намеру, проста, каб людзей крыху пасмяшыць ды даць ім перадыхнуць ад цяжкай працы, так вось жартуе.

Неяк яны ўбачыліся на вечарынцы. Баяліся спачатку адкрыта адзін аднаму ў вочы глянуць, але потым справа ўвайшла ў звыклае русла — пакахаліся маладыя. Цяпер ужо і дня не маглі пражыць, каб не спаткацца. І напрацуюцца так, што, здавалася, ногі ледзьве сунуць, а ўсё роўна хоць на хвіліну прыбягуць да старой вярбы, дзе было іхняе самае ўлюбёнае месца спатканняў. Сустрэнуцца, пакуль намілуюцца, то і сонейка свае агністыя косы пачынае па наваколлі распускаць. Бягуць дахаты патаемна, каб лішнія вочы не бачылі ды потым костачкі іхнія не перабіралі дарма. А пастухі ўжо жывёлу на пашу выганяюць, гаспадыні па панадворках шастаюць. Перахопяць што-небудзь дома маладыя і разам з астатнімі на працу кіруюць. Канешне, бачылі бацькі, што такім працаўнікам хоць крышку адпачыць трэба, і, калі праца не надта цяжкая і не тэрміновая была, казалі:

— Нешта нам пасядзець хочацца. Можа, і сапраўды адпачыць гадзіну-другую, а потым, да вечара, час яшчэ будзе, зробім усё. Пайшлі, прыляжам.

Так і ратаваліся. Мальвініны старыя ведалі, што яна з Міколам сустракаецца, і не былі супраць. Наадварот, ведалі, што за такім мужыком дачка не памрэ з голаду і будзе адчуваць сябе ў любой справе, нібы за печчу, там табе і цёпла, і зацішна. Чакалі, пакуль самі маладыя паведамяць пра каханне ды папросяць дазволу сватоў засылаць, вяселле гуляць. Яны чакалі, а хлопец з дзеўчынай гулялі. Так заўсёды вялося, не яны першыя. Ды не адчувалі закаханыя, што бяда чорная ўжо за імі следам ходзіць, зручны выпадак выбірае, каб накінуцца знянацку.

І бяда гэтая — эканом. Ён кіраваў іхняй вёскай ад імя памешчыка, у якога было гэтулькі зямлі, што, можа, і за тыдзень на кані не аб'ехаў бы. Не стары быў чалавек, Міколаў аднагодак, але вылучаўся сярод вяскоўцаў тым, што любога за капейку жывым закапаў бы, нават калі б маці, бацька ці родныя браты ці

сестры перад ім стаялі. Толькі б загадалі ды заплацілі добра.

Так гэты Грышка і эканомам стаў. На людскім горы вылез у высокае начальства. Здарылася так, што старога эканома знайшлі ля ракі з праломленым чэрапам. Усё так бы і закончылася. Злы надта быў, біў-катаваў людзей так, што валасы дыбарам уставалі. Не раз папярэджвалі яго сяляне, што атрымае за ўсё, але той у адказ катаваў сваіх вяскоўцаў яшчэ часцей і бязлітасней. І вось аднаго летняга ранку яго выпадкова адшукалі ў густым лазовым кустоўі. Можа, і не напаролія б, ды смярдзець труп пачаў. Не здагадаліся тыя, хто выканаў прысуд злачынцу, закапаць ці ўтапіць гада.

Пан, надзіва, не надта стараўся адшукаць тых, хто гэта зрабіў, ці, можа, якімі больш важнымі справамі быў заняты. Тут Грышка і паказаў сябе. Прапаў ён з дома раптоўна. Кінуліся бацькі шукаць, браты з сёстрамі ўсё наваколле на ногі паставілі. Не, няма хлопца, нібы пад зямлю пайшоў. Спачатку падумалі, што яго, можа, якія ліхія людзі напаткалі ды на той свет справадзілі. Галасілі жанчыны, спачувалі суседзі, ды аказалася, што дарма хваляваліся.

Грышка нікуды не прапаў, а пабег да... пана. Два дні і дзве ночы дабіраўся да палаца, у якім жыў памешчык. Спачатку яго не пускалі туды, але загарлаў не сваім голасам падарожны:

— Да пана мне трэба тэрмінова! Да пана! Вядзіце хутчэй, бо справа надзвычай цяжкая! Вядзіце, не марудзьце, бо пан вам тады бубну выб'е! Папрыгаеце не так, як зараз, а як рыба на патэльні!

Пераглянуліся паміж сабою služкі дый падумалі: «А раптам і сапраўды нешта важнае, а мы затрымаем, то самі ж і паплацімся...» Таму пачалі здалёк, але ўжо больш ласкава:

— Ну навошта крычаць? Навошта адразу палохаць? Калі нешта неадкладнае, то скажы нам, а мы ўжо пану нашаму і перадамо. Так і быць, раз справа не трывае.

Ды хлопец і слухаць іншага не жадаў:

— Вядзіце да пана хутчэй, штосьці маю яму сказаць!

Пачакалі яшчэ колькі хвілін памагатыя і пакрочылі з падарожным у палац. Там памешчыку перадалі, што да яго нейкі хлопец ірвецца.

— Сюды яго давайце! Што ён там мае сказаць?!

— Пане,— упаў Грышка перад гаспадаром на калені,— хачу распавесці табе, хто твайго вернага эканома ў нашай вёсцы жыцця пазбавіў.

Выпаліў такое хлопец і прыціх, сочыць уважліва, што гаспадар далей рабіць будзе. А той пахадзіў-пахадзіў перад ім і кажа:

— Гавары, чалавеча, хто гэтакае злачынства ўчыніў? Узнагароджу, калі праўду скажаш, не забуду тваёй паслугі...

— Гэта Мартын з Санькам яго забілі. Нашы вяскоўцы. Бедныя яны, і іх эканом прымушаў многа працаваць на вашу светласць. Яны яго пастаянна і раней запалохвалі, а тут вырашылі прыкончыць. Падцікавілі ля ракі і гопнулі даўбешкаю па галаве. Я якраз у карчах сядзеў, рыбу там меркаваўся лавіць. Так што ўсё бачыў.

— Значыцца так,— сказаў пан,— павядзеш маіх служак і пакажаш тых злачынцаў. Яны будуць пакараны, а цябе прызначаю на месца памерлага. Глядзі не шкадуй нікога, нікому ніякай паслабкі не давай, тады яшчэ і грошы плаціць стану, зажывеш як чалавек, бяды-гора ведаць не будзеш.

— Ой, дзякуй, ваша светласць,— пакаціўся з радасці па бліскучай падлозе Грышка,— ужо я апраўдаю ваш давер... Ужо я ім пакажу, як трэба выконваць панскія загады!..

Калі ў вёску прымчалі панскія служкі — ніхто і не заўважыў. Здарылася ўсё нечакана. Схапілі Мартына з Санькам і пачалі катаваць на вачах у сагнаных у вялікі натоўп аднавяскоўцаў. Сяляне ў злачынстве так і не прызналіся. Сканалі, але нічога не сказалі. Тады адзін з панскіх служкаў галасна загарлаў:

— Слухай, быдла, вось вам новы эканом! Яго вы павінны слухаць і выконваць ягоныя загады яшчэ стараннеи і больш шчыра, чым раней! Яму пан надаў такія паўнамоцтвы, што любога з вас можа смерцю пакараць за непаслухмянства!

Так сказаў і на Грышку паказвае. А той адразу неяк ажно перайначыўся: выцягнуўся ўвесь, губы надзьмуў і ніякага спачування ў вачах не відаць, што вось тут забілі двух чалавек. Стаіць ды з ганку на сялян пагардліва пазірае.

Моўчкі разышліся людзі па хатах. Не паспелі яшчэ добра спаць улегчыся, а ўжо Грышка на вуліцы крычыць:

— Уставайце! Уставайце! Уставайце! Час на працу! Калі хто не выйдзе зараз, то закатую!

Так і пачаў кіраваць вясковец, ды за пару гадоў да таго ўз'еўся, што вылітым зверам стаў. Нікога і слухаць не жадаў, нікога не пашкадаваў, ні над кім не зжаліўся. Хаціну сабе такую адгрукаў, што далёка не кожны пан меў такія пакоі. Грошай, багацця ўсялякага нахапаў, што, можа, і не ведаў дакладна, колькі ў яго чаго ёсць.

Вырашыў эканом жаніцца. Спачатку паехаў па мясцовых панах-суседзях, але тыя, хоць і бедныя, аднак за простага мужыка аддаваць сваіх дачок не жадалі. Тады ён запрыкмеціў Мальвіну і давай да яе падкочвацца. Дзяўчына адмовіла, але эканом і ўвагі не звярнуў на тое, што яна была супраць. Далей сабе хадзіў. Мальвіна сказала пра гэта Міколу, і той перастрэў панскага служку, калі той ехаў на далёкае поле. Забіць не забіў, але добра напалохаў злыдня. Звалок з каня і ўсяго адзін раз так улупіў Грышку пад азадак сваім вялізным ботам, што той прыляцеў дамоў значна хутчэй, чым туды ж прымчаў конік.

Але ад сваёй задумы эканом, тым не меней, не адмовіўся. Вырашыў пайсці іншым шляхам і амаль дасягнуў мэты. Загадаў Міколу і яшчэ некалькім вяскоўцам везці ў панскі палац нейкі груз, а сам кінуўся да Мальвіны. Згвалціць хацеў, але дзяўчына неяк вырвалася і пабегла. Грышка за ёю. Бяжыць да лесу, уцякае, але і злыдзень не адстае. Вось ужо, здаецца, рукою за валасы ўхопіць, ды то на камень які наступіць — паслізнецца, то якой галькай яму па твары дрэва лупяне. Адчувае дзяўчына, што сіла апошняя адыходзіць, і супынілася. Стала, глянула на Грышку — і той каменем шэрым стаў, хацела сама з месца зрушыцца, але не здолела — крынічкаю расплылася.

Прыехаў вечарам праз колькі дзён Мікола, а яму і паведамілі пра такое гора. Пабег хлопец да той крынічкі і ўкленчыў перад ёю. І дзіва — ператварыўся сам у магутны дуб.

Так яно колькі стагоддзяў і было: цякла крынічка, поруч рос-шапацеў асілак-дуб, а непадалёку ляжаў замшэлы валун. З цягам часу дрэва ўпала, крынічка заплыла, а камень па-ранейшаму перашкаджаў людзям. І хто ні ішоў міма яго — абавязкова пляваў у бок валуна:

— Цьфу, каб ты спрах!

Потым і камень той людзі разбілі, а вось назва, нібы памяць светлая, засталася — Крыніца.

## ЛЕБЕДЗЕВА

Мне мой прадзед казаў, што самая першая назва нашай вёскі была Лебедзева Дно.

Вось як усё адбывалася. Быццам бы ў далёкія часіны на месцы вёскі Лебедзева, між тых жа пагоркаў, што і сёння ўзвышаюцца, разлілося вялізнае, агромністае возера. Людзі, што жылі на яго прыгожых, непаўторных берагах, лавілі ў возеры рыбу (а яе там было мноства), палявалі ў густых чаратах паабапал берагоў на качак, касілі на зялёных лугах буйныя травы, якія раслі гэтак хутка, што іх не паспявалі скошваць і зграбаць, як трэба было пачынаць усё па-новаму. Выцякала з гэтага возера тая ж рачулка, якая і зараз у нас працякае, ды і назву яна аналагічную мела — Невежа. Адзінае, чым ад сённяшняй адрознівалася,— глыбінёю і чысцінёю. А на яе паўнаводных берагах стаялі шматлікія багатыя вёскі ды хутары. Добра жылося ў іх людзям, таму што ўсяго ставала, не было ніякіх цяжкасцей ні з ежай, ні з будаўнічым матэрыялам.

Само возера называлася Лебедзевым таму, што пасярэдзіне яго, на востраве, парослым высокім, густым лесам, здаўна жылі лебедзі. Ляцелі на зіму ў далёкія паўднёвыя краіны, знікалі на час віхур і завей, а калі сонца добра прыгравала, вярталіся дамоў. Здзіўляліся мясцовыя жыхары, як гэта яны знаходзілі дарогу назад з гэткіх далёкіх краін. Потым пачалі сцвярджаць, што лебедзі, відаць, валодаюць розумам і разумеюць гаворку вяскоўцаў. Шанавалі іх заўсёды мясцовыя жыхары, нікому не давалі крыўдзіць. Нават самыя зацятыя паляўнічыя не чапалі, не палохалі гордых птушак. Усе ведалі, што жывыя істоты на зямлі — ад Бога, і калі пайсці насуперак ягонай волі, то будзеш жорстка пакараны і не будзе табе нідзе даравання — ні на гэтым свеце, ні на тым.

Некаторыя гаварылі, нібыта лебедзі ахоўваюць возера, тайна ад людзей будуюць і рамантуюць схаваныя пад вадою плаціны і дамбы, таму вада ніколі і не выходзіць з берагоў, не затапляе навакольныя паселішчы, трымаецца між пагоркаў. У адваротным выпад-

ку гора такое абрынalася б на местачкоўцаў кожную вясну ды восень.

Ды толькі не ўсе гэтак думалі, бо заўсёды знойдзецца нехта, каму не даспадобы агульнапрынятае. Такі чалавек жыў і ў адной з бліжэйшых вёсак. Звалі яго Маркам. Недзе ён прачуў, што лебедзі не толькі дамбы рамантуюць, паднаўляюць разбураныя, але і каштоўнасці незлічоныя з дна возера намываюць ды перахоўваюць у падводных сховішчах. Вось зрабіць бы так, каб вада сышла і яны аказаліся на паверхні! Бяры сабе голымі рукамі, багацей!

Сядзіць Марка ў напаўразбуранай хаце, бо лайдак незвычайны быў, і марыць пра тое, як вызначыць тайну возера. Да такога надумаецца, што ўжо і спаць не можа, бо золата перад вачамі свеціць, спаць перашкаджае. Бачыць ён сябе самым багатым чалавекам у наваколлі, перад ім усе гнуцца, на яго ўсе працуюць не разгінаючыся. Кіраваць лёсамі іншых — вось да чаго імкнуўся гэты злыдзень.

Знайшоў недзе старую варажбітку, падкаціўся да яе і пачаў дапытвацца, як мэты дасягнуць. Але ж і тая не дурная была, дацяміла, што і ёй можна выгоду вялікую мець, і патрабавала:

— Калі будзе мне палова таго, што ты хочаш прыхапіць, то дапамагу, а калі не, то шукай сабе іншую таварышку, за так не збіраюся і рота адкрываць.

Павагаўся-павагаўся Марка ды і гаворыць:

— Хітрая ты, старая, але нічога не папішаш, трэба мне саступіць, бо без цябе нічога не атрымаецца.

Закірхала варажбітка ў адказ, запляскала ў ладкі:

— Вось цяпер іншая справа, вось цяпер іншая. Цяпер дапамагу. Слухай толькі ўважліва.

Марка крутнуўся і пасунуўся бліжэй да старой. Уторкнуўся немігаючым позіркам у яе твар:

— Гавары ўжо, раз так справа пайшла, гавары. Не цягні з мяне душу. Няўжо табе падабаецца быць беднай і каб табою пастаянна папікалі сёстры, кажучы, што ты вядзьмарка?.. Разбагацеем — то ў нагах поўзаць будуць, каб крышку і ім перакінулі. Ды гэта ўжо іншая справа. Сама будзеш вырашаць. Гавары, што трэба рабіць і да каго падыходзіць.

— Трэба выбрацца на возера глыбокай ноччу. Падабраць такую часіну, каб на небе ні зорачкі не было, каб месяц свае рогі не паказваў, каб ніхто не бачыў, як ты выбірацца будзеш, бо могуць прасачыць...

— Гэтаму не вучы — ведаю і без цябе.

— Трэба знайсці,— як ні ў чым не бывала працягвала варажбітка,— самага галоўнага лебедзя.

— А як яго адрозніць? Яны ж усе такія вялікія ды белыя...

— У яго невялічкая карона на галаве будзе. Агністая. Ці то з золата, ці то з якога каменя каштоўнага.

— Вось як...

— Не перабівай, слухай далей. Калі сустрэнеш гэтага лебедзя, то забі яго і закапай, а сабе прыхапі толькі карону, яна і падкажа, дзе каштоўнасці незлічоныя схаваны. Пабярэш іх, ды і мне палову не забудзь.

— Палову-то я не забуду аддаць, але дзе гарантыя, што служкі лебедзевы мяне не схопяць і жыцця не пазбавяць? Іх жа там многа.

— Ніякіх служкаў у лебедзя няма. Ён прызвычаіўся да таго, што людзі ні яго, ні ягоных падначаленых ніколі не craналі, таму і адчувае сябе ў поўнай небяспецы.

— Гэта добра... Гэта нібы пад заказ...

Задаволеныя, хаўруснікі разышліся. Варажбітка падалася ў сваю напаўзямлянку, якую ніхто ў наваколлі і хацінай не называў, а Марка кінуўся бегчы дадому, бо імкнуўся як мага хутчэй падрыхтаваць усялякае начынне, неабходнае ў такой адказнай справе: мяхі, сякеру, рыдлёўку ды ёмкую даўбешку.

Доўга давялося чакаць сквапнаму селяніну. Толькі ноч падбярэ і з вечара, здаецца, усё навокал змрокам зацягнецца, як аднекуль раптоўна наляціць моцны вецер і разнясе хмары, даючы магчымасць валадарыць ясным зоркам. Разоў колькі Марка ўжо і з хаціны з начыннем вылазіў, ды яго сустракалі на паўдарозе вясковыя дзецюкі з дзяўчатамі. Тады ўжо столькі крыку і рогату было, што ні пра якое золата і гаворкі нельга было весці.

— Куды гэта ты, дзядзька, выбраўся гэтак рана? — пытаўся хто-небудзь з найбольш смелых і адчайных.— Яшчэ ж і сонейка закаціцца добра не паспела, а ты ўжо ў поле шчыраваць прэшся, ды яшчэ прычындалля ўсялякага напіхаў, нібы на каня, не раўнуючы...

Астатнія ажно дрыгалі нагамі ад няўцерпнага рогату. Марка злаваўся, а моладзі гэтага толькі і трэба было.

— Дык, можа, дзядзька, ты скарбы выбраўся шу-

каць? То сёння ж не самы лепшы дзень. Да Купалля вунь як далёка...

— А можа, дзядзька, ты сваіх блох у мяхах па начах цягаеш ды выкідаеш дзе на балота?

Здавалася, што ад вясёлага і дружнага смеху нават зоркі ў небе станавіліся ярчэйшымі і пазіралі на тое, што адбывалася ў наваколлі.

— Не чапайце мяне, не чапайце. Я вам нічога благога не зрабіў,— даходзіў ажно да крыку Марка,— чаго да мяне чапляецеся?!

— Не зрабіў, дык зробіш, ты дзядзька здольны! — бомкнуў нехта.

Але ўжо, відаць, і маладым надакучыла злаваць гэтага ваўкаватага чалавека, таму, засмяяўшыся, беглі далей, пакінуўшы Марку аднаго.

Пасля такіх спатканняў сквапны чалавек надзвычай доўга адыходзіў, яму здавалася, што вяскоўцы нешта прачулі і сочаць за ім. Хадзіў, прыслухоўваўся ды прыглядаўся і, пераканаўшыся ў тым, што дарэмна турбаваўся, пачынаў збірацца зноў. Адна з такіх спроб аказалася для Марка ўдалай.

Выйшаў ён тады з хаціны і паджгаў да возера не па дарозе, а між кустоўя, хаваючыся і прыціскаючыся, нібы які злодзей. Пройдзе, спыніцца і надалей кіруе. Можа, з гадзіну прабіраўся, а там ужо смялей пайшоў. У густым чароце ў селяніна загадзя быў прыхаваны човен. Сеў ён у яго і стаіўся. Стаіўся, бо падалося, што ў кустоўі нешта зашамацела і пачало набліжацца да берага. Нават даўбешку ў рукі ўхапіў, каб было чым бараніцца, але гэта была ці то птушка, ці то звер нейкі.

Хвалі плёскалі ў човен ласкава, ціхенька, нібы падбадзёрваючы Марка на злую справу. Доўга ён веславаў, пакуль да вострава даплыў. Возера тое надта шырокае было. Вылез, а далей ісці баіцца, ногі ад зямлі адарваць не можа. Тут як каркне крумкач, то Марка ажно ў ваду назад палез. Стаіць, зубамі ляскоча, але золата спакою не дае. Гэта ж калі назад павернеш, то болей такога выпадку можа і не надарыцца. З рук уласнае шчасце назаўсёды выпусціш.

Пераадолеў страх і сумненні і падаўся наперад. Ідзе, а навокал яго белыя птушкі-лебедзі спяць. І столькі іх многа, што зямля белаю здаецца. Глядзіць злыдзень пільна, каб не прапусціць самага галоўнага — агністай кароны на галаве ў важака. Але пакуль не траплялася

яму такое дзіва. Можа, гадзін пару запар лазіў Марка па востраве, ужо зусім асмялеў, птушак лупцаваў так, што тыя толькі вухкалі і ніяк не маглі зразумець, што адбываецца навокал, бо раней людзі іх ніколі не турбавалі, адносіліся з павагай і пашанай.

Колькі Марка ні ходзіць, колькі ні злуецца, а галоўнага лебедзя знайсці не можа. Прытаміўся, сеў адпачыць на пагорачак, галаву апусціў, зусім замаркоціўся. «Вось,— думае,— столькі чакаў, столькі спадзяваўся, усяго перажыў-ператрываў, а ў самы апошні момант ад мяне шчасце і адвярнулася. Схаваўся недзе важак, і ніяк не магу яго адшукаць...» Устаў і сабраўся ўжо дамоў ісці, ды неяк выпадкова зірнуў на вялікі камень, які выторкваўся з кустоўя, і аслупянеў. На ім сядзеў лебядзіны валадар, бо ў яго на галаве свяцілася-пераліваласяся карона. Ухапіў тады Марка сваю даўбешку ямчэй і падаўся да птушкі. Падкраўся ціхенька і лупянуў з усяе сілы па галаве важака, той і піскнуць не паспеў, толькі скрыдлы распусціў і бухнуўся долу. Узяў сквапны чалавек карону — і ўцякаць з вострава. Птушкі папрачыналіся, галосяць, навокал жалобны стогн стаіць, а ён нічога болей не заўважае — бяжыць, дый годзе, да чоўна.

Пасля таго лебедзі адразу ж пакінулі возера. А праз год ці два прагнілі схаваныя ў чароце і пад вадой лебядзіныя дамбы. Спатрэбілася ўсяго толькі тры дні, каб вада назаўсёды выцекла са сваёй катлавіны-чашы, сплыла некуды далёка ў вялікую раку. Шмат было тады гора-бяды. Па берагах Нявежы пазносіла хаты, змыла з палеткаў шчодры ўраджай, патапіла жывёлу, яна так з пашы дамоў і не паспела папрыходзіць.

Прайшоў час. Людзі забыліся на тую бяду і пачалі зноў сяліцца ў зручным зацішку — на дне былога Лебядзінага возера. Таму новую сялібу і называлі спачатку Лебедзевым Дном. Пазней, калі ўжо ніхто не памятаў аб возеры, па дне якога цяпер праходзіла вуліца і стаялі хаты, захавалася ад назвы толькі першая яго частка — Лебедзева.

## РАЕЎКА

Людзі гавораць, што вельмі даўно праз тое мястэчка, якое зараз называецца Радашковічамі, праязджала са шматлікімі сваімі слугамі і аховай, фрэйлінамі

ды кавалерамі Кацярына II. Замілавалася царыца надзвычай прыгожай мясцовасцю, высунула ў акенца галаву з карэты ды глядзела і глядзела, ні з кім не размаўляючы. Чагосьці толькі задуменна ўсміхалася, нібы ёй у гэты момант важныя ўспаміны ў галаву прыходзілі. Так многа вёрстаў ехалі. Ніхто не адважваўся яе турбаваць, нават размаўлялі цішэй ды коней падганялі, каб ніхто не чуў. Ажно ў адным месцы выйшла насустрач каравану дзяўчына з вёдрамі, поўнымі вады, а, паводле народнага, гэта добрая прыкмета. Засмяялася тады шчыра Кацярына II і сказала, звяртаючыся да маладой сялянкі:

— Радуйся, красна маладзіца, хачу з табою параіцца! Так мне на душы хораша, дык распытаць жадаю — чаму?

З тае пары нібыта і пайшло, ад «радуйся» — Радашковічы, «красна» — Краснае, «маладзіца» — Маладзечна, «раіцца» — Раеўка.

Вось так некалі старыя людзі гаманілі, распавядаючы пра тое, чаму населеныя пункты гэткія назвы носяць, а не іншыя якія.

Даводзілася чуць і другія гісторыі, праўда, яны ў асноўным датычыліся нашай вёскі, а не тых, што навокал параскінуліся зараз.

Мой дзед Нічыпар пра вёску нашу, Раеўку, распавядаў гісторыю, якую ад некага са сваіх старых пачуў.

Некалі ў нашых мясцінах вёсак і хутароў не было ўвогуле, а было тут шырокае і глыбокае мора-возера. Плёскаліся ягоныя хвалі пад ветрам, пераліваліся на сонейку, насілі шматлікія караблі, берліны ды плыты. Плавалі жыхары, куды хацелі, надта дапамагала ім вада ў такіх справах. Пакуль там дабярэшся па сушы, пакуль праб'ешся праз навакольныя лясы ды балоты, дык вадою справа ўтрая хутчэй рухалася. Толькі каб стырнавы быў вопытны ды памагатыя яму спрактыкаваныя падабраліся, а там і бяды ніякай не адчуеш. Упрагуцца хвалі і панясуць судны ці плыты ў патрэбным накірунку.

Плавалі не толькі мясцовыя жыхары, але і чужынцы таксама. Людзі, якім трэба было прабівацца далей, наймалі з местачкоўцаў праваднікоў, што ведалі ўсё навокал, і кіравалі ўжо смялей. Тады рэдка нападалі рабаўнікі на гандляроў ці падарожных людзей. Канешне, былі і такія, якім золата туманіла вочы, але князь ці цар, які кіраваў, бязлітасна распраўляўся з такімі

злачынцамі. Адплочваў ім тым самым, чым яны сустракалі гасцей.

Гавораць, што на адным з бліжэйшых хутароў жыў вельмі дзіўны дзядуля. Надта спрактыкаваны ён быў у праводцы плытоў ды берлін, ніхто лепей за яго гэта не ведаў і не мог зрабіць. Калі звярталіся за дапамогаю, то не адмаўляўся, але і не рваўся на злом галавы. Спакойна ўсё слухаў, меркаваў, а потым ужо і выснову нейкую рабіў. А пачыналі прыспешваць — стары ўсміхнецца, рукі перад сабою працягне і скажа ласкава:

— Чалавеча, на іх маршчын намнога болей, чым ты гадоў пражыў...

Калі перад ім стаяў разумны падарожнік, то адразу ўсё разумеў і прасіў:

— Прабач, дзядулька, прабач, родненькі, пагарачыўся я. Хай па-твойму будзе. Як ты надумаў — так і здзейснім.

— Ды, чалавеча, гэта нічога, што ты спяшаешся, але трэба наперад паглядзець, памеркаваць, параіцца трэба, бо можна дарагую цану заплаціць. Што тавары ці рэчы свае згубіш — справа папраўная, а вось калі людзей страціш ды сам жыцця пазбавішся — тут ужо нічога выправіць нельга будзе. Вада — яна заўсёды вада, і з ёю жартаваць нельга, бо хоць наша моравозера і спакойнае, але жыццяў яно забрала даволі многа. Вы, можа, і не ведаеце, здалёку прыехалі, а я тут, побач жыву і за свой доўгі век многага наглядзеўся і наслухаўся. Вось параімся і паедзем заўтра з раніцы. Сонца ўстане, любую справу весялей распачынаць. Давайце ўсё прадумаем...

Так было і на той раз.

Сонца ўстала, і стары ўжо катурхаў прыезджых гандляроў:

— Ну што гэта вы, людцы, разаспаліся. Ляжыце, нібы на цалёвых падушках, і ў вус не дзьмухаеце. Трэба плыць нам. Бачыце надвор'е якое спрыяльнае. Ветрык добры павявае. Панясе ён нашыя берліны хутка-хутка, праз дзён пару да патрэбнага вам месца дабяромся. Уставайце. Час упусцім — вам жа не на руку...

Усхапіліся гандляры, вочы пацірають заспаныя, пацірающца, бо пасля сну неяк халаднавата стала, але дзядулька пасміхваецца:

— Нічога, зараз тавары грузіць пачнеце — сагрэецеся, разамнеце костачкі. Што мы лепей загружаць будзем? Я б параіў берліны. Яны не так глыбока ў ваду

садзяцца, лёгкія, і калі бура-навальніца ўсчнецца, то больш трывалыя на вадзе. Давайце, райце мне, што ж вы маўчыце?

— Раіць дык раіць,— адказаў нехта,— калі берліны прыдатныя да такой справы, то іх і будзем загружаць.

Спорна закіпела праца, забегалі гандляры туды-сюды па сходнях, і праз нейкую там гадзіну берліны былі загружаны. Але стары стырнавы не спяшаўся даваць каманду адплываць. Усе здзіўлена глядзелі на яго, а ён павярнуўся да людзей і прамовіў ціха:

— Трэба ахвяру вадзяному богу прынесці, каб усё спакойна прайшло, каб нічога ліхога ў дарозе не здарылася. Парадак такі ў нас. Тыя, хто плавае, заўсёды так робяць.

Але з берлін раздаліся незадаволеныя галасы:

— Чаго там час марнаваць? Плыць трэба! То падганяў, а то сам затрымліваеш. Гаворыш, што ахвяру прынесці трэба? Навошта яна? Усё і так добра будзе. Давай хутчэй, паплылі!

Незадаволены стары спахмурнеў і ступіў у берліну:

— Ну што ж, паплывём. Толькі я вас папярэджваў. Самі глядзіце.

Адплылі ад берага, і вецер панёс судны да супрацьлеглага берага. Цэлыя суткі ўсё ішло як нельга лепей. Ціха навокал было, спакойна, але раніцай наступнага дня ўсё рэзка перамянілася. Загула, нібы ў пустую бочку, бура, застагнала мора-возера і пачало бязлітасна шкуматаць берліны. Кідала іх, што тыя трэсачкі,— то высока ўздымала, то апускала ў ваду, ажно зверху хвалі сыходзіліся. Перапалохаліся гандляры і да старога, а ён на іх:

— Дапамагайце! Кідайце вяроўкі моцныя з аднаго чоўна на другі і звязвайце! Трымайце берліны носам да хваляў! Трымайцеся, толькі не палохайцеся, бо тады загінем!

Слухаліся гандляры, усё выконвалі, а бура яшчэ болей узмацнялася. Так іх кідала, можа, сутак двое, потым усё заціхла і супакоілася. Людзі знясіленыя пападалі ў судны і паснулі. Калі ачнуліся, ля іх быў бераг.

Стары стырнавы сядзеў ля невысокага лазовага карча і нечаму ўсміхаўся.

— Чаго ты, дзядулька? — звярнуўся нехта да яго з запытаннем.

— Я ж вам казаў, што не трэба спяшацца, што

трэба параіцца. З вамі-то я параіўся, і вы слухаліся, а вось з вадзяным богам вы мне параіцца не далі. Бачыце, чым справа ледзьве не скончылася...

— Цяпер абавязкова будзем раіцца,— адказаў другі гандляр.— Я са сваімі далей і не паеду, тут застануся, раз выжыў.

Так той падарожны гандляр і застаўся ды пасяліўшча новае заклаў. Пазней і назвалі яго Раеўкай.

## САЛТАНЫ

Адбылося гэта даўно, пасля цяжкай і доўгай вайны з туркамі. Дзесяткі гадоў яна цягнулася, гора беднаму люду прынесла столькі, што і пераказаць цяжка. На гэты раз перамаглі рускія войскі. Заўсёды ж хто перамагае, той і палон забірае, так спакон вякоў вялося. Раз рускія перамаглі, то яны і да палонных аднесліся надзвычай паблажліва. Палонных жа было надта многа. Там і воі былі, і жанчыны, і старыя, і дзеці. Пераможцы нічога благога ім не ўчынілі, проста вывезлі з сабою ў Расію. На Беларусь таксама даволі шмат туркаў трапіла, бо і з нашых земляў рэкрутаў вялікую колькасць набіралі на вайну. Беларусы заўсёды вылучаліся смеласцю, і ім адпаведна плацілі. Тым, каго прывезлі на новыя месцы, дазволілі жыць у гарадах і вёсках, займацца рознымі рамёствамі. Так, у Мінску палонныя туркі асвоілі хлебапячэнне. Выпякалі яго па сваіх рэцэптах, і мясцовым жыхарам ён спачатку падаўся дзіўным на смак, але з цягам гадоў прызвычаіліся. Так званыя турэцкія булкі доўгі час карысталіся поспехам у жыхароў горада. Вядомы былі туркі і як умелыя мельнікі-мукамолы.

Аднойчы на багаты хутар, які стаяў на месцы будучых Салтаноў, прыблудзіў адпушчаны на волю малады турак. Ранейшыя гаспадары не мелі патрэбы ў выкарыстанні ягонай фізічнай сілы, таму дазволілі чалавеку ісці і самому шукаць сваё шчасце. Вось ён і блукаў па нашым краі. На гэты хутар зазірнуў, спадзеючыся знайсці працу, а разам з ёю і часовае жыллё. Спытаўся ў вяскоўца, ці не патрэбны яму работнік. Паглядзеў селянін на турка дый гаворыць:

— Мне ён не пашкодзіў бы, бо зараз гарачая часіна настае, сена людзі касіць пачнуць, але ж я не ведаю, што ты за чалавек і як працуеш.

— Былы гаспадар нікому ніколі не скардзіўся,— адказаў хлопец.

— Вось што, чалавеча, найму я цябе пакуль што на касьбу, а калі апраўдаеш мой давер і пакажаш сябе з найлепшага боку, то і надалей пакіну. Калі такія ўмовы табе падыходзяць, то заставайся.

— Ну што ж, застануся, а там — што ўжо Усявышні дасць,— адказаў былы палоннік.

Пачалі яны касіць удваіх з гаспадаром. Даўней гэтым займаліся не дзень, не два, а можа, месяц, бо кожны вясковец многа жывёлы трымаў, і каб яе пракарміць, трэба было не адзін стог паставіць. Косіць той Салтан, нібыта тут і вырас. Лёгка ў яго атрымлітоваецца, не выжыльваецца хлопец. Сам селянін стоміцца і ўжо прапаноўвае:

— Давай, чалавеча, адпачнём, усё роўна за адзін дзень усё не зробім.

Тады работнік і скажа:

— Лепей яшчэ па пары пакосаў пройдзем, пакуль сонца не так прыпякае, а там ужо паляжым колькі часу.

Сядуць удваіх і нібы роўныя паміж сабою размаўляюць. Салтан пра сваю далёкую радзіму распавядае, а гаспадар пра тыя парадкі, якія тут пануюць. Пасябравалі яны. І калі вясковец адчуў, што турак — працаўнік хоць куды, то пакінуў яго ў работніках на ўвесь год. Хлопец жа спрытны, працавіты, паспрабуй знайсці такога.

Год прабыў у яго былы палоннік, а потым і на другі, на трэці застаўся.

Дык што ж вы думаеце далей здарылася? Была ў гэтага гаспадара адзіная дачка і звалі яе Тэкля. Галасістая ўдалася, прыгожая, працавітая. Калі станавілася ў полі жаць, то жнеяк пара з ёю не спраўлялася. Як пойдзе, як пойдзе, дык рукі толькі мільгаюць і снапы роўнымі радочкамі кладуцца. А можа, разагнецца ці пастаіць хоць хвілінку нейкую? Дзе там, толькі і думае, каб зрабіць як мага болей і спарней. Нарадавацца бацькі не маглі на такую дачку. Самі хвалілі, і людзі ніколі слова брыдкага ці гнеўнага на дзяўчыну не прамовілі. Не паварочваўся язык на такое.

І вось упадабалі адзін аднаго — малады турак і беларуская дзяўчына, пакахаліся, жыцця ім не стала. Усё патаемна сустракаліся, баяліся, каб бацька не заўважыў ды не выгнаў прэч парабка. Потым ужо немаг-

чыма хавацца стала. Сэрцу ж не загадаеш і не растлумачыш, што вось гэты вольны, а гэты вось палонны, ці што гэты бедны, а вось гэты — багаты. Яно затахкае звонкім салоўкам, засмыліць, і ўсё на тым. Лічы прапала. Нікуды ад кахання не ўцячэш. Дый пакажыце хоць аднаго дурня, які б сапраўды ўцякаў ад такой справы?

Дык вось, быццам бы той бяздомны жабрак набраўся смеласці і пасватаўся да гаспадаровай дачкі-прыгажуні. Казалі людзі, што перад селянінам на калені стаў і галаву схіліў. Той, можа, каб не ведаў чалавека, то і размаўляць бы не стаў, а тут хлопец столькі поту салёнага на ягоную гаспадарку праліў, столькі пагарбаціўся, ды і амаль што сябрамі сталі. Не змог абразіць чалавека дурным словам ці сабак на яго напусціць. Сумленне не дазваляла. Але ж і дачку за беднага аддаваць не надта хацелася, тым болей, што багатых жаніхоў было, хоць ты іх кіем адганяй. Пільнае вока вяскоўца заўважыла і тое, што сама Тэкля ўжо даўно прыхільна паглядала на адважнага і працавітага турка-прыгажуна.

Узняў ён Салтана з каленяў, супакоіў і даў зразумець, што нічым суровым адплачваць не збіраецца, што лічыць гэта нармальнай з'явай. Можа, так бы ўсё і завяршылася, але ў гэты момант уляцела маланкай у хаціну дачка і так глянула на свайго бацьку, што той вочы долу апусціў і саромеўся на Тэклю іх уздымаць.

— Дык, значыцца, вось як ты мяне, родны татка, любіш? Вось як твае ўсе абяцанкі спраўджваюцца? Адно кажаш, адно робіш, а ўчыняеш зусім іншае. Толькі паспрабуй крыўду якую намеркаваць, то з хаты збягу і за першага сустрэчнага жабрака замуж пайду, але ў гэты двор болей не вярнуся! Так і ведай!

Выгукнула, усхліпнула — і толькі яе і бачылі ў хаціне. Маці адразу ж загаласіла, а гаспадар пасля некаторага роздуму хмыкнуў:

— Але і характар у Тэклі... Але ж і характар... Ну...— і не дасказаў, бо жонка, плачучы, прамовіла:

— Выліты твой.

Гэта канчаткова пераканала вяскоўца дзейнічаць па-людску.

Устаў ён перад работнікам і паставіў сваю ўмову, бо трэба ж было нечым яшчэ маладога чалавека выпрабаваць. Дачку-то проста так аддаваць не хацелася.

— Разбагацей спачатку,— хітра прыжмурыўшыся,

сказаў ён,— набудзь хаця б з трэць таго, што я маю,— без слоў аддам тады за цябе сваю адзіную дачку. Паспрабуй, бо і самому, калі быць шчырым, ты спадабаўся. А калі яшчэ багацця якога прыдбаеш, то і ўвогуле ўсё вырашыш адразу.

Пачуў такое хлопец і крыху павесялеў. Нейкі ж шанц у яго заставаўся. Толькі нядоўга ён быў спакойны. Каб гэта ў родным краі, дзе сваякоў многа, ды бацькі пад бокам, там бы сабраць умомант можна было якое-небудзь начынне ці пэўную суму грошай. А тут жа для яго, хоць і добрая, але пакуль што чужая зямля. Сеў пад грушай у канцы нівы, апусціў галаву на калені і гэтак млосна ў яго на сэрцы зрабілася, што і перуказаць нельга. Колькі часу сядзеў — ніхто і не скажа, але прыбегла да свайго каханага Тэкля і гаворыць:

— Чаго ж ты, родненькі-міленькі, так засумаваў? Бацька ж не супраць, але выпрабаванне сваё прызначыў. У нас заўсёды так дзейнічаюць, калі некага выпрабаваць хочуць, паглядзець, на што ён прыдатны. Што ты працаўнік шчыры — ніхто і не сумняваецца, а тут паспрабуй даказаць, ці здолееш выкруціцца з такой сітуацыі. Калі хочаш, то падкажу табе, што рабіць.

— Падкажы,— неяк разляпіліся ў хлопца вусны.

— Папрасі ў майго таты ў арэнду ладны кавалак зямлі і дакажы, што ў цябе будзе ўсё расці лепей, чым у іншых. А я табе заўсёды дапамагаць буду.

Зноў прыйшоў да гаспадара Салтан і папрасіў даць яму ў арэнду кавалак зямлі, хай сабе нават кепскай, аж на вышыні пясчанага ўзгорка.

Селянін і гаворыць:

— Ведама ж, калі даць добрай, то і дурань расстараецца, а вось на жоўтым пясочку паспрабуй нажыцца...

Здзівіўся гаспадар, падазрона неяк зірнуў на Салтана, але ўсё-ткі згадзіўся, аддаў яму той неўрадлівы ўзгорак:

— Бяры на колькі гадоў, можаш нават мне за яго нічога не плаціць, я толькі буду назіраць, як справы пойдуць...

Вось на гэтым самым ўзгорку кемлівы і хітры Салтан пабудаваў свой першы ветраны млынок. А паколькі іншых млыноў нідзе паблізу не было, павезлі людзі малоць зерне да парабка. Кожны дзень праца ў былога палонніка не пераводзілася, болей таго, пастаянна жывая чарга пад дзвярыма стаяла. Прасілі хлопца, каб

і іх прыняў, каб і ім дапамог, і плацілі, адпаведна, добраю манетаю. Турак нікому не адмаўляў, калі трэба было, то і ноччу шчыраваў. Назбіраў беражлівы хлопец грошай, і на месцы малога ветрака пабудаваў сапраўдны млын з магутнымі жорнамі, з размахам крылаў аж у дзесяць сажняў. Цяпер стаў яшчэ ў тры разы болей зарабляць, чым да гэтага. Паваліў народ да маладога млынара, прыбытак яму несучы. Перад самымі калядамі (тэрмін у іх такі з гаспадаром быў вызначаны) занёс Салтан у хаціну да вяскоўца каваны куфэрак, адкрыў яго, на стол паставіўшы, і спакойна прамовіў:

— Лічы, гаспадар! Паглядзі, ці заслугоўваю я зараз рукі тваёй адзінай дачкі, ці аддасі ты яе за мяне! Можа зноў нейкая перашкода з'явілася?

А было ў тым куфэрку поўна залатых манет, паўнютка — як зачыніць.

Вясковец не стаў пералічваць, толькі радасна зазначыў:

— Я рады, Салтан, што ты з гонарам выйшаў і з гэтага цяжкага становішча. Я свайго слова не мяняю — гэта каб ты ведаў!

Паклікаў дачку і тут жа заручыў маладых. Потым і вяселле багатае згулялі.

Доўга яшчэ навакольныя людзі ездзілі на млын турка Салтана. А пад той час, калі гаспадаром млына стаў Салтанава сына сын, людзі ўжо ездзілі малоць зерне не на безыменны хутар, а ў вёску Салтаны.



# МЯДЗЕЛЬ

У далёкія часіны наша мясцовасць нагадвала сабою райскі куточак. Гэтак усё прыгожа і непаўторна было. Столькі звяр'я ды птаства вадзілася. А азёры якія... Яны ж у нас і зараз, нібы тыя сінія вочкі, адсвечваюць на сонейку.

Дык вось у гэтых мясцінах людзі вельмі даўно жыць пачалі. Яшчэ з незапамятнага веку. Выгадна ім тут было: і рыба, і мяса, і лес густы — усё на месцы. Далёка ісці не трэба. Спачатку нават ніякіх хацін сабе людзі не ўзводзілі, бо надвор'е было заўсёды цёплае, лагоднае. Гэта пазней ужо сталі палацы ды дамы стаўляць, калі ўсё крыху перамянілася. Кажуць нават такое — зімы з маразамі ды сцюжамі ўзніклі ад таго, што сярод людзей надта многа зла і крываҗэрнасці стала.

Сучаснае наша паселішча некалі акружалі тры высачэнныя і магутныя палацы-замкі, якія стаялі на асобных астраўках. Назва ў кожнага з замкаў была свая: Мядзел, Мястра і Нарач. Бачыце, многае пераклікаецца. Бо і ў нашыя дні гэтыя астравы жыхары называюць не інакш як «Замак». Згадвалі, што будавалі палацы дзіўныя нейкія замежныя будаўнікі, даклад-

ней, яны ўсё паказвалі і кіравалі, а чорную работу выконвалі якраз-такі тубыльцы, якіх прымусова прыганялі на будаўнічыя пляцоўкі. Многія сем'і не дачакаліся тады сваіх мужчын, бо ўзводзілі ж гмахі не год, нават не два, а, сама меней, дзесяць ці дваццаць гадоў. Усё рабілася толькі ўручную, ніякіх машын нідзе і ў згадках не было. Сяляне-бедалагі надрывалі здароўе і мерлі, нібы мухі. І ніхто з іх нікому не мог паскардзіцца, паплакацца, папрасіцца, каб не тое што вызвалілі ад працы, але хоць на пару дзён адпусцілі да сям'і, хоць адным вокам зірнуць на блізкіх і родных. Пра такое і згадваць нельга было. Каму хацелася браць лішні грэх на душу? Скажы, а потым як усыплюць, то і да раніцы не працягнеш. Нават хавалі памерлых не на могілках, а дзе прыйдзецца. Нярэдка і такое здаралася, што проста замуроўвалі разам з камянямі-глыбамі ўсярэдзіну будынка. Пазней пра гэта паданне існавала, што быццам бы ў святыя ночы (маецца на ўвазе ночы вялікіх рэлігійных святаў) тыя месцы, дзе былі замураваны нябожчыкі, свяціліся. Некаторыя гаманілі, што гэта душы іхнія нявінныя развітваліся з жывымі і нагадвалі, што яны памерлі не сваёй смерцю. Таму часта казалі, што палацы тыя стаялі на людскіх касцях. Ніколі не даводзілася мне чуць, каб пра іх што добрае прыгадалі, толькі змрочнае, страшнае.

Праўдзівасць маіх слоў вам няцяжка будзе праверыць, бо многія жыхары могуць сёння паказаць, дзе ўзвышаліся замкі. Справа ў тым, што на тых мясцінах захавалася шмат напаўразбураных фундаментаў, напаўзасыпаных ірвоў, рэшткі магутных некалі валоў. Вось толькі камянёў са сцен нідзе вы не ўбачыце, як ні ўзірайцеся. Справа тут вось у чым. Адразу пасля таго, як палацы пачалі разбурацца, камяні самі па сабе сталі раскочвацца на тыя месцы, адкуль іх сюды прывалаклі. Звязана гэта з яшчэ адным паданнем, паводле якога вынікала, што галоўная гаспадыня, якая валодала гэтымі землямі і, адпаведна, будынкамі, нечым надта ўгнявіла самога Бога. Гэта ж вам не жартачкі. Можаце ўявіць толькі, якой сілай і багаццем валодала, калі насуперак самога нябеснага валадара памкнулася пайсці. Таму Бог і зрабіў так, што толькі падмуркі захаваліся, а ўсё астатняе, каменнае, разбурылася і параскідалася.

Заснаванне гэтых палацаў-замкаў народнымі дарадцамі прыпісваецца каралеве Боне. Гавораць нават,

што ў адным з іх яна пастаянна жыла. Называлася тое месца Мястра. Падрабязней пра назву нічога вам зараз паведаць не магу, бо не ведаю. На двух іншых астраўках жылі родныя сёстры вяльможнай каралевы. Часта яны збіраліся разам, каб пасядзець, навінамі ўсялякімі абмяняцца, проста нешта адна адной пераказаць. Тады ўжо ўсю ноч у вокнах палаца гарэла яркае святло, гучна лілася музыка, пяяліся песні, скакалі шматлікія запрошаныя паны і паненкі. Толькі раніцай распаўзаліся фурманкі і экіпажы па навакольных маёнтках, куды накіроўваліся спаць-адпачываць багатыя памешчыкі.

Была яшчэ прычына раз'язджацца раніцай. Ноччу там праехаць нельга было. Навокал разлівалася вада. Там, напрыклад, дзе з вечара ляжала гладкая дарога, пасля першых пеўняў станавілася вадзяная роўнядзь. Глядзіць чалавек на такое дзіва і з глузду з'ехаць можа, ніколі не здагадаецца, што там не проста сцяжынка ёсць, а сапраўдны шырачэнны шлях, ды яшчэ і бярэзінкамі-прыгажунямі абсаджаны. З п'янай галавы, праўда, многа паноў і патапілася ў тых водах. Дзе ж вы бачылі, каб нехта пана, ды яшчэ на добрым падпітку, затрымаў? Ніколі такога не здаралася. Гупне кулаком ці бізуном у спіну фурмана ды раўне дзікім голасам:

— Наперад гані! Ды глядзі, як мага хутчэй коней прыспешвай! А то атрымаеш у мяне!

А што таму заставалася, як не на лёс уласны ды на волю боскую спадзявацца? Угне галаву ў плечы і гоніць коней насустрач сваёй смерці. Саскачыць нельга, звярнуць — таксама. Адзінае выйсце, калі экіпаж у ваду зваліцца,— даць нырца ды плыць далей ад гэтага страшнага месца, каб ніколі болей назад не вяртацца, бо не даруюць родныя пана смерць свайго блізкага, не стануць слухаць, што не жадаў ты ехаць і ні ў чым не вінаваты.

Але сама болей распавядалі людзі пра каралеву Бону. І гаварылі гэта нездарма. Сцвярджалі, што яна была не хто іншы, як злая чараўніца. Скажыце, будзьце ласкавы, адкуль яна магла ўсё ведаць, што робіцца ў свеце, калі амаль не выязджала са свайго палаца? Сядзела ля маленькага акенца, якое выходзіла на возера, і ўзіралася, што там робіцца. Потым нібы спахопіцца і выгукне:

— Паклічце да мяне начальніка варты, і не марудзьце!

Ведалі слугі, што гаспадыня жартаваць не надта любіць, таму ляцелі на злом галавы, і праз хвіліну патрэбны чалавек ужо перад Бонай калені згінаў:

— Слухаю, мая каралева. Што загадаеце, тое і выканаю з радасцю. Услужыць вам для мяне заўсёды найпершая асалода.

— Кінь ты тут словамі пляскацца, а слухай лепей, што скажу.

— Так...

— Тут, непадалёку, ёсць маёнтак. Дык ягоны гаспадар не ўсё ў дзяржаўную скарбонку ўнёс. Абхітрыў маіх збіральшчыкаў і большую частку грошай ды каштоўнасцей сабе пакінуў. Сёння ноччу ўсё гэта закопваў. Пад старой грушай, што непадалёку ад яго маёнтка. Адзінока гэтак у полі стаіць... Калі ён стане адмаўляцца, тады і нагадай яму, дзе ўсё схавана, каб зразумеў, што ад мяне нічога не схаваеш. На першы раз забярэш у яго ўсе тыя грошы, болей нічога не чапай. Прыпалохай толькі, што на другі раз не дарую, сурова пакараю. Мабыць, чуў ён пра мае падзямеллі-скляпенні... Не будзе правілаў прытрымлівацца — то там і пасядзіць.

— Слухаю, мая каралева... Дазвольце выконваць?

— Канечне, выконвай. Чаго ж я тады цябе сюды клікала? Прыедзеш — да мяне адразу заходзь, раскажаш, як усё там адбывалася.

— Так, зраблю...

Вось яно да чаго даходзіла. Нібы скрозь зямлю бачыла.

А то сядзіць, здаралася, пра нешта сваё, патаемнае дужа, думае, думае, потым усміхнецца і ласкава гэтак клікне:

— Слугі, бяжыце да мяне. Нешта вам такое скажу... Такое скажу, пра што вы і не чулі, і не здагадваліся нават...

Падляцяць тыя, вочы вылупяць на каралеву, а яна нібы з роўнымі трымаецца:

— Вось тут сядзела, сядзела і дадумалася да наступнага. Возера ж, мабыць, таксама дно мае...

Пераглядваюцца слугі здзіўлена, не разумеюць, да чаго іхняя гаспадыня хіліць.

— Калі ж дно ёсць, то на ім усё можа і расці, і хавацца, і ляжаць...

— Ведама, маці-каралева...

— Дык вось прымроілася мне, што нехта падару-

нак пад маё акенца падкінуў. Залатых поўны кошык. Так яны і гараць, так і пераліваюцца. Хто мне іх прыняce? Не палохайцеся, на смерць не пасылаю. Узнагароджу шчыра і шчодра...

Знойдзецца такі смелы сярод слуг і ідзе туды, куды Бона паказвае. А яна зноў сядзе перад акенцам і камандуе:

— Ідзі далей. Ідзі, не бойся. Там табе вады і па калені не будзе. Яшчэ крыху, яшчэ...

Астатнія слугі і дыхнуць баяцца, стаіўшыся за спіною гаспадыні. Сочаць уважліва, што ж далей будзе.

— Ага, ідзі яшчэ крышку наперад,— працягвае камандаваць каралева,— цяпер улева вазьмі. Вось так. Прыпыніся, азірайся. Няўжо не бачыш?

— Не,— даносілася з возера.

— Як гэта ты побач з залатымі стаіш, а нічога не бачыш? Дзіўна... Раз так, то нахіліся і ля левай нагі забяры кошык з залатымі...

Праз некалькі хвілін гучаў радасны крык:

— Знайшоў! Знайшоў, маці-каралева! Вось кошык!

— Нясі яго сюды ды глядзі, не рассып залатовак, бо тады ўзнагароды табе не дачакацца...

Ашаломленыя слугі толькі і робяць, што ціхенька просяць дазволу пакінуць пакоі.

— Ідзіце, ідзіце, я вас болей не трымаю.

Вось што выраблялася ў гэтым палацы-замку.

Цэлыя дзесяцігоддзі людзі не маглі здагадацца, ад чаго ў каралевы такая здольнасць да прадказанняў, да чараўніцтва, да прадбачання. Як ні гадалі — не атрымлівалася нешта акрэсліць дакладна. Ужо і тыя, хто прыслужваў ёй, назіралі ды цікавалі, але ўсё дарма. Цэлы дзень вачэй з Боны не спускалі, ведалі, дзе была, з кім сустракалася, што ў руках трымала — і ўсё роўна гэта нічога не давала. Так, можа, таямніца назаўсёды і знікла б са свету разам са сваёй гаспадыняй, каб не адзін выпадак. Раскажу вам пра яго.

Аднаго разу, у недалёкай вёсачцы, якая раскінулася амаль побач з палацам Боны, пачулася адчайнае галашэнне. Голас той не надрываўся, не супыняўся, а ўсё гарлаў і гарлаў, нібы нічога іншага ў свеце і не ведаў, адно толькі — дзіка крычаць. Надакучыла чуць крыкі каралеве, клікнула яна да сябе аднаго з найбольш верных слуг і гаворыць:

— Паслухай, даражэнькі, сігані ты туды ды выведай добра, што там такое ўтварылася? Нельга ўжо

болей такія крыкі выслухваць, галава пачала балець.

— Слухаю, маці-каралева,— стукнуў той абцасамі і паімчаў так, як гэта можа зрабіць самы спрытны чалавек.

Прыджгаў ён у тую вёсачку, а там усе людзі сабраліся на вуліцы ў натоўп і стаяць, панура галовы схіліўшы.

— Што тут у вас такое здарылася? Што? Сама маці-каралева мяне паслала даведацца, чаму так доўга і жаласліва галосіце.

— Ды і як жа тут не галасіць, чалавеча,— у сваю чаргу з запытаннем звярнуўся да яго старэнькі селянін,— калі вунь якое гора ў жанчыны?..

— Якое гора?

— Ды яна, бачыш, як толькі замуж выйшла, то ёй адразу не пашанцавала: недзе праз год-другі дрэвам забіла яе мужа. Застаўся ў бедалагі хлопчык маленькі на руках. Як яна яго толькі ні лашчыла, як ні аберагала... Усе людзі, чым маглі, дапамагалі. Падрос Мікітка, ужо яму гадкоў, мабыць, восем ці болей, і ўсё добра было... А вунь учора каровак пасвіў і недзе амаль пад самы вечар, з сябрукамі на выгане гуляючы, на змяюку напароўся, тая яго і джыгнула. Што ўжо не рабілі, якія замовы і шэпты над ім не шапталі, што толькі піць не давалі — нічога не дапамагло і не дапамагае... Адыходзіць малы... Я таксама шаптаў, ды дарма стараўся, яму ўжо ніхто не дапаможа.

— Але ж змей у нашых мясцінах не было даўным-даўно. Адкуль яны зараз узяліся? — пацікавіўся слуга.

— Вось і я гадаю. Быць не было, а тут хлапчук напароўся — і на табе... Добра ведаю, што калі я малым быў, то гадзюк даволі тут поўзала, а потым зніклі, нібы хто адгаварыў. Да ўчарашняга дня ніхто пра іх і не чуў. Такая бяда... Не, не дапаможаш ужо Мікітку. Шкада жанчыну, гэтак убіваецца. Яшчэ з адчаю рукі на сябе накладзе.

— Я пабягу, дзядуля, мне ж трэба маці-каралеве ўсё распавесці. Яна загадала, каб хутка абярнуўся.

Толькі стары не чуў гэтых слоў, бо ён зноў падышоў да аднавяскоўцаў, якія па-ранейшаму гаротна маўчалі і слухалі, як убіваецца няшчасная маці.

Ускочыў слуга ў пакоі да Боны, а тая сядзіць і глядзіць на возера.

— Ну што там такое, даражэнькі?

— Маці-каралева, там бяда вялікая. Гора ў адной жанчыны.

— Якое можа быць яшчэ гора?

— Змяюка яе адзінага сына ўкусіла, і ён таму памірае. Ужо, можа, адышоў...

— Змяюка? — і каралеву нібы хто падкінуў, яна раптоўна ўскочыла з крэсла.— Адкуль яна тут узялася?

— Гэтага не ведаю, маці-каралева,— слуга разгублена і бездапаможна разводзіў рукамі.

— Нічога не разумею. Не магла тут змяюка з'явіцца. Не магла...

Бона нервова захадзіла па пакоі, зусім не звяртаючы ўвагі на слугу, які застыў ля парога. Потым яна спрытна нахілілася і выцягнула з-пад свайго вялізнага ложка невялічкі, прыгожа аздоблены сундучок. Адчыніла яго і дастала адтуль... нейкую драўляную фігурку, вочы якой ярка гарэлі каштоўнымі камянямі.

— Як магло такое здарыцца? — раўнула гаспадыня палаца.

Слуга ўздрыгануў, бо думаў, што гэтыя словы датычацца яго, але нічога адказаць не паспеў, пачуўся іншы голас. Гаварыла драўляная істота.

— Якая змяюка?.. Дзе яна?..

— Гэта я ў цябе спытаць павінна, якая і дзе! — яшчэ грамчэй крыкнула Бона.

— Ды змей жа тут быць не можа, бо мы ж з табой заклінalі гэтую мясцовасць. Хіба ты, мая валадарыня, не памятаеш?..

— Памятаць-то я памятаю, але ўчора гадзюка ўкусіла хлопчыка і ён памірае. Як гэта растлумачыць?

— Яго трэба ратаваць, ратаваць неадкладна,— забомкаў ідал.— Пасылай людзей, каб прынеслі ў палац хлопчыка, а я тым часам раскажу, што трэба рабіць.

— Ты чуў? — цяпер ужо каралева звярталася да слугі, які ад усяго ўбачанага і пачутага добра ашалапеў.— Ляці ў вёску і нясіце ці вязіце сюды малога. Бягом, каб паспець, а то і памерці небарака можа...

Цяпер ужо слуга ляцеў напрасткі і джгаў так, што ажно лаўжы ды кустоўе трашчалі. Як ні спяшаўся, але запазніўся. Натоўп на вуліцы яшчэ стаяў, але людзі ўжо плакалі.

— Ну што? — падляцеў пасланец да знаёмага яму старога.— Што з малым?..

— Адышоў... Толькі што адышоў,— усхліпваючы,

прамовіў той.— Хай бы лепей неба мяне забрала. Навошта яно пазбавіла радасці гэтую маладзіцу?..

Слуга не ведаў, што яму рабіць далей. Хлапчук памёр, але ж Бона нічога канкрэтнага не сказала, везці толькі жывога ці і мёртвага таксама. Чалавек стаяў і думаў, цяпер уся адказнасць ускладалася толькі на ягоныя плечы.

— Давайце воз які-небудзь сюды хутчэй і па загаду маці-каралевы павязём нябожчыка ў палац...

— Навошта нябожчыка ў палац?

— Не гаманіце, а рабіце так, як вам сказалі! — узвысіў голас слуга, і людзі адразу кінуліся па дварах, нікому не хацелася звязвацца з каралевай.

Калі мёртвага хлапчука і ледзьве жывую ад гора маці слуга прывёз да замка, то Бона ўжо стаяла на высокім мураваным ганку і чакала.

— Ну, што?.. Жывы?..

— Не, маці-каралева, памёр... Памёр якраз перад тым, як я прыбег...

— Добра, што здагадаўся прывезці хоць мёртвага. Цяпер адыдзіце ўсе, я сама тут абыдуся, без вас...

Можа, гадзіны дзве варажыла вяльможная Бона над нябожчыкам. Нешта там падмешвала, падварвала, падлівала вады і зноў падмешвала, але здалёку не надта добра было відаць, што да чаго, таму ўсе слугі і маці хлапчука болей маўчалі. Ведалі адно, што мёртвых ніхто і ніколі не ажыўляў. Таму былі ашаломлены, калі пачулі выразны крык хлапчука:

— Мама, мама, дзе ты? Дзе ты, мама?..

Змярцвелая жанчына рванулася да воза. Яе, па праўдзе, ніхто і не трымаў. Яшчэ праз імгненне яна горача цалавала і абдымала свайго Мікітку, які весела смяяўся і ўсё паўтараў:

— Мамачка, а мне нічога не баліць... Нічагусенькі... Хоць бы што... А то ўчора, як джыгнула змяюка, дык і дыхаць нельга было...

Пасля толькі няшчасная жанчына апамяталася і павалілася да Боны ў ногі.

— Дзякуй табе, маці-каралева... Дзякуй... Болей у мяне нічога няма... Дзякуй... Нічым і не магу табе адплаціць...

У адказ каралева ўсміхнулася і шчыра прамовіла:

— Шчаслівая ты... У цябе сыночак ёсць, ад яго

ўнукі застануцца. А ад мяне?.. Вы толькі ў гэтым краі заўсёды жывіце, нікуды не выбірайцеся.

Сказала так і пайшла ў палац, а галоўнаму эканому загадала выдаць жанчыне залатовак, каб гаспадарку моцную сабе завяла.

Доўга яшчэ жыла тут Бона. Яе замак быў грозным і непрыступным. Увесь час у ім знаходзіўся моцны гарнізон з вопытных і спрактыкаваных вояў. З усіх бакоў палац, як мы ўжо адзначалі, акаляўся вадою, а з берагам злучаўся мостам. На ноч ён падымаўся ўвогуле, а днём апускаўся ў ваду, таму яго нельга было бачыць. Некалькі разоў замак бралі ў аблогу войскі непрыяцеляў, але ўзяць не маглі. Пастаяць, пастаяць, пабачаць, што марна людзей і сілу губляюць, і пойдуць, адкуль прыйшлі. Але аднаго разу палац не вытрымаў аблогі. Здарылася наступнае.

Пачалася тады вайна са шведамі, і іхнія палкі падступілі да астраўкоў. Чакала іх тут тое ж самае, што і іхніх папярэднікаў, ды дапамагла выпадковасць. Нейкая прыблудная карова пайшла па падводных мосціках на вачах у разгубленых чужынцаў прама да вострава. За ёй, па свежых слядах, і кінуліся ворагі. Пасля бязлітаснага бою, калі ўсе мясцовыя воі былі перабіты, шведы пералезлі цераз сцены. Сама каралева выратавалася. Яна разам са слугамі прабралася па падземным ходзе, які быў выкапаны пад возерам, да берага. Там, кажуць, некалі стары мядзельскі касцёл стаяў. Вылезла яна з лаза, слуг дачакалася, а потым і загадала:

— Ідзіце наперад, я вас даганю. Не бойцеся, праз пару хвілін рушу следам...

Засталася для таго, каб здзейсніць наступнае: падышла да студні і кінула туды свайго драўлянага ідала з каштоўнымі камянямі замест вачэй. Кінула і прамовіла пры гэтым:

— Ой, мядзел, ты мой мядзел, расстаёмся з табой назаўсёды. Даруй, калі што не гэтак зрабіла...

Болей каралеву Бону ў гэтых мясцінах ніхто не бачыў. Ні разу не сустракалася яна людзям. А ад таго мядзела — кавалка звычайнага, па-майстэрску апрацаванага дрэва — пайшла назва нашага паселішча — Мядзел, а крыху пазней — Мядзель.

## БУДСЛАЎ

Апошнія зімовыя госці прыцягнуліся на невялікі хутар, які самотна стаяў пасярод старога, дрымучага лесу, у суботу позна вечарам.

Спляжаныя коні і празяблыя людзі спыніліся ля варотаў. Слухаючы злое сабачае гыркатанне, нікому не хацелася вылазіць з-пад задубелых ад халоднага і слякотнага зімовага дажджу радзён і аўчын і валачыцца праз хлюпастае месіва снегу і вады да змрочных будынін, якія ледзьве былі прыкметныя на фоне начнога лесу. Хочаш не хочаш, але ісці трэба было, бо там чакала іх цяпло і вячэра, а што самае галоўнае — адпачынак. Гэта толькі адразу цяжка ўстаць і размяць зацёклыя ногі ды рукі, а потым стане значна лягчэй. Таму той, хто быў самым старэйшым і паважаным, прагуў:

— Ну што, хлопцы, трэба неяк вылазіць, бо пасінеем зусім тут. У хаціны як дастукаемся, то і абагрэемся. Можа, нават чарку якую перакулім. Уставайма...

— Ага, уставайма, але хто першы? — запытаўся нехта з малодшых гуллівым голасам.— Калі ўстанем, то і перакулім, канечне ж, пакуль зноў не ляжам.

У адказ выбухнуў здаровы і дружны мужчынскі смех.

— Вось сказаў, дык сказаў! Лепей не прыдумаеш і не мовіш.

— Як у сук уляпіў!

— Што плюнуў за ветрам!

— Ага, плюнуў і за ветрам, толькі суседу ў спіну!

Зарагаталі яшчэ гучней. Сабакі і тыя, не разумеючы, што да чаго, спалохана папрыціскалі хвасты ды перасталі брахаць на чужых людзей.

— То пайшлі, хлопцы. Раз ужо вы так баіцеся, дык я першым рушу,— прамовіў старэйшы і, пасмейваючыся ды зябка падрыгваючы магутнымі плячыма, вылез з-пад будана.

— Ох, аж за спіну хапае. Макроцце якое. Гразі са снегам па калені, хоць і ездзяць тут зараз зусім мала.

— Вылазь, вылазь, не бойся, не ўтопішся.

Неяк усё ж выбраліся мужчыны і, часткова застаўшыся ля вазоў, а часткова кіруючы да хацін, пачалі вырашаць гэткую неадкладную справу — начлег.

Пакуль дастукаліся гаспадароў, пакуль пазаводзілі вазы ў двор, то стала яшчэ пазней. Але неўзабаве ўжо

ўсе сядзелі за вялікім сталом. Мужчыны-хутаранцы прымасціліся побач, а жанчыны паспяшаліся ў камору, і хвілін праз колькі на стале стаяла святочная смажаная ласяціна ды свежыя аржаныя перапечкі. Госці са сваіх сундучкоў дасталі мёду ў гладышу, святочнае пітво ў турыным розе, абкаваным срэбрам. Пачалася хоць і позняя, але такая багатая вячэра. Калі рог разы са два абышоў і гасцей, і гаспадароў, то куды складней пацяклі размовы.

— Дык куды вы, госцейкі дарагія, кіруеце? — запытаўся гаспадар хаты.— Нешта здалёк вы, мабыць, бо раней я нікога з вас тут не сустракаў...

— Так, чалавеча, здалёк мы і тут першы раз. А едзем ажно да Плешчаніц. Ці чуў пра такое мястэчка? Там свае тавары прадамо ды з іншых што-небудзь прыкупім. Калі гэткім манерам не атрымаецца, то ці абмяняемся, ці далей падамося, бо з таварам назад вяртацца не выпадае...

— Яно-то так, госці,— умяшаўся ў гамонку яшчэ адзін з хутаранцаў,— ды тут непрадбачаныя абставіны...

— Што яшчэ здарылася? — пераглянуліся паміж сабою прыехаўшыя.— Што такое?..

— Ды нічога надта страшнага. Для нас гэта ўжо стала звычнай з'явай, асабліва падчас такой надзіва мяккай зімы... Бачылі ж, па якой дарозе да нас дабіраліся?..

— Хіба ж гэта можна дарогай назваць? Рака нейкая з бруду і смецця,— адказалі купцы.

— Вось-вось, рака,— ухапіўся за іхнія словы той, хто распытваў.— А далей жа дарога нізамі пойдзе. Уявіце толькі, што вас будзе чакаць наперадзе. Там жа балаціны, азёры, рэчкі, ручаіны... Там не ехаць — плыць трэба, а ў вас гэтулькі тавараў, коней, ніводнага чоўна няма. Населеныя пункты будуць сустракацца вельмі рэдка. Дзе ж вы дапамогі дапросіцеся?

— Мы пра гэта і не думалі. Не гадалі нават, што зіма мяккая стане і нельга будзе рухацца наперад.

— Ды яшчэ, госцейкі, нягледзячы на тое, што стаіць даволі цёплае і дажджлівае надвор'е, рэкі пад лёдам. Але ён ненадзейны, слабы, ступіць на яго конь ці чалавек — і толькі згадкі пра яго хвілін праз пару застануцца...

За сталом запанавала такая цішыня, што выразна

было чуваць, як шкрабецца ці то нешта грызе за печчу непаседа-мышка.

— Вось табе і прыехалі. Вось табе і ўзбагаціліся,— панура вымавіў нехта з прыехаўшых,— тут глядзі, каб дамоў дабрацца, а не пра заробак думай.

— Так, справы нашы нялёгкія...

— Што ж цяпер будзе?

— Вяртацца таксама нельга пустымі, бо засмяюць, пальцамі будуць да смерці торкаць.

Пагаманілі і зноў прыціхлі. Зусім настрой страцілі купцы, пачуўшы такую навіну. Ужо і спаць нікому не хацелася. Сядзелі ды маўчалі. Цішыню парушыў старэйшы з купцоў:

— Вы сабе, хлопцы, як хочаце, а я памкнуся наперад. Мне сорамна вяртацца. Усё жыццё я ездзіў гандляваць, чаго толькі не сустракаў на сваім шляху... Смерць мяне не палохае. Дзеці мае дарослыя, жонка памерла, таму плакаць асабліва ніхто не будзе. А вас за сабою ісці не падбіваю. Няхай кожны падумае, перш чым нешта адказаць. Не прызвычаіўся я на дарозе спыняцца.

— Хлопцы, вы не спяшайцеся тут дамаўляцца. А можа, мароз ударыць. Пагасцюйце ў нас дзён колькі. На свеце ўсялякае здараецца... Пабудзьце, мы ж вас не праганяем. Самі па свеце ездзім, і нас людзі добра прымаюць.

Яшчэ крыху памаўчалі, і купцы, нібы згаварыўшыся, сказалі свайму кіраўніку:

— Да гэтага часу ехалі разам, то і зараз разам будзем, няма чаго нам развітвацца, не даехаўшы да канца. Паедзем, а ўжо што атрымаецца — тое і атрымаецца. Аддамо сябе ў рукі Бога, няхай ён уладарыць над нашымі лёсамі...

— Дзякуй вам за давер, людцы,— праслязіўся стары купец,— а цяпер давайце спаць, бо наперадзе нас чакае шмат выпрабаванняў і цяжкасцей. Пайшлі спаць.

Лёгка сказаць — пайшлі спаць, калі такога наслухаліся, калі пачалі ўзнікаць перад вачыма твары знаёмых і родных, нібы ў апошні момант жыцця...

Раніцай усталі ўсе і давай ціхенька збірацца ў дарогу. Не было чуваць ні ранейшых жартаў-кпінаў, ні вясёлага смеху, людзі не маглі жартаваць у такі момант. Нарэшце старэйшы запытаўся:

— Усё гатова, хлопцы? Нічога зрабіць не забыліся?

Глядзіце, бо ў далейшым нешта выправіць, можа, не надарыцца магчымасці. Яшчэ раз старанна ўсё праверце, пакуль стаім на месцы.

Купцы кінуліся да вазоў і коней, а старэйшы застаўся стаяць. Пра што ён думаў? Ніхто, мабыць, зараз не скажа гэтага, але адно не выключана — пра тое, як давесці людзей да мэты і зберагчы іхнія жыцці.

Калі купцы ўсё пераправерылі і сказалі пра гэта свайму завадатару, той павярнуўся і пайшоў дзякаваць гаспадарам за пачастунак і начлег, за цёплыя парады. Адзін з хутаранцаў, выслухаўшы ўсё, як і патрабаваў тагачасны этыкет, адказаў:

— Мы, чалавеча, таксама спакойна не спалі. Тут вось знайшлі вам правадніка, які гэтыя мясціны ведае, як сваю даланю. Беражыце яго, і ён вас правядзе там, дзе нават сам чорт ногі зломіць...

— Вось за гэта дзякуй вам асабліvae, людцы,— нізка схіліў галаву купец.

Чаго толькі не перанеслі за тую дарогу! Божачкі! На іх, здавалася, абрынулася не толькі зямная, але і нябесная кара: дажджы, завеі, разлітыя рэкі і ручаіны, азёры і глыбокія каляіны. Але самымі страшнымі месцамі былі балоты. Менавіта ў іх чакала немінучая смерць і шчэрыла свае зубы. Ды правёў праваднік купцоў да больш-менш высокага месца, дзе можна было і адпачыць і смела кіраваць далей.

Калі развітваліся, то старэйшы запытаўся:

— Скажы, будзь ласкавы, нам хоць сваё імя, а то ўсё маўчыш і маўчыш. Гэтулькі разам прайшлі, а ні слова ад цябе не чулі.

— Будзьслаў,— адказаў хутаранец і... усміхнуўся.

Ён пайшоў, а тыя купцы заснавалі на тым самым месцы, дзе спыніліся, паселішча і з таго дня кожны раз на ім адпачывалі, калі ехалі з таварам. Назвалі населены пункт імем свайго выратавальніка — Будслаў.

## КНЯГІНІН

Тут такое смешнае і, разам з тым, трагічнае дзеянне адбылося, што пра яго ўжо вунь колькі стагоддзяў людзі памятаюць. Мала гэтага, то і назву наша вёска з таго самага моманту вядзе. А ўсё здарылася з-за нядобразычлівых адносін паміж маці і родным сынам.

Не думайце, што толькі сёння маладыя старым сваю праўду даказваюць, у тыя часы таксама ўсялякага хапала. Гэта ж ад чалавека залежыць, які ён, які ў яго характар і сумленне — так ён сябе і паводзіць. Не хапае ў галаве нечага — дык з бацькамі за чубы брацца хопіцца. А дзе ж вы бачылі, каб у вёсцы нешта зрабіў і цябе не заўважылі? Ды ты пад зямлю зарыйся і там якім дзелам займіся, то знойдуцца такія, што падыдуць і дапытаюцца, чаго гэта ты туды залез. Потым ужо прыплятуць лёгкія языкі і давай мянташыць па ўсім наваколлі. Не толькі адно пакаленне ведаць будзе, але і нашчадкі на колькі каленаў наперад абавязкова пачуюць. Так і тут адбылося.

Аднаго разу, позняй восенню гэта ўсё здарылася, маці мясіла хлеб у дзяжы. Тады ж, бачыце, хлеб пяклі на цэлы тыдзень, а то і на два, каб не адрывацца часта ад іншай якой справы. Месіць яна цеста дый сама сабе песню звычную спявае, каб час хутчэй ішоў:

Ой, дробны дожджык па полю сее,
Мая свякроўка дый мулка сцеле,
Спаці не станеш, спачыць не захочаш...

Далей працягнуць песню гаспадыні не ўдалося, бо дзверы рыпнулі і на парозе з'явілася невысокая постаць малога.

— А мой жа ты сыночак, дык ты ўжо каровак адпасвіў? А я нешта тут затрымалася з працай у двары, то і цеста не паспела да ладу давесці, вось і завіхаюся зараз. Як жа яно там у цябе? Усё добра, нічога не здарылася? Раскажы, сынку.

— Ат,— лянотна адмахнуўся той.

— Ну, чаго ж ты гэта так на мяне? Што я табе благога зрабіла? Удваіх мы толькі з табою жывём, няма ў цябе таткі, а ў мяне мужа. Ведама ж, без дарослага мужчыны ў хаце нагаруешся, наплачашся... Вунь і ты, не паспеў у хату ўлезці, а ўжо і размаўляць не хочаш. Раскажы, як пасвілася, то і мне весялей стане, душа мая супакоіцца...

— Ат,— зноў толькі і зрабіў, што буркнуў сын.

— Гэта мне такая падзяка, што цябе ўзгадавала ды на свет божы хадзіць пусціла? Нават слова добрага матулі роднай сказаць не жадаеш, усё гыркаеш, нібы той сабака на ката. Няўжо я заслужыла ад цябе гэтакую ласку? Няўжо нічога лепшага сказаць мне не можаш? Што ўжо ты за сын...

Але той, здавалася, нібы і не чуў пытання, сядзеў

сабе спакойненька ля камінка і на агеньчык, прыжмурыўшыся, пазіраў.

— Эх, Божа, Божа, і за што мне пакаранне такое?

Ускочыў тады сын і пужкай, якую прынёс з сабою з двара, секануў матулю па плячах. Тая не чакала гэткага павароту справы і ажно зайшлася ад нечаканага ўдару. Потым заплакала-загаласіла. Дайшла справа і да праклёну. Не ведала маці, што болей і гаварыць, таму і вымавіла са злосці і гора:

— Каб жа ты, калі дарослым станеш, пайшоў на коленцах па карчоўі! Каб цябе дзеці твае дамоў не пускалі! Каб унукі ўласныя не прызнавалі! Каб табе ніколі добра не жылося, раз ты мяне гэтак пугай секануў! Каб табе жонка грызля трапілася і грызла цябе не толькі днём, але і ноччу!..

Доўга б яшчэ гаманіла растрывожаная жанчына, каб сын не здагадаўся і не выйшаў з хаціны, гучна ляпнуўшы дзвярыма.

Маці гаманіла, пакуль не ўлеглася спаць, а падлетак так і не вярнуўся да самай раніцы. З сена падняўшыся, за каровамі пакіраваў.

З таго часу прайшло гадоў дзесяць. Усё крыху забылася, сцішылася. Праўда, маці з сынам, калі што якое, дык не саромеліся адзін на аднаго і слова брыдкае сказаць, і праклёнам прайсціся, і дулю паказаць-падсунуць пад самыя вочы. Людзі ўжо звыкліся з такой справай і мала ўвагі звярталі. Толькі, бывала, на сваіх, хатніх, прыкрыкнуць:

— Што, можа хочаце, каб і ў нас гэтак павялося?

Такога, канечне ж, мала хто хацеў.

Але ўсё ішло сваёй чарадой. І надумаў сын той матулі жаніцца. Усё ішло, як мае быць. Дзеўчыну яму высваталі і прыгожую, і працавітую, і пасаг за ёю надта добры абяцалі. Таму задаволены былі і жаніх, і ягоная маці. Рыхтаваліся да вяселля, нават пра спрэчкі свае звычайныя пазабываліся. Хацелася ім у гразь тварам не ўдарыць і людзей належным чынам сустрэць ды правесці. Гаспадыня гэтак і казала:

— Нічога, сыне, што апошняе на тваё вяселле прадаём. Не хвалюйся за гэта, яшчэ нажывём.. Толькі б не смяяліся, што пашкадавалі нечага ці некаму пачастунку або гарэлкі не хапіла... Адзін ты ў мяне, і няма болей для каго збіраць капейку да капейкі. Пасаг вунь які прапанавалі. Пажывём яшчэ, сынок...

Той таксама ласкава ў гэтыя дні да матулі адносіў-

ся, нават на «вы» пачаў да яе звяртацца. Эх, ведалі б яны, што ім на вяселлі старое прыгадаецца, можа, і пашкадавалі б, што некалі не надта думалі пра тое, чым займаліся ды якімі словамі лаяліся. Але пра ўсё па парадку слухайце.

У суботу раніцай пачалі шматлікія госці на вяселле сыходзіцца, а запрашалі ўсіх: і родных, і блізкіх, і суседзяў, і нават проста так — аднавяскоўцаў. Ідуць людзі ды ціха перашэптваюцца:

— Бачыш ты, як развярнуліся, колькі ўсяго нагаталі ды паназбіралі... Пан і той гэтулькі гасцей да сябе не кліча, калі нагода якая надарыцца, а тут...

— Ды што ўжо і казаць. Калі гуляць надумалі, дык гуляць...

— Глядзі ты. Людзі з іх пастаянна смяяліся, а яны чым аддзякаваць вырашылі...

— Пойдзем, хоць паглядзім ды страў святочных пакаштуем...

Гаварылі людзі паціху і нетаропка пасоўваліся да хаціны, дзе ўсіх сустракала шчодрая гаспадыня.

— Заходзьце, госцейкі, заходзьце, не саромейцеся. Гэткая ж ужо ў мяне радасць... Таму ўсіх клікала, нікога не абыходзіла: ні багатага, ні беднага, ні добрага, ні злога... Усе пасядзіце, усе выпіце ды закусіце, паскачыце ды песні паспявайце на вяселлі ў майго сына. Усіх запрашаю.

Неўзабаве і за сталы паселі, частавацца пачалі. Потым жаніх са сватам ды сваімі сябрукамі за маладой пакіравалі. Цуг коней, можа, на паўсотні, расцягнуўся па дарозе, а паабапал яго толькі песні ды свіст моладзі ляцелі. Нішто, здавалася, не стрымае такой буйной грамады.

Каб жа ведалі людзі, што і стрымліваць іх не стануць, само па сабе ўсё здарыцца...

Заехалі, як мае быць, да маладой, выкупілі яе, за сталамі пасядзелі і дамоў сабраліся ехаць. Маці з бацькам дачку сваю абразом на далейшае жыццё благаславілі. Пасадзілі яе ў вазок, следам куфар цяжкі-цяжкі вынеслі і паставілі, яшчэ і расчынілі, каб усе пабачылі, колькі там дабра маці дачцэ да вяселля назбірала. Селі нарэшце, песню велічальную заспявалі і паехалі.

Імчаць нястрымныя коні, паганяюць іх маладыя фурманы, пасвістваючы ды пакрыкваючы і, тым самым, яшчэ болей хуткасці надаючы, а ў вазках задаволеныя людзі сядзяць. І тут раптам, дзесьці на паўдарозе,

дзе абапал яе пачынаўся адразу густы-густы хмызняк, коні рэзка спыніліся. Адзін вазок налятаў на другі, панесліся трывожныя крыкі і воклічы:

— Што там такое?

— Цішэй нельга было? Вунь людзі сабе галовы ледзьве не паразбівалі!

І тут разнеслася галоснае:

— Куды?! Куды?! Ты куды ўцякаеш! Гэта ж тваё вяселле!

— Хто ўцякае?!

— Ды жаніх у кустоўе плетануў, толькі яго і бачылі!

— А можа, яго якраз у гэты момант нечага прыперла?!

Выбухнуў такі рогат, што ажно коні пачалі азірацца.

Праўда, неўзабаве ўсе захваляваліся — жаніха не было, не адклікаўся ён і на галасы. Чакалі яго доўга, можа, гадзін пару, але так і не дачакаліся.

Павярнулі коні назад і павезлі маладую да бацькоў, разам з багатым пасагам. Калі ў вёсцы распавялі маці, што яе сын уцёк, то яна спачатку і слухаць не захацела:

— Панапіваліся ды вярзяце абы-што...

Потым ёй давялі, што да чаго сталася, і тады яна пачала плакаць. Прыгадала, як усё адбылося...

Хлопец аб'явіўся недзе праз пару месяцаў. Але гэта ўжо быў не той здаровы і працавіты дзяцюк. Перад людзьмі паўстаў невядомы, прыгорблены чалавек, з ашалелымі вачыма, а на ўсе пытанні ён адказваў адно і тое ж:

— О, я цяпер жаніўся... На самай прыгожай дзяўчыне... І хату збудаваў... О, я цяпер князь... Княгінін... Няма прыгажэйшай за яе ва ўсім наваколлі...

Галасіла маці, слухаючы такое, плакалі людзі, але дапамагчы звар'яцеламу чалавеку нічым не маглі. Так ён і памёр гадоў праз колькі — утапіўся ў багне, калі недзе з лесу да будана свайго кіраваў.

Пазней на тым месцы нехта хату сабе паставіў, але назва засталася ад таго дзецюка, ад ягоных слоў. Так і цяпер вядзецца — Княгінін ды Княгінін.

## НАРАЧ

Пра гэта ўсе ведаюць. Мабыць, і вы чулі не адзін раз, бо такія легенды не часта трапляюцца. Прыго-

жая, самабытная. І пра возера наша слаўнае, і пра вёску некаторыя адзін і той жа твор распавядаюць, а некаторыя толькі пра населены пункт гамоняць ці, наадварот, толькі пра возера. Бо, самі ж ведаеце, і возера, і вёска аднолькава называюцца — Нарач.

У гушчары старых бароў, як сляза, упаўшая з яснага неба, блішчала-пераліваласяа вялізнае возера. Вельмі прыгожым і непаўторным яно было. Апавяданні пра яго чароўнасць, нават прымхлівасць, ішлі ад паселішча да паселішча, траплялі ў далёкія, замежныя краіны. Заносілі іх туды людзі, якія некалі тут хоць адзін раз у жыцці пабылі і на ўласныя вочы ўсё гэта пабачылі.

Яшчэ-вось пра што распавядалі тубыльцы. У вёсцы, якая прыляпілася да аднаго з пясчаных берагоў возера, жыла дзяўчына. Бацькі яе памерлі, калі яна была зусім малая, а ўзгадавалі сірату бабулька і дзядуля, якія замянілі ёй самых родных і блізкіх людзей на свеце. Звалі яе Найрыта, а па-вясковаму крыху прасцей — Нара. Вочы яе блакітныя, колеру азёрнай хвалі, заўсёды весела ўсміхаліся, здавалася, што яе не могуць выбіць з каляіны нават самыя суровыя выпрабаванні. Залацістыя валасы тугой касой абкручвалі галаву, а постаць была — сама дасканаласць. Голас дзяўчына мела высокі і гучны. Як песню заспявае, то на сярэдзіне возера чуваць. Адным словам, мара гэта была для кожнага дзяцюка, які яе сустракаў.

Вельмі прыгажуня любіла марыць. Для гэтага забіралася куды-небудзь у зацішнае месца і сядзела сабе там, пакуль не прыспяваў час ісці ды працу якую выконваць ці па якой іншай патрэбе кіравацъ дамоў. Бывала, сядзе на беразе пад разгалістым клёнам (гэта было яе самае ўлюбёнае месца, там часта і моладзь вясковая на пагулянкі збіралася), пакладзе на калені просценькія гусялькі і давай паціху іграць. Спачатку іграе, а потым і песню зацягне. Голас павольна цячэ, нібы вадзіца ў ціхай рачулцы, а пасля ўзлятае высока-высока, ажно пад аблокі, якія немаведама куды ляцелі над яе галавою. Уецца песня і разносіцца па наваколлі, толькі водгалас ідзе. У гэты час птушкі і тыя спынялі свой спеў, бо няёмка яны сябе адчувалі, надта майстэрскім было выкананне.

Людзі, адпаведна, забываліся пра гора-злыбеду, сядалі там, дзе іх песня супыніла, і слухалі, слухалі,

гаротна схіляючы галовы ніжэй і ніжэй да зямлі. Магло падацца, што песня да іх даносілася не па паветры, а выкочвалася аднекуль з-пад зямлі. Было ў песнях усё пра іхняе жыццё, цякла яна з-пад самага сэрца, з набалелай душы вясковага жыхара, які ўсё гэта зведаў на сабе. Пасля такіх хвілін сялянам станавілася крыху лягчэй, бо яны бачылі, што нехта ў свеце разумее і іхняе гора, спачувае і ім, гаротным, збяднелым, схударнелым і змізарнелым на чужой працы. Дзякавалі яны ў думках смелай дзяўчыне, прасілі паспяваць яшчэ, каб хоць у песні адарвацца ад страшнай рэчаіснасці, пабыць сам-насам са сваімі думкамі.

Аднаго разу, калі Нара спявала песню, вёскай гэтай якраз праязджаў вяльможны пан. Быў памешчык старым удаўцом. Жонку сваю давёў гэты злыдзень да таго, што яна не вытрымала здзекаў і прыніжэнняў і пакончыла жыццё самагубствам — кінулася з высокай вежы. Сядзеў і драмаў у карэце мясцовы валадар, мала што яго цікавіла навокал. Можа б, і далей праехаў, але нечага трэба ж было фурману прыпыніць коней, а можа, і ён, чалавек паднявольны, заслухаўся песняй і атрымалася ўсё гэта ў яго міжволі. Хто ж яго там ужо ведае. Але, тым не меней, коні сталі. Пан ачнуўся.

— Што гэта? — запытаўся ён у слуг надзіва ціха і неяк незвычайна для яго — па-чалавечы.

— Песня...

— Песня? А хто яе спявае?

— Дзяўчына адна. Мясцовая прыгажуня,— прамовіў магутнага целаскладу ахоўнік, і ў вачах ягоных бліснула сляза.

— Дзяўчына? — перапытаў пан.— А чаму я яе раней не чуў?

— Ды вы проста ўвагі не звярталі на такія дробязі, ваша светласць,— адказаў фурман.

— Сапраўды,— зноў-такі даволі лёгка пагадзіўся памешчык.

Калі песня скончылася, памешчык адразу ж загадаў пад'ехаць да дзяўчыны, каб на свае вочы глянуць на прыгажуню, пра якую па ваколлі хадзілі ўжо цэлыя легенды.

Пад'ехалі, і валадар ажно рот разявіў—такой прыгажосці яму не даводзілася сустракаць на сваім жыццёвым шляху. Доўга не мог ён вымавіць ніводнага

слова. Маўчалі і ўсе астатнія, дзяўчына таксама.

Нарэшце памешчык ачомаўся:

— Прыгожая... Прыгожая кветка вырасла ў гэтым дзікім краі...

— Чаму гэта дзікі край? — смела зірнула ў вочы пану Нара.

Але той не слухаў яе, ён працягваў сваё:

— Здзіўляюся, як ты магла тут вырасці... Але далей ты будзеш спяваць у маім палацы — гэта я ведаю дакладна... Такой прыгажуні спяваць толькі ў маіх пакоях.

— Дрэнная з мяне атрымаецца пакаёўка, пане, я не люблю корпацца ў чужой бялізне.

— А хто табе сказаў, што ты будзеш служанкай?

— Ну...

— Ты будзеш маёй жонкай. Гаспадыняй станеш, ва ўсім наваколлі самай багатай будзеш,— ужо са звычнай для яго пыхай працягваў памешчык.

Вакол той мясціны, дзе спявала толькі што прыгажуня-дзяўчына, сядзела даволі многа вясковых хлапцоў і дзяўчат, таму ўсе яны чулі гаворку. Як толькі пан загаварыў пра замужжа, з мурагу ўзняўся здаравенны хлопец і падышоў да карэты.

— Гэта мая нявеста, пане. Нікому яе за проста так я не аддам.

— А ці не сын ты таго самага Пятрака, які некалі ўзбунтаваў супраць мяне ўвесь мясцовы люд?

— Ага,— спакойна пагадзіўся хлопец.

— Узяць яго, слугі! Узяць! У кайданы за такое!

Кінуліся слугі да хлопца, але не тут-то было! Як размахнуўся ён, як развярнуўся сваімі здаравеннымі плячыма, то нават самы вялізны панскі слуга паляцеў галавою наперад і гопнуў кабылу ў азадак так, што тая зусім па-чалавечы ўкленчыла і трэснула капытом у спіну панскага лёкая. Атрымаў сваё і памешчык. Так і не звязалі слугі смелага дзецюка.

Праз некаторы час памешчык ужо пад значна большай аховай прыехаў у тую ж вёску праведаць Нару. Карцела пану запытацца, ці згодна яна выйсці за яго замуж. Спыніліся коні ля беднага падворка.

Бачыць дзяўчына, што гэты дурань не адчэпіцца, і зрабіла выгляд, быццам бы згодна. Адразу ж і дамовіліся пра вяселле.

Надышоў гэты дзень. Злосны вецер гнаў цёмныя, грувасткія хмары, а лес спяваў жалобныя песні, нечым

яны вельмі нагадвалі хаўтурныя. Нара ехала на фурманцы ў маёнтак, а ў руках трымала ўвесь свой пасаг, які маглі ёй даць бедныя дзядуля і бабуля.

Ля самай брамы сустрэлі яе шматлікія служанкі і павялі ў панскія пакоі, там на дзяўчыну апранулі шлюбную вопратку. Выйшла на ганак Нара і стаяла такой прыгажуняй, што ўсе навокал глядзелі на яе, вачэй не маглі адвесці. Нідзе нельга было знайсці такой прыгажосці, яна была непаўторная. Павярнулася дзяўчына да памешчыка і, пакланіўшыся, папрасіла дазволу вярнуцца назад у пакоі, каб крыху там адпачыць, супакоіцца, бо ўсё гэта для яе надзвычай нязвыкла. Гаспадар, вядома ж, даў згоду. Ходзіць ён сярод гасцей, размаўляе з імі, жартуе, на служанак ды на слуг пакрыквае без дай прычыны, а сам усё на вокны зеўрыць, цікава ж яму ведаць, чым там зараз Нара займаецца.

А дзяўчына тым часам дастала са свайго пакуначка смалякі, якія спецыяльна зараней нарыхтавала, ды падпаліла пакоі з сярэдзіны адзін за адным. Калі шугануў чорны, едкі дым з вокнаў, а на даху заскакалі чырвоныя, трапяткія пеўнікі полымя, выскачыла праз акно, з адваротнага боку будынка, і кінулася ўцякаць да роднай вёскі.

Прыбегла на тое самае месца, да высокага, разгалістага клёна, дзе пастаянна сустракалася са сваім каханым, прыхілілася да здаравеннага, шурпатага ствала і горка-горка заплакала.

У гэты момант пачуўся шматлікі конскі тупат — гэта імчала панская пагоня. Служкі бегалі па ўсёй вёсцы і бязлітасна катавалі нявінных людзей, але тыя зацята маўчалі, ніхто не хацеў выдаваць Нару. Толькі адзін, паміраючы, не вытрымаў і прамовіў:

— Ды вунь жа яна, пад клёнам...

— Не возьмеце мяне жывую! Не возьмеце! Самі свайму пану азадак ліжыце! — крыкнула прыгажуня і кінулася да возера.

Цёмныя хвалі з белымі грабянямі ішлі адна за адной, а ля берага калыхаўся човен, той самы, у якім Нара не раз плавала са сваім каханым. Спрытна і ўмела ўхапілася яна за карму і, адштурхнуўшыся ад берага, села ў човен.

— Я адпомсціла гэтаму злыдню, людзі. За ўсіх адпомсціла... За іх адплаціла, за тых, каго ён знішчыў у сваім палацы...— шаптала Нара.

Адзінае, што здолелі зрабіць панскія слугі,— гэта разбіць і кінуць у хвалі возера гуслі. Тыя самыя, на якіх гэтак хораша іграла дзяўчына.

А човен адплываў усё далей і далей, потым зусім знік сярод высокіх хваляў.

Усю ноч бушавала, не сціхала возера. Стагнаў і роў вецер. Высачэнныя хвалі выкочваліся на бераг і ўсё змывалі на сваім шляху.

З таго самага часу і назвалі людзі возера імем смелай і адважнай дзяўчыны, якая не пабаялася кінуць выклік грознаму пану. Да нашых часоў дайшла гэтая назва — Нарач. Яе атрымала і тая вёска, дзе жыла некалі, даўным-даўно, прыгажуня...

## НІЎКІ

У адной вёсцы было вяселле. Як гэта заўсёды і вялося, хлопец браў сабе дзяўчыну. Стварылі яны новую сям'ю і ад бацькоў адразу ж аддзяліліся. Звалі таго хлопца Сцяпанам, а жонку ягоную — Марысяй. Хацінка ў іх была невялічкая, але затое свая. Ніхто тут не мог на іх накрычаць, ніхто не меў права камандаваць, а для пачынаючых гэта вельмі важна, калі сам сабе гаспадар. Жонцы ў пасаг бацькі далі маладую кабылку. Таму лічылі сябе Сцяпан з Марысяй не вельмі беднымі. А што ім яшчэ трэба было? Хата ёсць, хлеў — таксама, у хляве пара падсвінкаў рохкае ды кабылка стаіць, сена хрумстае. Сэрца радуецца ў іх абодвух, як на падворак выйдуць. Толькі жыві і гора ніякага не ведай. Так ім марылася, але некаму жадалася па-іншаму. І вось як усё адбылося.

Аднойчы вечарам, калі Сцяпан з Марысяй перакусілі, пагаманілі крыху і спаць паляглі, каб з самае раніцы на ніўку пайсці шчыраваць, нехта пастукаў у акаміцу. Так моцна загрукаў, што здавалася, сцяну вываліць. Усхапіўся гаспадар і паклыпаў, спяшаючыся, да акна. Прыхіліўся тварам да шыбы, бачыць — сапраўды стаіць нехта, але пазнаць яго не можа.

— Хто там такі? — пытаецца Сцяпан.

А той самы цень і адказвае:

— Я гора тваё, чалавеча. Хочаш вер, хочаш не вер, але гэта так.

— Якая розніца, веру я табе ці не, але чаго ты тут апынулася?

Запанавала непрацяглая цішыня, пасля якой гора зноў азвалася:

— Ды вось, гуляла па белым свеце і тут апынулася. Падумала, падумала і вырашыла запытацца ў цябе, гаспадар: калі ты хочаш з жонкай жыць добра, у маладосці ці ў старасці? Маецца на ўвазе, у дастатку ды ў багацці, каб ніякай нястачы не ведаць. Вось што мяне зацікавіла. Які будзе твой адказ?

— Мой адказ? — перапытаў Сцяпан і прыціх.

— Што ты змоўк, чалавеча?

— Ды думаю...

— Думай, думай, але час не надта зацягвай.

— А можна я ў жонкі запытаюся? Мы ж цяпер адна сям'я і ўсё павінны разам вырашаць. Аднаму неяк не выпадае...

— Запытайся, запытайся, але толькі ў хаце не хавайся, бо ўсё роўна знайду.

— Не палохай.

Падышоў да жонкі і катурхае тую за плячук, а калі Марыся прачнулася, то і запытаўся, распавядаючы ёй пра сутнасць справы. Тая выслухала і адказвае:

— А навошта нам, Сцяпанка, жыць у старасці добра? Што нам тады трэба? Спарахнеем абодва, як пні старыя і ўсё... Зараз лепей добра пажыць, жыццю парадавацца, паглядзець на свет, людзей усялякіх пабачыць... Вось гэта сапраўднае жыццё было б, шчаслівае і вясёлае. А то ў старасці... Не, толькі ў маладосці.

Пайшоў гаспадар назад да акна і перадаў жончын адказ гору. Тое гучна зарагатала і, нічога болей не гаворачы, знікла. Сцяпан пастаяў колькі хвілін і спаць заваліўся, а раніцай, як усталі, дык і забыліся пра начное здарэнне. Паехалі ў поле, напрацаваліся там да сёмага поту і назад прыехалі на самым змярканні. А стомленаму чалавеку што трэба? Якога кіслага малака з бульбай пасёрбае — і на бок, каб даць адпачынак стомленаму целу. Так і яны зрабілі. Захраплі адразу, як толькі галовы да падушак дакрануліся. Толькі спаць доўга спакойна не давялося. Недзе, якраз калі поўнач наступіла, загарлалі голасна суседзі, залямантавалі так, што і мёртвага з магілы паднялі б, не тое што жывога, няхай сабе і стомленага.

— Пажар! Пажар! Ратуйцеся! Пажар! Хлеў гарыць! Сцяпанаў хлеў гарыць!

Ускінуліся Сцяпан з Марысяй, нібы і не ляжалі,

і да акна хуценька. А там, сапраўды, гарыць-палае іхні хлеў. Яны тады ў двор і ледзьве паспелі дзверы адчыніць, каб кабылку сваю ды падсвінкаў жывымі выпусціць. Толькі гэта зрабілі — дах і аб'ехаў на дол. Заплакала маладая гаспадыня, а гаспадар і кажа, да яе звяртаючыся:

— Не ўбівайся, Марыська, усё трэба пераждаць, і гора ўсялякае, і злыбеду... Галоўнае, што мы жывыя і здаровыя, ды набытак наш таксама, а ўсё астатняе справа нажыўная. Праз нейкі там год яшчэ лепшы і большы хлеў для жывёлы адбудуем. Пабачыш, спраўдзяцца мае словы.

Але гаспадыня па-ранейшаму хліпала і не пераставала плакаць.

Зноў пайшлі на працу, зноў вярнуліся дамоў на змярканні і палеглі спаць. Ды яшчэ адно гора здарылася ў тую ноч. Толькі заснулі, а ўжо крычаць суседзі:

— Уцякайце! Уцякайце з хаціны! Сцяпан, Марыська! Ваша хата гарыць!

У чым былі, у тым і выскачылі на вуліцу гаспадары, а хата ўжо так занялася, што яе і тушыць няма ніякай патрэбы. Сталі ўсе і глядзяць. Неўзабаве ад хаціны засталася гара галавешак і ўспаміны, што тут было жыллё людзей.

Дачакаліся раніцы маладыя і пачалі вырашаць, як жа ім быць далей, што рабіць, каб неяк да зімы зноў узбіцца на сваю гаспадарку, бо калі прыцісвуць маразы з халадамі, то не да такіх турбот стане. Гаворыць Марыська:

— Слухай, Сцяпанка, раз ужо так здарылася, то няма чаго нам тут болей сядзець і чакаць. Мабыць, тое гора, якое да нас ноччу прыходзіла, нешта пераблытала, і ўсё пайшло іншым шляхам. Давай збяром, што ў нас засталося, пакладзём на воз, запражом сваю кабылку і пакіруем, куды вочы глядзяць.

— Відаць, ты маеш рацыю,— пагадзіўся Сцяпан,— бо болей нам і сапраўды нічога рабіць не застаецца. Трэба ў свет кіраваць. Там пабачым, як яно ўжо атрымаецца.

— Давай так і зробім. Няма чаго час марна бавіць. Пайшлі збірацца.

— Пайшлі.

Пакуль сабраліся, пакуль кабылку запрэглі, то і полудзень прыспеў. Але ж усё роўна, не паедзеш жа ў свет, з суседзямі не развітаўшыся. Сталі Сцяпан

з Марыськай двары сялянскія абыходзіць і развітацца. Дзякавалі яны вяскоўцам, тыя ім таксама, даравалі адзін аднаму крыўды і знявагі, прасілі прабачэння і ў дарогу выправіліся з чыстай душой. Іх усе павыходзілі праводзіць.

Ехалі маладыя муж з жонкай дзень, ехалі другі, а на трэці спыніліся пераначаваць пад высокім дубам. Распалілі вогнішча, паставілі варыцца бульбу ў гаршчочку і самі ўзяліся марыць. Ведама ж, маладыя, а іх хлебам не кармі — дай пагаманіць пра будучае.

— Вось каб дзе выбіцца на ўрадлівую зямлю, то там бы і спыніліся, там бы і жыць пачалі нанова,— гаварыў Сцяпан.

Марыська ўважліва слухала мужа, але мела свой план.

— Мне б хацелася, каб побач рэчка была ці азярцо, хоць самае невялічкае, і там бы гусі-лебедзі плавалі... Грады нашыя амаль да азярца падступаліся і мы іх апрацоўвалі. Добра так было б...

— Ага,— пагадзіўся і Сцяпан.

Павячэралі яны, кабылку муж спутаў і адпусціў пасвіцца, а самі спаць ляглі.

Ды раніцай іх новае гора напаткала. Пачалі шукаць кабылку — няма яе нідзе. Яны і туды, яны і сюды — не, няма. Пайшлі ў розныя бакі, і раптам Марыська закрычала:

— Сцяпанка, бяжы сюды хутчэй!

Падбег ён да жонкі, а тая ўжо плача над касцьмі кабылкі. Не было яе болей — з'елі ваўкі ноччу, а яны спалі побач і нічога нават не чулі.

Цяпер ужо зусім рукі ў маладых апусціліся. Як жыць далей, і не ведаюць. Устаў у адчаі муж, азірнуўся і... заўсміхаўся. Жонка здагадацца не можа, чаго гэта ён. А Сцяпан пакручваецца на месцы, і твар ягоны свеціцца, нібы ён скарб закапаны знайшоў.

— Чаго ты, чалавеча? Што здарылася, скажы і мне?

— Ты казала, каб зямля добрая, каб рэчка ці азярцо побач, каб гусі-лебедзі ў ім плавалі...

— Казала, ну і што? — захвалявалася заплаканая Марыська.

— А ты ўстань і паглядзі лепей, тады ўсё да цябе і дойдзе.

Усхапілася жонка і давай галавою круціць. Туды-сюды азірнулася і таксама заўсміхалася.

— Сцяпанка, дык гэта ж і ёсць такая мясцінка, пра якую мы з табою з вечара марылі!

— Так...

— Гэта і будзе наша ніўка.

— Відаць, што так і будзе ўсё, як марылася.

Адтуль і павялося «ніўка». А калі побач іншыя хаціны паўсталі, то ў кожнага гаспадара была свая ніўка, таму і атрымаліся Ніўкі.

## ЧАРАЎКІ

Мне вядомы два паданні, якія распавядаюць пра тое, адкуль узялася назва ў нашай вёскі. Гэта і не дзіўна, бо дзве думкі аднолькавыя рэдка калі сустракаюцца. На першы погляд здаецца, што яны падобныя паміж сабою, а пачнеш услухоўвацца і заўважыш, што адрозніваюцца, і даволі істотна. Мая бабуля некалі расказвала абодва творы, то і я іх памятаю. Яна амаль сто гадоў пражыла, прыгон добра памятала, такія гісторыі ды былічкі распавядала, што па спіне ад жаху мурашкі бегалі, нельга было без слёз слухаць. Што хацелі паны з народам, тое і выраблялі. Беднаму вяскоўцу толькі і заставалася, што трываць гэтыя пакуты да таго часу, пакуль зямля-маці не злітуецца ды ў свае недры назаўсёды не забярэ. Спадзявацца можна было, што пасля смерці Усявышні прапусціць душу за шматлікія беды на зямлі ў рай, дзе яна і зойме адвечнае месца. Ніхто потым не згадваў з нябожчыкаў, ці здарылася хоць з адным гэткае. Толькі ў казках нябожчыкі размаўляюць, а на самай справе, як памёр — то ўжо назаўсёды, і нікуды ты болей не пойдзеш, ні да каго не звернешся. Згніеш дый годзе.

Адно паданне па сваім змесце вельмі нагадвае тыя жахлівыя часы.

Раней наша вёска называлася не Чараўкі, а крыху па-іншаму — Чараўнікі. Гэта было ад таго, што ў ёй жыло вельмі многа чараўнікоў, вешчуноў, знахараў, прадказальнікаў, шаптуноў і іншых людзей, якія маглі нешта такое, на што звычайны чалавек не здольны. Самым страшным і бязлітасным чараўніком быў не хто іншы, як сам мясцовы памешчык. Вось дзе ўжо ваўкалака быў, вось хто ўжо паздзекаваўся над ні ў чым не павіннымі, проста выпадкова сустрэтымі, людзьмі! Ні сэрца ў яго не было, ні душы. Нікога

не шкадаваў, ні старога, ні малога, ні крывога, ні сляпога. Раз трапіўся да яго, то жывым не выпусціць. Мала гэтага, яшчэ так нацешыцца, што чалавек той смерці ўласнай будзе жадаць, як пазбаўлення ад невычэрпных пакут-болю. А памешчык будзе сядзець побач ды пазіраць з асалодай, як ягоная ахвяра пакутуе. Усмешка, здавалася, у такія моманты ніколі не сыходзіла з твару людажэра. На ўсе просьбы-мальбы няшчасных людзей адно толькі ведаў казаць:

— Хіба вы мяне пашкадавалі б? Таму маўчыце, не звяртайцеся з просьбамі, бо паратунку вам не будзе.

А калі чуў праклёны, то рагатаў ва ўвесь голас, нібы яму пра якое смешнае здарэнне распавядалі.

Акрамя ўсяго таго, што ён валодаў чарамі, то, як памешчык, меў яшчэ і ўласны маёнтак, і сялян, да яго прымацаваных. Вось дзе ўжо каму нельга было пазайздросціць, дык гэта ім, бедным і шматпакутным. Што захоча пан, тое і зробіць, што яму ў галаву ўваб'ецца, тое абавязкова і выканае.

Некалі, у маладосці, у яго і жонка была, і дзеці пайшлі. Але ўсіх іх пярэварацень панішчыў. Усіх заўчасна да магілы давёў. Нават сэрца крывёю ні разу не аблілося, калі ўласных дзяцей зямлёю засыпаў. Вось дзе ўжо пачвара была!

Пад глыбокую старасць гэты пан-чараўнік вырашыў жаніцца. Выбраў сабе самую прыгожую дзяўчыну з вёскі. І, нягледзячы на тое, што ў яе жаніх ужо быў, што вяселле ў іх у хуткім часе павінна было адбыцца, сілай прывёў бедалагу ў свой палац.

Наспеў вечар, і гаспадар пачаў прымушаць дзяўчыну, каб ішла спаць да яго ў адзін ложак, але тая, гэткая ганарліўка, плюнула ў ненавісны твар памешчыку і сказала з выклікам:

— Хоць ты праваліся! Хоць ты задавіся, але гэтак, як ты хочаш, не заўсёды будзе! Разявіў рот! Узяць сілай ты мяне узяў, згвалтаваць сілай таксама можаш, толькі не чакай, што я па сваёй ахвоце да цябе ў ложак пабягу! Апенька ты ссохлая, а не мужчына, яшчэ і ротам нешта шамкаеш. Можа не спадабалася ці не згодны?! Ды лепей з сабакам бяздомным пад плотам спаць, чым з табою!

Гаспадар не чакаў гэткага адпору і не ведаў у першыя хвіліны, што яму рабіць. Вачамі лыпае, рукамі махае, на слуг пазірае, а сказаць нічога не можа.

Прарвала яго толькі пасля таго, як дзяўчына зарагатала, гледзячы на злыдня. Засмяялася гэтак галасна і адчайна, што нават мёртвага абудзіла б. Тады і прарэзаўся голас з панскага горла:

— Што?! Што?! Што ты сказала?! Ды ты на мяне такімі словамі кідаешся?! Ды я табе за гэта! Я табе за гэта!

— Што ты мне?! — зноў не ўтрывалася і ўставіла сваё слова прыгажуня.— Што?!

— З сабакам ёй спаць пад плотам лепей, чым са мной у ложку! Ах, вы паглядзіце на яе!

— Паглядзі, паглядзі!

— То раз табе гэтак хочацца сучкай стаць, дык і будзь ёю назаўсёды!

Толькі мовіў памешчык такія словы — дзяўчына адразу захісталася і стала ў росце меншаць.Валасы з галавы пасыпаліся, а на руках і на нагах густая поўсць з'явілася. Так і стала сучкай, як гаспадар і закляў.

Дык мала гэтага. Злы памешчык прымусіў бедную жонку сваю бегаць з ім на паляванне і там ганяць зайцоў ды лісіц. Сам едзе верхам на коніку, стрэльбу за плечы закіне ды пасміхваецца, гледзячы, як ягоная сучка па кустоўі шнырае, звяроў ды птушак шукае. Калі ж тая прыстане, то як джыгне, не шкадуючы, бізуном, дык яна, бедная, і з ног пакоціцца і заскуголіць-заплача чыста чалавечым голасам. Гаварыць-то яна магла, як і раней, а вось аблічча чараўнік ёй надаў сабачае. Так і доўжылася б, можа, яшчэ многа гадоў, каб не адзін выпадак.

Звычайна, калі ехалі на паляванне, то памешчык сучку сваю аддаваў весці самаму злому са слуг і той за яе галавой адказваў. Адзін жа раз той слуга нечага прыхварэў, і на ягонае месца паставілі маладога хлопца, той не быў у курсе справы і не ведаў добра, што да чаго. Едзе за панам і за ягонымі сябрукамі, а тут сучка галаву павярнула да слугі і ўзмалілася ціхенька:

— Адпусці мяне, хлопча, хоць на дзесятак хвілін. Пашкадуй ты мяне. Мы тут будзем непадалёку ад адной вёскі паляваць, а ў той вёсцы якраз мая радзіна жыве. Хочацца хоць адным вокам зірнуць, што там робіцца. Не перажывай, ты не паспееш і дзве сотні крокаў праехаць, не спяшаючыся, як я назад абярнуся. Адпусці...

Шкада стала служку беднай сучкі, ён яе і ад-

пусціў, але папрасіў толькі, каб яна не познілася, бо тады яму галавы не знасіць.

Маці той дзяўчыны якраз бліны пякла, а ўся сямейка за сталом сядзела, сняданку чакаючы. Тут адчыніліся дзверы і ў хату ўляцела рыжая сучка, схапіла колькі бліноў з услона і ўцякаць, а гаспадыня ўвішная была, як аперазала яе качаргою, дык тая і... закрычала чалавечым голасам:

— Ай, мамачка ж мая родная, ай, чаго ж ты мяне гэтак моцна лупцуеш? Хіба ж табе шкада адзінай дачцэ парачку бліноў?

Усе ў хаце аслупянелі. Якая дачка? Якая адзіная, калі перад імі сучка?

Праз колькі часу ўсё стала вядома. І тады браты пакляліся вызваліць сястру з нядолі, а яе бязлітаснаму гаспадару адпомсціць.

Сучка пабегла на паляванне, а браты ўзяліся меркаваць, як жа свой план здзейсніць. Нарэшце дадумаліся.

Дачакаліся наступнай нядзелькі і заселі ў засаду ў тым месцы, дзе найболей часта памешчык любіў на паляванні стаяць. Адразу і пашанцавала ім, бо сапраўды злы чараўнік якраз туды і прыпёрся. Як ускінуліся на яго хлопцы, як пачалі біць, то нічога не дапамагло прыгнятальніку: ні слугі не паспелі падбегчы, ні яго чараўніцтва не выратавала. Браты пана забілі, закапалі, а зверху камянёў вялікіх наскочвалі, каб не выбраўся ваўкалак пракляты.

Шукалі памешчыка, але, мабыць, не надта імкнуліся праўды даведацца, бо гэтак і не знайшлі.

Дзяўчына тая дамоў вярнулася, замуж выйшла і зажыла шчасліва. З таго часу слова «чараўнікі» стала нібыта зневажальным, і таму саму вёску перайначылі ў Чараўкі. Ад таго ўсё і засталося.

І яшчэ адно паданне вам раскажу.

Раней наша вёска не Чараўкі называлася, а Падрэзы. Гэта ўжо, як прыйшлі Саветы, дык яна тады і стала звацца Чараўкі. А Падрэзамі была таму, што зямля была парэзана на чвэрткі і валокі. Усе мясцовыя памешчыкі і падпанкі ўсялякія мелі багатаворнай зямлі, сенажацяў і лясоў, а ў бедных то чвэртка, то яшчэ меней. Вось паспрабуй пажыві ды пракармі сям'ю, калі на той палосцы павярнуцца няма дзе. Таму тое месца, дзе жылі бедныя, і называлі Падрэзы, што вельмі густа межы былі парэзаны.



# НЯСВІЖ

Па-ўсялякаму гавораць пра тое, адкуль пайшло наша месца. Той так кажа, а той па-іншаму, а каб усе да аднаго прыйшлі, то такога не здаралася. Мне вось што расказвалі.

Сам па сабе Нясвіж стаіць ужо каля васьмі стагоддзяў, а мо і болей. Зямля надта прыдатная для таго, каб на ёй сяліліся ды жылі. Бачыце самі, якія навокал палі, лясы, лугі ды рэкі. А даўней жа яшчэ прыгажэй было. Гэта апошнім часам усё павысякалі ды паасушвалі. А тады пушчы-бары такія былі, што за тыдзень на самым хуткім кані не аб'едзеш ад краю да краю, можа, і месяца не хапіла б. Звяр'я ўсялякага ды птушак гэтулькі было, што да самых хацін людскіх выбягалі. Паляваць на іх далёка ніхто і не адыходзіў. Ат, нейкую вярсту — і добра, а то за агародамі ці ў канец вёскі выйдзе селянін і дамоў вяртаецца са здабычай. Вось як усё было.

Бедныя людзі самі па сабе на паляванне хадзілі. Ды не ўсюды ім дазвалялася звера біць. Былі такія мясціны, куды можна было толькі багатым панам ды князям прыязджаць. А калі небарака які забіраўся

туды без дазволу, то яго сурова каралі за парушэнне парадку. Маглі нават жыцця пазбавіць.

Збяруцца, бывала, князі ці валадары якія мясцовыя і паедуць паляваць. Каму і радасць ад таго, а каму і гора, бо ніхто не звяртаў увагі, кудою ехаць, гналі праз лугі, нетры ці засеяныя палі. Вытаптвалі, вынішчалі ўсё навокал, і каліўца цэлага не заставалася. А селянін гаротны аддуваўся халоднай і галоднай зімой за гэтую патраву і бядоту. Самі паляўнічыя пасля палявання песні спявалі ды апавядалі пра ўсялякія здарэнні, а тым, каго на ловы зганялі з навакольных вёсак, здаралася, за ўвесь дзень і кавалка хлеба сухога не давалі. А часам раз'юшаныя звяры калечылі ці наогул задзіралі безабаронных загоншчыкаў, якія нічога не маглі супрацьпаставіць магутным жывёлінам, акрамя ўласных рук, бо зброю ім нават насіць, не тое што страляць, забаранялася. Так і жылі спакон вякоў.

Аднаго разу самы галоўны князь — Радзівіл — сабраў сваіх сяброў і гасцей на паляванне. Надта ж любіў гэты яснавяльможны валадар багаццем пафарсіць перад запрошанымі. У любым выпадку імкнуўся зрабіць нешта так, каб яго памяталі ўжо да скону жыцця. Нічога не шкадаваў. Ды і чаго было скваплічаць, калі на яго працавалі дзесяткі тысяч, а можа, і сотні людзей паспалітых. Золата, каштоўнасці фурманкамі ў галоўны палац звозілі. Ён яго і прагульваць не паспяваў. Ведама ж, каб сам гарбаціўся, то і да другіх па-іншаму адносіўся б, а то... Накрыюць сталы ў палацы, панаставяць слугі гэткіх страў і він, што і каралям заморскім не снілася, і давай сабе гуляць. П'юць-спяваюць тыдзень запар, а спадабаецца — то і значна болей. Потым на паляванне збірацца пачынаюць. Іншы гаспадар і на вайну гэтак не выбіраўся, як паны гэтыя, у лес едучы.

Так было і на гэты раз. Слуг ды памагатых ехала — і не пералічыць. Сотні вазоў, фурманак пылілі па вясковых дарогах, да пушчы дабіраючыся. Хмары вершнікаў па навакольных палях ды лугах дарогі прабівалі. На многа вёрстаў нават птушкі ў бакі разляталіся, бо не чулі раней такога вэрхалу і тлуму. Толькі на месцы палявання сцішыліся. Найбольш шаноўных гасцей на чале з самім Радзівілам разводзілі па засадах ды спецыяльных дамках, і там яны чакалі пачатку пампезнага мерапрыемства. Загоншчыкі, лоўчыя ды

палясоўшчыкі яшчэ зараней зганяліся ў пушчу і добра ведалі, адкуль пачынаць, калі і куды напалохваць звяроў.

Пан Радзівіл, ведама ж, нікому не аддаў свайго самага ўлюбёнага мястэчка. Непадалёку ад ручаіны стаяла складзеная са старых бёрнаў хацінка. Нават зблізку яе нельга было заўважыць — гэтак па-майстэрску выканалі працу майстры. Затое з вузенькіх акенцаў бліжэйшыя падыходы ў пушчу былі як на далоні. Там вяльможны пан і любіў сядзець, цікуючы ды пасмейваючыся над гасцямі, асабліва над надзвычай хуткімі ды няўдалымі, што «мáзалі» раз за разам.

— Паляўнічы мне знайшоўся! Ды ў таго тура каменем можна было патрапіць, не тое што з ручніцы! Эх, толькі тлуму нарабіў, а стрэліў, то...

Сам жа Радзівіл быў стралком выдатным: вока толькі прыжмурыць і як плясне — дык жывёліна капыты ўгору адразу і задзярэ. Канешне, і стрэльбы ў яго былі, як ні ў кога, можа, на сотні вёрстаў навокал.

У той раз, як і заўсёды, побач з вяльможным у хацінцы сядзеў стары палясоўшчык-слуга, які павінен быў хутка забіваць набоі ў стрэльбы і падаваць іх Радзівілу, а таму заставалася толькі страляць і не «мазаць». Дык князь свайму служку і кажа, гледзячы на тое, што некаторыя з паляўнічых ужо і зуброў і тура паваліді:

— Сцяпане, быў бы ты панам, колькі б настраляў? Колькі б паваліў звяроў вакол гэтай хаціны? Ведаю, што страляеш не горш за мяне, нягледзячы на тое, што не стрэльба ў цябе, а нейкая ламака. Бачыў, як ты лупіў з яе. Бачыў.

— Я, пане, калі б такую волю меў, то ўвогуле гэткія дзікія паляванні забараніў бы. Навошта столькі жывёлін губіць? Навошта гэтулькі жыта ды пшаніцы вытоптваць, нівы і лугі сялянскія дратаваць? Хай бы бегалі сабе па лясах ды барах звяры, хай бы птушкі лягалі, дзе хацелі. Чаго ўжо нам не хапае?..

Памаўчаў Радзівіл, не раззлаваўся на Сцяпана, бо надта паважаў гэтага слугу і даражыў ім, яшчэ бацьку ягонаму верна служыў стары. Азірнуўся на сцяжынку, што вяла ў пушчу:

— А што, можа, і праўду, чалавеча, гаворыш. Не буду я сёння страляць толькі дзеля таго, каб гасцям паказаць, які я ўмелы ў гэтай справе. І ўвогуле не буду болей наладжваць гэткія пыхлівыя паляванні. Неяк

раней і не задумваўся над тым, што ты зараз сказаў. Страляў дый годзе, а што там потым будзе і ў галаву не прыходзіла...

Але раптам ажывіўся пан Радзівіл:

— Глядзі, Сцяпан! Глядзі! Гэткага асілка я ніколі не бачыў, колькі палюю! Гэта ж, што тая гара!

Падступіў палясоўшчык да валадара і паглядзеў туды, куды ён рукою паказваў. І сапраўды, там вылазіў на палянку вялізны мядзведзь. Выкраўся паціху і прыўзняўся, відаць, хацеў пераканацца ў тым, што паблізу нікога няма і яму ніхто не пагражае. Звер стаяў на задніх лапах і смешна нюхаў паветра. Радзівіл замітусіўся:

— Ведаеш што, Сцяпане, я хоць і слова табе толькі што даваў, але па гэтаму стрэльну, бо такі выпадак на сто гадоў адзін раз прыпадае. Калі яшчэ надарыцца веліканa гэткага пабачыць ды ўпаляваць? Вось госці пазайздросцяць!

— Зноў, каб толькі зайздросцілі, а ўсё астатняе на задні план адступае...— незадаволена прагуў палясоўшчык.

Але валадар ужо ўз'еўся:

— Не твая справа, мужыцкае рыла! Ведай сваё, а то дагамонішся ў мяне!

Сцяпан адразу заціх і адступіў крокаў колькі назад. Пан загадаў:

— Давай маю самую найлепшую стрэльбу! Тую, з якой я любога звера забіваў з першага разу. Паядынку маю давай, ды хутчэй, кешкаешся там нечага!

Слуга працягнуў паядынку і ціха прамовіў:

— Вось яна, ваша светласць...

Радзівіл таропка ўскінуў стрэльбу да пляча і стаіў дух. Марудна, надта марудна цягнулася тая хвіліна, пакуль ён цэліўся. Сцяпан толькі нецярпліва перабіраў нагамі і пазіраў у акенца. Нарэшце грымнуў стрэл. Пасыпалася лісце, і дробныя голькі пападалі долу, а мядзведзь дзіўна падскочыў уверх і... пабег. Але не туды, адкуль прыйшоў, а прама на хацінку, у якой сядзеў Радзівіл. Паляўнічы спачатку падумаў, што звер спалохаўся і са страху заламаў прама на верную смерць. Ды дзе там! Мядзведзь прабег крокаў з трыццаць і сaўгануў у гушчар, які пачынаўся адразу за ручаінай. Пан ашаломлена глядзеў на кустоўе, якое ўжо скрыла ляснога асілка, потым крута павярнуўся да Сцяпана і разгублена прамовіў:

— А цяпер?.. Што цяпер мне рабіць?.. Няма ж нікога... Толькі мы з табою... Што ж далей?..

— Што, удваіх мала на аднаго звера? — занадта спакойна прагуў палясоўшчык.— Яно ж, ведама, калі б цэлай кампаніяй, ды са стрэльбамі, ды з сабакамі, ды яшчэ сотні дзве-тры слуг, тады ўсе вы смелыя, нічога не баіцеся.. А тут сам-насам трэба з падраненым мядзведзем выйсці...

— Падраненым? — здзівіўся разгублены Радзівіл.

— Так,— адказаў слуга,— хіба ж пан не бачыць кроў на пяску?

— Ну і зрок у цябе, Сцяпане. Як ты здолеў на такой адлегласці разглядзець?

— Ды чаго там,— адмахнуўся палясоўшчык.

— То што далей рабіць будзем? Час жа губляць нельга,— занепакоіўся Радзівіл.

— А нічога рабіць не будзем незвычайнага. Даганяць трэба асілка. Па слядах, пане, пойдзем з вамі. Толькі глядзіце, каб усё, што я скажу, выконвалі адразу і безагаворачна, бо памылка ці прамаруджванне можа каштаваць жыцця. Зразумелі?

— Зразумеў, чаму ж не,— не надта ахвотна выдавіў з сябе чалавек, які прывык усё жыццё камандаваць, а тут, наадварот, загадвалі яму самому.— Трэба — то буду выконваць. Пайшлі хіба, ці што!..

— Пайшлі...

Паляўнічы і ягоны палясоўшчык борздзенька шмыгнулі ў дзверы і пакіравалі па слядах мядзведзя.

— Во, пан, якія буйныя кроплі крыві на пяску і на лістах засталіся там, дзе звер бег,— ціха прамовіў палясоўшчык.

— Так,— адказаў Радзівіл, задаволены, што не прамахнуўся і на гэты раз.

— Глядзі, пане, не забывай, пра што я казаў табе.

— Памятаю.

— То пайшлі далей, тут мядзведзь не збіраўся адпачываць ці на нас нападаць. Бачыш, якім буйным крокам уцякаў. Далей адыходзіць. Можна і нам паспяшаць.

Доўга ішлі таропкім крокам Радзівіл з палясоўшчыкам. Пан стаміўся моцна, але перад старым чалавекам, які нібыта і не адчуваў цяжкасцей дарогі, няёмка было яму, маладому яшчэ князю, гаварыць пра стому. Ён проста прыцішыў хаду, але ягоны слуга не першы раз быў у лесе і адразу здагадаўся:

— Зараз, пане, выйдзем на сухое месца і перасядзім якую хвіліну, каб сілы аднавіць ды перакусіць чаго-небудзь. Крокаў трыста пройдзем, а там пагорачак будзе, і крынічка побач. Я тут быў нядаўна, мясціну ведаю, то і перадыхнем.

— Трэба, дык трэба,— ціхенька, каб не паказаць радасці, адказаў Радзівіл.— Толькі каб звера не адпусціць далёка...

— Не адпусцім, не адпусцім, пане. Ён цяпер не так палохаецца і ідзе спакайней. Можа прылегчы дзе-небудзь у зручнай для яго мясціне...

Папілі вадзічкі, прыселі на пагорачку. Сцяпан дастаў з-за плячэй невялічкую торбачку і, развязаўшы яе, дастаў адтуль кавалак аржанога хлеба і вэнджанага мяса. Парэзаў на долькі і прапанаваў:

— Перакусім, пане, чым Бог пачаставаў... Ведама ж, не багата і не княжацкі стол, але нам жа трэба далей ісці, мядзведзя высочваць ці, можа, вернемся, яснавяльможны?..

Радзівіл ужо жаваў і, чамкаючы, адказаў:

— Не, вяртацца не будзем. Вось перакусім, вады яшчэ пап'ём і далей пойдзем. Такога мядзведзя нельга ўпускаць. Можа, у жыцці болей не давядзецца з такім асілкам спаткацца. Пойдзем.

Паелі, і князь на мяккую траўку заваліўся. Стома сваё ўзяла, і як ён ні трымаўся, але здаўся, заснуў. Сцяпан сядзеў побач, прыжмурыўшы вочы і нечаму пасміхваючыся. Праз нейкую гадзіну палясоўшчык пачаў катурхаць Радзівіла:

— Княжа, княжа, уставай ды далей пойдзем, бо потым ці сляды згубім, ці не дагонім параненага звера. Уставай, княжа.

Нехаця адарваў галаву ад кулака валадар. Яму ён у гэты момант быў мякчэйшы і мілейшы за самую мяккую падушку.

— Пойдзем, княжа.

— Пойдзем, Сцяпане, пойдзем, вось толькі хвілінку яшчэ пасяджу.

Усталі і пайшлі. Неўзабаве знайшлі свежыя сляды мядзведзя. Жывёліна ўцякала ўжо не гэтак хутка, як раней. Сказалася страта крыві, ды і стаміўся, відаць. Палясоўшчык тыцнуў рукою на глыбокі след у макраватым пяску і прамовіў:

— Глядзі, княжа! Бачыш, як цяжка сунецца. Недзе ляжыць зараз звер і прыслухоўваецца, а не

выключана, што і сочыць за намі, у любы момант напасці можа...

Радзівіл толькі хуценька азірнуўся ў адказ і бліжэй ступіў да Сцяпана, нібы шукаў у яго паратунку.

— Не, усё роўна не павярну назад. Пойдзем да канца.

— Ды я і не адмаўляю, княжа, але перасцерагаю.

Прайшлі пару вёрстаў, і палясоўшчык спыніўся.

— Што з табою, Сцяпане? — запытаў усхваляваны князь.

— Нешта не падабаецца мне тут, яснавяльможны. Здаецца нібы нехта зырыць за намі вунь з тае лагчыны,— і стары працягнуў руку ў бок невысокага асінніку.— Можа, і залёг мядзведзь там ды чакае, калі мы міма пойдзем, каб нечакана кінуцца.

Пастаялі і паціху сунуліся наперад. І што ж вы думаеце? Толькі параўняліся з тым асіннікам, як раўнуў мядзведзь страшэнным голасам і кінуўся на паляўнічых. Радзівіл не паспеў і стрэльбу з-за плячэй дастаць, толькі рукамі закрыўся з перапуду. Затое Сцяпан не разгубіўся, з незвычайным спрытам выхапіў сваю стрэльбачку, якой ужо было, можа, гадоў з сотню, і лупянуў па мядзведзю. Было бачна, што стары палясоўшчык не прамазаў, але такога асілка забіць адным стрэлам было немагчыма. Таму мядзведзь пастаяў і паволі падаўся ад людзей.

Радзівіла стары служка адпойваў вадою. Калі князь прыйшоў у сябе, Сцяпан прапанаваў:

— То можа назад вернемся, княжа? Бачыш, як яно паварочваецца... Гэта ж не з засады ці з хацінкі страляць. Тут адзін на адзін выходзіць трэба...

Князь напаўляжаў і ўважліва пазіраў на служку, але калі той скончыў гаварыць, адказаў:

— Пойдзем, Сцяпане, за ім. Сапраўды, гэта зусім іншае паляванне, чым тыя, на якіх мне даводзілася быць. Я пачынаю разумець, што такое небяспека і што такое плячо сябра побач. Але ўжо калі ўзяліся, то пойдзем да канца. Пойдзем... Уставай, палясоўшчык...

Пайшлі далей. Цяпер Радзівіл нёс стрэльбу не за плячыма, а ў руках і папрасіў палясоўшчыка, каб не яго Сцяпан прыкрываў сабою, а ён старога абараняў. Хацелася яснавяльможнаму праверыць сябе. Так і ішлі па слядах, не надта спяшаліся, не надта расслабляліся, глядзелі пільна і ўважліва, бо пастаянна чулі,

як напярэдзе трашчыць голле — гэта зусім недалёка ад іх сунуўся паранены мядзведзь.

На ноч спыніліся на невысокім пагорачку. Сцяпан развёў вогнішча і запрапанаваў:

— Паспі, пане, а я пасяджу, павартую. Мне нешта і спаць не надта хочацца. Паспі...

— Няма чаго, чалавеча, хлусіць. У мяне, у маладога, ногі адвальваюцца, а табе спаць не хочацца. Будзем па чарзе вартаваць. Зараз, з вечара, ты спі, а потым мяне зменіш. І не адмаўляйся, няма чаго. Кладзіся і спі.

Так і зрабілі. Калі ў небе з'явіліся зоркі, Сцяпан ціхенька расплюшчыў вочы, каб праверыць, ці не спіць паляўнічы, але Радзівіл сядзеў на сваім месцы і падкідваў дровы ў вогнішча. Палясоўшчык усміхнуўся і соладка заснуў. Потым падмяніў князя, і той лёг спаць. Раніцай перакусілі і пакіравалі далей. Пасля полудня згубілі след звера і цяпер блукалі ўсляпую, бо Сцяпан пераконваў свайго валадара:

— Ён недзе тут. Не можа ён уцячы далёка. Стаіўся мядзведзь, час цягне, бо крыві многа страціў і аслабнуў. Тут недзе.

Амаль двое сутак кружыліся на невялікім участку пушчы Радзівіл з палясоўшчыкам. Наступнай раніцай стары служка пачаў нюхаць паветра:

— Нешта смярдзіць, пане. Учора не было гэтага паху.

— Так,— адказаў Радзівіл,— а можа...— і глянуў на Сцяпана.

Палясоўшчык згодна махнуў галавою:

— Хутчэй за ўсё...

І сапраўды, хвілін праз колькі яны стаялі над невялічкай ямінай, у якой ляжаў асілак-мядзведзь. Ён зарыўся ў пясок і амаль зраўняўся з зарослымі акрайкамі, таму яго і не было відаць. Над ім роем кружыліся вялізныя мухі. Ён сканаў ужо, можа, добрыя суткі назад. Пастаялі людзі, пастаялі, паглядзелі на ўжо безабароннага і зусім нястрашнага звера, і князь Радзівіл прамовіў:

— Бачыш, Сцяпане, колькі за ім пахадзілі, а ён нясвеж. Дайшоў у яміне і нават смярдзець пачаў. Нясвеж...

Вось і пачалі тое месца называць Нясвеж, Нясвіж.

А то яшчэ і іншае паданне існуе, адкуль старажытны горад пайшоў.

Калісьці, даўным-даўно, першы з пачынальнікаў роду Радзівілаў зрабіў замак. Першапачаткова яго ўзвялі з магутных і таўшчэзных дубоў, абнеслі высокім валам, глыбокім ровам. Праз некаторы час Радзівіл надумаўся закласці тут горад. Будоўлю распачалі недалёка ад замка, адразу за валам. Паставілі прыгожыя, мураваныя будыніны, а як назваць горад — пачынальніку ўсё ў галаву не прыходзіла. Тады ён паклікаў сваіх слуг і звярнуўся да іх.

— Ідзіце, хлопцы, і якое слова першае пачуеце — то гэта і будзе назва нашаму новаму гораду. Толькі ж глядзіце, будзьце ўважлівымі на дарогах.

Сказаў так таму, што тады людзей значна меней жыло, чым цяпер, і можна было цэлы дзень ісці, а нікога не сустрэць.

Пакіравалі з замка слугі. Пешкі пайшлі, бо Радзівіл спецыяльна сказаў ім коней не даваць, каб нікога не прапусцілі. Ішлі яны дзень, ішлі другі — нікога не сустракалі. А кіравалі яны не па адной дарозе, а па ўсіх, якія вялі з горада ў свет белы. Ажно аднаму са слуг усё ж пашанцавала. Там, дзе цяпер Новае Месца, ён сустрэў чалавека, які ішоў з рыбалкі і нёс у руках рыбу.

— Ці свежы ў пана карп? — спытаўся слуга.

— Нясвеж,— адказаў чалавек.

Слуга бягом кінуўся назад у палац, да пана Радзівіла, і сказаў таму, што першае слова, якое ён пачуў, было «нясвеж».

Адгэтуль і пачалі называць горад Нясвіжам.

А то яшчэ адну гісторыю чула, не надта даўно.

На тым самым месцы, дзе цяпер стаіць Нясвіж, было некалі старажытнае паселішча, ды такое даўняе, што яшчэ да нашага веку існавала. Тады людзі багам іншым, шматлікім, пакланяліся, і ахвяры ім прыносілі. Усё ў іх добра было. Працавалі, весяліліся, жылі, адным словам. А для ўсяго жывога жыццё самае галоўнае і ёсць, іншае можна ці купіць, ці прыдбаць, а вось жыццё — ніколі. Ды з цягам часоў нечага надта ўзганарыліся мястэчкоўцы. Хто ж яго ведае, ад чаго такое здарылася. Можа, ад таго, што ўсяго ім ставала, а можа, ад таго, што «скура ад хлеба пад'елася», як у народзе пра злых людзей гавораць. Як бы там ні было, але Усявышні на іх надта

разгневаўся і здарылася тады тут няшчасце: паселішча раптоўна праваліласся пад зямлю, а на ягоным месцы засталіся толькі паасобныя ямкі, пагоркі і колькі невялічкіх азёраў, якія яшчэ і цяпер існуюць. Невядома, колькі часу прайшло пасля таго, як тут зноў пасяліліся людзі. Але раз месца гэтае было «нясвежае», бо тут некалі жылі продкі, дык і назвалі яго, асабліва над гэтым не задумваючыся, Нясвіжам.

## ГАРАДЗЕЯ

Наша паселішча пайшло ад таго, што некалі, за сівымі вякамі, за далёкімі гадамі, тут дзіўная гісторыя адбылася. Хоць і надта даўно было, але людзі яе зберагаюць, перадаюць сваім нашчадкам, каб і яны не забывалі ды іншым таксама пераказвалі, бо калі перарвецца пераемнасць пакаленняў, то тады абрынецца бяда злая на мястэчка. Вось такая ўмова дайшла з даўніх часоў. Цяпер слухайце, што адбылося тут.

Жылі-былі на белым свеце два браты, звалі іх Сцяпан ды Іван. І як гэта часта бывае на свеце, адзін быў надта бедны, а другі, наадварот, багаты. У Сцяпана не было чаго ў гаршчок кінуць, каб неяк дзяцей сваіх пракарміць, а багаты не ведаў, куды валіць багацце. Так ужо павялося, так і працягвалася. Толькі ў адным не пашанцавала Івану — у яго была вялікая хата, ды, як даўней казалі ў народзе, пустая. Пустая таму, што ў яго з жонкай не было дзяцей. Вяскоўцы мовілі паміж сабою, што гэта здарылася ад таго, што Тэкля Іванава надта ўелася і не хацела глядзець за дзецьмі, за імі ж вока ды вока трэба мець, толькі адвернешся — што-небудзь абавязкова выкінуць.

У беднага — Сцяпана — была старая і цесная хата. Вецер яе прадзімаў навылёт. Калі бура якая ўсходзіцца, то ажно да сцяны супрацьлеглай прыбівала ўсялякія анучы ды смецце — гэтак дзьмула. Затое дзетак было ў Сцяпана з жонкай, можа, з дзесятак.

Марыська ягоная пастаянна наймалася працаваць да багатага брата, каб неяк мужу дапамагчы сям'ю карміць, каб які кавалачак хлеба ў хатку прынесці ці капейчынай якой разжыцца. А працаваць яе Іван прымушаў не абы-дзе, а адшукваў як мага цяжэйшыя

заняткі і амаль кожны дзень разам з парабкамі прымушаў працаваць на млыне. Там табе ні паветра чыстага, ні хвілінкі вольнай.

Аднаго разу сустракае багаты брат беднага і, відаць, вырашыўшы паздзекавацца, пытаецца:

— Скажы мне, Сцяпане, чым гэта ты ўмудраешся сваіх шматлікіх дзяцей карміць?

Запытаўся гэтак і па баках зырыць, каб яшчэ хто бачыў ці чуў, як ён над бедалагаю здзекавацца будзе.

Сцяпану трэба было спачатку падумаць, што казаць, а не адразу рот адкрываць, бо ў многім напсаваў ён сабе і сям'і ў той момант:

— А то ж я, браце, кармлю іх няблага.

— Ды як жа ты ўмудраешся?

— Уся справа ў тым, што мне жонка ў многім дапамагае.

— Жонка? У чым яна можа дапамагчы?

— Марыська ж да цябе на млын муку малоць пастаянна ходзіць.

— Так, ходзіць, не адмаўляю гэтага. Але што тут можна ўзяць? Парабкі ж правяраюць перад тым, як яна дамоў ідзе...

— Правяраюць, ды не старанна. Прыходзіць жонка дамоў, здымае з сябе вопратку і давай яе вытрушваць на чыстыя анучы. Патрусіць хвіліну-другую, і колькі жменяў мукі маем. Потым зацірку дзецям зварыць, і нам ёсць што перахапіць...

— Вось яно як! Ну пачакайце! Я вам выцерушу вопратку! Паскачаце ў мяне! — ажно ўзвіўся багаты брат.

— Чаго ты, Іване? — запытаўся здзіўлены Сцяпан, але той ужо не слухаў, джгаў дахаты так, што ажно пяткі бліскацелі.

Толькі цяпер зразумеў бедны, што зрабіў, ды нічога ўжо выправіць нельга было, бо ўсё ж шчыра распавёў...

Прыйшоў Сцяпан дамоў, а на жонку вачэй не падымае, сорамна, што не падумаўшы, Марыську і дзетак гэтак падвёў. Жонка адчула перамену настрою і запыталася:

— Што здарылася, Сцяпанка?

Але муж паспрабаваў выкруціцца:

— Нічога, родненькая, нічога, проста стаміўся сёння надта, настрою няма. Я хіба лягу раней, то, можа, да раніцы ўсё і пройдзе.

— Лягай, калі так блага сябе адчуваеш.

На наступны дзень Марыська зразумела, чаму муж быў такі пахмурны і хадзіў без настрою, бо калі скончылі працу і яна пачала збірацца дамоў, на млын прыбег Іван. Ускочыў у памяшканне і закрычаў на парабкаў:

— Гэта вы так маё багацце вартуеце?! Гэта вы так пільна сочыце, каб ніхто нічога не ўзяў?

— Ды ніхто і не бярэ,— замармыталі служкі.

— А яна,— выгукнуў гаспадар і тыцнуў пальцам на братавую,— яна ў мяне нічога не бярэ?

— Не, мы толькі што агледзелі ўсё старанна,— прамовіў самы стары з парабкаў,— гэтая жанчына нават жмені мукі тваёй за ўвесь час не ўзяла.

— Ах так,— узвіўся Іван,— то вазьміце яе вопратку ды патрасіце, тады і пабачым!

Заплакала жанчына горкімі слязьмі і ад абразы, і ад таго, што не будзе чым накарміць сёння дзяцей, а гаспадар радасны і задаволены глядзеў, як парабкі выбівалі верхнюю вопратку.

— Так і дурань пракорміцца, а вы паспрабуйце без нічога пракарміцца,— са злосцю кінуў ён, калі Марыська кіравала дамоў.

Прыйшла жанчына дамоў. Бачыць — муж сядзіць, галаву не ўздымае, дзеці галодныя скачуць, чакаюць, калі маці пачне вопратку выбіваць ды есці ім варыць. Але на гэты раз пачулі ў адказ ледзьве чутнае:

— Родненькія мае, што ж мы сёння есці з вамі будзем? Няма ў мяне нічога, бо злыдзень той загадаў усю вопратку павыбіць на млыне. Ой, як жа нам быць?.. Як жа гэта ты, мужу, да такога дадумаўся, і хто цябе за язык цягнуў? Чым жа я вас сёння карміць буду?..

Паплакалі ўсе разам і ляглі спаць галодныя. Дзеці і сярод ночы то адно, то другое ўсхліпвалі:

— Мамка, есці...

— Дай хоць хлебца, мамка...

Тая іх супакойвала, а сама слязьмі горкімі залівалася:

— Спіце, родненькія, спіце. Дасць Бог дзень — дасць і ежу. Неяк пражывём. Не мы ж адны на белым свеце пакутуем. Спіце, каханенькія...

Раніцай, яшчэ і сонейка добра не занялося, а Сцяпан ужо на ногі ўскочыў. Жонка яго супыніла:

— Куды ты гэтак рана, Сцяпанка? Паляжаў бы яшчэ.

— Пайду на возера. На рыбалку. Там, дзе наша гарадзень, я човен свой прыхоўваю. А раптам пашанцуе і рыбкі свежай налаўлю... Тады і есці што будзе, і на наступны дзень колькі рыбак можна будзе высушыць. А раптам...

— Поспеху табе,— пажадала Марыська і пачала завіхацца па гаспадарцы.

Прыбег Сцяпан да чоўна, сеў у яго і адплыў на сярэдзіну возера. Закінуў вуды ды з нецярплівасцю на паплаўкі паглядае. Амаль да полудня прасядзеў, а яны і з месца не скрануліся, нібы іх закляў хто. Зусім настрой сапсаваўся ў чалавека. А тут яшчэ хмара страшэнная, чорная такая, грувасткая выпаўзла з-за лесу, пярун стаў палыскаць. Як лупяне, то ажно водгулле на шмат вёрстаў ляціць. Дождж пачаўся такі, што за пару крокаў нічога нельга было ўбачыць, нібы засланкай якой адгароджвалася прырода ад занадта цікаўных вачэй.

Спалохаўся Сцяпан, што залье яго пасярод возера ці маланка трэсне прама ў човен, і з усяе сілы пачаў веславаць да таго месца, дзе човен заўсёды пакідаў. Падплыў, перакуліў яго і на бераг вышэйшы выцягнуў. Сам залез пад дашчанік і выцягнуўся, задаволены, што цяпер яму дождж не страшны. Ляжыць сабе ды ўслухоўваецца. Добра і ўтульна там чалавеку: вада не залівае, вецер не дзьме і відаць, што навокал робіцца. Ажно бачыць бядняк — што за дзіва? З самае азёрнае вады выходзяць плячо ў плячо тры асілкі-браты. Спакойна гэтак, нікога не палохаючыся. Ідуць сабе і на дождж увагі ніякай не звяртаюць. Падышлі, сталі непадалёку ад перакуленага чоўна і пачалі размову. А Сцяпану ж усё чуваць. Адзін з іх гаворыць:

— Добрую навальніцу мы наладзілі. Нівы вадзіцы нап'юцца, лугі-лясы зазелянеюць, сама маці-прырода ў рост пойдзе. Няхай перуны чарцей усялякіх, нячысцікаў па балотах паганяюць, каб не забываліся, хто на самай справе ў небе і на зямлі гаспадар.

Другі дадаў:

— Так, браце, ды і людзям, асабліва сквапным і злосным, каб наша навальніца нагадала пра тое, што не толькі на зямлі жыццё існуе, а трэба і пра пазамагільнае думаць...

Трэці прамовіў:

— Добра, браты, што мы з вамі сочым за тым, як яно адбываецца, ды за нядобразычліўцамі, каб яны чорных спраў не здзяйснялі, бо надта ж многа чорных варажбітоў на зямлі развялося. Ці чулі вы пра дачку мясцовага памешчыка, пра тое, што з ёю здарылася?..

— А што, браце, прыключылася? — перапыталі з цікаўнасцю астатнія двое.

— Ды нейкая старая варажбітка наслала цяжкую хваробу на панскую прыгажуню-дачку. Яна адна ў гаспадароў. Гэткая добрая ды ласкавая, ніколі нікога не пакрыўдзіла, а тут вось, з зайздрасці, што з ёю зрабілі. Плачуць бацькі, але ніхто вылечыць не можа. Каго толькі ні клікалі — усё дарэмна. Вось такая справа, браткі...

— А ці можна яе выратаваць, пакуль не позна, пакуль смерць не ахінула яе сваім жахлівым крылом?

— Можна, толькі гэтага ніхто не ведае.

— Што, лекі нейкія занадта цудадзейныя ці якая іншая прычына?

— Ды не... Трэба ўранні, калі яшчэ сонца не ўзышло, сабраць на росным лузе кветачак і зрабіць з іх моцны настой. Потым пачакаць, пакуль ён адстаіцца тры дні, і даваць хворай на працягу тыдня піць. Тры разы на дзень. Калі ўсё зрабіць у такім парадку, то дзяўчына ачуняе.

— А ці чулі вы,— азваўся тут другі з братоў,— што ў горадзе мясцовым вады ўжо амаль паўгода няма і людзі ад гэтага пакутуюць?

— У Нясвіжы ці дзе?

— Так, у Нясвіжы. Не ведаюць людзі, што рабіць, каб выратавацца.

— А што ж там за прычына такая?

— Ды складанага нічога. Трэба зайсці ў горад, выйсці на цэнтральную плошчу перад ратушай і зрушыць з месца вялікі камень, які ўжо не адзін дзесятак гадоў ляжыць там. Тады з-пад каменя заб'е магутная крыніца з чысцюткай і халоднай вадой. Вось такое выйсце.

— Чаго толькі на белым свеце не бывае, браточкі,— выдыхнуў нехта з вадзяных жыхароў.

— Ды ўжо ж, хапае цудаў і дзівосаў усялякіх. Такога наслухаешся, што і сваім вушам не паверыш адразу, пакуль на ўласныя вочы не ўбачыш...

— Пастаим яшчэ хвілін колькі, хлопцы, ды час і назад вяртацца, каб нас ніхто не заўважыў. Пабылі на беразе, паглядзелі на родныя мясціны і дамоў, на дно, пойдзем. Трэба ж было нам у тую буру на рыбалку выбрацца і ўтапіцца... Зараз бы сярод людзей жылі, а так — на дне, сярод рыб ды русалак жывём...

— Няма чаго згадваць, душу вярэдзіць, пайшлі лепей.

Праз хвіліну нікога з братоў ужо не было паблізу. Яны нібыта растварыліся ў прасторы. Сунуліся паціху ў ваду, і ніякіх слядоў за імі не засталося. Сцяпан, ляскаючы са страху зубамі, вылез з-пад чоўна і пачаў падскокваць на месцы — грэцца, бо хоць дождж і цёплы быў, але ж ляжаў на сырой зямлі нямала часу. Падскоквае, рукамі па баках паляпвае, а сам усё думае над тым, што незнарочна давялося пачуць. Мяркуе і так, і гэтак, потым сумнявацца нечага пачаў. Падалося яму, што, можа, нехта спецыяльна над ім паджартоўвае. З беднымі заўсёды якія-небудзь штучкі выкідвалі, бо за іх жа і заступіцца не было каму.

Пайшоў чалавек дахаты, рыбы не злавіў, зноў дзецям ды жонцы не будзе чаго есці, а ў галаве ўсё думка круціцца: «А што, калі паспрабаваць зрабіць усё тое, што толькі што пачуў?» Падышоў да падвор'я, а яго Марыська сустракае:

— Што, чалавеча, і там не пашанцавала?

— Ды яно як сказаць,— адказвае Сцяпан,— з аднаго боку, сапраўды, не пашанцавала, а з іншага...

І расказаў бядняк пра ўсё жонцы. Тая ў яго разумная была, умела добра падказаць. Уважліва выслухала мужа дый кажа:

— Дзеткі нашы сёння, дзякуй Богу, не галодныя. Я ім шчаўе зварыла, ягадак з лесу прынесла, то яны і пад'елі. А адносна гэтага я б так раіла — трэба паспрабаваць, а раптам і не жартачкі гэта, можа, тыя браты і не ведалі зусім, што ты пад чоўнам сядзіш... Можа, яны проста так паміж сабою размаўлялі, а ты выпадкова падслухаў... Тады ў нас ёсць шанц разжыцца і жыць надалей без бяды і гора. Ты мяне разумееш, Сцяпанка?

— Разумею, Марыська. Я і сам так думаў, але з табою ўсё роўна параіцца жадаў. Калі ты мяне падтрымліваеш, то я з заўтрашняй раніцы і пачну ўсё рыхтаваць.

— Давай, мужу, а можа, і праўда неяк выкру-

цімся, бо ўжо надакучыла дзеткам нашым хлусіць ды ў іхнія заплаканыя тварыкі глядзець.

Яшчэ сонца не ўзышло, а Сцяпан ужо па лузе туды-сюды хадзіў, кветачкі збіраў, пра якія напярэдадні размову чуў. Нарваў ладны абярэмак і дамоў прынёс.

— Марыська, ты іх варам залі і няхай стаяць, толькі глядзі, каб дзеці ненарокам не перакулілі ці чаго не падмяшалі туды. А я ў панскі двор пакірую, скажу памешчыку, што ягоную дачку змагу на ногі паставіць.

Як сказаў чалавек, так і зрабіў. Паджгаў да палаца, а да яго не надта блізка было. Прыйшоў туды, а слугі і блізка не падпускаюць. Тады Сцяпан і гаворыць:

— Няма мне калі з вамі час губляць, спрачаючыся. Вы лепей свайму пану перадайце тэрмінова, што прыйшоў чалавек, які можа ягоную дачку ад хваробы пазбавіць.

Пераглянуліся паміж сабою слугі. Чаго на свеце не здараецца?.. Пабеглі да памешчыка і сказалі яму пра ўсё. Той не дачакаўся, пакуль да яго селянін прыйдзе, сам насустрач выбег:

— Няўжо гэта праўда, чалавеча? Няўжо ты маю дачушку вылечыш? Калі так зробіш, то я табе адразу ж палову сваіх земляў аддам, грошай, колькі захочаш насыплю. Толькі выратуй маю птушачку, бо канае яна...

— Выратую, пане, але пра плату мне яшчэ зарана чуць. Зараз пакажыце мне хворую. Трэба ж глянуць усё на месцы...

— Ведама, ведама,— пані і пан, нібы слугі, самі подбегам пакіравалі наперадзе і павялі Сцяпана да пакояў.

Паглядзеў бядняк на дзяўчыну, абышоў разоў колькі вакол ложка і прамовіў спакойна, да гаспадароў звяртаючыся:

— Праз дзень-другі я прынясу вам узвар і скажу, як яго трэба піць і колькі разоў на дзень, а зараз пайду дамоў і буду лекі варыць...

— Толькі не падмані нас, чалавеча,— зазіраючы ў вочы Сцяпану, ласкава прасілі гаспадары.

— Слова маё цвёрдае,— паабяцаў мужык і выйшаў з палаца.

Дома распавёў жонцы пра ўсё. Ледзьве яны перачакалі тыя два дні, і бядняк панёс гладыш з узварам

для хворай. Пан чакаў ужо селяніна, седзячы на ганку і штохвілінна прыкладаючы руку да вачэй, каб засланіцца ад сонца.

— Вось гэтым напоем, пане, трэба паіць хворую тры разы на дзень: раніцай, у полудзень і ўвечары, калі змрок запануе. Так трэба рабіць цэлы тыдзень. І ўсё павінна сысці. Стане ваша дачка здаровай і вясёлай...

— Ты б, можа, чалавеча, дамоў не ішоў, а пабыў у палацы гэты час, бо надта мы з паняй хвалюемся. Нешта не гэтак зробім і толькі пашкодзім справе...

— Ну, то добра,— адказаў Сцяпан і застаўся ў палацы, але папрасіў гаспадара, каб ягонай сям'і занеслі чаго-небудзь есці. Не забываўся, бачыце, пра родных і ў такім становішчы. Гаспадар тут жа загадаў нагрузіць харчамі цэлую фурманку і адвезці ўсё гэта Марысьцы з дзецьмі.

Даў Сцяпан адзін раз паненцы вады напіцца, другі — то ў яе і твар пачаў чырванець. А калі трэці раз, пад вечар, даў цэлую шклянку свайго адвару з кветак, то дзяўчына ўжо паспрабавала нават квола ўсміхнуцца. Узрадаваліся пан з гаспадыняй:

— Чалавеча, ды мы табе ўсё сваё багацце перадамо, толькі дапамагай далей!

— Усё мне не трэба, але каб пражыць добра надалей, то не пашкодзіла б!

Так цэлы тыдзень і праляцеў незаўважна. Паненка ўставаць пачала на ногі. Яна была яшчэ вельмі слабая, але ўжо набірала сілы. Бацькі гатовы былі ўсё аддаць за выратаванне жыцця сваёй адзінай надзеі.

— Сцяпане, аддамо табе яшчэ больш, чым абяцалі,— адно і тое ж усё сцвярджаў гаспадар,— нічога не шкада, раз ты нам гэтак дапамог, гэтак нас выручыў. Мы цябе да скону жыцця свайго не забудзем.

— Калі ўжо на такое справа павярнула, пане, то лепей дайце мне слова сказаць,— папрасіў селянін.

— Гавары, чаго там...

— Дайце мне надзел зямлі каля майго гарадзеня, што на беразе возера ляжыць. Там я люблю і рыбку часам палавіць, і месца для земляробства надта ж прыдатнае. Кароў сабе развяду, коней, буду жыць не горш за іншых, бо так ужо надакучыла гэтая злыбеда... А болей мне нічога і не трэба, я ж не зломак, рукі маю...

— Калі так, то няхай, Сцяпане, будзе па-твойму.

Атрымаеш ты надзел ля гарадзеня, і грошай яшчэ насыплю, ды ўсяго іншага падкіну, бо такое, што ты нам зрабіў, не забываецца ніколі...

З таго дня і перайшоў бядняк жыць на новае месца, а праз некаторы час разбагацеў чалавек, дзяцей сваіх у людзі вывеў, надзелы ім асобныя нарэзаў. Мястэчка назвалі спачатку Гарадзенем, а потым ужо перайначылі ў Гарадзею.

## ВУЖАНКА

Наша вёска тады была зусім невялікая, двароў мо дваццаць-трыццаць. Але затое сем'і былі вялікія. Людзі працалюбівыя, шчодрыя. Весела і дружна жылі паміж сабою. Быў сярод іх адзін хлопец, Уладакам звалі. Ну і прыгажун! Высокі, сінявокі, плечы — што тая печ, валасы пшанічнага колеру. А песню як заспявае, дык усё наваколле, здаецца, заціхала, слухала яго.

Уладак часта кароў пасвіць ганяў. Раней жа кожны сам свой статак пасвіў, а ён самы малодшы ў сям'і быў — сёмы. Дык вось, пагоніць ён кароў на балота, яны траўку скубуць, а ён робіць што-небудзь для гаспадаркі і песню, канешне ж, спявае-выводзіць. Час так хутчэй ляціць, ды і праца спорыцца.

Аднаго разу ён пачаў пруткі лазовыя рэзаць для сваёй патрэбы. Рэжа сабе, спявае, і здаецца яму, што нехта сочыць за ім. Азірнуўся — не, нікога няма. Зноў сваю справу працягвае, і зноў яму здаецца, што нехта глядзіць. Павярнуўся рэзка і як шахне сабе са ўсяго маху вострым нажом па левай руцэ! Ды на гора якраз па вене трапіў і перарэзаў, мабыць, бо кроў ажно свістала. Спалохаўся хлопец. Людзей навокал блізка няма, да вёскі вёрст восем, а ратавацца неяк жа трэба. Парваў ён сваю сарочку, паспрабаваў перацягнуць руку, ды дзе там! Кроў льецца, як і лілася... Чуе ён, што пачынае ўжо хістацца, бо крыві многа страціў. Стаў крычаць, але голас, раней такі зычны, зараз амаль прапаў. Пабег Уладак у накірунку да вёскі. Прабег з сотню крокаў і ўпаў, страціўшы прытомнасць.

Ачнуўся хлопец ад таго, што яму захацелася піць. Калі апрытомнеў, то ажно затрымцеў: «Я ж крывёю сыду!» Але, зірнуўшы на сваю парэзаную руку, спа-

лохаўся яшчэ болей: рука была чыстая, крыві не было відаць, а на месцы парэзу застаўся толькі свежы шнар... І зноў яму здалося, што на яго нехта пільна глядзіць, прама ў спіну. Пастух рэзка ўзняў галаву і... ад здзіўлення ажно рот разявіў. У кроках трох-чатырох ад яго стаяла дзяўчына і ўсміхалася. Якая яна прыгожая была на вясновым сонейку! Валасы нібы свяціліся. Сама рослая. Тварык мілы. Вочы смяшлівыя. Уладак бессаромна разглядаў незнаёмку.

— Ну што, наглядзеўся? — гулліва спытала тая і ступіла да хлопца.— Дай руку сваю, а то я не паспела ўсё зрабіць да канца, як ты ачнуўся...

— Дык гэта ты мяне ўратавала? — выдавіў нарэшце хлопец.

— Я... Я, Уладак,— адказала дзяўчына ўсміхаючыся.

— А адкуль ты ведаеш, як мяне завуць? Я ў наваколлі такой прыгожай не бачыў,— прамовіў пастух.

— Усё пра цябе ведаю, пяюн, усё ведаю,— мовіла незнаёмка. Але адказала толькі на першую палову пытання.

— Зразумеў цяпер, хто за мной кожны раз падглядваў-цікаваў. І руку з-за цябе сёння гэтак недарэчна парэзаў,— ціха сказаў Уладак.

— Не крыўдуй на мяне, калі ласка,— прамовіла дзяўчына,— я руку табе зашаптала, ты і чуць яе не будзеш, а праз пару дзён і шнар прападзе. Не злуйся, добра? — І яна сваёй цёплай далонькай дакранулася да яго рукі. Хлопца ажно перасмыкнула, бо ўпершыню гэтак блізка ён бачыў такую прыгажосць.

— Хто ты, адкуль? — зноў запытаўся пастух. Але дзяўчына спахмурнела тварам і зноў нічога не адказала.

— Паспявай мне, Уладак, лепей песню, тую, памятаеш, пра бярозу,— папрасіла дзяўчына, і падалося яму, што голас яе стаў надта сумным.

Спяваў Уладак, як ніколі, бо спявала само сэрца, душа спявала. Ды і ці можна было стрымацца, калі побач была яна...

Нечакана надышоў надвячорак. Трэба было гнаць кароў дамоў. Яны ўжо і самі паглядалі ў бок вёскі. А хлопец з дзяўчынай усё размаўлялі. Потым яна ўстала і папрасіла:

— Уладак, адвярніся, калі ласка, і закрый вочы, толькі не падглядвай. Добра?

— Добра,— пагадзіўся той,— а мы заўтра ўбачымся?

— Убачымся, толькі адвярніся...

Адвярнуўся Уладак, заплюшчыў вочы і стаў чакаць. А калі ў хуткім часе азірнуўся назад, то дзяўчыны не было, яна нібы скрозь зямлю праваліласся, толькі нешта ў бліжэйшым лазовым кусце зашамацела і заціхла.

Пагнаў ён кароў на падвор'е. Гоніць, а сам ад радасці на ўвесь голас спявае, водгулле над ракою, над балотам разносіць словы адвечнай песні яго далёкіх продкаў, якія і кахаць, і працаваць, і ваяваць, калі надыходзіла тая часіна, умелі. І склалі пра гэта песню, якую, мабыць, яшчэ і сёння людзі спяваюць.

Есці яму дома не захацелася, спаць не мог, ледзьве наступнага дня дачакаўся. Сабраўся хуценька і пагнаў жывёлу з двара, нават маці здзівілася, што сын нейкі не такі сёння, не ўсмешлівы, а засяроджаны, маўклівы.

Прыгнаў хлопец кароў на ўмоўленае месца, але там нікога не было. Абабег бліжэйшыя кусты — не, няма. Сеў на купіну і заспяваў песню, ды такую ж нудлівую, што слёзы самі з вачэй пакаціліся. Скончыў песню, устаў, каб каровак адвярнуць ад далёкага балотца, і прасвятлеў тварам — ззаду сядзела ўчарашняя незнаёмка з журботна схіленаю галавою.

— Добры дзень, чаго ты сумуеш? — кінуўся да яе Уладак.— Адкажы.

Але тая зацята маўчала. Не адказвала.

Зноў цэлы дзень былі яны разам: спявалі, бегалі, весяліліся. У хуткім часе і дамоў трэба было вяртацца. Зноў яна папрасіла хлопца зажмурыць вочы і адвярнуцца.

Той паслухмяна адвярнуўся, пастаяў крыху, ды зноў прапала незнаёмка, толькі нешта зашамацела ў бліжэйшым лазовым кусце...

Прыгнаў статак дамоў. А субота якраз была, маладыя ўсе збіраліся ў канцы вёскі: карагоды вадзілі, дурэлі. Адным словам, весяліліся, бо пара іхняя была такая. Пайшоў і Уладак туды, да сваіх сяброў ды сябровак, каб пабыць з імі. Але сумна яму было там без прыгожай незнаёмкі. Нават бацькі здзівіліся, чаму ён гэтак рана прыйшоў, але сын спаслаўся на тое, што заўтра трэба на золку ўставаць і гнаць каровак на луг.

Зноў гэтак жа нечакана ён спаткнуўся з дзяўчынай, якую пакахаў усім сэрцам, зноў не ўбачыў, адкуль

яна з'явілася. Пачаў пастух дапытвацца ў яе, як завуць, хто яна такая, адкуль родам? Нарэшце дзяўчына не вытрымала і сказала:

— Добра! Скажу табе ўсю праўду, толькі глядзі нікому не прагаварыся, бо тады мы з табой болей ніколі не ўбачымся. Завуць мяне Настуля. Родам я з вёсачкі з-за лесу, яе цяпер няма. Жыла я ў вялікай і працавітай сям'і, у гэткай, як ты зараз. Ды наскочылі на нашу вёску аднаго разу татары, злыя нелюдзі. Усіх пабілі-парэзалі, а мне ўцячы ўдалося. Толькі не далёка я адбеглася, пачалі вершнікі даганяць, то кінулася тады ў раку, каб ім у рукі не трапіць... Ачнулася пад вадою ў вялікай, чысценькай хаціне. Сцены — з золата-срэбра, рыбкі дзівосныя за вокнамі плаваюць. Ціха, нязвычна. Ні птушкі не спяваюць, ні вецер не свішча. Ляжу з адкрытымі вачыма. Ажно бачу — сівы-сівы дзед да мяне падыходзіць і за руку бярэ. Глядзіць на мяне неяк дзіўна, а з вачэй слёзы коцяцца. Потым спытаўся:

— Ачнулася, унучка? Спі, набірайся сілкі, жыць цяпер ты доўга будзеш, надта доўга. Я зраблю так, што не будзеш старэць, мая каханенькая, а адлік гадоў пойдзе, калі ты замуж выйдзеш. Але пра гэта табе яшчэ рана марыць. Ведаю, якое ў цябе гора. Ведаю, бо ўсё бачыў і чуў, каб тых злыдняў зямля наша родная не насіла! Каб яны вады смярдзючай наглыталіся! Каб яны ў ёй захлынуліся!..

— Хто ж вы, дзедку,— не ўтрывала я.

— Вужоў бацька, унучка, Вужоў бацька. Але ты мяне не палохайся. Вужом я станаўлюся толькі тады, калі на зямлю выходжу. Ды і бяды я людзям ніколі не рабіў і не раблю...

— Дык я ў падводным царстве?..

— Але, ды ты не бойся. Як адыдзеш, то я дам табе магчымасць бачыць і чуць усё, што адбываецца на зямлі. Адпускаць цябе буду і суправаджаць, каб ніхто нічога злога не ўчыніў.

Так і стала я жыць пад вадою з дзедам-вужом па мянушцы Вужоў бацька. Дружна мы з ім жывём. Дапамагаем адзін аднаму. Доўгімі вечарамі, калі я кудзелю праду, ён мне казкі расказвае, былічкі распавядае. Дзядуля мяне нікуды адну не адпускае. І сёння побач, толькі ты не заўважыш яго...

— Дзе? — устрапянуўся Уладак.

— Вунь, бачыш? Вуж вялікі з каронаю на гала-

ве? — гэта і ёсць Вужоў бацька. Не палохайся, цябе дзядуля даўно ведае. Мы з ім разам раней песні твае пастаянна слухалі. Зашыемся ў корч і слухаем, а вечарамі пераказваем і плачам, бо без слёз не можам згадваць крывавае мінулае. Давай падыдзем, Уладак.

— Давай...

Яны нетаропка наблізіліся да вужа.

— Добры дзень, Вужоў бацька! — сказаў хлопец.

— Дзень добры, Уладак! — прывітаўся той чалавечым голасам.— Глядзі ж толькі, хлопча, не крыўдзі ўнучку маю Настулю. Пакахала яна цябе, а сказаць баіцца...

— Што вы, дзядуля,— зачырванелася тая.

— Добра, вы пагуляйце, а я папаўзу ў сваю хату. Нешта вельмі косці мае баляць-ныюць...

Закаханыя зноў засталіся ўдваіх. Пагаманілі, пасмяяліся, а калі прыйшоў час развітвацца, то дзяўчына зноў ператварылася ў вужаку. Але цяпер ужо не хавалася, а засталася ляжаць на тым самым месцы. Уладак падышоў да яе, пагладзіў і пайшоў за кароўкамі дамоў.

А ў вёсцы жыла адна дзяўчына. Звалі яе Гануля. І надта хацела, каб Уладак з ёю пабраўся, таму і сачыла пільна за хлопцам. А ён пільнасць страціў і паплаціўся за гэта.

Раніцай пастух зноў гнаў сваіх каровак на ранейшае месца. Ішоў за каровамі, весела спяваючы. Не ведаў, што чакае яго сёння. Неўзабаве і дзяўчына з'явілася. Прыселі маладыя побач на траву і пачалі гаманіць.

— Ты зноў з дзядулем?

— Ды не, сёння ён вельмі хворы, прасіў доўга не затрымлівацца. Баюся, каб дрэннага чаго не здарылася. Як тады буду без яго? Мы ж з ім як родныя. Стولькі разам пражылі. Стагоддзі цэлыя. Учора ўвечары ён мне сказаў, каб за цябе замуж выходзіла, калі пазавеш. Пасаг багаты мне назбіраў. Дасць магчымасць жыць сярод людзей, у людскім абліччы. Толькі прасіў, каб замуж выйшла пасля яго смерці. Ды каб пахавалі яго на вясковых могілках, як звычайнага чалавека... Вось такія сумныя навіны я табе прынесла, Уладачак. Не кінеш мяне?

— Ды што ты, Настуля, родненькая, заўсёды з табою буду! Да скону жыцця свайго!

— Дык я пайду, добра? А заўтра спаткаемся...

— Добра, каханая, добра.

— Адвярніся, калі ласка, як у першы раз...

Уладак, пасміхваючыся, адвярнуўся. «Зараз павярнуся і пагляджу, як яна пераўвасабляецца»,— падумаў пастух. Але зрабіць гэтага не паспеў, бо ззаду раздаўся нейкі стук і нехта злосна крыкнуў:

— Так табе і трэба, гадаўка!

Хлопец адвярнуўся на крык і ледзьве не страціў прытомнасць. Перад ім стаяла Ануля і вострай сякерай секла вужаку, якая ўжо была рассечана на некалькі кавалкаў.

— Што ж ты робіш, дурніца? — нема закрычаў Уладак, але было позна. Вужака не варушылася. Ануля, відаць, сачыла за імі ў гэты дзень.

Горка заплакаў хлопец. Заплакаў ад таго, што не збярог сваю долю, сваё шчасце, якое было гэтак блізка. Не крануў ён вужаку, калі ішоў з каровамі дамоў, бо вырашыў пахаваць яе на вясковых могілках.

Прыйшоў у хату і, плачучы, расказаў усю праўду сваім родным. Бацька цяжка ўздыхнуў. Маці ўсхліпнула. Браты і сёстры сядзелі, нізка апусціўшы галовы.

Раніцай разам з Уладакам пайшлі ўсе яго родныя. Запраглі і каня. На воз паставілі труну, каб забраць вужаку і забіць там жа векам. Не хацелі людскіх размоў. Прыйшлі і ўбачылі там, дзе, па словах хлопца, была забіта вужака, прыгожую дзяўчыну, усю пасечаную і скрываўленую. З енкам прыпаў да яе Уладак, заплакалі і родныя, бо такой прыгажосці яны ніколі не бачылі. Паклалі нябожчыцу ў труну і збіраліся ехаць, як раптам старэйшы сын ускрыкнуў:

— Глядзі, бацька!

Крокаў за трыццаць ад іх нешта бялела. Падышлі і ўбачылі старога. Увесь ён быў сівы, у белай палатнянай вопратцы. Ляжаў гэты дзед на спіне, склаўшы на грудзях рукі, і вочы ягоныя глядзелі ў неба, бо некаму было іх закрыць у апошні час. Побач з ягонай галавой ляжала агністая карона і пералівалася на сонцы...

— І гэты мёртвы,— ціха сказаў нехта.

— Гэта Вужоў бацька,— усхліпваючы, прамовіў Уладак.— Адчуў, што Настулі пагражае небяспека, ды не дапоўз. Не паспеў.

Забралі і яго на воз. Пахавалі іх на вясковых могіл-

ках побач. На месцы іхняй смерці Уладак пасадзіў дуб і бярозу. Дуб і зараз расце, бо ён крапчэйшы, а бяроза ўжо даўно ўпала. Вёску, якая значна пазней там узнікла, адтуль і назвалі — Вужава, а пазней — Вужанка.

## ЛАНЬ

Кажуць, што тут некалі многа было такіх коз, якія ў народзе ланямі называліся. Яны на вадапой часта прыходзілі да крыніцы, што каля лесу цячэ. Некаторыя з гэтых жывёлін былі, мабыць, цудадзейнымі, бо людзям дапамагалі. Вось што пра адзін выпадак распавядаюць.

Жыла-была ў аднаго селяніна дзяўчынка. Справа ў тым, што маці яе заўчасна памерла, і гаротная засталася з адным бацькам. А як жа мужчыну і гаспадарку самому ўсю весці, і дачку глядзець, ды ў печы ўпраўляцца? Вырашыў ён другі раз ажаніцца. Сам надумаў, а дачцэ, якую звалі Параскай, і слова ніводнага наконт гэтага не сказаў. Задумаў — і ўсё на тым, а ты, дачка, як сабе хочаш, так і выкручвайся.

Пайшоў хадзіць па суседніх вёсках, выбіраць сабе новую жонку. Але адразу натрапіць не мог на такую жанчыну, то яму тое не падабаецца, то гэтае. Можа, з паўгода блукаў — нічога не атрымлівалася. Вяскоўцы бачылі, што занадта ўжо ён перабіраў, і вырашылі паджартаваць над Петраком (гэтак мужчыну таго звалі).

Вось аднаго разу зайшоў ён у вёску, а яго людзі ласкава сустракаюць, запрашаюць за сталы з імі разам прысесці. Спачуваюць, што жанчыны адны галадранкі ды лайдачкі засталіся, а добрай ды спагадлівай і днём з агнём не адшукаеш. Пятрок выпіў гарэлкі і давай сваім багаццем пахваляцца. Сяляне галовамі ківаюць, пагаджаюцца, а на самай справе чакаюць зручнага выпадку, каб зрабіць тое, пра што зараней дамовіліся. Пераглядаюцца паміж сабою, адзін аднаму падміргваюць, маўляў, спяшацца не трэба, яшчэ паспеем, хай пахваліцца. А Пятрок — нібы рот упершыню за год раскрыў, так і льецца гамонка з ягоных вуснаў, не суціхае чалавек.

— Ды я, калі толькі захачу, на самай лепшай жанчыне ва ўсім наваколлі жанюся! Ого, мяне тады зве-

даюць! Ці ж то багацця, ці ж то грошай у мяне замала? Дзе ж гэта вы бачылі, каб Пятрок ды абы-каго ў жонкі выбраў? Не было такога і не будзе! Хіба ў мяне першая нябожчыца жонка благая была? Хто яе не ведаў, хто на яе слова дрэннае скажа?

— Так, першая жонка ў цябе надзвычай чулай і працавітай была — гэта праўда, але нешта надта хутка ты пра яе забыўся... Бачыш, бегаеш ды новую шукаеш, а дачку маленькую дома адну пакідаеш, і справы табе да гэтага аніякай няма. Чаму так робіш, га, Пятрок?..

— У мяне багацця столькі,— зноў пачаў было хваліцца вясковец, але яго перабіў нейчы спакойны і смяшлівы голас:

— Мы табе жонку, Пятрок, можам добрую падказаць. Ніколі не пашкадуеш, і нас пастаянна згадваць будзеш. Ну як? Хочаш?

— А хто такая? — зацікавіўся селянін.— Ці я яе ведаю?

— Не, ведаць яе ты не ведаеш, бо жанчыну гэтую ў свой час яе муж з далёкай вёскі сюды прывёў. Ды ён памёр, небарака, нядаўна, а жонка з дачкой на руках засталася. Прыгожая, раз убачыш — на ўсё жыццё запамятаеш.

— Ага,— паддакнулі астатнія,— надзіва прыгожая ды працавітая, толькі і робіць, што ў полі ці па гаспадарцы калупаецца, не разгінаючыся...

— То ў чым жа справа,— задзіваваўся Пятрок,— скажыце, як яе завуць, ды вядзіце мяне хутчэй у той двор.

— Грызля яе клічуць,— выпаліў нехта, не стрымаўшыся, і ледзьве ўсю справу не сапсаваў. Таму, спрабуючы неяк выкруціцца, адразу ж дадаў:

— Гэта яе зайздроснікі так клічуць, бо не могуць пераджыць таго, што чалавек усё пустазелле ў поле выпале, нібы выгрызе...

— То вядзіце хіба ўжо...

— Ты і сам хаціну знойдзеш. У нас яе кожны ведае,— пераглянуліся паміж сабою местачкоўцы.— Чаго весці?.. Вунь яе хаціна...

Дапамаглі Петраку ўстаць і накіравалі да Грызлінай хаты. Там ён і пераначаваў, там сабе і новую жонку прыдбаў. Раніцай пагрузілі ўсё багацце на калёсы ды паехалі ў тую вёску, дзе мужык жыў. Едуць, Грызля з радасці песні спявае. А голас надзіва

сакавіты і прывабны, водгулле па ўсім наваколлі ідзе.

З гэтага самага дня ўсё і пачалося. Толькі цяпер зразумеў Пятрок, якую жанчыну прывалок у сваю хаціну і чаму яе людзі гэтак дзіўна клікалі. Грызля — ніякая не працаўніца. Толькі і рабіла, што з дачкою сваёю дома ляжала і нават не спрабавала што-небудзь па гасподзе ці на ніве зрабіць. Адзінае, што ў яе спрытна атрымлівалася,— гэта кляцьба ды праклёны. Рот у Грызлі і на хвіліну не закрываўся. За нейкі там год-другі так падмяла пад сябе мужыка, што той і слова супраць баяўся прамовіць. А ўжо небараку, дачку Петракову, то толькі і прымушала працаваць ды ўсё рабіць. Не давала беднай нават прысесці, каб дух перавесці:

— Парасачка, а чаго гэта ты сядзіш, роднененькая? Каб ты болей ніколі не села! Чаго гэта ты нічога не робіш? Каб табе каршун за гэта вочы павыдзёўбваў! Знайсці не можаш, чым заняцца? Толькі хлеб ясі, а працы з цябе ніякай! Ой, Божачка, і куды ён глядзіць?! Бяжы ў поле, там яшчэ палоска жыта не праполатая стаіць, да вечара якраз і паспееш. Чаго зеўрыш, бяжы, каму сказала, бо зараз як трэсну, дык мала не падасца!

І гэтак кожны дзень ганяла туды-сюды дзяўчыну. Пятрок ужо і заступацца не спрабаваў. Маўчаў, дый годзе. А Параску ганялі і ўдзень, і ўначы.

Аднаго разу Грызля і кажа на Петрака:

— Не слухаецца твая дачка. Нічога рабіць не хоча. Таму вырашыла я, што лепей будзе, калі ты яе ў лес нібыта па дровы павязеш ды там і пакінеш. Няхай лепей там лазіць, чым нас дома аб'ядаць. Усё роўна прыбытку з яе тут ніякага няма.

Пятрок толькі рот адкрыў:

— Але ж...

— То што, ты ўжо і падпарадкоўвацца мне не жадаеш? Можа яна табе даражэй за мяне? Тады заставайся сам у сваёй хаціне!

— Ды не... Не... Я толькі спытацца хацеў, калі ехаць...

— Добра ўжо, едзь заўтра раніцай, а сёння няхай дома паспіць яшчэ,— змілавалася Грызля.

Едзе Пятрок раніцай на коніку ў лес ды горкімі слязьмі заліваецца, а Параска сядзіць сабе ў вазку ды па баках глядзіць, птушачак слухае, як яны

спяваюць. Ведае: гэтак, як дома было, нідзе не будзе. На бацьку ўвагі ніякай не звяртае. Зразумела, што ад яго падтрымкі не будзе. Прывёз Пятрок Параску да высокага дуба і загадаў, у бок адвярнуўшыся:

— Злазь з воза і заставайся тут. Дамоў болей не вяртайся. Там цябе ніхто не чакае. Мне яшчэ Грызля загадала да дрэва цябе прывязаць, але я гэтага не зраблю.

— Чаму? Я ж не ўцякаю,— з'едліва прамовіла дачка,— выконвай, раз табе загадалі.

— Там, у торбачцы, есці крыху ўзяў,— прамямліў Пятрок і паехаў з лесу, пакінуўшы Параску адзін на адзін з дзікімі звярамі.

Сядзіць тая пад дубам і дрыжыць. Ведама ж, баіцца. Ужо і з жыццём развіталася. Спалохалася. Падумалася дзяўчыне, што зараз вось вылезе які-небудзь люты мядзведзь ці воўк і з'есць яе. Ды не здарылася такога. Зашамацела кустоўе, і на палянку перад дрэвам выскачыла маленькая каза. Яе вяскоўцы ланкай называлі паміж сабою. Стала і ўтаропілася на Параску. Потым як пачала выкручвацца ды бегаць па палянцы, то дзяўчына ажно засмяялася, на небяспеку забыўшыся. Узяла кавалачак хлеба з торбачкі і працягнула козачцы. Тая паціху падышла і асцярожна злізнула пачастунак. Крутнулася разоў колькі і... збегла. А Параска зноў сумаваць пачала. Толькі праз колькі часу выскачыла на палянку тая ж самая ланка, ужо з сяброўкамі. І столькі іх многа было, што не злічыць. Глядзела-глядзела на іх дзяўчына дый заснула незаўважна пад магутным дубам. Спіць, і сніцца ёй дзіўны сон. Што ідзе яна да рачулкі, а там стаіць невялічкая хацінка. Заходзіць ў яе Параска — там нікога няма, толькі ўсялякага начыння надта багата і ежы таксама.

Падумала пра ежу дзяўчына і прачнулася, бо нават у сне есці хацела. Працерла вочы і ніяк зразумець не можа, дзе знаходзіцца. Пакуль дацяміла што да чаго, то не адна хвіліна прайшла. Перакусіла і вырашыла куды-небудзь ісці, бо неяк жа далей трэба было жыць.

І што ж вы, людцы добрыя, думаеце? Спраўдзіўся той сон. Нібы ў руку яго хто Парасцы паклаў. Ішла, ішла па пушчы і выбілася да ручаінкі. А там яе ўжо чакалі ланкі. Многа іх было. Яны паперадзе беглі, вялі, значыцца, дзяўчыну за сабою — гэта яна потым зра-

зумела. Да самага вечара не спыняліся хітрыя жывёлінкі. Пачакаюць, пакуль Параска бліжэй падыдзе, і зноў далей кіруюць. Калі ўжо сонейка за верхавінамі схавалася і змрок пачаўападаць, выйшла бедалага прама на... невялічкую хаціну, перад якой гарэла вогнішча. Стала і баіцца далей крочыць. Ажно чуе голас, ласкавы такі, спакойны:

— Чаго палохаешся, прыгажуня? Хадзі да вогнішча, не бойся мяне. Я не ваўкалак і не злыдзень які-небудзь, а звычайны чалавек, які тут ужо многа гадоў у самоце жыве. Хадзі, не палохайся...

Падышла дзяўчына да вогнішча, павіталася і бачыць, што сядзіць на пянёчку сівы дзядулька, а ля яго, пад нагамі, ляжаць котка і сабака, ды побач з дзвярыма хацінкі ўладкавалася колькі ланак. Стары працягнуў сваёй госці драўляную міску з ежай:

— На, падсілкуйся. Здарожылася, згаладалася, мабыць?..

Але Параска не адказвала. Яна прагна ела прапанаваную страву, якая падалася ёй незвычайна смачнай.

З таго дня і засталася дзяўчына з дзядулькам жыць у лясной хацінцы. Рэчку, на беразе якой будыніна стаяла, яны між сабою Ланкай празвалі, а потым і паселішча людзі гэтаксама назвалі. Ды здарылася такое значна пазней, калі старога ўжо не было сярод жывых, а сама Параска бабулькай стала. Адтуль наша Лань і пайшла.

## САСКА-ЛІПКА

Нашу вёску ад дрэва пачалі называць гэтак дзіўна. І вось што тут адбылося.

Было ў аднаго селяніна дзве дачкі, адна ад першай жонкі, якая памерла, а другая — ад другой, з якой ён зараз і жыў. Мачаха няродную дачку так ужо прымушала працаваць, што той, бедалазе, і сну не было. Толькі вочы заплюшчыць, а гаспадыня ўжо верашчыць:

— Час уставаць! Няма калі ляжаць! Каровак трэба даіць ды на пашу гнаць! Кожнаму ж вядома, што трава на лузе да ўзыходу сонца самая смачная. Калі яе сонца абагрэе, то ніякай карысці такая трава жывёле не прыносіць! Уставай, лайдачка!

Калі тая паспрабуе адгаварыцца ці сказаць нешта ў адказ, то мачаха з кулакамі ляціць:

— Што, можа хочаш, каб мая дачка працавала, а ты ў ложку ляжала? Не будзе такога! Не будзе! Зараз я табе тут наладжу лазню! А за тое, што не падпарадкоўваешся, яшчэ і заданне табе маё такое будзе: вось гэты лён каб змяла, страпáла і ў маткі памятала! Да вечара не выканаеш — у хату можаш не вяртацца!

Пагнала дзяўчына каровак на пашу. Села ля куста і плача-заліваецца. А тут да яе падыходзіць пярэстая кароўка-муроўка дый гаворыць чалавечым галасам:

— Чаго ты плачаш, прыгажуня? Чаго ты ніколі вясёлай не бываеш? Колькі пасвіш нас — усё слязьмі заліваешся? Што ж гэта робіцца?

— А як жа мне, кароўка-муроўка, не плакаць? Як жа мне слёз гаручых не ліць, калі мне мачаха гэткай цяжкай працы назадавала, што я яе і за год не перараблю, не тое, што за дзень адзін...

Кароўка-муроўка выслухала ўважліва і адказвае:

— Усё, што табе загадана, я выканаю ў адзін момант, так што не хвалюйся дарма, не лі слёзак гаручых, лепей супакойся ды паглядзі, як хораша навокал... А лён той, што прынесла, бяры па жменьцы ды сунь мне ў левае вуха, а з правага будуць гатовыя ніткі самі па сабе ў клубочак звівацца. Не паспееш і азірнуцца, як усё будзе выканана...

І сапраўды, за нейкіх паўгадзіны з цяжкай працай управілася. Дзяўчына давай дзякаваць сваёй памочніцы, а тая і слухаць не хоча ніякіх падзяк. Маўляў, чаго там з-за нейкай дробязі гэтак рассыпацца...

Гоніць дзяўчына жывёлу дамоў і песню голасна спявае. А мачаха ажно за ваколіцу выйшла сустракаць, каб даўжэй сварыцца, пакуль дахаты дойдуць, ды каб усе чулі, якая лайдачка ў яе расце. Як пачула песню злая жанчына, то падскочыла, нібы сабакам укушаная:

— Зрабіла тое, што я табе наказала?!

— Зрабіла,— адказвае няродная дачка.

На другі дзень, з самае раніцы, мачаха зноў загадвае дзяўчыне:

— Пагоніш кароў, і тое, што ўчора прынесла ў клубочак, каб сёння саснавала, саткала і ў сувой скачала! Не выканаеш — сама ведаеш, што цябе чакаць будзе!

Села дзяўчына ля кусціка і зноў заплакала. Падыходзіць да яе кароўка-муроўка, пытаецца:

— Чаго плачаш, прыгажуня? Чаго зноў невясёлая?

— Ды сёння мне задала мачаха яшчэ больш цяжкае заданне. Я яго і за два гады не выканаю.

— Не хвалюйся, зробім усё, як мае быць. Толькі дапамагай акуратна.

Стала кароўка-мурoўка на адным месцы, а дзяўчына толькі і робіць, што пражу ёй у вуха падае. Праз некалькі імгненняў усё было гатова.

— Вось бачыш, усё і гатова. А ты, гаротная, перажывала, хвалявалася.

Зноў вясёлай дзяўчына дамоў вяртаецца. Спявае сабе песню, каровак ласкавымі словамі падганяе. Мачаха яе на ранейшым месцы, ажно за вёскай, сустракае.

— Што, зрабіла ўсё? — злосна пытаецца.— Добра зрабіла ці абы-як, толькі б адчапіцца? Глядзі мне! Паказвай!

— То, можа, лепей дома паказаць, бо тут выпацкаць можна тканіну,— здзівілася дзяўчына, але мачаха і слухаць нічога не жадае:

— Пагавары ў мяне, то яшчэ і ў каршэнь атрымаеш!

Раскруцілі тканіну. Як глянула скнара, то са злосці ажно пабялела — усё чысцютка, раўнютка ды гладзенька выраблена, нідзе ні вузельчыка, ні складачкі не відаць.

Хацела мачаха гэтага ці не, але даведаліся людзі пра такую цудоўную майстрыху. Да таго ж, няродная дачка прыгажуняй сапраўднай стала, не тое што родная — рабая ды хваравітая. Пачалі жаніхі сватоў прысылаць у хаціну да злой жанчыны. Прыйдуць і давай гаманіць пра вяселле. Але мачаха пастаянна ім сваю дачку прапаноўвала. Сваты пераглянуцца паміж сабою, устануць і пойдуць, бо, ведама ж, каму ахвота ў сваю хаціну браць гэткую пачвару, ды яшчэ калі і характарам на маці падобна, то ўвогуле бяда з горам з сям'і вылазіць не будуць.

Аднаго разу прыйшлі сваты і зноў давай прасіць у гаспадыні паказаць ім дачку. Калі тая вывела родную, то гаваркія мужчыны ў адкрытую заявілі:

— Нам, родненькая, не гэтую дзяўчыну. Гэтая прыгожая, але мы не дзеля яе сюды прыйшлі.У вас жа яшчэ адна ёсць. Вось тую мы жадалі пабачыць...

— Ды яе дома няма. Яна ў полі каровак пасвіць.

— То вы сваю пашліце, гаспадынька, няхай яна там яе падменіць.

— Вось яшчэ выдумалі, каб мая дачка за некага там працавала,— усхадзілася жанчына.

— Надта просім, гаспадынька, не адмаўляйце нам,— узмаліліся сваты.

— Добра, пашлю мужа, але толькі пры адной умове — што вы будзеце аглядаць абедзвюх маіх дачок.

— Згода.

Паджгаў муж у поле, толькі пяткі, даўно нямытыя, на сонцы заблiскацелі. Неўзабаве абедзве дзяўчыны былі ў хаце. Тады старшы сват устаў і запрапанаваў:

— Шаноўная гаспадыня, вось вам кубачак, і няхай кожная з дачок вашых па чарзе прынясе нам вады ў ім калодзежнай і па пару яблык з вашага саду. Каму ўдасца гэта зрабіць, тая і стане нашай маладзіцай. Прабачце ўжо, што гэткую ўмову вам паставілі, але ў нас толькі адзін жаніх, і таму адна дзяўчына ў нашу хату патрэбна.

— Ды гэта нічога, нічога,— заўсміхалася жанчына, узрадаваная нескладаным, як ёй падалося, выпрабаваннем.— Зараз усё выканаюць, як вы і просіце.

Хітрая мачаха пачала родную дачку выпраўджваць:

— Вось табе, донька мая, кубачак. Ідзі з ім ды вадзіцы калодзежнай прынясі людзям і пару яблычак з нашага саду сарві. Не баўся там надта, бо бачыш жа — чакаюць цябе.

Пайшла яе дачка да калодзежа. Толькі сабралася вады зачэрпнуць, а тая раптоўна знікла, апусцілася, можа, на метры два. Пайшла ў сад і працягнула руку да яблык, але голле так высока ўзнялося, што яго і кіем нельга было дастаць. Зарумзала тады родная дачка ды ў хату, да матулі, падалася.

— Не змагла, мамка, выканаць тое, што ты сказала.

Настаў час няроднай ісці з кубачкам. Выйшла яна да калодзежа, нахілілася, бачыць — вада ніжэй апускаецца, тады яна перажагнулася і спакойна дастала вады. Тое ж самае зрабіла і ў садзе, і голле пасля святога крыжа ажно да галавы схілілася. Сарвала гаротніца пару яблычак і ў хату, на стол усё прынесла:

— Частуйцеся, госцейкі, на здароўе!

Зноў устаў старшы сват і прамовіў:

— Вось гэтую дзяўчыну мы і забяром у цябе, гаспадыня, бо яна выканала тое, што мы патрабавалі.

Згулялі вяселле і забралі дзяўчыну ў сваю хаціну. Калі яе везлі, то бацька з матуляй няроднай, мачахай, нічога ў пасаг не далі. Плакала, бедалага, гэтак, што ажно вочы пачырванелі, але муж і ягоныя бацькі супакойвалі:

— Не плач, родненькая, не ўбівайся гэтак! Гэта не самае страшнае, было б здароўе, а грошы і багацце самі нажывём.

Тады ўспомніла дзяўчына пра сваю верную памочніцу кароўку-мураўку. Падбегла да статка і стала ёй на вуха казаць, што замуж выйшла і ў другую вёску перабіраецца, што болей не ўбачацца яны ніколі. Але карова ціхенькім голасам ёй адказала:

— Не палохайся, мая сяброўка, сёння вечарам я сама прыйду ў хлеў на тваё новае месцажыхарства. Будзем зноў разам з табою.

Так і здарылася. Пайшла дзяўчына ў хлеў раніцай, а кароўка-мураўка стаіць сабе спакойненька там ды пережоўвае траўку, якую за дзень наскубла. Так яны і жылі разам: сям'я маладая ды кароўка-мураўка, якая дапамагала ім у кожным выпадку. Калі жывёліна памерла, то яе пахавалі, нібы чалавека, а над магілаю пасадзілі ліпку. Людзі звалі гэтае дрэўца Царска Ліпка, з-за таго, што пад ёю ляжала істота, якая ўсё на свеце магла зрабіць. А з цягам часу назву крыху перайначылі і засталося так, як і цяпер,— Саска-Ліпка.

## СЕЙЛАВІЧЫ

Сейлавічы — вялікае сяло за Нясвіжам. Стаіць яно на рацэ Тур'я, што ўпадае ў магутны Нёман. А пра паходжанне яго па-ўсялякаму пераказваюць. То паслухайце і вы.

У нас даўней так вадзілася, што моладзь па вечарах хадзіла на вячоркі. Пазбіраюцца, сядзяць там, дзяўчаты нейкія ніткі ці кудзелю з сабою прынясуць, нібыта для працы, але ж, самі ведаеце, што ў першую чаргу за хлопцамі сачылі ды дурэлі з імі. Часам і адны дзяўчаты збіраліся, тады хлопцы імкнуліся іх напалохаць. Чакалі, пакуль вячоркі скончацца, і дзе-небудзь на вуліцы выскаквалі нечакана перад імі. Тады ўжо крыкаў ды страху было на ўсю ноч.

Аднаго разу дзяўчаты сядзелі таксама адны і неяк заварылася ў іх спрэчка. І вось адносна чаго: ці адважыцца хто прынесці крыж з могілак, вырваць з магілы і прынесці ды паказаць астатнім. А была сярод іх Хрысця. Такая ўжо адважная ды смелая дзеўчына, што мужыка любога за пояс магла заткнуць. І здаровая была. Сама ўсю працу рабіла, усё ўмела і нікому не давярала, баялася, што толькі сапсуюць. Дык вось яна і гаворыць:

— Вой, нашлі чым палохаць. Крыж нейкі з могілак прынесці. Ды я вам зараз два прыцягну, каб толькі падужала прынесці. Не ўцякайце нікуды, а сядзіце тут і чакайце. Зараз пайду і прынясу!

Дзяўчаты засталіся ў хаціне, а Хрысця папраставала да могілак. Сяброўкі спачатку сядзелі ціха, толькі пераглядваліся, але потым пачалі сумнявацца, што Хрысця здолее гэта зрабіць. Найбольш скептычныя нават гаманілі:

— Недзе за вуглом стаіць, а потым прыйдзе і скажа, што напалохала нешта ці не падужала прысунуць...

— Або скажа, што заблудзілася і нячысцік яе вадзіў туды-сюды, не даючы магчымасці падысці да могілак...

— Ці ўвойдзе да нас, а на ёй твару няма, белая ўся, нібы ў муку выкачаная...

Нехта хацеў дадаць яшчэ нешта вясёлае, каб пасмяяліся і астатнія, ды не паспеў, бо гучна рыпнулі дзверы і... за гэтым трэскам раздаўся дзікі крык:

— Ой, Божачкі! Што ж гэта такое?! Глядзіце!

Дзяўчаты шухнулі у супрацьлеглы ад дзвярэй вугал. Толькі полымя ад лучыны скакала і нібы пацвярджала, што ў пакоі нехта ёсць. Праз парог паволі прасоўваўся здаравенны, збуцвелы крыж. За ім паказаўся ўсмешлівы твар Хрысці:

— Ну што, выпрабавалі сябе? Думала, што вы тут праз вокны павылазіце, як раўнулі? Ці ж гэта страх! Я і яшчэ адзін крыж валакла, але не здолела сюды прынесці, бо надта ж цяжка. То падперла ім дзверы ў папоўскай хаце. Вось заўтра смеху будзе, калі бацюшка вымушаны будзе вылазіць праз акно па нейкай там патрэбе.

Цяпер ужо загаманілі і дзяўчаты:

— Ды мы і не спалохаліся. Нешта такое з намі зрабілася...

— Ага, зрабілася,— перабіла Хрысця,— ледзьве

на сцяну не палезлі. Добра, што ніхто хавацца пад печ не папёрся.

Так і разышліся, а потым яшчэ доўга над бацюшкам смяяліся, як ён гарлаў на ўсю вуліцу, каб яго нячыстая сіла з уласнай хаціны выпусціла.

У другі раз сядзелі дзяўчаты на вячорках да позняга часу. Выйшлі з хаціны і пачалі разыходзіцца. А Хрысця жыла на хутары. Яго можна было б хутарам і не называць, бо стаяла сядзіба ўсяго кроках у шасцістах ад вёскі, але так ужо тады казалі. Таму дзяўчыне пастаянна трэба было адной праходзіць гэтую адлегласць. Тое, што яна была не палахлівая, мы ўжо ведаем.

Ідзе сабе Хрысця ды думае, як гэта назаўтра з матуляй у лес ехаць, па дровы. Бацькі ў іх не было. Памёр даўно, калі ёй яшчэ, можа, гадкоў усяго пяць было. Таму ўсё і ляжала на жаночых плячах у гэтай гаспадарцы. Ажно бачыць дзяўчына — свежанькія сляды ад саней па глыбокім снезе. Добра памятала, што, як ішла на вячоркі, іх не было, а тут... Пастаяла на месцы нейкую хвіліну, пакруцілася, нібы вагаючыся, прайсці ды глянуць, што там такое, ці спаць кіраваць. Цікаўнасць узяла сваё. Пайшла Хрысця па слядах. Снегу амаль па пояс, але ўжо раз сабралася, то і адступацца не надта хочацца.

У той вечар, аказваецца, шайка зладзеяў, якая ўжо даўно не давала спакойна спаць мясцовым жыхарам, вырашыла абабраць аднаго з найбольш заможных вяскоўцаў. Пад'ехалі ў двое саней да самай сядзібы і ў адкрытую, амаль не тоячыся, пачалі выносіць дабро з хаты ды з кладоўкі. Гаспадара з дзецьмі зачынілі ў хаце, і хоць ты плач, хоць маліся — ніхто не пачуе і на дапамогу не прыйдзе. Тым болей, што ноч на дварэ ды і хаты адна ад адной далекавата стаяць. Зладзеі размаўляюць сабе спакойненька і хуценька найбольш каштоўнае вымятаюць. Прытаілася Хрысця непадалёку. Ей відаць усё, як на далоні, а яе чужынцы не бачаць. Думае дзяўчына, што ж рабіць. Адна нічога не здолее, бо надта многа іх прыехала, хутка жыцця пазбавяць і ведаць ніхто не будзе, як гэта здарылася. Стаяла яна, стаяла, а потым як загарлае што было сілы сваім зычным голасам:

— Людцы добрыя, ратуйце! Ратуйце, родненькія! Зладзеі! Хутчэй, бо забіваюць! Ратуйце!

Зладзеі як пачулі, што нехта такім страшным

голасам закрычаў, ды яшчэ так нечакана, то спалохаліся і самі ўжо не ведаюць, што далей рабіць. Азіраюцца, кідаюцца туды-сюды. Але неяк старэйшы ачомаўся і кінуў:

— Уцякаем! Спарней, браткі, бо тут нас і пазабіваюць! Чорт з ім, з багаццем! Уцякаем!

— А коні? — выгукнуў нехта.— Коней трэба забраць!

— А сляды застануцца...

— Уцякаем, уцякаем! Коней мы сабе яшчэ прыдбаем, а калі тут сяляне зловяць, то канцы нам будуць!

Неўзабаве пачулася шматногае тупанне — гэта беглі на крык вяскоўцы. Тады толькі выйшла са свайго сховішча Хрысця. Людзі вызвалілі з заваленай хаціны гаспадара, унеслі яму ўсё ягонае дабро назад, а коней вырашылі аддаць таму, хто выратаваў чалавека ў бядзе — дзяўчыне. Так яны з матуляй і ўзбагаціліся крыху, сталі гаспадарамі чацвярых спраўных коней. А гэта ж вам не жартачкі!

Ды не была б яна Хрысцяй, калі б пачатую справу да канца не даводзіла. Пакуль прыйшла дамоў, пакуль супакоілася, то вось што ёй у галаву прыйшло — вырашыла прасачыць, куды ж зладзеі ўцякалі, і знайсці іхняе жыллё. Можа, яшчэ нешта прыдбае такім чынам. Раніцай устала дзяўчына і гаворыць матулі:

— Мама, давай перакусім, ды я запрагу коніка і паеду па дровы. Цяпер каня прасіць не трэба, у саміх ёсць. Цяпер мы з табою зажывём!

Гаспадыня радасна заўсміхалася — і ім шчасце падваліла.

Выехала Хрысця на дарогу заснежаную, а сама ж ведае, што калі зладзеі ўцякалі, то прабітай дарогі не шукалі, пёрлі, куды вочы глядзелі, дый годзе. Знайшла след і паехала па ім. Забралася на санях у такую гушчэчу, што ажно цёмна адразу стала. Навокал лес густы і высачэзны стаіць, верхавінамі сваімі з небам гамоніць. Потым і хаціну ўбачыла. Прывязала коніка, і сама бліжэй падалася. Глянула ў акенца, а ў пакоі сядзяць, можа, чалавек з дзесяць і мяшок золата-срэбра на стале дзеляць. Як убачыла Хрысця гэтулькі каштоўнасцей, то і падумалася ёй, што прыспеў яе час узбагаціцца. Крутнулася ў адзін бок, пабегла ў другі, але ў галаву пакуль што думка адпаведная не прыходзіла. Сюды вяскоўцы, калі і прыбягуць, то праз гадзіны тры-чатыры, а за

гэты час рабаўнікі паспеюць не тое што скарб свой хаваць, але і самі джгануць за трыдзевяць зямель. Прыпынілася ля вугла і задумалася. Ажно ўбачыла таўшчэразны цурбалак, які ляжаў ля парога. Як убачыла яго, то і вырашыла ўсё адразу. Пракралася да дзвярэй, завязала моцна клямку, зацягнула яе паскам так, што толькі разрэзаўшы можна было вылезці з хаты, але гэта з надворку, а з сярэдзіны... Узяла ў рукі цурбалак, адышлася, разбеглася ды ў сцяну як лупянула — ажно цэгла з коміна долу пасыпалася. Потым яшчэ разоў колькі, ды пры гэтым крычала на чым свет стаіць:

— Людцы! Зладзеі! Людцы! Забівайце іх хутчэй! Усіх на бярозе перавешаць! Хутчэй, пакуль не паўцякалі!

Кінуліся рабаўнікі да дзвярэй, каб уцякаць, а яны не адчыняюцца. Яны да вокнаў, а там нікога не відаць, толькі нешта грукоча ў сцяну так, што ўжо вуглы трашчаць. Тады старшы сярод зладзеяў выгукнуў:

— У вокны, родныя! У вокны, ды хто куды па лесе! Хто куды! Каб не здагадаліся ў пагоню пусціцца!

Тыя і рванулі, толькі кустоўе затрашчала, а атаман хітры быў, за мех з каштоўнасцямі — і папраставаў. Убачыла гэта Хрысця — і за ім бегчы. Доўга яна злодзея праследавала, ажно пакуль той з сілы не выбіўся, але ўсё роўна золата-срэбра не аддаў. Вось да чаго дадумаўся: ідзе наперадзе і каштоўнасці з мяха налева-направа рассявае. Дзяўчына блізка надта падысці баіцца, а рабаўнік ужо ўцячы не можа. Рассеяў, а Хрысця запомніла тое месца. Калі вясна прыйшла, яна з матуляй там жыць сталі, бо пастаянна залатоўкі знаходзілі на зямлі. Потым яшчэ доўгія гады так было, з-за гэтага і назвалі паселішча Сейлавічамі. Ад таго, што скарбы сеялі.

## СНОЎ

Хадзіў у далёкія часы па свеце вандроўнік. Нельга было сказаць, што гэта быў надта стары чалавек, не, але што многае пабачыў на сваім вяку, то гэта дакладна. Дзе ж вы чулі, каб чалавека штодзень новая дарога чакала, а ён нічога не ведаў? Навіны з ягоных вуснаў гэтак і цяклі, нібы ручаіна якая. Як пачне казаць, то раніцай скончыць, азірнецца дый скажа:

— Дзякуй вам, добрыя людзі, за прытулак. За тое, што пусцілі ў хаціну пасядзець-пагрэцца. Цяпер мне час далей кіраваць.

— То ж на вуліцы лета, і дзякаваць нам за прытулак неяк не выходзіць,— працівіліся гаспадары,— хоць хлеба кавалак вазьмі, чалавеча, тады справа іншая...

— Што лета — гэта праўда, але ўсё роўна ў хаце намнога лепей, чым на вуліцы, а сярод людзей — нібы ў роднай сям'і. За хлеб дзякуй асабліваe.

Так і хадзіў з месца на месца чалавек, запамінаў усё, распавядаў, і гэтак у яго дзень за днём і праходзіў. І была ў яго такая прымаўка, якой ён пастаянна прытрымліваўся: «Дрэнна рабі, добра рабі — усё сабе будзе». Яе часта згадваў, калі з людзьмі размаўляў. Яна яму і дапамагала, а ў некаторых выпадках нібы прадказвала тое, што павінна было адбыцца. А гісторыя наша так здарылася.

Аднаго разу вандроўнік моцна стаміўся, а ўжо вечар позні на дварэ стаяў і трэба было недзе прыхінуцца, бо пад адкрытым небам начаваць не будзеш. Падышоў яшчэ з вярсту якую і ўбачыў палац панскі. Пастаяў нерашуча, бо не жадаў ісці да багатых гаспадароў, звычайна ён іх абыходзіў, ведаў, што там яго не чакаюць і нічога не дадуць. Ды выйсця іншага не было. Узышоў на парог, а тут і слугі да яго падскочылі:

— Чаго ты тут, галадранец, шукаеш? Што ты тут вынюхваеш?

— Ды я толькі хацеў спытаць у пані-гаспадыні, ці нельга мне дзе-небудзь у яе будынках пераспаць ноч, каб з раніцы далей пакрочыць? Вышукваць я нічога тут не вышукваю. Толькі б пераспаць, дый годзе на тым...

— Бачыш ты, пераспаць! Цябе пусці, то ты тут яшчэ што ўкрадзеш, а нам за цябе потым адказвай. Нельга, і ўсё!

— Ну, нельга, дык я далей папрастую. Чаго ўжо там,— пачаў вандроўнік і памкнуўся, павярнуўшыся, ісці назад.

— Чаго гэта вы чалавека праганяеце? — пачулася пагрозліваe.

Зірнуў вандроўнік і ўбачыў старую пані, якая злосна пазірала на сваіх слуг:

— Начуй, чалавеча, начуй. Месца ў мяне хапае. Вунь колькі будынкаў пустуе, у любым можаш пераспаць. Чаго ўжо там.

Каб жа падарожны ведаў, што да чаго, то ён бы ціхенька збег, калі змрок запанаваў. А так заснуў сабе спакойным сном. А гаспадыня тая была не простая пані, а страшэнная нядобразычлівіца. Вось вырашыць чалавека са свету звесці — і перавядзе яго ні за што. Так і з гэтым вандроўнікам зрабіць захацела. Выклікала да сябе пасля апоўначы даверанага кухара і загадала:

— Шаноўны, спячы мне мой любімы пірог! Каб да раніцы быў гатовы!

Кухар нізка пакланіўся і прамовіў:

— Зраблю, пані, усё як трэба зраблю. Не ўпершыню.

— Глядзі, каб ніхто не даведаўся пра гэта, каб ніхто не пранюхаў, сам разумееш, чым тады справа можа скончыцца...

— Разумею, пані, разумею. Можаце не сумнявацца...

Яшчэ толькі сонца пачало залаціць ускраек лесу, а кухар ужо джгаў у пакоі да сваёй гаспадыні, несучы на вялізным падносе пірог. Ды такі прыгожы, румяны, высокі, што вачэй ад яго нельга было адарваць. Пастукаў ціхенька ў дзверы і кажа:

— Пані яснавяльможная, зрабіў, як вы і загадалі. Усё гатова...

— Заходзь тады, чаго за дзвярыма таўчэшся,— прагучаў нізкі голас гаспадыні.— Пагляджу, які ён выйшаў...

Унёс кухар пірог і спыніўся ля парога, а пані як убачыла, як засмяецца, як пляснe рукамі:

— Божачкі, ды гэта ж цуд цэлы, а не пірог! Як табе такое зрабіць удалося! Ну і малайчына ты ў мяне!

Кухар прысаромлена апусціў вочы долу. Маўляў, чаго ўжо там, пастараўся.

А падарожны, нічога не ведаючы, спаў сабе спакойна. Устаў потым і выйшаў на двор, каб ісці далей. Спыніўся і думае: трэба падзякаваць гаспадыні, але ж рана яшчэ, і пані, відаць, соладка спіць. Азірнуўся разгублена і паціху пакіраваў да брамы. Ступіў крокаў колькі, ажно чуе голас:

— Чаго ж ты, чалавеча, нават дзякуй не сказаў і адразу ў дарогу выбіраешся? Ці ж так ты паўсюдна робіш?

Глядзіць падарожны — ажно сама пані на ганку стаіць і пасміхваецца.

— Ды не, яснавяльможная пані, справа ў тым, што я не жадаў вас будзіць, каб дзякуй сказаць. Няёмка неяк такое рабіць.

— Ну нічога, чалавеча, усялякае здараецца. Чаго толькі ў жыцці не бывае. Часам і не хочаш, а зробіш...

— Так, пані,— ціха прашаптаў вандроўнік.

— То пайшлі ў пакоі, я цябе пачастую перад дарогай. Як жа гэта ты галодны пойдзеш? Ногі слухацца не будуць. Дзе-небудзь упадзеш, знясілены. Ці ж я не разумею.

— Дзякуй, яснавяльможная пані, але нешта з раніцы і есці не надта хочацца. Можа, я лепей пайду далей, пакуль сонца паліць не пачало.

— Пайшлі, пайшлі, не саромейся. Перакусіш і далей лягчэй будзе кіраваць.

Зайшлі, селі за стол. Пані падарожнага, нібы роўнага, побач з сабою пасадзіла. А на стале страў усялякіх, самых розных, што ў простага чалавека ажно вочы разбягаюцца. Гаспадыня кухара паклікала, і той, важны, тоўсты, самналіваў і падкладваў у талеркі нечаканаму госцю. Вандроўнік есць, а ў грудзях у яго ўсё замёрла. Адчувае, бедалага, што нешта тут не такое, што нешта далей будзе, а што — не ведае.

Пані не адпускае чалавека:

— Еш, не спяшайся, чаго ўжо там. Нейкая гадзіна ўсё роўна нічога не зменіць. Ты ж пастаянна ў дарозе і не ведаеш, дзе яшчэ да вечара будзеш, ці пакорміць хто, ці пераначаваць пусціць.

— Так, яснавяльможная,— адказвае вандроўнік, а сам, асмялеўшы, умінае ежу так, што ажно валасы на галаве трасуцца.

— То і еж ад душы, не палохайся. І на дарогу мой кухар табе гасцінец падрыхтаваў, з'ясі яго, калі згаладаешся.

— Ды мне і гэтага многа. Дзякуй вам, пані, не ведаю яшчэ, якімі словамі дзякаваць вам за ўсё...

— Нічога, нічога, вазьмі толькі падарунак ад майго кухара. Гэй, кухар, дзе ты там бавішся? Нясі хутчэй, чалавеку ў дарогу час выпраўляцца.

Выйшлі за парог, а кухар ужо стаіць і чакае з пірагом у руках. Як убачыў яго вандроўнік, дык ажно ў грудзях закалола. Ніколі ў жыцці такога не бачыў, а тут яму ў дарогу, з сабою даюць.

Падзякаваў падарожны пані за хлеб-соль і паджгаў

з палаца. Прэ так, што ногі да зямлі не датыкаюцца. А ў галаве адзіная думка: «Вось бы паспрабаваць разламаць пірог і пакаштаваць яго. Калі такі прыгожы, то і смачны павінен быць...» Толькі нейкі голас не дае чалавеку гэта зрабіць, нібы за рукі яго трымае.

Ужо амаль да полудня час падышоў, і вырашыў вандроўнік, што дойдзе да крынічкі, якая павінна была знаходзіцца непадалёку, прысядзе там адпачыць і пірог пакаштуе. Джгае і смяецца, радасна рукі паціраючы. Нарэшце і зруб над крынічкай заўважыў. Яшчэ здалёку пачаў торбу развязваць, каб падарунак дастаць і пачаставацца. Сеў, а рукі не могуць разламаць, парушыць гэткі цуд. Узяўся тады ён за пірог, заплюшчыў вочы і... пачуў грозны голас:

— Не руш! Не чапай пірог! Давай яго сюды! Бачыш ты на яго, рот разявіў! Давай сюды, мы і самі, без цябе яго з'ямо!

Адкрыў вочы і бачыць — стаяць перад ім два дзецюкі ў каштоўных вопратках і бізунамі памахваюць. Спалохаўся падарожны і кажа:

— Што ж рабіць, калі вас двое. Забірайце сабе... Надта ж хацелася хоць крышачку пакаштаваць...

— А мы табе пакінем,— весела зарагатаў адзін з незнаёмцаў,— давай яго сюды!

Ухапілі пірог і збіраліся спачатку сесці ў карэту і ехаць, ды адзін з іх прапанаваў:

— Давай тут, ля крыніцы, і перакусім!

Разламалі таропка пірог і давай яго есці. Вандроўнік не мог глядзець, як яны бессаромна яго падарунак елі, і адвярнуўся. Ажно чуе — хрыпіць нехта. Глянуў і спалохаўся: тыя панічы качаліся па зямлі і дралі свае целы рукамі. Зразумеў тут чалавек, што пірог быў атручаны, і пабег як мага далей ад гэтага страшнага месца. Бяжыць і чуе, як ззаду крычыць немым галасам нейкая жанчына:

— Сыноў сваіх пагубіла! Сыноў сваіх пагубіла!

Тады вандроўнік яшчэ хутчэй паімчаў, але і крык яго даганяе:

— Сыноў сваіх пагубіла! Сыноў пагубіла!

Ужо з сілы пачаў чалавек выбівацца, а голас усё роўна дастае, толькі ўжо не гэтак выразна:

— С...н..о..ў г...у...л...а...

Гэта пані тая крычала над целамі родных дзяцей, якія са сквапнасці з'елі атручаны пірог. Вось адкуль Сноў пайшоў.



# ПУХАВІЧЫ (МАР'ІНА ГОРКА)

Аповед наш пойдзе пра каханне. Пра трагічнае, праўда. Пра такое цяжка гаварыць, нягледзячы на тое, што, можа, мінулі цэлыя стагоддзі. Нельга абысці такія гісторыі, яны не пакідаюць абыякавымі нават самых счарсцвелых людзей. Пачуеш і сам нібы ў мінулае вяртаешся, да сваёй маладосці, дзе таксама не ўсё было гладка, дзе таксама былі нейкія перашкоды і цяжкасці, супярэчнасці і непаразуменні. Хочацца, каб ніколі такое болей не паўтаралася, каб сярод маладых панавала толькі шчасце ды каханне, каб яны гора-бяды не ведалі, бо на наш лёс яго даволі выпала і, можа, мы і за іх сербанулі. Хоць нездарма, мабыць, кажуць, што кожны чалавек павінен з'есці сваю соль і свой цукар. Гэта значыцца, перажыць уласную радасць і шанцаванне і хвіліны роспачы ды адчаю. Вось так.

Тут некалі, гадоў, можа, шэсцьсот ці васемсот таму назад, была невялічкая вёска і жыў у ёй сярэдняй рукі памешчык. Не надта багаты, але і бедным не быў. Меў і грошы, і зямлю добрую ворную, і лугі з сенажацямі, і лясы першастваральныя з борцямі

шматлікімі ды звяр'ём незлічоным. Сялян меў тысяч пару паднявольных. Яны на яго гнуліся штодзень і прыносілі вялікі прыбытак гаспадару.

Пан гэты быў з надзвычай старадаўняга роду, можа, яшчэ ад якіх князёў свой радавод адлічваў. Таму і ганарыўся вельмі, абы з кім сяброўства не вёў, роўню сабе заўсёды шукаў, іначай і быць не магло. Дзе ж гэта бачылі, каб багаты пан ды з вясковым жыхаром, напрыклад, за адным сталом сядзелі і гарэлку пілі. Не было такога ніколі, не чулі ні мы, ні нашы продкі пра такія выпадкі.

Таго памешчыка і звалі па-панску — Цыпрыянам. На выгляд быў дужа мажны: высокі, тоўсты, а вусы ды бакенбарды, нібы ў чорта, увесь твар ахутвалі. Калі малое дзіця дзе бачыла пана, то верашчала з перапуду не сваім голасам:

— Мамачка, нячысцік! Ратуйце, нячысцік!

Тады атрымлівалі бізуноў бацькі за абразу свайго гаспадара. Не надта разбіраўся памешчык, хто там вінаваты, а хто не, але раз яго нячысцікам клікалі, то нехта не даглядзеў і павінен быў атрымаць сваю порцыю лупцоўкі. Нельга сказаць, што Цыпрыян надта ўжо да сялян чапляўся, каб паздзекавацца. Не, такога не было. Што суровы быў і жорсткі — гэта праўда, але без дай прычыны не караў. Толькі і не папускаў ні ў чым сваім паднявoленым.

Жонка ягоная памерла даўно, зусім маладой. Гаварылі, што пан надта яе кахаў, і калі яе не стала, то на людзі, можа, з год цэлы не паказваўся, ніхто нават голасу ягонага тады не чуў. Сядзеў у пакоі ды плакаў горкімі слязьмі, на маляваны партрэт сваёй жонкі гледзячы. Плакаў і нікога не саромеўся. А калі адышоў пасля гора, то яшчэ больш маўклівым зрабіўся і ўсмешка ніколі не з'яўлялася на ягоным твары. З дзяцей у яго была ўсяго адна дачка. Маленькай дзяўчынкай засталася яна пасля смерці матулі. Выхадзіла і выгадавала яе старэнькая нянька, якая жыла пры двары, можа, гадоў з пяцьдзесят. Ніхто не ведаў, калі яна з'явілася ў панскіх пакоях, але замяніла сіраце і маці, і сяброўак.

Звалі паненку Мар'яй. Так проста і звалі. Казалі, што і маці яе па-простаму звалі, бо паходзіла з не надта багатага роду. Затое прыгажосцю ўдалася жанчына — такую трэба было пашукаць не дзень, не два, а можа, год-другі, ды яшчэ ці знойдзеш.

Мар'я нікуды не хадзіла, сядзела ў пакоі ды сумна ў акенца паглядала, ці размаўляла са сваёй вечнай дарадчыцай — нянькай. Гуляць выходзіла ў стары панскі сад, які цягнуўся, можа, на цэлую вярсту, да самай рэчкі. Пойдзе туды Мар'я, сядзе на беразе і глядзіць, як вада круціцца, як рыбкі ў ёй плёскаюцца, высока выскокваюць і потым назад плёхаюцца. Так час і бавіла.

Дзень за днём непрыкметна цягнуўся, вясна летам змянялася, восень — зімой. У госці з бацькам да багатых суседзяў паненка ездзіць не любіла. Цыпрыян гэта ведаў і не прымушаў, не ішоў супраць жадання дачкі. Не хоча — хай сабе дома пабудзе, хай па садзе паходзіць, па наваколлі паблукае — гэта яе асабістая справа.

Аднаго разу бацька паехаў у прыгожым экіпажы да свайго сябрука ў карты гуляць, а Мар'я дома засталася, толькі папрасіла Цыпрыяна:

— Татка, доўга не будзь там, бо мне адной сумна. Ты ж заўсёды прыязджаеш ужо глыбокай ноччу. Раней вяртайся, добра?

— Добра, дачушка, сёння прыеду раней, бо і самому позна сядзець не надта падабаецца...

Пахадзіла дзяўчына па падвор'і, не знайшла чым заняцца і вырашыла падацца на сваё ўлюбёнае месца — да ракі. Прыйшла, села і прыціхла, пра нешта думаючы. Так і задрамала. Ачнулася ад таго, што нешта пасвіствала непадалёку ад яе. Прыўзняла галаву і ўбачыла дзецюка, які касіў траву амаль побач з ёю. Відаць, войт ці хто там яшчэ загадаў яму выкасіць траву ў гэтым канцы сада. Мар'я глянула і збіралася пайсці, але нешта затрымала яе на месцы. Прыгледзелася і заўважыла, што касец — дужы, высокі, чарнявы хлопец. Праца так захапіла яго, што не глядзеў па баках. Махаў і махаў касою, а ззаду за ім заставаліся высокія, роўныя шнурочкі радкоў. Аглянецца касец і далей працуе. Потым, калі стаміўся і вырашыў крыху адпачыць, то падаўся якраз у той бок, дзе сядзела Мар'я. Падышоў, пацягнуўся і гопнуўся ў духмяны радок, але потым нечакана падхапіўся, азірнуўся і знямеў ад нечаканасці: побач сядзела і ўсміхалася прыгожанькая паненка. Хлопец ад разгубленасці нічога сказаць не мог, толькі зноў усхапіўся і стаяў, нерашуча пераміналочыся з нагі на нагу.

— Чаго ты падскочыў? — запытала Мар'я.— Ад-

пачывай, стаміўся ж, мабыць, гэтулькі вымахаў і, што самае галоўнае, адзін. Сядай бліжэй, пагамонім, ці баішся мяне? — весела зірнула дзяўчына.

— Ды не...— пачаў было хлопец, але потым сеў непадалёку і больш не мог сказаць ні слова.

Мар'я звонка засмяялася і зноў запытала:

— Цябе як завуць, касец малады?

— Сымонам.

— А чый жа ты, Сымон?

— Ды бацькаў... матулін...

У адказ загучаў такі сакавіты смех, што дзяцюк таксама не ўтрымаўся і ўсміхнуўся.

— Бацькаў... матулін...— заходзілася дзяўчына,— я здагадваюся, што не ад дуба і бярозы ты пайшоў.

— Мой бацька конюхам служыць у вашага таты, і я дапамагаю на стайні, а сёння загадалі ісці касіць, то я і пайшоў. Касіць люблю з дзяцінства, таму столькі многа і выкошваю. А да вечара ўдвая болей зраблю.

— Ты мяне, Сымон, не палохайся.

— Ды я...— нясмела паспрабаваў было нешта мовіць хлопец, але зноў прыціх.

— З табою не надта паразмаўляеш.

— Я ад нараджэння не надта гаманіць люблю,— шчыра прызнаўся Сымон.

— Яно і бачна.

— Маўчаць ды слухаць болей люблю. Калі магчымасць такая ёсць, то іду ў лес ці на луг і там птушак слухаю, цішыню навакольную...

— І я таксама надта люблю хадзіць адна вось на гэтае месца і тут думаць. Добра, калі ніхто не перашкаджае, не крычыць побач, не тупае, не даказвае, наколькі ён разумнейшы...

— Ведама ж...

— А ты сёння цэлы дзень тут будзеш касіць?

— Так.

— А заўтра?

— Ды пакуль не выкашу ўсё, сюды хадзіць буду.

Нічога болей не сказала Мар'я, устала, ласкава зірнула на Сымона і пайшла да палаца. Хлопец пасядзеў-пасядзеў, уздыхнуў горка і зноў узяўся за цяжкую працу.

Як жа ён здзівіўся, калі на наступны дзень Мар'я прыйшла на ранейшае месца, ды яшчэ і сукенку прыгожую апранула. Касец вачэй не мог адарваць ад паненкі, а яна, нібы і не заўважала гэтага, весела

гаманіла пра нешта, распытвала, а пад канец сустрэчы прапанавала:

— Давай, Сымон, мы з табою заўтра ў лес сходзім. Я сама баюся, а з табою не страшна будзе. Гэтак хочацца пачуць спевы лясных птушак. Сходзім?

— А калі войт убачыць?

— Ён і слова не пікне, я яму хутка што-небудзь загадаю!

— Тады пойдзем. Абавязкова пойдзем. А...

— Зразумела, сустрэнемся тут, на гэтым самым месцы. Ну, то да заўтра.

— Да заўтра...

Зноў паненка пайшла дамоў, весела спяваючы нейкую песенку, а касец у прадчуванні заўтрашняй прагулянкі так узяўся за працу, што здавалася, быццам бы ён займаўся самым улюбёным рамяством.

Раніцай, калі раса яшчэ добра не абсохла і касіць было надзвый зручна, Сымон ужо махаў і махаў касою, а сам усё па баках углядаўся, ці не ідзе Мар'я. Дзяўчыны не было. Ужо спіна ў хлопца ўзмакрэла, рукі стаміліся, а яе не было. Спахмурнеў дзяцюк, падумаў, што насмяялася з яго хітрая паненка, пажартавала. Кінуў касу і пакрочыў да вербачкі, якая расла непадалёку, каб адпачыць і супакоіцца. Прылёг на траву, а сэрца шалёна тухкае, ледзьве з грудзей не вырываецца. Ажно нехта асцярожна голькай пачаў вадзіць па ягонай шырачэннай спіне. Спачатку касец падумаў, што яму гэта падалося, але калі адкінуўся назад, то ўбачыў... Мар'ю. Яна стаяла і смяялася.

— А я даўно ўжо тут. Проста блізка не падыходзіла. Назірала за тым, што ж ты, хлопча, рабіць далей будзеш. Ды ўбачыла, як у цябе рукі апусціліся, вырашыла выйсці з кустоўя, да таго ж і гнюс там даймае. Вось так, Сымон...

— Ды не апускаліся ў мяне рукі,— пачаў было апраўдвацца касец, але адчуў, як запалымнелі ягоныя шчокі, і заціх.

— Так я табе і паверыла,— гарэзліва прамовіла паненка,— пайшлі лепей у лес птушак слухаць. Толькі, Сымонка, вядзі мяне так, каб меней хто бачыў...

— Зразумеў,— адказаў хлопец. Яму вельмі спадабалася, што дзяўчына назвала яго Сымонкам.— Правяду так, што ніхто не заўважыць... Пайшлі.

З таго дня ўсё ў іх і пачалося па-сапраўднаму. Калі зайшлі ў дуброву і касец пачаў тлумачыць, дзе

якая птушачка спявае, дзе які звер крычыць, яна нібы ў іншы свет трапіла. Неяк і самі не заўважылі, як рукі іхнія спляліся і вусны дзяўчыны знайшлі вусны дзецюка. Цэлы дзень прабылі яны ў лесе. Назад вярталіся, калі змрок густы апускаўся на наваколле. Мар'ю ўжо шукалі, бо яна раней ніколі гэтак позна не прыходзіла. Дзяўчына сказала расхваляванаму бацьку, што зайшла надта далёка і пакуль вярталася, то і вечар прыспеў.

Ноч прайшла для маладых людзей, нібы адна хвіліна, а ўжо з раніцы шукалі яны прычыну, каб зноў апынуцца разам. Забіраліся ў лес, ці на луг і там мілаваліся. Ніхто ім не перашкаджаў, ніхто не даймаў. Можа, месяцаў пару ўсяго шчасце доўжылася, бо нешта западозрыў Цыпрыян ці данеслі яму верныя і паслухмяныя служкі. Паклікаў дачку да сябе і пачаў вымаўляць сурова:

— Нейкія плёткі да мяне, Мар'ечка, даходзяць брудныя! Глядзі, калі гэта так, то не пагляджу, што ты мая дачка, а спадніцу задзяру ды такую лупцоўку дам — дзесятаму закажаш! Глядзі ў мяне!

Успыхнула дзяўчына:

— Што я, маленькае дзіця? Што вы мяне запалохваеце лупцоўкай? Сэрцу ніхто не загадае! Тым болей, каго кахаць ці з кім сустракацца! А пра вас, тата, таксама людзі нічога добрага не гавораць, і ніхто вас за гэта не лупцуе!

Вылупіў бацька вочы, нібы яму ў твар варам лінулі, і зверашчаў:

— Я цябе папярэдзіў, а што рабіць — глядзі сама, каб потым не шкадавала!

— Не пашкадую! — адрэзала Мар'я і, адыходзячы, ляснула дзвярыма.

— Пашкадуеш! — гнеўна выгукнуў гаспадар палаца і выклікаў да сябе вымуштраванага ў гэткіх справах войта. Калі той прыйшоў, Цыпрыян, нахіліўшыся да свайго служкі, загаварыў:

— Ведаеш што?

— Не, пане.

— Гавораць людзі, ды ты чуў, не прыкідвайся, што мая Мар'ечка з Сымонам... з сынам конюха зблыталася і да яго на спатканні бегае. Чуў?..

— Чуць-то я, пане, чуў, але не надта веру, каб гэткая прыгожая і разумная панейка да простага мужыка на спатканні бегала. Можа проста плёткі рас-

пускаюць вашы нядобразычліўцы? Нешта не падабаецца ім, вось яны такім чынам і хочуць вам адпомсціць.

— Каб жа гэта так было...

— А чаму не?

— Усё роўна трэба праверыць.

— Трэба дык трэба, пане, прасачу.

— Будзь пільным і ўважлівым, бо яны хітра дзейнічаюць, хаваюцца пастаянна недзе...

— Ды ці ўпершыню мне, гаспадар, за ўсялякімі злачынцамі сачыць? Самі ж ведаеце, колькіх я вам выдаў і ў палац звязанымі прыцягнуў. Таму і гэтага, калі што, заламаю са сваімі людзьмі і сюды прывяду. Можаце спаць спакойна, ад мяне яшчэ ніхто не ўцякаў.

— Глядзі, калі ўсё добра зробіш — узнагароджу, а не — то не пагляджу на твае ранейшыя заслугі, такую бубну загадаю выбіць — гадам круціцца будзеш!

— Зраблю, пане.

З таго вечара войт страціў спакой. Стаў падобны на сабаку, які толькі і рабіў, што хадзіў ды пільна прыслухоўваўся і прынюхваўся. Гайдукоў шматлікіх у засады саджаў і чакаў, чакаў, але ўжо пару тыдняў прайшло, а ўсе намаганні былі марнымі, не трапляліся ў поле іхняга зроку закаханыя. Здаецца, і сачылі старанна, па слядах хадзілі, а ў самы адказны момант нібы скрозь зямлю правальваліся хлопец з паненкай.

Час ішоў, і надышла ноч на Івана Купалу. Усе вясковыя дзяўчаты і хлопцы пайшлі на бераг рэчкі ачышчальнае вогнішча наладжваць, вянкі пускаць ды папараць-кветку шукаць па лясах. Сымон з Мар'яй таксама дамовіліся спаткацца і сходзіць на свята. Але і войт не драмаў. Цяпер ён расставіў сваіх людзей па ўсіх тропках, кудою маладыя кіравалі да вогнішча. Запалала зыркае вогнішча, сталі скакаць праз яго хлопцы і дзяўчаты, песні заспявалі ўрачыстыя, старадаўнія. Мар'я з Сымонам таксама да іх далучыліся, весяліліся, як і ўсе навокал. Ды не адчувалі, што за імі пільна сочаць варожыя вочы, што гэта апошняя іхняя сумесна праведзеная ночка. Дагарэлі галавешкі, падаліся ўсе шукаць кветку папаратніку, каб, знайшоўшы яе, завалодаць незлічонымі скарбамі.

Паненка з касцом пакіравалі ў знаёмую ўжо ім дуброву. Следам падаліся панскія служкі на чале з войтам. Прыйшлі закаханыя пад магутны дуб, селі і давай, як і не раз раней, мілавацца. Ажно тут выскачылі панскія гайдукі з засады і, дзіка зароўшы, да іх кінуліся, каб звязаць і, як і было дамоўлена, у палац завалакчы. Ды не тут-то было. Сымон нічога, што адзін, але ж дужы быў, нібы мядзведзь. Крыкнуў каханцы:

— Уцякай, Мар'ечка! Уцякай! Я з імі сам пагаманю! Бо не будзе мне даравання ад твайго бацькі! Што за адзін грэх адказваць, што за два — адна рада!

— Не пабягу, любы! Не буду ўцякаць! Будзе караць, дык няхай абодвух карае! .

Крыкнула гэтак і стала за спінаю ў волата, а той ухапіў дубовы цурбалак і давай служак пярэсціць. Першым пад гарачую і магутную руку трапіўся сам войт. Ён нават і пікнуць не паспеў, як галава ягоная трэснула, што той пераспелы гарбуз. Доўга змагаўся асілак з нападаючымі, не аднаго жыцця пазбавіў, але злаўчыліся злыдні, накінулі ззаду на яго вяроўку і ўсе ацалелыя слугі разам наваліліся. Як ні круціўся Сымонка — на гэты раз вырвацца не здолеў. Калі да Мар'і кінуліся паслугачы, каб і ёй рукі назад завесці, яна закрычала адчайна:

— Назад, ваўкалакі! Хто вы такія, каб мяне рукамі нават кратаць! Я — дваранка! А вы?!

Пасля гэтага нападаючыя болей да яе не наблізаліся. Цягнулі збітага, змардаванага Сымона, а паненка ішла поруч з ім, хоць і прасіў ён дзяўчыну адысці, не рызыкаваць з-за яго, бо нічога ўжо не выправіць, зараз будзе лютаваць стары пан Цыпрыян. Ды не слухалася паненка свайго любага, падбягала да яго і выцірала насоўкаю кроў, якая цякла з разбітай галавы. Нарэшце іх прывялі ў панскі двор. Гаспадар ужо нервова хадзіў перад высокім мураваным ганкам. Убачыўшы закаханых, яшчэ здалёк, не дачакаўшыся, завішчаў:

— Што, дабегаліся? Дамілаваліся? Я ж цябе папярэджваў, дачушка! Гаварыў, што справа дрэнна скончыцца! Гаварыў?

— Гаварыў, толькі я яго кахаю! — горда прамовіла Мар'я.— Калі ёсць у свеце грахі, то мой грэх нікому не перадам і адмаўляцца ад яго не збіраюся!

Кахала і кахаю! Што б ні было мне за гэта — з майго сэрца Сымонку не вырвеце!

— Было б што, а такое дабро,— зняважліва хмыкнуў гаспадар,— мужыка-бедняка сабе знайшла і ганарышся! Што табе, панічоў мала было? Што табе, заможных і багатых генералаў ды афіцэраў неставала? З мужыком звалялася!

— Мая справа! І не табе мяне вучыць!

— Ну, то развітвайся са сваім каханкам, бо болей яго ўжо не ўбачыш,— пагрозліва прароў пан Цыпрыян.— Я яго ў салдаты аддам. Заўтра з раніцы і павязуць у далёкую дарогу. Няхай там на сваю галаву прыгоды шукае! Вось такі мой прысуд! Як бачыш — не бязлітасны, не б'ю, не караю, а аддаю ў салдаты!

Заплакала горка Мар'я ды кінулася на грудзі да свайго любага:

— Сымонка, родненькі, як жа я тут адна застануся! — загаласіла, нібы самая звычайная сялянка, забілася ў плачы, сашчапіўшчы рукі на магутнай шыі.

— Не плач, каханенькая, не трэба. Не вартыя яны тваіх слёзак. Жыві спакойна. Кахай іншага каго, бо мне ўжо, мабыць, сюды вярнуцца не давядзецца. Дваццаць пяць доўгіх гадоў — гэта ж не адзін дзень. Там разоў колькі на кулю ці на штык нарвацца можна, руку ці нагу страціць...

— Нікога я болей і блізка да сябе не падпушчу, Сымонка,— прастагнала дзяўчына і асунулася беспрытомная. Яе панеслі ў пакой і там ледзьве адкачалі, а Сымона пацягнулі ў вязніцу, каб раніцай везці ў вялікі горад, адкуль яго павінны былі адасласць у салдаты. Калі Мар'я апрытомнела, то не лягла спаць, а папрасіла сваю няньку дапамагчы ёй у адной справе. Усю ночку, да самага світанку, гарэлі ў пакоі свечкі. Жанчыны над нечым працавалі.

Раніцай загарлалі панскія слугі, завылі-закрычалі Сымонавы бацькі, і гайдукі ўжо збіраліся лупянуць бізуном па хуткіх конях, як на ганак выскачыла Мар'я. У руках яна трымала белую вышываную сарочку, якую за ноч сшыла са старой пакаёўкай.

— Гэта табе, любы, табе,— горача зашаптала дзяўчына,— сарочка гэтая будзе засцерагаць цябе ад смерці, бо яна замоўлена маімі малітвамі, напоена маімі горкімі слязьмі...

Пасля вымушанага расстання прайшло, можа, з паўгода, і па наваколлі папаўзла чутка, што Мар'я

цяжарная і чакае дзіця. Неяк надвячоркам да палаца прычыкільгаў стары салдат. Доўга сядзеў ён і чакаў, да каго б звярнуцца. Нарэшце выцікаваў Мар'іну пакаёўку. Паклікаў яе, і калі тая падышла, перадаў ёй нешта закручанае ў белую анучку, а сам, горка ўздыхнуўшы, пайшоў сваёй дарогай.

Калі Мар'я раскруціла тую анучку, то пазнала сарочку, якую ў апошні момант падаравала свайму каханаму. Яна была скрываўленая, з дзіркамі. Усё зразумела паненка і зайшлася ў ціхім, бязгучным плачы...

А раніцай, калі пан Цыпрыян прачнуўся, да яго прыбеглі спалоханыя слугі і далажылі:

— Гаспадар, гаспадар, паненка рукі на сябе наклала!

Нібы аглушаны, стаяў памешчык, не чакаў ён такога павароту справы. Цела беднай дзяўчыны вісела на старой бярозе, якая самотна расла насупраць палаца на высокім пагорку.

Пасля трагічнай падзеі яго назвалі Мар'іна Горка. Пазней, калі паселішча вялікім стала, так стаў называцца наш горад.

## РУДЗЕНСК

У нас тут людзі здаўна жылі. Што трэба для нармальнага жыцця? Каб збажына расла, каб зямля радзіла, каб вада ды лес побач былі, а ўсё астатняе рукі працаўнікоў прыносілі. Раз зямля родзіць, казалі сярод вяскоўцаў, то нішто не шкодзіць. Але акрамя таго, што расло на паверхні, многае было схавана і ў глыбіні, у нетрах. Менавіта пра такія сховішчы і як яны звязаны з назвай населенага пункта і пойдзе далей наша гаворка.

Раней па ўсёй нашай зямлі хадзілі падарожныя, ад вёскі да вёскі, ад хутара да хутара, песні святыя спявалі, запаміналі, што навокал адбывалася. Зойдуць, бывала, у вёску і многага не просяць, а кавалак хлеба які, вадзіцы халоднай напіцца ды пераначаваць каб пусцілі. Летам, вясною, у цёплую часіну восені часцей хадзілі, а ў маразы ці калі снягі ішлі, то сядзелі дзе-небудзь на месцы, выпрасіўшы ў спагадлівага гаспадара дазволу пажыць тыдзень-другі ў яго і без таго цеснай хаціне. Ад іх вяскоўцы даведваліся многа цікавага пра падзеі ў наваколлі ці яшчэ

дзе далей. А ўжо ўсялякіх казак-показак ды былічак ведалі многа.

Некаторыя з падарожных, найбольш умудроных жыццём, сустрэчамі з рознымі людзьмі, маглі і варажыць, і хворых лячыць. Да іх і звярталіся ў першую чаргу, калі нехта хварэў ці параніўся.

Здараліся выпадкі і ўвогуле рэдкасныя, калі падарожныя (старцы ці жабракі) надзялялі паасобных людзей здольнасцю бачыць патаемныя скарбы, або ўлівалі ў іх магутную фізічную сілу, ці падвучвалі, як пабароць або перамагчы лютага ворага-саперніка, які ўяўляў пагрозу для роднага краю.

Вось і ў нас такое цуда здарылася. Тут раней невялічкі хутар стаяў. Хат, можа, пяць ці шэсць. І вёсачкай яго нельга было назваць. Перабіваліся людзі з года ў год на вадзе і хлебе, бо нешта не шанцавала ім у гаспадарчых справах. Толькі збожжа пасеюць, зарунее яно дружнымі ўсходамі — маразы ўдараць і ўсё вымаразяць, жывёліну развядуць — ваўкі высмыкаюць статак ды пакінуць толькі тое, што ўжо ледзьве ад хваробы ногі цягае. Вось і паспрабуй пажыві, парадуйся, калі так з года ў год. Можа, і хацелі яны нешта перайначыць, але ніхто ім не даводзіў, як гэта зрабіць, а самі не ведалі.

Сяляне трывалі, трывалі, а потым усё часцей і часцей сталі да Бога звяртацца ў сваіх слёзных малітвах. Прасілі ў яго заступніцтва і неадкладнай дапамогі — баяліся, што вымруць з голаду, калі крыху болей прыцісне, зараз-то хоць нейкі запас заставаўся. Вясною ўвогуле на адной лебядзе ды крапіве сядзелі, летам-восенню недаядалі, каб на зіму сабраць штонебудзь. Але і малітвы не надта дапамагалі. Тады сабраліся яны неяк ля адной з хацін і пачалі меркаваць, як жыць далей. Ды нічога добрага ў галаву не лезла. Потым адзін з сялян і гаворыць:

— Ведаеце што, людцы, давайце мы з вамі царкву пабудуем! Маліцца-то мы молімся, але ж спецыяльнай будыніны для гэтага ў нас няма. Можа, менавіта з-за гэтага Бог на нас асаблівай увагі і не звяртае! Збяромся, бярвенні пад бокам, майстраваць мы ўмеем. За які тыдзень і царкву агораем. Не мураванку, а драўляную, няхай сабе не такую ўжо вялікую ды прасторную, але сапраўдную божую хаціну!

Задумаліся і астатнія. А што, добрую справу раіць чалавек, можа, і сапраўды дапаможа. Пастаялі яшчэ

крыху і пайшлі па хацінах, бо з раніцы трэба было зноў ісці працаваць. Царкву вырашылі пачаць будаваць праз пару тыдняў, калі ўсё ў полі паладкуюць.

Так і зрабілі. Спачатку збажыну ды гародніну дагледзелі, а там пачалі бярвенні з лесу вазіць. Секлі непадалёку, бо коні і так ледзьве ногі перастаўлялі, на іх нейкі паморак напаў у той год. Нарэшце навазілі таўшчэразных лясін і пачалі ўзводзіць зруб. Кожны з дарослых сялян недзе бачыў царкву, як яна выглядала, прыкладна ўяўляў, а вось каб дакладна пабудаваць — то не так і проста аказалася, як спачатку ім падалося. Папамучыліся, папакруцілі галовы, пакуль да даху дабраліся, а там ужо справа весялей пайшла. Там што — крыж зрабілі і прымацавалі.

Будыніну паставілі, дык другое ліха надарылася: трэба ж нейкага бацюшку знайсці, каб службу правіў, а дзе ж яго ўзяць? Сталі людзі думаць, неяк жа трэба выйсце знайсці. Але нічога ў галаву не ішло. Потым вырашылі, што пакуль без бацюшкі абыдуцца, але маліцца будуць заходзіць у саму царкву. Так і ўрачыстасці болей будзе, і нейкай святасці ці шанавання.

Але не надта і гэта дапамагала. Як было даўней — так засталося і зараз. Хіба што людзі яшчэ болей часу марнавалі на малітвы ў царкве. Стаялі на каленцах, адбівалі нізкія паклоны, услаўлялі Бога, звярталіся за дапамогай, а саматужныя абразы, намаляваныя на хуткую руку, толькі абыякава зеўралі са сцен.

Вясна ў той год удалася надзіва засушлівая. Збожжа і гародніну як пасадзілі, то толькі маленькі дожджык пакрапіў палеткі, і неба на гэтым нібы замкнула. Ні хмаркі якой, ні ветрыку, толькі бязлітаснае сонца паліць з раніцы да вечара. Пайшлі сяляне глянуць на свае нівы, і ажно страшна стала — чорная, парэпаная зямля, нідзе ніводнага зялёнага каліўца. Пустазелле і тое выгарэла, не тое што збажына ды гародніна. Зразумелі вяскоўцы, што ў гэтым годзе іх зноўку чакае яшчэ большае выпрабаванне, чым раней. Голад насоўваўся ўжо зараз, калі, здавалася, ён і не павінен быў палохаць. Ціха стала на вуліцы: ні смеху, ні радаснага воклічу. Местачкоўцы і гаварылі паміж сабою толькі шэптам, ды ўсё азіраліся. Нібыта нехта наслаў злы праклён на гэты куточак.

Зусім разгубіліся людзі, але ж трэба было нешта вырашаць, бо з голаду яшчэ да зімы можна памерці.

Зноў сабраліся разам, на гэты раз ля царквы. Пасталі, хістаюцца ад знямогі і недаядання, у вочы сваім дзецям баяцца глянуць, бо ведаюць, што ўбачаць там нямы дакор і пытанне: «Што б пад'есці?» Толькі нейкая кабета ціхенька і жаласліва прамовіла:

— Можа, людцы, пабраць нам з сабою дзяцей, ды пакуль стаіць цёплае надвор'е, пайсці пабірацца па іншых вёсках? Адзінае выйсце ў гэтым бачу. Штонебудзь добрыя душы пададуць нам, неяк бы прагаравалі і гэтую зіму.Ці ж то першы раз голад пераносіць. Пойдзем — то хоць нехта ды выратуецца.

Астатнія стаялі і маўчалі. Некаторыя пагаджаліся з жанчынай, іншыя ведалі, што калі дзеці разбрыдуцца па свеце, то назад вернуцца лічаныя адзінкі, астатнія ці памруць, ці застануцца там, дзе напаткаюць лепшае жыццё.

— А можа, давайце ўсе разам збяромся ды пяройдзем на якое іншае месца? — няўпэўнена азваўся нехта з сялян.— Зямлі ж то навокал вунь колькі пустуе, і ніхто яе не арэ, не апрацоўвае. Ніхто нас не папікне, што мы мала працавалі ці працуем, што не ўмеем гэта рабіць. Колькі крыві, поту ды слёз мы ў свае нівы пралілі і бачыце, да чаго дажыліся...

— А з чым ты, чалавеча, на новае месца пяройдзеш, калі ў нас і зярнятка няма ў запасе — усё выгарэла, сам жа бачыў? Нехта нас там чакае... Кожны сам круціцца, як толькі можа. Ісці, канешне, яно лепей было б, чым тут заставацца. Заўсёды, калі на нешта спадзяешся, то лягчэй жыць. Надзея памрэ — і чалавек не вытрымае. Але ж...

Зноў запанавала цішыня. Чуліся толькі прыглушаныя ўсхліпы жанчын, ды дзеці канючылі сваё: «Мамка, есці хачу... Мамка, няўжо ты не чуеш? Есці хачу...»

— Давайце, родныя, мы заўтрашняга дня дачакаемся. Раніцай тут збяромся і працягнем размову. Можа, некаму за ноч нешта добрае прымроіцца, то і да канкрэтнай высновы прыйдзем. А зараз пайшлі адпачываць...

Паволі пацягнуліся па вулцы вяскоўцы, уздымаючы за сабою слупы густога пылу. За ім ніхто і не заўважыў, як прыйшлі тры жабракі-падарожныя. Магчыма, іх заўважылі, але не звярнулі ўвагі, бо не было чаго даць здарожаным, галодным людзям, самі нічога не мелі. А старыя, усе белыя, нібы галубы, прыйшлі да царквы і селі ля ганку.

— Што гэта з людзьмі такое робіцца? Упершыню такое бачу. Колькі па зямлі пахадзіў, а такога не бачыў. Счарнелыя нейкія, пахмурныя і, што самае галоўнае, нават увагі на нас не звярнулі...

— Можа, не заўважылі, таму і не звярнулі,— азваўся другі падарожны,— мала што ў людзей можа быць... Нейкая справа неадкладная, а тут мы на дарозе, то і прайшлі.

— Сапраўды,— падаў свой голас трэці,— нешта ў іх здарылася незвычайнае. Твары пахмурныя, ніхто вачэй ад зямлі не ўзняў нават...

— Вачэй-то вачэй, але ніхто нават не азваўся, не засмяяўся. Так проста ў такой маркоце вяскоўцы хадзіць не будуць, трэба распытаць. Можа, і дапаможам чым.

— Дапамагчы мы не супраць, толькі каб здолелі выручыць, а падтрымаць вяскоўцаў, параіць ім не цяжка.

Пакіравалі да бліжэйшай хаціны падарожныя. Зайшлі на падворак, ажно бачаць — сядзіць на прызбе стары, прыкладна гэткі ж, як і яны, дзядулька і гаротна галавою хістае. Сталі насупраць яго, а ён іх і не заўважае. Тады адзін з падарожных асцярожна, каб не напалохаць гаспадара, азваўся:

— Дзень добры, пане-гаспадару...

Той устрапянуўся ад нечаканасці і ўтаропіўся ў прыйшоўшых сваімі выцвілымі вачыма. Колькі хвілін так маўчаў, адно толькі — глядзеў перад сабою, а потым ціха прамовіў:

— Дзень-то, можа, і добры, але толькі не для мяне.

— А што ж такое здарылася, шаноўны, што дзень для вас дрэнным стаў? Можа гора нейкае вас напаткала? То лепей раскажыце, на душы лягчэй будзе...

— Што мне мая душа? Што мне яна? Я ўжо сваё пражыў. Нават праўнукаў дачакаўся. Вось як ім, гаротным, зараз будзе?

— Дык што здарылася, чалавеча?

— Хіба ж вы не ведаеце? Хіба ж не чулі, у чым наша гора-бяда? Тут жа па ўсім наваколлі пра гэта толькі і гамоняць. Не можа быць, каб не чулі.

— Не, праўду шчырую кажам,— не чулі нічога, і ніхто нам не даведаў, што ў вас тут здарылася,— здзіўлена прамовіў у адказ адзін з падарожных і прысеў побач з гаспадаром.

— Ды вы сядайце, людцы, мабыць, таксама намялі ногі добра, прытаміліся. Прабачце, што адразу не запрасіў сесці. Не да гэтага мне зараз. Не да гэтага...

— То мы слухаем, пане-гаспадару, што ты нам распавядзеш,— нібы не звяртаючы ўвагі на малазразумелыя дзедавы словы, сказаў другі падарожны,— можа, мы і дапаможам чым. Свет вялікі, цудаў усялякіх мноства бывае...

— Цуды-то бываюць, але нешта ў нас пра іх ніхто нічога не згадваў. Ды раз просіце, то раскажу пра ўсё па парадку. Вы па зямлі ходзіце, іншым паведаміце.

Доўга сядзелі падарожныя з гаспадаром, уважліва выслухалі ўсё тое, што ім расказаў селянін. Нарэшце, змахнуўшы няпрошаную слязінку, вясковец заціх. Маўчалі і старцы. Нічога не спяшаліся сказаць, бо справа была надзвычай цяжкай і адказнай. Пераглянуліся паміж сабою ды толькі ўздыхнулі. Гаспадар пабыў з імі і пачаў збірацца ісці спаць. Але потым схамянуўся і звярнуўся да падарожных:

— Вы прабачце мяне, шаноўныя, есці нічога не маю, таму і вам прапанаваць не магу, а пераспаць — калі ласка, хочаце ў хаціне, хочаце — у гумне. Месца хопіць.

— Дзякуй, пане-гаспадару, і на добрым слове. А есці ў нас пару кавалачкаў хлеба з сабою ёсць, можам аддаць іх тваім унукам. Вазьмі, не крыўдуй.

Працягнулі ачарсцвелы хлеб старому. Той задрыжэў, але ўзяў. Пацягліся спаць, баючыся загаварыць, каб ненарокам зноў не ўзрушыць душу гаспадара. У гэты момант адзін падарожны зачапіўся за нейкую грудку і балюча ўдарыў нагу:

— Ой, што ж гэта такое? Нібы камень які! Так лупянуў — ажно пальцы закрываваліся! На грудку зямлі падобна!

— Ды не, чалавеча, гэта не грудка зямлі, гэта я і растлумачыць не магу, што такое. У нас па ўсіх нівах сустракаюцца такія глыбы. Ляжаць, разбіць іх нельга, раструшчыць таксама. Араць ці скародзіць перашкаджаюць, дык мы, калі можам, выносім іх на ўзмежкі. Гэты я са свайго агарода некалі прывалок. Можа, гадоў дваццаць назад. Так з тае пары і ляжыць...

— Дайце я гляну,— нахіліўся над грудкай другі

падарожны,— недзе я такія дзіўныя камяні бачыў...

Ён доўга калупаў незнаёмы прадмет пальцам, потым ухапіў кіёчак, але грудка не паддавалася. Астатнія здзіўлена назіралі за тым, чым займаўся ўмудроны жыццёвым вопытам чалавек. А ён асцярожна паклаў камень на ранейшае месца і прамовіў:

— Дык і збожжа ў вас не родзіць, і гароднiна апошнім часам не надта расце?

— Так, шаноўны,— ледзьве чутна выдавіў з сябе гаспадар,— нібы закляў нас нехта. І з кожным годам усё горай і горай...

— Цяпер, пане-гаспадару, такога болей не будзе, не перажывай. Можаш класціся спаць спакойна, а заўтра я ўсім вам выйсце падкажу. Дакладна падкажу.

— Што ты, чалавеча? — ажно ўзвіўся вясковец.— Няўжо гэта праўда?

— Праўда, праўда...

Сонца яшчэ толькі-толькі пазалаціла верхавіны высачэзных бяроз, а ўжо ўсе местачкоўцы сядзелі ля царквы і чакалі падарожных. Стары селянін, мабыць, не спаў ноччу, а бегаў па хатах і папярэджваў пра тое, што раніцай усё пераменіцца.

Падышлі падарожныя, павіталіся з людзьмі. Тыя адказалі. Той са старцаў, які вечарам старанна даследаваў грудку, выступіў крыху наперад і пачаў гаварыць, бо бачыў, што сяляне ледзьве стрымліваюцца, каб не пачаць распытваць.

— Выйсце я вам падкажу вельмі простае. Справа ў тым, што тыя камяні, якія вы пастаянна выкідалі са сваіх палёў,— не камяні, і не грудкі, гэта...

— А што ж то?..

— Гэта руда, з якой можна плавіць метал, а метал можна прадаваць іншым і выменьваць на яго што толькі вам захочацца... Не баўце час, а будуйце рудніцы, я вам пакажу, як гэта робіцца. Некалі ў дзяцінстве з бацькам займаўся...

Дык першую рудніцу ўзвялі там, дзе сёння і знаходзіцца Рудзенск. Адтуль і назва пайшла.

## ДРЫЧЫН

Жыў у нас пан, а прозвішча ягонае было на польскі манер — Янушчынскі. Памешчык быў надта ганарлівы і прыгожы. Багацця — так сабе, не многа, але

і не мала, бо меў шмат зямлі, лесу, сенажацяў. Грошай не хапала пану заўсёды, бо штодзень у карты гуляў і, у большасці выпадкаў, прайграваў. Адзін раз прайграе, дык не каб прысесці, супакоіцца, пачынаў гарачыцца, крычаць, што зараз прайгранае назад верне. Як сядзе, то не толькі з кішэняў грошы павыкідае, але і распісак стос напіша, на будучае, значыцца. Дамоў прыедзе ці гасцей выправадзіць, калі ў сваім палацы гуляў, ды спаць заваліцца. Праспіць да самага надвячорка, а тады ўжо кліча да сябе войта:

— Вось, голубе, бяда тут здарылася са мною. Абакралі. Да нітачкі абчысцілі. Па дарозе перастрэлі разбойнікі, мабыць. Не пазнаў, хто такія, і паадбіралі. Каб іх меней было, то зведалі б, хто такі пан Янушчынскі, а так накінуліся ўсе адразу, дзе тут адаб'ешся...

— Дык вы ж, пане, гэтую ноч нікуды не ездзілі. Вы ж дома з гасцямі ў карты ўсю ночку гулялі,— меў неасцярожнасць заўважыць войт і ў той жа момант атрымаў поўху.

— Дык, можа, я па-твойму яшчэ і хлушу? Можа ты ў гэтым, мужыцкае пуза, мяне падазраеш і не верыш таму, што я гавару?

— Веру, веру, пане,— як мага хутчэй адказваў войт, бо добра ведаў характар гаспадара. Калі не паспяшаешся, то атрымаеш яшчэ ў каршэнь.

— Значыцца, я і гавару: напалі на мяне разбойнікі і ўсё забралі, ні капейкі, злыдні, не пакінулі. Дзе мне зараз грошай узяць? Вечарам збіраўся паехаць да пана Дрычынскага ў госці і там партый колькі перакінуць...

Войт усё добра разумеў, бо не ўпершыню даводзілася чуць такія словы ад свайго валадара.

— Але ж, пане, мы ўжо пазбіралі з сялян усё, што яны нам былі вінны,— асцярожненька вымаўляў верны служка і пільна сачыў за кожным рухам памешчыка, каб той ненарокам рэзка не крутнуўся ды зноў не загрэў у вуха.— Дзе ж яны тых грошай набяруцца? Каб жа самі малявалі, то, можа, на ўсіх хапіла б...

— Каб можна было самому маляваць, то гэтай справай і я займаўся б, і гора ніякага не ведаў бы... Трэба грошы — раз і гатова,— размарыўся пан, але тут жа ўсхапіўся: — Ты, войт, зноў нешта не тое кажаш. Глядзі ў мяне. Бачыш, да вечара зусім мала

часу засталося. Каб праз гадзіну грошай хоць руб-лёў з сотню было на стале ў маім пакоі! Не хочаш бізуноў — то прыдумай што-небудзь! Бягом, выконвай!

Войт вылецеў з пакоя, нібы кіпнем ашпараны, але на ганку спыніўся. Прысеў і давай разважаць, дзе на гэты раз яму грошай узяць, каб памешчыку дагадзіць. Пачаў перабіраць усіх мясцовых багацеяў, якіх можна было за нешта прыцiснуць і знайсці патрэбную суму. Сядзіць ды бармоча:

— У гэтага браў. У гэтага браў. Да гэтага ў мінулы раз заходзіў. У мельніка таксама пасвіўся. У карчмара быў.

Нарэшце радасна пляснуў рукамі і падскочыў:

— А ў Хаіма-карчмара якраз-такі і не быў. Не, не быў, дакладна памятаю. Вось і знайшоў месца, дзе грошы ёсць. Зараз пайду і пад зручнай прычынай выдуру, а потым хай з панам разбіраецца. Не пойдзе ж Хаім да памешчыка грошы спаганяць. А хай сабе і сходзіць...

Панскі служка панёсся па вуліцы ў канец вёскі, дзе стаяла карчма, якую ўжо гадоў колькі запар трымаў Хаім. Адкуль ён тут з'явіўся, ніхто мо і не ведаў, але тое, што капейка ў яго не пераводзілася, ведалі ва ўсім наваколлі. Падышоўшы бліжэй, войт пачуў, як нехта гарлаў дзікім голасам песню.

Ой, за гарэлку
Прапіў лейцы!
Ой, за гарэлку
Прапіў каня!..

Зазірнуўшы ў сярэдзіну, войт ажно злякаўся, гэтулькі там людзей было. Знайшоў Хаіма, паклікаў яго і хуценька ламануў у двор, каб меней хто яго тут бачыў, бо падпітыя мужыкі маглі адплаціць яму за ўсё благое, што ён учыніў ім за сваё жыццё.

— Слухай, Хаім, тут справа такая, вельмі важная.

— Якая, пане войце? — згорбіўся яўрэй.

— Мяне сам пан да цябе паслаў.

— Сам пан?

— Так, ён наказаў, каб ты яму пазычыў роўна сто рублёў. Маўляў, збегай да Хаіма, бо болей мяне ніхто і не выручыць.

Карчмар зразумеў адразу, што ад яго патрабуюць, і наперад ведаў, што грошы гэтыя прыйдзецца не па-

зычыць, а аддаць проста за так, таму паспрабаваў было неяк выкруціцца:

— Ды адкуль у мяне, беднага яўрэя, такія вялікія грошы? Ды ў мяне іх увогуле няма. Так проста, напавер мужыкам даю гарэлку...

— Ну што ж,— выдыхнуў войт,— значыцца, я так памешчыку і перадам, што ты адмовіўся пазычыць яму грошы. Глядзі, каб потым не пашкадаваў, ды позна ўжо будзе.

Пасланец пана павярнуўся і ўжо збіраўся ісці, як яго за плячук схапіла Хаімава рука:

— Што ты, што ты, пане войце? Я не адмаўляю нашаму пану ў пазыцы. Я проста кажу, што і ў мяне грошай малавата. Калі ўжо надта трэба, то магу выручыць. Але ж гэта мае апошнія. Пачакайце тут колькі хвілін, пане войт, я зараз абярнуся.

І згорблены яўрэй нехаця пасунуўся ў карчму.

Пан Янушчынскі сядзеў у крэсле на ганку і чакаў свайго войта. Час ішоў, а вернага слугі не было. Грошай таксама. Убачыўшы вясёлага войта, памешчык адразу ўзняўся:

— Ну што, лупцоўку табе загадаць усыпаць ці грошы прынёс?

— Ды расстараўся трохі, пане, толькі ў наступны раз мне ўжо не будзе ў каго пазычаць. Я ад вашага імя дзейнічаю.

— Ад свайго ці ад майго — розніца невялікая, галоўнае — што грошы даюць, астатняе потым прыдасца.

Янушчынскі сеў у экіпаж і загарлаў на фурмана:

— Паганяй коней! Чаго рот разявіў ды варон лічыш?!

Фурман хацеў было сказаць нешта ў апраўданне, але атрымаў у спіну магутнага кухталя і зароў немым голасам:

— А, каб вас чэрці пабралі, адроддзе панскае!!!

Войт знерухомеў, баючыся, што памешчык пачуе, але пану было не да гэтага. Ён у марах ужо даўно сядзеў за картачным сталом побач з памешчыкам Дрычынскім.

Раніцай злосны Янушчынскі крычаў на ўсё наваколле:

— За пана свайго ўступіцца не можаце? Яго рабуюць, а вы радуецеся?! Глядзіце ў мяне, каб плакаць не давялося!

Бедалага-войт трымаўся за галаву і стагнаў у роспачы:

— Зноў сёння пачнецца... Дзе ж я цяпер даставаць грошы буду?

Пад вечар, як і было заведзена, Янушчынскі зноў клікаў войта:

— Бягом да мяне! Куды ты там схаваўся!

Выслухаў паслугач, як пана зноў абакралі, як яго не шкадуе ніхто, і што трэба сто рублёў, бо вечарам прыедзе пан Дрычынскі ў карты гуляць. Колькі ні крычаў, колькі ні палохаў — войт стаяў на сваім:

— Няма грошай, пане, няма і годзе!

Адлупцавалі тады яго так, як ніводнага мужыка раней у маёнтку не білі, і кінулі пад плотам. А памешчык сам стаў думаць ды гадаць, як з незайздроснага становішча выкруціцца. Хадзіў, хадзіў, люта па баках зіркаючы, і раптам супыніўся як укапаны:

— Прыдумаў! Прыдумаў! Цяпер мне ніхто не страшны! Цяпер я ведаю, як ад даўгоў пазбавіцца!

Госць на двор, а ён за стол саджае і ўмову адразу ж сваю ставіць:

— На гэты раз, шаноўны, будзем гуляць не на грошы, як раней, а на зямлю. Разумееш? На пэўную колькасць зямлі...

Дрычынскаму даўно падабалася надта адна мясціна, ён і сказаў у адказ:

— Мне ўсё роўна, калі пан-гаспадар так жадае. Мне там спадабаўся лужок і ля яго мясцінка, то мо на яе і згуляем?

— На яе дык на яе...

І пачалі рэзацца. Праўда, прайграваў і пан Дрычынскі, але гаспадар уступіў значна болей. І той кавалачак прынадны перайшоў да новага памешчыка. З цягам часу ён паставіў там сваю вёску і людзі ў ёй сталі жыць, а ад ягонага прозвішча — Дрычынскі — назва пайшла — Дрычын.

## ПЕСТУНЬ

У далёкім мінулым, аб якім ужо і дзяды не памятаюць, будучая Пестунь быццам бы была лясным, усяго ў два двары, засценкам. Ворнай зямлі тамтэйшыя гаспадары амаль не мелі, затое ў няхуткай своавольніцы з пясчанымі плёсамі Свіслачы было ба-

гата рыбы, а ў векавым бары — усялякага звяр'я. Лепшага месца для палявання і прыдумаць нельга. Як некалі людзі казалі, яго для такога занятку спецыяльна Усявышні ўтварыў, калі Сусвет ствараў. Густыя, непралазныя хмызнякі, высокія, у два роста чалавека чароты — усё гэта і служыла надзейнай схованкай для птушак ды звяроў. Тут яны сабе спакойна і жылі, пакуль да іх не наведваліся людзі са стрэльбамі, і тады ўжо грымелі стрэлы, валіліся на дол лясныя асілкі і прыгажуны, валадары нябёсаў, а тыя, што мелі сілы ў скрыдлах, сягалі далей ад гэтага месца.

Сюды, у гэтыя цудоўныя мясціны, і наязджалі розныя паны з падпанкамі ды шматлікімі світамі, каб добра, на прыродзе, адпачыць і пазабаўляцца. Мясцовым жыхарам ад іх асаблівага ліха не было. А што сабе думаеце? Прыедуць памешчыкі, то яны ж біцца не кідаюцца, а найперш выпіць ды смачна паесці садзяцца, а потым на паляванне ці на рыбалку джгаюць. А калі яшчэ што і ўпалююць ці зловяць, то радасці іхняй канца-краю не бачна. Гатовы самымі каштоўнымі падарункамі частаваць спагадлівых вяскоўцаў, якія паспявалі і вогнішча зацепліць, і вадзіцы чысцюткай, крынічнай прынесці, і паказаць, дзе найлепей клюе, ці дзе сцежкі свежыя дзічыныя або ласіныя пракладзены.

Аднаго разу сабралося паноў вялікае мноства. Распачалі такую багатую вячэру, што ледзьве да раніцы ўправіліся. Прачнуліся ўжо пасля апоўдня. Ведама ж, з перапою галовы баляць, усё цела круціць, апахмяліцца хочацца. Яны зноў вогнішчы загадалі параспальваць ды давай «лячыцца». Панабіраліся, што тыя дзікі, мёрзлай бульбы і... на паляванне сабраліся. Слугі моляцца-просяцца, каб не ішлі, бо і да гора недалёка, яшчэ адзін аднаго пастраляюць ці дзе паблудзяць у начным лесе. Хіба ж за ўсімі ўсочыш. Ды паны на тое і паны, каб нікога не слухаць. Як сказалі, так і зрабілі, ды яшчэ з такім гонарам! Па паляўнічых нумарах і засадах іх ужо не разводзілі, такое здзейсніць было немагчыма, а развозілі на экіпажах. Пад'едуць да палянкі, выцягнуць якога пана, пакінуць слуг колькі ля яго і далей кіруюць. Не паслухацца нельга. Раз загадана — выконвай, інакш спінаю заплаціш. Кожнаму са слуг загадалі:

— Глядзі ж, ноч не спі, вачэй не змыкай, каб памешчык нідзе не згубіўся!

— Дык як жа я яго ўпільную, калі ён п'яны і на коленцах ад мяне ўцякае?

— Прыдумай што-небудзь, распавядай, можа, яму цікавую гісторыю...

— Ага, гісторый яму толькі зараз і не хапае, паглядзіце, якія бурбалкі ротам пускае,— што з меха якога прэ.

— Прыдумай што-небудзь, табе ж лягчэй будзе.

— Прыдумаць... Хіба што прывязаць да якой сасны, то, можа, стаміўся б, торгаючыся, ды заснуў бы?..

— Як хочаш, але глядзі, не згубі...

Некаторыя са слуг папарна пазвязвалі сваіх памешчыкаў і тыя, блукаючы, зачапіўшыся за які-небудзь корч ці ствол, падалі і засыналі мярцвяцкім сном. Заставалася толькі побач раскласці вогнішча ды адганяць камароў і надзвычай цікаўных звяроў, якія выходзілі да саміх «паляўнічых».

Потым, пад раніцу, усе зноўку сабраліся ў адно месца, і тут ужо пачалося! Кожны з паноў распавядаў сябрам такія жудасныя і неверагодныя гісторыі, што, відаць, і сам у іх да канца не верыў. Чаго тут толькі не было і каго толькі не згадвалі! Хіба што сланоў, бо яны ў тутэйшых лясах не вадзіліся. Астатні жывёльны свет прысутнічаў, прычым у такой колькасці, што калі б іх сабраць разам, то на кожнае дрэва, на кожны кусцік у пушчы прыходзілася б звяроў па тысячы. І пераважна гэта былі буйныя асобіны: зубры, туры, ласі, дзікі, у крайнім выпадку. А як пачынаў каторы пан гаварыць, то вочы прыжмурваў і хлусіў, хлусіў... Астатнія толькі вохкалі ды здзіўляліся, як гэта ён здолеў выратавацца ды раніцай да іх цэлым і непашкоджаным дабрацца.

Але гэта быў па-майстэрску разыграны спектакль, дзе кожны з памешчыкаў іграў сваю ролю. Усе загадзя ведалі, што тут хлусяць, што праўды не будзе і драбніцы, ды ведалі ж і тое, што праз хвіліну-другую самому прыйдзецца распавядаць пра такі ж самы «подзвіг», хлусіць, можа, яшчэ ў большай ступені. Тут ужо спрачаліся не ў трапнасці стрэлаў, а ва ўменні як мага болей навыдумляць. Векавая пушча і тая прысаромлена заціхала, пачуўшы, напрыклад, як пан-паляўнічы адзіным стрэлам забіў дзесяць самых здаравенных ваўкоў і яшчэ двух мядзведзяў вялізных

параніў, але тыя, пакуль ён ваўкамі займаўся, паспелі задаць лататы, пакінуўшы толькі лужы крыві.

Некаторым панам не спадабалася такое геройства свайго паплечніка, бо калі паверыць у такую колькасць звяроў, забітых адным стрэлам, то якую ж лічбу давядзецца ім самім называць, і ці павераць у гэта астатнія... Таму яны і спрабавалі асцярожненька пратэставаць:

— Можа шаноўны пан не забіў, а толькі параніў ваўкоў? Бо надта неверагодна такое чуць, каб дзесяць здаравенных ваўкоў адзіным стрэлам забіць. Можа нешта не так было, можа пан крыху перайначыў? — і гэтак умільна глядзелі ў вочы апавядальніку, што таму станавілася ніякавата і ён па-свойму, але з гонарам выходзіў з цяжкага становішча:

— Можа, панове, усё можа быць. Вы, можа, і не надта верыце, дык клянуся панам Езусам! Няхай ён будзе сведкаю майму трапнаму стрэлу! Калі і пасля гэтага не паверыце, то і не ведаю ўжо, як вам давесці... Але скажыце, я вас заінтрыгаваў?

— Гэта сапраўды так, шаноўны! Сапраўды. Нікому не даводзілася такога ні бачыць, ні чуць, ні здзяйсняць,— пачуліся ў адказ шматлікія галасы.— Такое цікавае і самабытнае апавяданне, што ажно валасы дыбарам становяцца...

— Дык вось, панове, як усё адбылося. Паслухайце ўважліва, бо болей пераказваць і адказваць на вашыя пытанні не буду. Сядзім гэта мы ў засадзе з панам Ялінскім... Праўда, пан Ялінскі?

— Сядзім,— пачулася ў адказ.

— Сядзім гэта мы, значыцца, а ноч, халера на яе, надта ясная была ды халаднаватая. Хіба ж вы не адчулі, шаноўныя?

— О так, так, пане...

— Ажно чую я — воўк завыў, і гэтак галасна, гэтак страшна, што мурашкі па спіне забегалі. Праўда, пане Ялінскі?

— Ага, толькі хіба ж ваўкі летам выюць?..

Ды апавядальнік і не збіраўся звяртаць увагу на такія дробязі: — Я прылаўчыўся, стрэльбу зручней узяў і пільна гляджу ў той бок, адкуль выццё пачулася... І што ж вы думаеце? Вылазіць такая пачвара страшэнная, што я і глядзець болей баяўся, нацэліўся ды як лупянуў — толькі поўсць паляцела. Праўда, пане Ялінскі?

Пан Ялінскі соладка пахрапваў і ніяк не адрэагаваў на запытанне.

— Выбег тады я са слугамі да ваўка, а гэта ж, мае родненькія, ваўчыца. Калі пачалі яе лупіць, то ў чэраве яшчэ дзевяць малых ваўчанят сядзела... Ну, як я вас?..

У адказ навакольны лес страсянуўся ад выбуху смеху. Доўга яшчэ калыхаліся кашлатыя яловыя лапкі ў такт гігіканню памешчыкаў.

— Ой, ой, трымайце мяне!

— Ой, дайце вады, бо памру!

— Ну і загнуў яснавяльможны пан!

Апавядальнік зразумеў, што трэба зноў ратавацца, і спакойна, дачакаўшыся цішыні, дадаў:

— То ж гэта не сёння было, а мінулым летам...

Але паляўнічыя не слухалі. Тады ён крутнуўся, убачыў абодвух гаспадароў з вёсачкі і кінуўся да іх:

— Скажыце, мае родненькія, скажыце, мае ласкавыя, скажыце... Праўда ж гэта было?..

— Ага, панове, праўда,— згодна západ... заківалі перапалоханыя сяляне,— праўда...

— Ай вы ж, мае пястунчыкі! Ай вы ж, мае шаноўныя! — загаманіў пан і працягнуў ім па некалькі залатовак. І памешчык застаўся задаволены, і вяскоўцы таксама. Адтуль і назва пайшла, ад тых самых пястунчыкаў, так Пеструнь і засталося...

## СВІСЛАЧ

Там, дзе гэта адбывалася, то, можа, ужо і знаку не засталося. Усё перамянілася за доўгія стагоддзі. Рака цячэ — ваду перакочвае, а час бяжыць — лёсы перамолвае, нібы млынар бязлітасны. Ні дрэвы, ні камяні шэрыя ды маўклівыя да нашых дзён не дажылі. Дрэвы самі зваліліся і згнілі, а камяням людзі дапамаглі закончыць свой працяглы век: паразбівалі, пакрышылі на драбнейшыя часцінкі і пазакладалі ў падмуркі.

Вось недзе ў той час і жыў тут дзіўны каваль. Ніхто не памятае і не ведае пэўна, як яго звалі, але слава пра ягоную сілу і прыгажосць вырабаў засталася. Клікалі яго вяскоўцы паміж сабою па мянушцы, якая прыклеілася да майстра яшчэ з хлапечых гадоў. А было гэта так. Нейк бацька папрасіў сына дапа-

магчы тэрмінова зрабіць нейкую рэч, заказаную багатым праезджым гандляром. Той паабяцаў дужа многа грошай заплаціць за неадкладнасць, бо надта спяшаўся некуды. Вось бацька і звярнуўся да сына:

— Дапамажы, будзь ласкавы, а то самому цяжкавата будзе, і падмайстар мой стоміцца. Патрымаеш колькі часу прылады, молатам пару разоў стукнеш, і ўся праца. Добра, сынок?

Але сын не надта ахвочы тады да працы быў, пацягваючыся, прамовіў:

— Мяне ўжо маці папрасіла нешта там на градах зрабіць. Пайду туды. Ей жа таксама нехта павінен дапамагчы. Там хапае працы,— сказаў і прыпусціў да агарода, каб хутчэй адчапіцца.

Доўга гнуліся і грукалі молатамі майстры, а калі выйшлі на вуліцу, то ўбачылі, што ўжо надвячорак бярэцца. Прыселі, стомленыя, але задаволеныя, што ўправіліся і грошай даволі многа зарабілі. І тут падмайстар ціхенька прамовіў:

— Глядзі, гаспадар, глядзі, што там робіцца. Гэта ж трэба...

— Што? — не зразумеў адразу каваль.— Дзе?

— Ды не туды глядзіш, не туды. Вунь, пад вярбою...

Зірнуў каваль і ажно знерухомеў ад злосці. Там сын... ляжаў на траўцы пад разгалістай вярбою і нішто на белым свеце яго не хвалявала.

Усхапіўся майстар, нібы і не стомлены быў, на ногі. Вочы шукалі які-небудзь цурбалак, каб гопнуць па лайдаку. Нарэшце наваколле страсянуў магутны крык:

— Дык гэта ты так грады палоць дапамагаеш?! Гэта ты так гарбацішся, не разгінаючыся?! Каб спіна твая, лайдача, і сапраўды не разгіналася пасля гэтага!

Сын падхапіўся і паляцеў, куды вочы глядзелі. Накірунак асабліва не выбіраў, бо кожная дарэмна страчаная хвіліна магла моцна адбіцца на спіне. Падлетак бег, а ззаду яго падганяў бацькоўскі крык:

— Каб жа табе месца спакойнага з гэтага дня не было, лайдак ты гэтакі! Каб табе ногі пакрывіла, калі ты так шпарка бегаеш, што толькі пяткі мільгацяць! Каб табе...— папярхнуўся на слове каваль ці то ад бегу, ці то ад гневу і неяк невыразна працягваў:

— Бач ты на яго! Знайшоўся... Свістач няшчас-

ны. Ды ў нашым родзе да цябе гультаёў не было і не будзе! Праклён накладу і з хаты прэч выпру. Я табе пакажу. Свістач ты пустагаловы! Гэта ж трэба... Мы з апошніх сіл выбіваемся, каб капейкай разжыцца, а ён ляжыць ды пасвіствае сабе, як ні ў чым не бывала... Свістач, пустадомак!

Расхваляванага майстра крануў за плячук ягоны падмайстар:

— Пайшлі, гаспадар, адпачні, супакойся. Хлопец малады, у яго ў галаве яшчэ дзіцячыя думкі, а не клопаты пра тое, як будыніну якую ўзвесці ці прыладу найлепш вырабіць. Каб дзе паляжаць ды за дзяўчатамі пабегаць — хіба ж у самога такога не было?..

— Было,— крыху супакоіўшыся, адказаў каваль,— было... Але ж я ніколі нават не прысеў, калі іншыя побач працавалі. А то... Свістач мне знайшоўся... Я яму зраблю! З гэтага дня ён ад мяне і на крок не адступіць. Цяпер я яму ні ў чым не саступлю і нідзе не спушчу нават драбніцу. Свістач...

— Ды чаго ўжо там, адпачні лепей,— зноў крануў за плячук падмайстар,— пройдзе ўсё паціху...

Узрушаны бацька хацеў было яшчэ раз паўтарыць «свістач», але ці то языку было няёмка вымаўляць гэткае цяжкае і нязвычнае слова, ці то яшчэ ад чаго — атрымалася зусім па-іншаму: «свіслач».

Пачуўшы такі перайначаны варыянт, падмайстар зарагатаў, ды так голасна і шчыра, што і сам гаспадар не ўтрымаўся і далучыўся да яго. Цяпер ужо абодва паміж смехам вымаўлялі: «свіслач»...

Парагочуць ды зноў: «свіслач».

Раніцай, яшчэ толькі трэція пеўні праспявалі, а падмайстар ужо катурхаў гаспадаровага сына ў духмяным сене:

— Уставай, Свіслач няшчасны.

Пасмяецца ды зноў торкае:

— Уставай, Свіслач...

З тае часіны і сталі хлопца па гэтай мянушчы клікаць, ніхто імя і не згадваў. Бацька так за сына ўзяўся, што той ажно пішчаў, ніякія адгаворкі не дапамагалі. З раніцы да вечара знаходзіўся побач з майстрамі, і за пару гадоў так разабраўся ва ўсіх складанасцях кавальскай справы, што не толькі падмайстра, але і бацьку перагнаў. Працаваў павольна, не спяшаючыся. Бацька, дык той гарачы надта быў, усё яму каб хутчэй, каб не марнаваць людзей пад

дзвярыма. А малады каваль наадварот: пагамоніць з імі, супакоіць і так вырабіць, што прылада ці рэч ягоная дзесяткі гадоў без рамонту выкарыстоўвалася.

Слава пайшла па наваколлі пра залатыя рукі мясцовага майстра. Ужо не адны сяляне, але і багатыя паны заказвалі ў яго рознае начынне. Здаралася, звярталіся з такімі просьбамі, што і самі сумняваліся, ці справіцца каваль. Але праз дзень-другі ўжо выхваляліся адзін перад адным выдатнымі вырабамі, сцвярджаючы пры гэтым:

— Не абы-хто рабіў, а сам Свіслач руку прыклаў. Ого, браце, гэта сапраўдны майстар, ад Бога. Такому і пераплаціць не грэх. Ведае сваю справу, і не злыдзень...

Так яно ў жыцці было. Калі чалавек не меў чым заплаціць, а прасіць усё роўна даводзілася, то абяцаў адпрацаваць, на што звычайна малады каваль паблажліва адказваў:

— Было б там чаго, шаноўны, усяго разоў колькі малаточкам па кавадле і ляпнуў, а ты ўжо гатовы на калені перада мною станавіцца. Кінь дурное, працуй здаровы...

— Дай Бог і табе здароўя, майстар! Каваць табе не перакаваць заказаў усялякіх!

— Вось за гэта дзякуй! — усміхнецца задаволены каваль і на тым развітаюцца.

Аднаго разу давялося майстру рамантаваць экіпаж надта багатаму і пыхліваму пану. Коні панеслі карэту і так размалацілі яе па карчах, што, здавалася, нічога з яе ўжо не будзе. Можа, і не было б, каб які іншы майстар узяўся. Свіслач жа абышоў вакол, паглядзеў, свіснуў і кажа:

— Да вечара, пане, зробім (а справа раніцай была). Пачакайце толькі.

— Калі зробіш, чалавеча, то ўзнагароджу шчыра.

— Раз абяцаў, пане, то зраблю.

І зрабіў да вечара. Усё падагнаў, выправіў, дзе трэба было — замяніў, і карэта стала што новая. Але і пан не падмануў. Даў таленавітаму кавалю вялікі надзел зямлі:

— Вось тут і жыві, раз такія залатыя рукі маеш.

Адтуль і вёска пайшла і назвалі яе па мянушцы таго маладога каваля — Свіслач.

## ТАЛЬКА

Гэтая гісторыя адбылася даўно: можа, трыста гадоў, а можа, і болей.

Гулялі нешк у вёсцы вяселле. Раней, калі вяселле надаралася, то яго ўсе местачкоўцы гулялі. Не надта каб многа пілі, але весялосці, песень усялякіх, танцаў хапала. Не дзень, не два свята доўжылася — цэлы тыдзень, а то і болей, бо час выбіралі не гарачы, а калі на двары ўсё ўжо было прыведзена ў парадак і можна было не спяшацца ў поле. Хораша ўсё ладзілі. Традыцыі прытрымліваліся, як у старых было, так і людзі рабілі, бо баяліся парушаць нешта ў адвечным парадку, каб маладым у сямейным жыцці не пакутаваць.

Дык вось, на той раз млынар аддаваў адзіную дачку-прыгажуню за добрага хлопца, таксама з заможнай сям'і, з працавітых сялян. У нас тут усе даўней багата жылі, гэта ўжо пад Саветамі іначай пайшло...

Дзяўчыну звалі Гэлькай. Што тая вішанька вясною на мяжы расквітнее, гэтак і яна цвіла. А хлопца Мартынам клікалі. Таксама прыгажун быў, якіх пашукаць: высокі, з твару вады можна напіцца, здаровы. Працаваў — утраіх ледзьве поруч з ім спраўляліся.

Кахаліся гадоў колькі з Гэлькай, бацькі не супраць былі. Чаго яшчэ жадаць? Ды і пасаг млынар за дачкою даваў не абы-які, а пару коней, гэтулькі ж валоў ды зямлі ворнай добрую ніву. Бацькі не пасквапіліся і адразу аддзялілі кавалак поля, дзе можна было пачынаць узводзіць уласны дом. Таму і святкавалі, таму і спяваліся вясёлыя песні. Важны сват хадзіў паміж гасцей і, запрашаючы іх, гукаў на ўсю вуліцу:

— Ну, то, госцейкі даражэнькія, не саромейцеся! Вазьміце ды ўздыміце чарачку залачоную за нашу пару асвячоную!

Нехта хуценька азваўся:

— Эй, сваце, яшчэ ж не асвячоную! Царкву ж яшчэ не наведалі!

— То так! Але ж па чарцы-другой не пашкодзіць, а там ужо і ў царкву вянчацца маладых павязуць. Налівайце, выпівайце ды добра запамінайце, як вас тут прывячалі-частавалі, каб благога слова потым ніхто нікому пра гэтае вяселле не гаварыў.

Ведаў бы бедны сват, што ён стаяў на парозе

трагічнай праўды, то, можа, не ляскаў бы языком, а старанна сачыў за ўсім, што навокал рабілася. А так...

— Выпівайце, госцейкі, закусвайце ды песню звонкую зацягвайце, дзеля такога выпадку грэх не паспяваць!

— Сапраўдны, сват, праўду кажаш! Няхай маладыя будуць здаровыя, вясёлыя ды працавітыя, а праз год — і дзеці ў іх спавітыя! — пачулася шчырае пажаданне з далёкага кута хаты.

— Дай ім Бог здароўя, шчасця, каб злыбеда мінала, а сонца заўсёды іхнюю сям'ю абагравала!

— Каб ляцела і касілася, а шчасце каб да іх сёння ж далучылася!

— Дзякуем! Дзякуем, людцы! — азваліся задаволенымі галасамі маладыя.

— Частуйцеся, родненькія! Частуйцеся! Смакуйце ўсё, што на сталах, каб нічога не заставалася! — гаманілі бацькі, ласкава запрашаючы гасцей. Яны былі задаволены. Усё ішло надзвычай важна і чынна. Як планавалі, так і атрымлівалася.

Дзынькнулі цымбалы, цілікнула скрыпка, неяк глуха-самотна гопнуў бубен, а потым, нібы выправіўшыся, рассыпаўся драбнюткім гарохам. Узвіўся нейчы высокі і зычны голас:

Ой, пайграйце мне,
Каб я паскакала.
Купіў бацька чаравічкі,
Каб я паскакала!

Гэткі ж звонкі і вясёлы голас выгукнуў:

— Музыканцікі! Рэжце так, каб разам з намі знічкі ў небе за аблокамі заскакалі!

— Мы-то ўрэжам, але паглядзім, чым вы адкажаце,— гулліва прамовіў барадаты скрыпач і трасянуў чубам.— Гоп-гоп-гоп, тра-та-та! Паехалі, хлопцы!

І пасля такой каманды гэтак зайгралі, што ў скокі пусціліся амаль усе людзі, якія былі на вяселлі. Не таньчылі толькі старыя, бо ўжо не тыя гады былі, не тая сіла і трываласць у нагах.

Гупалі ногі, абутыя дзеля такога выпадку ў боты і боцікі, тупацела ўсё навокал, трашчалі платы і кустоўе, у якое залятаў найбольш прыткія танцоры. Ад разгарачаных твараў гэтак і цягнула сілай і здароўем. Усе танцавалі, пакрыквалі, падсвіствалі, падляскваі, нібы дапамагаючы музыкам выбіваць такт. Мартын

з Гэлькай танцавалі ў самым цэнтры, як і належыць маладым.

А сват вёў рэй, дарма не губляў ніводнай хвілінкі. І тут, махнуўшы рукою музыкам, каб тыя закончылі іграць, крыкнуў:

— Час збірацца! Час збірацца! Трэба ехаць у царкву! Няхай госці тут гуляюць, а мы з маладымі ды з іхнімі дружкамі хутка абернемся, бо бацюшка чакаць не надта любіць, і дамоўлена з ім ужо!

Праз нейкіх там паўгадзіны коні панеслі Гэльку з Мартынам да бліжэйшай царквы. Там усё адбылося без нечаканасцей ці складанасцей. Добра бацюшку заплацілі — добра і хутка той і справу сваю зрабіў. Сват быў задаволены. Зараз можна было і дамоў кіравацъ, каб адтуль ужо маладую перавезці ў хату да жаніха ды там працягваць вяселле.

Дарогаю спявалі песні, пагігіквалі на коней, якія і без таго птушкамі ляцелі па не надта ўезджанай дарозе. Моладзь не смуткавала. Весяліліся, бо патрабавала душа, дурэлі з дзяўчатамі, і тыя зычнымі галасамі абуджалі наваколле.

Дома маладых ужо чакалі. Зноў сустракалі, зноў сядалі за сталы і частаваліся, але ўжо ўсе ведалі, што хутка маладая пакіне бацькоўскую хату і паедзе разам са сваім набыткам у гасподу да бацькоў Мартына. Такая была завядзёнка з сівых стагоддзяў. Так некалі продкі рабілі, гэтага трымаліся і нашчадкі.

Нарэшце ўстаў сват і скамандаваў:

— Ну, госцейкі, налівайце па поўнай чарачцы ды будзем благаслаўляць маладых ехаць у другую сямейку! Бацькі няхай самі благаслаўляюць дачку сваю! Хай пасаг грузяць на вазы! Няхай нясуць так, каб усе бачылі! Няма чаго хавацца ад цікаўных вачэй! Багацця многа, а найбольшае — сама Гэлька! Праўда, Мартын?

— Праўда! — выгукнуў той.

Калі ўжо селі на вазы і пабралі ўсё і ўсіх, то нехта запрапанаваў нерашуча:

— Трэба было б, паводле народнага, са стрэльбы стрэліць, нячыстую сілу напалохаць. Каб яна да маладых не чаплялася, ды коней па дарозе не закружыла. Так даўней заўсёды рабілі...

Але ці то сват быў п'янаваты, ці то верыў у тое, што ўсё прадугледзеў, ён павярнуўся на голас і, пасмейваючыся, гучна адказаў:

— Каб ты на печы сярод ночы... часта страляў. Мяне вучыць будзеш...

Тыя, хто сядзеў у вазах, падтрымалі свата:

— Няма чаго страляць, а то шчасце адпудзім!

— Дарога не такая і далёкая, ды і ведаем мы яе добра, таму гэта пустое ўсё, марна толькі час бавіць будзем.

— Даедзем, ці ўпершыню дзевак замуж аддаём! — пачулася бадзёрае.— Паганяй лепей!

Але нехта ўсё ж прамовіў:

— А мо і сапраўды стрэліць? Вечарэе ўжо, каб ліха якога не здарылася...

Каб жа чулі, калі добрае раяць...

Паехалі-паімчалі вазы навыперадкі, зацілікалі музыкі, заспявалі запрошаныя. Якая тут бяда, якія нячысцікі!

Ды аказалася, што якраз гэтая бяда і здарылася. Ці то сіла нячыстая, ці то ведзьмакі якія, ці то коньмі, дзе сядзелі маладыя, п'яны фурман кіраваў, але збіліся яны з роўнага шляху і паляцелі, нібы шалёныя, па нейкіх узгорках ды карчах. Спачатку Мартын з Гэлькай і ўвагі не звярталі, пасмейваліся, калі трэсла, мацней трымаліся ды прыціскаліся адзін да аднаго. Але небяспеку ўсё ж заўважылі. Праўда, позна. Раз'юшаных коней нельга было стрымаць. Неслі ў цемру на ўсім скаку. Так і ўляцелі ў дзікую балаціну. Так і пацягнулі за сабою маладых у смярдзючую магілу, якая сышлася над імі балотнаю травою ды купіннем. Дарма крычалі людзі, дарма джгаў сюды што было сілы сват. Не дачакаліся да раніцы госці вяселля ў той вёсцы, адкуль быў родам Мартын. Калі пачалі распытваць ачмурэлых сведкаў, то тыя і сказаць нічога канкрэтнага не маглі, толькі гаманілі:

— Няма... няма родненькіх... У таль... У тальку уляцелі... У тальку трапілі...

Пазней, непадалёку ад тае балаціны, стала вёска, яе і назвалі Талькай.

## ЦІТВА

Жыў тут на адным з хутароў селянін, і звалі яго Ціт. Так сабе чалавек быў, працаваць працаваў і пагуляць быў не супраць, асабліва, калі добры выпадак надараўся. Па рэдкіх святах хадзіў у госці сам ці прымаў гасцей дома. Але, што самае галоўнае,—

хадзіў адзін, без жонкі. На пытанне, чаму так рабіў, адказваў:

— Які з яе толк за сталом? Толькі верашчаць потым будзе, што выпіў ці лішнюю скварку з'еў... Сам сабе і гаспадар і пан валадар...

Вось пайшоў ён аднаго разу да свайго кума, а кум той жыў хоць і не надта далёка, але дарога ішла лесам і балатамі, таму дабрацца да яго нават на цвярозую галаву было цяжкавата, не кажучы ўжо, што п'янаму прайсці было амаль немагчыма. Ціт пацёгся з раніцы. Рашыў распытацца пра жыццё-быццё, пра здароўе, пра навіны, якія за гэты час адбыліся. Селі за стол, загаманіліся, добра джгнулі і не заўважылі нават, як змрок па балоту папоўз. Жонка кумава разоў колькі нагадвала ім пра гэта, але яны ў адказ толькі пасміхваліся:

— Чаго ты лезеш, дурніца, дай нам пасядзець. Дарога нікуды не дзенецца. Мы ж яе тысячы разоў нагамі перамервалі, то і на гэты раз усё добра будзе...

Потым неяк усё ж і самі ачомаліся:

— Ну што, кумок, давай аглаблёвую і пара развітвацца, бо ўжо і сапраўды зоркі ў небе свецяць.

Налілі па поўнай і, вядома ж, урэзалі. Кум з жонкай гасцінцаў Ціту на дарогу ў торбу паклалі, каб жонцы нечага, дзеткам сваім перадаў, правялі яго, можа, з вярсту, да самага балота, і назад пайшлі, а госць паплёўся дамоў. Ідзе сабе, нічога не баіцца, песню зычна цягне, толькі водгалас па лесе ляціць далёка-далёка і там недзе заціхае.

Ішоў, ішоў кум ды падалося яму, што ён ужо дома. Пакінуў торбу, ляпнуўшы яе ля парога, сам боты зняў і спаць залез на печ. Ціхенька ўсё зрабіў, каб жонка ненарокам не пачула ды сварку не ўсчала. Ляжыць сабе і соладка пахропвае. Цёпла на печы ляжаць, асабліва калі лета на дварэ.

Прачнуўся раніцай і дацяміць ніяк не можа, дзе гэта ён. Боты нехта зняў і па купінах параскідаў, торбачка з падарункамі ў траве ляжала, а сам ён на дзёрне расцягнуўшыся спаў. Круціць галавою чалавек, здагадацца не можа. Пачаў было крычаць, але калі туман сышоў, то адразу здагадаўся, што яго нячысцікі акруцілі. Дома, можа, хто іншы і маўчаў бы, але ж Ціт не ўтрываўся і распавёў пра ўсё. Таму тую мясціну Цітваю і назвалі. Там пазней і наша вёска стала.



# САЛІГОРСК (СТАРОБІН)

Быў у аднаго мужыка сын, і такі ўжо хітры ды практычны, што ўсе яго звалі не інакш як Старобін, а некаторыя — Староба. Гэта таму, што ўсё на свеце ён ведаў, а калі і не ведаў, дык усё роўна браўся тлумачыць і рабіў гэта так сур'ёзна і пераканаўча, што нават той чалавек, які яшчэ хвілінудругую таму назад дакладна ведаў, што ўсё няпраўда, пачынаў сумнявацца ва ўласнай праваце і згодна падтакваць хлопцу. Бацька спачатку спрабаваў было неяк паўплываць на сына, прымусіць яго болей працаваць, а не языком мянташыць, але ў хуткім часе зразумеў, што гэта марная трата часу і здароўя, і супакоіўся. Перажываў толькі за будучае сына, не падобнага на старэйшых братоў і сясцёр. Маці яго пашкадавала. Ведама ж, самы малодшанькі, таму і паспаць яму даўжэй дазвалялася, і з'есці лепшы кавалачак выпадала і г. д.

Неяк усё ж сасваталі Старобе дзяўчыну, і што самае галоўнае — прыгожую, працавітую, разумную. Бацька з маці нават паверыць не маглі, не ведалі, як радавацца такому цуду. За такога языкастага і

лайдакаватага хлопца ды такую дзяўчыну ўхапіць. Вяселле гэткае вялікае і шчырае наладзілі, што, можа, ніхто ва ўсім наваколлі раней так не гуляў. Віногарэлка ракою ліліся, сталы ад прысмакаў прагіналіся, песні тыдзень спяваліся, весяліліся, адным словам.

Далі Старобе з маладой жонкай старую хаціну, нарэзалі ладны кавалак зямлі і сенажаці, нават ніву засеяную аддалі, толькі жыві і радуйся. Ды не тут-то было. Маладая жанчына і рада была працаваць і дзяцей нараджаць, але муж за старое ўзяўся і ніякім чынам яго нельга было прымусіць хоць дробную справу па гаспадарцы выканаць. Не хоча, і ўсё на тым! Са старымі ды з малымі на прызбе якой цэлымі днямі праседжваў. Толькі есці дамоў і прыходзіў, для чаго іншага ў хату не загнаць было.

Вось ляглі аднаго разу яны спаць. Жонка, бедалага, на полі напрацавалася, павярнуцца не можа, гэтак усё баліць ад стомы, а муж толькі храпе, што той конь пасля полудня, калі ў халадку адпачывае. Потым прачнуўся Староба і ад нечага рабіць, бо спаць болей не хацеў, пытаецца ў сваёй гаспадыні:

— Ганулька (гэтак яе звалі), а ці любіш ты мяне? Скажы, не маўчы.

Бачыць жонка, што муж не адчэпіцца, і праз сон гаворыць:

— Кахаю, родненькі, толькі так, як пакахаў бы чалавек свайго земляка, сустрэўшы яго на чужой зямлі...

Надта не спадабаўся Старобе гэткі адказ. Прыўзняўся ён у ложку і перапытвае:

— Скажы яшчэ раз, як ты кахаеш, а то нешта я не зразумеў.

Тая і паўтарыла. Ці ж яна думала пра такое, што далей адбылося?

А здарылася вось што. Як толькі Ганулька сказала свае словы, муж улупіў ёй па твары з усяе сілы ды яшчэ і пракрычаў:

— Раз ты мяне гэтак кахаеш, то пайду я ад цябе, няма мне чаго тут рабіць!

Гопнуў яшчэ раз у каршэнь Ганульцы, плюнуў са злосці і з ганьбы і, апрануўшыся, пайшоў з хаты. Пайшоў, як меркаваў, каб ніколі болей сюды не вяртацца. Але ж як пайшоў чалавек у свет, то там не было дзе ні паесці, ні паспаць уволю. Мала хто зжаль-

ваўся над падарожным ды падаваў яму кавалак-другі. Пахадзіў-пахадзіў лайдак і бачыць, што яшчэ крыху гэтак паблукае — і ногі можа працягнуць ад голаду. Таму вырашыў наняцца да каго-небудзь у работнікі. Вось і будзе пірог з макам. Дома працаваць не хацеў, нават смяяўся з тых, у каго спіна ад салёнага поту не высыхала, а тут так лёс павярнуўся.

Неяк падышоў да старой, пахіленай хаціны і пастукаў у акяніцу:

— Гаспадар, гаспадар, гаспадар, пусці, калі ласка, пераначаваць, бо я падарожны і надта стаміўся, ходзячы па белым свеце. Спаць хачу — з ног падаю.

— Заходзь, заходзь, чалавеча,— пачулася ў адказ,— месца хопіць. Можа, чаго іншага не знойдзецца, а месца заўсёды будзе.

Бачыць Староба, што стаіць перад ім стары, сівенькі дзядулька і ўважліва яго разглядвае. Пасадзіў потым за стол, паставіў гаршчок з пустой капустай і пару бульбінак побач паклаў, маўляў, еж, падарожны, бо болей нічога не маю. Але лайдаку і гэта мёдам падалося. Сёрбае, толькі бародка трасецца ды рукі трымцяць, нібы ў злодзея. Стары ні пра што не пытаўся, маўчаў і сумна ўздыхаў, пазіраючы зрэдку на свайго нечаканага госця.

Пад'еў падарожны і, устаўшы, ціха прамовіў:

— Дзякую, пане гаспадар. Дзякую, цяпер я на тры дні наперад наеўся. Пасплю ў цябе і далей пайду.

А дзядулька хітры быў, гэтак спакойна пытаецца:

— А што цябе, чалавеча, у свет белы пагнала? Малады ж яшчэ, відаць? Нешта ж здарылася такое, што прымусіла да такога жыцця?..

— Так, старэча,— адказаў вандроўнік,— не пашанцавала мне ў жыцці. Жонка ліхая дасталася, вось і давялося ўцякаць як мага далей ад роднае хаціны. Такая ўжо лайдачка ды злосная — што не дай Божа каму-небудзь іншаму. Поедам ела, не карміла, толькі на працу выганяла з самае раніцы. А калі крыху раней прыходзіў, то верашчала-лаялася да паўночы, толькі і чакаў, каб ранак хутчэй прыспеў ды ўцячы ў поле ці на луг. Трываў я, трываў і вырашыў пайсці ў свет, бо ўсё роўна яна б мяне са свету белага зжыла.

— Гісторыю сумную ты мне паведаў, чалавеча,— змрочна мовіў гаспадар.— Канешне, калі і другому такая жонка трапіцца, то невядома яшчэ, як ён ратавацца ад такога ліха будзе...

— Вось і хаджу ад хаты да хаты, туляюся тамсям,— працягваў Староба,— неяк жа жыць трэба...

— То не туляйся сабе, не ідзі далей, а заставайся ў мяне, будзем удваіх жыць. Хатка ў мяне хоць невялічкая і старая, але ж свая, і ніхто мяне, ды і цябе зараз, праганяць адсюль не будзе. Поля кавалак маю, кароўку, коніка свайго — усё, як у людзей. Толькі мне ўжо цяжка ўсё гэта апрацоўваць аднаму. Цябе мне сам пан Бог паслаў. Заставайся, чаго там...

Брыкнуўся на калені Староба, пачуўшы такія прачулыя словы:

— Пане гаспадар, ды я на цябе з раніцы да вечара працаваць буду, апраўдаю тваю дабрыню і давер да мяне. Усё сам рабіць буду, а ты толькі гаварыць будзеш, куды на наступны дзень кіраваць, дзе шчыраваць.

Так і павялося ў іх з таго дня — Староба, не разгінаючыся, працаваў, а гаспадар побач быў. Скончыць ягоны работнік адну працу — ён адразу іншую яму падказвае. Ледзьве ногі да вечара валочыць былы лайдак, але і скардзіцца нельга, бо сам жа напрасіўся. Уцягнуўся ў працу, адчувае, што плечы і рукі сілай нечуванай наліліся, зрабіліся нібы жалезныя. Учэпіцца з раніцы за працу парабак і да вечара стольк і наварочае-пераробіць, што людзі праезджыя ці прахожыя толькі дзіву даюцца і ні ў якім разе не вераць, што гэта адзін чалавек зрабіў. Гаспадар іх пераконвае, а яны яму:

— Не паверым, дзядулька, як ні кажы. Дзе гэта бачылі, каб гэткую ніву ды за адзін дзень адзін чалавек пераараў. Не, такога быць не можа. Проста пажартаваць старэча вырашыў. Нічога, калі праца зроблена, то і жартаваць не вялікі грэх. Іншае — калі поле неаранае стаіць, вось тады няма часу зубы вышчаляць.

Сам Староба слухаў такія словы і пасміхваўся задаволена, маўляў, вось які я зрабіўся! Ніхто нават не верыць у тое, што гэткім працаўнікам стаў. Ды і гаспадар пераконваць не ўмее. Вось каб я сам за справу ўзяўся, то за адзін момант усіх пераканаў бы. Толькі не магу, бо зноў за старое вазьмуся...

Падумае гэтак парабак і пойдзе ў хаціну.

Не дзень, не два працаваў добра і натхнёна былы вандроўнік і лайдак. Але неяк так здарылася, ці то сэрцам адчуў, ці то нехта нешта сказаў — пацягнула

яго ў родныя мясціны. Спачатку нічога не гаварыў хітраму гаспадару, але потым не вытрымаў:

— Вось што, пане гаспадар, мне сніцца штодзень бацькоўская хата. Жонку, нібы жывую, перад вачыма бачу. Здаецца, што запрашае вярнуцца, сцвярджае, што болей лаяцца не будзе. Пайду я хіба ў свае мясціны...

Выслухаў яго гаспадар уважліва і прамовіў:

— Я даўно бачу, чалавеча, што ты пакутаваць пачаў, але ўсё чакаў, калі ж нарэшце растлумачыш, што да чаго. Вось і дачакаўся. Раз трэба вяртацца, раз сэрца і душа туды цягнуць, то нікога не пытайся і не марудзь, збірайся і ідзі дамоў. А можа, і сапраўды ўсё наладзіцца. Жыццё ёсць жыццё, яно — штука складаная і непрадказальная. Зараз мы з табою стол па-добраму накрыем, пасядзім на развітанне, а заўтра, з раніцы, кіруй у дарогу. Добра ты мне дапамог, выручыў мяне, старога, ад цяжкасцей і ўсялякіх перашкод, але і я табе добра адплачу...

— Не трэба мне ніякай адплаты,— стаў адмаўляцца Староба,— яшчэ чаго не хапала. Я ж за тое, што вы мне жыллё далі ды ежу на стол ставілі, дапамагаў. Не трэба адплаты ніякай.

— Не перажывай, не перажывай, супакойся,— пачаў суцяшаць гаспадар,— я табе не грошы прапаную. Пачакай крыху, потым сам пераканаешся, у чым справа...

Селі яны за стол і пасядзелі добра. Гаспадар дзякаваў вандроўніку, які столькі гадоў яму верна служыў, а той, у сваю чаргу, выказваў словы падзякі старому, які многаму яго навучыў, многае падаў у зусім іншым свеце, чым яго раней бачыў Староба. Сталі класціся спаць, а дзядулька і кажа:

— А зараз, чалавеча, слухай уважліва, бо я табе адплату прамаўляць буду. Запамінай, каб нічога не перайначыў, бо сабе на шкоду зробіш. Добра запамінай. Я нямнога скажу, але ўсё гэта надзвычай важна.

— Добра, пане гаспадар,— пагадзіўся парабак.

— Першая мая парада будзе такая. Калі будзеш ісці дамоў, то перад табою раскінецца шырокая і глыбокая рака. Не імкніся яе пераплысці, хоць там і чаўны будуць, і людзі. Не трэба табе гэтага рабіць. Не слухай і добразычліўцаў, якія стануць пераконваць пераправіцца праз раку. Дзейнічай так, як я зараз табе параю: ідзі ў левы бок, па беразе. Ідзі

і ні на каго не звяртай увагі. Ведай, якая цана будзе тваёй памылцы...

— Так, зразумеў,— ціха прамовіў Староба.

— Другая табе мая парада, чалавеча: як прыйдзеш у першую вёску на сваёй дарозе і будуць цябе запрашаць легчы спаць, то ты лягай, але не спі. Глядзі, як бы ні стаміўся — не засынай, жыццём можаш заплаціць. Там асабліва беражыся, бо ўсё можа бясслаўна завяршыцца...

— І гэта мне ясна, як Божы дзень,— сказаў Староба.

— Калі зразумеў, то слухай цяпер трэцюю параду: надыдзе табе на розум ударыць чалавека — супыніся. Чаго б ні каштавала, не рабі гэта, бо самае апошняе ва ўсім — біць людзей.

— І з гэтым згодны, пане гаспадар,— азваўся задуменна парабак. Дзякуй за слушныя парады, за тое, што гэтак мяне ўважыў. Цяпер спаць лягу, каб раніцай у дарогу рушыць.

— Лягай, чалавеча, а я яшчэ крыху пасяджу, падумаю, бо нешта і ў мяне душа захвалявалася.

На світанні ўстаў Староба, узяў торбачку, кіёчак і выйшаў за парог. Стары дзядулька пайшоў яго праводзіць. Ішоў гаспадар поруч і нічога не казаў, толькі цяжка ўздыхаў. Нарэшце не вытрымаў, супыніўся і прамовіў:

— Шкада, што ты адыходзіш, бо мне з табою гэтак добра і лёгка было, але што ўжо зробіш, у кожнага свой шлях у жыцці... Бывай, падарожны, поспеху табе і шчасця ва ўсім. Ды глядзі не забывай, што я табе ўвечары казаў...

Далей ужо пакіраваў Староба адзін. Адвык ён за той час, што правёў у старога, ад дарогі, і цяпер усё ўспрымалася па-новаму. Пакуль уцягнуўся, пакуль зноў адчуў сябе ў стыхіі нязведаных шляхоў, то прайшоў не адзін дзень, а можа, цэлы тыдзень. І ўвесь гэты час памятаў пра дзедавы парады, таму імкнуўся абыходзіць людзей, хавацца, калі надаралася такая магчымасць.

Неяк надвячоркам выйшаў падарожны на бераг шырокай рэчкі і апынуўся ў людным месцы. Усюды чулася гаворка, а калі заўважылі незнаёмца, то пачалі наперабой раіць:

— Пераходзь з намі, чалавеча.

— Не бойся, пайшлі, мы тут брод ведаем.

— Давай да нас у човен, азірнуцца не паспееш, як на тым беразе будзеш.

— Хадзі сюды, дзядзька, з намі і па дну, нібы па беражку, прабяжыш.

— Чаго саромеешся? Ці палохаешся нечага? Не бойся, не ты ў нас першы, не ты і апошні.

— Ты, відаць, ногі баішся замачыць, бо мыў іх напярэдадні,— выгукнуў нехта, і ўсе астатнія адказалі на гэты жарт дружным рогатам.

Староба нават не ўсміхнуўся, а з каменным выразам твару пайшоў міма ашаломленых людзей па левым беразе ракі, як яго павучаў стары гаспадар. У лесе і пераначаваў. Калі можна было гэта назваць сном: цэлыя хмары камароў, лясныя крыкі і сполахі не давалі магчымасці самкнуць вачэй. Але ўсё роўна падарожны не збаяўся і не пайшоў на той бераг, як яму прапаноўвалі.

На золку вандроўнік пакрочыў далей. Ужо і рака засталася далёка ззаду, і лес той адвечны схаваўся за высокімі ўзгоркамі. І ўбачыў Староба наперадзе вялікую вёску, якая раскінулася ў зялёнай даліне, нібы ў сподачку. Песні адтуль несліся вясёлыя, гукі нейкія незразумелыя. Спачатку ён прыпыніўся і нерашуча пататаўся на месцы, але прыгадаў другую параду дзядулькі і паціху падаўся наперад. Пакрочыў да крайняга падвор'я. Зайшоў, а там гаспадар з гаспадыняй сядзяць сабе на прызбе, ля хаты, і песню ладнымі галасамі выводзяць. Падумаў падарожны, што не час гэта рабіць, іншая ж праца ёсць, але потым і сам усміхнуўся. Пакуль ён хадзіў ды лазіў, то і надвячорак надышоў незаўважна.

— Вечар добры,— гаворыць,— шаноўныя гаспадары!

— Добры і табе, падарожны! — адказваюць ласкава тыя.

— Ці не пусціце мяне пераначаваць да сябе ў гумно, а то я здалёк іду, прытаміўся моцна і хацеў бы крыху пераспаць, сілы набрацца...

— Чаму ж не пусцім? Пусцім і пакормім добра, бо ў нашай вёсцы здавён так вядзецца, што падарожным, старцам усялякім ці жабракам заўсёды і пераспаць дазваляем, і кормім. Не саромейся, праходзь да нас ды сядай пакуль тут. У хуткім часе і вячэра прыспее, паясі і спаць ляжаш.

Селі размаўляць, і тут заўважыў Староба, што

гаспадыня маладая і прыгожая, а чалавек яе — стары і ўжо ледзьве хліпіць на гэтым свеце. Заўважыў, але нічога не сказаў, прамаўчаў, бо навучыўся ўжо за доўгія гады такому.

Паелі, і гаспадыня гаворыць:

— Пайшлі, чалавеча, завяду цябе ды пакажу, дзе спаць будзеш. Ты ж тут першы раз і не ведаеш, што да чаго...

— Так, гаспадынька, так,— пагадзіўся Староба.

Завяла яна яго ў гумно і, паказваючы на левы бок будынка, кажа:

— Вось тут і спі. Сена ў нас свежае, духмянае... Так што спакойнай табе ночы і добрага сну. Снедаць разбуджу.

Ляжыць Староба, але вачэй не заплюшчвае, баіцца, бо добра памятае пра тое, што яму казаў стары гаспадар. І тут чуе — нейчыя крокі на падвор'і пратупалі. Тады ён ускінуўся са свайго боку гумна і перабраўся на другі. Там і стаіўся. Ажно ціхенька рыпнулі дзверы і на парозе з'явіліся два сілуэты.

— Сюды хадзем, бо там ляжыць падарожны,— паціху шапнуў жаночы голас.— Асцярожна, каб не разбудзіць...

Ляглі амаль побач са Старобай і размаўляюць сабе:

— Трэба старога зарэзаць і засунуць у воз таго гандляра, які ўжо трэці дзень у нашай вёсцы ашываецца. Тады нас ніхто не западозрыць у злачынстве. Толькі каб якіх іншых слядоў не пакінуць...

Зразумеў падарожны, што гэта няверная жонка свайго хаўрусніка падмаўляе забіць старога мужа. Але ж і дрыгнуцца яму нельга, бо сябе выдасць і тады ўсё парушыць. Заснулі гаспадыня з каханкам, а Староба пракраўся да іх і адрэзаў ад крыса світкі ў мужчыны невялікі кавалак тканіны.

Што ж вы думаеце? Раніцай гандляр той сабраўся ехаць у дарогу і знайшоў у сваім возе нябожчыка. Ён не стаў таіцца, а пабег да князя і заявіў. Яго адразу арыштавалі і кінулі ў глыбокае падзямелле. А Староба быў чалавекам адчайным. Пракраўся ён да гандляра ў вязніцу і гаворыць:

— Я ведаю, хто гаспадара таго забіў. Магу табе дапамагчы, мне паверачь, але што буду мець за такую паслугу?

— Чалавеча, я цябе аддзячу ў сотні разоў болей,

толькі дакажы князю, што я невінаваты. Жыць мне хочацца. Я ж яшчэ зусім малады і, самае галоўнае — невінаваты... Але ніхто мне не верыць. Нехта хітра ўсё прыдумаў. Дапамажы, а я адплачу, можаш не сумнявацца.

— Паспрабую.

— Тады аддам табе воз з таварам, коней і золата яшчэ насыплю.

Пакіраваў Староба да князя. Варта спачатку не пускала яго, але калі чалавек сказаў, што прыйшоў з надзвычай важнай справай, то адразу правялі да валадара. Выслухаў той расказ пра забойства і коратка загадаў:

— Збірайце ўсіх мужчын і дзецюкоў на плошчу! Праверым, ці праўду гэты чалавек гаворыць, ці здолее ён пазнаць сапраўднага забойцу і вывесці яго на чыстую ваду.

Можа, праз якіх паўгадзіны на плошчы ажно віраваў натоўп. Усіх мужчын і дзецюкоў прывялі сюды дружыннікі, а калі князь аб'явіў, для чаго сабраліся, то людзі прыціхлі.

Староба дастаў з кішэні кавалачак тканіны, што адрэзаў той страшнай ноччу, і пайшоў ў натоўп. Доўга хадзіў там, прыглядаўся пільна да гараджан і вяскоўцаў. Нарэшце спыніўся і гаворыць на старшага дружынніка, які яго суправаджаў:

— Глядзі, вой, ты чалавек спрактыкаваны і вопытны, павінен мяне правільна зразумець. Бачыш, вунь у гэтага рыжага мужчыны на світцы кавалачак выразаны?

— Так, бачу.

— А цяпер паглядзі на тое, што ў мяне ў руцэ зажата.

— Усё зразумеў, падарожны! Усё зразумеў! Эй, дзядзька, пайшлі са мною да князя! — сказаў і моцна ўхапіў злачынцу за плячук.

Заверашчаў той не сваім голасам, завыў нема:

— Не я гэта! Не я! Хлусіць гэты вандроўнік! Знайшлі каму верыць! Ды ён гэта ўсё са злосці!

Але яго ніхто не слухаў, толькі валадар нецярпліва спытаўся:

— З кім ты сваю злачынную справу здзяйсняў?

Заплакаў у адказ злачынца і назваў імя сваёй каханкі. Іх кінулі адразу ў турму, а нявіннага гандляра вызвалілі. З радасці, што яму сапраўды дапамаглі

і даказалі праўду, ён падараваў свае тавары і коней Старобу, а потым яшчэ поўную шапку звонкіх залатовак насыпаў. Ды, развітваючыся, дзякаваў на чым свет стаіць.

Сеў падарожны ў фурманку і прыпусціў дамоў. Цяпер яму значна спрасцілася задача вяртання. На хуткіх конях за дзень можна было праехаць у дзесяткі разоў болей, чым прайсці пешшу. Дзён праз колькі дабраўся да родных мясцін. Стаў ля ваколіцы, і слёзы на вочы самі накаціліся. Пазнаў хаціну, сэрцу мілую, з якой некалі гэтак легкадумна выбраўся. Павагаўся крыху, а потым паехаў далей, якраз да таго падвор'я, дзе некалі жыў. Просіцца ў гаспадыні пераначаваць, а тая яму і адказвае:

— Начуй, чалавеча, месца на ўсіх хопіць. Хата хоць і старая, але ж вялікая. І кавалак хлеба ў нас заўсёды для добрага падарожнага знойдзецца.

Староба адразу пазнаў сваю былую жонку, а вось яна яго не ўгадала. Жанчына бачыць, што незнаёмец нешта яшчэ муляецца, дый гаворыць:

— У мяне толькі коней тваіх не будзе дзе паставіць. Хіба на двары пакінем...

— Зараз цёпла, і на двары пастаяць,— пагадзіўся вандроўнік.

Палеглі яны спаць. І чуе Староба, як да гаспадыні нехта прабіраецца. Зірнуў і бачыць — прыгожы юнак гадоў, можа, пад дваццаць ідзе спаць у яе палавіну. Ухапіў сякеру падарожны і ўжо збіраўся пусціць яе ў справу, але прыгадаў трэцюю параду дзедаву і супакоіўся.

Раніцай неяк знячэўку пачаў распытваць гаспадыню, хто гэта такі. Тая і распавяла яму, што гэта сын яе. А муж даўно ўжо сышоў з хаты і недзе блукае. Тады не вытрымаў Староба, упаў на калені перад гаспадыняй і прызнаўся, хто ён такі на самай справе. Купілі яны сабе зямлі пасля гэтага добрай і перабраліся туды жыць усёй сям'ёй. Добра жылі, заможна, дружна, ніколі не лаяліся болей, і людзі на іх благога не гаварылі. А месца тое, дзе пазней іншыя сталі сяліцца, назвалі Старобінам, ад імя першага гаспадара.

Пазней тут пачалі здабываць соль і горад назвалі Салігорскам.

## ЧЫРВОНАЯ СЛАБАДА

Жыў на свеце адзін вельмі багаты чалавек, і з дзяцей у яго з жонкай была толькі адна-адзіная дачка. Звалі яе Мар'я. Надта прыгожая яна вырасла. І прыспела тая часіна, калі трэба было дачцэ багацеяў замуж ісці. Нічога не зробіш, калі прырода свайго патрабуе, сэрца цісне, душа спакою не ведае. Але бяда была ў тым, што Мар'я кахала звычайнага вясковага хлопца — Хведара. Быў ён з беднай сям'і, таму бацькі дзяўчыны адразу ж супраць паўсталі. І чуць не жадалі пра такую пару. Калі Хведар прыйшоў сватацца, то гаспадар толькі паглядзеў з'едліва на яго і коратка хмыкнуў:

— Не, чалавеча. Не. Не для цябе мая дачка гадавалася...

Засмуціўся хлопец, пайшоў прэч, горка плачучы. Ды што ты зробіш, калі ў аднаго ёсць усё, а ў другога, акрамя рук, няма нічога. Мар'і шкада стала свайго каханага, і яна не ўтрывалася, нагаварыла бацькам усялякіх праклёнаў і пагроз:

— Не хочаце мяне за Хведара аддаваць, то і за вашага жаніха не пайду! Ніколі не пайду! Замуж не выйду! Буду сама жыць, але за вашу пару не пайду! Няхай сабе яны і прыгожыя будуць, і багатыя, але слова свайго не парушу! Так і ведайце! — ляснула дзвярамі і пабегла ў сад, да сваёй улюбёнай альтанкі, і там дала волю пачуццям.

Гадоў колькі прайшло з тае пары. Усе сяброўкі замуж выйшлі, дзяцей панараджалі, сваімі сем'ямі шчасліва жылі, а Мар'я ўсё адна хадзіла. Равеснікаў ужо не стала, дык і гуляць не было з кім, бо тыя, хто зараз на вячоркі хадзіў, былі маладзейшыя за яе. Хадзіла так, хадзіла гаспадарова дачка і вырашыла: чым адной на ўсё жыццё заставацца, лепей за першага сустрэчнага замуж выйсці. Слова, раней дадзенае, не парушыць, але і на ўмовы бацькоў не пойдзе. Хто ж яго ведае, якім чалавекам можа аказацца першы сустрэчны.

Ажно недзе, можа, праз паўгода сваты прыйшлі. Жаніх у іх надта багаты быў, але непрыгожы: гарбаты нейкі, саплівы. Нос у яго пастаянна чырвоны быў, а пад носам дзірка прагніла. Толькі Мар'я вырашыла болей лёс не выпрабоўваць. Бацькі, праўда, задаволеныя хадзілі, хоць і чулі ад людзей, што жаніх не

толькі гарбаты, але і на галаву слабаваты. Ім было ўсё роўна — хоць за чорта, каб толькі багаты ды заможны, каб золата-грошай дасталкова меў і зямлі паболей. Забегалі хуценька, вяселле рыхтаваць пачалі, гасцей шматлікіх запрасілі. Прычым не абы-каго ў хату звалі, а толькі тых, хто меў багацце і мог нешта падарыць маладым (і тут, як бачым, выгоду шукалі).

Нарэшце надышоў дзень вяселля. Ну і дзіўнае ж яно было! Адны на ім весяліліся, другія плакалі. Упіхнулі Мар'ю сілай у вазок да жаніха і павезлі да царквы — вянчацца. Па дарозе ўсё тое ж: госці песні гарлаюць, а маладая слёзы горкія лье. А ля царквы што рабілася! Людзі з бліжэйшых вёсак панаехалі, каб уволю пасмяяцца, пальцамі на жаніха паказвалі, які ледзьве да плечука дзяўчыне даставаў і пастаянна нешта ў носе шукаў, асаблівай увагі ні на што не звяртаючы.

Вось вам і вяселле: званы звоняць, людзі смяюцца, Мар'я плача.

Усё гэтак і скончылася б, ды надарылася так, што на той момант міма царквы ехаў багаты памешчыцкі сын. Ляцела ягоная тройка — толькі фурман паспяваў кіраваць. Прыпынілі ход ля натоўпу, і малады паніч звярнуўся да свайго фурмана:

— Слухай, Пятрок? Што ж то робіцца? Няўжо такая прыгажуня і за гэтага гарбатага ды саплівага замуж пойдзе і тым самым жыццё сабе навечна сапсуе?

— Так ужо атрымліваецца, пане, што трэба ёй ісці, ніяк не выкруціцца...

— А чаго гэта? — здзівіўся панiч.

— Справа ў тым, што лёс у бедалагі такі. А ад лёсу яшчэ ніхто не ўхіляўся, ніхто не ўцякаў і не хаваўся. Вось і ідзе. Бачыце, плача, але нічога зрабіць не можа.

— Нічога, кажаш, зрабіць нельга?

— Нічога, пане.

— Паварочвай коней назад і чакай мяне тут. Я зараз паспрабую што-небудзь перайначыць.

Вылез панiч і пайшоў да маладых, якія ўжо амаль да царкоўнай агароджы падышлі. Глянуў на дзяўчыну і адчуў, як радасна сэрца забілася. Такой прыгажосці яму яшчэ сустракаць не даводзілася.

— Ці можна да вас, маладая паненка, з запытаннем звярнуцца? — спытаў ён у Мар'і, а той было ўсё

роўна, толькі б хутчэй гэткая ганьба скончылася, таму і прамовіла:

— Чаму ж не...

— То давайце адыдзем на пару крокаў убок, каб не перашкаджалі.

— Дык мне ж пад вянец ісці, бацюшка крычаць будзе.

— Не будзе, ён мяне ведае і таму прытрымае язык за зубамі.

— То што вы, паніч, хацелі мне сказаць?

— Прабач, прыгажуня, можа, гэта і не мая справа, але адкажы мне, чаму ты, такая прывабная і прыгожая, за гэткага непрыгожага хлапца замуж выходзіш? Ці ж гэта па-божаму? Чаму так здарылася? Няўжо пары іншай не знайшлося? Ён жа ледзьве ногі смыкае, можа здарыцца, што праз год-другі яго і зусім не стане...

— Што ўжо зробіш, паніч,— ласкава зірнуўшы на спагадлівага незнаёмага чалавека, прамовіла Мар'я,— такі ўжо лёс у мяне. Ад нараджэння і да смерці ён будзе са мною, і нічога я не перайначу. Ні ў каго не прасіла дапамогі, бо ведала, што дарма.

— А калі...— ускінуўся паніч.

— Што? — перапытала дзяўчына, азіраючыся на гасцей, якія ўжо паказвалі ёй, што час ісці да шлюбу.

— А можа, ты, пані ясна, са мною да шлюбу пойдзеш?

Вочы ў Мар'і адразу высахлі і пашырыліся. Яна глядзела на паніча, ці не жартуе той, але насупраць яе стаяў зусім сур'ёзны чалавек.

— Калі паніч не жартуе, то я згодна...

— Чаго гэта я жартую?.. Як цябе завуць, дзяўчына?

— Мар'яй мяне клічуць, паніч.

— Стой тут і нікуды не ідзі. Я зараз да бацюшкі падбягу, каб ён нас з табою абвянчаў, а таго калеку бацькам вярнуў.

З боку бацюшкі перашкод не было. Багаты паніч хоча вянчацца — чаму б і не. Ён жа, вядома, і грошай намнога болей дасць, і чаго іншага падкіне, ды мала чаго да памешчыка потым прыйдзецца ісці. Праз нейкую хвіліну задаволены паніч падскочыў да Мар'і:

— Ну, пайшлі...

— Але ж дружкаў у вас няма, сведкаў, зноўтакі...

— Сведкаў? Зараз. Недзе тут мой фурман лазіць. Эй, фурман, дзе ты?

— Тут, пане,— пачулася зусім побач.

— Вось і ўсё. Пайшлі.

У царкве сталі яны на сувой белай тканіны, і бацюшка пачаў абрад. Людзі вакол прыціхлі, бо бачылі, які прыгожы паніч стаіць поруч з Мар'яй. Усё ў яго на месцы: і ростам узяў, і тварам. Нарэшце прагучалі заключныя словы бацюшкі: «Цяпер вы, мае дарагія, муж і жонка! Кахайцеся сабе ды любіцеся да скону жыцця!»

Узяліся яны за рукі і пайшлі да выхаду. Фурман карэту залачоную падагнаў, паніч у яе імгненна ўскочыў і крыкнуў:

— Паганяй!

Коні, нібы шалёныя, ірванулі з месца, а Мар'я нават і не зразумела спачатку, што атрымалася. Пакуль дайшло, ды загаласіла, то таго паніча і след прапаў. Людзі кінуліся супакойваць бедалагу, у чым жа яна вінавата, што так з ёю абышліся.

Мар'я не слухала, ірвала на сабе вопратку, валасы свае даўгія вырывала, крычала немым голасам:

— Божачка, за што мне адной такое пакаранне? Што я табе зрабіла?

Вяскоўцы раілі дамоў да бацькоў ісці ды супакоіцца. Што ўжо будзе — тое і будзе. Але дзяўчына адказала ім:

— Не пайду, людцы, я дамоў, бо хоць бацькі і многа гора-бяды мне прынеслі, але і я іх зганьбавала. Такое ўдумала, і вось чым усё павярнулася... Пайду я ў свет белы шукаць сваю долю. Прабачце мяне, калі можаце, пайду...

Так Мар'я і падалася ў свет вандраваць, бо сорамна ёй было вяртацца ў родную вёску.

А той паніч ехаў сабе з фурманам і размову гэткую вёў:

— Вось скажы мне зараз, які ў яе лёс далейшы будзе?

— Ды, пане, які наканаваны, такі і застанецца. Нічога вы ў ім, акрамя сораму, не змянілі. Хіба што прымусілі тую прыгажуню рукі на сябе накласці. А так...— і фурман злосна хвастануў па конях.

Паніч не зазлаваўся за гэткія разважанні, замаўчаў і ўнурыўся ў свае думкі. Потым, нібы схамянуўшыся, дадаў:

— А можа, і па-іншаму пойдзе, не так, як ты сказаў...
Фурман зрабіў выгляд, што не пачуў сказанага.

А Мар'я хадзіла ад вёскі да вёскі. Дзе переначаваць прасілася, дзе на працу наймалася, але ўвесь час шукала таго багатага паніча, які гэтак яе выручыў і... гэтак насмяяўся. Так прайшлі доўгія тры гады. Калі цікаўныя гаспадары дапытваліся ў яе, чыя яна ды адкуль родам, то вандроўніца звычайна адказвала, што не мае бацькоў і родных, з маленства, маўляў, засталася круглай сіратою. Працавала дзяўчына так, што за ёю ніхто ўгнацца не мог. Шкадавалі развітвацца з такой працаўніцай вяскоўцы, ды яна доўга нідзе не затрымлівалася. І плацілі ёй добра, і стараліся не пакрыўдзіць, толькі Мар'я за ўсё дзякавала і, не тлумачачы, чаму пакідала абжытую мясціну, ішла далей.

Аднаго разу нанялася яна да заможнага гаспадара. Той маўклівы быў надзіва. Мог цэлы дзень знаходзіцца поруч і слова не сказаць. А дзяўчыне гэта і на руку было, бо душу не вярэдзіў сваімі роспытамі. Цэлае лета шчыра служыла яму работніца, але неяк, аднаго дня, гаспадар здзівіў яе, запытаўшыся:

— Адкуль жа ты, Мар'я, родам будзеш?

— Не ведаю, гаспадарыку, не ведаю...

— А хто з твайго роду сярод жывых ёсць?

— Нікога не засталося. Адна я на белым свеце, нібы той крыж у полі чыстым.

— Дзіўна. І ты ўвесь час ходзіш наймацца да людзей?

— Так, гэтым і жыву, бо што ж адна здолею зрабіць?

— Вось я табе зараз добрае параю, Мар'я. Спадабалася ты мне. Прыглядаўся цэлае лета і бачу, што такі чалавек шчасця заслугоўвае, а не па чужых дварах хадзіць ды пабірацца. Таму слухай мяне ўважліва. Тут, непадалёку, ёсць багаты памешчык. У яго вялікі маёнтак, таму многа служкаў-парабкаў усялякіх. Ідзі і ты да памешчыка, наймiся на працу, то заўважаць тваю прыгажосць дзецюкі дый замуж каторы пазаве. Бо калі будзеш па сялянскіх падвор'ях туляцца, ніякай рады не выйдзе. Заможныя гаспадары ў першую чаргу бачаць у табе спраўную работніцу, а не прыгажуню і сваіх дзяцей за цябе ніколі сватаць не пойдуць. Яны знойдуць няхай сабе і непрывабных тварам, але багатых. А ў двары ў пана ты будзеш навідавоку. Можа

здарыцца, што і гаспадар вокам кіне ды пару табе неблагую падбярэ, тады ўвогуле не жыццё, а маліна пачнецца. Вось такое я хацеў, Мар'я, параіць. Як хочаш, прыслухоўвайся не прыслухоўвайся, але жыць жа і далей трэба...

— Дзякуй табе, гаспадар, на добрым слове, дзякуй, што сагрэў маю душу сваёй спагадай, што падтрымаў мяне гэтак,— расчулілася дзяўчына.— Сапраўды, чаму б і не падысці да панскага палаца...

Раніцай наступнага дня Мар'я ўжо стукалася ў брамку панскага маёнтка. Выбеглі слугі, запыталіся, што ёй тут трэба. Не разгубілася незнаёмка, адказала, што працу шукае, можа, у гэтых памешчыкаў знойдзе. Павялі яе да пана, але той, не доўга вагаючыся, да пані паслаў:

— Ідзі да маёй жонкі, можа, у яе які занятак ёсць, бо ў мяне каб для мужчыны, дык знайшоўся б, а для жанчыны — не...

Гаспадыні сапраўды патрэбна была маладая дзяўчына, бо яна збіралася звольніць старую кухарку, а на яе месца ўзяць чалавека. Калі ёй далажылі, што прыгожая падарожніца шукае сабе працу, то пані загадала прывесці яе да сябе ў пакоі. Убачыўшы такую прывабную дзяўчыну, адразу ж сказала:

— Я цябе вазьму, даражэнькая, каб ты навучылася і прызвычаілася працаваць на кухні, пакуль старая кухарка яшчэ ў мяне. Акрамя таго, будзеш прыглядаць за маім сынам, які дома рэдка бывае, усё па свеце са сваім фурманам ездзіць. Прыедзе калі на дзень-другі і зноў у нязведаныя шляхі кідаецца. Такая ўжо натура, што не можа сядзець на месцы. Я мару, каб ён ажаніўся ды з намі пастаянна жыў, але сын толькі смяецца ў адказ.

Як пачула такія словы Мар'я — нібы ў сярэдзіне ўсё абарвалася. Цюкнула нешта, што не іначай гэта той самы паніч, які так з яе насмяяўся. Але выгляду не падала, мужна трымалася.

А гаспадыня працягвала:

— Справа ў тым, мая даражэнькая, што я сваім слугам надта мала плачу, і таму адразу папярэджваю, каб потым не скардзілася і не ўпікала мяне.

— Гэта, пані гаспадыня, не так страшна,— адказала Мар'я,— мне грошы ўсё роўна не патрэбны, таму што няма мне іх куды дзяваць.

На тым і дамовіліся.

— Зараз,— загадала пані,— прыбірай пакоі, дзе мой сын жыве, бо ён вечарам павінен дамоў вярнуцца. Глядзі, каб усё належным чынам было зроблена, а то ён можа і засердаваць...

Калі на зямлю апусціўся прыцемак, вярнуўся дамоў гаспадынін сын, зайшоў у свае пакоі — а там чысцютка прыбрана. Не паспеў ён яшчэ і падумаць, хто ж тут так пагаспадарыў, як дзверы адчыніліся і на парозе паўстала новая кухарка. Паніч неўпрыкметку на яе паглядзеў і пазнаў, а Мар'я так і не здагадалася, хто перад ёю. Паставіла вячэру на стол і сабралася выходзіць, але паніч запытаўся:

— Дзяўчына-прыгажуня, а як жа цябе завуць?

— Мар'я,— ціха прамовіла тая і зачыніла дзверы.

Не палезла панічу ежа ў горла, лёг ён на ложак і задумаўся: «Няўжо гэта лёс мяне выпрабоўвае, ці яна за мною па слядах ходзіць? Не, мабыць, падалося... Але чаму яна тут апынулася? Не, нешта не тое адбываецца навокал...» Усю ноч не спаў, круціўся ды ўздыхаў цяжка, а калі сонца засвяціла ярка, пачаў клікаць кухарку, каб яму снедаць у пакой прынесла. Неўзабаве і прыгажуня паказалася. Павіталася ласкава, снядананак на стол паставіла і хацела ўжо ісці, але паніч папрасіў яе:

— Кухарка, будзь ласкава, прынясі мне кілішак і бутэльку з віном.

— Добра, паніч, зараз зраблю,— адказала тая і хуценька выйшла.

Хвілін праз колькі паставіла перад гаспадаром бутэльку і кілішак. Той, нібы не разумеючы, здзівіўся:

— А чаму кілішак толькі адзін? Я з табой жадаю выпіць.

— Няможна мне з вамі піць. Вы багаты, а я круглая сірата. Грэх вам з мяне смяяцца.

— Не збіраюся я з цябе смяяцца. Прыгожая ты, вось і хачу з табой выпіць...

Пайшоў і сам прынёс кілішак, сілаю пасадзіў кухарку насупраць сябе і наліў ёй віна.

— Давай цяпер вып'ем за лёс!

Уздрыганулася тут дзяўчына і запыталася:

— Паніч, дык гэта вы?

— Усё памятаеш?

— Ведама ж, такое не забываецца...

— Ну, то тады і будзь маёю жонкаю, бо мы ж з табою павянчаныя. Зараз пойдзем да маіх бацькоў, і я

ім усё пра цябе раскажу. Яны ў мяне добрыя. Ты толькі не перажывай і не палохайся...

Павёў яе да бацькоў і распавёў пра ўсё. Маці, калі такое пачула, то толькі рукамі пляснула:

— Што гэта з табою, сыночак, яна ж круглая сірата. У яе за душою нічога няма, а ты ж у нас адзін. Як жа так можна?

— Мы з ёю, маці, ужо тры гады вянчаныя як муж і жонка...

— Жартуеш... А хто можа даказаць?

— Ды фурман мой і дакажа. Ён жа сведкай пры гэтай справе быў.

Паклікалі таго сведку, а ён усё адмаўляе, бо паніч некалі наказаў яму маўчаць і нічога не гаварыць пра вянчанне. Але калі гаспадароў сын прымусіў, то выкрыў праўду:

— Гэта так, пані, я за сведку быў, а павянчаліся яны тры гады назад.

Пераканаліся памешчык з жонкай, што не хлусіць іхні сын, сапраўды ведаў раней Мар'ю, а паколькі гэтая дзяўчына ім прыйшлася даспадобы, то нічога супраць вяселля асабліва і не мелі. Пагаманілі крыху, што можна было б і лепшую пару знайсці, але сын заявіў грозна:

— Будзеце такое казаць — з'еду з палаца і стану з Мар'яй асобна жыць!

Але бацька не спалохаўся:

— Вой, толькі і тае бяды, сынку! Едзь, я і месца табе на сваіх землях дам.

І выдзеліў вялізны надзел, якраз там, дзе сёння наша мястэчка стаіць. Назвалі яго так ужо крыху пазней, з-за таго, што надзвычай прыгожае яно было. Чырвонае — харошае, значыцца, а Слабада — то вёска ці сяло. Так і засталося — Чырвоная Слабада.

## ВЯЛІЧКАВІЧЫ

Жылі-былі некалі даўным-даўно два браты. Старэйшы быў надта багаты, а малодшы, наадварот, бедны, нібы апошні жабрак з усяго наваколля. Вось табе і выраслі ў адной сям'і, і надзелы, здавалася б, пасля смерці бацькі аднолькавыя атрымалі, а так справа павярнулася, што па-рознаму жыццё ў іх пайшло. У багатага, Сцяпана, падвор'е поўнае ўсялякай жывёлы, па-

рабкаў тых не злічыць, у вялікай і светлай хаціне дабра ды нажытку хапае, а ў беднага, Івана, усяго і багацця было, што просты цяслярскі набытак, з якім ён нідзе і ніколі не разлучаўся, а сярод усяго гэтага — сякера. Такое ўжо жыццё чалавечае — як хочаш, так і круціся, ніхто табе надта не дапаможа. Паспачуваць яшчэ — адна справа, а вось капейчынай якой ці кавалкам хлеба падзяліцца на той час далёка не кожны мог.

Сцяпан з сям'ёю песні гучныя спяваў, а Іван са сваімі роднымі слёзы горкія ліў удзень і ўначы. Зрэдку звяртаўся за дапамогай да старэйшага брата, але той, пасміхваючыся, адказваў:

— А што ж ты хочаш, Іване, я старэйшы, значыцца, я вялікі, а ты, як ні пніся, усё роўна малы, дый годзе! Таму і багацця табе не бачыць...

Спачатку крыху усё ж дапамагаў Івану, але з цягам часу стаў забывацца на родныя карані. Ці то яму надакучыла, ці то ўжо да такой ступені заганарыўся. Але неяк прыйшоў да яго Іван, пастукаў у дзверы і на зычны голас: «Каго там прынесла?» — ціхенька адказаў:

— Я гэта, браце Сцяпане, я, твой родны брат.

— Чаго табе ў маёй хаціне трэба?

— Ды дробязь самую. Хачу коніка папрасіць. Дроў няма ў мяне, дык у лес пакірую. Добра было б адразу і дамоў прывезці...

— Дык і прывязі, чаго ж ты?

— Я б прывёз, браце Сцяпане, але ж у мяне, сам ведаеш, коніка ніколі свайго не было і да гэтага часу няма. Таму прашу, дай мне яго на сёння, хоць самага слабенькага. Не палохайся, не замучу, толькі крышку якога ламачча на воз ускіну і назад вярнуся...

— З такой нагоды ды яшчэ коніка марнаваць? Ты і за плечы можаш ускінуць і на сабе прыцягнуць, нічога табе не зробіцца.

— А можа, перадумаеш?

— Не, нават і не стой і не прасі. Не дам на гэты раз коніка. Болей не прыходзь, бо надакучыў ты мне ўжо сваімі просьбамі.

Згорбіўся Іван і паціху пасунуўся да сваёй хаціны. Баіцца ўжо і ў хату ўваходзіць, бо там жа жонка пачне распытваць, што да чаго. Ды тая неўзабаве і сама выйшла на падвор'е.

— Што здарылася, Іванка? — звярнулася яна да

мужа, убачыўшы яго засмучоны твар.— Раскажы, што яшчэ прыключылася?

— Хадзіў да Сцяпана, каня прасіў, каб дроў крыху з лесу прывезці, ламачча якога назбіраць. Але ён мяне і ў хату не пусціў, не тое што коніка даў.

— Не ўбівайся надта, Іванка, не трэба. Ідзі сам у лес, а потым і я з дзецьмі прыйду, то што-небудзь на сабе і прынясём... Не хвалюйся надта, і так нам усялякіх бядот хапае, а тут яшчэ такія дробязі ў галаву браць.

Паслухаўся Іван жонку, супакоіўся крыху і папраставаў у лес. Ідзе сабе, а ўсё роўна думае пра лёс свой гаротны, пра тое, што нічога не атрымліваецца, як хацелася б. Прыйшоў і давай ламачча-суччa ўсялякае збіраць, бо на плячах жа надта цяжкае не панясеш. Так пaціху і забыўся пра нягоды, толькі стукае сякерай, стукае ды далей адыходзіць. Сеў адпачыць, ды ці то згрызоты адолелі, ці паклаў недзе і забыўся, але згубіў свой самы каштоўны набытак — сякеру. Туды кінуўся, сюды — няма, ён ужо і мох давай разграбаць, і на пні бліжэйшыя заглядваць, нават уверх галаву задзіраў, быццам бы сякера сама па сабе магла наверх забрацца. Не было яе нідзе. Зусім настрой у Івана прапаў. Сеў ён на пень, абхапіў галаву рукамі і заплакаў. Плача і прымаўляе, нібы жанчына:

— Ой, Божачка! За што ж мне аднаму такое гора выпадае? За што? Ці то я ўжо такі нешчаслівы нарадзіўся, ці то ўжо зусім ніякага права на шчасце не маю? Чаго гэтак не толькі я сам пакутую, але і мая жонка, і мае дзеткі маленькія? За што? Адкажы!

Не пачуў гаротны чалавек ніякага адказу, толькі калі ўзняў галаву, то ўбачыў прама перад сабою нейкага дзіўнага маленькага чалавечка. Невысокага расточкам, сівенькага і сухенькага, зусім нібы якое дзіцятка. Ён стаяў і ўважліва глядзеў на Івана, потым азваўся:

— Чаго ты, чалавеча, гэтак убіваешся? Што такое цяжкое ў цябе здарылася, каб гэтак плакаць ды прымаўляць? Скажы мне, то, можа, я чым-небудзь дапамагчы здолею?..

— Ды куды табе, дзядулька? Тут і багаты не дапаможа, не тое што ты. Сам жа, відаць, таксама не надта заможна жывеш?

— Скажы, табе і на душы лягчэй стане, і, можа, сапраўды чым дапамагу...

Падумаў-падумаў Іван і расказаў пра сваю гарот-

ную жытку, пра тое, як нават у самыя вялікія святы яму цяжка было. Што родны брат і той ад яго адмовіўся, мала таго, яшчэ і насміхаецца. А вось сёння, у гэтым лесе, здарылася самае вялікае няшчасце — згубіў сякеру, самы каштоўны свой набытак, які да яго ад бацькі-нябожчыка перайшоў.

Дзядулька слухаў, не перабіваючы, а потым, нічога не гаворачы, паціху ўстаў і пайшоў. Іван падумаў, што ён ужо болей і не вернецца, але стары неўзабаве зноў падышоў да яго і, працягваючы рукі, спытаўся:

— Твая гэта сякера?

Глянуў небарака і бачыць: дзіўны стары трымае ў руках залатую сякеру.

— Не,— гаворыць,— не мая. Мая не такая была...

Тады стары другі раз рукі працягвае і кажа:

— А гэта твая ці не? — і ў руках ужо сярэбраная сякера блішчыць.

Але і тут Іван катэгарычна адказаў:

— Не, і гэта не мая сякера. Мая зусім не такая была.

Старэча трэці раз рукі паказвае і пытаецца:

— А можа, чалавеча, гэта твая сякера і ёсць?

Без асаблівых спадзяванняў зірнуў Іван на старога і ажно... засмяяўся:

— Ой, дзядулька, родненькі, дык гэта ж і ёсць тая самая мая сякера, якую я сёння ў лесе згубіў.

Сказаў так, а брацъ баіцца. Стаіць і з нагі на нагу нерашуча пераступае. Убачыў гэта стары і гаворыць:

— Выпрабоўваў я цябе, чалавеча, але бачу, што ўсё мне шчыра распавёў, і не зайздросны ты. Таму вяртаю тваю сякеру. Але не такую, як была раней. Ёй надам я такія цудадзейныя магчымасці, што яна будзе табе заўсёды дапамагаць у будзённым жыцці, і цяпер ты назаўсёды пазбавішся галечы і бядоты. Калі нешта трэба будзе, то стукні пару разоў сякерай аб калоду, і ўсё само па сабе адразу ж з'явіцца.

Сказаў так стары і знік раптоўна, нібы яго і не было ўвогуле. Пачаў азірацца Іван, ды дзе ты там знойдзеш чалавека, які ўсё жыццё пражыў у лесе, ён нібы растварыўся сярод лістоты ды кустоўя. Тады вырашыў малодшы брат праверыць, ці ж праўду яму сказаў дзядулька. Стукнуў сякерай аб пень і кажа:

— Хачу, каб конік з'явіўся з возам ды дровы самі на яго пакладаліся, і не абы-якія, а дубовыя!

Не паспеў і вокам міргнуць, як прама перад ім

паўстаў вараны конь. Такі прыгожы, здаровы, што не адзін, а два вазы зараз пацягне.

З таго самага дня і пачалося ўзбагачэнне сям'і Івана. З кожным часам нешта прыбаўлялася. Але малодшы брат быў кемлівым, надта многа не прасіў, каб той старэча не перадумаў, не абвінаваціў яго ў сквапнасці і не забраў цудадзейную сякеру. Вось выйдзе ранiцай з новай ужо хаціны, пару разоў ціхенька стукне сякерай аб калоду і папросіць нешта неабходнае, але не болей.

Багатаму ж карцела даведацца, як гэта бедняку ўдалося ўзбагаціцца, ды той і гаварыць не жадаў адносна ўсяго гэтага, не забываўся пра ранейшую сваю жытку. Толькі калі старэйшы ўжо надта надакучваў, ён, пасміхаючыся, адказваў:

— А ты што, браце, думаў, што толькі ты будзеш багацейшым? Як бачыш, і мне пашанцавала. Цяпер і я стаў зусім іншы, можна сказаць, вялікшы за цябе...

Потым браты сталі жыць паасобку, бо Іван не хацеў жыць побач са сквапным братам. Таму ён пайшоў на выселкі, а месца тое людзі Вялічкавічамі назвалі, ад таго насмешлівага адказу Івана свайму брату.

## ГОЦК

Калісьці, даўным-даўно, ніхто ўжо не можа сказаць дакладна, колькі соцен гадоў таму назад, калі яшчэ русалкі спакойна жылі побач з людзьмі, жыхары вёскі злавілі ў адным недалёкім лясочку ля балота нейкую дзіўную істоту. Такога стварэння раней яшчэ ніхто не сустракаў. Глядзелі ўсе і гадалі, што ж за дзіва такое ім пашчасціла вылавіць. Самых старых ды спрактыкаваных, жыццём умудроных вяскоўцаў паклікалі. Прыйшлі тыя і ажно раты ад здзіўлення паразяўлялі, бо і ім не выпадала такі цуд бачыць, не тое што злавіць. Тады самы даўні дзядулька ўстаў, прыжмурыў вочы і прамовіў:

— А мае ж вы дзеткі! Думаю, што гэта не птушка, але і не звер. Пачвара нейкая, дый годзе! Каб ліха якога на наша паселішча пасля ўсяго гэтага не было... Глядзіце, бо самі ведаеце, звязацца з нячыстай проста, але вось развязацца не надта. Тады ўсе паскачам... Ад птушкі, бачыце, хвост... Але ж гляньце, якія лапiшчы...

— Можа, які пераўвасоблены нячысцік і ёсць на самай справе,— азваўся нехта палахліва.— Тады ўжо будзе нам! Тады ўжо нікога гора-бяда не міне, бо гэта ж для іх (нячысцікаў) такая вялікая абраза... Трэба выкінуць як мага хутчэй, каб не паспелі спахапіцца астатнія вадзянікі ды лесавікі.

— А можа, гэта і не вадзянік, і не лесавік, а нешта зусім іншае? — пачуўся спакойны голас.— Жывёліна якая, раней намі не сустракаемая? Хто скажа, што не так? Мала чаго ў нашых лясах ды балотах водзіцца? І дзе гарантыя, што ўсе мясціны людзі аблазілі, што ўсіх жывых істот на свае вочы бачылі? Можа, і палохацца надта не трэба. Можа, усё спакойна будзе. Здзекавацца ж не здзекуемся, толькі стаім ды глядзім, раімся во пакрыху...

— Раіцца-то раімся, але нешта трэба прыдумаць, каб адгадаць усё ж, якая істота гэтак нас зачаравала, бо да ночы прастаім, а так і не здагадаемся...

Навокал, нібы здзекуючыся з дарослых, голасна зарагаталі шматлікія дзеці. Гэта яшчэ болей раззлавала людзей. Таму не дзіва, што пачуліся гучныя галасы:

— А вас якія чэрці сюды прыгналі? Што, вам няма дзе болей час бавіць? Уцякайце, пакуль дзягай не адхадзілі, бо тады не рагатаць давядзецца, а плакаць! А ну прэч адсюль!

Але дзяцей асабліва ўпрошваць і не трэба было, бо яны выдатна ведалі, што, калі ў дарослых нешта не атрымліваецца, тыя абавязкова будуць шукаць вінаватых, і крайнімі, як заўсёды, акажуцца ці дзеці, ці жанчыны. Таму толькі пяткі патрэсканыя замільгацелі на сонцы, гэтак дружна забілі нагамі па пыльнай сцяжынцы малыя, і толькі адбегшыся на небяспечную адлегласць, далі волю сваім пачуццям, і адтуль ужо неслася:

— Дзядзечка, га, дзядзечка, а вы ёй зазірніце пад спадніцу, то, можа, усе пытанні самі па сабе адпадуць! Тады і не трэба будзе варажыць, хто перад вамі!

У адказ раздаўся дружны рогат і дарослых, і дзяцей. Потым нехта, нібы ўдакладняючы, прамовіў:

— А можа, гэта Саніха?.. Яна таксама па паўгода не ўмываецца. І з выгляду падобна (была такая жанчына ў іхняй вёсцы, і жыла яна на самым водшыбе, пастаянна была на языку ў сялян з-за неахайнасці і сварлівага характару), і ростам падыходзіць...

Зноў рагаталі ўсе доўга, зацяжна, выціраючы слёзы,

калоцячы адзін аднаго ў плечукі і спіны, прымаўляючы пры гэтым:

— А каб жа вы спрахлі!

— Каб вам добра заўсёды было!

— Гэта ж трэба — гэтак развесялілі!

— Цяпер і спаць, браточкі, спакойна не будзеш, калі пра ўсё гэта прыгадаеш!

— Ды каб вам да самай старасці гэткімі вясёлымі быць! Гіцлі вы басаногія!

— Насмяшылі дык насмяшылі, нібы вадой цудадзейнай аблілі, і стома ўся з плячэй адразу спала!

Паступова смех супакоіўся, і зноў мужчыны прызадумаліся, што ж ім рабіць далей з дзіўнай істотай, злоўленай у ляску. Нічога ў галовы сялянскія не лезла, пакуль нехта не запрапанаваў:

— Усё, родненькія, добра, што добра канчаецца, але калі наш пан даведаецца пра гэта, то скуры з жывых паспускае. Хіба ж вы не ведаеце, ні разу не чулі ягоных загадаў адносна таго, што, калі хто што знойдзе на ягонай зямлі, адразу трэба цягнуць да палаца. Там усё і будзе вырашацца ў прысутнасці самога памешчыка. Інакш ён можа абвінаваціць нас у тым, што мы прысвоілі нешта ягонае. Тут ужо не да смеху будзе, калі паплікі па спінах запалыскаюць! А слугі панскія на такую рэч надта здатныя...

— А ты што гэтак упэўнена гаворыш, мабыць, паспрабаваў? — хутчэй па інерцыі, чым спецыяльна, запытаўся нехта з малодшых вяскоўцаў.

— Чаму ж не? Даводзілася... Каб табе такое шчасце не выпадала. Мала ва ўсім гэтым радаснага і вясёлага, ляжыш потым нерухома, можа, з тыдзень ці два...

— Кіньце вы, знайшлі калі і над чым жартаваць. Тут сапраўды трэба да памешчыка кіраваць,— азваўся нечы гучны голас.

Пастаялі ў нерашучасці яшчэ хвілін колькі вяскоўцы, і потым самы стары з іх прамовіў:

— Гэтым мы з вамі, людцы, ужо не нажывёмся. Усё роўна ж трэба ісці, то і гэтыя дзве-тры хвіліны, якія мы тут пастаім, нам не надта дапамогуць, толькі яшчэ болей напеによる нахвалюемся. Пайшлі хіба ўжо. Можа, і абыдзецца. Можа, лупцоўкі памешчык і не задасць. А то ўсе адразу спалохаліся за свае спіны. Хіба ім мала перападала? Дый не ўкралі мы нічога, а толькі, скажам, выпадкова нешта знайшлі, да-

кладней — злавілі, калі па пільнай патрэбе ў тым ляску былі. Пайшлі, людцы, бо і ноч нас тут прыспее.

Пачухаліся сяляне і без асаблівага жадання памкнуліся да палаца. Ідуць і ўвесь час азіраюцца на дзіўнае стварэнне. А яго двое найбольш дужых мужчын, ухапіўшы моцна пад лапы-крылы, валакуць ды гідліва ўбакі твары свае адварочваюць. Ведама ж, каму ахвота за гэткую пачвару рукамі трымацца?

А тая істота вочы вялізныя, акруглыя вылупіла (здаецца, яшчэ хвіліна-другая — і ўвогуле павылазяць) і глядзіць перад сабою нерухома. Крылы-лапы вісяць амаль да самае зямлі, ногі з аграмаднымі даўжэзнымі кіпцямі неяк зусім нязграбна ледзьве па сцяжынцы перасоўвае. Ужо некаторыя пачалі нават злавацца:

— Чаго гэта яна ледзьве сунецца? Урэжце ёй там якім цурбалкам пару разоў па спіне, тады яна добра ўведае, як хутчэй праставаць, а то што якую пані пад белыя ручкі валачом, ды і слова лішняе сказаць баімся! Лупяніце разоў колькі, пабачыце, як дапаможа!

Спадзяваліся, што дапаможа, але яшчэ большага клопату сабе нарабілі, бо калі каваль, які трымаў тую істоту за правую лапу-крыло, трэснуў яе лазінай, то яна гэтак заверашчала, што ўсім, хто бліжэй быў, вушы заклала. Як пачала трэсціся, як пачала раўці, дык ледзьве супакоілася. Болей цуд той не білі, але калі выйшлі на дарогу, якая вяла прама да палаца, нехта з сялян нерашуча запрапанаваў:

— А што ж гэта мы, браткі, вядзём яе да нашага памешчыка ў гэткім жахлівым выглядзе? Пан нас па галовах за такое не пагладзіць! Трэба было б хоць неяк апрануць яе ды на ногі якія лапці ўшчаміць, тады яна і не такая страшная будзе, і пан пабачыць, што мы з яе не здзекаваліся...

Пераглянуліся мужчыны — праўду гаворыць чалавек. Прыпыніліся. Найбольш жвавых паслалі ў вёску, каб якія транты там прыхапілі ды лапці дзе-небудзь вялікія знайшлі, бо на такія лапы добрыя лыжы трэба. Амаль гадзіну гэта ў іх заняло, а калі ўсё зрабілі ды зірнулі, то так і пакаціліся па зямлі. Цяпер перад імі стаяла самая сапраўдная пачвара. Відаць, каб і балотным жыхарам яе зараз паказаў, то яны ўцякалі б, як ашпараныя кіпнем.

Калі нарэшце падышлі да палаца, то на зямлю ўжо апускаўся змрок. Перастрэлі іх слугі і пытаюцца:

— Чаго гэта вы ў такі позні час да пана прэцеся?

— Патрэбу пільную маем,— кажуць сяляне, а самі не гавораць праўду.

Далажылі пану, што вяскоўцы нейкі цуд прывялі. Памешчык якраз са сваімі суседзямі ў карты рэзаўся, таму без асаблівай ахвоты пайшоў глянуць. Госці ўвязаліся за ім. Паказалі сяляне памешчыку тую пачвару. Як закрычыць ён з перапуду, як піскне тоненькім голасам, ды уцякаць, астатнія — за ім! Мужыкі ў другі бок паімчалі, а цуд той пастаяў, пакруціўся ды як джгане прама па балоту. Ляціць, нібы на крылах, толькі лапці тыя вялізныя па вадзе ды па дрыгве ляскочуць: «Гоц, гоц, гоц!» Так і ўзнікла назва той мясціне, на якой з цягам часу пасяліліся палешукі. Доўгі час яны не ведалі, што гэта была не пачвара, не цудоўная істота, а самая звычайная сава, толькі вялізных памераў. Вось так і выйшла — Гоцк, так і да нашага часу засталося, нічога не перайначылася.

## РАМАНАЎКА

Жыў у нас некалі ў старадаўнія гады адзін дзед, і звалі яго Раманам. Працавіты быў чалавек, гора ў маладосці многа зведаў, цягнуў на сваіх плячах усю працу, не разгінаўся ні днём, ні ноччу, таму і выбіўся неяк у людзі. Усяго ў яго стала хапаць: хлеб быў і да хлеба таксама. Сваім суседзям ды сялянам іншым ніколі ў дапамозе не адмаўляў, не мог многа даць, то хоць крыху пазычаў ці даваў назаўсёды за так. За гэта яго ўсе і паважалі, віталіся з ім ласкава, распытвалі пра жыццё-быццё пры сустрэчах, і калі трэба было, то прыходзілі ўсе дружна і да яго на падвор'е шчыраваць.

Але з жонкай Раману не пашанцавала. Такая ўжо лянотная ды сварлівая жанчына была, што даруй Божа з ёю лішні раз сутыкнуцца. Нават разбірацца не будзе, чый ты, ці вінаваты ты ці не, адразу кінецца сварыцца ці з праклёнамі злоснымі ўсхопіцца. Уцякаюць людзі і самі не рады, што напаткалі такую бабу. З-за ліхога нораву вяскоўцы амаль не звярталіся да яе, нават па імені рэдка калі звалі, а падыходзілі, калі надаралася пільная патрэба, да плота ці да падвор'я і казалі першымі, каб гаспадыня не пераняла:

— Раманіха, пакліч Рамана, справа ў нас да яго.

Ды не зіркай па баках, бо адкладу яна не трывае. Хутчэй давай...

Баялася жанчына гаспадара. Біць ён яе ніколі не біў, пастаянна толькі пагражаў:

— Чакай жа, выведзеш калі-небудзь мяне з цярпення, то я табе зраблю! Доўга будзеш памятаць той урок! Ніколі яго не забудзеш! А то рабіць дык нічога не ўмееш і не хочаш, а языком мянташыць дзень і ноч гатова, людзей граззю абліваць табе не прызвычайвацца! Ой, дачакаешся!

Дамовіцца Раман з людзьмі, што да чаго, і тыя дамоў пакіруюць, а ён да сябе ў хаціну. Баба ж толькі радуецца, што так добра для яе ўсё скончылася. Потым яна і ўвогуле перастала звяртаць увагу на мужавы пагрозы. Падумалася ёй, што гаспадар жартуе, і не болей таго. Ён гаворыць, а Раманіха толькі пасміхваецца ў адказ.

Аднаго разу муж і кажа, звяртаючыся да жонкі:

— Чаго гэта ты сядзіш толькі, а нічога ўжо ўвогуле не робіш? У суседзяў учора быў, то там жанчыны напралі столькі, што на два гады хопіць, а ты і не бралася. Хіба ж так можна?

Але тая, пацягнуўшыся, з'едліва адказала:

— Табе, чалавеча, трэба, то ты і прадзі, а ў мяне з вачыма нешта зрабілася — не бачу добра. Таму і прасці не маю магчымасці.

Праглынуў дзед абразу і далей працягвае:

— Глядзі, жанчына, каб гэта бокам табе не вылезла...

— Не палохай!

— Вось даскачашся, калі Мікалай Угоднік будзе хадзіць па хатах і пачынак глядзець! Будзе тады табе прыкурыць, ды нічога ўжо не выправіш!

Ляснуў дзвярамі чалавек і пайшоў з хаты, а сам усё думае, як жа яму бабу ад ляноты адвучыць. Хадзіў, хадзіў па вуліцы, па ніве і надумаў вось што.

Перад самым святам Мікалая Угодніка насыпаў у дзесяць мяхоў жыта і павёз на млын малоць. А калі на млын выбіраліся, то маглі там не толькі дзень, але і ноч прабыць, бо чэргі вялікія былі, асабліва калі ў вёсках работы важнай неставала і людзі былі крыху вальнейшымі. Вось і на гэты раз Раман, звяртаючыся да гаспадыні, сказаў:

— Паеду я, жонка, на млын, а ты глядзі, пачынай

працці, пакуль не позна, бо мы і ведаць не будзем, калі Мікола Угоднік прыйдзе.

Сабраўся і паехаў з двара, а баба выйшла за вароты, паглядзела ўслед, вярнулася ў хату ды спаць сабе завалілася. Ляжыць, храпе, ажно вуглы, здаецца, праз якую хвіліну параскочваюцца. А дзед управіўся на млыне за дзень і на ноч дамоў сабраўся. Прыехаў да двара, бачыць — не гарыць лучына, у акенцы няма святла, значыцца, спіць, як і раней, яго гаспадыня, ні пра што асабліва не дбаючы. Не доўга думаючы, развязаў адзін з мяхоў, вымазаўся добра мукою, галаву старанна абсыпаў, бараду — таксама. Падышоў да сцяны хаты і ў акяніцу грукоча. А баба перапалохалася, крычыць:

— Каму гэта там рабіць няма чаго? Хто гэта там так грукоча? Вось як ухаплю рагач, то будзе ўжо табе!

А Раман падробленым голасам адказвае:

— Не палохай мяне, дурніца, бо я не абы-хто, а сам Мікола Угоднік! Прыйшоў я з пільнай патрэбай, хаджу па хатах і гляджу, колькі якая гаспадыня пачынка напрала! Цяпер твая чарга надышла! Адчыняй хутчэй, не злуй мяне без дай прычыны, бо як разыдуся, то не паздаровіцца табе!

Зусім зніякавела Раманіха, але выгляду не падае. Колькі хвілін пастаяла, і падумалася ёй, што ў цемры Міколу Угодніка проста ашукае. Падышла да дзвярэй, адчыніла іх і ў хату ласкавым голасам запрашае:

— Заходзьце, чаго вы там стаіце? Заходзьце, зараз я вам усё пакажу. Проста я сёння надта змарылася, дапазна прала, ды вочы рэзаць пачалі, тады толькі спаць лягла. Заходзьце...

За стол запрашае, але Мікола не ідзе, маўляў, паказвай, дый годзе, пачынак. Баба павяла яго ў клець, дзе было ўсё самае каштоўнае. Там, у куце, стаяў кубел, і ў кубле ляжаў усяго адзіны пачынак, бо болей жа не наткала. Стала, засланяючы агеньчык, і дастае той пачынак.

— Во,— гаворыць,— адзін...

Потым паклала яго на месца і зноў дастала.

— Во,— кажа,— другі...

Зноў засунула ў кубел і праз хвіліну выцягнула назад:

— А во і яшчэ адзін, ды такі таўшчэразны...

А правяральшчык стаіць побач і робіць выгляд, што ўважліва слухае і пільна глядзіць. Потым ціхенька гэтак кажа:

— Дай, гаспадынька, я хоць адным вокам, адзін раз, але сам у твой кубел зазірну, бо так многа ты зрабіла, што мне і не верыцца. Калі сапраўды столькі напрала, то шчыра ўзнагароджу, ну а калі... то сама тады на сябе крыўдуй.

Адпіхнуў Раманіху і шась да кубла, а там, вядома ж, нічога, акрамя аднаго пачынка, і няма. Усхапіўся тады правяраючы:

— Я цябе, старая, папярэджваў?! Папярэджваў! А цяпер табе будзе мая адплата! Цяпер ужо трымайся!

Як усхапіўся пугай гаспадыню абходжваць, то тая нават пакручвацца не паспявала. А ён дубасіць і ўсё прымаўляе:

— Гэта табе за тваё непаслухмянства! Гэта табе за твае кпіны! Гэта табе за ляноту і згрызоту! А гэта за тое, каб да канца жыцця запамятала! Будзеш ведаць, як гаспадара свайго не слухацца, як ляжаць лежнем, калі астатнія шчыруюць! Каб добра запамятала!

Так адлупцаваў старую правяраючы, што месца жывога на ёй не засталося, ды і наказаў яшчэ:

— Зараз спаць не кладзіся, а садзіся ды прадзі, наганяй тое, што прапусціла!

Выскачыў дзед з хаціны і, пасміхваючыся, давай ад мукі абівацца. Пачакаў, можа, з гадзіну якую (пакуль жа там мяхі згрузіў ды коніка распрог і да месца паставіў), адчыняе дзверы і, нібы здзіўлены незвычайна, гаворыць:

— А што ж гэта ты, гаспадыня мая, не спіш? Што гэта з табою сёння такое здарылася? Ці, можа, ты крыху пераспала ды ўсхапілася ўжо?

А Раманіха адказвае, слязьмі заліваючыся:

— Ой, дзедка, каб ты толькі ведаў, што са мною сёння здарылася! Прыходзіў пасля апоўначы, Мікола Угоднік пачынак глядзець... Сам ведаеш, у мяне ж толькі адзін сувой палатна быў, дык ён збіў тады на горкі яблык і пайшоў, паабяцаў дзён праз колькі назад вярнуцца, зноў праверыць... Таму нельга мне час дарма бавіць. Вось і сяджу ўсю ночку, праду ды слязьмі заліваюся.

— А я табе, старая, што пастаянна даводзіў? Ты ж мяне не слухалася, яшчэ і насміхалася. Бачыш, чым справа скончылася? Цяпер будзеш ведаць, што толькі сама ва ўсім вінавата. Калі б слухалася, то хіба да такога дапусцілася б?

— Ой, не кажы, мужу. Я ж усё думала, што ты мяне проста палохаеш. Таму і не надта слухалася, чакала, каб толькі ты за дзверы, то спаць ці проста паляжаць клалася. Цяпер так не буду болей ніколі рабіць...

З тае ночы Раманіха зрабілася зусім іншай жанчынай: ласкавай, спагадлівай, ні з кім не спрачалася, бо толькі паспрабуе крыкнуць, а дзед супыняе:

— Глядзі, старая, зноў Мікола пакарае, але на гэты раз не за ляноту, а за язык адлупцуе. Раманіха адразу і заціхала, бо добра памятала той начны ўрок.

Да скону свайго жыцця мірна-дружна пражылі яны паміж сабою. Калі памерлі, то вёску людзі ад імя таго добрага чалавека і назвалі — Раманаўкай. Не Раманіхай, бо не маглі забыцца пра тое, якой жанчына раней была, а менавіта Раманаўкай.

## РОЖАН

Дзіўная гісторыя тут адбылася, на казку падобная, займальная. З задавальненнем перакажу, каб і вам тая даўняя памяць засталася, бо яшчэ дзесятак-другі гадоў, і ніхто болей яе ведаць не будзе: старыя памруць, а маладыя самі ж не выдумаюць.

Жыла тут у старадаўнія гады сівая бабуля. Такая ўжо старая, што, можа, і не памятала добра, колькі ёй гадоў на самай справе. А што? І такое магло быць. Ці ж кожны раней іх дзесяткамі лічыў. Ведаў, калі на свет з'явіўся, і ўсё на тым. На такія дробязі надта не разменьваліся. Звалі яе Тэкляй. Нічога па гаспадарцы тая бабулька ўжо рабіць не магла. Сілы неставала, кемлівасці ды розуму таксама. Здзяцінілася яна, даруй мне, Божа, такое слова. Самі ведаеце, як гэта здараецца: пачынае чалавек абы-што гаварыць, выкідваць усялякія конікі, нельга яго аднаго пакінуць у хаце, бо можа і запаліць, і забіць каго-небудзь. А да адказу яго ж не прыцягнеш. Паглядзяць усе і скажуць: «Што ж ты хочаш, калі ён на галаву слабы? Глядзець трэба было!»

Гэтая Тэкля, праўда, нічога такога страшнага не выкідвала, нічога паганага не рабіла. Сядзела сабе ціхенька ў куце, за печчу, ды дзіцячыя песні выдумляла і сама ж іх спявала. Прыйдуць усе дахаты, збяруцца за сталом вячэраць, то і яна да сваіх дзяцей есці садзіцца і давай ім свае гісторыі ды прымхі распавядаць. Малодшыя ўжо ведаюць, што да чаго, таму, толькі

Тэкля засмяецца, і яны тады рагочуць, а калі яна спахмурнее, то і яны хліпчуць насамі, абы толькі ў хаце ціха было ды старая чым іншым не займалася. Але як ні сцерагліся, як ні берагліся, аднаго разу бабуля іхняя усё ж штуку выкінула, ды такую, што на многія стагоддзі ў памяці вяскоўцаў засталася.

Прыйшлі неяк дамоў усе дарослыя, і дзеці сабраліся. Вячэраць думалі ды спаць класціся, бо цэлы дзень на ніве жалі, натаміліся страшэнна, а назаўтра ж зноў трэба было на тое самае месца кіраваць. Ледзьве ногі валочаць, а тут ужо Тэкля са сваімі гісторыямі за стол лезе. Трывалі яны, трывалі, а потым старэйшы самы сын і гаворыць:

— Эх, маці-маці, і трэба ж гэта, каб так Бог даў, што на старасці гадоў ты такой дурніцай будзеш! Нам спаць час класціся, бо вочы ад стомы зліпаюцца, а табе пасмяяцца-пахіхікаць ахвота.

— Што ты такое вярзеш, дурань! — накінулася на сына Тэкля.— Хіба ж я старая, хіба ж мне многа гадоў?! Аддавайце мяне замуж!

Пачалі хатнія на гаспадара крычаць, але Тэкля і чуць нічога іншага не жадае:

— Аддавайце мяне замуж! І не цягніце надта, бо пастарэю!

Упрошвалі яе і так, малілі яе і гэтак, але яна не саступала. Тады паабяцалі яе аддаць замуж у святую нядзельку, калі ўсе адпачываць будуць, бо зараз працы многа, ды і вопратку маладой жа пашыць трэба, пасаг сабраць. На тым і разышліся: Тэкля палезла ў свой кут, за печ, а астатнія спаць, нібы снапы, паваліліся.

Запрацаваліся людзі дый забыліся на тое, што старой абяцалі, а яна хоць і здзяцінілася, але не забыла нічога, усё добра памятала. Надышла нядзелька, апрануліся ўсе па-святочнаму, і Тэкля з кута, хіхікаючы, вылазіць ды свайму старэйшаму сыну гаворыць:

— Ну, то калі вы мяне павезяцё?

— Куды? — не адразу зразумеў той.

— Як куды? Замуж аддаваць!

Тут ва ўсіх прысутных дух у грудзях і перахапіла. Што яны забылі, тое старая не забыла. Але раз паабяцалі, то трэба выконваць. Раней, бачыце, надта волю бацькоў выконвалі, прытрымліваліся яе, не тое што ў нашы дні, калі старых і за людзей не лічаць.

Вяскоўцы ведалі, што маці іхняя хворая, і таму не надта здзівіліся, калі ўбачылі на вуліцы дзіўны святоч-

ны поезд, а ў фурманцы — упрыгожаную Тэклю, якая спявала-выла якуюсьці, толькі ёй адной зразумелую, песню. Фурманку вёз не конь, пабаяліся родныя, што жывёліна можа перапалохацца і панесці, таму самі ўпрэгліся ў аглоблі. Цягнуць, не спяшаючыся, а маці спявае сабе ды на людзей пазірае, якія дзеля святой нядзелькі ўсе на прызбах сядзелі, апошнімі навінамі дзяліліся. Некаторыя не стрымліваліся і шапталі паміж сабою:

— Ой, Божачка, можа, і нас такі лёс чакае... Чаго толькі ў белым свеце не здараецца... І не схаваешся ад такога нікуды...

Павазілі Тэклю сыны ды дочкі, павазілі, наспявалася яна, нагарлалася песень святочных і стамілася моцна. Таму, як толькі прывезлі яе дахаты, то яна звалілася спаць, нават за стол вясельны не села. Дзеці ўжо на пальчыках хадзілі, каб яе не разбудзіць, баяліся, што яшчэ чаго-небудзь дастаць ці прынесці загадае. Так той дзень і прайшоў незаўважна.

А з раніцы наступнага дня Тэкля пачала паводзіць сябе зусім па-іншаму. Не паспела вочы прадраць, падалося, мабыць, ёй, што яна маладой зноўку стала, і давай завіхацца па гаспадарцы. Ходзіць па хаце, па падвор'і, дапамагаць імкнецца, і што самае галоўнае — нічога благога не робіць, а ўсё так даводзіць, як і на самай справе трэба было б зрабіць. Нявесткі спачатку прасілі, каб ішла ды адпачывала, але калі ўбачылі, што ў старой усё добра атрымліваецца, то нічога супраць дапамогі не мелі. Жывёлу ў поле выгналі, і сталі маладзейшыя самі збірацца на працу. Тэкля ім і гаворыць:

— Ідзіце сабе, не перажывайце, я ўсё зраблю як нельга лепей... Дагледжу ўсё і апрацую... Не сумнявайцеся...

Пераглянуліся хатнія, але што зробіш? Дома сядзець усё роўна не станеш, калі ўся вёска ў поле пакіруе. Дзень упусціш — потым год шкадаваць будзеш.

— Добра, маці. Мы пойдзем, а ты ўжо глядзі за ўсім тут...

— Якая я вам маці, калі я толькі замуж выйшла? Вы самі старэйшыя за мяне,— абурылася Тэкля.

Нічога не адказалі на гэта дзеці, моўчкі сабраліся і пакіравалі на працу.

Старая пасядзела колькі часу ў хаце і, прыбраўшы са стала ды падмёўшы падлогу, пачала шукаць сабе іншую працу якую. Заўважыла нарэшце, што вады ў

вядзерцы зусім няма. Вырашыла пайсці да студні і прынесці свежай. Хоць і мроілася ёй, што яна маладая, але хадзіць усё ж цяжка было. Таму ўзяла з кута ражон і пайшла, на яго абапіраючыся праз крок-другі. Пакуль прыпхалася да студні, то і стамілася. Вадзіцы набрала поўнае вядзерца, і захацелася ёй адпачыць. Прысела на край зруба і... дзіва нечуванае — прама пад нагамі ўбачыла скураную калітў. Ды такую пукатую, поўную, што здавалася, зараз парвецца прама на вачах. Азірнулася Тэкля туды-сюды, нікога паблізу не ўбачыла і ўхапіла каліту. Вядома ж, не ўтрымалася, адкрыла яе і зазірнула ў сярэдзіну. Сапраўды, каліта аказалася поўнай грошай. Старая радасна заўсміхалася. І вось тут ужо, нібы на самай справе маладая, з вядзерцам у адной руцэ, з ражном у другой пакіравала дамоў. Ідзе сабе і ўвесь час азіраецца (баялася, мабыць, каб хто не ўбачыў, як яна каліту знайшла і з зямлі падняла).

Вечарам сабраліся ўсе хатнія дома, селі за стол і сталі клікаць маці, а тая не надта спяшаецца. Потым падышла да родных і гаворыць:

— Пакуль вы на ніве шчыравалі, мне пасаг мой перадалі,— сказала так і паказвае каліту, поўную грошай. Родныя раты разявілі, а старая не супакойваецца: — Каб не мой ражон, то і не знайшла б нічога. Ты мне, сынок, яго таксама аддай. Ды хаціну мне асобную пабудуйце, я ў ёй жыць адна буду. Не бойцеся, дагляджу сябе, і падвор'е ў парадку будзе, не стануць людзі смяяцца, а калі што якое, то і дапаможаце... Вы ж тут не надта далёка будзеце...

Як сказала Тэкля ў той вечар, так і прымусіла сваіх сыноў выканаць усё. Вывела іх на чыстае поле, торкнула ражном і прамовіла:

— Вось тут і стане назаўсёды мой ражон! Будуйце тут! Тут пачну жыць!

Праз дзесяткі гадоў іншыя людзі вакол яе падвор'я сталі сяліцца, і вёска новая паступова ўтварылася. Назвалі яе Ражном, ці як ужо цяпер — Рожнам.

## СКАЎШЫН

Жылі-былі некалі ў сівыя стагоддзі на гэтай зямлі бацька з маці, і была ў іх адным-адна дачка, ды такая прыгожая, такая вясёлая, што пашукаць не адзін дзень

трэба было, каб падобную знайсці. Звалі таго бацьку Скавыш, а дачку ягоную — Насткай. Простыя імёны, якіх сотні тысяч сустракаліся даўней. Збіраліся да Насткі сяброўкі, песні голасна спявалі, таньчылі ці танкі вадзілі, і старэйшым ля іх весялей жылося. Ды аднаго разу здарылася жудасная гісторыя, ледзьве дзяўчыну нашу ў магілу заўчасна не звяла.

Аднаго разу, на нейкія там святы, бацькі Настчыны задумалі паехаць у госці да родных, якія жылі ў далёкай вёсцы. Хацелі і дачку з сабою узяць, але яна адмовілася, спаслалася на тое, што да яе павінны ў хуткім часе прыйсці сяброўкі, з якімі яна дамаўлялася сустрэцца. Бацькі паглядзелі, што такая справа, і гаворыць Скавыш:

— Добра, тады заставайся, ды толькі, Настка, за гаспадаркай пільна прыглядай, каб нічога не здарылася. А мы доўга там не будзем, да заўтрашняга вечара дамоў абавязкова вернемся.

— Што вы, тата,— адказвае дачка,— хіба ж мне першы раз такое? Вы мяне яшчэ і падвучваеце. Не хвалюйцеся, усё дагледжу. Едзьце сабе спакойна, сяткуйце з роднымі ды прывітанне ад мяне абавязкова перадайце.

Паехалі бацька з матуляй, а Настка адна засталася. Недзе пад полудзень прыйшлі да яе, як і абяцалі, сяброўкі. Самі ведаеце, што калі многа дзяўчат разам збіраецца, то яны такі вэрхал падымуць, што нежывы на ногі ўстане. Так і на гэты раз было. Як усчалі бегаць ды гуляць, то ажно зямля навокал стагнала. Потым нехта выпадкова заўважыў клубы пылу на дарозе і закрычаў:

— Дзяўчаткі! Сюды едуць нейкія вершнікі! Глядзіце!

Усе сцішыліся і сталі ўзірацца. Праз хвілін колькі Настка адчайна прамовіла:

— Дык гэта ж канарэзы! Уцякайце, родненькія, па хатах, пакуль яны сюды не прыспелі, бо будзе нам тады ўсім ліха! Уцякайце, не марудзьце!

Сябровак доўга не трэба было ўпрошваць. Як прыпусцілі, дык за лічаныя хвіліны па хатах разляцеліся, нібы і не было іх тут. Настка таксама ў сваю хаціну забегла і зачынілася з сярэдзіны. А канарэзы тыя пад'ехалі і давай да яе ў акно ламіцца, бо адчувалі, што ў дзверы ўлезці не ўдасца. Толькі дзяўчына не з палахлівых была. Ухапіла бацькоўскую касу, якая вісела

якраз у сенцах, і стаілася ля акна. Тут і галава першага канарэза паказалася. Дык яна — жах касою, і галава гопнулася на падлогу, а тулава на другі бок павалілася. Потым другі галаву прасунуў, і з тым тое ж самае атрымалася. Астатнія пабаяліся пазбавіцца жыцця і адступілі. Некаторы час Настка баялася адчыняць дзверы і выходзіць на вуліцу, бо думала, што канарэзы дзесьці проста пахаваліся і чакаюць зручнага выпадку, каб напасці на яе. Толькі на самай справе ўсё было інакш — зладзеяў нідзе не было, яны паўцякалі. Тады дзяўчына закапала забітых ёю ліхіх людзей і стала чакаць Скавыша з матуляй. Пад вечар і яны з'явіліся. Убачыўшы, што яна нейкая разнерваваная і расхваляваная, бацька запытаўся:

— Можа нехта цябе пакрыўдзіў, Настка?

На што дачка ўпэўнена адказала:

— Няўжо вы думаеце, тата, што я здачы не дам і да мяне лезці кожны стане?

Нораў сваёй дачкі Скавыш ведаў добра, таму і перасталі яе распытваць. Паляглі спаць, каб з раніцы кіравацъ на працу, бо ўжо надыходзіў будзённы дзень.

Ажно прайшло дні чатыры. Настка крыху ўжо супакоілася і стала забывацца пра жахлівую падзею, як на двор да іх уехалі сваты. За жаніха сядзеў адзін з ацалелых у той дзень канарэзаў. Пачалі гаварыць-дамаўляцца. Маці супраць, і ўсё, нібы нажом вострым адрэзала, нешта адчувала, відаць, яе сэрца. Гледзячы на яе, і сам Скавыш сказаў, што не аддасць дачку, але ж Настцы... жаніх надта спадабаўся. Прамовіла яна родным:

— Не перашкаджайце мне, міленькія. Гэта мой лёс такі. Самі ж бачыце, які здаровы ды прыгожы жаніх, а як хораша апрануты. Пайду за яго замуж.

А сваты сядзяць за сталом і запрашаюць Настку прыехаць да іх перад вяселлем у госці. Дарогу, мовяць, яна вельмі проста знойдзе: яны будуць кідаць пасля сябе белыя паперкі ўздоўж каляін, так і будзе відаць, куды кіраваць... Прамовілі гэтак сваты і паехалі сабе дахаты, а дзяўчына ў хуткім часе стала збірацца іх праведаць.

Ідзе яна лесам, полем, пералескамі і бачыць: стаіць дом. Падышла да яго і пастукала ў акяніцу. Выйшла з хаціны старая бабулька. Як убачыла Настку, то ажно рукамі ўспляснула:

— Куды ж гэта ты, дзяўчыначка, кіруеш? Божа,

чаго гэта ты сюды прыйшла і што табе тут трэба? Хіба ж ты не ведаеш, што тут жывуць злыя нелюдзі-канарэзы, а займаюцца яны не тым, што коней хворых ды старых дарэзваюць, а людзей хапаюць і жыццяя пазбаўляюць. На часткі рэжуць, у вялікія бочкі запіхваюць, потым на кірмашах прадаюць, нібы свініну якую ці ялавічыну. Як жа цябе сюды прынесла?

— Яны мяне, бабулька, у госці запрасілі...

— Раз запрасілі і ты паслухалася, то схаваю я цябе, бо надта ты мне спадабалася. Лезь зараз жа ў пограб і сядзі там ціхенька, што б ні здарылася, бо яны хутка павінны дамоў вярнуцца. Тады і пачнуць лютаваць. Толькі не выдай сябе якім крыкам ці стогнам.

Засадзіла старэнькая Настку ў пограб і толькі паспела апусціць за ёю масніцу, як узарвалася цішыня шматкапытным тупатам, і на падвор'і з'явіліся канарэзы. Яны былі вельмі задаволеныя, бо на гэты раз таксама падманам прывялі з сабою надзіва прыгожую дзяўчыну. Зайшлі ў хаціну і адразу ж пачалі галовамі круціць, прынюхвацца:

— Што гэта ў нас тут нейкім вясковым духам цягне? Ці не было каго чужога ў хаце, старая?

— Ды не, людцы, гэта вы пасля паездкі сваёй не адышлі і падаецца вам усё,— адказала старая, баючыся, каб яны болей не прынюхваліся.

Але тыя супакоіліся і ўзяліся за сваю ахвяру. Пакруцілі дзяўчыну перад сабою і заўважылі на яе пальцы прыгожы пярсцёнак. Доўга не вагаючыся, адсеклі яго разам з пальцам, а палец той праваліўся пад масніцу, прама да Насткі. Сядзіць бедная, зубамі ляскоча, але крыкнуць ці на дапамогу каго паклікаць нельга, бо і з ёю такое адразу ж зробяць.

Канарэзы давай той палец шукаць, але нідзе яго няма. Тады старая гаспадыня адчула, што могуць масніцы падняць, дый гаворыць на іх:

— Едзьце вы сабе далей, а я тым часам сама знайду і для вас захаваю.

— Ну глядзі,— адказваюць злыдні,— калі падманеш, то і табе кара суровая будзе. Нікуды ад нас не схаваешся!

Прыпалохалі бабульку, пасеклі прыгажуню-дзяўчыну на дробныя кавалкі, кінулі цела ў бочку і паехалі сабе, песні гарлаючы, далей.

Узняла бабка масніцу і да Насткі звяртаецца:

— Уцякай, унучка, хутчэй адсюль, бо яны не супа-

кояцца, у хуткім часе назад вернуцца, і тады ўжо не выратую я цябе. Бяжы, і каб шлях твой паўз людзей праходзіў, дзе людзі — там яны нічога благога не ўчыняць! Бяжы, родненькая!

Паслухалася Настка старую гаспадыню. Як прыпусціла, то толькі сэрца ў грудзях ад шалёнага бегу заходзілася — гэтак імчала. Бяжыць яна, бяжыць, чуе — зямля ззаду стогне. Даганяюць, значыцца, канарэзы. Азірнулася, куды б схавацца. Бачыць, вязуць вяскоўцы сена. Яна да іх:

— Дзядзечкі, схавайце, будзьце ласкавы, бо смерць мая набліжаецца!

Не сталі тыя распытваць, што там да чаго, а хуценька звярнулі сена з аднаго воза, паклалі на ніз Настку і зноў сенам прывалілі. Толькі гэта зрабілі, ажно прыскочылі канарэзы:

— Ці не бачылі вы, людзі, тут прыгожай дзяўчыны?

— Не, не бачылі,— адказваюць спакойна тыя.

— А чаму ж гэта ваша сена толькі што перакладзена?

— А ў гэтым нічога дзіўнага няма. Справа ў тым, што воз разваліўся, то мы яго па-новаму пераклалі, і ўсё на гэтым.

Заехалі вазы ў вёску, і Настка разам з вяскоўцамі пакіравала да сваёй хаціны. Увайшла ў пакой, каб бацьку ўсё распавесці, а там за сталом... сядзіць той жаніх-канарэз і мірна-люба з гаспадарамі размаўляе. Гледзячы на яго, ніколі не сказаў бы, што гэта такі пярэварацень страшны ды злыдзень.

— А чаму ж ты, Настка, да мяне ў госці не прыехала, хоць і абяцала? — адразу запытаўся ў дзяўчыны, не даўшы ёй і дух перавесці.

Але і тая не паддалася:

— А мне,— гаворыць,— сон сёння нейкі дужа дзіўны прысніўся. Быццам я ў вас была. Толькі што была...

— Ды няўжо? — заўсміхаўся жаніх.

— Ага,— паддакнула дзяўчына і дадала: — І здаецца, я ведаю, чым вы там усе займаецеся і колькі людзей са свету белага перавялі...

— Сніцца дык і сніцца,— адказваюць сябры жаніха, а самі, непрыкметна пераглянуўшыся, з хаты прэч збіраюцца. Але ў парозе сяляне стаяць і пільна за імі

сочаць. Настка тым часам насовачку дастае і паказвае ўсім адсечаны палец з пярсцёнкам:

— Можа, вы не ведаеце, што гэта такое?

Убачылі адсечаны палец канарэзы і давай уцякаць. У дзверы нельга, дык яны ў вокны, а людзі за імі. Усіх дагналі, ніхто не ўцёк. Пазабівалі і ў адным месцы пахавалі, а над магілай вялізны камень паклалі, каб і душы іхнія на волю не вырваліся. Месца тое празвалі Скавышовым. А далей, калі гэтая гісторыя перастала сялян палохаць, то ля таго каменя сталі людзі хаты будаваць і падвор'і закладваць, ды і назву перайначылі крыху. Вёска Скаўшын стала. Так і павялося з тых дзён даўніх.



# СЛУЦК

Было ў аднаго магутнага князя тры сыны. Здаравенныя хлопцы, нібы мядзведзі, прыгожыя, смелыя, адчайныя, ніякага страху ні перад кім не ведалі. Колькі разоў славу бацькоўскую памнажалі з мячамі ў руках на крывавых палях бітваў ды сутычак. Абыходзілі іх смяротныя стрэлы і дзіды, параненыя, праўда, былі не раз і не два, але не болей. Матуля нават прызвычаілася, што пасля кожнай бітвы некага з сыноў вязуць параненым. Сэрца, вядома ж, хвалявалася, але ўжо ведала, што жывыя, што вернуцца назад і праз колькі часу зноў на нагах будуць.

Усё добра было, ды і з імі ліха здарылася. Нават і паверыць цяжка, што людзей, якія анікога з ворагаў не баяліся і не паварочваліся да іх спінаю, са свету звядзе ўсяго толькі адна... дзяўчына. Прычым зробіць гэта за даволі кароткі тэрмін — за тры гады. Тры сыны і тры гады. Якое ж мацярынскае ці бацькоўскае сэрца вытрымае такое гора? Таму і не дзіва, што, як загінулі сыны, адразу памёрлі і іхнія бацькі. Але пра ўсё па парадку.

Прыехалі аднаго разу браты з далёкага паходу.

Цяжкі гэта быў выезд і для іх, і для іхняй дружыны. Бацька ўжо не выступаў з воямі, а заставаўся ў палацы і разам з князёўнай цярпліва чакаў, калі загудуць баявыя трубы і сыны з'явяцца перад уязной брамай. Далёка былі, бо ворагаў туды пазаганялі. Ці то за татарамі ганяліся дружыннікі, ці то яшчэ за кім — не мела асаблівага значэння. Проста надакучылі тыя няпрошаныя госці ўжо да таго, што болей трываць не выпадала: то вёскі папаляць, то які горад у аблогу возьмуць ці нечакана на гандляроў нападуць і ўсіх пераб'юць. Бачаць браты, што ўжо зусім распеты разаліся злыдні, і пайшлі на іх вайною. Гналі да таго часу, пакуль не пакляліся чужынцы болей ніколі на іхнюю зямлю не ступаць, нават глядзець у яе бок адмовіліся.

Адаспаліся сыны гаспадара, адпачылі добра ды зноў за старое ўзяліся: то барукаюцца паміж сабою, то якім іншым шляхам сілу выпрабоўваюць ды смеласць сваю паказваюць. Не сядзіцца ім спакойна дома. Сабраліся неяк і гавораць бацькам:

— Мы тут на возера выскачым, пакупаемся, пыл з сябе пазмываем...

— Ды які на вас, сыночкі, пыл можа быць, калі вы кожную гадзіну вадою абліваецеся? — занепакоілася гаспадыня, нібы прадчуваючы нейкую бяду. Потым глянула на дзяцей — перад ёю стаяць не падлеткі, а здаравенныя мужчыны, з густымі барадамі, і пасмейваюцца. Сумелася тады яна, а князь, пакерхваючы, прамовіў:

— Ідзіце, хлопцы, ідзіце ды глядзіце, ніякім свавольствам не займайцеся. А то зноў чый-небудзь воз з сенам па мелкаводдзю на астравок занесяцё. Сяляне з глузду ледзьве не з'ехалі. Пайшлі — воз на беразе стаяў, а прыйшлі — пасярод возера... Прыбеглі ў двор і ўсё пра нячыстую сілу балабонілі.

У адказ сыны весела зарагаталі і пайшлі да возера. Прыйшлі туды і давай распранацца. А самы старэйшы кажа:

— Не хочацца, браткі, мне нешта ў вадзе плёскацца. Я пахаджу па беразе, а вада няхай вашы целы лашчыць. Пачакаю вас на беразе.

— Як хочаш,— адказалі браты,— мы будзем купацца.

Адышоў старэйшы брат крыху ўбок і пачуў нейкую дзіўную песню. Пайшоў на яе гукі. Доўга ішоў і нарэшце выбіўся на невялічкі луг. Але і песня заціхла. Тады

прысеў хітры вой і пачаў чакаць. Неўзабаве загучаў звонкі голас зноў. Падкраўся хлопец бліжэй і ўбачыў такую прыгожую дзяўчыну, якой ніколі да гэтага ў жыцці не сустракаў. Не памятаючы сябе, устаў і глядзіць. А спявачка яго заўважыла і таксама стала глядзець на прыгожага княжыча. Усміхнулася дый гаворыць:

— Што гэтак глядзіш? Вочы свае папсуеш. Можа, скажаш што-небудзь?

— Ды...— пачаў было хлопец і папярхнуўся ад разгубленасці,— дзе цябе можна заўтра пабачыць?

Засмяялася дзяўчына-незнаёмка, ды так шчыра, так галасна, што і сам княжыч усміхнуўся.

— Захочаш, то знойдзеш...

Сказала гэтак і... знікла, нібы скрозь зямлю праvalілася. Шукаў яе старэйшы сын, шукаў, пад карчы і кустоўе заглядваў, але дарма, нікога не мог знайсці. За гэтым заняткам яго і прыспелі браты, якія падумалі, што з ім здарылася нешта благое, і пайшлі шукаць.

— Чаго гэта ты, братка, тут поўзаеш? Можа, яйкі птушыныя шукаеш? Дык позна ўжо, бо яны наседжаныя,— і давай рагатаць над сваім жартам.

Нічога не сказаў ім старэйшы брат, не раскрыў сваёй таямніцы. Але з таго моманту зрабіўся маўклівым, часта прападаў з падвор'я і недзе хадзіў ці ездзіў. А бегаў ён да прыгажуні-незнаёмкі, каб з ёю сустракацца ды мілавацца.

Аднаго разу, калі спаткаліся, дзяўчына, нейк дзіўна ўсміхаючыся, прамовіла:

— Цікава, а ці выканаў бы ты якое-небудзь маё важнае даручэнне ці просьбу, га?

— Усё, што загадаеш, мая валадарка, усё, што папросіш,— усё зраблю як нельга лепей,— горача запэўніваючы прыгажуню, прамовіў старэйшы з братоў.

— Вось як? — перасмыкнула плечукамі незнаёмка.— Усе вы так толькі гаварыць любіце, а калі да справы дойдзе, то спасылаецеся на ўсялякія цяжкасці ды перашкоды, што і тое нельга, і гэтае не атрымліваецца...

— Падазраваць у няшчырасці, канешне, любога можна,— з гонарам адказаў магутны хлапчына,— але гэта непрывабны занятак. Хто захоча — той зробіць абавязкова, і ніякіх перашкод на яго шляху не паўстане...

— Праўда? — перапытала дзяўчына.

— Вядома ж...

— Тады і мне можна папрасіць аб адной рэчы?

— Пра што хочаш прасі, усё выканаю.

— Можа не трэба, любы?

— Ды чаго ўжо, потым і мяне ў няшчырасці ці палахлівасці падазраваць пачнеш. Лепей гавары хутчэй, не цягні, мне лягчэй будзе знайсці выйсце з няпростага, відаць, становішча.

— Ну што ж, сам напрасіўся. А хочацца мне, каханы, ні многа ні мала... Слухай уважліва, бо два разы паўтараць не буду. Мне сёння сон прысніўся, быццам бы вунь пад той высокай гарою, што сярод лесу ўзвышаецца, закапаны незлічоны скарб. Яго можна дастаць, прычым вельмі проста. Для гэтага трэба пацягнуць за таўшчэразны ланцуг. Калі добра натужыцца, то за ланцугом пасунецца і ўсё багацце. На паверхню высунуцца каштоўнасці, і застанецца іх толькі сабраць у свае сусекі. Ні ў кога на зямлі, ва ўсім белым свеце не будзе гэтулькі...

— А дзе ж канец таго ланцуга, за які я павінен пацягнуць? — адразу пасураве́ўшы, запытаў хлапчына.— Не ведаю і не чуў пра яго.

— Пакажу, любы, пакажу зараз жа, бо я сама бачыла, некалі мне той ланцуг паказвала мая матуля. Хадзем, тут непадалёчку...

Пакрочылі дзяцюк з дзяўчынай і, можа, праз якія там паўвярсты падышлі да высачэзнага каменя, які шэрай, маўклівай глыбай ляжаў пад магутным дубам.

— Вось пад гэтым каменем і знаходзіцца апошняе звяно таго ланцуга. Трэба толькі камень з месца ссунуць, тады ўсё будзе бачна...

Сабраўся з сілай князеў сын, падпёр глыбу плечуком і паспрабаваў перакуліць яе ці ўбок ссунуць. Ды дзе там! У хлапчыны ногі ўжо ў зямлю ўрастаць пачалі, але камень не паддаваўся. А дзяўчына стаяла і падбадзёрвала:

— Яшчэ крыху, міленькі, яшчэ, і камень перакуліцца на бок. Яшчэ... Давай...

Вочы ў княжацкага сына крывёю наліліся ад страшэннай напругі, але справу не кінуў. З апошніх намаганняў ссунуў глыбу ўбок, і адразу ж камень рассыпаўся на мноства маленькіх камянёў, якія пакаціліся па наваколлі... Аддыхаўся крыху хлапчына і тут заўважыў апошняе звяно ланцуга. Ухапіўся з радасцю за яго,

думаючы пры гэтым, што лёгка выцягне каштоўнасці і тады дзяўчына-прыгажуня стане ягонай жонкай назаўсёды. Ды дарма спадзяваўся. Толькі ўхапіўся за жалезны ланцуг таўшчынёю з добрую галёнку, як адчуў, што цела яго прырастае да жалеза і адразу дзеравянее. Толькі тут зразумеў дзяцюк, што яго падманулі, але нічога ўжо выправіць не здолеў, прахрыпеў з апошніх сіл: «За...ча...ра...ва...на...», і ўсё на гэтым. Ператварыўся сам у каменную глыбу, яшчэ большую і магутнейшую, чым тая, якую разбурыў.

Не дачакаліся ў той вечар старэйшага з братоў у княжацкім палацы, не было яго ноччу, не з'явіўся і раніцай. Тады толькі забілі трывогу, і атрады добра ўзброеных дружыннікаў кінуліся ва ўсіх напрамках. Старанна абшуквалі ўсе самыя глухія мясціны, нават там, дзе да іх нага чалавечая не ступала. Ды нічога радаснага ніхто паведаміць не мог — не бачылі хлапчыны, ніхто не мог ім дапамагчы і паведаміць, што сустракаў напярэдадні дзецюка. Пахмурыя воі ехалі назад да палаца, бо нічым не маглі ўзрадаваць гаспадароў. Шкада было такога вопытнага і магутнага воя, з якім не ў адной, не ў дзвюх бітвах-сечах удзельнічалі, а тут вось дзіўны выпадак — чалавек нібы скрозь зямлю праваліўся. Пачалі ўжо паміж сабою дружыннікі гаварыць рознае, але большасць схілялася да таго, што гэта варожы атрад ці дазор натрапіў на аднаго з княжычаў і ці паланіў яго (што малаверагодна), ці пасек на кавалкі.

Усе пасланыя воі вярнуліся. Не было толькі сярэдняга з братоў з атрадам. Усе спадзяванні былі звязаны з ім. І што ж вы думаеце? Аднаго разу, калі ўжо дамоў вярталіся, выехалі вершнікі на невялікую паляну, на якой ляжаў, нібы добрая хаціна, здаравенны камень. Сконіліся імгненна, бо заўважылі сляды. Зусім свежыя. Толькі нейкія дзіўныя, надзвычай глыбокія. Потым нехта з дружыннікаў заўважыў бліскучую бляшку, якая пастаянна вісела на папружцы ў княжыча. Усё наваколле амаль перарылі воі, але болей нічога не знайшлі. Толькі сярэдні з братоў нікуды не пайшоў, а ўсё глядзеў і глядзеў на камень. Яму здавалася, што гэта ягоны брат глядзіць на яго. Як толькі ні абыходзіў глыбу, але такое прадчуванне не пакідала.

Тым часам і воі сабраліся, данеслі, што нічога болей не знайшлі, хоць надзвычай старанна абшукалі наваколле. Загадаў княжыч ехаць, а сам застаўся яшчэ на

хвілін колькі побач з каменем, каб падумаць. Пагладзіў рукою яго шурпаты бок і сабраўся ўжо садзіцца на каня, ды ў гэты момант адчуў, што нехта глядзіць яму ў спіну. Адвярнуўся і... ажно рот разявіў. Насупраць яго стаяла дзяўчына, ды такая прыгожая, такая прывабная, што раней такой прыгажосці нідзе не сустракаў. Мову адняло ў адважнага воя, слова сказаць не можа, адно толькі — зяхае ротам бязгучна. Зрабіў крок наперад, але і дзяўчына адступіла, не падпускае да сябе блізка. Нарэшце ўсё ж неяк здолеў перамагчы княжыч хваляванне і разгубленасць і запытаўся:

— Хто... ты... такая?..

Засмяялася незнаёмка, ды такім гучным і звонкім голасам, нібы званочкі малюсенькія нехта тут умомант рассыпаў. Як пачуў смех княжыч, то і ўвогуле зніякавеў.

— Хто такая, пытаешся? — гулліва пачала дзяўчына.— Чалавек. Жыву тут непадалёку. Вось гуляла і наткнулася на цябе. Хто ж ведаў, што столькі войска тут сёння будзе, за кожным кусцікам — па ўзброенаму чалавеку... Таму ішла, хаваючыся. Мала хто тут можа быць, край жа глухі, лясны, усялякае можа здарыцца...

— Ты тут жывеш непадалёку? — запытаўся княжыч.

— Так,— адказала прыгажуня,— амаль побач мая хаціна. Можа, зойдзеш на хвіліну-другую, вадзіцы з крынічкі пап'еш, адпачнеш крыху і далей паскачаш, бо цябе, мабыць, ужо дома зачакаліся...

— Зайсці і сапраўды трэба, бо хачу вады напіцца... Але, можа, ты, прыгажуня, тут дзе майго брата роднага сустракала? У нас гора вялікае: старэйшы брат прапаў. Нібы скрозь зямлю праваліўся. Ніхто не чуў і не бачыў, а чалавека няма...

— А можа, на яго хто напаў? Якія злыдні ці рабаўнікі? — занепакоілася незнаёмка.

— Калі б на яго ў адкрытую напалі, то сляды мы адразу знайшлі б, бо брат такі вой быў, якіх пашукаць трэба, ды яшчэ ці знойдзеш. Нешта іншае прыключылася з ім...

Ідуць так, размаўляюць паміж сабою і непрыкметна да невялічкай хаціны прыйшлі. Там гаспадыня напаіла воя вадою сцюдзёнаю, адпачыў вершнік і дамоў пачаў збірацца, ды час цягне, на прыгажуню пазірае. Потым

усё ж не вытрымаў і запытаўся ціхенька, нібы каго баючыся:

— А можна, прыгажуня, я да цябе заўтра прыеду? — сказаў і прыціх прысаромлена.

— Паспрабуй,— гарэзліва адказала гаспадыня і стрэльнула на хлопца сваімі сінімі-сінюткімі вачамі.— Паспрабуй, можа, што і атрымаецца...

На гэтым і развіталіся.

У палацы пагаравалі, пагаравалі і забыліся на тое ліха са старэйшым сынам, бо надта часта на людзей у тыя часы ўсялякая злыбеда накочвалася.

Сярэдні з братоў цяпер таксама стаў даволі часта знікаць. Паспрабаваў было князь паслаць за сынам пільных віжоў, ды дзе ж вы бачылі, каб такі спрактыкаваны і вопытны вой на мякіне трапіўся. Адводзіў віжоў і сам неўпрыкметку ад іх уцякаў.

Пазлаваў, пазлаваў бацька дый кінуў дурную справу, зразумеў, што нічога з ягонай задумы не атрымаецца. А княжыч ведаў, куды ўцякаў — чакала яго заўсёды ва ўмоўленым месцы дзяўчына-прыгажуня. Сядуць на коніка ўдваіх і ў такую гушчэчу ды непралазную мясціну заб'юцца, што ніякая пагоня іх там не знойдзе. А тады ўжо мілуюцца ўдваіх...

Аднаго разу дзяўчына нечага спахмурнела. Заўважыў гэта княжыч дый пытаецца:

— Што з табою, мая каханенькая, здарылася? Чаму гэтак нечакана спахмурнела, чаго настрой сапсаваўся? Скажы, то, можа, табе чым і дапамагу?

— Ды ці здолееш?

— А я паспрабую...

— Тады слухай, калі справа ўжо на гэта пайшла. На вунь той высокай гары, дзе мы з табою сустрэліся, расце высачэзны і таўшчэразны дуб, пад тым дрэвам знаходзіцца жалезны ланцуг, які другім канцом прыкаваны да незлічонага скарбу, і калі пацягнуць за той ланцуг, то ўсё золата-каштоўнасці можна будзе на паверхню выцягнуць. Тады і жыць спакойна давядзецца, бо ні ў каго на зямлі большага багацця не будзе. Але ж справа гэта складаная і адказная. Толькі дужы, моцны чалавек можа яе выграшыць, іначай і брацца не трэба...

— Зраблю. Для цябе ўсё зраблю, родненькая. Не хвалюйся. Зараз жа і пойдзем. Толькі я не ведаю, дзе той ланцуг знаходзіцца...

— Я пакажу, бо мне матуля мая паказвала.

Паехалі на той пагорак-гару, да таўшчэразнага дуба.

Ухапіўся сярэдні брат за ствол, што было сілы пачаў хістаць дрэва. Пасыпаліся жалуды ды лісце, але самі карані надта глыбока ў зямлі сядзелі, трывала трымаліся за маці-зямлю. Ужо задыхаецца асілак, сілы болей нестае, але і кінуць пачатую справу нельга, бо дзяўчына падумае, што ён ці спалохаўся, ці занадта слабы для таго, каб выканаць цяжкую задачу. Разняў рукі, а ногі ад стомы калоцяцца, усё цела дрыжыць. Глянуў тады на прыгажуню ды зноў ухапіўся. Ломіць магутны дуб, а незнаёмка толькі яму падказвае:

— Яшчэ крышку, міленькі, яшчэ, і ўсё будзе ў парадку. Паспрабуй... Напніся што ёсць сілы... Вунь ужо і тое колца, за якое трэба пацягнуць... Давай...

Сярэдні брат амаль ужо па пояс у зямлю ўрос, але не здаецца. Цягне. Пачуў нават, як затрашчалі карані і асілак-дуб паволі пасунуўся ўверх. Прыгажуня задаволена засмяялася і запляскала ў ладкі:

— Вырваў, вырваў... Ты вырваў гэтае дрэва...

Ды ў той самы момант, калі дрэва, адарванае ад каранёў, пачало на бок хіліцца, падалося хлапчыне, што ён прырос да дрэва. Ірвануўся, каб вызваліцца, але дзе вы бачылі. Не здолеў бы нават надзвычай моцны чалавек, бо вельмі многа сілы растраціў. Адзінае, што паспеў зрабіць перад смерцю,— гэта ледзьве чутна прашаптаць: «За...ча...ра...ва...на...» І ўсё заціхла. На месцы, дзе толькі што рос магутны дуб, ляжала гара лістоты, жалудоў ды пашкуматанага голля. А побач узвышаўся яшчэ больш тоўсты і высокі дуб.

І гэтага княжыча шукалі, можа, цэлы тыдзень, ды нідзе не натрапілі на сляды, ніхто не мог падказаць, дзе шукаць сярэдняга з братоў. Вярталіся да палаца атрады дружыннікаў і на гэты раз сумна паціскалі плячыма.

Толькі малодшага з братоў, апошняга, з ягонымі людзьмі пакуль што не было. На яго і спадзяваліся. Ды дарэмна, бо той, бедалага, таксама трапіў у пастку да прыгажуні-дзяўчыны, яна і яго падсцерагла непадалёку ад месца смерці ягоных братоў. Страціў і гэты хлапчына пакой. Пачаў і ён бегаць ды ездзіць да незнаёмкі ў госці. Бацькі горам убіваліся, не маглі ўжо і чуць пра тое, каб ён сам куды ехаў. Ахову яму надзейную далі, яна суправаджала княжыча паўсюдна.

Але ці маглі воі, якія бачылі сустрэчы хлопца з прыгожанькай дзяўчынай, нешта благое падумаць ці падазраваць у нечым яе. Таму і не набліжаліся да іх, калі закаханыя ехалі наперадзе або збочвалі з дарогі і ехалі моўчкі. І не ўбераглі хлапчыну. А адбылося вось што.

Пад'ехалі неяк хлопец з дзяўчынай да таўшчэразнага дуба, які рос побач з агромністым каменем, то яна і кажа:

— Вось каб ты трапіў з лука вунь у таго сокала, у нас мноства золата-каштоўнасцей з'явілася б і можна было б жыць бестурботна.

— Чаму б і не,— ускінуўся княжыч і таропка дастаў лук.

Праз нейкае імгненне прыгажун-сокал з вышыні гопнуўся на зямлю, але з сядла ўзляцеў... другі. Калі ён уздымаўся ў вышыню, дружыннікі выразна пачулі:

— За...ча...ра...ва...на...

Цяпер яны здагадаліся, хто вінаваты ў смерці братоў, і калі пра гэта паведамілі маці-князёўне, яна ў вялікім гневе прамовіла:

— Каб жа ты ракою разлілася, каб жа ты жанчынаю ніколі не была! Каб жа ты слукою выгіналася!

І настолькі гэта быў моцны праклён, што так усё і здарылася на самай справе. Цякла рака, абмывала сваімі водамі камень, дуб, ды высока-высока ў небе пастаянна кружыў сокал. Раку тую так і назвалі Слукою ці Случчу, а пазней, калі горад на беразе яе з'явіўся, то і ён стаў, адпаведна, Слуцкам.

## ВЯСЕЯ

Калісьці надта даўно ўсё гэта адбывалася. З адным салдатам звязана ўзнікненне нашай вёскі.

У тыя часы салдаты служылі вельмі працяглы перыяд, можа, дваццаць, а можа, і дваццаць пяць гадоў. Вось адзін такі чалавек адслужыў і вяртаўся ўжо дамоў. А тады ж ні машын, ні якога іншага транспарту не было. Пешкі дабіраліся. Ды чым можна было здзівіць чалавека, які не раз і не два бачыў смерць побач, які губляў сваіх верных сяброў-таварышаў, галадаў і хварэў? Хіба ж яго нешта магло супыніць? І тая тысяча вёрстаў наперадзе — ці то адлегласць для сал-

дата? Як пачуў, што час прыспеў дамоў вяртацца,— ажно расцвіў. Далі сухароў на дарогу, грошай колькі капеек і развіталіся. Толькі перад самым адыходам адзін з верных таварышаў перасцярог:

— Ты, Іван, як будзеш вяртацца, то не заходзь у хаціну да багатага чалавека або якога пана, які адзін жыве, бо там можаш згінуць і ніхто табе не дапаможа. Глядзі, братка, у колькіх паходах мы з табою былі, у колькіх бітвах удзельнічалі, а выжылі, дык і тут каб усё добра было...

Падзякаваў Іван таварышу і пайшоў. Ідзе сабе, нікуды не спяшаецца, ніхто яго не падганяе. То там паглядзіць, то там пасядзіць, паляжыць, пераначаваць папросіцца і зноў ідзе сабе, толькі вёрсты тыя стомленымі нагамі лічыць.

Аднаго разу, а прайшло ўжо, можа, з месяц, прыбіўся Іван да багатага хутара, а на хутары тым палац багаты стаяў. Тут зразумеў ён, што гэта і ёсць тое месца, пра якое папярэджваў яго перад адыходам дамоў таварыш. Але ж набліжаўся вечар і падарожнаму нічога іншага не заставалася, як папрасіцца пераначаваць. Давай ён стукацца ў дзверы. Доўга ніхто не адчыняў. Салдат ужо збіраўся праставаць далей, ды ў гэты самы момант дзверы шырока расчыніліся і на парозе паўстаў сам гаспадар:

— Што табе трэба, чалавеча? Чаго ты мяне турбуеш перад сном?

— Ды мне, паночку, не многае трэба. Пусціце мяне пераначаваць, а то вечар наступае, а мне і галаву прыхіліць няма дзе. Раніцай я пайду далей і вас болей турбаваць не буду.

— Няма ў мяне месца, служывы, няма. Ідзі сабе з Богам далей. Можа, да ночы яшчэ куды паспееш зайсці і там табе пашанцуе болей.

— Паночку,— пачаў прасіцца салдат,— не ведаю ж дарогі, бо не мясцовы, ды і невядома, ці паспею прыйсці да жылля якога, пакуль ноч на наваколле не апусціцца. Пусціце, паночку, а то перастрэнуць якія ліхія людзі, і тады мне давядзецца з жыццём развітвацца...

Такія словы, такі паварот справы неяк паўплывалі на гаспадара, і ён загаварыў больш лагодна:

— Ды ўжо раз гэтак просішся, то давядзецца табе дапамагчы, бо і сапраўды, куды ж ты пойдзеш. У мяне тут ёсць яшчэ адзін будынак, то, можа, ты ў ім і пераначуеш? Толькі не крыўдуй, але калі ты туды пойдзеш

начаваць, то заўтра раніцай я прыйду ў гэты будынак за тваімі косткамі... Справа ў тым, што там, мабыць, нейкія чэрці водзяцца, не іначай. Колькі людзей туды ні заходзілі, назад ніколі не вярталіся жывымі. Глядзі, твая справа, чалавеча, як хочаш, так і рабі.

Салдат пастаяў, падумаў, потым махнуў рашуча рукой і адказаў:

— Дзе мая не прападала, пане гаспадару, іншага выйсця проста не бачу. Так ужо і быць — раніцай прыходзьце ды глядзіце, што там ад мяне застанецца. Раз чэрці, то буду з імі ваяваць, задарма жыцця не аддам. Толькі яшчэ ў вас папрашу: калі можна, дайце мне арэхаў добрую торбу, свечку ды пусты мех...

— Чаму ж нельга, гэта я табе дам з задавальненнем.

Узяў салдат прычындалле, якое папрасіў у гаспадара, і пайшоў у пустую будыніну. Ідзе, а сам зубамі з перапуду ляскоча, бо, ведама ж, баіцца. Жывы чалавек, што зробіш... Зайшоў, запаліў свечку, паставіў яе на стол у кут і, крыху супакоіўшыся, пачаў есці арэхі. Трэскае іх, адно толькі шкарлупінне пад ногі сабе кідае. Есць, а ў акно пазіраць не забываецца. Сцямнела ўжо добра, хутка апоўнач прыспее. Толькі так падумаў, як навокал усё затрашчала, зашамацела, завішчэла, ажно Іван ад нечаканасці ўздрыгнуў. Але ж нельга яму было свой спалох паказваць, таму ўзяў сябе ў рукі і зрабіў выгляд, што абыякавы да ўсяго гэтага. А нячысцікаў набілася поўная будыніна, ажно кішаць, ужо і за салдата гатовы ўхапіцца, толькі нечага ўсё ж баяцца, не лезуць першымі. Сталі паміж сабой перамаўляцца, а Іван, вядома ж, чуе ўсё, разумее. От адзін з чарцей, звяртаючыся да гэткага ж гідкага стварэння, як і сам, кажа:

— Ну, сёння мы пажывём... Сёння нам прыйшло сюды пажырэнне...

— Так,— адказвае той,— ды не абы-якое, а спраўнае, сытае. Парадуемся... Вось толькі моманту зручнага дачакаемся...

Салдат жа сядзіць і, як ні ў чым не бывала, далей сабе арэхі есць, толькі шкарлупінне ўжо не пад ногі, а куды хоча кідае. Спецыяльна гэта робіць, каб нячысцікаў з сябе вывесці.

Зноў нехта з нячысцікаў зашыпеў:

— Салдацік, мы цябе з'ядзім, і нічога табе не дапаможа...

А Іван адказвае памяркоўна:

— У горле вам косткай стану, брыдота вы ўсяленская! Нічога ў вас не атрымаецца!

Нячысцікі зазлавалі, але разам з тым і здзівіліся:

— Глядзі ж ты, сёння нейкі занадта смелы перад намі сядзіць, нікога не баіцца, нічым яго не запалохаеш. Што, салдат, згодны ты з намі паміырыцца ці будзем біцца?

Іван нібыта задумаўся, а сам сваю лінію далей гне:

— Толькі біцца! Каб з вамі, нячысцікамі бруднымі, ды я нейкі хаўрус усчаў? Такога не было і не будзе! Не дачакаецеся вы ад мяне міру! Толькі біцца, і годзе! Але, перш чым на адкрыты бой нам выходзіць, трэба сілай папярэдне памерацца! Згодны?!

— Згодны!

— Вось вам тады арэшак, і калі вы яго раскусіце гэтаксама, як і я, то вы мацнейшыя, а калі не — то я.

Сам Іван, перад тым як ад пана пайсці, падрабіў адзін крэмень пад арэшак, ды так па-майстэрску, што яго нельга было ад сапраўднага адрозніць. Як ні круці — сапраўдны і ёсць. Яго і падаў самаму здаравейшаму з чарцей. Той адразу і ўхапіўся, бо бачыў, з якой лёгкасцю іх Іван калоў. Думаў нячысцік, што і ў яго гэтак усё лёгка атрымаецца. Цісь-цісь, цісь-цісь, але як ні стараўся чорт, у яго нічога не атрымалася. Збянтэжыўся ён і кажа:

— Ну што ж, раз такая справа, то будзем мірыцца.

А салдат у адказ:

— Што з вамі ўжо зробіш, калі на такое справа пайшла. Не надта мне гэта хочацца рабіць, але бачу, што вы не можаце арэшак раскалоць. Раз справа ў гэты бок павярнулася, то лезце ўсе ў мяшок, я вас палічу.

Чэрці сваім старэйшым падпарадкоўваюцца безагаворачна. Таму як сказаў галоўны — так і зрабілі. Пазалазілі ўсе ў вялізны мех, а Іван — раз, і крыж на ім намаляваў. А гэта для нячысцікаў, як вядома, самая страшная з'ява, з-пад крыжа яны ніколі вылезці не здолеюць.

Наступіла раніца. Узяў салдат мяшок, на плечы яго ўскінуў і да пана пакіраваў. Гаспадар надзвычай здзівіўся:

— Жывы?! Як гэта табе ўдалося выкараскацца?

І зляку на табе ніякага не бачу. Раскажы, што там адбывалася?

Іван і гаворыць:

— Нічога там незвычайнага не было. Увесь той страх-зляк у маім мяху, за плячыма...

Але ж пану ўсё роўна цікава:

— Колькі ты, чалавеча, хочаш за тое, каб пра ўсё мне расказаць і паказаць?

Памуляўся салдат для прыліку, пераступіў разоў колькі з адной нагі на другую і кажа:

— Ды ўжо ж, калі пан гаспадар насыпле для мяне капялюш золата, то, так і быць, пра ўсё паведамлю.

Бачыць гаспадар, што Іван танней не прадасць сваю таямніцу, і адсыпаў золата падарожнаму чалавеку, дый яшчэ падзякаваў шчыра, ад усяго сэрца. А салдат, распавёўшы пану пра ўсё, узяў мех, пайшоў да мясцовага каваля і папрасіў:

— Пане гаспадару, трахні разоў колькі сваім самым цяжкім молатам па маім мяшку. Толькі, прашу цябе, бі з усяе сілы, не шкадуючы. Калі будзеш старацца, то я добра заплачу.

Каваль як лупянуў па мяху з усяе сілы (ведама ж, дармовыя грошы самі ў рукі лезуць), то ён у некалькі разоў адразу паменшаў ды... заенчыў-завішчаў усялякімі галасамі:

— Ой, не губі нас, чалавеча!

— Ой, даруй!

— Ой, выпусці жывымі!

— Толькі выпусці, што хочаш для цябе зробім!

А Іван не паддаецца ды кавалю падказвае:

— Гэпні яшчэ разоў колькі, я і за гэта добра заплачу.

Той зноў за сваю справу шчыра ўзяўся. Узмаліліся тады нячысцікі слёзна:

— Выпусці нас, садат. На самай справе ўсё для цябе зробім, да скону жыцця нашага аднаму табе служыць будзем.

Салдат тады загадаў пакінуць той дом, дзе ён начаваў, ды яшчэ нанасіць яму тры мяхі золата-срэбра. Чэрці на ўсё былі згодны, толькі б жывымі застацца.

Выканалі яны даручэнне Іванава і думалі, што на гэтым адчэпяцца ад хітрага чалавека, але не тут-то было. Салдат запатрабаваў, каб нячысцікі пабудавалі яму новую вёску:

— Пабудуйце мне, злыдні, новую вёску, я ў яе сваіх

землякоў жыць перавязу, каб ніхто тут з іх не здзекаваўся, не прыціскаў, не прымушаў на сябе працаваць. У мяне золата многа, навошта яно мне аднаму? Усім хопіць. Так і жыць станем. Разам...

Нячысцікі, можа, за месяц харомы такія адбудавалі, што ва ўсім наваколлі нідзе лепшых нельга было знайсці. Сталі сяляне, землякі Іванавы, у іх жыць і яго хваліць. А паселішча Вессю назвалі, бо так усё салдат казаў. Ён жа ў расейскім войску служыў і там, відаць, слова гэткае пачуў. Потым, з цягам часоў, перамянілася назва і стала наша вёска Вясеяй... А што да чарцей, то яны ніколі болей у нашых мясцінах не вадзіліся. Мабыць, моцна перапалохаліся і некуды далей выбраліся.

## ГРЭСК

Жыў некалі ў гэтых месцах адзін надта бедны мужык, і звалі яго Крэчка, ці мо і не звалі, а мянушка ягоная такая была, але гэтага ўжо ніхто дакладна не скажа, бо за сівымі стагоддзямі адказ схаваны. Нічога ў яго амаль не было з жывёлы, нічога не было і ў хаце. Ды і хата тая — адна толькі назва, бо пхні добра ў адзін вугал — другі калаціцца пачне.

Але жыццё ёсць жыццё, яно і для бедных і для багатых. Вось і нарадзілася ў Крэчкі з жонкай дачка. Нарадзіцца-то яна нарадзілася, ды ў такой галечы нельга было па-людску адсвяткаваць такую падзею: не было чаго з'есці, не было нават і з чаго есці. Абхапіў мужык галаву рукамі і пайшоў з падвор'я. Ідзе сабе ды думае, як бы яму неяк выкруціцца, нешта прыдбаць. Хочацца ж і яму, гаротнаму, паклікаць да сябе суседзяў ды родзічаў і пачаставаць іх шчыра.

Усё ж неяк назбіралі нейкіх там самых неабходных харчоў, і гаспадар пайшоў да крыніцы з вядзерцам па ваду. Ідзе і думу сваю гаротную думае. Ажно чуе — з глыбокага рова, які быў побач, нешта дзіўна крычыць. Заглянуў ён туды і супыніўся. На самым нізе бегала невялічкае цялятка. Шкада стала Крэчку жывой істоты, вырашыў ёй дапамагчы. Выцягнуў цялушку (а гэта была яна) і мяркуе, што далей рабіць, бо не ягоная ж. Пайшоў па вёсцы пытацца, у каго з жывёлы штонебудзь прапала. Але, як на тое шчасце, ніхто не знаходзіўся. Усіх абышоў сумленны чалавек, назад дамоў

вярнуўся ды жонцы распавёў пра тое, што з ім здарылася. Узрадавалася тая і кажа:

— Дык няхай яны разам і растуць у нас, дачушка нашая, немаўлятка роднае, і цялушачка. Хоць нешта ды будзе ў гаспадарцы...

Так і зажылі. Але нядоўга іхняе шчасце цягнулася. Прыйшоў неяк да іх у хаціну самы багаты вясковец і заявіў, што тры гады таму (а менавіта столькі часу з таго моманту прайшло) у яго прапала цялятка. Колькі ён ні шукаў — нідзе знайсці не мог, а тут людзі добрыя падказалі, дзе трэба шукаць. Гаворыць злыдзень, а ў самога вочы так і бегаюць, так і шныраць. Гаспадар разгубіўся:

— Але ж часу мнагавата прайшло. І, здаецца, я тады да цябе заходзіў... Так, добра памятаю, ты яшчэ ў гэты час полудзень правіў і з мяне пасміхваўся, бо, мабыць, у мяне ад голаду твар перасмыкнула. Быў я ў цябе, і ты сказаў, што нічога ніколі не губляеш, а толькі ўсё да сябе ў хату ды на падвор'е грабеш.

Але і багаты не саступаў:

— Не быў ты ў мяне, гаспадар, не быў. Нешта наблытаў і спрабуеш яшчэ болей заблытаць. Мая гэта кароўка, мая, і аддавай яе, не цягні час, бо ўсё роўна не выкруцішся, ашуканец ты гэтакі.

У гэты момант у хату ўбегла маленькая дачушка, якая гуляла ў двары, і, пачуўшы такія гнеўныя словы, звернутыя да таткі, прамовіла тоненькім галаском:

— Татка, гані яго прэч! Ён жа нічым не дакажа, што гэта ягоная цялушка, нават калі і на самай справе так адбылося! Столькі часу прайшло, а ён спраўляцца прыйшоў!

— Глядзі, Крэчка,— прамовіў разгневаны багач і пайшоў за парог,— у суд на цябе падам, то і гэтую развалюху мне яшчэ аддасі, не толькі што кароўку...

Засумаваў гаспадар. А што калі і сапраўды той злыдзень на яго ў суд падасць? Як жа з ім змагацца? У яго вунь колькі грошай, каго захоча, таго і купіць, што захоча, тое і зробіць.

Жонка поруч гаруе. Толькі малая дачушка па хатцы туды-сюды бегае і крычыць:

— Не палохайцеся, родныя, не бойцеся яго. Я вам дапамагу...

Пачулі такое гаспадар з гаспадыняй і нявесела ўсміхнуліся. Што возьмеш з дзіцяці.

Неўзабаве і сапраўды прыйшла Крэчку позва ў

суд. Aпрануў ён самае лепшае і чыстае, што ў яго было, развітаўся з дачкою і жонкай і пайшоў. Заходзіць у суд, а там ужо багаты стаіць ды пасміхваецца, маўляў, я ўжо добра ўсіх падмазаў.

Суддзя глянуў на Крэчку і пытаецца:

— Адкуль, чалавеча, у цябе цялушка тая ўзялася? Як гэта: і каровы не меў, а цялятка завёў?

Паспрабаваў было гаспадар нешта тлумачыць, але заўважыў, што яго ніхто не слухае, і замоўк.

Тады суддзя вырашыў справу так:

— Хто з вас адгадае загадку, таму жывёліна і дастанецца. Слухайце ўважліва: што самае хуткае на свеце? Прыходзьце сюды заўтра і адкажаце мне.

Багаты — ажно пуза закалыхалася, гэтак зарагатаў, яму падалося, што ён ужо ведае правільны адказ.

Прыйшоў Крэчка дамоў і сеў у задуменні. Жонка да яго:

— Ну што там, мужу?

— А што там... Загадку загадалі, а суддзя, відаць, сказаў багатаму адказ. Заўтра трэба зноў ісці...

— А што за загадка, тата? — запыталася дачка.

— Што самае хуткае на свеце?

— Дык гэта ж такая простая задача. Я і то адказ ведаю, а вы сумняваецеся. Гэта ж розум. Не паспееш падумаць, а на розум ужо прыйшло.

Узрадаваўся Крэчка і пайшоў раніцай зноў у суд. Там суддзя і пытаецца спачатку ў багацейшага:

— Ну дык які адказ ваш?

— Ды гэта ж мой жарабец, пане суддзя,— выпаліў багаты і засмяяўся.

— Розум гэта, пане суддзя,— прамовіў Крэчка.

Абазваў суддзя багатага дурнем, але і за Крэчкам перавагі не прызнаў. Другую загадку загадвае:

— Што тлусцей за ўсё на свеце? Заўтра прыходзьце з адказам...

Сказаў гэтак і злосна на багатага зірнуў. Колькі ж, маўляў, можна табе дапамагаць. Але той толькі вокам падміргвае: аддзячу, толькі дапамажы...

Зноў Крэчка сумны дамоў вярнуўся. Зноў да яго жонка падскочыла:

— Ну як, адгадаў загадку, мужу?

— Адгадаць-то я правільна адгадаў, перахітрыў багатага, ды суддзя новую задаў.

— А якую, тата? — падскочыла дачка.— Можа, я дапамагу...

— Ды гэтая складанейшая за першую. Ён спецыяльна робіць, каб адабраць у нас апошняе.

— Ты, тата, надта не перажывай, лепей скажы мне, што ж там за цяжкая загадка, якая цябе гэтак засмуціла.

— Слухай, дачушка: што тлусцей за ўсё на белым свеце? Вось так. Тут і я сваім розумам дадумацца не магу, не тое што ты... Цяпер дакладна забяруць цялушку...

— Я лічу, тата, што зямля самая тлустая ва ўсім свеце. Яна і родзіць, яна і корміць, яна і жыццё людзям дае...

— Вось як? А і сапраўды, мужу,— вохкнула жонка.— Гэта ж так і атрымліваецца. Зямля і ёсць за ўсё тлусцейшая.

— І я з такім адказам згодны,— выдыхнуў Крэчка і засмяяўся.

З самага рання пабег ён у суд. Там ужо багаты з нагі на нагу пераміна́ўся. Ледзьве дачакаліся, калі суддзя заявіцца. Нарэшце той прыйшоў.

— Ну, дык што самае тлустае на свеце?

Зноў багаты наперад выскачыў:

— Пане суддзя, пане суддзя, гэта ж мая жонка. Мая жонка самая тлустая,— выпаліў так і заціх з шырока адкрытым ротам, бо суддзя на яго гэтак глянуў, што хто іншы, то да скону жыцця свайго ў зямлю ўрос бы.

— Гэта, пане суддзя, зямля,— ціха, але ўпэўнена прамовіў Крэчка.— Яна нас і корміць, яна нас і поіць, яна нам і жыццё дае.

— Правільна ты сказаў, чалавеча, зноў правільна, і цяпер я задаю вам трэцюю, рашаючую загадку: што самае салодкае на белым свеце? Адказваць будзеце тут жа, хвілін праз колькі. Слухацца заўсёды трэба іншых, то і справа будзе,— дадаў суддзя, звяртаючыся да багатага.

Выйшлі яны на вуліцу. Багаты пасміхваецца, маўляў, ведаю адказ, а Крэчка галаву сваю ламае. Ажно бачыць — ідзе ягоная жонка, не сядзіцца і ёй дома, хочацца даведацца, як жа там справы ў мужа. А на руках у яе соладка спіць дачушка. Глянуў гаспадар на яе і павесялеў. Тым часам суддзя выходзіць і сурова пытаецца:

— Які адказ ваш будзе?

— Гэта, пане суддзя, той мёд, які я п'ю. Няма нічога за яго саладзейшага,— вымавіў багаты.

Суддзя скіраваў свой позірк на Крэчку:

— А што ты скажаш, чалавеча?

— Гэта ж сон, пане суддзя, паглядзіце, як салодка спіць мая дачушка...

— Значыцца, так. Табе, чалавеча,— сказаў суддзя і паказаў на Крэчку,— цялушка застаецца, і з гэтага вось дурня,— торкнуў у бок багатага,— яшчэ сто рублёў прысуджаю, за хлусню.

Так вось усё і здарылася. Крэчка, як разбагацеў (а сто рублёў было надзвычай многа), то купіў сабе ладны кавалак зямлі і пабудаваў на ёй падвор'е. Там і яго продкі не адно пакаленне жылі. І паселішча паступова асобнае ўтварылася, якое назвалі Крэскам ці Грэскам.

## ЖЫЛІН БРОД

У даўнія часы тут жыў адзін чалавек, і прозвішча яго было Жылін. Чаму так празвалі — хто ж яго ведае. Мала якіх імён на свеце ёсць, і ніхто ім не здзіўляецца. Звалі дык звалі. Але справа не ў гэтым, а ў тым, як яно, імя гэтае, звязана з назвай вёскі.

У яго, у Жыліна, толькі адна жонка і была, а дзяцей ім Бог чамусьці працяглы час не даваў. Людзі-то хто спачуваў, а хто і пасмейваўся, бо такога не зразумее той, хто сам з горам не сутыкаўся. Не хадзілі амаль нікуды муж з жонкай, толькі працавалі ўвішна ды ў хаціне сядзелі. Гэта ад таго рабілі, каб лішнія плёткі пра іх не казалі. Маліліся, да Усявышняга звяртаючыся, спадзеючыся, што той пачуе і дапаможа ім у такой страшэннай бядзе, бо якая ж радасць жыць людзям на зямлі, калі нашчадкаў няма? Загніваеш, што тое дрэва, на карані і ўпадзеш — прыйдзе часіна. Толькі дрэва, у пераважнай большасці выпадкаў, памірае ў атачэнні маладых парасткаў, а тут... Смеху не было чуваць у гэтым кутку, можа, дзесяткі гадоў, бо ад чаго смяяцца? Ды зміласцівіўся над імі Бог, паслаў нашчадка.

Неяк восенню зацяжарыла Жыліна жонка, і летам у іх нарадзіўся сынок. Душы ў ім бацькі не чулі, не ведалі ўжо як гушкаць і забаўляцца з немаўлём! Здавалася, што і самі не спалі, і сыночку свайму не давалі, каб

толькі нацешыцца. А сынок, яго Пілiпком назвалі, ужо разумець усё пачынаў, першыя словы казаць стаў, з ім ужо цікава было пасядзець, паглядзець ціхенька, як ён у пясочку гуляе.

Ды зноў бяда страшная здарылася ў хаціне Жыліна. Прайшло ўсяго гады тры, як сынок іхні нарадзіўся, і цяжка захварэла жонка. Што толькі не рабіў бедны гаспадар! Як ён толькі ні спрабаваў паставіць сваю каханую гаспадыню на ногі, але ўсе намаганні былі дарэмнымі. Гарэла жанчына, трызніла ў забыцці нешта незразумелае. Кідалася бедная на ложку, а поруч з ёю сядзеў Жылін з чырвонымі ад бяссоння вачыма, і гуляў, неяк па-даросламу ціха, без смеху, Пілiпок. Аднае ночы гаспадыня ачнулася і паклікала гаспадара да сябе:

— Мужу, мужу, ці ты мяне чуеш?

Пытанне прагучала надзвычай ціха, таму чалавек, які, седзячы, забыўся ў сне, яго адразу і не пачуў. Тады хворая запыталася яшчэ разоў пару:

— Мужу, мужу, ці чуеш ты мяне? Прачніся, чалавеча? Я цябе вельмі прашу. Прачніся, бо будзе позна...

Жылін ад нечаканасці ажно ўздрыгнуў, бо спачатку яму, відаць, падалося, што гэта ўсё прысніласся.

— Што, што здарылася? — ён пакуль нічога не разумеў, бо жанчына ўжо даўно хварэла і не размаўляла з ім, таму пытанне заспела яго знянацку.

— Мужу, гэта я цябе турбую. Я, твая жонка. Выслухай мяне, калі ласка, уважліва, бо гэта мае апошнія словы. Адчуваю, што паміраю і што перад самым апошнім развітаннем ачнулася. Тут такая справа... Я памру, але да вас буду пастаянна прыходзіць, таму вы не здзіўляйцеся, бо гэта, мабыць, ад таго ўсё, што я вас надта пры жыцці любіла. Нічога благога не рабі і не палохайся, бо я вам таксама нічога дрэннага не зраблю...

— Не разумею,— толькі і прашаптаў у адказ Жылін.

— Дай мне развітацца з нашым сыночкам.

— Ён соладка спіць, даражэнькая...

— То ты яго не будзі, а толькі мяне павярні на бок...

— Зараз, чакай, я ўсё зраблю...

— Так шкада, што болей вас ніколі не ўбачу, не пачую вашыя галасы...

— Ты яшчэ паправіш здароўе і дачакаешся нават

унукаў,— паспрабаваў было супакоіць хворую Жылін, ды ў адказ толькі дзве вялікія празрыстыя слязіны скаціліся па яе ўпалых ад працяглай хваробы шчаках.

— Не трэба, любы, лішніх словак. Не трэба... Пакажы мне толькі сыночка ў апошні раз... Паспяшайся, бо я магу сканаць кожную хвіліну...

— Зараз, зараз, родненькая,— зарухаўся гаспадар і падбег да ложка.— Вось, цяпер табе добра бачна?

— Так, дзякуй, дзякуй... Я гэтак і паляжу, а ты таксама паспі, не палохайся. Да раніцы я не памру, бо як толькі Піліпка ўбачыла, то нібы нехта жывой вадой напаіў... Прыляж ды адпачні, змізарнеў і ты ад гора...

— Тады добра,— прамовіў Жылін і не распранаючыся бухнуўся на палок. Адтуль адразу ж данёсся храп стомленага чалавека.

З першымі промнямі сонца ён падхапіўся, але было ўжо позна. Ягоная жонка ляжала халодная, толькі шырока адкрытыя вочы нібы глядзелі на Піліпка, а на вуснах засталася шчаслівая ўсмешка...

Калі пахавалі жонку, то на Жыліна ўскінуліся ўсе клопаты. Калі былі ўдваіх і спорна працавалі, то іх было меней, а тут... Маленькі сыночак ні на хвіліну не адыходзіў ад таты і хадзіў за ім як хвосцік. Куды ішоў бацька — туды браў з сабою і Піліпка. Так цягнулася ажно два гады, а на трэці пачаліся ўсялякія гісторыі, якія і прывялі да трагічнага канца. Ды пра ўсё па парадку.

Аднае ночы прачнуўся Жылін ад таго, што ў хаціне нехта размаўляў. Адплюшчваць вочы не спяшаўся, старанна прыслухоўваўся, спрабуючы зразумець, хто б гэта мог быць. Вы думаеце, што гэта яму падалося? Ды не. Так было на самай справе. Адзін голас — дзіцячы — належаў, як і мае быць, яго сыну, Піліпку, а вось другі, другі быў... нябожчыцы-жонкі. Тут ён усхапіўся, але святла не запальваў. Галасы па-ранейшаму выразна гучалі. Маці распытвала сына пра тое, як яму жывецца. Малы адказваў і нават сам спрабаваў нешта выведаць у нябожчыцы. Здзіўлены Жылін не мог вымавіць ні слова, толькі сядзеў і слухаў. Так доўжылася да таго часу, пакуль не прапялі трэція пеўні. Як толькі пачуліся іхнія крыкі, здань тая адразу ж знікла, і сын спакойна працягваў спаць. Перапалоханы гаспадар спачатку нікому не распавядаў пра здарэнне, бо думаў, што ніхто не паверыць, а яго

самога палічаць за вар'ята. Ды выпадкі сталі паўтарацца рэгулярна: адзін раз у трое сутак. Жылін не ведаў, што рабіць. Потым вырашыў пайсці да мясцовага варажбіта. Як вырашыў чалавек, так і зрабіў.

Стары, увесь сівы нібы лунь варажбіт, прыжмурваючы вочы, слухаў аповед вяскоўца. Потым устаў і, выцягнуўшы прама перад сабою рукі, прамовіў:

— Дам я табе, чалавеча, гаршчок. Калі зойдзеш дахаты, то пастаў пасярод стала свечку, запалі яе і накрый гэтым вось гаршком. Дым будзе праходзіць праз невялічкую адтулінку ў донцы. Калі адчуеш, што тая здань прыйшла, адкрый свечку, і яна болей ніколі не з'явіцца. Справа ў тым, што мая свечка няпростая, яна замоўленая. Толькі ўсё зрабі па парадку, як я табе казаў, бо ў адваротным выпадку нічога не атрымаецца. Зразумеў?

— Зразумеў,— адказаў Жылін і, ухапіўшы Пілінка за руку, пацягнуў за сабою.

Прайшло два дні, прыспела тая трагічная ночка, калі здань павінна была ўвайсці ў хату, Жылін не спаў. Дачакаўся, калі добра сцямнела, і неўзабаве пачуў, як выразна рыпнулі дзверы і ў хату нехта ўвайшоў. Але па-ранейшаму нічога не было відаць. Хвілін праз колькі радасна загаманіў Пілінок, у адказ пачуўся смех здані. Тады гаспадар кінуўся да гаршка і зняў яго хуткім махам са свечкі. Тое, што ён убачыў, прымусіла яго ўздрыгануцца: над сыночкам, схіліўшыся амаль да самае галавы, стаяла ягоная... нябожчыца-жонка. Яна спалохана азірнулася на Жыліна і прамовіла з дакорам і слязьмі ў голасе:

— Што ж ты нарабіў, чалавеча? Ты ж усіх нас згубіў. Цяпер мы болей ніколі не спаткаемся, і, болей таго, цябе самога і нашага любага сыночка ў хуткім часе чакае смерць.

Прамовіла такія дзіўныя словы жонка-нябожчыца і знікла. Цяпер ужо назаўсёды, каб ніколі болей не падыходзіць блізка да гэтай, некалі роднай для яе, хаціны.

А праз дзён колькі Жылін разам з Пілінком шчыраваў на сенакосе, ля самага лесу. Хлопчык гуляў з невялічкімі грабелькамі, якія зрабіў яму тата, а бацька граб сена і скідаў яго ў копы. За гэтым заняткам вясковец не адразу пачуў, што нема крычыць дзіця, клікаючы на дапамогу. Кінуўся на крык і ўбачыў, як здаравенны воўк валачэ на сваім карку ягонага Пілін-

ка, а той заходзіцца ад жаху і болю. Звер кіраваў за рэчку. Ляцеў, нібы віхор, куды там паспець чалавеку. Але Жылін не адставаў. Толькі калі воўк кінуўся ў раку і паплыў, даганяты спыніўся, бо не ўмеў плаваць. Пакуль шукаў брод і знайшоў яго, то звера і след прапаў. Вылез на бераг Жылін і на месцы сканаў, не вытрымала бацькоўскае сэрца такога гора. Потым яго тут, на беразе, людзі і пахавалі.

Вось адкуль назва ў паселішча Жылін Брод... А сыночка яго так і не знайшлі, толькі непадалёку ад рэчкі, на кусце, пастухі заўважылі кавалачак тканіны ад дзіцячай сарочкі. То яго паклалі ў бацькаву магілу.

## ТАЛІЦА

Ото жылі-былі бедныя людзі — жонка і мужык. І было ў іх многа дзетак. Можа, дзесяць, а можа, і яшчэ болей. Усе яны былі такія маленькія, што не маглі дагледзець яшчэ адзін аднаго. Раз бедныя, то нават і кумоў сабе знайсці не маглі.

Вось нарадзілася ў іх чарговае дзіцятка, жонка і кажа на мужа:

— Трэба ж нам яго да царквы завезці ды ахрысціць, як усе спакон вякоў робяць. Бо калі так не зробім, то яшчэ хвароба ці лёс які дрэнны нашаму немаўлятку выпадзе. Ідзі, мужу, пашукай кумоў...

Вясковец той і пайшоў. Ідзе па дарозе, а сам сабе думае: «Добра, калі хто пагодзіцца, а калі не, то як мне дамоў вяртацца?..»

Ажно заходзіць у хаціну да аднаго свайго добрага знаёмага, з якім яшчэ ў дзяцінстве кароў разам пасвіў, і давай прасіць:

— Братка Мікалай, выручай. Здарылася такая бяда, што ніхто з вяскоўцаў не хоча ісці да мяне за кума, то, можа б, хоць ты падмог... Вельмі цябе прашу. Улічваючы наша даўняе сяброўства, дапамажы...

А гаспадар і адказвае:

— Чаго ўжо ты, суседзе, гэтак убіваешся? Я абавязкова пайду ў царкву за твайго кума, бо добра ведаю цябе самога, і тваю гаспадыню, і тое, як вам кавалак хлеба дастаецца. Таму не трэба лішні раз прасіць мяне, не трэба прыніжацца, я абавязкова прыйду, скажы

а якой гадзіне, ды ідзі сабе спакойна далей, куму шукай...

Крыху павесялеў селянін і, развітаўшыся ды прызначыўшы тэрмін, пакрочыў куму шукаць. Вось тут задача паўстала больш складаная. Але і на гэты раз пашанцавала бедняку. Напаткаў ён па дарозе маладзіцу, ды такую прывабную, такую прыгожую, што залюбаваўся ёю і спачатку забыўся нават, для чаго пайшоў з дому, але потым ачомаўся і звярнуўся да яе:

— Будзь ласкава, жанчынка, прабач, што я цябе ад справы, можа, якой неадкладнай адрываю. Але ў мяне выйсця іншага няма...

— Ды чаго ўжо, чалавеча, раз трэба, то спакойна сабе звяртайся, дапамагу, чым змагу.

— Хачу запрасіць цябе да сябе кумой. Але адразу папярэджваю, што сям'я мая надзвычай бедная, і асаблівых прысмакаў на стале не будзе. Гэта і ёсць мая просьба.

— Няма чаго, чалавеча, з-за гэтага перажываць, бо раз табе іншага выйсця нестае, то і гэта ўсё добра. Ідзі дамоў, а я заўтра раніцай прыйду да цябе і стану кумой для твайго дзіцяці...

Пайшоў мужык дамоў, і паклікалі яны ўсіх на сваё невялікае сямейнае свята, нават тых, хто пастаянна смяяўся з іхняй беднасці. Паклікалі, бо так наказала будучая кума. Яна ж папярэдзіла і пра тое, што выпіўка ды закуска — гэта яе справа, каб болей нікога не турбавалі.

Суседзі смяяліся, але ішлі, каб паглядзець, што ж там будзе, чым жа частаваць беднякі гэткую процьму людзей стануць. Сунуліся да паніклай хаціны і толькі адно — пераміргваліся сабе, маўляў, зараз утром насы ды павернем назад. Ды калі пераступілі парог хаціны, то адразу ж заціхлі і ашаломлена вачыма заміргалі, бо на сталах стаяла гэтулькі ежы, ды самай што ні на ёсць рознай, самай што ні на ёсць багатай. А ўжо выпіўка такая была, якой, можа, і самыя багатыя паны ніколі не спрабавалі выпіць за сваімі сталамі.

Пасталі людзі ля парога, тоўпяцца, а далей ісці баяцца, як іх гаспадыня з гаспадаром ні запрашаюць. Ды ўсё ж нейк упрасілі сесці за сталы. Тым часам і кум з кумою знайшліся і ўзялі справу ў свае рукі, каб вызваліць ад гэтага абавязку гаспадароў. Так усе панаядаліся і панапіваліся, што ўстаць з-за сталоў самастойна не маглі — цяжкавата было. Але гаспадарам

ужо дзякавалі ад шчырага сэрца, бо такой сустрэчы і пачастунку не чакалі. Калі ўсе запрошаныя нарэшце разышліся і ў хаціне з гаспадарамі засталася толькі адна кума, селянін не ўтрымаўся і запытаўся:

— Скажы мне, кумка, адкуль такія багацці, адкуль такія пачастункі і выпіўка? Не чакаў я, што такое ў нас на сталах стаяць будзе...

— Я ж табе, чалавеча, паабяцала дапамагчы, то і дапамагла, а пытанняў лішніх ты мне надта не задавай.

Ды селянін не адступаў, дапытваўся:

— Скажы, я нікому не раскажу, не палохайся.

— Раз ужо ты так прычапіўся, то ідзі за мной, я табе ўсё пакажу на месцы. Толькі ж глядзі, нікому пра гэта не кажы і нават не згадвай, бо ўсё можа потым абярнуцца супраць цябе самога.

— Ды пеажагнуцца магу,— запяшаўся селянін,— слова лішняга нідзе не вымаўлю.

— Не трэба жагнацца, не трэба,— спалохана запярэчыла кума, але мужык не звярнуў на гэта асаблівай увагі, бо хацеў хутчэй даведацца пра таямнічае ўзбагачэнне.— Ідзі за мной і нічога не бойся, усё будзе добра, толькі ступай след у след і не задавай пытанняў...

— Добра,— пагадзіўся вясковец.

Так і пайшлі. Як выйшлі з раніцы, то крочылі беспերапынна да самага вечара. Стаміліся страшэнна, але жанчына не спынялася, няёмка было казаць пра стому і селяніну, бо сам жа напрасіўся. Выбіліся на шырокае возера, канца і краю яму не бачна. А ўжо сонца за лес садзіцца. Нарэшце выйшлі на высокі бераг і ўбачылі невысокую хацінку, якая стаяла сярод здаравенных дрэваў, нібы якая непрыкметная купіна.

— Вось і дайшлі, чалавеча,— ціха прамовіла кума.

— Надта далёка ты, кумка мая, жывеш. Што рабіла ў нашым краі, раз я цябе там напаткаў? — пацікавіўся селянін, але на гэтае пытанне так і не атрымаў адказу, бо жанчына павяла яго за сабой у хаціну. Скрыпнулі дзверы, і яны апынуліся пасярэдзіне ярка асветленага пакоя. Паўсюдна гарэлі высокія і тоўстыя свечкі, а пасярэдзіне, на габляванай падлозе, было навалена... процьма срэбра. Вясковец ажно прысеў ад такога відовішча, бо гэтулькі багацця бачыў упершыню ў жыцці.

— І гэта ўсё тваё? — толькі і прашаптаў ён.

— Маё, маё,— адказала задаволена гаспадыня,— а цяпер пайшлі далей, яшчэ нешта ўбачыш...

Адчыніла яна дзверы ў другі пакой, пераступілі яны туды, і зноў ашаломлена залыпаў вачыма селянін, бо там ляжала ўжо не срэбра, а само золата. Яго было столькі многа, што і на хуткім кані нават не пераскочыў бы.

— І гэта тваё? — запытаўся чалавек, можа, нават не спадзеючыся атрымаць станоўчы адказ.

Але гаспадыня спакойна, з лёгкай усмешкай адказала:

— Маё, чалавеча, маё. Калі ўсё маё багацце разам скласці, то за яго можна жыць сотні гадоў многім тысячам людзей. Але такога ніколі не здарыцца, бо не атрымаюць яны майго срэбра-золата.

— Чаму гэта?

— Таму што замоўленае яно.

— Як замоўленае?

— А вось так.

— То, можа, мне распавядзеш?

— Распавесці можна, але гэта небяспечна, бо калі нешта не выканаеш, то жыццём заплоціш, зразумеў?

— Зразумеў, але ўсё роўна хочацца даведацца...

— Тады слухай. Золата-срэбра гэтае замовіла яшчэ мая маці — злая чараўніца. З таго самага часу ім магу распараджацца толькі я ўласнаручна, а калі каму і даю, то на свой погляд. Магу зараз і табе даць, колькі панясеш, але пры адной умове...

— Якой гэта?

— Каб да світання паспеў назад прайсці той дарогай, якой мы сюды прабіраліся. Павінен дасягнуць супрацьлеглага берага возера. Калі ж не, то каштоўнасці ператворацца ў сучча-ламачча.

— Згодны, давай,— усхапіўся селянін.

— Колькі табе? — запыталася кума.

— Сып поўны мех, як панесці...

Тая гэтак і зрабіла. Ухапіў вясковец мех і пайшоў. Падаў, уздымаўся, зноў падаў, але ўпарта прабіваўся наперад. Калі ўжо да берага заставалася ўсяго нейкая сотня метраў, з-за лесу паказаліся першыя прамяні сонейка, і гэта вымусіла чалавека пабегчы. Сабраў апошнія сілы і памкнуўся як мага хутчэй праскочыць гэтую адлегласць, ды не тут-то было! Не згледзеў і ўляцеў у балоцістую мясціну. І мяшок з рук выпусціць

шкада, і сам вылезці не можа. Толькі і пачулі людзі, як крычаў нехта:

— Таль... Талька... Таліца...

Вось так усё і сталася з назвай вёскі.

## ШАНТАРОЎШЧЫНА

Жыў тут у старадаўнія часы ксёндз Шантар. Надзвычай хітры і сквапны быў чалавек. Чаго толькі пра яго ні казалі, як толькі яго ні дакаралі, а з яго ўсё роўна што з таго тлустага гусака вада. Абцёрся, ускінуўся і зноў сухім з вады вылез. Сквапны такі ўжо быў, гаварылі, што леташняга снегу ніхто б не дапрасіўся, калі б некаму і спатрэбілася. На працу да Шантара наймаліся толькі тыя парабкі, якім ужо не было да каго ісці, а неяк жа трэба карміцца, хлеба ніхто за так на ўвесь год не дасць, не пазычыць. Пасля аднаго года (а болей у ксяндза ніхто не вытрымліваў) ягонае падвор'е нават жабракі з павадырамі і тыя абміналі, нібы нейкае заклятае страшным праклёнам месца. Але здарылася і злыдню-гаспадару натрапіць на чалавека, які і яго вакол пальца абвёў. Дзякуючы аднаму такому выпадку ён на ўсё жыццё ў памяці застаўся, вёску нават ягоным імем назвалі. А здарылася вось што.

Непадалёку ад жытла Шантара быў калодзеж, да якога па ваду хадзілі многія вяскоўцы. Яны ваду чэрпаюць, а ксёндз сядзіць сабе, у акенца паплёўвае ды прамаўляе:

— Вы ж не забывайцеся, чыю ваду піць-варыць бераце. Калі звярнуся за дапамогай ці за чым яшчэ, каб не адмаўлялі...

Была сярод вясковых жанчын адна вельмі прыгожая маладзіца. Надта яна ксяндзу спадабалася, і небеспадстаўна: страйнюткі стан, зграбная шыя, высокія грудзі. Здавалася, што яна ніколі і не працавала, а толькі і рабіла, што сачыла за ўласным целам. Адразу на грэх жанчыну падбіваць Шантар не адважваўся, але выйсце знайшоў своеасаблівае — як толькі тая па ваду нагіналася, каб зачарпнуць, Шантар ёй у гэты час пасвістваў. Жанчына рабіла выгляд, што нічога не чуе і не заўважае, а на самай справе пра ўсё распавяла свайму мужу, якога вельмі кахала. Выслухаў муж уважліва і на запытанне: «А што ж мне, беднай, рабіць?» — адказаў:

— А ты вазьмі і адсвісніся, паглядзім, што далей будзе.

Маладзіца так і зрабіла. Прыйшла раніцаю за вадою, а ксёндз ужо ў акне сядзіць і пасміхваецца. Толькі яна нагнулася, а ён — свісь! Жанчына тады яму ў адказ таксама — свісь! Дык Шантар ужо болей не саромеўся і ў адкрытую запытаўся:

— Данусечка, сонейка, а калі ж да цябе прыйсці мне?

Жанчына нічога ксяндзу не адказала, стрымалася, але дома мужу расказала. Той зноў параіў:

— Паабяцай, што скажаш тады, калі мяне не будзе дома. На млын паеду ці куды ў іншае месца падамся.

Прыйшла Данусечка да калодзежа, а сама не спяшаецца вады набраць, усё пакручваецца ды хітравата на ксяндзовы вокны пазірае. Шантар таксама не сядзеў склаўшы рукі, а ўсё пасвістваў бесперапынна ды цікаваў за прыгажуняй. Тады жанчына глянула апошні раз, кінула вачыма па вуліцы і бліжэй да акенца Шантаровага падышла:

— Як жывяце, святы ойча? Што ў вас новага, цікавага?

— Ды вось, Данусечка, чакаю, калі ж ты мяне да сябе ў госці паклічаш, калі ў цябе мужа дома не будзе, каб мы з табой пасядзелі спакойна, пагаманілі... Ды ўсё, сама бачыш, не выпадае нам.

— Чаму не выпадае? Сёння ноччу якраз-такі і можна будзе вам наведацца, муж мой на млын зерне павязе. Смела кіруйце, ніхто вас не напалохае, ніхто нам перашкаджаць не будзе.

— Вось добра, вось добра,— па-казлінаму затарабаніў ксёндз і памкнуўся было нават дакрануцца да Данусечкі, ды тая адхілілася:

— Што гэта вы, святы ойча? Яшчэ хто ўбачыць, тады, лічыце, усё прапала і дамоўленасці нашай ніколі не здзейсніцца.

Вечарам мужык запрог коніка, наклаў поўны воз мяхоў і паехаў. А Шантар толькі заўважыў гэта, то адразу ж са сваёй гарэлкай і прысмакамі паджгаў да маладзіцы. Прыбег, за стол сядае ды Данусечку просіць-загадвае:

— Накрывай на стол, расстаўляй усё, што я прынёс, гуляць з табой будзем...

Зрабіўшы ўсё як мае быць, сталі піць і есці, ды так шчыра, што толькі сківіцы трашчалі, нібы нямазаныя

калёсы. Потым Шантар пачаў падбіваць маладзіцу працягнуць справу ў ложку. Тая спачатку крыху паўпарцілася, а потым пагадзілася. Ды толькі раскрануліся, як нехта пачаў стукаць у дзверы. Усхапіўся ксёндз і замітусіўся па хаціне:

— Ой, што ж гэта будзе, куды мне лепей схавацца, Данусечка?

— А пад палок, святы ойча, схавайся, там цябе і сам чорт не знойдзе.

Шантар залез пад палок і не дыхае. А гаспадар увайшоў у хату, зняў з пляча хамут і вупраж, кінуў пад палок і сеў вячэраць. Есць ды ўсё пасміхваецца:

— Нешта, жонка, у нас пад палком чарнее. Можа гэта ксёндз да нас прыблудзіў? То прызнавайся, пакуль не позна і пакуль я сам туды не залез.

Упала Данусечка на калені перад мужам і, нібы апраўдваючыся, затарабаніла:

— Толькі не карай мяне, чалавеча, так яно і ёсць на самай справе, там айцец Шантар...

— То вылазь, святы ойча, на свет Божы, я на цябе гляну,— звярнуўся гаспадар да ксяндза. Той, ледзьве дыхаючы ад перапуду і сораму, вылез.

— Значыцца, так, ксёнджа. Патаўчэш усё проса, якое ў мяху, і дасі нам кавалак свайго поля, таго, што каля лесу,— то мы нікому не раскажам, чым ты тут займацца збіраўся, а не — зараз і пайду па вуліцы...

Бачыць Шантар, што няма іншага выйсця, і пагадзіўся ўсе ўмовы выканаць. Цэлую ноч напралёт тоўк проса, замарыўся, узмакрэў, потам салёным вопратка ягоная прасалілася, ледзьве паспеў да світання. І самае галоўнае — напісаў паперу, дзе добраахвотна адмаўляўся ад ладнага кавалка поля, што знаходзілася каля лесу і лічылася найбольш урадлівым.

Данусечка выйшла на наступны дзень па ваду, стала ля калодзежа і пасвіствае ціхенька, на вокны паглядваючы. А Шантар, седзячы за фіранкай, адно толькі злосна прамаўляў:

— Вы яшчэ і тое не паелі, што я вам за ноч патоўк! Падавіцеся, злыдні ненажэрныя!

Як кажуць, каму смех, а каму і грэх. Але ўсё на самай справе гэтак і адбывалася. Там, дзе Данусечка са сваім мужам стала жыць, пазней іхнія нашчадкі аселі, і паступова цэлая вёска вырасла. А назвалі яе па-дзіўнаму — Шантароўшчынай, ад імя таго злоснага і сквапнага ксяндза.



# СМАЛЯВІЧЫ

Горад гэты даўно ўзнік. Праўда, раней ён горадам не лічыўся, а быў простым мястэчкам, ці, як яшчэ казалі,— паселішчам.

Тут недзе даўней, можа, стагоддзяў пяць ці дзесяць таму назад, жылі дзед з бабай. І была ў іх, як у казцы звычайна здараецца, з усяе радні толькі адна ўнучка. Звалі яе Хрысцяй. Глядзелі яны яе добра, слова благога не сказалі, не дапусцілі, каб дзяўчынка нешта дрэннае зрабіла, таму і выгадавалі Хрысцю шчырай ды працавітай, спагадлівай да чужога гора. Потым, калі зусім пастарэлі, то ўнучка за імі глядзела, сачыла, каб усё было ў парадку і ў полі, і ў агародзе, і на стале.

Настаў час, і прыспела Хрысці замуж ісці, то яна так і зрабіла. Хлопец да яе пасватаўся надзіва, не паглядзеў на тое, што дзяўчына была з беднага роду, што не было ў яе багатага пасагу ды грошай за душою. Вырашыў узяць за жонку і ні перад чым не спыніўся.

Зажылі маладыя дружна і шчасліва. Новую хаціну паставілі, жывёлы багата развялі, а потым і дзеда з бабай да сябе ўзялі. Нарадзілася і ў іх дачка, назвалі

яе Агрыпінкай, ды, відаць, ад самага нараджэння лёс у немаўляці быў нешчаслівы. Хваравітая дзяўчынка надзвычай была, то тая хвароба да яе прычэпіцца, то іншая. Думалі бацькі спачатку, што не выжыве іхняя Агрыпінка, але ўсё пайшло найлепшым шляхам, стала дачушка папраўляцца.

Гэтае гора мінула — іншая бяда прычапілася. Старыя злеглі і болей ужо не ўставалі. Бедная Хрысця з ног збівалася, ведама ж, і дачка, і старыя хворыя на тваіх руках. Мужык ёй пастаянна дапамагаў, але не мог жаночай справы рабіць. Возьмецца, а яна ў яго з рук валіцца. Ды і настрою не было, што і зразумела. Як там працаваць будзеш, калі ўсе навокал плачуць і стогнуць.

Прайшло яшчэ тыдняў колькі, і памёр стары дзед. Ціха сканаў, з пачуццём выкананага абавязку на гэтай зямлі. Развітаўся з усімі, прабачэння папрасіў за тое, што, можа, калі каго пакрыўдзіў, не тое сказаў. Пахавалі яго, а праз які месяц і старая на той свет выбралася.

Каб жа толькі такое гора, а то пасля іх смерці яшчэ і Хрысця нешта стала сябе дрэнна адчуваць. Відаць, сказалася тое, што вельмі сваіх старых любіла і за іх перажывала. То была маладзіца, якіх пашукаць трэба, ды ці знойдзеш, а то высахла, нібы трэска, счарнела ўся, змянілася з твару, нават былыя сяброўкі пры сустрэчах з цяжкасцю пазнавалі. Муж ужо і гэтак дапамагаў, і прасіў-маліў яе, каб лепшае што ела, бо ўсяго ж у гаспадарцы хапала, імкнуўся дапамагчы, чым толькі мог, але ўсё дарэмна. Хрысця не папраўлялася, а, наадварот, ужо ледзьве хадзіла і задыхалася гэтак, нібы ёй ад нараджэння было не трыццаць гадоў, а ўсе сто. Падыдзе пару крокаў і вымушана адпачываць, бо здаецца жанчыне, што зараз зямля пад нагамі разыдзецца, і яна праваліцца некуды глыбока-глыбока. Але хоць трошкі хадзіла, а месяцаў праз колькі ўвогуле звалілася і ўжо з ложка не ўставала. Надта перажывала і пастаянна казала:

— Чаго ж гэта мяне Усявышні гэтак пакараў? Чаму я адразу не памерла, а вымушана пакутаваць ды яшчэ дачушку сваю родную і мужа мілага да знямогі давадзіць? Хай бы ўжо адразу, то і мне намнога лягчэй было б, і ім таксама...

Калі такія словы чулі муж ці Агрыпінка, то дакаралі яе.

— Навошта ты, мама, гэтак гаворыш? — пачынала малая.— Ці ж табе з намі дрэнна? Ці ж мы табе не дапамагаем, ці, можа, шкадуем нечага? А можа, татка да цябе блага адносіцца, то ты скажы...

Пасля такіх пытанняў Хрысця плакала горкімі слязьмі і з апошніх сіл прыціскала да сваіх знямоглых грудзей дачушку:

— Я болей не буду, родненькая, не буду... Прабач мяне... Не стрымалася проста... Прабач...

Муж мала сядзеў дома, бо яму і ў полі ды на сенакосе працы хапала. Але калі вяртаўся, то ніколі не клаўся спаць, пакуль не распытае хворую, што ёй трэба, што есці раніцай зварыць. Калі яму, выпадкам, даводзілася чуць гэткія сумныя словы, то і ён не стрымліваўся, выгаворваў жонцы, каб і думаць пра такое кінула.

— Што гэта з табой, міленькая мая? Няўжо ты забылася, як мы кахаліся? Няўжо забылася пра тыя ласкавыя словы, якія шапталі адзін аднаму? Мы ж абяцалі, што і ў шчасці і ў горы заўсёды будзем разам. Як нам добра было... Няўжо зараз ты думаеш, што я цябе не кахаю ці жадаю чаго благога? Аднаго я жадаю ўсім сэрцам, любая,— каб ты паправілася, ачуняла ды ўстала на ногі, а там усё пойдзе сваёй чаргой... Не раз, не два мы галасна заспяваем. Пабачыш... Будзеш яшчэ трымаць на руках нашых унукаў... Ты толькі не плач болей, стрымлівайся як-небудзь. Агрыпінка вельмі пакутуе, калі бачыць у тваіх вачах слёзы. Яна яшчэ далёка не ўсё разумее. Адчувае сэрцайкам, што нешта благое адбываецца, а зразумець не можа, і да мяне часта падыходзіць з пытаннямі...

— Добра, родненькі, я болей такога казаць не буду,— шаптала хворая ў адказ,— я ўсё таксама разумею, але нойдзе нейкі жудасны сум, і тады ўжо не магу стрымацца, каб не заплакаць... Гэта ж калі б зараз здаровая была, то працавала б не разгінаючыся, а так ляжу ў ложку ды яшчэ і цябе, стомленага, ад працы і сну адрываю.

— Ты ж казала, што болей не будзеш, а зноў за старое бярэшся,— перабіваў яе муж.

— Паеш, каханенькі мой, ды кладзіся спаць, ты ж ад стомы ледзьве сядзіш. Я таксама нешта спаць захацела, і Агрыпінка вунь як соладка спіць. Набегалася за дзень, натамілася, то і з боку на бок не перавернецца.

Толькі не злітаваўся лёс, не дапамаглі бабкі-варажбіткі, якіх гаспадар прыводзіў да хворай. На самым прадвесні памерла яна. А перад апошняй ноччу паклікала да сябе мужа і, папрасіўшы сесці побач ды ўзяць яе за руку, стала гаварыць:

— Калі здарыцца так, чалавеча, што мяне хутка не стане, то ты надта не ўбівайся і не перажывай, а жаніся другі раз. Знайдзі сабе маладзіцу і жаніся. Чаго ты будзеш адзін. Па сабе ведаю, як гэта дрэнна, як самотна... Агрыпінку толькі беражы, не давай яе ў крыўду. Яна, крывіначка мая, зусім яшчэ маленькая і цягнуцца да ўсіх будзе аднолькава, не разумеючы нават таго, што сярод людзей роўная колькасць і добрых, і благіх. Беражы яе, мужу...

Пагаманіла яна так, а потым упала ў забыццё і амаль тыдзень стагнала. Нарэшце лёс злітаваўся над ёю і душа пакінула змарнелае цела. Застаўся муж адзін з малой дачкой на руках. А па суседству жыла жанчына, у якой гадоў колькі таму памёр муж. Рознае наконт гэтага гаманілі людзі. Адны казалі, што сама маладзіца перавяла чалавека, бо вельмі нораў круты мела, іншыя сцвярджалі, што каханак яе трэснуў чымсьці бедалагу па галаве, і той сканаў. Ніхто праўды так і не ведаў.

Ды гамонка не пра гэта, а пра тое, што было і ў яе дзве свае дачкі. Як пабачыла, што Хрысця памерла, то адразу і прыліпла да суседа:

— Давай, суседзе, жыць у адной хаціне... І табе цяжка, а мне без мужыка ў гаспадарцы то і казаць няма чаго... Ночы навылёт плачу. Каб хто ведаў, як адной упраўляцца з цяжкімі работамі: араць, скародзіць, сеяць ды жаць... Давай.

— Давай,— пагадзіўся вясковец, прыгадаўшы словы нябожчыцы-жонкі.

Так усё па-добраму і пайшло б, калі б новая гаспадыня нораў мела спакойны. А то ж, даруй мне Божа! Сабака і той ласкавейшы намнога бывае, чым яна. Як муж у хаце, то рассыпаецца перад ім, нібы гарох па падлозе, а як яго дома няма, то толькі і робіць, што б'е небараку Агрыпінку ды па-ўсялякаму яе лае. Толькі і гэта не ўсё. Справа ў тым, што ад маці і дочкі перанялі такую звычку і таксама сталі здзекавацца над малой. Тая паплача-паплача, а бацьку праўды не кажа, калі той прыйдзе дамоў і пачынае дапытвацца, што яна рабіла ды ці не крыўдзіў яе хто. Але

і такіх здзекаў злыдням было мала. Рашылі зусім са свету дзяўчынку зжыць.

Неяк аднаго разу мачаха, калі гаспадар паехаў далёка ў поле, і гаворыць Агрыпінцы:

— Дачушка мая, што ж гэта ты такая невясёлая сёння? Можа хто цябе зняважыў ці аблаяў?

І так у яе ласкава атрымалася, што малая нават не паверыла сваім вушам. Няўжо гэтая жанчына можа размаўляць спакойна і спагадліва? Слязьмі заліліся яе вочкі, але тым не меней сказала зусім іншае, чым думала:

— Ды што вы, мама, усё ў мяне ў парадку, усё добра...

— Хачу, дачушка, павезці цябе з сабою ў лес. Я там буду дровы секчы, а ты гуляцца. Цацак з дому ўсялякіх набяром... Хочацца, мабыць, у лес, ні разу ж там не была?

— Ні разу,— праўдзіва адказала Агрыпінка.

— Тады зараз і паедзем. У мяне ўжо ўсё гатова.

— Каб толькі тата не хваляваўся і не крычаў на мяне потым, што без яго дазволу з хаты адлучылася...

— Не бойся, ты ж са мной будзеш, не адна. Я лес як свае пяць пальцаў ведаю. Паедзем.

Падманула малую, пасадзіла яе на воз і пагнала коніка што было сілы. Заехалі яны ў густы-густы лес. Там мачаха паслала посцілку, паклала на яе ўсялякія цацкі і сказала:

— Гуляйся, дачушка, тут, а я побач буду дровы секчы.

Каб малая не палохалася, то і каня побач прывязала. А сама сякерай пачала дровы секчы. Агрыпінка гуляла, гуляла з цацкамі, палахліва азіралася на кожны гук і трэск, а потым лягла на посцілку і зусім нечакана заснула. Спіць сабе спакойна і не пачула, як мачаха хуценька каня адвязала і дамоў пакіравала. Праспала малая якую гадзіну ці дзве, прахапілася, а побач нікога няма. Давай яна плакаць. Ды хто цябе ў глухім лесе пачуе! Тым часам хмара груваcтая неба сіняе засланіла, гром завурчаў, маланкі заблiскалі і такі лівень пайшоў, нібы хто з вядра на зямлю палівау. Сядзіць Агрыпінка на посцілцы пад елкай і плача-галосіць, на дапамогу кліча:

— Мама, родненькая! Татулечка, міленькі, дапамажыце! Дапамажыце, бо я надта баюся, што мяне звяры лютыя парвуць, што камары заядуць, што з голаду

памру... Ой, дапамажыце! Ой, як мне страшна і жахліва!

Але дзе там. Галасок слабенькі далёка не ляціць, ды і раскаты грому яго адразу ж заглушаюць. Змрок жа не чакае, а насоўваецца і насоўваецца ваўкаватай кудзеляй, забірае ў свой палон усё навокал: кусты, дрэвы, лістоту... Заснула зноў дзяўчынка, ды на гэты раз не ад таго, што нагулялася, а з перапуду. Уздрыгваюць худзенькія плечыкі, вішчаць-таўкуцца над яе цельцам камары...

У той вечар гаспадар прыйшоў дамоў і, як заўсёды бывала, звярнуўся да сваёй новай жонкі:

— Што тут новага ў нас? Што чуваць у вёсцы? Навіны якія?

— Ды нічога новага не гамоняць,— адказвае жонка.

Тады муж азірнуўся і зноў запытаўся:

— А дзе ж гэта наша Агрыпінка? Нешта я яе не бачу.

— Ведама ж, не бачыш,— перабівае яго жонка.— Я яе сёння пад полудзень да сваіх бацькоў, у суседнюю вёску, пагасцяваць адвезла.

Паставіла вячэру. Чалавек паеў і лёг спаць. І што ж вы думаеце? Нешта не спіцца гаспадару, дый годзе. Ён і на гэты бок перавернецца, і на той перакоціцца — не. Круціўся, круціўся і пытаецца ў гаспадыні:

— Што ж гэта такое? І натаміўся даволі, а заснуць не магу. Можа, захварэў у час працы, бо чым іншым можна растлумачыць тое, што робіцца?

— Не дай Божа, каб яшчэ і ты захварэў,— адказвае тая.— Я сябе пастаянна нешта дрэннавата адчуваю, дочкі скардзяцца, а тут яшчэ і ты...

Змоўк чалавек, сцішыўся і неяк усё ж задрамаў, праваліўся ў сон, нібы ў якую яміну. Але толькі захроп, як пачаў яму сніцца дзіўны сон: вось стаіць перад вачыма яго былая нябожчыца-жонка і з такім дакорам глядзіць, што хоць ты са скуры вылазь ды ўцякай куды-небудзь. Ні слова не гаворыць, а толькі глядзіць, дый годзе. Позірк цяжкі, страшны. Селянін не вытрымаў і запытаўся, папярэдне адышоўшыся крокаў на колькі:

— Што, Хрысцечка, з табою здарылася? Ніколі, пасля таго як памерла, не прыходзіла ў нашу хаціну, а сёння прыйшла, ды яшчэ з такім настроем? Адкажы, бо нельга мне нават глядзець на цябе спакойна.

— Глядзець спакойна? — перапытвае тая.— Бачыш, чаго захацеў? А ці ўсё ты зрабіў, мужу, каб сёння спаць спакойна?

— Усё, родненькая, нічога не парушыў і нідзе не саступіў. Усё як мае быць...

— Усё як мае быць,— передражніла нябожчыца.— А дзе ж наша дачушка?

Сказала гэтак і знікла, а вясковец прачнуўся. Прыўзняўся і кінуўся да ложка, дзе звычайна спала Агрыпінка. Яе там не было. Забыўся селянін, што яму казала жонка, і ўсклікнуў:

— А дзе ж дачушка?!

— Я ж табе казала, што да бацькоў яе завезла сёння,— сонна прамовіла жонка, перавярнулася на другі бок ды захрапла так, што ажно сабака на двары спалохана заціх. Гаспадар вярнуўся на сваё месца і зноў прылёг. Толькі заснуў, як зноў сніцца яму дзіўны сон, што нібыта стаяць перад ім ягоныя бацькі-нябожчыкі і сурова дапытваюцца:

— Куды гэта ты, злыдзень, дачушку сваю завёў? Ці ж не ведаеш ты, дурында, што яна зараз аднааднюсенька ў цёмным лесе ляжыць і плача? Хіба ж ты не ведаеш, што яе кожную хвіліну там ваўкі-звяры разарваць могуць, ці ад голаду, небарака, памрэ або ад крыку зойдзецца? Сам спіш, а жывая душа па тваёй віне мучыцца...

Нешта памкнуўся было адказаць ім гаспадар, ды не здолеў, толькі бязгучна плямкаў ротам, а перад вачыма плылі высокія, кашлатыя елкі, магутныя дубы, разгалістыя вязы і ясені. Потым убачыў і сваю... Агрыпінку. Яна працягвала да яго ручкі і плакала. Расплюшчыў вочы селянін і адчувае, што ўвесь мокры ад поту. Сеў і азірнуўся. Цяпер толькі зразумеў, што нешта страшнае здарылася. Бомкнуў у плечы кулаком гаспадыню і сурова прамовіў:

— Прачынайся ды адказвай, куды маю дачушку сёння завяла? Што з ёю здарылася? Гавары, не цягні, іначай не ведаю, што табе зраблю, калі разыдуся.

— Гэта ж, мужу, бяда здарылася,— пачала плакаць тая.— Паехала я ў лес па дровы. Узяла і Агрыпінку з сабою, ды забылася яе ў лесе, а калі вярнулася, то на ранейшым месцы малой не было...

— То чаму ж ты адразу мне праўду не сказала?— накінуўся было на яе чалавек, але потым зразумеў, што жонка і тут хлусіць. Апрануўся і выйшаў у двор,

каб ісці шукаць дачку. Выйшаў і стаў за парогам. Куды ж пойдзеш, калі на вуліцы яшчэ цёмна, і дзе дровы жонка брала — не ведае. Пастаяў, прыслухаўся да цішыні, і падалося яму, што нейкае дзіця нібыта непадалёку плача. На той плач і пайшоў у лес. Прайшоў, можа, з вярсту. Навокал такая цемра стала, што і дарогі не было відаць. Тады ён сеў у адчаі, уткнуўся галавою ў калені і заплакаў ад бяссілля, ад таго, што не можа дапамагчы любай дачушцы. Плача ды прымаўляе паціху сам сабе:

— Я ж тваёй матульцы, міленькая Агрыпінка, абяцаў, што вачэй з цябе спускаць не буду, што сачыць пільна стану. А вось што здарылася... Ой, Божачкі, як жа я людзям у вочы глядзець буду? Навошта ж мне жыццё такое?

Плача-прымаўляе і адчувае, што нехта трэцца аб ягонае калена. Ускінуў чалавек галаву і ўбачыў Рабку — сучачку, з якой так любіла гуляцца ягоная дачушка. Апошнім кавалачкам хлеба заўсёды дзялілася, не шкадавала нічога і ні разу, колькі жыла ў іхнім двару сучачка, яе не пакрыўдзіла.

— Што,— звярнуўся нібы да чалавека да яе вясковец,— страцілі мы з табой Агрыпінку? Як жа далей шукаць будзем? Калі невядома нават, у якім накірунку ісці?

А Рабка ўсхапілася і, паматляўшы хвастом, кінулася наперад. Гаспадар, асабліва не задумваючыся, пакіраваў за ёю. Але потым, калі прайшлі ўжо даставкова многа, зразумеў, што сучачка бяжыць па нейкім, адной ёй толькі вядомым, следзе. Падбяжыць, пачакае яго і далей імкнецца. Тут ужо і чалавек стаў сачыць па баках, углядацца ў кустоўе, ды і цемра пачала разыходзіцца.

Яшчэ, можа, праз вярсту гаспадар адчуў пах дыму. Едкага такога, густога. Мабыць, нешта гарэла. Спачатку ён успрыняў гэта спакойна, але потым жахнуўся: а што, калі там яго дачушка і ўжо захлынулася ад дыму?

Рабкі не было побач, яна некуды таропка панеслася, толькі хвосцік хвілін колькі мільгаў сярод травы і знік у хуткім часе. Зусім дрэнна стала на душы ў гаспадара. І так было не дай Божа, а яшчэ як пра пажар падумаў, то і ўвогуле настрой сапсаваўся. Ужо і спадзяванняў ніякіх амаль не засталося.

Ідзе і плача чалавек наўзрыд. А што ж яму, беда-

лагу, рабіць яшчэ заставалася? Ажно выскачыла прама перад ім Рабка і гэтак радасна заскавытала, гэтак забегала, што яму не па сабе стала:

— Чаго ты, воўчае мяса, радуешся? Чаго скачаш? У мяне вунь гора якое, а табе скакаць ды весяліцца трэба? — сказаў гнеўна чалавек і замахнуўся было на сучачку кіем, але тая нават і не звярнула ўвагі на яго пагрозлівы голас, па-ранейшаму бегала і падскоквала. Толькі тут селяніна нешта страсянула:

— Што, можа, Агрыпінка мая знайшлася? Можа, недзе на маю крывіначку наткнулася?

Пачуўшы пра Агрыпінку, Рабка закруцілася і заскакала яшчэ весялей.

— Няўжо, няўжо знайшла?

Цяпер ужо і селянін павесялеў.

— Рабачка, калі знайшла, то вядзі хутчэй! Хутчэй вядзі мяне туды! Чуеш, Рабачка, вядзі!

Але сучачка не магла адразу супакоіцца. Цяпер ужо вясковец не злаваўся на яе і не замахваўся, а толькі ўпрошваў:

— Рабачка, вядзі хутчэй мяне да дачушкі... Вядзі ўжо, бо болей не магу... Чуеш ты ці не?..

Сапраўды, Рабка нібы пачула просьбы гаспадара і паволі, пастаянна азіраючыся, падалася па лясной сцяжынцы ў глыб лесу. Вясковец подбегам крочыў за ёю і маліў Бога, каб усё спраўдзілася, каб дачушка ягоная знайшлася, а ён ужо болей ніколі да такога не дапусціць, не пакіне сваю Агрыпінку адну.

Нечакана сучачка супынілася. Прыціх на месцы і чалавек. Гледзячы, як Рабка скіравала да высокай елкі, ён таксама зірнуў туды і ледзьве не закрычаў, бо там, на голлейку, скруціўшыся колцам, спала ягоная дачушка, ягоная Агрыпінка! Каб толькі не напалохаць яе, ён падышоў паціху, стараючыся не наступаць ні на голле, ні на сучча, якое магло затрашчаць і напалохаць і без таго ўжо перапалоханую дзяўчынку. Падышоўшы да дачушкі, селянін стаў ля яе на калені і накрыў сваёй світкай. Тая нават не ўстрапянулася, а толькі цяжка дыхала. Бацька сядзеў побач і шчасліва ўсміхаўся, ля ног, таксама скруціўшыся колцам, ляжала і глядзела на яго сваімі разумнымі вачанятамі Рабка.

Можа, праз гадзіну Агрыпінка ўздрыгнула і адплюшчыла вачаняты. Яна, відаць, і не паверыла, што побач з ёю знаходзіцца бацька, бо адразу ж

заплакала. Тады тата ўзяў яе на рукі і пачаў дапытвацца:

— Як жа гэта ты, дачушка, без майго дазволу пайшла з мачахай у лес? Я ж цябе папярэджваў і прасіў, каб нікуды не ішла без мяне. Я вінаваты, маленькая, толькі я, але цяпер мы не будзем з ёй жыць, мы зажывём асобна. Што ўжо будзе, тое і будзе. Вось Рабку забяром і зажывём шчасліва ўтраіх. А як жа ты тут не згарэла, мая малюсенькая?..

— А я, татка, перабегла з аднаго месца на другое. Я начавала вунь там, а калі пачаліся грымоты ды пажар ад стралы Перуна ўзняўся, то сюды прымчала... Толькі смала, мабыць, недзе па дарозе на галаву капала, бо надта пячэ.

— Смалячанка ты мая...— ласкава шаптаў бацька і нічога вакол болей не бачыў.

Там і жыць сталі, дзе дачушка ўратавалася. Спачатку ўтраіх, як і гаварыў вясковец, а потым людзі сталі падыходзіць ды асядаць. Паміж сабою першую сям'ю Смалевічамі звалі. Адтуль і пайшло — Смалевічы, Смалявічы.

## ЖОДЗІНА (Жодзіна Слабада)

Жылі ў адным месцы чатыры пчаляры-бортнікі, і быў у іх за галоўнага чалавек, якога ўсе яны звалі Жодзін. Ён усім валадарыў, ён за ўсё і адказваў, калі што надаралася. Падпарадкоўваліся гэтаму пчаляру безагаворачна. Ніхто ніколі не чуў, каб нехта сказаў слова супраць ці не пагадзіўся зрабіць так, як яму было загадана. Жодзін гэты валодаў і магутнай фізічнай сілай. Такі ўжо быў здаровы ды вынослівы, што куды ні пойдзе, дзе ні будзе — да яго ніхто не прычэпіцца і не асмеліцца напасці, бо такі занятак быў раўназначны смяротнаму прысуду, які быў бы выкананы неадкладна.

Сядзелі аднаго разу тры бортнікі, адпачывалі пасля цяжкага працоўнага дня. Неяк міжволі завязалася ў іх размова пра асілкаў. Каго толькі ні згадвалі, каго толькі ні прыводзілі ў якасці прыкладу, але ўсе аднаназначна пагаджаліся, што ў даўнейшыя часы людзі былі намнога здаравейшымі і больш вынослівымі, чым зараз. Дубы цэлыя выварочвалі, без сякеры і пілы абыходзіліся, голымі рукамі ўсё рабілі.

Самы стары сярод пчаляроў, якога звалі Вісусам, успомніў пра тое, як некалі яму, тады яшчэ падлетку, ягоны дзядуля расказваў пра асілка, які цэлыя горы з месца на іншае месца за адным разам перасоўваў.

— Вось возьме гэтак голымі рукамі і цягне, толькі пачырванее, крывёю нальецца так, што, здаецца, зараз лопне і ўсё яму на тым самым месцы будзе.

— Бачыш ты, што выробляў,— азваўся другі бортнік, якога звалі Свістуном.— Гэта ж калі б ён зараз з намі быў, то мы б яго папрасілі, ды і заплацілі б добра, каб толькі ён поле наша агульнае ад камянёў расчысціў. Там жа такія вялізныя камянюкі, што мы і ўтраіх ім рады даць не можам. А тут адзін чалавек усё давёў бы да ладу...

— Звялі таго асілка з белага свету тым,— працягваў Вісус,— што папрасілі выкапаць глыбокі катлаван, нібыта для княжацкага палаца. Ен пагадзіўся, бо трэба ж было неяк сям'ю сваю карміць. А на самай справе яго заманілі злыя людзі, каб пазбавіць жыцця. Даўно яны зайздросцілі гэткай сіле і магутнасці, але нічога не маглі зрабіць у адкрытым баі, баяліся. Тады такі хітры ход і прыдумалі.

Выкапаў асілак яміну такую, што ўжо ледзьве зямлю з дна на паверхню даставаў кідаць, а княжацкія памагатыя ўсё ходзяць вакол ды пакрыкваюць:

— Мала яшчэ, мала. Капай глыбей, каб мацней княжацкі палац стаяў, каб потым ніякія буры-навальніцы яму не былі страшныя. Капай...

Асілак, якім бы ён ні быў здаровым і магутным, а ўсё ж стаміўся і паспрабаваў было прысесці, каб адпачыць хоць якую хвіліну. Ды дзе вы такое бачылі? Адразу наляцелі на яго паслугачы і гарлаюць:

— Калі будзеш сядзець, то не заплацім і паловы ад таго, што абяцалі! Глядзі, табе дзяцей карміць, а не нам! Не будзеш выконваць, то знойдзем управу!

Прамаўчаў асілак і зноў за працу ўзяўся. А яны...

— Што яны? — не вытрымаў самы маладзейшы сярод пчаляроў, якога звалі Адамчыкам.— Няўжо нешта благое прыдумалі?

— Благое? — перасмыкнуўся Вісус.— Каб жа толькі благое, а то такое ўчынілі, што і ў вас зараз валасы на галовах дыбарам стануць...

— То кажы далей, чаго ўжо. Заінтрыгаваў, дык дагаворвай...

— Значыцца,— працягваў Вісус,— выкапаў ён такую яміну, што ўжо і зямлі да верху дакінуць не можа, а слугі пільнуюць, каб не адпачываў. Потым незначэўку цэлае войска падышло і давай камяні вялізныя зверху кідаць, па галаве асілку цаляць. Білі да таго часу, пакуль ён не ўпаў, а калі ўпаў, то яшчэ доўга малацілі па знямоглым целе камянюкамі, дабівалі... Калі самі стаміліся, то адпачылі і прыняліся закопваць яміну. А над ёю яшчэ і курган высачэзны насыпалі, на той выпадак, каб не выбраўся, не ажыў багатыр, бо тады ім ніякага паратунку не было б. Так і згубілі дужага чалавека...

— Нелюдзі,— прашаптаў Адамчык і адвярнуўся.

Свістун моўчкі павярнуўся на другі бок і нічога не сказаў, толькі яшчэ болей спахмурнеў.

Мужчыны паляжалі некаторы час моўчкі, і потым азваўся Свістун:

— Мне таксама чуць даводзілася ад старых людзей, што ў нас былі здаравякі, праўда, не такія, як гэты асілак, але сілы былі немалой... Калі падчас бітваў узбройваліся ды выязджалі супраць ворагаў, то развальвалі ўдарам мяча ці шаблі сапернікаў ад пляча і да сядла, а галовы, то што тыя гарбузы скочвалі. Пра аднаго надта мне спадабаўся аповед. Ад бабулі чуў. Яна — ад свайго дзеда.

«Аднаго разу ўсхадзіўся бык на пашы і давай бегаць-ганяцца за каровамі. Не тое, што іх там мілуе пасвойму, а, наадварот, б’е да смерці са страшнай сілай. Не глядзіць — старая гэта карова ці цялятка, а раз натрапіў — то і смерць! Пастухі спачатку паспрабавалі неяк з ім справіцца, ды не тут-то было! Як кінуўся на іх бык, то трое паспелі адскочыць, а аднаго на рогі ўзняў і як грохнуў, то было яму тут апошняе трызненне. Астатнія перапалохаліся і паўцякалі.

Людзі баяліся з хацін выходзіць, ваўкі ў адкрытую на жывёлу палявалі, нібы ім хто падказаў, што зараз вяскоўцы не страшныя, бо не да гэтага ім. Так, можа, цэлы тыдзень працягвалася, ніхто рады раз’юшанаму быку даць не мог. Пакуль адзін стары дзед не выйшаў да суседзяў і не сказаў, што знайшоў паратунак.

— Які? — усклікнулі ягоныя аднавяскоўцы.— Кажы, старэча, не цягні, бо нам кожная гадзіна зараз надзвычай дарагая...

— А што ўжо тут цягнуць. Унук у мяне ёсць. Яго можна папрасіць разабрацца з быком. Гэта для яго плёвая справа...

— Для каго — для быка? — не ўтрываўся, каб не пасмяяцца нехта з вострых на язык.

Усё навокал скалыхнулася ад смеху.

— Ды не, для ўнука,— спакойна адрэагаваў стары,— ён у мяне крыху ўжо ў сілу ўвайшоў. То няхай і паспрабуе даказаць сабе самому, на што здольны, а то ўсё хлопец губляецца, усё перапытвае ды распытвае...

— Раз такая справа, то сапраўды, няхай паспрабуе, а раптам што добрае і атрымаецца. Толькі мы, старэча, адразу агаворымся, што небяспечная гэта справа і ўсялякае можа здарыцца. Каб потым мы вінаватымі не аказаліся.

— Ды што вы, людзі добрыя,— адмахнуўся стары,— ён жа сам мяне да вас паслаў, каб я вам ягоную просьбу перадаў. І ўнук і я ведаем, чым рызыкуем, але нельга, каб далей так працягвалася. Скажыце лепей, дзе таго быка шукаць?

— За Ярчыным лугам яго ўчора бачылі. Там насіўся, нібы шалёны, Мітрыкаву кароўку ганяў...

— То я, людцы, пайду. Заўтра ўнучак будзе таго бычка вашага шукаць, каб з ім разлічыцца.

На наступны дзень і сапраўды пайшоў той унук шукаць быка, і што самае дзіўнае — нічога ў руках не меў, акрамя невялічкага кіёчка, якім можна было ката напалохаць, але не такога раз'юшанага бугая.

Доўга хадзіў хлапчына, але нідзе быка не было. А тая жывёліна хітрая надзвычай была, нібы які воўк, з-за кустоўя цікавала за чалавекам, выбіраючы зручны момант для нападу. Вочы крывёю паналіваліся, капытамі зямлю дзярэ, а з засады не выскаквае, чакае свайго моманту.

Сеў дзяцюк на пянёк і галаву журботна схіліў. «Вось,— думае,— людзям паабяцаў, а дапамагчы і не здолею, бо не знайду жывёліну...» Сядзіць сабе, думу горкую думае і не заўважыў, як задрамаў. Бык жа тым часам падкраўся зусім блізка, узняў свае жахлівыя рогі і паімчаў на спячага чалавека. То добра, што пашанцавала, добра, што нарадзіўся пад божай зоркай, якая яго ў жыцці, мабыць, засцерагала! Калі жывёліна паімчала, то трэснула голле там-сям, і гэта абудзіла хлапчыну. Усхапіўся ён, але ўхіліц-

ца ўжо не здолеў. Страшнай сілы ўдар прыйшоўся прама ў грудзі. Дзяцюк высока ўзляцеў і, разоў колькі перакуліўшыся, гопнуўся долу, толькі рэха пайшло па наваколлі. Бык задаволена мыкнуў і паляцеў дабіваць павержаную ахвяру. Ды праслічыўся бугай, бо хлопец быў надзвычай дужы і паспеў узняцца на ногі. Калі ягоны сапернік падляцеў, каб зноў махнуць рагамі, то ён з усяе сілы ўжарыў яго кулаком прама паміж рагоў. Гэта быў такі ўдар, што бык толькі і паспеў раўнуць апошні раз у сваім жыцці. Паволі асунулася жывёліна на ўсе чатыры нагі, а потым гэтак жа паволі паваліласяна бок.

Вяскоўцы сустракалі хлапчыну, нібы якога вызваліцеля ад цара-цмока. Віталі, зычылі сто гадоў жыцця, а то і болей...»

— Якой жа сілай трэба валодаць, каб быка забіць на месцы,— здзіўлена прамовіў Адамчык,— нават і ўявіць сабе цяжка...

Вісус толькі згодна махнуў галавой, і зноў усе заціхлі.

Глядзелі ў сіняе неба бортнікі і маўчалі, бо добра было вось так ляжаць на мурагу, адпачываць ды перамаўляцца з людзьмі, з якімі ты пастаянна працуеш і якім давяраеш, ведаеш, што яны, калі трэба будзе, абавязкова за цябе ўступяцца, не пашкадуюць ні кавалка хлеба, ні вольнага свайго часу, ні нават, калі спатрэбіцца, то і свайго жыцця. Можа б, яшчэ што прыгадалі і пераказалі адзін аднаму, ды прыйшоў Жодзін. А ён надта не любіў проста так бавіць час, няхай сябе і вольны, няхай сабе і пасля цяжкай, стамляльнай працы. Агледзеў сваіх падначаленых і сказаў:

— Вось што, хлопцы, тут навіна такая... Я толькі што, па дарозе з вёскі, заходзіў на наш пчальнік і знайшоў там...

— Што ты там такое ўмудрыўся знайсці? — ажно ўзвіўся Вісус.

— Мабыць, маладзіцу недзе там у кустоўі намацаў?..

Рагатнулі ўсе адразу, магутна, але коратка.

Адамчык, то той ажно галавой захістаў, бо ў сапраўднай блізкасці з жанчынай яшчэ ніколі не быў, і таму яму гэта ўсё здавалася нейкай далёкай і таямнічай марай.

— То што ж ты там, Жодзін, знайшоў? — перапытаў Вісус.— Скажы, а то заўсёды так — падраж-

нішся ды прымусіш галовы ламаць, самім здагадвацца...

— Не прымушу, бо ўсё роўна, як ні ламайце — не здагадаецеся... Там, хлопцы, знайшоў я... козліка.

— Казла? — здзівіўся Свістун.— І трэба было нас гэтак інтрыгаваць, каб потым такое сказаць?

— А што, казёл — ён і ёсць казёл,— па-філасофску зазначыў Вісус.— Жывёліна, якіх многа. Пабегае, траўкі паскубе, вадзіцы пап'е, задзярэ хвост, ды толькі яе і бачылі: скок, скок, і ўжо далёка.

— Ага,— уставіў свае тры капейкі і Адамчык.

— Дарма смеяцеся,— сказаў Жодзін.— Козлік той не дзікі, як вы падумалі, а свойскі, і ён не збег, а я яго прымкнуў у нашым буданчыку, так што заўтра і мяса свежае будзе...

— А можа, ён ад нейкага пастуха збег ці ад старой, якая за ім гнацца не здолела? А мы яго адразу зарэжам і сабе на мяса пусцім... Нас жа ў зладзеі залічаць, скажуць вяскоўцы з бліжэйшых вёсак, што мы ў сваіх людзей крадзем,— засыпаў меркаваннямі Адамчык.— Нельга, мне здаецца, так рабіць, не па-людску ўсё гэта...

— Сапраўды, з-за дробязі могуць потым вялікі агонь раздзьмухаць і нас ва ўсіх грахах абвінаваціць,— далучыў свой голас і Свістун.— З-за такой дробязі потым зладзеямі зробяць. Мы колькі ўжо разам жывём, разам працуем, а ніколі чужога не бралі. Не трэба, відаць, і на гэты раз надта рот разяўляць. Каб праз тыдзень мяса гэтае нам не засмярдзела...

— Не галодныя мы. У нас пастаянна нейкая дзічына ці птушка ёсць,— пагадзіўся і Вісус.— Распытаць трэба, чыя жывёлінка, ды назад яе вярнуць. Да гаспадароў адвесці.

— Раз ужо вы так вырашылі, то і я з вамі згодны,— схіліў сваю лахматую галаву Жодзін.— Заўтра пойдзем па вёсках ды распытаем, ці не згубіў хто з людзей козліка. Сапраўды, нешта я тут даў маху, не падумаў...

Пераспалі бортнікі і раніцай пайшлі на пчалярню, бо працы ў іх там было заўсёды многа, асабліва вясной ці летам. Заглянулі ў буданчык і заўсміхаліся: там спакойна спаў козлік, беленькі, маленькі, як тое немаўля.

— Пайшлі, хлопцы, па вёсках і каб да полудня ўсе тут зноў былі, сваёй працай займацца станем,— загадаў Жодзін.

Але колькі ні хадзілі, колькі ні перапытвалі сялян — ніхто не сказаў, што ў яго загінула жывёліна, ці нехта яе ўкраў, ці некага там падазраюць. Сабраліся пчаляры на ўмоўленым месцы пасля полудня і расказалі, што дзе хто чуў. Жодзін уважліва выслухаў і сказаў, на гэты раз цвёрда і без усялякіх хістанняў:

— Раз ужо так здарылася, то будзем яго гадаваць у сябе. Тут, на пчольніку, і травы многа, і вада ёсць, і ад ваўкоў яму пагрозы не будзе, бо мы ж пастаянна прысутнічаем. Потым, калі нам спадабаецца, то і казу завядзём, гаспадарку агораем. Мы ж таксама людзі, чаго нам такога занятку саромецца.

— Во-во, нам яшчэ тут маладзіц, Жодзін, не хапае, дзетак малюсенькіх, крыкаў іхніх,— падкалоў яршысты Свістун.— Што ж гэта за жытка, калі жонкі няма і ні разу не палаешся...

— А што, раз жонка, то і лаянка абавязкова? — наіўна запытаўся Адамчык.

На гэты раз усе зарагаталі так, што ажно верхавіны дрэваў уздрыгануліся і, здавалася, таксама рагочуць разам з людзьмі.

— Хе-хе-хе,— ледзьве выдыхваў Свістун.

— Ой-ой-ой,— раскацíста бухкаў Вісус.

— Го-го-го,— гігікаў Жодзін.

Разгублены Адамчык пазіраў па баках, а потым і сам далучыўся да астатніх.

Калі супакоіліся, то Вісус, як найбольш вопытны і спрактыкаваны чалавек, пачаў даводзіць маладзёну, што жонка — гэта як і чорт: ты яго не чакаеш, а ён з'явіўся. Ды чорт яшчэ не надта страшны, бо і ён жанчыны баіцца.

Так і стаў жыць маленькі козлік на пчалярні. Усё добра ішло, усё спакойна. Працавалі людзі, як і раней, хапала ім усялякіх клопатаў, ды з-за гэтых будзённых драбніц яны і да бяды вялікай дакаціліся.

Неяк прыгаў іхні козлік па пчалярні і няўдала за корч зачапіўся, грохнуўся на ўсе чатыры капыты і ледзьве ўзняўся, а калі ўзняўся, то не мог болей бегчы, нават пераступіць з капытца на капытца і то не здолеў, бо зламаў сабе... ножку. Вісус, а ў той дзень за пчоламі глядзеў ён, падбег да жывёліны і прыцягнуў да будана. Гэтак да вечара яго і пакінуў, пакуль астатнія не прыйшлі. А калі бортнікі пазбіраліся на

пчалярні і даведаліся, што здарылася, то Жодзін параіў самае простае:

— Хлопцы, давайце яму нагу перавяжам ды да якога кіёчка прывяжам, то яна сама па сабе і зрасцецца.

Адамчык, той прапанаваў зусім іншае:

— Давайце я яго ў бліжэйшую вёску занясу, да варажбіткі якой, і яна на месцы ўсё зробіць.

— Ага,— падкалоў яго Свістун,— там, у той варажбіткі, і застанешся, толькі паглядзі, каб у яе зубы свае былі, а то, можа, ужо ад старасці павыпадалі, то тады табе ёй жаваць давядзецца.

На гэты раз ніхто не засмяяўся, ды і сам Свістун, хутчэй за ўсё, пажартаваў проста так, бо трэба было нешта сказаць. Тым не меней Адамчыка ў вёску не адпусцілі. Перавязалі жывёліне нагу і прыкруцілі да гладка аструганага кіёчка. Так козлік і кульгаў непадалёку. Сваімі няўмелымі скачкамі зараз ён толькі выклікаў спачувальны смех у бортнікаў:

— Глядзі, як сівы козлік шпацыруе, нібы які начальнік,— не змаўчаў Свістун.

— Як Свістун да дзевак на вячоркі паклыпаў,— удакладніў Вісус.

— Ага,— пагадзіўся Адамчык,— надта падобна.

Як толькі ён так сказаў, то ўсе, і Свістун таксама, заліліся смехам. Жодзін і той не ўтрымаўся.

Аднойчы, калі ўжо добра змяркалася, а на пчалярні з мужчын былі Жодзін і Свістун, усхадзілася бура, ды такая, што дрэвы высачэзныя і таўшчэразныя з каранямі выварочвала. Жодзін, услухоўваючыся ў шум-гуд, прапанаваў свайму сябру:

— Трэба глянуць, што робіцца, бо так можам усіх пчолак за адну ноч страціць.

— Ага,— пагадзіўся адразу той.

Выскачылі з хацінкі і ажно жахнуліся: дрэвы валіла, нібы тоненькае голлейка якое, і перакідала на дзесяткі метраў. Але пчалярня стаяла нібы ў даліне, і таму ёй небяспека не надта пагражала, а вось жыллё пчаляроў было ў небяспецы. Таму мужчыны вырашылі перабрацца ў нізенькае кустоўе, дзе б ім бура нічым не пагражала. Свістун сказаў Жодзіну:

— Трэба ж козліка нашага забраць...

— Забяры — і пайшлі далей, перачакаем, пакуль перашуміць.

Селі ў кустоўі, добра там, але вецер наскрозь прадзімае. Таму развялі агеньчык. Угрэліся і паснулі, коз-

лік таксама ля іх прылёг, ды занадта блізка ад вогнішча. Таму, калі пчаляры паснулі, то агонь стаў моцна прыпякаць, а жывёліна нават і не пачула, як задымілася анучка на зламанай назе. Прачнуўся козлік ад невыцерпнага болю і кінуўся ўцякаць. Ведама ж, бег, куды вочы глядзелі, і выскачыў прама на пчалярню. Дастаткова яму было там кінуцца туды-сюды, і зыркае полымя ахапіла ўсе вуллі, перакінулася на лес. Калі мужчыны прачнуліся, ужо было позна што-небудзь ратаваць.

Пастаялі раніцай пчаляры на месцы сваёй былой пчалярні, азірнуліся сумна і пайшлі жыць на новае месца. Праўда, ужо не толькі пчоламі займаліся, але і іншай вясковай гаспадаркай. Дружна жылі, адзін аднаму дапамагалі, а паселішча сваё назвалі Жодзіна Слабада, а потым ужо яно горадам Жодзіна стала.

## БАБІН ЛЕС

Аднаго разу, а калі гэта здарылася — ніхто дакладна не памятае, на нашу зямлю напалі сасы (гэтак нашы продкі называлі шведаў). Нечакана здарылася такое ліха. Не паспелі добра да адпору ворагаў падрыхтавацца мясцовыя жыхары. Мужчыны пастаянна пад страхам хадзілі, што ў любы момант чужынцы напасці маглі, таму калі прыскочылі вершнікі і данеслі князю, што ворагі перайшлі мяжу, дружна ўскочылі на коней і паімчалі сустракаць няпрошаных гасцей. Дома засталіся толькі старыя, малыя ды жанчыны. Усе спадзяваліся, што ў хуткім часе, як нярэдка здаралася, вернуцца іхнія родныя з перамогай. Але на гэты раз было па-іншаму. Прыскакаў запылены вершнік на ўзмыленым кані і, папрасіўшы вады, прыпаў да гладыша з малаком, а потым, пераведшы дух, загаварыў:

— Людзі добрыя! Разбілі нас сасы... Разбілі княжацкую дружыну, бо надта ж многа іх было... На кожнага нашага воя даводзілася па пяць-дзесяць чужынцаў... Паспрабуйце тут змагацца, калі нават і паварочвацца ў сядле не паспявалі. Самога князя, цяжкапараненага, адвезлі і схавалі ў непралазнай пушчы, дзе ён і ляжыць зараз з усяго нейкім дзесяткам ацалелых у сечы дружыннікаў. Таму ўцякайце, пакуль ёсць магчымасць. Хавайцеся па толькі вам вядомых

балацінах ды выспах сярод лясоў і там чакайце, пакуль наш князь выздаравее ды збярэ новую дружыну. А там ужо мы з ворагамі па-іншаму пагаворым... Уцякайце, родныя, беражыце нашых дзяцей, бо яны ж наша будучыня, яны наша спадзяванне. Можа, ім давядзецца біцца з захопнікамі-сасамі. Уцякайце...

— То перадыхні і ты, чалавеча,— выдыхнуў нехта з вяскоўцаў,— стаміўся вунь як, зараз з сядла ўпадзеш. Паспі гадзіну-другую, а потым і далей можаш скакаць. Мы павартуем, не бойся...

— Дзякуй вам за спачуванне, каханыя мае, але не магу я ні на хвіліну затрымлівацца ў вас, бо трэба скакаць у іншыя паселішчы, таксама папярэджваць людзей аб небяспецы.

— То, можа, хоць чым-небудзь дапамагчы табе можам, чалавеча? Ты не саромейся, гавары, што трэба, абавязкова выканаем,— зноў данеслася з натоўпу.

— Дапамагчы? — перапытаў вершнік і ўстрапянуўся.— Можаце дапамагчы... Ведаеце што: збірайцеся самі і пашліце пасланцоў па бліжэйшых паселішчах, бо я ўсё роўна ўсіх папярэдзіць адзін не паспею. А так усе разам мы вельмі многіх ад смерці выратуем...

Так вырашылі, гэтак і зрабілі. Паляцеў вершнік стралой у адным накірунку, а найбольш вынослівыя ды кемлівыя з мясцовых жыхароў паджгалі па бліжэйшых населеных пунктах, каб папярэдзіць тамтэйшых тубыльцаў аб небяспецы.

Астатнія вяскоўцы доўга не марудзілі, а, як ім і раілі, закапалі самае каштоўнае, хатні нажытак прыхавалі, дзяцей з сабой пабралі, жывёлу і пакіравалі ў глухія лясныя нетры, дзе і з мясцовых далёка не кожны мог свабодна арыентавацца, асабліва ў такі час, калі ўсё навокал квітнела і зелянела, а незнаёмаму воку здавалася аднолькавым.

Доўга гналі жывёлу, ішлі, заблытвалі сляды, каб не падкраліся потым знячэўку чужынцы, не захапілі знянацку. Ды яшчэ ж і тое трэба было ўлічваць, што рухаліся жанчыны і дзеці, а дзе ж гэта вы бачылі, каб яны нешта надта хутка рабілі? Хіба што з мужыкамі палаяцца, то тут калі ласка. Дзеці патаміліся, пачалі плакаць, але спыняцца нельга было, бо гэта магло дрэнна скончыцца. Таму каго прасілі, каму пагражалі, але ішлі і ішлі. Наперадзе незвычайнага абозу ішоў сухенькі старэнькі дзядулька. Бойка кіраваў,

здавалася, неяк смешна падскокваў ды, пастаянна азіраючыся назад, паціху гаманіў:

— Трэба яшчэ далей, яшчэ, родненькія. Да маёй мясціны вёрстаў з дзесятак добры будзе. Пайшлі, пайшлі, а там ужо ўсе разам адпачнём. Не будзе каго баяцца. Туды ніхто не дабярэцца.

Добра сказаць — дзесяць вёрстаў, гэта калі па добрай дарозе, а калі па лясной? І хто іх увогуле тыя вёрсты мераў? А можа, яны з гакам? А гак той яшчэ столькі ж...

Ледзьве на нагах трымаліся, а ўсё ж ішлі наперад. Недзе ажно пад полудзень наступнага дня дзядулька радасна ўсклікнуў:

— Ну вось, родненькія, бачыце высокія дубы?

— Бачым, дзядулька,— адказалі яму тыя, хто яшчэ здолеў размаўляць.

— Бачым...

— Вось за імі і будзе той самы мой востраў. Туды мала хто і з маіх сучаснікаў дарогу ведаў, а з вас, то, можа, ніхто і не бываў. Чужынцам, думаю, таксама дарога туды будзе замоўлена. Хіба хто з нашых прывядзе, даруй, Божа, мне такія думкі...

— Ды хто ж прывядзе, дзеду, калі мы ўсе сюды пайшлі, дома ні душы не засталося,— азваўся звонкі хлапечы голас.

— Заўсёды так, унуча, здаецца, а на самой справе паварочваецца ўсё іншым бокам. Заўсёды знойдзецца які-небудзь злачынца...

— Кінь, стары, а то на самой справе накаркаеш бяду якую,— азвалася старая бабулька, якая клыпала ўсю дарогу нароўні з астатнімі.— Заўсёды так здараецца: калі доўга гаворыш, то абавязкова бяду-гора наклічаш на сваю галаву. Яшчэ калі на сваю ды на маю, то не так страшна, але ж паглядзі, колькі тут маладзіц ды дзяцей. Ім жа жыць ды жыць...

— Я нічога дурнога на розуме не меў нават, але неяк само вырвалася,— пачаў апраўдвацца праваднік.

За такімі лянотнымі перамовамі нарэшце дайшлі да месца прызначэння, і дзядулька сказаў:

— Вось тут і жыць станем, тут і сядзем...

Усе адразу, нібы падкошаныя, паваліліся на зямлю і захраплі на розныя галасы.

Не спаў толькі стары праваднік. Ён сядзеў на невысокім пеньчуку і пільна ўглядаўся ў той бок, адкуль

яны толькі што прыйшлі. Не цяжка было здагадацца, што гэты чалавек застаўся вартаваць сон іншых.

На наступны дзень усё стала на свае месцы: старыя і падлеткі майстравалі часовае жыллё як для людзей, так і для жывёлы, жанчыны спрабавалі нешта зварыць, каб накарміць дзяцей і пад'есці самім. Нават самую сапраўдную варту выставілі і аднеслі яе вёрстаў за колькі ад месцажыхарства, каб, на выпадак чаго, паспелі папярэдзіць аб небяспецы.

Так і зажылі вяскоўцы ў гэтым лясным паселішчы. Можа, гэтае слова і не надта падыходзіла для такога лагера, але людзі сапраўды жылі, хоць і знаходзіліся пастаянна ў прадчуванні бяды. На шчасце, яе болей не здарылася. Але калі прайшоў месяц, усе зразумелі, што цяпер трэба рыхтавацца да зімы, а гэта азначала — будаваць больш прыстасаваныя да халадоў і завеяў памяшканні. Няхай сабе гэта былі не хаты і пуні, а зямлянкі і паўзямлянкі — усё роўна майстэрства тут адпаведнае патрабавалася. Кіравалі ўсёй працай старыя, якія самі ўжо ледзьве хадзілі, а выконвалі без пары ўзмужнелыя падлеткі ды, зноў жа, жанчыны, на плечы якіх выпалі ўсе цяжкасці гэтай навалы.

Нейк агоралі сабе будыніны і перажылі першую суровую зіму, а вясной заўсёды весялей і вальней людзям дыхаецца. Пачалі ўжо палеткі шукаць бліжэй, каб жыта якое сеяць, агародніну садзіць. Адным словам, жывыя пра жывое дбаюць. Аднаго разу і не заўважылі нават, як у павелішчы з'явіліся ўзброеныя вершнікі. Спачатку надта спалохаліся вяскоўцы, падумалі, што гэта чужынцы, але потым пазналі ў адным з іх таго самага дружынніка, які папярэджваў іх аб небяспецы. Ён зарагатаў і гучна вымавіў:

— Колькі ні ехалі — усё пуста і пуста, а тут нейкі Бабін Лес.

Як сказаў, так і засталося назаўсёды...

## ЖАЖЭЛКА

Дзіўная назва ў нашае вёскі, і з даўніх часоў яна пайшла.

У паселішчы, а яно спачатку не тут, дзе зараз, было, а зусім у іншым баку, жылі мужык ды жонка. Нічым асаблівым іхняя сям'я не вылучалася, хіба што тым, што жонка надта ж не любіла свайго гаспадара. Як толькі прачнецца, вочы прадзярэ, то давай на яго па-

ўсялякаму лаяцца. Такога нагаворыць, што каб яно здзейснілася, то ў адзін момант ад мужыка толькі гурбачка попелу засталася б. Гэта ж падумаць трэба! Бацьку сваіх дзяцей і такога жадаць! Ды для ліхой бабы ўсё было проста, як свіснуць:

— Каб жа ты ногі не валачыў! Каб жа табе мая ежа колам у горле стала!

Гаспадар спрабаваў лагодна супакойваць сваю палавіну, але тая ў адказ яшчэ болей разыходзілася:

— Каб з цябе твае дзеці смяяліся, як ты з мяне спрабуеш! Няхай першае ж дрэва па дарозе сёння на галаву тваю дурную зваліцца!

— Што я ўжо такога дрэннага з самае раніцы зрабіў?

— То ты яшчэ і не ведаеш? То ты яшчэ і дапытваешся, бессаромная твая душа?! Каб жа табе за гэта за адзін дзень сто грахоў на душу ўпала! Я ж табе пакажу, злыдзень ты рыжавалосы!

Бачыў мужык, што жонку не ўтаймаваць, і, нават не пад'еўшы добра, збіраўся і джгаў з хаты як мага далей, каб там займацца якой справай ды крыху супакоіцца пасля такога сутыкнення з ліхім чалавекам.

Так яны і жылі гадоў, можа, дзесяць ці болей. Ужо і трое дзетак нажылі, і гаспадарку вялі спраўную, а вось сварыліся на кожным кроку. Потым па ўсім паселішчы пагудка пайшла, што мужык той не просты, а самы звычайны чараўнік, а то і пярэварацень. Гэта, відаць, гаманіла ягоная жонка, уплятала людзям у вушы ўсялякія неіснуючыя рысы свайго мужа, каб лягчэй было апраўдаць свой злосны характар. Прыйдзе на вуліцы да жанок, стане і давай абы-што гаварыць.

— Вось учора мой муж, з самага рання ператварыўшыся ў каршуна, паляцеў на паляванне і да вечара гэтулькі дзікіх гусей набіў, што мы за ноч ледзьве паскублі...

Жанчыны, вядома ж, пачынаюць смяяцца:

— Толькі гусей панабіваў ці яшчэ і качак дзікіх?

— Слухай, а качара там не было?

Успыхне тады маладзіца і давай на іх гарлаць:

— Бессаромніцы, я вам чыстую праўду гавару, слова адзінага нават не схлусіла, не тое што выдумала нешта, а вам бы толькі пасмяяцца.

— Знайшла дурніц. Яна хлусіць будзе, плесці, што ў галаву ўлезе, а мы ёй верыць павінны.

— Раскажы каму-небудзь іншаму пра свайго пя-

рэваратня. Мы ж яго ўчора цэлы дзень на сенакосе бачылі. Пляці, ды ведай меру...

Раззлаваная жонка пёрла дамоў, каб там зноў накінуцца на бедалагу мужа.

Але ўсё ж нейкія падазрэнні ў яе маглі ўзнікнуць, таму што муж сапраўды быў паляўнічым ад Бога. Як пойдзе ў лес, то без здабычы ні разу не варочаўся. І чым болей хадзіў, тым болей яму шанцавала. Наваліць ласёў ці дзікоў і ўвесь наступны дзень фурманкай мяса дамоў возіць. Аднаго разу нават зубра падстрэліў і да таго часу за ім па слядах ішоў, пакуль звер знясілена не ўпаў і ён яго не дабіў стрэлам у галаву. Іншая жонка толькі б радавалася такому павароту справы, што чалавек ні хвіліны не сядзіць дома, увесь час на гаспадарку працуе, цягне і цягне, як тая пчала ў вулей. А гэтая не. Усё роўна бегае па наваколлі ды на чалавека намаўляе.

Кожны дзень чаго-небудзь прычэпіцца да гаспадара. Той пасядзіць, пасядзіць ды да дзяцей ідзе гуляцца, то яна і ад малых адганяе:

— Чаго гэта ты рукі свае чорныя распусціў? Чаго ты іх да каленяў прывучваеш? Мала таго, што сам лайдак, то і іх такімі ж выгадуеш. Ідзі лепей ды ў двары займіся якой справай неадкладнай...

— Ды ў нас усё ў парадку. Я ж сам парадкаваў, да справы ўсё прыводзіў, што там яшчэ можна правіць? — спрабаваў адгаворвацца муж. Толькі словы ягоныя выклікалі ярасць і гнеў у гаспадыні:

— Няма яму працы? Дзе ж гэта вы, людзі добрыя, такое чулі, каб у вяскоўца ў двары працы не было?! Гэта ж рабіць нічога не хоча, хутчэй бы яму толькі спаць заваліцца, а астатняе няхай сабе згніе ці згарыць...

Плюне абражаны мужык і пойдзе зноў туды, адкуль толькі што прыйшоў.

На другі дзень чалавек зноў знікаў у лесе, бо толькі там адчуваў сябе вольным і спакойным, менавіта там мог пасядзець і пагаманіць з самім сабой.

А жонка не пакінула свой намер адносна таго, каб вывесці свайго чалавека на чыстую ваду ці ўвогуле звесці яго са свету. Неяк убачыла, як яе мужператварыўся за хлявом у ваўка і знік у кустоўі, і ажно засмяялася, гучна пляскаючы ў ладкі:

— Цяпер я ўжо дакладна бачыла! Цяпер я ўжо

сама ведаю, што да чаго! Цяпер ты ад мяне нікуды не дзенешся!

Прыйшоў таго дня муж дахаты, як звычайна, стомлены, але задаволены, бо ўпаляваў вялізнага лася, а гаспадыня, ну сама пяшчота і ласкавасць, яго ля парога сустракае:

— А дзе ж гэта ты, мой родненькі, цэлы дзень прападаў? Дзе ж гэта цябе насіла? Відаць, стаміўся? Сядай лепей да стала, ды я цябе пакармлю. Дзяцей ужо пакарміла і спаць паклала. Не хвалюйся, усё ў нас добра, усё ідзе як нельга лепей. Ты толькі не перажывай і не хвалюйся. Сядай за стол...

У мужа ажно сківіца адвісла, калі такія словы пачуў, бо яны ці не ўпершыню прагучалі з вуснаў ягонай жонкі за ўсё сумеснае жыццё. Нечым жа гэта было выклікана, нешта ж яна задумала. Але, заняўшыся ежай, забыўся на такія думкі, паеў і пайшоў спаць. Толькі жонка не адчапілася і там. Прыйшла і давай дапытвацца:

— Скажы мне, мужу, ці то праўду пра цябе людзі кажуць, што ты можаш ператварыцца ў любога звера альбо ў птушку?

— Ды не, куды мне,— пачаў адмаўляцца той,— не валодаю я гэткай здольнасцю. Не магу...

— Прызнайся, чаго ты саромеешся ці хаваешся, я ж твая жонка і злога табе не жадаю,— не адставала жанчына.

— Не магу,— не здаваўся гаспадар.

— Але ж, чалавечку, я сама сёння бачыла,— радасна выпаліла гаспадыня.

— Што? — ажно ўскочыў муж.

— Як ты ў ваўка ператварыўся і потым у лес джгнуў.

У хаце запанавала напружаная цішыня.

— Магу...— нарэшце выдыхнуў чалавек.

— У любога звера?

— У любога.

— І ў птушку?

— І ў птушку.

— І ў камара?

— І ў камара.

— То давай паспрабуй ператварыцца ў камара зараз.

Не паспела яна сказаць, як на шчаку ёй сеў невялічкі камар. Жанчына, доўга не думаючы, ляснула што

было сілы, толькі кроў пырснула з-пад рукі — забіла камара, які толькі што быў яе мужам. Узрадавалася, што нарэшце свайго дабілася, і заснула спакойным сном. Раніцай пабегла гаварыць пра такую навіну суседкам, але тыя глядзелі на яе, нібы на вар'ятку, і ўсё дапытваліся:

— Ды як свайго мужа забіць? А дзеці тады на каго абапірацца будуць, на цябе?..

Можа, з тыдзень радавалася дурная жанчына, пакуль не давялося ёй самой упрагацца ў працу. А калі навалілася ўсё на яе плечы, то завыла-загаласіла ў другі бок:

— Што ж я нарабіла? Як жа я зараз буду жыць адна з дзеткамі?

Пайшла аднаго разу ў лес, села на пень і давай там плакаць ды прымаўляць:

— Што ж мне, беднай, рабіць? Як мне быць?

Ажно чуе ў адказ магутны голас:

— Так табе, гадаўка, і трэба.

— А ты хто такі? — уздрыгнула жанчына.

— Я лясны гаспадар і добра ведаў твайго мужа. Ён мне крыўды ніколі не чыніў. Я магу цябе пашкадаваць і вярнуць яго, ды толькі пры адной умове...

— Якой?

— Калі ты пяройдзеш уброд вось гэтую рэчку і ніводнага слова не прамовіш, то і муж назад прыйдзе.

Не падумайце, што ўмова была такая простая, бо вада ў рацэ цякла сцюдзёная, што той лёд.

Уступіла жанчына ў раку, ногі нібы агнём апякло, але яна вытрымала, а як да сярэдзіны дайшла, не здолела болей трываць і сказала:

— Ой, якая халодная! Ой, якая жажэлка! Ой, якая...

Болей нічога не пачулася, бо ператварылася злая жонка ў камень на беразе той ракі. Пазней людзі вёску там заснавалі і назвалі яе ў памяць аб той падзеі — Жажэлка.

## ЗАЛАТАЯ ГОРКА

Калісьці і гара, на якой тады не было лесу, і вёска называліся Лісінай Гарой. Па навакольных кустах і балотах жыравалі лісіцы, але, што самае цікавае — норы свае рабілі не абы-дзе, а на высокай гары, дзе

было значна вышэй і сушэй, чым у нізіне. Так, можа, стагоддзі цэлыя прайшлі.

Толькі з аднаго разу сталі там сяліцца людзі. Нехта, мабыць, з паляўнічых, убачыўшы гэтулькі лісіц, застаўся там жыць назаўсёды. Лісіцы перайшлі на вяршыню, а затым і зусім сышлі, пакінулі такі прыгожы і аблюбаваны імі пагорак.

Спачатку вёску сталі называць проста Гарой. Толькі было незразумела, што за гара. Шмат іх высіцца навокал, і чым можна адну адрозніць ад другой? Яны ж усе падобныя, як дзве каплі вады. Глядзіш, і тут гара, і там гара, а за імі новыя паўстаюць. Пачалі думаць вяскоўцы, як зрабіць так, каб іхняе паселішча стала адрозніваццa ад іншых. Колькі ні думалі, нічога станоўчага ў галаву не лезла. Так і пакінулі да пары да часу ўсё па-старому, як і было раней. Але неяк людзям у іхняй справе дапамог просты выпадак. А здарылася вось што.

Прыехалі аднойчы ў паселішча хлопцы з горада. Двое ўсяго іх было: дужыя, спрытныя, прыгожыя. Як прыехалі, то ўсе дзяўчаты сталі перад імі пакручвацца, каб на якую ўвагу сваю звярнулі. Ды і малойцы не промах. Ведалі, мабыць, сабе цану, не надта на дзяўчат кідаліся. Пагуляюць, песні паспяваюць, з мясцовымі хлопцамі з-за прыгажунь за чубы возьмуцца, тут ужо нічога не паробіш, так спрадвеку вялося.

Жылі гэтак, можа, з месяц. Кватаравалі ў нейкай бабулькі, якая сама жыла і рада была пусціць хлопцаў да сябе, каб не так самотна ў хаце было. І яшчэ адно характэрна — надта ж цікаўныя гэта былі дзецюкі. Не пройдуць міма любой хаціны, каб не запытацца, хто там жыве, чым займаецца, адкуль сюды прыйшоў.

Мала таго. Калі вёску абышлі да адзінага падвор'я, то пачалі дапытвацца ў сялян, ці не стаяў тут некалі паблізу багаты княжацкі палац-замак, ці не засталіся ад яго якія скляпенні. Нават нейкі мудрагелісты план паказвалі. Паднясуць стараму чалавеку і пакручваюць перад вачыма, а самі ўсё цікавяцца, ці не даводзілася бачыць або чуць пра існаванне такой будыніны.

Толькі на гэты раз ім не надта пашанцавала, бо ніхто нічога не бачыў і не чуў. Паціскалі плячыма вяскоўцы ды ішлі далей сваімі справамі займацца.

Іншых якіх, то можна было б проста вакол пальца

абвесці, а гэтыя, як захадзіліся, дык ад сваёй задумы ні на крок не адступіліся. Хадзілі, хадзілі спачатку па Гары, а потым і па навакольных паселішчах, а як нічога не дабіліся, то вырашылі дзейнічаць самастойна. Купілі сабе ўсялякае начынне, лёзівы, вяроўкі, рыдлёўкі, сякеры і на колькі дзён заціхлі. Ніхто іх у гэтыя дні не бачыў. Спачатку падумалі, што яны назад з'ехалі, але дарма на гэта спадзяваліся, бо на наступную раніцу ўбачылі, як хлопцы крочылі да вяршыні гары.

Зайшлі яны туды і старанна ўзяліся за працу: павысякалі на адхонах шматлікае і густое кустоўе, потым знайшлі сярэдзіну і давай капаць яму. Рабілі, не адпачываючы нават і хвіліны. Гледзячы на іх, здавалася, што яны і сапраўды ведалі пра існаванне нейкага незлічонага скарба ў старым, разбураным палацы-замку, які нібыта знаходзіўся некалі на гары. Людзі пазіралі, ды падыходзіць блізка баяліся, бо верылі ў існаванне заклятых і чорных скарбаў, з якімі простым смяротным сустракацца непажадана. А хлопцы кожны каменьчык, што трапляўся пад руку, кожны карэньчык, на які наторкваліся рыдлёўкі, уважліва разглядвалі, правяралі, зрэдку і на зуб спрабавалі, гліну асобна адмывалі, а пасля яшчэ і пясок праз густое рэшата прасейвалі...

Вяскоўцы стаялі і пераміналіся з нагі на нагу, але па-ранейшаму блізка не падыходзілі, толькі гаманілі пра тое, чым хлопцы займаюцца:

— Мабыць, усё-ткі ім нехта падказаў, што тут шукаць...

— Можа, і так, людцы, бо бачыце, як спрытна ўзяліся капаць, толькі рыдлёўкі мільгаюць-бліскаюць на сонцы, толькі і ляціць зямля ўгару...

— А можа, і самі па сабе, нам на злосць, палезлі на вышыню, каб даказаць, што раз мы не дапамаглі, то яны і без нашай дапамогі знойдуць...

— Цікава, а што яны там шукаюць? Нешта ж ім там мроіцца. Відаць, скарб нейкі адкопваюць. Вось каб глянуць...

— Ага, глянь толькі, то цябе адразу і забяруць, назад не вернешся...

— Што гэта вы, людцы, я ж проста так сказала, вам падказваючы, а вы на мяне адразу наваліліся.

— Усё-то добра, але ж цікава...

— Яшчэ адзін цікаўны знайшоўся.

— Хопіць вам спрачацца. Пайшлі працаваць самі, а то да вечара прастаім.

Паціху, паціху людзі пачалі разыходзіцца па сваіх справах. На месцы засталося толькі чалавек з дзесяць, якім не надта жадалася працаваць у той дзень, ці яны ўвогуле не надта любілі гэты занятак. Але і яны нічога не дачакаліся, бо дзецюкі працавалі і працавалі, калі сонца зайшло, то ўсё роўна іх не было відаць. Мабыць, недзе там, на гары, спаць заваліліся, каб з раніцы зноў за працу ўзяцца.

Не адзін дзень, а тры дні і тры ночы капалі тыя хлопцы яміну і ўсё гліну ды пясок прасявалі, каменьчыкі і карэньчыкі правяралі, каб ненарокам чаго важнага не прапусціць, не выкінуць. Здавалася, як толькі чалавек можа такое вытрымаць, а яны хоць бы што!

Прыйшоў да іх неяк стары дзядок, паглядзеў, як яны ў той яміне змучыліся, схуднелі, і кажа:

— Што ж гэта вы, сынкі, пакутуеце тут? Ці ж можна так мардаваць сябе? Паглядзіце, вунь які дзянёк добры, як вакол золата зіхаціць.

Кінулі хлопцы свае рыдлёўкі, утарапіліся, збянтэжаныя, на старога:

— Дзе, дзе, дзядок, золата?

— Вылазьце, тады пакажу, падзялюся з вамі,— з хітрай усмешкай адказаў дзядок.

Павыскоквалі хлопцы з ямы, азіраюцца, а дзядок ім і гаворыць:

— Ды хіба ж вы не бачыце, колькі яго на нашых баразёнках ляжыць? Колькі яго на нашых бярозах вісіць?

А было тады якраз бабіна лета, цёпла, суха навокал. Пераглянуліся хлопцы паміж сабою ды раптам як зарагочуць. Падышлі да дзядка, руку яму паціскаюць, дзякуюць шчыра:

— Нам сказалі ў горадзе, а мы, дурні, паверылі і ў галовы сабе ўбілі, што знойдзем той незлічоны скарб, які быццам бы закапаны ў разбураным палацы-замку. Вось толькі знайсці месца, дзе ён стаяў, нам сталася не пад сілу. Тады проста ўнурыліся ў працу і незаўважна ажно трое сутак прапрацавалі не разгінаючыся. Зараз вось рукі трымцяць, ногі калоцяцца ад стомы. Так нічога і не знайшлі, а з ямы вылезці не маглі, бо гонар не дазваляў гэта зрабіць. Дзякуй вам, дзядулька, што пазбавілі нас ад марнай працы, што не далі тут згібець. Адкрылі вы нам вочы...

Закінулі тыя няўдалыя шукальнікі золата свае торбы за плечы і пайшлі назад у горад, каб ніколі болей сюды ўжо не вяртацца.

Вось з таго выпадку, з тых лёгкіх слоў мудрага дзядка быццам бы і знайшлося нарэшце для вёскі яе поўнае імя — Залатая Горка.

## ЛАЗОВЫ КУСТ

Адкупілі аднойчы ў пана два бедныя мужыкі, якія шмат гадоў збіралі капейчыну да капейчыны, тры дзесяціны добрай, урадлівай зямлі, каб пабудавацца на ёй і пачаць гаспадарыць. Дзе толькі паставіць хаты — вось пытанне, шкада ж кожнай пядзі, кожнай драбніцы дарагой зямліцы, якая ўелася ў цела і кроў салёным, прагорклым потам. Доўга яны разважалі ды меркавалі паміж сабою:

— Можа, возьмем і з самага краю, ад лесу, там, дзе ўжо нельга нічога ні сеяць, ні садзіць, паставім будынкі? — пытаўся адзін.

— Лепей з другога боку, там, дзе канчаецца поле і пачынаецца луг. Нізка, прыгожа, весела заўсёды будзе,і хаты здалёку бачны,— прапаноўваў другі.

— Весела-то весела, але калі надарыцца год дажджлівы, то будзем плаваць з дзецьмі і жонкамі па вадзе, як тыя дзікія гусі, што тут пастаянна жывуць, бо нізка ж надта...

— Тут ты маеш рацыю. То што ж рабіць будзем, час не чакае, і будавацца неяк жа трэба...

— Спачатку прадумаем усё добра, каб потым у незайздроснае становішча не патрапіць, а там ужо будзем і будавацца.

Так не дзень, не два, а цэлы тыдзень раіліся-спрачаліся мужчыны паміж сабою і ўсё ж прыйшлі да адзінага выніку: будавацца трэба каля самага краю свайго не такога ўжо і вялікага ўладання, непадалёку ад свавольніцы рэчкі. Праўда, там рос разгалісты і агромністы лазовы куст, але калі яго высекчы і голле прыбраць, то будзе неблагое месца для падвор'яў.

Калі вырашылі, то ад самае раніцы наступнага дня закіпела ў іх праца. Неяк незаўважна справіліся з лазой — акуратна высеклі, выкарчавалі, нават дробнае голлейка і тое папалілі.

Як задумалі — так і збудавалі па прыгожай, новай

хаце і сталі ў іх жыць. Нарадавацца не могуць, што на сваёй зямлі сядзяць, што нікому падпарадкоўвацца не трэба. Цёпла, утульна, ніякія ні завеі, ні ветры ў такіх сценах не страшныя. Мараць, як вясною пачнуць будаваць гаспадарчыя памяшканні, бо без іх у вёсцы не абысціся.

Гэтак непрыкметна праляцеў час, што і не заўважылі, як зіма прайшла, вясна наступіла. Ледзь толькі сышоў снег, пабеглі жаўрукі-раўчукі, як убачылі гаспадары не надта прывабную для сябе карціну: яшчэ і травіца не паспела нават зазелянець на пагорках, а ўжо пасярод двара, на агародах, ды і пад сценамі новенькіх хат — усюды, дзе толькі можна, прабіўся няпрошаны госць — лазняк.

Пачасалі мужчыны галовы, ды што рабіць будзеш — трэба ж неяк ратавацца. Пасядзелі, пагаманілі, няма іншага выйсця, як зноў усё высякаць. Прычым неадкладна, бо лазняк з кожным днём станавіўся ўсё зелянейшым і вышэйшым. Таму ўхапіліся за сякеры гаспадары, жонак, дзяцей сваіх на дапамогу паклікалі і даволі хутка павысякалі амаль ужо паўмятровыя парасткі лазы. Змораныя, стомленыя, але шчаслівыя палеглі спаць. Раніцай збіраліся заняцца іншай справай. Толькі не давялося гэта рабіць, бо калі прачнуліся і пайшлі скаціну даглядаць, дык ледзьве не пападалі ад таго, што ўбачылі. Аказваецца, за ноч лаза ўжо не на паўметра, а на цэлы метр вымахала, ды яшчэ гусцейшая стала, чым у першы раз. Селі бедалагі і раяцца, адзін аднаму ў вочы не пазіраючы, быццам бы вінаватыя самі ў чым.

— Бачыш якая справа, браце? — кажа адзін.

— Вядома ж, бачу,— адказвае другі.

— Што рабіць будзем?

— А нічога, працаваць і далей, бо час упусцім — потым ужо нічога выправіць нельга будзе.

— Давай тады за працу брацца.

— Так, зараз толькі перакусім чаго і пойдзем...

Узяліся мужыкі за сякеры, родных паклікалі і на гэты раз усю лазу, аж да апошняга прутка, старанна высеклі, сабралі, а потым, для надзейнасці, спалілі на раскладзеным дзеля гэтай мэты вогнішчы. Ледзьве да хат сваіх дайшлі і, нават не павячэраўшы, спаць пападалі, гэтак стаміліся. Ды толькі не дапамагло. За ноч, аказваецца, лазой зноў увесь двор зарос, ды такой густой — нібы шчотка якая! Цяпер ужо зразумелі гас-

падары, што нешта тут не тое, што нешта тут ёсць ад чараўніцтва. Вырашылі болей не чапаць лазу, каб не наклікаць на свае падворкі новай бяды. Адзін з адным параіліся і дамовіліся пачакаць дзён колькі, паглядзець, што ж далей атрымаецца.

Але, родненькія-каханенькія, далей ад тае лазы не стала мужыкам ніякага жыцця. Так яна за нейкі тыдзень разраслася, што ўсё на градах пад ёй засохла-загінула, а праз двор, каб куды прайсці, да паветак ці на дарогу, то як па густым цёмным лесе даводзілася прабірацца.

Зрэдку заходзілі бліжэйшыя суседзі, глядзелі на дзівосны лазняк, шкадавалі гаспадароў, давалі самыя розныя парады, як ад гэтай пошасці пазбавіцца. Хто раіў пад карані солі падсыпаць, хто — вадой заліць, а хто і наогул казаў, што нічога не трэба рабіць, а сядзець спакойна і чакаць зімы. Раптам яна будзе суровай і марознай, тады лазняк сам па сабе вымерзне і вынішчыцца.

Слухалі мужыкі, а самі ўсё думалі: «Лёгка вам парады даваць, гэтак бы і мы рабілі, каб на вашых надзелах такое выраблялася. Вы прыйдзеце, скажаце ды пойдзеце, а нам заставацца з гэтай злыбедай...»

І вось аднаго разу завітаў да тых мужыкоў дзядок, увесь у белай вопратцы, з кульбай у руцэ і з пустой торбачкай за плячыма. Вады чалавек папрасіў напіцца. Па ўсім адразу было відаць, што гэты падарожны ўсё сваё працяглае жыццё правёў, ходзячы па шматлікіх дарогах-сцяжынках. Напаілі яго шматпакутныя спагадлівыя гаспадыні не вадой халоднай, а малаком, якога ў гаспадарках заўсёды хапала. Малако было халаднюсенькае, толькі што з пограба. Дзядулька як напіўся, дык адразу павесялеў, а потым, убачыўшы вакол сябе пахмурыя твары, запытаўся:

— Што ж гэта вы, людцы родненькія, у такім дзікім кустоўі жывяце, а мне нават і не скардзіцеся? Гэта ж немагчыма тут што-небудзь пасеяць, каб яно выспела ды можна было потым прыбраць ці зжаць? Тут жа гадоў праз колькі вам з голаду самім давядзецца паміраць, бо зямля змізарнее, запусцее і нічога радзіць не стане...

Мужчыны дык тыя прамаўчалі, нічога не адказалі, а жанчыны, цяжка ўздыхнуўшы, вырашылі пра ўсё распавесці. Чым лёс не жартуе, а раптам дапаможа падарожны чалавек.

— Ды які з таго толк, што мы скардзіцца будзем? Каму мы толькі ўжо ні расказвалі пра сваю бяду, чые толькі парады не выконвалі. Прычым былі такія, што мы і самі ў іх дапамогу не верылі,— і солі пад карані лазе падсыпалі, і тапілі, і вымаразіць спрабавалі — нічога не дапамагло, як расла, так і расце, толькі больш густой становіцца. У нас ужо пасля такіх спроб і рукі паапускаліся, адзін, відаць, паратунак — кінуць гэтае месца і на новае куды перабірацца, у галечу зноў свае плечы і галовы ўсунуць.

Уздыхнуў дзядулька, зірнуў яшчэ раз на лазняк і кажа, да людзей звяртаючыся:

— Не, дачушкі, калі мяне паслухаеце і ўсё, што скажу, зробіце, не давядзецца вам на новае месца перабірацца. А зрабіце вось што. Дачакайцеся першага дожджыку. Як замжыць, асцярожна кожную лазінку паасобна выкапайце і нясіце як мага хутчэй да рэчкі, і там, на беразе, як найглыбей пасадзіце. І калі наказ мой дакладна выканаеце, то ўвесь куст да вясны сам па сабе да рэчкі перабярэцца...

— Нешта не надта верыцца, што дапаможа,— са скрухай выдыхнула адна з жанчын,— столькі нам раілі, што сумняваемся...

— Дапаможа, вось пабачыце,— супакоіў іх стары падарожны.

Расказаў пра ўсё гэта дзядулька, падзякаваў шчыра за салодкае малако, выйшаў за брамку і адразу ж знік невядома куды.

Хаця асабліва і не паверылі падарожнаму мужчыны і жанчыны, але ўсё-такі, калі імжыў першы пасля той размовы дожджык, перанеслі са свайго двара і пасадзілі на беразе рэчкі пучок лазовых пруткоў. І ўсё спраўдзілася, як і казаў той самы дзядулька: за які-небудзь тыдзень (зусім непрацяглы тэрмін) высахла лаза на двары і на агародзе да апошняга прутка, а на голым беразе Волмы вырас малады лазовы куст. Павыбіралі дзе якое голлейка, дзе які карэньчык гаспадары і таксама туды ўсё занеслі, у адну гурбу склалі, каб болей па чыстай зямлі лаза не распаўзалася і не ўкаранялася.

Вось ад тых дзвюх хацінак і пайшла вёска. І хаця ні ў каго больш на двары лаза не расла, нават не з'яўлялася, вёска ўсё ж атрымала сваю назву ад таго злашчаснага куста — Лазовы Куст.

## ШЫПЯНЫ

Жыла тут адна надта старая жанчына. Гаспадаркі ўласнай не трымала — жыла адна, а каб нeяк пракарміцца, хадзіла па падвор'ях вяскоўцаў і прасіла ў каго бульбы, у каго кавалачак сала, у каго хлеба ці круп якіх, і гэтак жыла. Аднаго разу прыйшла яна да мяне і стала гаварыць, каб я ёй крыху клубніц саступіла, маўляў, нешта дрэнна сябе адчувае, а калі паесць іх, то адразу і выздаравее. У мяне ягад гэтых не так і многа было, але адмовіць бедалазе таксама не магла, не заведзена такое ў нашай вёсцы з даўніх часоў. Насыпала ў рэшата клубніц, бабулька падзякавала мне шчыра дый кажа:

— А мая ж ты маладзічка, дзякуй табе вялікі. Але яшчэ хачу запытацца, ці не хворая ты, ці не баліць у цябе што, бо нешта ты надта белая... Мабыць, хварэеш, а прызнацца баішся. Але мне можаш смела казаць, я нікому і слова не перакажу, а цябе вылечу, пабачыш...

Падумалася мне, што старая можа і схлусіць, але потым прыгадалася, як у нас гаварылі, што нейкая жанчына адну маладзіцу, якую ўжо да мёртвых амаль што прыпісалі, выратавала сваім шэптам, таму асмелілася і гавару:

— У мяне нічога так асабліва не баліць, няма чаго скардзіцца. Толькі вось са страўнікам нешта не тое робіцца. Не магу свежых харчоў есці, не магу салёнага нічога пакаштаваць — усё назад выходзіць. Не паспею з'есці, а ўжо ванітуе. Калі можаце, то дапамажыце. Болей і скардзіцца няма на што. Вось і ўся праўда, бабуля...

Узрадавалася старая, відаць, ад таго, што мае магчымасць аддзячыць мяне за маю дабрыню і ласку, за спагаду да яе, і кажа:

— Добра, што прызналася. Зараз мы за адну хвіліну гэтую хваробу з цябе выганім. Толькі глядзі, усё старанна паўтарай за мной, нічога не перайначвай, бо тады мае словы і шэпты не дапамогуць.

Сказала так, дастала нейкі танюсенькі лісточак з-за пазухі і запатрабавала гарачай вады. Падала я ёй чыгунок з печы, яна туды той лісточак укінула і памешвае. Памешваць памешвае, а яшчэ і прымаўляе, ды па вокнах зіркае, каб ніхто не падглядваў і не падслухоўваў. Спачатку ўсё сама рабіла, потым мяне да сябе паклікала, пасадзіла насупраць і кажа:

— А зараз, родненькая, паўтарай слова ў слова. Што я скажу, тое і ты гавары, бо інначай не выйдзе ў нас нічога...

Яна шэпча, а я за ёю ўсе рухі і словы паўтараю, якія разабраць магу. Смешна спачатку было, а потым чамусьці пачала верыць, што дапаможа мне старэнькая, і на ўсім сур'ёзе слухаць стала. Нарэшце ўсё было закончана, і мая госця, пакідаючы хаціну, прамовіла:

— Цяпер, маладзічка, нічога не палохайся, не бойся. Усё будзе добра. Пабачыш. Гэтай хваробы ў цябе да смерці не будзе. Яна прэч пайшла...

Падумала я, падумала і не паверыла, але прайшоў тыдзень, другі, цэлы месяц, а страўнік мой пра сябе ніводнага разу не нагадаў. Тут толькі зразумела, што сапраўдную сілу мела тая варажбітка-бабулька. Іх у нас шаптунамі звалі. Але казалі, што іх звалі і па-іншаму, з той назвай паселішча наша звязана. Паслухайце пра яшчэ некаторых чараўнікоў ці варажбітоў, гэта ўжо як вам захочацца, так і завіце іх.

У маёй нябожчыцы-бабулькі быў на галаве каўтун. Што гэта такое — павінны ўяўляць. Здаецца, нічога страшнага, сядзіць сабе ў валасах, і няхай сядзіць, ды не так усё гэта. Справа ў тым, што галава ў хворага на каўтун пачынае балець і не дае спакою чалавеку ні днём, ні ноччу. Круціцца, бедалага, крычыць, стогне, на дапамогу кліча, а выратавацца сам не можа. Акрамя варажбітоў, ніхто такую хваробу ў тыя часы не вылечваў. Кажуць, што яе і цяпер урачы не лечаць, а накіроўваюць хворых да вясковых шаптуноў. Дык вось пра маю бабульку. Звіўся гэты каўтун у яе на галаве і хоць ты памірай, а выратавацца нельга. А яна ж яшчэ зусім маладая была, дзетак трое маленькіх мела. Плача-галосіць, свой лёс-долю праклінае, сірот будучых шкадуе. Гаспадар, яе муж, таксама сабе месца не знаходзіць. Ужо ўсе вясковыя варажбіты да яе ў хату прыходзілі, каўтун глядзелі, але выратаваць не браліся, гаварылі, што ў іх сілы не хопіць для такога.

Муж ужо ледзьве ходзіць, гора і яго падкасіла, дзеці счарнелі ад бядоты, а жанчына — увогуле змізарнела, што і бацькі, мабыць, не пазналі б.

Аднаго разу, пад самы вечар, прыйшоў у вёску падарожны і падышоў да бабулінай хаціны, каб папрасіцца пераначаваць. Гаспадар пачуў такія словы ды й адказвае:

— Я табе, добры чалавек, нічога не шкадую, але ў

мяне няма нават скарынкі хлеба. Дзеці і тыя галодныя спаць кладуцца. Жонка хворая, не сёння-заўтра ў іншы свет адыдзе... Спаць магу і на сена пакласці, і ў гумне месца ёсць, а вось адносна іншага — прабачай. Не я ў гэтым вінаваты. Было б у мяне ўсё ў парадку, то і табе больш пашанцавала б. Прабач яшчэ раз, чалавеча...

— Нічога, нічога. Што ты ў мяне прабачэння просіш, хіба ж ты ў нечым вінаваты? Было б у цябе добра, сапраўды, то і мяне па-іншаму спаткаў бы. А што, калі не сакрэт, з тваёй жонкай, пане гаспадар?

— Ды, чалавеча, у маёй жонкі каўтун на галаве звіўся, дзесьці з самага дзяцінства. Спачатку нічога страшнага не было, але потым усё ўскладнілася. І бачыце, што атрымалася... Памірае, а зусім жа яшчэ маладая. З чаго толькі такая хвароба з'яўляецца?

— З чаго, кажаш? — перапытаў падарожны.— Паслухай уважліва: калі дзень у дзень цяжка працаваць ды есці адну нішчымную бульбу, то і з'яўляецца такая дзіўная хвароба. Яе можна вылечыць. Нічога тут жудаснага няма. Проста вам ніхто не даводзіў, што гэта не смяротна, і вы ў галовы свае пабралі, таму так і мучыцеся. Я дапамагу вам, не сумнявайцеся, хворая будзе працаваць і жыць яшчэ доўга-доўга.

— Чалавеча, ды я табе апошняе аддам, толькі выратуй маю жонку. Нічога не пашкадую. Дзецьмі сваімі клянуся і прашу — дапамажы...

— Дапамагу, чаму не, толькі перастань прасіць. Раз я паабяцаў, то заўсёды слова сваё стрымліваю. Вядзі да хворай. Трэба вады цёплай і малака свежага, калі ёсць, хоць крышку. Заварым майго зелля, дамо выпіць, памажам галаву, і ўсё пройдзе. Пабачыш, не сумнявайся толькі. Глядзі весялей, гэтым і ёй і сабе дапаможаш... Пайшлі да хворай.

Падвёў гаспадар падарожнага да жонкі, а тая ўжо надумала з дзецьмі сваімі развітвацца назаўсёды. Стары вандроўнік звярнуўся ласкава да малых:

— Ідзіце, дзеці, пагуляйце. Ідзіце сваімі справамі займіцеся, а мы з вашай мамай пагамонім. Ідзіце... А ты, пане гаспадар, падрыхтуй тое, што я табе казаў, ды нічога не пераблытай, не перарабляй на свой густ.

Пагаманіў, пагаманіў стары з маладзіцай, а потым павярнуўся і паклікаў:

— То й давай ужо мой узвар, пане гаспадару, самая часіна да лекаў прыступіць.

Узяў, даў выпіць крышку, потым старанна галаву ўсю вымазаў і ўстаў:

— Ну вось, а праз пару дзён я састрыгу каўтун, і на галаве пачнуць расці звычайныя валасы. Зараз спі, каханенькая, сілы набірайся, галава табе болей балець не будзе.

І сапраўды. Пажыў падарожны ў гаспадара пару дзён і састрыг каўтун з галавы. Ён, як шапка якая, упаў, а на яго месцы закучараваліся прыгожыя валасы. Гаспадар рады, гаспадыня не ведае, як дзякаваць свайму выратавальніку, а ён, пасміхваючыся, толькі і прамовіў у адказ:

— Ай, якія там лекі, шыпуны нейкія. Пару разоў пашаптаў, і ўсё.

Дык людзі яго ў падзяку з сабою жыць пакінулі, а разам з дзедам і назва засталася — Шыпяны. Толькі крыху, як бачым, перайначаная.



# СТАРЫЯ ДАРОГІ

Розныя гісторыі апавядаюць пра ўзнікненне нашага мястэчка. Не, я не агаварылася — мястэчка, бо горадам яно зусім нядаўна стала, мо якіх гадоў дваццаць ці трыццаць таму, а да гэтага самае звычайнае мястэчка было — не надта каб вялікае, бруднае, таму што смецце і бруд ніхто не прыбіраў, а разбітыя каляінамі дарогі — і не рамантаваў. Як падсохне, то праехаць ці прайсці свабодна можна было, а як залье, то нібы возера пасярод вуліцы ўтваралася, і як ты ні старайся, а дамоў ці ў госці куды абавязкова па пояс мокры прыйдзеш. Мала таго, што мокры, то яшчэ і ў гразі, а яна смярдзючая, ліпкая, ажно зараз прыгадваць брыдка. Так і жылі. І пры нас так было, і пры нашых продках, адпаведна, таксама.

Пра тое, як яно пайшло тут, мне даводзілася чуць не раз і не два. Хто звязвае гісторыю з вайной з Напалеонам, а хто з яшчэ больш раннімі часамі. Раскажу вам абедзве легенды, хоць другая больш на праўду падобна.

Некалі людзей маглі пераўтвараць ва ўсялякіх звяроў і птушак, а часам і ў дрэвы ды камяні. Рабілі гэта, ведама ж, чараўнікі ці нячысцікі, якім надта

карцела чалавека з белага свету зжыць або проста панасміхацца над ім ці паздзекавацца. Удумаюць — і зробяць, ды яшчэ прымусяць што-небудзь такое ганебнае вытвараць, што калі і жывы, бедалага, застанецца, дык самому сярод вяскоўцаў знаходзіцца не захочацца. Сорамна ў вочы глядзець будзе, кожны папікаць пачне. Вось і мяркуйце, чаму раней сяляне, ды і гараджане таксама, не выраблялі гэткага паскудства, як зараз. Баяліся, што за кожны, нават самы дробязны, грэх будзе абавязковае пакаранне. А цяпер?..

Дык вось, у тыя сівыя стагоддзі ў нашым наваколлі таксама жылі людзі. Рэдка стаялі іхнія паселішчы, далёка адзін ад аднаго, але зрэдку, калі не было асаблівай працы, любілі вяскоўцы паездзіць-пахадзіць у госці да знаёмых ці родных. Ну а калі збяруцца, то пасядзяць добра і чарку-другую вып'юць. Галовы не прапівалі, ведалі, што рабілі. Але здаралася і адваротнае, вось як у гэтым выпадку.

Жылі тут, непадалёку, людзі-галубы. Далей крыху — людзі-гусі, з другога боку — людзі-лебедзі і г. д. А тут менавіта — людзі-галубы. Галубамі, вы не падумайце, яны станавіліся зрэдку, толькі тады, калі працы не было ды яны ў далёкую дарогу некуды збіраліся. То, каб не праставаць тых вёрстаў пешкі, ператвараліся ў птушак. Тут ім добрая сіла спрыяла, не для смеху ўсё было зроблена. Захоча чалавек з жонкай праведаць матулю — збіраюцца, а каб коней не таміць, не траціць дарагі час, раз — у галубоў перавярнуцца і паляцелі. Праз нейкую гадзіну ўжо на знаёмым падворку варкуюць. Выйдзе гаспадыня, гляне і ўскрыкне:

— Ай, Божачкі, хто ж гэта да мяне ў госці прыляцеў?! Дзеткі ж вы мае родныя! А як жа вы гэтак хутка дабраліся?!

А калі і ўнукі папрылятаюць (маладыя галубочкі), то ўсклікне і па-іншаму:

— Ай, міленькія ж вы мае! Як жа мне вас вітаць! Не забыліся пра мяне, старую, адведалі! То заходзьце, будзьце ласкавы, у хату!

Ператворацца галубы ў людзей і ідуць за матуляй у хаціну. Пасядзяць, пагамоняць, колькі трэба, навіны перакажуць усялякія і пачнуць дамоў збірацца, бо свая ж гаспадарка чакае, свае клопаты на падворку засталіся. Прамарудзіш гадзіну-другую — потым ужо можаш не дагнаць таго, што ўпусціў. Маці спрабуе гасцінцаў нейкіх даць з сабою, бо такі звычай быў у нашых

продкаў, што чалавека, нават зусім незнаёмага, нельга з хаты проста так, без падарунка, выпускаць. Верылі ў тое, што калі шкадаваць, не дзяліцца з іншымі, то дабрабыту, поспеху аніякага ў хатняй справе не будзе.

Галубы, ведама ж, многа не панясуць, але ўсё роўна што-небудзь у дзюбкі бралі, каб не парушаць заведзены парадак, каб не трапіць у няміласць да непераборлівага лёсу, бо тады наступяць для сям'і чорныя дні. Развітаюцца і паляцяць назад. Глядзіш — на двары толькі вечарэе, а яны ўжо дома ходзяць, жывёлу даглядаюць, да новага працоўнага тыдня рыхтуюцца.

Так вялося не год, не два, а, відаць, цэлыя стагоддзі. Пакуль не знайшліся благія людзі і не парушылі гэты спрадвечны закон. Здарылася ўсё наступным чынам.

Жылі ў адной вёсцы мужык з жонкай. Сям'я ў іх не надта вялікая была — усяго трое дзетак. Па тых часах гэта і не многа. Здаецца, толькі працуйце ды шчыруйце, то ўсё ў вас і будзе. Але калі людзям нешта дарма ці надзвычай лёгка дастаецца, то яны яго не берагуць.

Так і гэтым. Зямля добрая, урадлівая ад бацькоў засталася, пабудавацца родныя дапамаглі, ніякіх цяжкасцей з гэтым у іх не было. Так яны прызвычаіліся да іншай справы — навучыліся піць гарэлку, і рабілі гэта так спрытна, што дзе б ні былі, а ўсё роўна п'яныя, нібы гразь, дамоў прыцягваліся. Прыцягваліся, калі маладзейшыя былі, а потым ужо і валяцца сталі абы-дзе. Пойдуць з раніцы, а да вечара і не вернуцца. Добра, калі да вечара, а то па два, тры дні не прыходзілі. А гаспадарка ж вялікая была, жывёлы многа, усё трэба дагледзець, накарміць, пазаганяць і павыганяць. Пашанцавала гэтым гультаям у тым, што ў іх вельмі разумныя і працавітыя дзеці нарадзіліся. Гэта ж падумайце толькі. Бацькоў дома няма, а яны самі ўсё падаглядаюць, паробяць. Жывёла гладкая хадзіла, людзі навокал зайздросцілі. Грады тыя павыпалюць — нідзе ні каліўца зелля няма, нібы яно там і не расло. Не глядзелі ўжо на бацькоў, бо бачылі, што нічога зрабіць з імі не змогуць. Прымусіць працаваць іх было немагчыма, нават дзядуля і бабуля, браты ды сёстры і тыя паўплываць не маглі, а дзеці... Што дзеці?.. Цыкне на іх п'яны гаспадар, замахнецца і яшчэ добра, калі не ўдарыць, а то ж не надта пашкадуе і перацягне якім кіем, асабліва не задумваючыся, вінаватыя малыя ці не.

Ім надта цяжка было, калі самі малую сілу мелі і не маглі яшчэ ўсё рабіць, а як падраслі, увайшлі ў сілу, то і не звярталіся за дапамогай да старэйшых. Учэпяцца ўсе ўтраіх і зробяць. Якую працу ні распачнуць— абавязкова да канца давядуць.

Бацькі з кожным днём пілі ўсё болей і болей. Ужо тыднямі дамоў не прыходзілі. Калі ж і з'явяцца, то ссінелыя, апухлыя ад перапояў. Есці не хочуць, толькі шукаюць, дзе б пахмяліцца ці ў каго бутэльку-другую перахапіць. Крыўдна дзецям стала на такое глядзець. Ва ўсіх бацькі як бацькі, а тут горкія п'яніцы. Хто захоча, той і насмяецца — нічога ты яму не зробіш, супраць праўды не надта папрэш.

Дык яшчэ і гэтага мала. Пачалі п'яніцы рэчы з хаты забіраць ды прапіваць, з гаспадаркі цягнулі і збожжа, і сала ці мяса якое. Усё забіралі і пёрлі то ў карчму, то да тых, хто гарэлкай падгандлёўваў. Дзеці зберагалі, на цяжкі які перыяд пакідалі, а бацькі вось да чаго дайшлі. Прыляталі да гэтага падвор'я старыя бабулька і дзядуля, але яны нават у людзей пераўвасабляцца саромеліся. Сядуць дзе-небудзь у глухім месцы, каб іх дзеці не заўважылі, і плачуць горкімі слязьмі, што такі лёс малым выпаў. Лічылі сябе вінаватымі ў тым, што п'янства ў сям'і гэтай развялося.

Але аднаго разу, калі яны селі непадалёку ад студні і зноў пачалі плакаць, слухаючы, як перамаўляюцца паміж сабою малыя, снапы з поля возячы, да іх падышоў старэйшы ўнук і запытаўся:

— А чаго вы, бабуля з дзядулем, у людзей не пераўвасабляецеся?

— Ды нам, унучак, дамоў вяртацца хутка трэба. Старыя мы ўжо, пакуль дамахаемся, то і сцямнее...

— Не круціце, родныя. Не выкручвайцеся. Думаеце, мы не разумеем, як вам горка на такое глядзець? Усё разумеем. І не адным вам сорамна. Пераўвасабляйцеся лепей ды падкажыце, як спрытней снапы складваць, каб яны прасыхалі, як перавясла мацней вязаць... Можа, мы яшчэ так добра, як дарослыя, і не ўмеем. Не бойцеся, бацькоў дома няма, мы адны на ніве шчыруем, бо ад людзей адставаць не хочам.

— Божухна мілы, што ж гэта на белым свеце творыцца? — загаласіла бабуля, і з яе ў адзін момант апалі ўсе пёркі, а скрыдлы ператварыліся ў рукі.

— Каб ужо ім, п'яніцам горкім, і на тым свеце спакою не было, калі яны сваім дзецям гэткае дзяцінства

наладзілі,— сурова прамовіў дзядуля і таксама стаў чалавекам.

Узяліся ўсе разам за працу. Надвор'е добрае стаіць, часу ўпускаць нельга, бо пойдуць дажджы — і ўсё, прагаладаеш потым цэлы год і нават пасеяць зярнят не будзе. Старыя падказваюць, паказваюць, як прасцей і хутчэй, а ўнукі працуюць так, што толькі рукі мільгаюць. Радуюцца дзядуля з бабуляй, што такія памочнікі выраслі. Зрабілі ўсю справу і селі, каб даць адпачынак стомленым целам. Сядзяць, бабулька ўнукаў па галовах пагладжвае, а дзядуля ім у вочы зірнуць саромеецца. Тады старэйшы ўнук зноў запытаўся, каб, мабыць, згладзіць няёмкае становішча:

— Дзядуля, а чаго гэта ў нашай мясцовасці толькі людзі-галубы жывуць? Адкуль такое павялося? Раскажы нам, каб і мы ведалі.

— Добра, мае каханенькія, стаміліся вы, працуючы, то слухайце. Даўно такое здарылася, калі яшчэ сам пан Бог па зямлі пешкі хадзіў, сярод людзей неадкладнымі справамі займаўся. Ідзе як роўны сярод роўных. Калі заўважыць, што нейкі чалавек не паспявае, то яму абавязкова дапаможа. І з Усявышнім лічыліся, ніхто яго ні разу не пакрыўдзіў. Прыйдзе да якога дома і пераначаваць просіцца, прыкінуўшыся жабраком. Але вяскоўцы здагадваліся, хто гэта перад імі, і дзяліліся апошнім, што мелі ў той момант. Так і жылі: людзі і сам пан Бог побач. Вось дзе залаты час быў! Здарыцца нешта благое, то адразу да Усявышняга прастуюць, просяць, каб дапамог. Не было такога паселішча на ўсёй зямлі, дзе б ён не пабыў ці не пабачыў, як людзі жывуць. Усім дапамагаў, толькі злым ды сквапным адмаўляў. Ад іх і на неба жыць перабраўся. Спалохаўся, мабыць, што калісьці не ўтрымаецца і ім дапаможа.

— А чаму галубы, дзядулька? — перапытала белавалосая дзяўчынка, якую трымала на каленях бабулька.

— А гэта, каханенькая-родненькая, здарылася незадоўга да таго моманту, калі Усявышні збіраўся пакінуць зямлю і перабрацца жыць на неба. Тады, у той час, напалі на нашу зямлю злыя нелюдзі. І столькі народу перабілі, у палон павялі, што, здавалася, не будзе болей каму род працягваць. А чужынцы ўсё лезуць і лезуць. Тут пан Бог і ўмяшаўся, узяў і зрабіў так, што ўсе, хто ў жывых засталіся, ператварыліся ў галубоў. І паляцелі гэтыя вольныя птушкі ў той край, дзе ворагаў не было.

Заляцелі сюды вось, у гэтую старонку, паглядзелі, спадабалася ім тут, і засталіся назаўсёды. З таго самага часу здольнасць пераўвасабляцца ў галубоў у нас захавалася. Бачыце, адкуль карані такой прыгожай звычкі?

— Ага,— прамовіў самы малодшы з унукаў, які амаль ужо драмаў, паклаўшы галаву на дзедаву нагу.

— Потым сталі гаварыць, што некаторым людзям спачувае сам пан Бог, іншым — чараўнікі, а ёсць такія, якія ўжо запрадалі свае душы нячысцікам ды злым варажбітам.

— Хто ж гэта, дзядуля,— запытаўся старэйшы.— Няўжо і такія ёсць?

— Ёсць, унучак, ёсць. Як жа гэта, каб людзі жылі, а дрэннага сярод іх нічога не было. Не можа такога быць.

Бабуля пасля такіх слоў пачала зноў плакаць, выціраючы слёзы схуднелымі і зжаўцелымі ад старасці рукамі.

— Не плач, бабулька, не плач. Я табе дам свае цацкі пагуляць,— пачала супакойваць яе малая, і старая ў адказ горка ўсміхнулася, прыціснуўшы ўнучку да сябе яшчэ мацней.

Дзядуля працягваў сваю думку:

— Некаторым надта лёгка ўсё ў жыцці даецца. Не ведаюць яны, што такое праца, спяць-палежваюць ды толькі самі сябе глядзяць. Каб з дзяцінства працаваць прымушалі, то і распусты меней было б. Так, як вы шчыруеце, то і дарослыя не ўсе напружваюцца. Але ці ж вы ў гэтым вінаваты? Бацькі вінаваты, вось хто. Яны сваю жытку прыпяваючы пражылі і зараз нічога не робяць, толькі п'юць. Гонар згубілі, сумленне страцілі... Эх, каб жа мы маглі са старой што-небудзь перайначыць...

— З нас людзі смяюцца, дзеду,— змрочна прамовіў хлапчук, які драмаў на калене ў старога, і прыўзняў галаву,— хіба ж мы ў нечым вінаваты?..

— Не, вы ні ў чым не вінаваты, мае маленькія, ні ў чым,— голас у старога задрыжаў, і здавалася, ён вось-вось заплача. Але такога не здарылася, наадварот, у яго голасе загучаў метал.— Яны з нячыстай сілай звязаліся. Не раз я ўжо такое чуў, але ўсё не надта верылася, бо гэта ж сын мой, а ваш родны бацька. Думаеце, мне лёгка? Эх, мае вы гаротныя!..

— Так, і я чула, як нашы вяскоўцы, пры мне не хацелі гаманіць, а як я адышла, то казалі, што нячысцікі іх блытаюць. Яны за гарэлку душы свае запрадалі, цяпер ім ужо ні да чаго няма справы, толькі сябе і глядзяць. Дакладней — і не сябе, а як бы выпіць. На вас зусім не глядзяць. Вам бы яшчэ адпачыць, пабегаць, каб нешта з дзяцінства яснае запомніць на ўсё жыццё, а тут такое вось здарылася...

— Чаго ўжо вы гэтак убіваецеся, бабуля? — перабіў старэйшы ўнук.— Мы самі паспрабуем выкруціцца. Бачыце, многае рабіць ужо навучыліся, а што людзі падкажуць... Часам некаторыя і падсабляюць, асабліва калі нам не пад сілу.

— Вы зараз не палохайцеся, унучкі, цяпер мы будзем да вас кожны дзень прылятаць, раз такое здарылася. Пабачылі мы за гэтыя разы, як прыляталі, што вам даводзіцца самім пераварочваць, і цяпер будзем толькі з вамі. Сваю гаспадарку мы ўжо трымаем невялікую, і нам будзе проста дапамагаць. Калі не адолеем сілай, то, выбачайце, хоць парадай...

— Дзякуй вам, дзядулька! Дзякуй вам, бабулька! Цяпер мы разам будзем! — запляскала ў ладкі маленькая ўнучка і заскакала на адной ножцы, чым міжволі выклікала ўсмешку ў астатніх.

Бацькі прыйшлі дамоў дзесьці толькі дні праз тры. Адляжаліся, адаспаліся, зірнулі разоў колькі на вуліцу, і ўсё на гэтым. Набіраліся сілы, каб зноў пайсці ў якую-небудзь вандроўку па гэткіх жа абібоках і п'яніцах, як і самі. А то яшчэ мала таго, што нап'юцца ды паміж сабою паб'юцца, дык і дзяцей бязлітасна катуюць. Зусім звярэць пачалі.

Раз пряляцелі бабулька і дзядуля, прыселі пад вербачкай і хацелі ўжо ў людзей пераўвасабляцца, як пачулі адчайны крык:

— За што вы яго катуеце? Што ён вам благога зрабіў? Вы ж яго да смерці давядзяце!

Старыя адразу пазналі голас іхняй ўнучкі. Падляцелі бліжэй і ўбачылі, як бацька лупцуе чым папала старэйшага сына, а той маўчыць, нібы вады ў рот набраў, і толькі пакручваецца, каб хоць неяк змякчыць шматлікія ўдары. Не ўтрываўся тады дзядулька і што было сілы загарлаў:

— Ты што,ваўкарэзіна, робіш?! Ты за што дзіця б'еш? За тое, што яно працуе, рук не пакладаючы, што астатніх дваіх гадуе без вас?! Каб жа табе рукі

паадсыхалі! Каб табе спакойнага жыцця на гэтай зямлі не было! Каб табе кожны ўдар па гэтым худзенькім целе сто разоў адбіўся! Каб ужо ты горла сваё смалой гаручай дзе-небудзь заліў і на гэтым скончыўся!

Як пачуў гаспадар бацькоўскі голас, то адразу і прыціх. Ён жа спадзяваўся, што старыя не ведаюць, як жывуць яны тут. Не хацелася, каб былі нейкія сведкі. А тут гэтак атрымалася. Паспрабаваў адгаварыцца:

— Гэта ж, тата, зладзеяваты ён у нас. Толькі што пакінем — то адразу і прыбярэ, ды яшчэ і не прызнаецца...

— Няпраўда гэта! Няпраўда! — закрычала маленькая ўнучка і затрэсла ручкамі, а старэйшы сын ад абразы і ганьбы заплакаў горкімі слязьмі.

Стары не вытрымаў і зноў закрычаў:

— Як табе не сорамна? Як гэта ў цябе язык павярнуўся такое сказаць? Эх, сынку, сынку... Гарэлкай ты з жонкай не толькі вочы, але і сумленне сваё заліў. Такое сказаць... Гэтае дзіця начэй недасыпае, недаядае, а малодшых корміць. Гаспадарку на сваіх плячах трымае, і паглядзі, як усё спраўна робіць. Думаў, што мне памерці спакойна давядзецца, што ўсё да парадку табой будзе даведзена, але памыліўся. Памыліўся я, сынок, у табе. Праклёнам вас цяжкім праклінаю, даравання ад мяне не чакайце, нават калі перад смерцю з людзьмі развітвацца буду. А ўнукаў болей не чапай, не чапай, бо я табе за іх вочы павыдзіраю! Не хочаш глядзець гаспадарку — не глядзі. Я са старой малым дапамагу, але табе тут нічога болей належаць не будзе, так і ведай. Начаваць можаш, перакусіць, а на большае і не разлічвай...

Пачуў такія словы сын, злосна крутнуўся на месцы і, клікнуўшы жонку, прамовіў:

— І без вас абыдземся! Як сабе хочаце, так і жывіце! А мы пойдзем да сяброў, там і весялей, там з намі апошнім падзеляцца і выказваць не будуць. Пайшлі, жонка...

Сказаў такое гаспадар і пайшоў са сваёй палавінай з хаты прэч.

Не было, можа, цэлы тыдзень бацькі з матуляй, а дзеці — яны дзеці і ёсць. Шкада ім стала бацькоў, таму запрасіліся ў дзядулі:

— Можна, мы пойдзем іх шукаць? Бо не па-людску гэта, калі недзе пад плотам ці на дарозе сканаюць.

Знойдзем, прывядзём дамоў, то хоць сэрцы нашы супакояцца. А то нешта не так...

Ад такіх слоў бліснулі слёзы ў вачах старога. Падумалася яму, якія чуйныя душы ва ўнукаў. Ён пракляў сына з жонкай, а яны даруюць. Толькі і адказаў:

— Ваша справа...

Доўга хадзілі дзеці і шукалі сваіх бацькоў, але нідзе не маглі іх напаткаць. Толькі пад самы вечар пачулі, як недзе зусім непадалёку ад іх плача-заходзіцца... дзіця. Пайшлі яны на той крык і ўбачылі тату і маму, моцна п'яных. Яны ляжалі пасярод дарогі, а ля іх гаспадарылі чэрці. Спазніліся б на хвіліну — і ўсё. Прывялі бацькоў з горам папалам дамоў, а дзед пытаецца:

— Дзе ж вы іх, родненькія, знайшлі?

Унучка і кажа:

— На старых дарогах, дзядулька.

Так з таго часу і павялося — Старыя Дарогі.

Паводле другога падання вынікае, што калі напалеонаўцы падчас вайны з рускімі ўцякалі дамоў, то крычалі ўвесь час, што бягуць па старых дарогах...

## КРЫЧЫНА

Спачатку то была не вёска, а невялікі хутар, усяго некалькі хацін у глухім лесе. А раз так, і звяр'я ўсялякага хапала, і бядот ад іх таксама. Ці ж вы не чулі, як яны лютуюць? Асабліва ваўкі. Вакол хутара пастаянна воўчыя зграі круціліся. Гэта ўзімку, а калі цёпла было, дык навокал выводзіліся маладыя ваўчаняты, і, каб іх пракарміць, іхнія бацькі цягнулі з хутара ўсё, што толькі маглі. Людзі жылі ў страху, як цямнела крыху, то баяліся далей падвор'я выйсці, бо ваўкі пад самымі сценамі шнырылі, спажыву шукалі, ні перад чым не спыняліся. І не было на іх ніякай управы. Звяры адчувалі, што іх палохаюцца, і яшчэ больш лютавалі.

Ці адзін раз чулі людзі, як пасля апоўначы не сваім голасам крычала зусім недалёка ад іх ахвяра. Чуцьто чулі добра, але дапамагчы не маглі, бо толькі выйдзі за падворак — на плечы можа ўскочыць раз'юшаны звер, які ростам перабольшвае добрае цяля. Хвілінадругая, і ўжо ты будзеш гарлаць аб дапамозе, і табе ўжо ніхто не прыйдзе на выручку.

Спрабавалі сяляне не раз і не два што-небудзь прыдумаць, каб адвадзіць лясных драпежнікаў: бралі парася ў мех і рабілі засаду, сабраўшыся ўсе разам. Але толькі мех прывязвалі да елкі і хаваліся самі, як навокал трашчала голле, сухадрэвіны, і гэтулькі ваўкоў на піск набягала, што бедныя паляўнічыя самі вымушаны былі сядзець на дрэвах да раніцы. Потым толькі ўжо пасмейваліся адзін з аднаго:

— Эге, братка, а самым смелым аказалася парася! Яно нават пры ваўках не баялася вішчаць! Не тое што мы!

— А што мы? Мы на дрэвах тым часам сядзелі! Маўчалі, як тая рыба пад лёдам!

— Так, паляўнічыя, гавораць, заўсёды смелыя толькі ў хаце ці ў застоллі, а калі давядзецца, то лазяць, як бортнікі па дрэвах, і лёзіва ніякага не трэба...

— Каб мне хто калі сказаў, што я на такое высокае дрэва залезу і галава кружыцца не будзе, то ніколі не паверыў бы. А тут, мала таго, што залез, дык яшчэ на такую галюку сеў, якая цудам толькі ўтрымала мяне і не абламалася.

— А я на сасну ўспёрся, а ў ёй сукоў, можа, на вышыню дзесяць сажняў няма. І не падсаджваў жа ніхто, не дапамагаў... Вось да чаго страхоцце даводзіць.

— Мяне нячыстая, відаць, падбіла ўскараскацца на тую лясіну, пад якой мы мяшок з парасём прывязалі, то ўніз як гляну, дык здаецца, што пад маім дрэвам усе ваўкі сабраліся...

— Яно-то добра, што так усё скончылася. Добра, што смяёмся і ўсе да аднаго жывыя. Магло здарыцца і зусім іначай, тады б не да смеху было...

— І ўсё роўна, мужчыны, трэба ж нешта рабіць, бо далей гэтак жыць немагчыма. Звядуць яны наш хутар з белага свету. Дзе ж гэта вы бачылі, каб жывёлу, якіх пяць кароў і цялушак, пасвілі толькі дарослыя людзі. Дзяцей жа не пашлеш, бо і іх звяр'ё пахапае.

— Вось гэта самае страшнае. Ды і родныя не хочуць нават у госці ісці, бо баяцца. Кажуць, што ў нас тут воўчы край, і далёка не кожны асмеліцца сюды ступіць.

Пагаманілі дарослыя паміж сабою пасля няўдалага палявання ды разышліся па падворках справамі займацца, але дамовіліся, каб кожны нешта прыдумаў,

як можна напалохаць ваўкоў і адвадзіць ад гэтых мясцін.

Вечарам зноў сабраліся разам. Паселі на прызбе і маўчаць, бо пакуль што ніхто нічога слушнага не прапанаваў. Сонейка непрыкметна села, змрок пачаў за голле чапляцца. Людзі сядзяць і ўслухоўваюцца. Адзін з мужчын і гаворыць:

— Нешта сёння ніхто не крычыць, ніхто на дапамогу не кліча...

— Дасць Бог, пранясе, і не пажывяцца яны гэтым днём,— азваўся другі.

— Каб жа так здарылася,— дадаў трэці.

Нібы ў адказ на іхнія развážанні недзе здалёку данеслася адчайнае:

— Дапамажыце! Людцы, дапамажыце! Ваўкі! Ратуйце!

Вяскоўцы панура маўчалі. Баяліся пагледзець адзін на аднаго, сорамна было, што чалавек паратунку просіць, а яны сядзяць і з месца не рухаюцца.

— Жанчына крычыць,— міжволі вырвалася ў самага панурага,— бедалага, страшнай смерцю памрэ. Навошта ўжо гэтак людзям мучыцца. Няхай бы ішоў, ішоў, упаў сам ці на галаву што бомкнула, а то ваўкі жывое цела на кускі пашкуматаюць...

— У кожнага свой лёс. Жанчына крычыць ці мужчына, стары ці дзіця — мы ўсё роўна нічым не дапаможам. Думаць трэба, каб неяк іх адвадзіць...

Усталі і пасунуліся паволі па хатах, несучы з сабою ўласныя думкі і гароту.

Раніцай сабраліся зноў. Тут адзін з хутаранцаў і кажа:

— Мне здаецца, браточкі, што я прыдумаў. Ведаю, як гэтых злыдняў адсюль выправадзіць. Яны сваёй сілай пахваляюцца, і мы з імі гэтаксама дзейнічаць будзем. Дапаможаце сёння зрабіць пастку?

— Ведама што дапаможам. Самі ж дамаўляліся дзейнічаць агульна, бо ўсім ад гэтага бяда і гора. Якая нам выгода адмаўляцца,— пагадзіліся астатнія.

— То пайшлі, каб дарма час не бавіць. Я толькі самае асноўнае прыдумаў, а трэба ж драбніцы ўсе прадумаць, каб нідзе не схібілі, бо тады дарэмнымі намаганні нашыя будуць...

Прыйшлі яны ў густы ельнік і давай яму капаць. Адзін тлумачыць, што ён хоча зрабіць, а астатнія слухаюць і далей капаюць.

— Вырыем яміну метры на тры глыбінёй, каб не здолеў нават самы хітры воўк выскачыць, а сюды авечку пасадзім. На яе пах не адзін звер прыпрэцца...

— А далей?

— Далей раскажу, калі воўк ускочыць...

— А атрымаецца?

— Павінна. Толькі час дарма не баўце, рабіце хутчэй, каб да полудня паспець, каб звяры нічога не западозрылі...

Выкапалі мужчыны яму глыбокую і вузкую, старанна замаскіравалі яе і дамовіліся пад вечар, калі сонца будзе садзіцца, прынесці авечку і ўкінуць. Пабаяліся днём жывёліну кідаць, спаслаўшыся на тое, што ваўкі збяруцца тады, калі ў людзей яшчэ якая праца будзе, яны не паспеюць зрабіць задуманае — адвучыць лясных разбойнікаў.

Марудна цягнуўся час. Хутаранцы не адыходзілі ад падвор'яў, пільна сачылі за тым, што робіць сусед, і гатовы былі па першаму слову сабрацца разам, каб здзейсніць свой план.

Нарэшце той, хто ўсё прыдумаў, выйшаў з двара і гукнуў:

— Хлопцы, збірайцеся, час прыспеў!

Другі раз паўтараць не трэба было. Усе адразу збегліся разам, хто з віламі, хто з сякерай, а хто з дубовай доўгай рагацінай, з якой не раз і не два на самога мядзведзя-бацюхну палявалі хадзіў. Авечку звязалі і ўскінулі на плечы самаму маладому са словамі: «Паслужы добрай справе, жывёліна».

Прыйшлі да яміны і гопнулі туды авечку, а самі непадалёку стаіліся ды ва ўсе бакі азіраюцца, бо хто там ведае, адкуль драпежнікі з'явяцца. Раптам пачуўся трэск, і на палянку вылецеў здаравенны воўк. Крутнуўся на месцы і прыпаў да ямкі. Лазіць, зубамі скіргоча, а што рабіць — не здагадаецца. Потым не вытрымаў і гопнуўся да авечкі. У той самы момант хутаранец, які гэта прыдумаў, скамандаваў:

— Цяпер бліжэй да ямкі, браткі, і не шкадуйце сваіх рук, біце гада чым папала... Але старайцеся адразу да смерці не забіць, каб ён доўга памучыўся-пакрычаў...

Як узяліся біць-лупцаваць, а воўк як заверашчыць, як завішчыць, то хоць ты вушы закрывай, слухаць нельга. Можа, з паўгадзіны дубасілі, пакуль не апруцянеў.

Сталі потым, глядзяць адзін на аднаго ды ў цішыню ўслухоўваюцца. Але толькі чуваць, як лаўжы трашчаць, а ніхто болей не крычыць, не просіць аб дапамозе. Тады адзін з мужчын не ўтрымаўся і кажа:

— Ну і крычын мы тут сёння нарабілі... Ужо не ахвяры воўчыя галасілі, а сам драпежнік жыць прасіўся...

Як ён сказаў «крычын», так і засталося назаўсёды. Цяпер ужо вёску (яна паступова з хутара ўтварылася) Крычын сталі зваць.

## МЯДЗВЕДНЯ

Даўней тут мноства звяроў было. І ў сённяшнія часы вакол вёскі густыя лясы, а можаце сабе ўявіць, як гэта выглядала тады. Гаварылі старыя людзі, а ім яшчэ намнога старэйшыя пераказвалі, што ў нашай вёсцы сяляне на мядзведзях бярвенні з лесу валаклі. Прывучалі з маленства і выкарыстоўвалі потым ляснога асілка ў сваіх, гаспадарчых, мэтах. Як возьмецца мядзведзь за лясіну, то і дзесяцёра чалавек такое дрэва з месца не скрануць, а ён сам да воза падсуне і наверх пакладзе. Хіба ж не выгадна было такіх звяроў у падвор'і трымаць? Праўда, і небяспечна, асабліва калі ён нечага злаваўся ці шалець пачынаў. Не супакоіш адразу такога здаравяку. Толькі і заставалася, што забіваць ці дазваляць мядзведзю самому вырашаць уласны лёс — гэта значыцца адрывацца з ланцуга ці з якой іншай прывязі і ўцякаць назад у родны для яго лес.

Казалі таксама (і такое не было рэдкасцю), што магутныя мядзведзі прама на вуліцы вёскі сустракаліся. Вяскоўцы іх без дай прычыны не чапалі, то і звяры не надта вялікую шкоду рабілі. Есці ім заўсёды хапала, дык і жывёлу не краналі, а карысталіся тым, што самі здабывалі. Тыя небяспечныя былі, якія зімой спаць не клаліся. Сяляне сцвярджаюць да гэтых часоў, што гэтыя мядзведзі ў нечым саграшылі перад сваімі сабраццямі і таму не атрымалі дазволу нароўні з усімі легчы спаць на працяглы зімовы перыяд. Не было ім болей звароту назад, да лясной сям'і. Вось яны за гэта і помсцілі. А ў крыўды ды ў злосці, як вядома, вачэй няма. Хто трапіўся першым, той і паплаціўся жыццём, калецтвам, перапудам.

Можа б, і не так іх людзі баяліся, каб мядзведзі не былі надта ж хітрымі. У пяці мужыкоў столькі розуму не будзе, колькі ў аднаго звера. Ён жа і ў засаду засядзе, і падкрадзецца, і голас ці паходку падробіць так тонка і ўмела, што і не здагадаецца ніхто.

Надзвычай часта згадваюць пра адзін выпадак, які нібыта ў нашай вёсцы здарыўся, хоць мне даводзілася чуць яго і ў іншай мясцовасці. Тут распавядаецца пра тое, што мядзведзі хітрыя і ўдзячныя, асабліва калі ім чалавек дабро зробіць. Яны такога ніколі не забываюць. Паслухайце, як усё адбывалася.

У адной сям'і была гаспадыня. Звалі яе Ганна. Працавітая маладзіца. Калі ўчэпіцца за што, то нічога вакол сябе не заўважае. Часта здаралася, што нават палуднаваць забывалася і згадвала пра гэта, калі сонца ўжо за лес пачынала каціцца і сілы ў руках ніякай неставала. Тады толькі магла даць спачын свайму целу.

Дзівіліся на яе людзі. Як гэта можна адной столькі зрабіць, што трое самых спраўных і ўвішных жанчын не дагоняць. Пыталіся ў Ганны, а яна ўсміхалася ў адказ ды сарамліва мовіла:

— А хто ж яго ведае. Я і сама адказаць не магу, чаму так атрымліваецца. Неяк задумаюся, ды толькі пра адно — каб зрабіць болей. Таму і робіцца ўсё само па сабе...

— А ад каго ў цябе такія спрытныя рукі? Яны ж, відаць, стомы ніякай увогуле не ведаюць? Толькі і бачыш, як мільгаюць, ні на хвіліну не спыняючыся.

— Рукі як рукі. Няма ў іх нічога дзіўнага. Стомы, кажаце, не ведаюць? То начамі так ломіць іх і круціць, што слязьмі горкімі плачу... Ад каго яны мне дасталіся? Ад нябожчыцы-матулі. Яна надта ўвішная была. Я з ёю не спрацавалася б. Вось хто працаваць умеў і любіў. Не бачылі вы яе, як яна ўсё рабіла...

Дык вось гэтая самая Ганна аднаго разу пасеяла з мужам лён. Кавалак той зямлі быў далекавата ад дома, пад самым лесам, калі не сказаць, што ў лесе, бо адным канцом упіралася ніва прама ў адвечны бор, які аб нечым пастаянна шумеў-гаварыў сам з сабою. Вясною пасеялі, а з лёнам трэба добра пагнуцца-папрацаваць, каб мець потым і вопратку, і яшчэ што такое. Таму і глядзела-сачыла Ганна ўважліва за тым, як ён рос.

Незаўважна прайшоў час, і трэба ўжо было гэты

лёнірваць. Таму, калі вячэралі, сабраўшыся ўсёй сям'ёй пасля працоўнага дня, гаспадыня і сказала мужу:

— Пайду я, чалавеча, заўтра наш лён на ніве рваць. За пару дзён упраўлюся, бо далей цягнуць нельга. Каб усё ў час паспець зрабіць як мае быць, то нічога не згніе.

— Можа яшчэ з тыдзень пачакаць? — спакойна прамовіў гаспадар.— Здаецца, яшчэ ніхто не рваў...

Але сказаў ён гэта не для таго, каб спрачацца з жонкай, а хутчэй для таго, каб даць зразумець жанчыне, што, можа, час прыспеў і перадыхнуць крыху перад самымі цяжкімі сялянскімі працамі. Ганна здагадалася, таму ўсміхнулася і ціха адказала:

— Зімой сядзець будзем. Адпачнём... Самі будзем казкі казаць, а дзеткі нашы — слухаць. Тут жа няма калі сябе шкадаваць. Дзень упусцім — потым плакаць будзем, ды нічога назад не павернеш.

— Ну, раз вырашыла, то няхай так і будзе,— пагадзіўся гаспадар і потым, падумаўшы, дадаў:

— А я з'езджу ды папрацую з дзецьмі на нашай другой ніве, якая бульбай засаджана. Такім чынам, за адзін дзень мы ў два месцы паспеем.

З раніцы пачалі збірацца. Жонка паспела і есці зварыць, і сабрала перакусіць сабе ды дзецям у поле. Толькі тады пачала будзіць сваіх меншых:

— Уставайце, дзеткі, сонейка даўно ўжо па небе бегае, на працу ўсіх сумленных людзей запрашае. Нельга спаць, калі яно свеціць,— гэта ваша бабуля некалі любіла паўтараць.

Усхапіліся тыя і, спаласнуўшыся, бегма за стол есці ды на поле з татам збірацца. Так і разышліся ў розныя бакі: муж паехаў бульбу з дзецьмі капаць, а Ганна папраставала лён ірваць.

Пакуль прыйшла, пакуль пераадолела тыя вёрсты, то ажно спіна ўзмакрэла. Каб яшчэ з людзьмі ішоў, то дарога не такая нудлівая, а самому — дык ні пагаварыць, ні паспяваць, адно толькі — хутчэй зайсці. Вось і маладзіца джгала так, нібы за ёю нехта гнаўся.

Прыйшла на месца, скінула торбачку з плячэй, паражагналася на сонейка і пачала працаваць. Радуецца гаспадыня, што лён гэткі добры ўдаўся: высокі, кусцісты, нібы венік цэлы зрываеш адразу, калі за асобнае каліўца возьмешся. Паглядае папера сябе Ганна і мяркуе, колькі трэба сёння зрабіць, а

колькі на заўтра пакінуць, каб за два дні зрабіць усё. Задумалася і рве ды рве, потым песню зацягнула. Яе таксама ад матулі сваёй пачула ўпершыню і пераняла. Падабалася песня тым, што словы простыя, а за сэрца кранаюць, нібы пра ўласнае жыццё ў ёй гаварылася.

Спявала жанчына і не заўважыла, як сонейка на полудзень паказваць пачало. Запрацавалася. Ужо і да вечара не надта далёка, а яна справай занялася і нічога навокал не заўважае. Зрабіла ўжо добрую палавіну, і за заўтрашнюю норму ўзялася. Ускіне галаву, азірнецца і зноў далей.

Ажно пачула Ганна, як на суседніх нівах жанчыны нечага голасна закрычалі. Разагнулася і давай узірацца, што там да чаго. Убачыла толькі, як маладзіцы і старыя гаспадыні ляцяць так, нібы ім хто пяткі здорам панамазваў. Усміхнулася, а потым устрапянулася: «Нешта ж здарылася?» Памкнулася было сама за імі бегчы і тут аслупянела: прама перад ёю, кроках, можа, у чатырох-пяці, стаяў на задніх лапах здаравенны мядзведзь. Звер уважліва пазіраў на Ганну, а жанчына ўжо і дыхаць баялася. Так і стаялі хвілін колькі. Мядзведзь не ступаў да маладзіцы, а яна назад таксама не адступала, бо баялася гэтым раз'юшыць ляснога гаспадара. Крыху супакоіўшыся, пачала ўглядацца ў мядзведзя і заўважыла, што адну пярэднюю лапу ён трымаў надзвычай асцярожна і што яна ў яго страшэнна распухла. Тады жанчына вырашыла паспрабаваць падысці да звера. Зрабіла пару крокаў — нечаканы госць паводзіў сябе міралюбіва. Ёй нават падалося, што ён нахіліўся ніжэй. Узялася Ганна за хворую лапу і войкнула: з лапы тырчала вялізная стрэмка, якая глыбока пранікла ў цела і выклікала загнаенне.

— Ну што, мішка касалапы, будзем выцягваць? — зусім асмялеўшы, прамовіла Ганна.

Злаўчылася неяк, ухапіла зубамі стрэмку і выцягнула яе. З раны пабег гной, пацякла сукравіца. Маладзіца выціснула ўсё старанна, перавязала хусткай і стала, як укопаная, чакаючы, што ж будзе далей.

Мядзведзь нахіліўся яшчэ ніжэй, і жанчыне падалося, што ён ёй пакланіўся. Потым павярнуўся і, смешна кульгаючы, папёр да лесу.

Дома Ганна распавяла сваім пра здарэнне. Усе ўважліва слухалі. Потым муж прамовіў:

— Заўтра яго не будзе. Можашісці спакойна. Людзі кажуць, што яны па сваіх слядах двойчы не ходзяць.

З раніцы Ганна зноў пайшла на ніву. І што ж вы думаеце? Недзе пад полудзень, калі яна ўжо канчала працу, з'явіўся мядзведзь. Ён зноў ішоў на задніх лапах, а ў пярэдніх нешта трымаў. Падышоў бліжэй, паклаў на зямлю, крыху пастаяў і пабег да лесу. Ганна глянула на тое, што паклаў звер. Гэта быў свежы ліпавы мёд. Так ён аддзячыў сваёй выратавальніцы...

Вось таму і завецца наша вёска Мядзведня, што заўсёды ў нас шмат мядзведзяў вадзілася, розныя гісторыі з імі прыключаліся.

## ПАСЬКОВЫ ГОРКІ

Сабраліся аднаго разу тры хлопцы і пачалі спрачацца паміж сабою, хто самы смелы з іх, а хто баязлівы. Даказвалі, пераконвалі адзін аднаго, але ніяк не маглі дагаварыцца. Тады вырашылі праверыць на справе, а хто першым пахваліўся — таму і выпала ісці даказваць, што ён нічога на свеце не баіцца.

Сябры пераглянуліся і кажуць:

— Вось што, братка, прынясі ты нам цагліну са старой лазні. Не надта цяжкае заданне, бо ты ж першы выпрабаванне праходзіш...

А на дварэ стаяла цёмная непраглядная ноч, хоць вочы выкалі — нічога не бачна. За які крок чалавек ператвараецца ў невыразны сілуэт.

Пайшоў хлопец да лазні. Ідзе ціхенька, дыхнуць баіцца, углядаецца, каб дзе не ўпасці ды ногі не паламаць ці галаву не скруціць. Нарэшце дайшоў да мэты — прама перад ім стаяла напаўразбураная лазня. Прасунуў хлопец руку за дзверы і пачаў шукаць цагліну. Шнырыць рукой туды-сюды, ажно раптам нешта ўхапіла яго за грудкі, ды так моцна, што і паварухнуцца нельга. Стаў бедалага прасіцца:

— Адпусці мяне, няведама хто... Адпусці, я ж нічога благога зрабіць не хацеў... Вазьму адну цагліну і назад пайду...

А невядомая істота суровым голасам адказвае:

— Як паабяцаеш, што прыйдзеш да мяне ў сваты, то адпушчу ў гэты ж момант, а не — то будзеш сядзець тут да самай смерці. Выбірай, я не жартую, як скажу — так і зраблю.

Падумаў, падумаў хлопец і прамовіў:

— Мне нічога іншага не застаецца, як падпарадкавацца. Калі маеш сілу, то і волю дыктуеш, а калі слабейшы, то падпарадкоўваешся. Добра, я згодны.

Толькі так сказаў — яго адразу і адпусцілі. Ухапіў ён цагліну і папёр дамоў, каб сябрукі засведчылі яго-ную смеласць.

А тыя сядзелі і чакалі, узіраючыся і ўслухоўваючыся ў цемру. То адзін падыходзіў да акна, то другі — нікога не было.

Ажно неўзабаве дзверы расчыніліся і на парозе з'явіўся той, каго яны правяралі. З цаглінай у руках.

— Ну, малайчына, Пасько (гэтак таго хлопца звалі),— пачалі хваліць яго астатнія,— даказаў, што недарма пахваляўся сваёй смеласцю і храбрасцю. Цяпер наша чарга. Толькі ўжо заўтра вечарам пачнём, бо хутка раніца сёння надыдзе і часу не стане...

— Добра,— пагадзіўся той адразу, нібы чакаў такой прапановы.

Разышліся па хатах. Пасько прыбег да бацькоў і кінуўся на палок, каб паспаць хоць пару гадзін, бо на працу ж давядзецца ісці. Ды не так проста ўдалося яму заснуць. Толькі вочы заплюшчыць, як чуе, што нехта пад вокнамі ходзіць, да дзвярэй падбіраецца. Мала таго — стане і зноў давай нагадваць:

— Калі да мяне сватоў пашлеш, то дарую табе ўсё, а калі слова, табою дадзенае, парушыш, то не чакай ад мяне літасці. Глядзі, хлопча, у апошні раз цябе папярэджваю. Як хочаш, так і выходзь з гэтай сітуацыі...

Што было рабіць Паську? Нічога іншага не заставалася, як, устаўшы раніцай, сказаць матулі, каб пякла святочны пірог ды ў сваты ісці збіраліся, бо яму жаніцца трэба. Здзівілася маці, пачаў чухаць галаву гаспадар — ніколі раней сын не гаварыў пра вяселле, а тут на табе. Але не паказалі сваёй разгубленасці, бацька кхекнуў у кулак і прамовіў:

— Што ж, раз трэба, то трэба. Пячы пірог, маці, ды і пойдзем... Чым мы горшыя за іншых людзей! Будзе і ў нас усё па-людску...

Спяклі пірог, і Пасько павёў сваіх родных да старой лазні, як і патрабавала невядомая істота. Зайшлі ў сярэдзіну — там нікога не было. Стаялі, можа, з гадзіну, чакалі, думалі, што прыйдзе гаспадыня гэтай будыніны, але яе не было. Пераглянуўся хлопец з бацькам і матуляй і кажа:

— Раз няма нікога тут, то самі барыш пап'ём ды дамоў пойдзем. Я сваё слова стрымаў, няхай незнаёмка да мяне болей не чапляецца. Сядайце вось сюды, і вып'ем, каб не так маркотна назад было ісці.

Паслухаліся бацькі сына, прыселі за стол, дасталі пірог і гарэлку, закуску ўсялякую і давай сабе паціху баляваць. Пакуль пасядзелі, пакуль пагаманілі, то і часу даволі прабегла. Ужо добра на вуліцы сцямнела. Убачыўшы гэта, маці сказала:

— Пайшлі дахаты, бо цёмна стала на дварэ. Няма чаго тут дапазна затрымлівацца.

Усталі і да дзвярэй памкнулі, ажно тут пачулі словы:

— Дзякуй вам, дарагія, што слова сваё стрымалі, што прыйшлі, як і абяцаў ваш сын. Пасядзелі, пагаманілі без мяне — гэта нічога. Толькі запамятайце, што вяселле заўтра будзе. Часу асабліва разгульвацца няма, трэба ўсё паспець падрыхтаваць...

Дзявочы голас быў прыемны, сакавіты. Старыя заўсміхаліся, відаць, і сама будзе прыгожая, калі пакажацца на вочы. Спакойна адказалі гаспадыні:

— Заўтра дык заўтра. Паспеем...

Дзяўчына яшчэ нешта шаптала хлопцу, а Пасько стаяў і задаволена пасміхваўся. Пра што казала — бацькі так і не даведаліся, ды, калі шчыра, гэта іх і не надта хвалявала.

Як сказала дзяўчына, так усё і зрабілі, каб яе не пакрыўдзіць. Пасько святочную вопратку ёй паспеў купіць, абутак і ўпрыгожванні некаторыя. Падрыхтаваўся, адным словам. Пайшлі на вяселле. Толькі ў хату ўвайшлі, Пасько раз — і ўсё прынесенае ўкінуў у печ. Яно тут жа занялося яркім полымем. Яшчэ агонь не патух — з печы выйшла дзяўчына, ды такая прыгожая, такая прывабная — вачэй не адарваць. Стой толькі і глядзі. Маці з бацькам рукамі ўспляснулі і на сына пазіраюць. Маўляў, бачыш, якое шчасце прываліла, а ты сумняваўся.

Павянчаліся маладыя і сталі сабе жыць прыпяваючы.

Аднаго разу ў суседняй вёсцы быў кірмаш. Таму з самае раніцы жонка і звяртаецца да Паська:

— Мужу, запражы коніка, і мы паедзем. Паглядзім, як там людзі жывуць, навіны пачуем...

— Давай, толькі з адной умовай: пойдзем у той

двор, у які конь сам скіруе. Не палохайся, гаспадары вароты самі адчыняць... Я зараз, а ты збірайся...

Паселі на воз і паехалі. Едуць сабе (а дарога доўгая, праз лес цягнецца) ды размаўляюць, каб час хутчэй ішоў. Нарэшце і тая вёска паказалася, куды яны кіравалі. Глядзяць, куды ж конік завязе. А жывёліна цыбае па вуліцы і па баках нават не пазірае. Да канца паселішча дайшла і завярнула ў самы апошні двор, побач з могілкамі. Выскачылі адтуль гаспадары, адчынілі дзверы, у госці запрашаюць. Пасько з жонкай за імі ідуць. Селі за сталы і бачаць, што няма ў хаце звычайнай для такіх святаў весялосці. Пераглянуліся паміж сабою, і пытаецца жонка:

— А што гэта вы пахмурныя нейкія? Можа здарылася нешта?

— Эх, галубка, здарылася,— са скрухай у голасе вымавіла гаспадыня. Семнаццаць гадоў нашай дачушцы, а яна ляжыць у калысцы, нібы немаўля, і не расце, і не ходзіць, і не размаўляе... Дзяцей болей няма, а гаспадарка спраўная... Усё маем, ды шчасце нас абышло. Вось такое гора...

— А дзе ж ваша дачушка?

— У калысцы ляжыць, дзе ж ёй яшчэ быць.

— Пакажыце мне.

— Ды вось, гляньце.

Падышла госця да калыскі, стала пільна глядзець на дзіця і нешта шаптаць. Потым вады прынесла і дала напіцца. Як толькі дзяўчынка яе выпіла, то на вачах пачала расці і тут жа стала размаўляць. Так за адзін момант і вылечыла жанчына хворую. Удзячныя гаспадары далі ім ладны кавалак сваёй ворнай зямлі, бо ў іх жа ўсяго ставала. Пераехалі Пасько з жонкай туды жыць. Нават пчалярню завялі. Потым ужо і вёска стала, якую людзі назвалі Паськовы Горкі, бо невысокія ўзгоркі там-сям былі.

## ЯЗЫЛЬ

Нашай вёсцы не год і не дзесяць, а можа, пяцьсот ці чатырыста ў крайнім выпадку. Назва яе пайшла ад старадаўняга занятку нашых продкаў — рыбнай лоўлі. У тыя часы рыбы было не столькі, колькі зараз, а намнога болей, і, самае галоўнае — яе дазвалялася ўсім лавіць. Трэба чалавеку свежая рыба, то збярэцца і ідзе сабе на балота, на рэчку, на возера. Яе столькі

было, што кішэла ў вадзе! Праўда, калі на нераст ішла, то сяляне не хадзілі нішчыць рыбу, гэтак спрадвеку вялося. Колькі пакаленняў тут змянілася, а рыба як вадзілася, так і вадзілася.

Лавіць рыбу па-ўсялякаму можна было, як каму спадручней і гледзячы які вадаём пад бокам. Некаторыя гэта рабілі невадамі, сеткамі, а іншыя знаходзілі мудрагелістыя і разам з тым простыя прыстасаванні.

Спаткаліся аднаго разу два вяскоўцы — Сцяпан ды Іван, і нечага гаворка ў іх пра рыбу зайшла. Ці то часіна якраз падыходзіла адпаведная, ці то яшчэ з якой прычыны.

— Восень позняя на дварэ. Трэба было б і рыбы на зіму назапасіць,— сказаў Сцяпан.

— Ведама ж,— пагадзіўся Іван,— не толькі на зіму, да наступнай восені можна насушыць, калі пашанцуе.

— Дык давай сходзім.

— Чаму і не. Працы зараз няма. На падворку чыста, з поля ўсё звезлі і прыхавалі. Можна і схадзіць.

— А куды пакіруем? Ты болей хадзіў, то, можа, і мясціны лепей ведаеш?

— Ведаць-то крыху ведаю, але мне здаецца, што дзе ні распачнём справу — без здабычы не застанёмся. Рыбы хапае.

— Слухай, Сцяпане, а можа, пойдзем на рачулку, што пад лесам цячэ? Там я неяк столькі рыбы бачыў, нібы дзяружкай па вадзе ішла. Вось каб там спыніцца...

— Схадзіць-то сходзім, спыніцца — спынімся, але ці зловім?

— А чаму ты сумняваешся ў гэтым?

— Справа ў тым, што я некалі таксама на той рачулцы быў, але значна раней. Лес сплаўляў.

— Дык што з гэтага?

— Дно там, братка, занадта няроўнае, і карчоў многа. Зачэпімся, парвём снасці, і ўсё на тым, толькі працы сабе здабудзем, а рыбы — кот наплакаў.

— Не сумнявайся, я думаю, што ўсё будзе добра.

— Чаму ты так упэўнены?

— А таму, што так, як мы з табой лавіць будзем, да нас у нашай мясцовасці яшчэ ніхто не лавіў.

— А як жа гэта?

— Пачакай да заўтрашняга дня, і пра ўсё сам даведаешся. Смяяцца потым будзеш, што так проста і немудрагеліста.

— Дык да заўтрага, кажаш?

— Так, раніцай спаткаемся ля маёй хаціны. Запрагай каня, бяры сякеру, пілу ды вяроўку старую, якую ўжо выкідваць збіраўся.

— Тады я пайшоў...

На гэтым мужчыны разышліся, каб спаткацца заўтрашняй раніцай і распачаць важную справу.

Сцяпан кіраваў дамоў і ўвесь час думаў, як гэта яны заўтра лавіць будуць незвычайным спосабам. Што Іван кемлівасцю вызначаўся — усе ведалі, але што ён тут мог прыдумаць, было незразумела.

Яшчэ толькі пачынаўся восеньскі дзень, а Сцяпан ужо нецярпліва прыпыніў коніка ля Іванавага падвор'я. Нарэшце і той выехаў. Пакуль дабраліся да лясной рачулкі, то ўжо добра развіднела. Пасталі мужчыны, і Іван пачаў меркаваць:

— Думаю, браце, што найлепшая мясціна — вось тут. Бачыш, рэчка пакручваецца якраз і не надта шырокая. Гэта нам на руку. Меней работы.

Сцяпан пакуль што нічога не разумеў, таму толькі згодна ківаў галавой. Потым не стрымаўся і прамовіў:

— Ты скажы лепей, што рабіць будзем. Я ж да гэтага часу не ведаю. А ты нібы смяешся з мяне.

— Зараз пабачыш. А смяяцца я і не думаў.

— Давай паедзем і насячом лазы ды якога іншага голля. Вазы два-тры прывязём, і хопіць. Колля ўсялякага таксама мнагавата трэба.

Да полудня справіліся голля навазіць і калоў нарыхтаваць. А які там дзень восенню? Толькі распрацуешся, а ўжо трэба дамоў збірацца.

Дамоў едуць, Сцяпан на Івана злосна пазірае, а той і ў вус не дзьмухае, толькі ляжыць побач і гаворыць, як ні ў чым не бывала:

— Заўтра зноў з раніцы да мяне прыязджай. Рыштунак пабяром, снасці ўсялякія... Яны ў мяне ёсць. Ды не злуйся ты. Усё будзе добра, рыбы надта многа тут. Сам жа глядзееў і бачыў.

Раніцай спаткаліся па-новаму і паехалі на вядомае ўжо месца. Як пачалі вязаць у пукі голле, то Сцяпан і вочы вылупіў:

— А гэта яшчэ навошта?

— Праз пару хвілін даведаешся.

Набраў Іван цэлы абярэмак пукоў і да вады падаўся. Кінуў іх, убіў пару калоў і стаў сапраўдную сцяну рабіць. Потым невялікую адтуліну ў ёй пакінуў, і далей, зноў тое ж самае паўтарае.

— А лавіць чым жа будзем? — не ўтрываў Сцяпан.

— А тымі круглымі прыстасаваннямі, што на маім возе ляжаць. Хіба ж ты не бачыш? Іх жа там цэлы дзесятак. Якраз і хопіць.

— А хто гэта цябе, братка, навучыў? — павесялеў Сцяпан і ўзяўся дапамагаць.

— Дадумаўся неяк сам, што калі такімі звязкамі раку перагарадзіць, рыба ўсё роўна будзе адтуліну шукаць, каб далей прайсці... А снасць я неяк у аднаго старога бачыў.

Да ночы працавалі-шчыравалі мужчыны, але тое, што Іван задумаў, зрабілі і, болей таго, нават паспелі снасці паставіць. Ехалі дамоў, калі ўжо добра прыцямнела. Іван задуменна прамовіў:

— Цяпер, Сцяпане, дома падрыхтуй які посуд для рыбы ды заўтра раніцай зноў пад'язджай, бо трэба ж рыбу ехаць выбіраць і назад прывезці. Пабачыш, колькі яе там будзе.

І сапраўды, рыбы гару навалілі, як у адно месца вывалілі. Усю зіму стаяла запруда ў вяскоўцаў на той рацэ, і ў свежай рыбе яны патрэбы не ведалі.

Дапытваліся найбольш цікаўныя ў Сцяпана, дзе ён ловіць. Да Івана не чапляліся, бо той як скажа што-небудзь хітрае, дык і рот разявіш. Сцяпан трываў, трываў, а потым і кажа:

— Ды не надта далёка лавілі, тут, за язамі... за язамі...

Так і пайшла вёска Языль, ад таго слова — звяз ці яз...

А прозвішчы ў нашай вёсцы таксама рэдкія, мала дзе такія спаткаеш. Напрыклад: Міхаленя, Шпіленя, Раманеня, Капачэня, Яшчэня, Тучэня і г. д. Кажуць, што гэта павялося вось з якога выпадку.

Жыхары не мелі прозвішчаў, а іх жа трэба было неяк перапісаць, каб потым ведаць, каго ў воласць выклікаць ці яшчэ што. Прыслалі для такой адказнай справы валаснога пісара. Вядома ж, сяляне вырашылі спаткаць высокага, як ім падалося, госця адпаведна. Нанеслі закускі, дасталі гарэлкі і пачаставалі. А той як нарэзаўся ды як стаў прозвішчы самыя розныя даваць, то вяскоўцы ўжо і не рады былі, але што ты зробіш, калі так здарылася. Пісара таго даўно і косці згнілі, а прозвішчы, ім дадзеныя, жывуць, можа, ужо ў дзесятым пакаленні.



# СТОЎБЦЫ

Пра назву нашага горада спрачаюцца ўжо многія гады вучоныя і даследчыкі, а не толькі простыя жыхары, калі збяруцца старыя дзе-небудзь пасядзець, пагаманіць, падзяліцца апошнімі навінамі. Чаго там толькі не пачуеш. Прычым кожны даводзіць, што менавіта ягоная версія, апавяданне, былічка, легенда адпавядае рэальнасці. Па-рознаму гавораць. Адзін кажа, што ад бабулі чуў, другі — што ягоны дзядуля нават нейкія таямнічыя знакі паказваў, вось толькі за даўнасцю гадоў забыўся дакладна, дзе гэта знаходзіцца, трэці — сам нават чытаў старадаўнія паперы, дзе чорным па беламу было напісана і пра назву горада, і пра людзей, якія першымі тут з'явіліся, і пра тое, чым яны займаліся. Іншыя спрабуюць прыпомніць год стварэння, нібыта дакладна ім вядомы.

Адносна назвы, адкуль яна пайшла, мне даводзілася чуць вось што.

З Нёманам яна звязана. У даўнія-даўнія часы, калі яшчэ, можа, і вера старая была ў нашых продкаў, рэкі былі асноўнымі шляхамі зносін. Па іх перавозілі шматлікія грузы і тавары, па іх дабіраліся да

далёкіх земляў, плавалі на ворагаў, каб захапіць багаты палон і трафеі ці адпомсціць за іхні паход, і г. д. Адным словам, па рэках ці блізка ад іхніх берагоў у асноўным і ўзнікалі паселішчы. Спачатку яны былі дробнымі, а з часам павялічваліся і разрасталіся да буйных ці, здаралася і такое, увогуле знікалі з твару зямлі ў выніку нейкіх трагічных падзей. Пра такія ўжо толькі ў легендах і паданнях і можаце пачуць. А сам па сабе бацька-Нёман тады таксама далёка не такі быў, як зараз. Гэта ў апошнія часы ён абмялеў, і судны па ім амаль не плаваюць, плытоў не ганяюць. Раней жа...

Аднаго разу аднекуль здалёк — ці то з Балтыйскага мора, ці то з яшчэ якога — плыў вялікі караван суднаў. Вельмі багатая паклажа на іх была, бо купец, гаспадар каравана, быў ці не самым багатым чалавекам у сваім краі. Вырашыў гэты чалавек завезці тавары ў іншыя краіны і там памяняць, як і даўней рабіў, ці прадаць, а на грошы купіць нешта такое, чаго на радзіме нестае. Гандляр жа спакон вякоў толькі тым і жыве, што прадае ды купляе. Па нашай рацэ іхні шлях ляжаў, гэтак і карацей, і намнога зручней было. Нанялі пару праваднікоў. Самых вопытных і спрактыкаваных узялі, грошай не пашкадавалі, бо без такіх людзей чужынцы ў гэтых мясцінах, як кацяняты сляпыя. Паселі ў свае судны і паплылі. Дзе вяслуюць, высільваюцца так, што, здаецца, у грабцоў ажно жылы не вытрымаюць, а дзе, калі спадарожны вецер, на парусах плывуць. Тады ўжо людзям адпачынак. Выспацца можна, паляжаць спакойна, сілы набрацца, якую неўзабаве зноў патраціць прыйдзецца. Толькі стырнавыя пільна сочаць за ўсім ды праваднікі на пярэднім судне ўглядаюцца ў берагі, каб па іх арыентавацца і ведаць, якая глыбіня ды ці няма дзе падводных камянёў, заломаў або пясчаных кос, якія таксама былі небяспечнымі, калі на іх нагружанае судна з усяго ходу напіралася.

Ужо, можа, з тыдзень плылі судны па Нёмане. Усё пакуль што было ціха і спакойна. Не было з-за чаго хвалявацца, стырнавыя спрактыкаваныя, праваднікі таксама. Толькі глядзі не спі, і ў тэрмін будзеш у пункце прызначэння.

Але аднаго вечара стары праваднік прыйшоў да гаспадара. Той якраз лашчыўся з чарнавокай і гібкай, нібы маладзенькая рабінка, жанчынай. Купец быў на

добрым падпітку і, кранаючы голыя, высокія грудзі прыгажуні, нешта мурлыкаў на сваёй мове. Пачуўшы стук дзвярэй, незадаволена адкрыў вочы і ўтаропіўся ў правадніка:

— Чаго табе? Чаго ты сюды прыпёрся? Ніхто цябе не клікаў! Пайшоў прэч, а то загадаю ахове адлупцаваць ды выкінуць за борт!

Але стары нерашуча перамінаўся з нагі на нагу і не ішоў.

— Ты што, не зразумеў?

Увайшоўшы адмоўна хітнуў галавою.

— Зараз. Эй, дзе мой перакладчык! — узвыў гаспадар, і ўмомант застукалі таропкія крокі.

— Спытай, што ён хоча і чаго стаіць тут, нібы абсмалены казёл?

— Слухай, стары, чаго табе трэба? — ціха пачаў перакладчык.

Праваднік глянуў у бок таго, хто гаварыў, і адказаў:

— Я па справе прыйшоў. Перадай свайму гаспадару, што я на гэтай рацэ вырас і вельмі добра ведаю яе нораў. Сёння ноччу, магчыма, заўтра раніцай будзе вялікая бура і навальніца. Судны трэба тэрмінова ставіць бліжэй да берага і мацаваць за што-небудзь трывалае: за дрэвы, камяні, слупы... Калі такое не зрабіць, то можна жорстка потым папла-ціцца.

Перакладчык устрывожана ўскінуў вочы на купца. Той загарлаў так, што ажно ўздрыгнула напаўголая жанчына, якая па-ранейшаму не пакідала каюты:

— Што глядзіш, баран? Гавары хутчэй, якая там прапанова ці навіна?

Перакладчык загаварыў так хутка, як толькі на гэта здольны чалавек:

— Ён сказаў, што можа здарыцца бяда.

— Якая такая бяда?

Жанчына пачала апранацца, і вочкі яе забегалі, а з твару гандляра збегла задаволеная ўсмешка.

— Кажа, што будзе бура з навальніцай... Яна паразносіць і паразбівае нашы судны, калі іх не прымацаваць да чаго-небудзь трывалага.

— На рацэ? Бура на гэтай, параўнаўча невялікай, рацэ? Ён мяне гэтым палохае? Ды ці ведае ён, што мы сваімі суднамі і не такія рэкі ды моры праплывалі і ніякіх там бур з навальніцамі не баяліся. Калі ён

баіцца за тое, што недзе пасадзіць карабель на мель і не апраўдае тых грошай, якія яму заплацілі, то няхай уцякае прэч. У нас ёсць яшчэ адзін праваднік.

Зноў твар купца зрабіўся насмешлівым і задаволеным, а ягоныя рукі пацягнуліся да высокіх грудзей прыгажуні, схаваных ужо пад нейкай каштоўнай апранахай. Гаспадару падалося, што зараз чалавек, які ўвайшоў, каб папярэдзіць яго аб небяспецы, упадзе на калені і пачне прасіцца не выганяць і не адбіраць заплачаных наперад грошай. Ды так толькі падалося. Стары павярнуўся да перакладчыка і працягнуў таму сваю высахлую далонь, на якой паблісквала колькі залатовак.

Перакладчык здзіўлена глядзеў на праваднiка. Такое ён бачыў упершыню, каб ад грошай добраахвотна адмаўляліся.

Запанавала непрацяглая цішыня, пасля якой купец не змяніў свайго намеру працягваць падарожжа, не прыняў ніякіх мер засцярогі і адмовіўся ад паслуг старога праваднiка. Так і сказаў:

— Ідзі лепей, старэча, дамоў. Сядзі там ды не бярыся болей нікога праводзіць, бо ты толькі людзей з панталыку збіваеш. Паглядзі, якое сонейка, якое сіняе-сіняе неба, а табе нешта прымроілася, ці, можа, нехта з варты моцным віном пачаставаў... Бура, навальніца... Усім настрой разладзіў. І мне адпачыць не даў з гэтай вось прыгажуняй! — з такімі словамі купец ляпнуў жанчыну па сцегняку. Тая весела захіхікала ў адказ.

— Што ж, гаспадар, мая справа была папярэдзіць, а твая воля, як дзейнічаць. Глядзі, каб потым шкадаваць не давялося...

— Ты што, мне пагражаеш?

— Дзе там, я толькі спрабаваў прадухіліць бяду.

Стары павярнуўся і моўчкі зачыніў за сабою рыплівыя дзверцы. Калі садзіўся ў човен і збіраўся ад'язджаць да берага, то да яго падскочыў перакладчык, той самы, які быў у каюце.

— Слухай, дзеду, а гэта праўда? Праўда, што навальніца будзе?

— Павінна быць абавязкова, бо я ўжо не адзін дзесятак гадоў караваны ваджу, па Нёмане плаваю. Нораў ягоны і прыкметы на дождж ды навальніцу выдатна ведаю. Праз пару гадзін неба зацягнуць груваcткія

хмары, падзьме моцны вецер, а там і пачнецца самае страшнае...Шкада людзей нявінных, якія загінуць толькі з-за ўпартасці іхняга гаспадара. Ды гэта жыццё... Нехта жыве, а нехта гіне... Некаму весяліццарадавацца, а некаму — плакаць. Бывай, чалавеча... Мне трэба спяшацца, каб далей адысці ад гэтай мясціны ды схавацца дзе-небудзь у небяспечным месцы, бо ў пушчы хавацца тады не выпадае. Бура дрэвы валіць стане, нібы тонкія чароціны. Пакуль адбягуся, пакуль прыхаваюся, то і звечарэе...

— Так, страшнае ты мне распавёў,— задуменна сказаў перакладчык.— Што ж мне рабіць? Жыць жа хочацца...

— Прабач, чалавеча, але мне трэба плыць.

— Чакай, старэча, і я з табою. Толькі пару хвілін пачакай, я што-небудзь са свайго прычындалля захаплю, бо і далей жа неяк існаваць трэба. Я зараз, азірнуцца не паспееш...

Сапраўды, назад перакладчык выскачыў не болей чым праз пару хвілін са здаравенным мяшком у руках.

— Што гэта ты, пасцель з падушкай пуховай прыхапіў у дарогу, ці што? — зморшчыў вусны ва ўсмешцы праваднік.

— Ат, якое там, давай лепей вяслуй, пакуль нас ніхто не заўважыў ды крык не ўсчаў, бо ўмомант галовы з плеч скоцяцца. Там ужо нагамонімся.

Лёгкі човен стралой паляцеў да берага, бо кіравала ім рука чалавека, які ўсё сваё жыццё правёў на рацэ. Адно толькі — азірнуліся назад, на караван, і выскачылі на бераг. Стары выцягнуў човен, акуратна прыхаваў яго ў кустоўі і прамовіў:

— Навошта патрэбную рэч выкідваць? Можа, некаму якраз у часіну прыйдзецца... Тут яго хвалі не падхопяць і сонца не рассушыць.

Праваднік упэўнена, нягледзячы на ўзрост, крочыў наперадзе, а перакладчык імкнуўся не адставаць, бо яму замінаў яшчэ і мех, які ён раз-пораз перакідваўпапраўляў на плячах. Ішлі ўжо з добрую гадзіну, калі незнаёмы не вытрымаў і папрасіўся:

— Слухай, дзеду, давай адпачнём. Не магу болей ісці, ногі не слухаюцца. Давай... Усё роўна ж паспеем. Час яшчэ ёсць.

— Адкуль ты ведаеш, што ёсць? Навальніца можа пачацца ў любую хвіліну. Сам жа адчуваеш, што

вільготным паветрам пацягнула. Не паспеем азірнуцца, як ліне, а потым і вецер-бура ўсходзіцца. Малады ж, здаецца, а такі нетрывалы, пару вёрстаў прайшлі, а табе ўжо адпачыць давай. Выкінь ты гэты мех, жыццё ж даражэй.

— Не, не выкіну, не выкіну,— заспяшаўся з адказам перакладчык.— Ён нецяжкі... нецяжкі... я сам па сабе стаміўся... Ноч не спаў, разумееш? Ноч цэлую...

— Калі ўжо цэлую ноч не спаў, то пасядзі ці паляжы крыху,— прамовіў стары, а сам застаўся на нагах.

— А ты чаго не садзішся? Чаго не адпачываеш?

— Ды стомы пакуль што не адчуваю. Вось толькі трывога ўслед за намі крок за крокам прыспешвае.

— Якая трывога?

— Што там з людзьмі станецца, якія ў караване засталіся? Іх жа столькі многа, і ў асноўным усе маладыя, здаровыя, толькі жыць пачалі...

— Вось дзівак чалавек! Яго ледзьве за борт сілай не выкінулі ды вяслом па галаве не трэснулі, каб не ўсплыў, а ён за іх жа перажывае. Ды яны пра цябе і хвіліны не думалі б. Няма чаго глупствам галаву забіваць. Жывы — і добра, чаго яшчэ гадаць...

— Не магу я так, я ж ведаў, што здарыцца, але не змог пераканаць самаўпэўненага гандляра. Трэба было быць больш настойлівым.

— Ага, яшчэ і бізуноў у спіну наджыгалі б! Вось радасць была б! Настаяў!

— Памаўчы, чалавеча, ды сілы набірайся, бо зараз далей рушым, няма калі нам з табою расседжвацца. Далей ад ракі трэба ісці, каб бура не застала...

— Яшчэ хвілін колькі,— прамармытаў праваднік. Відаць, занепакоенасць старога захапіла і яго.

Пасядзелі яны, можа, з паўгадзіны і рушылі далей. Ішлі да таго часу, пакуль не пачаўся густы, нізкарослы лес. Тут стары спыніўся і сказаў ціха:

— Вось у гэтым месцы і будзем ладзіць якое-небудзь жыллё-прытулак, каб дождж і буру перачакаць. Добра, калі яна толькі пройдзе і заціхне, а калі ўсходзіцца на суткі-другія, тады што рабіць будзем. Мокрыя, галодныя, халодныя... Давай працаваць.

Спрытна і ўвішна ўзяліся яны за працу. Пад здаравенным старым вываратнем выкапалі ямку, бо знаходзіўся корч на высокім месцы, і нацягалі жэрдак, голля, кары. У дзеда была з сабой невялічкая ся-

керка. Зараз яна аказалася дарэчы. Усё рабілі моўчкі, толькі зрэдку праваднік падказваў:

— Тут больш трывала мацуй, каб потым не з'ехала, а то прамокнем. Тут насып пяску вышэй, каб вада не працякала да нас. Кару кладзі пад ухілам. На ніз. Вада па ёй будзе збягаць і ўсярэдзіну не трапіць ні кроплі. Бачыш, як хутка стала змяркацца. Значыцца, хмары насоўваюцца. Нам жа яшчэ трэба вогнішча невялічкае зацепліць, каб у нашай будыніне пастаянна гарэла. Мала што можа здарыцца... Дроў сухіх нацягаць усярэдзіну, бо потым не знойдзем.

Толькі ўсё зрабілі, толькі пацягнула дымком ад вогнішча і абодва падарожныя стомлена апусціліся ля яго на загадзя разасланыя голькі і лісце, як пачуўся першы ўдар грому. Ён быў глухі і далёкі, але нейкі задужа трывожны, бо абодва ажно ўздрыгнулі і глянулі адзін на аднаго. Перакладчык перажагнаўся, а стары не, толькі глянуў на чорнае неба праз невялічкую адтуліну і прашаптаў:

— Зараз пачнецца. Эх, хоць бы тым усё даравана было...

Бура з грымотамі была такая, што здавалася, зараз павырывае з каранямі і пазаносіць немаведама куды не толькі высокія дрэвы, але нават і нізкарослае кустоўе, сярод якога знаходзілася прыстанішча людзей. Праўда, усярэдзіне было ціха, спакойна, ціха патрэсквала вогнішча. Потым пачаўся дождж. Ліло нібы з вядра. Непрыкметна абодва падарожныя задрамалі. Ачнуліся ад таго, што ім падалося, быццам бы нехта крычаў. Сапраўды, хвілін праз колькі крык паўтарыўся. Нават не адзін голас данёсся, а многа.

— Што гэта? — спалохана ўтаропіўся на старога перакладчык.

— На рацэ крычаць,— адказаў дзед, і слязіна марудна пацякла па яго барадатым твары.

— Дык яна ж далёка. Мы ж гэтулькі часу ішлі.

— Вецер... Бура нясе...

Двое сутак выў-стагнаў вецер, ліў дождж, а калі ўсё прыціхла, то ласкава засвяціла, як і раней, сонейка, весела зашчабяталі птушкі. Здавалася, што нічога і не адбылося. Цяжка было паверыць, каб не вялізныя гурбы дрэваў ды вываратняў, наваленых як папала. Цяпер ужо дзед з перакладчыкам назад, да ракі, прабіраліся не пару гадзін, а амаль дзень. Тое, што яны ўбачылі, напалохала абодвух. На берагах

валяліся разбітыя, раструшчаныя, нібы іх нехта гіганцкімі сякерамі пасек, судны, мноства тавараў. І самае страшнае — паўсюдна былі трупы людзей. Стары з перакладчыкам моўчкі ішлі ўздоўж берага.

— Бачыш? Вось яно і ціхае рэчышча... Вось вам і на морах паплавалі, і буры-навальніцы бачылі... Не паслухаліся мяне...

Крокаў праз колькі наткнуліся на цела прыгожай жанчыны, якую ўсюды вазіў з сабою гаспадар. Яна ляжала голая на жоўтым мокрым пяску, і толькі даўгія чорныя валасы прыкрывалі зрэдку яе цела. Пастаялі падарожныя крыху і рушылі далей.

— А што зараз рабіць будзем? — не вытрымаў перакладчык.

— Слупы здаравенныя ўкопваць, каб іншыя памяталі, што можа іх напаткаць, ды падчас буры прывязвалі да слупоў судны...

Можа, тыдзень працавалі яны. Спачатку некалькі слупоў дубовых укапалі, потым мёртвых пахавалі, каб птушкі ды звяры над імі не глуміліся.

З цягам часу людзі пачалі гаварыць, калі плылі па Нёмане: «Вось даплывём да стаўбцоў, там прывяжамся і адпачнём».

Так і пайшло — Стаўбцы ды Стаўбцы...

## ГУДЗЯЛІ

На тым самым месцы, дзе цяпер стаіць наша вёска, некалі, у надзвычай даўнія часы, нічога не было. Толькі густы-густы лес, верхавіны якога амаль упіраліся ў неба. Вятры ды навальніцы гаспадарылі ў гэтых абшарах. Можна было тыдзень цэлы ісці і не тое што паселішча, а жывога чалавека не спаткаць. Вось якое месца бязлюднае было.

Потым, праз стагоддзяў колькі, адзін князь ехаў з дружынай па лясной дарозе. Ці то паход быў надзвычай удалы, ці то сечу буйную выйгралі ягоныя паплечнікі, але настрой ва ўсіх быў бадзёры. То там, то сям у калоне зацягвалі песні, услаўлялі Бога вайны, які не адвярнуўся ад ваяроў у такі цяжкі час. Прытаміліся коні, здарожыліся людзі, і, пабачыўшы такое, князь загадаў:

— Сконьвайцеся, хлопцы! Адпачнём крыху, бо ўсё роўна за адзін дзень дамоў не паспеем дабрацца!

Дружыннікаў не трэба было асабліва ўпрошваць.

Дружна саскочылі яны з коней, а праз некаторы час уздоўж дарогі запалалі вогнішчы, забулькала ў вялікіх катлах духмянае варыва. Воі, якія прызвычаіліся штодзень сустракацца са смерцю вочы ў вочы, умелі імгненна адключацца ад адных абставін і пераходзіць да іншых. Гэта значыцца, маглі тут жа заснуць ці пачаць спяваць песні. Многае было пазначана на іхніх суровых старых і маладых тварах. Той, хто ні разу не быў у паходах, ніколі гэтага не зведае.

Князь ляжаў на баку ля невялічкага вогнішча і задуменна глядзеў на тое, як агонь старанна ліжа сухія дровы. Насупраць яго сядзеў магутнага целаскладу чалавек, твар якога перасякаў стары, няправільна заросшы шрам. Ён, здавалася, драмаў, бо павекі былі прыкрыты. Але так толькі здавалася. Стары ваявода ніколі не засынаў у паходах раней дружыннікаў. Не мела асаблівай розніцы, у час баявых вылазак гэта адбывалася ці падчас вяртання дамоў, ужо на сваёй тэрыторыі, дзе не пагражалі ворагі.

— Што маўчыш, ваявода? — падаў голас князь.— Ці хвалюешся за што?

Вой памаўчаў хвіліну і павольна, не спяшаючыся, нібы баючыся сказаць нешта не тое, пачаў:

— Няма ў мяне, княжа, падстаў для хвалявання. Усё добра ідзе. Сам жа бачыш. Паход удала завяршыўся, страт амаль не панеслі, трафеяў вунь колькі набралі — коні ледзьве цюкі вязуць. Але на душы нешта не тое. Раней такога не здаралася, а тут...

— Можа, захварэў, ваявода? Можа, занямог, то трэба адляжацца...

— Ды не, валадар, не занямог я. Нешта душа мая плача. Вось усю дарогу, сюды дабіраючыся, згадваў я сваіх сыноў-нябожчыкаў...

— Добрыя былі воі, добрыя,— прамовіў князь, адразу, відаць, таксама прыгадаўшы тых, пра каго вялася гаворка.— Шкада, што яны так рана загінулі і пайшлі да нашых продкаў. А такія былі хлопцы, адзін дзесятка добрага каштаваў...

— Дык вось, валадар, еду я, еду, а ў вачах іхнія твары стаяць. Сяброў сваіх прыгадаў, якіх таксама ўжо няма, родных і блізкіх, і нешта так за сэрца хапіла, што ажно зайшлося яно. Здаецца, просяць яны, каб я далей не ехаў, каб з іхнімі душамі застаўся. Нябожчыца-жонка — тая на каленцы стала. Вось таму і сумую, княжа.

— Сапраўды, нешта тут не тое, каб проста так сумаваць. Нейкае дзіўнае прадчуванне. У мяне такога ніколі не было. Нічым і дапамагчы не магу...

— Можаш, княжа. Адпусці мяне з ратнай службы, я тут застануся. Манастыр невялічкі пабудую і буду ў ім маліцца аб здароўі жывых і светлай памяці загінуўшых ды памёршых. Верна я табе, валадар, служыў, ніколі ў цяжкі момант не пакінуў і не адвярнуўся, а зараз прашу толькі аб адным... Нічога мне болей не трэба, але адчуваю, што з такім настроем службу вайсковую правіць болей не змагу. Тут застануся...

— Я вельмі паважаю цябе, ваявода. Вельмі даражу тваёй парадай і падтрымкай. Ты ж мяне выхаваў, у сядло пасадзіў, верна служыў, і адмовіць табе не магу. Болей таго, дам нават пару чалавек, каб дапамаглі ўзвесці будыніны. Заставайся, а я, калі надарыцца такая магчымасць, пад'еду праведаю, як ды што... Сапраўды, пра такое нельга забывацца. Святая гэта справа.

— Дзякую табе, княжа,— у пояс пакланіўся магутны ваявода. Дакладней, ужо былы ваявода, які з заўтрашняга дня адыходзіў ад усіх дзяржаўных і вайсковых спраў.

Раніцай дружына рушыла далей, а на месцы адпачынку засталіся каля дзесятка чалавек. У пераважнай большасці людзі сталага ўзросту, якім таксама, мабыць, ужо надакучыла вайсковая служба, пастаянныя маршы і паходы. Яны вырашылі распачынаць са сваім былым ваяводаю новае, таямнічае пакуль што для іх жыццё. Воі час ад часу азіраліся назад, на баявых паплечнікаў, якія стаялі і глядзелі ім услед, але неўзабаве доўгі хвост калоны схаваўся за высокімі дрэвамі, і ўсе, хто застаўся, схамянуліся.

— Адпачываць-то яно, канешне, добра, але час і за працу брацца, каб да зімы паспець усё зрабіць, бо іначай можам у маразы тут, у глухім лесе, загінуць. Дапамогі чакаць няма адкуль. Спадзявацца трэба толькі на ўласныя сілы. Пайшлі завіхацца. Расплануем, што да чаго, і пачнём рыхтаваць лес для будынкаў.

Былыя воі з вялікай ахвотай накінуліся на працу, па якой даўно ўжо засумавалі, якая часам нават снілася ім начамі, мроілася падчас адпачынкаў. Неўзабаве і першы свой храм узвялі — цэркаўку. Пры-

мітыўная яна была. Спешна зробленая, аформленая без вялікага густу, затое — з любоўю будаўнікоў. Потым і вялікую хаціну агаралі, дзе не толькі для дзесятка чалавек месца хапіла б, але і для добрай сотні. З размахам будавалі, спадзяваліся, што пазней да іх іншыя прыйдуць, каб таксама служыць Богу.

Да восені таго месца і пазнаць нельга было. Навокал стаялі, адсвечваючы свежымі сценамі, будынкі, дымы да неба цягнуліся, жывёла пасвілася. Было відаць, што людзі тут папрацавалі гэты час не пакладаючы ўласных рук і не надта адпачываючы.

Так у гэтых мясцінах узнік манастыр. У хуткім часе слава пра яго панеслася па ўсім наваколлі, што манахі надта добра жывуць, што пароўну ўсё здабытае і вырашчанае дзеляць, што ніводнаму беднаму чалавеку ў дапамозе не адмовілі, што ніводнага бедалагі жабрака за парог не адпусцілі без кавалка хлеба і мяса ў кайстры. Чуткамі, як вядома, зямля заўсёды поўніцца. А тут яшчэ такая, Божая справа. Людзі не толькі з вуснаў у вусны перадавалі, але і ад сябе яшчэ столькі выдумлялі і прыбаўлялі, што звесткі гэтыя станавіліся падобнымі на легенды.

А ў сапраўднасці манастыр жыў сваім будзённым жыццём. Кожны дзень манахі, шчыра памаліўшыся, разыходзіліся па гаспадарчых справах, а на полудзень збіраліся зноў разам. Да вечара шчыравалі і рана кладліся спаць, каб з раніцы заняцца чым іншым. Кіраваў справамі былы ваявода, якога паплечнікі адразу і абралі старэйшым, спаслаўшыся на ягоны багаты жыццёвы вопыт.

Так і доўжыліся справы дзень у дзень. Непрыкметна ляцеў час. Князь, які пры разлуцы паабяцаў калі-небудзь заехаць у госці, ні разу тут не пабыў, мабыць, дзяржаўныя справы не адпускалі. Манахі спачатку паглядалі на дарогу, але потым супакоіліся і прызвычаіліся да думкі, што валадару зараз не да іх, ёсць нешта значна важнейшае.

Усё добра было б, ды аднаго разу бяда здарылася. Напалі на манастыр чужынцы. Можа, нехта спецыяльна навёў іх, паабяцаўшы багатую здабычу, а можа, выпадкова напароліся, калі прабіраліся ў глыбіню княства. Жорсткі бой пачаўся паміж імі і манахамі. Нічога, што некалькі гадоў прайшло, але былыя воі не забыліся пра тое, кім былі ў маладыя гады. Не аднаго чужынца адправілі на той свет. Але адбіцца не

здолелі, надта многа іх было. Апошнім загінуў стары ваявода, якога ворагі ўзнялі на дзідах — гэтак ён ім уеўся сваім спрактыкаваным вайсковым майстэрствам, не аднаго з нападаючых прыбіў да зямлі магутнымі ўдарамі.

Калі на месца манастыра прыехаў князь з дружынай, то навокал яшчэ дыміліся папялішчы і ляжалі целы забітых. Манахаў было нямнога ў параўнанні з ворагамі, але валадара гэта не ўзрадавала. Затуманіўся ягоны позірк, і ён прамовіў ціха, так, што пачулі толькі бліжэйшыя воі:

— Як жа мы вас не зберaглі? Няма цяпер і нам спакою на гэтай зямлі. Ворагаў мы дагонім, ніхто ад пакарання не збяжыць, але ж вас не вернем да жыцця. Эх, шкада...

Загадаў пахаваць забітых манахаў, а чужынцаў пакінуць, каб іхнія целы звяры лясныя парвалі. А яшчэ сказаў укапаць вялікі дубовы слуп на гэтым страшным месцы, каб ён нагадваў людзям пра тое, што тут здарылася.

Даўно ўсё было, але да гэтага часу, калі кінуць у тым месцы камень на зямлю, то чуваць, як звіняць-гудуць манастырскія званы. Недзе з-пад зямлі гук даносіцца...

Вось адкуль пайшлі Гудзялі, нашы Гудзялі. Ад слова «гудуць».

## ГУМЕНАЎШЧЫНА

Жыў тут некалі, непадалёку ад першапачатковага паселішча, заможны пан. Прозвішча ягонае было Ігумен. З яго ўсё і пачалося ў нашай гісторыі.

Калі мы з вамі кажам «пан», то ў галаве адразу паўстае вобраз таўшчэразнага і злоснага чалавека, часам з бізуном у руцэ. Тут жа якраз наадварот. Ігумен быў не тоўсты, а высокі і жылісты. Надзіва здаровы чалавек. Характарам вылучаўся нават сярод сялян, такім добразычлівым і памяркоўным быў. Сядзе побач з вяскоўцамі і пачынае з імі пра надвор'е ды гаспадарчыя справы меркаваць. Спачатку сяляне адносіліся да ягоных слоў з недаверам, але потым пераканаліся, што памешчык вельмі добра засвоіў народны каляндар і ўмее па-майстэрску прыстасаваць яго да тутэйшай мясцовасці.

Усходзіцца калі-нікалі спрэчка, ці сеяць ужо зба-

жыну. Адны гаворацы, што час, а іншыя сцяною пруць — нельга, дый годзе! Ледзьве ўжо за чубы не бяруцца, пакуль хто-небудзь з найбольш кемлівых не скажа:

— Эй вы, галовы лахматыя! Давайце лепей да пана Ігумена каго з маладзейшых пашлём. Няхай ён сюды прыйдзе, бо мы тыдзень спрачацца будзем — нічога добрага не зробім! Болей таго, яшчэ часіна прыйдзе, то і за калы возьмемся ды пачнём імі сваю справу даказваць! Пашлём па Ігумена!

— Сапраўды, чаго гэта мы ўсхадзіліся?! Даўно трэба было так зрабіць, а то спрачаліся амаль да полудня і дарма колькі часу змарнавалі. Шкада, што адразу не здагадаліся. А ты чаму не падказаў раней? — накідваліся на таго, хто першым прапанаваў слушнае выйсце.

— Ды я, калі шчыра, то і сам толькі што да гэтага дапёр,— пачынаў апраўдвацца той, чым выклікаў лагодныя ўсмешкі на тварах вяскоўцаў.

Неўзабаве прыходзіў пан Ігумен. Яго, як ганаровага госця, саджалі на што-небудзь і пачыналі з ім спакойна, мірна размаўляць, дапытваючыся, хто ж казаў праўду, а хто памыляўся. Памешчык памяркоўна разважаў і рабіў так, каб вінаватых сярод земляробаў не аказвалася:

— Нічога страшнага не было б у тым, калі б вы сёння пачалі сеяць збажыну. Поле ўжо падсохла, сонейка ласкава прыгравае, вады ў глебе хапае. Так што можна было б і пачынаць...

Першыя з вяскоўцаў, тыя, хто менавіта гэта і прапаноўвалі, глядзелі пераможна на тых, хто зваў сеяць заўтра. Але пан працягваў сваю думку далей:

— Нічога страшнага я не бачу і ў тым, калі б вы распачалі гэтую справу заўтра. Самі падумайце, каб толькі дожджык халодны не паліў ды ўвогуле халады не ўдарылі. Адзін дзень у вас марна не прапаў бы, не такія вы людзі. Нешта б іншае рабілі. Так што асабліва няма з-за чаго спрачацца.

— Вось дзякуй, пане, вось дзякуй. А то ў нас спакойна дамовіцца не надта атрымліваецца... То той злое слова скажа, то іншы кіне, і пачынаецца,— шчыра дзякавалі Ігумену вяскоўцы.

Пасядзяць яшчэ, пагамоняць з памешчыкам пра ўсялякія справы і разыходзяцца сабе па хацінах.

Аднаго разу, было гэта нейкае свята, сабраліся вяскоўцы ля карчмы, дзе звычайна святкавалі, і па-

чалі паміж сабою размаўляць. Потым неяк незаўважна завялася спрэчка, хто самы здаравейшы ў іхняй вёсцы. Вось тут ужо разгарачыліся па-сапраўднаму. Старэйшыя крычаць, ведама ж, за сваіх сыноў ці ўнукаў, а маладзейшыя плячыма крутымі пакручваюць, маўляў, толькі крані ці скажы што супраць, то даведаешся, хто я такі. Дамовіліся спрэчку вырашыць сілай. Спачатку хацелі, каб які цяжкі камень падымалі ды неслі на акрэсленую адлегласць, але гэта не надта спадабалася, і нехта запрапанаваў:

— Няхай барукаюцца! Хто каго да зямлі-асновы прываліць плячыма, той і пераможца. Потым пераможцы паміж сабою сыдуцца, і гэткім чынам да апошняй па́ры...

Ніхто нічога супраць не мовіў. Потым нехта сказаў:

— Пана Ігумена трэба паклікаць, то ён і правілы сачыць стане, каб усё па-чэснаму было. Яму мы верым.

Прыйшоў памешчык, сеў, як звычайна, сярод сялян і мовіў:

— То хіба давайце, няхай першыя пары сыходзяцца. Глядзець будзем. А пераможцаў потым паасобку выпусцім па адной пары. Давайце...

На невялічкай пляцоўцы, густа парослай травой, схапілася адразу, можа, пар трыццаць. Сярод іх былі і хлапцы-здаравякі, і маладыя мужчыны. Неўзабаве вызначыліся пераможцы. Потым сталі выпрабоўваць па асобных парах. Вось дзе пачалася сапраўдная барацьба! Сапернікі былі дастойныя адзін аднаго, барукаліся па-сапраўднаму, не шкадавалі сілы. Толькі расчырванелыя твары ды потныя сарочкі гаварылі пра тое, якія вялікія намаганні прыкладвалі тыя, за каго перажывалі вяскоўцы. Крыкі, гамонка, лаянка стаялі такія, што здавалася, тут ідзе не мірная барацьба, а крывавая сеча. Стараліся ўсе, але найболей гледачы.

Нарэшце на пляцоўцы засталіся толькі двое. Гэта былі прыроджаныя асілкі: малады, здаравенны каваль, які плячыма мог засланіць любыя дзверы, і сын млынара, які раней, спрачаючыся, мог падняць і пранесці дзесятак крокаў восем мяхоў мукі.

Ігумен устаў і зычным голасам крыкнуў, звяртаючыся да ўсіх:

— Людзі! Разыдзіцеся шырэй!

Натоўп паволі пасунуўся назад.

— Цяпер усе сачыце ўважліва, каб па правілах было, без недазволеных прыёмаў!

Асілкі сышліся. Барукаліся яны надзвычай доўга. Ніхто не жадаў саступаць, але каваль неяк усё ж прылаўчыўся, падкінуў саперніка крыху ўгару і, пакуль той не ачомаўся, што да чаго, грохнуўся разам з ім долу. Праўда, сам апынуўся зверху. Гледачы весела загалёкалі, вітаючы пераможцу, а сын млынара, аддыхваючыся і сарамліва пачэсваючыся, пайшоў да натоўпу. Каваль выступіў наперад і запытаўся:

— Можа, яшчэ хто жадае пабарукацца? То не саромейцеся, выходзьце. Што, не хочаце?..

І ў гэты момант прагучаў голас Ігумена:

— Слухай, каваль, а давай са мной. Болей таго, калі ты пераможаш, то я вам, мае шаноўныя, прызначу чатыры выхадныя дні на месяц, у якія вы ніякімі справамі гаспадарчымі займацца не будзеце, а адведзяце іх для адпачынку. Вось такія мае ўмовы...

— А калі пан пераможа? — хіхікнуў нехта, бо, мабыць, не надта верыў у свае словы, глянуўшы на магутнага каваля, мо на галаву вышэйшага за памешчыка.

— Тады ўсё па-старому застанецца. Нічога не зменіцца.

Сапернікі схапіліся адразу так моцна, што падалося, нібы іх хто злучыў жалезнымі абручамі. Трашчалі косці, выпіраліся жылы, а яны хадзілі і ніхто не жадаў паддавацца. Ігумен быў значна ніжэйшы і вужэйшы ў плячах, але крыху больш жвавы, і гэта дапамагала яму ўхіляцца ад магутнага каваля. Гледачы маўчалі. Яны ўжо не крычалі, не падбадзёрвалі крыкамі асілкаў, а толькі напружананазіралі. Многія ў душы хацелі, каб перамог каваль, і тады яны атрымалі б жаданае — тры, а то і ўсе чатыры, як паабяцаў пан, дні адпачынку на месяц. Ды нямала было і такіх, хто хваляваўся за памешчыка, бо Ігумен ніколі і нікому не адмаўляў у дапамозе, не адварочваўся ад чужой бяды.

Можа, з паўгадзіны барукаліся пан з кавалём, і ніхто не перамагаў. Здавалася, што іх ужо так і развядуць. І ў той самы момант Ігумен, неяк нечакана прысеўшы, ламануў каваля на сябе, і той, ці то не чакаў такога прыёму, ці то закарчанеў ужо ад напругі, гопнуўся на зямлю, ажно пыл з-пад плячэй закурэў. Цішыня стаяла незвычайная. Потым раздаліся гучныя воклічы, якія радасна віталі пераможцу.

Пан нічога не адказваў, проста адышоўся і сеў,

каб хоць хвіліну перадыхнуць. Некаторыя пачалі супакойваць каваля:

— Што ты... Усё добра... Пан наш спрытнейшым аказаўся. Ты і заўважыць не паспееў, як ён цябе падсек. Добра было б, каб ты перамог. Нам жа пан чатыры дні адпачынку абяцаў...

— Раз абяцаў, то і дам. Нічога, што я перамог. Але і каваль сапраўдны асілак. Такіх людзей нам пабалей, то і род бы наш ніколі не звёўся. Волат. Нічога, што я перамог, але чатыры дні адпачынку на месяц дарую,— пачуўся голас Ігумена.

Вось якім ён быў, пан Ігумен. З-за гэтага ўсяго яго людзі нашы і паважалі, і калі ён памёр, то вёску сваю, у гонар сумленнага чалавека, Ігуменаўшчынай назвалі. Потым Гуменаўшчынай стала. Так і да гэтага дня вядзецца.

Гэтая назва засталася і цяпер, але вяскоўцы, паміж сабою, адрозніваюць дзве Гуменаўшчыны: Вялікую і Малую. А звязана гэта з тым, што меншая ці большая частка жыхароў паселішча да вайны выехала за яе межы.

## ЖЫГАЛКІ

Тут такая гісторыя, што і пасмяяцца можна, але нельга забывацца таксама, у якія віхурныя ды бязлітасныя гады яна адбывалася.

Даўным-даўно гэта было. Ад паселішча яшчэ, можа, і следу на сённяшнім месцы не было. Лясы ды выспы навокал толькі распасціраліся, ляжала няволаная зямелька, не было пакуль што народу, каб яе дасачыць ды ўраджай пасеяць. Часам заходзілі сюды паляўнічыя, па рэках праязджалі рыбакі ды гандляры з розных замежных краін, зрэдчас на імклівых конях налятал і віхураю ворагі. Тады ўсім мясцовым жыхарам было вялікае гора, бо чужынцы нікога не шкадавалі. Павыбіваюць мужчын-вояў, а малых дзяцей ды жанчын да сябе ў рабства пабяруць. Гэтак жа хутка знікалі, як і з'яўляліся, ніхто нават не паспяваў заўважыць куды.

Аднаго разу таксама наляцелі ворагі — татары. І надта ж многа іх было. Можа, дзесяць тысяч, а можа, і дваццаць. Ніхто дакладна не скажа. Тады і пабітых захопнікаў не лічылі, не тое што жывых. А ў мясцовага

князя дружына была намнога меншая, і дапамогі чакаць яму не было асабліва адкуль. Паехалі-паскакалі, праўда, асобныя дружыннікі да суседзяў, каб не адвярнуліся, каб выручылі ды прыслалі свае дружыны, але ж пакуль гэта здарыцца, то пэўны час пройдзе і зручны момант будзе ўпушчаны. Дзе іх потым шукаць, няпрошаных гасцей, дзе сваіх родных даганяць, каб з палону вызваліць.

Вось і задумаў тады князь дзейнічаць не так сілай, як розумам. Ён хоць і малады быў, але не па гадах хітры і кемлівы, такое мог прыдумаць, што астатнія толькі дзівіліся, яго слухаючы ды мудрагелістыя загады выконваючы. Выклікаў да сябе валадар ваяводу і яшчэ колькіх найбольш спрактыкаваных у вайсковых справах дружыннікаў, пасадзіў іх уздоўж дубовага стала ў сваім пакоі дый кажа:

— Ну што, сябры? Як змагацца з чужынцамі будзем?

— На дапамогу трэба клікаць,— бомкнуў глухім басам адзін з прысутных.

— Я ўжо паслаў найбольш спрытных і праворных вояў. Але ўпэўненасці, што ўсе адклікнуцца і дапамогуць, у мяне няма. Калі нават і будуць імчаць чуйдух, то ўсё роўна раней чым за тыдзень не ўправяцца. Нам жа цягнуць няма калі. Нешта іншае трэба, у адваротным выпадку толькі і ўбачым хвасты татарскіх коней ды пачуем плач нашых родных па-за межамі княства.

— Давай, княжа, разаб'ём нашу дружыну на асобныя атрады і з усіх бакоў будзем пастаянна шчапаць ворагаў, не даваць ім спакою. У чужынцаў тады складзецца ўражанне, што нас намнога болей, і яны паўцякаюць. Чаму б не зрабіць так? — запрапанаваў сівавусы дружыннік.

— Дружыну-то разбіць на асобныя атрады не вельмі цяжка, але ці здолеем мы такім манеўрам падмануць ворагаў? А калі яны не пагоняцца за асобным атрадам, а будуць знаходзіцца ўсе ў адным кулаку? Тады не надта і нападзеш.

— Ды мы...— пачаў было той самы дружыннік.

— Я ведаю, што ўсе вы людзі надзвычай мужныя і адважныя, што па-майстэрску валодаеце зброяй, але нельга забывацца і пра тое, што сярод захопнікаў таксама гэткія ж вопытныя вершнікі, таму змагацца з імі будзе надзвычай цяжка. Вось я пра што думаю,

не трэба і астатнім забывацца. Дарагой цаной у гэтых абставінах за памылкі давядзецца плаціць.

— А калі крэпка сесці ў нашай крэпасці? Корму і харчоў, вады ды стрэл у нас надоўга хопіць, а крапасныя сцены надзейныя. Хай паспрабуюць нас тады ўзяць чужынцы. Мы ім пакажам,— сурова звёўшы бровы, сказаў адзін з дружыннікаў.

— Ворагі, чалавеча, толькі такога моманту і чакаюць, каб узяць нас у аблогу. Мы ім гэтым рукі развяжам. Яны і прысады павынішчаюць, яны і паселішчы навокал выпаляць, і людзей безабаронных у палон пабяруць, каб дамоў іх, нібы жывёлу, потым гнаць. Гэта, сябры, адпадае.

— То можа, княжа,— падаў голас стары ваявода,— мы дзе засаду паставім, каб яны на нас напароліся? Пакуль агледзяцца, то мы паспеем вырвацца, і яны ўбачаць толькі наш хвост...

Дружыннікі весела рагатнулі. Князь таксама не стаіў усмешку.

— У гэтым нешта ёсць, ваявода. Сапраўды, усе мы ведаем, што татары ў лясах не ваякі, ім роўнае поле падавай, лугі ды раўніны, каб свой галоўны козыр можна было выкарыстаць — хуткасць, манеўранасць. Скаваць іх — гэта ўжо паўперамогі, не даць магчымасці свабодна рухацца — таксама добра. Я думаў пра гэта. Вельмі слушная прапанова...

— А што ты сам, княжа, скажаш? — запытаўся дружыннік, які да гэтага часу сядзеў моўчкі, толькі ўважліва слухаў тое, што гаварылі іншыя.— Відаць жа, нешта ты задумаў хітрае, а нас спецыяльна выпрабоўваеш, дапытваючыся, хочаш параўнаць планы...

— Так, сябры, я задумаў свой план, і ён вельмі просты, але трэба знайсці выканаўцу.

— Ды кожны з нас, княжа...— варухнуліся магутныя постаці, дастаючы сваімі галовамі столь.

— Не, хлопцы, тут адной адвагі мала. Трэба вельмі кемлівага чалавека знайсці, які б сыграў ролю... здрадніка. Так, я не абмовіўся — здрадніка ці таго, хто пакрыўджаны мною і шукае магутных саюзнікаў, каб мне адпомсціць. Тут не кожны здольны. Самі ведаеце, што ад правільна выкананага загаду будзе залежаць жыццё дзесяткаў тысяч людзей. Адказная справа... Цяпер райце, хто такое можа зрабіць.

Задумаліся вої, сядзяць, моўчкі пераглядваюцца, думаюць, перабіраюць у памяці людзей. Не, няма та-

кога хітрага і кемлівага. Разумныя, ведама ж, ёсць, і многа, але ж трэба яшчэ, каб і ворага па-майстэрску сыграў. Нарэшце не вытрымалі, ускінулі вочы на ваяводу. Той хвіліну памаўчаў і, крэкнуўшы, ціха прамовіў:

— Прабач, княжа, але не можам мы табе параіць такога чалавека. Прабач...

— Што вы тут прабачэння просіце, ці ж для гэтага мы сабраліся? У мяне ёсць на прыкмеце такі чалавек. Павінен падысці...

Паклікалі ў пакоі княжацкага служку. Той уляцеў і схіліўся ў глыбокім паклоне. Суровыя воі пераглянуліся. Перад імі стаяў зусім малады чалавек і смяшліва глядзеў сінімі-сінімі вачыма, нібыта казаў: «Ну, што, хлопцы, без мяне не абышліся?»

— Княжа, а...— пачаў было адзін з вояў, але валадар перабіў яго:

— Не глядзіце, што малады і што пастаянна ўсміхаецца. За яго я магу галаву пакласці — гэты не падвядзе. Сядай, чалавеча, да нас і ўважліва слухай, што да чаго...

Доўга гаманілі тады князь і ягоныя прыбліжаныя асобы, усялякія варыянты перабіралі, а пад раніцу стралой вылецеў з лагера вершнік, і ў хуткім часе нават пошчак капытоў заціх сярод шуму лясных асілкаў-дубоў.

Княжацкая дружына ўжо амаль трое сутак сядзела ў засадзе і чакала, чакала ворагаў, якіх павінен быў прывесці сюды той малады служка. Але нікога не было. Ваявода зрэдку паглядваў на валадара, але той казаў толькі адно слова і адварочваўся:

— Прывядзе...

І сапраўды прывёў, але ажно на пятыя суткі. Воі цярпліва чакалі, пакуль разведчык завядзе татараў у пастку, і тады выскачылі ззаду. Ворагам не было куды дзявацца. Частка з іх загінула ў балоце, частка здалася ў палон. Калі справа была ўжо амаль вырашана, на дружыннікаў вылецеў на кані княжацкі служка. Убачыўшы сваіх, зляцеў з каня, нібы маланка, і заверашчаў, качаючыся па імху:

— Ой! Ой! Дапамажыце!

Воі кінуліся да яго.

— Што? Што? Гавары...

Але той круціўся і верашчаў:

— Ой, жыгалкі! Ой, жыгалкі!

Ніхто нічога не разумеў. Тады хлопец задраў сарочку, і ўсе ўбачылі спіну, густа распаласаваную нагайкамі. Навокал разлёгся такі рогат, што ажно коні папрысядалі. Рагаталі ўсе: параненыя, пакалечаныя, але найболей князь і ваявода. Яны былі рады за тое, што гэты маладзён выканаў загад.

— Кажаш, жыгалкі? — перапытаў князь.

— Ага, княжа, як жыгалкамі па спіне дубасілі. Дык там жа сорамна было крычаць — ворагі ж навокал, а тут свае людзі... То я як падляцеў ды заўважыў нашых, дык і давай выць, думаю, хоць тут выплачуся...

— Устань, хлопча! — загадаў князь.

Хлопец усхапіўся на ногі.

— За тое, што ты ўсё так добра зрабіў, я дару табе гэтую зямлю навокал. За мужнасць тваю і храбрасць.

Схіліліся ў знак павагі да героя сівыя галовы.

Пазней тут вёска ўзнікла, і назвалі яе Жыгалкі, ад таго смешнага слова.

## СВЕРЖАНЬ

Адкуль наша мястэчка пайшло? О, пра гэта многае гавораць, кожны са старых жыхароў, відаць, хоць адно паданне, ды знае. І я таксама чуў і вам зараз раскажу, бо цікавае надта. Ад каго чуў? Ці то ад дзеда, ці то ад каго са старых людзей.

Вось ажаніўся адзін хлопец, узяў сабе дзяўчыну. Яго звалі Фёдарам, а яе — Уллянай. Непадалёку тут недзе жылі, бо тады яшчэ нашага паселішча ўвогуле не было. Пажылі яны непрацяглы час, і захварэла маладзіца, ды гэтак цяжка, што як злягла, дык на ногі ні разу і не ўстала. Стагнала толькі ды прасіла мужа, каб ішоў па сваіх справах, не звяртаў на яе ўвагі. Толькі дзе ж ты пойдзеш, калі блізкі табе чалавек ляжыць і канае? Круціцца Фёдар, на падвор'е амаль і не заглядвае, бацькоў сваіх папрасіў на гэты час гаспадарку пільнаваць, нібы адчуваў, што яшчэ горшая бяда здарыцца. Не ідзе ад жонкі, дый годзе. Тая стогне, кідаецца ў забыцці, а ён побач слязьмі заліваецца. Ачнулася неяк, пачала прасіць:

— Ідзі, Фёдарка, то табе крыху лягчэй на вуліцы стане. Змізарнеў ты зусім, побач са мною седзячы. Схадзі паглядзі, што там на вуліцы робіцца.

— Добра,— адказвае муж,— яшчэ крыху пасяджу

і пайду. Ты спала, як я хадзіў, таму і мне адпачыць трэба. Пасяджу і пайду.

Пагаманілі яны гэтак, ажно бачыць муж — жонка неяк дзіўна ўсміхнулася і заціхла. Прыхіліўся да грудзей, а сэрца ўжо не б'ецца. Заплакаў горка, ды што ты зробіш, калі лёс такі напаткаў жанчыну. Пахаваў яе, як і патрабаваў звычай. А ў іх яшчэ такое заведзена было: калі нехта (муж ці жонка) паміраў раней, то той, хто заставаўся ў жывых, ішоў на могілкі і прасіў людзей, каб побач з магілай нябожчыка пахавалі і яго, бо далей не бачыць ніякай цікавасці да жыцця.

Вось і Фёдар таксама ішоў на могілкі і ўжо назаўсёды развітваўся з роднымі ды знаёмымі. Ажно ля самай агароджы, дзе стаялі пахіленыя збуцвелыя крыжы, сустрэў яго старэнькі дзядулька. Спачатку разышліся, а потым той падарожны павярнуўся і паклікаў:

— Куды ты, чалавеча, гэтакі маркотны сунешся? Можа, здарылася ў цябе нешта, то, чым змагу, дапамагу...

— Эх, дзядулька, гора ў мяне вялікае, але, відаць, ты ўжо нічым не дапаможаш,— адказаў Фёдар.

— А ты ўсё ж скажы, не палохайся. Чаго на свеце не бывае...

— Раз ужо так просіш, то слухай. Памерла ў мяне жонка тыдзень усяго таму. А ў нас такі звычай, што калі нехта памірае, то самага блізкага чалавека побач хаваюць. Вось і я іду, каб традыцыю не парушыць...

— Ну тут што-небудзь я змагу табе выправіць...

— Чым жа тут можна дапамагчы, дзядулька?

— А вось, хлопча, на табе кавалачак хлеба засушанага. Як зойдзеш на могілкі, то адкапай сваю нябожчыцу-жонку і, трымаючы хлеб у руках, прачытай словы малітвы, жонка тады і ажыве. Толькі глядзі, пасля гэтага табе з ёю давядзецца куды-небудзь уцякаць адсюль, бо вас могуць абвінаваціць у чараўніцтве, і тады благі лёс у абодвух будзе. Глядзі ж, не забудзь пра гэта, каб потым дарагой цаной не заплаціць.

— Дзякуй табе, дзядулька. Калі толькі дапаможа, то і не ведаю, чым змагу аддзячыць.

— А нічым, сынку, ідзі ды жывіце сабе ў міры і згодзе, толькі не забывайся пра маю перасцярогу. Адплаты мне ніякай не трэба, досыць я ўжо пажыў на гэтым свеце і ўсялякае пабачыў, але найбольш добрага, таму і сам раблю толькі дабро.

Зайшоў Фёдар на могілкі, старанна азірнуўся, каб нікога побач не аказалася, адкапаў магілу і дастаў кавалачак хлеба. Як толькі прачытаў малітву, то адразу ж і паўстала ягоная Улляна. Першы раз чалавек бачыў такое на вочы, але не здзівіўся, бо яго ж дзядулька загадзей папярэдзіў.

— Хадзем, Улляна, хутчэй адсюль, каб ніхто нас не паспеў заўважыць, інакш смерць будзе чакаць на кожным кроку, людзі не даруюць нам такога чараўніцтва, любым чынам будуць імкнуцца нас са свету звесці. Бяжым, пакуль не позна...

— Ага,— пагадзілася тая.

І яны паджгалі далей ад могілак. А тады ўжо якраз добра прыцямнела, таму цемра ім крыху і дапамагала. Ды, адбегшыся, можа, з якую вярсту, Фёдар спыніўся:

— А ведаеш што, Улляна, ты прыхавайся і пачакай мяне тут. Хочацца дамоў забегчы, глянуць на нашу гаспадарку, на падвор'е апошні раз. Не злодзей жа я, нічога ніколі не ўкраў, не браў чужога, каб па начах хавацца.

— Вой, Фёдарка, я адна надта ж баюся. Ды яшчэ пасля ўсяго гэтага... Мне цяпер з-за кожнага куста будзе мроіцца які ваўкалак ці пярэварацень. Вазьмі і мяне, мы будзем добра хавацца, каб ніхто не заўважыў. Вазьмі, не пакідай...

Слушна гаварыла жонка, таму Фёдар і пагадзіўся адразу:

— Добра, пабяжым удваіх, толькі ж глядзі, азірайся, каб ніхто не згледзеў.

Пакраліся яны па глухіх сцяжынках. Пройдуць крыху, пастаяць, прыслухаюцца — і далей. Думалі, што ўсё спакойна, але дзе там. Адзін з суседзяў па нейкай пільнай патрэбе выйшаў якраз на вуліцу і бачыць — Фёдар з Уллянай дамоў кіруюць. У яго ад такога вочы на лоб палезлі. Як закрычыць з перапуду, як загарлае на чым свет стаіць:

— Ратуйце, людцы! Ратуйце! Ведзьмакі па вуліцы лазяць! Ніколі яшчэ такога не было, каб нябожчыкі па вёсцы хадзілі! Ратуйце!

Выскачылі вяскоўцы хто ў чым і давай дапытвацца:

— Што ты ўсхадзіўся? Чаго верашчыш, нібы недарэзаны? Дзе тое дзіўнае ліха? Паказвай!

— А родненькія,— адказвае селянін,— выйшаў гэ-

та я на вуліцу па сваёй патрэбе. Вочы прадраў, ажно гляджу — Фёдар з Уллянай шпацыруюць...

— Трэба было вочы добра прадраць, каб не памыліцца,— насмешліва прамовіў нехта,— магло табе пасля сну і падацца...

— Ды не, не магло мне падацца, бо яны зусім побач прайшлі, яшчэ ціхенька перашэптваліся. Так што я іх добра пабачыў.

— А што ж тады рабіць?

Людзі маўчалі, але потым нехта нясмела прамовіў:

— Чаго тут доўга стаяць, пайшлі ды праверым. Калі нехта ёсць у яго хаце, то, значыцца, праўда, а калі няма, то і сапраўды падалося.

Такая прапанова спадабалася ўсім. Падаліся да Фёдаравай хаты. Падыходзяць, ажно і сапраўды: у адным акенцы святло гарыць. Прыглядзеліся, а там Фёдар з жонкай дабро сваё ў клункі вяжуць. Вяжуць і ўсё па баках зіркаюць, нібы каго баяцца. Тады вяскоўцы пачалі хапаць, што каму ў рукі трапляла-ся, але і гаспадар з гаспадыняй не драмалі — у момант вока выскачылі праз акно і палупілі з клункамі на спіне да Нёмана. Ляцяць, а за імі пагоня на пяты наступае, вось-вось дагоняць. Яшчэ нейкая сотня крокаў, і нельга будзе ўцячы. Тады Фёдар і крычыць Улляне:

— Хоць бы наш човен ніхто ў іншае месца не перагнаў. Я яго ўчора, калі на могілкі ішоў, спецыяльна сюды прыгнаў, нібы адчуваў... Вось толькі б чужыя рукі не ўхапілі...

— Тады б пашанцавала,— засопшыся, прамовіла жонка.

Нарэшце падляцелі да берага. З кручы як памкнуліся, то толькі ногі ды рукі ў цемры замільгацелі. Ажно бачаць — човен іхні на тым самым месцы стаіць непрывязаны, і вёслы ў ім ляжаць. Яны хуценька гопнуліся і адпіхнуліся ад берага, а ўслед ім паляцела колле ды каменне. Ды што ўжо ты зробіш, калі човен на сярэдзіну Нёмана выбіўся. Пашанцавала яшчэ і ў тым, што, пакуль пагоня чаўны шукала па беразе, бегала, ажно кустоўе трашчала, бура ўсхадзілася, ды такая, што хвалі, нібы хаціны вялізныя, па рацэ перакочваліся.

Вяслуе Фёдар, а Улляна ваду вычэрпвае, бо хвалі заліваюць, здаецца, яшчэ хвіліна і пойдуць на дно.

Ды ў апошні момант човен упарта выслізгваў на паверхню.

— Вяслуй, Фёдарка, бо як кінуцца наўздагон, то не ўцячом, іх жа гэтулькі многа,— моліць жонка.

— Я і так з апошніх сіл стараюся, сама ж бачыш, што навокал робіцца. Рукі ўжо не слухаюцца... Адкуль тая сіла...

Толькі ён так сказаў, як хваля, вялізная, грувасткая, накрыла човен, і ён пайшоў на дно. Фёдар і Улляна спрабавалі ўсё ж неяк дабрацца да берага, усё роўна да якога, да левага ці да правага, толькі б не ўтапіцца.

І тут Улляна закрычала:

— Фёдар! Фёдар! А тут ужо сцвержань! Дно! Станавіся, не бойся! Сцвержань!

Ад таго «сцвержня» наша мястэчка і стала потым называцца Свержань.



# УЗДА

Тут такая справа, што адным словам і не раскажаш пра ўсё. Вядома гэтая гісторыя многім, толькі па-рознаму яе распавядаюць. Як можа чалавек, так і расказвае, дзе прыбавіць, дзе адыме, але ўсё роўна галоўнае данясе да слухачоў. Некалькі паданняў і мне даводзілася чуць. Адно з іх недзе на пачатку веку настаўнік расказваў, ды гэтак цікава, ну як казку якую! Таму і запомнілася на ўсё жыццё. Я яго і ўнукам і праўнукам сваім распавядаю, бо часта цікавяцца. Вось як усё адбывалася.

Недзе ў сівыя стагоддзі, калі нашага паселішча яшчэ ўвогуле не было нават як хутара, не тое што мястэчка, здарылася бяда-ліха, якая навальнічнаю бураю пракацілася па беларускай зямлі. Напалі на княства гэтае татары. Ды столькі многа іх прыйшло, што і пералічыць нельга было. Толькі слупы дымоў і пылу нагадвалі пра тое, што і там, і там ворагі. Не паспеюць местачкоўцы павярнуцца туды-сюды, а вершнікі ў востраканечных шапках ужо нясуцца віхурай і смерць ды гора .навокал сеюць. Плачуць-стогнуць людзі, а што з таго? Хто іх пашкадуе, хто дапаможа

выратавацца з бяды? Дзе знайсці войска, якое б дало адпор няпрошаным гасцям? Глядзяць з надзеяй у бок стольнага горада, чакаюць, што разнясуцца ў хуткім часе грозныя воклічы княжацкіх дружыннікаў і пабягуць раскосыя назад.

Але дарма чакалі, бо надта далёка было княжацкае войска, надта далёка. Зусім у іншым баку паходам хадзіла. Ганяла іншых ворагаў, прымушала іх задумацца над тым, як жыць з суседзямі далей — варагаваць ці заключаць вечны мір, каб потым не вырашаць справу пры дапамозе зброі.

Павёў князь дружыну, а дома пакінуў толькі невялікі атрад, які, ведама ж, не мог выступіць на адкрыты бой з татарамі. Таму вершнікі мясцовыя толькі паляцелі па вёсках ды мястэчках, каб папярэдзіць народ, перадаць ім волю ваяводы: нічога не кідаць ворагам, лепей спаліць ці ў вадзе ўтапіць, але не даць магчымасці пажывіцца непрыяцелю. Яшчэ яны казалі, каб мужчыны і жанчыны, старыя і малыя ўцякалі ў лясы ды ў іншыя якія патаемныя мясціны, куды не знойдуць сцежак-дарожак чужынцы.

Прыскочыць пасланец, спыніць коніка і нават не злезе з яго, а толькі папросіць глухім голасам:

— Людзі добрыя, дайце вадзіцы напіцца, бо ў горле перасохла. Коніку — таксама, толькі халоднай не трэба, бо запáліце...

А калі нап'ецца, то адразу да справы пераходзіць:

— Слухайце ўсе ўважліва, што я вам скажу, тубыльцы. Ворагі напалі на наша княства, і надта іх многа прыйшло. Надта многа. Раней яны таксама часта тут бывалі, але такой сілы яшчэ не прыводзілі. Таму, каб з імі змагацца, нам трэба дачакацца князя з дружынаю. Болей таго скажу вам — трэба яшчэ і сябе зберагчы. А як пакліча князь да свае дружыны, то адразу адклікайцеся, выходзьце хто з сякерай, хто з касою, хто з даўбешкаю, але ўзбройвайцеся, бо бітва будзе бязлітасная. Пераможа ў ёй той, хто лепей збярэцца з сіламі. Таму, людзі, хавайцеся. Дабро сваё не пакідайце, закопвайце, хавайце, а што нельга забраць — паліце. Няхай татары са сваім войскам галадаюць. Да гэтага ім недалёка засталося, нейкі тыдзень-другі. Такую сілу пракарміць вялікія запасы трэба, а яны толькі коней завадных прывялі. Уцякайце, местачкоўцы, беражыцеся ды на кліч нашага князя потым збірайцеся.

Скажа так вершнік і паляціць далей, каб распавесці-папярэдзіць іншых пра блізкую небяспеку.

А ворагі тым часам гулялі па нашым родным краі. Багаты палон сабралі, бо што супраць іх могуць зрабіць амаль безабаронныя людзі? Нічога. Паб'юцца, і калі аднаго татарына заваляць, то за яго галаву сотняй сваіх заплацяць. Здабычы раскосыя назвозілі цэлыя горы, каштоўнасцей — мяхі бяздонныя насыпалі. Коні іхнія ледзьве ўжо рухаліся, так іх вершнікі абвешвалі нарабаваным. Прыцягнуцца ў галоўны лагер, у кош, да самага старшага начальніка, і дакладваюць: «У гэтым краі пабылі, болей няма ўжо чаго рабіць, бо людзей мы сюды прыгналі, жывёлу, якую знайшлі, на месцы парэзалі, а каштоўнасці — вунь яны. Глядзі сам, колькі... Адпачнём гэтую ночку, а раніцай у іншым ужо накірунку паскачам, каб прымножыць нашы багацці...»

Начальнік радуецца, смяецца, а разам з ім і ягоныя воі весяляцца. Чаму б не весяліцца, калі золата само ў рукі плыве, ды не ручаінкай, а суцэльнаю ракою. Калі яшчэ з месяц параскашаваць гэтак, то немаведама, чым дамоў давядзецца дабірацца, дзе знайсці такіх моцных і вынослівых коней, якія б усё гэта здолелі пацягнуць.

Мурза той, ці хан, начальнік іхні, самы галоўны, значыцца, Койданам зваўся. Са знатнага роду быў і не адзін раз ужо гуляў па спрадвечных беларускіх землях, але заўсёды шанцавала яму. Верыў прадказанням сваіх прыбліжаных, якія яму па зорках нагадвалі, што чакае наперадзе, ці можна здзяйсняць чарговы паход, ці пачакаць колькі дзён, каб рушыць потым. Пакліча Койдан да сябе прадказальніка і гаворыць:

— Сёння вечарам каб быў у мяне, будзем чытаць разам па зорках, што нас чакае наперадзе. Глядзі, падрыхтуйся добра, бо мне трэба іхняе спрыянне.

Той ажно дрыжыць са страху, баіцца слова нейкае сказаць супраць.

Перад гэтым паходам таксама так было. Толькі першыя зоркі ўзніклі на небе, а Койдан са сваім прадказальнікам ужо ўглядаліся ў вышыню.

— Вось, глядзіце, ваша вялікасць, зорка гарыць. Вунь тая, самая яркая. Гэта і ёсць ваша. А навокал, бачыце, колькі многа іншых, меншых... Гэта значыцца, што вам будзе спрыяць. Можна смела кіраваць у паход. Збірайце войска, і пайшлі...

— А чаго мне збіраць? Яно ў мяне заўсёды гатова.

Яно заўсёды пад сценамі майго табара, чакае свайго часу. Толькі загадаю — і пойдуць...

І на гэты раз надзвычай добра ўсё складвалася для Койдана. Амаль не было сутычак з мясцовымі дружыннікамі, а тыя, што адбываліся, нельга было назваць бітвамі. Страціць дзесятак-другі чалавек падчас такога паходу — нічога страшнага. Вайна ёсць вайна, і людзі да яе прызвычаіліся. Яны ў сёдлах нараджаліся і ў сёдлах пamіралі. Для татарына было б сорамам памерці не ў сядле, а на нагах.

Аднаго дня хану нешта не вельмі здаровілася. Таму ён паклікаў да сябе любімага прадказальніка, каб запытацца, ад чаго гэта ўсё адбываецца, а можа, надвор'е хутка зменіцца, ці старыя раны ныюць-смыляць? Заадно цікава было даведацца, што там свеціць з вышыні наперад, чаго можна чакаць, седзячы ў гэтых далёкіх ад радзімы месцах? Койдан нецярпліва хадзіў па варсістым дыване і перабіраў рукамі шаўковы шнурок, які звычайна пасылаў людзям, што павінны былі памерці.

— Да вас можна, ваша вялікасць?— пачуўся ціхенькі голас.

— А-а-а... Колькі можна цябе чакаць? Апошні раз чакаю. Глядзі, атрымаеш ад мяне...— і хан выразна глянуў на шнурок.— Што там сёння ў небе? Нешта ў мяне прадчуванне не з лепшых...

— Зараз, зараз, ваша вялікасць,— замітусіўся прадказальнік,— толькі хвілінку аглядзецца дайце, тады адразу ўсё і скажу...

— Тут ужо не спяшайся. Адразу не трэба, добра прыглядвайся, каб нічога не прапусціў.

— Ці ж такое можна, ваша вялікасць.

Запанавала працяглая і напружаная цішыня, якую парушыў нерашучым голасам прадказальнік:

— Мне здаецца, ваша вялікасць, што ўсё складваецца вельмі добра. Вось ваша зорка, яна яшчэ ярчэйшай стала. Навокал многа меншых гарыць. Адчуваеце вы сябе дрэнна, хутчэй за ўсё, ад змены надвор'я. Яно адбудзецца дзесьці прыкладна наступнай ноччу. Таму вашы раны адразу і адчуваюць перамену ў прыродзе.

Але, здавалася, Койдан не слухаў таго, што яму нашэптваў прадказальнік. Ён таксама глядзеў увышыню, задраўшы галаву, потым апусціў яе і запытаўся неяк асабліва з'едліва:

— А чаму гэта зоркі сёння такімі хмарамі груваст-кімі пакрываюцца? Глядзі, як іх вецер нясе... Бачыш ці не? Што гэта азначае? Не скрывай нічога, бо галаву загадаю адсекчы.

— Як можна, ваша светласць? Ці ж я нешта не так сказаў? І не скрываю я нічога. А хмары... Дык хмары зараз вецер раздзьме і следу ад іх не застанецца ніяка-га. Пабачыце. Праўду кажу.

— Ідзі прэч, я хачу пабыць адзін,— загадаў Койдан. Той нячутна выслізнуў.

Хан застаўся адзін. Ён доўга стаяў і думаў пра неш-та сваё, вядомае толькі яму.

А тым часам мясцовы князь ужо атрымаў звесткі пра тое, што татары гаспадараць на землях ягонага княства. Клікнуў-свіснуў ён сваім воям, кінулі яны ўсё, не захацелі браць багатай здабычы, бо спяшаліся хут-чэй вярнуцца і грудзьмі паўстаць на абарону разраба-ванай і безабароннай зараз зямлі. Дружыннікі ледзьве не выпадалі з сёдлаў ад стомы, але не згаджаліся спы-ніцца ні на хвіліну, толькі б хутчэй дабрацца да родных мясцін. Прозвішча таго валадара зараз ніхто, можа, і не ведае, але тое, што гэта быў разумны і храбры ча-лавек, вядома і сёння. Таму ён пастаянна стрымліваў сваіх вояў:

— Хлопцы, паслухайце мяне. Не першы раз мы з вамі разам у бітвах, не першы раз на ворага кіруем, але не забывайцеся, што на гэты раз ён у многа разоў пе-раўзыходзіць нас колькасна, таму безгляднасць можа нам бокам вылезці. Трэба высачыць злыдняў, палонных захапіць, каб даведацца, што яны мяркуюць далей рабіць. А для гэтага нам трэба добра адпачыць, пасляць ганцоў па вёсках ды па мястэчках людзей склікаць, каб да нас, да дружыны, ішлі. Падтрымка вялікая будзе. Таму не рвіце маё сэрца. Людзей я шкадую і перажываю не меней за вас. Зразумейце правільна, воі...

Спахмурнелі дружыннікі, што князь іхні пыл астуд-жае, але ні слова не сказалі, бо ў вайсковай справе безагаворачна яму давяралі. Іначай нельга. Няма ўла-ды і даверу — і перамогі ды поспеху не дачакаешся.

Ужо з тыдзень дабіралася княжацкая дружына. Ішлі так, каб як мага хутчэй дабрацца, але і каб ворагі не даведаліся, якая небяспека іх чакае. Валадар спа-чатку не пасылаў наперад нікога, ды потым, калі пад'ехалі да першых папялішчаў, спыніў свае атрады і загадаў ваяводзе:

— Тут нам трэба, ваявода, патроіць пільнасць. Нельга ўжо прабірацца ў адкрытую.

— Па роднай зямлі, княжа?

— Па роднай зямлі. Калі даведаюцца, што да чаго, то адразу ж заломяць дамоў. Дзе ты іх тады прыпыніш. Болей таго, у іх войска болей. Ні на хвіліну не забывайся пра гэта, браце. У адкрытую не выступіш. Калі зробім так, то страцім сваіх родных і блізкіх, ворагам за так іх аддамо. Татары ці паспеюць іх адправіць наперад са сваім перадавым атрадам, ці перарэжуць да аднаго...

— Яно-то так...

— Таму слухай, ваявода. Трэба паслаць ва ўсе бакі невялікія раз'езды. Людзей падбяры сам. Бяры тых, хто нарадзіўся ў гэтых мясцінах, каб ведалі ўсе патаемныя сцяжынкі, каб прабраліся да самага логава злыдня Койдана. Загадай, каб разведчыкі пастаянна трымалі нас у курсе справы. У адваротным выпадку мы можам нарвацца на ворагаў і тады загубім увесь наш план...

— Зразумеў, княжа, усё зразумеў. Зараз і пашлю самых вопытных і спрактыкаваных, каб і камар носа не падтачыў.

Ваявода выскачыў з часовага будана, а князь застаўся адзін і панура апусціўся на невялікі цурбалак, які нехта з дружыннікаў падкаціў, каб валадару было на чым прысесці. Ён пра нешта думаў. Колькі хвілін глядзеў сабе пад ногі, а потым ускінуў галаву і праз дзіркі ў даху глянуў на неба, якое густа было закудлачана воблакамі. Іх круціла, ірвала, некуды несла. Князю гэтая мітусня нагадвала татарскую навалу, якая ў ягонай свядомасці асацыіравалася з нечым чорным, жахлівым, што нясе смерць і разбурэнне. Знайшоўшы ў гэтай каламутнай мітусні яркую зорку, валадар падумаў: «А гэта ж можа быць мая зорка, якая будзе са мною на працягу ўсяго жыццёвага шляху...» Потым думкі ягоныя перанесліся да родных і блізкіх, пра лёс якіх ён зараз нічога не ведаў. Горка ўздыхнуўшы, князь падумаў пра іншае: «Нічога, знясём гэтую татарскую навалу, як вецер хмары з неба, і зажывём шчасліва, вольна...» Устаў, прайшоў пару крокаў і, сціснуўшы магутныя кулакі, нібы пакляўся сам сабе: «Ну, Койдан-хан, чакай! Не можа быць такога, каб не закавалі мы цябе ў кайданы! Пабачыш...»

У ханскім стане, наадварот, усе былі бадзёрыя і вя-

сёлыя. Ім было чаго радавацца. Воі цэлыя і задаволеныя, коні сытыя, палону набралі гэтулькі, што кожнаму будзе, можа, па цэлай сотні. Койдан аддаў загад праз тыдзень здымацца і адыходзіць у свой край, дзе іх чакаюць родныя.

Сам хан прызначыў на гэты дзень агляд палонніц. Надта ж ён быў ахвочы да дзяўчат і маладых жанчын, не мог прайсці проста так міма прыгожай постаці.

Пацягнуліся да ханскага шатра цэлыя атрады вояў з жанчынамі, то прывязанымі да конскіх хвастоў, то злучанымі суцэльнай вяроўкай. Ішлі яны панурыўшы галовы, бо ўжо зведалі на сабе гвалтоўныя дзеянні захопнікаў і марылі аб адным — хутчэй памерці, пазбавіцца далейшых здзекаў.

Койдан стаяў ля шатра і пасміхваўся. Яшчэ б, гэтулькі прыгажунь ён яшчэ ніколі не бачыў на сваім жыцці. Адна была прыгажэйшая за другую! Вочы хана бегалі, зубы аскаліліся, ён ляпаў сябе па акруглым жываце і цокаў языком, што азначала найвышэйшую ступень задавальнення. Спачатку адбіраў самых прыгожых, іх набралася недзе болей за тысячу. Усіх Койдан пажадаў далучыць да свайго гарэма. Потым яму падалося мала. Крыкнуў злы валадар:

— Вядзіце ўсіх жанчын, бо, калі даведаюся, што нехта прыхаваў палонніцу, галавы таму не знасіць! Калі прыведзяце, то караць не буду!

Прывялі сотняў колькі дзяўчат. Тут былі самыя маладзенькія і прыгожанькія. Койдан ажно ікнуў, калі ўбачыў адну. Яна нагадала яму сонейка, якое гэтак ласкава заўсёды абагравае татарына. Нягледзячы на змізарнеласць, стомленасць, а магчыма, і голад, позірк яе быў агністы. З нянавісцю глядзела яна на сваіх ворагаў.

— Чыя гэта палонніца?— гукнуў Койдан.— Чыя?

Наперад выскачыў і паваліўся на калені стары татарын:

— Мая, ваша вялікасць. Мая.

— Што ты за яе просіш?

— Нічога. Нічога, сонцападобны.

Татарын ведаў, што з хана грошай не папросіш, бо ўмомант можаш пазбавіцца галавы.

Тады Койдан сам сыпануў жменю залатых паверх галавы татарына:

— Вазьмі за яе...

Стары кінуўся збіраць манеты, пры гэтым, мабыць

дзякуючы шчодрую руку хана, прымаўляў:

— Гаварылі, што яна з княжацкага роду, сонцападобны. З княжацкага...

— Гэта праўда?— звярнуўся Койдан да дзяўчыны, але тая маўчала, грэбліва паджаўшы губкі.

— У мой абоз яе, і глядзець як зрэнку вока!

Праз пару дзён шматлікае татарскае войска зрушыла з месца і паволі пасунулася назад, туды, адкуль нейкі месяц таму прыйшло. Воі задаволена пасміхваліся, пацяскалі бізунамі па галовах і спінах палонных ды марылі аб тым, як будуць распавядаць знаёмым пра ўдалы паход у гэтую далёкую краіну.

Ужо амаль цэлы тыдзень цягнуліся шматлікія абозы і тысячныя атрады вершнікаў па выпаленай, вынішчанай зямлі. Палоннікі плакалі, гледзячы на тое, што сталася з роднымі мясцінамі, якія яны, магчыма, не ўбачаць да самай смерці, бо невядома, што чакае іх на чужбіне, дзе ніхто ім не паспачувае, не дапаможа.

Дружына мясцовага князя, узмоцненая паспешліва ўзброенымі сялянамі і гараджанамі, ужо чакала ворагаў, перасекшы ім шлях да адступлення. Пазіцыя была выбрана ўдалая. На беразе шырокай ракі, адзін бок якой быў балоцісты, а другі абрывісты, чакала засада. Па чужынцах збіраліся ўдарыць тады, калі яны пачнуць перапраўляцца з аднаго берага на другі і будуць болей сачыць за тым, як зберагчы сваё багацце, а не назіраць за наваколлем.

Князь паклікаў да сябе ваяводу і ўжо ў які раз запытаўся:

— Усё зрабілі, як дамаўляліся? Ці не заўважаць татары заўчасна каго з дружыннікаў?

— Не.

— А ці не паспяшаюцца ўдарыць па ворагу, убачыўшы родных і блізкіх сярод палонных?

— Не.

— Тады з Богам! Будзем чакаць, і сачыце за маім знакам!

Нарэшце ўсё ж дачакаліся татараў. Тыя сунуліся спакойна, не прадчуваючы небяспекі, так і цераз раку сталі перапраўляцца. Неўзабаве большая палова непрыяцельскага войска была на балоцістым беразе, і ў той самы момант раздаўся магутны крык князя:

— Пайшлі, сыночкі! Пайшлі! З Богам!

Узвіліся коні, разнесліся ліхія свісты ды воклічы, і лавіна вояў накінулася на татараў. Тыя не чакалі та-

кога павароту справы і не паспелі развярнуцца ў баявы парадак. Таму іх білі, як атрымлівалася. На другім беразе таксама калацілі.

Койдан спрабаваў неяк затрымаць сваё войска, супыніць уцякаючых, але тым, хто яшчэ хвіліну назад абагаўляў хана, было не да яго. Спрабавалі выратавацца, ды не тут-то было!

Тады і сам Койдан пусціў свайго надзвычай добрага коніка. За ім увязалася пагоня. Хвілін праз колькі разгарнулася хуткаімгненная сеча паміж аховай і пагоняй, і хан застаўся адзін. Ён скакаў далей, але за ім ляцеў вершнік — гэта быў князь — і гарлаў:

— Стой, Койдан! Давай на двубой! Давай на двубой!

Але відовішча імклівага разгрому ягонага шматтысячнага войска гнала хана далей. Тады князь стрэліў з лука, і страла, пушчаная магутнай рукой, трапіла ў спіну татарскага валадара. Пасунуўся ён у сядле і гопнуўся долу. Князь, калі пад'ехаў да яго, пачуў:

— Эх, узда ты мая, узда... Узда залачоная...

Адтуль і пайшла назва Узда.

Паводле другой легенды, усё было вось як.

Той князь, які даганяў Койдана, так захапіўся пагоняй, што не заўважыў, як згубіў залатую ўзду. Паслаў потым свайго слугу, каб той яе адшукаў. Дружыннік доўга ездзіў па полі бою, па той дарозе, кудой уцякаў хан, і павярнуў назад. Насустрач яму ішоў селянін, запытаўся ў воя:

— Што ты, чалавеча, шукаеш?

— Ды шукаю ўзду,— прагучаў адказ.

Так і сталася. Узда ды Узда. Да гэтага часу і засталася назва.

## КАМЕНКА

Раней усяму жывому пакланяліся, ды ці толькі жывому? Распавядаюць, што абагаўлялі дрэвы і азёры, крыніцы і рэкі, і нават... камяні. Таму ў нашай вёскі і назва такая дзіўная. Вось што пра гэта ў легендзе гаворыцца.

Аднаго разу з'явіўся на зямлі, у гэтым самым месцы, дзе зараз вёска стаіць, вялізны-вялізны камень. Такі вялікі, што трэба было пашукаць, каб дзе гэткі ж знайс-

ці, а можа, і шукаць не трэба было, бо ўсё роўна не знайшоў бы. Ды не ў гэтым справа. Пазней аказалася, што камень зваліў аднекуль сабе нячысцік, чорт, значыцца. Прысунуў для таго, каб у ім ці пад ім зладзіць сабе жытло. Ведама ж, цяжка такое зрабіць, але нельга забывацца і пра тое, што нячысцік тады валодаў магутнай сілай, пасля самога Бога быў другім. Што другім быў — гэта мы зараз ведаем, а чорт жа не ведаў і лічыў заўсёды сябе толькі першым.

Вам, мабыць, не раз і не два даводзілі, што нячысцік і Усявышні толькі на самым першым этапе стварэння Сусвету былі ў больш-менш нармальных адносінах, потым у іх хаўрус разладзіўся і яны сталі варагаваць. Чаго так здарылася? Кажуць, нешта Бог надта прасіў чорта тэрмінова зрабіць, а чорт жа ён чорт і ёсць. Пакуль туды, пакуль сюды, пакуль са знаёмымі нячысцікамі іхнія справы зладзіў, то і запозніўся, а раз запозніўся, то не выканаў просьбу Божую. Вось за гэта на яго Усявышні і зазлаваў тады. Стаў ушчуваць:

— Як жа табе не сорамна! Як мог такое зрабіць? Я ж з-за цябе такую падзею сарваў? Хто мне цяпер верыць будзе? На мяне і людзі, і жывёлы, уся жывая прырода спадзяюцца. А ты... Што ты зрабіў?..

Можа, Бог і не завёўся б, калі б чорт крыху слухаў ці хоць зрабіў выгляд, што яму сапраўды сорамна і ён перажывае разам з Усявышнім. Але дзе там! Стаіць нячысцік і ў адказ то язык высалапіць ды невядома каму пакажа, то хвастом сваім гідкім усялякія выкрунтасы вырабляе, а потым не стрымаўся і кажа:

— Падумаеш, нешта не паспеў зрабіць... То што мне, парвацца трэба было?

— Ды не трэба было табе рвацца, толькі б крыху прыспешыў і паспеў бы ў самы раз, а то з нячысцікамі стаяў ды лясы тачыў...

— Дык што, я павінен быў сваіх родных ды блізкіх абыходзіць, не распавесці ім, як мае справы ідуць, не распытаць пра іхнія?..

— Я ж такога не гавару, але трэба было ўсё зрабіць значна хутчэй.

— Ага, так я табе і пабег. Так я табе і паджгаў. Было б з-за чаго, з-за дурніцы нейкай. Яму ў галаву прыйдзе, а ты ногі тамі...

— Нічога тваім крывым лапам не зрабілася б, каб і падбег,— ледзьве стрымліваючыся, прамовіў Бог.

— Вось як ты загаманіў?— выпаліў нячысцік.— А ты паглядзі на сябе, чорт ты лысы!

— Гэта я лысы?

— А то не... Адны вушы толькі і тырчаць на тваёй пляшывай галаве. З сябе разумнага ладзіш, а мяне за дурня пастаянна выстаўляеш.

— Ты гэта з кім так размаўляеш?— узарваўся Усявышні.— Я табе за гэта ведаеш што?!

— Ну што?— вылупіўся чорт і смяшліва паставіў вушы тырчма.

— Ды я табе... Ды я табе... Хвост твой абсмалю,— закрычаў Бог,— не дарую такой абразы! Ніколі не дарую! Да самага скону памятаць буду!

— Вой-вой-вой,— падражніўся нячысцік і заскакаў на адной лапе.— Што ўжо ты мне можаш зрабіць? Можа на двубой выклічаш? Ці прымусіш па-ранейшаму на сябе аднаго працаваць. То адразу кажу: такога болей не будзе. Ніколі не будзе. Во...— і чорт, павярнуўшыся задам, пырнуў амаль што пад самы нос Усявышняга свой добра ўкормлены азадак.

Такой абразы любы чалавек не стрымаў бы, не тое што сам зямны і нябесны валадар. Як ухапіў ён ладны цурбалак, як замахнуўся ім і, пакуль нячысцік, прыжмурыўшы вочы, выскаляўся, як улупіў яму прама паміж рагоў, то таго нібы падкасіла адразу. Так і гопнуўся на зямлю-матку. Ляжыць, ледзьве дыхае, але не здаецца. Вочы крыху прыадплюшчыў і Богу язык паказвае. Тады зноў не стрываўся Усявышні. Ухапіў чорта за доўгі і слізкі хвост, наматаў яго на руку і пачаў раскручваць свайго зневажальніка над галавою. Так прыкладна, як гэта мужчыны цэпам робяць. Круціў, круціў, а потым як пусціў, дык нячысцік, можа, вёрст з дзесятак са свістам і піскам ляцеў, а потым у гнілое ды непралазнае балота хвастануўся. Ледзьве выцягся адтуль і, стоячы на краю багны, пакляўся:

— Ну, мой ты вораг цяпер да самага што ні на ёсць скону. Так і ведай, ніколі і нічога за такую абразу і здзекі не дарую. Хай ты мне пагражаў, але і я табе нагадаю. Пабачыш яшчэ. Кожны дзень будзеш мае весткі атрымліваць.

Так яны з таго самага дня і заварагавалі. Цяпер у іх такая завядзёнка стала: прачнецца Усявышні і адразу ж цікуе, дзе гэта чорт ці ягоныя родныя лазяць? Як толькі ўбачыць, то як лупяне маланкай — ажно пыл ды агонь на тым месцы пойдуць і смаленым за-

смярдзіць. Бог зарагоча, а чорт, паціраючы абпаленыя ды пабітыя бакі, уцякае-джгае ў сваё адвечнае балота. Калі чорт прачынаўся, то перш-наперш станавіўся насупраць сонейка і пляваў у той бок, бо ведаў, што там недзе павінен знаходзіцца ягоны вораг. Так яны адзін аднаго і злавалі ды падпільноўвалі, каб паболей насаліць.

Бачыць потым нячысцік, што яму з балота амаль не даводзіцца вылазіць, стаў думаць, якое жытло іншае пабудаваць, каб можна было б жыць па-іншаму. Вось і прыдумаў прыцягнуць гэткі вялізны валун. Прычым не абы-дзе паставіў яго, а на высокім пагорку, нібы пахваляючыся: глядзі, не надта я цябе, Божа, палохаюся! Ты мне соліш, а я табе ў ежу лью! Будзеш ведаць, як са мной заводзіцца!

Цяпер сапраўды Усявышняму стала цяжэй караць нячысціка. У балоце ўсё было відаць. А тут камень бачыш, але як яго зрушыць. Раззлуецца Бог ды як лупяне стралою ў камянюку, толькі іскры з яго роем паляцяць ды смех раскацісты панясецца — гэта гаспадар смяецца, бо яму нічога зрабіць зараз не могуць. Выгляне з дзвярэй каменных, пачэшацца, высалапіць язык ды плюне ў аблюбаваны бок.

Не адзін дзень у іх так цягнулася. Нячысцік стаў зноў адчуваць сваю ранейшую сілу, беспакаранасць. Што хоча, тое і робіць, а як заўважыць, што Бог да яго падкрадаецца,— адразу ў сваю хаціну хаваецца ды дзверы зачыняе, каб вогненная страла ўсярэдзіну не трапіла. Мала гэтага, ён усіх сваіх родных і братоў сюды жыць перацягнуў. Таму гэты ўзгорак Чортавым сталі зваць, бо гэтулькі многа іх там было — ажно кішэлі, нібы ракі ў азярыне.

Стаў цяпер ужо Усявышні задумвацца, як ад гэткай пошасці пазбавіцца. Часу нестае, каб нешта добрае для людзей ці для зямлі зрабіць, а тут яшчэ гэтае хвастатае стварэнне адрывае. Сядзіць дзень, сядзіць тыдзень. Палі дзе дождж залівае, дзе засуха вынішчае, а Бог не кранаецца з месца, не чуе просьбаў і маленняў людзей. Не да гэтага яму. Думае, бедалага, як ад нячысціка пазбавіцца. І так меркаваў, і гэтак прыкідваў, ды не вельмі атрымлівалася. Ажно неяк прыдумаў. Вырашыў вось як зрабіць — лупцаваць у камень штодзень, да таго часу, пакуль ён не рассыплецца на мноства маленькіх каменьчыкаў і не пахавае пад сабою ўсіх чарцей, якія там знайшлі б на́дзейны прытулак. Спада-

балася такая думка Богу, падскочыў ён адразу і паімчаў людзей з бяды выручаць.

Але цяпер, два разы на дзень, з раніцы і пад вечар, Усявышні абавязкова лупасіў ў камень-хаціну. Чорт не прыдаваў асаблівага значэння да таго часу, пакуль не заўважыў першую трэшчыну, якая прайшла па моцнай некалі сцяне. Занасіўся ён, закалаціўся, ды куды дзенешся.

Аднаго дня Бог выйшаў і як лупянуў у камень, дык той закурэўся і затрашчаў. Тады Усявышні яшчэ пару разоў дадаў, і ад камянюкі засталася горка дробных каменьчыкаў. Вось як усё атрымалася. Каменьчыкі тыя людзі з палёў пазбіралі, а назву паселішчу, якое там узнікла, далі Каменка. Так і засталося.

## МАГІЛЬНА

Так вёска называлася значна раней, а зараз па-іншаму завецца — Нёман. Перайначылі, бо некаму не надта спадабалася. Розныя чуткі хадзілі пра тую магілу, якая нібыта назву першапачатковую паселішчу дала.

Некалі даўным-даўно на гэтыя мясціны, на Панямонне значыцца, напалі ворагі — татары лютыя. Многа іх сюды прыйшло-прыехала і, нібы тыя ваўкалакі-пярэваратні, накінуліся на сваіх ахвяр. Каб жа чакалі нападу, то зараней падрыхтаваліся б да адпору. А то заўсёды так атрымліваецца, што не спадзяешся, не чакаеш, спакойна жывеш, і тут табе ўдар наносяць, ды яшчэ які!

Пра гэтую падзею згадвае і «Іпацьеўскі летапіс», і «Хроніка Літоўская і Жамойцкая», іншыя першакрыніцы, бо бітва надзвычай буйная і важная тут адбылася.

Быў на нашай зямлі тады вялікі князь Рынгольд. Любіў ён свой край, свой народ, ніколі ў знявагу яго не даваў. Касцьмі гатоў быў легчы, а чужынцаў не прапусціць. У яго падрастала тры сыны і дачка. Сыноў, як толькі хадзіць пачалі ды крыху падраслі, бацька ў сядло саджаў і даваў у рукі баявы меч, каб воінамі мужнымі выраслі, каб трывог-бітваў не палохаліся ніколі, адважна і храбра вялі сябе. Дачку аддаў на выхаванне матулі, і тая ўжо пільна сачыла за сваёй адзінай. Дружыну князь Рынгольд шанаваў, зямлю даваў воям, сялян-смердаў, грошы, калі яны з'явіліся,—

таксама. Але і патрабаваў адпаведна, каб вывучка была на самым высокім узроўні. Калі што не так, то ссуне грозна бровы, крыкне магутным голасам:

— Ты што, вой, зусім ужо ў жанчыну ператварыўся? Толькі есці ды спаць і ўмееш? А меч як трапалку ў руках трымаеш! Дзе гэта бачылі, каб такі здаравенны дзяцюк не ўмеў зброяй валодаць па-сапраўднаму? Вучыся, іначай пойдзеш да сялян плугам зямлю араць, збожжа малаціць, а не дзяржаву абараняць. Цябе народ корміць і поіць, табе я прывілеі ўсялякія даю, але ж і ты, глядзі, старайся. Каб болей я такога не бачыў. Запамятай назаўсёды.

Пачырванее дружыннік пасля такіх слоў да самых вушэй і так ужо стараецца, так ужо вучыцца ратнай справе, што сябры пачынаюць яго стрымліваць:

— Ды годзе ўжо, годзе. У цябе намнога лепей усё атрымліваецца, чым у самага вопытнага і спрактыкаванага воя.

Так і жылі з дня ў дзень, з года ў год. Самі не надта лезлі да суседзяў, але і ўласных земляў ды людзей у крыўду не давалі. Не адзін вораг зведаў, што такое землі князя Рынгольда, не аднаму чужынцу тут далі ад варот паварот. Але ж праўду ў народзе кажуць: «Як ні вучы злодзея, а яго ўсё роўна да лёгкага хлеба цягне». Так і тут. Аднаму няпрошанаму госцю адаб'юць ахвоту — другі знойдзецца.

У тое лета, спякотнае, без адзінага дожджыку, нібы нешта ў самой прыродзе папярэджвала аб хуткай небяспецы. Пацягнуліся па пыльных дарогах спачатку шматлікія жабракі, а потым ужо і былыя гаспадары з сем'ямі, якім не было чаго есці на старым месцы.

Князь Рынгольд і тут паступіў па-чалавечы. Загадаў сваім слугам і воям:

— Калі хто-небудзь падыдзе да варот нашага горада, да майго замка, то прапускайце адразу. Бачыце, якое гора на нашай зямлі ўчынілася? Галоднай смерцю людзі паміраюць. З маіх запасаў збожжа бярыце ды хлеб для іх выпякайце, мне з сям'ёй хопіць і таго, што застанецца. Каб ніводнага чалавека не пакарміўшы не адпускалі, бо грэх гэта вялікі і незамольны — не дзяліцца кавалкам хлеба са сваімі блізкімі.

Прачуўшы пра такі загад, пацягнулася мноства галодных і знясіленых людзей да княжацкага палаца. Усім тут дапамагалі, нікога не гналі прэч, бо ведалі, што такое грознае княжацкае слова.

Ды каб жа толькі ў гэтым была бяда, то неяк бы яе агаралі. Прыйшла іншая, больш страшная. Адна бяда сама не ходзіць, яна за сабою другую прыводзіць.

Неяк пад самы вечар, калі ўжо і ў замку, і вакол яго збіраліся людзі класціся спаць, затупацелі хуткія капыты па выбітай сцяжынцы.

— Да князя! Тэрмінова!— толькі і кінуў разгубленай ахове запылены і стомлены вершнік.— Хутчэй, справа адкладу не чакае!

Рынгольда паднялі і сказалі, што да яго нейкі пасланец просіцца, крычыць, што да раніцы пачакаць не мае магчымасці. Калі хоць на гадзіну спозніцца, то словы, якія ён павінен валадару сказаць, могуць вялікай бядой павярнуцца.

— Прапусціце яго!— загадаў князь, відаць, здагадаўшыся, што здарылася нешта сапраўды надзвычай важнае і чакаць да світання нельга.

Спатнелы вершнік пераступіў парог і прыхіліў сваё калена перад гаспадаром.

— Што здарылася такое важнае, вой, што ты мяне сярод ночы падняў?— запытаўся Рынгольд.

— Бяда, княжа,— толькі і вымавіў той ды зноў замоўк, бо за час шматгадзіннай язды ў яго перасохла ў горле, а вады вершніку ніхто не здагадаўся даць.

— Вады чалавеку,— загадаў князь ахове.

Калі той, спяшаючыся, наглытаўся, Рынгольд перапытаў:

— Дык што за бяда?

— Княжа, татараў сіла вялікая нашу мяжу перайшла. Я з перадавой заставы. Мяне наш дзесяцкі паслаў, каб я такую навіну страшную паведаміў. Пакуль я скакаў, то ворагі, можа, сотні кіламетраў ужо прайшлі, усё за сабою вынішчаючы і выпальваючы. Не мог я хутчэй, бо тры кані пада мною ўпалі...

— Не твая віна ў гэтым, вой,— панурыўшыся, мовіў князь і праз некалькі імгненняў зноў крыкнуў ахове:

— Ваяводу сюды! Давайце неадкладна! Каб праз паўгадзіны ў мяне быў!

А ў замку ўжо ўсё затупацела, забегала, замітусілася, здавалася, што самі сцены маюць вушы, і навіна імгненна перадавалася астатнім. Нарэшце з'явіўся і ваявода. Рынгольд папрасіў воя распавесці пра ўсё і свайму спрактыкаванаму ў баявой справе сябру. Сам жа ціха хадзіў па святліцы.

— Так,— толькі і выдыхнуў ваявода, выслухаўшы паведамленне,— так...

— Трэба нешта тэрмінова рабіць, браце,— звярнуўся да яго князь.

— Выступаць насустрач чужынцам і, знайшоўшы ўдалую мясціну, чакаць, каб даць рашаючы бой ворагам. Болей ніякага выйсця не бачу. Адступаць нам няма куды, бо і так яны глыбока на землі княства ўвашлі, кідаць свае гарады і вёскі — таксама не лепшае выйсце, аддаваць людзей на расправу — пра гэта і думаць не хачу.

— Правільна кажаш, ваявода,— павесялеў князь. — З раніцы ў паход збіраем дружыну. А ты, вой, крыху адпачні і павядзеш нас туды, адкуль яны павінны з'явіцца.

Над замкам запанаваў кароткі, цяжкі сон.

На золку дружына выехала ў паход. Наперадзе ехаў сам князь. Поруч з ім — тры сыны і ваявода, за імі — бясконцы аршак вершнікаў. Дарогу паказваў дружыннік, які прынёс гэткую трывожную навіну ў замак.

Доўга прабіралася дружына насустрач чужынцам. Можа, тыдзень, а можа, і болей, але неяк пад вечар на дарогу перад разведчыкамі выскачылі два воі са зброяй у руках.

— Стойце, далей нельга, бо татарскі лагер зусім побач.

Рынгольд з ваяводам вырашылі атакаваць ворагаў ноччу, калі добра прыцямнее. Сваім дружыннікам князь загадаў абвязаць шаломы белай палатнінай, каб пазнаваць адзін аднаго. Час цягнуўся марудна, але нарэшце пачуўся крык:

— Пайшлі!..

Што тут распачалося! Татары не чакалі нападу, таму па-сапраўднаму і не бараніліся. Кожны марыў вырвацца ў адзіночку, ды паўсюдна натыкаліся чужынцы на смертаносныя мячы і дзіды.

Да раніцы ўсё было скончана. Поле бітвы нагадвала сабою жудасную карціну. Навокал, як ахапіць вокам, ляжалі пабітыя. У асноўным татары. Мясцовых ваяроў загінула значна меней, але сярод іх быў і адзін з княжацкіх сыноў. Рынгольд сказаў, каб пахавалі ўсіх забітых, бо ў такую спёку разнясецца ад іх якая пошасць па зямлі. Праўда, не забыўся папярэдзіць, каб хавалі асобна — сваіх і чужых. Там, дзе былі шмат-

лікія курганы насыпаны і куды сцягвалі мноства цел,— стала Магільна, там, дзе косці закопвалі,— Касцяшы, а там, дзе адсечаныя галовы хавалі,— Галавачы, Галоўні. Вось адкуль такія дзіўныя назвы пайшлі.

## СТАРЫЯ МАРГІ

Жыў-быў надта багаты пан. Раней яны ўсе хітрыя былі. Толькі купіць зямлю, пабудуе агромністы палац і адразу ж патрабуе ці просіць, калі не вельмі багаты, каб побач ці ў ягоных вёсках абавязкова пабудавалі царкву і каб тут пастаянна жыў бацюшка. Поп, значыцца. А тлумачылася ўсё проста. Памешчык даваў служцы Бога грошы, нейкія там правы, і той забіваў галовы сялян, запалохваў іх, што трэба безагаворачна падпарадкоўвацца свайму гаспадару, іначай Усявышні не даруе пасля смерці і не прыме душу ў рай. Хто яго ведае, меркавалі вяскоўцы, і прытрымліваліся старога правіла, што з памешчыкам ды бацюшкам лепей не спрачацца і не заводзіцца, бо яны хутка знойдуць магчымасць паквітацца.

Дык вось гэты самы наш пан купіў зямлі ў яшчэ багацейшага за сябе, а можа, і ў карты выйграў, бо памешчыкі тады не толькі на зямлю, але і на людзей ігралі. Прыехаў аглядаць новыя ўладанні, а яны так сабе — навокал невысокі лес рассцілаецца і кустоўе паўзе па палях, нібы яго хто спецыяльна насадзіў. Пастаяў памешчык, пастаяў і загадаў фурману далей яго правезці, мабыць, думаў, што там нешта больш радаснае ўбачыць. Праехалі з вярсту, і што ж вы думаеце? Выбіліся па лясной сцяжынцы на невялічкую паляну. Тут і сталі. Пан выскачыў з карэты і пацягнуўся.

— І што ж я тут сабе такое прыдбаў? Чаго ўздумаў купіць гэтую пустку? Усё роўна як вочы нечым засціла, ці, можа, п'яны быў? Каб жа я ўсё ведаў... Не ўпомню, хоць і жадаў бы. Што тут рабіць? Як круціцца, каб нейкі прыбытак мець? Галаву яшчэ добра паламаць прыйдзецца. Ой, Божачкі... Куды я глядзеў, што думаў?..

Пан сеў на пень і абхапіў галаву рукамі. Прызадумаўся, але радаснага нічога ў галаву не лезла. І так нагу закіне, і гэтак яе адставіць, і вочы прыжмурыць — нічога не атрымліваецца. Тым часам фурман не сядзеў без справы, а таксама злез з козлаў і пайшоў блукаць па кустоўі. Потым падышоў ціха да памешчыка і стаў

ззаду, прызвычаіўся ўжо не перашкаджаць гаспадару. Памешчык зірнуў на яго і, неяк дзіўна ўстрапянуўшыся, прамовіў:

— Кажу, што зямлю я прыдбаў нейкую дзіўную, нічога добрага на ёй не расце, няма нічога такога, што можна было б прадаць і мець нейкі прыбытак. Не шанцуе мне. Адно толькі — палянка невялічкая...

Зноў глянуў на фурмана і, ўбачыўшы, што той не слухае, працягваў:

— Я і кажу, адна толькі палянка, ды і тая на тваю морду нямытую падобная.

Служка ажно падскочыў.

З таго часу і сталі тую мясцінку Мардачом зваць.

Пасля такой абразы фурман моўчкі залез на козлы і ўжо болей не злазіў, а чакаў гаспадара там. Памешчык яшчэ доўга сядзеў на пні. Стала крыху цямнець, і служка нецярпліва кашлянуў. Пан залез у карэту, і яны паехалі назад. Крыху збочылі, і гаспадар зноў заўважыў палянку, але ўжо іншую.

— Глядзі, і тут палянка. Невялікая і таксама хмызам парослая. Каб такую ачысціць, то не год і не два пройдзе. Добрых гаспадароў каб пасадзіў, то, можа, і навялі б парадак, а так...

Праехалі паляну з канца ў канец, і пан пачаў разважаць далей:

— Каб вялікая была, то поле ўзараць можна было б, збажыну пасеяць, потым яе прадаць — а мне грошы. Тут усяго нейкія сажні лічаныя...

— Чаго сажні,— умяшаўся ў панскі маналог фурман,— я думаю, маргоў восем, не меней, будзе, а то і болей на морг-другі...

— Цябе, даўбешка рыжая, нехта пытаецца? Лезеш пастаянна не ў свае справы. Толькі я слова скажу — і ён свой язык прыплятае... Апошні раз каб такое было, бо загадаю ўсыпаць добра ў твой шырокі азадак, адразу супакоішся, стрыманей будзеш...

— Стрыманей, стрыманей, а што ўжо я такога благога сказаў?— завёўся і служка.— Хіба ж я не чалавек? Хіба ж мне слова-другое сказаць нельга? Раз вы на мяне гэтак крычыце і пагражаеце, то калі і пытацца будзеце — усё роўна буду маўчаць.

— І праўда, лепей памаўчы, каб рот твой зашыўся і язык не пляскаў па губах,— зноў накінуўся пан з лаянкай.

Так і ехалі да самага палаца, перабрэхваючыся

ды адзін другому благога жадаючы.

Гадоў колькі памешчык не мог збыць гэты маёнтак, як ні імкнуўся, каму толькі ні прапаноўваў. Амаль задарма аддаваў, але ж ад каго схаваеш, што там зямляпустка і на ёй нічога, акрамя хмызоў, не расце? Таму пакупнікі, пасміхваючыся, казалі:

— Вельмі ўдзячны пану за такую слушную прапанову, але мне трэба падумаць, параіцца. Зямлю купляць — справа важная, і тут нельга ўспешкі гнацца, потым людзі смяяцца стануць.

Больш нястрыманыя на язык адразу супынялі торг:

— Знайшоў дурня. Сам па п'янцы прыдбаў, а зараз мне хочаш спіхнуць, каб з маёй сівой галавы потым яшчэ і ўнукі смяяліся. Жаб гадуй ды французам прадавай на той пустцы, а не мне пад збажыну прапаноўвай. Ды я і дарма такога дабра не хачу, не тое што за нейкую плату...

Зусім сумна яму стала. Грошы выклаў, а за што? Суседзям толькі дай падставу для кпінаў. Паперажываў, паперажываў пан дый супакоіўся. «Ат,— думае,— хай сабе стаіць, есці ж не просіць...»

І трэба ж было такому здарыцца. Аднаго вечара ўлятае слуга ў пакой да пана, нібы яго кіпнем ашпарылі, і гарлае:

— Да вас, ваша вялікасць, бацюшка просіцца!

— То чаго ты крычыш, нібы цябе кіямі сюды гналі?

— Справа ў тым... Справа ў тым...

— Ды кажы ты па парадку, што там здарылася?

— Бацюшка зямлю прыйшоў да вас купляць, вось што.

— Чаго ж ты, дурань, маўчыш? Казаў бы пра гэта адразу!

— Во, зноў я вінаваты...

— Кліч хутчэй госця сюды ды падрыхтуй нам добрую выпіўку...

— А закуску?— не ўтрымаўся слуга.

— І закуску таксама!— узарваўся гаспадар.

Тым часам увайшоў у пакой бацюшка і прывітаўся:

— Дзень добры, пане гаспадару. Жадаю здароўя ды дабрабыту ўсялякага!

— Дзякуй, і вам таго ж самага.

— Завуць мяне бацюшка Ануфрый, хачу я купіць ваш надзел зямлі.

— Калі ласка, калі ласка, і надта танна саступлю...

Селі за стол і як пачалі баляваць, то так панапіва-

лiся, што ледзьве рухалiся. Але гаспадар умудрыўся пры гэтым садраць з бацюшкi добрую плату, якую нiколi ў цвярозага не ўзяў бы.

Так i сталася зямля за бацюшкам. Вось i Ануфрова ад яго пайшло. З цягам часу на адной палянцы шыкоўны бацюшкаў дом з'явiўся: высокi, светлы, на два паверхi. На другой палянцы сталi жыць сяляне, якiя на бацюшку ды на памешчыка пастаянна спiны гнулi. Людзi гэтыя, са старых маргоў, працавалi ў панскiм маёнтку. З тых часоў i пайшло — Старыя Маргi.

## ХАТЛЯНЫ

Жылi-былi дзед з бабай, i быў ў iх адзiны сын. Звалi яго Халiмонам. Высокi, здаравенны, плечы — што тая печ. А голас якi меў! Як заспявае, то што цэлы хор завядзе.

Падрос i ажанiўся сын. Жонку сабе ўзяў адпаведную. Звалi яе Настуляй. З беднай надта сям'i была, але затое з працавiтай. Усё ўмела рабiць, ды так хутка i спрытна, што людзi дзiвiлiся. Няўжо, маўляў, чалавек так можа працаваць? А яна, калi пачуе такое пытанне, то толькi пачырванее i нiчога не адкажа, гляне сваiмi сiнiмi вачанятамi i маўчыць.

Добра, калi добра, але ж i бяда часам прыходзiць, i страшная яна бывае. Так i ў iхняй хацiне здарылася. Нарадзiўся ўнук у дзеда з бабай, але калi нараджала, то моцна захварэла i злягла Настуля. Думалi спачатку, што неяк ачуняе маладзiца, адступiць хвароба, але здарылася наадварот: хвароба яшчэ болей ахапiла маладое цела. На вачах худнела i згарала працаўнiца, якой яшчэ ўчора зайздросцiлi вяскоўцы. Плакалi старыя, стагнаў, скрыпеў зубамi здаравяка Халiмон. Не спаў бедалага, нават не клаўся, толькi прыпадаў галавою на краёчак пасцелi, дзе ляжала хворая, i пры малейшым руху цi скрыпе прачынаўся:

— Што, родненькая? Можа нешта трэба?

— Спi, каханы, спi... Ты ж ранiцай на працу пойдзеш. Табе адпачыць трэба, а я не даю. Спi... А дзе мой сыночак?

— Тут ён, тут. Спiць спакойненька. Мацi мая з бацькам з яго вачэй не зводзяць. Здаровы хлопчык расце. Ты сама папраўляйся, а пра астатняе не думай...

Але не пачуў Усявышнi нi мальбы старых i мужа, нi стогнаў хворай жанчыны — нiчым не дапамог. Праз

тыдзень сканала яна, пакінула пасля сябе хлопчыка-сірату і мужа-здаравяку.

Як хавалі небараку, то бацькі Халімона ў магілу кідаліся, надта перажывалі. Унучак нічога яшчэ не разумеў і толькі весела паглядаў навокал сваімі сіняватымі вачанятамі, усміхаючыся кожнаму новаму твару.

Пасля пахавання нібы нейкі злы дух стаў жыць у хаціне Халімонавых бацькоў. Спачатку захварэла старая. Толькі злягла — адразу папярэдзіла і сына, і мужа:

— Калі памру, то абавязкова пахавайце мяне побач з нявесткай. Мы там адна з адной размаўляць станем, у госці хадзіць будзем, вечараваць пастаянна. Прашу вас усё так і зрабіць.

Стары адгаворваў:

— Туды не спяшайся, жонка, пачакай крыху. Патапчы яшчэ траву зялёную. Унука трэба дапамагчы сыну на ногі ўзняць. Ты ж жанчына, а астатнія ўсе ў хаце мужыкі. Што ж мы тут рабіць самі будзем?..

— Неяк забядуеце,— адказвала хворая, і слёзы каціліся па яе маршчыністым твары.

Так і сталася. У хуткім часе Халімонава маці таксама пакінула белы свет. Павезлі яе мужчыны на могілкі і ямку выкапалі там, дзе і прасіла — побач з нявесткай.

Калі здарылася гэтае гора, то яшчэ цішэй стала ў хаціне. Шчабятаў нешта толькі маленькі ўнучак, а дарослыя найболей панура маўчалі. Кожны думаў пра сваё, пра тое, як жыць далей, калі няма побач вернага спадарожніка, на якога раней пастаянна абапіраўся.

Дзед дык той і на працу ўжо не хадзіў, толькі сядзеў на прызбе, трымаў на руках светлавалосага ўнука і нешта напяваў-шамкаў яму сваім бяззубым ротам.

Халімон імкнуўся паболей працаваць, каб неяк у празмерным фізічным напружанні забыцца пра тое, што зусім нядаўна адбылося. Прыходзіў у хаціну, калі ўжо змяркалася, і есці не браў, што бацька наварыў, а адразу да сыночка рукі працягваў, каб з ім паразмаўляць-пагаманіць. Той яшчэ і не разумеў гэтых слоў, але бацьку здавалася, што, наадварот, малы ўсё на свеце разумее, толькі сказаць пакуль што не можа.

— Хутка пойдзем з табой, маленькі. На свае ножкі станеш. Каровак у поле пагонім. Барозны па полі з табой павядзём. У лес пакіруем, каб ты пабачыў, які ён высачэнны ды прыгожы. Ты толькі расці хутчэй. Еж ды спі, дзеда слухайся, а там ўсё і прыспее само па

сабе. Пабачыш, сыночак. Шкада, што матуля нашага сыночка болей не пабачыць, не ўстане з сырой магілы. Маці-нябожчыца таксама болей сюды не прыйдзе. Спі, маленькі, расці здаровенькі.

Стомлены за дзень так і засынаў Халімон з малым на руках. Тады стары гаспадар ласкава вымаў малога, а на сына казаў:

— Халімонка, кладзіся спаць. Адпачываць час прыспеў. Кладзіся, Халімонка...

З дня ў дзень усё ішло сваім парадкам. Гора заўсёды крыху забываецца, бо нездарма ж кажуць, што час лечыць. Год прайшоў, другі прамінуў. Хлопчык хадзіць стаў і першыя словы вымаўляць. Цяпер яшчэ болей за ім стары дзед наглядаў. Бацька ўвечары прыходзіў, то малы на калені яму кідаўся, а стары распавядаў, што ўнук за дзень паспеў вырабіць.

— Такі ўжо непаседлівы, такі ўжо жэўжык, што стрымаць нельга. Толькі і глядзі, каб куды не ўскочыў, гарэза гэты... Ці ж я за табой выбегаю?..

Але хлопчык не чуў ужо слоў, бо соладка спаў на магутных руках у таты.

Ужо добра ўзрос Алеська (гэтак звалі малога), выцягнуўся, нібы каліўца жыта: худы, даўгарукі, жылісты. Бацька, гледзячы на яго, часам пасмейваўся:

— Эх, сынку, трэба ўжо і мясам абрастаць, а то адны косці. Бачыш, якія плечы шырокія ды худыя. Як станеш мужыком, дык будзеш за мяне, мабыць, здаравейшы...

Дзед абавязкова дадаваў:

— То ж так і павінна стацца. Заўсёды так было і будзе, што сын вырастае за бацьку мацнейшым. Хай расце толькі, хай у сілу ўваходзіць, тады і пабачым...

Але старому не давялося пабачыць. Захварэў і ён ды злёг. Сівы ўвесь ляжаў, схуднелы да празрыстасці, у белай палатнянай вопратцы. Яшчэ жывы, ён нагадваў сабою не зямнога жыхара, а нейкую вышэйшую істоту, якая нічога не баіцца, бо ўсё ведае, што адбудзецца, наперад, быццам бы сон прарочны ўбачыла. Так і сканаў: ціха, спакойна, не дакараючы ўласны лёс за тое, што выпала яму многае пабачыць і перажыць на жыццёвым шляху. Глянуў адно на сваіх сына і ўнука і, ўсміхнуўшыся, сказаў:

— Сапраўды, Алеська будзе намнога здаравейшым. Ужо і зараз відаць...

Потым узвёў вочы і... памёр.

Зрабілі дамавіну старому бацька з сынам і павезлі на могілкі. Выкапалі ямку побач з жонкай і нявесткай, і калі пачалі закопваць, то бацька, магутны і здаравенны, раптам заплакаў, застагнаў, вымавіўшы пры гэтым:

— Не магу болей, сынку, тут заставацца. Толькі гора адно нам тут... Пойдзем шукаць іншую мясціну.

Пайшлі ўдваіх з самае раніцы. Доўга ішлі, потым бацька аглядзеўся і зазначыў:

— Вось тут і хачу хату мець...

Ад гэтых слоў і пайшла назва Хатляны.

Распавядаюць яшчэ, што калі Халімон ставіў сваю хаціну і пачынаў вёску будаваць, то паклікаў бацюшку, каб, значыцца, асвяціць месца і каб ніякая пошасць, ніякі паморак тут ніколі не гаспадарылі. А поп быў сквапны да грошай, і яму ўсё роўна што рабіць, абы плацілі. Вось узяў ён сякеру, прыглядзеўся, цюкнуў ёю і прамовіў пры гэтым:

Першы гак,
Хай будзе так:
Што нядзелька — то радзінкі,
Што будні дзянёк — то й памінкі.

Не спадабалася такое Халімону з сынам. Што ж гэта атрымліваецца? Што ім тут запрошаны намаўляе? Таму ўхапіў сам гаспадар сякеру і таксама цюкнуў, толькі сказаў зусім іншыя словы:

Мой першы гак,
Хай будзе так:
Што гадок —
То й папок.

Цяпер ужо бацюшку перакрывіла, ды нічога выправіць ён не мог, бо сам першы пачаў. А з таго, што сказаў Халімон, справа атрымалася: кожны год-другі паміраў бацюшка ў гэтай царкве. Ужо баяліся папы сюды на службу ехаць. Каму ж хочацца так мала пражыць? Таму прыйшлі да Халімона і давай прасіць:

— Дапамажы нам ад гэтых слоў вызваліцца. Мы ж не вінаватыя, што наш папярэднік такі дурны ды сквапны быў.

Мусілі выбіраць тут падваліну і закладваць новую. Разам з гэтым усё і супакоілася.

## ЧАШЫН

Пра нашу вёску ёсць казка дужа цікавая. Паслухайце.

Жылі-былі бацька, маці, і ў іх быў хлопчык. Сцяпанка яго звалі. Неслухам рос малы, што ні скажуць — ніколі не выканае. Просяць яго раз — не слухае, просяць другі — не слухае. Параіліся маці з бацькам і вырашылі пакараць сына. Пашыла маці торбачку, каб на плячо павесіць, паклала туды булку хлеба, а бацька прынёс кавалак сала. Падае Сцяпанку і гаворыць:

— На вось і ідзі сабе ў белы свет. Нам такі сын не патрэбны. Што гэта далей будзе, калі ты ўжо зараз не слухаешся. Ідзі і дарогу назад забудзь.

Заплакаў Сцяпанка, ды бацькі не пашкадавалі. Выгналі прэч. Пайшоў ён. Ідзе дзень, ідзе другі. Сам малы, а малому, ведама ж, есці хочацца часцей і болей, чым дарасламу. Таму праз некаторы час з'еў ён хлеб, умяў сала — нічога не засталося. Куды ж яму цяпер падацца? Пайшоў далей. Ажно бачыць — шырокая рэчка і праз яе будаўнікі мост спрабуюць навесці. Вырашыў малы: «Падыду да іх ды наймуся на працу, то хоць з голаду не памру...»

Пакіраваў да людзей. Бачыць — сядзіць стары дзед і пакрыквае на цесляў:

— Хутчэй варушыцеся, лайдакі! Толькі хлеб мой пераводзіце, а працаваць не надта рвяцеся!

— Пабойся ты Бога!— паспрабаваў было ўсчуваць старога адзін з працуючых, ды той так на яго глянуў, што будаўнік схіліўся і баяўся нават вочы ўзняць. Так яны дзеда таго баяліся. Але Сцяпанку не было куды ісці, таму падышоў і павітаўся:

— Добры дзень вам!

— Добры. А чаго гэта ты тут, хлопча, ходзіш?

— Наймі мяне, дзядулька, на працу да сябе,— узмаліўся Сцяпанка.

— Але ж ты надта яшчэ маленькі, каб я цябе на працу браў.

— Дзядулька, пашкадуй, не адмаўляй, бо дажыўся я да таго, што няма ў мяне чаго есці і магу галоднай смерцю памерці.

— Не ведаю нават, як і быць мне з табою...

— Вазьмі, выратуй мяне, не дапусці, каб я сканаў такім малым.

— Ну, калі ўжо няма чаго табе есці, то параю, хлопча, наступнае. Вунь, бачыш, хатка невялічкая стаіць. Зайдзі туды і папрасіся: «Найміце мяне на працу». Пачуеш у адказ «калі ласка», то з задавальненнем наймайся на першую, на другую, на трэцюю, на чацвёртую, а на пятую ні пад якімі ўмовамі не згаджайся. Калі такую памылку дапусціш, то не соладка табе давядзецца і выратаваць з няволі цяжка будзе. А выканаеш усе мае ўмовы — будзеш ты, малы, і накормлены, і напоены, і клопатаў у цябе не стане. Калі наймешся на працу, дык адразу ж да мяне прыходзь, каб я пра ўсё ведаў. Шкада мне цябе, гэткага малога.

Сцяпанка пайшоў, як і сказаў дзядуля. Папытаў першую, другую, трэцюю, чацвёртую — няма ніякай працы. Зусім страціў надзею хлопчык, спалохаўся, што ў голадзе жыць давядзецца, і наняўся на пятую. Толькі даў згоду, як сам па сабе стол накрыўся і з'явілася на ім усё, што толькі пажадаць можна. Малы накінуўся на ежу. Не агледзеўся, як амаль усё і з'еў, а калі голад збіў, то спаць вельмі захацелася, і не заўважыў нават, як заснуў. Спіць сабе соладка, сны яму ніякія не сняцца. Так да самага вечара за сталом і прахроп.

Вечарам вочы прадраў і толькі паспеў пацягнуцца, як нейкая няведамая сіла ўхапіла яго і ўпіхнула ў цёмны невялічкі пакой, дзе было толькі адно акенца, ды і тое закратанае. Жудасна яму стала, страшна, не вытрымаў Сцяпанка і заплакаў. Плача, што ніхто і не даведаецца, як ён тут свой жыццёвы лёс скончыў.

А той самы стары дзед, які яго да хацінкі накіраваў, чакаў, чакаў малога і, не дачакаўшыся, пайшоў шукаць, каб даведацца, што ж з ім сталася. Нехта падказаў яму, куды хлопчыка запіхнулі. Тады ён да дзвярэй падышоў і давай ціхенька стукаць.

— Ты тут, Сцяпанка?

— А хто ты такі?

— Гэта я, стары...

Заплакаў уголас Сцяпанка.

Дзядулька давай яго дакараць:

— Казаў жа я табе, папярэджваў, каб не наймаўся на гэтую, пятую, працу, бо мне будзе цяжка цябе вызваліць...

— Што ж мне рабіць было, калі мяне гэтак падманулі. Паабяцалі, што працаваць буду і ніхто мяне няволіць не стане...

— Бачыш, чым справа павярнулася.

— Так, дзядулька...

— Як жа табе дапамагчы?

— Не ведаю...

— Добра, паспрабую, толькі ты хоць зараз усё так выканай, як я цябе навучу, бо зноў што-небудзь на зло сабе ўчыніш. На вось табе дубовы лісточак. Пакручвай яго па-ўсялякаму. Хто б ні выскачыў у гэтым пакоі, ты не палохайся, старайся не глядзець, бо такія пачвары могуць быць, што і ў дарослага чалавека валасы дыбарам стануць. Пакручвай да таго часу, пакуль дзверы не адчыняцца.

— Вось дзякуй, дзядулька, я не застануся тут ні на хвіліну. Каб толькі дзверы адчыніліся...

Стары пайшоў, а Сцяпанка ўзяўся пакручваць дубовы лісточак. Як ні стараўся хлапчынка, як ні імкнуўся адразу вызваліцца — нічога пакуль што не атрымлівалася. Недзе пад самую раніцу, калі ўжо ў малога вочы ад сну зліпаліся, выскачыла на сярэдзіну пакойчыка дзеўка-прыгажуня:

— Ого-го! Свежае мяса мне аднекуль прынесла!

А хлопчык увагі на яе не звяртае, усё робіць так, як дзядуля яго падвучыў, каб зноў з-за ўласнага глупства ў якую непрыемную гісторыю не трапіць. Дзяўчына і так круцілася, і гэтак выгіналася, каб яго напалохаць, але нічога не атрымалася. Запяялі трэція пеўні, і яна, злосна бліснуўшы вачыма, прамовіла:

— Ну пачакай, Сцяпанка, я табе яшчэ зраблю! Ты да скону жыцця свайго мяне памятаць будзеш! Не дарую, што ты з мяне насміхаўся!

Сказала так і знікла.

Раніцай яго тая ж невядомая сіла, што запіхнула ў цёмны пакойчык, каб дзяўчына з'ела, выпіхнула ў вялікі пакой да багатага стала:

— Еж, родненькі, еж. Ты ж усю ночку не спаў, і табе трэба сілы аднавіць. Паеж добра ды лягай, паспі да вечара. Ніхто цябе ў нас і пальцам не кране.

Сцяпанка і сапраўды як наеўся, дык адразу і заснуў, але нават сонны трымаў рукі на грудзях, дзе ў яго пад кашуляй быў схаваны чарадзейны дубовы лісток.

Вечарам зноў тая сіла завалакла яго ў цёмны пакойчык. Ён і ўпіраўся, але ці ж сілу пераможаш, калі ты адзін?

Сядзіць Сцяпанка і лісток пакручвае. Нічога не атрымліваецца, усялякія зданні выскакваюць, спрабуюць напалохаць малога, зрабіць так, каб ён закры-

чаў, але хлапчук трымаецца. Потым тая ж самая дзеўка выскачыла і да яго:

— Ну, цяпер-то ты мой ужо дакладна! Цяпер цябе ніхто не выратуе і не дапаможа! Часу ў мяне многа, што захачу — тое і зраблю! Так і ведай!

Ужо асмялела і рукі працягвае. Бачыць хлапчук, што нічога добрага з гэтага не атрымаецца, ухапіў тады дзяўчыну за доўгую касу ды як грукне кулаком у плечы.

— Так і ведай, я цябе таксама не выпушчу жывой! Буду біць да таго часу, пакуль не скарышся мне ці не памрэш!

Сказаў, ды зноў у плечы.

Дзяўчына круціцца, вішчыць ад болю, але памілаваць не просіцца. Хлопчык таксама не паддаецца, лупасіць у плечы. Ужо і лісток адкінуў убок:

— Выпускай мяне адсюль! Выпускай, бо заб'ю і не пашкадую!

Прыгажуня трывала, трывала і прамовіла:

— Не бі болей, Сцяпанка, то я цябе і так выпушчу ўжо...

Сапраўды, выпусціла, але хлапчынка яе касу з рукі не выпусціў, павёў да свайго дарадчыка — да дзеда.

— Дзядулька, вось яна, тая, якая ўтрымлівала мяне ў пакоі. Што рабіць з ёю?

— Твая палонніца, Сцяпанка, ты і вырашай.

Узмалілася тады дзяўчына-прыгажуня:

— Не забівай мяне, Сцяпанка, я табе буду вернай жонкай.

— Вось бачыш,— сказаў дзед,— усё само і вырашылася. А ты ў мяне будзеш бёрны ачэсваць ад кары ды сукоў. Праца не надта цяжкая, але пракормішся, і жонка твая з голаду не памрэ.

Так яны там жыць і засталіся. А вёска Чашын займела назву ад слова «часаць».



# ЧЭРВЕНЬ (ІГУМЕН)

Некалі, у сівыя стагоддзі, нашы продкі пакланяліся не нябеснаму Богу, а выраблялі сабе ідала з дрэва, з каменя і яму паклоны адбівалі ды ахвяры прыносілі. Такі ідал і ў нас тут быў. Вось толькі дзе дакладна стаяў, ніхто паказаць не можа. Спрачаюцца людзі, бо адны кажуць на адно месца, другія — на другое, а трэція — на трэцяе. Паспрабуй да праўды дайсці, калі кожны па-свойму чуў і, адпаведна, гэтак жа пераказвае. Але было ўсё прыкладна вось як.

З даўніх часоў жылі тут людзі. Спачатку жылі і ніякай веры не ведалі. І так, мабыць, ім добра было. Працавалі паціху, адпачывалі, калі час быў, і не скардзіліся на ўласны лёс. Многа стагоддзяў так прайшло, ды аднаго разу сядзелі местачкоўцы і спрачаліся. Зацікавіла іх наступнае: што гэта на небе так грукоча і трашчыць, калі дождж з маланкай усчнецца? Кожны выказваў сваю думку, але ўсё не было падобна на праўду.

— Грукоча, бачыце, людцы, як у два молаты кавальскія б'юць адначасова. Сіла, відаць, у таго, хто гэта робіць, страшная. Не бачыў я такіх людзей, якія б

здолелі так грукнуць,— сказаў стары дзед і азірнуўся на сваіх суразмоўцаў, ці то падтрымкі шукаючы, ці то гледзячы на іх рэакцыю на ягоныя словы.

— Сапраўды так. Нешта ёсць, але што? Каб жа можна было хоць адным вокам пабачыць, тады я вам адразу і сказаў бы,— уключыўся ў гамонку хударлявы, хітраваты мужык,— ні ад каго не хаваў бы такой важнай таямніцы.

— Што самае цікавае — то калі гром з маланкай усчнецца, дык не толькі па небе грукат коціцца, але і зямля трымціць. Вось дзе загадка. Трасецца лес, вада плёскаецца... Ад чаго, скажыце?— запыталася старая жанчына, якая невядома чаго прыплялася да мужчын. У другі раз яе хутка адсюль справадзілі б, а раз такая сур'ёзная размова завялася, то яе ніхто і не чапаў.

— Мабыць, старая, усё ў прыродзе паміж сабою звязана і ёсць нейкая патаемная сіла, якая ўсё гэта лучыць. Інакш чым растлумачыць? Меркаваць па-ўсялякаму можна, а што гэта дасць?— адказаў нехта з вяскоўцаў.

— Шанаваць тую сілу трэба, бо калі пакрыўдзім ці абразім яе нечым, дык не ўратуемся. Што мы супраць яе? Калі раз ці два па нас лупяне — мокрага месца не застанецца. Трэба неяк пакланяцца ёй, неяк шанаваць. Але як?..— працягваў далей нехта з сялян.

— Можа, зрабіць які ідал?— запытаўся нехта.

— А што гэта такое?— адразу ж пачуліся многія галасы.

— Ну, цурбалак дубовы ці выдзеўбаны з каменя. Каб крыху на чалавека быў падобны, іначай жа нельга. Якая б сіла ні была, але ўсё роўна яна на нас з вамі падобная...

— Гэта так, бясспрэчна,— азваліся многія з вяскоўцаў.

— Тады няхай ён і зробіць гэтага, як яго... ідала,— папярхнуўшыся пры вымаўленні нязвычнага слова, прапанаваў той стары, які ўсчаў гамонку.— Ён-то сабе хоць уяўляе, а мы што?..

— Ага,— пагадзіліся астатнія і звярнуліся да вяскоўца, што гаварыў пра ідала:

— Чаго ўжо там — зрабі. Вазьмі і зрабі, як атрымаецца — так і добра будзе. Смяяцца і дакараць не станем. Самі ж ведаем, як гэта складана і нязвычна для нас.

Дзён праз колькі дубовы драўляны ідал быў гато-

вы. Вясковец зрабіў яго падобным на сапраўднага вяскоўца, нават у шапцы, упрыгожыў, як мог. Паклікаў сялян, каб глянулі на тое, што ён здолеў высекчы пры дапамозе сякеры. Прыйшлі людзі, паўсталі навокал, глядзяць. Старанна быў высечаны ідал. Запрапанавалі некаторыя паставіць яго на ўзгорку, маўляў, адтуль бліжэй да нябёсаў будзе. Астатнім прапанова падалася слушнай. Хуценька ўсцягнулі ідала на бліжэйшы ўзгорак. Халаднавата было, восень на двары стаяла, таму вогнішча побач зацеплілі, каб крыху сагравацца. Спадабалася, што нябесная сіла зараз побач з імі знаходзілася, але вось як жа на яе маліцца? Зноў запыталіся ў майстра, а той толькі пацісnуў плячыма ды адказаў шчыра.

— Гэтага, сябры мае, і я не ведаю. Можа, і не трэба на яго маліцца, а проста шанаваць ды прыносіць яму ахвяры? Можа, і гэтага будзе дастаткова?

— А што, праўду чалавек гаворыць. Калі ў нас вязенне якое надарыцца ці свята, то мы яму тады болей будзем падарункаў і адносаў прыносіць, а калі звычайны дзень — крыху меней. І нам добра будзе, і ён не пакрыўдуе на нас...

— А калі гора не міне, то будзем звяртацца ўжо не з падарункамі і не са словамі падзякі, а маліць аб дапамозе...

— Вось, бачыце, як хутка ўсё разам вырашылі, а то што адна галава, калі навокал людзей гэтулькі,— узрадаваўся той самы стары дзед.

Так і павялося ў іх на многія дзесяцігоддзі. Ужо не толькі самі, але і дзеці іхнія, і ўнукі такой дзіўнай веры пакланяліся. Ідал пачарнеў ад часу і стаў яшчэ больш таямнічым ды загадкавым. Вяскоўцы ўжо нават навучыліся прадказваць надвор'е ці будучыя падзеі па тым, як нібыта ён рэагуе на ўсё тое, што адбываецца навокал. Цяпер ужо на ўзвышшы раслі высачэнныя дрэвы, пастаянна гарэў непагасны агонь і жыў вяшчун, які па тым, як згортвалася і загусала кроў у агні ці як трашчалі косці ў полымі, таксама гаварыў сародзічам, ці пачынаць нейкую новую справу або трэба адпачыць і пачакаць колькі тыдняў. Цяпер ужо людзі адчувалі поўную залежнасць ад ідала, яны баяліся яго, а гэта ўжо зусім не тое, што паважаць. Ахвяры і паднашэнні прыносілі рэгулярна. Вяшчун гаварыў, што калі нешта зробяць не так, як патрабуецца, то на паселішча абрушыцца пакаранне нябеснае, і ніхто не выратуецца.

З цягам часу на змену старой прыйшла новая вера — хрысціянская — і прынесла з сабою новыя парадкі і законы. Цяпер па ўсім краі будавалі храмы. Тубыльцы імкнуліся не падпарадкоўвацца хрысціянскім прапаведнікам, але куды ты дзенешся, калі ўсе багатыя і заможныя ўжо прызналі новага Бога? Бедных ды жабракоў прымушалі сілай, і мала хто на гэта звяртаў увагу. Адзінае, што ім заставалася,— гэта ўцякаць у маланаселеныя землі, знаходзіць такія куточкі, дзе яшчэ доўгія гады можна будзе пакланяцца сваім старым ідалам і ніхто гэтаму не перашкодзіць.

На месцы сучаснага Чэрвеня таксама была такая пустка, дзе і знаходзілася адзінае старадаўняе паселішча. Таму яго жыхары па-ранейшаму пакланяліся таму ідалу, якога некалі высек сякерай адзін з іхніх продкаў. Усё ішло добра. Прыйдуць, пасядуць навокал і слухаюць уважліва, што гаворыць іхні вяшчун. Той заклікаў не пакланяцца новаму Богу, а пакланяцца старым багам, якія былі гэтакія добрыя і спагадлівыя да іх, ніколі не адварочваліся ад іхніх бед і просьбаў. Ды ўсё добра, што добра канчаецца.

Аднаго разу аднекуль з'явіўся тут падарожны. Дзіўны ён быў нейкі: змізарнелы, худы, у чорнай вопратцы.

— Нібы груган які,— сказаў нехта з вяскоўцаў, і астатнія моўчкі пагадзіліся.

Напаілі чалавека, накармілі, бо ніколі такога не было, каб з падарожным апошнім кавалачкам хлеба не падзяліліся. Дык ён, як толькі пад'еў і падзякаваў, пачаў пераконваць іх, што ёсць такія землі, дзе пакланяюцца нейкаму адзінаму і, галоўнае, надта добраму Богу. Не трэба яму прыносіць ніякіх ахвяр, не трэба аддаваць апошняе, а толькі маліцца. Маліцца, прычым звяртаючыся не да ідала, а да самога неба.

— Як гэта?— не вытрымаў нехта з сялян.— Ці ж так можна? Для нас Бог вунь, на узвышшы. Мы яму і молімся.

— Не, таго Бога вы самі не ўбачыце, але ён бачыць добра і вас, і тое, што вы робіце... Нельга прайсці міма яго нядрэмнага вока. У кожнага чалавека свой лёс, і кожнаму наканавана толькі яму адпаведнае. Бог за гэтым сочыць і не дае магчымасці перайначыць нешта ці змяніць.

— А дзе ж яны моляцца таму свайму Богу?— пачуўся нечы нерашучы голас.

— У храме моляцца.

— А што гэта?

— Спецыяльная будыніна, і там многа абразоў з лікамі святых ды апосталаў...

— А хто ж будуе ўсё гэта?

— Самі людзі, якія новаму Богу моляцца, і будуюць.

— Дзіўна нам такое чуць. Не прывыклі мы да гэтага.

— Дык давайце паспрабуем, а раптам і вам спадабаецца?

Так з таго дня падарожны манах, які спецыяльна хадзіў па зямлі, каб схіляць людзей да новай веры, пераканаў местачкоўцаў шанаваць Ісуса — сына Божага.

З цягам часу, як ні працівіўся стары вяшчун, усе жыхары пачалі пад кіраўніцтвам манаха будаваць вялікі і прыгожы манастыр. Вяскоўцы былі вопытнымі і спрактыкаванымі майстрамі-цеслямі, ім было дастаткова паказаць, а астатняе яны рабілі самі, спасылаючыся на інтуіцыю.

Такі манастыр узвялі, а ў ім храм, што падарожныя толькі здзіўляліся, бо мала дзе даводзілася бачыць гэткае цуда. З таго часу і сталі местачкоўцы пакланяцца новаму Богу. У манастыры стаў жыць падарожны манах, а праз некаторы час, калі з'явіліся яшчэ манахі, ён стаў першым ігуменам. Гэта пасада такая царкоўная ёсць. Хутка ўзбагачаўся манастыр. Манахі і іхні старэйшы на першым этапе вялі сябе вельмі прыстойна: не бралі сабе нічога лішняга, не прымушалі сялян працаваць на царкоўных землях, а з усім гэтым спраўляліся самі. Болей таго, нават калі сустракалі чалавека, які пакланяўся старой веры, то не каралі яго, не прымушалі ўцякаць ад бязлітаснай нібыта кары, а імкнуліся пераканаць яго, каб ён таксама далучаўся да іх.

Раз ці два ў год запрашалі да сябе ў госці вяскоўцаў. Тады манахі паказвалі ім, як жывуць, як моляцца, як здзяйсняюць таемныя абрады, і многае іншае. Людзі паходзяць, паходзяць, а там глядзіш — і новыя манахі ў манастыры з'явяцца, выкажа нехта згоду ўсё жыццё служыць Богу. Ігумен быў надта справядлівы. Ён увесь ужо стаў сівы, нібы той голуб, але розум не страціў. Якое пытанне ўзнікне, ці завядуцца па нейкай прычыне служкі Бога — адразу рассудзіць па-роўнаму, без крыўды. Усе задаволенымі заставаліся, і ігумен

таксама. Яму было радасна, што ўсё ў манастыры сваім парадкам ідзе, нічога не парушаецца.

Але добрае ў жыцці абавязкова чаргуецца з благім. Дзе ж вы бачылі, каб людзі толькі весяліліся ды смяяліся? Абавязкова нешта прыключыцца. У манастыры ўсе бядоты пачаліся пасля смерці старога ігумена. Калі ён памёр, то пахавалі яго ўрачыста, і вельмі многія плакалі, шкадуючы, што сярод іх цяпер не будзе такога добрага і спагадлівага чалавека, а некаторыя нават прадчувалі, што завядзецца нейкая нячыстая справа.

Так яно і здарылася. Да таго часу ў манастыры было сабрана шмат каштоўнасцей, упрыгожванняў, залачоных абразоў і іншых царкоўных ды храмавых рэчаў. Казалі, што нават былі адліты па загаду ігумена дванаццаць медных апосталаў у рост чалавечы. Яны стаялі ў царкве паўколам, і манахі маліліся на гэтых святых ідалаў.

Пасля смерці ігумена пачалі спрачацца манахі паміж сабою, хто ж на вольную пасаду стане. Некаторым агідна было чуць такое, то яны ўбок адыходзілі і ў размовах не ўдзельнічалі, а іншыя, наадварот, толькі і чакалі, каб языкамі памянташыць ды паказаць свой сапраўдны характар і твар. Спрачаліся не дзень, не два, нават лаяліся брыдка, і не было зараз каму іх супакоіць ды прымусіць шчыра маліцца Богу. Нарэшце засталіся ўжо толькі два манахі, якія збіраліся заняць пасаду. Пачалі яны паміж сабою разбірацца. І што ж вы думаеце? Адкупіўся адзін ад другога. Невядома, адкуль у яго золата столькі магло з'явіцца, але ж факт застаўся фактам. Як адсыпаў залатых манах свайму саперніку, то ў таго вочы заблішчалі і адмовіўся ён ад задумы заняць ігуменскую пасаду.

Вось з тае часіны ўсё рэзка і змянілася: манахаў пачалі падзяляць на багатых і бедных, на добрых і благіх (маецца на ўвазе для ігумена), вяскоўцаў з бліжэйшых паселішчаў сілаю прымушалі працаваць на шматлікіх палях і сенакосах, каб мець у многа разоў болей прыбытку, чым раней. Стагналі сяляне, а што зробіш, іхнія продкі некалі самі пабудавалі манастыр на гэтай, тады яшчэ нічыйнай, зямлі. Ужо і на свае гаспадаркі часу амаль не заставалася, толькі і рабілі, што гнулі спіны на манастыр. Пагамоняць паміж сабою, паплачуцца на свой лёс і пойдуць далей шчыраваць. Што рабіць, раз лёс такі ім выпаў?

Ігумен жа ўсюды паспяваў прыглядзець, ніхто з ягонага поля зроку не выпадаў. Здаралася, што і манахаў сваіх загадваў люта катаваць. Прычына для гэтага магла быць самай дробязнай: нешта схаваў галодны чалавек, каб потым перакусіць, не вельмі хутка выканаў загад або не захацеў біць вяскоўцаў. Не цягнуліся цяпер да манастыра людзі, а, наадварот, абыходзілі яго далёка бокам, каб не сустрэцца з кім з манахаў ды потым не трапіць у вечнае рабства, бо і такое было: зловяць чалавека, у турму кінуць, а там як пасядзіць ён галодны ды халодны, дык згоду на што хочаш дасць. Так потым і не вяртаўся да родных, назаўсёды заставаўся гібець ва ўладаннях царкоўных.

Здаралася, едзе ігумен ў карэце, а насустрач яму стомленыя, змізарнелыя сяляне ідуць, дык фурман здалёк яшчэ верашчыць:

— На калені! На калені, воўчае мяса! На калені!

Калі хто на хвілінку затрымаецца, дык як джгне бізуном — толькі кроў засвішча з рассечанага цела, і застогне нехта, валячыся ў пыл. А ігумен паглядвае сабе праз акенца і ўсміхаецца. Мала таго, яшчэ і падмаўляе фурмана:

— Лупцуй, лупцуй іх, сын мой! Чым болей яны будуць плакаць і стагнаць, тым меней у іх усялякіх дурных думак у галаве будзе! Не шкадуй, бачыш — мы іх б'ём, а яны не скараюцца, усё роўна гнеў з вачэй бліскае! Джгані яшчэ каторага!

Панясецца карэта далей, а сяляне застануцца, выціраючыся ды стогнучы. Пойдуць далей, спачатку памаўчаць, а потым, азірнуўшыся, загавораць між сабою:

— Няўжо Бог не бачыць, што гэты ваўкалака над намі вырабляе? Няўжо гэта будзе яму даравана і ён таксама ў рай пойдзе?

— А чаму ж не? У іх жа ўсё куплена. Хіба не памятаеш, які той ігумен быў? А гэты... Ты на яго толькі зірні, і слухаць нікога не трэба — сам даведаешся, што гэта злыдзень ды вылюдак.

— Даруй нам Божа такія размовы, але мы ўжо трываць болей не можам.

— Эх, — толькі і выдыхне нехта, і пойдуць сяляне, згорбіўшыся, дамоў, бо з раніцы зноў трэба ўставаць і кіраваць на манастыршчыну...

А ігумену што? Ён жа валадар!

Вось аднойчы вярнуўся ён у манастыр з аб'езду ўладанняў і адразу ж гыркнуў:

— Есці мне пастаўце, бо нешта згаладаўся.

— Але ж яшчэ вячэрню стаяць,— забыўшыся, мабыць, з кім размаўляе, абмовіўся стары манах і аб гэтым пашкадаваў, бо разнеслася гучнае:

— На стайню яго! Ды ўсыпце, каб ведаў, як загады не выконваць і самога ігумена павучаць! Дайце яму!

Перакусіў, віна чырвонага ўдосталь выпіў і прылёг адпачыць. Але нешта яму ў той дзень не спалася, вырашыў таму пайсці на падворак і паглядзець, як справы ідуць. Выцягся на ганак з пакоя і ўтаропіўся на купку манахаў, якія стаялі і пра нешта гаманілі. Цікаваў, што ж гэта такое, каб потым было да чаго прыдрацца. Ды з такой адлегласці пачуць нічога не ўдалося, таму праз імгненне загарлаў:

— Ах вы, лайдакі! Чаго гэта вы стаіце і нічога не робіце?! Так цэлы дзень і аціраецеся па завуголлі, толькі каб нічога не рабіць!

Манахі памкнуліся было ўцякаць, але ігумен закрычаў:

— Куды вы, галубкі? Да мяне, да мяне кіруйце...

Тыя асцярожненька падаліся да свайго старэйшага.

— Што, вам працы нестае?— пагрозліва запытаўся той.

— Хапае, хапае,— азваліся найбольш палахлівыя.

— Дык чаго вы на двары купіцеся?

— Ды...

— Адказвайце хутчэй, а то зараз жа загадаю накіраваць вас на стайню!

— Справа ў тым, што знайшлі паселішча язычнікаў, якія па-ранейшаму пакланяюцца свайму ідалу, не прызнаюць нашага Бога,— пачаў нехта з найбольш адданых служак ігумена.

— Што? Язычнікі? І далёка?

— Ды не, пад самым амаль бокам, але месца глухое і непралазнае...

— Пралезем!

У хуткім часе вялікі атрад манахаў-вершнікаў выехаў з варот манастыра і на чале з ігуменам пакіраваў туды, дзе жылі прыхільнікі старой веры. Вёў атрад манах, якому цудам удалося натрапіць на само капішча.

Пад вечар, калі сонца ўжо села за верхавіны высачэзных дрэваў, манахі заселі ў засадзе. Неўзабаве на капішча сталі збірацца жыхары невялічкага паселішча, каб пакланіцца свайму драўлянаму Богу. Толь-

кі ўсе прыйшлі і паселі, як раптоўна затрашчала кустоўе, загаманілі людзі.

— Што гэта вы тут робіце, людзі добрыя?— запытаўся ігумен, позірк якога зараз нагадваў позірк316 гругана, які адчувае блізкую спажыву.

Сагнаныя ў натоўп вяскоўцы маўчалі. Толькі, нібы прадчуваючы небяспеку, захліпалі дзеці, моцна трымаючыся за мацярок.

— Я пытаюся, што вы тут робіце?

— Богу свайму маліцца прыйшлі,— горда ўскінуў галаву стары селянін.

— Дык Бог жа адзіны,— запярэчыў ігумен,— яго трэба ўсім прытрымлівацца.

— У вас свой, а ў нас — свой Бог,— цвёрда адказалі яму з натоўпу.

— Глядзіце, каб не пашкадавалі!— пагрозліва сцяў губы галоўны з манахаў.

— А ты хто такі, каб палохаць?

Дык загадаў ігумен за тое, што вяскоўцы адмовіліся пакланяцца новаму Богу, спаліць усіх тых людзей. Не паглядзеў, што сярод іх былі старыя і малыя. Усіх паеў агонь, толькі чуліся з яго пашчы праклёны і стогны паміраючых у пакутлівых муках сялян.

Вярнуліся ў манастыр манахі і паляглі спаць, але ноччу большасці з іх прысніўся дзіўны сон — з'явіўся ў небе абраз Прачыстай Богамаці, якая папярэдзіла, каб выбіраліся адсюль, бо ім за іхняе злачынства не будзе яе спачування і дапамогі.

Раніцай некаторых з манахаў недалічыліся. Яны паўцякалі. Ігумен, пырскаючы слінай, пагражаў усіх пералавіць і перавешаць. Але не паспеў здзейсніць задуманае — наступнай ноччу манастыр праваліўся скрозь зямлю. На яго месцы ўтварылася не надта вялікае, затое глыбокае возера.

Людзі гавораць, што ў летнія дні, калі стаіць добрае надвор'е, з глыбіні возера чуваць сумныя ўдары званоў. Заціхнуць званы — пачынаецца царкоўнае пянне, а за ім... стогны і крыкі многіх людзей. Летам таму, што манастыр нібыта ў гэтую часіну і праваліўся.

Доўга баяліся тубыльцы сяліцца ля возера, ды з цягам часоў ці то забыліся, ці то пасмялелі, але сталі будаваць хаціны.

Тыя манахі, якія паўцякалі перад страшнай ноччу, заснавалі новы, Лядскі манастыр, дзе ўсё вялося па справядлівых парадках.

Паселішча, якое ўзнікла на месцы старога манастыра, местачкоўцы назвалі Ігуменам. Можа, у памяць пра таго, добрага ігумена, а можа, наадварот, каб не забыцца, што ёсць і благія манахі. Хто ж яго ўведае? Гэта ўжо пазней у Чэрвень перайменавалі.

## СМІЛАВІЧЫ

Ото жылі на белым свеце два браты: бедны і багаты. Нічыпар ды Фёдар. Багатаму добра — усё ў яго ёсць, а беднаму цяжкавата даводзілася. Няма збожжа, не хапае яго і да сярэдзіны зімы, не тое што да вясны. Галадае сам, галадаюць жонка і дзеці, таму нічога іншага не заставалася, як прыйсці да багатага, да Фёдара значыцца, і прасіцца:

— Братачка міленькі, злітуйся. Дай крыху збожжа, бо не працягнем мы да будучага ўраджаю. Уся сям'я мая вымра. Ніхто, акрамя цябе, не дапаможа, не працягне руку ў цяжкую хвіліну. Не адмаўляй, братка...

Упадзе нават на калені. І гэта перад родным братам! Вось якія яны бываюць!

Той вочы закоціць і не глядзіць спачатку. Які яму інтарэс, і ці можа зразумець галоднага той, хто ні разу сам не прасіў, не прыніжаўся? Пакрывіцца, паздзекуецца, але крыху дасць. Праўда, да новага хлеба. Добра, калі яшчэ не накажа болей аддаць, чым узяў. Нічыпар прыйдзе дамоў, ногі-рукі калоцяцца ад голаду ды ад сораму. Але што той сорам, калі малыя плачуць і на вачах пухнуць. Што той сорам, калі жонка ўжо месяц амаль падняцца на ногі не можа.

Паелі тое, што Фёдар даў, і зноў пуста на стале. Няма нічога. Зноў старая музыка ўсчалася. Трэба нешта рабіць. Пахадзіў гаспадар па хаціне, пахадзіў і пакіраваў да багатага. Пастукаўся ў дзверы і зайшоў.

— Ну, што ўжо на гэты раз цябе прывяло да мяне?

— Усё тое ж, братка. Есці няма чаго. Хоць бы скарынка якая... Дай крышку, га...

Узарваўся багаты:

— Дакуль ты будзеш хадзіць? Павыколвай вочы, надзень дзве торбы і сядзь на перакрыжаванні, ля крыжа, ці ля царквы... Вось табе людзі і падаваць будуць. Вось і дармавы хлеб сам у кішэню палезе...

— Але, можа, на наступны год у мяне збожжа зародзіць, як жа яго сляпы прыбіраць буду? У мяне ж і

дзеткі яшчэ зусім малыя, хто іх на ногі паставіць?..

— Ясна... Тады выкалі адно вока, і я адразу загадаю парабкам цэлых восем мяхоў зерня табе насыпаць. Глядзі, болей паўтараць не буду, і ўпрошваць таксама. Твае дзеці галадаюць, а не мае.

Падумаў Нічыпар і гаворыць:

— Раз ужо такія ўмовы, то што мне застаецца, як не пагадзіцца... Усё роўна нельга дамоў з пустымі рукамі вяртацца. Згодны...

Узяў Фёдар шыла і свайму роднаму брату вока выкалаў, а потым загадаў парабкам насыпаць восем мяхоў зерня і адвезці іх да падвор'я беднага.

Хапіла збожжа якраз да пачатку вясны. Але ж на вуліцы яшчэ снег ляжаў, завеі здараліся. Таму зноў пайшоў Нічыпар да Фёдара:

— Братка, выручай. Зноў няма чаго есці.

— Дык я ж табе гэтулькі збожжа тады аддаў! Куды ты яго падзеў?

— Паелі ўсё, нічога не засталося.

— Ну і ну...

— Выруч і на гэты раз.

— Выручыць-то выручу, але ты і другое вока выкалі.

— Згодны, бо нічога іншага мне рабіць не застаецца. Толькі скажы, каб мяне дамоў завялі, як аслепну.

— Гэта няцяжка.

Выкалаў багаты беднаму і другое вока, а заплаціў за гэта ўжо толькі тры мяхі збожжа. Сляпы ж усё роўна нічога не бачыць. Загадаў Фёдар парабкам, каб завезлі і мяхі, і сляпога дамоў. Тыя загад выканалі. Прайшло колькі часу — зноў у бедных няма чаго есці. Тады ўжо Нічыпар паклікаў да сябе жонку і кажа ёй:

— Слухай, Тэкля (так яе звалі), пашый мне дзве торбы, каб крыж-накрыж на плечы павесіць, ды адвядзі да крыжа, што на дарозе стаіць. Я там сяду і буду ў добрых людзей хлеба-солі прасіць, каб неяк сям'ю пракарміць.

Тая зазлавала надта за тое, што муж павыколваў вочы, і, гнеўна паблісквhouseholds вачыма, адвяла сляпога туды, куды ён прасіў. Пасадзіла, а калі павярнулася, каб назад ісці, то прамовіла:

— Як сабе, Нічыпарка, хочаш, а я да цябе болей не пайду. Сядзі сабе тут... Вочы з-за глупства страціў — і сям'ю таксама.

Заплакаў муж, але побач ужо нікога не было. Доў-

га сядзеў там сляпы. Не адну ночку пераначаваў на халоднай зямлі, не адзін раз яго дожджык мачыў, а сонейка высушвала, але ні разу ні жонка, ні дзеці не наведаліся.

Аднаго разу, на самым ужо змярканні, а летні ж дзень доўгі, амаль не канчаецца, прысніўся Нічыпару дзіўны сон. Ён потым і не верыў, што сон такім можа быць. Вось бачыць сляпы, што прыляцелі тры лебедзі і селі непадалёку ад яго. Самае цікавае — што яны размаўлялі гэтаксама, як і людзі. Чалавек усё разумеў, бо чуваць было добра.

Адна з птушак і кажа ціхенька:

— Захварэла ў нашага бацькі-цара вельмі моцна адзіная дачка. Памірае, бедалага, а такая ласкавая і спагадлівая была, што не дай Божа. Варажбіты гавораць, што ў яе ў грудзях нейкая страшная змяя жыве і не дае ёй спакою. Вось каб падпільнаваць тую гадаўку ды зварыць у свежым малацэ, а потым даць хворай выпіць той узвар, дык немач і прайшла б адразу...

Нічыпар спіць, але ўсё чуе і запамінае.

Другі лебедзь прамовіў:

— А ў нашым краі яшчэ большая, дарагія мае, бяда. Надарылася страшэнная засуха. Людзі па тыдні вады не п'юць. Але я ведаю, што ёсць такі камень, з-пад якога, калі скрануць яго з месца, заб'е магутная крыніца, і ўсе нап'юцца з яе, усё навокал пазелянее. Ды толькі няма такога чалавека, які б схітрыўся зрабіць гэта.

Павярнуўся той лебедзь бокам і паказаў сваім таварышам, як зрушыць камень, бо ён жа надта вялікі і цяжкі.

Нічыпар дрэмле, але паспеў дакладна запамятаць, як трэба ўсё зрабіць.

Трэцяя птушка не змоўчала і таксама сказала:

— І ў нас бяда вялікая і нечуваная ёсць. Вы, браточкі, да такога і не дадумаецеся. Родны брат свайму малодшаму вочы шылам павыколваў.

— За што?— не вытрымалі тыя.

— Можна сказаць — за кавалак хлеба. Той небарака не ведае, што ўсяго крокаў за дзесяць ад яго, убаку, цячэ крынічка. Каб ён толькі падышоў да яе і чыстай хусцінкай, намочанай ў вадзе, працёр сабе вочы, дык стаў бы адразу відушчым. Усё на свае месцы вярнулася б...

Пагаманілі птушкі яшчэ колькі часу і паляцелі

некуды па сваіх справах, а Нічыпар тым часам якраз і прачнуўся. Ляжыць і не можа дайсці адразу, ці то яму такое падалося, ці то на самай справе было.

А ўжо сонца стала прыпякаць. Людзі па дарозе паціху пасунуліся. Тады ўскінуўся сляпы і давай побач з сабою крынічку з цудоўнай вадою шукаць. Знайшоў. Намачыў анучку і пацёр свае сляпыя вочы, ды тут такі цуд здарыўся — стаў бачыць, як і раней. Сядзіць і разважае, як жа далей быць: ці дамоў вяртацца, ці ў свет куды падацца. Другое падалося яму больш спрыяльным, і вырашыў ісці ў далёкую краіну, каб там паспрабаваць вылечыць паміраючую царэўну і неяк хоць крыху ўзбагаціцца, каб сям'я больш не бедавала. Азірнуўся на родныя мясціны і пакрочыў Нічыпар да царскага палаца. Доўга ішоў ці не, але нарэшце прыджгаў. Ля варот яго варта суровая спыняе, не прапускае далей, пытаецца, што ён тут забыўся. Пакуль гаманілі ды спрачаліся, то чалавек супакоіўся і адказвае:

— Бяжыце хутчэй ды свайму цару скажыце, што прыйшоў чалавек, які дапаможа ягонай дачцэ. Не марудзьце, а то павярнуся і назад пайду... Мне асаблівай патрэбы ў гэтым няма.

Варта кінулася да цара. Хвілін праз колькі той сам прыляцеў да Нічыпара:

— Ты, кажуць, чалавеча, пахваляўся, што маю дачку вылечыць можаш?

— Так, бацюхна-цар,— адказвае Нічыпар,— магу.

Цар глядзіць на вяскоўца і думае: «Беднавата апрануты, у лапцях лыкавых, світка парваная... У мяне ўсялякіх вучоных дактароў мноства перабывала, але дапамагчы не змаглі, а тут нейкі селянін... Хай і ён паспрабуе... Не атрымаецца — загадаю бізунамі да самай хаціны гнаць, каб ведаў, як пахваляцца...» Потым кажа ўголас:

— Пайшлі, правяду цябе да хворай дачкі.

Зайшлі ў палац. Падышлі да пакоя, дзе царэўна ляжала. Там народу навокал, што не прабіцца, і ўсе нешта раяць, як вылечыць ды што даваць піць ці есці. Тады Нічыпар і мовіў, да цара звяртаючыся:

— Загадайце ўсім выйсці прэч, каб не перашкаджалі і не заміналі мне, бо я ў такім тлуме працаваць не змагу.

Цар толькі глянуў сваім строгім вокам, дык усе і пабеглі прэч.

Сеў Нічыпар на зэдлік, азірнуўся і слугу паклікаў:

— Мне трэба свежае малако, і запаліце печ, каб усё было напагатове...

Зноў сеў ціхенька на зэдлік і пачаў пільна ўглядацца ў тое, што ў пакоі адбывалася. Ведаў жа з падслуханай размовы — зараз павінна змяя з'явіцца, і яе трэба будзе забіць.

Сядзіць гадзіну, другую, спаць ужо захацелася, галава на грудзі хіліцца, але стараецца не заснуць, бо галаву страціць тады можна. Дзесьці на самым світанні пачуў ён сыканне і шыпенне і заўважыў вялізную змяю, якая паўзла да грудзей дзяўчыны, каб ссаць іх. Падкраўся Нічыпар незаўважна і як лупянуў змяюку па галаве, то тут ёй і канец быў. Ухапіў за хвост і паімчаў да слугі, каб да палаючай печы яго хутчэй вёў. Зварыў там незвычайнае варыва, астудзіў і панёс хворай піць. Што ж вы думаеце? Толькі шклянку адну царэўна выпіла — адразу вочы адкрыла, а як адкрыла, дык і вымавіла:

— Ой, як жа доўга я спала... Хто ж мяне выратаваў?..

— Я гэта,— сарамліва мовіў Нічыпар.

Дзякуе яму дзяўчына і есці-піць просіць, бо галодная ж гэтулькі часу была. Нясуць ёй падмацавацца, і вяскоўца, адпаведна, не забываюць. Ядуць яны за адным сталом, і царэўна на вачах чырванець пачынае, адыходзіць ад хваробы, значыцца. Цар нарадавацца не можа. За такі кароткі тэрмін нейкі селянін ягоную дачку ад смерці выратаваў! Не адпускае Нічыпара дахаты, упрошвае пабыць яшчэ крыху:

— Ты ж маю дачку выратаваў... Ты зараз мой самы дарагі госць...

Але ж у гасцях добра, а дома — лепей. Пачаў Нічыпар дамоў збірацца, дык цар і кажа:

— Раз ты мне так дапамог, то прасі, што хочаш, Нічыпар, любую просьбу тваю выканаю.

— Ды мне, бацюшка-цар, многа не трэба. Каб толькі мог я сям'ю сваю пракарміць ды нястачы ні ў чым не ведаў, а то надакучыла ўжо такое жыццё...

— Столькі тае бяды,— адказвае гаспадар,— зараз усё зробім.

Выскачыў сам на ганак ды як загарлае:

— Дзе мой галоўны слуга? Сюды яго!

Прыбягае слуга, у ногі валіцца, а цар яго падымае і мовіць:

— Давай Нічыпара ў дарогу збірай. Нічога не шкадуй, сам ведаеш, як ён мне дапамог...

Калі селянін выйшаў у двор, то яго выправаджвалі нібы самага вяльможнага госця. Гаспадар навязаў яму ўсялякіх прысмакаў, вопраткі — цэлы абоз, золата наклаў цэлых тры вазы і парабкаў чалавек колькі даў. Нічыпар паспрабаваў было ў ногі цару ўпасці за такую шчырасць, але той сам ледзьве не паваліўся, гэтак рады быў, што дачку чалавек падарожны ажывіў. Царэўна маладая на шыі ў вяскоўца павісла і ягоным дзеткам ды жонцы асобна падарункі сабрала.

Можа, з месяц дабіраўся Нічыпар дамоў. Стаміўся, надакучыла страшэнна. Гэта калі нічога няма, то шукаеш якога лепшага месца, а калі ўсё ёсць, то рабіць жа асабліва няма чаго. Нарэшце роднае падвор'е ўбачыў, ажно праслязіўся. Падумалася адразу: «Як там дзеці ды жонка?» І крыўды ўсе адпалі, нібы іх і не было. Спыніліся насупраць пахіленай хаціны, а жонка выскачыла ды ўглядаецца, здагадацца не можа, хто такі пад'ехаў. Раней жа ля іхняга падвор'я падарожныя ніколі не спыняліся, бо самім не было чаго есці.

— Няўжо мяне не пазнала?— запытаўся Нічыпар.

Здзівілася гаспадыня, адказаць нічога не можа. Тады муж і гаворыць далей:

— Вось што, пакідаю я табе ўсё гэтае дабро, вопратку, ежу і каштоўнасці, парабкаў працавітых таксама, а сам далей падамся.

— Куды?— зацікавілася дурная баба.

— Па справе трэба,— не ўдаючыся ў падрабязнасці, сказаў Нічыпар.

Пайшоў чалавек далей. Пакіраваў у тую зямлю, дзе людзі даўным-даўно не ведалі, як здабыць ваду, нават для самага неабходнага. Прыходзіць і звяртаецца да першага сустрэчнага:

— Ці нельга мне ў вас, шаноўны, вады напіцца?

— Эх, чалавеча, ці пашкадаваў бы я табе яе? Але ж нельга здабыць нідзе. Дзеці мруць ад гэтага, ураджаю ніякага няма...

— Я мог бы вам дапамагчы, калі вы не супраць...

Пабег тады тубылец да свайго цара і пра ўсё распавёў. Хвілін праз колькі падляцела ахова, і Нічыпара павялі ў палац.

— Калі ты, падарожны, дапаможаш нам у нашым горы, то я табе ўсё, што ні папросіш, аддам. Калі не, то пакінеш тут назаўсёды сваю галаву, так і ведай.

Нічыпару не было куды адступаць, сам жа напрасіўся дапамагчы. Выйшаў ён з царскага палаца і пайшоў па землях таго царства. А сам цар са шматлікай аховай за ім едзе, хочацца яму паглядзець, як селянін ваду адшукваць будзе. Доўга Нічыпару не шанцавала, але ўсё ж неяк напароўся на той запаветны камень. Сеў ля яго і прыгадвае, як трэба яго пакручваць, каб з месца зрушыць ды каб вада з-пад камянюкі забіла. Прыгадаў і давай круціцца вакол каменя, спрабуючы ўхапіцца, а цар са світай рагочуць:

— Глядзі, каб штаны не спалі. Асілак... Ды тут тысяча чалавек нічога не зробяць, а ён адзін упёрся.

Але Нічыпар неяк ухапіўся і зрабіў усё так, як чуў. Камень пачаў паціху рухацца ўбок. Цар з прыбліжанымі ажно раты паразяўлялі. Дзіва такога ніколі не бачылі. Каб такі камень і адзін чалавек зрушыў — ніколі не чулі. А вясковец напружыўся і адпіхнуў камень зусім. Пакацілася агромністая глыба з гары, а з-пад яе забіла крыніца. Людзі, якія на працягу некалькіх гадоў не бачылі вады, з шумам і крыкамі наляцелі на яе. Кожны імкнуўся напіцца. Напіцца як мага болей, каб прагнаць смагу. Калі ўсе ажно патаўсцелі ад выпітай вады, цар аддыхаўся і прамовіў:

— Чалавеча, прасі, што толькі пажадаеш... Усё, як і абяцаў, выканаю. Аддам без адзінай агаворкі.

— Ды мне, цар-бацюхна, нічога такога і не трэба. Вось каб толькі есці чаго ды пражыць потым можна было без асаблівых хваляванняў, то я і задаволены застаўся б. Болей мне нічога не трэба.

Цар тут жа загадаў выканаць просьбу Нічыпара. Селянін аглядзеў абоз з падарункамі, цэлых два вазы з залатымі манетамі і трох парабкаў, якіх яму назаўсёды падараваў мясцовы цар, падзякаваў гаспадару і рушыў у дарогу да роднай хаты.

Можа, праз месяц зноў чалавек прывёз сваёй жонцы ўсялякага багацця і застаўся жыць з дзецьмі ды са сваёй Тэкляй. Жывуць сабе, гора ніякага не ведаюць.

Але ж побач з імі па-ранейшаму жыў багаты брат — Фёдар. Як пабачыў ён, што ў Нічыпара ўсё з'явілася, дык сон страціў, усё хадзіў і дапытваўся:

— Скажы мне, браце, як гэта табе ўдалося так хутка разжыцца? Я з года ў год па капейцы збіраў, а ты за нейкія лічаныя месяцы вунь колькі каштоўнасцей, ежы, вопраткі ды золата прывёз. Не мог жа ты знайсці гэткі скарб...

Нічыпар спачатку трымаўся, не гаварыў нічога, усё аднекваўся, але потым не змаўчаў і прамовіў:

— Ды тады, як ты мне вочы выкалаў, браце, усё гэта і пачалося. З таго самага моманту. Мне пашчасціла, і я стаў багатым...

— Дык што мне трэба рабіць, Нічыпарка?— не адставаў Фёдар.

— Мабыць, тое, што і я тады, калі да цябе прыходзіў зерня прасіць...

— Вочы выкалаць?

— Ага, і пад крыж з торбамі ісці, то там табе і панясуць усялякага багацця...

— Вось дзякуй табе, браце,— толькі і паспеў вымавіць багаты і выбег з хаціны.

Заляцеў Фёдар дамоў і кажа на жонку:

— Хутчэй выкалі мне вочы, пашый торбы, накінь на мяне і завядзі пад крыжык, што на перакрыжаванні дарог. Я там сяду ў людзей багацця ўсялякага прасіць. Буду доўга сядзець і болей, чым Нічыпар, назбіраю. Пабачыш.

Так і зрабілі. Пасадзіла яго жонка пад крыжыкам, а сама дахаты пакіравала. Але ж людзі пазнавалі багатага і нічога яму не давалі, бо ён ім ніколі нічога не даваў. Так і сядзеў Фёдар некалькі дзён запар, пакуль не сканаў. Хто казаў, што ад злосці, а хто, што ад сквапнасці.

Калі Нічыпарава жонка даведалася, што ён распавёў Фёдару пра тое, як узбагаціўся, то пачала штодня сварыцца на мужа і па-рознаму яго лаяць:

— Як табе не сорамна! Як гэта ты свайму злыдню, які цябе зроку пазбавіў, такую таямніцу выдаў? Га? Ці ёсць у цябе галава на плячах?.. Эх, ты, не чалавек ты, а смілга нейкая...

— А што гэта за смілга?— усхапіўся Нічыпар.

— Мяккі занадта характарам.

— Дык то не страшна...

— Табе не страшна, мне ж усё роўна — смілга, дый годзе!

Так з таго часу і засталося. Пытаюцца людзі:

— Дзе жывеш?

— А ў Смілгавічах.

Потым крыху назва перайначылася, і засталіся па-цяперашняму — Смілавічы.

## ВАЛЕВАЧЫ

Тут здарыўся некалі ў даўнія гады дзіўны выпадак.

Жыў у нас чалавек па прозвішчы Волевач. Чаму ў яго было такое прозвішча, цяжка сказаць, але гаманілі, што, як надумае што зрабіць — нічым яго не спалохаеш, не спыніш і не адгаворыш. Упрэцца, як той слуп, і хоць ты яго пад корань ссячы — не пераканаеш у адваротным. Але аднаго разу і яго прымусілі змяніць уласны пункт гледжання. Здарылася ўсё вось як.

У адной хаціне жыў Волевач з сям'ёю, а побач (самі ведаеце, тады на хутарах людзі сядзелі, то, можа, з нейкіх паўвярсты і было) жыла суседка, усе казалі — жанчына з мужчынскай хваткай. У яе чалавек нічога не значыў і ніякага права голасу не меў. Як прыкрыкне на яго, як гляне грозна, то той адразу і бяжыць выконваць, асабліва не задумваючыся, атрымаецца нешта з гэтай справы ці не. Паспрабуй не выканай — галодны цэлы тыдзень будзеш і начаваць давядзецца не ў хаце, а дзе-небудзь на сене ці ўвогуле пад адкрытым небам.

Аднаго разу надумала яна нешта і гарлае:

— Мужу, дзе гэта ты захаваўся? Зноў спіш, ваўкалак сівалобы! Бягом сюды!

Той прадраў вочы, зірнуў навокал, бачыць — яшчэ і сонейка не зайграла, толькі, здаецца, і заплюшчыў вочы, бо камары ўсё гудзелі-бзыкалі над тварам, а ўжо трэба ляцець. Прыджгаў і стаў перад гаспадыняй. А тая і мовіць, гледзячы прама ў твар:

— Што ж гэта робіцца ў белым свеце?

— Што?— не зразумеў чалавек.

— Гэты скнара Волевач амаль нічога не робіць, а бачыш, як багата жыве. Таму што скнара.

— Ты ж не лепей,— не вытрымаў муж і адразу атрымаў такую поўху, што конь і той пахіснуўся б. Таму адразу і змоўк, нізка нахіліў галаву.

— Дык я і гавару: гэты скнара Волевач надта багата жыве. Дзе ён толькі бярэ гэтае багацце? Поля ж многа не мае, ды не вельмі яно ўрадлівае... А сам жа заўважаеш...

— Таму што ні з кім не сварыцца, а працуе, не разгінаючыся. Усё паспявае ў час зрабіць, нічога на полі не кідае, нічога ў яго не рассыпаецца, не гніе... Вось у чым сакрэт яго заможнасці.

— Нешта не тое ты гаворыш. Не каб мяне пад-

трымаць, дык наадварот, супраць усё гаворыш. Вось што я прапанаваць хачу. Трэба неяк зрабіць гэтак, каб усё яго багацце прахам пайшло.

— Навошта?

— Маўчы, дурань. Слухай мяне, то ўсё добра будзе. Заўтра я з ім, з Волевачам, схаплюся сварыцца, а ты каб дапамог мне абавязкова, астатняе сама ўжо зраблю, раз ты такі сарамлівы.

Шморгнуў муж носам і пайшоў да гумна дасыпаць. Ды дзе ж ты там заснеш. Ляжыць, бедалага, і думае, як жа гэта жонцы дапамагаць давядзецца?

Не паспела сонца прамяні свае распусціць, а жонка зноў верашчыць:

— Дзе ты там, лайдача? Пайшлі на нашу ніву, паглядзім, ці не ўкраў той злыдзень чаго...

Зразумеў муж адразу і хто такі злыдзень, і што збіралася прыплясці яму злая жанчына, але пайшоў.

Волевач нават і не здагадваўся, што задумала супраць яго суседка. Устаў спакойна, як і заўсёды, і, параіўшыся з жонкай, сказаў, што паедзе на далёкую ніву, паглядзіць, ці хутка трэба жаць жыта. Запрог коніка і паехаў. Не ведаў жа ён, што з-за плоту за ім пільнавалі вочы другой жанчыны.

Прыехаў сабе гаспадар на ніву, пахадзіў, пагледзеў з усіх бакоў. Паспела збажына, трэба ўжо жаць. Радуецца вока хлебароба, бо ўраджай чакаецца добры, вось каб толькі надвор'е вытрымала. Стаіць у жыце Волевач і каласкі рукамі ласкава пагладжвае. Задумаўся пра нешта сваё, патаемнае, ажно чуе зычны голас:

— Што ж гэта ты, злодзей, нарабіў?!

Здрыгануўся вясковец, зразумець не можа, на каго крычаць і да каго з такімі абразлівымі словамі звяртаюцца. Потым толькі здагадаўся, што побач жа нікога іншага няма, значыцца, да яго звяртаюцца, яго лаюць. Азірнуўся і заўважыў суседку.

— Чаго гэта ты так раскрычалася? Што ўжо табе тут не падабаецца? Не каб павіталася, як іншыя людзі, заўсёды кідаешся з лаянкай. Што табе ўжо тут пашкодзіла?

— Ты яшчэ і пытаешся? А ведаеш, колькі ты майго поля сваім жытам засеяў?

— Я?.. Твайго?..

— Ты. Майго,— суседка набліжалася, і здавалася, што праз імгненне ўчэпіцца сваімі рукамі ў валасы Волевача.

— Што ты такое кажаш? Ды я... Я ніколі чужога рукою не крануў, не тое каб поле асмеліўся засяваць... Нешта ты пераблытала ці са злосці кажаш абы-што.

— Ды ў мяне сведкі ёсць, якія бачылі, як ты маё поле сваім зернем засяваў.

— Сведкі?..

— Так, сведкі.

— Як вазьму зараз даўбешку добрую, то і табе, і тваім сведкам такую бубну на спінах выб'ю, што вы мяне за тры вярсты абходзіць станеце,— Волевач крыху ачомаўся і спрабаваў адстойваць сваю праўду. Але суседка нібы і не чула ягоных слоў, пагражала далей:

— Пачнеш жаць, то я свае снапочкі назад пазабіраю. Пабачыш, я што сказала — тое і зраблю. Бачыш ты на яго. Скажы, мужу,— звярнулася да свайго чалавека, які маўкліва стаяў за яе спінаю.

— Але...— толькі і сказаў той ды зноў схаваўся за спіну.

Прайшло колькі часу. Супакоіўся Волевач і забыўся пра пагрозы злой жанчыны, але тая ні на хвіліну не забывалася пра сваё абяцанне — пусціць па свеце заможнага гаспадара. Высачыла, як той з жонкай ды дзецьмі поле ў копы паставіў, і за ноч сабе пяць коп перацягнула дамоў. Прыйшоў раніцай Волевач на ніву і жахнуўся — недалічыўся коп. Потым толькі дацяміў, хто гэта зрабіў, і адразу да суседкі кінуўся, каб назад аддала збожжа. Але тая і на падвор'е яго не пусціла, толькі з-за плоту дулямі частавала ды пасмейвалася:

— Што, дабіўся свайго? Ага, ідзі зараз скардзіся каму хочаш. Дапамогуць... Маё поле — маё і збожжа, а што ты засеяў, то не я, а ты сам вінаваты.

Ледзьве не заплакаў ад абразы Волевач, але з жанчынай біцца не будзеш, якая б яна дурная і злосная ні была. Прыйшоў дамоў, а там яшчэ навіна — тры каровы малака ў адзін дзень не далі. Жонка галосіць, нібы па нябожчыку. Гэткія добрыя кароўкі, а малака ані кроплі няма. Пасядзеў гаспадар, пасядзеў і вырашыў схадзіць да мясцовага варажбіта. Добры быў чалавек, заўсёды вяскоўцам у бядзе, у горы дапамагаў.

Прыджгаў да старога, а той яго сустракае пытаннем:

— Што, прыйшоў скардзіцца на нахабніцу суседку?

Волевач толькі рот разявіў ад здзіўлення, адкуль,

маўляў, стары пра гэта ведае? Але дзед далей гаварыў, нібы сам з сабою раіўся.

— Пойдзеш дамоў і не кладзіся спаць, а сядзь ціхенька непадалёку ад каровак і сачы за тым, ці не прыйдзе хто. Як толькі прыйдзе, то лупі, колькі сілы мець будзеш, не шкадуй.

— А чым біць?

— Возьмеш, Волевач, дома абрус, пасвянчоны ў царкве, і пакладзеш пад карову. Толькі каб ён быў не вельмі белы, бо нячыстая сіла, якая круціцца вакол тваёй гаспадаркі, можа заўважыць. Зразумеў?..

— Зразумеў.

Прыбег Волевач дамоў, зрабіў усё так, як дзед-варажбіт наказаў, і стаў чакаць. І што ж вы думаеце? Недзе за поўнач чуе: скача нешта. Прыглядзеўся, а гэта вялікая чорная жаба. Прымасцілася пад каровай і ўжо збіраецца малако ссаць, але гаспадар ухапіў даўбешку і як пачаў яе пярэсціць — толькі водгулле па хляве пайшло. Біў да таго часу, пакуль не стаміўся сам. Сеў адпачыць, а жаба акрыяла і паквокала далей, як ні ў чым і не бывала. З вуліцы ўжо пачуў Волевач такі жахлівы крык, што ўсхапіўся і выбег з хлява. Здалёку да яго неслася:

— Не думай, што табе гэта дарма пройдзе! Я табе адпомшчу! З-пад зямлі дастану, але сваё слова стрымаю! Так і ведай!

Гаспадар стаяў ля хлява і слухаў праклёны.

Дачакаўшыся раніцы, Волевач пра ўсё, што адбылося ноччу, расказаў сваёй гаспадыні. Тая выслухала, а потым заплакала і стала прасіць.

— Паехалі мы, мужу, куды-небудзь у іншае месца, бо не дасць гэтая гадаўка нам спакойна жыць. Зямля многа мае патаемных мясцін, дзе-небудзь ды спынімся, жыць спакойна станем. Паехалі адсюль...

Так яны і паехалі на новае месца. Знайшлі прыгожы куточак, пабудавалі хаціну і сталі жыць. Гадоў праз колькі суседзі ў іх з'явіліся, і паселішча сваё назвалі ад першага жыхара, Волевача. Таму і вёска стала — Валевачы.

## КАЛОДЗЕЖЫ

Было гэта вельмі даўно, калі яшчэ сівыя стагоддзі панавалі. Вёска не тут стаяла, дзе зараз, а крыху ўба-

ку. Зачынаў яе добры чалавек. А здарылася гэта наступным чынам.

Аднаго разу ішоў падарожны. З далёкага краю крочыў, а куды — і сам, можа, не ведаў. Ішоў, куды вочы глядзелі, дый годзе. Пройдзе пару вёрстаў, пагамоніць з людзьмі, калі яны на шляху сустрэліся, і далей кіруе. Многае чалавек пабачыў, а ведаў яшчэ болей. У кожнай мясціне своеасаблівыя абрады і звычаі, адрозніваюцца адзін ад аднаго, а ён жа ўсё гэта на ўласныя вочы бачыў, на свае вушы чуў. Падыдзе звычайна начаваць да вёскі якой ці хутара, зойдзе на падвор'е і просіцца:

— Пусціце пераначаваць падарожнага. Калі можна, то і скарынку хлеба якую дайце, бо з раніцы ў роце нават макавага зерня не трымаў. Калі месца няма, дык не бяда, я далей пайду.

Звычайна заўсёды пускалі начаваць і апошнім дзяліліся, а за гэта прасілі, у сваю чаргу:

— Раскажы нам, падарожны, якую гісторыю цікавую ці здарэнне, ты ж гэтулькі часу па свеце белым ходзіш і ведаеш не тое, што мы...

Доўга не прымушаў сябе ўпрошваць падарожны, а, крыху падумаўшы, відаць, згадаўшы, пачынаў гаварыць. Людзі сядзяць, дыхнуць баяцца, слухаюць.

Аднаго разу ішоў ён у незнаёмым краі. Неяк ці то з дарогі, вядомай яму, збіўся, ці то вырашыў праведаць і гэтую мясціну, але, як потым высветлілася, ні разу тут яшчэ да гэтага дня не быў. Лес глухі, непралазны навокал шуміць, звяры лясныя насустрач выбягаюць ды зубаміляскочуць — палохаюць. Чалавек, Богу памаліўшыся, на іх увагі не звяртае, крочыць далей. Калі на звяроў пачынаеш зважаць, то яны спецыяльна бліжэй пасоўваюцца і накідваюцца, а так, заўважыўшы абыякавасць, хутка адстаюць.

Ішоў чалавек гэты, ішоў — ніякага населенага пункта, дзе можна было б пераначаваць, не сустракалася. Зусім замаркоціўся. Мала таго, што галодны, дык яшчэ і спаць давядзецца пад елкай ці пад якім іншым дрэвам. Але што ж гэта за сон, калі вачэй самкнуць не давядзецца?

Сунецца падарожны, ажно спатыкаецца — гэтак стаміўся, а ўжо зоркі першыя ў небе засвяціліся. Падумалася яму: «Падыду яшчэ якую вярсту і прылягу, бо болей ужо крочыць сілы нестае. З Божай дапамогай пераначую, а раніцай, хоць і нашча, далей рушу...»

Толькі ён так падумаў, як наперадзе бліснуў агеньчык. Узрадаваўся падарожны, крок прыспешыў, адпачынак хуткі адчуў. Але ж самі ведаеце, што агонь заўсёды адлегласць скрадвае, добра памахаеш, пакуль да той агністай знічкі, што ўдалечыні мігціць, дойдзеш. Так і яму, бедалазе, давялося. Можа, праз гадзіну толькі, а то і болей, выбіўся да вогнішча. Спачатку не падыходзіў блізка, мала хто ў такой глухой мясціне ноччу адпачываць можа. Ліхія людзі ва ўсе стагоддзі вадзіліся. Стаіўся і слухае, ажно чуе:

— Будзем заўтра, хлопцы, у іншай мясціне капаць. Тут далей працаваць нельга. Самі бачыце, капаем, капаем, а выкапаем сажняў на дзесяць у глыбіню, то не вада выступае, а нейкая крывяністая вадкасць. У трох месцах ужо калодзежы капалі, і ўсюды адно. Што б гэта магло азначаць?

— Ніхто табе, братка, мабыць, і не адкажа на гэтае пытанне. Мне ўжо не адзін дзесятак гадоў, але такой з'явы растлумачыць не магу. А нешта ж ёсць...

— Так, людцы, не дакапаемся да вады, не даведаемся і праўды,— выдыхнуў нехта яшчэ.

Запанавала цішыня. Тады падарожны асмялеў, бо зразумеў, хто перад ім, і пайшоў прама да вогнішча. Людзі, заўважыўшы незнаёмага, заварушыліся. Усе глядзелі на чалавека, як на які цуд. Сярод ночы выйшаў з лесу, які цягнецца на дзесяткі вёрстаў.

Падарожны падышоў да іх і павітаўся. Яму адказалі.

— Чуў я, людзі добрыя, вашу гамону пра дзіўную з'яву ў капаемых вамі калодзежах. Не спецыяльна падслухоўваў, а спачатку баяўся падступіцца. Самі ведаеце, розныя сярод ночы сустракаюцца...

— Гэта так,— пагадзіліся тыя, што сядзелі вакол вогнішча.

— Магу вам распавесці, чаму вада чырвоная на паверхні ў гэтых мясцінах з'яўляецца.

— І чаму гэта? Што ж тут такое?— адразу зацікавіліся і бліжэй падаліся да яго далакопы.

— Даўняя надзвычай гісторыя. Слухайце. Чуў яе некалі ад старога падарожнага, з якім разам хадзіў. Ён мне яе распавёў, а так бы і я нічога не знаў.

У той час тут была вялікая і прыгожая вёска. Людзі жылі вясёлыя і працавітыя. Ніякай патрэбы ні ў чым не ведалі. Адзін аднаму дапамагалі, у бядзе сваіх братоў і знаёмых не кідалі. Вечарам, пасля працы, збіра-

ліся, і тады толькі песні разносіліся ў цішыні па наваколлі. Сядзелі усе, і старыя, і малыя. Хто спяваць не жадаў, той слухаў, а старыя найболей пераказвалі адзін аднаму цікавыя гісторыі ці спрачаліся адносна таго, калі пачынаць сеяць поле ці жаць збажыну. Усім, адным словам, праца знаходзілася і занятак па душы. Так і жылі местачкоўцы, гора-бяды не ведалі. Не думалі нават, што і з імі можа прыключыцца якая гісторыя. А яна здарылася, ды такая страшная і бязлітасная, што і пераказаць страшна. І прыйшла нечакана.

Аднаго дня сонца паліла так, што ажно ветрык не дыхаў ад спякоты. Але вяскоўцы ўсё роўна працавалі ў полі, бо нельга было ўпускаць зручнага моманту. Надвор'е хоць і гарачае, але збажыну ўбіраць трэба ў любы час, толькі каб дажджы не пайшлі. Справа ўжо да полудня набліжалася. Местачкоўцы, стому адчуўшы, паглядвалі адзін на аднаго, хто першы пойдзе ў цянёк, каб перакусіць і адпачыць гадзіну якую. Першым ніхто не асмельваўся, каб потым за лайдака не палічылі. Але неяк усё ж рушылі. І тады адразу поле апусцела, толькі пад свежаскладзенымі копамі забялелі кашулі ды хусткі.

Незвычайная цішыня ўсталявалася на ніве. Нават дзеці-немаўляты, якія ляжалі тут у калысках, і тыя не плакалі, нібы баючыся парушыць кароткі адпачынак шчырых працаўнікоў. Звінелі ў небе па-ранейшаму птушкі і стракаталі конікі.

Раптам недзе ад самага краю данёсся адчайны крык:

— Людзі! Людзі! Дапамажыце! Забіваюць!

Сон сам па сабе адышоў. Усе ўсхапіліся на ногі і пачалі ашаломлена азірацца. Не маглі ўцяміць, хто гэта крычыць. Але крык паўтарыўся, і яшчэ больш адчайны:

— Дапамажыце! Забіваюць! Гвалтуюць!

Цяпер ужо ўсе несліся на крык. Мужчыны трымалі ў руках тое, што першае трапілася на вочы. Жанчыны і дзяўчаты джгалі, можа, і самі не ведалі для чаго, бо дапамагчы істотна тым, хто крычаў, не маглі. Ляцелі, нібы маланкі, і ніхто не ведаў, што беглі насустрач сваёй пагібелі. Зразумелі, толькі калі прыджгалі туды, адкуль даносіліся крыкі, і ўбачылі страшную карціну: мужчыны ўжо былі нежывыя, а жанчын і дзяўчат яшчэ гвалтавалі. Тыя ўжо і не адбіваліся — неставала сілы. Навокал былі добраўзброеныя чужынцы. Убачыўшы вяскоўцаў, радасна заўсміхаліся і кінуліся ў бойку.

А што ты супраць узброеных да зубоў манкоў зробіш, калі ў руках маеш толькі драўляныя вілы ды граблі? Паспрабавалі мужчыны і дзецюкі прыкрыць сваімі грудзьмі жанчын і дзяцей, крыкнулі ім:

— Уцякайце да лесу. Пакуль што — мы яшчэ будзем жывыя, а потым яны нас усё роўна параб'юць. Уцякайце.

Пабеглі бедныя назад. Але калі ўжо зусім блізка быў выратавальны лес, ад яго адлучыўся аршак вершнікаў і маўкліва пасунуўся насустрач уцякаючым. Не вытрымала і загарлала нейкая дзяўчына, якую ўжо зваліў на зямлю вораг і рваў на ёй вопратку:

— Дапамажыце, людцы! Дапамажыце!

Чуць гэты крык некаторыя яшчэ чулі, але дапамагчы ўжо нічым не маглі, бо іх саміх напаткаў гэткі ж лёс. Неўзабаве па полі бялелі і чырванелі толькі трупы забітых людзей. Старшы над чужынцамі загадаў:

— Мужчын закапайце ў адну яму, жанчын — у другую, а дзяцей паскідайце ў трэцюю. Глядзіце, каб ніводнага мерцвяка не засталося на полі, каб ніхто пра гэта не даведаўся.

Вершнікі сконіліся і ўзяліся выконваць загад. Гадзін праз колькі зноў усе сядзелі на конях і азіраліся, ці не пакінулі каго, каб сведак не засталося.

Вось таму, мужчынкі, вы, калі капалі, то бачылі не ваду, а кроў тых людзей, што некалі жылі і былі тут пахаваны...

Скончыў сваё апавяданне падарожны. Навокал вогнішча па-ранейшаму панавала цішыня, потым нехта прамовіў:

— Бачыш ты тут прычына якая, а мы і не ведалі...

Тыя далакопы выкапалі сабе студню крыху ўбаку. З цягам часу зямля глыбей увабрала ў сябе кроў нявінна загінуўшых, і тут пачала выступаць чыстая вада. Але назва засталася тая, што пайшла ад трох старых калодзежаў,— Калодзежы.

## ПЕРУНОЎ МОСТ

Такія ўжо некалі тут непралазныя мясціны былі, што і прыгадаць жудасна. Колькі жывёлы ў твані загінула, колькі людзей пакалечылася, а то і жыцця пазбавілася ў смярдзючай багне. Гаварылі, што пры стварэнні Сусвету Бог усіх чарцей у наша балота паскідаў,

тут быў іхні прытулак, акрамя іх, нікому сюды не было дарогі. Калі людзі паўсюдна жыць сталі, то ім спатрэбілася ездзіць ды хадзіць па балотах, якімі б страшнымі яны ні былі. З цягам часу прыстасаваліся неяк і збожжа на лапінках зямлі сеяць, і бульбу садзіць, нават іншую гародніну вырошчваць. Што зробіш, голад не цётка — усяму навучыць.

Усё пачало на свае месцы станавіцца, але ўсё ж нельга было без моста абысціся. Вунь там, дзе цяпер у канаву ваду сабралі, была гіблая дрыгва, ні ўвесну ні ўвосень, як кажуць, ні прайсці ні праехаць. А выхад на стары, як тады яго называлі, Кацярынінскі, тракт з гэтага боку самы кароткі, інакш рабі крук вёрстаў на дзесяць.

Таму задумалі сяляне і выслалі бярвёнамі, засыпалі пяском, каменнем грэблю, частка якой і цяпер яшчэ прыкметна. А на самым багністым месцы пабудавалі сапраўдны, можа, сажняў на сто, мост. Гаварылі, ужо, праўда, потым, што мастоў было цэлых тры, а не адзін, і што ўсе яны цягнуліся асобна, гэта значыцца, ішлі адзін за адным.

Калісьці менавіта тут праходзіла бойкая дарога з Мінска, Пухавіч і да пераправы цераз раку Бярэзіну. Старыя людзі згадвалі, што падчас вайны па нашай дарозе войскі рухаліся: і свае, і чужыя. Хто наступаў, хто адступаў. Як пойдуць атрады вершнікаў ды пяхоты, як пацягнуцца шматвёрстыя абозы, то пару тыдняў усё навокал трашчыць-гамоніць. Здавалася, што і дрэвы абапал дарогі рухаліся — гэтак у местачкоўцаў у вачах усё мільгацела.

А самы першы мост праз гэтую дрыгву-багну праклаў не наш тубылец, не наш селянін, а салдат-чужынец. Здарылася гэта падчас вайны з французамі. Калі чужынцы ўжо дамоў вярталіся, то цяжка вельмі ім даводзілася. Мяркуйце самі: есці не хапала, коней сваіх забівалі ды елі. Халады раннія і лютыя стаялі. Войска не баяздольнае было, салдаты пастаянна паміж сабою біліся, ды ўжо не за каштоўнасці, а за кавалак хлеба ці якой прасмердлай каніны. Мала гэтага — расейскія казакі і кавалерысты на пяты наступалі. Адстрэльвацца пастаянна даводзілася. Таму ўцякалі дамоў па карацейшай дарозе, не глядзелі надта, ці можна па ёй прабрацца ці не, адно толькі — каб пажывіцца чым ды сілы свае зберагчы. Таму і ўпёрся адзін з атрадаў у нашыя балоты. Колькі ворагаў патапілася, ніхто і не

ведае, бо ні на хвіліну не супыняліся і памерлых ды тапельцаў не выцягвалі і не хавалі. І тут падышоў да камандзіра адзін з французаў.

— Я,— кажа,— правяду ўсіх, толькі дайце мне людзей і загадайце, каб яны ўсё выконвалі, што я ім буду гаварыць.

Узрадаваўся той начальнік і адказвае:

— Усіх людзей табе пад каманду аддам, нават сам пайду, толькі б выбрацца з гэтага заклятага балота ды дамоў, да жонкі, да дзяцей, патрапіць...

— Патрапім,— мовіў салдат і зноў паўтарыў:— Каб толькі ўсё выконвалі безагаворачна.

— Я ад свайго слова, салдат, не адмаўляюся,— перабіў яго камандзір.

Закіпела праца. Зарухаліся ўсе, нават параненыя, хворыя і афіцэры цягалі бярвенні, seклі кустоўе, выдзёўбвалі ў замерзлай зямлі ямкі. Здавалася, што ў людзей з'явілася дадатковая сіла, бо да гэтага яны ледзьве рухаліся. Грэбля доўжылася на вачах. Коні болей не правальваліся, цягнулі цяжкія фурманкі. Салдаты, крыху адпачыўшы, зноў браліся за працу, бо самі бачылі плён толькі што зробленага. Цяпер у кожнага была ўжо не мара, а канкрэтная надзея выбрацца. Чужынцы ведалі, што для гэтага трэба яшчэ многа і самаaддана працаваць, і стараліся. Самым цяжкім выпрабаваннем стала ўзвядзенне даўжэзнага моста, але і яго збудавалі за незвычайна кароткі тэрмін, адкрыўшы тым самым дарогу далей.

Хітрага і кемлівага таго салдата звалі на французскі манер — Пюры. Можа, прозвішча такое было. Але мясцовыя жыхары з цягам часу перайначылі гэтае слова і сталі вымаўляць яго на свой лад — Пярун. А ўжо ад моста і вёску (з яе, дарэчы, заўсёды прызначаўся даглядчык моста і грэблі) назвалі Перуноў Мост.

Ёсць яшчэ адно паданне, дзе зусім па-іншаму тлумачыцца ўзнікненне вёскі і паходжанне самой назвы паселішча.

Гіблай была дрыгва, яна аддзяляла некалькі вёсак ад мястэчка і тракту. Абрыдла кожны раз кладкі насцілаць, і вырашылі людзі збудаваць цераз балаціну мост. Узяліся ўсёй талакой і зрабілі справу — навялі мост. Толькі прастаяў нядоўга, усяго з месяц, бо аднойчы ноччу, у навальніцу, раптам загарэўся ад удару маланкі. Праз год на тым самым месцы збудавалі

другі мост. Ды толькі і з ім здарылася тое ж самае — падпаліў Пярун. Тады ўжо людзі і рукі апусцілі, маўляў, гэта кара нябесная, не іначай. Не ведалі, як далей жыць, бо без моста ніяк нельга, але і ўзводзіць новы не пачыналі — палохаліся, што праз некаторы час зноў згарыць. Раіліся, меркавалі паміж сабою, але да пагаднення не прыходзілі. Можа, так бы і пакутавалі, пакуль цуд не здарыўся — аднаму вяскоўцу прыснілася ноччу Божая Маці, якая выразна вымавіла:

— Скажы сваім суседзям, каб мост будавалі да Вялікадня, тады яго ніхто не парушыць і не спаліць. У іншы час нічога не чапайце, бо праца будзе дарэмнай. Глядзі не пераблытай...

Толькі сонца ўзнялося, а селянін ужо бегаў па вёсцы ды людзей склікаў:

— Уставайце, браточкі, ды за працу брацца будзем, бо часу мала засталося да Вялікадня...

Але вяскоўцы нічога не разумелі. Тады распавёў ён ім пра свой дзіўны сон, і ўзяліся сяляне дружна за працу. Якраз да Вялікадня і ўзвялі новы мост. Трэці па ліку. Але якраз на ім і перастаў Пярун выпрабоўваць цярпенне людское — больш не падпальваў, не джгаў у яго сваімі вогненнымі маланкамі. Вось таму той мост і празвалі Перуновым, а ад яго і вёска атрымала сваю назву.

## ТРОХГРАННЫ ДУБ

Наша вёска так называецца ад старога, сімвалічнага дрэва. Доўгі час яно расло ў бліжэйшым лесе, але потым з-за абыякавых адносін аднаго памешчыка было спілавана і разбіта на дошкі. Толькі памяць усё роўна засталася. І трэба сказаць, што карані гэтай памяці яшчэ ў язычніцтве, калі нашы продкі пакланяліся магутнаму асілку-дубу, абагаўлялі надзвычай прыгожае дрэва. Паслухайце, як падзеі разгортваліся:

Першапачаткова паселішча ўвогуле не мела ніякай назвы. Стаялі сабе хаты, дый годзе. Людзі жылі ў іх, займаліся тым самым, чым і іхнія суседзі: працавалі, весяліліся, адпачывалі, а здаралася бяда-гора, то і яе перажывалі. Пасмуткуюць ды зноў галовы ўздымаюць, бо жыццё ідзе, усё расце і развіваецца. Зямля не надта ўрадлівая была. Расло збожжа кволенькае, гародніна нейкая, але местачкоўцы і гэтым навучыліся зада-

вальняцца. Ледзьве хапала запасаў ад старога ўраджаю да новага, але сяляне не падалі духам, ведалі, што ў некаторых суседзяў і гэтага няма, ім прасіць-маліць даводзіцца, каб зямлю засеяць ды з голаду не памерці.

Навокал вёскі шумеў-гуў адвечны лес. Колькі яму было стагоддзяў — ніхто не цікавіўся, але пушча была, відаць, першастваральная. Дрэвы таўшчэразныя, высачэнныя, пні-вываратні — што хаціны. Часам людзі ўбіваліся ў такія гушчары, дзе не толькі ў поўны рост нельга было прайсці, але нават і прапаўзці.

Некрануты гэты лес, які называлі Завішанскай пушчай, цягнуўся некалі на дзесяткі вёрстаў. Спачатку ён быў нічыйны, а потым, пастунова, у яго з'явіліся гаспадары. Добрая палова належала аднаму з найбольш знатных з іх — Радзівілу. Другая частка была казённая, а на пустках і незайздросных сенажацях гаспадарылі сяляне, пра якіх мы вялі вышэй гаворку. На перакрыжаванні ўсіх гэтых уладанняў і ўзвышаўся шматвяковы асілак-дуб. Пра яго песні і казкі мясцовыя жыхары складалі, бо ён сустракаў і праводзіў не адно пакаленне людзей.

А яшчэ — дрэва было надзвычай прыгоднае як межавы знак. Мяркуйце самі: з аднаго боку ўладанні Радзівіла, з другога — казённы лес, а з трэцяга — землі вяскоўцаў. Квартальныя ды леснікі праводзілі, арыентуючыся на дуб, свае прасекі-межы і глядзелі, каб не былі парушаны мінулагоднія межы.

Радзівіл наняў сабе на службу дзесяткі, а можа, і сотні леснікоў, аб'ездчыкаў ды іншых служачых, і яны дзень ды ноч пільнавалі панскі лес. Калі зловяць якога вяскоўца ці жанчыну, што пакваліліся на памешчыцкае дабро і назбіралі ягад ці грыбоў, то так дадуць бізунамі, што да скону жыцця памятаць будуць. Селяніну порткі здымуць ды туды мурашак награбуць, а потым зноў на збітага нацягнуць. Рукі за спінай звяжуць, і ратуйся як хочаш. Круціцца, верашчыць немым голасам чалавек, а выкруціцца не здолее сам. Пакуль да вёскі дабяжыць, то ажно пасінее ад болю і крыку. Жанчыну, то таксама не пашкадуюць. Старая калі, дык улупяць гарачых, а калі яшчэ маладжавая ды з твару не страшная, то згвалцяць агулам і пасля спадніцу на галаве завяжуць. Ідзе жанчына, спатыкаецца — дарогі ж не бачыць, а ёй услед рагочуць-насміхаюцца панскія служкі:

— Запляцешся дамоў, то мужу паскардзіся! Бу-

дзеш ведаць, як не на сваё дабро рот разяўляць!

Таму не надта лезлі ў панскі лес вяскоўцы, баяліся самі і дзяцей сваіх адвучвалі ў той бок глядзець.

Але аднаго разу і сяляне адыграліся на панскіх лесніках ды аб'ездчыках. Пайшлі яны неяк на сваё поле, што ля самага лесу было засеяна, і ажно пасталі ад здзіўлення: добрыя сто сажняў захапілі радзівілаўскія служкі, панскія знакі паставілі і мяжу па-новаму правялі, каб сляды свайго зладзейства схаваць. Калі б толькі адзін чалавек быў, то засумняваўся б, а тут жа цэлая грамада на працу прыйшла, і кожны добра ведаў, дзе панскае канчалася, а іхняе пачыналася. Таму адразу пачалі спрачацца, што рабіць. Некаторыя, найбольш асцярожныя і палахлівыя, раілі:

— Няхай, браткі, так і будзе. Нічога мы не зробім. Не будзіце ліха, то будзе ціха. Зачэпім пана, то ён з нас па тры шкуры спусціць загадае. Хіба ж ад гэтага лягчэй стане?

Другія, больш рашучыя і адчайныя, выказвалі сваё незадавальненне і патрабавалі неадкладна ўсё зрабіць, як і было раней:

— Бачыш ты, гэтым панскім падлізам захацелася выслужыцца, дык яны нашай зямлі свайму гаспадару адрэзалі. Калі мы не зробім па-старому, то яны заўтра яшчэ болей нашага прыхопяць. Адчуюць, што мы безабаронныя. Зараз вось павырываем слупкі і пазакопваем іх там, дзе яны і павінны тырчаць...

Натоўп рушыў да слупкоў, толькі чалавек колькі засталося на месцы, відаць, вырашаючы, што рабіць. І ў гэты самы момант з лесу выскачылі тры вершнікі:

— Што гэта вы робіце? Хто вам дазволіў!

І за бізуны схапіліся, а мужчыны — за калы ды вілы, і давай пярэсціць панскіх леснікоў. З коней пазбівалі і ляжачых дубасяць ды яшчэ і прымаўляюць:

— Будзеце ведаць, як нашу зямлю чапаць!

Тыя верашчаць, прыкрыцца імкнуцца, ды дзе там ад стольких людзей схаваешся. Тады адзін з леснікоў і загарлаў:

— Ну як вырвуся, то нікому з вас спуску не дам! Усе вы ў мяне, як гады на патэльні, поўзаць будзеце!

— Дык яны яшчэ і пагражаюць!— ускрыкнуў здаравенны селянін, які і ў бойцы не ўдзельнічаў, бо баяўся, што адразу сваімі пудовымі кулакамі пазабівае іх.— Іх лупцуюць-вучаць, а ім такая навука на карысць не ідзе... Трэба ведаеце што зрабіць?— і ска-

заў такое, што не кожны паўторыць, бо сорамна.

Вяскоўцы, разгарачаныя бойкай, ледзьве супыніліся, але ўсё ж выслухалі асілка.

— А што, браточкі, давайце гэтак і зробім, дык яны нам за межавыя слупы будуць. Болей тады ніхто не кране слупкоў.

Ухапіліся за леснікоў і павалаклі, а тыя не ведаюць, што далей будзе, толькі нешта мармычуць сабе пад нос.

— Глядзіце пні шукайце, каб з трох бакоў дуба былі, якраз па ранейшых межах. Няхай стаяць і іншым нагадваюць, што іх за свавольства чакае.

Так і зрабілі. Толькі цяпер служкі здагадаліся пра ўсё і ўзвылі. Прасілі, малілі, але сяляне былі непрыступныя:

— А вы нас некалі шкадавалі? Вы нашых жанчын ды дачок не ганьбілі?

Расшчапілі пянькі, пазаганялі туды кліны і давай штаны з леснікоў сцягваць. А тыя кусаюцца, галосяць, ды ўжо позна вінаваціцца ўздумалі. Спачатку самага злога, таго, які абяцаў адплаціць вяскоўцам, тым канцом, якім усе мужчыны ганарацца, у пень упёрлі і клін выбілі. Ён адразу гэтак заверашчаў — усё роўна што тысяча ласёў затрубіла адначасова. Потым і астатніх такі ж лёс чакаў.

Пайшлі вяскоўцы дамоў, а леснікі так у расшэпленых пнях і сканалі. З-за іх пан нават і не судзіўся. Што яму просты чалавек, калі іншага можна наняць і ён гэтак жа свайго месца трымацца будзе. Але леснікі болей не надта лезлі да вяскоўцаў. Супакоіліся, навучаныя тым учынкам.

Дуб, як сімвал-сведка, стаяў на сваім месцы і аб нечым ціха гаманіў з падрастаючымі дрэвамі, нібы распавядаў ім пра ўсё тое, што давялося яму бачыць на сваім працяглым вяку. Ды здарылася бяда і з магутным дрэвам. Радзівіл і той яго не крануў, пакінуў у спакоі, а нейкі беднаваты панок знішчыў дуб-асілак. Здарылася ўсё вось як.

Калі ўжо Радзівіл прайграў большую частку сваіх грошай і ўладанняў, то ягоныя землі пачалі купляць усялякія паны і купцы, абы грошы былі. Будзь ты хоць селянінам у лапцях, але толькі каб заплаціў звонкай манетай.

Купіў частку зямель нейкі прыезджы пан. Не надта багаты, але пыхі меў — і блізка не падыходзь. Як прыдбаў надзел, дык адразу паехаў яго аглядаць. Едзе і

фурмана ў спіну ўвесь час штурхае, каб той распавядаў, дзе што знаходзіцца, а як убачыў агромністы дуб-волат, то і завохкаў:

— Ой, Божачкі! Ды ён жа столькі зямлі займае! Спілаваць неадкладна трэба, каб пра былога гаспадара і памяці не засталося. Я цяпер тут самы знакаміты! Спілаваць!

— Гэта ж трохгранны дуб,— паспрабаваў было растлумачыць фурман, але ягоны гаспадар і чуць не пажадаў:

— Спілаваць!

Прыйшлі з раніцы вяскоўцы. Баяцца пілаваць дрэва, якое ў іхняй памяці асацыіравалася з нечым незвычайным, ды пан падганяе:

— Пілуйце, няма чаго стаяць!

Так і спілавалі. І ўсё-ткі славуты дуб не пайшоў проста на дровы. Распілавалі яго на асобныя плахі і гэты трывалы матэрыял перадалі на будаўніцтва царквы ў Лядах.

А вёску, ушанаваўшы дрэва, так і назвалі — Трохгранны Дуб.

# ЗМЕСТ


МІНСК . . . . . . . . 3
Заслаўе . . . . . . . 11
Відагоршч . . . . . . 21
Дафарэнцыя . . . . . 25
Навашыно . . . . . . 30
Паперня . . . . . . . 33
БАРЫСАЎ . . . . . . 39
Божадары (Бярозаўшчына) . . . . . . . 48
Касцюкі . . . . . . . 52
Лаўніца . . . . . . . 56
Селішчы . . . . . . . 61
Чэрнеўка . . . . . . 65
БЕРАЗІНО . . . . . . 70
Беліўаны . . . . . . 79
Высокая Гара . . . . 83
Жураўка . . . . . . 87
Любушаны . . . . . . 91
Падкамень . . . . . . 96
ВАЛОЖЫН . . . . . . 100
Івянец . . . . . . . 109
Дубіна . . . . . . . 113
Камень . . . . . . . 117
Рум . . . . . . . . 121
Саланая . . . . . . . 124
Семернікі . . . . . . 129
ВІЛЕЙКА . . . . . . . 134
Крывазнакі . . . . . 143
Латыгаль . . . . . . 147
Тэклінаполь . . . . . 151
Шведы . . . . . . . 155
ДЗЯРЖЫНСК (Крутагор'е. Койданава) 159
Фаніпаль . . . . . . 168
Коўшава . . . . . . 175
Марс . . . . . . . . 179
Скарабагатаўшчына 183
Скірмунтава . . . . 187
Юцкі . . . . . . . . 191
КАПЫЛЬ . . . . . . . 196
Цімкавічы . . . . . 204
Какорычы . . . . . . 210
Пацейкі . . . . . . . 214
Ракіні . . . . . . . . 219
Смолічы . . . . . . . 222
Траянава . . . . . . 227
КЛЕЦК . . . . . . . . 232
Сіняўка . . . . . . . 236
Арда . . . . . . . . 243
Колкі . . . . . . . . 246
Морач . . . . . . . 251
Сякерычы . . . . . . 253
Якшыцы . . . . . . . 256
КРУПКІ . . . . . . . 261
Халопенічы . . . . . 270
Ігрушка . . . . . . . 278
Касенічы . . . . . . 282
Ухвала . . . . . . . 286
Худаўцы . . . . . . . 291
Янаўшчына . . . . . 295
ЛАГОЙСК . . . . . . 299
Плешчаніцы . . . . . 308
Гайна . . . . . . . . 315
Крайск . . . . . . . 318
Укропавічы . . . . . 323
Харошая . . . . . . 326
Швабы . . . . . . . 330
ЛЮБАНЬ . . . . . . . 335
Урэчча . . . . . . . 343
Гарадзяцічы . . . . . 350
Замошша . . . . . . 354
Сарачы . . . . . . . 358
Сосны . . . . . . . 363
Таль . . . . . . . . 366
МАЛАДЗЕЧНА . . . . 370
Радашковічы . . . . 379
Беніца . . . . . . . 386
Крыніца . . . . . . . 390
Лебедзева . . . . . . 395
Раеўка . . . . . . . 399
Салтаны . . . . . . . 403
МЯДЗЕЛЬ . . . . . . 408
Будслаў . . . . . . . 417
Княгінін . . . . . . . 420
Нарач . . . . . . . . 424
Ніўкі . . . . . . . . 429
Чараўкі . . . . . . . 433
НЯСВІЖ . . . . . . . 437
Гарадзея . . . . . . 446
Вужанка . . . . . . 454
Лань . . . . . . . . 460
Саска-Ліпка . . . . . 464
Сейлавічы . . . . . . 468
Сноў . . . . . . . . 472

ПУХАВІЧЫ
(Мар'іна Горка) . . . . 477
Рудзенск . . . . . 486
Дрычын . . . . . . . 492
Пестунь . . . . . . . 496
Свіслач . . . . . . . 500
Талька . . . . . . . 504
Цітва . . . . . . . . 507
САЛІГОРСК (Старобін) 509
Чырвоная Слабада . . 519
Вялічкавічы . . . . 526
Гоцк . . . . . . . . 530
Раманаўка . . . . . 534
Рожан . . . . . . . 538
Скаўшын . . . . . 541
СЛУЦК . . . . . . . . 547
Вясея . . . . . . . . 555
Грэск . . . . . . . . 560
Жылін Брод . . . . 564
Таліца . . . . . . . 568
Шантароўшчына . . . 572
СМАЛЯВІЧЫ . . . . 575
Жодзіна
*(Жодзіна Слабада)* . . 584
Бабін Лес . . . . . 592
Жажэлка . . . . . 595
Залатая Горка . . . 599
Лазовы Куст . . . . 603
Шыпяны . . . . . . . 607
СТАРЫЯ ДАРОГІ . . . 611
Крычына . . . . . . 619
Мядзведня . . . . . 623
Паськовы Горкі . . . 627
Языль . . . . . . . 630
СТОЎБЦЫ . . . . . 634
Гудзялі . . . . . . . 641
Гуменаўшчына . . . 645
Жыгалкі . . . . . . 649
Свержань . . . . . . 653
УЗДА . . . . . . . . 658
Каменка . . . . . . . 666
Магільна . . . . . . 670
Старыя Маргі . . . . 674
Хатляны . . . . . . . 677
Чашын . . . . . . . 681
ЧЭРВЕНЬ (Ігумен) . . 685
Смілавічы . . . . . 694
Валевачы . . . . . . 702
Калодзежы . . . . . 705
Перуноў Мост . . . . 709
Трохгранны Дуб . . . 712

**Мінщчына:** Назвы населеных пунктаў паводле
М 62 легендаў і паданняў (Склад., запіс, апрац. А. М. Ненадаўца.— Мн.: Беларусь, 1998.— 718 с.: іл.— (Мой родны кут).
ISBN 985-01-0015-X.

У чарговую кнігу з серыі «Мой родны кут» увайшлі апрацаваныя легенды і паданні, звязаныя з паходжаннем назваў 141 населенага пункта Мінскай вобласці.

Спроба такога выдання прадпрымаецца ўпершыню.

Адрасавана тым, хто цікавіцца гісторыяй роднага краю, духоўнай культурай беларускага народа.

**ББК 82.33 (4 Беи) —**
**6+81.2 (4 Беи)**

Літаратурна-мастацкае выданне

**МІНШЧЫНА**

Складальнік **Ненадавец** Аляксей Міхайлавіч

Рэдактар С. А. Корань
Мастакі М. В. Анемпадзістаў, А. Г. Дашкевіч
Мастацкія рэдактары Г. І. Мацур, А. Г. Дашкевіч
Тэхнічны рэдактар С. Л. Печанёва
Карэктары Р. П. Іваненка, Н. М. Масарэнка,
Г. К. Піскунова, Л. Р. Кузьміна

Падпісана да друку з дыяпазітываў 10.03.98. Фармат 84×108 1/32. Папера газетная. Гарнітура Літаратурная. Афсетны друк. Ум. друк. арк. 37,8. Ум. фарб.-адб. 38,43. Ул.-выд. арк. 40. Тыраж 2000 экз. Зак. 438.

Дзяржаўнае прадпрыемства «Выдавецтва «Беларусь» Дзяржаўнага камітэта Рэспублікі Беларусь па друку. Ліцэнзія ЛВ № 2 ад 31.12.97. 220600, Мінск, праспект Машэрава, 11.

Дыяпазітывы падрыхтаваны ў друкарні выдавецтва «Беларускі Дом друку». 220013, Мінск, праспект Ф. Скарыны, 79.

Ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга паліграфкамбінат ВПП імя Я. Коласа. 220005, Мінск, Чырвоная, 23.

R 191100

*„Жыў тут на Свіслачы волат Менеск.*
*Дужы быў волат, не ведаў ён страху.*
*Млын збудаваў з каменяў на сем кол*
*Быў ён разумны, свабодны як знахар.*
*Жыў тут годзі, і нікога вакол*
*Тысяча год праляцела, ці меней.*
*Кажуць старыя, што так і было:*
*Сыпаў той волат у жорны каменне,*
*Жыта з іх белай мукою цякло.*
*Кажуць, з млыну камянеў ён багаты.*
*Час незапамятны той адыйшоў,*
*Хутка народ прыцавіты і вадны*
*Горад тут мыльна яго збудаваў*
*Менскам прыгожы той горад назвалі."*

*Алена Масеўская*
*(Белдзяржкамяло)*